
БЕЛАРУСКІ
ФАЛЬКЛОР

Ад складальнікаў



Вусная паэтычная творчасць — важнейшая частка духоўнай культуры народа — надзвычай добра захавалася не толькі ў памяці беларусаў, але і ў актыўным бытаванні, адыграла вялікую ролю ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці, у развіцці літаратуры і мастацтва, у выпрацоўцы сацыяльных ідэалаў, маральна-этычных нормаў жыцця, яна плённа ўплывае і сёння на працэсы нацыянальнага адраджэння. З багатай беларускай фальклорнай спадчыны ў хрэстаматыю адабрана толькі невялікая частка, якая дае ўяўленне аб паэтычнай творчасці народа, сістэме яе жанраў і відаў. У параўнанні з папярэднімі выданнямі карэнным чынам зменена структура раздзелаў, перапрацаваны ўступныя артыкулы, кніга дапоўнена лепшымі ўзорамі твораў, якія сістэматызаваны ў кожным раздзеле па жанрава-відавым і генетычна-тэматычным прынцыпах. У хрэстаматыі змешчаны творы асноўных жанраў і відаў беларускай народнай паэтычнай творчасці. Матэрыялы дапаможніка

поўнасцю адпавядаюць курсу, які выкладаецца ў вышэйшых навучальных установах,— «Беларуская вусная паэтычная творчасць».

Складальнікі ўлічылі заўвагі выкладчыкаў беларускага фальклору, рэцэнзентаў і шчыра дзякуюць ім, у прыватнасці прафесарам М. М. Грынчыку і У. А. Калесніку, за карысныя парады, што садзейнічалі паляпшэнню дапаможніка і праграмы курса.

Раздзелы кнігі падрыхтавалі: К. П. Кабашнікаў — «Асаблівасці і значэнне вусна-паэтычнай творчасці», «Казкі», «Легенды і паданні», «Методыка збірання фальклору»; А. С. Ліс — «Каляндарна-абрадавая паэзія», А. С. Фядосік — «Сямейна-абрадавая паэзія», «Прыказкі і прымаўкі», «Анекдоты»; І. К. Цішчанка — «Замовы», «Загадкі», «Пазаабрадавыя песні», «Балады», «Дзіцячы фальклор», «Прыпеўкі», «Народны тэатр». Раздзел «Пісьменнікі і дзеячы культуры аб фальклоры» склалі А. С. Ліс і І. К. Цішчанка, раздзел «Гістарычныя песні, творчасць рабочых, паэзія змагання» склалі К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс і А. С. Фядосік.

Асаблівасці і значэнне вусна-паэтычнай творчасці

Вусная паэзія — эпічныя, лірычныя і драматычныя творы, народжаныя калектыўным мастацкім геніем народа,— важная і неад'емная частка духоўнай культуры чалавецтва. У ёй адлюстраваны мары і спадзяванні людзей працы, гісторыя народа, яго быт, гаспадарчы вопыт, грамадска-палітычныя і эстэтычныя ідэалы. Яна з'яўляецца адной з крыніц развіцця літаратуры і прафесійнага мастацтва.

У большасці тэарэтычных прац і падручнікаў апошніх гадоў вусна-паэтычная творчасць вызначаецца як калектыўная паэтычная творчасць працоўных мас, якой уласціва вуснасць бытавання і наяўнасць варыянтаў асобных твораў. Побач з тэрмінам «вусна-паэтычная творчасць» ужываюцца тэрміны «народная паэтычная творчасць», «вусна-паэтычная народная творчасць», «народная паэзія», якія падкрэсліваюць, што перад намі вусная паэзія, створаная народам, а таксама тэрмін англійскага паходжання «фальклор», які ўзнік у сярэдзіне XIX ст. і даволі хутка стаў міжнародным. Апошні тэрмін — «фальклор», які ў перакладзе абазначае народную мудрасць, народныя веды, ужываецца ў міжнароднай навуцы, і ўсё часцей ва ўсходнеславянскай, не толькі ў вузкім значэнні — вусна-паэтычная творчасць, але і ў набліжаным да яго першапачатковага зместу і ахоплівае розныя праявы народнай культуры, у тым ліку музычнае, харэаграфічнае, дэкаратыўна-прыкладное і іншыя віды народнага мастацтва. Калі ж трэба ўдакладніць змест паняцця «фальклор», да яго дадаюць азначэнні «музычны», «харэаграфічны», «драматычны» і г. д. у залежнасці ад віду народнага мастацтва, да якога ён у кожным канкрэтным выпадку адносіцца.

Фальклор у яго вузкім, філалагічным значэнні — адзін з відаў народнага мастацтва, які адлюстроўвае рэчаіснасць у вобразах, створаных пры дапамозе паэтычнага слова. Народная паэзія дае нам сапраўдныя ўзоры мастацкай даскана-

ласці, што адзначалі вялікія мысліцелі і паэты розных часоў і народаў, у ліку якіх трэба назваць А. С. Пушкіна, Я. Коласа, Я. Купалу. Узнікшы на заранку гісторыі чалавецтва, яна ў многіх выпадках захоўвае значэнне эстэтычнай нормы і ўзору. «Якое харство гэтыя казкі! Кожная ёсць паэма!» — пісаў А. С. Пушкін свайму брату Льву ў 1824 г. пад моцным уражаннем ад пачутых народных казак, якія расказвала яму вечарамі Арына Радзівонаўна.

Важнейшыя спецыфічныя рысы народнай вусна-паэтычнай творчасці — калектыўнасць і традыцыйнасць. У калектыўнасці трэба бачыць вытокі высокага мастацкага майстэрства і ідэйнай глыбіні фальклору, з ёю звязаны многія яго асаблівасці. Фальклорны працэс заўсёды адбываецца ў межах традыцыі, апіраецца на папярэдні вопыт і здабыткі, выкарыстоўвае назапашаныя мастацкія каштоўнасці, якія належаць усяму народу. Гэтую думку яшчэ ў мінулым стагоддзі выказаў выдатны рускі вучоны Ф. І. Буслаеў, які, аналізуючы мастацкія сродкі ўкраінскай паэзіі, у тым ліку і пастаянныя эпітэты, пісаў: «Усе адзначаныя і разгледжаныя намі выразы, як звычайныя, агульнапрызнаныя і агульнаўжывальныя, належаць усяму народу, а не выключна таму ці іншаму спеваку; у іх адлюстроўваецца агульны, народны погляд на сусвет і чалавека, а не асабістыя думкі аднаго аўтара; яны складаюць стыль цэлага народа, а не вядомай асобы»[1].

Цікавы малюнак узнікнення народнай песні, яе далейшага ўдасканалення і калектыўнага характару даў М. Гарэцкі, які падкрэсліваў пры гэтым ролю працы і адчуванне рытму. «Пры сумеснай працы і гульнях,— пісаў ён,— песню мог складаць не адзін чалавек, а ўся грамада разам, калектыў людзей. Калі ж яе складаў і адзін чалавек, дык усё роўна яна зараз пераходзіла ў калектыўную творчасць — бо тады пясняр рэдка стаяў вышэй у пяснярскіх адносінах за сваіх слухачоў. І твор яго без труда ўспрымаўся. Калі ж песня захоплівала ўвагу слухачоў, дык яна магла ўжо паўторвацца другімі, пашырацца, спаўняцца грамадою. Пры гэтым словы мяняліся, кожны мог дадаць нешта ад сябе або нешта забыцца, абмінуць або нешта свядома выкінуць»[2]. І нават з'яўленне «пеняроў-прафесіяналаў», якія захоўвалі ў памяці старыя і складалі новыя песні, не змяніла сутнасці справы. «Аднак ад гэтага калектыўны характар вуснай паэзіі,— прадаўжаў М. Гарэцкі,— не змяніўся. Незапісанае імя аўтара-песняра забывалася, а яго слоўны твор у многіх вуснах губіў свой першы вы-

[1] *Буслаев Ф.* О литературе: Исследования и статьи. М., 1990. С. 113.
[2] *Гарэцкі М.* Гісторыя беларускае літаратуры. Мн., 1992. С. 8.

гляд, а дзеля таго, што людзі тады стаялі ўсе на аднакавым культурным узроўні, мелі аднакавыя погляды, жылі ў аднакавых умовах, ён прымаў агульнанародны характар»[3].

Калектыўнасць вуснай народнай паэзіі — гэта не звычайнае сааўтарства, а своеасаблівы і працяглы працэс мастацкай творчасці, працэс ідэйнага і паэтычнага ўдасканалення песень, казак, легенд, прыказак, прымавак. Найбольш ярка яна праяўляецца ў пастаянным адборы твораў народнай паэзіі: з многіх і многіх складзеных калі-небудзь твораў народ выбірае і захоўвае, шліфуючы дзесяцігоддзямі толькі самае лепшае, сугучнае яго думкам і эстэтычным поглядам. Калектыўнасць праяўляецца таксама і ў існуючых на кожным гістарычным этапе пэўных фальклорна-эстэтычных нормах, выпрацаваных калектывам, у межах якіх ствараецца кожны новы твор, і ў багацці сродкаў мастацкага адлюстравання рэчаіснасці, назапашаных за стагоддзі, якімі шырока карысталіся і карыстаюцца невядомыя аўтары фальклорных твораў, і ў комплексе ідэй, народжаных жыццём і барацьбой народа, што ўвасабляюцца ў мастацкіх вобразах вусна-паэтычнай творчасці.

Калектыўны пачатак у фальклоры не супрацьстаіць індывідуальнаму пачатку. Фальклору ўласціва арганічнае адзінства калектыўнага і індывідуальнага, пры якім калектыўнасць не перашкаджае праяўленню індывідуальных здольнасцей складальнікаў і выканаўцаў. Светапогляд, грамадзянская пазіцыя казачніка, спевака выразна адбіваюцца на ўсёй яго творчасці: на выбары твораў, на распрацоўцы вядомых сюжэтаў і трактоўцы традыцыйных вобразаў. Ад яго таленту ў значнай ступені залежыць мастацкі ўзровень твора і яго ўспрыняцце слухачамі: сапраўдны выканаўца адчувае настрой і патрэбы аўдыторыі, хутка дасягае кантакту з ёй, прыцягвае ўвагу слухачоў. Ён добра валодае голасам, мімікай, заўсёды імправізуе, перадае свае адносіны да падзей, аб якіх апавядае. Аб тым, наколькі поўна і ярка выяўляецца ў фальклоры індывідуальны пачатак, можа даць уяўленне параўнанне запісаў, зробленых ад некалькіх вядомых выканаўцаў народнай паэзіі, напрыклад ад казачнікаў А. Сержпутоўскага ці Е. Раманава.

З калектыўнасцю народнай творчасці арганічна звязана вусная форма бытавання фальклору. Фальклор узнік раней, чым пісьменнасць, і, натуральна, бытаваў толькі ў вуснай перадачы. Ды і са з'яўленнем пісьменнасці доўгі час перадача з вуснаў у вусны таксама была адзіным шляхам распаў-

[3] *Гарэцкі М.* Гісторыя беларускае літаратуры. С. 9.

сюджвання фальклору. Такім чынам народ знаёміўся не толькі з песняй, казкай, прыказкай, прымаўкай, легендай, але і з лепшымі ўзорамі пісьмовай літаратуры.

Аднак вуснасць як адна са спецыфічных асаблівасцей фальклору не павінна разглядацца толькі ў сувязі з развіццём пісьменнасці. Вуснае бытаванне — гэта адна з неабходных умоў працэсу мастацкага ўдасканалення народных твораў, адбору лепшага з мастацкай спадчыны. Вусная перадача звычайна з'яўляецца актам творчасці з уласцівай ёй імправізацыяй у межах фальклорнай традыцыі. У наш час, час суцэльнай пісьменнасці і тэхнічнага прагрэсу, друк, радыё, тэлебачанне спрыяюць масаваму распаўсюджанню народнай паэзіі, прапагандзе лепшых яе ўзораў, аднак яны не кананізуюць тэкст, не спыняюць яго фальклорнага жыцця.

Вуснае бытаванне народнай паэзіі вядзе да стварэння варыянтаў аднаго і таго ж фальклорнага твора, якія маюць пэўныя адрозненні. Нават ад аднаго і таго ж выканаўцы пры паўторных запісах мы атрымаем розныя варыянты. Яны могуць з'явіцца таксама ў выніку пераходу твораў у новае асяроддзе, механічных змен, калі выканаўца пад уплывам пэўных абставін свядома скарачае або пашырае твор, памылак памяці і г. д. Фальклорны твор існуе ў сукупнасці варыянтаў. Так, напрыклад, веснавая песня «Вол бушуе — вясну чуе» ў шматтомніку «Беларуская народная творчасць» прадстаўлена 57 варыянтамі, запісанымі ў розных раёнах рэспублікі на працягу 90 гадоў, балада «Браткі» — звыш 40, казка «Смерць-кума» — 19. Варыянты могуць быць блізкімі, калі адрозніваюцца асобнымі словамі, радкамі песні, і далёкімі, калі адрозненні набываюць больш істотны характар і закранаюць колькасць і змест асобных строф, рытміку, а ў апавядальных жанрах — асобныя сюжэтныя звёны, сістэму вобразаў, мастацкіх сродкаў. Выяўленне і запіс варыянтаў мае вялікае навуковае значэнне. Аналізуючы іх, можна прасачыць гістарычнае жыццё твора, змены, якія адбываліся пры перадачы з пакалення ў пакаленне, мясцовыя асаблівасці, геаграфію распаўсюджання, міжэтнічныя ўплывы.

Калектыўнасць, вуснасць бытавання, варыянтнасць — рысы, якія ўласцівы толькі фальклору і якімі ён прынцыпова адрозніваецца ад мастацкай літаратуры. Фальклорныя творы адрозніваюцца ад твораў пісьмовай літаратуры і некаторымі асаблівасцямі мастацкай формы. Гэта ў першую чаргу традыцыйная паэтыка, выпрацаваная народам на працягу стагоддзяў. Традыцыйная народная сімволіка, разнастайныя формы паралелізмаў, пастаянныя эпітэты, метафары, параўнанні і іншыя віды тропаў, асаблівасці кампазіцыі надаюць вуснай

паэзіі спецыфічны каларыт. Гэтыя мастацкія сродкі характэрны і для старадаўніх класічных форм народнай творчасці, і для многіх твораў, што ўзнікаюць у наш час, хаця, бясспрэчна, паэтыка сучаснага фальклору набывае і новыя рысы.

Фальклор адрозніваецца ад пісьмовай літаратуры і асаблівасцямі тыпізацыі. Літаратуры рэалістычных напрамкаў уласціва стварэнне тыповых характараў у тыповых абставінах. Тыповы характар, адлюстроўваючы асноўныя рысы свайго сацыяльнага асяроддзя і сваёй эпохі, праяўляецца праз індывідуальныя якасці героя, праз яго індывідуальнае і непаўторнае аблічча. Вобразы вусна-паэтычнай творчасці не маюць такой індывідуалізацыі. Асаблівасцю фальклору з'яўляецца і тое, што мастацтва слова тут вельмі цесна звязана з музычным мастацтвам, харэаграфіяй і неаддзельна ад працэсу выканання.

Узнікненне фальклору адносіцца да глыбокай старажытнасці і звязана з працоўнай дзейнасцю чалавека, з яго барацьбой за падпарадкаванне сіл прыроды. «Прызнана і ўстаноўлена,— пісаў А. М. Горкі,— што мастацтва слова нарадзілася ў глыбокай старажытнасці з працэсаў працы людзей. Прычынай узнікнення гэтага мастацтва служыла імкненне людзей да арганізацыі працоўнага вопыту ў моўных формах, якія найбольш лёгка і трывала замацоўваліся ў памяці,— у формах двухрадкоўяў, «прыказак», «прымавак», працоўных лозунгаў старажытнасці»[4]. Далейшае развіццё народнай паэзіі таксама было звязана з працоўнай дзейнасцю чалавека, з яго барацьбой за справядлівасць і сацыяльную роўнасць. Фальклор нясе ідэі справядлівасці і сацыяльнай роўнасці, перадае адносіны народа да важнейшых падзей, выказвае інтарэсы працоўных. У беларускай народнай вусна-паэтычнай творчасці моцна гучыць голас сацыяльнага пратэсту. Творы адлюстроўвалі і ўслаўлялі барацьбу супраць прыгнёту, супраць іншаземных захопнікаў. Патрыятызм працоўных мас, іх самаадданая барацьба за свабоду і незалежнасць нашай краіны ярка праявіліся ў творах часоў Вялікай Айчыннай вайны. Выкрышталізаваныя ў фальклоры маральныя і этычныя нормы, эстэтычныя густы, адносіны да працы — гэта мараль і этыка працоўных, гэта погляды народа на мастацтва, гэта яго адносіны да працы. Аднак трэба мець на ўвазе, што не ўсе вусна-паэтычныя творы адлюстроўвалі толькі перадавыя, прагрэсіўныя і дэмакратычныя ідэі. Умовы жыцця працоўных мас у грамадстве, падзеленым на антаганістычныя класы, адбіліся на іх свядомасці, якой былі ўласцівы і супярэчнасці і абмежаванасць, што

[4] *Горький М.* О литературе. М., 1953. С. 787.

знайшло адлюстраванне і ў некаторых творах. Таму да шматлікіх твораў, якія бытавалі і бытуюць у народзе, патрэбен гістарычны падыход, які дапаможа пазбегнуць суб'ектывісцкіх памылак у іх ацэнцы і адрозніць сапраўдную народную паэзію ад твораў, якія ўзнікалі ў іншым асяроддзі.

Фальклор займаў і займае важнае месца ў духоўным жыцці народа. Цяжка пераацаніць яго грамадска-палітычнае, эстэтычнае і выхаваўчае значэнне на ўсіх этапах развіцця грамадства, хоць роля яго і ўдзельная вага не заўсёды былі аднолькавымі. Народная вусная паэтычная творчасць вучыць палымяна любіць сваю радзіму, садзейнічае выхаванню лепшых якасцей чалавека: імкнення да свабоды, павагі да людзей, працавітасці, справядлівасці, сумленнасці, непрымірымасці да недахопаў і інш., выхоўвае пачуццё прыгожага на лепшых узорах створанага народам мастацтва.

Для большасці працоўных фальклор з'яўляўся фактычна і школай, і кнігай, і, нарэшце, цэлым кодэксам маральна-этычных норм. Палымянае паэтычнае слова народа ўзнімала масы на барацьбу з прыгнятальнікамі, садзейнічала росту свядомасці працоўных.

Народная творчасць — адна з жыватворных крыніц развіцця нацыянальнага прагрэсіўнага мастацтва і літаратуры. Асабліва вялікае значэнне меў фальклор для развіцця літаратуры тых народаў, якія доўгі час пакутавалі пад сацыяльным і нацыянальным прыгнётам, мова і літаратура якіх былі пад забаронай. Фальклор з'явіўся першай паэтычнай школай многіх выдатных беларускіх пісьменнікаў. Творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча, М. Багдановіча, Я. Коласа, Я. Купалы і многіх іншых вядомых беларускіх паэтаў і празаікаў непарыўна звязана з народнай паэзіяй і па сутнасці вырастала з яе. Гэта сувязь праявілася не толькі ў шырокім выкарыстанні фальклорных сюжэтаў, тэм, вобразаў, мастацкіх сродкаў, але і ў падыходзе, ацэнцы і адлюстраванні з'яў рэчаіснасці. Сувязь з народнай творчасцю спрыяла станаўленню рэалізму і народнасці беларускай літаратуры.

Фальклор як мастацтва слова звязаны з іншымі відамі народнага і прафесійнага мастацтва. Можна было б прывесці шмат прыкладаў дабратворнага ўплыву народнай паэтычнай творчасці на прафесійнае музычнае, выяўленчае мастацтва, на драматургію. Многія буйныя музычныя творы напісаны на фальклорныя сюжэты і шырока выкарыстоўваюць народны мелас. Напрыклад, толькі на сюжэт вядомай многім народам казкі «Папялушка» кампазітарамі розных краін напісана каля дзесяці опер і балетаў, у тым ліку дзіцячая опера Б. Асаф'ева

і балет С. Пракоф'ева. Беларускае народнае паданне «Машэка» лягло ў аснову лібрэта аднайменнай оперы Р. Пукста. Пастаянна звярталіся да беларускага народнага меласу кампазітары М. Чуркін, М. Аладаў, А. Туранкоў і інш. Да фальклорных сюжэтаў звярталіся сусветна вядомыя майстры жывапісу В. Васняцоў, В. Сяроў і інш. Шырокае выкарыстанне сюжэтаў і матываў вусна-паэтычнай творчасці ўласціва таксама народнаму прыкладному мастацтву, асабліва кераміцы, разьбе па дрэве. У сваю чаргу літаратура і прафесійнае мастацтва ўплываюць на развіццё фальклору, асабліва на мову, стыль, вершаскладанне, у пэўнай ступені на сістэму вобразаў і прыёмы мастацкага адлюстравання рэчаіснасці.

Фальклярыстыка як навука аб народнай паэзіі таксама звязана з іншымі галінамі навукі і ў першую чаргу з гісторыяй. Вывучэнне народнай вусна-паэтычнай творчасці толькі тады будзе плённым, калі даследчык знойдзе тлумачэнне складаных з'яў развіцця фальклору ў фактах гісторыі яго стваральнікаў і захавальнікаў. Значная частка фальклорных твораў, асабліва песень, звязана з абрадамі. Іх вывучэнне патрабуе добрых ведаў этнаграфіі — навукі, якая займаецца даследаваннем матэрыяльнага і духоўнага быту народа, у прыватнасці пытаннямі паходжання і сутнасці тых ці іншых абрадаў або звычаяў. Знаёмства з тэорыяй музыкі і харэаграфіяй аказвае вялікую дапамогу ў вывучэнні песень, прыпевак і частушак, у першую чаргу пры разглядзе іх мастацкіх асаблівасцей, рытмікі, структуры верша, а таксама пры класіфікацыі песень і г. д.

У творчасці кожнага народа ёсць свае непаўторныя рысы, якія ўтвараюць нацыянальную спецыфіку фальклору. Разам з тым вельмі многія творы, складзеныя рознымі народамі, падобныя; прычынамі такога падабенства з'яўляюцца агульнасць законаў развіцця чалавечага мыслення, свядомасці людзей і мастацкай творчасці, асабліва ў падобных умовах жыцця, генетычная блізкасць некаторых народаў, як, напрыклад, славянскіх, пастанны культурны абмен паміж народамі.

Беларуская народная вусна-паэтычная творчасць таксама мае шмат агульнага з творчасцю іншых народаў свету і ў той жа час уносіць у сусветную скарбніцу народнай паэзіі свой пэўны ўклад, канкрэтнае значэнне якога становіцца відавочным пры разглядзе асноўных этапаў развіцця беларускага фальклору і асобных яго жанраў.

Фальклор уяўляе сабой складаную ўзаемазвязаную сістэму жанраў, якія пастаянна знаходзяцца ў руху, у зменах, у нараджэнні новага і адміранні старога. Асаблівасці фальклорнага працэсу, дынаміка жанраў абумоўлены зменамі ў

сацыяльна-эканамічным жыцці грамадства і ў значнай ступені вызначаюцца мастацкім бачаннем рэчаіснасці, якое пануе на тым ці іншым гістарычным этапе. Народная паэзія, па словах М. Гарэцкага, «адбівае жыццё розных эпох, жыццё пры ўсякіх класавых групіроўках, эканамічных адносінах, веравызнаннях, светапоглядах, звычаях»[5]. У выніку кожны этап гістарычнага развіцця грамадства так ці інакш адбіўся ў фальклоры, у яго тэматыцы, вобразах і г. д.

Адным з важных фактараў, пад уплывам якога адбывалася і адбываецца развіццё беларускага фальклору, з'яўляецца адзінства паходжання, роднасць моў і трывалыя сувязі духоўнай культуры ўсходнеславянскіх народаў, што абумовіла блізкасць паэзіі і садзейнічала ўзаемапранікненню, узаемаўзбагачэнню фальклору.

Беларуская народная вусна-паэтычная творчасць прадстаўлена амаль усімі жанрамі: каляндарная і сямейная абрадавая паэзія, казкі, паданні і легенды, прыказкі і прымаўкі, загадкі, замовы, народны тэатр у розных яго відах, сацыяльна-бытавая лірыка. Не было ў беларускім фальклоры такіх твораў, як быліны або думы, спецыфічных для рускага і ўкраінскага фальклору, але беларускі народ таксама стварыў свой гераічны і гістарычны эпас, які хаця і не набыў адзінай жанравай формы, аднак даволі поўна адлюстроўваў многія гераічныя старонкі нашага мінулага. «Не трэба думаць,— пісаў яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя ў часопісе «Rubon» Ігнат Храпавіцкі, палемізуючы з думкай аб безэпічнасці нашага народа,— што паэзія беларуская была пазбаўлена ўсялякай гістарычнай вартасці. Наадварот, яна можа стаць прадметам цікавых назіранняў для гісторыка, які, не абмяжоўваючыся храналогіяй, сухой наменклатурай славутых імён, апісаннем войнаў і да т. п., хацеў бы адкрыць нам унутранае жыццё народа»[6]. На Беларусі бытавалі казкі і паданні аб волатах і асілках, казкі на былінныя сюжэты і песні быліннага складу, гістарычныя песні і паданні, якія апавядаюць аб барацьбе беларускага народа з рознымі іншаземнымі захопнікамі і прыгнятальнікамі.

Параўноўваючы жанравы склад фальклору трох братніх усходнеславянскіх народаў, можна адзначыць і іншыя адрозненні. Некаторыя жанры і віды народнай паэзіі ўласцівы толькі беларускаму фальклору або найбольш шырока ў ім прадстаўлены. Да іх ліку можна аднесці валачобныя песні і некаторыя іншыя творы веснавога цыкла: куставыя, песні,

---

[5] *Гарэцкі М.* Гісторыя беларускае літаратуры. С. 9.

[6] Rubon. 1845. N 5.

якія суправаджаюць абрад пахавання стралы, і інш. Наогул, абрадавая паэзія беларусаў, асабліва каляндарная, звязаная з земляробчай працай, у пэўнай ступені вызначае нацыянальную спецыфіку беларускай песеннай творчасці. Свае адметныя рысы маюць не толькі валачобныя, жніўныя, восеньскія, але і тыя групы песень, якія больш ці менш поўна прадстаўлены ў фальклоры ўсходнеславянскіх народаў, напрыклад, калядныя, летнія, а таксама радзінныя песні. Асаблівасці ў жанравым складзе мае таксама беларускі казачны эпас. Беларускія казкі ўзбагачаюць казачны эпас славян некаторымі новымі сюжэтамі і вобразамі. Характэрным відам беларускага народнага тэатра з'яўляецца батлейка.

Нацыянальны каларыт беларускаму фальклору надаюць паэтычныя вобразы волатаў і асілкаў, асобныя мастацкія сродкі, паэтычная мова. Але вылучаючы некаторыя спецыфічныя рысы беларускага фальклору, не менш важна адзначыць агульнае ў паэзіі братніх народаў як вынік агульнасці іх паходжання і непарыўных сувязей на працягу ўсёй гісторыі.

У эпоху феадалізму па канкрэтных сацыяльна-эканамічных, палітычных і гістарычных прычынах роля фальклору ў духоўным жыцці працоўных Беларусі была як ніколі вялікай. Доўгі час ён заставаўся для працоўных мас адзінай даступнай сферай выяўлення эстэтычных поглядаў і мастацкіх здольнасцей, адзінай даступнай шырокім масам скарбніцай ведаў аб навакольным свеце. У гэты гістарычны перыяд асабліва ярка праявіліся асноўныя спецыфічныя рысы фальклору як народнага мастацтва слова — калектыўнасць, вуснасць, варыянтнасць, канчаткова склалася традыцыйная паэтыка. Казкі і песні, прыказкі, прымаўкі і іншыя творы, накіраваныя супраць паноў і служак культу, адыгрывалі важную ролю ў фарміраванні светапогляду працоўных мас, заклікаючы на барацьбу з прыгнятальнікамі.

Многія складзеныя беларускім народам у мінулым вусна-паэтычныя творы дзякуючы глыбіні выказанай у іх думкі, шчырасці пачуццяў і дасканаласці мастацкай формы вытрымалі выпрабаванне часам і зараз шырока бытуюць у народзе. Вобразы Несцеркі, Рымшы, мудрай дзяўчынкі-Семілеткі і многіх іншых герояў беларускага фальклору дапамагаюць глыбей зразумець гісторыю нашага народа, асаблівасці яго нацыянальнага характару.

З усталяваннем новых грамадскіх адносін, зменамі ў сацыяльнай структуры грамадства, у дэмаграфічнай сітуацыі, сямейным быце, якія інтэнсіўна адбываліся з другой палавіны XIX ст., беларуская народная паэтычная творчасць набы-

вае новыя рысы, больш складаным становіцца фальклорны працэс. Хаця па-ранейшаму ў жыцці шырокіх мас вялікае месца займае традыцыйная паэзія, яна не застаецца нязменнай і не з'яўляецца ўжо адзіным выразнікам мар і спадзяванняў народных, адзіным сродкам выяўлення мастацкага таленту і задавальнення эстэтычных запатрабаванняў.

Частка твораў найбольш старажытных жанраў народнай паэзіі, заснаваных на міфалагічных уяўленнях нашых продкаў аб навакольным свеце, паступова выходзіла з актыўнага бытавання, што выклікала непакой Е. Р. Раманава і некаторых іншых фалькларыстаў мінулага за лёс традыцыйнага фальклору, у прыватнасці чарадзейных казак. Але, прызнаючы гэты факт, мы ў той жа час маем не менш падстаў гаварыць аб жыццяздольнасці традыцыйнага фальклору, чым аб яго адміранні ў эпоху капіталізму. Гэта жыццяздольнасць праявілася не толькі ў бытаванні старога, але і ў наяўнасці тых унутраных жыватворных сіл, якія садзейнічалі ўзнікненню новых варыянтаў традыцыйных песень, узбагачэнню старых жанраў новымі творамі і фарміраванню новых відаў народнай паэзіі. Ды і адмірала старое даволі своеасабліва: забываліся, знікалі некаторыя абрады, але частка песень, звязаных з імі, працягвала сваё існаванне ўжо як творы пазаабрадавай паэзіі.

У песнях, казках і ў іншых жанрах яскрава праявіліся тэндэнцыі да больш глыбокага і праўдзівага адлюстравання рэчаіснасці, зварот да самых надзённых, важных і хвалюючых праблем. Гэтыя тэндэнцыі ўласцівы ў першую чаргу творам сацыяльнай тэматыкі, але прыкметныя ў любоўнай лірыцы, казках і г. д.

У рамках старых жанраў нараджаліся варыянты раней вядомых твораў, а таксама новыя творы, якія адлюстравалі новы этап барацьбы працоўных супраць прыгнятальнікаў. З'явіліся казкі, песні і творы іншых жанраў, у якіх беларускі народ узнімаўся да крытыкі існаваўшага ладу як ладу сацыяльнай няроўнасці і несправядлівасці, выступаў супраць цара, выкрываў неадпаведнасць паміж словамі і справамі служак культу, маляваў Бога абаронцам багацеяў, адмаўляючы яго існаванне. Да іх ліку адносяцца казкі «З чаго ліха на свеце», «Іванка Прастачок», «Прошча», «Заламка», песні «Ой, ляцелі гусі...», «Горка доля ты, батрацкая...», прыказкі *Ад прыгона аслабанілі, ды пад пана пасадзілі; Да Бога высока, да цара далёка; За тым і Бог, хто бедака перамог* і многія іншыя. Характэрнай рысай развіцця традыцыйных жанраў было ўсё больш глыбокае адлюстраванне рэчаіснасці, узмацненне рэалістычнай плыні ў народнай паэзіі.

Адбываецца канчатковае фарміраванне і далейшае развіццё новых відаў вусна-паэтычнай творчасці — частушкі, народнага анекдота,— якія выраслі на глебе традыцыйнага фальклору і хутка сталі вядомы шырокім колам гарадскога і сельскага насельніцтва.

Яшчэ больш значнай і прынцыпова новай з'явай у паэзіі беларускага народа было зараджэнне і развіццё рабочага фальклору з яго новымі тэмамі, ідэямі, мастацкімі вобразамі. Рабочы фальклор на Беларусі быў звязан з традыцыйнай паэзіяй і ў той жа час ён развіваўся разам з рабочай паэзіяй рускага і ўкраінскага народаў, што спрыяла ўзаемаўзбагачэнню паэтычнай творчасці, надавала ёй рысы інтэрнацыяналізму. Мастацкая творчасць рабочых праяўлялася ў розных формах: апрача вуснай паэзіі, назіралася некаторае развіццё мастацкай самадзейнасці, самадзейнай паэтычнай творчасці і інш. Паэзія рабочых нараджалася як паэзія працы і барацьбы, паэзія сацыяльнага пратэсту, паэзія светлай веры ў перамогу ідэй сацыяльнай справядлівасці. На развіццё традыцыйнай вусна-паэтычнай творчасці, рабочага фальклору, на фарміраванне светапогляду працоўных прыкметны ўплыў аказала рэвалюцыйная паэзія.

Складаным і супярэчлівым было развіццё народнай паэтычнай творчасці пасля Кастрычніка 1917 г. Высокія мэты, абвешчаныя партыяй, згуртоўвалі працоўных, аб'ядноўвалі іх, выклікалі непадробны, сапраўдны энтузіязм, з якім яны ўзяліся за будаўніцтва новага жыцця і які знайшоў сваё паэтычнае ўвасабленне ў шматлікіх творах, прысвечаных абароне краіны і новай савецкай улады, індустрыялізацыі, калектывізацыі, культурнай рэвалюцыі і іншым буйным падзеям, што адбываліся на нашай зямлі і змянялі — не заўсёды ў лепшы бок — яе аблічча. Але побач з Днепрагэсам і Магніткай існавалі ГУЛАГ і Курапаты, побач з калгасамі, на палетках якіх загулі трактары, былі раскулачаныя, побач з энтузіязмам з'явіліся расчараванасць, апатыя, крытычнае стаўленне да рэчаіснасці, адмаўленне яе, што таксама знаходзіла водгук у народнай паэзіі.

Тая дваістасць, што заўважалася ў грамадскай свядомасці, той водападзел паміж афіцыйнай ідэалогіяй і грамадскай думкай з яе разнастайнымі ацэнкамі рэчаіснасці, адбіліся і ў народнай паэтычнай творчасці, дзе існавала, умоўна кажучы, афіцыйная плынь — яна ўсяляк падтрымлівалася, прапагандавалася,— і бесцэнзурная народная творчасць, якая адлюстроўвала розныя погляды на рэчаіснасць, розныя яе ацэнкі, часам супрацьлеглыя афіцыйным і таму практычна

забароненыя. На вялікі жаль, сёння ў распараджэнні даследчыка ёсць у асноўным запісы твораў першай плыні і амаль адсутнічаюць творы, якія супрацьстаялі афіцыйнай ідэалогіі, што вельмі ўскладняе стварэнне аб'ектыўнага малюнка развіцця народнай творчасці ў гэты час.

І ўсё ж нават у такіх складаных умовах фальклор развіваецца. Па-ранейшаму істотнае месца ў жыцці сучаснікаў займае традыцыйны фальклор, многія творы якога аказаліся сугучнымі новаму часу. Яны не толькі бытуюць, але і ўплываюць на фарміраванне мастацкага мыслення, эстэтычных ідэалаў і застаюцца крыніцай мастацкай вобразнасці.

Жанравы склад вусна-паэтычнай творчасці савецкага часу некалькі змяніўся ў параўнанні з мінулым. Асноўнае месца зараз належыць песеннай творчасці: песням і частушкам. Сярод новых песень ёсць узоры грамадзянскай і любоўнай лірыкі, балад і г. д. Разнастайнасцю вылучаюцца і частушкі. Менш прыкметныя ў рэпертуары апавядальныя жанры, асабліва казкі. З апавядальных жанраў трэба адзначыць вусныя сказы, успаміны, анекдот. У час Вялікай Айчыннай вайны былі створаны легенды пра Заслонава, Каўпака і іншых герояў. Па-ранейшаму шырока бытуюць прыказкі і прымаўкі.

Характэрнай асаблівасцю сучаснай беларускай паэзіі з'яўляецца яшчэ большае ўзаемадзеянне фальклору і літаратуры, узаемапранікненне і ўзаемаўзбагачэнне паэтычнай творчасці народаў нашай краіны і суседніх краін.

Адна з галоўных рыс фальклорнага працэсу нашых дзён — разнастайнасць форм праяўлення мастацкіх талентаў народных мас. Побач з вядомымі класічнымі фальклорнымі формамі маюць месца такія з'явы, у якіх больш выразна праяўляецца ўжо не калектыўны, а індывідуальны пачатак. Асабліва гэта датычыць самадзейнай паэтычнай і музычнай творчасці.

Беларуская народная вусна-паэтычная творчасць глыбока і ўсебакова раскрывае веліч мастацкага генія народа, прыгажосць яго маральнага аблічча, высакароднасць ідэалаў, самаадданую барацьбу за іх ажыццяўленне. Разам з іншымі відамі народнага і прафесійнага мастацтва яна з'яўляецца важнейшым духоўным набыткам нацыі, адным са сродкаў выхавання яе самасвядомасці.

Пісьменнікі і дзеячы культуры аб фальклоры

П. М. ШПІЛЕЎСКІ

Па дарозе мне сустракаліся знаёмыя твары і касцюмы, чулася родная беларуская мова, якая... шчаслівы час!.. некалі, у гады маленства і дзяцінства, гучала ў вушах маіх, калі добрая бабулька-нянька закалыхвала мяне фантастычнымі казкамі пра шапачку-невідзімку, пра заклятых княжнаў, пра Бабу-Ягу — касцяную нагу.

У гады дзяцінства я і сам марыў, што некалі, гадоў праз дваццаць... буду вывучаць або, дакладней, давучваць родную сваю мову і для гэтага падарожнічаць па тых самых месцах, што дарагія для мяне ўспамінамі аб шчаслівым мінулым. Цяпер настаў для мяне час выкарыстаць даўняе знаёмства з гэтай старажытнарускай мовай, на якой гаварылі галоўныя плямёны славяна-рускія, крывічы і дрыгавічы, і на якой пісалі на Русі многія акты і дагаворы, нават Літоўскі статут. Прыгадаліся і казкі, чутыя ў дзяцінстве, і прымаўкі, і прыказкі, і розныя павер'і пра духаў, ведзьмароў, чараўнікоў і страшыдлаў некалі язычніцкага рускага народа.

Тое, над чым раней у нас смяяліся і лічылі не больш чым забавамі лакейскіх і дзявочых у памешчыцкіх хутарах, цяпер звяртае ўвагу вучонага рускага свету, за тое цяпер узяліся сур'ёзна і разумна ў вучоных кабінетах і кафедрах... І не дзіва, беларуская мова, паданні, павер'і і казкі беларусцаў варты таго: беларуская мова такая самастойная, настолькі характарыстычная ў археалагічных і філалагічных адносінах, паданні, павер'і і казкі яе настолькі арыгінальныя, да таго напоўнены першабытнай, старажытнай паэзіяй славянарускай, што пры сучасным напрамку і развіцці ў нас філалогіі і археалогіі становіцца неабходным даследаваць і знайсці галоўны прытулак старажытнай рускай славяншчыны і пазнаёміцца добра з роданачальнымі яе элементамі, якія захаваліся ў Беларусі: вывучаючы беларускую мову, паданні, павер'і і казкі беларускага народа, мы вывучаем мову, паняцці і вераванні сваіх продкаў.

Пачуўшы даўно знаёмую мне беларускую мову, я міжволі спыніўся і, здавалася, удыхаў у сябе пачутыя ў паветры гукі меладычнай, пявучай мовы, у душу маю так вось і прасіліся адгалоскі слоў, вымаўленых, па звычаю беларусцаў, нараспеў, працягла.

АЛЯКСАНДР РЫПІНСКІ

Ёсць у простай яго [селяніна] думцы, у шчырай наіўнай ноце яго песні, у яе прыродных танах якаясь невядомая любасць, чароўная сіла, якая прымушае шыбка біцца сэрца; захапляе, уракае, нават самой прастатой цешыць розум.

ЯН ЧАЧОТ

Калі б такія ўсе ўрачыстасці (вяселлі і старажытныя святы) не ўнікалі вока даследчыка, які цікавіцца і любіць свой край і сялян, быў бы гэта цудоўны помнік уласнай фантазіі і ўяўлення жыхароў беларускай зямлі, што не настроены ні на грэчаскі, ні на лацінскі, ні на французскі лад, а спяваюць так, як адчуваюць сэрцам. Такіх урачыстасцяў шмат, напрыклад, купалле, дзяды, каляды, вялікдзень, шчадрэц, зажынкі, дажынкі, Юр'е. Усё гэта з рытуаламі і песнямі... Словам, пільна трэба заняцца збіраннем такіх помнікаў сапраўднай літаратуры гэтага краю.

Сёння кожны шкадуе, чаму Длугаш або Стрыйкоўскі, нашы храністы, не сабралі песень і паданняў народа, пра якія толькі мімаходам упамінаюць; будуць некалі, праз колькі вякоў пасля нас, шкадаваць і больш слушна папракаць сённяшнія часы, калі мы не збяром рупліва гэтых помнікаў і не перададзім патомкам: бо хоць просты народ — гэта верны і не вельмі зменлівы хавальнік мясцовых нораваў і звычаяў, аднак і ён з поступам цывілізацыі або нават са зменай адносін у краіне павінен перайначыцца і не можа зберагчы ў чысціні карціну жыцця, што праходзіць у гэтай юдолі; аднак любяць нашчадкі аглядаць абліччы сваіх прадзедаў; захавайма ж іх для іхняй чуллівасці, а пагаслі, яшчэ абудзім у іх сэрцах большую прыхільнасць да цяперашняга веку і памяць аб ім.

Паэзія, якую мы называем сённяя гміннай, простанароднай, была некалі агульнай для ўсіх нашых продкаў: для паноў, князёў, словам, агульнанароднай; ужо ад аднаго гэтага яна павінна была б карыстацца большай павагай нават у тых, хто нічога добрага не хоча бачыць ва ўсім, што ёсць простанароднае, сялянскае.

Нашым сялянам мы абавязаны тым, што яны захавалі

старажытныя абрады і песні. Ім за гэта мы павінны быць удзячныя. Паддаўшыся ўплыву суседніх плямён і цывілізацый Еўропы, мы самі змяніліся хутчэй, чым яны; а таму і забылі мы тыя песні, якія далёкая прабабка не аднаго з нас, можа, нават у той самай вёсцы спявала пры кудзелі разам са сваімі роднымі, нашчадкі якіх ад таго, што не мелі заслуг у краі, засталіся ў становішчы падданых.

ЯН БАРШЧЭЎСКІ

Я нарадзіўся там і вырас, іх скаргі і сумныя апавяданні, як пошум дзікіх лясоў, навявалі на мяне заўсёды змрочныя думкі і з дзяцінства былі маёй адзінай марай.

Некаторыя з гэтых родных успамінаў я прыгадаў у баладах; гэта быў мой самотны напеў. Балады былі пачаткам таго, пра што я меў намер расказаць падрабязней. Гэта ў чалавечай натуры — ад песні пераходзіць да апавядання таго, што нас найбольш займае.

Апавяданні старых пра розныя здарэнні ў народных іх аповесцях, якія перайшлі з вуснаў у вусны з старадаўніх часоў, былі для мяне гісторыяй гэтай зямлі, характару і пачуццяў беларусаў.

Шмат і іншых паданняў у тым краі кружыць сярод простага народа; у многіх з іх згадваюцца гістарычныя выпадкі, іншыя ж — болей плён фантазіі і меланхалічнага духу, які адзначае жыхара гэтых дзікіх і лясістых ваколіц; па прыродзе ён здольны да жвавай думкі, уяўленне яго стварае дзіўныя карціны. Некаторыя з тамашніх простанародных паданняў я перадаў у баладах, змешчаных у трох томіках штогодніка «Niezabudka», а менавіта: «Крыніца Дзяўчыны», якая знаходзіцца ў паўночным баку ад горада Полацка, схаваная ў цяні адвечных лясоў; «Дзве Бярозы», якія і цяпер народ паказвае нападалёку ад берагоў возера Шэвіна; «Курганы і Русалка», узятыя з песні чараўніцы, якая, сумуючы па сваім каханку, спявае:

Гусанькі лябёдэнькі,
Скіньця мне па пёрэчку,
Я з вамі полечу.

У большасці песень гэтага простага народа, як у думках, так і ў мелодыі, ёсць нешта меланхалічнае, і нават вясельныя песні, дзе маладым жадаюць шчаслівага супольнага жыцця, маюць у сабе нейкае пачуццё суму, як быццам яны не давяраюць будучаму лёсу ў гэтай юдолі плачу... Але вясельныя

абрады характарызуюцца рыцарскім запалам; малады перш чым стаць ля парога нарачонай, прывучае свайго каня не баяцца агню і кідацца ў полымя, а пасля такой падрыхтоўкі, калі збіраецца ехаць да сваёй нарачонай, ён і яго дружына апранаюць чырвоныя шапкі, звешваюць на грудзі чырвоныя хусткі і імчацца праз горы да дому, дзе іх чакаюць нявеста і сабраныя госці.

ІГНАТ ХРАПАВІЦКІ

Не трэба думаць, што паэзія беларуская была пазбаўлена ўсялякай гістарычнай вартасці. Наадварот, можа стаць прадметам цікавых назіранняў для гісторыка, які, не абмяжоўваючыся храналогіяй, сухой наменклатурай славутых імён, апісаннем войнаў і да т. п., хацеў бы адкрыць нам унутранае жыццё народу. Бо ў ёй выразна адбіты звычаі, хатні быт, характар нашага люду.

Памыліліся б мы, аднак, гаворачы, што гэта схільнасць нашага селяніна прыймання ўсялякіх уражанняў выключала здольнасць глыбока прасякнуцца імі. Нават павярхоўнае знаёмства з паэзіяй нашага люду павінна засцерагчы нас ад падобнай памылкі. Без гэтай велічы сэрца як бы мог просты беларускі селянін аздобіць свае творы кветамі найтанчэйшых пачуццяў і выпрацаваць у сабе такі мастацкі інстынкт, які часта адкрывае яму без дапамогі навуковых росшукаў самыя запаветныя таямніцы мастацтва.

АДАМ МІЦКЕВІЧ

...З усіх славянскіх народаў русіны, гэта значыць сяляне Пінскай, часткова Мінскай і Гродзенскай губерняў, захавалі найбольшую колькасць агульнаславянскіх рыс. У іх казках і песнях ёсць усё. Пісьмовых помнікаў у іх мала, толькі Літоўскі статут напісаны іх мовай, самай гарманічнай, з усіх славянскіх моў найменш зменены. Усю сваю гісторыю на зямлі яны прайшлі ў страшэннай галечы і прыгнёце.

УЛАДЗІСЛАЎ СЫРАКОМЛЯ

Справай вялікага значэння з'яўляецца ці то збіранне легенд, якія засталіся з часоў дахрысціянскай славяншчыны, у мэтах чыста гістарычных, ці то мастацкае адкрыццё цераз іх мінулага, што мроіцца за імглой вякоў, мінулага, частку вестак пра якое данеслі летапісы, частку дакапваемся мы з курганоў. Здаецца, гэта няшмат, але і з такой крыхі геніяль-

ны паэт можа стварыць рэчы гамераўскай магутнасці, бо шмат таго, што нам недарасказала кніжка або старая магіла, знайсці можна пад саламянаю страхою народа, які ў паданнях, казках, прыказках, прымхах і мове захаваў яшчэ мноства дахрысціянскага элементу. Вышэй жа за ўсё — умець падслухаць біццё сэрца гэтага народа, умець адкрыць іерогліфы легенд ключом уласнай шчаслівай інтуіцыі, умець узнавіць вобразы мінулага ў барвах і контурах, якія на працягу стагоддзяў асталіся,— вось задача паэта, вось яго наглядная ніва.

М. В. ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ

У песнях беларусаў шмат хараства і грацыі. Калі беларуская дзяўчына дзе-небудзь у лесе ці на паляне зацягне вяснянку, у яе песні адбіваецца лікаванне веснавой прыроды, ціхая радасць прабуджэння вясны; любоў і пяшчота нястрымана ліецца ў голасе спявачкі. Гэта — гімн вясне. На полі ў час жніва раздаецца ціхая журботная мелодыя, здольная выклікаць у слухача шчырыя слёзы: гэта маладзіца аплаквае сваю горкую долю. Але калі жнеі вяртаюцца дахаты, асабліва пасля дажынак, то з іх грудзей выліваецца вясёлая бадзёрая песня, у якой чуецца здаволенасць пасля несупыннай дзённай працы. Матывы песень, прымеркаваных да другіх часоў года, адрозніваюцца тужлівым настроем, які цалкам гарманіруе са словамі.

...Народная творчасць беларусаў складае наша вялікае багацце, якім беларусы могуць ганарыцца. Яго павінны падтрымліваць і захоўваць.

ЯНКА КУПАЛА

<...> Кнігі абудзілі маю фантазію... Але больш за ўсё, я думаю, зрабілі на мяне ўплыў беларускія народныя казкі, якія я чуў у маленстве. Калі мы жылі ў Прудзішчы (тады я быў яшчэ хлапчуком), у нас служыў рабочы... нехта Песляк... І вось ён быў, як мне тады здавалася, надзвычайны майстра расказваць казкі, ды яно так і было. Памятаю, што я не даваў яму праходу. Ці пойдзе ён у поле араць, ці паедзе на начлег, я заўсёды з ім і заўсёды выпрошваю ў яго казкі. Расказваў ён захапляюча... Можаце сабе ўявіць: чалавек ходзіць за сахой, а следам за ім, як варона, хаджу я і слухаю. Другі такі апавядальнік... быў ужо ў Селішчы. Таксама я яму не даваў спакою ні днём, ні ўначы. Дык вось хто, бадай, быў маім першым настаўнікам, хутчэй натхніцелем у адносінах да маёй... паэтычнай творчасці.

Не толькі блізкасць да народа, з якім я падзяляў і гора і радасць, але і народная творчасць, з якой я знаёміўся, слухаючы ад блізкіх мне людзей казкі і інш., безумоўна, рабілі на мяне свой уплыў у сэнсе развіцця фантазіі... Якія былі паэтычныя штуршкі? Усё навакольнае. І сацыяльная і нацыянальная крыўда, і беларуская прырода, і песні, пачутыя на полі, на вяселлі, на вечарынцы і г. д.

ЯКУБ КОЛАС

<...> І другое, што ўражала больш за ўсё: матчын голас. Нават калі яна сварылася на нас і пачынала ўшчуваць, голас не траціў мяккасці і дабраты. Я вельмі любіў, як яна спявала. Спявалі ў нас рэдка: прыедуць госці, падгуляюць і тады заводзяць песні: і жанкі і мужчыны. Тут ішлі ў ход найболей жартоўныя мелодыі, скочныя. Галасы, у тым ліку і матчын, рабіліся прарэзлівымі, як бы штучнымі. А мне падабалася іншае. Управіўшыся з чарнейшаю работаю па хаце і па гаспадарцы, маці садзілася, як на адпачынак, за верацяно або за шытво. Яна спачатку абзывалася ледзь чутна, тонка-тонка, як шчыгол, прабуючы голас, ці не ахрып часам за ноч. Потым матчына песня бралася ў сілу і запаўняла хату.

Спявала маці, калі дома не было мужчын, бацькі і дзядзькі. Ці то саромелася яна, ці можа лягчэй было ёй думаць, успамінаць дзявочыя гады пад той просценькі напеў. А ўлюбёная матчына песня расказвала пра нешчаслівае каханне, і галоўнаю асобаю, разлучнікам, выступаў Нёман. Ні матыву, ні слоў успамянуць не магу, але яна недзе жыве ва мне, і калі пачынаю ўяўляць нашу хату, маці пры рабоце,— здаецца, чую і песню. <...>

<...> Я многа запісваў такога (этнаграфічнага і фальклорнага) матэрыялу і ведаў многа апавяданняў і анекдотаў з сялянскага жыцця. Гэтымі апавяданнямі я на працягу чатырох год забаўляў сваіх таварышоў у часы адпачынку.

МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

Прыпеўка — гэта менавіта тая песня, якую спявае ў цяперашні час ледзь не ўся вясковая Расія. Здавалася б, аднаго гэтага зусім дастаткова, каб даць прыпеўцы права на самую пільную і сур'ёзную ўвагу. А між тым колькасць прац, прысвечаных ёй, вельмі невялікая, прычым працы гэтыя прайшлі міма шырокай публікі і фактычна не ўнеслі прыкметнай папраўкі ў агульнаадмоўныя адносіны да прыпеўкі — гэтага цікавага роду песеннай творчасці... Менавіта лічыцца, што

прыпеўка ёсць хваравіты прадукт фабрычнай гарадской культуры, якая разбурае моцны ўклад вясковага жыцця... Прыпеўка ў многіх адносінах з'яўляецца прамым працягам старадаўняй песні. Так, напрыклад, і там і тут незвычайна развіты паралелізм (параўнанне), і там і тут ён з'яўляецца арганізуючым пачаткам, паэтычным сродкам. Апрача таго, шэраг прыпевак уяўляе сабой не што іншае, як асколкі «старадаўніх» песень...

Гэта тым больш цікава, што такім чынам часткова падрываецца думка пра фабрычнае паходжанне прыпеўкі. Канчаткова ж высветлілі памылковасць такога погляду этнаграфічныя звесткі: песні, якія складаюцца з кароценькіх радкоў, вядомыя здавён... Існуюць яны... у многіх славянскіх народаў: палякаў («кракавякі»), украінцаў («каламыйкі»), беларусаў («прыпеўкі») і г. д. Ва ўсіх іх прыпеўка развілася і зарадзілася раней, чым з'явілася якая-небудзь капіталістычная культура (у Беларусі ж, прынамсі, развіццё і зараз невялікае, а між тым прыпеўка тут здавён шырока распаўсюджана і з'яўляецца ледзь не самай лепшай выразніцай беларускай народнай песні). Такім чынам, ужо з гэтых нешматлікіх слоў зусім ясна відаць памылковасць пашыраных поглядаў на прыпеўку...

ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ

Дакуль у народзе жыве песня яго, датуль народ мае душу сваю, мае сваю паэзію. Замрэ песня, і душа ў народзе замрэ, астанецца ён бяздушнай істотай, пазбаўленай сваёй адметнай псіхікі.

Песня народная — гэта бяздонны скарб паэзіі, неацэнная ўласнасць, якую народ павінен шанаваць і перадаваць з пакалення ў пакаленне. Яна апавядае нам далёкую мінуўшчыну і атварае цяпершчыну, тлумачыць нам звычаі і абычаі, апавядае перажытыя народам мукі і радасці. Апавядае няраз у такіх пекных словах і формах, што дарэмна бы кусілася мастацтва патураці ім: не патрапіць мастацтва даць тэй свежай красы слова, як малярства не патрапіць аддаць свежасці барвы і багацтва форм простай палявой краскі, узросшай між дзікай травы.

Калі паўстала народная песня? Дарэмна шукаць гэтага часу. Навуковыя доследы не могуць азначыць час паўстання народнай песні. Радзілася яна на свет разам з першымі людзьмі. Нечыя перапоўненыя пачуццём грудзі яе выспевалі, нечае некалісь квола-чулае сэрца яе выпесціла — і гэтак пайшла яна ў свет, між людзей далей і далей, з вусн у вусны, з пака-

лення ў пакаленне і будзе жыць датуль, пакуль жыве душа ў народзе.

Багат беларускі народ песнямі, хоць доля гэтага народу і перажытая ім гісторыя неспрыяльны былі. Да нас аднак наша песня не дайшла ў сваёй першабытнай чыстаце, ды да таго многа нашых песень замерла і загінула нет ведама калі і як. Гэтак не дайшоў да нас наш былінны эпас, у каторым народы апавядаюць сваю гісторыю і легенды аб сваіх героях. Не дайшлі да нас у цэлку і песні княжага часу. З княжых часоў маем толькі абломкі, руіны песень. Там сям блісне багатазалочаны гзымс, разбітыя часткі рэзных стаўбоў калісь стройнай будоўлі, залепленыя прыбудоўкамі і надбудоўкамі, ды пераробкамі пазнейшых часоў. І судзячы з гэтых абломкаў адно толькі цяпер можна сказаць, што калісь песні гэтыя распяваліся не толькі ў курных хатках сярмяжным народам, але пяяліся яны і за «цісовымі сталамі», пры «залатых кубках», поўных «салодкага віна», людзьмі адзетымі ў «тонкія кітайкі», дарагія «саеты» і г. д. Калі ж чужая песня выцяснiла нашу родную песню з багатых харомаў, яе прытуліў сярмяжны народ і, нягледзячы на трудныя варункі нацыянальнага жыцця, перахаваў яе і перадаў нам, хоць і перайначаную і агрубеўшую, але маючую яшчэ гэтулькі красы, што смела можа яна раўняцца з любымі творамі мастацтва. І хоць часта-густа народная песня не падходзіць пад меру і форму, вымаганую правіламі вершавага мастацтва, аднак гэта не робіць ёй уймы, наадварот: характэрны лад народных песень становіць іх воблік, у каторым адбілася і далёкая мінуўшчына і цяпершчына, яе род-племя і яе доля.

Найбагацейшы аддзел народнай беларускай славеснасці твораць песні.

ЦЁТКА

Наша народная песня вылілася з сэрца, вуснаў і фантазіі ўсяго народу беларускага і дзеля таго называецца народнай. Гэту песню наш народ складаў вякамі ў розныя хвіліны свайго жыцця: ён як бы выкаваў шчырымі словамі ў вузкія рамкі песні ўсе свае радасці, свой смех, сваё гора, долю і нядолю, слёзы жыццёвыя. Песня народная шчырымі словамі, не раўнуючы, як працавітымі пчолкамі, сабрала ўсё багацце красы і праўды для сваіх узораў. З пакалення ў пакаленне народ ад дзеда — унуку, а ўнук — праўнуку перадаваў у песні глыбокую і праўдзівую навуку тым, перад каторымі яшчэ слаўся няпройдзены цяжкі жыцця шлях.

Толькі кожнае новае пакаленне да дзедавай навукі-песні

дадавала яшчэ ўласнымі губамі свой уласны погляд на жыццё, свой боль, свой жаль, свой смутак і сваю радасць. Таму то для нас народная песня так зразумела, так родна, так блізка сэрцу, бо ў ёй мы чуем і слёзы памершай маткі і радасць брата, надзеі сястры і залатыя свае ўласныя сны. Затым то наша песня народная так гудзе ўлетку пры кожнай працы — ці то на полі, ці то на лузе, ці ў лесе, ці ў садочку. А прыдзе зіма,— заштурмуюць сіверы — народная песня разам з намі туліцца пад страху — у цесную нашу хатку, жыве ў ёй разам з намі, з нашымі думкамі, жаданнямі. Сэрцу нашаму песня дае пацеху, а дзеткам, слухаючым яе,— жывую навуку.

ЗМІТРОК БЯДУЛЯ

<...> Беларуская народная творчасць — гэта заварожанае люстра сялянскага жыцця, якое адбівае жывы малюнак не толькі за пэўны перыяд, за маленькі час, але цэніруе быт ад самога пачатку гістарычнага існавання народа да апошніх дзён. Калі возьмем любую песню, любую казку, дык адразу пабачым вобраз, пачуем непадроблены голас народа, які падсвядома, інстынктыўна рваўся да вольнага жыцця доўгімі вякамі. Наша народная творчасць — гэта рухлівы калектыўны вусны летапіс, пісаны не ў манастырскіх мурах... але апяваная ў песнях на сотні ладоў гора-нядоля мужыка-селяніна. На прасторах палёў і лугоў араты бачыў вакол сябе волю, а на сваім карку адчуў бізун панскага прыганятага, які не адыходзіў ад нявольніка ні на крок.

<...> Песня гэта кіравалася тахтам грабель і цапоў; дзынканне касы і шастанне сярпоў на спелых каласах тварылі яе рытмы; зычная крынічка, пералівы рэчкі на лузе даравалі ёй час ад часу просценькія вянкі рытмаў; чырвоная калінка, шэрая зязюленька і зялёны яварок шчыра вартавалі беларускую песню з абодвух канцоў: служылі ёй загартаванымі прыпевамі-замовамі.

<...> Водгалас пушчы падхопліваў яе, песню, прапускаў праз сіта галін-пляцёнак, рассяваў яе ветрам віхурным па ўсіх абшарах беларускага краю. Па разлогах-далінах, па вёсках-сялібах яе сустракалі, як шчыра пажаданую госцейку-сваццю, жалейка, дуда, цымбалы і ліра.

— Хадзі, песня родная, к нам у нашы святліцы! — на лад салаўіны прасіла жалейка; кволым голасам кленчыла дуда; дробным макам рассыпаючыся, шапталі цымбалы; залацістабасавым голасам малілася ліра,— пагасціш у нас і пойдзеш далей у вандроўку. Ніякія перуны цябе не заб'юць, ніякія

астрогі цябе не зняволяць, ніякія мячы і стрэльбы ў цябе жыцця не забяруць.

Ты, песня, будзеш жыць вечна, з пакалення ў пакаленне, пакуль прыдуць пісьменныя людзі і пералью́ць цябе на белы пергамент для ўнукаў і праўнукаў.

Нібы слуцкія паясы, нібы зычна барвяныя дываны беларускіх гарапашных сялянак, будзеш выражаць сэрцы родных песняроў і вучоных і пакажаш свету ўсяму, як жыў калісьці беларускі ратай — твой глебны творца. <...>

МАКСІМ ГАРЭЦКІ

<...> Мастацкасць вусных народных твораў з'яўляецца прадуктам безупыннай творчасці на працягу многіх вякоў, прычым усё горшае з мастацкага быту забывалася ці адкідалася, а ўсё лепшае жыло. Паміма таго, што першымі аўтарамі вусных твораў былі выдатныя паэты-мастакі, іхнія творы шліфаваліся потым масамі, праходзячы праз многія-многія вусны, і з'яўляліся школаю для далейшага развіцця мастацкасці.

* * *

Вусная народная творчасць гэтак жа старая, як і само чалавецтва. Нарадзіўшыся адначасна са з'яўленнем чалавека, як мыслячай істоты, вусная народная творчасць расце, развіваецца, ускладняецца адначасна з узростам, развіццём і ўскладненнем чалавечага духа. Народная творчасць жыве датуль, пакуль жыве народ.

<...> Народная вусная творчасць дае багаты матэрыял і для лінгвіста-мовазнаўца, і для гісторыка культуры, і для юрыста (народнае звычаёвае права), і для гісторыка літаратуры, і для паэта, і для артыста-мастака, і для разьбяра і г. д. Народная творчасць наогул, а беларуская народная творчасць увасобку — гэта мора, якое хавае ў сабе незлічоныя скарбы. Толькі трэба ўмець гэтыя скарбы дастаць.

* * *

Браты-пісьменнікі! Гадуйцеся на чытанні класікаў і ўдыхайце свежае паветра народнай паэзіі, пазнавайце прыгажосць гэтай паэзіі, тчыце праўдзіва-мастацкія ўзоры беларускага жыцця. Працуйце пяром так, каб творы вашы красаваліся на пачэсным месцы ў кватэры інтэлігента-беларуса і знаходзілі б шчырае спатканне пад самай беднаю стрэшкаю маламожнага селяніна.

КАНДРАТ КРАПІВА

<...> Мастацкі бок прыказак гаворыць нам аб вялікай жывасці ваабражэння стваральнікаў прыказак, аб чым сведчаць тыя надзвычайныя супастаўленні, якія мы бачым у метафарах і параўнаннях. Мастацкі густ народа выявіўся як у справе маляўнічасці, так і ў сугучнасці прыказак, якая часамі дасягае ўзроўню лепшых узораў сучаснай паэзіі. Вобразнасць скрозь вызначаецца канкрэтнасцю і пластычнасцю. Нават адцягненыя паняцці, як голад, бяда, няволя, уяўляюцца рэальнымі істотамі.

Спецыфічнымі рысамі светапогляду і характару беларускага селяніна мінулага часу, якія адбіліся ў прыказках, на мой погляд, з'яўляюцца адсутнасць рэлігійнага фанатызму, скромнасць і некаторы скептыцызм у адносінах да рэчаў і людзей, а адгэтуль іронія, якой прасякнута такая значная колькасць беларускіх прыказак. <...>

А. А. АФАНАСЬЕЎ

Чароўная беларуская народная казка па праву можа лічыцца непараўнальнай па сваёй паэтычнасці ў свеце казак славянскіх народаў.

С. В. САЎЧАНКА

<...> Багацце казак пра жывёл у Беларусі — даволі знамянальная з'ява. Да таго ж, беларускія казкі пра жывёл і расказваюцца на дзіва захапляюча. Нам здаецца, што гэтыя казкі — сапраўдныя ўзоры беларускага народнага эпасу... У беларускіх зборніках багата таксама «лірычных» казак, старых, традыцыйных, пра Кацігарошка, Сучанка, пра пачварных змеяў і інш. І расказваюцца яны надзвычай жыва і маляўніча; адчуваецца, што апавядальнік вельмі блізка зжыўся са сваімі героямі, цудоўна разумее ўсе матывы іх учынкаў і ўмее надзвычай вобразна перадаць.

Перачытаўшы ўсе рускія казкі, мы можам смела сцвярджаць, што па жывасці і прыгажосці апавядання беларускія казкі не маюць сабе роўных. Нават лепшыя казкі Анчукова і Сакаловых уступаюць ім у гэтых адносінах, хаця пераўзыходзяць у строгасці эпічнай канструкцыі.

Е. Р. РАМАНАЎ

...Беларускія песні... рашуча абвяргаюць думку аб беднасці беларускіх мелодый. Праўда, большая частка іх тужлівая

і выклікае слёзы ў слухачоў, якія хоць крыху знаёмы з трагічнай гісторыяй гэтага народа-пакутніка, але затое яны ж сведчаць аб глыбокай старажытнасці беларускай народнай паэзіі і служаць доказам жывучасці і сілы беларуса, які не згубіў, нягледзячы на ўсе гістарычныя перавароты і цяжкія ганенні, свайго этнаграфічнага аблічча.

МІХАЛ ФЕДАРОЎСКІ

Багацце беларускай народнай песні — нязмернае: вяселле ці пахаванне, хрэсьбіны ці заручыны, кожны занятак, кожная пара года мае свае арыгінальныя спевы. Пачуцці, страсці выражаюцца ў спеве. У песні гучыць прызнанне ў каханні, часам скарга або нават, хоць вельмі рэдка, праклянне. Мелодыі іх, за выключэннем вясельных, якія грашаць манатоннасцю, тужлівыя, паважныя, у вольным тэмпе, нібы шум сосен у беларускіх барах.

АНТОН ГРЫНЕВІЧ

Песня людская адбівае ў сабе душу чалавека, яго боль і гора, яго патрэбы, жаданні і само жыццё. Як па абліччу пазнаюць чалавека, так па песні, асабліва народнай, пазнаецца цэлая нацыя, яе характар і душа. Разам з гэтым песня многа прыносіла і прыносіць карысці для народу: яна быццам зменшвае людскія няшчасці, пацяшае ў нядолі, а калі трэба, дык і весяліць. Усім вядома, што песня — гэта быццам нейкая вялікая таемная сіла: яна памагала будзіць народ, узахвочваць яго да працы, падымаць з цемнаты, клікаць да святла — навукі, да абароны свайго краю, на добрыя важныя справы. Для таго ў народаў з шырокай асветай песня даўным-даўно заваявала сабе пачэснае месца, яе справядліва шануюць, як вялікі ўсенародны скарб...

М. М. ПЯТУХОВІЧ

Беларускі мастацкі фальклор вызначаецца вялікім багаццем і своеасаблівай разнастайнасцю. На тэрыторыі Беларусі да гэтай пары сабрана манументальная скарбніца фальклорных матэрыялаў. Але гэта скарбніца мала выкарыстана навуковымі даследчыкамі. Багацце беларускага фальклору ў навукова-даследчым ужытку да нашай пары застаецца амаль мёртвым капіталам, які яшчэ чакае свайго абароту ў галіне навуковай думкі.

...Беларуская абрадавая паэзія грунтуецца на шырокай аг-

рарнай аснове. Гэта аснова ва ўсіх нашых абрадах і звязаных з імі песнях выступае вельмі яскрава; можна сказаць, што ў нашай абрадавай паэзіі «ўлада зямлі» выдаецца на першы план.

УЛАДЗІМІР ТЭРАЎСКІ

Хоць народныя спевы па складзе сваім і бываюць цяжкія, але, услухаўшыся ў іх, шмат хто ўбачыць харaство родных мелодый, унясе іх з сабой у жыццё і, можа быць, не раз дзякуючы ім знойдзе духоўны спакой.

АЛЯКСАНДР ГРАЧАНІНАЎ

(з пісьмаў да Р. Р. Шырмы)

Беларуская народная творчасць мяне заўсёды захапляла і захапляе. Многія песні Вашага запісу мне вельмі падабаюцца, і я з задавальненнем буду працаваць...

Я быў шчаслівы атрымаць свае любімыя беларускія песні. Чакаю, каб і «Пчолка» прыляцела: памятаецца, яна была цудоўная песенька...

У мяне здавён засела ў галаве думка напісаць беларускую оперу, калі б знайшоўся добры сюжэт (вядома, народны), добры лібрэтыст, упэўненасць, што опера будзе пастаўлена (дзе?), я б з руплівасцю прыняўся б і за работу і можа зрабіў бы што-небудзь нядрэннае...

Я ўсё яшчэ не трачу надзеі трапіць у Ваш край і пазнаёміцца з Вамі асабіста.

СЯРГЕЙ ГАРАДЗЕЦКІ

У неўміручай скарбніцы паэтычных твораў, складзеных славянскімі народамі, беларуская народная паэзія ззяе, як адна з самых старажытных і самых цудоўных каштоўнасцей.

М. В. АНЦАЎ

Сярод некаторай часткі грамадства, спешчанай сучаснымі гукавымі дасягненнямі, здаралася няраз чуць, што нашы беларускія песні пазбаўлены тых паэтычных элементаў, якія могуць зачароўваць і захапляць слухача. Тэхнічны бліск інструментальна-вакальнага музыказнаўства, відавочна, мае ўплыў на гэтых людзей ашаламляючы, так засляпляе іх, што прастата і натуральнасць родных беларускіх напеваў здаюцца

ім нязначнымі і пазбаўленымі цікавасці. Наша родная абяздоленая песня, якая радзілася сярод палёў і лугоў Беларусі, была амаль заўсёды прыгнечанай. Калі ж яна выпадкова з'яўлялася на свет, дык не інакш, як у нямецкім убранні. Вось адна з галоўных прычын, чаму беларускія песні да гэтага часу не былі вядомы шырокім колам грамадзянства, вось чаму і да гэтага часу многія глядзяць на гэту сапраўдную з'яву народнага жыцця недаверліва, баючыся, без разумення.

...Недалёкі той час, калі зусім незаслужана абяздоленая беларуская песня ўзмужнее, прыбярэцца і выйдзе на людзі паказаць сябе, а не будзе хавацца на пазадворку, як гэта было да рэвалюцыі; недалёка той час, калі гукі роднай песні будуць чутны не толькі ва ўсіх кутках Беларусі, але і далёка за межамі яе. Вольна, радасна, смела будзе гучаць наша родная беларуская песня, тая песня, якую наш селянін прыгрэў і прытуліў пад сваёй саламянай страхой, хаваў і песціў яе, перадаючы з пакалення ў пакаленне.

<...> У музычных адносінах беларускія песні адрозніваюцца шчырасцю, цеплынёй, мяккасцю. Песень, западаючых у душу і пакідаючых уражанне суму, у нас значна больш, чым песень бадзёрых, жыццярадасных. Матывы суму пераважаюць, але мастацкая каштоўнасць такіх песень зусім не памяншаецца. Сумная мелодыя, як дагараючы вечар, як ранняя зорка, прымушае хвалявацца чалавечае сэрца мацней, чым бойкая, шумлівая, поўная бляску, як яскравы, радасны дзень, вясёлая песня. У заміраючых гуках беларускай элегіі значна больш прыгажосці і паэзіі, клічучай да жыцця заўзятай мазуркі. Уражанне суму застаецца доўга, прападае не хутка, а ўражанне радасці мімалётнае, хуткаплыннае. Пачуцці, песцячыя сэрцы пачуцці, грэючыя душу, найбольш уласцівыя нашым беларускім мелодыям. Шырокі размах, пустое вяселле, несустрымная дзікая гульня ў беларускіх песнях адсутнічае. Бадзёрасць і стрыманасць вяселля адчуваецца толькі ў песнях жартаўлівага характару, іншы раз у вясельных і калядных.

...Адносьцеся да роднай беларускай песні ўважліва, з павагай. Не забывайце, што сярод гэтай народнай спадчыны пападаюцца перлы, якія ад няўмелага і грубага абыходжання трацяць сваю прывабнасць. Не забывайце, што гэта скарбніца народнага розуму, народнага гумару з'яўляецца таксама выявіцельніцай яго глыбокага суму; гэты скарб — наш нацыянальны гонар, наша слава. Не забывайце, што родная песня — гэта далікатная пахучая кветка, што расла на працягу доўгага часу — дзесяткаў, а можа быць і цэлага стагоддзя на ніве

чалавечага гора, на ніве, палітай нярэдка горкімі слязьмі. Не забывайце, што гэта сціплая палявая кветка, якая выросла на дзікіх прасторах, а не ў багатых цяпліцах, лёгка завяне, калі да яе падысці без ласкі, без любові <...>

А. К. СЕРЖПУТОЎСКІ

<...> Хаця добрыя апавядальнікі трапляюцца даволі рэдка, затое яны заўсёды прыцягваюць многа слухачоў. Бо тут вусныя апавяданні замяняюць усю літаратуру, якою карыстаюцца пісьменныя людзі, і таму маюць велізарнае значэнне ў жыцці непісьменнага простага люду. Пад уплывам апавяданняў, казак, прыказак і іншых твораў вуснай народнай творчасці вырабляецца часткова ўвесь светапогляд, уся жыццёвая мудрасць і ўсе этычныя ўяўленні цёмнага вясковага люду.

<...> Сапраўдныя падзеі змешваюцца ў апавяданнях беларуса з дзівоснай выдумкай. Нярэдка сам апавядальнік не ўсведамляе, дзе канчаецца рэчаіснасць і дзе пачынаецца выдумка. Такія, напрыклад, апавяданні пра страхі, пра хаджэнні мерцвякоў, пра штукарствы чараўнікоў і г. д.

Народ глядзіць на казачныя эпізоды як на падзеі, якія сапраўды адбываліся ў жыцці. Нездарма пры размовах спасылаюцца на тыя альбо іншыя сказанні з вядомых казак, апавяданняў і г. д.

Апавядальнікамі з'яўляюцца, вядома, больш здольныя і развітыя людзі. Гэта, так сказаць,— інтэлігенцыя. Адны з апавядальнікаў валодаюць найвыдатным красамоўствам, другія адрозніваюцца дарам мастацкага чуцця і творчасці, і амаль усе яны маюць схільнасць да філасофіі.

<...> Хаця кожны беларус ведае дзесяткі два бытавых апавяданняў і некалькі казак, не кожны любіць і ўмее расказваць. Добрыя апавядальнікі сустракаюцца даволі рэдка. Усё іх мастацтва заключаецца ў тым, што яны ў свае апавяданні ўносяць асабістыя рысы,— перадаюць апавяданне пад вуглом гледжання свайго светапогляду... Добры апавядальнік... не звяртае ўвагі на дасканаласць зместу і падрабязнасці якой-небудзь падзеі. Ён бярэ ў апавяданні галоўную думку, якая выражаецца прыказкай ці адной характэрнай фразай, развівае гэту думку і вобразнымі зваротамі мовы тут жа складае цэльнае, закончанае, апавяданне. Добры апавядальнік — гэта свайго роду мастак-раманіст плюс актор-апавядальнік.

Вось такія таленавітыя людзі, нікім не заўважаныя, усё

сваё жыццё праводзяць у глухіх кутках. Пры іншых умовах, мусіць, яны сталі б нацыянальным гонарам. <...>

МАКСІМ ТАНК

Мне хацелася б адзначыць тую вялікую ролю, якую адыгралі ў маім жыцці творы нашых беларускіх класікаў Я. Купалы і Я. Коласа. Толькі дзякуючы ім і народным казкам і песням, якія я чуў ад сваёй маці, ад народа, я пачаў пісаць на сваёй роднай мове.

Я ўжо збіраўся пакінуць кірмаш, калі пачуў песню. Яе спявала нейкая ў чырвонай хустцы маладзіца, седзячы на возе, засланым даматканай зялёнай посцілкай, на якой ляжалі закуска, казюковыя пернікі і вянок смаргонскіх абаранкаў.

Запала сонейка за лес калінавы.
Ападае раса на ліст малінавы.
Не ападай, раса, раса сцюдзёная.
Як босы я пайду сцежкай знаёмаю?
Падзёр я боцікі, з любай ходзячы.
Праз лес калінавы яе праводзячы.

<...> Заўсёды народная песня пакідае глыбокае ўражанне. Яшчэ будучы малым, я не раз прыслухоўваўся, як пяялі жнеі: доўга, працяжна, быццам нашы нізінныя рэкі, звонючы нізка звісаючай лазой, алешнікам, чаротам, калышучы срабрыстыя россыпы сонца, пераліваючыся цёплымі перламі летніх зораў, плылі, шырока разліваючыся вясеннім разлівам, парываючы сваёй бязмернай глыбінёй пачуцця. І не ведаю, чаму, пачуўшы народную песню, не толькі заслухоўваюся, але мне хочацца глянуць вачыма ў яе.

Шмат я чуў, як пяялі народныя песні.

Ледзь не заўсёды яны неяк іначай гучэлі, як там, каля сваіх вытокаў.

У выкананні адных яны гублялі сваю прастату, другія — пелі іх чужымі вуснамі, і здавалася, што за голасам недзе яшчэ б'ецца незразумелае, дзіўнае сэрца гэтых песняў, якое ці і патрапіць хто адчуць.

Забег у бібліятэку Беларускага музея, дзе пазычыў некалькі фальклорных зборнікаў. М. паказала мне цікавы сшытак Дубяйкоўскага: «Пагаворкі». Я, захапіўшыся, так і не змог адарвацца ад гэтага рукапісу, пакуль не прачытаў і не перапісаў у свой блакнот з паўсотні яго пагаворак. Шкада, што ў нас няма ніякіх сродкаў, ніякіх магчымасцей выдаваць такія рэчы.

<...> Сяджу над галошаннямі Шэйна. Столькі ў іх цяжко-

га і жудаснага, што аж страх чытаць. Прыпомнілася наша пількаўская плакальшчыца Тэкля Калбун, якая не толькі ў сваёй вёсцы, але і ў суседніх аплаквала нябожчыкаў. Колькі ад яе можна было запісаць галошанняў і па старых і па малых, па дзяўчатах і хлопцах! Колькі ў яе імправізацыях было паэзіі і трагізму, навеянага жыццём нябожчыка, падказанага абставінамі яго асірацелай сям'і! Усё яна ўмела ўлічыць, нічога не забыць, пра ўсё ўспомніць. На пахаванні пастыра Данілкі, пералічваючы яго заслугі, успомніла, як ён прыгожа іграў на трубе, якія цудоўныя плёў лапці, вязаў венікі, майстраваў кошыкі і спускаў жалейкі, не забылася ўспомніць, што ён пакінуў неагледжаную на зіму сваю хату і батрачую спадчыну, якую будуць дзяліць яго дзеці:

...А хто ж, мой Данілачка,
Нацягае кастры на шаламя,
Ацепліць у хаце прызбачку,
Пазатыкае ўсе дзірачкі
Каля шулы і на покуці?
А хто ж памірыць дзетачак,
Як паспрачаюцца, дзелячы
Тваю торбу пастырскую,
Пужку-дратаваначку,
Дзесяць пар лапцей пакінутых,
Песню трубы-берасцяначкі,
Скарынку хлеба чэрствага,
Долечку незайздросную...

Шкада, што, як быў там, я не змог запісаць яе галошання па нашым суседзе — Езупавым Мацеі, галошанне, якое цягнулася ўсю ноч; або яе галошанне па майму дзядзьку Ціхану, пра якое і сёння ўспамінаюць пількаўшчане.

Ізноў узяўся за фальклор. Я часта вяртаюся да яго, як крыніцы, каб асвяжыць свае вусны, змыць з твару дарожны пыл. Але доўга каля гэтай крыніцы стараюся не затрымлівацца. Паэзія павінна адкрываць новае. Інакш яна перастане быць паэзіяй. А новае трэба шукаць на жыццёвых шляхах не толькі свайго, але і іншых народаў.

ЯНКА БРЫЛЬ

<...> Звычайны дзядзька ў Пасынках — Барыс Харута. От сабе, не так жыве чалавек, як з клопату не вылазіць. А голас — божа мой, што за голас! Яго б для цэлага свету, па радыё перадаваць, ды салавей гэты навек ублытаўся ў сіло вераўчаных лапцюжных абораў. Усяго і свету пабачыў за век, што ў царскіх салдатах ды на вайне (прападзі ён, той акопны свет!),

адкуль прынёс дахаты для сябе аднаго — пакалечаную руку, а для сябе і для другіх — многа цудоўных песень.

З волжскім, з раўнінным, з таёжным раздоллем Расіі, з сардэчным сумам ямшчыцкіх званочкаў, з бурлацкім стогнам ды з грознаю, гордаю сілай усенароднага «Барадзіна» ці «Ермака»... З хмельнаю, буйнаю, ціхім і шчодрым сонцам залітай украінскай радасцю, пышнагрудай і каравокай, з дасціпным, смачным смехам: з размахам і адчаем запарожскай славы, страчанай, ох як даўно, на бязмежжы крывавага Прыдняпроўя...

У гэты навальнічна-магутны рокат дзвюх музычных стыхій задушэўна ўпляталіся песні пра слуцкіх прыгонных ткачых, пра Нёман, быстры і чысты, як быццам з расы, пра юнака, што памірае ў турме, пакідаючы любы свой край у пакуце, пра ясную крынічную ваду, што плешчацца ў залаціста-сасновых вёдрах прысухі-суседачкі...

Вясной, толькі вясной — ніколі так не спяваецца! І колькі б іх, мужчын ды хлопцаў, ні было, якімі б шырокімі ні былі іх маладыя грудзі, як ні грымела б іх песня пад самыя зоры,— усіх перамагаў Барыс Харута. Нават свайго любімага памочніка, Алеся. Не крыкам, а нейкай дзіўнай ціхай сілай голасу, які з пашанай называлі хто проста тэнарам, а хто яшчэ і «дражашчым».

Спяваючы, дзядзька Барыс — і высокі, і стройны, і нават прыгожы, якім ён без песні ніколі не быў,— пагойдваўся, як тая гонкая сасна, разгайданая радасным, сонечным шумам. І, пераймаючы запявалу, у такт песні пагойдваліся мужчыны, дзяцюкі, падлеткі, што шумелі вакол яго лесам, ноччу нікому не бачным, але затое ж патрэбным і проста наўздзіў, як здаецца, прыгожым — за шум свой, вядома, за песню, што красіць любое жыццё!..

РЫГОР ШЫРМА

Я памятаю 1915 год. На карысць дзяцей — ахвяр вайны — трэба было зрабіць этнаграфічны канцэрт, выканаць народныя песні ў кампазітарскай апрацоўцы. Павінны былі выконвацца песні рускія, украінскія і беларускія. Цудоўны хор у 80 асоб з прыгожымі галасамі вывучыў песні рускія і ўкраінскія, а як дайшло да беларускіх, то аказалася, што не было ніводнай апрацаванай беларускай песні.

У другі раз з такім з'явішчам я сутыкнуўся ў Віленскай гімназіі. Стварылі мы там з энтузіястаў надзвычай добры хор, а апрацаваных беларускіх песень не было. Па-руску спяваць забаронена было (тое, што было ў харавой літаратуры,

прыходзілася перакладаць). Вось і прышлося збіраць беларускія песні і шукаць кампазітараў, якія б зацікавіліся гэтымі песнямі, апрацавалі іх. Інакш кажучы, гэту простую беларускую сяляначку трэба было вывесці на канцэртную эстраду дамай высокага культурнага свету. Такія кампазітары знайшліся: прафесар Галкоўскі, украінскі кампазітар Кошыц, рускі кампазітар Грачанінаў. Такім чынам, мы атрымалі матэрыял для паказу народу, пакуль не дасталі праз зялёную граніцу апрацовак беларускіх песень з Савецкага Саюза.

Запіс мелодыі — вельмі складаная справа. Той, хто запісвае народную мелодыю, павінен добра яе адчуваць. Кожная сапраўды народная песня па сваёй структуры вельмі ясная, вельмі пластычная і даходзіць да сэрца. Але не заўсёды фальклярысты правільна разумеюць яе. Некаторыя фальклорныя зборнікі, выданыя да рэвалюцыі, даюць мелодыі народных песень, якія ў кампазітарскай практыцы не знайшлі свайго месца. Зборнік З. Радчанкі музыказнаўцы і фальклярысты ўпамінаюць, але мелодыі з гэтых зборнікаў у жыцці, у практычнай дзейнасці кампазітараў свайго праламлення не знаходзяць, бо З. Радчанка не праніклася духам народнай песні.

Мне прыходзілася многа жыць у народзе і з народам хадзіць ад сяла да сяла. Тыя песні, якія я запісваў, я сам вывучаў на памяць. Мне не трэба было ні фанографа, ні магнітафона, мне лёгка было іх захоўваць.

Больш за трыццаць гадоў я займаюся збіраннем беларускай народнай творчасці. Вандруючы па сёлах, мястэчках і гарадах Беларусі, я знайшоў багатую крыніцу народнага меласу ў вёсцы Кацялкі Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Тут жыла сямідзесяцігадовая Захвея Хвораст — таленавітая народная песенніца, вядомая на ўсё наваколле.

Чатыры гады запар, кожнае лета, прыязджаючы ў вёску Кацялкі, я засвойваў мелодыі, перакладаў іх на ноты і запісваў народныя звычаі і абрады ад гэтай мілай старэнькай бабулі.

Захвея Хвораст — самародны талент. Яна карысталася ўсеагульнай павагай сельскай грамады і суседніх сёл і вёсак не толькі як славутая народная песенніца, але і як чалавек мудры і справядлівы.

Апрануўшыся ў чыстае ільняное адзенне і старанна вымыўшы рукі, яна хадзіла сустракаць з'яўленне на свет новага чалавека. Яна прайшла суровую цяжкую школу жыцця, дзяўчынкай працавала ў панскіх маёнтках яшчэ тады, калі крывавелі на народным целе раны ад парваных ланцугоў прыгоннай няволі. Глыбока ў сабе таіла яна багатую народ-

ную песню для таго, каб потым аддаць яе на ўцеху, радасць і адпачынак свайму працалюбіваму брату-селяніну і батраку-работніку.

Захвея Хвораст не толькі сустракала новага чалавека,— яна хадзіла закрыць вочы і таму, хто прайшоў свой жыццёвы шлях, для кожнай душэўнай раны ў яе знаходзілася цёплае слова. Затое якой вялікай любоўю і павагай адказвалі ёй! Нават малыя дзеці, сустрэўшы яе, калі яна ішла па вуліцы, цёпла віталі словамі: «Добры дзень, бабулька!»

На вяселлях Захвея Хвораст заўсёды займала самае пачэснае месца; там, дзе трэба было павесяліць чалавека, дарэчы была яе песня, прыгожае мудрае слова, з якімі, здаецца, весялей і лягчэй было маладым пачынаць жыццё.

...Акрамя Захвеі Хвораст, мне даводзілася сустракаць многа іншых таленавітых спявачак і спевакоў. Назаўсёды засталіся ў памяці Наталля Хадзінская з вёскі Новыя Зімодры Маладзечанскай вобласці, Тэран Карпюк з вёскі Страшава былога Ваўкавыскага павета, Буцэя Рэдзька з вёскі Каралевічы на Дзісеншчыне, Васіль Скурко з Навасёлак на Пастаўшчыне і цэлая плеяда маладых талентаў ва ўсіх кутках Савецкай Беларусі. Іх вуснамі народ расказваў пра сябе, аб сваім горы і радасцях, якія жылі ў яго марах.

З гэтымі талентамі я заглянуў у бяздонныя крыніцы народнай песнятворчасці, ад якой як зачараваны не ў сілах больш адарвацца. Я бязмерна шчаслівы, што яны дапамаглі мне захаваць найвялікшыя каштоўнасці музычнай культуры нашага народа.

Кожны народ мае свой асаблівы духоўны характар, які знаходзіць найбольшае адбіццё ў яго песнях.

Народ пяе,— па песні адразу можна распазнаць, з чыіх вуснаў, а галоўнае, з чыйго сэрца яна выйшла. У песнях чуваць, аб чым народ сумуе і да чаго рвецца яго душа.

Песня народа — гэта сапраўдная жывая чалавечая душа.

Беларуская народная песня, заўсёды ясная, пластычная і багатая, часцей засмучаная, чым рэзвая і гуллівая, адзначаецца асабліваю задумаю аб жыцці і долі.

З боку настрояў, мелодыі і рытму яна зусім самабытная.

Цудоўная, шчырая, як народнае сэрца, мелодыя, высокапаэтычны верш народнае паэзіі з яго наіўнымі чаруючымі вобразамі і зваротамі,— усё гэта разам узятае падымае беларускую песню на высокамастацкі п'едэстал.

АЛЯКСАНДР ФАДЗЕЕЎ

(з пісьма да Р. Шырмы)

Дарагі Рыгор Раманавіч! Пішу вам як вялікі аматар і паклоннік харавога спеву, пішу з адзінай мэтай перадаць Вам, якую асалоду я атрымаў, слухаючы па радыё некалькі дзён назад канцэрт Вашага цудоўнага хору...

Вы — вялікі і сапраўдны майстар, дарагі Рыгор Раманавіч! Праслухаўшы першыя дзве песні «Выходзіла праўда» і «Радзіма мая дарагая» (асабліва іменна гэту, другую), я ўжо страціў тыя халодныя ацэначныя адносіны, якія, на жаль, заўсёды жывуць у нас недзе побач з непасрэдным эстэтычным пачуццём, асабліва калі мы маем справу са з'явай новай, нам невядомай,— я іх зусім страціў і ўвесь аддаўся жывой, непасрэднай, так сказаць, бескарыслівай асалодзе.

Уласна — беларускія песні, як народныя ў той ці іншай апрацоўцы, так і сучасныя, створаныя на народнай аснове, вельмі краналі мяне яшчэ і неяк асабіста. Я сам рускі, з рускай сям'і, але біяграфічна так склалася, што ранняе дзяцінства маё, а пасля невялікага перапынку і ўсё астатняе дзяцінства і малалецтва былі ў значнай меры звязаны з беларускім асяроддзем (маці — фельчарка — служыла ў Мінскай губерні, у вёсцы, потым у Віленскай губерні, а затым сям'я наша жыла сярод перасяленцаў — беларусаў і ўкраінцаў — на Далёкім Усходзе). А вы самі ведаеце, як гэта дзейнічае на душу, калі ў незвычайным майстэрстве, пранікнёным выкананні раптам пачуеш тое (ці роднае), што пела табе маці ў дзяцінстве!

...Яшчэ раз хочацца сказаць, што ў Вашай асобе наша краіна можа ганарыцца адным з лепшых настаўнікаў і выхавацеляў, зберагальнікаў і прадаўжальнікаў таго самага лепшага, што можа даць нам харавое мастацтва.

А. КАНДРАТОВІЧ

(А. Т. Твардоўскі пра Беларусь і беларускі фальклор)

...Радаслоўная Твардоўскага і сапраўды далей дзеда не ідзе, ды і з дзедам не ўсё ясна. Дакладна вядома, што дзед Гардзей Васільевіч нарадзіўся ў сялянскай сям'і на Бярэзіне, пад Бабруйскам. Але што азначае дакладна, калі так ніхто і не ведае, дзе на Бярэзіне і дзе пад Бабруйскам: назвы сяла ці вёскі не захавалася ў сямейных паданнях, а пасля столькіх войнаў і разрухаў ні ў якіх цэрквах не адшукаеш цяпер запісаў аб нараджэнні простага сялянскага сына...

У Загор'і, з якім звязана дзяцінства Аляксандра Трыфанавіча, сям'я яго пасялілася на пачатку века. Там была ўпершыню куплена свая зямля. Дзед Гардзей Васільевіч быў беззямельным салдатам.

Загор'е размешчана на ўсход ад Смаленска. Гэта ўжо сапраўдная Расія. Твардоўскія рухаліся да яе з захаду, з Беларусі.

І вось гэтую акалічнасць Твардоўскі таксама падкрэсліваў.

Сваю першую аўтабіяграфію, пазначаную маем 1946 года, ён пачаў такімі словамі: «Мова, на якой я гаварыў у дзяцінстве, была блізкай да беларускай. Гэта вызначалася не толькі блізкасцю этнаграфічнай мяжы, але і тым, што продкі мае былі родам з Мінскай губерні. Пазней, пазнаёміўшыся з узорамі беларускай літаратуры і фальклору і пачуўшы жывую мову Беларусі, я адчуў іх як нешта роднае мне. Сляды гэтай моўнай стыхіі няцяжка заўважыць ва ўсім, што напісана мною ў вершах і прозе».

В полбуханки режу скибку.
Ешьте, дети, что глядеть.

Гэта з ранняга верша. Скібка (скіба) — рус. «ломоть», «краюха» — слова беларускае. Але ў рускай народнай мове яно існуе.

У Твардоўскага можна знайсці і «посул», і «кужаль» і «ляды» і іншыя словы з дзяцінства, з мовы бацькі і дзеда, а іх мова была рускай, але з моцнай прымессю беларускай. Адзін крытык, які аналізаваў паэму «За даллю — даль», з замілаваннем пісаў пра наватвор Твардоўскага «метуситься», але гэта ніякі не наватвор. *Метусіцца* — дыялектнае слова з заходніх абласцей, ёсць яно і ў беларускай — *мітусіцца*. Твардоўскі вельмі любіў гэты выразны дзеяслоў. «Не метусись, как критик вздорный, по пустякам не трать огня»,— не адзіны выпадак, калі ён яго ўжываў. Але не адны гэтыя слоўцы вылучалі мову Твардоўскага. Той, хто чуў Твардоўскага, лёгка мог заўважыць у яго вымаўленні і моцнае аканне, і мяккае «г», і многае іншае, што ніяк не паходзіла на мову масквіча. З гадамі, натуральна, і беларусізмы, і наогул немаскоўскае гучанне мовы амаль зніклі, але не зусім. Калі ён хваляваўся, то ранейшае гучанне раптоўна ўсплывала на паверхню, і тады можна было пачуць мову дзяцінства Твардоўскага — «хаканне», як ён сам казаў.

Ён ведаў многа беларускіх песень і любіў іх спяваць.

Гэтыя песні жылі ў ім ад бацькі і дзеда і былі прынесены на Смаленшчыну з Бярэзіны ці яшчэ аднекуль.

«Ах, Лявоніха!» — пісаў ён у час вайны.— Упершыню я пачуў твой слаўны, заліхвацка-гарэзлівы і разам з тым журботна-няшчасны лад даўно-даўно не толькі да вайны, яшчэ ў дзяцінстве, недзе ў родных мясцінах, куды яго выпадкам занесла, можа, з якім-небудзь кірмашовым музыкам. І, бадай, ён і тады ўжо нешта нагадваў мне, толькі ён увайшоў у маю душу невядомым шляхам яшчэ раней.

«Ах, Лявоніха, Лявоніха мая...» — за кожным матывам, пачутым калі-небудзь, як за кожным пахам кветкі, цэлае бяздонне ўспамінаў, лепшая палова жыцця, а то і цэлае жыццё».

А я прыгадваю, як ён сам спяваў яе, лёгка, прытупваючы нагой і дырыжыруючы невялікім застольным хорам,— рука яго так і лётала над сталом.

А Лявоніху Лявон палюбіў,
Лявоніце чаравічкі купіў.
Лявоніха, душа ласкавая,
Чаравічкамі паляскавала.
А чаму ж цябе пярун не пабіў,
Як ты мяне ў маладосці любіў...

І «А ў лузе касец косіць» спяваў, але ўжо задуменна, гледзечы на тых, хто падцягваў. І «Лятуць, лятуць белы лебедзі цераз сад». А аднойчы пасля такой песні ён раптам весела ўсміхнуўся і сказаў: «Хопіць піць, хопіць дурыць, ці не час нам пакаяцца, пайсці дамоў, параіцца, што заўтра прапіць».

Усе рассмяяліся ад нечаканасці. «Гэта адкуль?» — хацеў спытаць я ды тут жа ўспомніў: ён жа гэты жарт у «Краіне Муравіі» выкарыстаў, там ён сярод розных песенек і прыгаворак вельмі ўдала падышоў, перакладзены, вядома, на рускую мову.

Будет нам пить,
Будет дурить,
Пора бы нам одуматься,
Пойти домой задуматься:
Что завтра пропить?

Любоў да беларускай мовы, да беларускага фальклору і цудоўнае, не з кніг веданне іх, веданне, якое даецца, як кажуць, ад нараджэння, убіраецца, уваходзіць у свядомасць з самага ранняга дзяцінства, натуральна, пералівалася ў Твардоўскага ў такую ж моцную сталую любоў да беларускага народа, да яго паэзіі і да яго паэтаў.

ГЕНАДЗЬ ЦІТОВІЧ

Багатае і разнастайнае народнае мастацтва беларусаў!

У маляўнічай народнай вопратцы ўвасоблен вялікі вопыт пакаленняў у галіне вышыўкі, ткацтва і вязання. У ліштвах і вільчаках, у керамічных вырабах і драўлянай скульптуры здзіўляюць невычэрпная фантазія і высокае майстэрства народных умельцаў. Мудрыя і глыбоказмястоўныя беларускія казкі, прыказкі і прымаўкі, дасціпныя народныя анекдоты.

Разнастайны і ўзорысты беларускі народны танец — ад урачыста-спакойных веснавых карагодаў да імклівай «Лявоніхі».

А колькі настрояў, арыгінальных сюжэтаў у беларускай народнай песні! Пры перавазе ў ёй лірычнага пачатку мы знойдзем тут і нястрымную весялосць, і гарэзлівы жарт, і едкую сатыру, і гнеўны сацыяльны пратэст.

У гісторыі беларускага народа праз доўгі час фальклор быў адзінай формай мастацкай творчасці і дамінуючае становішча займала ў ім народная песня, якая выконвалася звычайна без суправаджэння. Яна давала тэмп, настрой, а часта і сюжэт карагодам і скокам, жывіла характэрнымі інтанацыямі інструментальныя найгрышы.

Народнае музычнае мастацтва беларусаў развівалася і развіваецца ва ўмовах гістарычна склаўшыхся руска-ўкраінска-беларускіх узаемасувязей, якія маюць многавяковыя традыцыі і адзіную крыніцу ў старажытнай агульнарускай народнай культуры. Многімі ніцямі яно звязана з фальклорам заходніх і паўднёвых славян, а таксама суседніх літоўцаў і латышоў.

Знаходзячыся ва ўмовах заняволення, беларускі народ руплівa зберагаў самабытнасць сваёй нацыянальнай культуры. Процідзеянне асіміляцыі садзейнічала захаванню ў беларусаў і перажытачных з'яў, якія мы цяпер не знойдзем у народнай творчасці рускіх і ўкраінцаў. Дзеля таго даследчыкі культуры старажытнай Русі нярэдка звяртаюцца да прыкладаў з беларускага фальклору.

ТАЦЦЯНА ЛАПАЦІНА

Уцехай і радасцю ў нашай сям'і былі толькі песні. Праўда, больш за ўсё спявалася ў іх пра гора, пра няшчасную жаночую долю. Бывала, як пачнём спяваць, як растрывожым сабе душы, то і наплачамся.

Мы чакалі, не маглі дачакацца бацьку яшчэ і таму, што

ведалі,— кожны раз прынясе з сабою новую песню. Шмат тады мы пераспявалі і ўкраінскіх песень.

Але ніколі столькі і так не спявалася, як пры Савецкай уладзе. Нібы спалі з душы ўсе аковы...

НІЛ ГІЛЕВІЧ

...«Не цурайцеся роднай песні»,— завяшчаў нам вялікі Купала. Да яго запавету можна было б далучыць не менш пранікнёныя наказы многіх іншых слаўных сыноў зямлі нашай беларускай, для якіх таксама найдаражэйшаю святыняй была ў жыцці родная матчына песня.

...Раскрытая ў яркіх паэтычных вобразах гісторыя жыцця і барацьбы працоўных здольна глыбока запасці ў душу і сэрца маладога чалавека і абудзіць, ускалыхнуць у ім пачуцці патрыятызму, любві і замілавання да роднага краю, сыноўняй гордасці за гераічнае мінулае і сучаснае свайго народа, за яго вялікасныя здзяйсненні на шляху камуністычнага будаўніцтва. Жывое паэтычнае слова, спалучанае з цудоўнай мелодыяй, здольна раскрыць для моладзі харство і багацце народнай душы, недасягальную вышыню, сілу і моц народнага духу, дапаможа акрыліць іх веру ў вялікую будучыню свайго народа, у яго шчаслівае заўтра.

Праверэная і выпрабаваная часам, адшліфаваная ў сэрцах і ў вуснах тысяч безыменных майстроў, беларуская народная песня і сёння хораша служыць і будзе служыць людзям добрай волі ў іх імкненні да міру і шчасця на зямлі. Наш клопат, наш абавязак — каб яна і надалей развівала свае крыллі шырока над светам, каб яна несла ў свет высакародныя, прыгожыя і гуманныя думы, пачуцці і мары таленавітага, працавітага, гераічнага народа.

* * *

Песні і казкі, легенды і паданні, прыказкі і загадкі роднага краю! Колькі ў іх глыбокай мудрасці і высокай паэзіі, колькі святла душы таго, хто стварыў — душы працоўнага люду! Колькі жыццёвай сілы і харства ў іх мове! І як жа важна кожнаму чалавеку з маладых гадоў далучыцца душою да паэтычных і моўных скарбаў свайго народа — так, каб праз усё жыццё адчуваць патрэбу зноў і зноў прыгубіць сэрцам з гэтай цудоўнай невычэрпнай крыніцы, а прыгубіўшы — адчуць, як ты мацнееш духам, святлееш думкай, дужэеш і акрыляешся на добрыя людскія справы!

А найлепшы прыклад такога далучэння да вусна-паэтычнай

творчасці народа, як і найлепшы ўзор авалодання яго мовай, падаюць паэты і пісьменнікі, тыя, каму наканавана самім тварыць высокую паэзію ў слове. Знаёмства з тым, як яны пранікаюць у таямніцы народнай паэзіі і жывога народнага слова, як авалодваюць сакрэтамі моўнага майстэрства народа,— карысна, на нашу думку, кожнаму, хто нераўнадушны да лёсу роднае мовы і сваёй нацыянальнай культуры, да лёсу Бацькаўшчыны.



Замовы



Замовы (у народзе іх яшчэ называюць загаворамі, нагаворамі, шэптамі) — гэта славесныя формулы, якім надавалася магічнае значэнне. Замовы — від народнай творчасці, які ў сучасны момант у жывым бытаванні амаль не сустракаецца.

У мінулым замовы былі шырока распаўсюджаны ў быце і мелі чыста утылітарнае значэнне: з дапамогай слова, магічнага дзеяння ператварыць жаданае ў рэальнасць, падобным выклікаць падобнае.

Нягледзячы на пашыранасць сярод сялянства, замовы больш за ўсё знаходзіліся на ўзбраенні вузкай групы людзей — «прафесіяналаў», так званых шаптуноў, чараўнікоў, ведзьмароў, якія з мэтай замацавання ў насельніцтва веры ў магічную сілу слова нярэдка выкарыстоўвалі рацыянальныя сродкі народнай медыцыны, чым забяспечвалі больш устойлівае месца гэтаму віду творчасці ў народзе.

Прынята дзяліць замовы на некалькі тэматычных груп: першая група — замовы, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю чалавека (паляванне, рыбацтва, пчалярства, збор ягад, грыбоў, захаванне жывёлы, ураджаю); другая — замовы супраць хвароб (ліхаманка, зубны боль, укус змяі, шал і г. д.); трэцяя — замовы, звязаныя з сямейнымі адносінамі і прыватным бытам (сюды адносяцца таксама прысушкі і адсушкі — любоўныя замовы); чацвёртая група — замовы, звязаныя з грамадскімі адносінамі, і г. д.

Замовы каштоўныя тым, што ў іх знайшлі адлюстраванне многія бакі гаспадарчага, грамадскага і духоўнага жыцця чалавека. Яны з'яўляюцца помнікамі мастацкага слова народа. Па эстэтычна-эмацыянальных вартасцях, паэтычным майстэрстве, вобразнасці мовы замовы стаяць побач з іншымі фальклорнымі жанрамі і складаюць цікавую частку вуснай спадчыны народа.

ЛІТАРАТУРА

Замовы / Склад. Г. А. Барташэвіч. Мн., 1992.

Беларуская народна-паэтычная творчасць / Пад рэд. М. Р. Ларчанкі. Мн., 1979. С. 127—135.

Кабашнікаў К. П., Фядосік А. С., Ліс А. С., Цішчанка І. К. Беларуская вусна-паэтычная творчасць. Мн., 1988. С. 108—115.

Замова паляўнічага

Вадзіца царыца, усяму свету памачніца. Як ты змываеш сырое карэнне, шэрае і белае каменне, так і змый і маю ружыну-ружніцу і булат-жалеза. Як страляе з неба Міхаіл-архангел громам і маланняй і вострай стралой і як ніхто не можа ўняць ні грома, ні маланні, ні вострай стралы, так ніхто не можа ўняць і мяне, раба Божага, стральца, і маю ружыну-ружніцу і булат-жалеза. А над маёй ружынай-ружніцай і булат-жалезам няма спаруганння на векі вякоў.

Замова на стрэльбу

На сінім моры, на беражочку, на жоўтым пясочку стаіць дуб зялёны, да зямлі нахілёны. А з таго дуба як узняліся шуры ды буры, ветры кавуры, як нанасілі глушцоў, цяцерак, гусей і вутак, малога птаства, як цёмнай хмары. Як наганялі лісіц і зайцоў, ласей і дзікоў мне на патрэбу. Ой, ляціце, пташкі і шэрыя вуткі, ка мне, стральцу, малайцу. Бяжыце, лісіцы і шэрыя зайцы, на маю стрэльбу. А мая стрэльба ручоная, вучоная, каб маху не давала, усякае жывёлу на месцы клала.

Замова для пчол

Стой, рой малады! Не іграй, да сырой зямлі прыпадай.

Вось вам, пчолкі, святліца — новая, цясовая, адмысловая. Жыць вам тут і быць сто лет і зім і дзвесце дзяцей павадзіць. І ты, матка ліпа Валляна, ліпа красная дзявіца, і ты, трутень Іван, параней уставайце, сваіх дзетак пабуджайце і пасылайце іх у цёмныя лясы, у шчырыя бары. Майце шум баравы, майце роў прудавы, мядзведжую лапу, воўчы рост. Саграбайцеся, змятайцеся. Да чужых пчол не лятайце і чужых да сябе не пускайце. Як маці зямлі, свайго месца пільнуйцеся.

Замова пры выгане скаціны ў поле

Красна сонца і ясен свет, і з лунамі яснымі, і звёздамі частымі, і з зорамі вогненнымі, і ранішняй расой і з вячэрняй і сушу і мора асычаеш і маць сыру зямлю ўграваеш! І з вясеннім цяплом і з летнім агнём і ўгрэй, упар зямлю, распусці зялёну траву па лясах, па лугах, па канавах, па кустах. І сахрані ты маіх мілых жыватоў ад усякага ліхадзея! Даруй маім жыватам піценне і ядзенне, пакрый іх шоўкавай

пеляной, а ліхадзея забі вогненнай стралой, агнём-пламенем. Ідзіце, матушкі, у чыстае поле, у зялёныя лугі! Там вам яда — трава зялёная, там піццё — вада студзёная. І ўгрэй іх, красна сонца, а дамоў прывядзі, ясен месяц. І саблюдзі іх, красна сонца, ад ліхога чалавека, ад цара палявога, ад цара вадзянога, ад цара лесавога, ад яго дзетак царанят, каб ён кароў дамоў не вадзіў і царат малаком не паіў. І сахрані іх ад стралы вогненнай, ад звера бягучага, ад гада паўзучага, ад змяі папілухі. Амінь.

Замова на сцаленне малака ў каровы

Першым разам, добрым часам. Госпаду Богу і мамцы прачыстай пакланюся і Госпада Бога папрашу з усімі сіламі нябеснымі, кіеўскімі, пячэрскімі. А ўсе вы, праведнічкі прападобныя, станьце ж гасподухначку на помач божай кароўцы чорненькай. У полі стаяла богава стаянка, а ў той стаянцы богава кароўка, а ў тыя кароўкі залатыя рожкі, мядзяныя ножкі, сярэбраны язык. Прыдзі ж, кароўка, к маёй божай кароўцы, паліжы, кароўка, маю кароўку, ножкі і рожкі, і вымечка. Як жа ў моры вадзіца прыбаўляецца, каб у маёй божай кароўкі, Божа, малако прыбаўлялася; як жа ў моры бераг з беражком не сходзіцца, каб і к маёй божай кароўцы ўрокі не прыходзілі,— ні жаноцкія, ні хлапоцкія, ні дзявоцкія, ні схода, ні маладзіка і не пад поўнае і ветрам ненаноснае. І дай жа ты, Госпадзі, маёй божай каровачцы белага малачка, а жоўтага маслечка, тоўстага сырцу; не будзь жа ты ўрочна, а будзь жа ты малочна; як было, так каб і было, каб даў Бог яшчэ болей прыбыло. А хто завідуе ды прыглядаецца, дык соль яму ў вочы і галаўня ў зубы...

Замова на захаванне жывёлы

Уставала я ранюсенька, умывалася бялюсенька, выганяла я кароўку ў зялёную дуброўку, на Юр'еву роску, на мікульную траўку, на скацерку-атаўку ў чыстае поле. У чыстым полі стаіць прыстол. На прыстоле сядзіць святая матка, прачыстачка-багародзіца і дзяржыць на прыполе Ісуса Хрыста і накрывае чорнаю рызаю. Як Ісусу Хрысту з чорнае рызы не ўставаці, так блудніку-самаблудніку каля маёй каровы не бываці, з маёй кароўкі плоду, малачка не браці. Мая кароўка будзе ўросная, праросная і будзе добра малосная. Будзе па чысту полю пахаджаці і капыцікам траўку збіваці, і роску злізаці, і сваёй хазяйцы малачко збіраці з дзевяці жылачак у ча-

тыры цыцачкі. Смятанка жоўценька, тлусценька, тваражок гусценькі.

Кароўка на пажытак, малачко на прыбытак.

Замова ад ваўка

Першым разам, божым часам. Госпаду Богу памалюся, святой матары божай прыкланюся. Ёсць у свеце многа царыкаў, а мне тры трэба: першы царык — ясны месяц на небе; другі царык — воўк у калодзе; трэці царык — мядзведзь пад выскаддзей. Як мне з ім не схадзіцца, а ім за адзін стол не садзіцца і не піць і не есць, не гуляць, не бяседаваць, так рабу зверу з маёй скацінкай, з бурай шарсцінкай, не схадзіцца, не відацца, не стракацца. Я сваю скаціну загаворваю дзвёмі зарамі — ранняй і вячэрняй — застанаўляю, цёмнай ноччу пасцель усцілаю, дробнымі зорамі абсяваю, ясным месяцам пакрываю. Ваўку валаўство, ваўчыцы юцы, чорнай рызай вочы засцілаю, застанаўляю і замыкаю зубы, губы, ногці, когці залатымі замкамі, сярэбранымі ключамі. Я ж тыя ключы вынімаю і на сіне мора кідаю. Маёй скаціне, бурай шарсціне, чур ад пары да пары, да слушнага часу.

Замова ад лесуна

Хаджу па лясах, па кустах, па імхах, па балотах, па лыкадзёрах, па гніліцах, па чарніцах, па малінах — куды ні хаджу, ніколі не блуджу; сонца па сонцу, месяц па месяцу; пры частых зорках, пры вячэрніх зорах хаджу не блуджу, а табе, лясны хазяін, пакорнасць аддала; ад мяне, раба, адшатніся, у бярозу абярніся. Амінь.

Замова ад дамавіка

Цар дваравы! Царыца дваравіца! Твае дзеткі цараняты! Дарую я вас і хлебам і соллю, мілуйце вы і маіх жыватоў, карміце вы іх ярай пшаной, а паіце вы іх мядовай сытой, пакрыйце вы іх шаўковай пеляной, блюдзіце вы іх ад чужога дваравога, ад чужога палявога, ад падмежніка, ад качарэжніка, ад кустоўніка, ад грыбоўніка...

Замова ад русалкі

Вадзяніца, лесавіца, шальная дзявіца! Адвяжыся, адкаціся, у мой двор не кажыся; табе тут не век жыць, а нядзелю

быць. Ступай у раку глыбокую, на асіну высокую. Асіна, трасіся, вадзяніца, уйміся! Я закон прынімаў, златы крыж цалаваў; мне з табой не вадзіцца, не куміцца. Ступай у бор... к лясному хазяіну, ён цябе ждаў, на імху пасцель слаў, муравой усцілаў, у ізгалоўе калоду клаў; з ім табе спаць, а мне, хрышчонаму, цябе не відаць. Амінь.

Замова ад ліхога вока

Царыца вадзіца, красная дзявіца, марская крыніца, божжа памачніца, і ўгодніца Улляніца, і румяніца, рака вялікая. Каціцца ты, вадзіца, па днях, па начах, па вячэрніх зарах, ідзеш з-пад крутых гор, з-пад красных зор, з-пад жаркага сонца, з-пад яснага месяца, з-пад латыра камня, па тонкіх жылах, марскіх сілах. Падмываеш ты крутыя берагі, жоўтыя пяскі, калоды валяныя, траву шаўковую і вымываеш сырое карэнне, белае каменне; абмываеш камушкі дробныя, крамені чорныя і жалеззе марское цяжкое. Ачышчаеш цароў, каралёў і ўвесь народ хрысціянскі, абмый і сцалі рабу гэту нядужную ад першага вока аднавокага, і ад карага, і ад ярага, і ад белага, і ад шэрага, ад стрэчнага, ад папярэчнага, ад падзіўнага і пасмешнага, ад падумнага і пагляднага, ад прыгаворнага і набродная, ад галоснага і ад глоснага, ад завіснага і ад радаснага, ад вадзянога і сухавейнага, і скразіцельнага, і скрозь плотнага, і светавога, і агнявога, і гаравога, і палявога; ці схода, ці маладзіка, ці пад поўдня; ад часіны, ад хвіліны, і дзённага, і начнога, і ранняга, і вячэрняга, і паўночнага, і паўдзённага, і радзімага, і насыльнага, і падымнага, і светавога, і калючага, і балючага, і ламучага, і гаручага, ці панскага, ці цыганскага, ці дзякоўскага, ці яўрэйскага, ці мужчынскага пад вянцом, ці жаноцкага пад ганцом, ці хлапецкага пад шапачкай, ці дзявоцкага пад завіткай, ці ўдовіна, ці ўдаўцова, ці дзядова, ці бабіна, ці бацькіна, ці маткіна, ці братова, ці сястрына, ці рабячага, ці сабачага, ці дзядзькіна, ці цёткіна, і ад старых старыкоў, ад старых старушак, ад вядзьмінскіх і чараўніцкіх і таго беззаконнага ўдовіна навараджэнца, які два разы маць сасець; і на чым бы яны ні былі: на піцянні ці на едзянні, на гулянні-красаванні ці на мяккім спачыванні.

Вадзіца царыца, зямная і нябесная! Зара вячэрняя, зара вутранняя, сонца краснае, месячык праведны, зорачкі частыя, панядзелачак святы, святачкі святыя, гадавыя! Станьце, гаспадухначкі, на помач, святыя анёлы, на радасць, памажыце мне зглаз-урокі загаварыць! І выхадзіце вы, зглаз-урокі, з раба

гэтага нядужнага, з буйнай галавы, з чорных брывей, з слухавых вушэй, з баявых наздрэй, з рацівага сэрца, з сільнага жывата, з чорнай печані, з белага лёгкага, з гарачай крыві, з пальчыкаў, з сустаўчыкаў, з рус кос, з трыдзевяць касцей, з трыдзевяць жыл, з трыдзевяць пажылак, з ногцікаў, з локцікаў, з белых рук, з хрыбетнай касці, з гаручых слёз. Ідзіце вы, зглаз-урокі, на імхі, на балоты, на тонкія аржаванні, на ніцыя лозы, на гнілыя калоды, на сухія лясы, на жоўтыя пяскі, на буйныя ветры, на неадчыненыя дзверы, на нехрышчоную зямлю, дзе сонца не грэе, дзе ветры не веюць, дзе пеўні не спяваюць і гусі не крычаць, і сабакі не брэшуць, і птушкі не пяюць, і звяр'ё не бегае, і людзі не ходзяць. Там вам курганы — нагуляны, і там, на белым камні, стаяць сталы цясовыя, на тых сталах абрусы белыя, на тых абрусах кубкі вінныя; там стаяць ложкі цясовыя, на тых ложках пярыны пуховыя; там у шэрых барах, у цёмных лясах ёсць прыгожая сенажаць, сярод той распрыгожай сенажаці стаіць куст ракітавы, пад кустом ракітавым сядзіць паненка, пірагі пячэ і вас да сябе ў госці кліча, і піва наварыла, і мёду насыціла.

Там вам гулянне-красаванне, там вам адпачыванне; там вам гуляць, вінныя кубкі выпіваць, на цясовых ложках аддыхаць; там быць, там вам жыць, там і раскашавацца. Тут жа вам не хадзіць, касцей не ламаць, шчырага сэрца не знабіць, цела не пушыць, не калоць, не пароць, не гарэць, не балець. Чур табе!

Вазьмі ты, вецер ціхі, вятровае ліха; дзе ты гуляў, дзе ты буяў, дзе ты рабу гэту балезную сустракаў, што ты ёй даў, каб назад адабраў.

Правялікі пан дамавы! Правялікі пан лесавы — безыменшчык! Правялікі пан баравы — Сцяпан! Правялікі пан палявы — Антон! Правялікі пан лугавы — Хвядос! Правялікая пані маці, малання-бліскуха! Прасіце вы сваіх сыноў, дванаццаць ціхіх вятроў, які нам шкоду зрабіў, адабраць вятровае ліха.

Чурайся, ліха, адракайся ад раба гэтага і ідзі, вятровае — на вецер; зямное — на зямлю; вадзяное — у ваду; агнявое — у агонь. Амінь.

Замова ад злога духа

На сінім моры камень, на тым камні дуб, на тым дубе трыдзевяць какатоў, на тых какатах трыдзевяць гняздоў, на тых гнёздах трыдзевяць сарок, трыдзевяць урок — ад жаночча, ад дзявочча, ад хлапечча, ад мужчынска — русы волас, чор-

ны волас, рыжы волас, белы волас. Святыя святочкі, хадзіце ка мне на помач; я з славамі, Бог з духамі; як стала, так перастала.

Замова ад нячыстай сілы

Выганяю я з раба божага (імя) бясоў, д'яблаў, нячыстых духаў і самазлейшых духаў, выганяю з такога-та раба, з такога-та воласа, з ярых воч, з сэрца, з зубоў, з целясоў, з рота, з носа, з віскоў, з мазгоў, з шыі яго, з плеч, з хрыбётнае касці, з рабёр, з сярэдзіны, з рук, з ног, з суставаў, з нутры, з утробы, з жыл, з няжыл, з крыві, з целяса, з дыхання, з узгляду. І ссылаю вас, бясы-д'яблы, нячыстая сіла, на мхі, на балоты, на гнілыя калоды, на паганыя воды, дзе Садом і Гамора страблены. Заклінаю я вас, бясы-д'яблы, нячыстая сіла, ветраных і віхорных, і вадзяных, і жывотных, і насякомых. Заклінаю ўсемагучым Богам з вышніх воблак чатырма евангелістамі: Іванам і Маркам, Луком і Матвеем. Адступайце, злыя духі, ад раба божага (імя)...

Замова ад ляку

Госпаду Богу памалюся, прачыстай матары пакланюся і ўсім святым прападобным кіеўскім, пячэрскім Антонію і Хвядосію. Станьце ўсе на помач ляк шаптаць. І вышаптаю яго і шчосваю — і жаночы, і мужскі, і дзявоцкі, і парабацкі, і ветравы, і земляны, і вадзяны, і конскі, і каравячы, і свінячы, і авечы, і гусіны, і курыны, і сабачы, і кашачы. І ссылаю цябе, ляк: забярыце ляк, бабы, у чапцы, мужчыны, у шапкі, дзеўкі, у косы, хлопцы, у магеркі: вятровы — на вецер ляці; земляны — на зямлю ўпадзі; вадзяны — на вадзе плыві, каню ў ногі, карове ў рогі, свінне ў жывот, авечцы ў капыты, кошцы ў пячонкі, сабацы ў галоўку, гусю ў дзюбку, курыцы ў лапкі. І нясіце на мхі, на балоты, на крутыя горы, дзе вецер не вее і людзі не ходзяць, пеўні не пяюць, ваўкі не выюць. Там чорны вол па гарэ ходзіць, расу абівае, там увесь ляк прападае...

Замова ад ляку

І, пуд-упудзішча, выгаворваю я цябе з буйнай галавы, з русага воласа, з руцівага сэрца, з жыл, з пажылак, з касцей, пакасцей, з суставаў, з суставак раба божа (імя). Святы светлы дзянёчак, стань на помач! Святы Мікола, стань на помач!

50 Святы пяцінка, стань на помач! Святое ўзнясенне, стань на помач! Святы Пятрок-Павел, стань на помач! Святы Ілля, стань на помач! Святы Спас, стань на помач! Святая прачыстая, стань на помач! Святы Пакроў, стань на помач! Святы Кузьма-Дзям'ян, стань на помач! Упуд-упудзішча, высылаю я цябе на мхі, на балоты, на гнілыя калоды, на белыя каменні, на ракітавыя карэнні.

Замова ад ляку

Першым разочкам, добрым часочкам... Вялікая зара-зараніца, хвораму памачніца, стань на помач, на ратунак, на радасць.

Як на небе месячка састанавіўся, састанавіся, кроў. Калеснік калесніка сустракае — немач адсякае.

Дарогай ішлі Пётра-Паўла, Ілля, сустракаюць прачыстую маці. Яны ў яе пытаюць: «Ох маці, мая маці, чым мы ету будзем балезць пакрываці?» — «Будзем жа мы пакрываць чорнай рызай». Чорнай рызай пакрывалі, к сабе пераход любімага ліха прызывалі: любімае, радзімае, спужанае, уздрыганае, уляканае, аручае, пяручае, ветраное, вадзяное, падзіўнае, пагляднае, пасмяшна, прыгаворна, намоўна, з агня, з ветра, з вады ў раба божага не быць, па касці не хадзіць, касці не ламіць, сэрца не таміць, жылак не марыць, вочак не цямніць, галовачкі агнём не паліць, у вобмарак не ўвадзіць. Патуль ты хадзіла, гуляла, буяла, пакуль раба божая Дар'я прыступіла, ухадзіла, угаварыла, высылала з жыл, з паджыл, з кагцей, з машчэй, з чуткіх вушэй, з чырвонае крыві, з жоўтае касці, з буйныя галавы, з румянага ліца, з русага валаска, з шчырага сэрца, з белага цельца. Дасць Бог час добры, любі мой дух лёгкі.

Замова ад крыксы

Першым разам, добрым часам. Госпаду Богу памалюся, матцы прачыстай пакланюся. Матка божая, святая, стань жа мне на помач, рабу божаму, младзенцу, крыксы гаварыці. Зоры-зараніцы, красныя дзявіцы, вазьміце вы крыксы-начніцы — і бацькавы, і маткіны, і дзявоцкія, і парабацкія, і жаласныя, і карысныя, і ўцешныя, і пасмешныя, і светавыя, і заравыя. І вам, зорачкі, на стаянне, а рабу божаму, младзенцу, на здароўе; вам, зорачкі, пасвяціці, а рабу божаму, младзенцу, паспаці.

Замова ад змяінага ўкусу

...Гадзіна вадзяная, земляная, сляпні і вужы, змеі і вужакі, ярыца, пераярыца! Аддайце і вазьміце сваю жаласць і ярасць (імя або назва жывёлы). Калі не аддасцё сваёй жаласці і ярасці, то не будзе вам збудзішча ні пад кустом, ні пад лістом, ні пад карэннямі. Сонца і яркі месяц не будуць вам свяціць і не будзе прынімаць вас сыра маць-зямля.

Замова ад шалу

Устану я рана-раненька, умыюся бела-бяленька, узыйду на крутую гару, зірну пад ясную зару — там стаіць дзедзька-лябедзька, стары, барадаты. Дзедзька-лябедзька, унімай свайго сабаку-кусаку, круцяку і вярцяку: укусіў ён раба божага, вынімай шал з касцей, з машчэй, з чорных печаней, з сініх жыл, з гаручай крыві і буйнай галавы, каб у раба божага косці не ламіла, гаручае крыві не марыла, ясных вачэй не круціла.

Замова ад кровацячэння

Плыло тры рэчкі: адна вадзяная, другая малочная, а трэцяя крывавая. Вадзяная — працячы! Малочная — працячы! А кроў гаручая, супыніся і запячыся. Другім разам, гасподнім часам. Плыла рака морам, а ў той рацэ тры жылы: адна вадзяная, другая малочная, а трэцяя крывавая. Вадзяная — працячы! Малочная — працячы! А крывавая, суніміся і запячыся! Трэцім разам, гасподнім часам. Плыло тры рэчкі: адна вадзяная, другая малочная, а трэцяя крывавая. Вадзяная — працячы! Малочная — працячы! А кроў гаручая, сунімайся, запякайся!

Замова ад ліхаманкі

Наперш вяснянка, а другая лядзянка, а трэцяя лістападніца, а чацвёртая касцяніца, а пятая квактуха, а шостая начніца, а сёмая смутніца! Адкаціся, адваліся ад грудзей і ад бела цела, ад буйнай галавы! Ты дзеўкай не шляйся, на мяне не зазірайся. Я ў хаце ляжу, на вугаль гляджу. Як вуглю згарэць, так табе ў катле кіпець. Бяжы не азірайся, назад не вяртайся, ступай у пні, у калоды, у гнілое балота. Там табе жыць, са мхоў ваду піць. Амінь.

Замова ад лішая

Іду я ў гумно і бяру палову і свінням мяшаю. А ты, лішай, рабу божаму не мяшай і выхадзі з яго і з касцей, і з мажджэй, і з ясных вачэй, і з гарачай крыві, і з чыстага цела і карэння не пускай. І здымала цябе матар божая духам сваім і ссылала цябе на мхі і на балоты, і на дзікія лозы — там яны гуляюць і сталы засцілаюць, і ўсіх лішаёў дажыдаюць: і красных, і белых, і купленых, і коленых, і падзіўных, і прастудных, і пасмешных, і ветраных, і вадзяных, і знаючых, і нязнаючых. І чур цябе, хрышчонага, нараджонага!

Замова ад скулы

Ты, зара-зарыца, ты, раса-расіца, ранняя і вячэрняя! Ты, скулішча-асудзішча, ты, скула белая, ты, скула чорная, ты, скула сіняя, ты, скула багровая, ты, скула жоўтая, ты, скула завісная, ты, скула радасная, ты, скула ўрошная, ты, скула ўгрумая, ты, скула грудзішча, ты, скула залатніца — якой бы ты ні была, я, раб божы, цябе ўпрашаю. Я цябе высылаю з касці, з машчэй, з ясных вачэй, з буйнай галавы, з рацівага сэрца, з усіх жыл, з усіх поўсуставаў, каб раб божы балець перастаў.

Ты ступай, скула, на сінія моры. На сінім моры ляжыць белы камень, на белым камні сядзіць там белая дзявіца; яна не шые, яна не мые, яна не тчэ, яна не прадзе, толькі рабу божаму помач ад скул дае.

Мы ж просім: «Красная дзявіца, сама чыстая вадзіца, ты ішла з марскога ключа, з землянога нутра, ты размывала жоўтыя пяскі, ты падлівала крутыя беражкі — змый з раба божага (імя) скулу ўгрумую і ўсю балесць!»

Замова ад зубнога болю

О вы, зубы, зубы! Чаму ж вы не белы, ды руды? Хіба вы што кепска жавалі, што хваробы дасталі. Перастаньце ж вы хварэці, будзеце, як велькі пан у гарэце. А калі не перастанеце балеці, то мы будзема вас жалезам цягнуці. Ідзі ж ты, хвароба, у шырокае поле, у сухія лясы ды ў мокрае балота. А хваробы нам жаднай не трэба, бо яна прышла ад чорта, але не з неба.

Замова ад хваробы валасоў

Ты волас, волас калавы і волас ламавы, і мазгавы, і рассыпны, і волас жыльны, і трохжыльны, і волас дзянны, і во-

лас начны, і волас свярбучы, і волас ламучы, і волас знабучы! Адчаго ты колеш, адчаго ты ломеш? У буйнай галаве, у рацівым сэрцы, у скорых нагах, у ясных вачах уцішся, умірся і не калі, не ламі, ні ў маладзіках, ні ў ветахах, ні на сходзе красна сонца, ні на закаце красна месяца. Ступай у зямлю цёмную, у цьму крамешную, не к людзям жывым, а к папурам ліхім.

Замова ад залатніка

Загаворваю залатнік ступны, стрывожаны, калючы, падзіўны, прыгаворны, дзявочы, жаночы і хлапечы. Дванаццаць разоў загаворваю і замаўляю: не гарэць, не балець, не ламіць і жыл не сушыць. Цары, каралі б'юцца, сякуцца і зноў усціхамірваюцца. Так і ты, залатнічок, хадзі, расхадзіся і ўсціхамірвайся, на сваё месца станавіся, якое табе Гасподзь Бог паказаў. Уніз не схадзі, касці не ламі, раба божага (імя) не сушы. Як чорны мак пасеўны, так і ты, залатнік, пяром угору ўзніміся, на сваё месца станавіся не ніжэй, не вышэй пупа. Як на небе маладзічок, зоркі і балачынкі круг свету ходзяць, расходзяцца і на сваё месца становяцца, так і ты, залатнічок, хадзі, расхадзіся, свайго месца пільнуйся і на сваё месца станавіся — ля пупа, ля пупа, ля пупа.

Любоўная замова (прысушка)

Устану я, добры маладзец, і выйду не дзвярыма за новыя вароты ў чыстае поле. У чыстым полі стаіць тры бясы, два бясы, адзін бес: бес Сава, бес Савул, бес Калдун. Падыйду я, добры маладзец, пабліжэй, пакланюся паніжэй, і вы, трыдзевяць бясоў — бес Сава, бес Савул, бес Калдун, паслужыце мне, як служылі Іраду цару. Ідзіце па гарадах, па сёлах, па дзярэўнях і збярыце ўсю таску і сухоту ад звярэй, птушак, рыб і ўсякага роду людзей і знясіце тую таску і сухоту дзявіцы Прасінні ў ясныя вочы, у чорныя бровы, у румянае ліцо, у рацівае сэрца, у чорную печань , у гарачую кроў, у трыдзевяць жыл і адну жылу станавую, падпятную, і каб гэта дзявіца не магла ні жыць, ні быць ні днём па сонцу, ні ноччу па месяцу без мяне, добрага моладца. У чыстым полі стаіць сарачынскі дуб, з-пад дуба выходзіла Баба-Яга і паджыгала трыдзевяць кастроў дубовых дроў. Так жарка, так ясна, каб разгарэліся ў дзявіцы ясныя вочы, чорныя бровы, румянае ліцо, рацівае сэрца, чорная печань, гарачая кроў, семдзесят адзін сустаў; каб тая дзявіца не магла наслаждац-

ца, ні ў чыстым полі нагуляцца, ні ў парнай лазні парыцца, ні прэсным малаком нахлябацца, ні ў мяккай пасцелі адаспацца без мяне, добрага моладца. І гэтым добрым маім словам ключ і замок, замок замкну і ключ знясу ў акіян-мора пад латыр камень. Амінь.

Замова ад нагавору

Зоры зарыцкія, хвораму памачніцы, прыступіце, памажыце ўпрасіць і ўмаліць 12 прымавак і ўгаварыць, адкуль яны ўзяліся, ці ветраныя, ці віхраныя, ці ўрочныя, ці ўлечныя, ці падуманыя, ці пакідоныя, ці памаўлёныя, ці нагавораныя, ці страчаныя, ці пасланыя. Прашу я вас усіх: выступіце з следу, з печаней, з касцей, з вачэй, ад белае касці, ад чырвонае крыві, ад русых косак, ад чорных вочак. І прашу я Госпада Бога. Ідзіце вы на сіняе мора. На сінім моры стаіць дуб зялёны, пад тым дубам 12 панове гуляюць. Стаяць столікі засціланыя, кубачкі паліваныя, там вам піці, гуляці, а гэтаму чалавеку здароўечка даці. На лёгкае спанне, на смачнае ўжыванне, па беламу свету хадзіці і з добрымі людзьмі гаварыці.

Як чорнаю кароваю па мору не араці, чорным катом не баранаваці, жоўтым пяском не сеяці, у жоўтым пяску каласку не бываці, так ліхім людзям яго здароўечка не ўцінаці.

Прысушка

Лягу я, раб Божы, памалюся, устану я, благаслаўлюся, памыюся я расою, вытруся я прастольнаю пеляною, пайду я з дзвярэй у дзверы, з варот у вароты, выйду я ў чыстае поле, у зялёнае памора, стану я на сырую зямлю, пагляджу я на ўсходнюю старану.

Як красная сонейка ззяе, прыпякае мхі і балоты, чорныя гразі, так і ты прыбягай, ка мне прысыхай, раб Божы, ка мне, рабе Божай. Вочы ў вочы, сэрца ў сэрца, мыслі ў мыслі. Спаць бы ён не засыпаў, гуляць бы ён не гуляў, а ўсё б ка мне прыбягаў. Амінь, слава табе.

Каляндарна-абрадавая паэзія

Каляндарна-абрадавая паэзія — від фальклору, які суправаджаў аграрныя святы і працу земляроба на працягу гаспадарчага года. Вытокі каляндарна-абрадавай паэзіі — у родавым грамадстве. У самым старажытным пласце каляндарных абрадаў, павер'яў, песень ужо адбіўся культ сонца. Невыпадкова і найбольшыя земляробчыя ўрачыстасці, святкаванні, у першую чаргу Каляды, Купалле, прыпадалі на зімовае і летняе сонцастаянне. Назіранні старажытнага чалавека над кругазваротам у прыродзе, біялагічнымі цыкламі раслін склаліся ў цэлую сістэму поглядаў, якія знайшлі выяўленне ў аграрна-магічных абрадах, павер'ях, каляндарных прыкметах, прыказках, песнях. Чалавек першабытнага грамадства імкнуўся разгадаць таямніцы прыроды, паўплываць на іх дзеля захавання роду, каб забяспечыць аснову дабрабыту сям'і — вырасціць і сабраць ураджай, павялічыць статак, спадзяваўся дасягнуць гэтага заклінаннем, магічным словам, абрадавым рытуалам. З развіццём грамадства каляндарна-абрадавая паэзія шырока адлюстроўвала ў сабе працоўную дзейнасць земляроба, маральна-этычныя ўяўленні народа, яго характар, паэтычны погляд на свет, прыроду, чалавека.

Беларуская каляндарна-абрадавая творчасць як з'ява нацыянальна адметная, са сваёй лексічна-вобразнай структурай, жанравай і ладава-інтанацыйнай спецыфікай склалася не пазней чым у XIV — XVI ст. У цэлым яна ўяўляе сабой складаную многасастаўную сістэму. Паэзія беларускага земляробчага календара ўключае звыш дваццаці жанравых і групавых песенных разнавіднасцей. Яна буйна развівалася, добра захавалася і складае своеасаблівы феномен беларускай нацыянальнай паэтычна-песеннай культуры. Цыклізацыя каляндарна-абрадавай паэзіі абумоўлена кругазваротам у прыродзе, чаргаваннем пор года. У паэзіі беларускага земляробчага (ратайскага) календара вылучаюцца чатыры вялікія цыклы: веснавы, летні, асенні і зімовы. Кожная пара года, кожны сезонна-вытворчы перыяд мелі адпаведныя абрады, звычаі, павер'і, песеннае суправаджэнне. Агульнай у іх была шырокая аграрная аснова, мэтавая ўстаноўка, паасобныя матывы, што вынікалі з яе. Усе каляндарныя абрадава-песенныя комплексы былі прасякнуты думкай аб будучыні роду, сям'і, клопатам пра тое, каб у найспрыяльнейшы час засеяць ніву, вырасціць і захаваць ад стыхій ураджай, зберагчы статак ад паморку і дзікіх звяроў, у пару сабраць плён. Аднак толькі гэтай, галоўнай, функцыяй змест каляндарна-абрадавай паэзіі не вычэрпваўся. Выконвала яна і гуллівапацешлівую функцыю, а таксама мела немалое эстэтычнае значэнне.

Пры пераемнасці некаторых абрадавых элементаў, пераклічцы паасобных матываў кожны песенна-каляндарны цыкл вызначаецца разнастайнасцю і своеасаблівай непаўторнасцю паэзіі. Гэта абумоўлена прыроднымі асаблівасцямі кожнай пары года, неаднолькавым характарам працы, клопатаў земляроба ў розны час.

Зімовы перыяд у сялянскім календары меў падрыхтоўчы характар. Абрады і песні зімовага цыкла былі накіраваны на тое, каб загадзя, наперад паўплываць на будучы ўраджай, захаваць азімыя пасевы, рунь на палях. Насычанасцю абрадамі, песнямі вылучалася святкаванне беднай Куцці, Каляд (25 снежня ст. ст.), Шчадрухі, багатай Куцці ў пярэдадзень Новага года. У ходзе каляндарна-пераднавагодніх урачыстасцей шмат увагі аддавалася аграрнай і любоўнай варажбе, розным гаспадарчым прыкметам. Зорнае неба на Куццю абяцала добры ўраджай на ягады і грыбы ў новым годзе, іней на дрэвах — багатую квецень у садах, снег і мяцеліца — добрае раенне пчол улетку. У аснове такіх павер'яў, уяўленняў ляжыць сімільная магія.

Вызначальнае месца ў зімовым каляндарна-абрадавым цыкле належала калядаванню і шчадраванню. Паэтычнае ядро яго складалі калядкі і шчадроўкі, песні, што ўвабралі ў сябе быт і помыслы земляроба і вызначаюцца метафарычнасцю і пластыкай вобразаў. Піліпаўскія песні выразных жанравых адзнак не мелі. Зімовы цыкл уключаў ігрышчы, драматычныя прадстаўленні з пераапрананнем, абрадавае «ваджэнне казы» на багатую Куццю (пярэдадзень Новага года), аграрна-шлюбную гульню «Жаніцьба Цярэшкі» і інш.

На мяжы двух цыклаў развіліся масленічныя, або запусныя, песні. Масленічныя абрады прызначаліся наблізіць прыход вясны. Масленкі, што суправаджалі гульні моладзі, абход двароў, дзе была сёлетняя нявеста, уключалі матыў заклінання ўраджаю, перадавалі радасць з выпадку набліжэння вясны, гуллівы настрой удзельнікаў святкавання.

Веснавыя абрады і песні павінны былі асвячаць сабою асабліва адказны перыяд у жыцці старажытнага земляроба — пачатак палявых работ, час веснавых усходаў, выгану жывёлы на пашу. Прызыванне (гуканне) вясны, песні-вяснянкі, абрад валачобніцтва і валачобныя песні, пачатак ваджэння карагодаў, абрадавы выган жывёлы на Юр'еву расу (23 красавіка), ушанаванне памяці продкаў на Радаўніцу, Сёмуха, або Тройца, з культам расліннасці, русальны тыдзень, абрад куста, песні траецкія, русальныя, куставыя складалі змест веснавога каляндарна-абрадавага цыкла.

Летнія абрады і песні прызначаліся зберагчы збажыну ў пару даспявання, паспрыяць паспяховаму збору ўраджаю. Абрады, звычаі, павер'і, паданні Купалля нясуць на сабе адбітак глыбокай даўніны, маляўнічыя паводле зместу і формы. Купальскія рытуалы выконвалі ахоўную (апатрапеічную) і прадуцыравальную функцыі. Купальскія і пятроўскія песні пранікнёна паэтызуюць харство прыроды ў час яе найбольшага росквіту, стварылі поўныя пяшчоты і першароднай чысціні дзявочыя вобразы. Невялікую групу ў летнім цыкле складаюць песні сенакосныя. Купальскія і пятроўскія мелодыямі сваімі яшчэ блізкія да позневясновых. Уласна летнімі, паводле сталай народнай традыцыі, лічацца жніўныя песні — зажынкавыя і дажынкавыя. Яны непасрэдна перадаюць атмасферу самай гарачай пары года ў жыцці сялянскай сям'і — жніва, цяжкай працы, перажыванняў жняі, сацыяльныя адносіны, асабліва добра выражаныя ў песнях прыгоннай пары. Важны элемент летняга цыкла — дажынкі і звязаныя з імі песні.

Асенні перыяд земляробчага календара быў бедны на абрады. Звязаны з уборкай яравых, выбаркай, апрацоўкай ільну, засяваннем азімых — заканчэннем палявых работ, ён характарызаваўся дамінаваннем у песнях перадвясельных матываў, развіццём у іх моцнага лірычнага пачатку. Сярод восеньскіх свят вылучаліся Пакроў, Багач (суправаджаўся аграрным абрадам), і, асабліва, Змітраўскія дзяды, Асяніны, прысвечаныя ўшанаванню памяці продкаў.

У рамках веснавога, летняга і асенняга сезонна-вытворчых перыядаў бытавалі талочныя песні, песні працоўнай узаемадапамогі. Разам з валачобнымі і восеньскімі яны складаюць нацыянальную спецыфіку паэзіі беларускага земляробчага календара.

Талочныя песні хоць і развіліся ў рамках паэзіі земляробчага

календара, але стаяць крыху асобна. Яны звязаны са старажытнай формай узаемадапамогі ў працы — талакой (адсюль паходзіць і іх назва). На талаку склікаліся сваякі і суседзі. Збіраліся талокі вясной — на вывазку гною, у жніво — на дажон, часам і ўвосень — на малацьбу, апрацоўку лёну, вывазку дрэва на зруб... Спяваліся талочныя песні звычайна ў застоллі. У іх успамінаўся сам гаспадарчы занятак, але пераважалі бяседныя матывы. Найбольш захавалася песень так званай жніўнай талакі, але нямала ёсць і песень веснавой талакі. Усе талочныя песні вылучаюцца жартоўным зместам.

Каляндарна-абрадавая паэзія — шматжанравая па прыродзе. Яна ўключае паэтычныя абрады, звычаі, заклінальныя, велічальныя, баладныя, лірычныя і жартоўныя песні, рэцэі-прыгаворы, прыказкі, паданні. У каляндарных прыказках і прымаўках знайшлі адлюстраванне ў першую чаргу назіранні над прыродай, шматвекавая земляробчая практыка селяніна, практычныя парады, філасофскія абагульненні («Сей авёс у гразь — будзеш, як князь», «Якое семя, такое і племя», «Прыйшоў багач, кідай рагач (саху), бяры сявеньку і сей памаленьку», «Селянін пры сасе — то краса» і інш.). Паэзія зямлі па сваёй сутнасці, каляндарныя песні ўзялі ад прыроды працоўна-вытворчага быту земляроба сваю выяўленчую палітру. Вобразы міфалагічныя, народжаныя фантазіяй суседнічаюць у ёй з пачэрпнутымі з рэальнага жыцця, створанымі па законах рэалістычнага мастацтва, вобразы сонца, вясны, жыта, купалкі, калядкі, спарыша, талакі, зімы — з вобразамі гаспадара-земляроба, хлопцаў, дзяўчат, жняі-пастацянкі і інш.

Каляндарна-абрадавая паэзія, асабліва велічальныя песні, вельмі шырока карыстаецца гіпербалай, беручы параўнанні з касмічнай і гаспадарчай сфер. Яна мае свае адметныя сталыя эпітэты *(вясна-**красна**, сонца **ярае**, раса **мядовая**, жыта **каласістае** і **ядраністае**, сярпы **сталёвыя** або **залатыя**, поле **руннае**, сяўня **залатая**, віно **зеляно**).*

Старажытны пласт каляндарнай паэзіі вылучаецца сцісласцю формы, эканомнасцю слова і яго выяўленчай выразнасцю. Царква і касцёл на працягу стагоддзяў усякім чынам стараліся ўздзейнічаць на старажытныя земляробчыя святы, абрады, звычаі, каляндарную песнятворчасць. Аднак уплыў хрысціянства закрануў народную паэзію толькі знешне. Народная паэтычная стыхія толькі часткова ўспрыняла паасобныя элементы хрысціянскай міфалогіі, перапрацаваўшы іх у адпаведнасці са стыхійна-матэрыялістычным бачаннем свету. Юрый, Мікола, Ілля, Пятро з песень гадавога круга — сялянеземляробы, раталі і сейбіты. І клопат іх пра жыта караністае ды ядраністае, пра Юр'еву расу ў дзень першага выгану статка ў поле, пра пагодлівы сенакос і спорны ўжон жыта, пра раі семяністыя ды мядзістыя — чыста сялянскі клопат. З карэннымі зменамі ў вытворчым укладзе сялянства ў савецкі час каляндарныя абрады страцілі першапачатковую магічную прадуцыравальную функцыю, перайшлі ў звычаі, забыліся, зберагаліся часцей у форме гульні, забавы. Строгая прымеркаванасць песень парушылася. Некаторыя з іх трапілі ў іншыя цыклы, перайшлі ў дзіцячы фальклор. Аднак асноўны песенны фонд каляндарнай паэзіі яшчэ даволі трывала захоўваецца ў памяці старэйшага пакалення. Жывучасць каляндарна-абрадавай паэзіі абумоўлена багатымі векавечнымі традыцыямі яе ў Беларусі, а таксама класічнай мастацкай завершанасцю. Менавіта высокая мастацкая вартасць лепшых здабыткаў каляндарнай паэзіі і мелодый перадвызначыла іх непераходнае значэнне для прафесійнай культуры — літаратуры, музыкі, выяўленчага мастацтва.

ЛІТАРАТУРА

Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць / Рэд. калегія: П. Ф. Глебка, І. В. Гутараў, М. Я. Грынблат. Мн., 1967. С. 61—77.

Беларуская народна-паэтычная творчасць / Пад рэд. М. Р. Ларчанкі. Мн., 1979. С. 135—192.

Валачобныя песні / Склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей, муз. часткі — В. І. Ялатаў. Мн., 1980.

Веснавыя песні / Склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей, муз. часткі — В. І. Ялатаў. Мн., 1979.

Восеньскія і талочныя песні / Склад. А. С. Ліс, уклад. і каменціраванне талочных песень С. Т. Асташэвіч, муз. часткі — В. І. Ялатаў. Мн., 1981.

Жніўныя песні / Уступ. арт., уклад., сістэматызацыя тэкстаў і каментарыі А. С. Ліса, напеваў — В. І. Ялатава. Мн., 1974.

Зімовыя песні: Калядкі і шчадроўкі / Уклад., сістэматызацыя тэкстаў, уступ. арт. і камент. А. І. Гурскага, уклад., сістэматызацыя, характарыстыка і рэдагаванне напеваў — З. Я. Мажэйка. Мн., 1975.

Купальскія і пятроўскія песні / Уклад. А. С. Ліса, С. Т. Асташэвіч, муз. часткі — Г. В. Гаўлай. Мн., 1985.

Земляробчы каляндар (абрады і звычаі). Мн., 1990.

КАЛЯНДАРНЫЯ АБРАДЫ

Каляды

Пад назваю «Коляды» ў нас разумеюць усе дні з 25 снежня да 7 студзеня, прычым у апошні дзень «толькі да абеду Каляда». Дзень напярэдадні Каляд называецца Куццёй. Назву гэту ён атрымаў ад стравы, якую абавязкова гатуюць у гэты дзень і падаюць на стол. На Куццю гатуюць і многа іншых страў, але самая галоўная з іх — куцця. Яе гатуюць з раніцы. Як толькі сонца зойдзе, уся сям'я адзяваецца па-святочнаму, стол засцілаюць белым абрусам, і потым ставіцца на сена на покуці куцця, якая застаецца там да вячэры. А калі сядуць вячэраць, дык стол засцілаюць сенам і ядуць спачатку іншыя стравы, а куццю пад канец. Акрамя гэтай Куцці адзначаюць яшчэ дзве іншыя: адну напярэдадні Новага года, якую называюць багатай (у іншых месцах — тоўстай), а другую напярэдадні Вадохрышча — яе называюць галоднай (або поснай). Апошнія дзве куцці адзначаюць з такой жа абраднасцю, як і першую, з той толькі розніцай, што на багатую гатуюць мясныя стравы і запрашаюць мароза «куццю есці», а на галодную ўсе стравы гатуюцца посныя і не ў такой колькасці, акрамя таго, «Каляду запісваюць». На багатую куццю, калі сама куцця ўжо стаіць на стале, гаспадар, калі адчыняецца акно, адчыняе яго і кліча:

— Мароз, мароз, ідзі куццю есці! Улетку не бывай, а ў зіму прабывай, бо мы будзем цябе біці жалезнымі пугамі!

Гэта паўтарае ён тры разы.

А «запісваюць Каляду» на галодную Куццю гэтак. Бяруць перад вячэрай кавалак крэйды і пішуць ёю крыжык на гаршку з куццёй і на хлебе, якім яна накрыта. Потым бяруць куццю, хлеб, крапіла з каласоў жыта, крыжык, зроблены з дрэва, і свянцоную ваду. Апошняй акрапляюць дом і ўсе будынкі каля яго, а крэйдай пішуць тры крыжы на верхнім і бакавых дзвярных і аконных вушаках і па аднаму на дзвярах, варотах і на кожнай сцяне, а ў хаце — таксама на дзвярах. Акрамя крыжа, крэсляць чалавека на белым кані і дрэвы, а некаторыя крэсляць яшчэ гусей, качак, кароў і інш. Крыжык і крапіла ўтыкаюць потым у зямлю ля варот гумна. Крыжы пішуць таму, што яны праганяюць «нячыстую сілу», засцерагаюць ад чараў і перадаюць здароўе таму, хто там жыве, дзе ўсё гэта накрэслена. Чалавек на кані азначае каляду, якая павінна ехаць далей.

Калі гатуюць куццю, то кожны раз насыпаюць у гаршчок аднолькава і па тым, як варыцца, мяркуюць аб будучым ураджаі. Так, калі на першую Куццю гаршчок з куццёй паўней, то лепшы ячмень будзе ранні, калі на другую, то лепшы ячмень будзе не зусім ранні, калі на трэцюю, то лепшы будзе позні ячмень. Звяртаюць увагу і на надвор'е ў гэты час: шэрань, іней і зоркавае неба прадказваюць ураджай грыбоў, грэчкі і раенне пчол; шэрань азначае грыбы, іней — грэчку, зоркавае неба — раі пчол.

Сена, якое было пад абрусам і на покуці пад куццёй, раніцай аддаюць свойскай жывёле. На багатую Куццю замест сена на стол пад абрус кладуць жытнюю салому. Пасля вячэры, не ўстаючы з-за стала, гэту салому малоцяць кулакамі, г. зн. б'юць імі па настольніку, пад якім яна ляжыць, а потым выцягваюць з-пад яго ж па адной саломінцы, па даўжыні якой адгадваюць, які будзе лён гэтым летам. Потым салому сабіраюць і старанна вышукваюць у ёй зярняты, якія змешваюць з насенным запасам у надзеі, што гэта засцеражэ каласы ад галаўні, а па колькасці знойдзеных зярнят мяркуюць аб якасці будучага ўраджаю. Саломай гэтай абвязваюць ігрушы, яблыні і іншыя пладовыя дрэвы, упэўненыя, што садавіна ад гэтага будзе лепшай, саладзейшай і добра ўродзіць. Далей — у гэты самы дзень ходзяць у хлеў з куццёй глядзець, як ляжаць цельныя каровы, і па тым, як ляжаць, адгадваюць, у які час сутак яны будуць цяліцца. Так, напрыклад, калі карова ляжыць галавою на поўдзень, то гэта паказвае, што яна ацеліцца днём, калі на захад — ноччу, а на ўсход — раніцаю. Пасля вячэры не мыюць лыжак, а звязваюць іх шарсцяной ніткай і пакідаюць на стале; гэта для таго, каб авечкі не адбіваліся

і прыходзілі ўсе з выгану дадому. Для таго каб куры несліся дома, а не дзе-небудзь на чужым двары, пасля вячэры робяць з чаго-небудзь абруч, кладуць яго на зямлю і потым выкладваюць у яго круг астаткі ад вячэры — куццю. Хто-небудзь са сваіх выходзіць у гэты час з хаты на двор і кажа пад акном: «Добры вечар!» З хаты адказваюць: «Добрае здароўе!» Той, што пад акном, пытаецца: «А дзе вашы куры нясуцца?» З хаты адказваюць: «Пад печчу!» Паўтараецца гэта тры разы. Потым выпускаюць курэй, якія павінны падабраць (скляваць) куццю ў крузе.

Звязваюць або спутваюць ножкі стала, каб жывёла не пераскоквала праз платы і не таптала пасеваў, а таксама і для таго, каб не ўцякалі пчаліныя раі.

Дзяўчаты на багатую Куццю варожаць пра свой лёс. Бяруць першы спечаны бліп, вымятаюць хату, смецце кладуць на засланку і нясуць на сметнік. Там становяцца на засланку са смеццем, ядуць бліп і ў гэты час прыслухоўваюцца, дзе брэшуць сабакі: з якога боку брэшуць, адтуль і жаніхі прыедуць.

Бяруць каноплі або проса, бягуць пад чыё-небудзь акно, там гэта высыпаюць і прыслухоўваюцца да размовы ў хаце. Калі пачуюць словы: «ступай», «хутка ідзі», «што засядзеўся», «чаму не йдзеш» і да т. п.,— да каго б яны ні адносіліся, то дзяўчына верыць, што яна ў надыходзячым годзе выйдзе замуж; калі данясуцца словы: «садзіся», «яшчэ рана», «пачакай трохі», «астаньcя» і да т. п., то гэта азначае, што дзяўчына замуж у гэтым годзе не выйдзе. А калі ж гаворка ідзе пра папа, свечку або пра дошкі, то гэта азначае, што дзяўчына або той, хто яе хоча сватаць, у гэтым годзе памрэ.

Ходзяць у хлеў і ловяць у цемнаце авечак, прытым калі зловіць барана — выйдзе замуж, а калі авечку — не. Бяруць на сваім двары, колькі можна захапіць у ахапку, дровы, нясуць у хату і пералічваюць паленне; абхватваюць рукамі частакол і лічаць калы або насыпаюць куцці, даюць есці пеўню і лічаць зярняты, якія засталіся, пры гэтым калі іх цотны лік — выйдзе замуж, калі не цотны — не выйдзе.

Дзяўчаты збіраюцца ў адну хату, пякуць з мукі булачкі велічынёй з курынае яечка, кладуць іх у рад і клічуць сабаку: чыю булачку ён схопіць першую, тая першая выйдзе замуж. Бяруць першую лыжку куцці ў час вячэры, але так, каб ніхто гэтага не заўважыў, і кладуць пад галаву сабе на ноч, спадзеючыся, што ноччу абавязкова прысніцца жаніх; калі сасніцца што-небудзь накшталт свечкі, дошкі, дамавіны, то або яна або ён павінны памерці.

Багатая Куцця называецца яшчэ «Шчадрэц», відаць, таму,

што ў гэты вечар хлопцы і дзяўчаты ходзяць шчадраваць, г. зн. ходзяць пад вокны, па хатах спяваць песні з прыпевам: «Шчодры вечар». Шчадраваць ходзяць звычайна невялікімі групамі: ад двух да пяці чалавек. За праспяваную песню гаспадары даюць па аднаму або па два бліны на кожнага або па паляніцы (маленькая булачка з жытняй, ці грэцкай мукі, ці з простай пшаніцы), а хто багацей, то і сала кусок, а іншыя — і грошы.

Некаторыя хлопцы робяць звязду і ходзяць з ёй. Ходзяць таксама і з «казой». Тут ужо ёсць скрыпка і бубен. Каза, вядома, не сапраўдная, галаву яе робяць з дрэва — з доўгімі рагамі, абшываюць латкамі са старога кажуха, прымацоўваюць палку. Потым выварочваюць вялікі кажух поўсцю наверх і ў адзін з рукавоў устаўляюць палку з «казой» і моцна завязваюць на «шыі». Адзін з найбольш спрытных хлопцаў, звычайна здатны танцор, носіць гэту «казу», а калі трэба спяваць, ён залазіць у кажух, рукамі бярэцца за палку і варочае «казінай» галавой.

Ходзяць у гэты вечар яшчэ адны спевакі, якія шчадруюць на царкву. Усё імі сабранае прадаюць і атрыманыя грошы аддаюць у царкву. Гэтыя, аднак, ходзяць са званочкам і з дазволу прыходскага свяшчэнніка. Яны спяваюць тыя ж песні, што і шчадроўшчыкі, якія ходзяць са «звяздой», але ім за песню даюць больш.

Вечары ў час Каляд усе лічацца святымі. Як толькі зойдзе сонца, усе перастаюць працаваць. У гэтыя вечары хлопцы і дзеўкі ў сувязі з тым, што няма ніякай работы, збіраюцца на так званыя ігрышчы. Наймаюць музыкаў — у складзе скрыпкі і бубна, хлопцы закупляюць гарэлку, піва і квас, а дзяўчаты прыносяць прадукты і гатуюць вячэру. На ігрышчах п'юць, весяляцца і танцуюць. А калі ў які вечар няма музыкі, то слухаюць апавяданні, байкі і казкі старых; загадваюць загадкі, спяваюць шчадроўкі або і такія песні, якія можна спяваць у любы час, гуляюць і ў розныя гульні.

Днём жа на Каляды не робяць той работы, якую звычайна робяць у любы іншы час. Так, нельга прасці, віць вяроўкі і ніткі, намотваць іх у клубок, круціць дзіркі, скручваць што-небудзь, звязваць, гнуць, плесці лапці або што-небудзь іншае, шыць, малаціць, калоць, шчапаць. І ўсё гэта таму, што такія работы маюць (паводле сялянскіх уяўленняў) шкодны ўплыў на прыплод дамашняй жывёлы: усё будзе нараджацца з крывымі нагамі, або сляпымі, або і яшчэ з якімі заганамі. Не вараць нічога, не кінуўшы папярэдне ў гаршчок косткі, хоць голай, дзеля таго, каб не радзілася што-небудзь без касцей.

Не пякуць на Каляды хлеба да Шчадраца і бліноў, каб не пякла печая (пякотка). Стараюцца, каб на першы дзень Каляд не прыйшла першай дзяўчына, таму што будуць сякеры ламацца. На Новы год стараюцца не піць вады, каб і летам не хацелася піць. Стараюцца на Каляды не разбіваць чаго-небудзь з посуду, каб наогул посуд не біўся ўвесь год. Смецце не выкідваюць на сметнік, а складваюць у жлукту, адкуль пасля Каляд выбіраюць і выносяць на балота, каб не было пустазелля ў полі.

Калі ж хто па неабходнасці або незнарок парушыць штонебудзь з прыведзеных вышэй звычаяў, устаноўленых даўніною, то, каб не шкодзіла, не здарылася чаго, на наступную раніцу рассякаюць у плятні перавясла, прыгаворваючы: «Што секлася — рассячыся, што вязалася — развяжыся, што шылася — расшыйся» і г. д., а на галодную Куццю ўстаюць да сонца, рассякаюць дзяркач на дробныя часткі і кідаюць каля будынкаў, дзе больш за ўсё свінні бегаюць.

Абраднасць Куцці

На першую Куццю жонцы з ранку трэба прыбраць хату ды пахаваць усе верацёны, каб, барані Божа, нідзе не відно было ніводнага ў час свята, бо яно летам скінецца верацяніцаю і, як пойдзеш у лес, палохаць будзе. Дзяўчаты павінны прыбраць свае прасніцы, каб Каляда не зрабіла ім пакасці ў кудзелі. А калі ўжо затопіш печ, то куццю сып у гаршчок як можна мерна ды прыглядайся, каторая куцця вырасце лепш: ці першая, ці другая, ці трэцяя. Тады трэба так і ячмень сеяць, каторая куцця лепш вырасце, значыць, той і ячмень будзе лепшы: ці першы, ці сярэдні, ці апошні. За сенам пасылаюць таго хлопца, які заўсёды валы пасе. Калі ён і згубіць валы палету, то шукаць іх не трэба, самі прыйдуць, таму што ён прынёс сена на куццю. Калі ж хочаш, каб у цябе рана квахталі куры, то прывяжы белы фартух, вазьмі ім з печы гаршчок з куццёю і, несучы на покуць, квахчы, як курыца, дзевяць раз «кво, кво, кво...» ды старайся, каб схапіць каго-небудзь за чуб: тады ў цябе будуць чубатыя кураняты. Сухую корку куцці збяры ў чарапок і захавай. Звараную куццю пастаў на сене і закрый хлебам...

Як прыйдзе вечар і запаляць агонь у хаце, а сям'я збярэцца вячэраць, адскубні палавіну сена, дзе стаіць куцця, і пасцялі на стол, пасля накрый белым абрусам. Гаспадар павінен прынесці пляшку гарэлкі і паставіць на стол. Потым гаспадару трэба ўзяць куццю з гаршком і абысці тройчы хату, затым

пастукаць у акно, а жонка з хаты павінна спытаць: «Хто там стукае?» Гаспадар адкажа: «Сам Бог стукае з цёплай, мокрай вясною, з гарачым небурлівым летам, з сухой і багатай восенню». А жонка павінна сказаць: «Просім да хаты».

На вячэру трэба, каб быў квас добры з грыбамі, а то і з рыбай, блінцы з макам і з мёдам, гарох з сытою ды ўзвар добры, як на радзіны, і куцця. Як садзяцца за стол, то гаспадар першым садзіцца на покуці (пад абразамі), а жонка насупраць яго на ўслоне, бо ёй трэба ўставаць, ставіць міскі на стол. Як пачнуць піць гарэлку, то гаспадар, наліўшы першую чарку, павінен сказаць: «Дай жа, Божа, за год даждаць Каляд у добрай радасці і карысці...». На апошнюю страву, куццю, гаспадар, зачэрпнуўшы першую лыжку, павінен пазваць мароза: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці! Каб ты не марозіў ячменю, пшаніцы, гароху, сачавіцы, проса і грэчкі і ўсяго, што мне трэба пасеяць». А гаспадыня, набраўшы ў лыжку куцці, павінна падысці да таго акна, што насупраць печы, пастукаць і сказаць: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці, каб не марозіў расады, агуркоў, гарбузоў, морквы і буракоў і ўсяго таго, што мне трэба пасадзіць і пасеяць». Дзеўкі павінны выцягваць сяннінкі з-пад абруса і мераць: чыя будзе даўжэйшая, у той і лён будзе лепшы. А як павячэраюць, то ўсе павінны адысці ад стала. Гаспадар, тройчы перахрысціўшыся, павінен сесці на покуці, а жонка насупраць яго і запытаць:

— Чы бачыш ты мяне?

А ён павінен сказаць:

— Не бачу!

— Каб жа ты не бачыў за стагамі, за капамі, за вазамі, за снапамі свету.

Тады гаспадар пытае ў жонкі:

— Баба! Чы бачыш ты мяне?

— Не бачу!

— Каб жа ты не бачыла за агуркамі, за гарбузамі, за капустай, за буракамі свету.

Затым жонка брала качаргу і штурхала гаспадара. А ён хутка падаў на лаўку і гаварыў:

— Дай, Божа, каб твае снапы так хутка падалі на ніве!

Пасля клаліся спаць. Дзеўкі варажылі пра жаніхоў. Сена з покуці не прымалі. Яно ляжала аж да апошняй Куцці. На другую Куццю зноў здымалі вяршок з ячменнай кашы і захоўвалі ў тым жа самым чарапку. Пяклі блінцы, якія давалі шчадроўнікам.

На галодную Куццю зноў клікалі мароза. Гэты дзень трэба было пасціць да зары дай напісаць крыжы на ўсіх дзвярах, вокнах і варотах дзеля таго, каб не ўвайшоў чорт у двор...

і каб сваркі не ўнёс у хату, каб сям'я жыла лагодна, а ў хлявах каб дамавік скаціны не чапаў. Можа чула, што дамавік ездзіць на конях і на валах, дай так замучыць, што і рукамі не гожа дакрануцца да іх, а ў гумнах і свірнах каб чорт нічога не хаваў, а то ён на пакасць як схавае што-небудзь, то хоць і перад вачыма, ды не знойдзеш,— а як будуць крыжы напісаны, то ён пакасці рабіць не пасмее. Пасля крапілі куткі святой вадой у хаце, бо так рабілі нашы бацькі, то і мы так будзем рабіць. На Вадохрышча хадзілі ў царкву ды стараліся як можна хутчэй вярнуцца дадому. Тады ты першая і з поля збярэш. Не забудзь унесці ў хату на Вадохрышча рана абручыка, пасыпаць куццю, што збірала ў чарапок, няхай куры яе паклююць, то не будуць губляць яек па чужых харомах, а будуць несціся ў сваім двары. І сена тое, на якім праз усе гэтыя Каляды стаяла куцця, аддаць па крошцы ўсякай скаціне, бо гэтае сена, не раўняючы, для яе так, як ля нас праскурка.

Мясцовыя народныя звычаі на Калядныя святы

Свята Каляд — адно з тых свят, якіх увесь хрысціянскі свет чакае з асаблівай радасцю і стараецца сустрэць найболей урачыста. І горад, і вёска, і стары і малы — усе рыхтуюцца сустрэць свята як мага лепш, але ў горадзе гэта не так прыкметна, як у вёсцы. У вёсцы падрыхтоўка да свята пачынаецца з першага ж тыдня посту. Кожную ноч з 2—3 гадзін апоўначы ўся вёска напаўняецца глухімі пераменлівымі ўдарамі, як бы падземным грукатам — гэта таўкуць куццю. Тыдні праз два стогны ступ сціхаюць, і ў тую ж пару пачынаецца роўны, аднастайны, які схіляе да сну, гоман жорнаў. Уся вёска робіцца падобнай да велізарнага вулля, у якім усё рухаецца, шуміць, трывожыцца, гудзе ў чаканні чагосьці вялікага, вельмі важнага. Але вось і гэта работа заканчваецца, і апошнія тыдні праходзяць у нарыхтаванні рыбы, грыбоў, маку; а ў апошнія дні мыюць, беляць, пякуць, вараць і г. д. На Куццю, калі ўжо ўся работа закончана, кожная сям'я пачынае мыцца. Затым, апрануўшыся па-святочнаму, усе дарослыя ідуць да вячэрні. Вярнуўшыся з царквы, прымаюцца за вячэру. Стол засцілаецца сенам і накрываецца белым абрусам. Пасля малітвы садзяцца за стол, п'юць спачатку гарэлку, а потым падаецца ежа ў такім прыблізна парадку: селядцы з ільняным алеем, боршч з рыбаю і грыбамі, рыба, пампушкі, кісель і, нарэшце, куцця. Вечарам і на працягу ўсёй ночы, на другі дзень Каляд ходзяць славельшчыкі, па-простанароднаму ка-

ляднікі. Звычай калядаваць існуе ў нашым народзе спрадвеку і заключаецца ў тым, што моладзь і мужчыны сярэдніх гадоў збіраюцца асобнымі групамі, бяруць з сабою скрыпача, пераходзячы з хаты ў хату, распяваюць песні, выказваюць сваю добразычлівасць і віншаванні кожнаму гаспадару — багаты ён ці бедны. Падышоўшы да вядомай хаты, калядоўшчыкі прыпыняюцца каля акна і хто-небудзь з іх пытаецца ў гаспадара: «Дзядзька, ці кажаш спяваці, ці так каляду даці?» Калі гаспадар дазваляе, то і пачынаюць спяваць свае простанародныя песні. З такіх песень некаторыя даволі характэрныя і заслугоўваюць увагі. Пасля выканання песень калядоўшчыкі звяртаюцца да гаспадара з прыпевамі і куплетамі:

Пахадзі, дзядзька, каля кваскі,
Пашукай, дзядзька, нам каўбаскі,
Пахадзі, дзядзька, каля печкі,
Пашукай, дзядзька, нам панечкі.

У кожнай сялянскай сям'і для калядоўшчыкаў пякуць асобныя невялікія булкі хлеба, пірагі, даюць сала, каўбасу, а падчас і грошы. Адпусціць іх без нічога ніхто не адважваецца, і кожны гаспадар абавязкова павінен што-небудзь даць, інакш калядоўшчыкі нагавораць яму вострых жартаў і стануць пець з'едлівыя песні. Абышоўшы такім чынам спачатку сваю вёску, калядоўшчыкі адпраўляюцца ў суседнія, іншы раз вёрст за 10—15 і болей. Сабраныя прадукты затым прадаюцца і ўтаргаваныя грошы дзеляць паміж сабою. У некаторых месцах на гэтыя грошы купляюць іконы і ахвяруюць цэрквам. Час ад Каляд да Вадохрышча называюць Трыма каралямі, у гэтыя дні вечарамі ніхто не працуе, таму што вечары гэтыя лічацца святымі вечарамі.

Пярэдадзень Новага года называецца «Шчодры вечар», «Шчадруха». Ён мае для нашых сялян такое ж значэнне, якое для велікарусаў вечар на Вадохрышча. Усе дзяўчаты займаюцца варажбой.

Найбольш распаўсюджана варажба па калах, хоць існуе выліванне на ваду растопленага воску ці волава, падслухоўванне, аб чым гавораць, і многае іншае. Пры варажбе па калах дзяўчаты бяруць міску з каўбасой ці з кашай, выходзяць на двор і ставяць яе ў тым месцы, куды выкідваюць смецце (на сметніку), а самі бягуць да плота, і, хапаючыся рукой за калы па парадку, кожны раз паўтараюць: «Удавец, маладзец»; апошні кол і выявіць, удавец ці маладзец. Тады ж прыслухоўваюцца да брэху сабак: у якім баку забрэша сабака, адтуль, значыць, і з'явіцца жаніх. Кашу і каўбасу аддаюць на другі

дзень старцам, але большую частку, калі варажбіткі бегаюць вакол плота, хлопцы, якія падпільноўваюць, выкрадваюць у іх. У гэты ж дзень, як гавораць сяляне, «ходзяць па шчадрусе», г. зн. таксама калядуюць, як на першы і другі дзень Каляд, толькі песні спяваюцца ўжо трохі іншыя, больш свецкія:

Шчодры вечар, добры вечар,
Пане гаспадару да цебе!
Маеш хлопцаў пышных, гарных,
Яны ў стадоле пшаніцу мераць.
Намералі трыццаць шанкоў,—
То табе.
А другія штыры — нам, каляднічкам,
Каляды.

Акрамя ўсяго гэтага, напярэдадні Новага года існуе звычай красці. Пагэтаму кожнага, хто прыходзіць у хату вечарам у гэты дзень, прымаюць за злодзея і хаваюць рэчы. Крадуць не толькі рэчы, але і скаціну. Усе, хто ўкраў, на другі дзень прыносяць і прыводзяць да гаспадара ўкрадзенае, і гаспадар павінен іх частаваць. Гэтым звычаем часам карыстаюцца сапраўдныя злодзеі, і тады крадзенае прападае.

На Вадохрышча, ці па-простанароднаму «на вадзяную Каляду», устаноўлены такі звычай. Пасля агульнай малітвы перад вячэрай гаспадыня дома ставіць у невялікай місцы куццю з макам ці мёдам, кладзе туды адну лыжку і падае гаспадару кавалачак крэйды. Гаспадар бярэ прынесенае, хрысціцца і пачынае пісаць крэйдай крыжы; перш на вокнах, дзвярах і печы, у сярэдзіне дома, а затым знадворку малюе па 3—4 крыжыкі на вокнах і дзвярах жылога дома і на дзвярах усіх сваіх будынкаў. У гэты час усе хатнія размяшчаюцца за сталом і сядзяць у чаканні гаспадара. Падышоўшы да апошняга акна (запечнае акно) і намаляваўшы крыжыкі, гаспадар пытаецца: «Баба, а дзе будзем лён сеяць?» Прысутныя ў хаце адказваюць: «Там, дзе Бог ходзіць». Вярнуўшыся ў хату, гаспадар ставіць на стол узятую ім куццю і, пакаштаваўшы яе тры разы, прапануе таксама і ўсім астатнім. Пасля гэтага падаюць тыя ж стравы і ў тым жа парадку, як перад Калядамі.

У канцы вячэры варожаць, як лён уродзіць у наступным годзе. Для гэтага хто-небудзь з жадаючых устае з-за стала і, стаўшы да яго спіной, не гледзячы, цягне з-пад абруса сяннінку да трох раз. Па даўжыні сцяблінак і мяркуюць пра будучы ўраджай. Рэшткі куцці на другі дзень даюць патроху ўсёй скаціне. Такія агульныя звычаі нашых сялян на Каляды.

Масленіца ў вёсцы

У вёсцы Масленіца, уласна, пачынаецца ў чацвер. Спачатку мужычок скупіцца: першыя два-тры дні на Масленічным тыдні яго гаспадыня пячэ бліны аржаныя, аўсяныя ці ячныя, а пасля, калі работа зусім спыніцца і настануць дні «развітальныя», мужык, за малым выключэннем, есць бліны з куплёнай грэцкай мукі. Сялянскі блінец рэзка адрозніваецца ад бліна іншых саслоўяў і па сваім аб'ёме, і па сваім змесце: цяжкі, наздраваты. Звычайна на стол падаецца цэлы стос бліноў. Гаспадар разразае гэты стос крыж-накрыж, на чатыры часткі, а затым кожны член сям'і бярэ чвэрць бліна, скручвае яго і апускае ў міску з тварагом і разагрэтым каровіным маслам. Добрая вясковая баба ўмее цудоўна зберагчы летні «пятроўскі» (г. зн. назапашаны ў час Пятроўскага посту) тварог, які яна злёгку пераціpае з соллю, кладзе ў які-небудзь посуд і зверху залівае гарачым каровіным маслам. У такім выглядзе тварог можа доўгі час захоўвацца несапсаваным. Бедны мужык, гаспадыня якога не змагла назапасіць тварагу, змазвае свае бліны посным канапляным алеем.

Разам з блінам падаецца на стол і селядзец. Гарэлку на Масленіцу пачынаюць піць з пятніцы. Даўней быў добры звычай: у апошні дзень Масленіцы «развітвацца». Вечарам, пасля вячэры, гаспадар садзіўся «на кут» у строгім і набожным настроі духу. Да яго па чарзе падыходзілі спачатку браты і сыны, а пасля і жанчыны і, кланяючыся да зямлі, гаварылі: «Прасці, бацька родны, калі чым саграшыў перад табою, справай ці языком». Пасля таго як усе сямейнікі канчалі з абрадам «развітання», гаспадар сыходзіў са свайго месца і ў сваю чаргу кланяўся да зямлі ўсёй сваёй сямейцы, просячы таксама даравання за ўсе свае грахі і памылкі.

Сваты, кумы і радня бойка ездзяць на сваіх санках адзін да другога. Прыцемкам збіраецца на вуліцы гурт моладзі. Песні спяваюць, скачуць. Масленіцу праводзяць.

У Краснінскім павеце па вёсках існаваў такі звычай, які меў прамыя адносіны да Масленіцы. У панядзелак на Масленічным тыдні збіраюцца бабы з усёй вёскі, бяруць пояс ці папругу і прывязваюць да аднаго канца яго невялікі, але тоўсты абрубак дрэва, а другі канец пояса прывязваюць да нагі халастога хлопца, які ім сустракаўся, як бы ў пакаранне за тое, што ён не жаніўся за мінулы Мясаед. Калі хлопец не пажадае насіць гэты цяжар за сабою ўвесь дзень, ён павінен адкупіцца і даць бабам на пернікі некалькі манет. Тое самае праробілася і з дзяўчатамі, калі яны не выйшлі ў Мясаед замуж, хоць гэта адбылося і не па іх віне.

Вялікдзень на Беларусі

Тыдзень св. Вялікадня ў простага народа называецца Велікодным, вялікім і радасным. Першы дзень Вялікадня ў беларусаў называецца «Вялікадзень». Народ чуе ў царкве, што свята Вялікадня вышэй за ўсе іншыя, свята са святаў і ўрачыстасць з урачыстасцей. З другога боку, святкаванне Вялікадня ранняй вясною, калі толькі што пачынае ажываць прырода, надае гэтаму святу ў вачах селяніна нейкае асаблівае значэнне. Разам са святам сяляне сустракаюць пачатак палявых работ — галоўную крыніцу іх дабрабыту, галоўную сваю эканамічную задачу.

З Велікоднага тыдня пачынаюцца летнія гулянні, ваджэнне карагодаў і закліканне вясны. На першы дзень Вялікадня ў некаторых мясцовасцях Беларусі сяляне ходзяць глядзець на «ігру» сонца. Дарослыя мужчыны падымаюцца на званіцы глядзець, як будзе «іграць» сонца, а жанчыны і дзеці назіраюць на ўзгорках і стрэхах хат. З'яўленне сонца на ясным небе і яго «ігранне» вяшчае добрае лета, добры ўраджай, шчаслівыя вяселлі. Бабулі пры ўсходзе сонца мыюцца з пасудзіны, у якую кладзецца золата, срэбра і чырвонае яйка, спадзеючыся разбагацець і памаладзець. Дзяды расчэсваюць валасы з прыгаворам: «Колькі на галаве валасоў, няхай столькі будзе ўнукаў». У панядзелак святога тыдня на Беларусі выходзяць на могілкі «пахрыстосавацца» са сваімі памерлымі і пагаварыць аб жыцці-быцці. Даўней выходзілі на могілкі ўсёй сям'ёй і заставаліся да вечара. У аўторак спраўляюць «купалішча»: тых, хто прасыпае «заутраню», абліваюць вадой.

З Велікоднага тыдня паўсюль пачынаецца ваджэнне карагодаў, і першыя з іх, веснавыя, працягваюцца да канца Фаміна тыдня, які завуць таксама «краснай горкай», Радаўніцай. У іншых месцах «краснай горкай» завуць толькі панядзелак гэтага тыдня, Радаўніцай — аўторак. Беларусы Фамін панядзелак называюць «магілкамі» «грабкамі», «праводзінамі»; на «красную горку» яны спяваюць свае вяснянкі — ходзяць з песнямі па вуліцах; дзеці ходзяць па хатах славіць «яр» і «зялёначку».

У некаторых рускіх губернях заклікаюць першы дождж. З паданняў вядома, што раней у закліканні дажджу ўдзельнічалі людзі ўсіх узростаў, цяпер жа гэтым займаюцца адны дзеці.

Рэшткі гэтага звычаю сустракаюцца і ў Беларусі. Дзеці прыгаворваюць:

Ідзі, ідзі, дожджыку,
Звару табе боршчыку,
Цэбрам, вядром, дайніцаю
Над усякаю пашніцаю.

На Беларусі спецыяльна велікоднай забавай служыць гульня ў яйкі...

На другі і трэці дзень Вялікадня ў Беларусі па вёсках ходзяць валачобнікі (ад слова «валачыцца»). Так называюцца велікодныя ўслаўляльнікі-спевакі. Валачобнікі захаваліся толькі на Беларусі, гэты велікодны звычай даўно ўжо знік ва ўкраінскай вёсцы, а ў Расіі яго, здаецца, ніколі не існавала...

Валачобнікі гуртам блукаюць з вёскі ў вёску, з хаты ў хату, усюды пад акном, а часам і ў хаце, у выпадку ветлівага прыёму іх гаспадарамі, спяваюць розныя валачобныя песні, атрымліваючы за гэта валачобнае, г. зн. фарбаваныя яйкі ці што-небудзь з велікодных страў, а часам і грошы. Усе гэтыя падачкі збіраюць у адно месца і дзеляць між сабой пароўну або наладжваюць агульнае баляванне валачобнікаў. Падышоўшы да хаты, валачобнікі трохкратна вітаюць гаспадароў, потым пачынаюць пець песню і перш-наперш гаспадару.

Святкаванне Вялікадня працягваецца толькі тры дні, а астатнія дні Велікоднага тыдня беларус не лічыць святам, хоць і ўстрымліваецца ад работы, але па-свойму прымхліва. Так, у сераду не праводзяць палявых работ, каб град не пабіў збажыны. Гэты дзень называецца Градавай серадою. У пятніцу не працуюць дзеля царквы, бо кожная першая пятніца пасля вялікага свята лічыцца нейкім асобым днём.

Святы Юрый на Беларусі

Свята св. Юр'я, памяць якога ўшаноўваюць 23 красавіка, належыць да аднаго з самых вялікіх свят народных, таму што Юрый лічыцца заступнікам сельскай гаспадаркі. Напярэдадні свята неабходна на ноч выводзіць коней у поле, таму што ў гэты час з'яўляецца першая веснавая раса, якая вельмі карысна для хатняй рабочай жывёлы, апекуном якой лічыцца той самы Юрый...

Абраду вываду коней у поле ў ноч на Юр'я папярэднічаюць такія падрыхтоўчыя цырыманіі. Гаспадар з усёй сваёй сям'ёй старанна моліцца дома перад іконай св. Георгія, каб гэты святы захаваў у цэласці яго коней. Затым па колькасці коней бярэ яйкі і накіроўваецца да стайні, у якой знаходзяцца яго коні. Абыходзіць яе кругом тры разы, а затым кладзе

яйкі пад парог. Тры разы перахрысціўшыся, ён адчыняе ўваходныя дзверы стайні і пры ўваходзе гаворыць:

Прыйшла Юр'ева раса,
Не дам вам аўса!

Падыходзіць па чарзе да кожнага каня, гладзіць па ўсёй спіне, надзявае на кожнага вяровачную аброць, выводзіць з канюшні, прычым стараецца правай нагой ступіць на парог стайні, дзе раней ім былі пакладзены яйкі. У гэтым-та месцы і знаходзіцца «нячыстая сіла», якая ўсімі сваімі сродкамі стараецца шкодзіць росту і здароўю коней, а на гэта ёй дадзена права толькі ў ноч на Юр'я. Калі гаспадар ступіць на парог пры вывадзе коней правай нагой, то д'ябальская сіла абясшкоджана на працягу цэлага года.

Пасля вываду коней з канюшні ці хлява гаспадар перадае іх работніку-начлежніку, прычым дае апошняму пару кілбас, кварту пшанічнай мукі, кусок сала, некалькі яек і грошы.

Другая, больш урачыстая абраднасць здзяйснялася дзеля каровінага статка. Напярэдадні Юр'ева дня гаспадыні-сялянкі пякуць хлеб-каравай, загортваюць яго ў чысты белы абрус і аддаюць гаспадару, які кладзе яго ў бярозавы кашэль. На світанні ён выходзіць з хаты з гэтым кашалём, абыходзіць усе свае палі, падышоўшы да апошняй паласы, засеянай жытам, дастае з кашаля хлеб-каравай, кладзе яго ў жытнёвую рунь і параўноўвае вышыню сцябла з караваем. Калі апошні хаваецца ў жыце, то ў гэтым годзе жыта будзе добрае. Пасля малітвы ён вяртаецца з караваем дадому, разразае яго на кавалкі па колькасці членаў сям'і, і ўсе ядуць яго.

У іншых жа мясцовасцях гэтыя абрады праходзяць пры больш урачыстых абставінах. Сям'я гаспадара раніцай нашча адпраўляецца ў абход па сваіх палях, захапіўшы з сабою каравай, кілбас, яек, гарэлку і косці ад асвячонай велікоднай смажаніны ці ў натуральным выглядзе, ці ў выглядзе парашку (перапаленых касцей). Прыйшоўшы на ніву, яны качаюцца па ўсходах, каб абкрапіцца «Юр'евай расой», прычым спяваюць:

Здраствуй, ніва святая!
Паздраўляем з хлебам-соллю
І з святым Юр'ем,
Каб Бог найвысшы і святы Юр'я
Пацешыў нас пагодаю і здароўем.

Гаспадару пры гэтым жадаюць:

Піва рабіць,
Сына жаніць.

Гарэлку гнаць,
Дочку замуж даць.

І пачынаецца частаванне. Касцямі абтыкаюць мяжу, а калі яны ў парашку, то абсыпаюць тыя месцы, дзе расце пустазелле, каб яно ніколі не расло. Звычай абыходжання палёў, паводле народнага падання, тлумачыцца тым, што ў гэты дзень можна падслухаць, аб чым гаворыць жыта. Па надвор'і, якое будзе ў дзень Юр'я, сяляне мяркуюць аб ураджаі. Калі ідзе буйны дождж, то будзе расці вялікае жыта, а калі дождж будзе толькі капаць, то будуць увесь год кароў даіць. Калі будзе раса, то будзе даволі коням аўса. Зразумела, шмат з гэтых народных абрадаў цяпер ужо адышлі ў вобласць паданняў, але ўсё ж просты беларус яшчэ жыве рэшткамі сваёй роднай старасветчыны. Прыкладам можа быць звычай, які паўсюдна і зараз існуе, выганяць у поле хатнюю жывёлу вярбою, асвячонаю ў Вербную нядзелю. Яе ўтыкаюць у зямлю каля мяжы, і гэта ахоўвае ніву ад граду.

Дзень Тройцы

Дзень св. Тройцы беларусы называюць Сёмухай. Як жа святкавалася ў старажытнасці Сёмуха і наколькі абрады, прыстасаваныя да гэтага свята, захаваліся да нашых дзён сярод беларусаў? Гэта было свята ў гонар вясны як апекуна шлюбаў і любоўных асалод, вясны-нявесты, упрыгожанай кветкамі і зеленню, якая ішла насустрач свайму жаніху — Сёміку. Таму і свята гэта лічылася лепшым у годзе часам для кахання і для варажбы аб будучым сямейным шчасці. Сам Сёмік, па паданнях, паказваўся вясёлым, ласкавым юнаком, вялікім прыяцелем Масленіцы, а святкаванні, прысвечаныя яму, пачыналіся з таго, што дзяўчаты і жанчыны выходзілі на луг з зялёнымі галінкамі ў руках, танцавалі каля пастаўленай у полі статуі вясны ці Сёміка, упрыгожанай зеленню і кветкамі, і пелі песні ў гонар кахання, якія прыносілі ім асалоду. Гэты звычай, які перажыў стагоддзі і пакаленні, цалкам захаваўся сярод беларусаў. У Пінскім павеце ў гэты дзень сялянскія дзяўчаты выбіралі са свайго асяроддзя самую прыгожую сяброўку, абвязвалі яе бярозавымі і кляновымі галінкамі і пад назвай «куст» з адпаведнымі песнямі вадзілі па вуліцах і дварах. Затым нашы продкі збіраліся каля вады, якая прабуджалася з прыходам вясны, і там праводзілі варожбы: упрыгожаныя вянкамі, знакам кахання і шлюбнага жыцця, яны дапытвалі гэтую прарочую стыхію аб сваім будучым лёсе, пускалі па вадзе свае вянкі і назіралі за

іх рухам, прамывалі вочы і ва ўдзячнасць за «прадказанне» кідалі ў яе розныя дары, прынесеныя з сабою. І гэтыя абрады не выміралі. У гэты ж дзень сялянскія дзяўчаты адпраўляліся ў лес «вянкі завіваць». Яны бралі з сабою каўбасу, яйкі, смажылі ў лесе яечню і, паеўшы, прымаліся за варажбу. Кожная выбірала дзве невялікія бярозкі і, звязаўшы іх вярхушкі ў выглядзе вянка, праходзіла пад імі і спявала:

Пойдзем, дзевачкі, у луг гуляць,
Зялёныя вянкі завіваць.
Заўём вянкі на ўсе святкі,
На ўсе святкі, на ўсе празнічкі.

Пасля гэтага адломлівалі са сваіх бярозак галінкі, рабілі з іх вянкі і, спяваючы:

Выхвалялася бяроза,
Што ў яе лісточак зялёненек,
Што ў яе вецвікі да долу.
Як зачуў, пачуў серы дуб:
— Не хваліся,— кажэць бярозе,—
Не сама бяроза расцілася,
Расціў бярозу Гасподзь Бог,
Зеляніў лісточкі дожджычак.
Выхвалялася дзевачка,
Што ў яе спадніца да долу.
Як зачуў, пачуў дзяцінка:
— Не сама, дзевачка, спраўляла,
Спраўляла табе мамачка.
— А ў мяне касіца да пояса,
Не сама касіцу расціла,
Расціла касу мамачка,—

кідалі свае вянкі ў ваду і варажылі аб будучым. Калі вянок паплыве — добрая прыкмета, а калі патоне — дрэнная.

Праз тыдзень прыходзілі развіваць вянкі. Ішлі і развівалі бярозкі, сплеценыя ў выглядзе вянка, пры гэтым заўважалі: калі чый вянок не засох — таму доўга жыць, а калі засох — таму смерць блізка. Пры развіванні вянкоў спявалі:

На Тройцу мы вянкі завілі,
На Разгары — развілі,
Гарэлачкі папілі
І яешню з'елі.

Звычай гэты не ўсюды на Беларусі захаваўся аднолькавым чынам, кожная мясцовасць уносіла ў яго свае рысы. Так, напрыклад, у іншых месцах не звязвалі бярозкі, а вешалі на іх вянкі і спявалі:

Русалачкі зямляначкі
На дуб лезлі, кару грызлі,
Звaліліся, забіліся.
Тройца!

Часам кожная дзяўчына пускала на ваду не адзін вянок, а два. Адным вянком загадвала на сябе, другім — на хлопца, якога яна хацела б мець сваім мужам. Глядзела, ці сходзяцца іх вянкі, ці не. Па гэтым жа яна і вырашала, збудуцца яе жаданні ці не.

Зелень і кветкі адыгрывалі галоўную ролю на вясёлым святкаванні вясны. Яны служылі абавязковымі атрыбутамі пры ўсіх абрадах і ўшанаваннях гэтай любімай багіні і, прайшоўшы горан стагоддзяў, якія захавалі нам паданні старажытнасці, адлюстраваліся ў нашых бярозках, у звычаях і г. д.

«Куст»

У Пінскім павеце на другі дзень Тройцы збіраюцца дзяўчаты з усёй вёскі, выбіраюць самую прыгожую і маладую са сваёй кампаніі і надзяваюць на яе ўбранне, сплеценае з маладых бярозавых і кляновых галінак з лісцем. Прыбраная такім чынам атрымлівае назву «куст». Дзяўчаты становяцца парамі па ўзросце: старэйшыя ідуць уперадзе, пасля — малодшыя, а нарэшце — дзеці, і ў такім парадку, з «кустом» уперадзе ідуць на панскі двор ці да знаёмых. Свята гэта выключна дзявоцкае — рэдка прымаюць у іх удзел замужнія жанчыны ці маладзіцы. У такім выпадку яны займаюць месца ў першым радзе за «кустом». Мужчыны ж зусім не прымаюць удзел. Ідучы ў двор ці да якога-небудзь гаспадара, выконваюць «куставыя» песні:

Да чэраз сяло Багданаўскае
Ішло войска ўсё ж дзявоцкае,
Да камяньчане не здзівіліся,
Што ў Багданаўцы нарадзіліся.
Бог вам даў, багданавачкі,
Што ў вас кусты ўсё кляновыя,
А вяночкі ўсё ж пярловыя.
А ў нас кусты ўсё лазовыя,
А вяночкі ўсё ж бярозавыя.

У двары ці ў гаспадара:

На гары, на новай крамяніцы
Танцавалі дзеўкі, маладзіцы.
Там ягамосць да па перадочку ходзіць,

Сваю імаць да за белу ручку водзіць.
Ты імаць, гардуеш ты мною,
Што быці штогод із табою.

Паненцы ці дачцэ гаспадара:

Каля таго да зялёнага куста
Парасла сачавічанька густа.
А каля дуба дуброва зялёна.
Да па той дуброве да Агапка хадзіла,
На ёй сукня ў дробненькія хванды,
Да любілі яе да багатыя паны.
На ёй сукня ў дарагія пасаманы,
Да любілі яе ненарокам, папраўдзе.

Сыну:

Каля таго да зялёнага куста
Парасла сачавічанька густа.
Хто ж тую сачавічаньку парве,
Той сабе красную панну азьме.
Наш Сямёнка сачавічаньку парве.
Ён сабе красную панну азьме.

У час танцаў спяваюцца наступныя песні:

Ой, пайду я пад гай зеляненькі,
Сустрэне мяне там казак маладзенькі,
Стане мяне да дарогі пытаці,
Да я, маладая, не ўмею адказаці...
Не ў свайго ты бацькі, дзеўка, узрасла,
Што не ведаеш, куды дарожанька пайшла.
Сказала б табе: у калінавы масты,
Да шкада будзе, што да бацюхны ў госці,
Сказала б табе: пад гай зеляненькі,
Да шкада будзе, што казак маладзенькі.
Мяне ж маці не на тое ўрадзіла,
Каб я казакаў па дарогах вадзіла.
Урадзіла мяне маці для сваёй выгоды,
Штоб я хадзіла з дзевачкамі ў ягоды,
Штоб падавала да крынічнай воды.
Пахілілася сухая ляшчынанька,
Палюбіліся да абое маладыя,
Пахавалі аднае гадзіны.
Казак ляжыць у зялёненькай дуброве,
Дзяўчына ляжыць у бацюхны ў каморы.
Па казаку чорны воран крача,
Па дзяўчыне бацька, матка плача.
Па казаку дуброва зашумела,
Па дзяўчыне ўся радзіна зажалела.
Па казаку ўсе лугі зашумелі,
Па дзяўчыне ўсе званы зазванілі.

Пры танцах спявалася і шмат іншых, прымеркаваных да «куста» песень.

У двары і ў знаёмых звычайна даюць «кусту» грошы ці што-небудзь з харчовых прыпасаў — вяндліну, хлеб, сыр і інш. Усё сабранае нясуць у карчму ці хату якога-небудзь гаспадара і, уваходзячы, гавораць:

Вот тут кусту есці, піці даці,
Вот тут кусту да на станцыі стаяці.

Тут наладжваецца вечарынка на сабраныя «кустом» грошы і прыпасы, якая працягваецца ўсю ноч.

Дзень Івана Купалы

Ні адзін дзень у годзе не абстаўлены, здаецца, такімі забабоннымі расказамі, як Купала (24 чэрвеня па ст.ст.). У гэтых расказах, праўда, ёсць шмат падобнага са светапоглядам велікарускім і наогул славянскім, але, думаем, падобная з'ява даказвае толькі супольнасць заходнерусаў з астатнім велікарускім светам. Гавораць, што ноччу на Купалу душы памёршых (русалак) прачынаюцца ад доўгага сну і купаюцца. Пасля, калі ўзыдзе сонца, яны быццам сушацца пры яго цяпле і святле. Калі сонца нібы ў тумане, то русалкі, значыць, закрылі яго. Раніцою ў дзень Івана Купалы звычайна, на думку народа, «іграе» сонца. Гавораць, што яно раздзяляецца на шматлікія рознакаляровыя кругі, якія то сыходзяцца, то разыходзяцца, ствараючы пры гэтым цудоўную гульню колераў. Асабліва дзеці цікавяцца, каб убачыць падобную з'яву, і ўстаюць для гэтага па магчымасці раней. Але звычайна нічога не бачаць ці бачаць толькі тое, што намалюе ім іх настрой, вядомым чынам іх уяўленне. У іншых месцах проста гавораць, што немагчыма бачыць, як «іграе» сонца. Яно не дазваляе, кляне — вы, маўляў, людзі, цэлы год сорак раз гуляеце, дайце мне пагуляць хоць адзін раз.

На Купалу дзяўчаты і хлопцы збіраюць рознага роду кветкі, травы, наломліваюць галінак дубу, рабіны і ўсё гэта прыносяць пасля ў царкву, каб асвяціць. З асвячонай зелені ўюць вянкі і захоўваюць іх як сродак супраць нашэсця ліхой сілы. Думаюць, што ў гэты дзень здзяйсняецца якісьці пераварот у свеце, цяпер быццам расхаджваюць па зямлі ведзьмы, духі. Дрэвы, звяры і наогул усё жывое нібы вядуць паміж сабою гаворку і г. д.

Гавораць, што ўсе гэтыя цуды можна бачыць, можна зразумець гаворку звяроў, знайсці скарб, варта толькі дагледзець,

як будзе цвісці папараць, якая, на думку сялян, цвіце ў ноч на Купалу, і авалодаць гэтай кветкай. Апошняе дастаецца надзвычай цяжка. Перад захадам сонца трэба пайсці ў лес і абавязкова ў такую глуш, куды ніякім чынам не можа пранікнуць спеў пеўня, якога, на думку народа, моцна баіцца д'ябал. Адшукаўшы прыгоднае месца, дзе, зразумела, павінна быць і папараць, чалавек уладкоўваецца на ўсю ноч. У гэты час яму неабходна чытаць «боскую» кнігу пры запаленай «грамніцы», таму што д'ябал будзе прымаць усе меры, каб якнебудзь напалохаць яго і як бы выбіць з занятай пазіцыі. Ён будзе кідацца на чалавека ў выглядзе розных звяроў, будзе, відаць, затапляць яго вадою, падпаўзаць да яго ў выглядзе страшных змей, будзе пазбаўляць слыху пранізлівым гікам і піскам. Чалавеку будзе здавацца, што на яго валяцца велізарныя дрэвы, і ўсё гэта для таго, каб толькі прымусіць яго да ўцёкаў. Патрэбны, гавораць, незвычайная прысутнасць духу і цвёрдасць волі, каб устаяць супраць падобнага наслання. Гавораць, быццам бы і д'ябал быў неразумным, пакуль не авалодаў кветкай папараці. Таму ён і баіцца так, каб чалавек не падзяліў яго веды. Сродкам супраць яго нападкаў, акрамя малітваў, з'яўляецца яшчэ і наступнае: трэба абрысаваць круг вакол сябе крэйдай, якая была асвячона ў «дзень богаз'яўлення». Д'ябал ніякім чынам не пераступіць гэтай свяшчэннай лініі.

Расказваюць, што нейкаму шчасліўцу ўдалося авалодаць кветкай папараці. Было гэта так. У аднаго чалавека напярэдадні Купалы заблудзіліся валы. Ён пайшоў шукаць іх у лес ды і сам заблудзіўся. Трапіў ён у такую глуш, што не меў магчымасці ісці далей, і паняволі прыйшлося прыпыніцца, каб адпачыць. Выявілася, што, заблудзіўшыся, лёг сярод папараці. Ноччу, калі адцвіла папараць, а цвіце яна, па ўяўленні народа, адно імгненне, кветка яе папала селяніну ў лапаць. Прачнуўшыся, селянін адчуў сябе зусім іншым чалавекам. Ён разумеў шапаценне дрэў, чуў, што гавораць у яго дома, бачыў усё, што там адбываецца, як бы перад сабою, бачыў тое месца, дзе знаходзяцца яго валы, бачыў багацці зямлі, скарбы. Ён вырашыў пайсці за валамі, хутчэй загнаць іх дамоў і адправіцца адкрываць скарбы. Ужо ён гнаў дамоў валоў, але тут адчуў, што горача яго нагам, і, каб аблегчыць сябе і хутчэй дабрацца дамоў, ён скінуў лапці, не падазраючы, што ў іх знаходзіцца галоўная і адзіная прычына яго ўсёбачання. Скідаючы лапці, ён выпусціў з іх магічную кветку і ў тую ж хвіліну згубіў усе свае веды і разуменне: стаў ранейшым селянінам з няясным успамінам аб нядаўняй сваёй унутранай вялікасці.

У гэты дзень асабліва баяцца, каб ведзьмы не сапсавалі кароў. Яшчэ задоўга да гэтага паміж гаспадынямі ідзе размова, што хутка, маўляў, наступіць час змяншэння малака. Думаюць, што ведзьмы тады збіраюцца ў адно месца на Лысую гару ў Кіеве і там раяцца, куды і якая з іх павінна адправіцца за малаком. Паколькі некаторыя гаспадары ў гэты час выганяюць сваю жывёлу на пашу вельмі рана, то ведзьмы дзейнічаюць тут наступным чынам. На луг, дзе пасуцца каровы, яны з'яўляюцца таксама рана, бяруць ручнік, цягаюць яго па расе і гавораць, паказваючы на тую карову, у якой жадаюць адабраць малако: «Як раса ўбывае з-пад ручніка, так каб убыло малако ў гэтай каровы» і «Як раса ўбіраецца ў мой ручнік, так няхай і малако пераходзіць ад гэтай каровы і ўбіраецца ў вымя маёй каровы». Пасля ведзьма выкручвае ручнік і ваду, што з'явілася, дае выпіць карове. Малако пасля гэтага будзе ўбываць і пяройдзе да каровы ведзьмы. Гавораць, што іншы раз хтосьці пайменна ўсіх кароў заве ў лес. На гэты кліч каровы моцна рвуцца. Значыць, тут ёсць ведзьма. Трэба ўсімі сіламі не пускаць туды кароў: інакш ведзьма іх сапсуе.

Каб хоць колькі-небудзь засцерагчы сваіх кароў ад такога зла, іх пояць часам расою, сабранай у агародзе, або пераганяюць жывёлу праз раскладзены агонь. Яшчэ мацней баяцца сяляне, каб ведзьма не забралася да кароў у хлеў. З гэтай мэтай яны стараюцца як бы перагарадзіць ёй усе шляхі да свайго жылля. На варотах кладуць крапіву, каб ведзьма апяклася, а часам забіваюць касу, каб яна адрэзала сабе хвост. У хлявах затыкаюць усе дзіркі і шчыліны, над дзвярыма ў хляве вешаюць свечку, якая была асвечана ў царкве. Гавораць, што ведзьмы яе баяцца, і хоць са злосці грызуць яе, але перагрызці не могуць. На вуглах вешаюць вянкі з асвячонага зелля, вешаюць іх таксама ў дзвярах, кладуць на стрэхі, на вокны. Шчыліны ў дзвярах затыкаюць, таму што думаюць, быццам ведзьмы пераварочваюцца ў яшчарак і жаб і такім чынам могуць забрацца ў хлеў. На лбе ў кароў намазваюць дзёгцем крыж. Ісціну існавання ведзьмаў сяляне пацвярджаюць мясцовым паданнем.

У дзень Іаана Прадцечы сяляне наказваюць пастухам, каб на гэты раз яны не пераганялі сваёй жывёлы «праз мяжу», г. зн. праз тую мяжу, якая аддзяляе палі адной вёскі ад другой: там, гавораць, збіраюцца ведзьмы, пераварочваюцца ў жаб і, падпоўзшы пад кароў, адбіраюць малако. Аднойчы дамовіліся некалькі хлапчукоў не паслухаць сваіх гаспадароў і пагнаць жывёлу ў забароненае месца «за мяжу». Адзін хлопчык, назіраючы за жывёлай, заўважыў, што паміж каро-

вамі поўзае вялізная жаба. Ён зразумеў, што гэта ведзьма, узяў палку, завастрыў яе, быццам долата, і, наблізіўшыся да жабы, сказаў: «Ах ты, ведзьма, ты прыйшла за малаком да маіх кароў, вось я цябе пачастую!» Ён прыцэліўся і так лоўка стукнуў па жабе палкаю, што адсек ёй пярэднюю лапу. Параненая жаба запішчала і папаўзла без нагі. Хлопчык расказаў аб гэтай гісторыі сваім равеснікам. Яны пасмяяліся, пажартавалі — на гэтым усё, відаць, і закончылася б. Але калі гэты хлопчык вярнуўся вечарам з жывёлай дадому, то тут жа яму сказалі, што нядаўна хтосьці яго хроснай маці адсек руку. Успомніўся хлопчыку той выпадак, і ён тут жа паспяшаўся наведаць сваю хросную маці. Не паспеў ён уступіць у хату, як старая, сабраўшы апошнія сілы, схапіла качаргу і здаровай рукою шарахнула малому па галаве. «Ах ты, шалун, неслух,— сказала яна,— ты прыйшоў яшчэ сюды здзекавацца нада мною? З-за цябе я адыходжу на той свет!» Усе, хто прысутнічаў, былі здзіўлены падобным відовішчам і прасілі хлопчыка растлумачыць ім прычыну такога прыёму яго хроснаю маці. Хлопчык, зразумела, расказаў, што здарылася ў полі з несапраўднай жабай. Хатнія даведаліся, што была ў іх за старая. Хутка яна сканала, а паданне пра яе захавалася.

Жывёла ў гэты дзень вяртаецца з пашы ўвенчаная кветкамі, якія застаюцца на ёй на працягу ўсёй ночы. На другі дзень вянкі з гэтых кветак асвячаюцца ў царкве і захоўваюцца ў гаспадароў як ахоўныя сродкі супраць жывёльных хвароб. Коней у ноч перад Іванам не пускаюць на начлег. Думаюць, што тады злосныя духі маюць асабліва шмат клопатаў і спраў, адчаго і рады бываюць, калі пападаецца добры рысак, каб пры яго садзейнічанні хутчэй зрабіць сваю справу...

Вечарам на Купалу сялянскія хлопцы і дзяўчаты наладжваюць рознага роду гульні. Выбраўшы папярэдне месца па агульнай згодзе, яны познім вечарам выходзяць з вёскі са спевамі розных песень:

— Ой, маладая маладзіца,
Ой, выйдзі, выйдзі на вуліцу,
Ой, развядзі нам купальніцу.
— Ой, як я магу выхадзіці,
Вам купальніцу развадзіці?
У мяне свёкарка — не баценька,
У мяне свякроўка — не мацюхна,
У мяне дзеверы — не брацікі,
У мяне залованькі — не сястронкі,
У мяне дзіця маленькае.
Што дзіця пісне,
То кулаком сцісне.
Што дзіця квякне,

То кулаком гракне.
Некаму ўстаці, яго пакалыхаці.

Ідучы па дарозе, хлопцы і дзяўчаты набіраюць крыху дроў, запальваюць з аднаго канца доўгія палкі і з імі часам праходзяць праз усю вёску. Прыйшоўшы ў вызначанае месца, моладзь кладзе «купалу» — вялікі агонь з дроў, і пачынаюць тут рознага роду перакульванні, гульні, танцы і песні:

Сягоння ў нас Купала... То-то-то!*
Сам Бог агонь расклаў,

Усіх святых к сабе зазваў,
Толькі няма Іллі з Пятром,
Пайшоў Ілля каля жыта...

Або:

Купальнай ночы
Выпеклі ведзьме вочы,
Каб у ночы не хадзіла,
Каб расы не збірала,
Каб у печы не сушыла,
Каб у жорнах не малола,
Каб кашы не варыла,
Каб дзяцей не карміла,
Каб вядзьмят не пладзіла.

Зашалясціць што-небудзь удалечыні — вясёлы гурт адразу сціхне, але тут жа хвіліннае маўчанне перапыняецца яшчэ болей гучным крыкам: «Ведзьма ідзе!» Раздаюцца вясёлыя крыкі і рогат. Пачынаецца скаканне праз агонь, каб адным хутчэй жаніцца, другім — выйсці замуж, а там ізноў палілі-ся песні:

Звала Купала Іллю на ігрышча. То-то-то!*
— Хадзі, Ілюшча, ка мне на ігрышча.
— Не маю часу, Купалічка.
Гэту ночку мне не спаці,
Нада жыта ўсяго пільнаваці,
Каб змяя заломаў не ламала,
У жыце карэнні не капала,
У кароў малака не адбірала.
Адбяры, Божа, таму ручкі, ножкі,

* Прыпеў «То-то-то!» паўтараецца ў канцы кожнага радка.

Выдзеры, сава, са ілба вочкі,
Каб не відзеў, не чараваў,
Каб не хадзіў, а прапаў.

У некаторых месцах (в. Гарадок Вілейскага п. Віленскай губ.) у час вяртання назад з гульні дзяўчаты абыходзілі свае засеяныя палі і па вуглах іх утыкалі па адной галінцы. Думалі, што гэтым загародзяць ведзьме доступ на ніву і такім чынам засцерагуць пасевы ад той шкоды, якую б яна магла зрабіць. Ці па канцах нівы забівалі асінавыя калы, на верх якіх клалі каменьчыкі. У гэтым бачылі засцерагальны сродак ад граду. Часам крапяць яшчэ свае пасевы асвячонай вадой. Лічаць гэта засцерагальным сродкам і супраць ведзьмаў і супраць рознага роду насякомых.

Абрады сялян Віцебскай і Мінскай губерняў пры ўборцы хлеба з палёў

Уборка хлеба з палёў складае на Беларусі адну з найважнейшых падзей.

...Пры ўборцы хлеба з палёў захоўваюцца наступныя абрады: 1) пакрыванне поля, 2) зажынкі і 3) дажынкі.

Першы і другі абрады звычайна здзяйсняюцца пры пачатку жніва ў кожнага селяніна, багатага і беднага, таму што не звязаны з вялікімі выдаткамі; трэці — пры канчатковай уборцы з поля жыта (а ў некаторых гэты ж абрад святкуецца пасля поўнай уборкі ўсяго хлеба з поля) і спраўляецца толькі ў багатых сялян і пераважна на панскім двары, таму што такі абрад патрабуе немалых расходаў для пачастунку значнай колькасці жней.

Пакрыванне поля. У Беларусі жыта звычайна даспявае ў пачатку месяца ліпеня, і кожны селянін імкнецца як мага хутчэй пачаць жніво, каб жыта не пераспела. Пачынаюць жаць нават крыху зеленаватае жыта, думаючы, што з такога бялейшая бывае мука; няхай лепей, кажуць, жыта даспее ў снапах, чым пераспее ў каласах. Жнуць звычайна жанчыны і дзяўчаты (а не мужчыны, як бывае ў велікарускіх губернях), а таму і ў жніўных абрадах удзельнічаюць выключна яны адны; нават пры частаванні вечарам амаль не бывае мужчын.

Раніцай, да ўсходу сонца, адпраўляецца на поле маладзіца, пераважна нядаўняя замужніца, і ў прысутнасці некалькіх дзяўчат нажынае невялікі снапок жыта і, абвіўшы яго наметкаю або проста ручніком і нават кавалкам новага палатна, падкідае ўверх, прыгаворваючы:

Пакрыла ніўку
На добрую спажыўку;
Парадзі, Божа,
Наша збожжа!..

Затым дзяўчаты спяваюць, пляскаючы ў далоні і кружачыся:

Пашлі, Божа, многа збожжа!
Нарадзі хлеба пры дарозе:
Штоб было ўсім гожа
І не пуста на кожным возе.
Крыта, крыта!
Поўна, сыта!
Божа, памажы,
Хлеба ўрадзі!..

Потым маладзіца і дзяўчаты адпраўляюцца дамоў, г. зн. да таго селяніна, чыё поле пакрывалі. Пры ўваходзе ў хату ўсе разам спяваюць:

Крыта, крыта!
Поўна, сыта!
Божа, памажы,
Хлеба ўрадзі!

Маладзіца падае снапок гаспадыні, якая дарыць яе грашыма і палатнінай; потым разам з дзяўчатамі падыходзіць да гаспадара з паклонам. Гаспадар частуе іх гарэлкаю і запрашае на дажынкі. Тым і заканчваецца пакрыванне поля.

Пакрыванне поля робіцца амаль у кожнага селяніна Віцебскай і Мінскай губерняў; думаюць, што ў выпадку нездзяйснення гэтага абраду ўборка хлеба будзе няўдалая.

Зажынкі. Праз два дні пасля пакрывання поля ідуць зажынкі. Вечарам, на захад сонца, гаспадарова дачка разам з сяброўкамі адпраўляецца на поле. Выходзячы з дому, яны спяваюць:

Выпраўляюцца малажайкі
На спраўленне зажынак,
Паглядзець на дабро гаспадаркі
Да прыняць поўны жыта абірак...
Да гатоў жа, гатоў, гаспадыня,
Сустрэчанне ім шчырае,
Расчыняй, калі ёсць скрыня,
Да бяры нясі мёд з вырая...

Гаспадыня ім дае яечню, сыр і гарэлку, з чым дзяўчаты

і адпраўляюцца на поле*. Прыйшоўшы на месца жніва і падсілкаваўшыся, дзяўчаты зразаюць па каласку і звязваюць невялічкі снапок, які вядомы пад назвай гаспадара-снапка; потым акрапляюць яго гарэлкаю і з ім адпраўляюцца ў гаспадарову хату, прыпяваючы:

Галубок-снапок
Нажалі малажайкі
Да іх белыя ручайкі.
Месяц месячыку!
Свяці ж нам дарожачку:
Што б мы не заблудзілі,
Снапочка не згубілі,
Бо наш снапок красны,
Як месячык ясны,
Яшчэ высшы ад плота,
Яшчэ дарожшы ад злота,
Яшчэ высшы ад гары,
Ясней ад зары.

Увайшоўшы ў хату, гаспадарова дачка з паклонам падносіць бацьку снапок-гаспадарок. Гаспадар, падкінуўшы ўверх снапок, ставіць яго на покуці пад абразамі; пад снапок кладзе чатыры медныя манеты і кланяецца.

Паставіўшы гаспадар-снапок, гаспадар частуе дзяўчат гарэлкаю, а гаспадыня дорыць іх пшанічнымі булачкамі; дзяўчаты спяваюць:

Слаўся, гаспадарку, слаўся,
Што малажаек не стыжаўся,
Як яны не стыжалі,
Ніўку тваю зажыналі...

Затым дзяўчаты разыходзяцца. Пры развітанні гаспадар з гаспадыняй запрашаюць іх на дажынкі. Зажыначны снапок захоўваецца «на куце», пад абразамі, да Прачыстай; напярэдадні яе снапок абмалочваюць, і зерне прыносяць у царкву для свянцання; гэтым жа зернем засяваюць свежаўзаранае для азімага хлеба поле — некаторыя на Прачыстую, а іншыя на другі ці на трэці дзень пасля свянцання; пры засеўках звоняць манетамі, якія былі пакладзены пад снапком...

Дажынкі. Дажынкі бываюць розныя: багатыя і небагатыя. Для лепшага ўяўлення пра гэты абрад апішам дажынкі заможнага селяніна, якія адрозніваюцца ад панскіх дажынак тым, што пры першых захоўваецца больш народнасці і праста-

* Чаго не з'ядуць і не вып'юць, тое закопваюць на тым месцы, дзе зжата жыта для снапка.

ты, чым пры другіх. Дажынкі ў сялян маюць аблічча старажытнаславянскага быту і знакаміты свабоднай нязмушанасцю жыцця...

Звычайна ў той дзень, калі назначаецца канчатковая ўборка жыта, збіраюцца на полі пэўнага селяніна (па запрашэнні яго дачкі ці жонкі напярэдадні дажынак) мноства жней, большай часткай бясплатна пажаць, адзіна дзеля таго, каб павесяліцца ў гасціннага гаспадара. Колькасць жней залежыць ад гаспадаровай гасціннасці або прыхільнасці да яго суседзяў. Некаторыя жнеі прыходзяць нават незапрошанымі і з другіх вёсак... Гаспадар вельмі рады такім жнеям і іх старанне цэніць больш за гатоўнасць запрошаных работніц. На дажынкі збіраюцца большай часткай бясплатна; платных жа жней збіраюць у такіх выпадках, калі ў адзін і той жа дзень назначаюцца дажынкі ў некалькіх гаспадароў, а між тым чаму-небудзь пэўнаму гаспадару трэба неадкладна скончыць уборку жыта ў гэты самы дзень.

Збіраюцца на поле, як толькі рассвітае, і, калі жней шмат у параўнанні з невялікім участкам пасеянага жыта, жнуць паволі, не спяшаючыся; калі ж жней мала, жнуць як мага хутчэй, каб дажаць усё жыта.

Старшая між жнеямі размяркоўвае месца, каму дзе жаць, усе падпарадкоўваюцца і ахвотна выконваюць яе распараджэнні... Старшую называюць пачынальніцай, а астатніх — памагальніцамі.

Прыступаючы да жніва, пачынальніца запявае:

Наша ніўка залатая,
Нашы сярпы вострыя,
Наш пан гаспадар налягае,
Што б мы не былі чорствыя...

Памагальніцы працягваюць:

— Ой, чыё ж то поле
Зажаўцелае стаіць?
— Янукова поле
Зажаўцелае стаіць!
Жнейкі маладыя,
Сярпы залатыя...
Да зялён бор, зялёны
Над усімі барамі,
Да славен наш гаспадар
Над усімі гаспадарамі.
У нашага гаспадара
Куна на дварэ іграе,
Сабаля вызывае:
— Саболю, саболю!

Пагуляем з табою.
Развесялім свайго гаспадара
І гаспадыню маладую,
І чалядку вясёлую.

Калі ж жнуць на панскім полі, спяваюць наступную песню:

Золата маё, золата
На таку малочана,
На стале насыпана.
Хто золата палічыць,
Той на чужу старану не паедзець...
Да наш пан маладзенькі
На чужынку не паедзець,
Пашлець служку маладога
І каня варанога.
Конік будзе гарцаваці,
Служка паганяці.
Наш пан маладзенькі,
Пад ім конь вараненькі,
Выехаў на ніўку
У шчаслівую гадзінку,
Стаў жнеек лічыць,
Стаў Бога хваліць:
— Слава табе, Божа,
Маё жыта будзе ў стозе.

Песні складаюць галоўную асаблівасць дажынак. Ні адзін абрад не багаты так песнямі, як абрад дажынак. І ўсе гэтыя песні больш або менш маюць адносіны да той нагоды, з якой іх спяваюць.

Дык вось праз некаторы час (не больш двух гадзін), нажаўшы па дзесятку снапоў, жнеі спяваюць наступную песню, у якой гаворыцца, што яны ўжо сто коп нажалі:

Добрая ніўка была,
Сто коп жыта зрадзіла
І яшчэ хваліцца,
Што на капу калоссе валіцца...
Запрагайце волы,
Паедзем на дубровы
Хвойкі выцінаць,
Копкі падпіраць.

Калі настае час полудня (10 ці 11 гадзін раніцы), гаспадары прыносяць усякай ежы і піцця: на гэты раз нічога не шкадуюць...

Полудзень цягнецца гадзіны дзве: вясёлая шумная гаворка, звонкі рогат, песні, жарты, пляскання ў далоні не змаўкаюць на працягу ўсяго полудня. Полудневыя, або, так сказаць, за-

стольныя, песні не маюць асобага значэння. Прыводзім адну для ўзору:

Ой, паслала мяне маці
Спелае жыта жаці,
Ой, нуце, жнейкі,
Не будзьце санейкі!
Ой, я жытка не жала,
У баразёнцы ляжала,
Ой, нуце...
Наехалі чужы жнейкі,
Нашлі мяне ў баразейке,
Ой, нуце...
Зажурылася Кацярына,
Што не зжата жыціна,
Ой, нуце...
Праз твае русы валосы
Выкасілі ўсе пакосы,
Ой, нуце...
Цераз твае чорны бровы
Выкасілі ўсе дубровы,
Цераз твае белы рукі
Выкасілі ўсе прылукі
І жыціну выжалі,
І Кацярыну палюбілі,
Ой, нуце, жнейкі,
Не будзьце санейкі,
Не рана пачалі,
Трэба, што б багата уцялі...

Пасля абеду бяруцца зноў жаць і зноў з песнямі. Гадзіны цераз тры па полудні гаспадары прывозяць падвячорак з халоднай стравы і закускі. Як пры абедзе, так і ў час падвячорка гаспадары частуюць жней гарэлкаю.

Пад вечар жнеі дружна бяруцца за працу і, падганяючы адна другую рознымі прыказкамі і прымаўкамі, спяваюць песню:

Ой, мілы Божа
Нам дапаможа?
Ці не выжнем?
Сонейка нізка,
Вячэрайка блізка,
Ай, не выжнем!
Пташкі злятайце,
Снапочкі знашайце,
Ай, мілы Божа
Нам дапаможа?
Ці не зносім?
Саколікі злятайце,
Копачкі складайце,
Ой, мілы Божа
Нам дапаможа?
Зязюлейка кукуе,
Копачкі рахуе,
Не злічыць!
Ой, мілы Божа
Нам дапаможа?
Сонейка нізка,
Вячэрайка блізка,
Не злічыць!..

Нарэшце, калі дажынаюць ужо апошні загон, кожная са жней адкладае па каласку для аднаго агульнага снапа, так

званага дажыначнага. Сабраўшы такім чынам дастатковую колькасць каласоў і звязаўшы дажыначны сноп, жнеі дзеляцца на дзве палавіны: старыя і замужнія жанчыны зносяць і складаюць у копы снапы, а дзяўчаты, сабраўшыся ў кружок, доўга раяцца, каго выбраць багіняю (талакою). Выбраўшы ў багіні прыгожую сяброўку, жнеі-дзяўчаты дажынаюць пакінутую лапінку жыта і з гэтага сплятаюць вялікі вянок і аздабляюць яго рознымі кветкамі і стужкамі.

Старыя жнеі спяваюць:

У нас сягоння вайна была,
Усё поле звaявалі,
Змялі поле мяцёлкамі,
Ідзём дамоў вясёлкамі.
Ніўка, ніўка, ніўка,
Аддай нашу сілку.
Мы свайму гаспадару
Да зрабілі славу:
Жытачка нажалі,
У снапы павязалі,
У копы паскладалі,
Мы свайму гаспадару
Да зрабілі славу.
Ой, гаспадарачку наш!
Дажыначкаў час!..

У гэты самы час дзяўчаты-жнеі, дажынаючы жыта для вянка, спяваюць:

Канец ніўцы, канец!
Упляцём гаспадару вянец,
Да ўжо жніво ў канца,
Нуце, дзевачкі, да вянца!
Кружыліся, кружыліся,
Ужо мы жытка дажаліся,
Дажаліся дзевачкі
Да яснага сонейка.

Звіўшы вянок, дзяўчаты ўскладаюць яго на галаву «багіні», а ў рукі даюць дажыначны сноп, пакрыты доўгім белым пакрывалам. Потым дзяўчаты абкружаюць яе ланцужком і скачуць, прыпяваючы:

Кружком, дзевачкі, кружком,
К гаспадару з паклонам.
Не самі мы ідзём,
Мы вяночак нясём,
У нашай гаспадыні
Поўна хлеба ў адрыні,
Трэба пакланіцца,
Штоб к ёй дабыцца.

У гэты час да дзяўчат далучаюцца старыя і замужнія жнеі, і, узначаленыя «багіняю», усе разам адпраўляюцца да гаспадаровай хаты. Пры гэтым спяваюць:

Да гудзець поле, гудзець,
Багіня з поля ідзець.
Гаспадарку, не ўлякайся,
У святлічку не схавайся.
Выкаці бочку піва,
А другую гарэлкі...
Мы жнейкі не жаўнеркі,
Не пап'ём усёй гарэлкі.
Наша гаспадыня міла
Дасць нам белага сыра.
Сіва пава лятала,
Крыламі двор мятала,
Спадзявалася вянца
Да свайго гумянца!

Песні не моўкнуць усю дарогу. Праходзячы праз вёску, жнеі-дзяўчаты прытанцоўваюць, старыя пяюць:

Будзь сяло весяло,
Бо мы вянок несямо
З добрага жыта,
Вельмі красавіта...

Потым усе разам спяваюць:

Адчыняй, гаспадару, свой двор,
Бо вядзём увесь жніўны збор.
Ай, нажалі, навязалі копачак,
Як на небе звёздачак...
Спраў жа нам, гаспадару, дажынкі,
Бо мы страцілі для цябе свае сілкі.
Адчыні нам хатку,
Упусці багіню-матку.
Забі нам, гаспадару, барана,
Забі нам вялікага быка,
Забі нам свае гускі,
Не пажалуй цялушкі!..
Не крыйся ж, гаспадару, перад намі,
Бо мы відзім цябе вакнамі.
Выйдзі да нас,
Выкупі вянок у нас!..

Гаспадар і гаспадыня, пачуўшы песні жней, выходзяць з хаты і сустракаюць іх на дварэ хлебам-сольлю. «Багіня» выступае наперад і, пакланіўшыся гаспадару, кладзе ля ног яго дажыначны сноп, які гаспадыня акрапляе «святой» вадою, а вянок перадаюць яму ў рукі, прыгаворваючы:

— Паздароў, Божа, гаспадару! Прынеслі табе вянок з шырокага поля, з ядронага жыта. Гаспадар свайго гаспадарства не страціць, нам за вянок заплаціць, хоць чырвоныя боты для нашай ахвоты — жыту на ўраджай, гаспадару на доўгі век. Гаспадару вянок, а нам гарэлкі збанок!

Гаспадар бярэ вянок з паклонам «багіні», а гаспадыня дорыць ёй грошы і боты...

У той час, як «багіня» вітае гаспадароў, усе жнеі пяюць:

Прынеслі вам плён
За ўсіх чатырох старон,
Прынеслі вам збор
З-пад зялёных гор,
І з гары, з-пад гары
На гаспадарскія двары,
З падвароў да каморы
На ўсялякія зборы...

З'яўляецца музыка, і гаспадары пры гуках хатняга аркестра і прытанцоўванні дзяўчат вядуць «багіню» ў хату. Вянок і дажыначны сноп нясе якая-небудзь дзяўчына. Увайшоўшы ў хату, гаспадары ставяць дажыначны сноп на покуці, пад абразамі, разам з зажыначным, дзе ён стаіць часам цэлы год, а вянок вешаюць на абразы. Затым садзяць «багіню» на першым месцы, побач з ёю садзяцца гаспадар і іншыя жнеі. Гаспадыня кланяецца «багіні». «Багіня», не кранаючыся з месца, гаворыць:

Гаспадынечка, нут-ка!
Звівайся нам хутка,
Так як мы звіваліся,
Каля ніўкі напажыналіся!..

Жнеі тут жа спяваюць:

Гаспадыньцы сорам,
Што сядзяць так жнейкі за столам.
Сілы ўсе яны растраслі,
Шыпкі на руках нараслі.
Трэба нам гарэлкі,
Штоб разагнуць касцелкі...
Дайце ж нам гарэлкі
З новай барэлкі!..
Казала нам ніўка,
Ёсць у каморы гарэлка,
У каморы на паліцы,
У маляванай шкляніцы...

Пасля такой просьбы «багіні» і жней гаспадыня прыносіць у вядры гарэлку, і гаспадар частуе ёю работніц. Першая чарка

прапануецца «багіні», затым падаюць гарачыя стравы.

У час пачастунку музы́ка, седзячы воддаль, іграе розныя п'есы сваёй кампазіцыі...

Час ад часу ў прамежках змены страў некаторыя ахвотніцы спяваюць, але прыпевы не што іншае, як урыўкі або нават некалькі слоў з цэлых песень.

Пасля вячэры старыя застаюцца ў хаце разам з гаспадаром і гаспадыняй, а дзяўчаты і маладзіцы разам з дачкою і іншымі гаспадаровымі родзічамі выходзяць на двор, дзе, упрасіўшы музы́ку іграць, пачынаюць скакаць народныя мясцовыя танцы. І танцамі і музы́кай распараджаецца «багіня»: музы́ка не адважваецца адказаць ёй ні ў якай просьбе. Любімыя танцы падчас дажынак розныя, але часцей іншых паўтараюцца «Талакуха», «Журавель», «Мяцеліца» і «Скакуха». Усе яны больш-менш падобныя адзін на другі. Адна «Талакуха» некалькі адрозніваецца ад іншых танцаў. Асаблівасць яе ў тым, што спачатку наперадзе ўсіх кружыцца «багіня», а іншыя дзяўчаты, стоячы паўкругам, топаюць нагамі і падскокваюць, не сыходзячы са свайго месца і размахваючы хусткамі. Потым усе дзяўчаты даганяюць «багіню» і, абкружыўшы яе, кланяюцца ёй, а яна, седзячы на зямлі, спявае:

Да іграла сонейка,
Небагата іграла,
У хмарку схавалася,
Дажджу баялася...
Камарочкі вы мае,
Не кусайце вы мяне,
А кусайце вы жнеек,
Што мне ўстаць неяк...

Пасля гэтага дзяўчаты ўсе разам садзяцца ля «багіні»...

Між тым гаспадыня не забывае дзяўчат і час ад часу выносіць ім гарэлку і закускі. Знамянальна, што пры падобных абрадах ніколі не бывае п'янства. П'юць няшмат для весялосці, але ніколі для таго, каб зваліцца з ног.

Танцы цягнуцца да позняй ночы. «Багіня» першая напамінае жнеям, што пара ісці дамоў, і вось уся грамада старых і маладых пачынае развітвацца з гаспадарамі. На развітанне гаспадар і гаспадыня яшчэ раз частуюць усіх жней гарэлкай, закускамі і дзякуюць за аказаную ім паслугу, просячы не адмовіць у дапамозе і ў наступнае лета. Жнеі дзякуюць гаспадарам за пачастунак, прычым «багіня», звяртаючыся да гаспадара, кажа:

Дай Божа табе, нябожа,
Абсяваць, насяваць,
А нам жаць, дажынаць!

Тут гаспадар накідае на галаву «багіні» пакрывала з дажыначнага снапа і адорвае яе пшанічным хлебам.

Грамада жней разыходзіцца па хатах з песнямі і ў суправаджэнні музы́кі... Нягледзячы на тое што музы́ка замучаны дарэшты, «багіня» ўсё ж патрабуе, каб ён праводзіў яе да самай хаты разам з іншымі дзяўчатамі-жнеямі. Нярэдка здараецца, што жнеі вяртаюцца дамоў на світанні і праз гадзіну адпраўляюцца на панскую або на сваю работу.

Жніўныя абрады

Зажынкі. Жніво пачынаецца з жыта таму, што яно раней за іншую збажыну даспявае. Таму на яго долю пераважна і прыпадае больш абрадаў, пачынаючы з зажынак. Падобныя ў цэлым сярод рускага насельніцтва (Шэйн, паводле афіцыйнай тэрміналогіі, так называў і беларусаў.— *А. Л.*) Паўночна-Заходняга краю, гэтыя абрады адрозніваюцца па мясцовасцях некаторымі падрабязнасцямі, якія выразна сведчаць аб старажытнасці іх паходжання.

...У Гарадоцкім павеце Віцебскай губерні перад пачаткам жніва гаспадар кладзе на стол буханку хлеба, зверху якога ставіць салонку з соллю і, накрыўшы ўсё гэта чыстым абрусам, акрапляе свянцонай вадой. У такім выглядзе хлеб-соль застаецца на стале ўвесь першы дзень зажынак, на працягу якога неаднаразова паўтараюцца выпіўкі і танцы.

У Гродзенскай губерні зажынкі паўсюдна робяцца ў аўторак або чацвер, але найчасцей у суботу пад вечар, да захаду сонца.

Адпраўляючыся на зажынкі, гаспадыня бярэ акрамя простага аржанога хлеба і цэлы, знарок на гэты выпадак падрыхтаваны сыр і, прыйшоўшы на ніву, кладзе ўсё гэта на край загона, дзе збіраецца зрабіць зажын. Першую жменю зжатага жыта яна кладзе асобна, а зверху яе — прынесеныя сыр і хлеб. Затым, нажаўшы снапоў з дзесяць, гаспадыня вяртаецца дамоў, распяваючы песні ўсю дарогу. Хлеб і сыр яна прыносіць з сабой назад некранутымі і кладзе іх на стол, дзе яны толькі перад вячэрай з'ядаюцца сям'ёй. Першы ж сноп нажатага жыта, перавязаны чырвонай ніткай, гаспадыня ставіць на покуць, за абразы, дзе ён і застаецца да будучага года.

У Бельскім павеце Смаленскай губерні да жніва жыта прыступаюць так. Гаспадыня адпраўляецца на зажын адна або ў суправаджэнні сваіх нявестак. Бярэ з сабой некалькі яек, невялікі кавалак хлеба з соллю і сала. Прыступаючы да зажыну першага снапа, прыгаворвае: «Стань, мой сноп, на тыся-

чу коп», а затым гаспадыня, зрэзаўшы некалькі каласоў, звязвае іх у пучок і адносіць яго дамоў. Там яна кладзе яго пад абразы, дзе ён ляжыць аж да малацьбы. Калі ж пачнуць малаціць першы пасад жыта, то яго бяруць і кладуць сушыць у ёўню разам з іншымі снапамі.

У некаторых мясцовасцях Гродзенскага павета жыта зажынае абавязкова мужчына, каб, як там кажуць сяляне, лета не было гнілое. Першы сноп зжатага жыта таксама прыносяць у хату, ставяць на покуці і накрываюць ручніком. У гэты дзень рыхтуюць святочную вячэру.

Дажынкі, або **Абжынкі**. У агульных рысах дажынкі, як і іншыя жніўныя абрады, адбываюцца амаль аднолькавым чынам на ўсёй Беларусі, адрозніваючыся толькі некаторымі, больш ці менш цікавымі асаблівасцямі па мясцовасцях.

а) Так, напрыклад, у Віцебскай губерні і павеце, заканчваючы жытняе жніво, адна частка жней, зрэзаўшы жменю жытніх сцяблін з каласамі, пачынае звіваць з іх вянок; у той жа час другая частка, аддзяліўшыся ад іх, садзіцца на зямлю і спявае адпаведную нагодзе песню. Першая з пявунняў садзіцца на кукішкі перад знарок пакінутым на полі кустом аржаных сцяблін з каласамі і, працягваючы пець з астатнімі, поліць, г. зн. вырывае траву, якая засталася ў недажатым кусце жыта. Гэта работа працягваецца і канчаецца адначасова з падрыхтоўкай вянка. Калі ўсё гатова, палольніца вырывае адну сцябліну і ёй звязвае ў пучок увесь куст ля самых каласоў, што і завецца «барадой», а ў сярэдзіну ачышчанага ад травы куста кладзе акраец аржанога хлеба з соллю. Усё гэта дзеянне называецца «завіваць бараду».

Закончыўшы сваю работу, усе ўстаюць, і жняя-завадатар, менавіта тая, што палола куст і «завівала бараду», бярэ вянок з рук тых, хто яго плёў, і кладзе сабе на галаву. Жнеі, узначаленыя ёю, адпраўляюцца павольным крокам у хату гаспадара і дарогаю спяваюць доўгую песню. Калі на шляху ім трапіцца свойскі чалавек, то зачынальніца здымае з галавы вянок і адзяе яго на галаву свойскага сустрэчнага чалавека. У той жа час усе жнеі наўкол «палонніка» працягваюць спяваць да таго часу, пакуль ён не дасць ім выкупу, які складаецца звычайна з грошай або якой-небудзь рэчы. Толькі ў такім выпадку вянок здымаюць з яго галавы, і ён атрымлівае свабоду.

Падышоўшы да хаты, жнеі спыняюцца і заканчваюць песню. Да іх тады падыходзіць гаспадар і просіць у хату. Скончыўшы песню, зачынальніца здымае вянок са сваёй галавы і надзявае яго на гаспадарову галаву. У суправаджэнні гаспадара жнеі заходзяць у хату. Гаспадыня сустракае іх у сенях,

трымаючы ў руках гарэлку, хлеб, соль і сыр, якімі яна тут жа іх частуе. У выпадку калі гатова вячэра, то адразу садзяцца за стол, і не толькі жнеі, але ўсе, нават людзі стараннія, няпрошаныя, але ўцягнутыя адной пустой цікавасцю.

На дажынках (у Лепельскім п. Віцебскай губ.) пякуць бліны і да іх падаюць жнеям масла, мёд і сыту. Акрамя таго, гатуюць вельмі густую кашу для таго, каб і пасевы на лета былі такія ж густыя, як яна. Таксама смажаць або вараць парася, пякуць яечню і шчодра частуюць гарэлкаю.

б) У Мінскай губерні і павеце, калі гаспадар збіраецца святкаваць дажынкі або дажынаць хлеб, напярэдадні таго дня сам асабіста ідзе да сваіх суседзяў і просіць у іх на другі дзень колькі трэба жней, гледзячы колькі застаецца недажатага хлеба. Яму абяцаюць, і ён ідзе гатаваць на заўтрашні дзень частаванне для гасцей. У назначаны тэрмін прыходзяць да яго запрошаныя абедаць, а пасля абеду, а поўдні, ідуць у поле дажынаць. Гаспадар ідзе таксама на палетак і гатуе там полудзень і гарэлку. Пачастунак залежыць ад заможнасці селяніна. Калі на полі застаецца ўжо зусім мала жыта, то ўсе запрошаныя пачынаюць ірваць з гэтай рэшткі жыта траву. Гэта завецца «рваць бараду». Пры гэтым заклікаюць на дапамогу чараўнікоў, мядзведзяў, лісіц і іншых жывёл. Самі ж аржаныя каласы рве адна, выбраная ўжо загадзя для гэтага дзяўчына (замужняя жанчына або ўдава не можа рваць гэтыя каласы). Вырваўшы калоссе з зямлі, дзяўчына дзеліць яго на дзве часткі і кладзе іх накрыж адна з другой на зямлю. На гэтым крыжы ўсярэдзіне, па баках і па канцах кладуць хлеб. Пасля гэтага ўсе разам вяжуць вялікі сноп, які завецца «баба». З края бяруць каласы і плятуць аржаны вянок. Выбраная дзяўчына сядзіць у гэты час на «бабе». Калі сплятуць вянок, то маладзейшыя дзяўчаты здымаюць абранніцу з «бабы», надзяваюць ёй на галаву вянок і ідуць у вёску... Як толькі выйдуць з поля на дарогу, у той жа час пачынаюць пець «Засцілай, пані, сталы, лавы...»

в) У Бельскім павеце Смаленскай губерні апошні сноп абвязваюць хусткаю і адзяваюць на яго кашулю, называючы яго «бабай». Поле жнеі не дажынаюць да канца, а пакідаюць у ім нязжатую невялікую лапінку, называючы яе «барадою» таго гаспадара, у якога працавалі. Усе жнеі садзяцца наўкол «барады», паставіўшы перад сабою «бабу», і снедаюць прынесенымі запасамі ежы. Затым усе з песнямі адпраўляюцца да хаты, у двор гаспадара поля. Наперадзе ідзе адна, выбраная, з «бабаю» ў руках. Пачуўшы іх галасы, гаспадыня выходзіць да іх насустрач і запрашае ў хату. Там яны ставяць «бабу» на покуці, пад абразамі, і прымаюцца за прапанаваную ім вячэ-

ру; п'юць за здароўе гаспадара, гаспадыні, іх дзетак, жней і закусваюць блінамі, якіх яшчэ з вечара напякла для гэтага свята гасцінная гаспадыня. Па заканчэнні вячэры «бабу» адносяць у гумно і потым гуляюць усю ноч.

г) У Гродзенскай губерні паўсюдна жытнія сцябліны, што прызначаны для апошняга снапа, таксама не звязваюць да таго часу, пакуль гаспадыня пры песнях жней не заўе так званай «барады», для чаго і пакідаюцца знарок недажатымі крыху сцяблін, у прамежках якіх старанна выполваецца трава і кладзецца невялікая луста хлеба з соллю. Затым гаспадыня перавязвае сцябліны чырвонай ніткаю і падразае сярпом пры самым карэнні, пасля чаго яна, трымаючы пучок жыта ў левай руцэ, правай кідае серп уверх і крыху ўбок і кладзе гэты пучок у сярэдзіну нязвязанага снапа, які цяпер і звязваецца ў двух месцах: зверху, ніжэй каласоў, і знізу, у звычайным месцы. Гэты сноп не прывозіцца возам разам з іншымі, а забіраецца з поля выбранай жняёй, хоць не заўсёды ў самы дзень дажынак. У гумне яму адводзіцца ганаровае месца. Напярэдадні ж Спаса (6 жніўня) гэты сноп абіваюць, а на самога Спаса свенцяць, і тады яго зерні скарыстоўваюць для засеўкаў.

У Лашанскай воласці той жа губерні і павета, калі дажынаюць жыта, таксама ў канцы поля, пры мяжы, пакідаюць невялічкую лапінку нязжатага і кажуць: «Трэба пакінуць звяром, бо калі не было на свеце гэтым жыта, то звяры пачалі прасіць Бога чаго есці, а Бог ім кінуў жменьку жыта, штоб яны памялі, і адгэтуль распладзіўся хлеб». Затым робяць вянок з каласоў, палявых кветак, прыносяць яго дамоў і ставяць на покуці.

Калі дажынкі бываюць у пана, то хоць вянок робяць таксама з жыта, але пры перанясенні яго захоўваецца асобая цырымонія: яго надзяваюць на галаву самай прыгожай дзяўчыне, і ўзначаленыя ёю астатнія жнеі адпраўляюцца ў панскі двор, спяваючы ўсю дарогу прымеркаваныя да гэтага выпадку песні. Калі жнеі падыходзяць да панскай сядзібы, то пан або пані ці абое разам выходзяць да іх насустрач, бяруць вянок з галавы дзяўчыны і хто-небудзь з іх надзявае на галаву сабе. У гэты час хто-небудзь з дворні раптам вылівае цэлае вядро халоднай вады на галаву дзяўчыны, што несла вянок. Пан дарыць яе грашыма, а часам звыш таго і хусткай.

Багач

У Ігуменскім павеце Багачом называюць Ражство багародзіцы (8 верасня), і апошняя назва амаль невядома народу.

У жыцці земляроба гэта самая шчаслівая пара — пара адноснага дастатку, калі ў бедняка ёсць хлеб на стале, а ў багатых, «як князі, скірды шырока сядзяць, падняўшы галовы». Адсюль зразумела, чаму народ называе Багачом свята, што супадае з часам канчатковай уборкі хлеба і гаспадарчага багацця...

Галоўную ролю ў абрадзе гэтага свята адыгрывае «багач», або «багатца». Гэта лубка жыта з устаўленай у яе васковай свечкай. «Багач» стаіць на працягу цэлага года ў хаце гаспадара, на покуці, пад абразамі. У гэты дзень свечка запальваецца. Запрашаецца святар для служэння малебна, які адбываецца перш-наперш у тым доме, дзе стаіць «багач». Потым гаспадар услед за светаром нясе «багача» ў наступны двор, дзе іх сустракаюць гаспадары. Для сустрэчы ставяць на дварэ стол, накрыты белым абрусам, устаўлены лубкамі жыта, пшаніцы, ячменю ці іншага збожжа. «Багач» ставіцца на стол да збажыны, і служыцца кароткі малебен. Святар і ўсе, хто яго суправаджае, запрашаюцца ў хату для пачастунку, прычым «багач» ставіцца на покуці. І так абыходзяць па чарзе ўсе дамы. Збажына, якой сустракалі «багача», ідзе на карысць прытча.

На другі канец вёскі зганяюць усю жывёлу і, калі абойдуць усе двары, абносяць «багача» наўкол статка. Пасля гэтага адносяць яго ў хату чарговага гаспадара, дзе ён і застаецца цэлы год. Ён, паводле павер'я, прыносіць у дом багацце і шчасце.

У некаторых мясцовасцях жыта і воск для «багача» збіраюцца з усёй вёскі і падмяняюцца толькі тады, калі «багач» па чарзе абыдзе ўсё сяло ці калі свечка згарыць. А ў іншых месцах жыта і свечка падмяняюцца штогод чарговым гаспадаром, прычым жыта для гэтага вымалочваецца з першага зажыначнага снапа. У апошнім выпадку падмененае «багачовае» жыта змешваецца са звычайным і ўжываецца на насенне. Падрыхтоўка свечкі суправаджаецца агульнай вячэрай усіх удзельнікаў і асобнымі песнямі, што нагадваюць дажынкавыя.

ЗІМОВЫЯ ПЕСНІ

КАЛЯДКІ І ШЧАДРОЎКІ. ПЕСНІ КАЛЯДНЫХ ІГРЫШЧАЎ

А Калядачкі, а хадзіце к нам...

А Калядачкі, а хадзіце к нам,
Ой, рана, рана, а хадзіце к нам.
А хадзіце к нам, а мы рады вам,
Ой, рана, рана, а мы рады вам.
Нашы праснічкі паламаліся,
Ой, рана, рана, паламаліся.
Верацёначкі пагубляліся,
Ой, рана, рана, пагубляліся.
Нашы пальчыкі паспрадаліся,
Ой, рана, рана, паспрадаліся.
І пярсцёначкі пасціраліся,
Ой, рана, рана, пасціраліся.
Каб вас, Калядак, нядзель дзесятак,
Ой, рана, рана, нядзель дзесятак.
А бы, дзевачкі, нагуляліся,
Ой, рана, рана, нагуляліся.
І Калядак наўспаміналіся,
Ой, рана, рана, наўспаміналіся.

Прыехала Каляда на белым кані...

Прыехала Каляда на белым кані,
Яе конічак — ясен месячык,
Яе дружачка — ясна зорачка,
Яе пужачка — ясна звёздачка,
Яе вазочак — з тоўстага лядку,
Яе кажушок — з белага сняжку.

Як пайшла Каляда...

Як пайшла Каляда
Упярод Ражства,
Каляда, Каляда!*
Прынесла ж Каляда
Рэшата бліноў,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Рэшата бліноў,
Берасцень мёду.
Дзеткі блінамі
У мёд макалі,
У мёд макалі,
Каляду ўспаміналі.

Прыехала каляда ў вазочку...

Прыехала каляда ў вазочку
Да на сівенькім канёчку.
Прыехала каляда ўвечары,
Прывезла дудак рэшата.
Паставіла дудкі на стаўпе,
А сама села на куце.
Зайграйце, дудкі, тоненька,
Скачыце, дзяўчаткі, хорашанька.
А вы, хлопчыкі, пазірайце,
Сабе дзевачак выбірайце.

Добры вечар таму, хто ў етым даму...

Добры вечар таму, хто ў етым даму,
Добры вечар добрым людзям!
А ў етым даму сам пан гаспадар,
Шчодры вечар добрым людзям!
Сам пан гаспадар да й на покуце,
Шчодры вечар добрым людзям!
Дай на покуце ўвесь у золаце,
Шчодры вечар добрым людзям!
Ой, каля яго да й жана яго,
Шчодры вечар добрым людзям!
Ой, каля яе дзетачкі яе,
Шчодры вечар добрым людзям!

За сяньмі, сяньмі там за новымі...

За сяньмі, сяньмі там за новымі,
Шчодры вечар, добры вечар*,
Стаіць святліца нова зрублена.
У той святліцы чатыры акенцы:

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

У першым акенцы — да яснае сонца,
У другім акенцы — да ясны месяц,
У трэцім акенцы — да дробныя звёзды,
У чацвёртым акенцы — да цёмная хмара.
Яснае сонца — то жонка яго,
Ясны месяц — то сам гаспадар,
Што дробныя звёзды — то дзеткі яго,
Што цёмная хмара — жыта яго.
А з карэнечка — караністае,
А з саломінкі — сцебялістае,
А з каласочка — каласістае.
А дай жа, Божа, пану гаспадару,
Ой жыці-быці, піва варыці,
Піва варыці, сыны жаніці,
Гарэлку гнаці, дочкі замуж даваці,
Шчодры вечар, добры вечар!

Ой, ў ляску, ў ляску...

Ой, ў ляску, ў ляску
На жоўтым пяску,
Святы вечар,
святое Васілле!*

Пчолкі гудуць,
Цэркаў будуюць.

Да збудавалі
З трыма вярхамі,

З трыма вярхамі,
З трыма акнамі.

У першым акенцы —
Ясен месячык,
У другім акенцы —
Ясна сонейка,

У трэцім акенцы —
Ясныя зорачкі.

Ясен месячык —
То гаспадарчык,

Ясна сонейка —
То гаспадынька,

Ясныя зорачкі —
То іх дзетачкі.

Ці дома, дома сам пан гаспадар?..

Ці дома, дома сам пан гаспадар?
Святы вечар, святы Васілеў!
Ой, калі ж ты спіш — Гасподзь з табою,
А калі не спіш — гавары са мною,
А не са мною — з сваей жаною,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

А не з жаною — з сваімі дзеткамі,
А не з дзеткамі — то з суседкамі,
Не з суседкамі — з добрымі людзьмі,
З добрымі людзьмі, што к табе прыйшлі,
Што к табе прыйшлі, радасць прыняслі,
То трое гасцей, трое радасцей:
Ой, первы госцік — яснае сонца,
А другі госцік — дробненькі дожджык.
Усхвалялася яснае сонца:
— Ой, як я ўзыду ў нядзельку рана,
То ўзрадуецца ўвесь мір хрышчоны,
Увесь мір хрышчоны да й нараджоны.
Ой, усхваляўся свецел месячык:
— Ой, як я ўзыду ўночы-паўночы,
То зрадуецца шчука ў моры,
Шчука ў моры, а звер у полі,
А звер у полі, купец у дарозе.
Ой, усхваляўся дробненькі дожджык:
— Ой, як я пайду тройкай у маю,
То зрадуецца жыта-пшаніца,
Жыта-пшаніца, ўсяка пашніца.

Пане гаспадару, ці спіш, ці ляжыш?..

Пане гаспадару, ці спіш, ці ляжыш,
Ці спіш, ці ляжыш, ці нас чуеш?
Адчыні акно, паглядзі ў гумно,
Што ў тваім гумне сам Бог ходзіць,
Сцірты лічыць і цябе клічыць,
Цябе клічыць, дар табе даць:
Табе самому — сто коп жыта,
А жане тваей -- шубу да полу,
Сыночкам тваім — да па коніку,
Да па коніку, да па вараненькім,
Дачушкам тваім — да па вяночку,
Да па вяночку па руцьвяненькім.
Пане гаспадару, не кажы таміць,
Не кажы таміць, проша нас дарыць!
Проша нас дарыць, наш дар невялік:
Коўш гароху, рэшата бобу,
Асьміну аўса, наверх каўбаса,
Калі другую, то падзінькую,
Пане гаспадару!
Аддаўшы нам дар, сам жыві здароў
З дзеткамі, з жаной і з усёй сям'ёй.

У нашага пана...

У нашага пана,
Пана гаспадара,
Пасярод двора
Стаіць абора
Нова зрублена,
Не дарублена.
А ў той аборы
Да стаяць волы
Сівы, паловы.
— Стань, пане,
Пане гаспадару,
Стань, не лянуйся,
Стань, абуйся.
Пайдзі да клеці,
Вазьмі амеці,
Там у куточку
Перагні бочку.
Вазьмі ў карабочку
Да кармі ж волы
Сівы, паловы,
Залатыя волы,
Залатыя рогі.
Яго рагатык
Да ялованькі.
Яго плашанькі
Да берастовыя.
Яго сошнечкі
Да шталёвыя.
Яго палічкі
Да яловыя.
Яго падпалічкі
Да грушовыя.
Яго падвоікі
Да шаўковыя.
Яго кручочкі
Да штабовыя.
Яго ярэмчык
Буковенькі.
Яго кульбачкі
Да дубовыя.
Яго занозікі
Да лазовыя.
Яго ражочкі
Да месанзовыя.
Яго павадочкі
Да шаўковыя.
Яго асценчык
Да чарамховы.
Яго сошанькі
З шчырага золата.
Як едзе ў поле,
Бярэ яхота.
— Судзі ж, Божа,
Вясны даждаці,
Да паедземо
У поле гараці.
Да пагарэма
Горы, даліны,
Да павалачэньма
Варанымі коньмі.
Да пасеялі
Гарным насеннем
Жыта, ярыны
І ўсякай пшаніны.
Дай жа ж, Божа,
Шчоб горы гараў
Да грошы набраў.
Што на гарэ —
То на вяселлі,
А што ў даліны —
То на радзіны.
Сцялі, Божа, валы,
Шчоб хлеба далі.

Пане гаспадар, Бог цябе заве...

Пане гаспадар, Бог цябе заве,
Святы вечар!*

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Бог цябе заве, дар табе дае,
Дар табе дае, валы паруе,
Паруе валы усё палавыя,
Усё палавыя, усё вараныя.

Пане гаспадар, Бог цябе заве,
Бог цябе заве, дар табе дае,
Дар табе дае, коні стайлуе,
Стайлуе коні на тры стайненькі,
А вараныя ды й на чатыры.

Пане гаспадар, Бог цябе заве,
Бог цябе заве, дар табе дае,
Дар табе дае, стажкі шаруе,
Шаруе стажкі у тры шарачкі,
А пшанічныя да й у чатыры.

Пане гаспадар, Бог цябе заве,
Бог цябе заве, дар табе дае,
Дар табе дае, сям'ю роўнюю,
Сям'ю роўнюю, усё маладую.
Усё маладую, ўсё пакорную.

У нашага пана двор гараджоны...

У нашага пана двор гараджоны
(Двор гараджоны), явар саджоны.

На тым явары сіў сокал сядзіць,
На мора глядзіць, ён дзіва бачыць.

Ён дзіва бачыць: караблі плывуць,
На тых караблях па сто малайцоў.

Тыя ж малайцы дорага плацяць,
Дорага плацяць, па сто чырванцоў

(Па сто чырванцоў), па яснай ветцы,
Па яснай ветцы, па краснай дзеўцы.

— Купім жа, братцы, залаты чоўнік,
Залаты чоўнік, срэбна весельца.

Спусцімся, братцы, да таго пана Івана,
Дай яму, Божа, шчасця, здароўя ў яго даму.

Го-го-го, каза...

Го-го-го, каза!
Го-го, шэрая!
Дзе рогі дзела?
— На соль праела:
Соль дарагая,
Мера скупая.
— Не дыбай, каза,
Крывыя ногі,
Не станавіся
Цераз дарогі:
Будзе ехаць пан —
Казу разаб'е!
На табе ляску
У залёты йці —
Папіраціся.
— Чорт цябе бяры
Із залётамі:
Ёсць у мяне конь
За варотамі,
У даліне каза
З казлянятамі,
За гарою воўк
З ваўчанятамі.
Як прыбег ваўчок,
За козку ды ўцёк,
А ваўчанята
За казлянята:
— Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.
Дзе не бывае,
Там вылягае,
Дзе каза ступіць,
Там яно кусціць.

Паварочывайся, казёл...

Паварочывайся, казёл,
На капыцікі,
На срэбраныя,
На ўсе крутыя.
Дзе казёл ходзіць,
Там жыта родзіць,
Дзе прабягае,
Там вылягае.
Дзе казёл рогам,
Там жыта стогам,
Дзе казёл хвастом,
Там жыта кустом,
Дзе казёл нагою,
Там жыта капою.
Да пашоў казёл
Па ўсіх старонах,
Да знашоў казёл
Караля ў зямлі
З караліхаю,
З гаспадынькаю.
Да ты, гаспадынька,
Не будзь такая,
Як тая была барабаніха,
Барабаніла нашага казла,
Нашага казла не ўдарыла,
Толькі смех учыніла.
Скамароху —
Бочку гароху,
А скамарыцы —
Бочку пшаніцы.
За гэту свечачку
Пайдзі ў клетачку,
Да зірні ў бачок,
Дзе стаіць мачок,
Да зірні ў другі,
Дзе стаяць крупы,
Да зірні ў трэці,
Дзе вісяць лейцы.

На новае лета...

На ноьае лета
Радзі, Божа, жыта,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Жыта, пшаніцу,
Усяку пашніцу,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Дай табе, Божа,
Пане гаспадару,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Піва варыці,
Сынкоў жаніці,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Гарэліцу гнаці,
Дачок аддаваці,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Залезь на баляску
І дастань каўбаску,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Стань на драбінку
І дастань сланінку,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Кошычак маку
Да таго прысмаку,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

А ці дома сам пан гаспадар?..

А ці дома сам пан гаспадар?
Святы вечар!*
Ой, нам казалі, што няма дома,
А ў новым гумне жыцечка вее.
Ой, хадзем да яго, узвесялім яго.
Ці не дась ён нам недавеечкаў,
Недавеечкаў на гарэлачку,
На гарэлачку, на кватэрачку?
Да ці дома, дома да яго жана?
Ой, нам казалі, што няма дома,
А ў новай свяцёлцы белы кужаль чэша.
Ой, хадзем да яе, узвесялім яе:
Ці не дась жа нам недачосачкаў,
Недачосачкаў на гарэлачку,
На гарэлачку, на кватэрачку!
Да ці дома, дома да яго дачка?
Ой, нам казалі, што няма дома,
А ў новай клеці белы хусты качае.
Ой, хадзем да яе, узвесялім яе:

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Ці не дась жа нам па хусціначцы,
Па хусціначцы па бялесенькай,
Па бялесенькай, па танесенькай?
Да ці дома, дома да яго сынок?
Ой, нам казалі, што няма дома,
А ў новай стайні каня сядлае,
Каня сядлае, з канём гаворыць:
«Ой, коню, коню! прадам я цябе,
Прадам я цябе за сто чырвонцаў,
За сто чырвонцаў, за чатыры грошы,
За чатыры грошы, што ты не харошы».
— Ой пане, пане, уздумай прыгоду:
Калісь мы былі ў Турэцкай зямлі,
За намі стрэлы, як дым, ляцелі,
За намі кулі зямлю пабілі.

Ці дома, дома сам пан гаспадар?..

Ці дома, дома
Сам пан гаспадар.
Добры вечар,
Сам пан гаспадар?
Ой, калі дома,
Выйдзі паслухай,
Добры вечар,
Выйдзі паслухай.
Выйдзі паслухай,
Што ў бары гудзе,
Добры вечар,
Што ў бары гудзе.

Што ў бары гудзе —
Пчолка-матка йдзе,
Добры вечар,
Пчолка-матка йдзе.
Пчолка-матка йдзе,
І райкі вядзе,
Добры вечар,
І райкі вядзе:
Семяністыя
І мядзістыя,
Добры вечар,
І мядзістыя!

А ў пана, пана, пана Васіля...

А ў пана, пана, пана Васіля
Двор гараджоны,
Бог яму даў вумную жану Арынку.*
Двор гараджоны, садам саджоны.
Закупіла яна да тры гарады:
А першы горад — ўсё з мужыкамі,
А другі горад — ўсё з панамі,
А трэці горад — ўсё з казакамі.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

А з мужыкамі — поле пахаці,
А з панамі — суды судзіці,
А з казакамі — вайну чыніці.

Ой, рана, рана куры запелі...

Ой, рана, рана куры запелі,
Каляда, куры запелі.
Ой, яшчэ раней Ганначка ўстала,
Каляда, Ганначка ўстала.
Ганначка ўстала, коску ўчасала,
Каляда, коску ўчасала.
Коску ўчасаўшы, павы пагнала,
Каляда, павы пагнала.
Павы жануч ы, пер'е збірала,
Каляда, пер'е збірала.
Пер'е збірала, ў хвартушок клала,
Каляда, ў хвартушок клала.
З хвартушка брала, вяночак віла,
Каляда, вяночак віла.
Вяночак звіла, на Дунай пусціла,
Каляда, на Дунай пусціла:
— Хто вяночак пойме, той мяне возьме,
Каляда, той мяне возьме!
Ой, адазваўся малады Васілька,
Каляда, малады Васілька:
— Я вяночак пайму, я цябе вазьму,
Каляда, я цябе вазьму!
Як ступіў нагою — па пояс вадою,
Каляда, па пояс вадою.
Як ступіў другою — на дно галавою,
Каляда, на дно галавою.

Ля варот, варот высокі цяром...

Ля варот, варот высокі цяром,
Святы вечар добрым людзям!*
А ў тым цераме дзевачка сядзіць,
Дзевачка сядзіць, кужалёк прадзець
Свайму татухну на сарочачку,
Сваёй матухні на намётачкі,
Сабе, маладзе, на падарачкі.
Яе брахненька з войска прыехаў,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Прывёз жа ён ёй тры падарачкі:
Первы падарак — пярловы вянец,
Другі падарак — залаты персцінь,
Трэці падарак — зялёны саян.
Пярловы вянец галоўку клоніць,
Залаты персцінь ручку цісніць,
Зялёны саян след замятаіць.
Яна прыбраўшысь у цэркаўку пайшла,
На ўсходцы ўзышла — сходцы абламіла,
У цэркаўку ўвайшла — цэркаўку свяціла,
Князі, баяры дзівавaліся:
— Ці царэўна йдзець, ці каралеўна?
— Я ні царэўна, ні каралеўна,
Бацькіна дачка, злічная панначка.

Ой, па мосціку, па залатому,
Каляда, Каляда!

Ой, па мосціку, па залатому, Каляда, Каляда!*
Ой, стучаць, бяжаць калядоўнічкі,
Ой, пытаюцца да новага двору:
— А ў каго, у каго ты, двор новенькі,
Двор ты новенькі, сад вішнёвенькі?
А ў тым садзе тры сталы стаяць,
На тых сталах кружасты абрусы,
А на тых абрусах зялёна віно,
Зялёна віно, пшанічны хлябы.
За тымі сталамі красна панна
Чэша русу касу, просіць у Бога долі,
Каб у зялёным віне выкупалася,
Салодкім мядком аблівалася,
З красным панічком павіталася.

У нашага пана двор гароджаны...

У нашага пана двор гароджаны,
Добры вечар, шчодры Васілей!
Двор гароджаны, садам саджаны,
Добры вечар, шчодры Васілей!
А ў тым садзе хадзіла зверка,
Добры вечар, шчодры Васілей!
Гэта не зверка, маладая дзеўка,

* Прыпеў «Каляда!» паўтараецца пасля кожнага радка.

Добры вечар, шчодры Васілей!
Шыла-пашыла шоўкам кашулю,
Добры вечар, шчодры Васілей!
Шчэй на падоле — бурыя арлы,
Добры вечар, шчодры Васілей!
А на рукавах — ясны сакалы,
Добры вечар, шчодры Васілей!
Бурыя арлы, хочуць сядаці,
Добры вечар, шчодры Васілей!
Ясны сакалы хочуць ляцеці,
Добры вечар, шчодры Васілей!

Да мостам, мостам да вярбовенькім...

Да мостам, мостам да вярбовенькім,
Шчодры вечар, добры вечар!*
Ішла тудэма слічна паненка,
Несла мёд-віно ў туравым розе.
За ёю, за ёю панскі сыночак:
— Пажджы, пажджы, слічна паненка,
Дай мне мёд-віна пакаштаваці,
Віна пакаштаваці і цябе паймаці.
— Не тваё дзела, панскі сыночак,
Віно каштаваці і мяне паймаці.
Ты ж не бачыў сошкі-баронкі,
Хай табе за гэта — варона жонка.
Да мостам, мостам да вярбованькім
Ішла тудэма слічна паненка,
Несла мёд-віно ў туравым розе.
За ёю, за ёю пахарскі сыночак:
— Пажджы, пажджы, слічна паненка,
Дай мне мёд-віна пакаштаваці,
Віна пакаштаваці, цябе паймаці,
— То ж тваё дзела, пахарскі сыночак,
Віно каштаваці і мяне паймаці.
Ты і з коніка да не ссядаеш,
Буйна жыта да вырашчаеш.

Там на рэчаньцы, там на быстранькай...

Там на рэчаньцы, там на быстранькай,
Святы вечар людзям добрым!*

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Стаіць перавоз слічнай паненкі,
Слічнай паненкі, панны Ганны.
Прыйшлі да яе тры браткі яе:
— Перавязі нас, слічная паненка.
— Не маю часу да перавозу.
Ужо ж мой татулька з дарогі прыехаў,
Прывёз жа ён мне тры гасцінчыкі,
Тры гасцінчыкі да тры венчыкі:
Першы гасцінчык — пярловы венчык,
Другі гасцінчык — чэрзлосны персцень,
Трэці гасцінчык — зялёна сукенка.
Пярловы венчык — на вянчаннейка,
Чэрзлосны персцень — на заручаннейка,
Зялёна сукенка — на пагуляннейка.
Пярловы венчык галоўку клоніць,
Чэрзлосны персцень ручаньку цянець,
Зялёна сукенка — то краса яе.

Красна дзевачка, расці скоранька...

Красна дзевачка, расці скоранька,
Святы вечар, расці скоранька!
Расці скоранька, будзь разумненька.
Прыйдзе к табе кароль у сваты,
Прывязе сукно нямеранае,
Прывязе грошы няшчытаныя,
Прывязе злота няважанае.
Красна дзевачка разумна была:
Узяла сукно перамерала,
Узяла грошы перашчытала,
Узяла злота пераважыла,
Каралевіча не ўзняважыла.

Ой, у лузе, у лузе красна каліна...

Ой, у лузе, у лузе, красна каліна,
Святы вечар!*
А красней за таго Ганна ў таткі.
Маладая Ганначка па двару хадзіла,
Па двару хадзіла, увесь двор скрасіла.
У сенічкі вайшла, сенцы заззялі,
У хатачку вайшла, паны стаялі.
Паны стаялі, шапкі знімалі,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Шапкі знімалі, яе пыталі:
— Ці ты царэўна, ці ты каралеўна?
— Я Іванава дачка, да Ганначка.

Там за садамі трава-мурава...

Там за садамі трава-мурава,
Шчодры вячор, багаты вячор!*
На той мураве — бела бяроза,
На той бярозе — залаты росы.
Як узняліся буйныя ветры,
Абцерусілі залаты росы.
— Ідзі, Ганначка, пазбірай росы
І купі сабе трое надоб'е:
Перша надоб'е — медзяны кубак,
Друга надоб'е — срэбна талерка,
Трэце надоб'е — залаты персцень.
Медзяны кубак — к запіваннечку,
Срэбна талерка — к дараваннечку,
Залаты персцень — то к вянчаннечку.

Узышло, узышло тры месяцы...

Узышло, узышло тры месяцы...
Гэй, каляда, каляда!*
Тры месяцы, ўсе тры ясны.
Было ў маткі тры сыночкі,
Паўставалі, паўмываліс ь,
Паехалі аж на места.
А на месце тры таночкі,
Тры таночкі, усе дзявочкі:
Адзін любіць берасцянку,
Другі любіць кабрынянку,
Трэці любіць камяньчанку.

Ой, пад лесам да пад высокім...

Ой, пад лесам да пад высокім,
Ой, там ходзіць стада коней,
Добры вечар, шчодры вечар!*
А ў тым стадзе конь гаворыць:

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

«Ніхто мяне не паймае, не асядлае».
Адазваўся малады малойчык:
«Я й таго каня паймаю, я й асядлаю.
Ой, паеду ў чыста поле,
Выпалюю дзевяць лісаў,
Дзевяць лісаў, дзесятую кунку,
Да сваёй матачцы на шубку».
Як пачула гэта — загневалася
Ой, да яго міленькая.
«Ох, не гневайся, мая міла!
Ці ж ты мяне гадавала?
Гадавала мяне родна матанька:
Цёмнай ночы не даспаўшы,
Яснай свечы не тушыўшы,
Ачэпак з ножак не спушчаўшы».

Ой пад вярбою, пад зеляною...

Ой, пад вярбою, пад зеляною,
Святы вечар!*
Ой, там стаяла мужаў грамада,
Мужаў грамада, вяліка рада.
— Станьма мы, братцы, у вяліку раду,
Пастройма мы, братцы, залаты човен,
Леньма-паленьма да сваго пана.
А наш бо пан — слаўны багатыр,
Слаўны багатыр, дорага плаціў,
На месяц плаціў па сто чырвоных,
Па сто чырвоных, па вараным кані.
На тым кані залатое сядло,
А на тым кані залата грыва,
Залата грыва персцень укрыла.
На тым сядле пышнае дзіця,
Пышнае дзіця — малады Іванка.

Ой, рана-парану да куры запелі...

Ой, рана-парану да куры запелі,
Святы вечар, да куры запелі.
Раней таго Васілька ўстаў,
Святы вечар, Васілька ўстаў,
Да рана ўстаў, тры свячы ссукаў,
Святы вечар, тры свячы ссукаў,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Да ўсё папаліў, да ўсё папаліў,
Святы вечар, да ўсё папаліў:
Да адну спаліў, абуваючыся,
Святы вечар, абуваючыся.
А другую спаліў, умываючыся,
Святы вечар, умываючыся.
А трэцюю спаліў, браткаў пабуджаючы,
Святы вечар, браткаў пабуджаючы:
— Уставайце, браткі, да хадзем на аблаву,
Святы вечар, да хадзем на аблаву,
Да хадзем на аблаву да ў зялёну дубраву,
Святы вечар, да ў зялёну дубраву.
Вам, браточкі, куна ў дзераве,
Святы вечар, куна ў дзераве,
А мне ж, маладому, дзеўка ў цераме,
Святы вечар, дзеўка ў цераме.

Зажурылася крутая гара...

Зажурылася крутая гара,
Святы вечар!*
Што ні ўрадзіла шоўкава трава,
Толькі ўрадзіў зялёны вінаград.
— Хто таму вінаграду старожка будзе?
Малады Сцяпанка сцярог ночачку,
Сцярог ночачку, сцярог другую,
А на трэцяю крэпенька заснуў.
Прыйшоў к яму яго татачка:
— Вунь твае гарады туркі абляглі,
Вунь твая патрава пылам запала,
Вунь твая дзевачка между дзевак стала.
— Я ж тых турачак ды ні баюся,
Агнём выпалю, меччу высяку,
А сваю вячэру з перцам прыпраўлю,
А сваю панну паміж дзевак вазьму.

Там за рэчкаю, там за быстраю...

Там за рэчкаю, там за быстраю, каляда,
Там за быстраю, каляда!

Ой, там Іванька стружа стрэланькі, каляда,
Стружа стрэланькі, каляда!

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Стружа, малюе, на Дунай пускае, каляда,
На Дунай пускае, каляда!

— Ляціце, стрэлкі, да маёй дзеўкі, каляда,
Да маёй дзеўкі, каляда!

Няхай гатуе тонкі падаркі, каляда,
Тонкі падаркі, каляда!

Тонкі падаркі для маёй маткі, каляда,
Для маёй маткі, каляда!

Майму татулю — тонку кашулю, каляда,
Тонку кашулю, каляда.

Мне, маладому, з руты вяночак, каляда,
З руты вяночак, каляда!

Ой, за варацьмі крутая гара...

Ой за варацьмі
Крутая гара,
Святы вечар!*

Ой, на той гарэ —
Шаўкова трава.

А на той гарэ —
Стада каней ходзіць.

А між тых коней —
Адзін вараны,

Адзін вараны,
Да й не сядланы.

Хлопцы лавілі,
Да й не злавілі.

Адкуль узяўся
Малады Пецечка.

Як к каню прыпаў,
Так коніка ўзяў.

Як сеў паехаў
К новаму двару,

К новаму двару,
К цесцейку свайму.

Цесцейка кажа:
— Вон ясен сокал.

А дзевачка кажа:
— То не ясен сокал,

То не ясен сокал,
То Пецечка мой.

Вазьміце коніка
Да із стаенькі,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожных двух радкоў.

Маладога Пеценьку —
Да й да Святланкі.

Дайце коніку
Сена аброку,

Маладому Пеценьку —
Мёду і віна,

Мёду і віна,
Сітняга хлеба.

За естым словам
Жывіце з Богам.

Святое Ражаство
Радасць прынясло.

Святое Васілле
Развесяліла.

За естым словам
Жывіце з Богам.

А ў лузе, ў лузе красна каліна...

А ў лузе, ў лузе красна каліна,
Святы вечар!*
Пад тою калінаю калодзезь цячэ,
Молад Іванька коніка поіць.
Коніка поіць, з канём гаворыць:
— Ой, коню, коню, запрадам цябе,
Запрадам цябе, за дзвесце рублёў.
— Малады Іванька, не прадавай мяне,
(Не прадавай мяне), дзяржы ля сябе.
Як будзеш ты да жаніціся — памашчу масты,
Памашчу масты ўсё калінавыя,
Пастаўлю стаўбы да ўсё залатыя,
Павешу хусты ўсё шаўковыя.
Як будзеш ты дзевачку вязці,
Забраджаць масты ўсё калінавыя,
Заззяюць стаўбы ўсё залатыя,
Замашуць хусты ўсё шаўковыя.

Хадзіла-блудзіла семсот малайцоў...

Хадзіла-блудзіла семсот малайцоў,
Святы вечар!*
Семсот малайцоў да й каляднічкаў.
Прыблізіліся к новаму двару,
К новаму двару, к пану Івану.
— Ох, пазволь, пане, поле змераці,
Поле змераці, стада зганіці,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Стада зганіці на калінаў мост.
А калінаў мост да й уламіўся,
Вараное стада да й затанула.
Ох, не жаль жа мне варанога стада,
Толькі жаль жа мне сіўца-варанца,
Сіўца-варанца, белага капытца.
Ён капыцечкам зямліцу сячэ,
Ён хвасцічачкам слядкі замяце,
А грывенькаю ўсё поле ўкрые,
А вушыцамі ўсю роду шчуе,
А вочыцамі ўсё войска згляне.
Усё войска згляне, свайго пана знае,
Свайго пана знае з войска выбаўляе.

Зажурылася крутая гара...

Зажурылася крутая гара,
Што не парасла шаўкова трава.
Святы вечар добрым людзям!*

Не парасла шаўкова трава,
Да парос, парос зялён вінаград.

Што парос зялён вінаград,
Да хто ж яго будзе сцерагчы?

Малады Яська сцярог ночаньку,
Малады Яська сцярог другую.

Ох, да ён сцярог другую,
А на трэцюю сон яго змарыў.

А на трэцюю сон яго змарыў,
Да сільненька ён заснуў.

Прыйшла да яго матачка яго:
— Да ўстань, устань, сыночак мой,

Да ўстань, устань, сыночак мой,
Да ўжо твая стрэлачка да пылам запала,

Твая стрэлачка пылам запала,
Твая дзеванька між дзевачак стала.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.

— Я сваю стрэлачку з пылу падыму,
Я сваю дзеваньку між дзевачак вазьму.

А збегла, збегла з поля старожа...

А збегла, збегла з поля старожа,
Святы вечар, з поля старожа.*
Ды прыбегла к Іваньку на двор:
— Ці спіш, ці ляжыш, малады Іванічка?
— Не сплю, не ляжу, лісточкі пішу.
Лісточкі пішу да к паненцы шлю.
— Хоць шлі, хоць не шлі — не твая будзець,
Тваю паненку ў палон забралі,
У палон забралі туркі з татарамі,
Туркі з татарамі, баяр з баярамі.
— А я тых баяр мечам парублю,
А я тых турак канём патапчу,
Я сваю паненку за сябе вазьму.

Калядка йдзе, сто коні вядзе...

Калядка йдзе, сто коні вядзе,
Каляду!
Ой, выйшаў, выбег млоды Ясенька:
Каляду!
— Пазыч, Калядка, свайго коніка,
Каляду!
Паеду сабе дзеўкі шукаці.
Каляду!
Яшчэ Ясенька дзеўкі не знайшоў,
Каляду,
А ўжо Калядка па каня прыйшла,
Каляду!

Ляцеў каршунішча, каляда...

Ляцеў каршунішча, каляда,
Цераз папялішча, каляда,
Відзеў курак стаду, каляда,
А ён жа лятаіць, каляда,
Курак выбіраіць, каляда.
— А каб жа я ведаў, каляда,
Якая мне будзіць, каляда.
Што белае скрылле, каляда,
Лятучая курка, каляда,
Што жоўтыя ножкі, каляда,
Нясушчая курка, каляда.
А што ў чубочку, каляда,
Тая каршуночку, каляда.
А каб жа я ведаў, каляда,

* Прыпеў «Святы вечар» паўтараецца з другой часткай кожнага радка.

А што мая будзіць, каляда,
Я б ножкамі браў бы, каляда,
На скрыллейку нёс бы, каляда.
А нёс бы я, нёс бы, каляда,
Аж у роўна поле, каляда,
У сваё гняздзечка, каляда.
А у новых сенях, каляда,
Там карагод дзевак, каляда.
А ў тым карагодзе, каляда,
Там Валодзька ходзіць, каляда,
Дзевак выбіраіць, каляда.
— А каб жа я ведаў, каляда,
Якая мне будзіць, каляда.

Што сінія вочкі, каляда,
Драмлівая дзеўка, каляда,
Што белыя ручкі, каляда,
Лянівая дзеўка, каляда.
Што чорныя броўцы, каляда,
Рабочая дзеўка, каляда.
А каб жа я ведаў, каляда,
Што маёю будзіць, каляда,
На коніку вёз бы, каляда.
А вёз бы я, вёз бы, каляда,
Аж у роўна поле, каляда,
Аж у роўна поле, каляда,
У сваё падвор'е, каляда.

А йшоў-перайшоў, каляда...

А йшоў-перайшоў, каляда,
Месяц па небу, каляда,
А браў-перабраў, каляда,
Усе звёздачкі, каляда.
А выбраў сабе, каляда,
Ясней за сябе, каляда.
Рана усходзіць, каляда,
Позна заходзіць, каляда.
А йшоў-перайшоў, каляда,

Млоды Мішачка, каляда.
А браў-перабраў, каляда,
Усіх дзевачак, каляда.
А выбраў сабе, каляда,
Павышай сябе, каляда.
Позна лажыцца, каляда,
Кожан дзівіцца, каляда,
Рана ўстаець, каляда,
Пятух не пяець, каляда.

Чаго ты, рожа, адна ў гародзе?..

— Чаго ты, рожа, адна ў гародзе?
Рожа мая чырвоная.*
— Я тут не адна, няпраўда твая.
Што ёсць красачак, то ўсё са мной,
Аднаго нету — баравога цвету.
І дзе ж ён будзе, ка мне прыбудзе,
Ка мне прыбудзе, са мной цвісці будзе.

— Чаго ты, Мар'ечка, адна ў карагодзе?
— Я ж тут не адна, няпраўда твая.
Што ёсць дзевачак, то ўсё са мной,
То ўсё са мной, перада мной,
Аднаго нету — маладога Іванечкі.
І дзе ён будзе, ка мне прыбудзе,
Ка мне прыбудзе, са мной жыць будзе.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Да я Каляду да на кут павяду...

Да я Каляду да на кут павяду,
Ой, рана, рана, да на кут павяду;
Да мне Каляда да гулянне дала,
Ой, рана, рана, да гулянне дала;
Да я Калядзе кісялю навару,
Што мне Каляда да гулянне дала,
Ой, рана, рана, да гулянне дала;
Да я Калядзе да куцці натаўку,
Што мне Каляда да гулянне дала,
Ой, рана, рана, да гулянне дала;
Да я Калядзе пірагоў напяку,
Што мне Каляда да гулянне дала,
Ой, рана, рана, да гулянне дала;
Да я Калядзе каўбасу спяку,
Што мне Каляда да гулянне дала,
Ой, рана, рана, да гулянне дала;
Да я Каляду да з куста павяду,
Што мне Каляда да гулянне ўняла,
Ой, рана, рана, да гулянне ўняла.

Пайшла Каляда калядуючы...

Пайшла Каляда калядуючы,
Каляда, да ты Калядзіца,*
За ёю хлопцы жабруючы.
Зайшла Каляда да пана Якіма:
— Чым у пана Якіма вароты завешаны?
— То стужкамі, то паяскамі —
Званке звоняць, сватэ едуць,
Аддай дачку, хоць ядыначку!

Пайшла Каляда калядуючы,
А за ёю хлопцы жабруючы.
Зайшла Каляда да пана Уласа:
— Чым у пана Уласа вароты завешаны?
— Каўбас лыка, пірагоў у века.

Або:

— Лапцямі, лапцямі, ўсё анучамі.
Пайшла Каляда калядуючы,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

За ёю хлопцы жабруючы,
Зайшла Каляда ў Янкавы вароты,
А ў пана Янкі да куццю таўкуць,
Куццю таўкуць, кісель вараць,
Кісель вараць, дзеці плачуць,
Дзеці плачуць, кіі скачуць.

У канцы сяла да стаіць вярба...

У канцы сяла да стаіць вярба,
Каляда, да ты Калядзіца!
Да на той вярбе да дзіка каза.
Прыйшоў да яе да сівы ваўчок:
— Да злезь, козка, да патанцуйма,
Да патанцуйма, да пажартуйма!
— Да не палезу, бо цябе баюся:
Калі ў цябе, воўча, вялікія вочы.
— Я ў караля быў, усю ноч свяціў,
Усю ноч свяціў, вочы павялічыў.
А ў канцы сяла да стаіць вярба,
Да на той вярбе да дзіка каза.
Прыйшоў да яе да сівы ваўчок:
— Да злезь, козка, да патанцуйма,
Да патанцуйма, да пажартуйма!
— Да не палезу, бо цябе баюся:
Калі ў цябе, воўча, вялікія лапы.
— На вяселлі быў, каравай пляскаў,
Каравай пляскаў, лапы параспляскаваў.
У канцы сяла да стаіць вярба,
На той вярбе да дзіка каза.
Прыйшоў да яе сівы ваўчок:
— Да злезь, каза, да патанцуйма,
Да патанцуйма, да пажартуйма!
— Да не палезу, бо цябе баюся:
Калі ў цябе, воўча, галава вялікa.
— Я ў караля быў, усё судэ судзіў,
Усё судэ судзіў, галаву наклапаціў.
У канцы сяла да стаіць вярба,
Да на той вярбе да дзіка каза.
Прыйшоў да яе да сівы ваўчок:
— Да злезь, козка, да патанцуйма,
Да патанцуйма, да пажартуйма!
— Да не палезу, бо цябе баюся:
Калі ў цябе, воўча, хвост вялікі.
— Я ў караля быў, пакоі замятаў,

Пакоі замятаў, хвост размахаў,
Каляда, да ты Калядзіца!

Ой, рана, рана каваліха ўстала...

Ой, рана, рана, каваліха ўстала,
Святы вечар добрым людзям!
Каваліха ўстала, кавалёў будзіла:
— Уставайце, кавалі, куйце тапары,
А йдзіце ў лясы, ішчыце дуб'ё,
Цяшыце брусся, масціце масты.
Чыраз тыя масты ішлі тры празнічкі:
Первы празнічак — святое Ражство,
Другі празнічак — святое Васілля,
Трэці празнічак — святое Хрышчэнне.
Святое Ражство каўбас прынясло,
Святы Васілля сватоў узнасіла,
Святое Хрышчэнне — саўсім вяселле.

МАСЛЕНІЧНЫЯ ПЕСНІ

Наша масленка катліва...

Наша масленка
катліва,
Штось катліва,
Люлі, катліва!

А мы масленку
пракацілі,
Пракацілі,
Люлі, пракацілі!

Сырам гору набівалі,
Набівалі,
Люлі, набівалі!

Паверх маслам
палівалі,
Палівалі,
Люлі, палівалі!

Нашы дзеванькі
гуллівы,
Штось гуллівы,
Люлі, гуллівы!

Нашы хлопцы
гарэзлівы,
Гарэзлівы,
Люлі, гарэзлівы!

Нашы маткі штось
бурчлівы,
Штось бурчлівы,
Ой, бурчлівы!

Нас да хаты з горкі
клічуць,
Дамоў клічуць,
Люлі, дамоў клічуць!

У нас сягоння масленіца...

У нас сягоння масленіца,
Прыляцела ластавіца,
Села-пала на жэрдачку,
Шчабятала вестачку.
Ластавіца песню спела,
Назад у поле паляцела.
Садзіцеся, хлопцы, вы на коні,
Даганяйце ў чыстым полі!
Папытайце ў ластавіцы,
Што дзеецца ў Прудзішчы,
А ў Прудзішчы дзеецца,
Дзевяць хлопцаў жэніцца,
Адна дзеўка замуж ідзець,
У карагодзе дзевак вядзець.

Наша масленіца гадавая...

Наша масленіца гадавая,
Яна госцейка дарагая.
Яна пешаю к нам не ходзіць —
Усё на коніках раз'язджае.
Штобы конікі былі вараныя,
Штобы слугі былі маладыя.

У нас маслены дзень...

У нас маслены дзень...
На гары бабы сядзелі,
Кулаком зямлю пабілі,
Аб нявестках судзілі.
Адна нявестка шэльма была:
Клець запаліла, ўпроч пайшла.
А як там багацця згарэла:
Жалудова бочка віна было,
Арэхава міса масла было.

Мы на горушцы пабывалі, пабывалі...

Мы на горушцы пабывалі, пабывалі,
Ай-люлі, пабывалі!
Масленку сустракалі, сустракалі,
Ай-люлі, сустракалі!
Сырам гару набівалі, набівалі,
Маслам гару палівалі, палівалі,
Наша горушка катліва, ай катліва,
Свякровушка варкатліва, варкатліва:
Яна на нас варчала, ай варчала,
На горушку не пушчала, не пушчала!
А нам дамоў не хаціцца, не хаціцца,
А хаціцца пракаціцца, пракаціцца!

Мы думалі — масленкі сем нядзелек, сем нядзелек,
Ажно масленкі сем дзянёчкаў, сем дзянёчкаў!
Нас масленка абманіла, абманіла:
На сем нядзель паста пасадзіла, пасадзіла,
На белую капусту, капусту,
На горкую рэдзьку, на рэдзьку,
Ай-люлі, на рэдзьку.

**Чок, чок, салавей, вы,
пташкі, маўчыце...***

Чок, чок, салавей, вы, пташкі, маўчыце:
Нядаўна Андрэйка з вайны прыехаў,
Яго конічак на стаенцы стаіць,
А яго паненачка ў каморы сядзіць.
Конічак на стайні — то паязды яго,
Боцікі на ножках — то паходы яго,
Сукенькі на плечках — то ўборы яго,
Хустачка ў руках — то размахі яго,
Шабелька пры боку — абарона яго,
Дзевачка ў каморы — размова яго.

ВЕСНАВЫЯ ПЕСНІ

ПЕСНІ ГУКАННЯ ВЯСНЫ. ВЯСНЯНКІ

**Благаславі, Божа,
на ўзгорачку сесці...**

Благаславі, Божа,
На ўзгорачку сесці...
Вясну загукаці,
Лецечка адмыкаці,
Зіму замыкаці:
Лецечка цяпленька,
Зіма сцюдзёная,
Лецечка ў каточку,
Зіма ў палазочку.

---

* Запусная.

Благаславі, Божа мілы, зіму замыкаці...

Благаславі, Божа мілы, зіму замыкаці,
Зіму замыкаці, вясну аклікаці.
Зімою ў вазочку, вясною ў чаўночку,
У цёплым леце ў карэце.
Благаславі, Божа, зіму замыкаці,
Зіму замыкаці, вясну загукаці.
Дай, Божа, на жытачка род,
На статачак плод,
Людзям на здароўе.

Благаславі, Божа, вясну красну пеці...

Благаславі Божа,
Вясну красну пеці
На ціхае лета,
На буйнае жыта,
Каб наша жыта
У трубы павілося,
У трубы павілося,
Набок схілілося,
На полі снапамі,
А ў гумне тарпамі,
У арудзе прысыпна,
А ў млыне прымолна,
А ў дзяжы падходна,
А ў пячы пячыста,
А на стале краіста.
Сям'і на здароўе,
Панам — безгалоўя!

Дабравешчанніко святое...

Дабравешчанніко святое,
Пашлі сонейка залатое,
Каб зямелька адышла,
Да вясна да нас прыйшла,
Каб распусціліся ветачкі,
Каб раскраснеліся кветачкі,
Каб лугі зазелянеліся,
Нашы нівачкі адзеліся.

Ты, пчолачка ярая...

Ты, пчолачка ярая,
Ты вылець з-за мора,
Ты вынесі ключыкі,
Ключыкі залатыя,
Адамкні лецечка
Лета цёплае,
Замкні зіманьку,
Зіму сцюдзёную!

Зіма з летам сустракаецца...

Зіма з летам сустракаецца,
Пра здаровейка пытаецца:
— Ой, чалом, чалом, да цёплае лецейка!
— Ой, здарова была, да халодная зімачка!
— Што цябе, лецейка, узвелічаюць,
Мяне, зімачку, праклінаюць?
— Бо ты, зімачка, халодная,
Лугі, балоты памарозіла,
Ой я, лецечка, да вясёлае,
Лугі, горы ізмачыла,
Лугі, горы ўзвесяліла.
Ой, там хлопчыкі сабіраюцца,
Да на мёд, віно складаюцца:
Ой ты, Іваначка, кладзі больш за ўсіх.
Твая Ганначка лепш за ўсіх.

Прыдзі, прыдзі, вясна...

Прыдзі, прыдзі, вясна,
Прыдзі, прыдзі, красна
К нам у таночак.
Прынясі нам збожжа,
Прынясі нам красак,
Каб нам звіць вяночак.

Едзіць вясна, едзіць
На залатым кані
У зялёным саяні,
На сасе седзячы,
Сыру зямлю аручы,
Правай рукой сеючы,
А смыком скародзячы.

Вязець, вязець вясна,
Вязець, вязець красна
Ясныя дзянёчкі,
Частыя дажджочкі,
Зялёныя травы,
Красныя цвяточкі
Нам на вяночкі.

Ой, вясна ды й весенка...

— Ой, вясна ды й весенка, ды й весенка,
Што ж ты нам прынесла прынеселька?
— Маладым малодкам — па бердзечку, па бердзечку,
А дзевачкам па пранічку, па пранічку,
А малым дзеткам па яечку, па яечку,
А старым дзядкам па кіёчку, па кіёчку,
Маладым мужчынкам па плужочку, па плужочку,
А хлопчыкам па пужачцы, па пужачцы.
Маладым малодкам красёнцы ткаць,
А дзевачкам дый палотна бяліць,

Старым дзядкам на мураўцы сядзець,
Маладым мужчынкам поле араць,
А хлопчыкам на пастку гнаць.

Ой, вясна красна!..

— Ой, вясна красна!
Да што ж ты нам прынясла?
— Ой, прынясла, прынясла,
Тры карысці ў радасці:
Першая карысць бортнічкам,
А другая й аратаму,
А трэцяя пастушкам,
Дзе бортнічкі барцілі,
Там трэсачкі ляжалі,
А дзе аратаі аралі,
Там сошачкі ляжалі,
А дзе пастушкі паслі,
Там пужачкі ляжалі.
Як стукне бортнічак у бару:
«Да садзі ж, Божа, пчолачкі
Да новага лецечка!»
Як ксохне ратай у полі:
«Зарадзі, Божа, жыцечка
Да на новае лецечка!»
Як гукне пастушок у бору:
«Спасі, Божа, худобку
Да на новае лецечка!»

Ты, вясна, ты, красна...

— Ты, вясна, ты, красна,
Да што ж ты нам вынесла?
— Прынесла тры карысці-радасці:
Першая карысць — бортнічак,
Другая карысць — пастушок,
Трэцяя карысць — ратайка.
Бортнічак стукне: «Садзі, Божа!»
Пастушок гукне: «Пась, Божа!»
Ратай сокне: «Радзі, Божа!»
Кароўка йдзе, рыкае,
Пастушок ідзе, гукае:
«Сюды, кароўка, кароўка,
Тут зялёная муроўка».

Жаваранак, ранняя птушэчка...

Жаваранак, ранняя птушэчка,
Чаго так рана з выр'ю вылятаеш?
А там пры даліне —
там ляжаць крыгі,
А там пры дарозе —
снягі і марозы.
— А я тыя крыгі крыламі разаб'ю,
А я тыя марозы нагамі растапчу.

Вясна красна, вясна красна наступае...

Вясна красна, вясна красна наступае,
Вадой лугі, вадой лугі залівае,
Што ні прайсці, што ні прайсці, ні праехаць,
Свайго роду, свайго роду не праведаць.
Ой, вясною, ой, вясною — за вадою,
А ў лецечку, а ў лецечку — за жнівамі,
А зімою, а зімою — за снягамі.
— Дзіця ж маё, дзіця ж маё маладое,
Ты вясною, ты вясною — на чаўночку,
Ты ў лецечку, ты ў лецечку — у нядзелечку,
А зімою, а зімою — ў палазочку —
Такі ж роду, такі ж роду пераведай.

А вясна, вясна, вясеначка...

А вясна, вясна, вясеначка,
Вясеначка,
Развесяліла ўсе вулачкі,
Усе вулачкі.
Да ўсе вулачкі-праталачкі,
Праталачкі.
Да дзе хлопчыкі збіраліся,
Збіраліся,
На мёд-гарэлку складаліся,
Складаліся.
— Кладзі, дзяцінка, болей за ўсіх,
Болей за ўсіх,
Твая дзевачка луччы за ўсіх,
Луччы за ўсіх:
Яна беленька, румяненька,

Румяненька,
На работачку слухмяненька,
Слухмяненька.
Яна свёкарку паслухае,
Паслухае,
Возьме вядзерца, пастукае.

Ой, вясна ды й вясенка ды я вясенка...

Ой, вясна ды й вясенка ды я вясенка,
Што ж ты нам прынесла прынеселька?
— Маладым малодкам — па бердзечку, па бердзечку,
А дзевачкам па пранічку, па пранічку,
А малым дзеткам па яечку, па яечку,
А старым дзядкам па кіёчку, па кіёчку,
Маладым мужчынкам па плужочку, па плужочку,
А хлопчыкам па пужачцы, па пужачцы.
Маладым малодкам красёнцы ткаць,
А дзевачкам — дый палотна бяліць,
Малым дзеткам з яечкамі гуляць,
Старым дзядкам на мураўцы сядзець,
Маладым мужчынкам поле араць,
А хлопчыкам на пастку гнаць.

Ой, вясна, вясна, што ты прынясла?..

Ой, вясна, вясна, што ты прынясла,
што ты й прынясла?
А я прынясла цёпла лецечка,
дый цёпла лецечка.
Старым бабачкам пасядзеці,
дый пасядзеці,
А маладзічкам кросенцы ткаці,
дый кросенцы ткаці,
А дзевачкам цэўкі сукаці,
дый цэўкі сукаці.

Ой, прышла вясна красна...

Ой, прышла вясна красна,
Чужыя малодкі ткуць кросна.
А я, маладзенька, не прала,
Пад лёд кудзелькі пускала.
— Плывіце, кудзелькі, валакном,
Ка мне маладзенькай палатном!

Да ўсе дзевачкі смяюцца,
Як тыя кудзелькі прадуцца.
Да ўсе людзячкі дзівяцца,
Чые то кудзелькі беляцца.
Да гэта ж тае гультайкі,
Да што стаяла ля пелькі.

Ой, вясна мая вясёлая...

Ой, вясна мая вясёлая,
Развесяліла ўсе горачкі,
Усе горачкі, усе горачкі-даліначкі,
Даліначкі, дзе парабачкі збіраліся,
Збіраліся, на мёд-гарэлачку складаліся,
Складаліся, аб помсце пану змаўляліся.

Вол бушуе — вясну чуе...

Вол бушуе — вясну чуе,*
Воран крача — сыра хоча,

Воран крача — сыра хоча,
Дзеўка плача — сына хоча.

Воран крача, падлятае,
Дзеўка сына спавівае.

Воран крача — сыр бяленькі,
Дзеўка плача — сын маленькі.

Воран крача, сыра з'еўшы,
Дзеўка плача, сына меўшы.

Воран крача на галіне,
Дзеўка плача на магіле.

Да вясна красна...

Да вясна красна,
Дзе ты была?
Да што ты нам прынясла?
Прынесла хлопцам па лясачцы,
А малым дзецям па кружочку,
Малоданькам па чэпчыку,
А дзевачкам па кветачцы.
Каб хлопчыкі ў войска пайшлі,
А малыя дзеткі хутка раслі,
Малоданькі ўбраны былі,
Красны дзеўкі замуж пайшлі.

---

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

Вясна красна...

Вясна красна,
Што ж ты нам прынясла?
З пункі сянцо
Вынесла, вынесла.
З току саломку
Вытрасла, вытрасла.
З клеці зярно
Вымела, вымела.
На гары бабкі
Сядзелі, сядзелі,
Кулаком зямлю
Калацілі, калацілі.
Да нявехначак
Судзілі, судзілі.
— Ой, мая ж нявехна
Дурмі-дурак, дурмі-дурак,
Зімку прала,—
Усё спала, усё спала.
Кросна ткала,—
Драмала, драмала.
Вось мая дачушка
Разумна, разумна,
Зімку прала,—
Не спала, не спала,
Кросна ткала,—
Ляшчала, ляшчала.

Рынулі рэкі, рынулі...

Рынулі рэкі, рынулі
Аж да Ганначкі пад сені.
Там збіраліся малойцы,
Складалі грошы на танцы.
Адзін маладзец найбольш клаў,
Сабе дзяўчыну намаўляў:
— Ідзі, деванька, за мяне,
Будзеш маёю жаною,
Будзеш маёю жаною,
Маёй маценькі слугою,
Будзеш маценькі служачка,
Мне, маладому, жоначка.

А ляцела сойка цераз чыста поле...

А ляцела сойка цераз чыста поле,
Вясна красна, дзень цёплы!*
Ды яна схапіла Іванаву жонку.
А бяжыць жа хлопчык, шапку зняўшы,
Шапку зняўшы, галаву задраўшы.
— Сойка, сойка, аддай маю жонку.
Мая жонка тонкая пралля,
Тонкая пралля, звонкая ткалля.
Тонка прала, беленька бяліла,
Кашулечкі шыла і мяне любіла.

Зязуля кукуе, лецячка чуе...

Зязуля кукуе, лецячка чуе —
Ой, рана-рана, лецячка чуе.
Марыся плача, замуж не хоча —

* Паўтараецца пасля кожнага радка.

Ой, рана-рана, замуж не хоча.
Яе матанька цешыць, не ўцешыць —
Ой, рана-рана, цешыць, не ўцешыць.
Не плач, дзіцятка, маё радненька —
Ой, рана-рана, маё радненька.
Не аддам я цябе далёка ад сябе —
Ой, рана-рана, далёка ад сябе.
Аддам блізенька, праз поле вузенька —
Ой, рана-рана, праз поле вузенька.
Будзеш хадзіці што дзянёк да мяне —
Ой, рана-рана, што дзянёк да мяне.
Будзеш часаці русу косу ў мяне —
Ой, рана-рана, русу косу ў мяне.

Зайдзі, зайдзі, зоранька вячэрняя...

Зайдзі, зайдзі, зоранька вячэрняя...
Выйдзі, выйдзі, дзевачка бяздольная!
Ой, знаці, знаці, што ў каго свая маці,—
То штодзень ідуць на вуланьку гуляці!
Ой, знаці, знаці, што ў каго чужая маці,—
Не пушчае на вуланьку гуляці.

Дзякуй Богу, што вясна прышла...

Дзякуй Богу,
Што вясна прышла.
Я, малада, каля жыта
пайшла.
— Расці, жыта,
Караністае,

Караністае,
Лапушыстае,

Каб у трубы
Пакачалася,

Каб я, малада,
Нажалася
І снапочкаў
Нанасілася.

Была ў маткі...

Была ў маткі,
Была ў маткі адна дачка.
Адсюль, адтуль,
Адсюль, адтуль сваты слалі.
Матка дачкі,
Матка дачкі не давала.
Сабе служку,

Сабе служку гадавала.
Прыйшла й вясна,
Прыйшла й вясна — дачку ўзяла.
Гарэлачкі,
Гарэлачкі не насіла.
Дачкі ў маткі,
Дачкі ў маткі не прасіла.
«Дзіця ж маё маладое,
Дзе мне дары,
Дзе мне дары падзяваці?
Ці мне дубы,
Ці мне дубы абвязаці?
Што й дубочак,
Што й дубочак — то й сваточак.
Што й бярозка,
Што й бярозка — то й сватачка.
Што грушачка,
Што грушачка — то й дружачка».

Зязюлечка баравая...

— Зязюлечка баравая,
Дзе ж ты ночку начавала?
Зязюлечка баравая,
Дзе ж ты ночку начавала?
— Адну ночку — на дубочку,
А другую — на бярозе,
А другую — на бярозе.
А там ішлі скамарохі,
А там ішлі скамарохі.
Адрэзалі па пруточку,
Адрэзалі па пруточку.
Дый зрабілі павучочка,
Дый зрабілі павучочка.
Павучочак, не гудзі ж ты,
Павучочак, не гудзі ж ты,
Шэрай зязюлькі не будзі ж ты,
Шэрай зязюлькі не будзі ж ты.

Сярод Дуная дзевачка сядзіць...

Сярод Дуная дзевачка сядзіць,
Дзевачка сядзіць, красачкі рве,
Красачкі рве, вяночкі ўе.
Адзін савіла — на бярозу ўшчапіла,

Другі савіла — на галовачку,
Трэці савіла — у Дунай пусціла.
А там жа ехаў удалы маладзец,
Удалы маладзец жаніцца.
Прывязаў каня к белай бярозе,
К белай бярозе, к бітай дарозе.
«Удалы маладзец, падай мне вянец».
Удалы маладзец палез па вянец.
Ступіў жа раз — па пояс увяз,
А другі ступіў — і сам паплыў.
«Бяжы ж ты, кося, бітай дарогай,
К таму сялу, к татульку майму.
Выйдзе з хаты родная маці,
Цябе рассядлае і спытае:
«Скажы, канёк, дзе мой сынок?»
Не кажы, кося, што я ўтапіўся,
А кажы, кося, што я жаніўся:
Мае дружкі — круты беражкі,
Мая сваціца — рыба-плаціца.
Мая жонка — глыбока вада —
Маёй матульцы да веку бяда».

Бяжыць рэчка ад мельнічка — ой, рана!..

Бяжыць рэчка ад мельнічка — ой, рана!*
А другая ад Дуная, ой, рана!
На той рэчцы човен плыве, ой, рана!
Бел-маладзец красны Стасенька, ой, рана!
Стружа стрэлкі з калінанькі, ой, рана!
Што прасцейшы, ў човен кладзе, ой, рана!
Што крывейшы, на Дунай мяце, ой, рана!
Плыньце, стрэлкі, да мае дзеўкі, ой, рана!
Мая дзеўка крывічанка, ой, рана!
Мая дзеўка Касюленька, ой, рана!
Няхай прадзе на падаркі, ой, рана!
Няхай прадзе ценюсенька, ой, рана!
Няхай беліць белюсенька, ой, рана!

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

ВАЛАЧОБНЫЯ ПЕСНІ

На первы дзень, на вялікдзень...

На первы дзень, на вялікдзень,
Зялён явар, зялёны.*
Валачобнікі сабіраліся.
Сабіраліся, рахаваліся:
«А куды пойдзем, а куды зайдзем?»
— Пойдзем, пойдзем ўсё дарогаю,
Усё дарогаю, усё шырокаю.
Зайдзем, зайдзем к пану Івану.
«А ці дома, дома пане Іване?»
— Хоць жа ён дома — не акажыцца:
У новай каморы прыбіраецца,
Адзяе майтачкі гарнатовыя,
Адзяе боцікі ўсё казловыя,
Адзяе шубачку сабалёвую,
Адзяе шапачку ўсё бабровую,
Выводзіць каня вараненькага,
А кладзе сядло залаценькае.
Садзіцца, едзе ў роўнае поле,
У роўнае поле ды к свайму жыту.
А яго жыта ядраністае,
Ядраністае, каласістае.
К адной мяжы нахілілася,
Свайму гаспадару пакланілася.
Песенька спета напроці лета,
А будзь жа весел, як вясна красна,
А будзь жа ціхі, як ціха лета,
А будзь жа багаты, як багата восень.
А ты, гаспадынька, усё дагадайся:
Скавародку — ў печ, па яечкі — ў клець,
Кусок сала пакрышыці,
А калбаскаю абгарадзіці,
Кварту гарэлкі і сыр на талеркі,
Зялён явар, зялёны.

Добры вечар, пане гаспадару!

Добры вечар, пане гаспадару!
Вясна красна на ўвесь свет.*
Прыйшлі мы да пана як да багача,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Хочам пана да й павітаць,
Яго панскае здароўе спытаць:
Ці здароў пан, ці вясёл пан?
Ці здарова панская жонка?
Ці здаровы панскія дзеткі?
Панская жонка будзе падвышона,
Панскія дзеткі — як у садзе кветкі.
А панскі двор, як у вянку.
На панскім ганку крэслы стаяць,
На тых крэслах сам Бог сядзіць.
«Увайдзі, Божа, у панскія пакоі».
— Я не пайду ў панскія пакоі,
Але пайду ў роўнае поле,
У роўнае поле па мяжах хадзіці,
Па мяжах хадзіці — жыта радзіці.
А ўсіх жыта харашусенька —
Нашага пана ўсё найлепшае,
Найлепшае, ядрынейшае.
Яно сцяблом сцяблыністае,
А коранем караністае
І коласам каласістае,
Яно пад гару пахіліўшыся.
Як пан араў — валы бушавалі,
Як пан баранаваў — конікі іржалі.
Жнуць яго жнейкі маладзенькія,
Іх сярпочкі залаценькія.
Яны самі, як ластаўкі,
Іх галоўкі, як макаўкі.
Як яны жалі — сярпы зажалі,
Як яны селі — сярпы зазвінелі,
Як яны сталі — сярпы заззялі.
Часты, густы зоры на небе —
Часцей, гусцей снапы ў полі.
Як на небе высок месяц —
Так за ім вышэй копы.
Як пан звозіў ды сваё жытцо
У цёмныя гумны да з светлага поля,
Яно ў тарпе прылежыста,
А на таку прымалоціста,
А ў арудзі прысыпіста,
А ў млыне прымеліста,
А ў дзяжы падыходзіста,
А ў печы румяніста.
А на стале, як сыр белы.
Сыр бяленькі — для коласа,

Кварту гарэлкі — для голаса.
Мы свае боты патапталі,
Пакуль пана апыталі.

Добры вечар, чэсны й пане...

Добры вечар, чэсны й пане,
Чэсны й пане, пан Аркадзі!
Ці пазволіш песню спеці?
У нядзельку паранюсенька
Ўзышло сонца весялюсенька,
Ўзышло яно, абутрала,
Асвяціла лугі, бары,
Лугі, бары, чыстае поле,
Чыстае поле, жыта ядраное.
Во што ў полі рана пагукаець?
Во ці лебедзі, во ці сокалы?
Во не лебедзі, во не сокалы —
Ядраное жыта гаспадара кліча.
Патом таго, слаўны пане,
Слаўны пане, пан Аркадзі,
Пасеяў жыта, у полі не быў,
У полі не быў, не адведаваў.
Не адведаваў у корані,
Адведай хоць у коласе.
А ў корані каранісценька,
А ў коласе каласісценька.
Патом таго, слаўны пане,
Слаўны пане, пан Аркадзі,
А пашоў жа ён у чыстае поле,
Поле паляваці, жыта аглядаці,
Пяшком пашоў, ён не абышоў,
На кані паехаў, ён не аб'ехаў,
Сокалам ляцеў, жыта аглядзеў:
— Хвала Божа, харашо жыта!
Каласок гнецца, аб зямлю б'ецца,
Ядраное жыта высыпаецца,
Колас к коласу галаву клоніць.
Патом таго, слаўны пане,
Слаўны пане, пан Аркадзі,
Ой, едзь жа ты дадоманьку,
Да доманьку, да новага,
Да новага, да айцоўскага,
Да айцоўскага, да бацькоўскага,
Да краватачкі да цісовае,

Да сваёй жаны да вернае.
— Ты жана мая, ты душа мая,
Ой, быў жа я ў чыстым полі
Поля паляваці, жыта аглядаці,
Хвала Богу, харашо жыта!
Патом таго, слаўны пане,
Слаўны пане, пан Аркадзі,
Выйдзі жа ты да стаенкі,
Да новае, да айцоўскае.
Вазьмі каня варанейшага,
Варанейшага, што найлепшага,
Паязджай жа ты да горада,
Да горада да Магілёва.
А стань жа ты на рыначку,
На рыначку, пры крамачку,
Пакупляй сярпы ўсе сталістыя,
Падзяржаначкі пазлацістыя.
Прыехаў жа ды із горада,
Із горада, із Магілёва.
Чэсная пані дагадліва:
Сабрала жняёк да павён дварок,
Сорак сярпоў жыта жаці,
Сорак хлопцаў сноп'я насіці,
Сорак мужчын копы класці.
— Ты жана мая, ты душа мая,
Заві жняёк у хатачку,
Запалі свечы трайчастыя,
Саджай жняёк за столічак,
За столічак, за цясовенькі,
За цясовенькі, за кляновенькі,
За скацеркі бірчастыя,
За талерачкі двайчастыя,
За ложачкі серабрыстыя,
За хлебцы за сітовыя,
За стравіцу, за сахарную,
Пабій жа ты іх хлебам, соллю.
— Цяпер вы, жнейкі, не пышыцеся,
Госпаду Богу памаліцеся,
Слаўнаму пану пакланіцеся.
Патом таго, слаўны пане,
Слаўны пане, пан Аркадзі,
Адпраўляй жняёк у чыстае поле,
Чэсную жану ва пераду,
З белым сырам, з малым сынам.
Што раз разнець — то сноп нажнець,

На ступень пражнець — капу кладзець.
Часты-густы ў небе звёзды,
Часцей-гусцей ў полі копы
Слаўнага пана, пана Аркадзя.
Вялік-шырок у небе месяц,
Шырэй-вышэй у гумне стагі
Слаўнага пана, пана Аркадзя.
Перанясі, Божа, во гэту пашэнку,
Во гэту пашэнку цераз асетку.
Во дай, Божа, умалоціста,
А ў арудзе во насыпіста,
А з аруда невыборыста,
А у мельніцы намеліста,
А у дзежцы падыходзіста,
А у печы набуханіста,
А у столічку укроіста,
У сямейцы — міравая сыць.
Патом таго, слаўны пане,
Слаўны пане, пан Аркадзі,
Да ўжо ж госці даўно пяюць,
Слаўнаму пану весці даюць.
А мы госці недакучныя,
Год у год раз пабываем,
Вашага здароўя спытаем,
Во ў той жа дзень, у вялікдзень.
Ой, чым жа нас дарыць будзеш,
Ці золатам, ці серабром,
Ці краснымі яечкамі,
Ці харошымі славечкамі?
Нашы дары не вялікія,
Не вялікія і не малыя:
Пачынальнічку — чырвон злоты,
Падхватнічку — паўзалатога,
Асвістаму хоць нямнога,
Хоць нямнога — каня варанога,
Каня варанога гулі вазіць.
Нашай скрыпца — мерка жытца,
Нам механош — кашэль насіць,
Кашэль насіць, сала прасіць,
Паўсланіны з самай серадзіны.
А на нашу браццю — па капе яец.
Па капе яец негдзе ўзяці,
Па дзесятачку можна даці.
А мужыкова горкая доля,
Горкая доля — кварта гарэлкі,

Кварта гарэлкі, сыр на талеркі,
Пірог мяккі на закуску.
Кварта гарэлкі для смеласці,
Пірог мяккі для крэпасці,
Сыр бяленькі для голасу.
А што не вып'ець — мы дапаможам,
Як уп'ецца — спацькі паложым,
Як праспіцца, працверазіцца,
Пойдзець з намі, развесяліцца.
Патом таго, слаўны пане,
Слаўны пане, пан Аркадзі,
Да ўжо ж вам песня спета,
Песня спета процію лета,
Процію лета, лета краснага,
Ў добрай ласцы, у добрай згодзе,
Ў добрай згодзе, нам пець годзе.

Пане гаспадару, слаўны мужу...

Пане гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Ці ёсць у дому у свянцоным?
Ці спіш, ляжыш, ці спачываеш?
Ці з жаною маладою,
Ці з дзеткамі з малалеткамі?
Да калі спіш — Бог з табою,
Калі не спіш — моў са мною.
Пане гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Устань рана-ранюсенька,
Мыйся бела-бялюсенька,
Трыся суха-сухусенька
Да ўчашыся слізюсенька.
Правай ручкай адчыні ваконца,
Адчыні ваконца на ўсход сонца
Дай паглядзі на свой дварок,
Што ў тваім дварэ дай дзеецца,
Дай дзеецца, лялеецца.
Твой дварочак, як вяночак,
Тынам тынен дубовенькім,
Дубовенькім, цісовенькім,
Твой дварочак мастом мошчан,
Вароценькі маляваныя,
Зашчэпачкі пазлацаныя.
Сярод двору шацёр стаіць

Навюсенькі, яснюсенькі,
Злотам крыты, срэбрам літы,
Прыбрамачкі срэбраныя,
Зашчэпачкі залаценькія.
Да ў тым шатры крэсла стаіць,
Крэсла стаіць залатое,
Да ў тым крэсле сам Бог сядзіць,
Сам Бог сядзіць, кніжку дзяржыць.
Каля яго пчолкі ляталі, мяды збіралі.
Тыя пчолкі — усе святачкі,
Перад Богам збіраліся,
Збіраліся, рахаваліся,
Катораму святцу ўперад стаці.
А збор мовіць гаспадару:
— Слаўны мужу над мужамі!
Тваё дзела — на торг ехаць,
Зялеза купляць, нарогі каваць.
Аўдакею дровы сячэць,
А саракі клады кладзець,
Аляксею — сані на плот,
Сані на плот, рыба аб лёд,
Лёд вадою, рыба лускою.
Благавешчанне — араты на ніву,
Араты на ніву, сядун на прызбу.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Вазьмі ж, ваша, нову сошку
Дай коніка варанога,
Варанога, маладога,
Едзь жа, ваша, у чыста поле,
У чыстае поле заарываць
З соллю, з хлебам, з белым яйцом,
З белым яйцом, з боскім слаўцом.
Вярба свята — нова лета,
Вярба пасвіць у поле гнала.
Дай жа, Божа, гэта святца праважаці,
Свята вялічка дажыдаці!
Дай у радасці, весялосці,
Тры дні святца, чырвоным яечкам,
Чырвоным яечкам разгаўляцца,
Малым дзеткам на вуліцу,
На вуліцу, па прагулянне.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Маеш сабе чаляданьку.

Згадай, ваша, свайму чалядку,
Няхай возьмець златы ключы,
Златы ключы ад стаенькі,
Няхай ідзець у стаеньку,
Няхай закладаець дай коніка,
Варанога, маладога.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Вазьмі, ваша, солі, хлеба,
Солі, хлеба, чаго трэба.
Ідзі ж, ваша, да касцёлу,
Да касцёлу пасвянцаці,
Да прывёзшы, спажываці.
Сядзь жа, ваша, на скам'іцу,
І з жаною, з маладою,
І з дзеткамі маленькімі,
Шасні, бразні на скам'іцы.
Вазьмі, ваша, залаты кубак
Дай пі віно зеляное,
Віно зеляное — на сваю жану,
Жана твая — на дзетачак,
Дзеткі твае — на сямейку,
А сямейка — на чалядку,
Чаляданька — сама на сябе.
Радаўнічка — яна ў Бога
Параднічка, парадзіла
Баранаваці, поле раўняці.
Стары Юрый, Боскі ключнік,
Да йдзі ў поле да ў чыстае,
Адамкні зямлю, пусці расу,
Пусці расу на гэту вясну,
Дай мокрую, дай цёплую,
На гэты свет, на ўсякі цвет,
На люд вясёлы, на ўраджай.
Святы Барыс ляды паліць,
Зямлю грэець, ячмень сеець
З поўнай сявенькі, з правай жменькі.
Кінеш рэдка — дасць Бог густа.
Дай жа, Божа, зарадзі, Божа,
Каласіста, ядраніста.
Святы Мікола, старая асоба,
Гарох сеець, па полі ходзіць,
Па полі ходзіць, жытца глядзіць.
Дзе вымакла, там падсушыць,
Дзе высахла, там падмочыць.

Святы шоснік — аўсы шастаць.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Закладай, ваша, дай коніка,
Варанога, маладога,
Вязі, ваша, ў чыста поле,
У чыста поле авёс сеяць.
У адной кашулі, без шапачкі,
З поўнай сявенькі, з правай жменькі.
Кінеш рэдка — дасць Бог густа.
Дай жа, Божа, зарадзі ж, Божа,
Дай вяцвісты, ядраністы.
Святая сёмка — позна сяўба,
Позна сяўба — грэчку сеець,
На вуліцы стучыць, гручыць,
Гнайкі возіць, папар арэць.
Дзевятушка-памяжаначка
Па межах хадзіла, жытцо абзірала,
Жытцо абзірала дай раўнавала.
Дзесятуха красу давала,
А пяцінка красу здымала,
Красу здымала, пятку стаўляла.
Святы Іван коску правіць,
Лугі пратаць, у сцірты кідаць.
Святы Пятро — саўсім ядро,
Папар барануець, поле раўнуець,
Поле раўнуець, грунт гатуець.
Шыпілінка ў кузню ідзець,
У кузню ідзець, сярпы зубіць.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Збірай, ваша, стары сярпы
Да йдзі ў кузню напраўляці.
Кузнец-маладзец, зубі сярпец!
Табе платы — чырвон злоты,
Чырвон злоты табе на боты.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Да йдзі ж дамоў да аддай жане
Да маладзе новы сярпок.
Няхай ідзець твая жана
Ў чыста поле жытцо жаці
З ячным блінам, з белым сырам,
З белым сырам, з трэцім сынам.
Свята Ілля — старая жняя,

Яна жала, не ўважала,
Што раз зажнець, то сноп звяжэць.
Святыя Ганны да помачы сталі,
Вязь вязалі, копы клалі.
Святы Барысе, за мешань бярыся!
Святы Спас па полі ходзіць,
Копы лічыць, раскладаець:
Гэта на семя, гэта на емя!
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Сядлай, ваша, дай коніка,
Варанога, маладога,
Едзь жа, ваша, ў чыста поле,
У чыста поле копы лічыць.
Як на небе звёзды густы,
Гусцей таго ў полі копак.
Прачыстая да большая
Жытцо пасвянцала, засявала.
Дай меншая, дык лепшая,
Дык лепшая паненачка
Пераб Богам кланялася:
— Я ж, Божа, не гуляла,
Жытцо пахала, у грань паганяла,
У грань паганяла, яр збірала.
А Ян-сценцель руней сцеліць.
Узвіжанне — унясі ж, Божа,
Узнімі, Божа, з ільном, з аўсом,
З усім дабром у гуменца.
Святы пакроў пакрыў зямлю
Жоўтым лістом, маладым сняжком,
Ваду лёдам, пчалу мёдам.
Святы Зміцер — на ўсё хіцер:
Салады салодзіць, піва робіць,
Сыноў жэніць, дачок выдаець.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Ці ўслых табе наша песенька,
Наша песенька старасвецкая,
Што мы ходзім, Бога просім:
— Дай жа, Божа, зарадзі ж, Божа,
У пуні кладам, на таку ўмалотам,
У дзяжы падходам, у печы ростам,
У печы ростам, на стале насытам.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!

Дары гасцей, не баў, бардзей.
Нашы дары невялікія,
Невялікія — у дзверы не лезуць,
Праз аконца як шыць шыюць.
Дай мерачку за фатыгачку,
Чырвон злоты мне на боты,
Пачынальнічку — капу яек,
Братцам-памагальнікам — па дзесятачку.
Дай на дварэ ветрык веець,
Валачэбнічкам ножкі млеюць;
Дай на дварэ дожджык дыліць,
Валачобнічкам жывот ныіць.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Прасі к сабе гасцей ў хатку,
Сыр на талерку, кварту гарэлкі,
Кварту гарэлкі, пшонны пірог,
К таму пірагу місу тварагу.
Дай жа, Божа, каб васьмёркай пахалі,
Васьмёркай пахалі, дзевятым ганялі,
А дзесяты падбрыківаў,
А на адзінаццатым у дружкі ездзіць.

Да на першы дзень святых Вялікадней...

Да на першы дзень святых Вялікадней
Да віно ж віно зеляно!
Сабіраліся красны малойцы,
Красны малойцы валачобнічкі.
А ішлі ж яны да гуляючы,
Слаўнага сяла да пытаючы,
А ў тым сяле слаўнага пана,
Слаўнага пана, пана Івана.
Дапытаўшыся, прышлі пад ваконца.
— Ой ці ж дома ты, слаўны пане,
Ці спіш, ці ляжыш, ці адпачываеш?
Калі спіш, ляжыш — дык Бог з табою,
А не спіш, не ляжыш — дык гукай са мною.
Хоць і ўдома — не абзываецца,—
У новай каморы прыбіраецца:
Надзяе боты слуцкай работы,
Надзяе футру сабалёвую,
Надзяе шапку бабровую.
Паджыдае ён святых святачкаў,
Святых святачкаў — велікоднічкаў.

Першае свята — свято Вялічка,
Другое свята — свято Юр'я,
Трэцяе свята — святога Міколу.
Усе святыя пазбіраліся,
Аднаго святка ды нямашыка,
А якога святка? Святога Міколы.
Святы Юры, Божы ключнік,
Сядлай каня, едзь па Міколу.
Толькі Юрай на каня садзіцца —
Святы Мікола ідзе у вароты.
— Святы Мікола, дзе ты бываў?
Дзе ты бываў, што ты чуваў?
— Па барах хадзіў, пчолы садзіў,
Пчолкі садзіў раістыя,
Раістыя, медзяністыя;
Па межах хадзіў — жытцо радзіў,
Жытцо радзіў ядраністае,
Зярно к зярну, каласок у зямлю.
Каласок гнецца, жняі спадзяецца.
А хто ж тое жыта зажынаць будзе?
Зажынаць будзе пані гаспадыня,
Што раз разне, дык сноп нажне,
На ступень пражне, дык капу нажне.
Як на небе зоры часты-густы,
Так у полі копы часты-густы.
Ой, мы пелі, шчабяталі,
Як салавейкі ў ціхім лузе,
У ціхім лузе на каліне.
Чырвона каліна, не угібайся,
Слаўны пане, вазвелічайся.
Адзавіся, слаўны пане,
Ці ўслых табе наша песня,
Наша песня старасвецкая?
Калі ўслых табе — не тамі ж ты нас,
Не тамі ж ты нас — падары ж ты нас.
Выйдзі, выйдзі ды на ганачак,
Вынесь, вынесь ды падарачак
Срэбра-злота ды не важучы,
Ды не важучы ды не лічачы.
Срэбра-злота самі злічым,
Слаўнага пана ўзвялічым.
Слаўнаму пану песня спета,
Песня спета проці нова лета,
Проці новага і вясёлага.
Ой, жыві здароў і будзь багат

І з жаною маладою,
І з дзеткамі наймілейшымі,
І з брацелямі найкраўнейшымі,
І з суседзямі найбліжэйшымі.
Будзь здароў, як крынічна вада,
Будзь вясёл, як хароша вясна,
Будзь багаты, як сырая зямля.

А ў нядзелю да параненька...

А ў нядзелю да параненька
Ходзіць паніч ды па ганачку.
Ходзіць, ходзіць ды пахаджвае,
Сваю чаляданьку ды выклікае.
— Да ўстань, да ўстань, новая чаляданька,
Да мы пойдзем да новае стаенькі,
Да мы возьмем каня варанога,
Каня варанога, сядло залатое,
Да я паеду на руннае поле
Да свае ніўкі аглядаці.
Як выехаў за вароцечка,
Сустрачае Юр'я самога.
— Да куды едзеш, слічны панічу?
— Да еду на руннае поле
Свае ніўкі аглядаці.
— Да вярніся, слічны панічу,
Да твая ніва сей урадліва:
Да на карэнне караністая,
З сярэдзінкі да сцяблістая,
Да з каласочка каласістая...

Ішла хмара да хмарыстая...

Ішла хмара да хмарыстая,
Ехала войска украінскае,
Наперад яго царыч-паніч
На вараным кані увіхаецца,
Залатым мячом укладаецца.
Едзе поле, едзе і другое,
На трэцяе уз'язджае,
Зазывае турэцкага цара:
— Выйдзі, выйдзі, турэцкі цар,
Выйдзі ка мне ў поле ваяваці.
— Як я маю з князем ваяваці,
Лепей жа князю згоду даці:

Даці князю каня варанога,
Каня варанога, сто чырвон злот.
— Я гэта прымаю і табе не дзякую.
Пашла хмара да хмарыстая,
Ехала войска украінскае,
Наперад яго царыч-паніч,
Царыч-паніч малады Пятрусь
На вараным кані увіхаецца,
Залатым мячом укладаецца.
Едзе поле і другое,
На трэцяе ўз'язджае,
Вызывае турэцкага цара:
— Выйдзі, выйдзі, да турэцкі цар,
Выйдзі ка мне ў поле ваяваці.
— Як я маю з князем ваяваці,
Лепей жа князю згоды даці:
Даці князю каня варанога,
Каня варанога, сто чырвон злот,
Сто чырвон злот і крулеўначку.
— Я гэта прымаю і табе дзякую,—
Каня варанога — паязджаці,
Чырвон злоты купчаваці,
А крулеўначку за сябе ўзяці.

А мы паніча віншуемы,
Шчасця, долі жычыемы,
Патом таго да бывай здароў,
Бывай здароў да будзь багат,
Будзь багат да будзь весел,
Як салавейка ў ціхім лузе,
У ціхім лузе да на калінцы.
Тонка калінка, стой, не гібліся,
Красны панічык, гуляй, весяліся.

Ой на моры, моры ды на сіненькім...

Ой на моры, моры ды на сіненькім,
На камені ды на беленькім
Там паненка бель бяліла,
Бель бяліла, ручкі мыла,
Ручкі мыла, персня забыла.
Да прасіла свайго войчанька:
— Мой войчанька, мой родненькі,
Да паедзь, паедзь па мой персцень,

Да па мой персцень, да па залаценькі.
— Калі ж мой конь да не кованы,
Да не кованы да не поены,
Да на белы камень да не наступе,
Залатога персня ды не дастану.
Войчанька едзе, персня не вязе,
Персня не вязе, праўды не кажа.
А на моры, моры да на сіненькім
Да на камені да на беленькім
Там паненка бель бяліла,
Бель бяліла, ручкі мыла,
Ручкі мыла, персня забыла,
Да прасіла свайго брацетка:
— Мой брацетка, мой родненькі,
Да паедзь, паедзь па мой персцень,
Да па мой персцень да па залаценькі.
— Калі ж мой конь ды не кованы,
Да не кованы, да не поены.
Да на белы камень да не наступе,
Залатога персня да не дастану.
Брацетка едзе, персня не вязе,
Персня не вязе, праўды не кажа.
А на моры, моры ды на сіненькім
Там паненка бель бяліла,
Бель бяліла, ручкі мыла,
Ручкі мыла, персня забыла.
Да прасіла свайго мілага.
— Да мае коні падкаваны,
Падкаваны да напоены,
Да на белы камень да наступяць,
Да залаты персцень да дастану.
Міленькі едзе, персцень вязе,
Персцень вязе, усю праўданьку кажа.

Да ў кольнічку, ў агародзічку...

Да ў кольнічку, ў агародзічку
Тудэю ішло да дзевачак танок,
Да ўсе ж яны весялюсенькі,
Адна паненка хмурнюсенька.
Красна паненка на імя Ганначка
Загневалася на айца, на матку,
Што сукенку шылі, пакараціліі,
Ядвабным шнурам да не аблажылі,
Дзіце ж наша да міленькае,

Не гневайся, маладзенькае,
Мусіма краўцоў папрасіці
Да сукенку надтачыці,
Ядвабным шнурам аблажыці.

А ў тыночку ў вагародчыку...

А ў тыночку ў вагародчыку,
Да віно віно зеляно.*
Да ні мак-рожа зацвітала,
Слічна паненка сашчыпала,
Сашчыпала, у рукавец клала.
— Каб маё ліцо ды такое было,
Як гэта рожа да чырвоненько,
Не пашла б я ні за селяніна,
Ні за селяніна, ні за двараніна.
А пашла б я за такога пана,
Што з коніка не ссядае,
З стрэмя ножак не вымае,
Мяча з пляча не спушчае,
Шаблі з похвы не вымае.

Дай на Вялікдзень, дай на першы дзень...

Дай на Вялікдзень, дай на першы дзень
Дай віно ж віно зеляно!
Да ўсе святкі да гуляць пашлі,
Да ўсе святкі да гуляць пашлі.
Дай віно ж віно зеляно!
Адно адзін Юры да гуляць не йшоў,
Адно адзін Юры да гуляць не йшоў.
Да віно ж віно зеляно!
Дай на яго матка зажурылася,
Дай на яго матка зажурылася.
Да віно ж віно зеляно!
Не журыся, матка, не сварыся, родна,
Не журыся, матка, не сварыся, родна.
Да віно ж віно зеляно!
Я па мяжы хадзіў да жыцечка радзіў,
Я па мяжы хадзіў да жыцечка радзіў.
Дай віно ж віно зеляно!
Чыё, сынку, жыта дай найлепшае,
Чыё, сынку, жыта дай найлепшае?

* Паўтараецца пасля кожнага радка.

Дай віно ж віно зеляно!
Пана Лукаяна дай найлепшае жыта,
Пана Лукаяна дай найлепшае жыта.
Дай віно ж віно зеляно!
Найлепша дзяўчына жыта зажынала,
Жыта зажынала, ў тры радочкі клала.
Дай віно ж віно зеляно!
Першы радочак дзеля засявання,
Першы радочак дзеля засявання.
Дай віно ж віно зеляно!
А другі радочак дзеля спажывання,
А другі радочак дзеля спажывання.
Дай віно ж віно зеляно!
А трэці радочак гарэліцу гнаці,
Гарэліцу гнаці і сына жаніці.
Дай віно ж віно зеляно!
Дай жа, Божа, пане гаспадару,
Каб ваша дачка ўзрасла, ўскрасла
І да зялёных свят замуж пайшла.

Чый то домік на прыгорачку?..

Чый то домік на прыгорачку?
Да віно ж віно зялёнае!
Залаты тыночак, зыбкія варотцы,
Каля тыну пчолкі гудзяць,
Каля застрэшку галубкі шумяць,
А ў каморы краўцы сядзяць,
Краўцы сядзяць, шубу шыюць,
Шубу й шыюць самой пані,
Самой пані, пані гаспадыні.
Сукна многа — шуба доўга.
Наша гаспадынька расхадзілася,
Па бруку ходзе, брук падмятае.
Сваіх дзетак рана пабуджае:
— Устаньце, дзеткі, ранюсенька,
Умыйцеся бялюсенька,
Пойдзем жа мы ў новую абору.
У новай аборы яў з'явілася,
Сорак каровак ацялілася,
А йшчэ столькі пазначылася.
Як на небе зорка пакацілася,
Наша гаспадынька расхадзілася,
Шуба на апашак, у кішэні пляшак:

Сыра на талерку — запіваць гарэлку,
Скварку ў печ, па яйкі ў клець.

Добры вечар, ды паненачка!..

Добры вечар, ды паненачка!
Зялён явар, зялёны.*
Просім адамкнуць нам акеначка,
Просім пабачыць свайго каханага.
Твой жа каханы на коніку едзе,
На коніку едзе, бліжай пад'язджае,
Бліжай пад'язджае, тры падаркі мае:
Першы падарак — руцвяны вянак,
Другі падарак — залаты персцень,
[Трэці падарак — срэбраны кубак].
Руцвяным вянком павянчаціся,
Срэбраным кубкам мёд, віно піці,
Мёд, віно піці — не ўпіваціся,
Залатым перснем абмяняціся.
Просім выйсці к нам на ганачак,
Просім вынесці нам ды падарачак:
Сыр на тарэлку — закусіць гарэлку,
Парасё з хвастом валачы на стол,
Слаўная паненка, бывай здарова,
Бывай здарова, жыві багата!
Зелён явар, зелёны.

А ў матулькі адна дочка...

А ў матулькі адна дочка,
Сад зялёны, вішнёвы.*
Як вішанька ў садочку.
Пайшла ж яна ў садочак,
У садочак пагуляці,
Сабе грушку выбіраці.
Ды выбрала сабе грушку
Ды такую высокую.
На ёй сучча срэбранае,
На ёй лісце залатое.
Як напалі сільны ветры —
Сучча й лісце абарвалі.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Паненачка рана ўстала,
Умылася бялюсенька,
Зачасалася слізюсенька.
Пайшла ж яна у садочак,
Гэту шкоду забачыла,
Шоўкаў платок разаслала,
Сучча, лісце пазбірала,
У пучочкі павязала,
Пашла яна да злотнічкаў:
— Вы, злотнічкі-работнічкі,
Ды зрабіце мне тры выгоды:
Перша выгода — злоты кубак,
Друга выгода — злоты персцень,
Трэцяя выгода — злоты венец.
Злоты кубак — віно піці,
Злоты персцень — на мянянне,
Злоты венец — на вянчанне.
— Паненачка, не будзь горда,
Не будзь горда, будзь пакорна,
На малойцаў агляніся,
Нам, малойцам, аддарыся:
Ці серабром неважоным,
Ці золатам незлічоным,
Добрым часам, перад кірмашам!
Серабро сваё мы зважым —
Мы паненку не зняважым,
А золата самі злічым —
Мы паненку падвялічым.
Чырван злоты нам на боты,
Бо мы боты патапталі,
Пакуль панну дапыталі.
Паненачка, не будзь горда,
Не будзь горда, будзь пакорна,
Татку з мамкай пакланіся,
Нам, малойцам, адгадзіся.
Як не хочаш аддарыцца —
Пойдзеш з намі валачыцца.
Нашы сцежкі далёкія,
Нашы росы халодныя,
Нашы рэкі глыбокія:
Заросішся, замочышся.
Тады нам аддарышся,
Нейдзе ж нанач папросішся.
Паненачка, не будзь горда,
Не будзь горда, будзь пакорна,

На малойцаў агляніся,
Нам, малойцам, аддарыся:
Сыр на талерку, водкі бутэльку,
Пірог на стол і нас за стол.
Сад зялёны, вішнёвы.

А ў гародзе ды на пераходзе...

А ў гародзе ды на пераходзе
Стаіць ружа чырвоная,
Віно ж маё, віно зеляно!*
Выйшла-выбегла красна паненка,
Красна паненка, на імя Аленка,
Вышчыкнула з ружы кветку
Ды меркавала к свайму лічку.
— А дай, Божа, такое лічка,
Як із ружы гэта кветка,
То пайшла б я за садавода,
Бо садавод сады садзіць,
Першы садок — ды вішнёвы,
Другі садок — ды чарашнёвы,
Трэці садок — краснае паненкі,
Краснае паненкі, маладой Аленкі.
Гэта песня табе спета,
Песня спета проці лета,
А што, панна, за дар дасі?
Сорак яек на паўміску,
Каўбасою абкружыўшы,
Белым сырам завяршыўшы,
Віно ж маё, віно зеляно!

Ой, на азярыне ды на сіненькай...

Ой, на азярыне ды на сіненькай,
Вясна красна на ўвесь свет!
На кладачцы ды на гібенькай,
Зялёны явар, зялёны!**
Там дзяўчына бель бяліла,
Бель бяліла, ручкі мыла,
Ручкі мыла, персцень ураніла.
Дзе бралася шчука-рыба,

---

* Паўтараецца пасля кожных двух радкоў.

** Прыпевы «Вясна красна на ўвесь свет!» і «Зялёны явар, зялёны!» паўтараюцца па чарзе праз адзін радок.

З хваль нырнула, персцень праглынула.
А к той азярыне ды па лугавіне
Ішлі-брылі тры малойчыкі,
Тры малойчыкі-рыбалоўчыкі
Ішлі на нерат, неслі невад.
— Ой, мілыя мае тры малойчыкі,
Тры малойчыкі-рыбалоўчыкі,
Вы злавіце шчуку-рыбачку,
Адбярыце залаты персцень.
Я ж вам буду ў вялікай адгодзе:
Аднаму буду суседкаю,
Другому буду швагеркаю,
Трэцяму, згадаем, сама маладая.
Я да суседа агню пайду,
Я да швагра ў госці паеду,
А з каханым век жыць буду.
— Дзяўчыначка-журавіначка,
Загадаем табе сем загадак.
Адгадаеш — персцень атрымаеш.
Не адгадаеш — нас не дачакаеш.
А што шэпча без говара?
А што бяжыць без повада?
А што расце без кораня?
А што чорна не чэрнячы?
А што бела не белячы?
А што стогне без немачы?
А што ўецца паверх дрэва?
— Вецер шэпча без говара,
Вада бяжыць без повада,
Камень расце без кораня,
Снягі белы не белячы,
Воран чорны не чэрнячы,
Свіння стогне без немачы,
Хмель віецца паверх дрэва.

Авёс зелен, позна сеян...

Авёс зелен, позна сеян.
А ў тым аўсе да мяжа ляжыць,
Да той мяжой да куна бяжыць.
Куна бяжыць з кунаняткамі.
Вышаў, выцек красны панічак,
Стрэліць, меціць да куну забіць.
Стала куна прасіціся:
— Не бі, не рубі мяне.

Скажу табе тры радасці:
Першая радасць — маткі слухаць,
Другая радасць — ажаніціся,
Трэцяя радасць — каралю служыці.
Маткі слухаць, то збавен будзеш,
Ажаніціся, то багат будзеш,
Каралю служыць, то славен будзеш.

Ой, на моры, на сінім Дунаі...

Ой, на моры, на сінім Дунаі,
Віно ж маё зеляно!*
Ляжыць кладка брусаваная,
А масточкі ўсе каваныя.
Тудой ішло семсот коней,
Усе кладачкі пазгібаліся,
А масточкі паламаліся,
Семсот коней утапілася.
Скуль узяўся красны панічык,
Красны панічык, малады Андрэйка,
Ляціць-бяжыць, гукаючы,
Свайго каня шукаючы:
— Вот не жаль жа мне семсот коней,
Вот жаль жа мне аднаго каня:
З яго рота цякло злота,
Ён капыцікам камень разбівае,
Ён хвосцікам вулку падмятае,
Ён вушкамі неба падпірае,
Ён вочкамі зорачкі шчытае,
Ён Андрэйку паненку шукае.

А ў лесе, лесе да на верасе...

А ў лесе, лесе да на верасе,
Там хадзіла стада коней,
Між тых коней вараны конік,
Ніхто таго каня не спаймае,
Не спаймае, ані асядлае.
Абабраўся слічны паніч,
Слічны паніч, малады Міколка.
Ён таго каня і спаймае,
І спаймае, і асядлае.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Асядлаўшы да й паедзе,
І ён паедзе з гары пад гару,
Напроціў турка ваяваці.
А вывеў турак варанога каня;
І ён на таго каня ані ўзгляне,
Ані ўзгляне, і вачэй не падыме:
— Не хачу з туркам да гадзіціся,
А кажу з туркам ваяваціся.
А вынес турак паўмісак злота:
І ён на тыя злоты ані ўзгляне,
Ані ўзгляне і вачэй не падыме:
— Не хачу з туркам пагадзіціся,
А кажу з туркам ваяваціся.
А вывеў турак слічную панну:
І ён на тую панну як сокал глядзіць,
Як сокал глядзіць і за ручку дзяржыць:
— Не кажу з туркам ваяваціся,
А кажу з туркам пагадзіціся.

Добры вечар, слічны панічок!..

Добры вечар, слічны панічок!
Вясна красна на ўвесь свет!*
Хоць і дома — не акажацца,
У каморы прыбіраецца.
Ён сеў сабе за столікам,
Піша пісьмы ў тры зямлі,
Піша пісьмы, размячае,
У тры зямлі раскладае:
У першую — па коніка,
У другую — па золата,
У трэцюю — да паненкі.
Па коніка пасла пашлю,
Па золата — таварыша,
Па паненку сам паеду.
На коніку пад'язджаць буду,
А золатам шахаваць буду,
А з паненкай векаваць буду.
Табе, панічок, песня спета,
Песня спета проці лета,
Лета цёплага і вясёлага.
Дай жа, Божа, за рок дачакаці,
Гэтага паніча панам назваці.
Вясна красна на ўвесь свет!

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

У цёмным лесе стучыць, гручыць...

У цёмным лесе стучыць, гручыць,
Вясна красна на ўвесь свет!*
Мы ж думалі, што гром грыміць,
Аж моладзец борць дзяўбаіць,
Борць дзяўбаіць, пчолак садзіць,
Пчолак садзіць, Бога просіць,
Каб пчолачкі зляталіся.
Зляталіся, звіваліся,
Дый малойцу асталіся —
Дый за працу мядок насіць.
Вясна красна на ўвесь свет!

Дзень вялік, дзень вялік...

Дзень вялік, дзень вялік,
А лустачка мала:
Не свая мамка
Лустачку давала.
У каго свая мамка,
Дык дала краюшку,
Дык дала краюшку.
«Напасі цялушку!
Калі не з'ясі —
Пастушкам дасі,
А калі мала —
Дамоў пабяжы».
А мне мачыха
Дык дала скарынку,
Дык дала скарынку.
«Напасі скацінку!
Калі не з'ясі —
Дык дамоў нясі,
А калі мала —
Дык каб парвала».

А на першы дзень, на Вялікадня...

А на першы дзень, на Вялікадня,
Вясна красна, дзень цёплы!*
Валачобнікі валачыліся,
Па калені памачыліся,
Зайшлі к бабцы, пасушыліся.
Дала бабка усім па яечку,
А свайму ўнучку — два яечкі ў ручку.
Адной сіраце да не выйшлася,
Да не выйшлася, да не высталася.
Пайшла сірата за новыя вараты,
Не падзякаваўшы да заплакаўшы.
Вярніся, сірата, цябе Бог кліча,
Цябе Бог кліча, табе долю дае,
Каня варанога, князя маладога.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Як пайшоў Мікола...*

Як пайшоў Мікола
У чыстае поле,
У чыстае поле
Жыта аглядаці.
Радзі, Божа, жыта,
Радзі, Божа, жыта
Густа, каласіста,
Густа, каласіста,
Ядром ядраніста.
А ехалі госці
З чужое валосці,
У бару начавалі,
У бару начавалі,
Пад сасной агонь клалі.
Каб гэта сасёнка
Да на нашу старонку,
Да на нашу старонку.
А з гэтае сосны
Было б тры угоды,
Было б тры угоды.
У коране сосны
Ды густое жыта,
Ды густое жыта.
У сярэдзіне сосны
Ды ярыя пчолы,
Ды ярыя пчолы.
А ў вярхушцы сосны
Ды звонкія гуслі,
Ды звонкія гуслі.
А мы б з таго жыта
Піва наварылі,
Піва наварылі.
У сярэдзіне сосны
Ярых пчол лавілі,
Ярых пчол лавілі.
Мяды выбіралі
Ды воскі тапілі,
Ды воскі тапілі.
Мы б жыта выжалі,
У гусельк і іралі,
У гусельк і іралі.

ЮРАЎСКІЯ ПЕСНІ

Юр'я, Юр'я...

Юр'я, Юр'я,
Божа мой,**
Падай ключы
Зямлю адмыкаць,
Бычка напасаць!
На Юр'еву расу
Бычка папасу:
— Бычок, трацячок,
Ці повен бачок?
— Яшчэ не повен,
З левым не ровен.

Юры, ўставай рана...

Юры, ўставай рана,
Адмыкай зямлю,
Выпускай расу
На цёплае лета,
На буйнае жыта,
На ядраністае,
На каласістае!
Пойдзем, дзявочкі,
У лугі-лужочкі
Завіваць вяночкі
На годы добрыя,
На жыта густое,

* Мікольская.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

На ячмень каласісты,
На авёс расісты,
На грэчку чорную,
На капусту белую!

Ой ты, Юр'я, Мікола...

Ой ты, Юр'я, Мікола,
Абыдзі жыта наўкола,
Юр'я кажа — абайду,
Мікола кажа — пагляджу.
Юр'я кажа — караніста,
Мікола кажа — каласіста,
Юр'я кажа — у копачкі,
Мікола кажа — ў торпачкі.
Юр'я кажа — з прыкроем,
Мікола кажа — з прыпёкам.

Ой, выйду я на вулачку...

Ой, выйду я на вулачку, бычкі бушуюць,
Юр'я, Юр'я, бычкі бушуюць.

Бычкі бушуюць, бо вясну чуюць,
Юр'я, Юр'я, бо вясну чуюць.

Загулі рэчкі, ляды паплылі,
Юр'я, Юр'я, ляды паплылі.

Зачарнела зямліца, бо пааралі,
Юр'я, Юр'я, бо пааралі.

Задрыжала бяроза, бо папукалася,
Юр'я, Юр'я, бо папукалася.

Завесялела дуброва, птушкі спяваюць,
Юр'я, Юр'я, птушкі спяваюць.

Зазелянела даліна, кветкі зацвілі,
Юр'я, Юр'я, кветкі зацвілі.

Ой, выйду я, выйду кветкі збіраці,
Юр'я, Юр'я, кветкі збіраці.

Кветкі збіраці, вяночкі віці,
Юр'я, Юр'я, вяночкі віці.

Вяночкі віці, Юр'я спяваці,
Юр'я, Юр'я, Юр'я спяваці.

А Юр'ева матка каля рэчкі хадзіла...

А Юр'ева матка каля рэчкі хадзіла,
Каля рэчкі хадзіла, ключыкі-замочкі насіла.
Ключыкі-замочкі насіла, зямельку адмыкала,
Зямельку адмыкала ды травіцу выпускала.
Ах вы, жонкі-бухонкі, вы ўставайце раненька,
Вы ўставайце раненька, вы ганіце каровак.
Вы ганіце каровак да на Юр'еву раўсу,
Да на Юр'еву расу, да на Божую красу.

Павядзём Юр'е да бору...

Павядзём Юр'е да бору
Да пасадзім Юр'е на хвою.
Няхай наша Юр'е пасядзіць
Да болей свету паглядзіць.
Дзе наша Юр'е хадзіла,
Там наша жыта ўрадзіла,
А дзе наша Юр'е юравала,
Там наша жыта красавала.

Юр'ева маці ўпроч пайшла...

Юр'ева маці ўпроч пайшла,
Залатыя ключы панясла.
Юр'ева маці, вярніся —
Залатыя ключы найшліся.
Адамкні зямліцу,
Выпусці расіцу
На зялёную травіцу,
На здраёву вадзіцу.

Да што там у стайні стучэла?..

Да што там у стайні стучэла?
Звінела кола, звінела.
Малады Янка каня сядлае,
Яго татачка пытае:
— Куды ты, сынку, паедзеш?
Ці ў вёску, ці ў мястэчка?
Не едзь, сынку, у мястэчка,
Бо там дзевачкі лянівы:
Высока ржышчы зжынаюць,
А рэдка копы стаўляюць.

Да што там у стайні стучэла?
Звінела кола, звінела.
Малады Янка каня сядлае,
Яго татачка пытае:
— Куды, сынку, паедзеш,
Ці ў вёску, ці ў мястэчка?
Да едзь, сынку, у вёску,
Там дзевачкі рабочы:
Нізка ржышча зжынаюць,
Густа копы стаўляюць.

Юр'я, уставай рана...

Юр'я, уставай рана,
Умыйся бела,
Да кладзі боты,
Надзявай сукні,
Да сядлай каня,
Да бяры ключы,
Да едзь у поле,
Адмыкай зямлю,
Выпускай расу
На лён, на пшаніцу,
На усяку пашніцу.

Юр'е, добры вечар!..

— Юр'е, добры вечар,
Юр'е, падай ключы.
— Бацько, каторыя?
— Сынку, зямлёвыя,
Зямлю адмыкаці,
Расу выпушчаці.
Раса — 'ля каровак,
Трава — 'ля конікаў,
Лаза — 'ля козачак,
Дзягель — 'ля свіначак,
Мурог — 'ля авечак.

Юр'ева матка ў свет пайшла...

Юр'ева матка ў свет пайшла,
Гэй, Юр'ю, Юр'ю, святы Юр'ю!
З сабой ключы панясла.
— Юр'ева маці, вярніся:
Адамкні зямліцу, выпусці расіцу.
Радзі, Божа, жыта на новае лета.
У зямлі ядраніста, увярху каласіста,
Жменечкі гусценькі, снапочкі часценькі,
У старане прыкладна, на таку ўмалотна,
У печы прысушна, у жорнах прымольна,
У дзяжы падходна, у печы прыпечна,
Чаляданцы сытна і панам слаўна.

Й матка Юр'я клікала, гэй...

Й матка Юр'я клікала, гэй.
— Да падай, сынку, ключыкі,
Да падай, сынку, ключыкі, гэй,
Да адамкнуці зямліцу,
Да адамкнуці зямліцу, гэй,
Ды выпусціці расіцу,
Да выпусціці расіцу, гэй,
Да на ярую пшаніцу,
Да на ярую пшаніцу, гэй,
На ціхое лецечко,

Да на ціхое лецечко, гэй,
Да на буйнаё жыцечко.

Дзе ты, Юр'е, ўрасіўся?..

— Дзе ты, Юр'е, ўрасіўся?
Дзе ты, Юр'е, ўмачыўся?
— Па далах, па росах ходзячы,
Людзям жыта родзячы.
Дабро жыта да дабро,
Радзі, Божа, налета,
Радзі, Божа, налета
Да лепшае за гэта:
У корані караністае,
У саломцы сцяблістае,
У саломцы сцяблістае,
А у коласе каласістае.
У роўным полі капамі,
У цёмным гумне тарпамі.
У цёмным гумне тарпамі,
А у сверне засякамі.
А у сверне засякамі,
А на стале баханамі.

А ты Юр'я, Мікола...

— А ты, Юр'я, Мікола,
Абыдзі жыта наўкола.
Юр'я кажа: «Абыду».
Мікола кажа: «Пагляджу».
Юр'я кажа: «У пучочкі».
Мікола кажа: «У каласочкі».
— Дзе ты, Юр'я, ўрасіўся?
Дзе ты, Мікола, ўмачыўся?
— Горы, межы ходзячы,
Жыта, пшаніцу родзячы.
Жыта, пшаніцу — то дабро.
Да дай, Божа, налета,
Да дай, Божа, налета
Лепшую ўроду за гэта.

Юрайка, Юрайка, ці зелена мураўка?..

— Юрайка, Юрайка, ці зелена мураўка?
— Траўка-мураўка зеляненька,

На вуліцы дзевачак поўненька,
Траўка-мураўка пабялела,
На вуліцах дзевак пагалела:
Да ішоў дожджык дробненькі,
Памачыў рукавец тоненькі.

Разгуляўся Юр'еў конь...

Разгуляўся Юр'еў конь,
Разбіў камень капытом.
Як у камені зерне ёсць,
Так у хлопцаў праўда ёсць.

Разгуляўся Юр'еў конь,
Разбіў гарэх капытом.
Як у гарэху зерне ёсць,
Так у дзяўчынак праўда ёсць.

А вы, хлопчыкі, бяжыце,
Вашы конікі ў жыце.
А ты, мілы, не бяжы,
Бо твой конік на мяжы.

КАРАГОДНЫЯ

Ды хадзіў карагод...

Ды хадзіў карагод
Каля нашых варот.

Ой, люлі, ой, люлі,
Каля нашых варот.*

**Я чула, бачыла,
Не паспела сказаць,**

**Карагодам назваць
Ды у хату пазваць,**

**Ды у хату пазваць
І віном частаваць.**

Завілася пчолка над варотамі...

Завілася пчолка над варотамі.
Гэй, люлі, гэй, люлі. **
Красна сонца заіграла над людзьмі.

---

* Прыпеў «Ой, люлі, ой, люлі» паўтараецца з другім радком кожнай страфы.

** Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Што ж ты, вясна, наша красна, прынясла?
Прынясла цёпла летца дзеля вас.
Малым дзеткам па яечку,
Старым бабкам па кіёчку,
Красным дзеўкам па вяночку,
Маладушкам па сярпочку.
Стары бабкі чапцы шыці,
Красны дзеўкі вянкі віці,
Маладушкі жыта жаці.
Красны дзеўкі на вулачку,
Маладушкі за люлечку.
Красны дзеўкі гулі ды гулі,
Маладушкі люлі ды люлі.

Ды рынула вада з Дуная...

Ды рынула вада з Дуная,
З Дуная ціхага, з беражка крутога.
Там тры конюхі да коней паілі.
Ды рынула вада з Дуная,
З Дуная ціхага, з беражка крутога.
Там тры дзевачкі да ваду бралі.
Да рынула вада з Дуная,
З Дуная ціхага, з беражка крутога.
Іваначка кажа, я Ганначку люблю,
Я Ганначку люблю і за сябе вазьму.
Да рынула вада з Дуная,
З Дуная ціхага, з беражка крутога.
Васілька кажа, я Кулінку люблю,
Я Кулінку люблю і за сябе вазьму.
Да рынула вада з Дуная.
З Дуная ціхага, з беражка крутога.
Міхалачка кажа, я Алёну люблю,
Я Алёну люблю і за сябе вазьму.
Да рынула вада з Дуная.
З Дуная ціхага, з беражка крутога.

Устань рана, перапёлачка...

— Устань рана, перапёлачка,
Устань рана, маладзенькая.
— Я ж устала, мае дзевачкі,
Я ж устала, мае сястрыцы.
— Умыйся бела, перапёлачка,
Умыйся бела, маладзенькая.

— Я ўмылася, мае дзевачкі,
Я ўмылася, мае сястрыцы.
— Учашыся слізка, перапёлачка,
Учашыся слізка, маладзенькая.
— Я ўчасалася, мае дзевачкі,
Я ўчасалася, мае сястрыцы.
— Надзень сукенку, перапёлачка,
Надзень сукенку, маладзенькая.
— Я ж надзела, мае дзевачкі,
Я ж надзела, мае сястрыцы.
— Прывяжы каралькі, перапёлачка,
Прывяжы каралькі, маладзенькая.
— Я ж прывязала, мае дзевачкі,
Я ж прывязала, мае сястрыцы.
— Надзень панчошкі, перапёлачка,
Надзень панчошкі, маладзенькая.
— Я ж надзела, мае дзевачкі,
Я ж надзела, мае сястрыцы.
— Абуй чаравічкі, перапёлачка,
Абуй чаравічкі, маладзенькая.
— Я ж абула, мае дзевачкі,
Я ж абула, мае сястрыцы.
— Прытанцуй нам, перапёлачка,
Прытанцуй нам, маладзенькая.

Як пушчу стралу...

Я пушчу стралу
Па ўсяму сялу,*

Ды ідзі, страла,
Да уздоўж сяла,

Да зайдзі, страла,
К добру молайцу,

Да убі, страла,
Добра молайца.

Да й што па молайцу
Некаму плакаці:

Матка старая,
Сястра малая,

А жана молада
Жыве каля горада.

Ой, дзе конік бяжыць,
Там зямля дрыжыць,

Дзе сястра жыве,
Ручаі плывуць,

А дзе жонка жыве,
Пажары гараць.

* Кожная страфа паўтараецца.

А мы ляда капалі, капалі...

— А мы ляда капалі, капалі,
Зеляна наша дуброва, дуброва!

— А мы проса сеялі, сеялі,
Зеляна наша рутачка, жоўты цвет!

— А мы коней іспусцім, іспусцім,
Зеляна наша дуброва, дуброва!

— А мы коней пабярэм, пабярэм,
Зеляна наша рутачка, жоўты цвет!

— А за коней сто рублей, сто рублей,
Зеляна наша дуброва, дуброва!

— Мы не хочам сто рублей, сто рублей,
Зеляна наша рутачка, жоўты цвет!

— Ой, дайце нам дзеўчыну-паненку,
Зеляна наша дуброва, дуброва!

— За паненку слова нет, слова нет!
Зеляна наша рутачка, жоўты цвет!

Пастаўлю й свячу проціў месяца...

Пастаўлю й свячу проціў месяца,
Ціха йдзе.
Да вада па каменю, да вада па беламу
Ціха йдзе.

Да не будзе свёкарка, як мой бацюхна,
Ціха йдзе.
Да вада па каменю, да вада па беламу
Ціха йдзе.

Да не будзе свёкраўка, як мая маманька,
Ціха йдзе.
Да вада па каменю, да вада па беламу
Ціха йдзе.

Да не будзе залвіца, як мая сястрыца,
Ціха йдзе.

Да вада па каменю, да вада па беламу
Ціха йдзе.

Да не будзе дзеверка, як мой браціхна,
Ціха йдзе.
Да вада па каменю, да вада па беламу
Ціха йдзе.

Медуніца, медуніца лугавая...

— Медуніца, медуніца лугавая,
Ай, лугавая,
Чом не пахнеш, чом не пахнеш на ўсём лугу,
Ой, на лужочку?
— Як мне пахнуць, як мне пахнуць на ўсём лугу,
Ой, на лужочку?
Стары бабы, стары бабы прысядзелі,
Прысядзелі,
Маладухі, маладухі прыстаялі,
Прыстаялі,
Красны дзеўкі, красны дзеўкі прыскакалі,
Прыскакалі.

Як ад кута да парога...

Як ад кута да парога
Да ўсё жаніхі.
— Скажы, Насця, скажы, дзеўка,
А дзе ж твой?
— Сядзіць на ўслонцы да ліча чырвонцы —
От то ён.
Як ад кута да парога
Да ўсё жаніхі.
— Скажы, Праня, скажы, дзеўка,
А дзе ж твой?
— Ой, сядзіць на куце, як рожа, цвіце —
От то ён.
Як ад кута да парога
Да ўсё жаніхі.
— Скажы, Пракседа, скажы, дзеўка,
А дзе ж твой?
— Ой, сядзіць на куце да лапці пляце —
От то ён.
Як ад кута да парога
Да ўсё жаніхі.

— Скажы, Васіліна, скажы, дзеўка,
А дзе ж твой?
— Ой, лезе з-пад лаўкі, вочы-булаўкі —
От то ён.
Як ад кута да парога
Да ўсё жаніхі.
— Скажы, Домна, скажы, дзеўка,
А дзе ж твой?
— Ой, лезе із грушы, ў гразі па вушы —
От то ён.

Дуброва мая зялёная...

Дуброва мая зялёная,
Я ж па табе пахадзіла.
Я ж у табе заблудзіла.
Клікаў татка — не пачула,
Па галасочку не пазнала,
Родным татанькам не назвала.
Дуброва мая зялёная.
Я ж па табе пахадзіла,
Я ж у табе заблудзіла.
Клікала мамка — я й не пачула,
Роднай мамкаю не назвала.
Дуброва мая зялёная,
Я ж па табе пахадзіла,
Я ж у табе заблудзіла.
Клікаў брацетка — я не пачула,
Па галасочку не пазнала,
Родным брацеткам не назвала.
Дуброва мая зялёная,
Я ж па табе пахадзіла,
Я ж у табе заблудзіла.
Клікаў мілы — я й пачула,
Па галасочку яго пазнала,
Мілым дружком яго назвала.

У майго татулькі сад над ракою...

У майго татулькі
Сад над ракою,
Сад над ракою,
Двор на даліне.
Пусці, татулька,
У сад пагуляці,
Не буду тваіх
Вішань шчыпаці,
Толькі вышчыпну
Вінаградзінку,
Занясу матульцы
На парадзінку.

— Парай, матулька,
Што мне рабіць:
Ці замуж ісці,
Ці дома быць?

Замуж зайшоўшы,—
Вяліка гора,
Дзеўкай старэці,—
Людская размова.

Пры лужку бела бярозка зашумела...

Пры лужку бела бярозка зашумела,
Пра людскую нядолечку песні пела.
А пад вечар яна ціханька стаяла,
У захад сонца мілага госцечка ждала.
К ёй прыязджаў бел-малойчык начаваці,
Яму ж была бярозка, як родная маці.
Няма мамкі ў яго роднай, ні куточка,
Толькі белая бярозка ля лужочка.
І з радасцю малойчыка прынімала,
Між карэння на лісточку пасцель слала.
Рання зорка ўжо на небе патухала,
Ужо бярозка малойчыка будзіць стала:
— Уставай жа, мой саколік, досыць спаці,
Пара коні вараныя з лугу браці.
Бо твой татка не родненькі раскрычыцца,
Твая мамка не родная зажурыцца!
Пакланіўся бел-малойчык на зямельку,
Падзякаваў бярозачцы за пасцельку:
— Я паспаўся ў бярозачкі на карэнні,
Як у роднай матулечкі на калені,—
Я выспаўся ў бярозачкі на лісточку,
Як у роднай матулечкі ў прыпалочку.

Вылятала галачка, вылятала...

Вылятала галачка, вылятала...
Выбівала аконца, выбівала,
Каб матулька дачушку пабуджала:
— Устань, дачушка, бела ўмыйся,
Вазьмі грабёначак, учашыся,
Ідзі ў камору прыбярыся,
А выйдзі на вулачку агляніся.
Правадзіла мамка дачку, правадзіла,
Праз высокія горы — з капачамі,
А праз цёмныя бары — з агнямі,
Праз вялікі сёлы — з скрыпкамі.
Дзе матуля із дачушкай сядзела,
Там вырасла мята-рута, лілея,

Дзе матуля із дачушкай стаяла,
Там вырасла яблынька чудавая,
Дзе матуля із дачушкай рассталася,
Слязлівая рэчка разлілася.

ТРАЕЦКІЯ, КУСТАВЫЯ, РУСАЛЬНЫЯ ПЕСНІ

Пойдзем, дзевачкі...

Пойдзем, дзевачкі,
Ва лугі, лужочкі
Завіваць вяночкі.
Мы заўём вяночкі
На годы добрыя,
На жыта густое,
На ячмень каласісты,
На авёс расісты,
На грэчку чорную,
На капусту белую.

Пойдзем, дзевачкі...

Пойдзем, дзевачкі,
Мы ў гай гуляць,
Ай люлі, люлі,
У гай гуляць.
У гай гуляць,
Вянкі завіваць.
Як заўём вянкі,
Ды на ўсе святкі,
Ай люлі, люлі,
Ды на ўсе святкі.
На духоўскія
І на пятроўскія.
Ой, дух-тройца,
Ты субор дзеўкам,
Ай люлі, люлі,
Субор дзеўкам,
А святы Ілля —
То разгон дзеўкам,
Ай люлі, люлі,
То разгон дзеўкам.
Разагнаў дзевак
Па чыстым полі,
Ай, люлі, люлі,
Па чыстым полі,
Па ельнічку,
Па бярэзнічку,
Ай люлі, люлі,
Па бярэзнічку.

Пойдзем мы, дзеванькі, на луг гуляці...

Пойдзем мы, дзеванькі, на луг гуляці,
Люлі, люлі, на луг гуляці.
Мы саўём вяночкі, мы саўём зялёныя,
Люлі, люлі, саўём зялёныя.

Пусцім мы вяночкі на чыстыя воды,
Люлі, люлі, на чыстыя воды.
Вяночкі, плывіце, пра долю кажыце,
Люлі, люлі, пра долю кажыце.
Ці будзем мы жывы да цёплага лета,
Люлі, люлі, да цёплага лета.
Ці спалюбяць нас хлопцы удалы,
Люлі, люлі, хлопцы удалы.
Ці павядуць нас у свае дамы,
Люлі, люлі, у свае дамы.

За рэчкаю, за быстраю...

За рэчкаю, за быстраю,
Слабодка стаіць*.

Небальшая слабодачка —
Чатыры •двары.

Ой, а ў той жа слабодачке
Чатыры кумы.

Вы кумушкі-галубушкі,
Падружкі мае,

Куміцеся, любіцеся,
Любіце й мяне.

Як будзеце ў зялён сад ісці,
Гукайце й мяне,

Як будзеце красачкі рваць,
Нарвіце і мне,

Як будзеце вяночкі віць,
Савіце і мне,

Як будзеце на галоўкі класць,
Кладзіце і мне,

Як будзеце на Дунай пускаць,
Пусціце і мой.

---

* Кожная страфа паўтараецца.

А ўсе вянкі паверх пайшлі,
А мой на дно паў,

А ўсе дружкі з вайны прыйшлі,
А мой запрапаў.

Ай, не радуйся, зялёны дуб...

Ай, не радуйся, зялёны дуб,
Ай, не радуйся, зялёны,
Не к табе ідзём вянкі развіваць,
Не к табе ідзём вянкі развіваць.
Ай, узрадуйся, бяроза,
Ай, узрадуйся, белая,
Мы к табе ідзём вянкі развіваць,
Мы к табе ідзём вянкі развіваць.
Разаўём вянкі на святкі,
Разаўём вянкі на святкі,
На гадавыя празнічкі,
На гадавыя празнічкі.
А мы вяночкі развілі,
А мы вяночкі развілі,
Мы гарэлачку папілі,
Мы гарэлачку папілі,
Мы яешаньку паелі,
Мы яешаньку паелі.

Не радуйся, клён да ясення...

Не радуйся, клён да ясення,
Не к табе ідуць дзеўкі красныя,
Не табе нясуць яешні смашныя,
Гарэлку горкую, скрыпку звонкую.
Ай, люлі, ай, люлі!
Ай, люлі, люлі, люлі!
Ты радуйся, белая бяроза,
К табе ідуць дзеўкі красныя,
Табе нясуць яешні смашныя,
Гарэлку горкую, скрыпку звонкую.
Ай, люлі, ай, люлі!

Ох, мы ж былі у харошаму й бору...

Ох, мы ж былі у харошаму й бору
І звілі куста ж із зялёнага клёну.

І звілі куста із зялёнага клёну
Да прывялі куста ды й да слаўнага двору.

Да прывялі куста ды й да слаўнага двору,
Проша пана выйці із новага ж пакою.

Проша нам вынесці тры барылкі гарылкі,
Мы прывялі куста да харошых тры дзеўкі.

Ой, у нашага куста ножанькі невялічкі,
Ой, проша вынесці да хоч на чаравічкі.

Прывялі куста, зеляненькага клёна...

Прывялі куста, зеляненькага клёна.
Дай нам, пане, хоць па залатому,
Дай нам, пане, тры барыла гарэлкі,
Прывялі куста да харошай дзеўкі.
Да не тут кусту да стоем стаяці,
Трэба кусту піці-есці даці,
Трэба кусту да добрая выгода,
Трэба кусту крынічная вода.

Пойдзем, дзевачкі, у шчыры бор...

Пойдзем, дзевачкі, у шчыры бор
Да зрубаема высокі клён,
Да выкалемо тры дошчачкі,
Да зробімо тры бочачкі:
У адной бочачцы — салодак мядок,
У другой бочачцы — зялёна віно,
У трэцяй бочачцы — горкае піва.
Саладок мядок — то для дзевачак,
Зялёна віно — то для малодачак,
А горкае піва — для малойчыкаў.

Ці ты бывала, тройца, ці бывала?..

Ці ты бывала, тройца, ці бывала?
Ой, я й, маладая, не ўгадала,
Я і, маладая, не ўгадала...
Я і, маладая, на вуліцы не бывала.
Да й на вуліцы я й не бывала,
Эх, мяне мая мамачка не пушчала.
Мяне мая мамачка не пушчала,

Ой, да й у каморку, ой, запірала.
Да й у каморку, эх, запірала,
А ў каморачцы акенечка.
А ў каморачцы ды акенечка,
А там мне, маладой, ой, бядненечка.
А там мне, маладой, бядненечка,
А на вуліцы дымок, ох, да ідзе.
А на вуліцы дымок ідзе,
А там мой міленькі танок вядзе.
А там мой міленькі танок вядзе,
А ў левай руцэ ён вянок нясе.

На Граной нядзелі...

На Граной нядзелі
Русалкі сядзелі,
Ой, раны-раненькі,
Русалкі сядзелі.

Русалкі сядзелі,
На дзевак глядзелі.
Ой, раны-ранецькі,
На дзевак глядзелі.

— Дзевачкі-сястрыцы,
Падайце вадзіцы,
Ой, раны-раненькі,
Падайце вадзіцы.

Падайце вадзіцы
З халоднай крыніцы,
Ой, раны-раненькі,
З халоднай крыніцы.

А хлопчыкі-браццы,
Вы спляціце лапці,
Ой, раны-раненькі,
Вы спляціце лапці.

Павяду русалку...

Павяду русалку
Із бору да бору,
Рана-рана,
Із бору да бору.

Із бору да бору
Ў зялёну дуброву,
Рана-рана,
Ў зялёну дуброву.

Ў зялёну дуброву,
У ядраное жыта,
Рана-рана,
У ядраное жыта.

У ядраном жыце
Там русалцы жыці,
Рана-рана,
Там русалцы жыці!

Правяду русалку, правяду...

Правяду русалку, правяду
Дай асінкаю заламлю,
Каб тая русалка па жыце не хадзіла,

Майго жыта не ламіла.
Маё жыцейка дробнае
Да ў каласку буйнае.
Правяду русалку, правяду
Дай асінкаю заламлю.

На Граной нядзелі...

На Граной нядзелі
Русалкі сядзелі,
Рана-рана,
Русалкі сядзелі.

Правяду русалак
Із бору да бору,
Рана-рана,
Із бору да бору.

Із бору да бору,
У зелену дуброву,
Рана-рана,
У зелену дуброву.

Штоб не ласкаталі,
У зіму не лякалі,
Рана-рана,
У зіму не лякалі,

У зіму не лякалі,
Улетку не пужалі,
Рана-рана,
Улетку не пужалі.

Ветрычак вее, сонейка грэе...*

Ветрычак вее, сонейка грэе,
Люлі, люлі, сонейка грэе.

А мой міленькі касіць не ўмее,
Люлі, люлі, касіць не ўмее.

Узяў касіцу, пайшоў касіці,
Люлі, люлі, пайшоў касіці.

А мне, маладзе, абед варыці,
Люлі, люлі, абед варыці.

Абед гатую, бяду бядую,
Люлі, люлі, бяду бядую.

Каб мой абедзік хаця зварыўся,
Люлі, люлі, хаця зварыўся.

* Сенакосная.

Каб мой міленькі не знаравіўся,
Люлі, люлі, не знаравіўся.

Ой, як згатую, панясу есці,
Люлі, люлі, панясу есці.

Скасіў міленькі, што недзе сесці,
Люлі, люлі, што недзе сесці.

ЛЕТНІЯ ПЕСНІ

КУПАЛЬСКІЯ І ПЯТРОЎСКІЯ ПЕСНІ

Ішла Купала сялом, сялом...

Ішла Купала сялом, сялом,
Закрыўшы вочкі пяром, пяром,
На Йвана Купала.*
Закрыўшы вочкі пяром, пяром,
Вітала хлопцаў чалом, чалом.
Вітала хлопцаў чалом, чалом,
Свяціла ночкі агнём, агнём.
Свяціла ночкі агнём, агнём,
Пляла вяночкі шаўком, шаўком.
Пляла вяночкі шаўком, шаўком,
Слыла Купалка цяплом, дабром,
Славу Купалу пяём, пяём.

Сягоння Купала, а заўтра Ян...

Сягоння Купала, а заўтра Ян,
Зайграй, сонейка, зайграй нам,
Каб у ясным небе звінела,
Каб сырая зямліца стагнала
Ад дзявоцкага гуляння,
Ад жаноцкага спявання.

Да ўзыйдзі, месячык...

Да ўзыйдзі, месячык,
Да ўзыйдзі, ясненькі,
Разлажы нам Купалейка
Хлопчыкам на іґранейка,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожных двух радкоў.

Дзевачкам на·гулянійка.
Дзевачкі нагуляліся,
Хлопчыкі наіграліся,
З Купалейкам папрашчаліся...

Прасілася Гарыслаўка ў ойчанькі...

Прасілася Гарыслаўка ў ойчанькі
На Купаленька,
На дзявоцкае пагулянейка:
— Ой, мой ойчанька, родненькі!
Пусці ж мяне пагуляць.
Да й дзецюкам Купальнічка
заспяваць:
Яны жа з нас смяюцца цэлы год,
А мы ж жа ім заспяваем
усю ноч.
Заспяваем Купальнічка такога,
Каб яны не дачакалі году другога,
Калі яны жаніціся не хочуць,
Да нас маладзенькіх любіць
не будуць.
Ой, гуляла Гарыслаўка ўсю ноч,
Нямаш жа яе ў ойчанькі
на абед;
Нізка сонца, нізка пад палудзень,
Гарыслаўка з Купальнічка ідзе,
А ойчанька яе сустракае,
У вароцейках праўданькі пытае:
— Донька мая родненькая,
скажы мне,
Каго любіш верна ў сяле,
Таму пашлю залаты пояс у дары,
Што б ён пазнаў Гарыслаўку малады.
— Не пасылай, мой ойчанька, паяса,
Ой, прывядзе мне малайца мая краса!

Ой, пойдзем, сястрыцы...

Ой, пойдзем, сястрыцы,
Пад ясну зарніцу.
Ноч малая ды Купальная!
Набярэм, сястрыцы,
Жоўтага пясочку.
Іграй, сонца, із зарою!

Пасыпем, сястрыцы,
У таткі пад аконцам.
Ноч малая ды Купальная!
Пасеем, сястрыцы,
Белага гарошку.
Іграй, сонца, із зарою!

Гарошку не ўзысці,— Ноч малая ды Купальная!
Мне ў таткі не быці.

Ой, рана, рана на Яна...

Ой, рана, рана на Яна
Зямля дрыжала з Купала.
Дзевачкі рвалі, не знялі,
Жычкай крапівы нарвалі,
Да самога круля паслалі.
Круль гэтага зелейка не ўвазнаў,
Да крулёвае адаслаў.
Крулёвая зелейка пазнала,
Яна яго Купалам назвала.
Дарагое зелейка Купала,
Той дзявоча гулянне.
Да весела дзевачкам жыта жаць,
Да цяжанька хлопчыкам Пятра ждаць.
Весела дзевачкам, пажаўшы,
Да цяжанька хлопчыкам, прыждаўшы.

Ой, рана на Йвана...

Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Проці Йвана ночка мала,
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Дзе, Купала, начавала?
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Начавала ў чыстым полі,
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Ў чыстым полі сярод жыта,
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Чым, Купала, вячэрала?
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Варэнічкі вячэрала,
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Чым, Купала, запівала?
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Гарэлачкай запівала,
Ой, рана на Йвана.

Ой, нету, нету Купаліша...

Ой, нету, нету Купаліша
Да як над нашага Яначка;
Пяшком на вулку не выходзіць,
Ён на коніку выязджаіць,
Сабе дзеваньку выглядаіць;

Сам жа ён едзе на коніку,
Дзеваньку вязець на возіку,
Сам жа ён едзе ў атласе,
А дзеваньку вязець у пакрасе,
Сам жа ён едзіць, як жар гарыць,
Дзеваньку вязець, як цвет цвіцець.

А як я ў зёлачкі пашла...

А як я ў зёлачкі пашла,*
Шэру зязюлечку нашла,
Зязюля кукавала,
На мяне вешчавала.
На сем год замуж не йці.
Я й да хатачкі прышла,
Я й парадачак нашла:
Татулька піва варыць
Да к майму вяселлейку,
Матулька хлябы пякець
Да к майму вяселлейку,
Брацетка каня строіць
Да к майму вяселлейку,
Сястрыца дары кроіць
Да к майму вяселлейку.

Ты, купалінька, рана, рана...

— Ты, купалінька, рана, рана,
Да дзе ты была, рана, рана,
Да што ты рабіла, рана, рана?
— Ды ў бары была, рана, рана,
Я краскі збірала, рана, рана.
— Нашто красачкі, рана, рана?
— Я й вянкі віці, рана, рана.
— А нашто вяночкі, рана, рана?
— Дзевачцы на галоўку, рана, рана.

Купалачка, дзе твая дачка?

— Купалачка, дзе твая дачка?
— А ў гародзе на пагодзе красачкі рвець,
Вяночкі ўець.
Звіўшы вяночак, пайшла ў таночак,
А ў танок ідучы пахваляецца:
— Ніхто ў мяне вяночка не зніме.
А дзе ўзяліся буйны ветры,
Знялі з галоўкі вяночак,
Пакацілі на сіняе мора.
Пайшла дзявіца шукаючы, пытаючы,
Спатыкаіць трох рыбаловаў:

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

— Ах, рыбаловы, братцы мае,
Чы не відзелі вяночка майго?
— Ой, дзевіца, не шукай, не пытай:
Твой вяночак на сінім моры.
Будзем сеці закідаць, вянка шукаць.
— Вы рыбаловы, братцы мае,
Аднаму дам залаты персцень,
Другому дам шаўкову хустачку,
А за трэцяга я сама пайду.
Што персцень дала — меншы брацец,
Што хустку дала — сярэдні брацец,
А за старшага сама пайшла.

А хто ж у нас не жанаты ходзіць?..

А хто ж у нас не жанаты ходзіць?
— Сямёнка ў нас не жанаты ходзіць:
Ён браў хмялёк у святы дзянёк,
Саладзіў солад на пярэклеце,
Мыў катлы на сінім моры,
Сушыў бочкі на сонейку.
Доля яго няшчасная:
Козы, оўцы хмель паелі,
Куры, гусі солад паклявалі,
Мора катлы патапіла,
Сонцам бочкі пашчапіла.

Купала. Янава ночка невялічка, Купала...

Купала. Янава ночка невялічка,
Купала.
Нашы дзевачкі ўсю ноч не спалі,
Купала.
Ім зязюленькі ўсё шчабяталі,
Купала.
Дзевачкі, з ружы вянкоў не віце,
Купала,
Дзевачкі, рана замуж не йдзіце,
Купала.
Віце вяночкі ды із чабору,
Купала.
Ідзіце замуж ды ўпору,
Купала.

Была ў суседа дачушка...

Была ў суседа дачушка,
А ў другога — другая.
Адна хвалёная,
А другая сужоная.
Прыехалі баяры
Да сужоначку ўзялі,
А хвалёначкі не бралі.
Стала хвалёнка плакаці,
На свае белы дары гледзючы:
— Мае белыя дарочкі,
Каго я буду дарыць вамі?
Ці белы бярозы укрываць?
Ці чорны гасцінец усцілаць?
Белы беразняк укрыўшы,—
Расой прыпадуць,
А чорны гасцінец услаўшы,—
Баяры коньмі саб'юць,
Сужанку вязучы,
А хвалёнку клянучы...

Купалялё, на сенажаці мядуначка...

Купалялё, на сенажаці
мядуначка, купалялё.
Купалялё, там кукавала зязюлячка,
купалялё.
Купалялё, там кукавала, праўду казала,
купалялё.
Купалялё, не будзіць свёкарка
родны татулька, купалялё.
Купалялё, не будзіць свякроўка
родная мамка, купалялё.
Купалялё, не будзіць залвіца
родная сястрыца, купалялё.
Купалялё, не будзіць дзевярка
родны брацятка, купалялё.

Малая ночка Купалночка...

Малая ночка Купалночка,
Нашы малойцы не выспаліся,
За валамі ідуць хліпаючы,
Хвастамі вочы праціраючы.
— Быцю, быцю, пазыч хваста,
Патры вочы пасля ночы.
Вяліка ночка Купалночка,
Нашыя дзеванькі выспаліся,
За валамі ідуць спяваючы,
Шолкам хустанькі вышываючы.

Да зялёны кусток распускаецца...

Да зялёны кусток распускаецца,
Багатыр дачкой набіваецца,
— Ды бяры дачку-багатырачку,
Дам пасагу — шэру сярмягу,
Калі яшчэ мала, дык лапцёў пару,
Калі яшчэ мала, дык абор пару,
Калі яшчэ мала, дык ануч пару.
— Не бяры, сынку, ды што ў золаце!
— Не бяры, сынку, ды што ў серабры!
А бяры, сынку, што ў беленькім!
А што ў золаце, то не паненачка, то гультаечка,
А што ў серабры, то цыганачка, то абманачка,
А што ў беленькім, то работніца.

Купала на Йвана...

Купала на Йвана,
На Купала сонца гуляла,
Купала на Йвана,
Над Бабрынаю калясом стала,
Купала на Йвана.
Ой, у Бабрыне хлопцы белы,
Купала на Йвана,
Хлопцы белы, дзяўчатам мілы,
Купала на Йвана.

На Купала сонца гуляла,
Купала на Йвана,
Над Куняўкаю калясом стала,
Купала на Йвана.
У Куняўцы дзеўкі красны,
Купала на Йвана,
Дзеўкі красны, хлопцам страшны,
Купала на Йвана.

Каліна, а па ельнічку...

Каліна, а па ельнічку,
па бярэзнічку, каліна,
Каліна, канюшкі свішчуць, конікаў ішчуць, каліна.
Каліна, а згубіліся тры конікі, каліна.
Каліна, адзін конік сівы-буланы, каліна,
Каліна, другі конік — звёздачкі ў ілбе, каліна.
Каліна, трэці конік — залатагрыўка, каліна.
Каліна, сівы-буланы — Юрачкаў, каліна,
Каліна, звёздачка ў ілбе — Іванкаў, каліна,
Каліна, залатагрыўка — Сцяпанаў, каліна.
Каліна, сівы-буланы — да Галечкі, каліна,

Каліна, звёздачка ў ілбе — да Манечкі,
каліна,
Каліна, залатагрыўка — да Валечкі, каліна.

Ой, каліна, а хто ж у нас...

Ой, каліна, а хто ж у нас
да дзевачак лас, каліна?
Ой, каліна, а Мішачка ў нас да дзевачак
лас, каліна.
Ой, каліна, узяў лясачку папіраціся,
каліна,
Ой, каліна, пайшоў Манечкі давядаціся,
каліна.
Ой, каліна, лясачка яго паламалася,
каліна,
Ой, каліна, Манечка яго адчуралася,
каліна.

Каліна, чыя рута за вадою...

Каліна, чыя рута за вадою,
каліна?
Каліна, зарасла яна лебядою, каліна.
Каліна, чаму, Ніначка, руты не полеш,
каліна,
Каліна, руты не полеш, дзевачак
не просіш, каліна?
Каліна́, дзевачкі мае, не да руты мне,
каліна,
Каліна, не да руты мне, не да рутачкі,
каліна,
Каліна, узялі мяне цяжкі смутачкі, каліна.
Каліна, паехаў мілы на паляванне, каліна,
Каліна, пакінуў мяне на гараванне, каліна.
Каліна, пакуль конік наскачацца, каліна,
Каліна, дык я, малада, наплачуся, каліна.
Каліна, пакуль мілы напалюецца, каліна,
Каліна, дык я, малада, нагаруюся, каліна.

А ў масце, масце...

А ў масце, масце
Сон-трава расце,
Ой, люлі-люлі,
Сон-трава расце.
Сон-трава расце,
Жоўты красачкі,

Жоўты красачкі
Аднагодачкі,
Нашы дзевачкі
Самаволачкі:
Дзе піва чуюць,
Там заначуюць,
А дзе салодкі мёд —
Там і круглы год,
А дзе гарэлка,
Там нядзелька.

Кукуй, зязюленька, не ўпікай...

Кукуй, зязюленька, не ўпікай,
Ой, люлі, не ўпікай.
Нямнога будзеш кукаваць,
Ой, люлі, кукаваць.
На Юр'я рана пачынаць,
Ой, люлі, пачынаць.
На Пятро позна пакідаць,
Ой, люлі, пакідаць.
Заплач, Анэтка, жалосна,
Ой, люлі, жалосна.
Нямножка будзеш плакаці,
Ой, люлі, плакаці.
У нядзельку рана пачынаць,
Ой, люлі, пачынаць.
У аўторак позна пакідаць,
Ой, люлі, пакідаць.

А ў бару, бару, на баравіне...

А ў бару, бару, на баравіне,
Ай, рана, рана, на баравіне.
Там Аленка ягадкі брала,
Ай, рана, рана, ягадкі брала.
Ягадкі брала, цяжка ўздыхала,
Ай, рана, рана, цяжка ўздыхала:
«Бярозкі мае, невядомыя,
Ай, рана, рана, невядомыя.
Дарожкі мае, незнакомыя.
Ай, рана, рана, незнакомыя.
А з некім сесці лустачку з'есці,
Ай, рана, рана, лустачку з'есці.
А з некім стаці, слоўца згукаці,
Ай, рана, рана, слоўца згукаці».
Прыйшоў да яе міленькі яе,
Ай, рана, рана, міленькі яе.
«Чаго, Аленка, цяжка ўздыхаеш,
Ай, рана, рана, цяжка ўздыхаеш?
Мы з табой сядзім, лустачку з'ядзім,
Ай, рана, рана, лустачку з'ядзім.
Мы з табой станем, слоўца згукаем,
Ай, рана, рана, слоўца згукаем».

А ў нашым жыце перапяліца...

А ў нашым жыце перапяліца,
Яна не свішчыць — праўду гаворыць:
«Ай трудна жыці той маладзіцы,
А ў каторае заловак многа,
А дзівярочка ніводнаго.
Куды ні пойдуць — нявестку ганюць:
«Наша нявестка не работніца,
К нашаму двору непрыходніца,
Нашаму скоту непрыглядніца,
Нашым гасцём непрыветніца».
А ў нашым лесе зязюлечка,
Яна не кукуіць — праўду гаворыць:
«Ой, добра жыці той маладзіцы,
А ў каторае дзівяроў многа,
А заловачкі ніводнае.
Куды ні пойдуць — нявестку хвалюць:
«Наша нявестка работніца,
Нашаму двору прыходніца,
Нашаму скоту прыглядніца,
Нашым гасцём прыветніца».

Ішоў вечар па вулачцы...

Ішоў вечар па вулачцы,
З Купалкай жартуючы:
«А дзе нам спаць, начаваць?»
— А ты, вечар, ў канцы сяла,
А я, Купалка, сярод сяла,
А дзе вулачка мяцёная,
Дзе дзевачка заручоная,
За купчыка аддадзёная.
Купчык будзе купчаваць,
А дзевачка — панаваць.

Ішла Купалка сялом, сялом...

Ішла Купалка сялом, сялом,
Казала мальцам: «Чалом, чалом».
А мужчынам наругалася:
«Нашто з Купалкі дзівіліся,
А што ў Купалкі сыноў многа.
А што за многа — тры сыночкі:
Першы сыночак — Васілёк,
Другі сыночак — Іванька,
Трэці сыночак — Дзям'янка».
Ішла Купалка сялом, сялом,
Казала дзеўкам: «Чалом, чалом»,

А бабачкам наругалася:
«Нашто з Купалкі дзівіліся,
А што ў Купалкі дачок многа.
А што за многа — тры дачушкі:
Першая дачушка — Аксіннячка,
Другая дачушка — Наталачка,
Трэцяя дачушка — Валячка».

Каліна на лузе стаяла...

Каліна на лузе стаяла,
А з луга пайшла — зайграла.
Мостам ішла — грымела,
А полем ішла — лялела,
А к сялу прыйшла — зайграла,
У сяло ўвайшла — гуляла,
К варотам прыйшла — грукнула,
Пад вакенца прыйшла — гукнула:
«Адчыні, Тацянка, новы двор».
А Тацянка ёй адказала:
«Некалі, калінка, некалі:
У садзе вінаград пераспеў,
Трэба яго пашчыпаць,
Да свайго мілога паслы слаць.
Я б паслала пасол — не смею,
Напісала б лісток — не ўмею,
І пайшла б я сама — баюся,
Доўгая дарога — стамлюся.
Дык прабачай, калінка, прабачай».

Купалка Яна на вулку звала...

Купалка Яна на вулку звала:
«Ой, выйдзі, выйдзі, пане Іване,
На вулку дзіва паглядзець,
Дзіва паглядзець, падзівіціся:
Едзе Мішачка жаніціся.
Чатыры кані папярадзе ідуць,
А на пятым — Манячку вязуць,
А на шостым — ён сам едзе,
А на сёмым — дружыначка,
А на восьмым — радзіначка».

На вуліцы скрыпка грае...

На вуліцы скрыпка грае,
Каліна.*
Кароль дачкі не пускае.
Яна ў яго прасілася,
Прасілася, малілася:
«Пусці мяне, мой татачка,
Я ж тамака не забаўлюся,
Хуценька дамоў вярнуся».
А на дварэ петушкі пяюць —
Каралёвай дачкі з вулачкі не чуць.
Ужо на дварэ сонейка ўзыходзіць —
Каралёва дачка з вулачкі прыходзіць.
Яе шаты сцерты, змяты,
Яе косачка растрапана,
Яе вочачкі заплаканы.

Купальна ночка невялічка...

Купальна ночка невялічка,
Да не выспалася дзевачка,
Да ягадкі рвала — драмала,
Перабірала — заснула,
Прыехаў дзяціначка — не чула,
Махнуў хустачкаю, не дамахнуў,
Пакаціў персцянём — не дакаціў,
Злез з коніка — сам пабудзіў!
— Устань, мая дзевачка, годзе спаць,
Да ўжо твае сватове на дварэ стаяць,
Пара табе падаркі падаваць.
— Да няхай жа стаяць здаровы,—
Ужо ж мае падарачкі гатовы:
Да сорак саракоў палацён,
Да трыццаць паставоў ручнікоў,
Да апарць дробні і драбніцы,
Што дараць дзеверы і залвіцы.
Да дзяцінка дзевачку падабаў,—
Ён ёй пярсцёначак дараваў,
Дзевачка дзяцінка падабала,—
Яна яму хустачку даравала.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Ішла паненка цераз бор...

Ішла паненка цераз бор,
На ёй сукенка ў дзевяць пол,
Стала тая сукенка шамрэці,
Зялёна дуброва шумеці,
Стала наша Купала гарэці.
Ішлі малодкі тушыці,
Неслі ў чэпчыку вадзіцы,
Колькі ў чэпчыку вадзіцы ёсць,
Столькі ў малодкаў праўды ёсць.
Ішла паненка цераз бор,
У яе сукенка ў дзевяць пол,
Стала тая сукенка шамрэці,
Зялёна дуброва звінеці,
Стала наша Купала гарэці.
Ішлі малойцы тушыці,
Неслі ў рэшаце вадзіцы,
Сколькі ў рэшаце вады ёсць,
Столькі ў малайца праўды ёсць.
Ішла паненка цераз бор,
На ёй сукенка ў дзевяць пол,
Стала тая сукенка шамрэці,
Стала наша Купала гарэці.
Ішлі дзевачкі тушыці,
Неслі ў кубачках вадзіцы,
Колькі ў кубачках вады ёсць,
Столькі ў дзевачках праўды ёсць.

Ой, то-то! Ляцелі гусі рад па раду...

Ой, то-то! Ляцелі гусі рад па раду, ой, то-то!
Крыкнулі гусі раз па разу:
«Чаму, Іванька, не жэнішся?»
— А як я маю жаніціся:
Хмель на тычынцы не павіўся,
А ячмень на ніўцы не наліўся,
Дачка ў мамкі не нагулялася,
А мне маладому не спадабалася!
Цяпер буду жаніціся:
Хмель на тычынку ўжо павіўся,
Ячмень на ніўцы ўжо наліўся,
Дачушка ў мамкі нагулялася,
А мне маладому спадабалася!

Ой, то-то! Хто гэту гару капаў...

Ой, то-то! Хто гэту гару капаў, ой, то-то!
Чорную сцягу таптаў?
Васілька гару капаў,
Чорную сцягу таптаў,
Да Зосечкі ходзячы,
Падарачкі носячы.
Стук-стук пад акеначка:
— Ці дома паненачка?
Прынёс я падарачкі!
— Што ж та за падарачкі?
— Два садовых яблачкі,
Чырвоны каралічкі.
Яблачкі кругленькія,
Мы з табой роўненькія,
Каралічкі дарагія,
А мы з табой маладыя.
— Каралькі насіць буду,
Тады ж я любіць буду,
Яблачкі качаць буду,
А з табой гуляць буду!

Да Купаленка, рана, рана...

— Да Купаленка,
Рана, рана.
Дзе дасюль была?
— За ракой была,
За быстрай была.
— Што ты рабіла?
— Кужалі прала,
Ткала, бяліла,
Замуж дачок выдавала.

Цёмная ночка Купалачка...

Цёмная ночка Купалачка,
На моры вуткі купаліся,
На беражочку сушыліся.
Наша Марыська стужылася,
Што яе дары не прадзёныя,
Хоць прадзёныя, не звіваныя,
Хоць звіваныя, не снаваныя,
Хоць снаваныя, не вытканыя,
Хоць вытканыя, не бялёныя,
Хоць бялёныя, не дзялёныя;
Таму-сяму па локціку,
Свайму мілому не меручы.

А што ў нас сягоння за вечар быў?..

А што ў нас сягоння за вечар быў?
Звінелі страмёны каля коней.
«А едзьце малойцы ў славен горад,

А ў слаўным горадзе дзяльбу дзелюць:
Кожнаму малойцу по коніку,
Нашаму Данілку што найлепшага».
А што ў нас сягоння за вечар быў?
Звінелі страмёны каля коней.
«Сядайце ўсе малойцы на коней,
А едзьце малойцы ў славен горад,
А ў слаўным горадзе дзяльбу дзеляць:
Кожнаму малойцу па дзевачцы,
Нашаму Данілку што найлепшая».

Ішла Купалінька па вуліцы...

Ішла Купалінька па вуліцы,
Краскамі вочы завесіўшы.
Сталі людзі дзівіціся,
І стала Купалінька сварыціся:
— Што вы за людзі за дзіўныя!
Ці вы на вулку не хадзілі?
Ці вы Купалінькі не відзелі?
Ці вы вяночкаў не звівалі?
Я не такое дзіва відала:
Шчука рыба кросна ткала,
А рак небарак цэўку сучыў,
Сучыў жа цэўкі чырвоныя,
Яна ткала кітайкі зялёныя
І слала да маткі радзёныя:
Вот табе, маці, кітаечка
Ад тваёй дочкі каханачкі,
Вот табе, маці, зялёная
Ад тваёй дочкі радзёныя,
Вот табе, маці, урубочкі
Ад тваёй дочкі галубочкі,
Вот табе, маці, цясёмачкі
Ад тваёй дочкі паненачкі.

Я зёлкі ў полі збіраю...

Я зёлкі ў полі збіраю,
Івана Купалку пераймаю
І ўсё гляджу ў цёмен лес.
А ў цёмным лесе агонь гарыць,
Каля агня Купалка сядзіць,
Купалка сядзіць і ўголас плачыць.
«Чаго, чаго, Купалка, плачаш?

Ці табе тут соўнінька мала?»
— Ох, ні мала мне яснага соўнінька,
Тут досыць мне ўсяго, усяго!
І плачу я таго, таго,
Што мяне людзі не так пераймаюць,
Толькі то й робяць,
Што агні раскладаюць.

Сонейка, сонейка, Ян з Пятром ходзяць...

Сонейка, сонейка, Ян з Пятром ходзяць,
Сонейка, сонейка, да па межах ходзяць,
Сонейка, сонейка, да жыта глядзяць.
Сонейка, сонейка, да ідучы гаварылі:
Сонейка, сонейка, усё жыта добрае;
Сонейка, сонейка, Юрасёва яшчэ лепшае,
Сонейка, сонейка, Габрусёва найлепшае.
Сонейка, сонейка, Юрасёва ў трубу ўецца,
Сонейка, сонейка, Габрусёва ў сцірты кладзецца.

На моры вутка купалась...

На моры вутка купалась,
На беражочку сушылась,
Я маладзенька журылась.
Ці было лета, ці не бывала,
Я маладзенька не ўгадала,
Мамка на вулку не пускала,
А ў каморачку замыкала.
Выб'ю я, выб'ю балоначку,
Гляну я, гляну на вулачку:
Аж-ну мой міленькі танок вядзе,
Ды і з маёй даўняй падружанькай.
Дай табе Божа, падружачка,
Гэтага танка не звадзіці,
Гэтага вянка не знасіці.

Ай, бору мой, бору мой!..

— Ай, бору мой, бору мой!
Што ты, бору, ні шумён?
— Як я маю шумён быці,
Колі ў мяне пташак нет?
Адна была зязюля,
Тую пташачкі ўзялі
Салавейкам падалі.
А пташачкам на адзін дзень,
Салавейкам на ўвесь век.
— Ай, двору мой, двору мой!

Чаму, двору, ні мяцён?
— Як я маю мяцён быць,
Колі ў мяне дзевак нет?
Адна была Марынка,
Тую сваты ўзялі
Ды сужыньку падалі.
А сваточку на адзін дзень,
А сужыньку на ўвесь век!

Ляцеў чыжык цераз рынак...

Ляцеў чыжык цераз рынак
Ды клікаў дзевак на купалле:
— Дзеўкі, бабы, на купаллю!
Красным дзеўкам свая воля,
А маладзіцам няма волі:
Дзіця плача ў калысцы,
А муж бурчыць у пасцельцы,
А свякроўка супроць печы,
Свёкар-бацюшка на печы,
А дзявер'я на пакоі,
А залоўкі на купаллі.
Ды я млада прыбяруся,
Ды я дзіцё прыгалублю,
Ды я мужа перапрашу,
Ды я свёкру пакаруся,
Ды я свякроўцы пакланюся,
Я дзевяр'ям па платочку,
А залоўкам па вяночку.
Пакуль млада прыбяруся,
Дзеўкі, жонкі ідуць з купалля,
А я молада на купалле.
Дзеўкі, бабы, на купаллю!
Рана, рана на купаллю.

Кукавала зязюлька ў садочку...

Кукавала зязюлька ў садочку,
Прылажыўшы галоўку к лісточку:
— Бедна ж мая галоўка на свеці,
Хто ж маё гняздзечка разаўе,
Хто ж мае дзеткі пабярэ?
Аказаўся салавейка ў садочку:
— Я ж тваё гняздзечка сам разаўю,
Я ж твае дзеткі сам пабяру.
Да плакала дзеванька ў святліцы,
Прылажыўшы галоўку к стальніцы:
— Бедна ж мая галоўка на свеці,
Хто ж маю косачку распляце,
Хто ж мяне да шлюбу завядзе?
Аказаўся брацейка ў каморы:
— Я ж твой братка родненькі,
Я ж тваю косачку распляту,
Я ж цябе да шлюбу завяду.

У нашага войта на дварэ...

У нашага войта на дварэ
Стаіць явар зялёны,
Пад яварам сталове.
За сталамі панове,

Радзяць рады тайныя,
Не так тайныя — дзіўныя,
Войтаўна сына ўрадзіла,
На бацьку няславу пусціла.
Не вінавацяць віноўнага,
Вінавацяць бацьку яе,
Што доўга замуж не выдаваў,
Вялікага пасагу шкадаваў,
Часта да свірна пасылаў
Ды з залатымі ключамі,
А з маладымі панічамі
Па мёд, па віно, па гарэлку
Такую дарослую дзеўку.

Ай, то, то, ды за гарою за каменнаю...

Ай, то, то, ды за гарою за каменнаю, ай, то, то!
Стаяць коні вараныя,
Вараныя, прыбраныя,
Прыбраныя, сядланыя.
Як уссесці, паехаці
Да ўдованькі жаніціся.
Ды ўдованьку лёгка браці,
Лёгка браці, цяжка жыці:
Пасцель сцеліць — усё клянецца,
Спаць кладзецца — не хінецца.
За гарою за каменнаю
Стаяць коні вараныя,
Вараныя, прыбраныя,
Прыбраныя, сядланыя.
Як уссесці, паехаці
Да дзеванькі жаніціся.
Ды дзеваньку цяжка браці,
Цяжка браці, лёгка жыці:
Пасцельку сцеліць — усё смяецца,
Спаць кладзецца — прыхінецца.

А ў горадзе на рынку...

А ў горадзе на рынку
П'ець худоба гарэлку,
А багаты дзівіцца,
Чым худоба жывіцца.
— Шынкарачка малада,
Падай піва і віна!
— Ах ты, добры моладзец,
На сколькі табе?
— А на сто рублёў піва,
А на тысячу віна!
— Ах ты, добры моладзец,
Не сап'еш ты ўсяго.
— Хоць я сам не сап'ю,
Таварышаў напаю.
— Калі ты такі пан,
Я за цябе дзеўку аддам:
Харошую паненку —
Яўрэйскую наймічку.
Іх у касцёле вянчалі,
У каморы спаць клалі.
— Скажы, скажы, дзявіца,
Якога ты роду?
— Па бацюшку Карпаўна,
Па матушкі Войтаўна.

— Скажы, скажы, моладзец,
Якога ты роду?
— Па бацюшку Карповіч,
Па матушкі Вайтовіч.
А хвала ж табе Бог,
Што з сястрою спаць не лёг.
Пойдзем, сястра, у поле
Рассеімся травою,—
А на брату — сіні цвет,
На сястрыцы — жоўценькі.
Будуць дзеўкі краскі рваць,
У вяночкі ўвіваць,
У вяночкі ўвіваць,
Нас з табою памінаць...
А на Йвана Купала
Дзеўкі краскі ірвалі,
Дзеўкі краскі ірвалі,
У вяночкі ўвівалі,
У вяночкі ўвівалі,
Брата, сястру паміналі:
А брахцінька — сіні цвет,
А сястрыца — жоўценькі.

Цераз гару чорна сцежка...

Цераз гару чорна сцежка,
Да там ішла красна дзеўка,
За ёй ззаду бел-малойчык.
— Пастой, пастой, красна дзеўка,
Скажу табе шчыру праўду:
Каля ражства рожа цвіла.
— Праўда, праўда, бел-малойчык,
Я й там была, вянкі пляла.
Цераз гару чорна сцежка
Да там ішоў бел-малойчык.
— Пастой, пастой, бел-малойчык,
Скажу табе шчыру праўду:
Каля Пятра рэкі сталі.
— Праўда, праўда, красна дзеўка,
Я там быў, лёд прабіў, каня паіў.

А на Купалу...

А на Купалу
Рана сонца іграла —
Рана сонца іграла
На добрыя годы —
На добрыя годы,
На цёплыя росы —
На цёплыя росы,
На хлябы ўраджаі —
На хлябы ўраджаі.

Да ў адным канцы Купала...

Да ў адным канцы Купала,
А ў другім канцы дзіўное.
Да на тым жа дзіўным дзевачка,
Да прышла па яе матачка:
— Да ідзі, дачушка, дадому,
Прыехалі сваты з Альбова!
— Да няхай жа едуць, да не мае.
Як будуць мае ехаць,
Да будзе дуброва звінець,
Да будзе музыка іграць,
Да будуць дзецючкі спяваць.

Да не будзе лецечка...

Да не будзе лецечка
Да ніводнага дзянёчка,
Да не будзе ягадак
Ніводнае ягадкі,

Да не будзе дзевачак,
Да ніводнае дзеванькі:
Ягадкі з расы падуць,
Дзевачкі замуж пайдуць.

Ой, у лесе, у лесе пры барку...

Ой, у лесе, у лесе пры барку,
Да рабіў дзяцінка каморку.
Да к яму дзевачка прыбяжала,
Яна яго маладога навучала:
— Да рабі, дзяцінка, з акенцам,
Каб і к нам салавейка прылятаў,
Каб нас маладзенькіх пабуджаў.
Бо чужая матка, ні свая,
Да не будзе рана будзіці,
Пойдзе да суседа судзіці:
— Сонейка зайдзе, пастаіць,
Да мая нявехна яшчэ спіць,
Сонейка зыйдзе, паграе,
Спіць мая нявехна, не дбае.

А ў майго татулькі тры сады зялёных...

А ў майго татулькі тры сады зялёных,
Чацвёрты вішнёвы.
У адным садочку зязюлька кукуе,
У другім садочку салавей шчабечыць,
У трэцім садочку конёчык гагочыць,

У чацвёртым садочку Маланачка плачыць.
Зязюля кукавала — у шчыр бор паляцела,
Салавей шчабятаў — у лазу паляцеў,
Канёчак гагатаў — на вайну паехаў,
Маланачка плакала — ад таткі ўзялі,
Галоўку звязалі.

Ой, дымна за дваром...

Ой, дымна за дваром,
Едуць баяры ўсе радом,
Вязуць Янку на коніку,
Да яго галоўка на мячы,
Да за ім матачка плачучы:
— Ой, сынок Янка,
За каго галоўку палажыў?
Ці за пана-айца старога,
Ці за матку родную,
Ці за брацейка маладога,
Ці за сястрыцу малую?
— Да не за пана-айца старога,
Да не за матачку родную,
Да не за брацейка маладога,
Да не за сястрыцу малую:
Палажыў галоўку за дзеўку,
За яе ціхія паходы,
За яе нізкія паклоны.

Перад Пятром, пятым днём...

Перад Пятром, пятым днём
Разгуляўся Янаў конь.
Разгуляўся Янаў конь,
Разбіў камень капытом.
А ў камні ядра няма,
А ў мальчыкаў праўды няма.
Такая праўда, як узімку сонца,
Хоць яно яснае, але яно халоднае.
Перад Пятром, пятым днём
Разгуляўся Янаў конь,
Разгуляўся Янаў конь,
Разбіў арэх капытом.
У арэха ядро ёсць,
У дзевачак праўда ёсць.

Купала на Івана! Што Іван робіць?..

Купала на Івана! Што Іван робіць? —
Косы клепець!
Купала на Івана!*
Нашто яму косы? — Сена касіць.
Нашто яму сена? — Кароў карміць.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Нашто яму каровы? — Малокі збіраць.
Нашто яму малокі? — Дзетак карміць.
Нашто яму дзеці? — Краскі ірваць.
Нашто яму краскі? — Свінней карміць.
Нашто яму свінні? — Горы рыць.
Што ў тых гарах? — Жалезная ступа.
Што ў той ступцы? — Палівана міска.
Што ў той місцы? — Макава зерне.
Дзе тое зерне? — А пятух склюваў.
Дзе той пятух? — На мора паляцеў.
Дзе тое мора? — Краскамі зарасло.
А дзе тыя краскі? — Дзеўкі парвалі.
А дзе тыя дзеўкі? — Замуж пайшлі.
Дзе іх мужыкі? — На вайну пайшлі.

Зажурылася малада ўдованька...

Зажурылася малада ўдованька,
Што не кошана зялёна дубровенька.
— Не журыся, малада ўдовачка,
Будзе скошана зялёна дубровачка.
Будзем наймаці касары маладыя.
Будзем плаціці па чатыры златыя.
— Касары косяць — ветрык павявае,
Маё сенца ад сонца пасыхае.

А я дзеўка добрая Алеся...

А я дзеўка добрая Алеся
Бацькі багатага,
Мой бацька — ясны месяц,
Мая маці — краснае сонейка,
Мае браты — ў саду салавейкі,
Мае сёстры — ў жыце перапёлкі;
Ясны месяц усю ноч свеціць,
Красна сонейка ўвесь дзень грэіць,
У садзе салавейка ўвесь дзень спяваіць,
У жыце перапёлкі — жыта падбіраюць.

Да ў нашым сяле тры вуліцы...

Да ў нашым сяле тры вуліцы:
У першай вуліцы ружа лялея,
У другой вуліцы рамон бялее,
У трэцяй вуліцы крапіва млее.

Ружа лялея — то дзевачкі,
Рамон бялее — то малойчыкі,
Крапіва млее — то малодачкі.

А ў лузе касец косіць...

А ў лузе касец косіць,
А ў лузе касец косіць
Ды, прылёгшы, галосіць.
— А чаго, касец, плачаш,
А чаго, касец, плачаш,
А ці твая каса тупа?
Ці твая каса тупа,
Ці твая каса тупа,
Ці твая жана скупа?
— А мая каса востра,
А мая каса востра,
А мая жана жостра.
Прынясла палуднаваць,
Прынясла палуднаваць
У маленькім адлівачку,
У маленькім адлівачку,
У маленькім адлівачку
І хлеба скарыначку,
Цыбулькі быліначку,
Цыбулькі быліначку
І солі драбіначку.

Сонейко. Пятрова ночка, дзе твая дочка?..

Сонейко. Пятрова ночка, дзе твая дочка? Сонейко.
Сонейко. Там у лесе начавала. Сонейко.
Сонейко. Начавала, зелле збірала. Сонейко.
Сонейко. Там начлежнічкі начавалі. Сонейко.
Сонейко. Начавалі дай агонь клалі. Сонейко.
Сонейко. Агонь клалі дай гаварылі. Сонейко.
Сонейко. Паедзем хлопцы жаніціся. Сонейко.
Сонейко. Жаніціся ў Ягадзень. Сонейко.
Сонейко. Бо ў Ягодні дзевак многа. Сонейко.
Сонейко. Усе харошыя, усе прыгожыя. Сонейко.

Сонейко. Пятрова ночка суборначка...

Сонейко. Пятрова ночка суборначка. Сонейко.
Сонейко. Сабрала дзевачак на вулачку. Сонейко.
Сонейко. На вулачку, на тыночку. Сонейко.
Сонейко. Да выпраўляла ў бор жыта жаць. Сонейко.
Сонейко. У бор жыта жаць, у луг сенаваць. Сонейко.
Сонейко. У бары жыта пажата. Сонейко.
Сонейко. У лузе сена пасенована. Сонейко.

Ой, рана, рана, на Яна-Купала...

Ой, рана, рана, на Яна-Купала
На вулачку сонейка дзевачак збірала,

У ручкі сярпочкі давала.
— Да годзе, дзевачкі, гуляці,
Да ідзіце ў поле жыта жаці,
Роўнае поле, роўнае,
Зародзіць Бог жыта буйнае,
А ярую пшаніцу да на навіне,
Да збірайся, родзе, увесь ка мне.

ЖНІЎНЫЯ ПЕСНІ

Гаварыла поле шырокае...

Гаварыла поле шырокае,
Жыта ядраное:
— Не магу я на полі стаяці,
Каласочкам махаці,
Толькі магу на полі капамі,
У гумне стагамі.
Гаварыла сужанькава маці:
— Не магу я па двару хадзіці,
Ключыкі насіці.
Толькі магу за сталом сядзеці,
Чарачкі наліваці,
Гасцей частаваці
Віном зеляненькім,
Мядком саладзенькім.

У полі жыта палавее...

У полі жыта палавее,
У багатага душа млее,
Што ў засеку жыта тлее.
А ў беднага радуецца,
А ў беднага радуецца,
Што новы хлеб гатуецца,
Што з багатым зраўнуецца.

Як пайду я дарогаю...

Як пайду я дарогаю,
Пушчу голас я дуброваю,
Няхай голас галасуе,
Хто мой голас пачуе,
Той мяне пашкадуе.
А зачуў голас свёкарка:

— Калі ж дзіця мае голас вядзець,
Дык няхай ідзець пагуляе,
А калі ж нявестачка,
Хай ідзець пажынае.
— Поле ж маё далёкае,
Рэзка мая шырокая.
А жыта маё ядронае,
А я ж яму дзіця не роднае.

Ой, час, пара дадоманьку...

Ой, час, пара дадоманьку,
Па постаці раса ўпала.
Па постаці лядовая,
Па коласі мядовая,
Лядовую валы з'ядуць,
Мядовую дзеўкі сап'юць.
Валы з'ядуць — гараць будуць,
Дзеўкі сап'юць — гуляць будуць.

Да знаці пана, знаці...

Да знаці пана, знаці
Да праміж усімі панамі:
Ён на коніку паязджае,
На коніку паязджае
Дай жэнчыкаў прыганяе:
— Жнеце, жэнчыкі, жнеце,
Жнеце, жэнчыкі, жнеце!
Ды самі сябе не пазнеце,
Не дажаўшы, не пойдзеце,
Не дажаўшы, не пойдзеце
Да тут начаваць не будзеце.

Пераж ані, Божа, хмаркі...

Пераж ані, Божа, хмаркі,
А-эй, пераж ані, Божа, хмаркі
На чужую староначку,
Дзе пажалі, пакасілі
Да снапочкі павазілі.
У нас не жата, не пажана,
А-эй, у нас не жата, не пажана
Да ў гуменца не звожана.

Ой, не ляжы, ветру, ў полі...

Ой, не ляжы, ветру, ў полі,
Паміж горачак у разоры,
Да ўстань, ветру, памаленьку,
Павей, ветрык, паціхеньку,
Развей хмарачку цямненьку —
Маю тугу цяжаленьку.
Каб я малада жыта жала
І сярэдзіну сваю не зажала.
Панічыку, а панонічку, пусці мяне да доміку,
У мяне дома дзетак многа:
Што куточак — то сыночак,
На покуці — дзевяць дочак.

Ой, месяц ясненькі...

Ой, месяц ясненькі,
Асвяці нам дарожаньку,
Асвяці нам дарожаньку,
Кудэма ісці да доміку.
Каля саду вінаграду
Да айчанькі на параду,
Да свякроўкі на вячэру,
Да мілога на пасцелю.
Вячэрайка у галушачкі,
Пасцель бела ў падушачкі.

Да ўжо сонца за бор, за бор...

Да ўжо сонца за бор, за бор,
Пара жнейкі дамоў, дамоў,
На постаці раса пала,
На сярпочках іржа стала,
Малы дзеткі дома плачуць,
У старых бабак ручкі зябнуць,
У малодачак вянкі вянуць.

Ой, закаціся, сонейка...

Ой, закаціся, сонейка,
Усё з гары ў далінку,
Ой, зрабі нам вячэраньку.
Няхай вечар бардзей будзе,
Майму сэрцу лягчэй будзе:
Нахадзіліся ножанькі,
Ой, нарабіліся ручэнькі,
Сярпы не жнуць, нажаліся,
Ручкі не ймуць, наймаліся,

Насвяціліся вочанькі
Аж да цёмнае ночанькі.

Няхай вечар бардзей будзе...

Няхай вечар бардзей будзе,
Майму сэрцу лягчэй будзе.
Мой міленькі з таргу едзе,
Мне, маладой, гасцінец вязе —
Пярсцёначак залаценькі,
А вяночак руцвяненькі.
У пярсцёначку жыта жаці,
А ў вяночку красаваці.

Паслаў мяне свёкар...

Паслаў мяне свёкар
Да ў бор жыта жаці,
Заказаў мне свёкар
Да сто коп нажаці,
Сорак кароў падаіці,
Трыццаць вепраў накарміці,
Дзяжу хлеба замясіці.
Я малада спазнілася,
Да дзіцяці забылася.
Прыляцела два лебядзі,
І абодва беленькія,
Браткі мае родненькія.
Узялі яны дзіця маё.
Адзін кажа: панясем мы,
Гэта ж нашай сястрыцы,
Што на чужой стараніцы,
Кожны яе наб'ецца,
Яе слёзкаў нап'ецца.

Сакатала бочачка...

Сакатала бочачка,
У піўніцы стоячы:
— Калі мяне не вып'еце,
Я сама разліюся
Па дварэ расіцаю,
За варота крыніцаю.
Гаварыла дочачка
Сваёй роднай мамачцы:
— Калі мяне не аддасцё,
Я ад вас сама пайду
Па двары мяцёлкаю,
Да мілога пчолкаю,
Па дварэ расіцаю,
Да мілога сініцаю.

Ой, красуйся, жыцейка...

— Ой, красуйся, жыцейка,
Калі цёпла лецечка.
— Як жа мне красавацца?
Буен вецер павяваець,
Буен вецер павяваець,
Красу маю абіваець,
Не даець красавацца.
— Ой, красуйся ж, дзевачка,
У роднага татачкі.
— Як жа мне красавацца?
Кожны дзень сваты едуць,

Кожны дзень сваты едуць,
Не даюць красавацца,
Не даюць красавацца,
У белае прыбірацца.

Пад арэхавым кустом...

Пад арэхавым кустом
Начавалі начлежнічкі,
Начуючы, агонь клалі
Да й хлопчыка
пагуквалі:
— Да хлопчычак-
брацейка,
Тут твайго каня няма,
Да пабег твой конічак
Па залаты
пярсцёначак
І па белу пярыначку,
Па маладу княгінечку.

Да раўнуйце постаці...

Да раўнуйце постаці,
Бо ўжо пара дадому йсці,
На постаці раса пала,
На коласе і другая;
На постаці лядовая,
На коласе мядовая;
На постаці валы з'ядуць,
На коласе паны сап'юць,
Валы з'ядуць рагатыя,
Паны сап'юць багатыя,
Валы з'ядуць — араць будуць,
Паны сап'юць — гуляць будуць.

Дзевачка з поля ішла...

Дзевачка з поля ішла,
За поясам сярпок нясла,
За поясам сярпок нясла,
За плячыма — калысачку,
А на руках — дзіцятачка.
Калысачка — цыргі-цыргі,
Дзіцятачка — кугі-кугі.

Палуднічкі прагудзелі...

Палуднічкі прагудзелі,
Палуднаваць захацелі.
Хоць гудзіце, не гудзіце,
Палуднаваць не будзеце:
Шчэ постаці не пражалі,
Капы снапоў не звязалі.

Кругло, мало балоцечка...

Кругло, мало балоцечка,
Хоць жа яно кругло, мало,
Але ж яно ўрадлівае:
Наляцела пташак многа,
З імі разам салавеечка.

Нізка, мала Аленачка,
Хоць жа ж яна нізка, мала,
Але ж яна шчаслівая:
Наехала сватоў многа,
Выбрала сабе Іваньку.

Наш гаспадар маладзенькі...

Наш гаспадар маладзенькі,
Пад ім конік вараненькі.
Ён усё поле аб'язджаіць,
Сваіх жнеяк аглядаіць:

Ці ўсе яго ў полі жнеі,
Ці ўсе звязаны іх жмені?
Ці ўся яго талочанька,
Ці зжата ўся валочанька?

А чыя ж то валока...

А чыя ж то валока*
Доўга і шырока?
На ёй жэнчыкі жалі,
Серпікі паламалі.
Серпікі сталёвыя,
Жэнчыкі маладыя,

Паджынайся, нябожа,
Табе Бог дапаможа.
Паперадзі віно п'юць,
А ззаду мядзведзі.
Паперадзі лебедзі,
А пазадзі кіём б'юць.

Выйшла маці жыта жаці...

Выйшла маці жыта жаці,
Стала сярпы перакладаці.
Няма сярпа залатога —
Жанца маладога.

Выйшла свякроў жыта жаці,
Стала сярпы раскладаці.
Прыбыў сярпок залаценькі —
Жанец маладзенькі.

Што ў мяне была за свякровачка...

Што ў мяне была за свякровачка,
Што ў яе была за наровачка.
Сама ўстане ранюсенька,
Мяне ўкрые цяплюсенька:
— А спі, нявехна, высыпайся,
На работу не спяшайся.
Пакуль у полі сонца ўгрэець,
Сонца ўгрэець, расу абвеець,
Тады, нявехна, у поле пойдзеш.

---

* Кожны першы радок страфы паўтараецца двойчы.

Баліць мая сярэдзінка...

Баліць мая сярэдзінка,
Што жыта маё рэдзенька;
Сярэдзінка не гнецца,
Постаць мая валачэцца;
Няма маёй маці
Мне постаці падагнаці,
Няма маёй сястрыцы,
Маёй большай памочніцы,
Сястрыца б постаць падагнала,
А я трохі пастаяла,
Да й варон пастраляла.

Добры вечар, нашай маці...

Добры вечар, нашай маці, *
Ці гатова вячэраці?
Ідзець тваё дзіцятачка,
Утаміўшыся, умарыўшыся,
Ядраное жыта жнучы.

Чые гэта талачане...

Чые гэта талачане,
Што па полю блудзілі?
Пыталіся яны Лунінскага сяла,
А Януськава двара.
Там столікі цясовыя,
Там кубачкі залатыя.
Там столікі засціланы
І кубачкі наліваны
Мядком саладзенькім
І віном зеляненькім.

Ой, дайце мне загон-разгон...

Ой, дайце мне загон-разгон,
Маладога павязнечка.
Ён са мною снапы звяжа,
Ён са мною спаці ляжа,
Снапы звяжа, памацуе,
Спаці ляжа, пацалуе.

Ой, пара й, пара да двара...

Ой, пара й, пара да двара,*
Цёмная ночанька абняла,
Цёмная ночанька і нявідна,
Шырока дарожка й грудліва.
Вараны конічак спадбіўся,
Малады Іванька спазніўся.

---

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Ой, закаціся, ярка сонейка...

Ой, закаціся, ярка сонейка,
Дый за лес цёмны, дый за горачку,
Дый за лес цёмны, дый за горачку,
А мне пара ісці дадомачку,
А ў мяне дома дый ліхі свёкар,
Дый ліхі свёкар дый свякрухна.
Ой, стрэнуць мяне на вароцечках,
Ой, пашлюць мяне дый па вадзіцу.
Ой, пашлюць мяне па вадзіцу,
Ой, у шчыры бор, у крыніцу.
Я ж, маладзенька, шчэ й не снедала,
Шчэ й не снедала, й не абедала,
Шчэ й не снедала, й не абедала,
А мая родная мамка дый не ведала.

Глядзіць, глядзіць маё вочка...

Глядзіць, глядзіць маё вочка,
Беражочак недалёчка,
А на гэтым беражочку
Стаіць прыганяты,
Здаровы, чубаты.
Судзі, Божа, мне дажаць,
Бо ён скуру можа зняць.

Сіняе азёрачка...

Сіняе азёрачка,
Чаго затанула?
Як жа мне не тануці?
Наляцелі шэры гусі
Й беражкі абтапілі,
Наляцелі шэры гусі,
Беражкі абтапілі
І вадзіцу замуцілі.
Маладая Манячка,
Чаго ж ты зажурылася?
Як жа мне не журыцца?
Наехалі чужаземцы, майго татку ўпаілі,
Наехалі чужаземцы, майго татку ўпаілі,
Маю мамку абманілі
І мяне заручылі.

У слаўнага пана...

У слаўнага пана
На зары жыта жала,
Па месяцу копы клала,
Дадому пайшла па ночы,
Вячэрала пры свечы,
У белым свеце спаць лягла,
Лажылася, гаварыла:
— Божа мой, калі я запачыну!
Ужо ж свет за гадзіну.

Да гула пчолка, гула...

Да гула пчолка, гула,
Па бару лятаючы
Да мядок збіраючы:
— Горкі мой мядочку
Да без цябе, мой бортнічку.
Да плакала ўдовачка,
Да па двару ходзячы,
Да дроўцы збіраючы,
Да абед гатуючы:
— Горкі мой абедзе
Да без цябе, мой міленькі.
Сама сяду на покуце,
А дзеткамі абсажуся,
Слёзкамі абальюся.
Дзеткі ж мае маленькія,
Слёзкі мае драбненькія;
Дзеткі мае пабольшалі,
Слёзкі мае пагоршалі.

Вялік наш бор, вялік...

Вялік наш бор, вялік
Над усімі барамі,
Багат наш пан, багат
Над усімі панамі.
Няма такі пана дома,
Паехаў ён у Шклова
Чарачак пакупаці,
Жнеечак частаваці.
Нашы жнейкі маладыя,
Іх сярпочкі залатыя,
Па месячку жыта жалі
І сярпочкі паламалі.

Ты наш пане — баране...

Ты наш пане — баране,
Пускай дамоў заране.
Наша пані авечая
Дзяржала нас да вечара.
Дымна ў полі, дымна
Да й нічога не відна.
Наша пані затапіла,
Нам вячэры наварыла.
Наварыла боршчу
І накідала хвошчу,
І наварыла сачавіцы,
Накідала й чамярыцы,
Хоча жняцоў патравіці.

У добрага пана...

У добрага пана
Пры месячку жыта жала.
Бадай яму кроўна,
Што пускаў дадому цёмна.
Бадай яму горка,
Што пускаў дадому зоркай.

Ой, жыта жну, пажынаю...

Ой, жыта жну, пажынаю,
На дарожаньку пазіраю,
Да ці скора маці ісціме,
Мне абедаць нясціме?
Нясе хлеба булачку
І мядочку у кубачку.

Я жыта жну, пажынаю,
На дарожаньку пазіраю.
Да ці скора свякроў ісціме?
Нясе хлеба скарыначку
І вадзіцы ў чарапочку.

Мая мамка, мая кветка...

Мая мамка, мая кветка,
Не аддавай мяне ўлетку,
Да аддавай мяне ўзімку,
Штоб сабрала сабе сілку
На свёкраву дзесяцінку.
Бо у свёкра поле далёкае,

А загоны шырокія,
Азяроды высокія,
А падпоры жалезныя,
А жнеечкі маладыя.
Я з імі не сажнуся
Да з загонам астануся.

Ой, у полі бярэзінка...

Ой, у полі бярэзінка,
Баліць мая сярэдзінка
Ды некаму спагадаці,
Сярэдзінку патаптаці.

А дай жа Божа кугакала,
Каб пад снапком заплакала,
А я б пашла скалыхнула,
Сярэдзінка б аддыхнула.

Поле маё, поле маё вялікае і вясёлае...

Поле маё, поле маё вялікае і вясёлае,*
Вялікае і вясёлае, й прыгожае й прывольнае.
Па полю іду, па полю іду — весялюся,
Па полю іду, па полю іду — красуюся,
Дамоў прыду, дамоў прыду — не шчуюся.

---

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Добра жаць — шырокая ніўка...

Добра жаць — шырокая ніўка,
Вялікая постаць.
Добры вечар, сцюдзёная хатка,
Не родная матка!
Не пытаецца, ці змарылася,
Што спазнілася.
Ды пытаецца, ці доўга пражала,
Ці многа нажала.
Добра гнаць — шырокая ніўка,
Вялікая постаць.
Добры вечар, цёплая хатка,
Родная матка!
Не пытаецца, ці злянілася,
Ці многа нажала.
Ды пытаецца, ці змарылася,
Што спазнілася.

Ой, пара дамоў, пара...

Ой, пара дамоў, пара.
Ужо й пара мінаецца,
Ужо й пара мінаецца,
Ды наш пан валяецца:
То за пень, то за елку,
То за бабу, то за дзеўку.

На лугу касцы косяць...

На лугу касцы косяць,
Косяць, косяць ды мыляюцца,
На мяне ўглядаюцца,
Што я тонка, высока,
Што я бела, румяна,
Хораша я ўбрана,
На лугі я паслана.

Лета ж маё, лецейка...

Лета ж маё, лецейка,
Ужо я твая не жнеечка!
Матка ж мая, ды матуленька,
Ужо я твая не служачка!
Таго ж я служачка,
З кім на каберцы стаяла.

Ды ўжо вечар, вечарэе...

Ды ўжо вечар, вечарэе,
Мая мамка вячэрае,
Вячэрае ды астаўляе
Ды ў вакенца паглядае:
Нейдзе ж маё дзіця ў полі
Пры вялікім загоне,
Пры вялікім загоне,
Пры вялікім прыгоне.
Ды вячэрай, мая мамка,
Я ўжо вячэрала.
Не сухі я хлеб ела,
Слёзкамі палівала.

Калі ж тая серада прайшла...

Калі ж тая серада прайшла,
Як я не еўшы на прыгон пайшла,
Увесь дзень жала, не лянілася,
Злому войту пакланілася.
А цяпер не аб чым тужыць:
Войт п'яны ў карчме ляжыць.

Сонейка, сонейка...

— Сонейка, сонейка,
Ці бывала ты ў найме?
Ці бывала ты ў найме,
Ці спагадаеш ты мне?
Каб ты ў найме пабывала,
Ты ж бы мне спагадала:
Позненька ўзыходзіла,
Раненька заходзіла!
— Малада малоданька,
Не дзіві ты на сонейка,
Не дзіві ты на сонейка,
Ды дзіві ты на пана:
Я й раненька ўзыду —
Цябе ў полі знайду,
Я й позненька зайду —
Цябе ў полі пакіну!

Ой, пара нам дамоў, пара...

Ой, пара нам дамоў, пара,
Сцюдзёная раса пала,
Цёмная ночка настала.
А ў нас няма параднічка,
Ні пана, ні ўраднічка.
Некаму рады радзіці,
Нас дамоў адпусціці.
Дадзім пану паўбарана,
Можа пусце дамоў рана.
Бадай яго з нашым панам:
З'еў нашага паўбарана,
З'еў нашага паўбарана,
Бадай пана разарвала,
Бадай пана разарвала,
Не пусціў нас дамоў рана.
Вяліць прыйсці світаючы,
А пушчае змяркаючы.

Ой, гудцы гудуць...

Ой, гудцы гудуць, гудцы гудуць,
Усенькі людзі палуднуюць.

Ці гудзеце, не гудзеце,
Палуднаці не будзеце,
Ваш прыстава развусенькі,
Вы жэнчыкі маладыя,
У вас сярпочкі залатыя.
А як сталі, заспявалі,
А як селі, зазвінелі.

Закурыўся ціхі, дробны дожджык...

Закурыўся ціхі, дробны дожджык.
Да па чыстаму полю,
Зажурыўся мой татачка родны
Па маёй горкай долі.
Не курыся, ціхі, дробны дожджык,
Да па чыстаму полю,
Не журыся, мой татачка родны,
Па маёй горкай долі.
Ні сама я долечку шукала —
Мужа выбірала.
Пан багаты з залатой палаты
Даў мне мужа ката.
Закурыўся ціхі, дробны дожджык
Да па чыстаму полю,
Зажурыўся мой татачка родны
Па маёй горкай долі.

Пара дамоў, пара...

Пара дамоў, пара,
Халодная раса пала,
Халодная раса пала,
Нам дамоў пара стала.
Ой, чуйце дома, чуйце,
Нам вячэрку гатуйце,
На вячэрку рыбку з перцам,
Легчы спаць пад акенцам,
Легчы спаць пад акенцам,
Эй, з маладым кавалерцам,
Эй, з маладым кавалерцам,
Эй, да на белай пасцельцы.

А мы поле рачком сышлі...

А мы поле рачком сышлі,
Пад мяжою вянок знайшлі,
А-а-эй, пад мяжою вянок знайшлі
Ды й паненцы прынеслі.
Наша пані маладзенька,
А-а-эй, наша пані маладзенька

Да злавіла верабейку,
Да на кухні гатавала,
А-а-эй, да на кухні гатавала,
Сваіх жнеек частавала.
Жніце, жніце, мае жнейкі,
А-а-эй, жніце, жніце, мае жнейкі,
Не дажаўшы, не пойдзеце,
Не дажаўшы, не пойдзеце,
А-а-эй, не дажаўшы, не пойдзеце,
Без вячэры не ляжаце.

А пара нам дамоў ісці...

А пара нам дамоў ісці,
Пагубляла зара ключы
Каля постаці ідучы.
— А хто ж мае ключы знойдзець,
Той жа ўвосень замуж пойдзець,
А дзяўчынка йшла і ключыкі знайшла
І ўвосень замуж пайшла.

Да ў нашага пана...

Да ў нашага пана
Да нядобрая слава:
Па месяцу жыта жалі,
Па зорах копы клалі.
Цёмна ў полі, цёмна,
Бадай таму цямней было,
Хто да хаты не пушчае
Да на полі нас трымае.
Да мы позна з поля ідзём,
Да прыганятага клянём.

Да падзякуйма Богу...

Да падзякуйма Богу
Да за яго выгоду:
Да за ціхае лета,
Да за буйнае жыта.
Да мы ўсё лета жалі
Да не ляжалі,
Да не ляжалі,
Усё каласкі збіралі.
Да мы поле рачком сышлі,
Да пад мяжой вянок нашлі,
Да прынеслі на галоўцы,
Палажылі на талерцы.

Ай, добра ноч!..

Ай, добра ноч!
Шырокае поле,
Жыта ядраное,
Ай, добра ноч!
На здароўе,
Жнейкі маладыя,
Сярпы залатыя,
На здароўе!

Прыхадзіце
Заўтра раненька,
Як сонейка ўзойдзіць,
Прыхадзіце!
Прынасіце
Адзін гаршчок кашы,
А другой сараквашы,
Прынасіце!
Вы сажніце
Шырокае поле,
Жыта ядраное,
Да сажніце!

Пастаўляйце
У полі капамі,
А ў лузе стагамі,
Пастаўляйце!
А мы зжалі
І поле пажалі,
І пастаўлялі
У полі копамі,
У полі копамі,
А ў гумне стогамі
Пастаўлялі.

Хадзі, выдзі, пане гаспадару...

Хадзі, выдзі, пане гаспадару,
Да выглянь, выглянь да на сваю ніўку,
Што на тваёй ніўцы да рыжэецца,
Да рыжэецца да бялеецца,
Да бялеецца да лілеецца.
Да рыжэецца буйнае жыта,
Да бялеюцца маладыя жнеі,
Да лялеюцца сталёвыя сярпы.
Жанцы жалі, ў копы клалі,
У копы клалі, сцірты мяталі,
Дзе горачка — там копачка,
Дзе даліначка — там сцірдачка...

Ой, хадзіў Раю...

Ой, хадзіў Раю,
Ой, хадзіў Раю, Раю, мой Раю,
Да па вуліцы.
І ніхто Раю, Раю, мой Раю,
У хату не клічыць.
Ой, абазваўся,
Ой, абазваўся, Раю, мой Раю,
Молад Іванька:
«А хадзі, Раю,
А хадзі, Раю, Раю, мой Раю,
Ка мне ў хатку.
У маёй хатцы,
У маёй хатцы, Раю, мой Раю,
Як у святліцы.
Стаяць столікі,
Стаяць столікі, Раю, мой Раю,
Пазасціланы.
Кубачкі мёдам,
Кубачкі мёдам, Раю, мой Раю,
Паналіваны.
Жнеячкі мае,
Жнеячкі мае, Раю, мой Раю,
Пазазываны.
Усе ў радочак,
Усе ў радочак, Раю, мой Раю,
Папасаджаны».

Хадзіў Спарыш па вуліцы...

Хадзіў Спарыш па вуліцы,
Па вуліцы па шырокай,
Па мураўцы па зялёнай,
А ніхто Спарыша ў двор не завець.
Выйшла, выехала Хвядорыха:
— Хадзі, Спарыш, ка мне на двор,
Ка мне на двор, за цясовы стол:
У мяне сталы пазасціланы,
Віном кубкі паналіваны,
У мяне пірагоў панапечана,
У мяне мёду панасычана,
У мяне кашы наварана.
Сядзь, Спарыш, на покуце,
На покуце да на золаце.
Пі, Спарыш, зялёна віно.
Спарыш, Божа, у маім гумне,
У маім гумне, у маім дварэ:
На таку ўмалот, а ў дзяжы падход,
А ў печы рост, а на стале сыццё.

Разгарыся, вячэрняя зорка...

Разгарыся, вячэрняя зорка
Перад ранней,
Расхадзіся, наша гаспадынька,
Перад жнейкамі,
Кажы выносіць цясовыя сталы
На чыстыя двары,
Бяры залатыя ключы
З-пад пояса,
Адмыкай жа залатымі ключамі
Зялёную скрыню,
Выбірай ў зялёнай скрыні
Бялёвыя абрусы,
Засцілай, наша гаспадыня,
Цясовыя сталы,
Налівай жа, наша гаспадыня,
Залатыя кубкі,
А частуй жа старшую жнейку,
Пастацяначку:
— Будзь здарова, старшая жнейка,
Пастацяначка!

На здароўе, мая гаспадыначка,
Сенатарачка!

Каціўся вяночак па полю...

Каціўся вяночак па полю,
Прасіў жэнчыкаў дадому:
— Ідзеце, жэнчыкі, дадому,
Занясеце мяне ў стадолу.
Палажэце мяне ў старону,
Ой, то я пайду на ніву,
Ой я, мне на ніве гадзіна,
Ой я, мне ў старне гасціна!
— Адчыняй нам, пане, вароты,
Нясемо вяночак з золата,
Ой, не з золата, з крапівы,
Бо шчэ мы гарэлкі не пілі.

У нас сягоння вайна была...

У нас сягоння вайна была:
Усё поле звааявалі,
Да пану жыта пажалі,
А ты ж, пане, не ўлякайся,
Ды ў пакой не хавайся,
Бо мы ёсць не жаўнеркі,
А панскія жнейкі.
Да выходзь, пане, выходзь,
А віна бочку выкоць,
І белы сыр на талеркі,
Частуй свае жнейкі.
Да ўмеў жа нас прыганяць,
Умей цяпер частаваць.

Ляцеў саколік па полю...

Ляцеў саколік па полю,
Збіраў пташачкі да бору:
«Да бору, пташачкі, да бору,
Ужо наляталіся па полю!»
— Нямнога ж мы ляталі,
Чырвоны ягадкі збіралі!
Ездзіў гаспадар па полю,
Збіраў жанцы дадому:
«Дадому, жэначкі, дадому,
Ужо нагуляліся па полі!»
— Нямнога то мы гулялі,
Усё густа жыта жалі.
Тоўстыя снапкі вязалі,
Частыя копкі складалі.
Колькі на небе зорачак,
Столькі на полі копачак.

Рада, рада шэра перапёлка...

Рада, рада шэра перапёлка,
Што лета даждала.
Рада, рада наша гаспадынька,
Што жыта дажала.

Перамёрзла шэра перапёлка
Глыбока ў крыніцы,
У сцюдзёнай вадзіцы.

Перамёрзла наша гаспадынька
Без жытняга хлеба,
Без кіслага квасу.

Радзей таго наша гаспадынька,
Што жнеек сабрала
І жыта дажала.

Ніўка, ніўка, аддай маю сілку...

Ніўка, ніўка, аддай маю сілку
На другую ніўку!
На коніка лой, на ніўку гной,
А мне здароўя!
Судзі, Божа, налета жаці
І ядранейшае і гусцейшае.

Адчыняйце шчытовы вароты...

Адчыняйце шчытовы вароты,
Ідуць жнеі з работы,
Ні так жа з работы,
Як з жаркай пякоты!
Вечар вечарэе, душа весялее,
Заранка зарае, душа занывае,
Што трэба ісці на работу,
На жарку пякоту!

Ой, я з поля цяку, бягу...

Ой, я з поля цяку, бягу:
Да сярпочак за поясам,
Дый малазён на ручаньках.
Дзеля цябе, малазён,
Да мне ў маткі не быці,
Вох, з руты вянка не звіці.
Ой, да хоць я яго саўю,
Вох, то насіці не буду.
Зносіць мая залавіца,
Яго родная сястрыца.

Жала я жыта...

Жала я жыта да не ляжала,
Ой, я жала яго па шчырай праўдзе,
Да не давайце да па чарачцы,
Да давайце ж па цэлай кварце.
Й ад чарачкі я не ўп'юся,
Й ад квартачкі ж да не павалюся,

Ой, я ж табе, мой бацюхна,
Йшчэ ж дзянёк да пажынаю.
Да лугамі ж йду, песні ж пяю,
Й аж лужочкі разлягаюцца,
Да сялом іду, сільна плачу,
Варожачкі ж пацяшаюцца.
— Да пацяшайцеся, да варожачке,
Да й на сваё ж да бяздолейка,
Ах, я ж пецьму ж да й гуляцьму,
Калі ж маё да й здароўечка.

У нашага пана...

У нашага пана
На дварэ куна йграла,
Сабаля падмаўляла:
— Саболю, саболю,
Пагуляем з табою,
Развесялім пана
І пані маладую,
Чэлядзь яго каханую,
Дзеткі яго маленькія —
Служкі яго вярненькія.

Да ці выйшла да цёмная туча?..

Да ці выйшла да цёмная туча
З-пад цёмнага лесу?
Да не выйшла да цёмная туча,
Да не выйшла,
Да высыпала да дробнага дожджу
Да буйнага ветру.
Да ці выйшла наша гаспадынька
Раненька на ніўку,
Да ці выйшла?
Да не выйшла наша гаспадынька
Раненька на ніўку,
Да не выйшла.
Да высылала трох сынкоў-сакалкоў,
Дачок-перапёлак,
Да высылала мілых жней:
— Жніце, жніце, сынкі-сакалкі,
Дочкі-перапёлкі,
Жніце, жніце, мае мілы жнейкі,—
Вам прынясу гарэлкі.

Жніце, жніце на халадочку —
Прынясу мядочку.
Жніце, жніце па шырокай ніве —
Прынясу вам піва.

Пахіліўся зялёны дубочак...

Пахіліўся зялёны дубочак
з гары ды ў далочак,
пахіліўся.
Пакланіўся малады малойчык
ды роднай матулі,
пакланіўся.
Паехаў ён долам-даліною,
чужой дальняй стараною,
паехаў ён.
Дый вышукаць багатага цесця,
ласкавай паненкі,
пашукаць ён.
Праездзіў ён жалезныя колы,
вараныя коні,
праездзіў ён.
Не знайшоў ён багатага цесця,
ласкавай паненкі,
не знайшоў ён.

А чы поўна арэхавая чаша?..

А чы поўна арэхавая чаша
Ядром налітая?
А так поўна — ні калыхнецца
І ні пральецца.
А чы поўна гаспадара гумно
Дабром навязёна?
А так поўна — ні з канём уехаць,
Ні пяхотаю ўйці.
Толькі можна сокалу ўзляцець,
Дабро паглядзець.

Да слава табе, Божа...

Да слава табе, Божа,
Што мы жыта пажалі,
Што мы жыта пажалі,
У снапочкі павязалі,

У снапочкі павязалі,
У бабачкі пастаўлялі.
Ой, раўняйцеся, копы,
У роўным полі стоячы,
У роўным полі стоячы,
На гуменца гледзючы.

Залатая мяцёлачка...

Залатая мяцёлачка
Памяла, папратала,
Памяла, папратала,
У застаронкі паскладала.
Судзіў нам Бог пажынаць,
Судзі нам, Бог, і спажываць
З панамі, каралямі,
З людзьмі нашымі здаровымі.

Да на гарэ вецер вее...

Да на гарэ вецер вее,
Гаспадар жыта сее,
Да сеючы Бога просіць:
— Зарадзі, Божа, жыта,
На прышлае лета,
Да на корань караніста,
Да на колас каласіста,
Да на ядро ядраніста,
Да на таку умалотам,
А ў млыне прымалотам,
А ў дзяжы падыходам,
А ў печы румяна,
Да на стале кахана,
Да на стале, як сонейка,
Гаспадарам на здаровейка.

ВОСЕНЬСКІЯ ПЕСНІ

ЯРЫННЫЯ ПЕСНІ

Журавы лятуць...

Журавы лятуць,
Палудзень нясуць,
Будзем палуднаваць.
Журавы селі,

Палудзень з'елі, Палудзень нясе,
Нечага палуднаваць. Будзем мы палуднаваць.
Мамачка ідзе,

Ападае лісточак...

Ападае лісточак
На жоўты пясочак,
Дзевачцы да на вяночак.

А ў цёмным лесе...

А ў цёмным лесе,*
Люлі-рана, мядзведзь рыкаіць.

Мядзведзь рыкаіць,
Люлі-рана, дзевак пужаіць.

Рыкай, ні рыкай,
Люлі-рана, я не баюся.

Толькі ж баюся,
Люлі-рана, асенняй ночкі.

Асення ночка,
Люлі-рана, цёмна, вяліка.

Яна разлучыць,
Люлі-рана, з айцом і мамкай.

Яна прылучыць,
Люлі-рана, к чуж-чужаніну.

К чуж-чужаніну,
Люлі-рана, к свёкру, свякроўцы.

Ай, у бару ціцярук балбочыць...

Ай, у бару ціцярук балбочыць,
А ён з бору ляцеці не хочыць,
Ай, у бору ягодкі салодкі,
У крыніцы вадзіца студзёна.
Гапулька ат маткі іці не хочыць.

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

У матулькі позняе ўставанне,
У матулькі ранняе ўкладанне,
А ў матулькі гладкае часанне,
У матулькі бела умыванне,
У матулькі ранняе сняданне.
У свёкраткі такога не будзіць:
У свёкраткі позняе ўкладанне,
У свёкраткі ранняе ўставанне.
У свёкраткі не бела ўмыванне,
У свёкраткі не гладка часанне,
У свёкраткі позняе сняданне.

Сінія мае два галубочкі...

Сінія мае два галубочкі,
Голасна забрукуйце,
Падайце тугу зялёнаму лугу,
Майму татку жалю:
Ён мяне дае і не ведае,
Якая доля будзе.
— Дачушка мая, мілае дзіця,
Я табе тое даю,
Я табе тое даю,
Што ў хазяйстве маю,
Пра долю не ўгадаю.

Сінія мае два галубочкі,
Жаласна забрукуйце,
Падайце тугу зялёнаму лугу,
І маёй мамцы жалю:
Яна ж мяне дае
І не ведае, якая доля будзе.
— Дачушка мая, мілае дзіця,
Я ж табе гэта даю,
Я ж табе даю,
Што ў скрыні маю,
А пра долю не ўгадаю.

Ой, восень мая...

Ой, восень мая,
Восень сцюдзёная,
Чаго ты рана захаладала?
Я й не раненька,
Я й не позненька,—
Калі мая пара прышла:
Лісточак апаў, зямельку ўслаў,
Вось мая і пара прышла.
Рэчкі сталі, пазамярзалі,
Во мая й другая пара.

Ай, восень, восень, макрота...

Ай, восень, восень, макрота,*
Дзецюкам жаніцца ахота,
Дзевачкам ісці няволя,
Заняволіла субота
Усё й татулькава работа.

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Ужо не раненька, ужо не позненька...

Ужо не раненька, ужо не позненька —
Сонейка на заходзе.
Была ў мамачкі адна дачушка
І тая на выходзе.
Пайшла у каморку і чэша галоўку,
Беленька умываецца.
Выйшла з каморкі, выйшла з новенькай,
Мамачцы скланілася.
— Дзякуй, мамачка, дзякуй, родненька,
За тваё гадаванне,
Што гадавала, што шкадавала,
Што нямножка пасылала,
А хто не гадаваў, а хто не шкадаваў,
Той пасылаці будзе.

Непраўдзівая каліна казала...

Непраўдзівая каліна казала:
Цвесць не буду,
Белага цвету не пушчу,
Чырвоных ягадак не ўраджу.
Як вясна прыйшла — зацвіла.
На ёй цвяточык бяленькі,
На ёй ягад паўненька.
Непраўдзівая дзевіца казала:
Замуж не пайду.
Як восень прыйшла — дак пайшла,
Яна жаніха ўзлюбіла.
Ці ў слядок яго ступала,
Ці хлеба яго скушала,
Што яна яго, маладога, спадабала?

Бярозка з лістом...

Бярозка з лістом
Усю восень шумела.
— Мая бярозка, мая белая!
Як мы расстанемся?
— Ты мой лісточык,
Ты мой зялёны,
Так мы расстанемся,
Ветры павеюць,
Цябе абвеюць,

А я застануся.
— Мая бярозка, мая белая!
Я ж цябе не забуду,
На вясну к табе буду.
Дачушка з мамкай
Усю ночку гуляла:
— Мая матулька, мая родная!
Як мы расстанемся?
— Сваты прыедуць, цябе возьмуць,
А я застануся.
— Мая й матулька, мая й мілая!
Я ж цябе не забуду,
Не тужы, радная,— не забуду.
Зараз у госцікі буду.

Ай, чый то конік пад борам...

Ай, чый то конік пад борам,*
Увесь золатам укован?
Лявонькаў конік пад борам,
Увесь золатам укован.
Хто ж яму золата надаваў,
Хто ж яму коніка ўкаваў?
Надавалі золата каралі,
Укавалі коніка кавалі.
На ўсе чатыры ножанькі.
Каб не баяўся слізгаты,
На ўсе чатыры ночанькі.

А віхор каліну паламаў...

А віхор каліну паламаў,*
А на ціхі Дунай кладку гнаў.
Там ішоў Ванька з абою,
Вёў сваю дзевачку з сабою.
— Хадзі, мая дзевачка, са мною.
— Баюся з табою, баюся:
Гібкая кладачка — увалюся,
Глыбокая рэчка — утаплюся.

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Ой, заржы, заржы, вараны каню...

Ой, заржы, заржы, вараны каню,
Рана з падвор'я йдучы.
Ці не пачуе млада дзяўчына,
У саду вяночка ўючы.
Конічак іржаў, аж явар дрыжаў,
Дзяўчынанька пачула,
Яна пачула, цяжка ўздыхнула,
Жаласна заплакала:

— Чаму не прыйшоў ці не прыехаў,
Як я табе казала?
Ці каня не меў, ці дома не быў?
Ці маці не пускала?

— А я дома быў і коніка меў,
Мяне маці пускала,
Меншая сястра, бадай, не ўзрасла,
Сядзёлачка схавала:

«Не едзь, Ясенька, не едзь, брацейка,
Да тае дзяўчынанькі —
Не ўмее жаці, ні вышываці,
Толькі косу часаці».

— Расці ты, каса, хоць да пояса,
Буду цябе часаці,
Ці не пакіне а мой Ясенька
Мяне верна кахаці!

Праду я, праду, спатанькі хачу...

Праду я, праду, спатанькі хачу.
Як пайду я ў каморачку,
Прыкладу я галовачку там,
Ці не засну, ці не паляжу.
Свёкарка ідзець, мяне судзючы:
— Санлівая, драмлівая, на работу лянівая,
Толькі ёй усё спаць,
Толькі ёй усё драмаць.
Праду я, праду, спатанькі лягу,
Як пайду ж я ў каморачку,
Прыкладу я галовачку там,

Ці не засну, ці не задрамлю.
Свякроўка ідзець, мяне судзючы:
— Санлівая, драмлівая, на работу лянівая.
Праду я, праду, спатанькі хачу.
Як пайду я ў каморачку,
Мамачка ідзець, мяне жалеець:
— Дзіця маё ж дарагое,
Пашло замуж маладое,
Дзеткі абнялі, спаткі не далі.

Ай, упала ластаўка, упала...

Ай, упала ластаўка, упала
У тое дзядоўе колкае.
Ай, у тую макрыцу, травіцу.
Ай, па ёй жа пташкі тужылі.
Не тужыце, пташкі, вы па мне!
Я тое дзядоўе паламаю,
Я тую макрыцу, травіцу пакашу.
Ай, упала Гапулька, упала,
Ай, у тое дзевер'е ліхое,
Ай, у тыі залоўкі-чачоткі.
Не тужыце ж, дзевачкі, вы па мне:
Я тое дзядоўе пажну,
А заловак-чачотак пааддаю,
А ліхія дзевер'я ў суседзі,
А залоўкі-чачоткі ў гасціны.

Хто на стаёнцы зазвоніць...

Хто на стаёнцы зазвоніць,
Рана-рана, зазвоніць?
А там Косцячка выходзіць,
Рана-рана, выходзіць,
Сівога каня выводзіць,
Рана-рана, выводзіць.
За ім мамачка выходзіць,
Рана-рана, выходзіць:
— Куды, сыночак, паедзеш,
Рана-рана, паедзеш?
— Паеду, мамка, на рынак,
Рана-рана, на рынак,
Буду выбіраць там дзевак,
Рана-рана, там дзевак.

Дробна пташачка, невялічкая...

Дробна пташачка, невялічкая
Па ляшчыначцы скача,
Малада дзяўчына, неразумная
Па малойчыку плача.
— А ні я плачу, а ні я тужу,—

Самі слёзы ліюцца,
Што ад мілага лісточкаў няма,
Ад нямілага шлюцца.
Хоць вы шліціся, хоць не шліціся,
Я ўжо ваша не буду,
Каму падала ручку белую,
Таго век не забуду.

Да ўсе хмарачкі да па парачцы...

— Да ўсе хмарачкі да па парачцы,
Адна хмарачка — розна,
Да не сварыся, мая мамачка,
Што я гуляю позна.
А хоць сварыся, ці не сварыся,—
Ты мяне не навучыш,
Да каго люблю, за таго пайду,
Ты ж мяне не разлучыш.
Да пі, мамачка, да тую вадзіцу,
Да што я нанасіла,
Хоць нямілы зяць, хоць нялюбы зяць,
Ну ж я яго палюбіла.
— Не буду піці, не буду піці,
Не буду разліваці,
Хоць нямілы зяць, хоць нялюбы зяць,
Не буду разлучаці.

Ластаўка-белакрылка...

Ластаўка-белакрылка,
Не лятай па гародзе. *(2 разы)*
На цябе сакол глядзіць
Да з высокага дубу, *(2 разы)*
Да з зялёнага лугу.
Ён цябе ўхапіць хоча,
Ухапіць хоча, паляцеці *(2 разы)*
У сваё гняздзечачка.
Маладая дзяўчыначка, *(2 разы)*
Не хадзі па рыначку:
На цябе хлапец глядзіць *(2 разы)*
Да з высокага ганку.
Ён цябе ўзяць хоча,
Узяці паехаці *(2 разы)*
У сваю дзярэўнечку, *(2 разы)*
У сваю сямеечку.

Лятала каза па бярэзнічку...

Лятала каза па бярэзнічку,
Летучы блекатала:
— Каб не той ваўчок, шэранькі бачок,
Я бы тут зімавала:
Ўчора прыляцеў, дзетачак паеў,
А сягоння самую.
Ходзе Манечка ды па рыначку,
Ходзячы бедавала:
— Каб не Васілька, каб не малады,
Я б у мамкі век векавала:
Учора прыехаў, пярынкі забраў,
А сягоння самую.

Чаго ты, лосю, чаго, сівенькі?..

— Чаго ты, лосю, чаго, сівенькі,
Ты к сялу прылягаеш?
Да ці ты, лосю, ці ты, нябогі,
Цяжкую зіму чуеш?
— Да хоць цяжкую, хоць не цяжкую,
Не будзе, як лецечка:
Я ўлетку хаджу, расу церушу,
А зімою не буду.
— Чаго, дзяўчына, чаго, малада,
Ты к сталу прылягаеш?
Ці ты, дзяўчына, ці ты, малада,
Ліхую свякроў чуеш?
— Да хоць ліхую, хоць не ліхую,—
Не будзе, як мамачка:
Я ў мамкі хаджу, косачку пляту,
У свякроўкі не буду.

У садочку, у халадочку...

У садочку, у халадочку
Салавейка шчабеча,
У новым ганачку, у залатым крэсле
Дзевачка коску чэша.
Ой, чэша, чэша, перабірае
І з мамачкай размаўляе:
— Мамачка мая, родная мая,
Чым я стала няміла?
Ці я ў цябе, мая мамачка,

Верненька не рабіла:
Тонка не прала, звонка не ткала
І беленька не бяліла?
Ці табе мілей, мая мамачка,
Зятняя гарэлачка?
Зятняя гарэлачка
Выпіта будзе,
Няма дзевачкі, няма дзіцяці —
І некага пасылаці.

Дай у гародзе на пагодзе...

Дай у гародзе на пагодзе
Канапелька стаяла,
На канапельцы, на зялёненькай
Зязюля кукавала.
Чыя то матка, чыя то матка
Зязюльку праклінала:
— Бадай, зязюля, бадай, шэрая,
Ты тут больш не лятала,
Адкукавала, адшчабятала
Дачушку-работніцу,
Прыкукавала, прышчабятала
Нявестку-нягодніцу.

Ой, гаварыла канапелька...

Ой, гаварыла канапелька,
Стоячы ў гародзе:
— Адкуль на мяне, канапелечку,
Усё й тыя буйныя ветры?
Як сталі веяць, сталі павяваць,
Канапелечку убіваць.
Ой, гаварыла маладая дзевачка,
Жывучы ў татачкі:
— Адкуль на мяне, маладзеньку,
Усё й тыя добрыя людзі?
Як сталі хадзіць, мёд-віно насіць,
Мяне ў татачкі прасіць...
Датуль хадзілі, мёд-віно насілі,
Пакуль татачку упрасілі.

Там пад борам-лесам...

Там пад борам-лесам
Там мядзведзь рыкае,
Цёмна, позна,
Там мядзведзь рыкае.

У маладой малодкі
Свякроўка ліхая,
Цёмна, позна,
Свякроўка ліхая.

Я таму мядзвёдку
Саладзін падкіну,
Цёмна, позна,
Саладзін падкіну.

Я сваю свякроўку
Пярынай прыкрыю,
Цёмна, позна,
Пярынай прыкрыю.

Няхай той мядзвёдка
Саладзіны смокча,
Цёмна, позна,
Саладзіны смокча.

Хай мая свякроўка
Пад пярынай квокча,
Цёмна, позна,
Пад пярынай квокча.

Авясец, мамухна!..

— Авясец, мамухна!
Авясец!
А калі ж чорт сватоў
Прынясець?
— Пачакай, дачушка,
Пажнёмся —
Тагды мы сватоў
Дажджомся;
Мы ім вячэрку
Згатуем —
Да сваіх сваточкаў
Участуім.
Куплена гарэлка
На куце,
Грыбіны пірог
На стале,
Пражоная яешня
У вагне.

Дзе ты, хмелю, быў?..

— Дзе ты, хмелю, быў,
Дзе ты, хмелю, рос,
Чаму ж ты не развіўся?
— Я ў саду рос,
Прыўдарыў мароз,
Затым я не развіўся.

— Дзе, малойчык, быў,
Дзе, малойчык, жыў,
Чаму ж не жаніўся?
— Я ў цара быў,
Я ў цара служыў,
Затым не жаніўся.

Ой, пры Дунаю, пры ціхусенькім...

Ой, пры Дунаю, пры ціхусенькім,
Ой, позна, позна, пры ціхусенькім

Млода Варуська кубачкі мыла,
Ой, позна, позна, кубачкі мыла,

Кубачкі мыла, вянка забыла̀,
Ой, позна, позна, вянка забыла.

Да хто паедзе па мой вяночак,
Ой, позна, позна, па мой вяночак?

Татулька кажыць: я не паеду,
Ой, позна, позна, я не паеду,

Я не паеду, каня не маю,
Ой, позна, позна, каня не маю,

Каня не маю, вянка не знаю,
Ой, позна, позна, вянка не знаю.

Францучок кажыць: я сам паеду,
Ой, позна, позна, я сам паеду.

Коніка маю, вяночак знаю,
Ой, позна, позна, вяночак знаю.

Вядзьмедзька кару дзярэць...

Вядзьмедзька кару дзярэць,
Вядзьмедзька кару дзярэць.
Дзяўчына ваду бярэць,
Дзяўчына ваду бярэць.
— Вядзьмедзька, нашто кара,
Вядзьмедзька, нашто кара?
Дзяўчынка, нашто вада,
Дзяўчынка, нашто вада?

— Карою хатку крыці
Карою хатку крыці,
Вадою лаўкі мыці,
Вадою лаўкі мыці.
Хатку крыці — зімаваці,
Хатку крыці — зімаваці,
Лаўкі мыці — сватоў ждаці,
Лаўкі мыці — сватоў ждаці.

Пушчу я паву...

Пушчу я паву,
Рана-рана, па Дунаёчку,
А сама пайду
Рана-рана, па беражочку,
А ці не ўвіджу,
Рана-рана, таткавы сені,
Таткавы сені,

Рана-рана, новыя дзверы?
Па гэтых сенях,
Рана-рана, мне не хадзіці.
Пушчу я паву,
Рана-рана, па Дунаёчку,
А сама пайду,
Рана-рана, па беражочку,

А ці не ўвіджу,
Рана-рана, свёкравы сенцы,
Свёкравы сенцы,
Рана-рана, старыя дзверцы?
Па гэтых сенцах,
Рана-рана, па іх хадзіці,
Па іх хадзіці,
Рана-рана, у свёкра жыці.

Дабро маё зеляное, зеляное...

Дабро маё зеляное, зеляное,
Я й па табе, дабро маё, пахадзіла,
У цёмным лесе зялёненькім заблудзіла.
Татка кліча — я й не чула.
Дабро маё зеляное,
Я й па табе, дабро маё, пахадзіла,
У цёмным лесе зялёненькім заблудзіла.
Мамка кліча — я й не чула.
Па голасе не спазнала,
Роднай мамкай не назвала, не назвала.
Дабро маё зеляное, зеляное, зеляное,
Я й па табе, дабро маё, пахадзіла, пахадзіла,
У цёмным лесе зялёненькім заблудзіла.
Мілы клічыць — я пачула, я пачула.
Па голасе, па голасе я й спазнала, я й спазнала,
Сваім мілым, сваім мілым я й назвала.

Ходзіць вутачка па сенажаці...

Ходзіць вутачка па сенажаці,
Сама сабе разважае:
«Ці ў мора плысці, ці ў мора плысці,
Ці на беражку быць?
У мора паплыўшы, ў мора паплыўшы —
Нечага жыраваці.
На беражку быўшы, на беражку быўшы —
Недзе зімаваці».
Ходзіць дзевачка па падвор'ейку,
Сама сабе разважае:
«Ці замуж ісці, ці замуж ісці,
А ці ў дзеўках быці?
Замуж няйшоўшы, замуж няйшоўшы —
Людская пагаворка.
Замуж пайшоўшы, замуж пайшоўшы —
Бедная галоўка».

Ой, зара мая, несхадзімая...

Ой, зара мая, несхадзімая,
Ой, ля-лё, рана, несхадзімая.
За што я ў таткі нешчаслівая,
Ой, ля-лё, рана, нешчаслівая?
З церама йдучы, ўцерала ключы,
Ой, ля-лё, рана, ўцерала ключы.
А прызнайцеся, хто за мной ішоў,
Ой, ля-лё, рана, хто за мной ішоў?
Хто за мной ішоў, ключыкі знайшоў,
Ой, ля-лё, рана, ключыкі знайшоў?
Калі маленькі — братцам назаву,
Ой, ля-лё, рана, братцам назаву.
Калі старэнькі — таткам назаву,
Ой, ля-лё, рана, таткам назаву.
Калі роўніца — то замуж пайду,
Ой, ля-лё, рана, з ім жыць буду.

Чом вы, канапелькі, не зялёны стаіце?..

Чом вы, канапелькі, не зялёны стаіце?
Ой, люлі, люлі, не зялёны стаіце?*
Як жа нам, канапелькам, зялёным стаяці,
Ой, люлі, люлі, зялёным стаяці:

Зверху канапелькі клююць вераб'і,
З ісподу канапелькі вада падмыла,
А ў сярэдзіне канапелькі хваля зламіла.
Чом ты, дзевачка, не вясёлая ў танку?
Як жа мне вясёлаю ў танку стаяці,
Бацюшка кажа — за князя аддаць,
Мамачка кажа — у чорныя чарнушкі.
Ой, стукаў, пагрукаў у цясовыя вароты,
Мне бачца, мой бацька з князямі, з баярамі,
Аж то мая мамка з чорнымі чарнушкамі.

Лугавая зязюлечка, лугам ляціш...

Лугавая зязюлечка, лугам ляціш,—
Чаму не кукуеш?
Ужо тваё мінулася вясенняе кукаванейка,
Настала асенняе жыраванейка.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Ой ты, дзеўка-дзяўчыначка, ад бацькі йдзеш,—
Чаму не заплачаш?
А ўжо тваё мінулася, дзевачка, каханейка,
Ма́шына гулянейка.

Ішла цяцера з лугоў, з балотаў...

Ішла цяцера з лугоў, з балотаў,
Рана, рана.*
За ёй суполе ясны саколік:
— Пастой, цяцера, пастой, рабая,
Знімаю табе рабае пер'я,
Жадаю табе саколлі крылля!
— Я ні кідаю рабае пер'я,
Я ні жадаю саколля крылля!
Ішла Францyска з хаты на ранак,
А за ёй суполе малады Стасік.
— Пастой, Францyска, пастой, малада,
Знімаю табе румяны венчык,
Складаю табе шаўковы чэпчык!
— Я ні скідаю румяны венчык,
Я ні жадаю шаўковы чэпчык.

Ці я табе, мая мамачка...

Ці я табе, мая мамачка,
Усю вясну не казала:
— Не ары барку ды не сей маку,
Я яго рваць не буду.
Узары дарожку, пасееш гарошку
Для сваіх малых дзетак.
Людзі прыдуць, мяне забяруць,
Твой мак зазімуе.

Досыць, калінка чырвоненькая...

Досыць, калінка чырвоненькая,
Табе ў лузе стаяці.
Цябе, калінка чырвоненькая,
Пташачкі склявалі.
— Ні так пташачкі, ні так пташачкі,
Як дробны птушаняткі.
Прылятуць — клюнуць, палятуць — клянуць:

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

— Ягадкі ні салодкі.
Досыць, дзевачка маладзенькая,
Табе ў мамкі гуляці.
Цябе, дзевачка маладзенькая,
Суседкі асмяялі.
— Ні так суседкі, ні так суседкі,
Як мае пароўніцы.
Ай, няхай судзяць, няхай гавораць,
Бо я іх не баюся.
Сваты прыедуць, я замуж пайду,
І я з іх насмяюся.

Час дамоў, час дамоў, час дамоў ісці...

Час дамоў, час дамоў, час дамоў ісці,
А ў маім дамочку раёчкі ўюцца.
Усё раі, усё раі, усё непустыя.
Ай, носяць мядочкі да ўсё густыя.
А хто ж тыя раёчкі аграбаць будзець?
Аграбаць раёчкі будзіць Міцечка,
Спажываць мядочкі будзіць Верачка.

Хадзіла дзеванька...

Хадзіла дзеванька
Калі рэчанькі,
Крыкнула, гукнула
Перавознічку.
Адклікнуўся, адгукнуўся
Яе міленькі:
— Я ж к табе, мілая,
Чаўнаком плыву.
— На тваім чаўночку
Я не плавала.
— Я ж табе, мілая,
Масты машчу.
— Па тваім масточкам
Я не хадзіла.
— Я ж табе, мілая,
Конікаў пашлю.
— На тваіх коніках
Я не ездзіла.
— Я ж табе, мілая,
Баяры пашлю.
— З тваімі баярамі
Я ні знаюся.
— Я ж к табе, мілая,
Сокалам ляту.
— Я ж к табе, мілы мой,
Перапёлачкай.

Недаспелая макаўка...

Недаспелая макаўка,*
А дзе ж ты будзеш даспяваць?

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

А ці ў гародзе на лясе (градзе),
А ці ў капуснай баразне?
Маладая Валечка!
А дзе ж ты будзеш дарастаці?
А ці ў татулькі на куце,
А ці ў мілога на руцэ?

Гуляй, гуляй, шчука, плаціца...

Гуляй, гуляй, шчука, плаціца,
Пакуль цёпла вадзіца!
Маразы удараць, возеры стануць,— гуляць
не будзеш.
Гуляй, гуляй, малада дзеванька,
Пакуль у роднай маманькі!
Як у людзі пойдзеш, работку зададуць,—
Гуляць не будзеш.
Цябе, маладу, пашлюць па ваду,
Самі сядуць абедаць.
Горы — высокі, воды — далёкі,
на абед не паспееш.
Прынясеш вады для сваёй бяды,
Кожнаму трэба даць піць:
Дасі старому, дасі малому
і мужаньку маладому.
Дадуць кусочак, пайдзеш у куточак —
Тут твой абед будзе.

Ой, не вылятай, сіва зязюленька...

— Ой, не вылятай, сіва зязюленька,
З куточка сенажаці:
Сокалы ляцяць, на цябе глядзяць,
Хочуць цябе ўзяці.
— Ой, няхай ляцяць, ой, няхай глядзяць,
То я іх не баюся,—
У вішнёвым саду, у кляновым лісту
Я ад іх схаваюся.
— Ой, не выглядай, малада дзеўка,
Із бацькавага двара:
Бо едуць сваты, музыкі іграюць,
Хочуць цябе ўзяці.
— Ой, няхай едуць, ой, няхай йграюць,
То я іх не баюся,—

А ў майго бацькі нова камора,
То я там схаваюся.

Асіна балота красіла...

Асіна балота красіла,
Мар'ічка Івана прасіла:
— Вязі мяне, Іван, дзе ўзяў,
Каб мой вяночак тут не звяў.
— Не бойся, Мар'ічка, не звяніць,
Калі мая мамачка загляніць,
На галоўцы вянок заззяіць,
Студзёнай вадой абаллець.

Віліся пчолачкі...

Віліся пчолачкі
Каля ніцай лозачкі.
— Віціся, не віціся —
Паціханьку садзіціся,
Сучайка не абагніце,
Лісцейка не абатрыце.

А віліся сваточкі
У дзеванькі за столікам:
— Віціся, не віціся —
Паціханьку садзіціся,
Серабра не абагніце,
Золата не абатрыце.

Ой, зялён мой лён, зялён...

Ой, зялён мой лён, зялён,
Да пры мяжы стоячы,
Да пры мяжы стоячы,
Галоўкамі звонячы.
Не дадуць даспяліці,
Галоўкамі пазваніці.
Ой, бяда мая, бяда,
Што я ў мамачкі адна.

Не дадуць дасядзеці.
Касіцы дарасціці,
Касіцы дарасціці,
Кубяльца налажыці.
Ой, кубялец мой новы,
Не за год налажоны,
Не за год налажоны,
За гадзіну страчоны.

Каханка дзеванька, каханка...

Каханка дзеванька, каханка,
А ў ёй косынка кованка,
Не было каваля — раскаваць,
Не было грабянцоў — расчасаць.
Былі кавалі ў дарозе,
А былі грабянцы ў возе.
Прыехалі кавалі
З чужой стараны,

Дзевіцы косынкі раскавалі,
А сужанькі коніка падкавалі.
Былі ў дзяўчыны істужкі,
То яго коніка падпружкі.
Былі ў яе малады пярсцёнкі,
То яго коніка падкоўкі.

Затужылася Евачка...

Затужылася Евачка,*
Што рана восень настала,
Рутая мятачка завяла.
Не з чага маладзе вянка звіць,
На галовачку ўзлажыць.
Зачуў тое Лявонька.
— Не клапаціся, Евачка,
Я ўчора на таргу пабываў,
Я ж табе вяночак старгаваў,
А з руты з мяты зялёны,
З чырвоненькае каліны.

Ды на полі ліпа з сонейкам йграець...

Ды на полі ліпа з сонейкам йграець.
Рана, рана,**
Малады маладзец коніка сядлаіць,
А старшы брацітка яго намаўляець:
— Выбірай, брацітка, на ніўцы,
А не выбірай, брацітка, на рынку,
На рынку дзевачкі хваслівы,
А на ніўцы дзевачкі працаўлівы.

Кляновы лісточак...

— Кляновы лісточак,
Ды куды ты пакоцішся,
Ці ўгару, ці ў даліну,
Ці ў бор на кляніну?
— Ды я й сам не ведаю,
Куды вецер пакоціць,
Ці ўгару, ці ў даліну,
Ці назад на кляніну!
— Маладая дзяўчыначка,
Ды куды ты ідзеш?
— Я й сама не ведаю,
Куды маці аддае,
Ці ў сяло, ці ў прысёлле,
Ці ў дзявочае бяздолле!

---

* Кожны радок паўтараецца двойчы.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Хадзіў-пахадзіў...

Хадзіў-пахадзіў
Ясен месяц па небу,
Лічыў-палічыў
Зараначкі на небе.
Не далічыўся́
Адной зоранькі вячэрняй,
А Бог знаіць, Бог ведаіць,
Дзе яна?
Каму яна, каму яна
Гэту ночаньку свяціла?
Да ці яна, да ці яна
Ў поўнач з месяцам хадзіла?

Хадзіў-пахадзіў
Андрэйка па хаце,
Лічыў-палічыў
Сямеечку ды сваю.
Не далічыўся, не далічыўся
Адной Гапулькі сваёй.
Ах, Бог знаіць, Бог ведаіць,
Каму яна, каму яна
Гэту ночаньку служыла?
Да ці яна, да ці яна
Ў поўнач з міленькім хадзіла?

Ішла дзевачка за вароцейкі...

Ішла дзевачка за вароцейкі,
Расплятаючы коску.
За ёй мамачка, за ёй родная,
Разліваючы слёзкі.
— Пастой, дзіцятка, мы з табою пагаворым,
— Не буду стаяць, не буду чакаць,
Не буду й гаварыць.
Мне людзі кажуць, я й сама знаю,
Што мне ў цябе не быці.
— Дзевачка мая, дзіцятка маё,
Ідзі ў садочак, сарві цвяточак,
Стань сабе ля дзевачак.
Дзевачкі стаяць, па вяночку дзяржаць,
Там цябе дажыдаюць.
— Жаночкі сядзяць, па сыночку дзяржаць,
Там мяне дажыдаюць.

За цёмным лесам — трава павяла...

За цёмным лесам — трава павяла,
За благім мужам — жана прапала.
На ніўку пойдзець — ніўку праклінаець:
— Каб гэта ніўка — пакарацела,
Каб гэта пастацька — павузела,
Каб я старэнька — яшчэ пастарэла!
За цёмным лесам — трава зялёна,
За добрым мужам — жана вясёла.
На ніўку пойдзець і Бога просіць:

— Каб гэта ніўка — падаўжэла,
Каб гэта пастацька — пашырэла,
Каб я, маладзенька,— памаладзела!

На моры вутачка купавалася...

На моры вутачка купавалася,
Яна свайго пер'ечка дзівавалася.
— Пер'ейка ты маё сізенькае!
Ці будзеш сізае на чыстым полі,
Як цяпер сізае на сінім моры?
У каморы дзевачка ўмывалася,
Сваіх белых ручак дзівавалася,
— Ручанькі мае бяленькія!
Ці будзеце белыя ў свякроўкі,
Як цяпер у матулькі?

Закракатала шэра вутанька на рацэ...

Закракатала шэра вутанька на рацэ —
Заплакала родна матулька па дачцэ.
— Не плач, родна матулька, па мне.
Мамка, пойдзеш у чыста поле авёс жаць,
А я пайду на сіне мора хусты праць.
Ранняю, вячэрняю зарою
Да й сайдуцца нашы галаскі з табою.

Румяна поле, румяна...

Румяна поле, румяна,
Рана, рана, румяна.
Поўны двор каней нагнана,
Рана, рана, нагнана.
Ніхто тых каней не пазнаў,
Рана, рана, не пазнаў.
Да ніхто ў стаенкі не загнаў,
Рана, рана, не загнаў.
Выйшла Алёнка, пазнала
І да стаенкі загнала,
Рана, рана, загнала.
Прыйшла ў хату, сказала,
Ой, рана, рана, сказала:
— Пойдзеш, татачка, да току,
Ой, рана, рана, да току,
Дай конічкам аброку,

Ой, рана, рана, аброку.
Сівому каню болей дай,
Рана, рана, болей дай.
Рана, рана, болей дай.
А я пайду ў чужы край
Да за чужое дзіцятка,
Будзе свякроўка — не матка.

Былі ў татулькі да тры дачушкі...

Былі ў татулькі да тры дачушкі,
То яму Бог даў.*
Усіх трох ён замуж павыдаваў:
Першую аддаў да за пашнічка,
Другую аддаў да за бортнічка,
Трэцюю аддаў да за дудара.
Што за пашнічкам, едзіць у госці,
Вязець гасцінец — бохан хлеба,
А малым дзеткам па піражочку;
Што за бортнічкам, едзіць у госці,
Вязець гасцінец — гаршчок мёду,
А малым дзеткам па гарнушачку;
Што за дударом, едзіць у госці,
Вязець гасцінец — дуду-рагаўню,
Малым рабяткам па жалеечцы.

Да за сцяною за камянною...

Да за сцяною за камянною
Удоўка сільна плача.
— Не плач, удава — бедна галава,
Татачка ў госці едзе.
— Да няхай едзе,
Не заязджаецца,
Не будзе начаваці:
Не маю стайні
А ні новенькай
Конікаў пастаўляці,
Не маю сыра
А ні белага
Татачкі частаваці,
Не маю слаўца
А ні вернага

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

З татачкам гаварыці,
Не маю саду я вішнёвага
З татачкам пахадзіці.
Да за сцяною за камянною
Удоўка сільна плача.
— Не плач, удава — бедна галава,
Міленькі ў госці едзе.
— Да няхай едзе, заязджаецца,
Будзе тут начаваці:
Маю я стайні,
Маю новыя
Конікі пастаўляці,
Маю я ложа і падушачкі
Міламу пасцель слаці,
Маю я сыр, маю белы
Мілага частаваці,
Маю я слаўца, маю верна
З міленькім гаварыці,
Маю я садзік, ўсё вішнёвенькі,
З міленькім пахадзіці.

Па сінім моры...

Па сінім моры*
Тры чаўны плывуць.
У першым чаўночку
Конікі ірзуць,
У другім чаўночку
Салдаты пяюць,
У трэцім чаўночку
Дзевачкі плачуць.
Конікі ірзуць —
Дарожку чуюць,
Салдаты пяюць —
На вайну ідуць,
Дзяўчаты плачуць —
Іх пакідаюць.

Ой, чаго, зімачка...

— Ой, чаго, зімачка,
Ой, чаго, лютая, раненька настала?
— Ой, не раненька,
А ўжо позненька зімачка настала.
Ужо ліcточык апаў,
Дый зямліцу ўваслаў.
То мая пара прышла.
А рэчачкі сталі дый пазамярзалі —
То й пара другая.

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

— А чаго, дзевачка,
А чаго, красачка, маладзенька
Замуж пайшла?
— А я ўжо вырасла,
Як былінка ў полі —
То мая пара прышла.
А я ўжо расцвіла,
Як ружачка ў садзіку —
То і пара і другая.

ПЕСНІ ПРЫ ЛЁНЕ

На гары лён...

На гары лён, на гары лён, белы кужаль,
валакністы, валакністы.
Не з кім стаці, не з кім стаці лён ірваці
і гукаці, і гукаці.*

Мамка кажа, мамка кажа: — Я з табою,
з маладою, з маладою.
А мне з мамкай, а мне з мамкай а ні рвання,
ні гукання, ні гукання.

Татка кажа, татка кажа: — Я з табою,
з маладою, з маладою.
А мне з таткам, а мне з таткам а ні рвання,
ні гукання, ні гукання.

Сястра кажа, сястра кажа: — Я з табою,
з маладою, з маладою.
Мне з сястрою, мне з сястрою а ні рвання,
ні гукання, ні гукання.

Мілы кажа, мілы кажа: — Я з табою,
з маладою, з маладою.
А мне з мілым лён ірванне, лён ірванне і гуканне.

Доўга, доўга я з вечара сяджу...

Доўга, доўга я з вечара сяджу,
Тонкі белы кужалёк праду,

* Гэты куплет паўтараецца пасля кожнага наступнага.

Часта, часта праз аконачка гляджу.
Я думала: ясен месяц усходзіць,
Ажно мой міленькі каля аконка ходзіць.

Як пайшоў жа кужаль па кутах, па лаўках...

Як пайшоў жа кужаль па кутах, па лаўках,
Каліна, маліна мая!*
Па кутах, па лаўках, па дзеўках-красаўках.
Да прышоў жа кужаль ды к нашай Насцінцы.
А наша Насцінька — ды тонкая пралля,
Ды тонкая пралля, ды звонкая ткалля:
Увадзіла ніткі пароўна калена,
Пароўна калена — таўсцей за палена.
Задумала Насцінька красенкі й ткаці,
Пайшла ў добры людзі бёрды дабываці.
Бёрда не дабыла — сабак надражніла.
Сабак надражніла, людзей насмяшыла.
Параілі людзі па пнёўю снаваці,
Па пнёўю снаваці, ў ізгароду ткаці,
У ізгароду ткаці, калом прыбіваці.
Ехалі баяры, Бог помач давалі:
— Бог помач, Насцінька, красёнцы й ткаці!
Красёнцы й ткаці — калом прыбіваці,
Дачкам — на платочкі, сынам — на парточкі.
Павязла Насцінька бялізну бяліці:
На рэчку каламі, а з рэчкі — валамі.

ТАЛОЧНЫЯ ПЕСНІ

Талака, талака...

Талака, талака
Талачылася,
Увесь дзень па полі
Валачылася.
Мы ўвесь гнаёчак
Павыносілі,
На падводачках
Павывозілі,
Да ўвесь гнаёчак
Раскалацілі,
На ручках гнаёчак
Перадзяржалі,
Ножкамі зямельку
Перамералі.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Гаспадар, гаспадар...

Гаспадар, гаспадар,
Выхадзі з клеці,
Вынасі, вынасі
Кварту гарэлкі.
Мы твае гнаёчкі
Павывозілі,
Мы твае хлявочкі
Павычышчалі,
Мы твае нівачкі
Пазасцілалі.

А і добра мы табе...

А і добра мы табе,
Татулька, зрабілі:
Мы твае хлявочкі
Папаражнілі,
Мы твае нівачкі
Пазалацілі.
Заплаці ж вознічкам
Хоць па грыўнічку,
А сваім капачам —
Па рубельчыку.

Чыя ж гэта талака?..

Чыя ж гэта талака
Шчуку-рыбу валакла
А сабе на вячэру?
Іванава талака
Шчуку-рыбу валакла
А сабе на вячэру.
Гаспадыня тужыла,
Што вяліка дружына:
Піва не набраці.
А гаспадар таму рад:
«Садзіцеся, жнейкі, ў рад,
Буду частаваці».

Талака, талака...

Талака, талака
Талачылася,
Таўкучы, мелючы,
Я змарылася.
Сеяла мучыцу —
Апылілася.
Вышла на вуліцу —
Скаланулася
Ды сваім суседкам
Наругнулася.
Работка мая —
Уся пыльная,
Маім суседзям
Дый завідная.

Добра мне, добра...

Добра мне, добра
За старым дзедам:
Не маю клопату
За яго хлебам.
Пойдзець у карчомку —
А я за ім следам.
З карчомкі ідзець —
За ручку вядзець.
Прывёўшы дамоў,
Пасцельку сцелець.
Паслаўшы пасцель,
Спатачкі кладзець.
«Спі, мая мілая,
Да белага дня:
У мяне не дзесяць —
Ты ў мяне адна».

Як сядзем мы на лавачцы...

Як сядзем мы на лавачцы,
Як вып'ем ды па чарачцы,
Як сядзем мы на роўненькай,
Як вып'ем ды па поўненькай.
А мы пілі, не ўпіваліся,
Што дамоў ішлі — не валяліся,
У вароцейках пахіліліся,
У новых сенях паваліліся.

На мяне казалі...

На мяне казалі:
Пасялушачка,*
А я ў свайго таткі
Весялушачка.
На мяне казалі:
Па сялу хаджу,
А я ў свайго таткі
Работку раблю.
На мяне казалі:
Горка п'яніца,
А я ў свайго таткі
Ды работніца.

А знаць наш бацюшка багата жывець...

А знаць наш бацюшка багата жывець,
Яго талака далёка слывець,
А ў яго талака ўсё наёмная,
Паплаціць бацюшка талачаначкам:
Маладым дзевачкам па чырвончыку,
А маладым важтайкам па рубельчыку,
А сваім кідачом паддай гарбачом:
За імі конікі настаяліся,
Малыя важтайкі нагуляліся,
У полі дзеванькі напяяліся.

А чыя ж то жана па двару ходзіць?..

А чыя ж то жана па двару ходзіць,—
Двор разлягаець?
Максімава жана па двару ходзіць,—
Двор разлягаець.
На ганачак ўзойдзіць — аж ганачак гнецца,
А ў клетаньку ўвойдзець — аж клетанька ззяець,
За пляшачку возьмецца — гарэлачка льецца,
За чарачку возьмецца — гарэлачка п'ецца.

---

* Кожныя два радкі паўтараюцца.

Ішла талака з чыстага поля...

Ішла талака з чыстага поля,
З круглае ніўкі:
— Гаспадынька, запалі свечку,
Выдзі на сустрэчку.
Не пытаіць наша гаспадынька,
Ці жывы-здаровы, ці крэпкі, вясёлы,
Толькі пытаіць: ці многа ўвазілі,
Ці многа ўлажылі?
Улажылі поле нязмернае,
Увазілі вазы незлічоны.

Ці не пчолка?..

Ці не пчолка
Зазвінела звонка,
З улля вылятая?
То ж не пчолка —
Наша гаспадынька
Па двару хадзіла,
Ключыкі насіла,
Каморы адмыкала,
Кубкі налівала,
Кубкі налівала,
Гасцей частавала.

Ах вы, мілы мае бабачкі...

Ах вы, мілы мае бабачкі,
Вы пажалі маё жыцечка, у-у!
Вы пажніце маю белую яр,
Пабярыце канапелечкі,
Пакапайце мае градачкі,
Пакажыце мне парадачкі!

Ды знаць наша доля худая...

Ды знаць наша доля худая,
Наша гаспадынька скупая:
Схавала чарачку пад хвартух,
На свайго мілога міргала:
— А схавай, мой міленькі, бутэльку,
Пап'юць талачанкі ўсю гарэлку.

А мы свайму пану...

А мы свайму пану
Да ўчынілі славу,
Славу ўчынілі,
Гнаёк навазілі,
Ніўку украсілі.
Радзі ж, Божа,
Жыта на навозі.
Дай, Божа!
Такое й на аблозі
Жыта ядраное,
Калоссе буйное.

Каля месяца, каля яснага...

Каля месяца, каля яснага
Усё дробныя звёзды,
У нашага гаспадара каля століку
Усё любыя госці.
А ты, Андрэйка, ты татулькаў сын,
Прыглядай жа гасцей,
А ты, чарачка пазлачоненька,
Да хадзі ж ты часцей.

Ня слава, ня слава, Андрэйка, твая...

Ня слава, ня слава, Андрэйка, твая,—
Не п'яна, не п'яна талака твая.
Учыні ж ты, Андрэйка, славу сваю,
Напаі, напаі талаку тваю.
А ўчыніў жа Андрэйка славу сваю,
Напаіў, напаіў талаку сваю.
У хлеве мужчынкі покатам ляжаць,
А на ніве жоначкі, як званкі, звіняць.
У хлеве мужчынкі б'юцца-дзяруцца,
А на ніве жоначкі пяюць, смяюцца.

Ні слава, ні слава, Яначка, твая...

Ні слава, ні слава, Яначка, твая,—
Ні п'яна, ні п'яна талака твая!
Талачу, талачу — талачаначкі,
Папілі, паелі прыхаджаначкі.
Талачу, талачу — талакі ні ўняць,
Не дадуць гарэлкі — не буду спяваць.
Капачы ў хлеве, як свінні, ляжаць.
Дзеванькі на полі, як пчолкі, звіняць.

Ні слава, ні слава, гаспадар, твая...

Ні слава, ні слава, гаспадар, твая,—
Ні п'яна, ні п'яна талака твая.
А ў хлеве, ў хлеве мужчынкі п'янюсенькі,
А ў полі, ў полі жоначкі цверазюсенькі,
А ў хлеве мужчынкі, як жучкі, гудзяць,
На полі жоначкі, як пчолкі, звіняць.
Да ўчыні, да ўчыні славіньку сваю
Да ўпаі, да ўпаі талаку тваю.

Дунай з морам паспіраліся...

Дунай з морам паспіраліся
А за дзеваньку сіроціньку.
Мора кажыць: «Я яе ўтаплю
Гэту дзеваньку сіроціньку».
Дунай кажыць: «Валной выкіну
Гэту дзеваньку сіроціньку».
Сонца кажыць: «Я яе высушу
Гэту дзеваньку сіроціньку».
Дождж кажыць: «Я яе абаллю
Гэту дзеваньку сіроціньку».
Вецер кажыць: «Я яе абадму
Гэту дзеваньку сіроціньку».
А Бог кажыць: «Я ёй долю дам
Гэтай дзеваньцы сіроціньцы».

Вы мужове-панове...

Вы мужове-панове!
Піце піва п'яное,
Гаварыце мужское:
А ў каго мамка стара —
У той хаце слаўна.
А чыя жонка добра —
У той хаце штодзень гульня,
У каго жонка ліха,
У хаце няціха.

Таргуйся, таргуйся, Кірылку, з намі...

Таргуйся, таргуйся, Кірылку, з намі,
Мы тваё поленька злотам слалі,
Золатам, золатам да ўсё серабром,

Дай жа нам, Кірылка, хоць па талеру,
Вайшцякам, вайшцякам хоць па рубялёчку,
Капачам, капачам хоць па бізуночку,
Што яны табе наругаліся,
На стайні конікі настаяліся,
У полі жоначкі напяяліся.

Па полю сіз голуб лятаіць...

Па полю сіз голуб лятаіць,
А ён свае галубкі шукаіць:
— Ай, каб мая галубка са мною,
А ўмеў ба ж я па полю лятаці,
А ўмеў ба ж я пшанічку кляваці...
Іванічка ўсё па двару ходзіць,
А ён сваю Алесечку просіць:
— Ай, каб мая Алесечка са мною,
А ўмеў ба ж я пры сталу стаяці,
А ўмеў ба ж я жнеек частаваці.

Па шырокаму гасцінцу...

Па шырокаму гасцінцу
Вялікі абоз ідзе,
Дачка матцы гасцінчык шле,
Невялікі гасцінчык —
Віннае яблычка,
На тым яблычку
Тры слоўцы напісана:
Першае слова: Добры дзень, матачка,
А другое слова: Ці жыва, здарова?
А трэцяе слова: Бывай, мама, здарова.

Сілязенька, галоўка сізенька...

— Сілязенька, галоўка сізенька,
А крылейка быстрынька,
Ці пераляціш шырокае поле,
Глыбокае мора?
— Не пералячу я шырокага поля,
Глыбокага мора,
Толькі пералячу імхі ды балоты
Ды вузкія валокі!
— А ты, Аўдулька, нежнае дзіцятка,
Ці перанясеш матульчыну негу

К свёкру на падвор'е?
— Не перанясу я матульчыну негу
К свёкру на падвор'е,
Толькі перанясу цяжкае ўздыханне,
Слёзнае абліванне.

Ні слава, ні слава, Ярэмка, твая...

— Ні слава, ні слава, Ярэмка, твая,
Ні п'яна, нясыта талака твая,
Хто ў цябе, Ярэмка, работку рабіў?
Хто ў цябе, Ярэмка, гарэлку папіў?
— Рабілі работку талачаначкі,
Папілі гарэлку прыхажайкі.
Трасейкам-паненкам хоць па талеру,
А гультаям-капачом у лоб таўкачом.

Да бараначка чорненькі, чорненькі...

Да бараначка чорненькі, чорненькі,
На ім воўна сучыцца, сучыцца,—
Нам гарэлачкі хочыцца, хочыцца.
Мы бараначку стрыч будзем, стрыч будзем,
Мы гарэлачку піць будзем, піць будзем.
Мы бараначку астрыжом, астрыжом,
Мы гарэлачку ўсю пап'ём, усю пап'ём.
На іх воўна каротка, каротка,
Нам гарэлачка салодка, салодка.
На іх воўніца роўненька, роўненька,
Нясуць нам бутэлькі поўненькі, поўненькі.

Сямейна-абрадавая паэзія

Да сямейна-абрадавай паэзіі адносяцца вусна-паэтычныя творы, якія суправаджалі і адлюстроўвалі тры важнейшыя падзеі: нараджэнне чалавека, шлюб і пахаванне. Генетычна яна ўзыходзіць да часоў язычніцтва. У эпоху складвання і фарміравання беларускага этнасу вусная творчасць беларусаў, у тым ліку і сямейна-абрадавая паэзія, набыла шмат спецыфічных нацыянальных рыс, якія выразна праявіліся і ў жанравым саставе, і ў ідэйна-тэматычным змесце, і ў мастацкай форме. Функцыянальнасць абрадавай паэзіі не ўспрымалася нязменнай. Разам з абрадамі, у якія яна арганічна ўваходзіла, сямейна-абрадавая паэзія павінна была ўплываць на звышнатуральныя сілы, у існаванні якіх людзі не сумняваліся, каб палепшыць лёс чалавека, абараніць яго ад усяго шкоднага, забяспечыць шчаслівае жыццё, дабрабыт сям'і.

Асаблівай адметнасцю ў беларускай вусна-паэтычнай творчасці вылучаецца радзінная паэзія і перш за ўсё хрэсьбінныя песні, якія складаюць нацыянальную спецыфіку ў славянскай сямейна-абрадавай творчасці. Радзінна-хрэсьбінны абрад і песні, якія выконваліся пры гэтым, у беларусаў лепш захаваліся, чым у іншых народаў. Абраднасць, звязаная з нараджэннем дзіцяці, характарызавалася арыгінальнымі звычаямі і змястоўнай паэзіяй, якія мелі мэту садзейнічаць шчаслівай долі нованароджанага. Частка гэтых абрадаў і звычаяў была заснавана на жыццёвым вопыце, іншыя ж грунтаваліся на старадаўніх забабонах і вераваннях. Ім прыпісвалася магічная сіла, здольная абараніць парадзіху і дзіця ад нячыстай сілы, сурокаў. Хрэсьбінныя песні займалі найважнейшае месца ў радзіннай абраднасці, сваю назву атрымалі з увядзеннем хрышчэння дзяцей пасля прыняцця хрысціянства і выконваліся пераважна ў час урачыстасці — хрэсьбін, сямейнага святочнага застолля. Аднак многія з гэтых песень паходзяць з больш далёкага мінулага.

Зыходзячы з функцыянальнага, эстэтычнага і тэматычнага прынцыпаў хрэсьбінныя песні дзеляцца на велічальныя, жартоўныя і застольна-бяседныя. У велічальных песнях услаўляюцца парадзіха, бацька дзіцяці, бабка-павітуха, кума, кум. Выказваюцца пажаданні шчасця і долі нованароджанаму. Глыбокай пашанай прасякнуты амаль усе песні, прысвечаныя парадзісе. Уважлівым і клапатлівым, старанным і спагадлівым да жонкі і дзіцяці паказваецца таксама бацька нованароджанага.

Вельмі папулярнымі былі песні пра бабку і кумоў. У іх гучыць удзячнасць бабцы-павітусе за дапамогу. Адлюстроўваюцца таксама ўзаемаадносіны паміж кумам і кумой. Пашана да бабкі нярэдка спалучалася са спагадлівым гумарам. З задушэўнай гумарыстычнай замілаванасцю бабка (або кума) прыпадабняецца ў некаторых песнях да кветкі. Жартоўныя песні колькасна пераважалі ў радзінным абрадзе. Абумоўлена гэта перш за ўсё тым, што радзінныя абрады і звязаныя з імі песні даўно страцілі свой сакраментальны характар, адышлі ад магіі і набылі іншую накіраванасць, эстэтычна-

мастацкая функцыя ў якой пачала дамінаваць. Добразычлівым гумарам напоўнены і велічальныя, і застольна-бяседныя, і жартоўныя песні. Жартоўныя песні нібы развейвалі ідэальнасць галоўных удзельнікаў хрэсьбін, дакаралі іх за ўяўныя заганы: бабка, напрыклад, у гэтых песнях не працавітая і хваравітая, а «варавітая»: «Як жыта жаць, дык ляжыць, як ісці куміць, дык бяжыць». Падобна высмейваліся і іншыя ўдзельнікі ўрачыстага застолля. Найбольш пашыранымі сярод жартоўных песень былі песні пра куму і кума. Іх учынкі падаваліся нярэдка ў камічным плане. Шмат песень прысвячалася застольнай бяседзе, паводзінам на ёй бабкі, кумоў і іншых удзельнікаў урачыстасці.

Надзвычай багатая ў беларускага народа вясельная абраднасць. Песні ўваходзяць у абрад як яго арганічная частка і суправаджаюць усе этапы вяселля. Узнік вясельны абрад у глыбокай старажытнасці. Адбіткі такіх форм шлюбу, як умыканне або купля-продаж нявесты, у асобных звычаях і песнях — яркае сведчанне старадаўнасці абраду. У перыяд феадалізму шлюб часцей за ўсё заключаўся па волі памешчыкаў-прыгоннікаў або бацькоў. З пачуццямі жаніха і нявесты мала хто лічыўся. Тым не менш уступленне ў шлюб як важная падзея ў жыцці чалавека адзначалася ўрачыста і вельмі цікава.

Беларускі вясельны абрад вызначаўся не толькі сваімі нацыянальнымі рысамі (пры тым, што меў і шмат агульнага з усходнеславянскай шлюбнай абраднасцю), але і разнастайнасцю мясцова-рэгіянальных асаблівасцей. Амаль паўсюдна беларускае вяселле мела наступныя этапы: сватанне, запоіны, заручыны, дзявочы вечар (зборную суботу, або вяночкі), пасад нявесты (у некаторых месцах і жаніха), выпечка каравая, вясельнае застолле ў маладой і жаніха, раздача каравая, пярэзвы (гасціны). Ва ўсіх гэтых этапах удзельнічала шмат людзей, дзеянні якіх былі рэгламентаваны традыцыйнымі звычаямі. Важнай дзеючай асобай вяселля быў сват, актыўная роля якога не абмяжоўвалася пачатковымі этапамі шлюбнай абраднасці, а працягвалася да самага канца вяселля.

Вясельныя абрады пачыналіся са сватання. У сваты звычайна хадзілі некалькі чалавек, адзін з якіх быў асабліва гаваркі і дасціпны, таму і лічыўся старшым сватам. Песні, прыгаворы, прамовы, якія гучалі на падрыхтоўчым этапе вяселля, нярэдка мелі алегарычны характар і адлюстроўвалі старажытныя звычаі. Песні першых этапаў вяселля па сваім функцыянальна-эстэтычным прызначэнні павінны былі паэтызаваць традыцыйныя абрады і звычаі, садзейнічаць стварэнню пэўнага настрою — весялосці або смутку. Разам з тым яны адлюстроўвалі юрыдычна-бытавое замацаванне новых узаемаадносін маладых, іх пачуцці ў час, калі вырашаўся іх лёс. Ужо на першапачатковых этапах вяселля выразна выяўляецца утылітарная функцыя абрадаў і паэтычных твораў, якія ў гэты час выконваліся. Заклінальныя песні і пажаданні павінны былі садзейнічаць дабрабыту сям'і, яе росту, добраму ўраджаю, прыплоду жывёлы.

Перад асноўным этапам вяселля, у які ўваходзіла вянчанне і шлюбавіны, звычайна ў суботу вечарам адбываліся спецыяльныя цырыманіі, якім надавалася важнае значэнне ў вясельна-абрадавым рытуале. У дзявочы вечар (інакш, зборная субота, вяночкі, жаніхі) у многіх месцах Беларусі да нявесты прыязджаў жаніх з падарункамі, а дзяўчаты — сяброўкі нявесты — вілі вяночкі з руты для маладой (рута сімвалізавала маральную чысціню нявесты). Выпякаўся каравай. Каравайны абрад меў мясцовыя асаблівасці і суправаджаўся шматлікімі песнямі, у якіх перш за ўсё ўслаўляўся хлеб — аснова дабрабыту сям'і. Дэталёва, але гіпербалізавана паказвалася, з чаго выпякаўся каравай, як яго саджалі ў печ і да т. п. Пры гэтым каравай маляўніча паэтызаваўся, часцей за ўсё з дапамогай персаніфікацыі: «каравай рагоча, да печы хоча», «у печы іграе, заслонку адбівае», ён ходзіць, кліча каравайніц, размаўляе з імі, шукае дарогу да клеці і г. д. Так «ачалавечваюцца» і ін-

шыя прадметы ў вясельных песнях: «прыпечак рагоча, печ каравая хоча»; памяло хваліцца: «Ужэ ж мяне вяселле праняло, жаркія печы мятучы, частыя караваі пякучы». У песнях каравайнага абраду трапна выкарыстоўваюцца памяншальна-ласкальныя суфіксы, якія надаюць мілагучнасць твору, прымушаюць любавацца вобразам.

З дзесяткаў тысяч беларускіх вясельных песень адлюстраванню царкоўнага вянчання прысвячалася няшмат, а поп у іх абмалёўваўся ў сатырычным плане. У некаторых песнях шлюбная паездка нявесты паказваецца як прымусовая акцыя чужынцаў, за якімі, як гаворыцца ў адной з іх, гоніцца брат нявесты з «грознай шабелькай». У песнях, якія спяваліся ў час вяртання з-пад вянца, адлюстроўваўся псіхічны стан маладой, горыч яе пачуццяў перад невядомасцю лёсу.

Глыбокай эмацыянальнай напоўненасцю і пачуццёвай узрушанасцю вылучаюцца ў вясельнай паэзіі сіроцкія песні. У іх нявеста-сірата жаласна просіць маці або бацьку ўстаць з магілы, прыйсці на вяселле і благаславіць яе шлюб. Яна звяртаецца да магутных стыхій прыроды, каб яны дапамаглі ёй вызваліць з магільнага палону маці. Сіроцкія песні часцей за ўсё спявала не сама нявеста, а яе дружкі. Галоўным лірычным героем часам выступала маці, якая прасіла Бога адпусціць яе на вяселле дачкі. Розныя мастацкія сродкі, сярод іх частыя памяншальна-ласкальныя суфіксы, узмацнялі спагаду да сіраты, выклікалі глыбокае спачуванне.

У час застольнай вясельнай бяседы выконвалася шмат лірычных песень, у якіх абмалёўваліся вобразы жаніха і нявесты, паказваліся ўзаемаадносіны маладых, іх пачуцці, стаўленне да бацькоў. Песні стваралі ідэальныя вобразы маладых, паказвалі іх незвычайную прыгажосць з дапамогай маляўнічых параўнанняў, сімвалічных вобразаў сонца, зорак, месяца.

На вяселлі спявалася нямала сумных, тужлівых песень, але пераважалі вясёлыя, жартоўныя. Гумарам розных адценняў, здзеклівай насмешкай, вясёлымі жартамі прасякнуты песні пра сватоў, дружкоў, прыданак і нават пра жаніха і нявесту. У камічным плане малюецца, напрыклад, сват: ён вельмі «харош» — у яго буслаў нос, крывы бок, лысая галава, «добра на ёй боб малаціць, ды нікуды ж ён не паляціць», казліная рыжая барада, «па яблыку вочы, з гарбуз нос, па калені жывот, ледзьве ў хату ўнёс», ён «скача на вяселлі, як белка», «плавае па хаце, як таран, лупае вачыма, як баран». У абмалёўцы партрэта свата (і іншых удзельнікаў вяселля) шмат абразлівых эпітэтаў. Камічная экспрэсіўнасць яго вобраза павышаецца часам метанімічным адушаўленнем прадметаў адзення: шапка сабачая — брэша, шуба цялячая — мычыць, пояс вужачы — шыпіць і г. д. Гратэск выкарыстоўваецца і ў абмалёўцы вобраза свахі, паднявесніцы-«душкі», якая «сядзіць, як кадушка»...

Сатырычна-гумарыстычныя песні звычайна ўспрымаліся без крыўды, бо ў іх не было зласлівасці. Гумар вясельнай паэзіі ў сваёй аснове мяккі, добразычлівы, праз яго вельмі тонка раскрываецца «вясельная гульня».

Беларускія вясельныя песні характарызуюцца разнастайнасцю паэтыкі. Апрача адзначаных мастацкіх сродкаў, у іх шырока выкарыстоўваюцца перыфраз, метафара, сімволіка, паралелізм і інш.

Шлюбныя абрады і вясельная паэзія беларусаў маюць шмат агульнага з рускімі і ўкраінскімі абрадамі і паэзіяй, што сведчыць аб блізкасці поглядаў, эстэтычных запатрабаванняў і цесных культурных узаемасувязях усходнеславянскіх народаў. Многія лепшыя традыцыйныя абрады, звычаі і творы выкарыстоўваюцца і ў сучаснай вясельнай абраднасці нашага народа.

Значнае месца ў сямейна-абрадавай паэзіі займалі хаўтурныя галашэнні — імправізаваныя творы, у якіх шырока выкарыстоўваліся традыцыйныя мастацкія прыёмы для аплакавання памёршых. Пахавальныя галашэнні вядомы з глыбокай старажытнасці. Яны грунтуюцца на кульце продкаў, веры ў бессмяротнасць душы, на ўяўленнях аб тым, што чалавек і пасля смерці можа дапамагаць або шкодзіць жывым. Галашэннямі суправаджалася пахаванне

нябожчыка, памінанне, якое адбывалася ад двух да пяці разоў у год. Асаблівую цікавасць уяўляюць нешматлікія галашэнні, у якіх адлюстраваны жыццё і быт беларускіх прыгонных сялян.

Хаўтурныя галашэнні і пэўныя абрадавыя дзеянні адлюстроўвалі бязмернае гора ў сувязі са смерцю блізкіх або родных людзей. У галашэнні жонкі па мужу гучаў папрок Богу, які разлучыў іх. Горка наракала жонка і на мужа за тое, што ён пакінуў яе адну з дробнымі дзеткамі. Пры гэтым размова з памёршым вядзецца, як з жывым. Звароты да нябожчыка эмацыянальна насычаныя, багатыя традыцыйнай сімволікай. З галашэннямі выносяць труну з нябожчыкам, галосяць і ў той час, калі вязуць яе да царквы і на могілкі, і тады, калі развітваюцца перад тым, як апусціць труну ў магілу.

Вялікі душэўны боль адчуваецца ў галашэннях маці па дзіцяці. «Яблычка маё недаспелае, ягадка мая недазрэлая», «а мой ты сыночак, мой яварочак», «сыночак міленькі, дубочак зялёненькі», «дачушка мая, зязюлечка мая», «мая пралесачка», «мая галубачка, мая ластачка залётная, лябёдачка мая беленькая» — з такімі пранізлівымі пяшчотна-журботнымі словамі звяртаецца яна да дзіцяці.

У галашэннях выкарыстоўваецца багаты арсенал разнастайных мастацкіх сродкаў народнай паэтыкі: метафары, параўнанні, эпітэты, іншасказанні, псіхалагічныя паралелізмы. Усе гэтыя сродкі ўзмацняюць эмацыянальнае ўздзеянне галашэнняў. Усе галашэнні цесна звязаны з традыцыямі вуснай народнай паэзіі, таму і пераходзяць з аднаго твора ў другі адны і тыя ж вобразы, прыёмы, устойлівыя славесныя формулы. Паводле традыцый пахаванне нябожчыка называецца дарожкай дальняй або адлётам, труна — хатачкай новай. Памёршага просяць прыйсці ў госці, прыляцець хоць птушкай і г. д.

Хаўтурныя галашэнні перадаваліся з пакалення ў пакаленне і выконваліся сваякамі памёршага, якія ў сваіх імправізацыях шырока выкарыстоўвалі традыцыйнае. Сучасныя галашэнні адрозніваюцца ад традыцыйных сваім зместам. Глыбокі смутак з прычыны смерці роднага або блізкага чалавека спалучаецца з адлюстраваннем цвёрдай веры ў заўтрашні дзень жывых, у іх шчаслівае будучае. Традыцыйныя прыёмы і сродкі дапамагаюць і тут ярчэй перадаць эмацыянальны стан засмучаных горам людзей, але не пакідаюць месца для веры ў замагільнае жыццё, у існаванне звышнатуральных сіл.

Менш распаўсюджаны былі ў беларускім фальклоры рэкруцкія галашэнні, у якіх аплаквaліся навабранцы царскай арміі, расстанне з імі на 20—25 гадоў.

Такім чынам, сямейна-абрадавая паэзія была цесна звязана з жыццём селяніна, яго паўсядзённымі клопатамі; яна адлюстравала сацыяльна-эканамічныя, бытавыя і культурныя ўмовы жыцця працоўных у розныя гістарычныя эпохі.

Важна падкрэсліць, што функцыянальнасць сямейна-абрадавых песень паступова змянялася: першапачатковая цесная сувязь з абрадамі паступова страчвалася, магічная функцыя, якая раней была дамінантнай і спалучалася з мастацка-эстэтычнай, з цягам часу стала другараднай. Страціўшы сувязь з абрадамі, многія абрадавыя песні амаль не адрозніваліся ад пазаабрадавых ні сваёй функцыянальнасцю, ні паэтыкай. Размежаванне іх магчыма галоўным чынам праз выяўленне ранейшых сувязей з абрадамі і грунтоўны аналіз зместу твораў. У час сямейных урачыстасцей спявалася шмат песень, якія ніякай канкрэтнай сувязі з імі не мелі.

ЛІТАРАТУРА

Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: В 3 т. Спб., 1890. Т. 1. Ч. 2; 1902. Т. 3.

Романов Е. Р. Белорусский сборник. Киев, 1886. Вып. 1-2. С. 338—367; Вильна, 1910. Вып. 7. С. 35—39; Вильна, 1912. Вып. 8. С. 323—550.

Шырма Р. Беларускія народныя песні. Мн., 1960. Т. 2. С. 252—274; Мн., 1976. Т. 4.

Анталогія беларускай народнай песні / Уклад. і каментарыі Г. І. Цітовіча. Мн., 1968.

Радзінная паэзія / Уклад., сістэматызацыя тэкстаў, уступ. арт. і камент. М. Я. Грынблата. Падбор нот, характарыстыка напеваў і камент. В. І. Ялатава. Мн., 1971.

Беларускі фальклор у сучасных запісах. Брэсцкая вобласць. Традыцыйныя жанры / Склад. В. А. Захарава. Мн., 1973.

Песні народных свят і абрадаў / Уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. Мн., 1974.

Лірыка беларускага вяселля / Уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. Мн., 1979.

Вяселле: Абрад / Склад. К. І. Цвірка. Мн., 1978.

Вяселле. Песні: У 6 кн. / Склад. Л. А. Малаш. Мн., 1980—1985.

Гілевіч Н. С. Наша родная песня. Мн., 1968.

Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць / Пад рэд. П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава, М. Я. Грынблата. Мн., 1967. С. 77—90.

Беларуская народна-паэтычная творчасць. Мн., 1988. С. 173—214.

ХРЫСЦІННЫ АБРАД

...У адзін дзень, каля другой гадзіны, увайшла да мяне незнаёмая бабуля-сялянка і сказала:

— Дзень добры паненцы!

— Здарова, галубка, што добрае скажаш?

— Усе добрае, панначка. Будзь ласкава, не пагардуй перахрысціць майго ўнучка.

— Добра, бабка; ад Хрыста ніхто не адмаўляецца, да вось бяда, бабка,— абраднасцей вашых не ведаю.

— Калі не пагардуеш, то навучым.

— Што ж, бабка, трэба для гэтага, раскажы?

— А от, панначка, вазьмі булачку хлеба, драбок солі і палатна на рукава да трохі асьмакоў (гэта значыць крыху грошай).

— Колькі ж, бабка, грошай трэба?

— А як твая спрамога, вазьмі з грывяньку — пацалаваць куму, да шастака (3 капейкі) бабе на кашу. Да калі хочаш усе нашы мужыцкія парадкі рабіць, то скажы зварыць гаршчык кашы. Да толькі, панначка, будзь ласкава не абаўляйся.

— Я, бабка, не буду бавіцца,— іду з табою разам.

Ідучы дарогай, я спытала:

— Што ж мне, бабка, рабіць і гаварыць, калі я прыду ў хату?

— Хлеб і соль палажы на стале, да і скажы: «Няхай жа добрае вядзецца!» Дай куме (парадзісе) грывяньку — тады ўжо будзем збіраць несці дзіця хрысціць; толькі прашу цябе, панначка, як будзеш несці дзіця хрысціць, то не гавары з кумам!

— А гэта, бабка, чаму?

— А дзеля таго, каб дзіця не было крыклівае.

— Добра, я буду маўчаць.

Калі я прыйшла ў хату, было некалькі сялян і сялянак, запрошаных гасцей. Палажыўшы хлеб-соль і перадаўшы куме 50 капеек, я заўважыла, што кума засаромелася; прычына сарамлівасці пакуль мне заставалася невядомаю, а пазней я даведалася, што яна засаромелася таму, што ёй даводзілася даваць падарунак, адпаведны грошам. У сялян, звычайна, даецца ў дар наметка.

Сабраліся скора, і трэба было ісці на дом да свяшчэнніка. Тады баба, так званая павітуха, вывела мяне за руку на ганак і перадала мне ў кішэню маленькі вузельчык, завязаны ў анучку, са словамі:

— Глядзі ж, панначка, гэты вузлік выкінь на крыжовых дарогах.

— Што ж, бабка, у гэтым вузліку?

— Усякая пашня (насенне зерневага хлеба), пячына (гліна, выцягнутая з печы) і соль.

— На што ж, бабка, гэта кідаць?

— От дзеля таго, штоб не было ліхой стрэчы.

Пасля адпраўлення абраду хрышчэння, прынёсшы дзіця ў хату, я перадала яго парадзісе. У гэты час стол ужо быў падрыхтаваны, на ім ляжала некалькі булак хлеба, прынесеных гасцямі, і стаяла вялікая бутэлька гарэлкі. Мяне і хроснага бацьку з пашанай пасадзілі на першыя месцы, а стары гаспадар, дзед нованароджанага, узяў чарку і, налiваючы яе, сказаў:

— Боэ, баславі (Божа, благаславі).

Наліў чарку гарэлкі, выпіў сам, а рэшткі выліў уверх са словамі:

— Дай жа, Боэ, штоб наш унук вялік рос!

І палажыў капейку ў чарку, наліў яе гарэлкай і перадаў хроснаму бацьку. Той прыняў чарку, сказаў тыя ж словы, што і дзед, выпіў чарку, выняў адтуль капейку, выплюхнуў рэшткі ўверх, прамовіў:

— Штоб наш хрышчэннік так высока скакаў.

І перадаў чарку дзеду. Дзед палажыў у чарку срэбраную грыўню, наліў яе гарэлкай і перадаў мне. Я папрасіла жанчыну, якая сядзела побач са мною, выпіць гэтую гарэлку; яна выпіла, выняла грыўню, перадала яе мне разам з чаркай і з рэшткамі гарэлкі. Я, у сваю чаргу, таксама выплюхнула гарэлку ўверх і сказала:

— Каб наш хрышчэннік так высока скакаў.

Тады пачалі гарэлкаю частаваць усіх гасцей, толькі не кідалі ўжо ў чарку грошы. Перадача ж чарак з грашыма хросным бацькам называецца «перапіваць кумоў».

Мужчыны і жанчыны пілі гарэлкі шмат, але п'янымі не былі, што мяне, прызнаюся, вельмі здзівіла. Пасля выпіўкі пачаўся абед. Ежа звычайная на хрэсьбінах: «квас» (кіслы крупнік з парасяці), «млінцы» (бліны), «узвар», г. зн. сушаныя плады, звараныя з чарніцамі, а пасля ўсяго гэтага ставілі гаршчок з кашай. Гэта была бабіна каша. Тады баба падышла да стала і звярнулася да хроснага бацька з такою прамоваю:

— Кумочак, галубочак, салавейко, прахаю (прашу) цябе, не бі майго гаршка, бо ён жа не тут купованы, я ж за ім ездзіла ў Альвова (горад Львоў).

Кум адказваў іранічна:

— Бабко! Ты ўжо старая, трохі сляпая, не дабачыш, гэта ж гаршчок гліняны да й той расколаты.

Баба адказвала:

— Ты, куме, пап'ян, то і не бачыш!

— Я хоць і пап'ян, але ж усё-такі бачу, што гэта чэрап, а не срэбны, а калі срэбны, то ён не разаб'ецца.

І з гэтымі словамі з размаху стукнуў гаршчок аб стол. Гаршчок разляцеўся на кавалкі. Тут пасыпаліся жарты:

— Але ж ты, куме, добра б'еш гаршкі, каб ты так біў цэпам да касою.

Ён адказваў:

— Я майстар на ўсё, а падчас, як п'яны з карчмы прыду, то і жонцы ўсе гаршкі пераб'ю.

Тады баба паставіла тарэлачку, палажыла на яе капейку і пачала ўсім гасцям раздаваць па ложцы кашы. Кожны рукою браў кашу з ложкі, а ў ложку клаў капейку. Сабраўшы ад усіх грошы і палажыўшы ложку кашы, яна перадала яе з талеркай парадзісе. Услед за гэтым паставілі на стол маю (г. зн. хроснай маці) кашу, але мая каша не была ў гаршку, а ў каструлі. Тады баба сказала куму:

— Эге, куме, хоць жа ты здароў, як мядзведзь, ды гэтага гаршка не ўкусіш.

Пасля гэтага баба абдзяліла ўсіх прысутных кашаю, але грошай за гэта ўжо ніхто не плаціў. Паставілі на стол яшчэ трэці гаршчок, гэта была «кумава» каша. Пры гэтым баба сказала:

— Ты ж гаршкі ўсе біў, паспрабуй жа свайго разбіць.

— Эге, бабко, якая ты разумная, добра, што я й тваго разбіў, а яшчэ буду свайго біць!

Калі з'елі «кумаву» кашу, усталі з-за стала падпіўшыя, і паміж бабамі пачалася нарада:

— Калі рабіць змуркі, бо заўтра кума-паненка не прыдзе да нас, ёй конча трэба прамыць вочы.

(Змуркамі называецца змыванне святога міра, якім было памазана дзіця пры хрышчэнні, інакш яшчэ называюць *зліўкі*).

Баба ўзяла кубак і, трымаючы на руках раздзетае дзіця, абліла яго вадой. Бацька дзіцяці прынёс 9 галінак з лісточкамі. Калі ж «змуркі» бываюць зімою, дык трэба, каб галінкі былі ўзяты хоць са старога веніка, але з лісткамі. Палажылі галінкі ў міску (9 галінак бярэцца таму, каб нованароджаны дасягнуў 90 гадоў). Стол накрылі чыстым абрусам, на стале паставілі міску з галінкамі і такую ж другую з салодкаю гарэлкаю і была паложана хлеб-соль. Тады баба першая падвяла мяне да стала пад руку і сказала:

— Прамый жа, панначка, вочы і рукі, каб твае вочы не хварэлі.

Але я сказала, што мае вочы вельмі яшчэ добра бачаць, а рукі апусціла ў ваду. Пасля гэтага мне далі чарку і ложку, я наліла чарку гарэлкаю з дапамогай ложкі і сказала, што піць яе не магу, тады бабы прыступілі да мяне з асобай просьбаю:

— Панначко, прахленачко, выпі хоць адну чарачку, гэта ж салодкая!

Калі я адмовілася ад гарэлкі, дык, відаць, бабы былі гэтым засмучаны, а некаторыя ўпаўголас прамовілі:

— От жа гардая кума!

Тады ўсё сямейства па чарзе падходзіла да міскі, мылі рукі і твар, уяўляючы, што змытае міро дае незвычайна гаючую сілу, і пілі гарэлку. Пасля гаспадароў падходзілі такім жа чынам госці, выпівалі ўсю гарэлку і, відаць, усе ап'янелі. Тут мяне з «кумам» пасадзілі на ганаровае месца, каля мяне яшчэ села баба-павітуха, а каля яе адна жанчына, якая ўмела пець хрэсьбінныя песні, якімі я павінна была адказваць «куму» як «кума».

Першай за ўсіх пачала пець баба:

1

Ў нядзелю ранесенько
Бяжыць Іван к сваёй бабусеньке.
Бабусенька дагадалася,
Ў адзін чобат абувалася;
Бяжыць яна боса і без пояса,
Бяжыць яна скарэсенько,
Просіць Бога шчырэсенько:
— Дай жа, Боэ, маёй ўнучцы:
Лягесенько, дабрэсенько, скарэсенько!

2

Ідзе бабусенька да свае ўнучкі,
Аж яе ўнучка па сенечках ходзіць,
Сваю бабусеньку просіць.
— Гардая ж, мая бабусенька,
Дам ісе я табе, бабусенька,
Я мерачку проса,
За што ты прышла ка мне боса.
Дам жа табе, бабусенька,
Я каробку мукі,
Да прылажы ж, бабусенька,
Ка мне свае рукі.
Дам жа табе, бабусенька,
Гарэлачкі з перцам,
Да прылажы свае рукі
Да майго сэрца.
Дам жа табе, бабусенька,
Сіню наметачку,
Да прылажы ж свае ручкі
К майму жываточку.

3

Ой кум куме рад,
Павёў куму ў вінаград:
— Шчыплі, кумка, ягодкі,
Каторыя салодкі;
А каторы горкі,
Кідай для маёй жонкі.
Прышоў кум да кумы,
Кума грады поле.
— Добра, куме, што прыйшоў,
Цяпер мая воля.
А ліхая свякроў
На радзіны пайшла,
А мой свёкар дабрэсенькі
Спіць на печы п'янесенькі.
А я й мужа пазаву,
Вас гарэлачкай напаю;
Мёдам, кашай накармлю.
Свякроў прыдзе п'яна —
Таго яна і не ўвазнае.

Спевы, магчыма, працягваліся б і далей, але баба заўважыла маю стомленасць, пачала быццам бы пераборліваць:

— І хата ў цябе, ўнук, цесная і паскакаць мне няма дзе.

Тады мужчыны спыталі гаспадара:

— Ці ёсць у цябе коні, штоб павазіць нашу княгіню-бабу?

Гаспадар адказаў:

— І коні е і карыта (карэта), пайду запрагаць!

У гэты час у хату ўвайшоў малады мужычок з уздзечкаю на шыі і сказаў:

— Бабко, княгіня, паедам у карчму, там і паскачаш.

І ўсе прысутныя кінуліся да вакна глядзець экіпаж. Каля ганка стаяў ручны воз, на возе ляжала барана, пакрытая кажухом і была паложана падушка.

Двое з мужыкоў узялі бабу на рукі і пасадзілі на воз, прытрымліваючы яе, каб яна не саскочыла. Некалькі чалавек узяліся за дышаль і хутка пацягнулі бабу ў карчму. Усе госці пайшлі следам глядзець, як будзе баба танцаваць, а я пачала развітвацца з парадзіхай; яна прапанавала мне ў падарунак чырвоную шарсцяную хустку і, калі я адмаўлялася, дык пачала мяне ўпрошваць і прасіць прабачэння, што падарунак нязначны. А калі я сказала, што не вазьму падарунка, дык тыя, што засталіся ў хаце, сказалі, што гэта будзе цяжкі грэх парадзісе, і што яе падарунак абавязкова павінен быць у шэсць разоў каштоўнейшы тых грошай, якія яна атрымала ад мяне, таму ж сяляне ніколі не даюць парадзісе больш грыўні пры пацалунку.

ХРЭСЬБІННЫЯ ПЕСНІ

А хто, хто ў нас да па ночы ходзіць?..

А хто, хто ў нас да па ночы ходзіць,
А хто, хто ў нас да бабульку просіць:
— Бабулька мая, галубка мая,
Прыйдзі ж ты ка мне і к маёй жане.
У маёй жаны жываток баліць,
Жываток баліць, сярэдзінку ломіць.
— Унучак ты мой, галубочак мой,
Не журыся ты, каго Ьожа дасць:
Калі дачушку — швачкаю будзе,
А калі сынка — пісарам будзе.

Цераз рэчачку, цераз быструю...

Цераз рэчачку, цераз быструю
Гібка кладачка ляжыць.
Па той кладачцы па той гібенькай
Молад Мішачка ідзець,
Сваю жоначку, сваю мілую
Ён за ручачку вядзець:
— Ой ты, кладачка, ой ты, гібкая,
Ты не гніся пада мной.
А ты, жоначка, мая мілая,
Ты не старуйся за мной.

Пі мёд, пі віно і гарэлачку,
І не будзь ты п'яная.
Радзі сем сыноў і дачушачку,
І не будзь ты старая.
— А мой мужанька, а мой міленькі,
Ды няпраўдачка твая:
П'ючы мёд, віно і гарэлачку,
Мушу быці п'яна,
Раджу сем сыноў і дачушачку,
Мушу быці старая.

Ў нас сягоння, хвала табе Божа...

Ў нас сягоння, хвала табе Божа,
Застагнала Гэлячка ў ложы,
Зажадала вішнёвага соку,
Зажадала вішнёвага соку:
— А паклічце міленькага з току,
А паклічце міленькага з току,
Хай дастаніць вішнёвага соку,
Хай дастаніць вішнёвага соку.
— Калі сына — магу расстарацца,
Калі сына — магу расстарацца,
Калі дочку — прашу перабачыць.
Калі дочку — прашу перабачыць,
Бо сыночак — свой гаспадарочак,
Бо сыночак — свой гаспадарочак,
А дачушка — то людская служка,
А дачушка — то людская служка.—
Ў садзе вішні — ўсё роўнае вецце,
Ў садзе вішні — ўсё роўнае вецце,
Бацьку й маці — ўсё роўныя дзеці,
Бацьку й маці — ўсё роўныя дзеці:
Сыны і дачушкі — ўсе роўныя служкі,
Сыны і дачушкі — ўсе роўныя служкі.

Сцелецца да ўецца...

Сцелецца да ўецца — Жонка мая маладая,
Па лугах трава зялёная. Радасць мая дарагая.

Цяпер цалуе да мілуе Парадзіла мне сыночка (дочку),
Мужык жонку маладую. Як яснага сакалочка.

Замаладу — на ўцеху,
А на старасць —
на перамену.
Замаладу — гадавацьмем,
А на старасць — пасылацьмем.

Калі сынок — залатая калыбелька,
А калі дачка, дык луб'яначка.

Ды хто ў нас, ды хто ў нас...

Ды хто ў нас, ды хто ў нас
З паўночы ходзіць?*

Іванька да Іванька
З паўночы ходзіць.

Іванька да Іванька
Бабачкі просіць:

— Бабка мая, любка мая,
Увойдзем ка мне.

Ой, ка мне, ой, ка мне,
Да к маёй жане.

— Іванька, Іванька,
Што жа вам Бог даў?

Ці сына, ці сына,
Да ці дачушку?

Калі сын, калі сын,
То пісаці будзе.

Калі дачка, калі дачка,
Вышываці будзе.

Калі сын, калі сын,
Малявана калыбелька,

Калі дачка, калі дачка,
Лубяная каробачка.

Ой, дымна, дымна ў садзе...

Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.
У нашага Іванічкі
Да трое варот у дварэ.

У первыя вароцечкі
Да сакол вылятаў.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

У другія вароцечкі
Іванічка выязджаў.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

А ў трэція вароцечкі
Да чалядачка бяжыць.

* Кожны другі радок паўтараецца двойчы.

Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

— Вярнісь, вярнісь, дзяціначка,
Ты назад.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

Твая жана табе сына
Радзіла.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

— Я для сына ў двор не вярнуся,
Сын у мяне хазяін у дварэ.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

— Вярнісь, вярнісь, дзяціначка,
Ты назад.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

Твая жана табе дачку
Радзіла.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

— Я для дачкі ў двор вярнуся,
Дачка ў мяне госцейка ў дварэ.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

А між сеначак, між каморачак...

А між сеначак, між каморачак,
А між сеначак, між каморачак,
Ой, там Гэлячка павай хадзіла,
Ой, там Гэлячка павай хадзіла,
Павай хадзіла, сына радзіла,
Павай хадзіла, сына радзіла.
— А Міколачка, а мой душачка,
А Міколачка, а мой душачка,
А бяжы, бяжы па бабулечку,
А бяжы, бяжы па бабулечку.

Наша бабулька ды не гордая,
Ды не гордая, а здагадалася:
І сама бяжыць, аж зямля дрыжыць,
І сама бяжыць, аж зямля дрыжыць,
І прасціначку у руках дзяржыць,
І прасціначку у руках дзяржыць.
«А прасці, Божа, а дзве душачкі,
А прасці, Божа, а дзве душачкі:
Адну душачку — парадзішачку,
Адну душачку — парадзішачку,
Другу душачку — нараджоную,
Другу душачку — нараджоную,
А дзве душачкі — мае ўнучачкі».
І старэнькая, і маленькая,
Мы старэнькую — шанаваць будзем,
А маленькую — гадаваць будзем.
Мы старэнькую — дзеля жаласці,
А маленькую — дзеля радасці.
Мы старэнькую — у пярыначках,
А маленькую — у пялёначках.

Раса пала на травіцу...

Раса пала на травіцу,
Наша мама — парадніца,
Наша мама — парадніца,
Дзевяць сыноў парадзіла.
Дзевяць сыноў парадзіла,
А дзесятую дачушку.
Яе браты калыхалі,
Калышучы, прымаўлялі:
«Люлі, люлі, сястрыца,
Спі доўга, расці скора,
Сваёй маме на пацеху,
Чужым людзям на ўспамогу».

Як малодка дзіцятку радзіла...

Як малодка дзіцятку радзіла,
Яна сваю свякроўку прасіла:
«Свякроўка-матулька, палі ліхтары,
Ідучы ў каморку, крэпка застучы,
А майго міленькага разбудзі.
Устань, устань, міленькі мой,
Досыць табе ў каморцы спаць,

Пойдзем у сад вінаград ламаць
Ды будзем гарэлачку гнаць,
Нагнаўшы, радзіначку сабяром,
А сабраўшы, хрэсьбінкі згуляем».

Каб я знала, ведала...

Каб я знала, ведала,
А хто бабай будзець,
Пасадзіла б я яе
Ў агародзе на градзе
За чырвоную розу.
Палівала б я яе
Не вадою,— сытою.
Калі б сыты не стала,
Я б і мёду дастала.
Каб я знала, ведала,
А хто ў мяне кумам будзець,
Пасадзіла б я яго
Ў агародзе на градзе
За сінь-васілёчак.
Палівала б я яго
Не вадою,— сытою.
Калі б сыты не стала,
Я б і мёду дастала.
Каб я знала, ведала,
А хто ў мяне кумою будзець,
Пасадзіла б я яе
Ў агародзе на градзе
За пахучую мяту.
Палівала б я яе
Не вадою,— сытою.
Калі б сыты не стала,
Я б і мёду дастала.

Цераз гару сцежка ляжала...

Цераз гару сцежка ляжала,
Цераз гару чорна ляжала.
А хто ж тую сцежачку вытаптаў?
А хто ж тую чорную вытаптаў?
Вытаптаў Іванка ходзячы,
Ды сваю бабульку просячы.
Казловыя боты ён стаптаў,
Замшовую шубачку ён сцёр, змяў,
Бабровую шапачку ён знасіў,
Пакуль сваю бабульку упрасіў.

Не стук стучыць...

Не стук стучыць ды па сенічках,
Не грук гучыць ды па новенькіх,—
Там Міхасічка ідзець,
А ён бабу вядзець.

Хадзі, хадзі, ды бабусечка,
Ратуй маю ды Ганусечку
З вялікія мукі,
З вялікія мукі.

А й дам табе, ды бабусенька,
А й дам табе, ды бялюсенька,
А квартоўку мукі,
А квартоўку мукі.

А й дам табе, ды бабусенька,
А й дам табе, ды бялюсенька,
Квартоўку канапель,
Квартоўку канапель.

Кладзі маё а дзіцятачка,
Кладзі маё ды маленькае
Ў новенькі калыбель,
Ў новенькі калыбель.

Ой, учора, мае кумочкі...

Ой, учора, мае кумочкі,
У нас радзінкі былі,
А сягоння, мае кумочкі,
Мы на хрэсьбінкі прыйшлі.
Не шкадуйце, мае кумочкі,
Па рубельчыку даць,
То мы будзем, мае кумочкі,
Да аўторка гуляць.
Не шкадуйце, мае кумочкі,
Па каровачцы даць,
То мы будзем, мае кумочкі,
Ўсю нядзельку гуляць.

Не кукуй, зязюлечка, рана...

Не кукуй, зязюлечка, рана,
Не кажы, што ночачка мала.
Наша Маруська ўсю ночку не спала,
Яна к сабе мілых гасцей чакала,
Мілых гасцей і бабулечкі сваей.
Столікі абрусамі засцілала,
Кубачкі віном налівала,
Яна сваіх кумочкаў паджыдала,
Хоць мяне ды ў доме не будзе,
Бабуля прыглашоная будзе,
Мёдам-віном напаёная будзе,
Падаркам надароная будзе.

Папрасілі мяне на хрысціначкі...

Папрасілі мяне на хрысціначкі,
Да няма ж у мяне кашулечкі.
Ой, пайду я да суседачкі
Пазычаць кашуліначкі.
Суседачка дурна назвала:
— Як я прала, дык ты спала,
Як я бяліла, дык ты ножкі мыла,
А як насіць, дык ты прасіць.

А што па масту па калінаваму?..

А што па масту па калінаваму
І стучыць, і гручыць, і пастуківаець?
То Васілечка да Грыгоравіч,
Ён спяшыць, ён бяжыць да па бабушку.
— А ты, бабушка да Іванаўна!
Перабаб ты майго дзіцёначка да маленькага.
А што па масту па калінаваму
І стучыць, і звучыць, і пастуківаець?
То Васілечка да Грыгоравіч,
Ён спяшыць, ён бяжыць да па кумочка.
— Ты, кумочак мой да Іванавіч!
Перанясі ты майго дзіцёначка да маленькага.
А што па масту па калінаваму
І стучыць, і гручыць, і пастуківаець?
То Васілечка да Грыгоравіч,
Ён бяжыць, ён спяшыць да па кумушку.
— А ты, кумушка да Захар'еўна,
Перахрысці ты майго дзіцёначка да
маленькага.

Бабуля к унучцы сабіралася...

Бабуля к унучцы сабіралася,
Цэлую нядзелю гатавалася:
У панядзелак у млын ездзіла,
У аўторак з млыну прывезла;
А у сераду — муку сеяла,
А у сераду — муку сеяла;
А у чацвер — дзяжу учыняла,
А у чацвер — дзяжу учыняла;
А у пятніцу — дзяжу мясіла,
А у пятніцу — дзяжу мясіла;

А у суботу — ў печ садзіла,
А у суботу — ў печ садзіла;
А у нядзелю — з печы выняла,
А у нядзелю — з печы выняла.
Да ў нядзелю на хрэсьбінкі пайшла.
«А ўнучачка, мая душачка,
А унучачка, мая душачка,
Паспытай жа майго піражка,
Паспытай жа майго піражка.
А мой піражок — ды сыр з маслам».
Як разрэзалі да бабулін пірог —
А не сыр з маслам, а цялё з хвастом.
«А унучачка, мая душачка:
Пры лучыначцы дзяжу мясіла,
А лучыначка ды пагасілася —
І цялё з хвастом умясілася,
І пастух з бічом, і свіння з лычом».

Парадзіха ў полазе ляжыць...

Парадзіха ў полазе ляжыць,
А захацела яна віннага соку...
— А пазавіце майго мілага з току:
Ці не дастанець мне віннага соку?
А ён пытаецца: «Каго, жана, радзіла?
Калі сына, я мёду дабуду,
Калі дачушку, я і так абайдуся,
Калі сына, я і горад пастаўлю,
Калі дачушку — з кажухамі адпраўлю».

А учора звячора...

А учора звячора
Бабцы просьба была,
А сягоння ранюсенька
Яна сама прыйшла:
«Не прыйшла ж я піці, есці,
А з людзьмі пасядзець,
Унучачка паглядзець».
А ўчора звячора
Кумку просьба была,
А сягоння ранюсенька
Ён і сам прыйшоў:
«Не прыйшоў я піці, есці,
А з людзьмі пасядзець,
Хрышчэйніка паглядзець».
А учора звячора
Кумцы просьба была,
А сягоння ранюсенька
Яна сама прыйшла:
«Не прыйшла я піці, есці,
А з людзьмі пасядзець,
Хрышчэйніка паглядзець».

Добра, добра мне...

Добра, добра мне
За сталом сядзець,
Як у майго ўнука
Парадак ідзець.
Як мой унучак
Парадак вядзець,
Поўны чарачкі
Усё наліваець,
Мілых госцікаў
Усё запрашаець:
«Выпі, бабулька,
Поўну чарачку.
Глядзі, бабулька,
Ля парадачку».

А бабулька, пахнючая мята...

А бабулька, пахнючая мята,
А бабулька, пахнючая мята,
Люблю цябе, што вельмі багата,
Люблю цябе, што вельмі багата.
А кумачка, чырвоная рожа,
А кумачка, чырвоная рожа,
Люблю цябе, што вельмі прыгожа,
Люблю цябе, што вельмі прыгожа.
А кумочак, сіні васілёчак,
А кумочак, сіні васілёчак,
Люблю цябе, што сеў у радочак,
Люблю цябе, што сеў у радочак.

Бабулька ж мая міленькая...

Бабулька ж мая міленькая,
Парода твая лёгенькая.
Дам табе, бабулечка,
Тры пуды маку,
Абы вырас ўнучак
Без годнага браку.

Бабулька мая міленькая,
Парода твая лёгенькая.
Дам табе, бабулечка,
Тры пуды проса,
Абы вырас ўнучак
Вельмі харошы.

Бабулька мая міленькая,
Парода твая лёгенькая.
Дам табе, бабулечка,
Тры пуды вікі,
Абы быў бы ўнучак
Вельмі вялікі.

Бабулька мая міленькая,
Парода твая лёгенькая.
Дам табе, бабулечка,
Тры пуды канапель.
Абы яго ўсе любілі
Так вялікага, як цяпер.

Наша бабачка а пірагі пякла...

Наша бабачка а пірагі пякла,
А ў панядзелак муку сеяла,
А ў аўторак вадзіцу грэла,
А ў сераду дзяжу чыніла,
А ў чацвер жа дзяжу кісліла,
А ў пятніцу дзяжу мясіла,
А ў суботу ў печ садзіла,
А ў нядзелю умывалася,
К унучачцы сабіралася.

Ці ведаеш, бабка?..

— Ці ведаеш, бабка,
Ці ведаеш, любка,
За што намётку бярэш?*

Ці хадзіла часта,
Ці насіла смачна,
А к унучцы сваёй?

— Адзін раз — із юшкай,
Другі — з калатушкай,
Трэці раз — з кісялём.

Каля месяца, каля яснага...

Каля месяца, каля яснага
Усе дробныя зоркі.
А ў Іванькі на куце
Усе любыя госці.
Любыя госці, любыя госці!
Бабуля на куце сядзіць,
Харошую песню пяе.
Першую — нараджоную,
Другую — сужоную,
Трэцюю — хрэсьбінную.
Дай, Божа, нашаму дзіцяці
Хрэсьбінкі згуляці,
Хрэсьбінкі згуляці,
І вяселля даждаці.

* Кожны трэці радок паўтараецца двойчы.

А ў бару дуб'ё...

А ў бару дуб'ё
Ялаватае.
У Іванькі кум'ё
Усё й багатае.
У бабулькі хвартух
Сто рублей стоіць,
А ў кумы саян —
Усю й тысячу,
А ў кума штаны —
І няма цаны.

Наша бабулька да й малімонка...

Наша бабулька да й малімонка,
Не п'ець гарэлкі, кажыць, што горка.
Яе ўнучка ўгаварыла,
Мёдам гарэлку прысаладзіла.
— А пі, бабулька, хоць упівайся,
На мяне, ўнучку, не забывайся.
А пі, бабулька, павесяліся,
Выйдзі на вулку ды пахваліся.
— Добрая ўнучка, ёсць чым хваліцца,
Смачна гарэлка, можна упіцца.

Бедавала наша бабулька...

Бедавала наша бабулька:*
— А ці мая долька такая,
Ці мая ўнучка скупая?
Села на палочку ў куточку
Ды на свайго мужа мігаець:
— Прымі, прымі, мужу, бутэльку,
Бо вып'ець бабулька гарэлку,
Прымі, прымі, мужу, закуску,
Пабярэць бабулька у хусту.

Півушка, півушка ты піўное...

Півушка, півушка ты піўное,
Дзівушка, дзівушка ты дзіўное.
Да не будзем, міленькі, упівацца,

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

А будзем на госцейкаў спадзявацца.
А любыя госцікі: кум з кумою,
Яшчэ найлюбейшыя — брат з сястрою.
Яшчэ наймілейшыя — татка з мамкай,
А найдаражэй за ўсіх — бабка наша.

А я ж гэту бабку...

А я ж гэту бабку,
А я ж гэту любку,
Я ж бы й бабкай не браў:
Не часта хадзіла,
Не смачна насіла
Ўсё к унучцы сваёй.
Першы раз юшку,
Другі — калатушку —
Ўсё к унучцы сваёй.
А я ж гэту бабку,
А я ж гэту любку,
Я ж бы й бабкай узяў:
І часта хадзіла,
І смачна насіла
Ўсё к унучцы сваёй.
І ў суботу позна
Зарэзала козла —
Ўсё к унучцы сваёй.
А ў нядзельку рана
Зарэзала барана —
Ўсё к унучцы сваёй.

Куначка па бору пахадзіла...

Куначка па бору пахадзіла,
А яна саболя пабудзіла:
«А ўстань, саболю, абудзіся,
А ўжо ж нас стрэльчыкі акружылі,
Хочуць нас, саболю, пастраляці:
Цябе, саболя — на падболле,
Мяне, куначку — на шубачку,
А нашых дзетак — на адкладкі».
Ніначка па спальні пахадзіла,
А яна Іваньку пабудзіла:
«А ўстань, Іванька, абудзіся,
А ўжо ж нас суседзі асудзілі,
Што наша бяседа невесяленька,
Што наша бабулька неп'яненька».

Упілася бабка, упілася...

Упілася бабка, упілася,
За столікам звілася, звілася.
Мышы-шышы шалелі, шалелі,
Хвартух бабцы праелі, праелі.
Стала бабка ўставаці, ўставаці,
Стала моцна плакаці, плакаці,

Нечым хвартух латаці, латаці.
— Збірайце, бабкі, халацця, халацця,
Бабцы хвартух наладзьце, наладзьце.

А ўпіўся кумок, упіўся,
За столікам ён звіўся, ён звіўся.
Мышы-шышы шалелі, шалелі,
Куму штаны праелі, праелі.
Стаў кумок ўставаці, ўставаці,
Стаў моцненька плакаці, плакаці,
Нечым штаны латаці, латаці.
— Збірайце, дзяўчаты, лахманы, лахманы,
Куму латаці штаны ды штаны.

Упілася кумка, упілася,
За столікам звілася, звілася.
Мышы-шышы шалелі, шалелі,
Кумцы спадніцу праелі, праелі.
Стала кумка ўставаці, ўставаці,
Стала моцна плакаці, плакаці,
Нечым спадніцу латаці, латаці.
— Збірайце, хлопцы, халацце, халацце,
Куме спадніцу латаці, латаці.

А скочыла наша Хрыстынка...

А скочыла наша Хрыстынка
З полу далоў,
Як ударыцца сваёй бабачцы
У ножкі чалом:
— Гуляй, гуляй, мая бабачка,
Буду й я, буду й я,
Наварыла бочку мядочку,
А дзве віна.

А скочыла наша радзіха
З полу далоў,
Як ударыцца сваёй кумачцы
У ножкі чалом:
— Гуляй, гуляй, мая кумачка,
Буду й я, буду й я,
Наварыла бочку мядочку,
А дзве віна.

А скочыла наша радзіха
З полу далоў,
Як ударыцца свайму кумочку
У ножкі чалом:
— Гуляй, гуляй, мой кумочак,
Буду й я, буду й я,
Наварыла бочку мядочку,
Дзве віна.

Кума мая, кумачка...

Кума мая, кумачка,
Дзе жывеш?*
Чаму мяне ў госцейкі
Не завеш?

Ці ты, куме, розуму
Пытаеш?
Ці ты маёй хатачкі
Не знаеш?

А вунь мая хатачка
Ля вады,
З высокага дзераўца,
З лебяды,

Яшчэ к таму сенечкі
Прыпляту,
З харошага дзераўца,
З асату.

Тады цябе ў госцейкі
Пазаву,
Як свежае рыбачкі
Навару.

А свежая рыбачка —
Акунёк,
А любенькі госцічак —
Мой кумок!

Кум з кумою на куце сядзіць...

Кум з кумою на куце сядзіць,
Паміж іх да ручаёк бяжыць.

А ў тым ручайку да тры кубачкі,
Да тры кубачкі маляваненькіх.

У адным кубку зеляно віно,
У другім кубку саладок-мядок,

У трэцім кубку горка гарэлка.
Зеляно віно для радзішачкі,

Саладок-мядок для кумы з кумам,
Горка гарэлачка для суседачак.

---

* Другі і чацвёрты радкі кожнага куплета паўтараюцца двойчы.

Кланялася кума куму...

Кланялася кума куму
Нізенька ў грудцы:
— Дзякуй табе, мой кумочак,
Што звазіў у людцы.
Кланялася кума куму
Нізенька ў ножкі:
— Дзякуй табе, мой кумочак,
Што прывёз з дарожкі.
Кланялася кума куму
Нізенька ў пяткі:
— Дзякуй табе, мой кумочак,
Што прывёз да хаткі.

Ой, кум да кумы заляцаўся...

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек сеяць абяцаўся.
Ой, сеяў, прысяваў,
Прысяваючы, казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек слаці абяцаўся.
Ой, слаў да й прысцілаў,
Прысцілаючы, казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек рваці абяцаўся.
Ой, рваў да й вырываў,
Вырываючы, казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек збіраці абяцаўся.
Ой, збіраў, вызбяраў,
Вызбяраючы, казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек біці абяцаўся.
Ой, біў да й прыбіваў,
Прыбіваючы, казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек церці абяцаўся.
Ой, цёр да выціраў,
Выціраючы, казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек часаць абяцаўся.
Ой, часаў, вычэсываў,
Вычэсываючы, казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Палаценца ткаці абяцаўся.
Ой, ткаў да вытыкаў,
Вытыкаючы, казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Палатна бяліці абяцаўся.
Ой, бяліў, пабяліў,
А пабяліўшы, казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
У свойчыкі качаці абяцаўся.
Ой, скачваў, прыкачваў,
Прыкачваючы, казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Што ж то за красачка?..

Што ж то за красачка,
Што то за нагодка
Ў маім садзе не бывала?
Я б тую красачку,
Чырвону нагодачку
Ў сваім садзе пасадзіла,
Я б тую красачку,
Чырвону нагодачку
Рана й вечарам палівала.
Што то за кумочак,
Што за галубочак
Ў маім доме не бывае?
Я б свайго кумочка,
Свайго галубочка
За столікам пасадзіла,
Я б свайго кумочка,
Свайго галубочка
Харашэнька частавала.
Я б свайго кумочка
Свайго галубочка
Мёдам-віном напаіла.
А калі ж ні стала б,
А калі ж ні стала б,
Я й з вады дастала б.
Ай, што ж то за кумачка,
Што то за галубка
Ў маім доме не бывала?
Я б сваю кумачку,
Я б сваю галубачку
За столікам пасадзіла,
Я б сваю кумачку,
Я б сваю галубачку
Харашэнька частавала.
Я б сваю кумачку,
Я б сваю галубачку
Мёдам-віном напаіла,
А калі ж ні стане,
А калі ж ні стане,
Я й з вады дастану.

У нашага кума бела бяроза...

У нашага кума бела бяроза
Павалілась на дварэ;
Наша кумка дарагая
Пахвалілась пры стале:
— Не пайду, кумка, не пайду, любка,
Болі ў кумкі к табе.
— Забудзеш, кумка, забудзеш, любка,
Пакуль браці цябе.
А гарэліца ў бутэліцы
Ды якочыць, якочыць;
Наша кумушка, наша любушка
З куту іцці не хочыць.
— Не люблю, кумка, не люблю, любка,
Прыгавораў тваіх.
— Не любіш, кумка, не любіш, любка,
Ты нас, верна, кумоў.
Праганяеш, кумка, праганяеш, любка,
З паўночы дамоў.
Запражы, кумка, запражы, любка,
Хоць аднаго ж ты каня,
Завязі, кумка, завязі, любка,
Мяне, кумку, да двара.

Ой, кум ідзець па вуліцы...

Ой, кум ідзець па вуліцы,
Кума па гароду.
Ой, кум нясе кусок сала,
Кума скавароду.
— Ай, кумачка, галубачка,
Гатуй мне яешню.
— Ай, кумочак, галубочак,
Каб не было смешна.
— Ай, кумачка, галубачка,
Не бойся ты смеху.
— Ай, кумочак, галубочак,
Каб не было грэху.

Кум з кумою на покуце сядзяць...

Кум з кумою на покуце сядзяць,
На покуце сядзяць, мёд п'юць.
— Пі, кумок, пі, кумка!
Калі мёду не будзе,
Хоць кароўку збуду, а мёду дабуду.
— Можна, ўнучак, без віна гуляць,
Худа, ўнучак, без кароўкі дзяцей гадаваць.

Цераз бор сасна павалілася...

Цераз бор сасна павалілася,
Кума з кумам пасварылася.
А за што ж яны пасварыліся:
Ці за шышачку за яловую,
Ці за чарачку за хмялёвую?
Ні за шышачку за яловую,
Ні за чарачку за хмялёвую,
А за хрэснічка за маленькага,
А за хрэснічка за маленькага.

Ай, кум куме рад...

Ай, кум куме рад,
Павёў куму ў сад,
Пасадзіў куму
Ў садзе на суку:
«Сядзі, кумачка,
Ты галубачка,
Покуль я прыду,
Мёду прынясу».
Сядзіць кума дзень.
Сядзіць і другі:
«Ні кума майго,
Ні мёду яго».

На тым баку за рэчкаю...

На тым баку за рэчкаю
Слабодка стаіць.
Слабодачка невялічка:
Чатыры двары.
А ў дварочку — па кумочку:
Чатыры кумы.
П'юць, гуляюць малойчыкі,
За мной паслы шлюць.
Першы пасол за мной прышоў,
Не справілася.
Другі пасол за мной прышоў,
Не сабралася.
Трэці пасол за мной прышоў,
Я сабралася.
— Ай, кумачка, галубачка,
За чым бавілася:
Ці за курмі, ці за гусьмі,
Ці за лебедзямі?
— Не за курмі, не за гусьмі,
Не за лебедзямі.
А за тою жураўкаю —

Дзіцяй малаю.
Дзіця мала, сям'я няўдала —
Забавілася.

На стале каша стала...

На стале каша стала,
Залатога вярха ждала.
— Ой ты, кумачку-пане,
Ой, такі ў цябе стане!

Ой ты, кумачку-пане,
Ой, такі ў цябе стане:
Ўсадзі руку ў кішэню,
Вымі грошыкаў жменю.

А ў нядзелечку з параненечку...

А ў нядзелечку з параненечку*
На небе развіднела.
Кумочак ходзіць, дзіцяцю носіць,
А ў Бога долі просіць:
— А дай жа, Божа, гэтай дзіцяці
Усякую долю ўзяці:
І хлебавую і салявую,
Трэцюю — здаравейкавую!

А у нашай Кацярынушкі...

А у нашай Кацярынушкі
То хрэсьбіны, то радзінушкі.
Ой, на печы каравай месяць,
Сярод хаты калыбель весяць.
Жана мужу не прызналася:
Само дзіця завязалася.
Яна яму на злосць, на злосць
Накрухмаліла фартух, як тросць.
І ўсё кажа: «Буду дочкі вясці,
Каб цябе ды з гаспадаркі звясці».

Прасілі хоху у хрысцінушкі...

Прасілі хоху у хрысцінушкі,
Хоху, хоху, у хрысцінушкі.
Не мела хоха хвартушыначкі,
Хоха, хоха, хвартушыначкі.
А пайшла хоха да суседачкі,
Хоха, хоха, да суседачкі,

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

А папрасіці хвартушыначкі,
Хоха, хоха, хвартушыначкі.
«А як я прала — ты вандравала.
Хоха, хоха, ты вандравала.
А як я ткала — ты позна спала,
Хоха, хоха, ты позна спала.
Як я бяліла — ты ножкі мыла,
Хоха, хоха, ты ножкі мыла.
Як я пашыла — ты папрасіла,
Хоха, хоха, ты папрасіла».
А пайшла хоха на лужыначку,
Хоха, хоха, на лужыначку.
Вырвала хоха лапушыначку,
Хоха, хоха, лапушыначку.
Пашыла хоха хвартушыначку,
Хоха, хоха, хвартушыначку,
І пайшла хоха у хрысцінушкі,
Хоха, хоха, у хрысцінушкі.
І ўзялі хоху ў шалёны танец,
Хоху, хоху, ў шалёны танец.
Стала хвартушыначка разлазіціся,
Хоха, хоха, разлазіціся.
Пачалі ўсе госцікі разбягаціся,
Хоха, хоха, разбягаціся.
Толькі адзін гаспадар прызастаўся,
Хоха, хоха, прызастаўся,
Ды і той за ступу схаваўся,
Хоха, хоха, схаваўся.

А было у бабкі...

А было у бабкі,
А было ў любкі
Ды дванаццаць бычкоў,
Ды дванаццаць бычкоў.
Прыехала к бабцы,
Прыехала к любцы
Ды дванаццаць купцоў,
Ды дванаццаць купцоў:
— Прадай жа нам, бабка,
Прадай жа нам, любка,
Ды дванаццаць бычкоў,
Ды дванаццаць бычкоў.
— А ў мяне ёсць рабы,
Возіць мяне ў бабы.
Я ж таго не прадам,
Нізавошта не аддам.
А ў мяне ёсць гнеды,
Возіць ззаду дзеда.
Я й таго не прадам,
Нізавошта не аддам.
А ў мяне ёсць лысы,
Возіць за мной місы.
І таго не прадам,
Нізавошта не аддам.
І ёсць пераплесы,
Возіць перапечы.
І таго не прадам,
Нізавошта не аддам.

Ёсць бычок падласы,
Возіць мне каўбасы.
І таго не прадам,
Нізавошта не аддам.
Ёсць і ганаровы,
Возіць дамоў дровы.
І таго не прадам,
Нізавошта не аддам.
Ёсць яшчэ і рыжы,
Да работы хіжы.
Я й таго не прадам,
Нізавошта не аддам.
Ёсць у мяне й чорны,
Ён мне круціць жорны.
Я й таго не прадам,
Нізавошта не аддам.
Ёсць у мяне буры,
Ён пасець мне куры.
Я й таго не прадам,
Нізавошта не аддам.
Ёсць у мяне шэры,
Піша мне паперы.
Я й таго не прадам,
Нізавошта не аддам.
Ёсць у мяне крутарог,
Вядзе п'яных за парог.
Я й таго не прадам,
Нізавошта не аддам.
Ёсць у мяне белы
На ўсякія дзелы.
Я й таго не прадам,
Нізавошта не аддам.
І ўсіх іх не прадам,
Нізавошта не аддам.

У нашага Іванькі...

У нашага Іванькі
Вінаград на дварэ,
Пасадзіў ён ды сваю бабульку
Да й на самым куце.
Ой, частуе, ганаруе
Не людзей,— сам для сябе:
— Запражыце, запражыце
Да дванаццаць валоў,
Завязіце, завязіце
Да й бабулю дамоў.
Наша бабулька-галубулька
Да й не пышная была,
Узяла падарак
Да й дадому павязла.

У нашага Іванькі
Вінаград на дварэ,
Пасадзіў ён свайго кума
Да й на самым куце.
Ой, частуе, ганаруе
Не людзей,— сам для сябе:
— Запражыце, запражыце
Каня варанога,
Завязіце, завязіце
Кума маладога.
Наш кумочак-галубочак
Не пышны быў,
Узяў падарак
Да й дадому пайшоў.

У нашага Іванькі
Вінаград на дварэ,
Пасадзіў ён сваю куму
Да й на самым куце.
Ой, частуе, ганаруе
Не людзям,— сам для сябе:
— Запражыце, запражыце
Лянівую кабылу,
Завязіце, завязіце
Куму маладую.
Кума-кумачка
Не пышная была,
Узяла падарак
Да й дадому пайшла.

Стаіць шацёр над вадою...

Стаіць шацёр над вадою,
Веццейкі да долу,
Веццейкі да долу.
А ты ж сабе, мая кумачка,
Едзь сабе дадому,
Едзь сабе дадому.
Ды я ж цябе, мая кумачка,
Люблю і кахаю,
Люблю і кахаю.
Ды я ж цябе, мая кумачка,
Я ж цябе не трымаю,
Я ж цябе не трымаю.
— Ай, кумачка, ты галубачка,
Як я цябе люблю,
Як я цябе люблю.
Я ж ад цябе, мая кумачка,
Гасцінчыка хачу,
Гасцінчыка хачу.
А ты ж мяне, мая кумачка,
Навек не накорміш,
Навек не накорміш,
А для сябе, мая кумачка,
Вялікую славу зробіш,
Вялікую славу зробіш.

Ішоў кум па сялу...

Ішоў кум па сялу,
Кума па гародзе,
Нясе кум чапялу,
Кума скавароду.
Кум дроў насячэ,
Кума бліноў напячэ,
Кум бліноў не хоча,
Каля кумы рагоча.

Кума кума любіла...

Кума кума любіла:
К сабе ў госці зазвала:
— Ты кума, ты душа,
Саўсім, кума, хараша.

Кум к куме ў сені,
Кума к куму ў крупені.
— Ты кума, ты душа,
Саўсім, кума, хараша.

Кум к куме ў хату,
Кума куму букату.
— Ты кума, ты душа,
Саўсім, кума, хараша.

Кум к куме на парог,
Кума куму пірог:
— Чым цябе, кум, частаваць?
Ці віном зеляном,
Ці салодкім мядом?

На гарэ ліпка нахілілася...

На гарэ ліпка нахілілася,
А кума з кумам пасварылася.
А за што яны пасварыліся?
Ці за трэсачкі за цісовыя,
Ці за дзетачак за хрышчоных?
Не за трэсачкі за цісовыя,
А за дзетачак за хрышчоных.
Кума кума перапрашавала:
— Хадзі, кумок, кісялёк есці,
Кісялёк есці із сыціцаю,
Кісялёк есці із сыціцаю,
Са мной, добрай маладзіцаю.

Я ў хрэсьбінкі паманілася...

Я ў хрэсьбінкі паманілася,
Цэлы тыдзень сабіралася:
У панядзелак — у печы паліла,
У аўторак — пшаніцу сушыла.
У сераду — таўкла і малола,
А ў чацвер — у печы паліла,
У печы паліла, вадзіцу грэла,
А ў пятнічку — пірог учыняла,
А ў суботку — чуць на зорачку — мясіла,
А лучынка пагасілася —
Цяля з хвастом умясілася,

І парсюк з лычом,
І пастух з бічом.
Як сталі пірог мой кроіць,
Дык цяля мычыць,
А парсюк квічыць,
А пастух крычыць.

Пасаджу я квасоліну...

Пасаджу я квасоліну,
Сама йду дадому,
А мой мілы чарнабрывы
П'е ў карчме з кумою.

— Ой, нядобра, няхораша,
Мой міленькі, робіш,
Як дзень, як ноч п'янюсенькі
Із кумою ходзіш.

Годзе, мілы чарнабрывы,
Із кумою піці,
Ой, хадзема дадоманьку
Вячэру варыці.

— Мая міла чарнабрыва,
Яшчэ вазьму кварту,
Кума мая харошая,—
Яшчэ болей варта.

Пад вішнямі, чарэшнямі
Палягалі спаці;
— Мая міла чарнабрыва,
Не дай людзям знаці.

Я, малада, як ягада,
Тады не ўтрывала
І, выйшаўшы на вуліцу,
Усім людзям сказала.
Там за садам, за гародам,
Ішчэ за пералазам
Іскавалі куму з кумам,
Ды абое разам.

— За што ж цябе, мой міленькі,
Разам іскавалі?
— То за тое, мая міла,
Што з кумою спалі.

У полі гаёк расшугаўся...

У полі гаёк расшугаўся,
Іванька з жонкай разгукаўся:
— Ой, жана мая дарагая,
Дзе ўсю ты красу сваю дзела?
Ці з малайцамі прагуляла?
Ці з дзевачкамі прапяяла?
Ці з жоначкамі прасядзела?
— Ой, муж ты мой, муж маладзенькі,
Калі сам не знаеш, не ведаеш,
То ў добрых людзей папытайся:
Як табе сыночка радзіла —
Ўсю сваю красу я згубіла.

Ой, два дубы, ой, два дубы...

Ой, два дубы, ой, два дубы
Ды зялёныя стаяць.
А два браты, а два браты
Ды на хрэсьбінках сядзяць.
П'юць, гавораць, п'юць, гавораць
Аб жаніцьбачку сваю:
— Не ўдалася, не ўдалася,
Брат, жаніцьбачка мая.
А ўдалася, а ўдалася
Мая п'яніца-жана.
А пойдзем, брат, а пойдзем, брат,
Мы да добрых кавалёў,
А скуём, брат, а скуём, брат,
Ваструсенькі тапары.
А пойдзем, брат, а пойдзем, брат,
Мы у цёмныя бары.
А ссячом мы, а звалім мы
Ды горкую асіну.
А скуём мы, а зробім мы
Маляваненькі чаўнок.
А ўложым мы, а ўложым мы
Маю п'яную жану.
А пусцім мы, а пусцім мы
Да на быструю раку.
Самі глянем, самі глянем
Мы пад ясную гару:
Ці высока, ці высока
Ясна зорачка ўзышла,
Ці далёка, ці далёка
Мая жана адплыла.
А скаціся, а зваліся,
Ясна зорачка, далоў.
А вярніся, а вярніся,
Мая жоначка, дамоў.
— Не скачуся, не звалюся,
Ясна зорачка, далоў.
Не вярнуся, не вярнуся,
Бо я п'яніца, дамоў.

А на моры селязенька ды падпырхіваець...

А на моры селязенька ды падпырхіваець,
А ён сваю шэру вутачку паісківаець:

«Дзе дзелася, падзелася шэра вутачка мая?
Калі ж яна у гняздзечку, не спужайце яе,
Калі ж яна на жырочку, не страляйце яе».
Ходзіць па сенцах Іваначка, паглядываець,
А ён сваю мілу жоначку паісківаець:
«Дзе дзелася, падзелася міла жоначка мая?
Калі ж яна ў белай ложы, не будзіце яе,
Калі ж яна у каморы, дык паклічце яе».

Чарачка медавая...

Чарачка медавая
Па сталу пахадзіла,
Бабачку напаіла.
— Пі, бабка, не співайся,
На пахмеллейка спадзявайся.

Чарачка медавая
Па сталу пахадзіла,
Кумачку напаіла.
— Пі, кумка, не співайся,
На пахмеллейка спадзявайся.

Чарачка медавая
Па сталу пахадзіла,
Кумочка напаіла.
— Пі, кумок, не співайся,
На пахмеллейка спадзявайся.

Ой запала, ой запала...

Ой, запала, ой запала
Да дарожка сняжком.*

Ой, не зойдзе, ой, не зойдзе
Да бабулька пяшком.

— Запражыце, запражыце
Да дванаццаць сабак,

Завязіце, завязіце
Да бабульку ў кабак.

Запражыце, запражыце
Каня варанога,

Завязіце, завязіце
Кума маладога.

Запражыце, запражыце
Кабылу сівую,

Завязіце, завязіце
Куму маладую.

* Кожны другі радок паўтараецца двойчы.

Час дадому, час...

Час дадому, час,
Час да ўжо даўно.
Будзе мяне мілы біці,
Няма каму бараніці,
Час дадому, час.
Я дадому йду,
Як пчолка гуду,
Да й за мною, маладою,
Едуць хлопцы чарадою,
Барабаны б'юць.

— Да й міленькі мой,
Адчыні мне двор.
Ідзе твая міленькая,
Яна трошкі п'яненькая,
Да ці рад ты ёй?
— Як я ёй не рад,
Калі з яе лад.
Парадзіла мне сыночка,
Пасадзіла, як дубочка —
Будзе ў хаце лад.

Хрэсьбінныя прыгаворкі

Як бабка ставіць перад кумамі гаршчок з кашай і бутэльку салодкай гарэлкі, што падаў ёй бацька нованароджанага:

— Мой унучак,— ваш хрэснік,— кашку прыслаў, а бацька ягоны вінца здагадаў. Прашу адведаць, бабку пацешыць, унучка паславіць, маць з бацькай паздравіць.

З гэтай жа прамовай бабка звяртаецца і да іншых гасцей.

Кум ад сябе і ад кумы адказвае:

— Наш хрэснік — прыветнік, не ўстаў ўзрасці,— вялеў кашу нясці, гасцей частаваць, дабра нажываць. Дай, Божа, здароўя яму, быць вумнаму, разумнаму, шчасліваму, багатаму, радзіцелям пацехай ва младасці, карміцелем іх старасці, а нам — гуляць на радасці. Маць з бацькаю паздраўляем, прыбыткаў большых жалаем. Бабу за ўнука і ўгашчэнне прывячаем.

Кашу з ячменем кум разбіваець, потым адкупляець.

Кум: Я разбіваю, я адкупляю.

Бабка: Плоцім за кашу, не за вашу,— за нашу.

Бабка, кладучы на талерку тры грошы:

— Бог да нас чужаземца прыслаў і ад вас, дзядзькі і цёткі, успамогу ўзяць заказаў. Прашу чым яго падарыць, каб было за што мыла купіць, і прашу нікому не адмаўляць, бо будзе чужаземец смаракаваць, бо ён з далёкіх строн прыбыў і вас усех накорміць і напоіць. Дайце, а не адмаўляйце. Гэты госць не прыбыў, каб век тут быць.

Бабка, атрымаўшы падарунак ад парадзіхі:

— Дзякуй, унучка і ўнучак, за падарак і піражок. Каб мой унучак, а ваш сынок, вялікі рос і вяселлем трос.

Бабка на «муравінках», абвязаўшыся падараванай халсцінай:

— Каб мой унук вялікі рос, шчасліў быў! Каб на яго долю паслаў Бог усяго ўволю!

Кум, б'ючы кашу (гаршчок):

— Гадуй, Божа, малое, да каб на той год другое.

ВЯСЕЛЬНАЯ ПАЭЗІЯ

Шлюбныя звычаі на Беларусі ў XVI стагоддзі

Запісаў Ян Ласіцкі

Шлюб бяруць так. Юнак, якому спадабалася якая-небудзь дзяўчына, пасылае трох-чатырох сваякоў да яе бацькоў, якіх яны пераконваюць аддаць дачку. Бацькі ж, каб яшчэ больш падахвоціць жаніха, гавораць, што нічога з гэтага не атрымаецца, выдумляюць сватам якую-небудзь сур'ёзную прычыну.

Жаніх, пацярпеўшы такую няўдачу, робіць цяпер інакш. Ён вырашае завалодаць дзяўчынаю сілай і падбірае для гэтага зручны момант.

І вось, калі дзяўчына выходзіць выпадкова з бацькоўскага дому, памагатыя жаніха, якія хаваліся ў засадзе, ловяць яе, чаго яна ніяк не чакае і таму не асцерагаецца, і перадаюць, як паляўнічыя здабычу, жаніху.

Пасля таго, як ён пазбавіць яе дзявоцкасці, ужо другія пасланцы жаніха дастаўляюць яе да бацькоў. Пасланцы часткова прызнаюць віну, але адначасова апраўдваюць учынак жаніха моцным каханнем.

Калі бацькі даюць, нарэшце, згоду, прызначаецца дзень вяселля. Але жаніху з нявестай нельга жыць разам, пакуль не адбылася публічная ўрачыстасць.

І вось каля адзінаццаці гадзін вечара пад гукі музыкі, пры святле паходняў жаніха і нявесту вядуць да храма. Да іх прыбыцця прывозяць сюды некалькі бочачак, поўных сікеры, мядовага віна і піва. Танцуючы, забаўляючыся, са смехам і крыкам госці абодвух полаў праводзяць добрую частку цёмнай ночы. А тым часам некаторыя ідуць па фламіна. Часцей за ўсё ходзяць да яго па некалькі разоў, але кожны раз дарэмна. Гэта таму, што бедалага-попік п'яны і не можа

прачнуцца. А народ між тым водзіць карагоды. Нарэшце, не выцерпеўшы, сваякі жаніха ўрываюцца ў дом п'янага духоўніка, хапаюць яго і нясуць у храм, каб ён выканаў там неабходныя абрады. Ён жа, прыступаючы да сваіх прывычных абавязкаў, не можа стаяць на нагах і часта падае пасярод храма. Гэта выклікае такі бессаромны рогат, такое варварства, якое, я думаю, не параўнаеш нават з блазенствам язычнікаў пры выкананні імі таінства Венеры. Да гулякі падбягаюць і падтрымліваюць яго, каб не паваліўся. Толькі пасля гэтага ён загадвае прынесці яму абрадавы хлеб.

Затым ён разгортвае кнігу і стэнтарскім голасам пяе якісьці Давыдаў гімн. Пасля гэтага хапае за чупрыну жаніха і звяртаецца да яго:

— Скажы мне, жаніх, брат, друг, ці можаш ты быць мужам гэтай маладой? Будзеш ці не біць яе калі-небудзь палкай? Пакінеш яе ці не, калі яна будзе хворая, караслівая, пакалечаная?

Жаніх клянецца тут усімі святымі выконваць як трэба абавязкі добрага мужа. Далей духоўнік звяртаецца да нявесты і гэтак сама пытаецца ў яе, ці зможа яна жыць з мужам (дзяўчаты ж выходзяць тут замуж ва ўзросце дзесяці-адзінаццаці год), ці будзе яна клапаціцца пра сям'ю, ці захоча яна быць, пры выпадку, верным спадарожнікам сляпому, кульгаваму, пакалечанаму мужу.

Яна дае станоўчы адказ.

Тады фламін надзяе на галовы жаніха і нявесты вянкі з галінак дрэў. Па акружнасці гэтых карон па-русінску напісаны словы: расціце і размнажайцеся.

Калі ён гэта робіць, усе запальваюць васковыя свечкі. Духоўніку падаецца чаша пеністага мёду, ён выпівае яго адным глытком за здароўе маладажонаў, яны таксама п'юць з такой жа хуткасцю і зноў падаюць чашу фламіну. Скінуўшы з галоў жаніха і нявесты вянкі і растаптаўшы іх нагамі, зноў наладжваюць карагоды. Тут ужо завадатарам выступае фламін, а ўсе доўгай чарадою ходзяць за ім.

Жанчыны рассыпаюць па храме зерне лубіну і лёну, прыгаворваючы:

— Хай жа багі нашы зробяць так, каб маладажоны ніколі не мелі нястачы.

Нарэшце, увесь гам канчаецца. Духоўніка адводзяць дадому. Госці праводзяць мужа і жонку.

У час гэтай весялосці многа п'юць.

Вытанчанай музыкі яны не ведаюць. На вяселлях і іншых святочных урачыстасцях яны часцей за ўсё скачуць пад рукапляскання.

Абрады вясковага люду з-над Бярэзіны

Запіс Э. Н.

Запоіны

Найважнейшымі асобамі ў вясельнай урачыстасці з'яўляюцца сваты: яны рэкамендуюць бацькам нявесты маладога, дамаўляюцца, калі і як гуляць вяселле, вызначаюць з імі (зыходзячы з іх заможнасці) велічыню пасагу, мяркуюць аб уладкаванні будучай сям'і. Звычайна маладая ідзе ў дом бацькоў нарачонага. Часам маладога прымаюць у дом яго жонкі. Гэта бывае тады, калі тут вялікая гаспадарка, бацькі ўжо старыя, а поле і жывёла патрабуюць клапатлівага догляду і працавітага работніка. Малады, якога прымаюць у дом жончыных бацькоў, на іх гаспадарку, завецца прымак.

Старшы сват — звычайна чалавек у гадах, красамоўны, вясёлы, усімі паважаны,— дамовіўшыся папярэдне з абодвума бакамі, у прызначаны час прыходзіць з гарэлкаю ў дом нявесты і вітае прысутных... Гаспадары, адказаўшы «На векі вякоў», саджаюць яго за стол. Тым часам нявеста адпраўляецца збіраць сябровак, а хто-небудзь іншы з хаты ідзе запрашаць на запоіны яе хросных бацькоў, а таксама сваякоў. Калі ўсе збяруцца, дзяўчаты ўводзяць нявесту з наступнаю песняй (імя свата, напрыклад, Васіль):

Ото ж табе, Васілька,
Увядзёнка Агатка.
Калі яе любіш — дай пірог,
Калі не любіш, то вон за парог.
Не хваліся, што ў нас быў,
Што нашай Агаткі не злюбіў.

Сват вітаецца з маладой за руку, дае ёй пірог, сыр, смажанае мяса, лье ў міску гарэлку, кладзе туды трохі грошай. Пасля гэтага дзяўчаты моўчкі ідуць у істопку*, дзе частуюцца і спяваюць для маладой песні, дружына ж садзіцца з гаспадарамі вячэраць.

Прыехалі заручнікі,
Чаму яны без дудачкі?
Агатка не ўдовачка,
Захочаць пагуляць,
Таткаў двор раўнаваць
Ножкамі, астрожкамі,

* Істопка — чыстая хата па другі бок дома; называлася часам святліцай, бо была святлейшай за курную і задымленую.

Чорнымі чабатамі
З маладымі сватамі.

Каб я ведала блізкія заручынкі,
Паслала б я свайго татачку ў лог па каліну.
Татачка ідзець,
Калінкі не нясець,
Ветры не веюць,
Слонца не грэець,
Калінка не спеець.
Што мая за доля!

Мавіла бочачка,
У піўніцы стоячы:
— Калі мяне не вып'еце,
Сама выкачуся,
Па дварэ разліюся
Крыніцай сцюдзёнай вадзіцы.
Мавіла Агатка ў таткі седзячы:
— Калі мяне не выдасі,
Так я сама пайду,
Па дварэ памаленьку іду,
За варота угрунь пабягу.

Зыбнула мора, зыбнула,
Там наша Агатка ўтанула!
Прышоў к ёй татка:
— Падай ручку, Агатка.
— Не падам я ручкі:
Хоць я ў моры ўтану,
Няхай нікаму не застануся,
Застануся адному
Яначку мілому.

Камора звінела,
Гдзе Агатка сядзела:
Сядзела ў каморы,
Тонкія абрусы ткала,
Мыслямі ўзоры
Дзіўныя паклала.
Прыехаў сужаненькі сам дзесят,
Папушчаў конікі ў вішнёвы сад.
Не ржыце, конікі, не ржыце,
Яначка напасець на жыце,
Ядраным аўсом абсыпець,
Чырвоным сукном абшыець.

На гэтым заканчваецца першая, уступная частка вяселля, пасля якой наступае другая — так званыя змовіны. Перад імі сват з квартай гарэлкі яшчэ раз прыходзіць да бацькоў нявесты, каб дамовіцца, колькі патрэбна браць гарэлкі і пірагоў на змовіны.

Змовіны

Пячэнне каравая, дружына, якая павінна складаць вясельны поезд маладога і маладой, запрашэнне сяброў і сваякоў, іх прыём і частаванне — словам, усё, што датычыцца вяселля, з'яўляецца на змовінах прадметам абмеркавання паміж сватам і бацькамі маладой. Сват прыязджае ў час, калі ў доме маладой рыхтуецца каравай, прывозіць гарэлку, кладзе на стол жытні пірог для хросных бацькоў і бабкі, якая прысутнічала пры нараджэнні маладой. Калі бабкі няма ў жывых, яе замяняе дачка ці хто-небудзь іншы з яе хаты. Дзяўчаты тым часам уводзяць маладую ў хату з тымі ж абрадамі і песнямі, што і на запоінах. Сват дае ёй пірог з макам і мёдам усярэдзіне, сыр, смажанае мяса, налівае ў міску гарэлку, і маладая з дзяўчатамі выходзіць з хаты. Якраз у гэты час і дамаўляюцца пра ўсё, аб чым гаварылася вышэй.

Вясельны поезд маладога складаецца звычайна з трох свах (старшая сваха — хросная матка, дзве малодшыя — сёстры або бліжэйшыя сваячкі), двух дружкоў, столькіх жа намеснікаў і хроснага бацькі, які вязе сваіх і якога таму завуць вазіла; садзяць яго на вяселлі ў канцы стала, ён не карыстаецца такой пашанай, як хросная матка, якая звычайна займае самае ганаровае месца — на куце. Закончыўшы перагаворы з гаспадаром, сват садзіцца вячэраць, гаспадыня ж прымае і частуе каравайніц. Яна гаворыць, якія і для каго прыгатавала падарункі — колькі жанатых мужчын у хаце, куды ідзе дзяўчына, столькі трэба паслаць туды намітак, абкручаных паясамі; свату ж прызначаецца барылка, абвязанае палатном, або намітка, таксама абкручаная поясам. Калі каравай замешаны, сват ідзе па гарэлку: частаванне каравайніц — гэта выключна яго абавязак.

Рашчыняецца каравай у суботу раніцай. Хросная маці або старэйшая ў хаце жанчына перад тым, як сыпаць у дзяжу муку, просіць бласлаўлення: «Есць тут Бог, бацька, матка, родныя і суседы, блізкія і дальнія, мужы статэчныя, бабкі запечныя, дзеткі заплечныя, благаслаўліце краснай панне каравай учыніць». Такім спосабам просіць бласлаўлення тры разы. Калі каравай рашчыняць, яго ставяць у цяпло. Вечарам запрашаюць пяць ці сем каравайніц і трох мужчын — мясіць і пячы каравай. Мужчыны, узяўшы дзяжу, павінны тры разы перакруціць яе і паставіць на крыж супраць печы. Сват тым часам дае гарэлку, гаспадары — сыр і аладкі на закуску. Старшая каравайніца просіць бласлаўлення — так, як і пры рашчыньванні — і спявае наступную песню:

Благаславіце, людзі,
Блізкія суседзі,
Гэтаму дзіцяці
Каравай замясіць
Ручкамі бяленькімі,
Персцнямі залаценькімі,
Песнямі весяленькімі.
Ты саступ, Божа, з неба,
Як нам цяпер трэба!
Памагаў рашчыніць,
Памагай замясіць
Ручкамі бяленькімі,
Персценьмі залаценькімі.
Песнямі вяселенькімі.
Не стой, Божа, за дзвярмі,
Да ідзі, Божа, у хату,
Да сядзь, Божа, на куце,
Да дай долю маладзе.
— Я ў хату не пайду,
Я за дзвярмі пастаю,
Маладзе долю перашлю.
Збірайся, родзе,
Да к беленькаму караваю!
Старыя бабы для парадку,
Маладыя маладзіцы песні пець,
Удалыя малойцы каравай печ.

Прыступаюць да работы тры або пяць каравайніц: па чарзе адна за адной месяць цеста, а скончыўшы, ставяць на дзяжу талерку, на якую кладуць свае дары для маладой. У гэты час сват зноў частуе іх гарэлкай, гаспадары закускай, мужчыны ставяць дзяжу на месца, перакручваючы яе, як раней.

Хвала ж табе, Божа!
Што мы дзела зрабілі,
Каравай замясілі
Ручкамі бяленькімі,
Персцнямі залаценькімі,
Песнямі весяленькімі.
Чатыры нажы ў дзяжы,
Пятая — мая сіла
Каравай замясіла.
Да ўпала я ў дзела,
Цела маё ўпацела,
Гарэлачкі захацела,
Гарэлачкі-акавітачкі,
Для мяне, працавітачкі,
Гарэлачкі-ташчаначкі,
Для мяне, мяшчаначкі.

Ідуць у танец, а потым спяваюць:

У нашага гаспадара
Кудравая галава.

Кудзёркамі патрасець,
Нам гарэлкі прынясець.
А кудзёркамі пакалоціць,
Нам гарэлкі прысалодзіць.

У адказ на гэта прыносяць гарэлку, закуску і зноў пачынаюць танец.

Каравай ў дзяжы іграець,
Да века паднімаець,
Каравайніц 'жыдаець.
— Гдзе ж мае каравайніцы?
Чы на мяду запіліся,
Што на мяне забыліся?
Гаспадынечка вудка,
Варачайся хутка,
Ужэ на дварэ вечар,
Каравай наш не печан.

Пакуль цеста не падыдзе, працягваюцца жарты і танцы. Потым мужчыны нясуць дзяжу і, тройчы яе перакруціўшы, ставяць на крыж. Старшая каравайніца, збіраючыся саджаць у печ каравай, просіць бласлаўлення. Усе разам спяваюць:

Саступ, Божа, з неба,
Як нам цяпер трэба,
Памагаў замясіць,
Памажы і ўсадзіць
Ручкамі бяленькімі і г. д.

Калі каравай саджаюць у печ, спяваюць такія песні:

Ніхто не ўгадае,
Што ў нашым караваю:
Дзевяці пудоў мука,
Асьмі кароў масла,
А яец паўтараста.
З суботы на нядзелю
Сабралася Агаты радзіна,
Зняслі ж яны сем сіт мукі на каравай.
Хвала ж Богу, вялік будзе каравай!
Зняслі ж яны сем фасак масла на каравай.
Хвала ж Богу, пушон будзе каравай!
Зняслі ж яны сем сіт яец на каравай.
Хвала ж Богу, румян будзе каравай!
На дварэ явар сякуць,
А ў хатачку трэсачкі лятуць.
Каля явару трэсачкі,
Каля караваю маладзічкі.
Першая квятка —
Нашая Агатка.
На дварэ явар сякуць,
А ў хатачку трэсачкі лятуць.

Калі ўжо цеста падышло, збіраюцца саджаць каравай у печ. Адзін каравай робяць у выглядзе паўмесяца — ён прызначаецца для абмену; другі — у форме вялікай булкі, якая называецца перапека. Выпякаецца яшчэ адна невялікая булачка — трэці каравай. Прызначэнне яго такое. Калі маладая першы раз на рацэ палошча бялізну, ёй дапамагаюць суседкі. За гэта яна і частуе іх пірагом і гарэлкай. Гэтыя тры булкі ўпрыгожваюцца рознымі фігуркамі. Саджаюць яшчэ чацвёртую булку, без упрыгожанняў, плоскую — каб хутчэй спяклася. Яе потым дзеляць паміж сабой каравайніцы і ўсе прысутныя. Акрамя таго, для кожнай каравайніцы і каравайніка, а таксама для кожнага дзіцяці, якое ёсць у хаце, пякуць па маленькаму піражку — называецца ён кроска.

Караваі саджаюць у печ па чарзе два мужчыны. Пры гэтым яны за кожным разам стукаюць у столь лапатаю, якую пад канец стараюцца зламаць. Трэці каравайнік раскладае на загнеце з дубцоў чыстага сухога веніка агонь і ўвесь час яго падтрымлівае — каб каравай быў румяны. Дзяўчаты пры гэтым спяваюць:

Шчарбаты, лупаты загнет закладаець,
Яму Бог не памагаець.

Калі ўсе пірагі пасаджаны, каравайніцы скачуць і спяваюць, пляскаючы ў ладкі:

Хвала ж Богу, што мы дзела зрабілі,
Каравай усадзілі
Ручкамі бяленькімі,
Персцнямі залаценькімі,
Песнямі весяленькімі.
Каравайніцы п'яны,
Усё цеста пакралі,
Па кішэнях паклалі.
Ах, ця мне прышло,
У кішэні цеста падышло.
Чыя жана гожа,
Языком дзяжу гложа,
Чыя жана хіжа,
Языком дзяжу ліжа.
Дайце мне чарку, я тую вып'ю,
Дайце другую, я вып'ю і тую,
А за трэцюю падзенькую.

Пра каравай клапоцяцца толькі каравайнікі і каравайніцы. Маладая ж і дзяўчаты, якія яе акружаюць, сядзяць асобна, збоку. Гарэзлівасць, вясёлыя жарты, бясконцыя спевы, перамешаныя з танцамі, пляскання ў ладкі, смех робяць заба-

ву вельмі жывой. А чым большая тут весялосць, тым большая слава для гаспадара і каравайніц. Калі-нікалі і дзяўчаты пускаюцца ў танец, але каравайніцы ім перашкаджаюць. Калі пірог ужо спёкся, узбуджаныя працаўніцы, пляскаючы ў ладкі, танцуючы і спяваючы, бягуць да печы.

Стану я для печы
Караваю глядзець,
Каб ён не адпёкся,
Каб ён не аджогся,
Каб нам сорам не быў
Да ў чужыя людзі.

Вымаюць кроскі і раздаюць усім, хто тут ёсць, і, вядома, дзецям. Дзеляць і ядуць таксама плоскую булку. Пачынаецца частаванне гарэлкай і закускай. Потым — танцы і спевы. Затым ставяць на стол века ад дзяжы, накрываюць яго абрусам і кладуць спечаны каравай і талерку для складвання падарункаў.

Палажылі каравай на стале —
Сталавыя ножкі гіблюцца,
Усе людзі дзівяцца,
Што ўдаўся наш каравай,
Да пану Богу на хвалу,
Добрым людзям на славу,
А прыяцелям на дзіва.
Вы, прыяцелі, глядзіце
І па талеру кладзіце.

Тут дружка адпіхвае дзяўчат убок, паварочвае тры разы дзе — гаспадар, за ім — каравайнікі з караваем; тройчы перакруціўшыся, за імі выбягаюць каравайніцы, пляскаючы ў ладкі і спяваючы:

Пытаўся каравай у перапечы:
— Да куды сцежка да клеці?
— А ты, караваю, верапаю,
Часта ў клеці бываеш,
Сцежкі, дарожкі пытаеш!
Вазьмі пасажок, напірайся
Да у клетку дабывайся.

Гаспадар, увайшоўшы ў клець, частуе гарэлкаю спачатку каравайнікаў, потым каравайніц, затым усіх, хто ёсць. Каравайніцы, ідучы назад у хату, скачуць, пляскаюць у далоні і спяваюць:

Мы ж былі на караваю,
Там нас частавалі

Піўцом маладзенькім,
Мядком саладзенькім.

Садзяцца за стол. Пітва і яды падаюць шмат. Каравайніцы спяваюць:

Цымбалы заігралі,
Каля акон забразджалі.
Агатчына чэлядзь
Захацела вячэраць.
Ляцелі гусачкі з выраю
Да пыталіся караваю:
— Чы ўжо вы каравай спляскалі?
Чаму нас, гусачак, не ждалі?
Мы б вам каравай спляскалі,
Крылкамі, ножкамі спляскалі.

На гэтым заканчваецца абрад пячэння каравая ў доме маладой. У той жа самы час і такім жа спосабам пякуць каравай і ў хаце маладога, пасля чаго малады выбіраецца да сваёй нарачонай. Перад ад'ездам яго саджаюць на каробцы з жытам, хросная матка падстрыгае яму валасы, а сястра падсмальвае іх васковай свечкай. Пры гэтым свахі спяваюць:

Яначка-брахна па гумне ходзіць
Да тры сады садзіць,
Усе тры хмялёвыя.
Війся, хмелю, війся да кола тычкі,
Да ў сад шышачкамі,
Падстрыгайся, Яначка,
З рабяцкага стану да ў мужаскую славу.

Да ў месяца два ражкі крутыя,
Да ў Яначкі два браты радныя.
Адзін брахна каня сядлаець,
А другі брахна яго научаець:
— Да будзь, брахна, разумненькі,
Да паедзеш, брахна, у чужыя людзі,
Выйдзець к табе танок дзевак;
Не бяры таей, што ў золаце,
Да бяры тую, што ў розуме;
Мы золата ў краме дастанем,
Мы розуму свайго не ўставім.

— Кляновы лісточак, куды ж ты коцішся?
Чы ў луг, чы ў даліну,
Чы зноў на кляніну?
— Да не сам я качуся,
Коціць мяне буен вецер.
Не ў луг, не ў даліну,
Да і зноў на кляніну.
— Яначка маладзенькі,
Куды ж ты радзішся,
Чы ў госці, чы ў дарожку?
— Да не сам я раджуся,

Радзіць мяне мой татачка,
Не ў госці, не ў дарожку,
К цесцятку на падвор'е,
К Агатцы на застолле.

Уся дружына садзіцца за стол. У маладога, прыстойна адзетага, на галаве аўчынная шапка з чырвоным бантам, на шыі хустка, таксама перавязаная чырвонай стужкай. Жанчыны за сталом спяваюць:

Чые то конікі
Для стаенкі стаяць,
Сівыя, буланыя,
У дарожку прыбраныя?
Чые ж то свашачкі
За столікам сядзяць,
Белыя, румяныя,
У дарожку прыбраныя?
Яначкавы конікі
Для стаенкі стаяць,
Сівыя, буланыя,
У дарожку прыбраныя.
Яначкі свашачкі
За столікам сядзяць,
Белыя, румяныя,
У дарожку прыбраныя.
Сабраўся раёчак
Да ў цёмны куточак,
Хочаць паляцець на шчырыя бары,
На жоўтыя цвяты,
На салодкія мяды.
Сабраўся Яначка з сваёй радзінай,
Хочаць ён паехаць
Цесцятку звяваць,
Агатку к сабе ўзяць.

Спявачкам даюць гарэлку, закуску, пасля чаго ўсе разам, узяўшы са стала па кавалку хлеба з соллю і схаваўшы за пазуху, выбіраюцца да свата. Прыстойна адзетыя хлопцы ў шапках з кударкамі набакір садзяцца на коней. З імі і скрыпач. Дзяўчаты і жанчыны рассаджваюцца па вазах. Перад самым ад'ездам маці маладога ў вывернутым кажусе тройчы абходзіць увесь поезд, абсыпае яго аўсом, а дружка б'е яе бізуном. У дарозе ўвесь час спяваюць:

Да борам, борам, барамі
Ехалі сваты радамі,
А молад Яначка напярод,
А яго брахнечка пасярод.
Стойце, пастойце, сватове!
Чы не зязюлька кукуець?
Чы не салавейка шчабечаць?

Яначка адказваець:
— То не зязюлька кукуець,
Не салавейка шчабечаць;
Гэта маёй Агатцы песні пяюць,
Мне, маладому, ведама даюць.

Для сватняга двара
Да высокая гара.
Не ўзыйці, не ўз'ехаць,
Сакалом не ўзляцець.
Што даці, то даці,
Тую гару раскапаці,
І ўзыйці, і ўз'ехаць,
Сакалом узляцець,
А Яначку уз'ехаць.

Сват вярхом на кані сустракае поезд маладога, і ўсе ў добрым настроі, з песнямі і музыкай пад'язджаючы да хаты маладой, спяваюць:

Белыя бярозкі,
Да не развівайцеся,
Крутыя дарожкі,
Да не размінайцеся —
Яначка к цесцю едзець.
Ён дзіця разумнае:
Ён мора селязнём плывець,
Ён поле сакалом ляціць,
У вароцях расой падзець,
На дварэ князем станець,
За сталом госцем сядзець.
Частуйце ж, частуйце
Небывалага госця,
Свайго любага зяця.

Калі ўжо спыняцца на падворку, спяваюць:

Ай, Божа ж мой, Божа, мы борам ехалі,
Ветры не веялі, бары не шумелі,
Прыехалі к свату, так дзеўкі запаялі,
Як сучкі забрахалі:
— Чы на гэта сват запрасіў,
Каб сельскімі сучкамі напусціў;
Вазьмі, сваток, памяло,
Да гані сучак за сяло;
Альбо вазьмі й добры лут (лыка)
Да гані сучак у цёмны кут.
— Да дзевачкі мае,
Не лайце мяне,
Да прыдзеце ж і вы к нам,
Будзе ж гэта і вам.

Хлопцы бадзёра саскокваюць з коней, дзяўчаты — з вазоў. Дружына маладой выходзіць з хаты прывітаць гасцей. Агуль-

ная радасць і весялосць. У хаце ў гэты час рыхтуюцца да нова-га абраду, які называецца садзіць маладую на пасад. Маладая, застаўшыся ў хаце з адной дзяўчынаю, сядзіць на лаве. Яе брат з жытнім пірагом у руках, з конаўкай вады, што завецца ражка, і бярозавай галінкаю — трыма сімваламі сялянскага жыцця — уваходзіць у хату і, сказаўшы «нех бэндзе пахвалёны Езус Хрыстус», спыняецца на парозе, не зачыняючы за сабой дзвярэй. Пасля гэтага маладая бярэ за руку сваю таварышку, накрываецца хусткаю і спявае са слязамі:

А мой брахненька, пашто ўвашоў
Са ржаным пірагом, з дубовай ражкай,
З пшонным півам, з бярозавай розгай?
Ржаны пірог дзеўкам падзялю,
З дубовай ражкай у ягады пайду,
Пшоннае піва пад угол падлію,
З бярозавай розгай на паству паганю.

Брат бярэ маладую за руку і вядзе на пасад. Дзяўчаты спяваюць:

Брат сястру на пасад вядзець,
Шаўком зямельку мяцець,
Сытой паліваець,
З сястрой размаўляець:
— Сястрыца родная,
Да не будзь гордая,
Да не жалей галоўку, да кланяйся:
Мамцы ў ножкі, няхай мамка знаець,
Да аб долю ўгадаець.
— Знаю, дзіцятка, знаю,
Да аб долю не ўгадаю;
Дасць Бог долю, дасць добрую,
Хвала табе, Божа!
А калі якую праклятую,
Ах, моцны мой Божа!..

Брат, стоячы перад парогам хаты, просіць бласлаўлення: «Ёсць тут Бог, бацька і матка, хрышчоныя і радзоныя, суседзі блізкія і дальнія, мужы статэчныя і бабкі запечныя і дзеткі заплечныя — благаславіце маладую панну на пасад пасадзіць». Усе адказваюць: «Бог благаславі». Так просьба благаславіць паўтараецца тройчы. Затым брат вяртаецца ў хату, ставіць на паліцу ражку з вадой, а маладая з сяброўкай, якая яе абдымае (абедзве накрытыя хусткай), становяцца перад парогам і галосяць: «Добры вечар да ў гэту хату! Мужам статэчным, бабкам запечным, дзеткам маленькім; суседы мае, да ідзіцѐ ка мне, на маё вяселле». Пры гэтых словах маладая падае ў ногі бацьку і мацеры і просіць у іх благаславення:

«Матачка мая! Благаславі мяне на пасад сесці, на Божае месца, пад высшым акном, пад Божым крылом, гдзе Бог расказаў, гдзе люд разгадаў». Пасля гэтага з той жа просьбай яна абходзіць па чарзе ўсіх родных, абдымаючы іх і плачучы. Дзяўчаты ў гэты час спяваюць:

Ходзіць, паходзіць зязюлька
Па шчырым барочку,
Садзіць, пасадзіць дзетачак сваіх
На белым паучыне,
Пакуль прыляціць салавей з лугу;
Ён вас разгоніць і мяне з сабой возьмець.
Ходзіць, паходзіць маладая дзевачка
На новым ганку,
Садзіць, пасадзіць сваіх дзевачак
На белых лаўках,
Пакуль прыедзець Яначка з дружынкай;
Ён вас разгоніць, ён вас разгоніць,
А мяне з сабой возьмець.

На лаве за сталом насупраць печы кладуць кажух; брат, узяўшы маладую за стан і тройчы перакруціўшыся з ёю, садзіць яе на кажух. Цяпер чакаюць сватоў. Дзяўчаты спяваюць:

Што то за зара
У таткі на дварэ?
Дзевачка з цяплом ходзіць,
Дзевачак пабуджаець:
— Устаньце, дзевачкі,
Бярыце шчотачкі,
Чашыце галовачкі;
Ужэ мая ўчасана,
Касніком упляцёна,
Ужо ж мае прыехалі,
Ужо ж маю развіюць коску,
Мамчыну разліюць слёзку.

Сваты застаюцца на вуліцы, дружкі з жытнім пірагом падыходзяць да парога хаты і гавораць: «Добры вечар, панесваце, і той свяцонай хаце, таму міру хрышчонаму. Прыслаў сват да свата, сваця да сваці, малады князь да маладой князі; ёсць тут панна заручона, каб нам была выдадзёна; чы чулі?» З хаты адказваюць: «Не чулі!» Гэта ж самае дружка паўтарае тры разы, пакуль не скажуць: «Чулі». Тады дружка ў вывернутым кажусе, падпярэзаны цераз плячо бізуном, уваходзіць у хату, кладзе адзін пірог высока на слупе ля печы, які называецца стаўпец, другі на стале насупраць печы для дзяўчат, кладзе таксама тры грошы. Калі дружка, наблізіўшыся да печы, кладзе пірог, дзяўчаты спяваюць:

Улез дружка ў хату, на печ зазіраець:
Чы вялік гаршчок кашы, чы паядаюць нашы?
Адзін кажаць мала, другі кажаць годзе,
Трэці кажа: маўчы, бо загадаюць таўчы.

Дружкі хочуць забраць маладую, але дзяўчаты не аддаюць, скідваючы са стала дружкаў траяк. Пры гэтым яны спяваюць:

Бяры сабе гэта,
Купі сабе мыла,
Каб цябе жонка любіла,
Каб дзеці пазналі
І бацькам назвалі.

Пачынаецца «торг», спрэчка. Дружка просіць дзяўчат, каб яны ўзялі тыя тры грошы і аддалі яму маладую. Нарэшце, кладзе яшчэ трохі грошай і хоча ўзяць нарачоную, але дзяўчаты не аддаюць яе. Адна, залезшы пад лаву, трымае яе за ногі, другая — за рукі, каб як мага цяжэй было ўзяць і тройчы перакруціць маладую. Пры гэтым дзяўчаты пяюць:

Верабей, дружко, верабей,
Па суметніку паскакаў,
Нагой шэлег выкапаў,
Сваю дзеўку выкупляў.

Тут дружка адпіхвае дзяўчат убок, паварочвае тры разы маладую. Яна пры гэтым, плачучы, спявае:

Дружко! Дружко!
Не варочай мяне,
Я не калода табе.
Каб я калода,
У бару б ляжала,
Каб я бяроза,
На мяжы б стаяла.

Наступае яшчэ адзін вясёлы момант. Дзяўчаты са смехам і жартамі абвязваюць дружку ручнікамі. Потым п'юць гарэлку, закусваюць і спяваюць:

Звязалі дружка, звязалі,
Гдзе ж яго паймалі?
Запіўся дружко, запіўся!
І на дружыну забыўся.
А гдзе ж твая дружына?
Чы у полі пад шатром,
Пад беленькім палатном?

Дружкі жана дасужа была,
Сем год кросна ткала,
Сем нядзель фартух шыла,
Да абеду знасіла,
На парозе згубіла.

Не зважаючы на гэтыя прыпеўкі і вострыя жарты, дружкі спакойна п'юць і закусваюць, толькі часам кідаюць надакучлівым спявачкам: «Брашыце, брашыце!» Або вымаюць з кішэні і даюць ім кавалкі сыру і аладак — каб толькі яны замаўчалі. Але гэта не памагае. Абуяныя бясконцай весялосцю, нявіннай бяздумнай гарэзлівасцю, дзяўчаты бесперапынку скачуць вакол дружкаў, б'юць у ладкі, часам скубянуць якога хлопца за валасы, прыпяваючы: «У нашаго дружкі голым-гола галава» і г. д. Астатнія госці застаюцца на вуліцы, чакаючы дружкаў, якія, пад'еўшы і перахрысціўшыся, ускокваюць на лаву, б'юць тры разы бізуном па сцяне, нібы запісваючы кватэру на тых, хто на вуліцы, і выходзяць. Дзяўчаты, гледзячы ў акно, спяваюць (сваты стаяць):

Сваты борам едуць і іграюць,
Нашая дзевачка не даець веры — не плачаць.
Ужо сваты полем едуць і іграюць,
Нашая дзевачка не даець веры — не плачаць.
Ужо сваты сялом едуць і іграюць,
Наша дзевачка не даець веры — не плачаць.
Ужо сваты на двор едуць і іграюць,
А наша дзевачка не даець веры — не плачаць.
Ужо сваты за стол ідуць і іграюць,
Наша дзевачка не даець веры — не плачаць.
Ужо сваты за стол ідуць, за ручку бяруць;
Тагды дала веры наша Агатка і плачаць.

Прыехалі сваты на двор,
Пусцілі стралу ў акно.
— Страла мая, страла,
Па што ты прышла?
Чы па мёд, чы па гарэлку,
Чы па красную дзеўку?
— Не па мёд, не па гарэлку,
Але па красную дзеўку.

Наступае момант прыёму маладога. Усе на чале з нарачоным тоўпяцца на дварэ перад хатай. Сваты выносяць з хаты стол, ставяць перад парогам, маці ж маладой у вывернутым кажусе з хлебам-соллю і гарэлкай выходзіць сустракаць маладога. Падыходзяць госці з аднаго і другога бакоў, матка з чаркай у руцэ так вітае будучага зяця: «Зяценька! П'ю да цябе поўным кубкам, добрым здароўем, што мыслю сабе, то і табе». І падае чарку. Малады вылівае яе цераз галаву. Матка зноў гаворыць тое ж самае і зноў падае чарку. Малады зноў вылі-

вае яе. За трэцім разам ён, нарэшце, прымае кубак і, дакрануўшыся да яго губамі, укідае дзесяць ці дваццаць грошаў, пасля чаго аддае матцы, якая выпівае гарэлку да дна і забірае грошы.

Хросныя бацькі ў гэты час тройчы ўздымаюць уверх абгорнутыя абрусамі каравaі маладога і маладой, прыгаворваючы: «Мой вышшы! Мой вышшы!» Гэта называецца мянянне караваяў. Потым каравaі кладуць на стол адзін на адзін — прытым дзявочы знізу, а хлопцаў наверсе — і нясуць у клець. Вяселле пасля гэтага раздзяляецца: жанчыны ўваходзяць у хату, мужчыны застаюцца на дварэ, свахі пры гэтым спяваюць:

У грознага цесця
Стаіць зяць за варотамі,
Сняжком перапаўшы,
Дажджом перамокшы;
Крыйся, зяцю, кунамі,
Бабрамі, чорнымі сабалямі.

Ужо ж мы пазяблі
У доўгай дарозе,
На тугім марозе.
Нашыя зубкі сакочуць,
У хатачку хочуць,
Нашыя конікі гагочуць,
У стаенку хочуць.

Цешча зяця ждала,
Кунамі двор слала,
Кунамі, бабрамі,
Чорнымі сабалямі.
Каб жа мая змога,
Выслала б я і многа.
Пышна цешча, пышна,
Да к зяцю не вышла.
Чы ў яе кажуха нет?
Чы ў яе кубка нет,
Чым зяця вітаць?

Нарэшце, прымаюць стол і просяць сватоў у хату. Ідучы яны спяваюць:

Зціха, баяры, ідзіце,
Харом не вярніце.
Харомы ўсё новыя,
Столікі цясовыя,
Абрусы двайчастыя,
Мы госці не частыя.

Наляцелі гусі
Да з Беленькай Русі,

Селі, палі на крыніцу,
Сталі яны ваду піць.
Наехалі госці
Да з чужой валосці,
Селі яны за сталом,
Сталі яны мёд, віно піць
Да кубкамі аб стол біць.

Дзяўчаты спяваюць, дамагаючыся ад свах гасцінцаў. Песня датычыцца ўсёй дружыны і маладога:

У нашай цесценкі
Пірагі з кішэні коцюцца;
А нам жа іх хочацца.
Ёй даваць маркотна,
А нам браць ахотна;
Яна даець плачучы,
А мы бяром скачучы.

Хочуць гасцінцаў усе. Удзячнасць сваю за гасцінец выказваюць песнямі, танцамі, пляскáннем у далоні і агульнай весялосцю.

Перад тым як пачнецца частаванне гасцей, свахі спяваюць:

Дзьмецца свацця, дзьмецца,
К нам не хінецца,
Каля прыпечку трэцца;
Чы мы ей не любы,
Чы мы ей не мілы?
Мы госці зазваныя,
Любыя, каханыя.

Нарэшце падаюць гасцям гарэлку, міску капусты і надзяляюць іх падарункамі — палатном, паясамі. Мужчыны і свахі пяюць:

Казалі нам людзі,
Што наша Агатка
Не ткаха,
Не праха.
Аж наша Агатка
І тонка прала,
І звонка ткала,
І бела бяліла,
І ўсіх сватоў дзяліла.

Песня дзяўчат:

Яліначка зіму і лета зелена,
Наша Агатка не штодзень весела.
У суботу касу часала,

Слёзкі разлівала,
У нядзелю рана да шлюбу ехала.
У нядзелечку параненечку
Агатка сенцы мяцець,
Венічкам махнець,
Жаласна плачаць.
У яе мамачка пытаець:
— Чаго, мая дачушка любая,
Так жаласна плачаць?
Чы ты жалуеш старасці маёй?
Чы падворыйка майго?
— Мая мамачка, мая родная!
Усяго я жалею: жалею старасці тваёй,
І падворка тваяго, жалею касы русай,
Усяей дзявочай пакрасы.

Песні для сірот:

Хто ў полі паціхусеньку гукаець?
Там Агатка сваёй мамкі шукаець.
Хоць шукаець не шукаець — не знайдзець.
Ой, далёка яе мамачка, далёка,
У сырой зямлі, у жоўтым пяску глыбока.
Да зрабілі добрыя людзі вечны дом,
Без дзвярэй, без аконачка, без слонца,
Не прамоўлю, дзіцятка, ні слоўца.
Чые то слёзкі з гор каціліся?
Агатчыныя слёзкі з гор каціліся,
Пяскі разрывалі,
Мамачкі даставалі.
Далёка мамачка, за трыма замочкамі:
Першы замочак — сасновы церамочак;
Другі замочак — жоўты пясочак;
Трэці замочак — дошкі сасновыя,
Сасновыя дошкі ды сціснулі ножкі,
Да сціснулі ножкі — нельга мне крануць;
Сырая зямля грудцы налегла — нельга крануць;
Жоўты пясочак засыпаў вочкі — нельга праглянуць,
Сырое каменне пазабоччу ляжыць — нельга павярнуць.

Дзяўчаты пачынаюць прыбіраць маладую. Яны сыплюць у лубянку жыта, кладуць наверх паленцы і садзяць маладую на вывернуты кажух. Затым дзяўчаты заплятаюць яе косы, прытым моцна, так, каб закоснікам цяжка было іх расплесці, і надзяюць на галаву вянок са стужак.

У Васількі на дварэ стаіць бяроза для плота,
Кала таей бярозы бярэзнічак,
А на таей бярозцы ліcточак,
А на ліcточку расіца.
Аж то не бяроза — да Агатка,
Не бярэзнічак — да дзевачкі,
Аж не ліcточак — а дружачкі,
Аж не расіца — слёзачкі.

304 Маладая ўстае, кланяецца тым, што стаяць каля яе. Пабраўшыся за рукі, усе ідуць за стол.

Агатка за стол ідзець,
Шубачку ў руках нясець.
— Дзевачкі, дружачкі,
Не трыце шубачкі:
Бо не тут яна спраўляна.
Шылі яе краўцы немцы,
Бралі сукно ў Кралёўцы,
У Кралёўцы — у горадзе,
Прыслана мне, моладзе.

Дзяўчаты садзяцца каля маладой, закоснікі — на зэдлі. Падаюць гарэлку і закуску. Кожная з дзяўчат і маладая бяруць па кавалачку хлеба і, памакнуўшы ў соль, хаваюць за шнуроўку.

Ішла Агатка з поля,
Нясла краскі ў прыполе,
Звіла вянок пры столе,
Пакаціла па стале,
Задала жаласці ўсёй сям'і,
Не так сям'і, як татцы і мамцы.
Агатчына мамка ў канцы стала стаіць,
На дзевачак глядзіць.
— Усе дзевачкі як дзевачкі,
Адно маё дзіцятка слёзкамі заліваецца,
Слёзкамі заліваецца, валаскамі уціраецца.
Па чым жа пазнаці калінку ў лузе?
Нізенька сядзіць, беленька цвіце.
Па чым жа пазнаць Агатку у мамкі?
Між дзевак сядзіць, жаласна плачаць.
Да дубу, зязюлька, да дубу,
Час табе, Агатка, да шлюбу.
— Што табе, зязюлька, да таго,
Ёсць у мяне татка для таго.
Благаславіць пайсці — я пайду,
Пасцеліць ручнічок — я стану.
Паставім цэркву на крутым беражку,
На дробнай жарствіцы, каб добра хадзіць,
Пана Бога прасіць:
— Дай жа, Божа, долю,
Шчаслівую гадзіну
Нашаму чалядзіну.

Закоснікі ўскокваюць на лаву, адзін з іх просіць паблаславіць: «Ёсць тут Бог, бацька, матка, хрышчоныя і радзоныя, суседцы блізкія і дальнія,— благаславіце краснай панне касу расплятаць». Закоснік паўтарае сваю просьбу тры разы; расплятаюць касу, якую потым нельга ўжо заплятаць ніколі (дзяўчына пасля запоін не заплятае касу, толькі звязвае валасы стужкай). Дзяўчаты спяваюць:

Благаславіце, людзі,
Блізкія суседзі,
Гэтаму дзіцяці
Да шлюбу стаці.

Дзяўчаты ідуць за стол, маладая нізка схіляецца перад кутам, дзе ёсць абраз, і, плачучы, спявае:

Таткаў куточак,
Божы дамочак,
Благаславі да шлюбу ступіць!
Калі ты благаславіш,
Сам Бог благаславіць.

Сірата дадае:

Мяне маладу,
Мяне сірату.

Дзяўчаты спяваюць:

Скочыла Агатка з лаўкі далоўкі,
Скланілася мамцы нізка ў ножкі,
Коркамі зямельку парыла,
Слёзкамі ножкі памыла.

Маладая падае да ног бацькі і маткі, абхоплівае іх і, усхліпваючы, просіць:

Да мой татачка! Благаславі мяне да шлюбу ступіць,
Калі благаславіш — сам Бог благаславіць.

Дзяўчаты спяваюць:

Карыся, Агатка, старому,
Кланяйся і малому;
З паклону галоўка не баліць,
Стары і малы благаславіць.

Маладая абходзіць усю сваю і жаніхову радню, абдымае ўсіх па чарзе і з плачам просіць бласлаўіць. Хлопцы тым часам садзяцца на коней, старэйшыя мужчыны, а таксама жанчыны — на вазы. Закоснікі едуць папярадзе, маладая — з дзяўчатамі (бальшанкамі) за імі.

Закладайце сянца,
Паедзем да вянца,
Да нет ксяндза дома,
Паехаў да Львова:
Ключыкі купляць,

Цэркаўку адчыняць,
Двое дзетак вянчаць.
Дзеткі не адналеткі,
Не аднаго айца:
Первае радзонае,
Другое судзонае.
Яначка радзоны,
Агатка судзоная
Яначку аддадзёна.

Маладая, сеўшы, кланяецца на ўсе бакі. Калі маладым выпадзе ехаць каля млына, мельнік застаўляе застаўкі. Маладая дае мельніку пояс, каб той ізноў пусціў ваду,— інакш ехаць далей нельга. Такі існуе забабон.

Ехала Агатка да вянца,
Сыпала золата з рукаўца.
Хто гэта золата пабярэць,
Той мяне на вянец павядзець.
Пабярэць золата меншы брат,
Павядзець на вянец большы сват.

Прыехаўшы да царквы браць шлюб, маладая павінна кожнаму, хто там стаіць, пакланіцца. У царкве яна становіцца з дзяўчатамі ля сцяны. Малады і дружка ідуць па маладую; дзяўчаты не аддаюць яе, пакуль яны ім не паклоняцца. Некаторыя не хочуць кланяцца і адбіраюць маладую сілай. Малады вядзе маладую за руку з левага боку і ставіць на разасланы ручнік; сваячка маладой, паслаўшы ручнік, павінна даць дзяку пояс.

У час вянчання ўсе звяртаюць увагу на тое, як гараць свечкі. Па яркасці гарэння мяркуюць аб шчаслівай будучыні. Калі, барані Божа, свечка патухне, то гэта, на іх думку, азначае няшчасце.

Выйшаўшы з касцёла або з царквы, дружкі спяваюць:

Мы былі ў касцеле,
Стаялі пры сцяне,
Маліліся Богу і Духу Святому.
Наш ксёндз маладзенькі,
Да вусок залаценькі,
Бародка шаўкова,
Галоўка кудрава,
На ём чырвоныя квецці,
Звязаў нашыя дзеці.
Дзеткі не адналеткі,
Не аднаго айца, маткі:
Первае радзонае,
Другое судзонае,
Яначка радзоны,
Агатка судзона.

З касцёла заходзяць у клябаню. Малады павінен мець кварту гарэлкі і пірог. Ксёндз, запісаўшы маладых у касцельную кнігу, частуецца гарэлкай. Затым усе едуць да маладой.

З гары, з гары, з далі
Беглі конікі чатыры,
Вязлі карэтаю сіняю,
Звязалі Агатку сільна.
Да не дарма яе звязалі,
Звязалі за грошы.
— І харош, і прыгож, і вялік,
Чаму не прывёз чаравік?
— Як жа я маю вазіць,
Калі яна не ўмее насіць.
— Хоць чырвоныя прывязі,
Буду насіць па гразі.
Зажыгай, мамка, свечку
Да выходзь на сустрэчку,
Да выходзь, мамачка, процію нас,
Да вітай кубачкам усіх нас,
Да пытайся ў дачкі, чы твая?
— Не твая, мамачка, не твая,
Да таго пана, караля,
З кім я на шлюбе стаяла,
За белую ручку дзяржала,
Залаты персцень мяняла.

Маладога з дружынаю саджаюць за стол, на куце, а маладую з яе таварышкамі — насупраць печы. Падаюць гарэлку і закуску.

Па бару, па верасу раёвыя пшчолкі,
Да ў Васілька на куце шлюбовыя госці,
Да п'юць яны зялёнае віно, мёдам запіваюць.
Хвала ж табе, Божа,
Што на нашым стала,
Што мы раненька ўсталі,
Ксяндза ашукалі,
Да не дорага аддалі:
За сваю паненку
Цэлую капейку.
А за таго маладога
Паўзалатога.

Усе ідуць танцаваць. Забавам няма канца. Пад вечар дружына збіраецца за сталом. Падаюць гарэлку і закуску. Маладых частуюць асобна ў істопцы, куды ім прыносяць на патэльні яечню, якую яны павінны есці адной лыжкай — каб і ў далейшым жыцці ўсё ў іх дзялілася напалам. Дружыну маладога кормяць два разы. Пасля таго як маладыя пад'ядуць у істопцы, яны ідуць у хату. Малады далучаецца да сваёй дру-

жыны за сталом, а маладая садзіцца на калені мацеры, якая сядзіць насупраць печы. Плачучы, маладая спявае:

Мая мамачка,
Прыступ к столачку,
К майму славечку!
Не сына жэніш,
Не нявестку бярэш,
Мяне, маладзеньку, аддаеш.
Мая мамачка, што ж табе лягчэй:
Чы малую было хаваць?
Чы цяпер з сулоння аддаваць?

Малады зачэрпвае кубкам або чарпаком гарэлку ў ражцы, што стаіць на стале, і гаворыць да маладой: «Агатка, п'ю на цябе поўным кубкам, шчырым сэрцам, добрым здароўем, што мыслю сабе, то і табе!» Малады паўтарае гэта тры разы, за трэцім разам выпівае. Маладая на кожны яго зварот адказвае плачучы: «Чужы, чужаньцін, не пій на мяне, пій сам на сябе, на сваю сястру, што для цябе сядзіць, што з табой гаворыць». Дзяўчаты спяваюць:

Шаўковая нітачка к сцяне льнець,
Агатка з мамкай чолам б'ець.
Дабранач мамцы аддаець:
— Дабранач, мамка, дабранач,
Не той дабранач, што нанач,
Але той дабранач, што на ўвесь век,
Не на адну мяне, але на ўвесь свет,
Не на адну ночку, а на ўвесь век.
Жаль нам, Агатка, на цябе,
Што ты нас гоніш ад сябе.
Чы мы табе косачкі не плялі?
Чы мы табе вяночка не вілі?
Плялі табе косачку ў чатыры рады.
Не будзем плясці ні разу,
Не будзеш у таткі ні года.

Бацька (або брат) бярэ маладую і адводзіць на кут да маладога. Яна, плачучы, спявае:

А мой татачка, за ручку бярэш
Чы за постаць вядзеш?
Калі за постаць — займай шырока,
Паганю далёка.

Сеўшы паміж сястрою і мужам, маладая, не перастаючы плакаць, спявае:

Цяпер я села між шыпшынічку,
Між крапіўкі.

Жыжка крапіўка пажыгаць будзець,
Сухі шыпшынік сушыць будзець.
А мой татачка, аддавай і пытай:
Каб не прапою,
Каб не разбою.
Калі прапою — у карчме прап'ець,
Калі разбою — на дарожцы заб'ець.

Бацька гаворыць маладому:

«Зяцелка! Даю табе дачку не храмую, не сляпую. Даўшы лёну, прасі сарочкі; даўшы жыта, прасі хлеба; даўшы ячменю, прасі круп; а калі таго не паслухаець, вазьмі нітку, навяжы на саломку да дай, дай; а калі таго не паслухаець, вазьмі гуж да дай, дай гужам, каб звала мужам».

Матка маладога падстрыгае маладую, кладзе на галаву тры пасмачкі лёну, прыпальвае накрыж свечкаю валасы, а сястра маладога падстрыгае іх нажнічкамі. Свахі ў гэты час спяваюць:

На сінім азёры сядзела лебедзька,
Крылкамі апусцяся, пер'ейкам асыпяся.
Прыляцеў к ёй лебедзь:
— Белая мая лебедзька,
Узнімі сваё крылле,
Збяры сваё пер'е;
Паляцім з табою, гдзе галубы зляталіся,
Нас з табою спадзяваліся,
Цёплае гняздзечка ўюць,
Беленькай лебедзькі ждуць.
Да за новай скам'ёй сядзела Агатка,
Коскамі апусціўшыся,
Слёзкамі абліўшыся.
Прыехаў Яначка:
— Мілая мая Агатка,
Збяры свае коскі
Да ўтры й жа дробныя слёзкі;
Паедзем з табою да свайго дому.
У нас госці з'язджаліся,
Нас з табой спадзяваліся;
Белае ложа слалі,
Зёлкі ў галоўкі клалі,
Нас маладзенькіх ждалі.

Дзяўчаты:

Матка дачку прапіла,
Машну грошы набіла,
Воласам зашыла,
Голасам завыла.
Прапіла матка дачку,
На салодкім мядку;
Да ўпіўшыся, скачаць,
А выспаўшыся, плачаць.

Тут свахі здымаюць з галавы маладой лён, падбіраюць яе валасы ўгору, завязваюць, закручваюць і прыціскаюць ільняной пасмачкай. Гэты лён, абшыты сукном, яна павінна насіць заўсёды, яго завуць тканкаю. Затым пачынаюць надзяваць ёй чапец або шапачку, якую маладая тры разы скідае з галавы,— раз на печ, другі раз пад лаву:

Нашто мне чапец,
Я кіну на печ.
Нашто мне тканка,
Кіну пад лаўку.

Трэці раз маладая хоча выкінуць яго за акно, але ёй не дазваляюць і «сілаю» абвязваюць яе галаву новай белай наміткаю. Пры гэтым свахі спяваюць:

Хвала ж табе, Божа,
Надзелі Агатцы чапец,
Да не кідай жа яго на печ.
Улажылі Агатцы тканку,
Да не кідай жа пад лаўку.
Чарнец Яначка, чарнец,
Да ўлажыў Агатцы чапец,
Да на чэпчык — намётку,
Прыбраў, як лябёдку.

Дзяўчаты пляскаюць у ладкі, ускокваюць на лаву і стараюцца ўдарыць маладога, пацягаць яго за валасы. Пры гэтым спяваюць:

Бяры, блазняк, бяры
Да ўмей шанаваці,
Як родную маці,
Як вішаньку ў садзе,
Як пшчолачку ў мядзе.
У нас была работніца,
У вас будзець свавольніца;
У нас была — ткала і прала,
У вас будзе папіхайла.
Наша Агатка — сыр наліты,
Ваш Яначка надуты.

Баліць мая галоўка ад вянца,
Не аддавай, мой татачка, за ўдаўца.
Аддай мяне, мой татачка, у сям'ю —
У сям'і ёсць парадачак усяму.
У істопку таўчы, малоць — залоўкі,
А ў крыніцу па вадзіцу — я маладая.
Да мой татачка пакінаўся мною,
Як не любаю, як садавым яблачкам недаспеленькім.
Не бядуй жа ты, сястрыца мая,

Я ж буду недалёка ад цебя.
Будзем у чыстым полі жыта жаць.
І ранняй, і вячорнай зарою
Зойдуцца нашыя галаскі з табою.

Бяруць века дзяжы, кладуць на яго суконную спадніцу; бацька прыносіць цэлую булачку хлеба, крыху солі і гаворыць: «Дару цябе, дзіцятка, хлебам-солей» — і кладзе на хлеб грошы.

На гэта не спадзявайце,
Да рана ўставайце,
Адно другога пабуджайце.

Дзяўчаты спяваюць:

Добрая, Агатка, твая доля,
Што цябе татка дарыць.
Шчасліва будзець гадзіна,
Цябе дарыць уся радзіна.

Дружка з лучынкаю ў руцэ становіцца на ўслон, стукае палкай у столь і кліча ўсіх дарыць маладую, якая, паплакваючы, спявае да бацькі:

Да мой татачка,
Шчыра табе рабіла,
Верна служыла,
Выслужыла хлеба кусочак,
Солі драбочак.

Маладая сядзіць, закрытая новай наміткаю, і не бачыць, хто ёй што дорыць. Дружка абвяшчае: «Агатка, дарыць цябе брат». Дораць грашыма, цялушкаю, авечкаю, свінкаю, палатном, хто чым хоча. Дружка падрабляе голас жывёлы, якую дораць, і выплёскваe крыху гарэлкі ўгору — каб жывёла добра вялася, вось так высока падскоквала. Пры гэтым ён папярэджвае, што трэба абавязкова аддаць маладым абяцаную жывёлу; хто не аддасць, ён жадае, каб тую жывёлу ваўкі з'елі. Маладая, плачучы, дзякуе:

Да мой брахненька,
Дзякую табе за дары вялікія твае.
Калі жыва буду да спамагуся,
Табе адгаджуся;
А калі не табе,
То дзеткам тваім.

З такімі прыкладна словамі звяртаецца яна да ўсіх бліз-

кіх сваякоў, а далёкім кланяецца. Бальшанкі дораць паясамі або палатном.

Пасля дарэння маладая схіляецца перад кутам і галосіць:

Таткаў куточак,
Божы дамочак,
Заставайся здароў,
Жыві багата.

Перад ад'ездам маладая кідаецца ў ногі матцы і развітваецца:

Мая мамачка,
Заставайся здарова,
Жыві багата,
Не забывайся на мяне маладую.
Калі буду жабраваці,
Варотца адчыняйце,
Нанач пушчайце,
Хоць па кусочку хлеба давайце.

Гэтак жа сама маладая развітваецца і з бацькам. Развітваючыся з астатнімі членамі сям'і, яна па чарзе абходзіць іх і абдымае за шыю.

Свахі спяваюць:

Хоць я ночкі не спала,
Я сваю свацьку ашукала.
Сабе нявехну даждала:
Да к сцюдзёнай зіме — плацце праць,
А к краснай вясне — кросны ткаць,
А к ціхаму лету — жыта жаць,
А к цёмнай ночы — на таку малаціць.

Усе садзяцца за стол, а свахі спяваюць:

Да я гаварыла: сакалы лятуць!
Аж мае брахны на коні сядаюць;
Я гаварыла, што месяц усходзіць,
Аж мой татачка па дварэ ходзіць,
Мяне маладую праводзіць.

Наступае час ад'езду маладой пары да бацькоўскага дому. Сустрэча яе і частаванне ўсіх удзельнікаў вяселля з'яўляецца астатнім актам урачыстасці і вясельных абрадаў. Усе папярэднія абрады і песні або адлюстроўвалі вясковае жыццё, працу, гаспадараванне, а таксама непазбежныя ў сямейным жыцці прыкрасці і няшчасці, або выражалі пажаданні долі на будучае і поспехаў. Дзе-нідзе, аднак, прабіваюцца ў песнях

адвечныя звычаі, характэрныя толькі для часоў язычніцтва. Як і ва ўсіх іншых народаў, у нашым простанароддзі дзявочая цнатлівасць, акружаная якімсьці рэлігійным арэолам, з'яўляецца сімвалам дабрачыннасці і шчасця для таго дому, у які ідзе маладая, а таксама доказам пачцівасці яе бацькоў, што здолелі належным чынам выхаваць сваю дачку. Даўней нашы земляробы жадалі мець гэтыя доказы. Маладая, якая паддалася слабасці, траціць павагу, просіць, прыніжаная, прабачэння. Уся ўрачыстасць сапсавана, і не ўсе цяпер абрады выконваюцца. Цнатлівая нявеста, наадварот, яшчэ больш ганарыцца сабой, яна прыносіць у дом радасць, весялосць і надзею, становіцца прадметам усеагульнай пашаны.

На воз, на якім маладая пара павінна ад'язджаць дадому, кладуць падушку і белую кашулю, загорнутыя ў прасціну і завязаныя поясам. (Пояс гэты застаецца дзяўчыне, якая па прыездзе здымае пасцель з воза і адносіць яе ў лазню або ў асець.) Маладая садзіцца з мужам і, паплакваючы, спявае:

Таткава ніўка, да не ўлякайся:
Радзіла пры мне, радзі і без мяне.
Добрая доля, да ідзі за мной,
З печы пламянём,
З хаты каміном.

За возам едуць два закоснікі, а таксама свахі. Пад'ехаўшы да дому маладога, свахі спяваюць:

Звонка дзерава каліна,
Да борам ішла — шумела,
А полем ішла — звінела,
А к двару ішла — гаварыла:
— Адчыні, мамачка, новы двор,
Вязём нявехну, як явор;
Адчыні, мамачка, аконца,
Вязём нявехну, як слонца;
Адчыні, мамачка, вяршочак,
Вязём нявехну з каршошак;
Адчыні, мамачка, хіжа,
Вязём нявехну грызе.

Калі маладыя едуць праз сяло, хлопцы запальваюць пасярод вуліцы куль саломы. Каб яны патушылі агонь і прапусцілі вяселле, ім даюць пояс. Пад'ехаўшы да самага дому, вяселле спыняецца перад дзвярамі і чакае, пакуль не выйдзе з векам ад дзяжы матка. Маладая нізка кланяецца ёй і, схіліўшыся, стаіць пакорна, пакуль матка, крануўшы векам галаву нявесткі, не скончыць наступнай прамовы: «Свякроў нявехну навучаець да ў лоб векам лучаець: не хадзі, нявехна, па сялу,

не судзі, аб маю сям'ю, ні ранняго абеду, ні познай вячэры». Пасля гэтага маладая кладзе на века пірог, загорнуты ў палатно. Малады, падаўшы руку, праводзіць яе ў хату. Увайшоўшы, маладая кідае на печ пояс. Свахі пачынаюць спяваць:

Мілыя мае сватове,
Чы добра было ў дарозе?
Чы белыя былі тарэлкі?
Чы давалі вам гарэлкі?
— Да добра было ў дарозе,
Да белыя былі тарэлкі,
Да давалі нам гарэлкі.

Прыезджых садзяць за стол і частуюць; усім, хто ёсць у доме, даюць гарэлкі. Маладым жа, калі маладая аказалася цнатлівай, падаюць па лусце хлеба з мёдам. Жанчына, якая падала гэты хлеб і прымусіла маладых есці яго, адбягаючы, спявае: «Пятух курку маніць, на курасаднік садзіць, даець мёду есці». Сястра маладога ў гэты час выносіць пасцель у лазню або ў асець, сцеле яе, на парозе пры выхадзе рассцілае кажух і чакае маладых. Першая пераходзіць кажух маладая, за ёю малады. Пасля гэтага сястра маладога дапамагае маладой распрануцца, складвае скінутае адзенне, падае ёй чыстую кашулю і выходзіць. Праз нейкі час малады пакідае маладую адну, сам выходзіць і пасылае да яе сястру. Маладая апранаецца, зноў надзявае вясельную кашулю, а тую, што была на ёй, аддае сястры маладога, якая бяжыць з той кашуляй у хату, скачучы, пляскаючы ў далоні і спяваючы:

Добрыя нашыя марозы,
Не змарозілі нам рожы.
Пакраса наша Агатка!
Да пакрасіла два двары:
Адзін дварок, гдзе расла,
А другі, гдзе прыйшла.
Гуляйце, прыданкі, у Агатцы каханай,
Да вялела нам маці
Харашэнька гуляці,
Слаўку ўчыніць
Да лаўку паламіць.
Да ў гародзе ячмень,
Ён золатам зацвіў,
Лепша таго злота
Агатчына цнота;
Калі наша Агатка швачка была,
Вышыла кашулю з падала... і г. д.

Прыбывае маладая, усім кланяецца. Затым бацькі праводзяць маладых у клець, частуюць іх салодкай гарэлкай і закускамі і падаюць яечню, якую маладыя ядуць адной лыжкай.

Малады неўзабаве ідзе па прыданых і выязджае з імі да маткі сваёй жонкі з гэтай жа кашуляй, у якую павінна быць увязана жменя жыта і дзесяць або пятнаццаць грошай. Зяця, што прыбыў з братам, прымаюць як найлепш: садзяць за стол, частуюць усім найлепшым. Маладому кладуць за пазуху сыр, загорнуты ў куплёную хустку, а брату — рукавы. Запрашаюць родных, прыданых і іншую моладзь. Радасць ахоплівае ўсіх.

Учора з вячора
Перапёлка зляцела.
Мы сягодня светам
Перапёлчыным следам;
Гдзе мы яе ўследуем,
Там мы заначуем:
Там жа нам добра будзець,
Конікам аброк будзець.

Усе з музыкай адпраўляюцца ў дом маладога і па дарозе спяваюць:

Да ў чыстым полю прыданыя блудзілі,
Негдзе яны дарожку згубілі
Да спаткалі маленькага хлапчынку:
— Такі-сякі маленькі хлапчына,
Укажы нам дарожку у сяло,
Куды нашая сястра вязёна.
Тая ўся дарожка мураўкай утрасёна,
Будзець нашая галовачка вясёла.

На двор маладога ўязджаюць з музыкаю і песнямі:

Прыданыя на двор едуць,
Куркі пад клець бягуць:
Не бойцеся, куркі!
Нямнога ж вас нада:
Сем на вячэру,
А осьмую на пячэнь,
Дзевятая на сняданне,
Дзесятая на ад'язджанне.

Маладая выходзіць з хаты сустракаць гасцей, усім кланяецца. У гэты час кубел з хатнім скарбам і бялізнаю ўносяць у клець. Таму, хто яго прывёз, малады дае столькі грошай, колькі на кубле абручоў. Уваходзяць у хату, садзяцца за стол і спяваюць:

Зціха, баяры, хадзіце,
Хорам не вярніце і г. д.

П'юць гарэлку, закусваюць.

Далі нам есць і піць,
Дайце пагуляць.
Дайце нам волю,
Пусціце ў камору,
Хаця б мы паглядзелі,
Гдзе нашу сястру дзелі,
Паглядзець на калінку,
Падняць пярынку
Чы харашо развілася,
Па кашулі разлілася.

Прыданкі выводзяць маладую ў сенцы, каб завязаць ёй там на галаву хустку або намітку — у хаце гэтага рабіць нельга, бо ў ёй столь, на якой ляжыць пясок. Цяжарная жанчына ў гэтым абрадзе не павінна ўдзельнічаць — лічыцца, што праз гэта маладая цэлы год будзе драмаць. Маладым падаюць ваду — яны павінны разам памыцца ёю. Таму, хто прынёс ваду, маладая дорыць пояс, маладому ж дае белую чыстую кашулю. Затым яна садзіцца на лубцы, таварышкі завязваюць ёй хустку, накрываюць новай наміткай і спяваюць*:

Пасярод хаты стаіць печ,
Не умела Агатка печ перапеч.
Нечага на яе дзіваваць,
Бо нядаўна стала жанаваць:
Учора была дзявою,
А сягоння жаною.
Як мы захацелі,
Так мы нарадзілі:
З жыта палавіцу,
З дзеўкі маладзіцу.

Маладая пара з прыданкамі ідзе з сянец у хату і садзіцца. Перад імі за сталом ставяць венік, за што маладая дае паясок. Абое робяць выгляд, што бяруць нешта рукамі і ядуць, пры гэтым кожны стараецца вымазаць другому твар. Прыданкі ж спяваюць:

Гдзе ж то свёкар дзеўся?
Знімі пакрывала,
Не сушы сем'яніна,
Свайго чалядзіна.

Бацька маладога, свёкар, узлазіць на лаву, бярэ з галавы маладой намітку, вешае каля абразоў на крук і выганяе маладых з-за стала розгаю з веніка. Маладая імкнецца выскачыць першаю. Калі яна цнатлівая, то пераскоквае праз стол і кла-

* Кажух і сярмяга ў нашых сялян адвечнае ўбранне. Да шлюбу маладая, калі не вельмі горача, апранае сярмягу і кажух.

няецца бацькам, у адваротным жа выпадку абходзіць вакол стала, падае бацькам у ногі, як быццам просячы прабачэння. Усім прысутным дзецям маладая дае па паяску. Потым прыданкі садзяцца есці, а маладую знаёмяць з гаспадаркаю. Усім, хто ёй сустрэнецца, яна павінна даваць паяскі або па тры грошы. Прыданкі спяваюць:

Прыехалі прыданкі з Гданя,
Папрасілі ў Агаткі сняданя.
— Пажджыце, мае сястрыцы, пажджыце,
Пакуль я сваю свякроўку пазнаю,
Тагды і вам сняданя згадаю.
Адчыніце дзверы!
Да няхай вецер веіць:
Пад новыя лаўкі,
Гдзе селі прыданкі.
Здрыгнуліся лаўкі;
А чы так здрыгнуцца,
Як прыданкі пап'юцца!
Гдзе селі — запелі,
Гдзе сталі — заіграл і;
Хто з кім прыткнецца,
То і піва нап'ецца,
Дзіва наглядзіцца.

Пачынаецца рух і сваволя. Госці, скачучы па лавах, стараюцца іх перавярнуць і паламаць; гаспадары, каб не дапусціць гэтага, чым-небудзь падпіраюць лавы. Калі гасцям удаецца іх задума, то яны хваляцца, што ім вельмі добра было — дазволілі нават паламаць лавы! Забавам няма канца: закоснікі ловяць курэй, рэжуць, гатуюць — усё дазваляецца, калі маладая вартая таго. У адваротным выпадку гасцям няма ні такога прыёму, ні свабоды ў забавах, усе сядзяць засмучаныя. Ні скакаць па лавах, ні чапаць курэй у такім выпадку ніяк нельга. Наадварот, закосніку часам надзяваюць на галаву хамут і выганяюць. Інакш кажучы, гулянка бывае сапсавана. Пасля сваволі закоснікі садзяцца за стол. Перад імі ўвесь час стаіць гарэлка і закуска. Скрыпач жа маладога, які сядзіць ля закоснікаў, іграе, часам падпяваючы:

Мілыя закоснікі!
Чаму ж вы не вясёлы?
Чы вашыя конікі не ў злоце?
Чы ваша сястра не ў цноце?
Гэта ж вашыя конікі ў злоце,
Гэта ж вашая сястра ў цноце.

Музыка і танцы працягваюцца доўга. Перад ад'ездам прыданкам даюць есці. Яны, пасадзіўшы з сабой за стол маладую, спяваюць:

Агатка, сястрыца мая!
Стань жа ты ў канцы стала.
Хаця мы нагледзімся,
Пакуль мы раз'едземся.
Агатка, сястрыца мая,
Ужо ж мы дамоў едзем,
Мы цябе научаем:
— Уставай ранюсенька,
Мый лаўкі бялюсенька,
Мяці хату чысцюсенька,
Каб табе не ўпікалі,
Што мы ў цябе гулялі.

Прыданкі ад'язджаюць. Маладая, астаўшыся за сталом, плача. Хто-небудзь з сям'і маладога садзіцца каля яе і суцяшае, як можа.

Перазоў

На гэту апошнюю вясельную бяседу малады запрашае важнейшых і найбольш сталых асоб: хросных бацькоў, дзядзькоў, цётак і г. д. Яны прыносяць з сабой лубянкі, напоўненыя пірагамі, мочанымі макам з мёдам; аладкі ў смятане, смажаніну. Матка ўсё гэта дзеліць паміж сваімі. П'юць гарэлку і спяваюць:

У нас сягодня перазоў,
Сам Бог перайшоў,
З святой тройцай, з прачыстай,
З усімі святымі, з шчасцем і доляй.

Госці гуляюць даволі доўга. Гаспадары прымаюць іх лепей, чым прыданак. Танцуюць мала. Старэйшыя больш за ўсё гавораць пра будучае жыццё маладой пары. Песні паўтараюцца тыя самыя, што спявалі прыданкі.

Вяселле ў вёсцы Пудзіна Навагрудскага раёна

Запіс У. А. Урбановіча

Мая зацікаўленасць беларускай вуснай народнай творчасцю пачалася з захаплення вясельным абрадам. Хаця ў жыцці заходнебеларускага сялянства трыццатых гадоў нямнога было радасці, але вяселле ў нашай вёсцы заўсёды і ў кожнай сям'і праходзіла шумна і весела. Гэта было паважанае і любімае свята не толькі для маладых, але і для іх бацькоў, усіх удзельнікаў і аднавяскоўцаў: гралі музыкі, звінелі песні, гучалі жарты, чуліся віншаванні і пажаданні дабра і шчас-

ця — кожны стараўся, каб вяселле было радасным і прыемным. Усё гэта перапляталася мнагалікімі песнямі і тэатралізаванымі сцэнкамі «Краўцоў», «Цыганоў» і інш.

У аднастайнай манатоннасці сялянскага побыту вяселле станавілася своеасаблівым спектаклем, у якім яскрава праяўляліся таленты спевакоў і танцораў, народная дасціпнасць і гумар, мудрасць і мараль, духоўнае багацце, звычаі і многія іншыя грані народнага характару і жыцця.

Не раз мне прышлося назіраць, як гарэзлівая весялосць і сціпласць параджалі новыя прыпеўкі, жарты, вясёлыя выслоўі. Напрыклад: дорачы маладога — «Дару дугою, каб не хадзіў за (з) другою», «Дару газетаю, каб жыў толькі з гэтаю». Аграному жадалі: «Будзь такі аграном, якому не патрэбна ні маланка, ні гром», трактарысту — «Ары і сей як трэба, каб мы не сядзелі без хлеба», не праміналі нават і старшыню калгаса — «Ты нас, старшынька, не журы, а навядзі парадак на калгасным двары...» У гэтых каламбурах заўсёды высмейвалі нешта адмоўнае, амаральнае ў паводзінах таго, каму яны адрасаваліся, але за гэта ніхто не крыўдаваў на жартаўнікоў, пра гэта хутка забываліся, новыя вяселлі параджалі новыя прыпеўкі і жарты. Часамі ў вядомых вясельных песнях паяўляліся новыя матывы, звязаныя з нейкімі жыццёвымі фактамі маладых.

Апісанае ніжэй вяселле адбывалася ў трыццатыя — сарокавыя гады нашага стагоддзя ў вёсцы Пудзіна Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці.

Кожнае вяселле незалежна ад заможнасці бацькоў маладых і іх веравызнання складалася з наступных трох дзеяў: сваты, вяселле і пярэзвы.

Сваты

Хлопец рашыў жаніцца, і бацькі далі на гэта згоду. Яму прыглянулася дзяўчына: часамі яны сімпатызавалі адно аднаму, часамі кахаліся, але найчасцей дзяўчыну проста пасвацалі, або бацькі захацелі, каб ён з ёй жаніўся. Нярэдка малады з маладою ні разу не сустракаліся, нават не ведалі адно аднаго. Але гэта не мяшала сватаўству. Асноўную ролю іралі чыста меркантыльныя матывы: які ёй (дзяўчыне) даюць пасаг.

Сваты. У аўторак, чацвер або суботу малады са сватам едуць у сваты. Сватам найчасцей бывае хросны бацька маладога, а не то паважаны чалавек з роду жаніха. Здараецца і так, што ў вёсцы ёсць гаваркі і спрытны мужчына, і яго многія запрашаюць за свата.

Сама паездка ў сваты знешне вызначалася тым, што бралі

брычку, зімою — вазок, добрага каня (часта ўсё гэта пазычалі ў суседзяў), шаластуны; сват і малады апраналіся па-святочнаму.

Па прыездзе да дзяўчыны чакалі, пакуль выйдзе гаспадар і запросіць заязджаць на падворак. Разам распрагалі каня, давалі яму аброк, заходзілі ў хату, распраналіся. Пачыналася гутарка на абсалютна пабочныя тэмы. Сват уважліва ўсё ўзважваў, сачыў за настроем гаспадароў. Калі адчуваў, што бацькі дзяўчыны адносяцца прыхільна, добразычліва, тады клаў на стол акрайчык хлеба і ставіў гарэлку. Гэта кульмінацыйны пункт сватаўства: калі бацькі маладой не згодны за гэтага хлопца аддаць замуж сваю дачку — адмаўляюцца піць гарэлку. Сватаўство разбураецца. Калі згодны — маці маладой рыхтуе закуску, прыходзіць па-святочнаму апранутая маладая. У трыццатыя гады найчасцей загадзя пыталіся ў бацькоў дзяўчыны аб згодзе і толькі тады пасылалі сватоў.

Запоіны, або малая гарэлка. І вось сватоў прынялі. За стол садзяцца сваты, бацькі дзяўчыны, маладая і бліжэйшыя іх сваякі. Выпіваюць, пасля некалькіх чарак пачынаецца гутарка пра пасаг. Сват стараецца вытаргаваць як мага больш, бацька маладой, каб даць як мага менш. Здараецца, што бацькі маладой не згадзіліся з патрабаваннямі сватоў. У такім выпадку сватаная плаціць маладому за выпітую гарэлку.

Пярэгляды. Згадзіліся пра пасаг. Праз тыдзень-два маладая з бацькамі і старэйшым братам прыязджаюць да маладога ў пярэгляды: аглядаюць двор, хату, камору, свіран (калі ёсць), хлявы, гумно. Пры гэтым бывала часта многа ашуканства: у хлеў ставілі чужыя каровы, добрыя коні, у свірне насыпалі збожжа на днішча перавернутых бочак, хату ўпрыгожвалі дзяружкамі і не сваімі ручнікамі і г. д. Маладая старанна ўсё аглядала, вывучала, распытвала ў суседзяў аб паводзінах, характары, прывычках будучага мужа. Калі маладой не спадабалася сям'я будучага мужа, яна плаціла за выпітую на запоінах гарэлку, вяселле раскідалася.

Справункі. Калі пярэгляды далі станоўчы вынік, прыблізна праз тыдзень-два малады вязе сваю нявесту і яе маці ў бліжэйшы горад на справункі: маладой абавязкова купляе вэлюм і іншыя падарункі (залежна ад свае заможнасці), купляе гасцінец і яе маці.

Вялікая гарэлка (заручыны). Пасля пярэглядаў у бліжэйшую нядзелю малады са сватам прыязджаюць да маладой; іх сустракаюць, акрамя маладой і яе бацькоў, братоў і сясцёр, бліжэйшыя іх родныя і хросныя бацькі. Малады прывозіць гарэлку, закуску рыхтуе маладая. Канчаткова дага-

ворваюцца аб памеры пасагу і тэрміне вяселля. Часамі толькі пасля заручын едуць па справункі.

Пачынаецца вясельны абрад і розныя варожкі, звязаныя з вясельным абрадам. Маладая насыпае жыта ў тую бутэльку, што выпілі на «малой водцы», абвязвае яе поясам і дае свату. Сват забірае пояс сабе, а бутэльку з жытам вяртае маладой. Прыехаўшы ад шлюбу ў хату маладога, гэтым жытам, перамешаным з цукеркамі і дробнымі манетамі, нявеста пасыпае хату — каб заўсёды вёўся хлеб і грошы, каб жыццё было салодкім. У бліжэйшы час даюць у цэркві на запаведзі, пачынаецца падрыхтоўка да вяселля.

Вяселле

Вяселле пачынаецца адначасова ў маладога і маладой з каравайніка, найчасцей — у суботу.

К а р а в а й н і к. У маладога каравай пячэ яго хросная маці з бацькамі без удзелу суседзяў і моладзі, без пачастунку і якіх-небудзь абрадаў. Заможная хросная робіць гэта дома з усяго свайго.

У маладой у гэты самы час сабраліся сяброўкі, якія будуць на вяселлі дружкамі. Яны прыбіраюць хату, мыюць падлогу, распальваюць печ, месяць цеста на каравай і вясельны хлеб. Калі каравай і хлеб пасадзяць у печ, ніхто моцна не гаворыць, каб каравай не паў на закалец.

Прыходзяць хлопцы. Пачынаецца т. зв. «воўчы вечар» (паходжанне назвы ніхто не растлумачыў). Дзяўчаты і хлопцы рассаджваюцца на лавах кругом сцен, пяюць розныя лірычныя песні (не абрадавыя). Хлопцы прывялі музыканта. Бацька маладой з бутэлькай гарэлкі і маленькім кілішкам абходзіць усіх і частуе, маці ў рэшаце нясе закуску. Пачаставаўшы ўсіх, бацька і маці маладой ідуць танцаваць. Танец кончыўся. Бацька звяртаецца да моладзі:

— Вяселле пачалося. Просім цэлае кампаніі выпіць патроху.

Хто хоча, выпівае яшчэ чарачку, закусвае. Усе танцуюць, пяюць прыпеўкі, часамі ў форме дыялогу паміж хлопцамі і дзяўчатамі:

1. Кукарэку пятушок
Пасярод балота.
Не відзела я мілога,
Увідзець ахвота.

Наша рэчка не шырока,
Я й лучынкай змераю.

Мая міла недалёка,
Я й вечарком збегаю.

Цераз сад-вінаград
Гоніш ты цялята.
Туды сэрца мае рвецца,
Дзе мілага хата.

А ў гародзе на градзе —
Тры каліны мяты.
А хто дзеўку пацалуе,
Той будзе багаты.

А ў гародзе на градзе —
Тры каліны бобу.
А хто дзеўку пацалуе,
Дастане хваробу.

Цераз сад-вінаград
Гоніш ты індыкі.
Туды маё сэрца рвецца,
Дзе граюць музыкі.

На пытанне, ці не было песень, якія спявалі толькі пры пячэнні каравая, старыя людзі адказвалі, што такіх песень было многа, але ў «нямецкую вайну», пасля ў «польскую» было не да караваяў і не да песень. Са смерцю старажылаў уміралі і песні.

У гэты вечар дру́жкі плятуць вянкі (кветкі) сваім заўтрашнім дружбантам. Пры гэтым пяюць песні:

2. Зборная суботка, зборны дзень,
Пазбірала Марылька* ўсіх людзей.
Сама села за стол між іх
Да скланіла галоўку ніжэй усіх,
Да ўраніла слёзаньку драбней усіх.

3. А ў гародзе роў-стаўё, роў-стаўё,
Сястра (брат) сястры (брату) вянкі ўе.
Беленькімі ручкамі, ручкамі,
Пярсцёначкі з вочкамі.

Гучаць тут песні і аб матчынай трывозе і жаласці аб лёсе дачкі:

4. А ў гародзе зялёная рутанька сядзела.
А тую рутаньку маладая Марылька палола.
Яна дый цяжанька заснула.
Прыйшла да яе родна матанька будзіці.
За вялікай жаласцю ня можа збудзіці.
— О, няхай маё родна дзіця падаспіць,

* Імёны ва ўсіх песнях мяняюцца ў залежнасці ад імён маладой і маладога.

О, няхай яно русу коску падрасціць.
Бо як пойдзе ў чужыя людзі — не даспіць,
А яна тады русу коску ўкараціць.

Пасля гадзіны-дзвюх танцаў моладзь расходзіцца. Заўтра — асноўная частка вясельнага абраду.

У маладога. Нядзеля. Раніца. З'ехаліся госці. Малады ў суправаджэнні дружбантаў уваходзіць у хату. Яго бацька бярэ з покуці ікону якога-небудзь святога, сын кленчыць на разасланую сярод хаты дзяружку, а сват, трымаючы ў руцэ запаленую свечку, урачыстым голасам кажа:

— Просім Бога найвышэйшага, святой Тройцы адзінага, бацьку і маці родных, бацьку і маці хросных, браццяў, сёстраў, прыяцеляў і суседзяў просім на благаславенства. Усе адказваюць:

— Няхай Бог благаславіць.

Гэты рытуал паўтараецца тройчы.

Пасля сват свечкаю прыпальвае маладому валасы з чатырох бакоў галавы. Дружына садзіцца за сталы, пачынаецца пачастунак перад ад'ездам да маладой. Гучаць песні:

5. Па саду хаджу,
Ручанькі ламлю
І думкі гадаю:
Ці лісты пісаць,
Ці паслоў паслаць,
Ці самому ехаць?
Лістоў не пішу,
Паслоў не пашлю —
Сам сяду і паеду.

6. Маладзенькі Ясенька
Вядзе каня да Дунаю.
А сам стане на камені,
Дзяржыць каня на рамені.
Быстра вада ножкі мые,
А Ясеньку мыслі бяруць:
Ад караля паслы йдуць,
Ад цесцяткі другія йдуць.
— Ты да караля сам паедзеш,
Да цесцяткі паслы пашлеш.
— Дзіўныя суседзейкі,
Дзіўныя прыяцелейкі,
Я да караля паслы пашлю,
Да цесцяткі сам паеду.

7. З Вільні ручай цячэ,
Там Ясенька мячом сячэ,
Кубачкам віно чэрпае,
Свайго коніка поіць.
А той конік віна не п'е,
А ён яго ў галоўку б'е.
— Ой, панічу-кароліку,

Не бі мяне ў галованьку.
Я табе наравіць буду:
Праз тры тыны пераскочу,
Чацвёртае частаколле
Да цесцяткі на падвор'е.

8. Да еш, Ясенька, да не забаўляйся,
Да ўжо твая патрава пылам запылела,
Да ўжо твая дзяўчына да з другімі села.
— А я тую патраву хустачкай размахаю,
А сваю Марыльку між усіх пазнаю.

Пачастунак закончан, дружына выходзіць з-за сталоў. Іх праводзяць песнямі:

9. Зялёны дубочак, зелянюсенькі,
На явар пахіліўся,
Малады Ясенька ў дарожку залажыўся.
У гародзі зялёны баркун паслаўся,
Ой, малады Ясенька ў дарожку сабраўся.
Сеў за столікам за чусовенькім,
Зялёнага віна напіўся,
Ой, за тым віном
Да ў дарожаньку спазніўся.
— Пачувайцеся, вараныя коні, пад намі,
Да будзем ехаць чатыры мілі барамі,
А пятую мілю — усё жалезнымі мастамі.
Каб маладую на пасадзе засталі.
Ой, пакуль русу касу ўчэша,
Ой, пакуль бела ліцо ўмые,
Такі ж мы яе русу касу распляцем,
Такі ж мы яе дробны слёзкі разальем.

Падаюць коней. Дружына садзіцца на вазы: на першы — малады з сватам і братам, на далейшыя — дружбанты. Коні вымыты, з шаластунамі, пачышчаная збруя, упрыгожаная каляровымі стужкамі. Вясельнікі спяваюць:

10. Канцы мосту каліна,
Там ехала дружына.
Пры дружыні Ясенька малады
Стаў каліну ламаць
Дый шапачку ўбіраць,
Каб яго цешча пазнала,
Маладым зяцем назвала
Дый за стол пасадзіла,
Зялёным віном напаіла.

Бацька маладога выходзіць з хаты. У левай руцэ трымае талерку з хлебам і соллю, у правай — пугу, тры разы абходзіць кругом вазоў і звяртаецца да вясельнікаў:

— Прашу ўсіх дазволіць адправіцца маладым да вянца.

Вясельнікі хорам адказваюць:

— Няхай едуць шчасліва.

Бацька перад першым возам чэрціць пугаўём на дарозе крыж. Малады з дружынаю едуць да маладой.

У м а л а д о й. К поўдню ў маладой сабіраюцца дружкі і госці. Маладая не прыбіраецца, а хаваецца ў каморы — яна павінна першая ўбачыць маладога, каб верхаводзіць у сям'і. І вось малады прыехаў, маладая пабачыла яго. З вазоў ніхто не сходзіць. Вясельнікі спяваюць:

11. Ой, застукацелі вараныя коні на дварэ,
Ой, загрукацелі залатыя кубкі на стале,
Ой, зачула маладая ў каморы,
Ой, пала свайму ойчаньку (матаньцы) ў ногі.
— Ой, не дай, не дай, мой ойчанька, ад сябе,
Перазімую (пералетую) хаця зіманьку ў цябе.
— Ой, як жа, мае дзіцятка, не аддаці,
Да прыехалі тыя госцікі, што ўзяці,
Ой, адны сталі перад парогам, Божа мой!
А другія сталі перад свірнам, Божа мой!
А трэція сталі перад хлявом, Божа мой!
А што перад парогам, то па цябе маладую,
А што перад свірнам, то па скрыню, пярыну,
А што перад хлявом, то па вала, карову.

12. У новай клеці-пераклеці
Дзве вутанькі драчуць.
У новай каморы пад акенцам
Дзве сястрыцы плачуць.
— Ой, пайдзі, сватка, да запытайся,
Да чаго яны плачуць?
— Падаркі рэжуць,
Дружынку вяжуць,
Аб тым яны й плачуць.

13. Па саду хаджу,
Тры рады раджу —
Сам сабе не дараджу.
Ці лісты пісаць,
Ці пасланцы слаць,
Ці самому ехаць.
Усе людзі спяць,
Усе людзі спяць,
А ў мілай агонь гарыць.
Мілая не спіць,
Пад акном сядзіць,
З ветрыкам размаўляе:
— Павей, ветрыку,
Скажы праўданьку:
Дзе мілы бяседуе?
Калі ў дарозе,
Калі ў вялікай —
Прынясі яго, Божа,

Калі з лепшымі
Ды харошымі —
То скарай яго, Божа!

У гэты час бацька маладой (або яе старэйшы брат) сустракае маладога з хлебам і соллю і кажа:

— Прашу ўсю дружыну ў хату. Коней не распрагайце.

Малады прывёз музыкантаў, яны пачынаюць граць. Дружкі ў каморы прыбіраюць маладую. Вясельнікі спяваюць:

14. Сядзела зязюля на тычынцы,
На свае крыльцы глядзела.
Сядзела Марылька, плакала,
На свае ручкі глядзела.
— Ручкі мае да беленькія,
Ці будзеце вы такія,
Ці будзеце вы беленькі,
Як у свае маткі роднай?
Ой, што дзень мылам мыла,
Ой, што нядзелькі вянкі віла.

У хаце кругом трох сцен стаяць сталы, на іх вясельны пачастунак. Перад сталамі супраць уваходных дзвярэй разаслана найпрыгажэйшая дзяружка, паверх яе — снежна-белы абрус, патрушаны жытам (ніколі пшаніцаю). Маці і бацька садзяцца тварам да жыта і дзвярэй. Кругом стаяць дружкі, дружбанты, вясельнікі. Спяваюць:

15. Ляцелі гусанькі цераз сад,
Вядуць, вядуць Марыльку на пасад.
— О, што ж вам, гусанькі, да таго?
Ёсць у мяне ойчанька й матанька для таго.
Яны мне раданьку парадзяць,
Яны мяне на пасад пасадзяць.

16. Да паедзеш, Марылька, Богу маліцца,
Не забудзься, Марылька, ойчаньку скланіцца.
Ойчаньку да ножак, матаньцы да слёзак,
Ой, рана-рана, матаньцы да слёзак.

Калі ў маладой няма маці:

17. Да ляцелі гусанькі цераз сад,
Да клікалі Марыльку на пасад.
— Што ж вам, гусанькі, да таго?
Ёсць у мяне ойчанька для таго.
Ён жа мне і раданьку парадзіць,
Ён жа мяне і на пасад пасадзіць.

18. Ой, пастаньце, баяры, усе ў рад,
Будзе ісці сіротанька на пасад.

Ці вы ёй з дарожкі саступеце,
Ой, вы ёй матаньку ўкажэце.
— Ой, мы ёй з дарожкі ўступім,
Ой, мы ёй матанькі не ўкажам.

Калі ў маладой няма бацькі і маці:

19. Марылін войчанька
Даўно Богу служыць,
На залатым крэсле сядзіць,
На крыжы ручкі дзяржыць,
Пану Богу кланяецца,
Да ў Бога ўпрашваецца:
— Да спусці мяне, Божа,
Да зямлі мыгліцаю.
Да зямлі мыгліцаю,
На падвор'е расіцаю,
На шырокае дробным дожджыкам,
А ў хату ясным сонейкам—
Паглядзець дзіцяці.
Ці хораша яно ўбранае,
Ці ў радочку пасаджанае,
А ці добра навучанае.
Толькі тым не хораша,
Што радзяць суседзейка,
Благаславяць прыяцелейка.
Раду радзяць не хочучы,
Багаславяць не судзячы.
Раду радзіць не ойчанька,
Багаславіць не матанька.

20. Ой, добрыя вы, багатыя суседзі,
Благаславіце вы сіротку, што йдзе.
— Ой, няхай яе Бог багаславіць, і мы будзем,
Ой, няхай ёй долю дае, як людзям.

Музыканты пачынаюць іграць вясельны марш. З каморы пад руку старшы брат вядзе маладую з запаленаю свечкаю ў руцэ. За маладою ідзе сванька (найчасцей яе хросная), дружкі. Воддаль трымаецца малады са сваёю дружынаю, вясельнікі. Маладая кленчыць на абрус тварам да бацькоў. Брат, які вёў яе на пасад, звяртаецца да прысутных:

— Просім Бога найвысшага, святой Тройцы адзінага, бацьку і маці родных, бацьку і маці хросных, брацціяў, сёстраў, прыяцеляў і суседзяў просім на благаславенства.

Усе хорам адказваюць:

— Няхай Бог благаславіць.

Пасля брат паўтарае:

— Так і другі раз. Так і трэці раз.

Вясельнікі даюць той жа адказ. Брат бярэ ў маладой свечку, тройчы абносіць галаву нявесты і прыпальвае валасы з чатырох бакоў. Вясельнікі спяваюць:

21. Ходзіць маладая каля століка,
Як яснае сонейка. *(2 разы)*
Галоўку клоніць,
Зямліцы прыпадае,
Слёзкі праліває.

Гэты абрад канчаецца тым, што маладая кланяецца бацьку, маці, братам, сёстрам і ўсім суседзям. Дзяўчаты ў гэты час хапаюць дзяругу і закідаюць яе на стрэху — каб дзяўчаты ўсе павыходзілі замуж.

Дружына садзіцца за стол. Ад сцяны — дружына маладой, напроціў — маладога: сват проціў сванькі, малады — маладой, дружбанты — дру́жак. Застолле пачынаецца з таго, што сванька свату, маладая маладому, а дружкі дружбантам ушываюць кветкі — звычайна гэта быў цвяток васілька, засушанага бяссмертніка, з кусочкам прыгожага саматканага паяска. У гэты час вясельнікі, якія запаўняюць свабоднае месца ў хаце, спяваюць:

22. Зялёная ружанька, жоўты цвет,
Пыталіся ў Марылькі, ці ўжо свет.
— Ой, ці ты яму вяночка не звіла.
Ой, ці ты яму хустачкі не дала?
— Ой, звіла вяночак я з кветак,
Дала яму хустачку-сурветку.
Ой, звіла вяночак я з атласу,
Дала яму хустачку да носу.

Калі маладая мела кавалера:

23. Ой, цераз мой сад
Да цераз мой двор
Цяцера ляцела.
Ой, не даў мне Бог,
Не судзіў мне Бог,
Каго я хацела.
Ой, з кім я піла,
Хораша жыла,
За таго людзі пойдуць.
З кім не піла, насмяялася,
За таго папалася.

Маладыя выпіваюць (даволі сціпла — члену дружыны сорамна быць п'яным), закусваюць, а астатнія вясельнікі прадаўжаюць спяваць:

24. Звінела камора, звінела,
Маладая Марылька сядзела
Ды тонкія абрусы снавала,
Мыслямі-ўзорамі патыкала.
Прыехаў міленькі ўночы,

Насунуўшы шапачку на вочы.
Да не даў ён абрусаў даткаці,
Да сказаў ён да воза ступаці.
Стала Марылька плакаці.

Калі ў маладой памёр бацька:

25. Ой, хто там ходзіць па цёмным лесе, гукае?
Маладая Марылька свайго ойчанькі шукае.
Сыдзі, сыдзі з высокай гары ў даліну
І там найдзеш свайго ойчанькі магілу.
Да прыпала яна да магілы блізенька,
Да пакланілася яна нізенька.
— Ой, устань, мой ойчанька, борздзенька,
Пакланюся табе нізенька.
Ой, устань, устань, ойчанька, да мяне,
Да парадзь раданьку для мяне.
— Ой, не ўстану, маё дзіцетка, не ўстану —
Засыпаны вочкі жоўтым пясочкам, не згляну,
Звязаны ручкі шаўковым платочкам, не зніму.

Калі ў маладой памерла маці:

26. У чыстым полі яліначка стаяла,
А па магілцы сіротанька хадзіла,
Яна сваю родну матаньку будзіла:
— Устань, устань, мая матанька, не ляжы,
Хаця ты мне гэту ночаньку паслужы.
— Рада б я ўстаці да свайго дзіцяці — не магу:
Сасновыя дошкі сціснулі ножкі — не ўстану...

Жоўты пясочак засыпаў вочкі — не згляну.
Зялёны дзярночак заціснуў грудзі — не дыхну.
Ты ж паглядзі, як ясны месяц высока,
А я ляжу закапана глыбока.
Не свеціць мне ні ясны месяц, ні сонца,
Не прамоўлю, маё дзіцятка, ні слоўца.

Калі ідзе замуж за ўдаўца:

27. Ой, ці табе малайцоў не стала,
Што твае сэрданька да ўдаўца прыпала.
Да ўдаўца сэрца, як зімова сонца,
Хоць яно ясненька, да халодненька.
Дзяцюкова сэрца, як летняе сонца,
Хоць яно хмурненька, да яно цепленька.

Сват паднімаецца — гэта знак, што пара ехаць да вянца. Усе выходзяць з-за сталоў. Маладую садзяць на покуці «на пасад». Старэйшы брат бярэ яе за руку і тры разы абводзіць кругом стала. Кожны раз маладая кланяецца абразам на поку-

ці. Увесь час стаіць, садзіцца нельга — дзяўчаты пасля яе вяселля не будуць выходзіць замуж. Вясельнікі спяваюць:

28. На дварэ зялёны явар паслаўся,
Наш малады ў дарожаньку сабраўся.
Насыпайце аўса ў новае карыта,
Карміце коні ў вялікую дарогу.
А ў той дарозе трої вароты:
Першыя вароты месячык абыдзе,
У другія вароты сонейка сыдзе,
У трэція вароты малады ўедзе.
Месячык абыдзе, то відненька будзе,
Сонейка сыдзе, то цепленька будзе,
Малады ўедзе — мой міленькі будзе.

Брат маладой звяртаецца да вясельнікаў са словамі:
— Прашу ўсіх дазволіць маладым адправіцца да шлюбу.
Усе адказваюць хорам:
— Няхай едуць шчаслівыя.
Гучыць песня:

29. Ой, ойчанька мой родненькі,
Выпраўляй, не забаўляй,
Бо нас там ажыдаюць,
Цэрквачку адмыкаюць,
Алтарыкі засцілаюць,
Нас, маладых, чакаюць.

Але маладую не выпускаюць з-за стала. Яе акружылі хлопцы, якія не ўдзельнічаюць у вяселлі, і патрабуюць у маладога выкупу «за касу». Малады разлічваецца гарэлкаю. Цырымонія ад'езду такая ж, як і ў маладога.

Да шлюбу едуць у наступным парадку: на першым возе — сват, малады з братам, на другім — сванька з маладою і яе братам, за імі — дружбанты з дружкамі. Калі коні рушаць, маладая цягае з воза сена і кідае на дарогу — гэта варажба, каб дзяўчаты хутка выйшлі замуж. Пасля шлюбу парадак мяняецца: на першым возе едзе малады з маладою і сват, на другім — сванька з братамі, далей — дружбанты з дружкамі.

У маладога і маладой вяселле прадаўжаецца. За сталы садзяцца госці старэйшага пакалення, моладзь з бярозак, елачак будуе браму. У маладой да прыезду маладых усе танцуюць (тут засталіся музыкі), у маладога пасля пачастунку госці разыходзяцца. Тут вяселле пачнецца толькі заўтра пасля абеду.

Пасля вянчання кожны дружбант у бліжэйшай краме купляе сваёй дружцы цукеркі як падарунак за кветку.

Пасля прыезду ад шлюбу маладых ізноў сустракае бацька хлебам і соллю і запрашае ў хату. Дружына, прывёўшы сябе

ў парадак, садзіцца за сталы: на покуці сват з сванькаю, каля іх — малады з маладою, браты і дружбанты каля сваіх дружак. Пачынаецца пачастунак. Вясельнікі і аднавяскоўцы стаяць сярод хаты і спяваюць:

30. Нашы пчолкі параіліся,
Дай ім, Божа, сад добры.
Нашы маладыя пажаніліся,
Дай ім, Божа, век доўгі,
Каб яны пілі, елі
Да хораша гаварылі.

31. Маладая Марылька,
Ці была ў Божым доме,
Ці стаяла на каберцы,
Ці трымала Бога ў сэрцы,
Ці мяняла залаты пярсцёначак?
— Дзяўчаткі, мае сёстранькі,
Я была ў Божым доме,
Я стаяла на каберцы,
Мела Бога я ў сэрцы.
Я мяняла залаты пярсцёначак,
Залаты крыж цалавала,
Пану Богу прысягала.

32. Ой, удаленькі да харошанькі Ясенька,
Да ўдалася твая Марылька ўся ў цябе.
— Ой, каб я ведаў, што яна ў мяне ўдалася,
Купіў бы я ёй шоўкаву сукню з атласу,
Справіў бы я ёй кунью шубу з бабрамі,
А яшчэ да таго тулевы чэпак са стужкамі.

33. Дзе была, зязюля?
Дзе быў, салавейка?
Зляцеліся яны ў адзін садочак,
Селі яны на адзін кусточак.
Елі яны малінку з аднае галінкі,
Пілі яны расінку з аднае травінкі.
Дзе быў, Ясенька?
Дзе была, Марылька?
З'ехаліся яны на адно падвор'е,
На адно падвор'е, за адно застолле,
Елі яны патраву з аднае паўміскі,
Пілі яны мёд-віно з аднаго кілішка.

Часамі можна пачуць і смяшлівыя песні:

34. Ой, Марыльчын айцец
Ездзіў на кірмаш,
Выбіраць зяця да даборнага.
Ажно выбраў да нягоднага:
Як стаў пры парозе —
Як пень пры дарозе.

Як стаў ён каля ямкі —
Пацягаў усе дзялянкі.
Стаіць, есць, мармыча,
А свае Марылькі не кліча.

35. А наш сватко мельнічак, мельнічак,
Павёў сваньку ў ельнічак,
Стаў над ёю варажыць,
Як сванечку палажыць.

36. А ў нашага свата лысы лоб,
Будзе добра малаціць боб.
А за рэчкаю гук падае,
Што свата па лысіне моцна б'е.

37. Ой, казалі — дружко вельмі харош,
Ажно ў яго доўгі нос.
Дайце яму коўш канапель,
Няхай клюе, як гарабей.

Сват дае знак, што пара канчаць застолле. Музыкі іграюць марш. Моладзь адпраўляецца на танцы. За сталы садзяцца апошнія госці.

На танцах час ад часу чуюцца прыпеўкі:

38. І капуста мая,
І лісточкі мае.
Дзе мой мілы павернецца,
Там і вочкі мае.

Ах, капуста мая,
Ах, качанейка!
Дзе мой мілы павернецца,
Там каханейка.

Мой хвартух дарагі,
Вышываны берагі.
На калочку павешу,
Усіх хлопцаў пацешу.

А ты, дурню, думаў,
Што цябе я клічу.
Я такому дурню
Пад нос хвігу тычу.

А ў гародзе асака,
Белае карэнне.
Хто дзяўчыну пацалуе,
Дастане збавенне.

Я такіх дуракоў
Верна не любіла.

Я такімі дуракамі
Платы гарадзіла.

Я такіх дуракоў
Верна не кахала.
Я такімі дуракамі
Платы падпірала.

А вы грайце, музыкі,
Мае лапці вялікі,
Бо мне свёкар іх плёў
Ад каляд да пакроў.

Наша вуліца шырока,
Толькі камяніста.
Нашы хлопцы харошы,
Толькі ламашысты.

Наша вуліца шырока,
Толькі жвіравата.
Нашы хлопцы харошы,
Толькі свінаваты.

Голуб сівы, голуб сівы,
Галубка сівейша.
Бацька мілы, матка міла,
Дзяўчына мілейша.

Паступова падходзяць астатнія вясельнікі. Танцы працягваюцца аж да свету. У перапынках гучаць песні:

39. Ой, значны, значны,
Хто жаніцца хоча,
Па начах конік яго рагоча.
Ой, значны, значны,
Хто любіць руску —
Вытаптаў сцежку цераз пятрушку.
Ой, значны, значны,
Хто — каталічку —
Вытаптаў сцежку цераз пшанічку.
Ой, значны, значны,
Хто ажаніўся:
Скурчыўся, знішчыўся і адмяніўся.
— Як я быў хлопцам, дзеўкі любілі,
Як ажаніўся — матцы не мілы.
Як я быў хлопцам — хустка за пасам,
Як ажаніўся — смаркач пад носам.
40. Пара, маці, жыта жаці,
Колас нахіліўся.
Пара сына жаніці,
Бо развалачыўся.
Сядзіць голуб на дубочку,
Галубка — на вішні:
— Скажы, скажы, сыночку,

Хто табе наймільшы?
— Голуб сівы, голуб сівы,
Галубка сівейша.
Бацька мілы, маці міла,
Дзяўчына мілейша.
Я з матуляй пасварыся —
Граху набяруся.
А з дзяўчынаю сыдуся —
Не нагаварыся.

Гэты вечар — самы шумлівы і гарэзлівы момант вяселля ў маладой. Музыка і танцы чаргуюцца з вясёлымі народнымі песнямі, жартамі, віртуознымі танцамі з прыпеўкамі і песнямі асобных танцораў. Весялосць дасягае тут кульмінацыі.

Назаўтра вяселле ў маладой працягваецца. К абеду сват збірае дружыну. Заклікае ўсіх садзіцца за сталы — завідна яны павінны прывезці да маладога вяселле.

За сталом рассаджваюцца ў такім парадку, як і пасля вянчання. Пачынаецца застолле з таго, што маладая абвязвае свата прыгожым ручніком, брата маладога — адрэзам тонкага старанна выбеленага самадзельнага ільнянога палатна. Пасля выпіваюць, закусваюць, раз-два раздаецца вакліч «горка», маладыя «салодзяць». Застолле працягваецца даволі доўга. Увесь час гучаць песні:

41. Новае сяло, новае сяло,
Старыя будаванні.
Мінуцца табе, маладая Марылька,
Дзявочыя жартаванні.
Выйшла Марылька за вароцейка
Да рассыпала карты.
Мінуцца табе, маладая Марылька,
Дзявочыя жарты.
Выйшла Марылька за вароцейка
Да рассыпала гарэшкі.
Мінуцца табе, маладая Марылька,
Дзявочыя смешкі.

42. Ой, бярэш, бярэш, малады Ясенька,
Умей жа й шанаваці.
Яна ў нас была, як ягода,
У цябе будзе, як калода.
Яна ў нас была, як сыр белы,
У цябе будзе, як пень гарэлы.
Яна ў нас была, як ластаўка,
А ў цябе будзе, як засланка.
Яна ў нас была, як павечка,
А ў цябе будзе, як галавешка.

43. Ой, будзе, будзе цёмна ночка пад акном.
Ой, будзе выціраць дробны слёзкі рукавом.

Ой, будзе, будзе суседанька маткай,
Ой, будзе, будзе паветачка хаткай.
Ой, будуць твае гордыя слоўцы
Што дзень прад табою.
Ой, будуць твае сінія вочкі
Што дзень пад слязою.
Ой будуць твае русыя коскі
Што дзень пад нагою.

44. Ой, жаль жа мне, мая матанька, на цябе,
Што застаецца зялёна рута ў цябе.
— З Богам, з Богам, маё дзіцятка, ад мяне,
Забірай жа сваю зялёну руту ад мяне.
— Ой, як жа мне, мая матанька, зялёну руту забраці,
Да я не знаю, дзе зялёну руту саджаці.
Ой, пасадзіла б я зялёну руту ў гародзе,
Ой, не будзе расці зялёна рута на пагодзе.
Ой, пасадзіла б я зялёну руту на мяжэ,
Ой, не будзе расці зялёна рута ў дзерназе.
Ой, пасадзіла б я зялёну руту ў ляску,
Ой, не будзе зялёна рута расці на пяску.

45. Ой, ці не жаль табе, да мой ойчанька, будзе,
Ой, як я ў бары сівыя валы напасу,
Ой, да не ў твае вароцейка паганю.
Чужы ойчанька будзе волікаў упрагаць,
А мой родненькі будзе слёзкі раняць.
Ой, ці не жаль табе, да мой брацейка, будзе,
Як я ў лузе сівага каня напасу,
Ой, да не ў твае вароцейка павяду.
Чужы брацейка будзе коніка сядлаць,
А мой родненькі — слёзкі раняць.
Ой, ці не жаль табе, мая матанька, будзе,
Як я ў лесе чорных ягадкаў набяру,
Да чужой матаньцы чорныя ягадкі прынясу.
Чужая матанька будзе ягадкі прымаць,
А мая родная будзе слёзкі раняць.
Ой, ці не жаль табе, мая сёстранька, будзе,
Ой, як я ў садзе чырвоных кветак набяру
Да чужой сёстраньцы панясу.
Чужая сёстранька будзе кветкі трымаць,
А мая родная — будзе дробныя слёзкі раняць.

46. У зялёным садзе зязюля кукавала.
Ой, там хадзіла Марыльчына маці,
Зязюлю праклінала:
— Бадай, зязюля, бадай, сівая,
Больш не кукавала.
Выкукавала, вышчабятала
З дому дамаўніцу,
З дому дамаўніцу, з поля работніцу.

47. Ой, пасадзіла ж я
Зялёну руту ў гародзе.
Ой, паглядзішся,

Ні такаво табе будзе,
Як у свае матанькі роднай.
У камору не пойдзеш,
Ані хлеба не ўкроіш,
Ані сыра не ўкалупіш.
На парог паступнешся —
Назад аглянешся,
Ці не йдзе свякроўка ліхая,
Што ключыкі пахавала
Пад пухову падушачку,
Пад чуткую галовачку.

Дружына пакідае застолле, рыхтуецца да ад'езду да маладога. На вяселлі застаюцца сват і сванька, малады з маладою і яе брат. Стол, што на покуці, засцілаюць чыстым абрусам, ставяць сурвэткаю засланую талерку і некалькі чарак. На суседнім стале стаяць розныя закускі. На покуць сядаюць сванька і сват, які трымае ў руцэ палку. Побач іх у цэнтры стала садзіцца малады з маладой. Музыканты іграюць марш. Брат маладой, танцуючы, нясе з каморы на ручніку каравай, падняўшы яго над галавой, і ставіць яго ў цэнтры стала, што на покуці, а сам садзіцца побач маладых.

Каравай — гэта раскошны на смак і з выгляду пірог, дыяметрам 40—50, а вышынёю больш 30 сантыметраў, зверху ўпрыгожаны мноствам розных грыбкоў, вавёрачак, пеўнікаў, шышак, пакрытых рознакаляровымі крэмамі.

Пачынаюць дзяліць каравай. Сват устае, канцом палкі стукае ў столь і ўрачыста громкім голасам кажа:

— Просім на падарунак бацьку і маці родную.

Бацькі падходзяць к сталу. Бацька падае сваньцы свой падарунак, калі дорыць грошы, то кладзе іх на талерку, віншуе маладых, а пасля прыкрывае правую руку чыстай насоўкай (тое ж робяць і маладыя), паціскае рукі маладым і цалуецца спачатку з маладой, а пасля з маладым. Брат абдорвае караваем, сват частуе гарэлкай. Маладыя, зразумела, толькі дакранаюцца губамі да чарак, а той, хто дарыў, выпівае, закусвае. І так дораць усе родныя і запрошаныя на вяселле госці. Людзі падходзяць адзін за адным, але сват абавязкова заўсёды аб'яўляе ступень сваенства з маладой таго, хто дорыць.

Жанчыны ў асноўным дораць абрусы, дзяружкі, ручнікі, адрэзы самадзельнага палатна, мужчыны — грошы. Многа смеху і жартаў: дораць гаршкі, міскі, лыжкі, калыску, пялёнкі і інш. рэчы. Але сват і брат разумеюць жарты, прымаюць падарункі, абдорваюць усіх караваем, частуюць гарэлкай. Зазначу, што пры дзяленні караваю гарэлка маладога.

Пакуль дзялілі каравай, сталы прыбралі і накрылі для

«вялікага абеду». Апошні раз дружына садзіцца за сталы ў маладой. Акрамя гарэлкі і закускі пад канец падаюць гарачую страву: спачатку капусту, боршч або сяканку, на другое — макароны (так называлі ў народзе дамашнюю лапшу) або яешню. Асаблівай пашанай карысталася яешня. Калі яе з'ядуць, то на талерку кожны клаў пяць-дзесяць грошай у падарунак паварыхам. У час «вялікага абеду» пяюць многа песень.

48. Ой, пойдзеш, пойдзеш,
Маё дзіцятка,
У чужыя людзі.
Табе там ліха будзе:
Там сцежачкі невядомыя,
Там блудзіць ты будзеш,
Там суседачкі незнаёмыя,
Яны цябе судзіць будуць.
Ты выйдзеш беленькая —
Яны скажуць куслівая.
Ты выйдзеш хмурненькая —
Яны скажуць санлівая.
Ты выйдзеш чорненькая —
Яны скажуць лянівая.

49. Ходзіць галубка па галубятнічку,
Галубок за ёю.
— Пастой, галубка, пастой, сівая,
Пабрукуем з табою.
— Досыць, галубок, досыць, сівенькі,
З табою брукаваці.
Кінулі сеці на мае дзеці,
Не далі паглядзеці.
Ходзіць Марылька па новых сенях,
Ойчанька за ёю.
— Пастой, дзіцятка, пастой, мілое,
Пагаворым з табою.
— Досыць, ойчанька, досыць, родненькі,
З табою гаварыці.
Звіла вяночак з руты, мяты —
Не даў данасіці.

50. Ой, шчабятала сіняя ластаўка,
Над морам лятаючы.
Ой, плакала маладая Марылька,
У каморы седзячы,
Свайму свёкру да кашульку шыючы.
Ой, шыла, шыла, шолкам вышывала.
Ой, дай Божа да добры час-гадзіну,
Каб я свёкратку да кашульку ўгадзіла.
— Ой, не ўгодзіш, мая нявестанька,
Не ўгодзіш.
Пакуль па падвор'ейку паходзіш,
Дзевяцеры ключы паносіш,

А дзесятую думаньку здумаеш,
Тады свёкратку кашулю ўгодзіш.

51. Свякроўка — да не матанька,
Яна рана не пабудзіць.
Выйдзе на вуліцу да абсудзіць:
— Ой, добрая да нявестачка,
Да дабрэнькая,
Спіць у каморы ды да яснага сонейка,
Пятух пяе — не чуе,
Пастух жане — не ўстане.

52. Ой, наглядзішся, мая матанька, без дачкі,
Ой, пазарастаюць да мураўкай ложачкі.
Ой, людзі будуць гускі ў поле ганяць,
А ў мае маткі каля ложачак шчыпаць.
Ой, наглядзішся, мая матанька, без дачкі,
Ой, пазарастаюць пападлавіччу казлячкі.
Ой, людзі будуць у лес па грыбы хадзіць,
А ў мае матанькі пападлавіччу будуць радзіць.

53. — Ой, пойдзеш, Марылька, у чужыя людзі,
Табе там не так будзе.
Там сцежачкі невядомыя,
Там ты блудзіць будзеш.
Там суседачкі незнаёмыя,
З кім ты гаварыць будзеш.
— Я дарожак распытаюся,
Там блудзіць не буду.
Я з суседкамі разазнаюся,
З імі гаварыць буду.
— Ой, пойдзеш, Марылька, у чужыя людзі,
Там табе не так будзе.
Гара высока, вада далёка,
Там табе цяжка будзе.
— Ой, ёсць у мяне міленькі-душа,
Ён мяне пашкадуе.
Гару скапае, ваду дастане —
Усё-такі лягчэй будзе.
Ды работку кіне, вядзерца прыме,
Ён маё сэрца ўніме.
Ён за вядзерца, я за другое,
Пойдзем разам абое.

54. Ой, пойдзеш, маё дзіцятка, ад мяне.
Пры ком мяне старэньку пакінеш?
— Пры Богу, мая матанька, пры людзях.
А як прыедзеш — у мяне ў госціках будзеш.

55. — Ой, хоць вы яе да таўчы, малоць застаўляйце.
Да хоць вы яе часцей у госцікі пускайце.
— Ой, яна ў нас да таўчы, малоць не будзе,
Ой, яна да вас часта ў госцікі не пойдзе.
— Ой, пусцілі, пусцілі да на Каляды адзін раз,
Да прыказалі, каб вярнулася жыва да нас.

Ой, пусцілі, пусцілі да на Вялікдзень другі раз,
Да прыказалі, каб не бавілася ў вас.

Калі ў маладой няма маці:

56. Ой, пахадзі, маладая Марылька, пахадзі,
Па новых сенейках пахадзі,
Сваёй матанькі на белай ложы паглядзі.
— Ой, ні раз, ні два я па сенях прайшла,
Сваёй матанькі на белай ложы не знайшла.
Ой, выходзіла на чорну сцежку, слядамі,
Ой, палівала белу ложу слязамі.

Калі ў маладой няма бацькі:

57. — Ой на дварэ новая студня і вядро.
Чаму, Марылька, твайго войчанькі не відно?
Пайдзі, Марылька, пахадзі па новых сенях,
Свайго войчанькі на белай ложы паглядзі.
— Ой, ні раз, ні два новыя сені перайшла,
Свайго войчанькі на белай ложы не знайшла.
Ой, схадзіла я новыя сені слядамі,
Ой, палівала я белу пасцель слязамі.
Ой, сыдзі да з горачкі ў далінку,
Там увідзіш свайго войчанькі магілку.
Ой, прыдзі, прыдзі да магілачкі блізенька,
Ой, пакланіся свайму войчаньку нізенька.
— Ой, устань да мой войчанька,
Ой, парадзь раданьку для мяне.
— Ой, не ўстану, дзіця маё, не ўстану —
Прыбіты ножкі к сасновай дошкі, не ўстану.
Прысыпаны вочкі жоўтым пясочкам, не ўзгляну.
Ой, збудавалі да мне хатаньку сталяры,
Ой, не пусцілі ні акеначка, ні дзверца.
Ой, не прамовілі майму дзіцяці ні слаўца.

58. Нашы пчолкі параіліся,
Дай, Божа, ім сад добры.
Нашы дзеткі пажаніліся,
Дай, Божа, ім век доўгі.
Ой цераз наш сад,
Цераз вінаград цяцера ляцела,
Ой, не даў мне Бог, не судзіў мне Бог,
Каго я хацела.
Ой, я хацела, ой, я жадала
За вялікага пана.
Ажно ж я пайшла, да мне папала
За нялюбага блазна.
А ў таго блазна чорная лазня,
Я хадзіці не буду.
А таго блазна, а таго блазна
Я любіці не буду.

Апошні пачастунак у маладой закончаны. Дружына сабіраецца ехаць да маладога. Вясельнікі спяваюць:

59. Прасіла Марылька ойчаньку з сабою:
— Паедзь, ойчанька, паедзь, родненькі,
Са мною, маладою.
Ой, будзем ехаць роўнай раўніною.
Не караністай, не камяністай
Роўнай раўніною.

60. Ой, кацілася чорна галка з прыполля,
Ой, прасілася маладая Марылька з застолля:
— Ой, пусці, пусці, мой міленькі, з застолля
Ой, паглядзець свайго ойчанька падвор'е.
— Ой, не пушчу, мая міленькая, з застолля —
Ой, быў у цябе ў суботку вольны дзень,
Было хадзіць па падворайку цэлы дзень.
— Ой, я ў пятніцу русу косу часала,
А ў суботу бела ліцо ўмывала,
А ў нядзелю вас, маладых, дажыдала.

З-за сталоў не выходзяць да таго часу, аж пакуль ад маладога не прыедзе яго хросная з кім-небудзь з яго сваякоў па маладую. Іх частуюць. Гучаць песні:

61. Ехаў малады цераз дзядзінец
Да дарожкі пытаўся.*
Выйшла Марылька
Да горданька адказала.
Ой, будуць твае гордыя слоўцы,
Што дзень пад табою.
Ой, будуць твае белыя плечкі,
Што дзень пад плятнёю.
Ой, будуць твае русыя коскі
Што дзень пад нагою.
Ой, будуць твае сінія вочкі
Што дзень са слязою.
Выйшла Марылька за вароцейка
Да рассыпала гарэшкі.
Мінуцца табе, малада Марылька,
Усе дзявочыя смешкі.
Выйшла Марылька за вароцейка
Да рассыпала вішні.
Мінуцца табе, малада Марылька,
Усе дзявочыя мыслі.
Выйшла Марылька за вароцейка
Да рассыпала карты.
Мінуцца табе, малада Марылька,
Усе дзявочыя жарты.

---

* Кожны другі радок паўтараецца двойчы.

62. Да хадзілі два стрэльчыкі па бары,
Да забілі сівага лося ў ламу.
Як учула яго мамка ў берагу,
Як кінула круты рогі аб дарогу.
— Няхай мае круты рогі прападуць,
Няхай майго сівага лося не б'юць.
Да ездзілі два браткі па полі,
Да згубілі сівага каня падкову.
— Не жаль жа нам сівага каня падковы,
Але жаль жа нам нашай сястрыцы размовы.
Не жаль жа нам сівага каня, што скача,
Да жаль жа нам сястрыцы, што плача.
Не жаль жа нам сівага каня, што гарцуе —
Ні аднаго вернага слоўца не ўчуе.

63. Сванька сваньцы журылася,
Каб маім дзіцём не глумілася,
Каб не стаяла цёмнай ночкай пад акном,
Каб не выціралa дробных слёзак рукавом,
Каб не была ды паветачка хаткай,
Каб не была ды суседачка маткай.

Калі маладыя садзяцца на вазы, спяваюць:

64. Ойчанька да мой родненькі,
Да перайдзі мне дарожаньку.
Да перайдзі мне дарожаньку
Да перанясі шчасце-долю.
— Да мая ж ты дочанька,
Няхай табе Бог пераходзіць.
Няхай табе Бог пераходзіць,
Шчасце-долю пераносіць.

Перад ад'ездам дружбанты з хаты маладой хапаюць, што папала: калаўротак, прасніцу, міскі і г. д. Бацькі і вясельнікі маладой стараюцца не даць. Цырымонія ад'езду такая ж, як і да вянца.

У маладой запрашаюць на апошні пачастунак («вялікі абед») астатніх гасцей. Маці маладой і тыя, каго запрасілі маладыя, едуць «у прыданыя». Яны вязуць куфар з дабром маладой, падушкі, а маці ўзяла з сабою мяса, пірагоў, хлеба, гарэлкі, каб у маладой заўтра арганізаваць для дружыны снеданне.

«Вялікі абед» — гэта канец вяселля ў маладой. Назаўтра ўсе, хто быў запрошаны на вяселле, прыходзяць да бацькі маладой, кожны прыносіць сявеньку жыта, грачыхі ці пшаніцы, у якую ўстаўлена бутэлька гарэлкі, абвітая адною-дзвюма кілбасамі, багацейшыя паложаць яшчэ і аполец сала; прыезджыя — пірагі, кілбасы, гарэлку. У гаспадара неабходна нешта зарэзаць жывое: падсвінка, цяля, а ў беднага — хоць

курыцу. Так госці дзякуюць гаспадару за гасціннасць і частуюць яго. Гэтай заключнай п'янкай, якая часамі цягнецца цэлы дзень, канчаецца вяселле ў маладога і маладой. У народзе называюць гэты звычай «задзяры нагу».

У маладога. На першым возе едзе малады з маладою, якая трымае на каленях абвешаную вышываным ручніком ікону, якою яе благаславілі, садзячы на пасад, на другім — сват і сванька, далей — дружына.

Пры ўездзе на двор маладога з елачак (летам з бярозак) пабудавана брама, застаўлена прыкрытым белым абрусам сталом, на якім стаіць бутэлька вады або квасу, хлеб і соль. Ноччу брама асветлена ліхтарамі. Сват, пасля кароткага торгу, дае гарэлкаю выкуп «будаўнікам». Убіраюць стол, наперадзе малады з маладою, за імі сват з сванькаю, далей дружына накіроўваецца ў хату. Перад уваходам іх сустракае бацька маладога з хлебам і соллю. Гучыць песня:

65. Да свякроў нявесткі
Да жадом жадала,
Па ўсіх гасцінцах
Старажоў стаўляла.
Старажоў стаўляла
Да долі пытала:
— Нявестка мая,
Што за доля твая?
Калі добра доля,
То жыві са мною.
Калі дрэнна доля —
Ідзі за вадою.

Бацька кланяецца маладым і кажа:

— Просім цэлую кампаню ў хату.

Маладыя ўваходзяць у сені, але пераступіць парог нельга — ён закіданы дрывамі. Гэта праверка маладой — ці акуратная з яе будзе гаспадыня. Маладая перадае сваньцы ікону і складае дровы каля сцяны так, каб яны не мяшалі нікому. Пераступіўшы парог, яна абсыпае хату жытам, цукеркамі і медзякамі, некалькі манетак кідае на прыпек. Гэта варажба — каб у хаце заўсёды вёўся хлеб і грошы, каб жылося соладка.

За сталом сядзяць «краўцы», апранутыя неймаверна смешна. Яны спяваюць непрыстойныя песні. Да іх падыходзіць малады са сватам. Ім прапануюць купіць вясельную вопратку: пінжак без рукава або каўняра, штаны з адной калошай і інш. Малады са сватам на жарты адказваюць жартамі і просяць вызваліць сталы — ім трэба накарміць дружыну. Пасля кароткага торгу, атрымаўшы адну-дзве бутэлькі гарэлкі і

крыху цукерак, «краўцы» ўступаюць месца маладым. Часамі маладых сустракаюць «цыганы» з мядзведзем — гэта імправізаваная тэатральная сцэнка, у якой многа смеху, бяскрыўдных жартаў.

Маладыя селі за сталы. Сванька на покуці вешае ікону, якую прывезла маладая, і ўпрыгожвае яе вышываным ручніком. Вясельнікі спяваюць:

66. У зялёным садзе
Зязюля кукавала.
Ой, там хадзіла
Ясенькава матка,
Зязюлю выхваляла:
— Бадай, бадай сівая,
Здарова кукавала.
Выкукавала, вышчабетала
У дом дамаўніцу,
На поле работніцу.

67. Сышоў месячык над ракою,
Звабіў зораньку за сабою.
— Тут жа нам, зоранька, начаваць,
Тут жа мне, месяцу, свет даваць.
Да з'ехаў Ясенька на свой двор
Да прывёз Марыльку з сабой.
— Тут жа вам, конікі, пастаяць,
Тут жа вам, мілыя, век векаваць.

68. Ой, братка сястрыцу ды да дому кліча:
— Паедзем, сястрыца, са мною дадому.
Будзеш, сястрыца, ты ў мяне слугою.
— Ой, не паеду, да мой брацейка, з табою.
Будзе добра сысціся на таргу з табою,
Будзе добра ды павітацца,
Пра сваю матулю ды запытацца.

69. Ой, паедзеш, да мой брацейка, дадому.
Ой, забяры мяне дадому з сабою,
Ой, буду табе я да вернай слугою.
Ой, будзеш ты мяне да рана пабуджаць,
Ой, будзеш ты мяне да работы пасылаць.
Да буду я табе да верна служыць,
Да буду я табе работу рабіць.

Калі ў маладога няма бацькі:

70. Знацьма вяселейку,
Што ў Бога сіротанька,
Знацьма па радзіне,
Што няма палавіны.
Без роднага войчанькі
Трэба ўстаць ды падумаці,
Каб паслаць па войчаньку.

Ой, есць зязюля,
Ой, есць сівая,
Яна рэзвая птушачка.
— Праляці лясок, падзі ў пясок,
Закукуй галосненька.
Малады за ёю з сваёю тугою,
Плачучы жалосненька.
Шчэ малады ў паўдарожанькі —
Зязюля назад ляціць.
— Вярніся, малады.
Міма твайго войчанькі.
Твой войчанька пад трыма замочкамі:
Першы замочак — зялёна дзярно,
Другі замочак — жоўты пясочак,
Трэці замочак — сасновыя дошкі.
Прыбіты ножкі да сасновай дошкі —
Не ўстане.
Засыпаны вочкі жоўтым пясочкам —
Не гляне.

Прыязджаюць прыданыя. Іх сустракае бацька і маці маладога. Забіраць куфар і іншыя пажыткі не дазваляе фурман — ён патрабуе выкуп не гарэлкай, а грашыма. Бацька разлічваецца. Гучыць песня.

71. Паглядзела Марылька
Цераз акно на вулачку,
Ці не едзе яе матанька
З тонкімі падаркамі.
— Ой, дзе ж вы,
Да прыданачкі, блудзілі?
— Ой, мы, прыданачкі,
Да блудзілі ў чыстым полі,
Да дарожку страцілі.
Ой, дзе ўзялося
Да маленькае дзіцянё
Да паказала нам
Дарожку ў сяло:
— Ой, сюды, сюды,
Прыданачкі, да сяла.
Ой, сюды ж
Ваша срэбра-золата везяно.

Калі выйшлі з-за стала, бацька маладога выводзіць маладую ў танец — праверыць, ці не кульгавая, ці спрытная. Закружыўшыся адзін-два разы, кажа:

— Не выдумляйце, людзі, спраўная маладая, спрытна танцуе.

Так жа паступаюць маці, браты, сёстры маладога.

Далей вяселле прадаўжаецца па тым жа сцэнарыі, што і ў маладой. На танцах многа весялосці, дасціпных прыпевак.

72. За што мяне, мужу, б'еш,
За якія ўчынкі?
Ці я табе не напрала
За год тры пачынкі?

Люблю, люблю кавалера,
У якога шапка бела.
Ён не гарэ і не косіць,
А намагір шапку носіць.

На вяселлі была,
Не палуднавала.
Памаленьку скачу,
Бо я есці хачу.
Каб я есці не хацела,
То б я вышэй падляцела.

Я пайду па таку
Да па гладкай зямлі.
Каго верна любіла,
Таго чэрці ўзялі.

Ох ты, міленькі мой,
Я цябе пацешу.
Куплю камень сто пудоў,
На шыю павешу.

Пайду я на гару
Па жоўты пясочак.
Падману я кавалера
За сыра кусочак.

Назаўтра маці маладой сваімі абрусамі накрывае сталы, расстаўляе прывезеныя закускі і гарэлку і запрашае на снеданне. Маладая адзяе на матку маладога новую сукенку, фартух, завязвае хустку; бацьку дорыць вышываную ільняную рубашку, падпяразвае прыгожым самадзельным поясам і садзіць іх на покуць разам з іх братамі і сёстрамі, сынамі і дочкамі. Прыслужвае запрошаным на снеданне сванька з маладою. Пасля за сталы садзіцца дружына. Вясельнікі спяваюць:

73. Прыехала сванька-купавешка,
Не прывезла сыра, ні гарэшка.
А ехала сванька каля елі,
Павыстаўляўшы калені.
Да зрабілася прычына:
Да ўбілася ў калені тычына.
Сват каня выпрагаў
Ды тычыну даставаў...
Усё ж сваньку ратаваў.

74. Да прыехаў братко багаты
Да прывёз шэлег шчарбаты,
Да закінуў за комін.
А ваш дружко лакомы
Да палез па шэлег за комін.
З коніка зваліўся,
Шэлега забыўся.

Далей вяселле праходзіць па тым жа сцэнарыі, што і ў маладой: за сталы садзяцца запрошаныя госці. Моладзь танцуе, прыпявае:

75. Ах ты, мілы, што фарсіш,
Я цалую, а ты спіш?
Твае губкі, як мядок,
Сам халодны, як лядок.

Не фарсі, фарсун пракляты,
Я цябе не даражу.
Паязджай да другой у сваты,
Табе слова не скажу.

Дзеляць каравай у маладога так жа, як і ў маладой. Маці маладога прыбірае сталы, знімае абрусы маладой, рассцілае свае — рыхтуе сталы да апошняга вясельнага пачастунку — «вялікага абеду». Многа гучыць жартаўлівых песень:

76. Падумай, пагадай, красная дзеўка,
Як цябе заручалі.
Як заручалі, тады казалі,
Што ёсць конь і карова.
А як прышлося, у кучу сплялося:
Адзін бычочак — трэці гадочак,
Дый таго ваўкі з'елі.

77. Наш малады, як кветка, як кветка.
Ваша маладая, як шкарпетка.
Наш малады, як сыр белы, як сыр белы.
Ваша маладая як пень гарэлы.

78. Ваша сванька з сямі сёл,
У яе спадніца ў сем пол.
За кожнай хвандою
Сядзяць вошы капою.

79. Не сядайце, дружкі,
Блізка сцяны —
Нашы хлопцы шутлівы.
У сцяне дзіркі круцілі,
На маладых дружак глядзелі.

Каб спыніць гэтыя едкія песні, спевакоў частуюць пірагамі, цукеркамі. Але яны патрабуюць гарэлкі:

80. А ў нашага гаспадара
Кучарава галава.
Ён кудрамі патрасе
І гарэлкі прынясе.

Гаспадар прыносіць бутэльку гарэлкі і кілішак, частуе спевакоў. Калі госці не спяшаюцца выходзіць з-за сталоў, ім напамінаюць песнямі:

81. Едзьце, сваты, вон, вон,
Будзем церці лён, лён,
А не лён, то каноплі,
Каб вы, сваткі, памоклі.

82. Едзьце, сваты, дадому, дадому,
Паелі коні салому,
Каля плоту — крапіву
І яшчэ мякіну.

Назаўтра ў бацькі маладога яго госці справяць яшчэ «задзяры нагу» і на гэтым вяселле скончыцца.

Праз два дні пасля вяселля малады прыводзіць дамоў жончыных бацькоў, багацейшыя — і хросных, і частуе іх, з часамі гэта было і першым бліжэйшым знаёмствам сватоў.

Праз адзін-два тыдні малады з маладою прыязджае да яе бацькоў па пасаг, прывозіць сваю гарэлку, у маладой рыхтуюць закуску, запрашаюць бліжэйшых сваякоў. З пасагам да маладога едуць і бацькі маладой з гарэлкаю і пірагамі. Гэты заключны этап вясельнага абраду называўся «пярэзвамі» або паездкай «з пірагамі».

Вяселле ў вёсцы Берлеж Блужскага сельсавета Пухавіцкага раёна

Запіс А. С. Фядосіка

Цяпер жэняцца толькі тады, калі згаворацца самі маладыя людзі. Часцей за ўсё яны задоўга да шлюбу знаёмяцца, гуляюць, дамаўляюцца паміж сабой, а потым гавораць бацькам. Малады з бацькамі выбіраюць дзень і едуць да нявесты і яе бацькоў (пры гэтым яны бяруць з сабой хлеб, соль, гарэлку, ручнік).

Заходзяць у хату. Адразу не гавораць чаго прыехалі, а нібы гандлююць што-небудзь, напрыклад кажуць, што прыехалі купляць цялушку. Бацькі нявесты адказваюць:

348 — А наша цялушка бадліва, брыкліва, крыкліва, калюча.

Сваты ж не здаюцца, не «цяраюцца», на «цялушку» згаджаюцца. Ставяць на стол гарэлку, хлеб, соль. «Запіваюць» нявесту. Так адбываюцца запоіны (або заручыны).

Калі на заручынах бываюць сяброўкі нявесты (будучыя дружкі) і іншыя госці, тады, падпіўшы, яны спяваюць шмат песень. Сярод іх і наступную:

Сваты хаты дай не ведалі*
Да ў хлеў заехалі.
Бычку ручку далі,
А кароўцы шапку знялі,
А з цялушкай прывіталіся,
А авечачцы пакланіліся.
Свіння тут падзівілася,
Са смеху пакацілася.
Адзін сват пытае:
— А дзе ж ваша маладая?
А жывёлы засмяяліся:
— Не туды сваты папаліся.
На дварэ стаіць святліца —
Там жыве красная дзявіца.
Сватам сорам стала —
Заручыны йдуць нядбала.

На заручынах дамаўляюцца пра дзень вяселля. Нявеста падносіць маладому ручнік з хлебам і соллю.

Прыкладна праз тыдзень бацькі маладой разам з ёю едуць (або ідуць) да маладога і яго бацькоў, каб упэўніцца, што вяселле будзе. Калі маладая перадумала, то вязе хлеб, соль, гарэлку і ручнік, які прывозіў жаніх, і вяртае яму, калі ж малады і нявеста згодны браць шлюб, то канчаткова дамаўляюцца пра дзень вяселля (адпаведна дамаўляюцца і ў сельсавеце аб рэгістрацыі шлюбу).

Вяселле пачынаецца звычайна ў суботу. У сярэдзіне дня ўчыняюць каравай. Для гэтага збіраюцца ўсе сваякі. Замешвае каравай часцей за ўсё хросная маці з удзелам іншых сваякоў, каравайніц. З цеста качаюць шышкі, якія потым кладуць на каравай. У сярэднюю шышку закатваюць грошы (15 кап. або больш) — «для жыцця харошага» (потым, калі разразаюць каравай, гэту шышку даюць маладым).

У час падрыхтоўкі караваю спяваюць шмат спецыяльных каравайных песень. Замешаны каравай кладуць на драўляную лапату. Каравайніцы гушкаюць каравай і прыгаварваюць:

— Благаславі, ацец і маці, добрыя людзі! (Паўтараюць гэтыя словы тры разы.)

---

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

— Першым разам, добрым часам Бог благаславіць.
Другім разам, добрым часам Бог благаславіць.
Трэцім разам, лепшым часам Бог благаславіць.

Каравай садзяць у печ, а каравайніцы ідуць за стол, каб «паліць» каравай. «Паліваюць» каравай такім чынам — п'юць гарэлку, закусваюць, спяваюць.

Вымаюць каравай таксама своеасабліва: стукаюць тры разы лапатай аб столь, потым першая шаферка выскаквае з гэтай драўлянай лапатай на вуліцу. Калі сустрэне мужчыну, то скора выйдзе замуж, калі ж жанчыну — у гэтым годзе нельга спадзявацца на шлюб. Але ў гэту прыкмету ўжо ніхто не верыць. Выняўшы каравай і «выведаўшы» лёс першай шаферкі, зноў садзяцца за стол і «мочаць» каравай. Пры гэтым нярэдка запрашаюць маладога, каб і ён прыняў удзел у «замочванні» караваю. Пасля з караваем, упрыгожаным кветкамі, печанымі шышкамі, едуць да маладой. (Такі каравай рыхтуецца і ў маладога і ў маладой.)

Па шляху ім некалькі разоў загароджваюць дарогу: ставяць стол, кладуць на яго хлеб, соль, бутэльку з вадой, чарку. Малады павінен адкупіцца грашыма. Калі малады едзе да маладой, спяваюць песню:

Да ой, борам, борам да баравінаю, *
Да хто ж там едзе да вечарыною.
Да ой, едзе, едзе да Іванка п'яны:
— Адчыніся, Ленка, да я твой каханы.
— Я не адчынюся, мамкі баюся.
— Я ж тваёй мамачцы нізенька скланюся,
У цябе, маладой, нанач папрашуся,
Ноч паначаваці, цябе таргаваці,
За русую косу — тры таляры даю,
За цябе, маладую,— тры тысячы дарую.

Маці нявесты выходзіць у вывернутым кажуху, сустракае гасцей хлебам (з двума драбкамі цукру наверсе), гарэлкай, віном і чаркамі. Выносяць каравай маладой. Маці нявесты вядзе маладога ў хату (маладая ў гэты час дзесьці схавана: дома або ў суседзяў). Ад брата маладога патрабуюць выкупу, і ён выкупляе яе цукеркамі.

Цікава адзначыць, што маладая не адзявае вянка, пакуль не прыедзе малады. Калі з'яўляецца малады, а яго брат выкупляе нявесту, яна адзявае вянок, прыданкі прымацоўваюць да яе валасоў кветкі.

Маці нявесты вядзе ўсіх за стол. Маладых садзяць на кут. Справа ад маладога садзіцца нявеста, а за ёю сваякі і пры-

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

данкі, злева ад маладога садзяцца яго сваякі і дружкі. Бацькі наліваюць гарэлку, благаслаўляюць маладых, усе крычаць «горка». Маладыя імкнуцца адкупіцца цукеркамі, але ім гэта не ўдаецца. Крыкі «горка!» сціхаюць тады, калі маладыя пацалуюцца.

У час застольнай бяседы пяюць многа песень.

Пасля працяглага пачастунку сват нясе каравай і ставіць яго на стол*. Ён гаворыць: «Благаславі, ацец і маці і добрыя людзі, каравай падаці» (паўтараюць тры разы).

Бацькі маладой прыносяць хлеб з двума кавалачкамі цукру наверсе і грашыма. Маладым даюць шышкі з каравая, у якія былі закатаны грошы.

Каравай дзеляць і пры гэтым выказваюць пажаданні шчаслівага жыцця маладым, напрыклад:

— Жадаю вам долі, шчасця, здароўя, як у зялёнага дуба, каб жылі люба, каб позна не спалі, рана ўставалі, добра працавалі, каб быў хлеба кусок і дзяцей куток.

— Сыплю вам сто рублёў медзі, каб былі дзеці, як мядзведзі.

Дно каравая завязваюць у хустку і аддаюць музыканту.

Каравай «замочваюць» да позняй ночы, а нярэдка і ўсю ноч. Спяваюць песню пра пірог:

Ой, пойдзем і паглядзім**,
У што наша свацця прыбрана.
Ай ці ў шоўк, ці ў атлас,
Ці ў такія сітцы, як у нас.
Добры вечар, сваціца,
Ці добрая зямліца,
Ці ўрадзіла пшаніца,
Ці спякла нам пірага?
А не спякла пірага,
Возьмем вала за рага,
Сіву кабылку за грыўку.
Да павядом на таржок,
Вытаргуем піражок.
Сядзіць свацця на уллі,
Пад ёй пчолкі загулі.
Адна пчолка піснула,
Свацця пірог сціснула.
А другая загула —
Свацця пірог аддала.
— Дзякуй, свацця, за пірог.
І харошы, і прыгожы, і мякенькі,
Толькі ганьба, што маленькі.
Возьмем пірог,

* Калі прыносяць каравай, маладая павінна кінуць з яго кветкі прыданкам, дружкам, г. зн. перадаць ім дзявочую красу.

** Кожны радок паўтараецца двойчы.

Самі пойдзем за парог,
Сядзем на пясочку
І будзем дзяліць па кусочку.
Тапаром білі — не разбілі,
Адскочыла скарына —
Там — аўсяная мякіна.

Маці аддае пірог, а ўсе ідуць дзяліць яго за парог і даюць усім па кавалачку.

Потым «бяруцца» за сватоў. Звычайна жарты пачынаюцца з першага свата (шафера). Яго абуваюць у лапці, брыюць палкаю або трэскаю. Робяць для яго вянок і вешаюць на шыю, пырскаюць адэкалонам, абліваюць вадою. Нарэшце патрабуюць выкуп (звычайна грошы, за якія потым прыданкі купляюць цукеркі). Сват скача, жартуе, а бабы чаўпуць ля яго гужам, як хто зможа.*

Маладая ж у гэты час рыхтуецца ў дарогу. Яна звязвае свой пасаг, забірае падарункі. У гэты час звычайна пяюць песню:

Вячэрайма, мая мамачка**,
Павячэраўшы, мы падзелімся з табою,
Табе, мамка, сені, хатачка й камора,
А мне, мамка, скрыня, пярына й карова.
Случылася пасля ночачкі дарога,
Бывай, мая мамачка, здарова.

Брат маладога (або сват) стараецца ў гэты час украсці пару вілак, пару блюдцаў і інш. Маці маладой садзіцца на звязаныя падушкі і іншыя рэчы і патрабуе ад маладога выкуп. Потым малады бярэ нявесту за руку, падае руку старшай свацці, якая абводзіць іх тры разы вакол кутняга стала (на куце павінен абавязкова стаяць такі стол).

У гэты час госці становяцца парамі і трымаюць булкі хлеба ў руках. Пар павінна быць столькі, колькі дзвярэй ў хаце. Хлеб трымаюць уверсе, на выцягнутых руках, пакуль пройдуць маладыя. Маладая бярэ булку хлеба, абварочвае яго ручніком, а потым гэты хлеб кладзе ў маладога на комінку печы.

Хросная маці вядзе маладых да машыны. Родная маці бярэ вядро вады і абходзіць машыну тры разы, выліваючы ваду пад машыну з розных бакоў тры разы, садзіцца ў машыну і, праехаўшы 50 метраў, вяртаецца.

Маладая бярэ клубочак або катушку нітак, кідае яго, узяўшы нітку ў рукі, і крычыць:

---

* Скачуць, тоўпяцца гуртам.

** Кожны радок паўтараецца двойчы.

— Каціцеся, дзеўкі, усе за мною (каб усе дзяўчаты выходзілі замуж, а калі хлопцы злуюць на дзяўчат, то абрываюць ніткі).

І на гэты раз маладых некалькі разоў перапыняюць. Калі прыязджаюць да маладога, маладая сыпле ў тры бакі цукеркі. Жанчыны спяваюць:

Знаці, знаці, што чужая маці,
Вывернула кажух,
Хоча спужаці.
— Не пужай, мамачка,
Я ж не баюся,
Злезу з машыны —
Нізенька схілюся.

Маці выносіць хлеб з двума кавалачкамі цукру, віно, налівае маладым поўныя чаркі. Першыя чаркі выліваюць, а ў трэцюю маладая кідае грошы, віно выпіваюць, бяруць у рот па кавалачку цукру. Маці маладога ставіць табурэтку (даўней ставілі дзяжу, накрытую кажухом), на яе кладзе падушку. Маладая павінна паслаць надзежнік. Потым маці падае маладой булачку хлеба. Маладая бярэ хлеб і разам з маладым становіцца на падушку. Маці вядзе маладых у хату. Як праходзяць цераз парог, маладая сыпле жыта па хаце, кладзе хлеб на комін і ідзе на кут. Там яна вешае ручнікі, засцілае скацеркай кутні стол (адной або трыма) і кліча радню — бацьку, маці, сясцёр, братоў маладога, дае ім падарункі.

Калі прывязуць маладую, спяваюць песню:

Ой, сватачка, салавеечка, просім вас*,
Каб не было нашаму дзіцяці ганьбы ў вас,
Каб не стаяла цёмнай ноччу пад вакном,
Каб не ўцірала дробных слёзачак рукавом,
Каб не была паветачка хатачка,
Каб не была суседачка матачка,
Паветачка — не цёплая хатачка,
Суседачка — не родная матачка.

Вяселле працягваецца. Жартуюць, пяюць, зноў благаслаўляюць маладых, нясуць каравай і дзеляць яго амаль так жа сама, як і ў маладой. Як падзеляць каравай, маці маладога здымае вянок у нявесткі, павязвае ёй сваю хустку, маладая ж таксама завязвае хустачку свякрусе.

Вяселле цягнецца тры дні. Прыданкі часам адзяваюцца ў цыганоў, варожаць, патрабуюць цукерак. Калі малады з таго

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

ж самага сяла, што і нявеста, ён едзе па маці маладой і сватоў (маладая не мае права тыдзень хадзіць да маці). Госці прыязджаюць і спяваюць:

— Добры вечар, добрыя людзі, і мы к вам*,
Ці не заляцела наша пташачка ўчора к вам,
Хоць вы на ёй усё пер'ейка парвіце,
Толькі вы яе ў зялёныя бары пусціце.
Добры вечар, добрыя людзі, і мы к вам,
Ці не заехала наша дзевачка ўчора к вам,
Хоць вы яе таўчы, малоць застаўце,
Толькі вы яе часта ў госцікі пускайце.
— Яна ў нам таўчы і малоць будзе,
Яна ў нас частыя госцікі забудзе.

Для вяселля характэрна вялікая колькасць жартоўных песень, якія спяваюцца і на заручынах, і ў маладой, і ў маладога. У час вяселля асабліва дастаецца сватам, дружкам і іншым удзельнікам. Як «пабрыюць», напрыклад, свата, спяваюць пра бруснічка (першага шафера):

У нашага бруснічка залатая ручачка,
Ён з кішэні выймае і нас, жаночак, угашчае.

У гэты час бруснічак крычыць:

— Няма, няма нічога, жанчынкі.

Тады яны здзекуюцца з яго:

Наш бруснічак харош:
Па яблыку вочы,
Буслаў нос.
У яго на спіне горб,
На гарбу вярба,
На вярбе сава.

Да свата звяртаюцца і з такой песняй:

— А наш сватачка харош*,
Па яблыку вочы, з гарбуз нос,
З начоўкі пуза — ледзь у хату ўнёс.

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Праз тыдзень, у нядзелю, большасць удзельнікаў вяселля збіраецца зноў — на пярэзвы, галоўная мэта іх — праведаць маладых. Зноў усе садзяцца за стол, частуюцца, спяваюць, а пасля пачастунку танцуюць, весяляцца.

ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ

Зялёная дубровачка...

— Зялёная дубровачка,
Чаго рана шумець стала?
Яшчэ ветры не веялі,
Дробныя дажджы не капалі.

— Маладая дзевачка,
Чаго рана плакаць стала?
Яшчэ сваты не ехалі,
Цябе, моладу, не сваталі.

Ляцелі гускі рад па раду...

Ляцелі гускі рад па раду,
Крыкнулі гускі раз-паразу:
— Чаго, Іванька, не жэнішся?
На каго, Іванька, надзеешся?
— Як жа я буду жаніціся? —
Хмель каля тыну не абавіўся,
Авёс на ніўцы не урадзіўся,
У гародзе пшонка не выспела,
Яшчэ мая дзевачка не вырасла,
Красаты сваёй не вынесла,
Русую косачку не выплела.
Ляцелі гускі рад па раду,
Крыкнулі гускі раз-паразу:
— Чаго, Іванька, не жэнішся?
На каго, Іванька, надзеешся?
— Ай, буду, буду жаніціся —
Хмель каля тыну абавіўся,
Авёс на ніўцы урадзіўся,
У гародзе пшонка ўжо выспела,
А мая Манечка ўжо вырасла,
Красату сваю ўжо вынесла,
Русую косачку ўжо выплела.

Чаму, верабейка, ды не жэнішся...

— Чаму, верабейка, ды не жэнішся?
Прыйдзе пара — дзе ты дзенешся?
— Ды мне ў гэтым бары ды мне пары няма:
Узяў бы сінічку — дык сястрычка мая,

Узяў бы зязюльку — ў яе бацькі няма,
Узяў бы сароку — шчабятлівая яна,
Узяў бы варону — у яе нос даўгі.
— Вот там у бары перапёлачка —
Для верабейкі была б жоначка.
Верабеечка як лятаць, дык лятаць,
Перапёлачку як шукаць, дык шукаць.
Перапёлачка ж у пшаніцы была,
Для верабейкі ды дачушачку дала,
Для мілага зяця пірагоў напякла.

Прыехалі сваты на двор...

Прыехалі сваты на двор,
Пусцілі стралу ў акно:
— Страла мая, страла,
Па што ты прышла?
Чы па мёд, чы па гарэлку,
Чы па красну дзеўку?
— Ні па мёд, ні па гарэлку,
Але па красну дзеўку.
У чужую сторану аддаваць.
Будзе чужой мамульцы гадзіці,
Ад зары да зары рабіці,
Хмурыцца на дварэ, хмурыцца,
Ганулькі мамулька журыцца:
Гадавала дачушку на долю,
А цяпер аддае ў няволю.

Да і сіні васілі зацвілі...

Да і сіні васілі зацвілі,*
Усю гару камяну пакрылі.
Ішла Ніначка за цвяточкамі,
А за ёй сужанька слядочкамі:
— А падажджы, Ніначка, падажджы!
— Не буду стаяць і цябе ждаць:
Я у Бога сірата, а ты пан —
Бяры сабе такую, які сам.
— Пераехаў, Ніначка, я ўсю Русь —
Не найшоў такой, як ты ёсь.
Пераехаў, Ніначка, Русь-Украіну —
Не найшоў, як ты, дзяўчыну.

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

З суботы на нядзелю нявеста сон відзела...

З суботы на нядзелю нявеста сон відзела,
Нікому не казала, сваёй мамачцы распісала:
— Да мамачка, родная, што я за сон відзела!
Галубы наляцелі, па застоллю паселі,
Па застоллю паселі, чорны шоўк развярцелі,
Чорны шоўк развярцелі, золата рассыпалі.
— А дачушка малада, малады розум мае,
Малады розум мае, сна не разгадае,
Галубы — сваты твае, чорны шоўк — коскі твае,
Чорны шоўк — коскі твае, золата — слёзкі твае!

Ой, скарэй бы вячора даждаці...

Ой, скарэй бы вячора даждаці:
Пойдуць людзі дзяўчыну сватаці.

Пойдуць людзі дзяўчыну сватаці,
А мы пойдзем пад вакно слухаці.

А мы пойдзем пад вакно слухаці,
Ды што будзе дзяўчына казаці.

Дзеўка ходзіць ды ўсё пахаджае,
Белы ручкі на сэрцы складае:

— Маці, маці, парадніца ў хаці,
Парадзь, маці, што свату казаці.

Парадзь, маці, што свату казаці:
Ці йсці замуж, ці з год пагуляці?

Да ў месяца два ражкі крутыя...

Да ў месяца два ражкі крутыя,
Да ў Янечкі два браты родныя,
Адзін брахна каня сядлаець,
А другі брахна яго наўчаець:
— Да будзь, брахна, разумненькі,
Да паедзеш, брахна, ў чужыя людзі,
Выйдзець к табе танок дзевак:
Не бяры таей, што ў золаце,
Да бяры таю, што ў розуме,
Мы золата ў краме дастанем,
Мы розуму свайго не ўставім.

Татачка мой родненькі!..

— Татачка мой родненькі!
Да нашто ты піва варыш,
Гарэлачку гоніш,
Ці ты мяне
Да й аддаць хочаш?
— Да дзіцятка, дзевачка!
Малады розум маеш,
Ці ты таго не знаеш,
Што мой двор пры дарозе,
У мяне госці на парозе,
Просяць мёду
І гарэлачкі,
Гарэлачкі саладзенькае
Да дзевачкі маладзенькае.

Ці ты, дзевачка, не чуеш?..

— Ці ты, дзевачка, не чуеш,
Як цябе купцы таргуюць?
— Яны таргуюць, таргуюць,
Ды ні шэляга не даюць.
Толькі даюць віно ў чару,
За маю русу касу,
За дзявоцкую красу.
Тады красы жалела,
Як у татачкі сядзела,
А цяпер яна не трэба мне —
Ні рута, ні мята,
Ні ружа чырвона.

Прыляцелі коршуны з сакалом...

Прыляцелі коршуны з сакалом,
Пасадзілі коршунаў за сталом.
Частуюць коршунаў, вяльмуюць,
Шэрую вутачку не ратуюць.
А ты, шэра вутачка, хавайся,
Лютаму сокалу не давайся:
Бо ён цябе, вутачку, прыклюе,
У чужую старонку панясе.

Хвалілася каліначка за ракой...

Хвалілася каліначка за ракой:
— Ніхто ж мяне не высячэць за вадой.

Абазваўся буен ветрык на яе:
— Ды я ж не высеку, да зламлю.

Хвалілася Марусечка за скам'ёй:
— Ніхто ж мяне не дастаніць за сталом.

Абазваўся Міколачка на яе:
— Ды я ж цябе хоць не вазьму, заручу.

Ды я ж цябе, хоць не вазьму, заручу,
Ды я ж цябе ад дзевачак адлучу.

Ды я ж цябе ад дзевачак адлучу,
Ды я ж цябе і к жоначкам прылучу.

Дзяўчыначка мая заручоная...

«Дзяўчыначка мая заручоная,
Чаго ж ты такая засмучоная?»
— Ой, як мне жыці, вясёлай быці:
Каго любіла — трэба забыці.
Каго любіла — каб пазабыла,
Каго не знала — каб пакахала,
Каго любіла — не пазабыла,
Каго не знала — да шлюбу стала.
Пайду я ў лясы, лясы зеляныя,
Найду я часы, часы залатыя,
Дзе я хадзіла, дзе гаварыла:
«А судзі, Божа, каго любіла».
Каго любіла, то пазабыла,
Каго не знала,— то пакахала.

Ай, не шум шуміць...

Ай, не шум шуміць,
А зялёная дуброўка,
Ай, баліць, баліць
Да й ў мяне, малайца, галоўка,
Ай, жэніць, жэніць,
Мяне татка маладога.

Ай, бярэць, бярэць
Ды нялюбую мне жонку.
У нялюбай жаны
Печка топіцца не жарка,
Нялюбай жаны
Мне вячэрачка не смачна,
Нялюбай жаны
Мне пасцелечка не мякка,
Нялюбай жаны
Накрываннейка не цёпла,
Нялюбай жаны
Абніманнейка не цесна,
Нялюбай жаны
Цалаванне йка не ўцешна.

Мамачка мая, родная мая...

Мамачка мая, родная мая,
Куды мяне выпраўляеш?
Ў чужыя людзі, не ў знакомыя,
Ды ў вялікае гора.
Мяне, маладу, пашлюць па ваду,
Самі сядуць вячэраць.
Вада далёка, гара высока,
Я й няскора вярнуся.
Прынясу вады — на сябе бяды —
Кожнаму піці даці:
І старэнькаму, і маленькаму,
І свайму міленькаму.
Піцькі падаўшы, пасцель паслаўшы,
Сама села вячэраць.
На стале ложкі, хлеба ні крошкі —
Вот мая й вячэрачка.
Ложачкі ляп-ляп, слёзачкі кап-кап —
Вот я й павячэрала.

Будзе табе, дзевачка, вялікае гора...

Будзе табе, дзевачка, вялікае гора,
Вялікае гора.
Будзе цябе свякроўка раненька будзіці,
Раненька будзіці.
Ты раненька ўстанеш, на соўнейка глянеш,
На соўнейка глянеш.
Возьмеш вядзерца, пойдзеш за вадою,

Пойдзеш за вадою.
А твой жа сужанька пойдзе за табою,
Пойдзе за табою.
Ён вядзерца зніме, цябе абніме,
Цябе абніме.
Як ты будзеш плакаць — ён цябе суніме,
Ён цябе суніме.

Пойдзеш, дзевачка, ў чужыя людзі...

Пойдзеш, дзевачка, ў чужыя людзі —
Там табе так не будзе:
Ой, там вулачкі немяцёныя —
Ты ж па іх блудзіць будзеш.
Ой, там суседцы незнакомыя —
Аб цябе судзіць будуць.
— Мае цётачкі, мае родныя,
Я ж таго не баюся:
Я і вулачкі павымятаю,
Я ж па іх хадзіць буду,
Я з суседцамі распазнаюся —
Я й з імі жыці буду.

А за лесам, лесам...

А за лесам, лесам
Там круглае поле.
Маладая дзевачка
Да пшаніцу поле.
Яна поле, поле,
Да перабірае,
Да куколь-мятліцу
Вон выкідае.

Да куколь-мятліца —
Татку на насенне,
Перабор-пшаніца —
Самой на вяселле.
А куколь-мятліца —
Да курам кляваці,
Перабор-пшаніца —
Каравай гібаці.

Ляцелі, гусачкі, усе маўчалі...

Ляцелі гусачкі, усе маўчалі,
Толькі адна гусачка пракрычала:
Чула яна зімачку халодную,
Чула яна марозы траскучыя,
Чула яна мяцелі замятучыя.
Сядзелі дзевачкі, усе маўчалі,
Толькі адна Манечка праплакала:
Чула яна свякратку журлівага,

Чула яна свякроўку сварлівую,
Чула яна заловак-калатовак,
Чула яна дзевераў абгаворчастых,
Чула яна Валодзьку раўнівага.

За гарой рутачка, за гарой...

За гарой рутачка, за гарой,
А зарасла травой-муравой.
— Чаму ты, Аксенька, не ходзіш,
Зялёну рутачку не полеш,
Белыя ручачкі не колеш?
— Хадзіце, дзевачкі, хадзіце,
Зялёну рутачку паліце,
Белыя ручачкі каліце.
А ўжо мне, моладзе, не хадзіць:
Прыехаў Андрэйка у сваты,
А йшчэ мае рушнічкі не ткаты.
Пастой, Андрэйка, у кутку,
Пакуль рушнічкі я патку.

Ідзі, дачушка, дадому...

— Ідзі, дачушка, дадому —
Наехала сватоў поўны двор.
Наехала сватоў поўны двор —
Выбірай, дачушка, на выбор.
— Адпраўляй, татка, без мяне —
Гэта сваточкі не мае.
Як будуць ехаць да мяне —
Будзе калінка шумеці,
Будзе дарожка звінеці.

Ой, цёмна, цёмна ў лесе...

Ой, цёмна-цёмна ў лесе,
Ой, цямней таго на дварэ.
Баяры вароты адкрывалі,
Дарагога тавару пыталі:
— Даражы, мамачка, даражы —
Сем падушачак палажы.
— Сем падушачак не грошы —
А быў бы хлопчычак харошы.

Прыехалі на заручыны...

Прыехалі на заручыны —*
Хата, сені закручаны.
А каго ж мы заручаць будзем?
Ганначкі дома няма.
А куды ж яна пайшла —
Ці ў лес па каліну,
Ці ў вёску па радзіну?
А у лес па каліну —
Усю каліну абламае.
А ў вёску па радзіну —
Усю радзіну пазбірае.

Каб я знала да я ведала...

Каб я знала да я ведала,
Што скора мае заручыны,
Я ж бы раненька ўставала,
Да тоненька прала,
Да беленька бяліла —
Ўсіх сватоў бы надарыла,
Ўсіх сватоў бы надарыла.

Пашугай, рута, пашугай...

— Пашугай, рута, пашугай,
Пашугай, рута, пашугай.
— А рада б я пашугаці —
Ка мне ветры не заходзюць,
Ка мне ветры не заходзюць,
Жарка сонца запякаіць.
— Пагуляй, дзяўчоначка, пагуляй,
Пагуляй, дзяўчоначка, пагуляй.
— А рада б я пагуляці —
Ка мне дзеўкі не прыходзюць,
Ка мне дзеўкі не прыходзюць,
Толькі хлопцы заязджаюць,
Мяне, млоду, заручаюць.

Да ў вароцечках яліна...

Да ў вароцечках яліна,
Там дзевачка ручнікі бяліла.
Прыйшла да яе мамка яе:
— Бялі, мая дачушачка, бяленька,
Ужо ж твае заручнікі блізенька.
— Да няхай жа едуць здаровы —
Ужо мае ручнікі гатовы:
Сорак саракоў ручнікоў,

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Трыццаць локатаў намётаў —
Таней лісціны кляновай,
Бялей паперы лістовай.

Ой, звонка, звонка сасонка...

Ой, звонка, звонка сасонка...
Да званчэйшая каліна:
І ў лузе стаяла — шумела,
А й мостам ішла — грымела,
У полі стаяла — пяяла,
А ў сяло ўвайшла — зайграла,
І к варотам прыйшла — стукнула,
Пад акенцам стала — гукнула:
— А ці дома, дома дзеўчына?
Адчыні маладому вароты.
— Не смею, жанішка, не смею,
Па двару хаджу, мак сею.
Узыдзі, узыдзі, чоран мак,
Узыдзі усходам зялёным,
Зацвіці цветам чырвоным,
Залатой макаўкай узрасці.
А зялёненькі ўсход — братулькі,
Чырвоны цвяток — сястрыцы,
Залатая макаўка — жанішка.

Не сядзі, дзевачка, не сядзі...

Не сядзі, дзевачка, не сядзі,
Адчыні акенца, паглядзі:
Ці ясен месяц пры зары,
Ці харошы хлопчык на кані.
Ой, пад ім конічак, як сакол,
На ім шапачка, як агонь.
Пры боку шабелька мігцела,
За яго дзевачка хацела.

Зборная суботанька настае...

Зборная суботанька настае,
Зялёная рутанька на стале.
Дзевачка дружыну збірае,
Кругом свайго століка саджае.
Сама, маладзенькая, між усіх,

Скланіла галованьку ніжэй ўсіх.
Скланіла галованьку з касою,
Паліліся слёзанькі ракою:
— Ці вы мне галованьку звяжыце,
Ці вы мне малойчыка прышліце.
— Звяжамо галованьку вяночкам,
Прышлемо малойчыка з цвяточкам.

Звязлі, зняслі...

Звязлі, зняслі
Сем бочак мукі на каравай.
Звязлі, зняслі
Сем фасак масла на каравай.
Звязлі, зняслі
Сем коп яйцаў на каравай.
Звязлі, зняслі
Сем пудоў цукру на каравай.
А Божа мой,
Вялік, высок наш каравай.

У Цімоха хата топіцца...

У Цімоха хата топіцца,
Шаўковыя да дымы ідуць,
Да Васільку каравай пякуць.
Каравай у печы іграе
Да заслонку адбівае,
А шышачкі рагочуць —
На прыпечак хочуць.

Да разгарэлася каліна...

Да разгарэлася каліна,
Да перад сонцам стоячы,
Дробныя іскаркі ронячы,
Тушыў ветраньку, не патушыў,
Па полю іскаркі разнасіў.
Расплакалася дзевачка,
Перад татачкам стоячы.
Сунімаў татачка, не суняў,
Большае жаласці шчэ задаў:
— Да дзіцятка мае любае!
Аддаю цябе ад сябе
У тыя людзі дзіўныя,

Што мяняюць коней без цаны,
Да што б'юць жонак без віны!

Стаіць дубок зелянюсенькі...

Стаіць дубок зелянюсенькі,
На мора пахіліўся,
Сядзіць Федзечка маладзюсенькі,
У дарожку павадзіўся.
Дзяржыць хустачку бялюсеньку,
Слёзачкі ўціраець,
Свайму татульку, свайму роднаму
Да ножак прыпадаець:
— Татулечка мой, родненькі мой,
Адчыні вароцікі,
Благаславі мяне на дарожачку,
У чужую староначку.
— Табе дарожачка благаслаўлёна,
Вароцікі адчынёны.

Ой, звіўся раёчак па край вароцечак...

Ой, звіўся раёчак па край вароцечак,
Хоча ён паляцеці
Ды на шырокі бары, на пахучыя сады,
На салодкія мяды.
А сабраўся Мішачка са сваёй дружынай,
Мамчынай радзінай,
Хоча ён паехаці цесцечку звяваці,
Дзевачку к сабе ўзяці.
Сем год ваявалі, сем год ваявалі —
Дзевачкі не давалі.
А на восьмым гадочку шабелькі паламалі —
Дзевачку к сабе ўзялі.

Села маці блізко дзіцяці...

Села маці блізко дзіцяці,
Ціхенька навучае:
— Паедзеш, сынок, родно дзецятко,
Па сваю міленькую,
Ой, скажы ты ёй, прыкажы ты ёй,
Каб мяне паважала.
Я ж муляла ручкі аб вяровачкі,
Як цябе калыхала,

Спаліла свечку не раз васковую,
Пакуль гадавала.

Як табе, маё сонейка?..

— Як табе, маё сонейка,
З месяцам разысціся,
З месяцам разысціся?
— Я пайду па залессейку,
Я пайду па залессейку,
Хмарачкай апушчуся,
Хмарачкай апушчуся,
Дожджыкам абліюся
І з месяцам разыдуся.

— Як табе, мая дзевачка,
З мамачкай разысціся,
З мамачкай разысціся?
— Я пайду па застоллейку,
Я пайду па застоллейку,
Коскамі апушчуся,
Коскамі апушчуся,
Слёзкамі абліюся
І з мамачкай разлучуся.

Ляці, ляці, саколе, ды не апазняйся...

— Ляці, ляці, саколе, ды не апазняйся,
Аб сваёй зязюлі ды не забывайся,
Бо тваю зязюлю сакалы абселі.
— Ды няхай абселі — я ж аб іх не дбаю,
Я сваю зязюлю між усіх пазнаю,
Бо ў мае зязюлі шэрае пер'е,
Шэрае пер'е, залатыя крыллі.
— Едзь, едзь, Валодзік, ды не апазняйся,
Аб сваёй Марысьцы ды не забывайся,
Бо тваю Марыську шафяры абселі.
— Ды няхай абселі — я ж аб іх не дбаю,
Я сваю Марыську між усіх пазнаю,
Бо ў мае Марыські па плячах коскі,
Па плячах коскі, пад вачыма слёзкі.
Па плячах коскі развіваюцца,
Пад вачыма слёзкі разліваюцца.
Па плячах коскі — як лён бяленькі,
Пад вачыма слёзкі — як гарох драбненькі.

За лесам, лесам сонейка іграе...

За лесам, лесам сонейка іграе,
Малады малойчык коніка сядлае.
Коніка сядлае, цяжка ўздыхае,
Цяжка ўздыхае, сільненька плача.
Прыйшла да яго матулька яго:

— Чаго, сыночак, цяжка ўздыхаеш,
Цяжка ўздыхаеш, сільненька плачаш?
— Матулька мая, як мне не ўздыхаць,
Як мне не ўздыхаць, сільна не плакаць:
Бяру каралёўну — сабе не роўну:
На двор уз'едзе — увесь двор асвеце,
У сені ўвойдзе — чаравічкам стукне,
У хату ўвойдзе — шубачкаю шасне,
За столікам сядзе — ключыкамі лясне.
Шубачкаю шасне — я спалахнуся,
Ключыкамі лясне — з ложка звалюся.
— Пакінь, сыночак, пакінь думаці:
Шубачку зносіць, к мамцы ходзячы,
Чаравічкі стопча, ваду носячы,
Ключыкі згубіць, хату мыючы,—
Гэта каралёўна будзе з намі роўна.

Кукавала зязюля ў садочку...

Кукавала зязюля ў садочку,
Прыклаўшы галоўку к лісточку,
А к ёй пташанькі прыляталі,
А ў яе праўданькі пыталі:
— Чаго ты, зязюля, кукуеш?
— Чаму ж мне, пташанькі, не кукаваць?
Я ж была дый звіла гняздзечка,
Я ж была дый знясла яечка,
Адкуль узяўся сізой арол,
Ножкамі раскапаў гняздзечка,
Дзюбачкай раздзюбаў яечка,
К сабе і зязюльку ўзяў.
Плакала Ганулька ў святліцы,
Прыклаўшы галоўку к сястрыцы,
А к ёй дзеванькі прыхадзілі,
Ды і ў яе праўданькі пыталі:
— Чаго ж ты, дзеванька, плакала?
— Чаму ж мне, дзеванькі, не плакаць?
Я ж была дый звіла вяночак,
Я ж была пашла ў таночак,
Адкуль ўз'ехаў Іванька,
Конікам разагнаў таночак,
Ручкамі разабраў вяночак,
Ды мяне, маладу, к сабе ўзяў.

Па лузе зялёны рамон паслаўся...

Па лузе зялёны рамон паслаўся,
Па лузе зялёны рамон паслаўся,
А куды, куды наш Ванечка сабраўся?
Яго мамачка ля стала гавора,
Яго мамачка ля стала гавора:
— А не едзь, не едзь, мой сыночак, за мора,
Бо там свае вараны коні паморыш,
Ты там сваё ўбраннейка замочыш.
— А не бядуй, мая мамачка, аба мне,
А не бядуй, мая мамачка, аба мне —
У майго цесця тры садочкі на дварэ.
Я ў адным садзе свае конікі напасу,
Я ў адным садзе свае конікі напасу,
У другім садзе сваё убраннейка пасушу,
А ў трэцім садзе з сваёй Манечкай пахаджу.

Раззеляніўся зялёны садок у гародзе...

Раззеляніўся зялёны садок у гародзе,
Развесяліўся молад Мішачка у дарозе,
А да сваёй дзевачкі едучы,
Дарагія падарачкі везучы.
Яна яго падарачкамі гардуець,
Сама свае новенькія гатуець.
Яна гатуець сорак саракоў ручнікоў,
Каб было чым падарыці дзевяроў.
Яна гатуець сорак лакотак намётак,
Каб было чым падарыці заловак.

З-пад белага бярэзнічка...

З-пад белага бярэзнічка
Да сівы конік выбягае.
Да не сам жа ён бяжыць —
На ём жаніхна сядзіць.
Ён коніка да паганяе,
Ён з конікам да размаўляе:
— Коню мой, сівы коню,
Пахвалён жа ты мною,
Пахвалі ж і ты мяне
Перад цясцёвым дваром:
Пераскоч да вароцечка,
Да не выбі білечка,
Да не зварушы капыцечка,
Да не дай цесцю знаці,
Што мы едзем да ваяваці,
Што мы двор ізваюем,
Камору ізрабуем.

Чырвона каліначка...

Чырвона каліначка
Блізка саду стаяла
Ды расою прыпала.
Там дзевачка да расу брала,
Расою вымывалася,
Да шлюбу сабіралася,
У мамачкі пыталася:
— Мамачка мая родная,
У што ж мне прыбірацiся?
— Дзіця маё ды маладое,
Прыбярыся сабе ў золата —
Каб галовачка ззяла,
Каб свякровачка знала,
Родным дзіцем назвала.

Пусціла дзевачка русу касу...

Пусціла дзевачка русу касу
Да па шоўкаваму паясу.
— Няхай мая руса каса лялеецца,
Няхай мая родна мамка жалеецца.
Лялей, лялей, руса каса, да свету,
Жалей, жалей, мая мамка, да веку.
Адлялела мая косачка, адлялела,
Аджалела мая мамачка, аджалела.

Зялёная руціца, жоўты цвет...

Зялёная руціца, жоўты цвет.
Пыталася Манечка: — Ці ўжо свет?
Чаму майго Мішачкі доўга нет?
Ці я яму хустачку не дала,
Ці я яму вяночка не звіла?
А я ж яму хустачку шаўкову,
А я ж яму вяночак ружовы.
А ён маю хустачку сцёр, змяў,
Вараному коніку падаслаў.
А ён жа вяночак мой развіў
І ўсім дзяўчаткам падзяліў.

Непраўдзівая калінка...

Непраўдзівая калінка —
Няпраўду лугу казала.
Казала: цвіцець не буду.
Казала: ягад не будзе.
Як прыйшла вясна цяпленька,
Аж на ёй цвету бяленька.
Як прыйшла восень сцюдзёна,
На каліне ягад чырвона.

Непраўдзівая Лідачка —
Няпраўду дзевачкам казала.
Казала: замуж не пайду,
Казала: хлопцаў не люблю.
Яна ж Сярожку любіла,
Ў адзін слядочак ступіла.
Яго слядочак цяпленькі,
Яе Сярожка міленькі.

Калінка мая лугавая...

Калінка мая лугавая,
А ў лузе стаяла — лялела,
А борам ішла — шумела,
Да сяла падышла — зайграла,
А ў сяло ўвайшоўшы — гуляла.
Пад акенца прыйшла — гукнула:
— А ці дома, дома Ганначка?
Адчыні каліне вароты.
— Некалі, калінка, некалі:
А ў садзе вінаград паспеў —
Трэба той вінаград пазбіраць,
Шоўкам у пучочкі павязаць.

Шкада табе, мамачка, а мне горш...

Шкада табе мамачка, а мне горш,
Што аддаеш мяне няўзросшай.
Ці ў цябе хлеба-солі не стае,
Што ты мяне маладу аддаеш?

Ці табе хлеба-солі прыбудзе,
Як мяне ў цябе не будзе?
Што ж я табе, мамачка, вады не насіла,
Што ты мяне аддаеш, каб я галасіла?
Ці ж я табе, мамачка, пасцелі не слала,
Што ты мяне аддала, каб я гаравала?

Не плач, не плач, мая матулька, да па мне...

Не плач, не плач, мая матулька, да па мне,*
А я ж буду недалёчка ад цябе.

---

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

А ты ж будзеш на сінім моры плацце праці,
А я ж буду ў чыстым полі жыта жаці.
А будзем жа мы адна адной галаскі падаваці
І ранняю й вячэрняй парою,
А сыйдуцца нашы галаскі з табою.

У гародзе мята...

У гародзе мята,
У садочку рута.
Няма каго паслаці
Руты наламаці.

Сястра маладая,
А брат не ўнаровіць,
А брат не ўнаровіць,
Да з голлем наломіць.

А ёсць у мяне дружачкі,
То мае служачкі.
Яны мне ўнаровяць,
Без галля наломяць.

І саўюць вяночак
На адзін дзянёчак.
І буду насіці
І Бога прасіці,
Каб гэтаго знасіла
І больш не прасіла.

Станьце, дружачкі, да ўсе ў рад...

Станьце, дружачкі, да ўсе ў рад —
Будуць мяне родныя прадаваць.
Стануць мяне родныя прадаваць —
За русую косаньку грошы браць;
Роднаму бацейку — на вала,
Роднаму брацейку — на каня,
Палавым волікам — плуг цягаць,
Вараным конікам ваяваць.

На чыей гэта ніве?..

На чыей гэта ніве
Жыта ў трубы павілося,
Жыта ў трубы павілося,
На каравай удалося?

На Пётрухнавай ніве
Жыта ў трубы павілося,
Жыта ў трубы павілося,
На каравай удалося.

А ў чыей гэта хаце
Каравай ў дзяжы йграе,

Каравай ў дзяжы йграе,
Века ўверх падымае?

У Пётрухнавай хаце
Каравай ў дзяжы йграе,
Каравай ў дзяжы йграе,
Века ўверх падымае.

Караваю, мой раю...

Караваю, мой раю,
Караваю, мой раю,
Я каля цябе йграю,
Я каля цябе йграю.
Я каля цябе йграю,
Я цябе прыбіраю;
Навакол сыр і масла,
Навакол сыр і масла,
Пасярод — доля, шчасце.

Каравайнічкі, пачынайнічкі...

Каравайнічкі, пачынайнічкі,
Ды не стойце ў запечку.
Да выйдзіце на хатачку,
Да пачніце вяселлейка,
Вяселлейка вясёлае:
Дзевачкі — у песенькі,
Музычкі — у скрыпачкі,
А мамачка — у мыселькі.

Прыйшоў на вяселле наш сваток...

Прыйшоў на вяселле наш сваток,
Павязаўшы крыжам ручнічок.

А казалі, сват наш вельмі харош,
Аж у свата доўгі буслаў нос.

А у свата лыса галава
Ды казлінна рыжа барада.

Плавае па хаце, як таран,
Лыпае вачыма, як баран.

Калі, сват, гарэлкі не дасі,
Караваю — трасцу ты з'ясі.

Сыпце пшаніцу...

Сыпце пшаніцу
Ў новыя карыты
Ды карміце коней
У вялікую дарогу.
У той дарозе
Трое варот.
У першыя вароты —
Месячык свеціць,
У другія вароты —
Сонейка грэе,
У трэція вароты —
Жанішок едзе.
Месячык свеціць —
Відненька будзе,
Сонейка грэе —
Цёпленька будзе,
Жанішок едзе —
Вяселлейка будзе.

Ліхія стральцы-байцы па полю ходзюць...

Ліхія стральцы-байцы па полю ходзюць,
Сочуць-пасочуць старога лося ў гаросе.
Як дачула яго ласіца, што ў лозе,—
Як кінула свае крутыя рогі пад ногі:
— Няхай мае крутыя рогі прападуць!
Куды майго старога лося павядуць?
А з кім я буду па балоце хадзіць,
А з кім я буду сваіх дзетак вадзіць?
Як зазвінелі кутыя колы па мосце,
Як пачула малада Зіначка ў каморцы —
Як кінула залатыя ключы пад ногі:
— Няхай мае залатыя ключы прападуць!
Куды ж мяне ад мамачкі павядуць?
У мамачкі як была, куды хацела хадзіла,
А ў свякроўкі куды захочаш не пойдзеш,
А ў свякроўкі трэба прасіцца, карыцца.

Брат сястру на пасад вядзе...

Брат сястру на пасад вядзе,
Сястра брату да слаўцо кладзе:
— Мой брацейка, да мой родненькі,
А што ж ты мне за пасаг дасі?
— Дам сто злотых яснюсенькіх
За сястрыцай малюсенькай.
Дам брычачку маляваную
За сястрыцай гадаванаю.

Маладая Гэлечка ў сені ўступіла...

Маладая Гэлечка ў сені ўступіла,
У сені ўступіла — сені асвяціла.
У хатачку прыйшла — як зорачка ўзышла.
На пасадзе села — як ружа зардзела.
А з пасаду ўстала — як рутачка звяла.
Каля яе дзевачкі — як ластавачкі,
Каля яе хлопцы — як рыбалоўцы.
— А нашто ж мы яе ў чужы край аддалі?
А чаму ж мы яе за сябе не ўзялі?

Ой, хадзіла дзевачка круг стола...

Ой, хадзіла дзевачка круг стола,
Не мовіла нікому ні слова.
Толькі мовіла аднаму —
Роднаму браціку свайму.
— Падай, падай, брацік, грабянец
Да расчасаць косачку пад вянец.
Ляжы, ляжы, грабянец, касцячком,
Ужо твая косачка пад вянцом.

Разлягайцеся, горы...

Разлягайцеся, горы,
Раўняй, Божа, дарогі —
Дзевачка да вянца едзе,
Яе доля папярод ідзе.
— Ой, ты, доля, да ты, долечка
Калі ты доля добрая —
То садзіся са мною
І паедзем з табою.
А калі доля ліхая —
Дык плыві ты з вадою,
А я, малада, за табою.
Адказала ёй доля:
— Я й такая, і сякая,
Я й добрая, і ліхая.

За гарой, за гарой...

За гарой, за гарой
Цэркаўка стаяла;
Там дзяўчына
З нялюбым шлюб брала,
Шлюб брала,
У шлюба пытала:
— Шлюбе, мой шлюбе!
Скажы адну праўду:
Ці горы капаці,
Ці з нялюбым шлюб браці?
— Дзяўчына, дзяўчына!
Дурны розум маеш,
Што ў шлюба пытаеш.
Горы пакапаўшы,
Ляжаш — спачынеш;
З нялюбым шлюб узяўшы,
То навек загінеш.

Як прыехалі з-пад вянца...

Як прыехалі з-пад вянца,
Як прыехалі з-пад вянца —
Не прамовілі ні слаўца.
Толькі тое да прамовілі:
— Мамка мая да родненька,
Ці доўга вы нас ждалі?
Ці доўга вы нас ждалі?
— Дзіця маё ды маладое,
Я стральцоў да нанімала,
Я стральцоў да нанімала
Дый у пушчу выпраўляла.
Дый у пушчу выпраўляла,
Каб лася да звяявалі,
Да і ў катле згатавалі.
Да і ў катле згатавалі —
Свае дзеці частавалі.

Кацілася калясо з клеці...

Кацілася калясо з клеці,
Спіць мая да нявехна ў клеці.
Няхай спіць хоць да вечара.
Няма хлеба дай на печыва,
Ложачкі пад камешнічкам
Пазарасталі арэшнічкам,
А місачкі пад лаўкаю
Пазарасталі мураўкаю.

Ды пайшла сіротачка ды па свету, плачучы...

Ды пайшла сіротачка ды па свету, плачучы,
Ды па свету, плачучы, мамачкі шукаючы.
Не знайшла яна мамачкі, ды знайшла магілачку.
Ды на той магілачцы вырасла яварынка.
Маладая дзевачка вырвала яварынку,
Вырвала яварынку, стукнула аб магілку.
Магілка здрыганулася, мамачка адклікнулася:
— Ды хто тут ходзіць, ды хто надакучвае?
— Ды мамачка родная, ды я па табе хаджу,
На сваё вяселлейка я цябе прашу,
Ды прыйдзі ў вяселлейка на благаславеннейка.
— Ды мая ты дачушка, я сама не прыйду,
Я табе трох янеляў выпраўлю.
Дзевачкі не запелі — аж у куце селі,
Музыкі не зайгралі — аж у куце сталі,
Дый так яны сіраце долю далі.

Хто там, хто там у цёмным лесе гукае?..

Хто там, хто там у цёмным лесе гукае?
Там дзевачка свае мамачкі шукае.
— Ой чаго, чаго, мая мамка, сюды пайшла,
Чаму ка мне на вяселлейка не прыйшла?
— Ой, не прыйду, маё дзіцятка, не прыйду,
Бо змарыў мяне сон — вечны сон,
Да й набок маю галовачку схіліў,
Да й накрыж мае ручачкі злажыў,
Да й навек мае вочачкі закрыў.
Да й змуравалі мне муляры новы дом,
Да й не пусцілі ні дзверцаў, ні аконца,
Да й не прамоўлю, маё дзіцятка, ні слоўца.
Ходзе-паходзе месяц па небе.
Ліча-паліча зоркі на небе.
Усе зорачкі — вячэрняй нету,
Ой, нету, нету, не будзе да свету.
Ходзе-паходзе дзевачка па сенях,
Ліча-паліча радзімку сваю.
Уся радзімка — мамачкі нету,
Ой, нету, нету і яе прывету.
Пайшла дзевачка мамку прасіць:
— Прашу цябе, мамка, к сабе на вяселле.
Прыйдзі ка мне, мамка, у нядзельку рана,
У нядзельку рана на выпраўлянне,
Прынясі свечачку на застрыганне.

Усе зорачкі паўсходзілі...

Усе зорачкі паўсходзілі,
Усе суседцы папрыходзілі.
Не ўзышоў месяц штонайяснейшы,
Не прыйшоў татулечка мой найраднейшы.
Татулечка мой, я ночку не спала.
Татулечка мой, лісточкі пісала,
Татулечка мой, табе іх слала.
Татулечка мой, чаму не прыйшоў?
Татулечка мой, ці ліcток не дайшоў?
Татулечка мой, ці адрасок не сышоў?
Татулечка мой, ці дарожка доўга?
Татулечка мой, ці дарожка камяніста?
Татулечка мой, ці дарожка гарыста?
Татулечка мой, калі дарожка доўга —
Я конікаў падашлю і сама падбягу,
Татулечка мой, калі дарожка гарыста —
Дык я тыя горы раскапаю,
Татулечка мой, калі ж яна камяніста —
Дык я тыя камні раскачаю.

А й чырвоная каліна, каліна...

А й чырвоная каліна, каліна,
Ці не досыць стаяць у лозе,
А й ці не досыць стаяць у лозе?
Пара перайсці к дарозе,
А й пара перайсці к дарозе,
А й к таму гасцінцу бойкаму,
А й к таму гасцінцу бойкаму.
А й маладая Манечка, Манечка,
Ці не досыць гуляць у мамкі,
А й ці не досыць гуляць у мамкі?
Пара перайсці к свякроўцы,
А й пара перайсці к свякроўцы,
А й к тэй свякроўцы-шальмоўцы,
А й к тым дзевярам-жандарам.

Зялёненькі наш вінаград...

Зялёненькі наш вінаград,
А й дзе нам яго пасадзіць,
А чым нам яго паліваць?
Пасадзім яго на градзе,
Будзем паліваць вадой.

А харошы наш Сашачка,
А й дзе нам яго пасадзіць,
А кім нам яго надзяліць?
Пасадзім яго на куце,
Надзелім яго Манечкай.

Ой, рэчка, рэчка быстрая...

— Ой, рэчка, рэчка быстрая,
Як жа ты ўчора звячора быстро ішла,
А сягоння раненько — ціхенько.
— Ой, як жа мне, рэчачцы, быстро ісці?
Што наплылі серы вуткі на мяне
Ды крыллямі вадзіцу сунялі,
Мне пераходу не далі.
— Ой, дзеўко, дзеўко Хвядорко,
Як жа ты ўчора звячора вясёла была,
А сягоння раненько — смутненька.
— Ой, як жа мне, дзевачцы, вясёлай быць?
Што абсела кругом мяне чужа чужына,
Ды ўсё хлопчыкава радня.
З правага боку — хлопчычак,
З левага — залвіца, яго сястрыца.

Усходзіла красна сонца з замор'я...

Усходзіла красна сонца з замор'я,
Прасілася красна Анютка з застолля —
Паглядзеці на таткіна падвор'е,
Распытаці пра мамкіна здароўе.
— Не пушчу цябе, Анютка, не пушчу.
Была ў цябе цэлая нядзелька —
Паглядзеці на таткіна падвор'е,
Распытаці пра мамкіна здароўе.
— Гэта нядзелька ўся ў рабоце была:
У панядзелак на рэчачцы стаяла,
А ў аўторак сваё бяллё катала,
А ў сераду радзіначку збірала,
А ў чацвер у хаце прыбірала,
А ў пятніцу з баярачкамі гуляла,
А ў суботу ў банечку хадзіла,
А ў нядзелю на шлюбе стаяла.

Ой, сваточкі, галубочкі, просім вас...

Ой, сваточкі, галубочкі, просім вас,
Каб не стала наша дачушка ў абідзе,
Каб не была ёй паветачка за хатку,
Каб не была ёй суседачка за матку,
Каб яна бяды-гора не знала,
Каб яна доўгіх летаў даждала,

Каб яна дзецям торбы не шыла,
Каб свякроў бы яе не сушыла.
Ой, сваточкі, галубочкі, просім вас
Ды адведаць хлеба-солі ў нас.

Спіралася куна й з бабром пад вадой...

Спіралася куна й з бабром пад вадой:
— Табе, бобра, будзець добра, а мне не:
А ты будзеш на сінім моры, а я не.
Ты будзеш купаціся, а я не,
На муражочку сушыціся, а я не.
Спіралася Анечка з Колечкам за сталом:
— Табе, Колечка, будзець добра, а мне не:
Ты будзеш у сваёй мамкі, а я не,
Цябе будзець раненька будзіці, а мяне не,
Табе будзець работку казаці, а мне не.
Выйдзець на вулку, гаварыць будзець аб мяне:
«Мая нявестка не ў хаце расла, а ў бару —
Не робіць работку у пару».

Салавей зязюльку да сябе падмаўляе...

Салавей зязюльку да сябе падмаўляе:
— Ляці, ляці, зязюлька, да ў мой садочак,
У маём садочку да многа жырочку:
Вішні, цярэшні да парасцвіталі,
Чырвоныя малінкі да панаспявалі.
Хлопчык дзевачку к сабе падмаўляе:
— Едзьма, едзьма, дзевачка, да маёй мамкі,
У маёй мамкі да ўсяго даволі:
На парог уступіш — пірага адкроіш.
— Да няпраўда, хлопчычак, няпраўда твая.
На парог уступлю — цяжанька ўздыхну,
А гляну на клеці — мякінка-амеці,
А гляну ў куточкі — там стаяць кіёчкі,
Кіёчкі дубовы на мяне гатовы.

Як заручалі, тады казалі...

Як заручалі, тады казалі,
Што ў свата каней многа.
Прыйшлі ў хлявочак,
Глянулі ў куточак,
Аж там адзін жарабочак.

Як заручалі, тады казалі,
Што ў свата кароў многа.
Прыйшлі ў хлявочак,
Глянулі ў куточак,
Аж там адзін бычаночак.

Як заручалі, тады казалі,
Што ў свата авец многа.
Прыйшлі ў хлявочак,
Глянулі ў куточак,
А там адзін бараночак,
Як заручалі, тады казалі,
Што ў свата свінней многа.
Прыйшлі ў хлявочак,
Глянулі ў куточак,
Аж там адзін кабаночак.
Як заручалі, тады казалі,
Што ў свата курэй многа.
Прыйшлі ў хлявочак,
Глянулі ў куточак,
Аж там адзін пятушочак.

Харошы сваце, харошы...

Харошы сваце, харошы,
Хораша ў людзі прыбраны:
Яснае сонца на галоўцы,
Ясен месяц на грудзях,
Ясныя зоркі на плячах,
Чорныя сабалі ў падалах.
Не хадзі, сваце, па парогах,
Не выбівай сабалёў у падолах,
Трэба будзе краўцоў наймаці,
У падалах сабалі ўшываці.

Маладзенькая дружачка...

— Маладзенькая дружачка,
Чаму ж ты харошая?
Ці цябе сонца радзіла,
Ці цябе месячык выгадаваў?
— Парадзіла мяне маці,
На пуховых падушачках,
На пуховых падушачках,
На шаўковых дзяружачках.

А сваціца-галубіца, не баў нас...

А сваціца-галубіца, не баў нас,
Адкрой хлеба, пасып солі, адпраў нас.
Просім цябе, сваціца, не тужыць —
Мы ж яе бяром не за наймітку служыць,
Мы ж яе бяром за гаспадыньку жыць.
Мы ж яе пусцім па сваім полі, па волі.
Мы ёй аддадзім залаты ключ ад клеці —
Ці добра будзіць гаспадарачкі глядзеці?
Ды калі будзіць нашай мамачцы гадзіці —
Дык яна будзіць у чаравічках хадзіці.
Калі не будзіць нашу мамачку шанаваці —
Тады будзіць і лапцікі абуваці.

Пры дарозе белы рамон сцелецца...

Пры дарозе белы рамон сцелецца,
Млада дзевачка з роднай мамкай дзеліцца:
— Табе, матухна, адна кашулька, мне дзве,
Я паеду ў чужы людзі, а мамка — не.
Пры дарозе белы рамон сцелецца,
Млада дзевачка з родным таткам дзеліцца:
— Табе, татка, скрынка, пярынка, а мне дзве,
Я паеду ў чужы людзі, а татка — не.
Пры дарозе белы рамон сцелецца,
Млада дзевачка з роднай сястрой дзеліцца:
— Табе, сястрыца, адна спадніца, а мне дзве,
Я паеду ў чужы людзі, сястрыца — не.
Пры дарозе белы рамон сцелецца,
Млада дзевачка з родным браткам дзеліцца:
— Табе, братка, дзве рэдзечкі цвілыя,
А мне, братка, дзве авечачкі сівыя,
Я паеду ў чужы людзі, а братка — не.

Стаяць коні пры дарозе...

Стаяць коні пры дарозе,
Запрэжаны ў новым возе,—
Толькі сядайце.
Яшчэ ж я не сядала,
Свайму бацюхну не дзякавала:
— Дзякуй, дзякуй, родны войце,
Што хадзіла ў срэбры-злоце,
А цяпер не буду.
Стаяць коні пры дарозе,
Запрэжаны ў новым возе,—
Толькі сядайце.
Яшчэ ж я не сядала,
Сваёй мамачцы не дзякавала:
— Дзякуй, дзякуй, родна матка,
Што часала касу гладка,
А цяпер не будзеш.
Стаяць коні пры дарозе,
Запрэжаны ў новым возе,—
Толькі сядайце.
Яшчэ ж я не сядала,
Свайму браціку не дзякавала:
— Дзякуй, дзякуй, родны браце,

Жылі-былі ў роднай хаце,
А цяпер не будзем.
Стаяць коні пры дарозе,
Запрэжаны ў новым возе,—
Толькі сядайце.
Яшчэ ж я не сядала,
Сваёй братавай не дзякавала:
— Дзякуй, дзякуй, братавая,
Штодзень з хаты выганяла,
А цяпер не будзеш.
Стаяць коні пры дарозе,
Запрэжаны ў новым возе,—
Толькі сядайце.
Яшчэ ж я не сядала,
Сваёй сястры не дзякавала:
— Дзякуй, дзякуй, родна сёстра,
Жылі-былі, як меч, востра,
А цяпер не будзем.
Стаяць коні пры дарозе,
Запрэжаны ў новым возе,—
Толькі сядайце.
Яшчэ ж я не сядала,
Сваім парогам не дзякавала:
— Дзякуй, дзякуй, мае парогі,
Дзе хадзілі мае белы ногі,
А цяпер не будуць.
Стаяць коні пры дарозе,
Запрэжаны ў новым возе,—
Толькі сядайце.
Яшчэ ж я не сядала,
Сваім столікам не дзякавала:
— Дзякуй, дзякуй, мае столы,
Дзе ляжалі мае строі,
А цяпер не будуць.

Віцечка каля цешчы ходзіць...

Віцечка каля цешчы ходзіць,
Ён жа цешчу просіць:
— Цешчухна, мая мамачка,
Частуй мяне, не баў мяне.
Коні мае настаяліся,
Музыкі награліся,
А баяры нагуляліся,
Я, малады, насядзеўся,
На дзевачку наглядзеўся.
А дзевачка зажурылася,
Што ў мамачкі забавілася,
А к свякрусе запазнілася.

Вынось, маці, дзежку...

Вынось, маці, дзежку,
Прывёз сын нявестку.
Чырвоная, як каліна,
Высокая, як вярбіна,
Не будзеш гадаваці,
Адно будзеш пасылаці.
Куды бліжэй — яе пашлеш,
Куды далей — сама пойдзеш,
Яе пашлеш за мукою,
Сама пойдзеш за вадою.

А ў нашым садзе паспелі вішні...

А ў нашым садзе паспелі вішні —
Ўзялі нявестку пад свае мыслі.
А ў нашым садзе паспелі дулькі —
Ўзялі нявестку пад свае думкі.
А ў нашым садзе селі цяцеры —
Ўзялі нявестку, каго хацелі.
А ў нашым садзе агрэст рагаты —
Ўзялі нявестку з багатай хаты.
А ў нашым садзе бацвінне вяніць —
Ўзялі нявестку — ёсць на што глянуць.
А ў нашым садзе рута лялеіць —
Ўзялі нявестку — хлопцы жалеюць.

А прыданачкі, мае галачкі, едзьце дамоў...

А прыданачкі, мае галачкі, едзьце дамоў,
Завязіце маёй мамачцы нізкі паклон.
Яна ж мяне маленькую гадавала,
Сорак ночак цямнюсенькіх не спала,
Сорак свечак яснюсенькіх спаліла,
Пакуль мяне маленькую ўзрасціла,
А ўзрасціўшы, работачцы навучыла,
А наўчыўшы — у чужыя людзі пусціла.

А стаяла наша Валечка пры мосце...

А стаяла наша Валечка пры мосце,
А прасіла сваю мамульку ў госці:
— Я прашу цябе, мая мамулька, харашэнька.
А бывай, бывай, у мяне ў госцейках часценька.
— Як жа маю я, мая дачушка, бываці?
Дарожачка бруснічнікам зарасла,
Чырвонаю калінаю завісла.
— Паціхонечку, мая мамулька, абыдзі,

Зялёную бруснічынку не стапчы,
Чырвоную каліначку не зламі —
А ты ж маю свякровачку не ўгняві:
Мая свякроўка ў белай пярыне спіць,
А прыказала ўсю нядзелечку не будзіць.
Усю нядзелечку на цыпачках хадзіла,
А ўсё роўна я сваю свякроўку ўгнявіла.

Аддалі мяне, забылі мяне...

Аддалі мяне, забылі мяне,
Як жа вам не жаль будзе?

Як жа я буду ў чужой старонцы
Цяжанька тужыці?

Як жа я буду ў чужой старонцы
Свякроўцы наравіці?

Будуць жа мяне раненька будзіць,
Позненька спаць класці.

А там вулачкі невядомыя,
Блудзіць жа я буду.

А там суседкі незнаёмыя,
Судзіць мяне будуць.

Аддалі мяне, забылі мяне,
Як жа вам не жаль будзе?

Прыедзь, мамачка, прыедзь, родная,
Мяне адведаці.

ХАЎТУРНЫЯ ГАЛАШЭННІ

Мой міленькі дружок...

Мой міленькі дружок,
З кім ты мяне пакідаеш,
Толькі з дробнымі дзеткамі.
Ай, мой жа параднічак,
А мой жа работнічак!
З кім жа астаюся?
Толькі з дробнымі дзеткамі.

З кім жа іх гадаваць буду,
Чым я іх адзяваць буду?
Я ж іх не адзену,
Я ж іх не прыгадую,
Я ж як прычыхаюся — я і ўлякаюся.
Куды мой друг вянчальны падзеўся,
Ці ён паехаў у дарожаньку?
А ці ён пайшоў у цэркаўку?
У мяне дзеткі пытаюцца:
«Куды наш татка дзеўся?»
Дзеткі мае мілыя,
Страшнае гэта слаўцо,
Што я завуся «ўдованька»,
А вы, дзетанькі,— «сіротанькі».
Сяду з вамі абедаці,
Вамі, дзеткі, абсажуся
І слёзкамі абальюся.
Што вы, дзеткі, маленькі,
А слёзанькі вашы драбненькі,
А як дзеткі пабольшаюць —
І слёзанькі пагоршаюць,
Што ёсць каму загадаць вам,
Да некаму пажалець вас
Без свайго роднага татанькі.
І вы не будзеце ведаць,
Што і быў у вас родны татанька.
Цяпер вы, дзеткі, сіротанькі,
А я астаюся ўдованькай.
Што ж вы, дзеткі, не пытаецесь:
Хто вас будзець гадаваці
І ў салдаты выпраўляці
Без свайго роднага татанькі?
Людскія такі будуць выпраўляць дзетак,
А адна ўдованька, бедная мая галованька,
Нельзя мне і слоўцам нідзе абазвацца
Без свайго дружочка, без вашага татанькі.
Прыдзець цёплае лецечка,
Людзі паедуць з сошкамі,
А я з кім і з чым?
У мяне зямелькі было нямножка:
Палосанька была і вузенька і кароценька,
А цяпер стала і доўга і шырока,
І будзець стаяць някошана,
Будзець ляжаць няорана,
А я буду хадзіць і ручанькі ламаць.

Як прыду я ў хатаньку —
Мая хатачка не міла:
Нет майго параднічка, а дзеткам татанькі.
Усё мне не міла і хатанька пастыла.
Як устануць дзеткі і спытаюцца татанькі —
Адраклась бы лепі гэтай хатанькі.
Як жа вас гадаваць без татанькі:
Няма чаго вам зварыці,
Няма чым пасаліці.
Трудна рыбкі без вадзіцы,
Трудна дзеткам без татанькі.
Дась Бог цёплае лецечка,
Вазьму дзетак за ручаньку
І павяду на магілачку,
Гукайце, дзеткі, свайго татаньку:
— Устань, устань, наш татанька!
Верна, ў гробе дошкі
Прыціснулі твае ножкі,
Што няльзя табе ўстаці.
Гора наша і сэрцу тошна,
Таткі вярнуці з магілы няможна.
Галовачкі нашы бедныя,
Асталісь мы сіраты вечныя.

А мой мілюсенькі, а мой раднюсенькі!..

А мой мілюсенькі, а мой раднюсенькі!
А на што ты нас пакінуў?
А цябе, як ты сам казаў, татка да мамка
Маленькага кінулі.
Да табе было вельмі трудненька на свеце,
Да не было каму цябе глядзеці,
Да цябе надта ўсе крыўдзілі.
Да трэба было для пана паншчыну адбыці,
Да ў доме ўсенка зрабіці,
Да галоднымі рокамі хлеба прыкупіці,
Але трудна было скуль ўзяці,
Да трэба было на шыю сваю набраці,
Да прыдумаць, да прыгадаці,
Як потым грошы і квоту заплаціці.
Да зноў, ты казаў, як вырас да ажаніўся,
Да зноў жыць пусціўся,
Матка ідзе з сярпом, а ты да дня с касою.
Да ты казаў, што вельмі быў ледашты
Акоман, да за якое глупства

Зараз зачне галавіці да ў морду біці.
Да ты не піўшы, не еўшы цэлы дзень,
Да прыдзеш дадому галодны, як сабака,
Да уж было табе не да яды,
Але хоць хутчэй дзе-кольвек галаву прывярнуці,
А назаўтра трэба было ўстаці,
Да работу ў рукі ўзяці,
Да за сваёю гаспадаркаю трэба было глядзеці.
Да як табе Бог даў дзеці,
То і не было каму глядзеці.
Да мы, як шчаняты, валяліся пад плотам.
Да балазе й што дзянёк пражывеш,
Да ты з мацер'ю з двара прыдзеш
Ад акомана з крыўдзіны:
Да каб яму рукі пазалацелі
Да па локаць адляцелі.
А мы былі яшчэ маленькія,
Да бульбы вам накапаем і зварым...

Ах, мая ж ты матушка...

Ах, мая ж ты матушка,
А мая ж ты зязюлечка!
Чаму ж ты, чаму памёрла,
Сваю дачку асіраціла?
Ах, каб ты ведала, знала,
Якая мяне доля спаткала!
Ух, ўстала ж бы ты, ўстала,
Раданьку бы ты мне, беднай, дала.
Ах, некаму ж мяне пажалеці —
Я й ў хаце, я й ў клеці
Слёзкамі, слязамі плачу,
А шчасця-долі дай не бачу.
Ах, свякроўка ж мяне заганяець,
Ніколі мне не спагадаець,
Ласкавага слоўца не прамовіць,
Усюды толькі гоніць да гоніць,
Плакаць па табе не пазваляець;
Ах, хоць добра зрабіла — усё хаіць.
Чаму ж ты са мной да не пагукаеш?
Сваёй дачкі да не распытаеш?
Як жывець да гаруець,
Як жа начуець, як днюець?
Ах, цяжанька ж мне, цяжанька,
Ах, трудненька мне, трудненька

У чужой хаце жыці,
У чужой матулькі быці!

Яблычка маё недаспелае...

Яблычка маё недаспелае,
Ягадка мая недазрэлая!
Дзетанька маё міленькае,
Дзетанька маё любенькае!
Лісточак мой зялёненькі,
Цвяточак мой чырвоненькі!
Без пары ты адпадаеш,
А мне пячаль пакідаеш.
Пташачка мая любенькая!
Салавеінька шэранькі, шчабяценнік мой!
Ты ж гаворыш, як салавейка шчабеча.
Ты ж хацеў быць татку пераменачка,
А цяпер проці лецечка цёплага
Здзелаў нам пераломаньку вялікую.
Ўсе пташачкі заспяваюць,
Ўсе казявачкі пааджываюць,
Ўсе мурашачкі павыпаўзаюць,
Ўсе рабяткі на вулку павыбягаюць,
А цябе нігдзе не будзе:
У пясочак закапаюць.
Дужа мне будзець тошненька,
Дужа мне будзець маркотненька,
Што цябе, салавеінька, не чуць будзе шчабечучы.
Адкуль я буду цябе спадзявацца,
Адкуль буду дажыдацца?
Хто маю хатаньку даглядзіць,
Хто скацінку прагоніць,
Хто татку па коніка збегае?
Пацера наша вялікая,
Пацера наша дарагая,
Пацяралі мы сыночка,
Пацяралі дарагога.
Вот паследні разочак
Цалую цябе, сыночак.

Дзецятка маё роднае, дзецятка маё мілае...

Дзецятка маё роднае, дзецятка маё мілае,
Куды ж ты ад мяне адлятаеш?
І з кім ты мяне пакідаеш?

Ці ты адлятаеш у лес за пташку,
Дзе я цябе глядзець буду?
Ці з пташкамі лятаючы,
Ці з дзеткамі гуляючы?
Цвяточак мой родненькі!
Што ж ты ад мяне адсыпаешся:
Ці цябе ветрыкі адбілі?
Ці цябе дожджыкі адмылі?
А загадала ты мне загадачку:
І збудавала сабе хатачку —
Хатачку новую, за адзін дзянёчак гатовую.
Хатачка твая цёмная,
І хадзіць мне к табе нельзя будзець.
Як прыдзець цёпла лецечка,
А пайду я ў зялёны лес,
Там кукулькі кукаваць будуць,
І салавейкі шчабятаць будуць,
І я буду слухаць:
Ці не маё чадзенька з пташачкамі песенькі пяе?
Куды ж ты гэта прыбраўся,
У якую дарожаньку і ў якую староначку
Проціў лецечка цёплага,
Проціў ўрэмечка вясёлага?
Усе мурашачкі паажываюць,
Усе казявачкі павыпаўзаюць,
А мне будзець тошненька,
Як рыбачцы без вадзіцы,
А травіцы без расіцы,
Што людскія дзеткі цвяточкі ірваць будуць,
А не будзець майго дзетанькі,
Будзець ірвацца маё серданька.
Я ж цябе гадавала і думала,
Што ты мой пракапаннічак будзеш.
Хто ж маю старасць даглядзіць,
Хто ж мне пасцельку пасцеле,
Як прыдзець цёмная ночанька?
І хто ж мне пітанькі падасць?
А без свайго дзіцятачкі дзянёчкі мае будуць маркотныя,
Бяседанька мая маркотная,
Бяседанька мая пячальная!
Музыкі у мяне не іграюць,
І радзінка мая песенькі не пяе,
Толькі адна я, гаратніца,
Хажу да слёзкі лью.

Страшны мой дзянёчак —
Пахаронен мой мілы сыночак.
Дзетка маё мілае!
Як я з табой разлучуся?
Людскія дзеткі будуць на рабоце,
А мая галоўка будзе ў забоце,
Што з табой разлучылася.
Каб ты ад мяне было сагнатае —
Я ж бы хадзіла пыталася,
І я ж бы цябе нахадзіла;
Каб ты было забранае —
Я ж бы цябе адсудзіла.
А як ўзяла цябе зямлічка,
Дык я цябе не найду,
Дык я цябе не адсужу.

Бабка мая, зязюлька мая!

Бабка мая, зязюлька мая!
Хоць бы ты ў запечку пасядзела,
Дзіцятка майго паглядзела.
Хоць бы ты яго паняньчыла,
Хоць бы ты яго пакалыхала.
А цяпер некаму яго паглядзеці,
Некаму яго пакалыхаць.
А як ты была, мая бабачка:
Куды я ні пайду, мой дварок быў заведамам.
Мае дзеткі былі прыгледжаны.
А цяпер няма маёй бабачкі:
Некаму мне скацінку загнаць,
Некаму мне дзіцятка пакалыхаць.

Прыказкі і прымаўкі



У афарыстычнай творчасці беларускага народа прыказкі і прымаўкі карыстаюцца найбольшай папулярнасцю. Яны ярка адлюстравалі багаты працоўны і жыццёвы вопыт народа, яго мудрасць, псіхалогію і светапогляд, маральна-этычныя і эстэтычныя ідэалы. Прыказкай называецца створанае народам лаканічнае, часцей за ўсё вобразнае, устойлівае выслоўе з павучальным зместам, якое мае прамы і пераносны сэнс. У прыказцы выказваецца закончаная думка, якая можа асацыятыўна характарызаваць разнастайныя з'явы дзякуючы шырокім абагульненням. Эстэтычнай завершанасцю вызначаецца і мастацкі вобраз прыказкі. У адрозненне ад прыказкі прымаўка характарызуецца незавершанасцю думкі; яна не мае такога абагульняльнага значэння і выкарыстоўваецца толькі ў канкрэтных выпадках, каб адцяніць, напрыклад, пэўную рысу чалавека, яго ўчынак, раскрыць сутнасць грамадскай або прыроднай з'явы. Сэнс прымаўкі можна зразумець толькі ў кантэксце.

Прыказкі і прымаўкі ўзніклі яшчэ ў дакласавым грамадстве. У некаторых з іх адбіліся язычніцкія ўяўленні пра сусвет, прыроду, чалавека, расліны, жывёл. У старажытнасці многія з такіх прыказак маглі выконваць утылітарна-практычныя функцыі.

Ідэйна-тэматычны змест афарыстычнай творчасці надзвычай багаты. У ёй, як у фокусе, адбіліся найбольш характэрныя з'явы пэўнага часу — жыццё, быт, культура, думкі і пачуцці народа. Кожная эпоха пакідае пасля сябе велізарныя пласты прыказак і прымавак: у іх адлюстравалася жыццё ў часы прыгону, ва ўмовах жорсткай капіталістычнай эксплуатацыі, раскрываюцца карэнныя змены ў жыцці і побыце народа ў сучаснасці.

У прыказках і прымаўках эпохі феадалізму выразна адбілася тэма прыгоннага жыцця, паказана стаўленне народа да паноў і іх паслугачоў — войтаў, цівуноў, аканомаў: «Ці ад пана, ці ад цівуна, а ўсё баліць ад бізуна», «Хвалі каня пасля дарогі, а пана — як выцягне ногі», «Добры быў той пан, што здох», «Як ні бяжы, а бізун аканома здагоніць». Народ дасціпна высмейваў паразітызм, звычкі і норавы паноў: «У пана горла — прорва: тысяча працуе, а ён адзін прагарцуе», «Толькі і гора пану, што жывот баліць».

Выкрыццё сацыяльнай несправядлівасці — адна з важнейшых тэм прыказак і прымавак эпохі капіталізму. Народная афарыстычная творчасць раскрывае эксплуататарскую сутнасць царызму, царквы і рэлігіі, паказвае невыносна цяжкае становішча працоўных мас у грамадстве з антаганістычнымі класамі: «Адзін з сошкаю, а сямёра з ложкаю», «Адзін сыцее, а дзесяць пацее», «Аднаму аж з горла прэ, а другі з голаду мрэ». Рост класавай самасвядомасці, узмацненне сацыяльнага пратэсту знайшлі адлюстраванне ў прыказках, у якіх востра крытыкуецца жорсткасць, прагнасць, дэспатычнасць, хцівасць багацеяў: «Бедны пот лье, а багаты яго кроў п'е», «Багаты — рагаты: усё глядзіць, каб каго збіць», «Багатым жыццё, а бедным выццё».

Развіццё таварна-грашовых адносін, грамадскі быт, гаспадарчыя і матэ-

рыяльныя клопаты селяніна, яго жыллё, адзенне, ежа даволі поўна паказаны ў народных прыказках і прымаўках. Адлюстраваны ў іх таксама сямейна-бытавыя адносіны: погляды на шлюб, выхаванне дзяцей, сям'ю і інш.

Грунтоўна характарызуецца ў афарыстычнай творчасці чалавек. У адпаведнасці з маральна-этычнымі прынцыпамі і разуменнем эстэтычнага ідэала народ ухваляе лепшыя, станоўчыя рысы і якасці чалавека і крытыкуе, высмейвае, асуджае ўсё заганнае, адмоўнае. Асноўным крытэрыем чалавечай годнасці з'яўляецца стаўленне да працы. Шматлікія прыказкі ўхваляюць працавітасць, гаспадарлівасць, умельства, кемлівасць, дасціпнасць, праўдзівасць, сумленнасць, сціпласць, дабрату, ашчаднасць, шчодрасць, шчырасць, гасціннасць. Бязлітасна асуджаецца гультайства, дармаедства, п'янства, несправядлівасць, ашуканства, хцівасць, прагнасць, зайздрасць, дурасць, пляткарства, сварлівасць, хлуслівасць, зладзейства і іншыя заганныя рысы.

Прыказкі вучаць любіць свой край, Радзіму, яе герояў і ненавідзець здраднікаў, ворагаў. Народная мудрасць заклікае да калектывізму, еднасці: «Калі робіш укупе, не забаліць у пупе», «У гурце нішто не страшна», «Адзін дасуж, да не дуж», «Моцны статак чарадою, а людзі грамадою».

Трапна выказвае народ свае мудрыя думкі пра шчасце, лёс і долю, дабро і зло, праўду і крыўду. Народныя афарызмы павучаюць, як трэба жыць, ставіцца да людзей, выхоўваць дзяцей: «Шануй людзей, то і цябе пашануюць», «Старога паважай, малога павучай», «Да пяці год пястуй дзіця, як яечка, з сямі — пасі, як авечку,— тады выйдзе чалавечка», «Людзей слухай, да свой розум май».

Адлюстраваны ў народных прыказках і пэўныя гістарычныя падзеі, канкрэтныя вядомыя асобы: «Наша Бяроза чужых і генералаў тапіць можа», «Так турнуў, як Кутуз пранцуза», «Як швед пад Палтаваю», «За Саса было досыць хлеба і мяса, а настаў Панятоўскі, стаў хлеб не такоўскі», «Не проста пані, а пані Стоцкая». Увогуле прыказкі і прымаўкі — гэта своеасаблівая энцыклапедыя жыцця народа ў розныя гістарычныя эпохі.

Аднак у прыказках адбілася не толькі мудрасць народа, але і супярэчнасці ў яго светапоглядзе, абмежаванасць свядомасці. Пануючыя класы і царква імкнуліся распаўсюджваць антынародныя па змесце прыказкі. Мэта іх — пераканаць працоўных у нязменнасці эксплуататарскага ладу, у непазбежнасці наканаванага лёсу.

Прыказкі і прымаўкі вызначаюцца багатым асацыятыўным зместам, дзякуючы чаму адны і тыя ж творы шырока выкарыстоўваюцца ў розных жыццёвых сітуацыях. Гэтаму спрыяе мастацкая дасканаласць прыказак і прымавак, якая праяўляецца і ў іх кампазіцыі, і ў вобразнасці, і ў рытміцы, і ў рыфмоўцы. У стварэнні надзвычай ёмістых і яркіх мастацкіх вобразаў народ трапна ўжывае сінтаксічны паралелізм, антытэзу: «У свінушніку жыве, ды хоча кашляць па-панску», «Пана клянуць, а пан таўсцее», «Паны балююць, а мужыкі гаруюць»; параўнанні: «Пан шалёны, як сабака, а яму служы, небарака», «Ад папа, як ад чорта, не адхрысцішся», «Я ксяндзоўскі слуга, сагнуўся, як дуга: як жа мне не сагнуцца, калі нечым апрануцца»; метафару, сінекдаху, метанімію: «Кожная сасна свайму бору песню пяе», «Чужая старана тугою арана, слёзкамі засявана», «Белыя рукі працы баяцца»; гіпербалу: «У папоўскай кішэні з галавой схаваешся», «Наша пані — бяздонная бочка, ніколі яе не наталіш» і інш. Вельмі пашырана ў прыказках іронія. Па падліках К. Крапівы, «40—35 % прыказак маюць у сабе пэўную ступень іроніі, якая нярэдка пераходзіць у сарказм»[1]. Іранічна высмейваецца, напрыклад, поп: «Поп «праведна» жыве: з беднага дзярэ да ў карман кладзе» або паны: «Пашкадуй пана, а ён табе адплаціць», «Кашляйце, паночку, вам можна»,

[1] *Крапіва К.* Зб. тв.: У 5 т. Т. 5. С. 74.

«Паздароў, Божа, паноў, што ў нас няма ні коней, ні кароў: цяпер нам добра пагуляць, бо нечага заганяць» і інш.

Часцей за ўсё прыказкі маюць двухчленную будову, але нямала існуе адначленных, трохчленных і шматчленных. Кожная частка прыказкі нярэдка рыфмуецца з другой. Большасць з іх не мае вершаванай рытмікі, але ёсць шмат прыказак, у якіх выкарыстаны двухскладовыя стопы — ямб, харэй, а часам і трохскладовыя — анапест, дактыль, амфібрахій.

Рыфма, рытміка, багаты арсенал мастацкіх сродкаў цесна знітоўваюць прыказку ў адзінае эстэтычнае цэлае, ствараюць дасканалы мастацкі твор, які жыве сотні год і выконвае розныя інфармацыйна-камунікатыўныя, эстэтычна-мастацкія і утылітарныя функцыі.

Народныя прыказкі, прымаўкі шырока выкарыстоўваюцца пісьменнікамі, якія ў сваю чаргу ствараюць шмат трапных афарызмаў, што папаўняюць вусна-паэтычную скарбонку.

Сістэматычнае збіранне і вывучэнне беларускіх прыказак і прымавак пачалося ў XIX ст. Найбольш багатыя зборнікі афарыстычных твораў у дарэвалюцыйны час апублікавалі І. І. Насовіч, Я. А. Ляцкі і М. Я. Нікіфароўскі. Вялікая калекцыя прыказак і трапных выслоўяў была падрыхтавана таксама А. К. Сержпутоўскім. У 1935 г. у Варшаве быў надрукаваны зборнік беларускіх прыказак і прымавак, сабраных М. Федароўскім (каля 10 тысяч). У савецкі час вялікія зборы прыказак выдалі Ф. Янкоўскі і Я. Рапановіч. Асаблівую навуковую каштоўнасць мае самы поўны зборнік беларускіх прыказак, выдадзены ў серыі «Беларуская народная творчасць» у дзвюх кнігах у 1976 г. (складальнік М. Я. Грынблат).

ЛІТАРАТУРА

Носович И. И. Сборник белорусских пословиц. Спб., 1874.

Ляцкий Е. А. Материалы для изучения творчества и быта белорусов: 1. Пословицы, поговорки, загадки. М., 1898.

Янкоўскі Ф. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы. 2-е выд. Мн., 1962; 3-е выд. Мн., 1992.

Рапановіч Я. Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі. 2-е выд. Мн., 1974.

Грынблат М. Я. Прыказкі і прымаўкі: У 2 кн. / Пад рэд. А. С. Фядосіка. Мн., 1976.

Беларуская народна-паэтычная творчасць. Мн., 1968.

Янкоўскі М. А. Паэтыка беларускіх прыказак. Мн., 1971.

Колас добра не спее, калі сонца не грэе.

З вялікае хмары малы дождж.

Шмат снегу — шмат хлеба.

Што ў воду ўпала, то пішы прапала.

З агнём не жартуй і вадзе не вер.

З малой іскры бываець часам вялікі пажар.

Воўка ногі кормяць.

Воўк не пастух, а казёл не агароднік: воўк — злодзей, а казёл — шкоднік.

Цалаваў каршун курачку да апошняга пёрушка.

Пчала на любую кветку ляціць, але не на кожную сядзе.

Што ў лесе родзіцца, у хаце знадобіцца.

Зімой і летам адным цветам.

З голага куста і ягада пуста.

Зіма на лета робіць, а лета на зіму.

Якая зіма, такое лета.

Зіма снежная — лета дажджлівае.

Прыйшоў люты — пытаецца, ці добра абуты; прыйшоў марац — прымарозіў палец.

Вясной прапусціць — летам не дагоніш.

Цёплы апрэль, мокры май — будзе жыта так, як гай.

Красен красавік цяплом, а жнівень дабром.

Май халодны — не будзеш галодны.

Мокры май — жыта, як гай.

Што летам ножкай коп, то зімой ручкай хоп.

Хто ўлетку спіць, той узімку не есць.

Хто халадку шукае, той узімку галадае.

Хто ўлетку балуе, той узімку галадуе.

Лета праляжыш, то ўзімку ў пазыкі пабяжыш.

Восень кажа: «Я ўраджу», вясна адказвае: «Пачакай, як дагаджу».

Увосень і верабей багат.

Дзень — бацька, а ноч — маці.

Учарашняга дня не дагоніш.

У адзін дзень сем перамен.

Ноч — маці, дзень — мачаха, вечар — залоўка, раніца — ятроўка.

Чакай Пятра — з'ясі сыр.

Прышоў Пятрок — апаў лісток, прышоў Ілля — апала два, прышоў Барыс — усё пагрыз, прышоў Міхал — усіх з поля паспіхаў.

На Юр'я павінна быць сена і ў дурня.

Варвара ночы ўрвала.

Пакланіся кусту, дак ён дасць хлеба лусту.

Не бяда, калі ёсць лебяда.

То не бяда, што ў жыце лебяда,— няма гарэй бяды, як ні жыта, ні лебяды.

Урадзіўся сівец — жыту канец.

Канюшына родзіць — ільну годзіць.

Без сахі і бараны сам цар хлеба не есць.

Пільнуй гаспадаркі — будуць у гаршку скваркі.

Гультая зямля не любіць.

Не марнуй часу дарэмна: вясна пройдзе — не вернеш.

Кладзі гной густа — не будзе ў свірне пуста.

Дзе гной, там лой.

На пустом полі й трава не расце.

У гліне зярнятка не гіне.

Калі добра ўзарэш, то і ўраджай збярэш.

Дзе гультай арэ ды скародзіць, там пустазелле добра родзіць.

Памяраць збірайся, а жыта сей.

Хто сее рана, той насенне не губляе.

Сей у добрую пару — збярэш хлеба гару.

Сей авёс у гразь — будзеш князь.

Калі суніца красна, не сей аўса напрасна.

Калі суніца чырванее, не сей проса — не паспее.

Хто сее па пакрові, таму няма чаго даць карові, а хто варожыць, той галавой наложыць.

Сей ячмень, як загудзіць сляпень.

Калі будзеш жыта па жыту сеяць, тады не будзеш ні малаціць, ні веяць.

Жыта сей на канаплішчы, дык не пашкадуеш.

Што пасееш, тое і вырасце.

Што пасееш, тое і пажнеш (сажнеш).

Якім зярном хто сее, такім збірае.

Хто сее ды вее, той не збяднее.

Каб не было пуста, трэба сеяць густа.

Хто дажджом косіць, той пагодаю сушыць.

Калі старанна косяць, то сена зімою не просяць.

Каса любіць брусок і сала кусок.

Каса любіць парася, а калі хлеб да ваду,— ляжы, каса, у халаду.

Хто ў жніво халадку шукае, той галадае.

Закончыш жніво ў пору — будзе што вазіць у камору.

Ніўка, ніўка, аддай маю сілку.

Не той хлеб, што на полі, а той, што ў гумне.

Не гані каня дубцом, а гані аўсом.

Кармі каня не пугай, а сенам з луга.

Дагледзь каня дома, то ён цябе ў дарозе.

На галодным кані доўга не наездзіш.

На лечаным каню не наездзіш.

Рамясло піць-есці не просіць, а само корміць.

Трэба розумам надтачыць, дзе сіла не возьме.

Рыбка ў рацэ, ды не ў руцэ.

У паляўнічага часта і заяц пудовым бывае.

Ружжо адзін раз у год само страляе.

Воўк яшчэ бегае, а шкуру ўжо дзеляць.

Не тагды сабак кормяць, калі на ўловы ехаць.

Каваль без молата, як без рук.

Каб не клін і мох, то плотнік даўно б здох.

Не святыя гаршкі лепяць.

І з голкі кравец жыве.

З музыкі хлеб невялікі.

Скамарох папу не таварыш.

Шчырая праца — мазалёвая.

Працы і світкі не саромейся.

Работа міла, да дзень малы.

Работа і корміць і поіць.

Хто працуе, той мае.

Хто працуе, таму і шанцуе.

Хто працуе, той не сумуе.

Сушыць не работа, а турбота.

Не вялік муравей, ды горы варочае.

Не той харош, хто прыгож, а той харош, хто на справу гож.

Добра ўсё ўмець, але не ўсё рабіць.

Якая справа, такая і слава.

Адклад не йдзець у лад.

Хто рана ўстае, у таго хлеба стае.

Канец — дзелу вянец.

З вялікага паспеху наробіш смеху.

Спяшыць — людзей насмяшыць.

Якая скібка, такая і сілка.

Працуй да поту — з'ясі у вахоту.

У добрага гаспадара ўсё ёсць.

Якія сані, такія і самі.

І мыш у сваю нару цягне кару.

Няхай ляжыць, хлеба не просіць.

Не падпірай гнілога забора: ён усё роўна ўпадзе.

Даў Бог цяля, ды няма хлява.

Як з казла: ні шэрсці, ні малака.

Няма кароўкі, няхай не будзе і вяроўкі.

Не мела баба клопату, купіла парася.

Панадзілася свіння ў агарод.

Жыве кот і сабака, ды толькі жытка не аднака: кот на пячы, сабака пад дзвярыма.

Кату жартушкі, а мышы смяртушкі.

Збродлівай кошцы хвост уцінаюць.

Свая хатка як родная матка.

На сваём сметніку і певень гаспадар.

Слаўна хата не вугламі, але пірагамі.

Дома й вуглы памагаюць.

Пасуда чыстату любіць.

Голад — найлепшы кухар.

Галоднаму хлеб на ўме.

Часам з квасам, а парою з вадою.

Калі ёсць хлеб і вада, то не бяда.

Без хлеба няма абеда.

Шукаючы пірага, хлеб згубіў.

Хлеб не зяць — паглядзяць ды з'ядзяць.

Жывём, хлеб жуём.

Едзеш на дзень — бяры хлеба на тыдзень.

Першы блін комам.

Ні рак, ні рыба.

Дорага ложка к абеду.

На то і кот гладак, што паеў і набак.

Не адзежа чалавека, а чалавек адзежу красіць.

Не стрыжана — голена.

Ладзь калёса зімою, а сані летам.

Не конь вязе, а дарога.

Хто пытае, той не блудзіць.

Баба з калёс — калёсам лягчэй.

Што з воза ўпала, то ўжэ прапала.

Лепш нічога няма свайго роднага вугла.

Для ўсякай птушкі сваё гняздо міла.

Жыве кулік, дзе прывык, і кожны роднае балота хваліць.

Няма смачнейшае вадзіцы, як з роднай крыніцы.

Чужбіна не грэець.

У чужой старонцы не так свеціць і сонца.

Што край — то абычай, што старана — то навіна.

Пакуль да Бога, то чорт душу выме; пакуль да цара, то пан і скуру здыме.

Наш пан, а ваш гаспадзін — чорт адзін.

У пана вочы завідушчыя, рукі заграбушчыя.

Толька й гора пану, што жывот баліць.

Калі пан смяецца — мужык плача.

Пан у шынку скача, а мужык у полі плача.

Не дай Бог панскай злосці, а яшчэ горай не дай Бог панскай ласкі.

Казаў пан: кажух дам, да й слова яго цёплае.

Пану не з'есці мужыка, бо тонка кішка.

Ці ад пана, ці цівуна, а ўсё баліць ад бізуна.

Рак не рыба, кажан не птушка, а няволя не жыццё.

Панскай работы не пераробіш (перадзелаеш).

Мужык у полі надрываецца, а ў пана пуза ўздымаецца.

Поп грабіць слаўцом, а пан бізуном.

Благая зямелька лепей добрага пана.

Не так будзе, як пан кажа, а так будзе, як мужык зробіць.

Не будзе аратага, не будзе і багатага.

Дзярэ каза лазу, а воўк казу, а мужык воўка, а поп мужыка.

Не так у папа воласы доўгі, як рукі.

Поп з жывога і мёртвага дзярэ.

За грошы поп і чорта пацалуе.

Ад папа, як ад чорта, не адхрысцішся.

Дванаццаць папоў, і кажды па-свойму моліцца.

— Хто ідзе? — Чорт! — Добра, што хоць не поп.

Няма нікому так, як ксяндзу ды кату: абодва ляжаць і хлеб задарам ядзяць.

Каза лазу дзярэ, казу дзярэ пастух, пастуха дзярэ пан, а пана дзярэ юрыст, а юрыста чартоў трыста.

Не чын уважаюць, а чалавека па яго праўдзе.

Балота без чорта не будзе.

Не давай, Божа, лячыцца ды судзіцца.

У каго карман паўней, таго і суд спраўней.

За курыцу судзішся, а гуся пад пахаю нясі.

Кабыла з ваўком цягалася — хвост ды грыўка асталася.

Хораша ў найме, ды не дай Божа мне.

Лепей з ваўком у лесе стрэцца, як на панскай печы грэцца.

Абы рукі, то служба будзе.

У парабках вякуючы, не разжывешся.

400 І так бывае: хто працуе, той не мае.

Наймалі — сала давалі, нанялі — хлеба не далі.

Моцны статак чарадою, а людзі грамадою.

Ідзі з людзьмі, то не згубішся.

Там добра рада, дзе шчыра парада.

Добрая слава лепш за багацце.

Пажыві для людзей — пажывуць і для цябе.

Адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве і ў полі не гаснуць.

Дзе дружна, там і хлебна.

Дружны табун і ваўкоў не баіцца.

Хто ў бядзе і ў вялікім няшчасці не быў, той і праўдзівых прыяцеляў не знае.

Не той друг, хто мёдам мажа, а той, хто праўду кажа.

Ліхая кампанія на ліха выведзе.

Блізкі сусед лепш дальняй радні.

Хата гасцямі багата.

Добрае слаўцо лепш за піўцо.

У гасцях каша, а дома кулеш, да за кашу лепш.

Гдзе любяць, бывай рэдка, а гдзе не любяць, ніколі.

Госць першы дзень — злота, другі дзень — срэбра, а на трэці — медзь і дадому едзь.

Любіш гасцяваць — любі і прымаць.

Бедны да беднага гарнецца, а багаты ад каго хочаш адвярнецца.

Той нічога не страціць, хто нічога не мае.

Сыты лічыць зоры ў небе, а галодны мае думку аб хлебе.

Як беднаму жаніцца, дык і дзень кароткі.

Не дзівіся худабе: сёння давялося мне, заўтра — табе.

Пакуль з багатага пух, то з беднага дух.

Багатаму і чорт у кашу маслам кідае.

Чым багацей, тым скупей.

Аднаму аж з горла прэ, а другі з голаду мрэ.

Так на свеце вядзецца: адзін плача, другі смяецца.

У кожнага свая асечка: у багатага не варыць жывот, а ў беднага — печка.

Не лезь, куды галава не лезе.

Па Сеньку шапка, па кучару калпак.

Усе людзі роўна родзяцца і роўна паміраюць.

Бяда і на гладкай дарозе спаткае.

Ты ад бяды, а бяда ў вочы.

Пасля бяды кожны разумны.

Калі адна бяда ідзе, то й другую за ручку вядзе.

Раней смерці не памірай, раней бяды не бядуй.

Чужую бяду і я развяду, а сваю і возам не развязу.

Чужой бядзе не радуйся.

Чы саву аб пень, чы пень аб саву, усё саве бяда.

Добра будзе — накрасуешся, кепска будзе — нагаруешся.

Хто гора пазнае, той чалавекам стане.

Людскому гору не радуйся.

Ліхому ўсюды ліха.

Як прыдзе ліха, то не ўседзіш ціха.

Не толькі сонца, што ў акне.

Ліха перамелецца — дабро наступіць.

Кажды купец свой тавар хваліць.

Якой меркай мерыш, такой і табе будзе адмерана.

Бачылі вочы, што купавалі.

На базары і бык цельны.

Ёсць — прадаў бы, няма — купіў бы.

Якія грошы, такі і тавар.

За морам цялушка палушка, ды руб перавозу.

Прадаць, то і сын прадасць, але купіць, то і бацька не купіць, як няма за што.

Смачны табе гарэх, да зубоў Бог не даў.

За свае грошы ўсюду харошы.

Розуму грашыма не заменіш.

402 Не журыся, што ў мяне грошай няма, дась Бог, што і ў цябе не будзе.

Не ганіся за даўгім рублём, а то і кароткі згубіш.

Пашкадуеш грошай, пабядуеш горшы.

Грошы здароўя не дадуць.

Не дае спаць чужы грош, як вош.

Старасць не радасць, доўг не карысць.

Лепей галоднаму пераспаць, чым з даўгом праснуцца.

Лучшы людзям даць, чым самому прасіць.

Дзякуй, як дасі, а калі не дасі, то й сам не прасі.

Лёгка бярэцца, ды цяжка аддаецца.

Угавор лепей грошай.

Карчмар як камар: дзе сядзе, там і п'е.

Як прышоў у карчму, чорт за кучму.

Шынкар п'яніцу любіць, ды дачкі за яго не аддасць.

Хлеб, соль, вада — салдацкая яда.

Салдату трошкі трэба: солі драбок ды хлеба шматок.

Салдат спіць, а служба ідзе.

Салдат ваюе, а дзеці дома гаруюць.

Або грудзі ў крастах, або галава ў кустах.

Вайна кроў людскую п'е.

Мора без вады, а вайна без крыві не бывае.

Лепей дома хлеб аўсяны, як на вайне пытляваны.

Батура — сабачча натура.

За Саса было досыць хлеба і мяса, а настаў Панятоўскі, стаў хлеб не такоўскі.

Не навіна казаку вайна.

На казаку няма знаку.

Як швед пад Палтаваю.

Збіраецца, як цар пад Рыгу.

Не за год Масква пастаўлена.

Масква слязам не верыць.

Грэўся француз у Маскве, а замярзаў на Бярозе.

Наша Бяроза чужых і генералаў тапіць можа.

Так турнуў, як Кутуз пранцуза.

Пякуцца французы, бы бульба ў прыску.

Баіцца холаду, як пранцуз.

Галодны француз і вароне рад.

Мусю француз, ці не з'ясі гарбуз?

Пайшла слава аж да Аршавы.

Панам беларускі пірог, а беларусам — астрог.

Асаднікі — прадажнікі.

Як мяне, мамачка, хлопцы любяць: як выйду на вуліцу, то за кулакамі свету не бачу.

Даганяўшы, не нацалавацца.

Ліхога любіць — сябе губіць.

Сілаю не быць мілаю.

Горка рэдзька, ды ядуць, ліха (дрэнна, кепска, плоха) замужам, ды ідуць.

Гора ж маё чубатае: ніхто замуж не бярэ, а толькі сватае.

Дай Бог нашаму цяляці воўка паймаці.

Якая песня — такія скокі; якая дзеўка — такія жаніхі.

З гультаём пажаніцца — лепей задавіцца.

Хто п'яніцу палюбіць — жыццё сабе загубіць.

Хоць бы дзеўка не коха, абы грошай панчоха.

Не перабірай, а то скулу схопіш.

Свату першая чарка і першая палка.

Адзін з'еш хоць вала, то адна хвала.

Згода будуе, нязгода руйнуе.

Нашто клад, калі ў сям'і лад.

Бусенькі, бусенькі — абое галюсенькі.

Хату мяці, але смецця на вуліцу не нясі.

І сцены маюць вушы.

І ў добрай сям'і выпадак бывае.

Чорт лапці стаптаў (падраў), пакуль пару дабраў.

Недасол на стале, перасол на спіне.

404 Не кайся рана ўстаўшы, замоладу ажаніўшыся.

Чужая хата не грэе.

Як дзеўкаю — арэ і косіць, як выйдзе замуж — ног не носіць.

Хоць муж, як лапаць, абы за ім не плакаць.

З старым жыць — ваўком выць.

Любіць муж жану здаровую, а брат сястру багатую.

Не хвалі жонку за цела, а хвалі за дзела.

Добрая жонка дом зберажэ, а ліхая рукавом растрасе.

Сварлівая жонка горш, чым каню хамут.

Жонку ў яму, а сам на другую гляну.

Апошняя ў папа жонка.

З бабаю і чорт не зладзіць.

Дзе чорт сам не справіцца, туды бабу пашле.

Другой маткі не найдзеш.

Няма такой крамы, што купляюць мамы.

Сваю дачку пазнаю ў андарачку.

Я за свайго Кузьму каго захачу вазьму, а ты сваю Арынку павазі па рынку.

Што кажа стары на глум — бяры малады на вум.

Стары вол баразны не псуе.

За старою галавою, як за пнём.

Прымачы хлеб — сабачы.

Хто ў прымах не бывае, той і гора не знае.

Прымак — тэй жа парабак.

Жонка не бот — не скінеш.

Бог сіротаў любіць, але долі не дае.

Ніхто не ведае, як сірата абедае.

Баба без мужыка, як калёсы без каня.

Удаву па двары пазнаеш.

Кума з возу — каню лягчэй.

«Чые дзеткі харашэйшыя?» — «Мае,— кажа сава.— І лупаценькія, і кашлаценькія».

Каторага пальца не ўрэж, то ўсё баліць.

Усякая матка хваліць сваё дзіцятка.

Даў Бог дзеці, ды няма дзе дзеці (падзеці).

Без дзяцей ціха, ды на старасці ліха.

Дзе многа нянек, там дзіця без носу.

Яйца курыцу вучаць.

Ласкавае дзіцятка дзве маткі ссе, а гордае ні адной.

Што робіць воўк, то і ваўчаня.

Яблыка ад яблыні далёка не адкачваецца.

Сава не ўродзіць сакала.

Дасі дзецям волю, адбярэш долю.

Да пяці год пястуй дзіця, як яечка, з сямі — пасі, як авечку — тады выйдзе на чалавечка.

Тагды дзяцей вучаць, як каля лаўкі ходзяць.

Не слухаў бацькі і мацеры, няхай людзі вучаць.

Дзесятая вада на кісялю.

Радня да паўдня, сонца зайшло — і ўсё к чорту пайшло.

У вас адпелі, а ў нас ад'елі.

Пра нябожчыка блага не кажуць.

Бог не дасць — свіння не з'есць.

Бог не гуляе, многа палатна мае ды бедным торбы нагатаўляе.

Беднаму Бог не залоціць парог.

Хоць бедны ох, то не слухае Бог.

У Бога многа, але не для нас.

Ведаў Бог, каму не даў рог.

Божая міласць — як вада на плыт.

Не кідае Бог пірагамі, а дагары нагамі.

Няхай табе Божа паможа, а мне вол.

Богу маліся, а за праўду дзяржыся.

Нечага таму Богу маліцца, каторы нашых малітваў не прымае.

Што Богу здарылі, тое згубілі.

Абяцаў Бог даць, але казаў паждаць.

Божая ласка не дасць нам ні хлеба, ні мяска.

406 Бог шчырых любіць, але долі не дае.

На Бога надзейся, а сам не плашай.

На Бога надзейся, калі хлеб у торбе.

Бог як Бог, а не будзь сам плох.

Богу маліся, а сам працуй, бо згаладуеш.

Бог не бачыць з неба, што на падаткі грошы трэба.

Чаго чалавек не зможа, то і Бог не паможа.

Чакай збавення з неба, а тым часам хлеба трэба.

Бог жыве сабе на небе і не думае аб хлебе.

Смяяўся і плакаў, а ўсё Бог аднакаў.

Плакаў, плакаў — Бог аднакаў, стаў спяваці — стаў Бог даваці.

Калі Бог прыстане (прычэпіцца), то і хлеба не стане.

Бог нікому не дапамог.

Госпадзі ў Рослаўлі, а прачыстая ў Мсціславе, а ўсё грошы выцісні.

Пакуль да Бога, то чорт душу выме.

Богава дорага, чортава дзёшава — лепей сваё мець.

Пакуль да Бога, то святыя дух выймуць.

Святыя ўгоднікі на п'янку ўгодлівы: што ні дзень, то свята.

Як Бог дапусціць, то і святыя не абароняць.

Кожны святы да сябе горне.

Калі не пад'ясі, і святых прадасі.

Вольнаму воля, святому рай.

Бачылі чудатворцы, якія мы багамольцы.

Чытае: да будзе воля твая, а думае: каб мая.

Ад малітвы і паніхід толькі поп адзін сыт.

З аднаго дрэва і крыж і лапата.

Не хадзіў пляшывы Богу маліцца, як пайшоў, дык і лоб разбіў.

На табе, Божа, што нам не гожа.

Без грошай то і збавення няма.

Рад бы ў рай, да грахі не пускаюць.

Мінулася кату масленіца.

Каму пост, а папу мясаед.

Перад Богам грэх, перад людзьмі смех.

Пакуль гром не загрыміць, мужык не перажагнаецца.

Надвое бабка варажыла.

Вучэнне — свет, а невучэнне — цемра.

Вучыся, нябожа, вучэнне паможа.

Вучыцца заўсёды прыгадзіцца.

Навука вочы адчыняе.

Ад навукі галава не баліць.

Навука — не мука.

Ад навукі дужэюць (спрытнеюць) рукі.

Дрэнныя тыя рукі, што не ведаюць ніякай навукі.

Хто без навукі, той як бязрукі.

Чалавек невучоны, як тапор нетачоны.

Невучоны што сляпы.

Век жыві, век вучыся.

Дурнога вучыць, як мёртвага лячыць.

Заўсёды людзі кажуць: старайся, вучыся, а то дурнем памрэш.

І мядзведзя вучаць.

Што напісана пяром, не высечаш і тапаром.

Як многа чытае, то многа знае.

За словам у кішэню не лезе.

Хоць рэдка, ды метка.

Хоць гаршком назаві, толькі ў печ не станаві.

Кайся не кайся, выпусціў слаўцо — не вернеш.

Слова як птушка: выпусціў — не вернеш.

Старая пасловіца вавекі не зломіцца.

На прымаўку і суда няма.

Добрая прыказка не ў брыво, а ў вока.

Рынуў прымаўкаю, як граззю ў вочы.

На прыказкі, як на прывязкі.

Салаўя байкамі не кормяць.

Песня дарогу пазнаець.

Дзе праца, там і песня.

З песняй і работа спорыцца.

У дурнога салаўя і дурная песня.

З песні слова не выкінеш.

Славен бубен за гарамі.

Абы ўмела танчыць, работку гора наўчыць.

Маленькі, але ўдаленькі.

Мал залатнік, да дораг.

Нос — на семярых рос.

Сіла й салому ломіць.

Няма лепшага багацтва над здароўе.

Здароўя за грошы не купіш.

Каму баліць, той і крычыць.

Пакуль жаніцца — загаіцца.

Жывы аб жывое і думаець.

Жывы ў зямлю не палезеш.

Маладога кроў грэе.

Малады, ды з ранніх.

Быў конь, да з'ездзіўся (заездзіўся).

Старога вераб'я на мякіну не падманіш (не ашукаеш, не зловіш, не правядзеш).

Пытае старасць, што прыгатавала моладасць.

Сівізна ў бараду, а чорт у рабро.

Старога мяшка не залатаеш.

У старога каня і падковы знімаюць.

У адной шкуры не звякуеш.

Да пары жбан ваду носіць.

Розум — найлепша багацтва.

Усякі жыве сваім розумам.

Хто дасужы, той разумны.

Якая галава, такі і розум.

Бачыць вока далёка, а розум яшчэ далей.

Які розум, такая й гаворка.

Разумная галава, ды дурню прышлася.

Каб задні розум ды наперад.

Пагавары з разумным — розуму набярэшся, а з дурным, то згубіш тое, што маеш.

Грошы згубіў — нічога не згубіў, здароўе згубіў — палавіну згубіў, розум згубіў — усё згубіў.

Ён здурнеў з вялікага розуму.

П'яніца праспіцца, а дурань ніколі.

Вырас пад неба, а дурны, як трэба.

Вялікая галава, да пустая.

Дурная галава нагам спакою не дае.

Вінавата галава, куда ногі вяла.

Пашлі дурнога, за ім другога.

Скажы дурному паклоны біць, то ён і лоб разаб'е.

Дурному дурное на ўме.

Лепш з разумным згубіць, як з дурным (дурнем) найці (знайсці).

Дурня пахвалі, дык ён і на неба задзярэцца.

Не зачапайся з дурнем.

Дурному трэба выбачыць.

Малому дурню саступаюць, вялікага б'юць.

Справядлівага чалавека Бог любіць, да яму шчасця не дае.

Для добрага чалавека дабра не шкода.

Добраму ўсюды добра.

Злосці поўныя косці.

Сам мужычок з кулачок, а зла, як у казла.

Крывога дзерава не выпраміш.

І ў царкву ходзіць, і людзям шкодзіць.

Лепей з добрым згубіць, як з благім знайсці.

Не чапай сабаку, ён і гаўкаць не будзе.

Колькі воўка ні кармі, а ён у лес пазірае.

410 Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота, там пуста.

Праца чалавека корміць, а лянота порціць.

У гультая рукі не баляць.

Хто змоладу не працуе, той на старасць жабруе.

Гультай ды злодзей — два родных браты.

Палец аб палец не ўдарыць.

Яму раніцаю росна, у поўдзень млосна, а ў вечары камары кусаюць.

На яду мастак, а на работу сяк-так.

Есць за вала, робіць за камара.

Як да чаркі — скоры, як да працы — хворы.

Ядзім — пацеем, работаем — мерзнем.

Не еў, дак млеў, пад'еў, дак спаць захацеў.

Не хваліся языком, а хваліся дзелам.

Лянівы і санлівы — два браткі.

Пад ляжачы камень вада не цячэць (не бяжыць, не падплыве).

На адном месце і камень абрастаець.

— Гультай, бяры сухары.— Яны мочаныя?

Гультай за дзела — мазоль на цела.

Конь на чатырох нагах спатыкаецца.

Скупы два разы плоціць, лянівы два разы ходзіць.

Чужымі рукамі добра толькі жар заграбаць.

Адна звычка гультаёў: рабіць чужымі бакамі, а ляжаць на сваіх.

Няўмеламу рукі не баляць.

Калі ўзяўся за гуж, то не кажы, што нядуж.

Калі ўлез у дугу, не кажу «не магу».

Калі адзеў хамут, дык цягні, пакуль гужы не парвуцца.

Калі не грыб, не лезь у каробку.

Калі не поп, не ўбірайся ў рызу.

Ні Богу свечка, ні чорту галавешка (качарга, кучма).

Адважны не баіцца няўдачы.

Ці пан, ці прапаў.

У страха вялікія вочы.

Баязліваму й капа стогам здаецца.

Хто баіцца, таму ў вачах дваіцца.

Як п'ян, што мне пан? А як праспюся, і свінні баюся.

Воўк сабакі не баіцца, да звягі яго не любіць.

Хто апарыўся малаком, той і на халодную воду дуе.

Сцеражонага Бог сцеражэ.

Беражыся каровы спераду, а каня ззаду.

Цярпі, казак, атаманам будзеш.

Гавары яму — стрыжана, а ён табе — голена.

Каса на камень трапіла (нашла).

Трапіў лысы на пляшывага.

Справіць гарбатага магіла.

Лысае жарабя ўрадзілася, лысае і здохнець.

Каму рупіць, той не спіць.

Малады верабей, ды спрытны.

Ішла разявака і дастала аглоблямі ў рот.

Адным вухам слухае, а другім выпускае.

Ад зямлі адарваўся і да неба не дастаўся.

Абы сумленне чыста.

Нікому вады не замуціў.

Брахнёю (абманствам, лгарствам, няпраўдай) свет пройдзеш, назад не вернешся.

У яго на вербе грушкі растуць.

Хітрасцю доўга не нажывеш.

Хітрасцю ўвесь свет перайдзеш, а назад не вернешся.

Хто ліслівы, той куслівы.

Зміцер то хіцер, да і Саўка не дурак.

Людзі хітрэй за чорта.

Кось-кось, ды й у аглоблі.

На хітрасць дай Бог мудрасць.

Злітаваўся рак над жабаю да й очы выдраў.

Пажалеў воўк кабылу: аставіў хвост да грыву.

412 На губах — мёд (медзь), а на сэрцы — лёд (ледзь).

Хоць мякка сцеле, але цвёрда спаць.

У вочы лісам, а за вочы воўкам.

З воч іскры сыплюцца, а з языка мёд цячэ.

Ніяк не глядзіць — ні вока, ні бока.

Да сэрца ліпне, а ў кішэнь паглядае.

Ён цябе прадасць і грошы палічыць.

Не бойся сварлівага, а бойся маўклівага.

Не бойся ліхога, а бойся ціхога.

У ціхім балоце чэрці растуць.

Ціхая свіння глыбока капае.

Спадцішка, як з-пад мяшка.

Паклонамі шубы не пашыць.

Гібкага дзерава вецер не зломіць.

Па шэрсці трэба гладзіць.

Лоб нізкі, нос склізкі, відаць, што лізаў панскія міскі.

Падліза падлізаю і застанецца.

Хоць яму ў вочы плюй.

У сквапнага горла вяліка.

Хцівы і Бога прадаў бы.

Усяго на свеце не заграбеш.

У труну ўсяго табе не ўложаць.

Горла шырока, ды кішка тонка.

Чым дабру прападаць, няхай жывот лопне.

Сам не гам і другому не дам.

Скупы два разы траціць.

Сам сябе не хвалі, няхай людзі пахваляць.

Хто сябе хваліць, няхай таго агонь спаліць.

Гаварыла свіння, што даўно б каралём была, але лыч не пускае.

Адным махам сем сот душ забіяхам.

На капейку ўпіўся, на рубель пахваліўся.

Не пераскачыўшы, не кажы гоп.

Без фігі (дулі) ні да носа.

Відаць птушку па яе палёту.

Не ўсё то золата, што блішчыць (свеціць).

Стыд не дым — вачэй (вочы) не выкура.

Паганыя вочы дыму не баяцца.

П'янства (гарэлка) да дабра (да добрага) не давядзе.

Вада жывіць, а гарэлка губіць.

Без чаркі няма хваробы і сваркі.

Калі мужык п'е, то палавіна бяды, а калі жонка, то цэла бяда.

Ад водкі розум кароткі.

Хлеб на ногі ставіць, а гарэлка з ног валіць.

Хто п'яны ходзіць, сам сабе шкодзіць.

Хто гарэлку любіць, той сам сябе губіць.

Хто п'е, той доўга не жыве.

Бачыш, пані (дружа), як гарую: з адной карчмы да ў другую.

Як п'е, то як у бочку лье.

П'яны і мора выпіваець.

Усей гарэлкі не вып'еш.

Што ў цвярозага на вуме (на мыслі, на думцы, у галаве), то ў п'янага на языцэ.

П'яны што й дурны.

П'янаму і мора па калена.

П'янаму вуліца вузкая.

Як п'ян, тады ўсім пан.

Сядзіць нядуж: налізаўся, як вуж.

Ідзець Іван, вельмі п'ян, за ім Якаў паўзе ракам — той не п'яны.

Дзе гарэлка, там і слёзы.

Калі хочаш прапасці, начані (ідзі) красці.

Крадзеным доўга не пажывеш.

Крадзеным сыты не будзеш.

Крадзена не ідзе ў карысць.

414 Крадзеным падавішся.

У лесе крадзеш — поле ўбачыць, на полі крадзеш — лес убачыць.

Па нітачцы і клубок знайдзеш.

Як украў, то й прапаў.

Пусціў воўка ў аўчарню (аўчарнік).

На злодзею (і) шапка гарыць.

Хто парася ўкраў, таму ў вушах пішчыць (вішчыць).

Не той злодзей, што ўкраў, ды той, што кепска схаваў.

Хоць украў, абы канцы схаваў.

Не ўзяў за руку, не кажы злодзей.

Шукай у полі ветру.

Быў і на кані, і пад канём.

Дзяржы язык за зубамі.

На чужы раток не павесіш замок.

Слова не кідай на вецер.

Слухам зямля поўна (поўніцца).

Па сакрэту, ды ўсяму свету.

Не смейся з людзей, ты сам смяшней.

Смех без прычыны — прызнак (адзнака, знак) дурачыны.

Век пражыць — не кашулю пашыць.

Старасць не радасць, а смерць не пацеха.

Сабацы сабачча і смерць.

У кожнага свая дарога.

Шчасце само ў рукі не ідзе.

Шчасце не конь — у аглоблі не запражэш.

Хутчэй шчасце згубіць, як найці.

Не радзіся красны, а (радзіся) шчасны.

Ад дабра дабра не шукай.

За добрае добрым плаціць трэба.

Нарабіў ліха — не чакай дабра.

Любіў добрае, палюбі ж і злое.

На праўдзе свет стаіць.

Праўда не ўтоне і не згарыць.

Праўда вочы коліць.

За праўду не гневаюцца.

Не ўсё праўда, што кажуць.

Хлеб-соль еш і праўду рэж.

Кожнаму крыўда не міла.

Лепей горкая праўда, як салодкая мана.

Чужое ў карысць не пойдзе.

Чужым багацтвам сыт не будзеш.

Чужым дабром не забагацееш (не збагацееш).

Чужое не грэець.

Чужы кажух (нікога) не грэе (не нагрэе).

З чужога не радуйся (не цешся).

Хто сумленне мае, той чужога не чапае.

Чужы кусок дзярэ раток.

На чужы каравай рота не разявай (не разяўляй).

Не чапай нікога, не бойся нічога.

Хто чужога не шкадуе, той свайго не мае.

Жыві не так, як хочацца, а як можацца.

Трэба так жыць, як набяжыць.

Як гукнеш, так і адазвецца (адгукнецца, адклікнецца).

У людзей пытай, да свой розум май.

Жыві сваім розумам.

Агню ў шапцы не носяць.

За двума зайцамі пагонішся — ні аднаго не паймаеш.

Не шукай мора — у лужы ўтопішся.

Хутка йдзеш — бяду найдзеш, памалу ідзеш — бяда цябе нагоніць.

Шануй людзей, то і цябе пашануюць.

Не чыні таго другім, што табе не люба.

Не капай на каго (на чалавека) ямы, бо сам упадзеш.

Ад добрага не ўцякай і блегога (ліхога) не рабі.

416 Не рабі каму бяды, бо сам яе сустрэнеш.

Не плюй у крыніцу: прыдзеш па вадзіцу.

Кінь перад сабою — знойдзеш за сабою.

Калі робіш дрэннае для людзей, то робіш дрэннае для сябе.

Дзе ўзяў, там палажы.

Не падымай носа — спатыкнешся.

Паперад бацькі ў пекла не хватайся.

Еш пірог з грыбамі ды дзяржы язык за зубамі.

Не спамінай ліхога.

Няма чаго наперад загадваць.

Любіш катацца (ездзіць), любі і саначкі вазіць (цягаць).

Не кіем, да палкаю.

У чужым воку і порах відна, а ў сваім калода не відна.

Чалавек сабе не вораг.

Дзе тонка, там і рвецца.

Каб ведаць, дзе павалішся, саломкі бы падсцяліць.

Адзін жне, а другі ў цянёк жме.

Працаваць яму лень, а крычыць: мала на працадзень.

Хто не робіць — той не есць.

Трактар у полі — хлеба ўволю.

Пасееш машынаю — хлеба збярэш асьмінаю.

Не той зямлі гаспадар, хто па ёй ходзіць, а той, што па ёй трактар водзіць.

Калі хочаш, каб быў ураджай,— агратэхніку павышай.
Не шкадуй гною, будзеш мець хлеба ўволю.

Вясна красна кветкамі, а калгас палеткамі.

У даяркі малако ў руцэ, а ў каровы на языку.

Той брыгадзір прыгож, у каго ўраджай харош.

Які брыгадзір, такая і брыгада.

Агранома хваляць не за белыя рукі.

Каб у пашане быць, трэба працу любіць.

Гультаю ўдарнік не напарнік.

Не хваліся, план складаючы, пахваліся, год канчаючы.

Хваляць — заткні вуха, крытыкуюць — слухай.

Не навучышся выконваць каманду, не здолееш камандаваць і сам.

Салдат без дысцыпліны хварэе, ад дысцыпліны здаравее.

Прыняў прысягу — ад яе ні шагу.

Хто за Радзіму гарой, той сапраўдны герой.

Граматнаму быць — па-новаму жыць.

Мір ясны ад сонца, а чалавек ад навукі.

У каго веды, у таго і сіла.

Цяпер без навукі і каровы не дояць.

Вучы народ, вучыся і ў народа.

На працягу ўсяго века кніга вучыць чалавека.

Паможа шаптуха, як мёртваму кадзіла.

Пры добрым жыцці і песні вясёлыя.

Не тое багацце, што цесць з цешчаю далі, а што маладыя самі нажывалі.

Не давай праходу фрыцу — ратуй родную зямліцу.

Фашысцкую заразу знішчай адразу.

Ворагаў не лічаць, а б'юць.

Закон савецкага байца — біць фашыстаў да канца.

І песня, і граната — зброя салдата.

Салдацкае дзела — ваяваць храбра і ўмела.

Сорак фашыстаў, двое нас, ды смякалка пра запас.

У беларускім краі не быць фашысцкай зграі.

Савецкая сіла — ворагу магіла.

Кожнай фашысцкай гадзіне вісець на перакладзіне.

Фашысцкі салдат — разбойнік і кат.

Фашысцкі лад — пятля ды кат.

Ішлі немцы па куры, а папалі на свае хаўтуры.

Гітлераўцы ўвесь свет з'елі б, ды кішкі тонкія.

Кожны куст для фашыстаў рызыка: трасе іх трасца, кідае ў дрыжыкі.

Дзе партызаны жывуць, там фашысты мруць.

Фашысту служыць — рабом быць.

Здраднік за агрызкі прадасць родных і блізкіх.

Бургамістр ды кат — адзін другому брат.

Для прадажнай (фашысцкай) псіны — кол з асіны.

Астроўскі — сабака гітляроўскі.

Ад вялікіх «перамог» не пацягнуць фашысты ног.

Фашысты высока масціліся, ды нізка звaліліся.

Няпраўдай фашысты ўсю Еўропу заваявалі, але дамоў не папалі.

Беларус — не трус: ад яго Кубэ здох, як прус.

Гітлер хацеў Расію праглынуць, але Масквою падавіўся.

Гітлер да Волгі дайшоў, а здох у Берліне.

Фашыст брэша, як сабака ў лесе.

Сабака віляе хвастом, а Гебельс языком.

Што Гебельс пляце, усё наадварот ідзе.

Будзе з дучэ гною куча.

Пераступілі фашысты наш парог, ды асталіся хто без рук, а хто без ног.

Ішоў да нас ваякам, а назад поўз (паўзе) ракам.

На Маскву ішлі фашысты з падскокам (скокам), а назад пакаціліся бокам.

Кубэ крута панаваў, ды скора і дуба даў.

Зайшоў фашыст у Сталінград — ні наперад, ні назад.

Прапаў, як фашыст пад Сталінградам.

Мір будуе, а вайна руйнуе.

Добрым людзям — мір, а шаленцам — галавою ў вір.

Добра працуеш — мір мацуеш.

Аб міры на зямлі дбаем, хоць звышмагутныя ракеты маем.

Хто пасее вецер, той пажне буру.

Загадкі



Загадка — кароткае паэтычна-вобразнае апісанне прадмета або з'явы, якое даецца, як правіла, у форме пытання і адгадваецца па другарадных адзнаках, па прыкметах падабенства.

Загадка, як і прыказка, прымаўка і прыпеўка, адносіцца да фальклорных жанраў малых форм. Лічыцца, што галоўная функцыя загадкі — развіваць у чалавека мастацка-вобразнае мысленне, паэтычны погляд на рэчаіснасць. У мінулым загадка служыла сродкам выпрабавання разумовых здольнасцей, іншасказальная, загадкавая форма з поспехам выкарыстоўвалася ў ваенных і пасольскіх справах. Загадкі, песні-загадкі надзвычай шырока ўжываліся ў вясельных абрадах, напрыклад, з мэтай «праверкі» разумовай сталасці жаніха.

У побыце дарэвалюцыйнага сялянства загадка займала важнае месца. Доўгімі зімовымі вечарамі моладзь і старэйшыя людзі, сабраўшыся ў якой-небудзь хаце, арганізоўвалі займальныя спаборніцтвы загадачнікаў. Загадка пашырала кругагляд чалавека, развівала яго фантазію, кемлівасць, назіральнасць, трэніравала памяць, прывучала да развагі, аналізу. Раскрыццё затоенага сэнсу загадкі было працэсам, які нёс вялікую выхаваўчую ролю: у чалавека складваліся, замацоўваліся і паглыбляліся пэўныя веды аб навакольным свеце. Загадка перадае змест праз высокі мастацкі вобраз, поўны часам нечаканых параўнанняў, супастаўленняў, збліжэнняў і паваротаў.

Цяпер гэты старажытны жанр страціў сваю сур'ёзную актыўна-грамадскую функцыю і стаў сродкам забавы і пацехі — творчасцю дзяцей і для дзяцей.

Каштоўнасць традыцыйнай загадкі ў тым, што яна ў высокапаэтычнай форме адлюстравала гаспадарчую і працоўную дзейнасць чалавека, яго жыццёвы вопыт, быт, працу, фауну, флору, будову сусвету і да нашых дзён мае вялікае эстэтычна-мастацкае значэнне для выхавання дзяцей.

ЛІТАРАТУРА

Никифоровский Н. Я. Простонародные загадки. Витебск, 1898.
Рыбникова М. А. Загадки. М.; Л., 1932.
Загадкі /Склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. Мн., 1972.
Гілевіч Н. С. Паэтыка беларускіх загадак. Мн., 1976.

Сіняя дзяружка ўвесь свет накрыла. *(Неба)*

Вісіць сіта, залатое, навітое. *(Сонца)*

Усе яго любяць, чакаюць, убачуць — адразу заплачуць. *(Сонца)*

420 Як зойдзе ў дом — не выганіш калом, а пара прыходзіць — ён і сам уходзіць. *(Прамень сонца)*

З акна ў акно — залатое верацяно. *(Прамень сонца)*

Сярод поля ляжыць капыток. *(Маладзік)*

Лысы конь церазь вароты глядзіць *(Месяц)*

На полі Ярох рассыпаў гарох; стала світаць — няма чаго сабіраць. *(Неба і зоры)*

Без кораня, а расце. *(Камень)*

Ляцелі тры галкі, селі на праталкі. Адна кажа — паляжым, другая — пабяжым, трэцяя — паківаемся. *(Камень, вада, трава)*

Без ног бяжыць, без воч глядзіць. *(Вада)*

Карова бяжыць, скура ляжыць. *(Вада і лёд)*

Дзед мост масціў без сякеры, без долата. *(Лёд)*

Бегла ліска каля лесу блізка: ні сцежкі, ні дарожкі, толькі залатыя рожкі. *(Маланка)*

Ішоў даўгавяз — у сырую зямлю ўвяз *(Дождж)*

Мяне ўсе просяць, мяне ўсе чакаюць, як толькі з'яўлюся — хавацца пачынаюць. *(Дождж)*

Без чаго чалавек не можа жыць? *(Без імя)*

Чаго нельга абнесці кругом хаты? *(Вады ў прыполе)*

На што каню хамут кладуць? *(На шыю)*

Які ў моры камень? *(Мокры)*

Пад якім кустом заяц сядзіць, як дождж ідзе? *(Пад мокрым)*

Без чаго хаты не пабудуеш? *(Без стуку)*

Чаму пастух пугу носіць? *(Бо сама не ходзіць)*

Што бывае пасля сямі гадоў? *(Восьмы год)*

Ляцела сарока, за ёю сорак. Колькі ляцела сарок? *(Дзве)*

Дзве дачкі, дзве маці і бабулька. Колькі ўсіх? *(Трое — бабка, маці і дачка)*

Ляцелі галкі, селі на палкі. Сядуць па адной — галка лішняя, сядуць па дзве — палка лішняя. Колькі было галак і колькі было палак? *(Тры палкі і чатыры галкі)*

Якая з'явілася новая зорка? *(Чырвонаармейская)*

Хто ўвесь век жыве маладым? *(Камсамол)*

Пайду ў лес, высяку цялеш; з таго целяша і века, і дзяжа, і булачка хлеба. *(Дуб і жолуд)*

Пайду я ў лес, вырублю цяльнеш, з таго цельняша — дзве плашкі дроў, двое начоў, адзін карэц і шыла канец. *(Жолуд)*

Не разаб'еш гаршчочка, то і не з'ясі кашы. *(Арэх)*

Стаіць певень над вадою з чырвонаю барадою. *(Каліна)*

Усю зямлю прайшоў, чорну шапачку знайшоў. *(Грыб)*

Хоць у капелюшы, а галавы не мае. *(Грыб)*

Як радзіўся, так за кій ухапіўся. *(Хмель)*

Загадаю загадку, закіну за градку; у адзін год пушчу, у другі выпушчу. *(Азімае жыта)*

На коніку сем саколікаў, кожны ў капаточку. *(Авёс)*

Длінней пана вусы. *(Ячмень)*

Прыйдзе восень — заб'ю лося: галаву з'ем, шкуру аблуплю, а мяса за плот выкіну. *(Лён)*

Білі мяне, білі, білі, калацілі, на полі цягалі, клоччамі ірвалі, на ключ запіралі і на стол саджалі. *(Лён)*

Косці на лагу, скура на таргу, а галава ў клеці. *(Канопліі)*

Чорная свінка мае тры спінкі. *(Грэчка)*

Сядзіць панна ў чырвоным кафтане. Як узялі разбіраць — сталі плакаць, наракаць. *(Цыбуля)*

Ляжыць грушка ў чырвоным кажушку. Хто яе ўкусіць, той плакаць мусіць. *(Цыбуля)*

Лата на лаце, ніткі не знаці. *(Капуста)*

Хата пуката, поўна вераб'ёў нагната. *(Гарбуз)*

Дзеўка ў каморы, а яе косы на дворы. *(Морква)*

Галава пляшывая, што ў ксяндза,— ды не ксёндз, барада калтамая, што ў папа,— ды не поп. *(Рэпа)*

Была птушка брыкацён, віла гняздо за сем дзён, звіла гняздо за плотам, знесла яйцо за гняздом. *(Агурок)*

Поўна дзежачка круп, а наверсе струп. *(Мак)*

Пад адным брыльком семсот казакоў. *(Мак)*

Зранку ходзіць на чатырох нагах, удзень — на дзвюх, а ўвечары — на трох. *(Чалавек у розным узросце)*

Што любіш, таго не купіш, а чаго не любіш — не прадасі. *(Маладосць і старасць)*

Прыйшоў нехта, узяў нешта: ні яго дагнаць, ні ў яго адабраць. *(Смерць)*

За табою стаіць дуб, ніхто яго не абыдзе, ніхто яго не аб'едзе: ні цар, ні царыца, ні красна дзяўчіца. *(Смерць)*

Ляжыць калода пасярод балота: не гніе, не сохне. *(Язык)*

Каля прарубы стаяць белы галубы. *(Зубы)*

Цераз мяжу брат брата не бачаць. *(Вочы)*

Чатыры чатырнічкі: на кожным чатырнічку па пяць пятернічкаў *(Рукі, ногі, пальцы)*

За вушы два канцы дугі трымаюць мора берагі. *(Почапка вядра)*

Дзве галачкі сядзяць на адной палачцы. *(Каромысел і вёдры)*

Сам худ, а галава з пуд. *(Бязмен)*

У аднаго парсюка два лычы. *(Начоўкі)*

На той свет ідзе — скача, з таго свету ідзе — плача. *(Вядро ў студні)*

422 У лес ідзе — дамоў глядзіць, дамоў ідзе — у лес глядзіць. *(Сякера за поясам)*

Маленькі Данілка ў пяцельку ўдавіўся. *(Гузік)*

Сяджу на нагах, а хаджу на галаве. *(Цвік у ботах)*

Браты за братамі гоняцца, ды дагнаць не спаромяцца. *(Колы)*

Бягуць сычыкі, задраўшы лычыкі. *(Сані)*

Паўзулькі паўзуць, рагулькі вязуць, едуць пана калаціць, што на лузе стаіць. *(Сані)*

Еду, еду — ні дарогі, ні следу: конь без хваста, пуга без пасвіста. *(Лодка)*

Жывая жывулечка на жывым крэсле сядзіць і жывы абед абедае. *(Маці корміць дзіця)*

Сяло заселена, а пеўні не пяюць і людзі не ўстаюць. *(Могілкі)*

У лесе знята, да хаты ўзята, на руках плача, а не дзіця. *(Скрыпка)*

Хто з жывога і з мёртвага бярэ? *(Поп)*

Божжу хвалу за хвост цягаю: хвала крычыць, што хвост баліць. *(Звон)*

Хто ляціць без крылаў? *(Вецер)*

Што зімою камлём угору расце? *(Ледзяшы)*

Што без вады плавае? *(Воблака)*

Без чаго хлеб не спячэш? *(Без скарынкі)*

Хто гаворыць на ўсіх мовах? *(Язык)*

Што ў вадзе сохне, а ў печы мокне? *(Воск)*

Баба-Яга, віламі нага; увесь свет корміць, а сама галодная. *(Саха)*

Дзіравае радно ўсё поле збегла. *(Барана)*

Рыбка бялява хвосцікам віляла, лясы ламала, горы стаўляла. *(Каса)*

Бацька з сажань, матка з пядзень, а дзеткі па мязінцу. *(Граблі)*

Рота няма, а зубы маюцца. *(Граблі)*

Гарбаты дзядок усё поле аббегаў. *(Серп)*

Сам я тонак, як паясок, у мяне востранькі насок. Як выйду на поле ваяваці проціў высокенькіх панічоў у злаце, яны мяне паясаюць, а мае востранькія зубкі іх усіх перакусаюць. *(Серп)*

Аснова саснова, уток саламяны. *(Азярод)*

Хата рагата, вокан багата. Як улезеш — не вылезеш. *(Рыбацкая сетка)*

Семсот варот, адзін уваход. *(Невад)*

Сама пад страхою, а хвост мокры. *(Кудзеля)*

Чым я больш вярчуся, тым я больш таўсцею. *(Верацяно)*

Пяць козак смокчуць стажок, а пяць у поле ідуць *(Пальцы і кудзеля)*

Крыж на крыжы; хто ведае — не кажы. *(Клубок)*

Жоўценькі вепручоначак між загародак бегае. *(Чаўнок)*

Бегла свінка, залатая спінка, льняны хвосцік. *(Іголка)*

Б'юць мяне палкамі, пнуць мяне камнямі, рэжуць мяне нажамі. За тое мяне глумяць, за што мяне любяць. *(Хлеб)*

Жалезны ток, свінячы пераскок, аўсяная пасцель. *(Скаварада, падмазка і блін)*

У вадзе родзіцца, а вады баіцца. *(Соль)*

Вутка ў моры, а хвост на заборы. *(Апалонік)*

Худ канёк, а ўсё возера выпіў. *(Лыжка)*

Чатыры шчучкі, галоўкі ў кучцы, тулава па-рознаму. *(Сцены, вуглы)*

Сядзіць дзядок, на хату гарбок. *(Крук у сцяне)*

Маці таўстуха, дачка краснуха, а сын перабор выскачыў на двор. *(Печ, агонь, дым)*

Стаіць бычок, асмалены бачок. *(Засланка)*

Сізы Салівон пайшоў вон. *(Дым)*

Два стаяць, два ляжаць, пяты ходзіць, за пуп водзіць. *(Дзверы, вушакі і чалавек)*

Не брэша, не кусае, а ў хату не пускае. *(Замок)*

Поле шкляное, а межы дрывяныя. *(Акно)*

Чырвоны пеўнік па жэрдачцы сунецца. *(Агонь на лучыне)*

Сам голы, а сарочка за пазухай. *(Свечка)*

Пад адной страхой чатыры браты стаяць. *(Стол)*

Бабка-крываножка на золаце скача. *(Качарга)*

Быў я на капанцы, быў я на кружанцы, быў на пажары, быў на базары; малады быў — увесь свет карміў, а як стары стаў — пелянацца стаў; давялося ж паміраць — некаму касцей пахаваць. *(Гаршчок)*

Жывы — чорны, памрэ — чырвоны. *(Рак)*

Без станка і без рук, а кросны тчэ. *(Павук)*

Вісіць сіта, не рукамі звіта. *(Павуціна)*

Крыллі — арловы, хобат — слановы, грудзі — каніныя, ногі — ільвіныя, голас — медны, нос — жалезны, мы яго біць, а ён — нашу кроў ліць. *(Камар)*

Ляціць — вые, сядзе — зямлю рые. *(Жук)*

Семсот муляроў змуравалі царкву без вуглоў. *(Мурашкі)*

Лес сяку — лес вяне, на тым месцы горад стане. *(Сенакос)*

Тысячы брацікаў звязаны, адным поясам падпяразаны. *(Сноп)*

Ляжыць мужычок у залатым каптане, падпяразан, ды не поясам; сам устаць не можа, а людзі падымаюць. *(Сноп)*

424 Ляцелі гускі, дубовыя наскі, ляцяць і гавораць: «То-то я! То-то я!» *(Малацьба цапамі)*

Матка гладка, сыны-цакуны, дочкі-палізухі. *(Ток, цапы, мётлы)*

Бацька гарбаты, маці пляската, дзеці кручоныя, на суку павешаныя. *(Гумно, ток, цапы)*

Дзве маткі маюць пяць сыноў, а кожны з іх аднаго імя. *(Рукі і пальцы)*

Пяць братоў у адну ноч нарадзіліся і ўсе з адным імем. *(Пальцы)*

Як родзіцца — у дудачку грае, як вырасце — зямлю капае, як памрэ — дык у скокі ідзе, а ўсё не гуляе. *(Вол)*

Чатыры дзяды назад бародамі. *(Капыты)*

Каля бочкі качаюцца клубочкі. *(Парасяты каля свінні)*

Па полі і лузе ходзіць у кажусе. *(Авечка)*

У цёмнай цямнушачцы сядзяць чарнушачкі і вяжуць вязаначкі — ні вузла, ні пяцелечкі. *(Пчолы)*

Выйшла панна з трасок, а на ёй сорак сарочак, а як вецер павее — гола цела віднее. *(Курыца)*

Ляцела пава, на белыя камені пала; камні разбіла — усіх мёртвых узбудзіла; мёртвыя ўсталі — у дудачкі зайгралі. *(Квактуха)*

Ані шпунта, ані дна, поўна бочачка віна. *(Яйцо)*

Ходзіць цар па гародзе, носіць два бліны ў бародзе, а трэці на галаве. *(Певень)*

На лапатах ходзіць, рогам траву есць. *(Гусь)*

Не кравец, а ўсё жыццё з іголкамі ходзіць. *(Вожык)*

Два разы нараджаецца, адзін раз памірае. *(Птушка)*

Даўжэй клеці зашчэпка. *(Сарока)*

Сперади шыльцы, ззаду вільцы, наверсе чорнае сукно, падысподам белае палатно. *(Ластаўка)*

Плача баба на ўвесь лес, а па ёй ніякі бес. *(Сава)*

Ва ўсіх дзетак адзенне з манетак. *(Рыба)*

На тым свеце жывы, а на гэтым мёртвы. *(Рыба)*

Ехаў не дарогай, сцёгаў не пугай, шыбаў не палку, злавіў не галку, шчыпаў не пер'е, еў не мяса. *(Рыба)*

Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай памірае. *(Раса)*

Ляцеў птах, на ваду — бах. Вады не скалыхнуў, на дно патануў. *(Снег)*

Ляцелі сівыя галубкі, упалі на ваду; вады не скаламуцілі і самі не паляцелі. *(Снег)*

На вадзе ляжыць, ды не тоне; па агню бяжыць, ды не гарыць. *(Цень)*

Жыве без цела, гаворыць без языка; ніхто не бачыць, а ўсякі чуе. *(Рэха)*

Дванаццаць арлоў, пяцьдзесят дзве галкі знеслі адно яйцо. *(Год)*

Стаіць дуб, на дубе дванаццаць гнёзд, у кожным гняздзе па чатыры сініцы, у кожнай сініцы па чатырнаццаць яек, сем чорных і сем белых. *(Год)*

Пасцялю дзяружку, пасыплю гарошку, пакладу акраец хлеба. *(Неба, зоры, месяц)*

Прыйшла чорная карова, усіх людзей пабарола. *(Ноч)*

Чорная карова ўвесь свет пабарола; белая ўстала — увесь свет пападымала. *(Ноч і дзень)*

Кроў маю п'юць, косці мае паляць, маімі рукамі адзін другога б'юць. *(Бяроза)*

Казкі

Важнае месца ў фальклорнай спадчыне беларускага народа належыць апавядальным жанрам — казкам, легендам, паданням, вусным сказам, анекдотам і інш. Проза народная звычайна падзяляецца на дзве вялікія групы: казачную, да якой адносяцца творы пра незвычайныя падзеі з людзьмі, жывёламі, фантыстычнымі істотамі — казкі, анекдоты, небыліцы, частка легенд (казкі-легенды), і няказачную, творы якой — паданні, легенды, былічкі, або прымхліцы, бывальшчына, або бываліцы, і інш.— арыентаваны на пэўнасць, дакладнасць у перадачы звестак, апісанні падзей, хаця часам такая «дакладнасць» не пазбаўлена выдумкі і аказваецца ўяўнай.

Сярод апавядальных жанраў беларускай вусна-паэтычнай творчасці шырынёй ахопу жыццёвых з'яў, глыбінёй абагульнення, яркасцю створаных вобразаў вылучаюцца казкі. Тэрмін «казка» аб'ядноўвае розныя па форме і змесце апавядальныя творы: пра жывёл і птушак, пра фантастычных пачвар і непераможных асілкаў, пра кемлівага сялянскага сына Несцерку і ненажэрных крывасмокаў-паноў, пра хітруна-злодзея і служкаў культу, пра мудрую дзяўчыну і языкатую жонку і інш. Такая разнастайнасць матэрыялу вельмі ўскладняе задачу фальклярыстаў даць гранічна акрэсленае азначэнне гэтага жанру. Сярод розных, але ў асноўным блізкіх паміж сабой азначэнняў казкі, якія прыводзяцца ў навуковай літаратуры, найбольш прыдатным можна лічыць наступнае: к а з к а — гэта мастацкае вуснае апавяданне сацыяльна-бытавога, фантастычнага або авантурна-навелістычнага зместу, якое адлюстроўвае рэчаіснасць пры дапамозе мастацкай выдумкі і заключае ў сабе дыдактычна-павучальны сэнс.

Казкі ўзніклі ў глыбокай старажытнасці і заўсёды былі непарыўна звязаны з шматгранным жыццём народа, яго барацьбой з сіламі прыроды, а ў класавым грамадстве — за роўнасць, сацыяльную справядлівасць. Казкі як творы сапраўднага мастацтва задавальнялі эстэтычныя запатрабаванні народа і ў той жа час былі важным сродкам пазнання навакольнага свету і абагульнення працоўнага вопыту многіх пакаленняў, а таксама сродкам выхавання.

Класіфікацыя казак даволі ўмоўная. Звычайна іх падзяляюць на казкі аб жывёлах, чарадзейныя, або міфічныя, і сацыяльна-бытавыя. Кожная з груп беларускіх казак вылучаецца асаблівасцямі зместу, сістэмай вобразаў, характэрнымі прыёмамі мастацкага адлюстравання рэчаіснасці. Усім ім уласціва высокае паэтычнае майстэрства. Беларускія казкі маюць шмат агульнага з казкамі іншых народаў, асабліва славян, але ў той жа час узбагачаюць казачны эпас славянскіх народаў новымі сюжэтамі, ідэямі, вобразамі.

Казкі аб жывёлах адрозніваюцца ад астатніх груп казачнага эпасу тым, што галоўнымі персанажамі ў іх з'яўляюцца жывёлы, птушкі і нават расліны; ліса, воўк, мядзведзь, заяц, дзік, кот, баран, певень і інш. Частка гэтых твораў узнікла вельмі даўно, калі чалавек быў амаль у поўнай залежнасці ад

сіл прыроды і ў сваім уяўленні надзяляў жывёл, расліны, з'явы прыроды рознымі незвычайнымі якасцямі, а таксама некаторымі якасцямі людзей. У гэтых першых казках мы чуем, па словах М. Горкага, водгукі працы над прыручэннем жывёл, над адкрыццём лекавых траў, вынаходніцтвам прылад працы. Пазней, у класавым грамадстве, казкі аб жывёлах набылі новы змест. Разам з трапнымі назіраннямі над навакольнай прыродай у гэтых казках у алегарычнай форме правільна перададзены адносіны паміж людзьмі, асобныя рысы чалавечых характараў, выкрываюцца заганы грамадства, заснаванага на прыгнечанні чалавека чалавекам.

З тонкім гумарам народ высмейвае фанабэрыстасць, зайздрасць, баязлівасць і іншыя недахопы людзей свайго асяроддзя. Мэта іншых казак пра жывёл, спецыяльна разлічаных на дзіцячую аўдыторыю,— пазнаёміць дзіця з навакольным светам, паказаць прасцейшыя ўзаемасувязі паміж прадметамі, жывымі істотамі, паміж дзеяннем і яго вынікам.

Казкам пра жывёл уласціва кампазіцыйная завершанасць, рыфмаваная і рытмізаваная мова, асабліва ў прыказках-зачынах і канцоўках, шырокае ўжыванне прымавак, песень, мянушак. Разгорнуты дыялог казак стварае магчымасці для імправізацыі. Часам дзеянне будуецца на нарошчванні падзей, накшталт вядомай казкі пра рэпку, якая з'яўляецца прасцейшым прыкладам казкі з камулятыўнай, або ланцужковападобнай, пабудовай.

Чарадзейныя казкі таксама вельмі старажытныя па сваім паходжанні. За доўгі час бытавання ў народзе яны значна змяніліся, але захавалі вобразы міфічных асілкаў (Вярнідуб, Гарыня) і варожых сіл (шматгаловы змей — «Паганы цмок»). Разам з жывымі істотамі ў казках дзейнічаюць сонца, вецер, месяц, мароз, гром. Героям дапамагаюць цудадзейныя прадметы: тапор-самасек, дыван-самалёт, жывая вада, цудоўны збанок.

Асобную групу сярод беларускіх чарадзейных казак складаюць творы на былінныя сюжэты, якія з'яўляюцца тым звяном, што звязвае беларускі фальклор са старажытнарускай паэзіяй, і дазваляюць гаварыць аб бытаванні ў мінулым на Беларусі быліннага эпасу. У беларускіх казках адлюстраваны многія эпізоды з былін пра Потака, Дабрыню, Данілу Лаўчаніна, але найбольш падрабязна расказваецца пра Іллю Мурамца: яго цудоўнае выляжэнне, карчаванне ляда, выпрабаванне каня, перамогу над нягодным Сокалам і царом Пражорам, якія вельмі нагадваюць Салаўя-разбойніка і Ідалішча паганае — усё гэта вядомыя эпізоды з былін.

У аснове многіх чарадзейных казак ляжыць сацыяльны канфлікт, які адлюстраваў справядлівае жаданне працоўных пазбавіцца ад эксплуатацыі. Характарам асноўнага канфлікту ў такіх творах абумоўлены некаторыя змены ў сістэме вобразаў: тут галоўнымі дзеючымі асобамі з'яўляюцца сяляне і іх ворагі — паны.

У чарадзейных казках увасоблены ўсе найбольш характэрныя рысы казачнай паэтыкі. Многія творы маюць разгорнутыя рыфмаваныя зачыны і заключныя формулы. Шырока ўжываюцца трохразовыя паўторы дзеяння, а таксама так званыя агульныя месцы — тоесныя апісанні багатырскага каня, поля бою, выпрабавання булавы, паэтычныя формулы для перадачы незвычайнага знешняга падабенства герояў і г. д.

Сацыяльна-бытавыя казкі ўзніклі ў класавым грамадстве, калі пад уплывам працоўнай практыкі і класавай барацьбы чалавек усё больш вызваляўся ад першабытна-наіўных поглядаў на навакольны свет. Змены ў свядомасці, у сацыяльна-эстэтычных поглядах працоўных адбіліся на асаблівасцях казачнай фантастыкі, якая рэалізуецца ў сітуацыях, максімальна набліжаных да рэальнага жыцця.

Да сацыяльна-бытавых казак адносяцца ўласна бытавыя казкі, а таксама антыпрыгонніцкія і антырэлігійныя творы. Уласна бытавыя казкі малююць селяніна ў яго паўсядзённым жыцці, услаўляюць працавітасць, глыбокі розум, дасціпнасць і сціпласць простага чалавека, асуджаюць гультайства,

прагнасць, зайздрасць і іншыя заганы. Многія бытавыя казкі — гумарыстычныя, жартоўныя творы.

Антыпрыгонніцкія і антырэлігійныя казкі адлюстроўваюць барацьбу сялянства супраць сацыяльнага і духоўнага ўціску, рост яго класавай свядомасці. Працягваючы лепшыя традыцыі гераічнага эпасу, народ стварыў у іх каларытны вобраз народнага заступніка. Многія антыпрыгонніцкія і антырэлігійныя казкі — сатырычныя творы, яны выкрываюць прыгнятальнікаў-паноў і служкаў культу.

Паказваючы знешнюю, уяўную веліч прыгнятальнікаў і сапраўдную іх нікчэмнасць, нечакана зрываючы маску і агаляючы іх унутраную сутнасць, сатырычныя казкі выклікалі смех, у якім чулася не адна весялосць, але і помста за прыніжаную чалавечую годнасць і, такім чынам, сцвярджалася, па словах В. Р. Бялінскага, перамога маральнага закону.

Па асаблівасцях адлюстравання рэчаіснасці, па характары мастацкай выдумкі да сацыяльна-бытавых казак набліжаюцца авантурна-навелістычныя, якія вылучаюцца прыгодніцкім характарам. У шматлікіх варыянтах запісана на Беларусі вядомая многім народам свету авантурная казка «Клімко» пра знаходлівага, кемлівага селяніна, які ўдала перамагае сваіх прыгнятальнікаў і кпіць з іх, а таксама казкі аб верных і няверных жонках і іншыя падобныя творы.

На развіццё казкі як фальклорнага жанру, на ўдасканаленне яе мастацкага ўзроўню і стан казачнай традыцыі значны ўплыў аказвае дзейнасць казачнікаў. Вядомы ў сваёй вёсцы таленавіты казачнік адыгрывае прыкметную ролю ў фарміраванні мясцовага рэпертуару. Пачутыя ад яго казкі як мастацкі эталон актыўна пераймаюць суседзі, аднавяскоўцы і пераказваюць іх сваім дзецям, унукам, а часам і больш шырокай аўдыторыі. Выдатнымі майстрамі-казачнікамі былі Рэдкі і Азёмша, ад якіх шмат твораў запісаў А. К. Сержпутоўскі, інфарматары М. Федароўскага і У. М. Дабравольскага Ян Дзежка, В. Міхайлаў і многія іншыя.

У наш час казачная традыцыя паступова затухае, але многія казкі трывала захоўваюцца ў народным рэпертуары і па-ранейшаму выконваюць значную ролю ў выхаванні падрастаючага пакалення. У апошнія гады ў розных раёнах Беларусі было запісана шмат гэтых твораў, у асноўным казкі пра жывёл і чарадзейныя, якія карыстаюцца асаблівай увагай дзіцячай аўдыторыі. Былі выяўлены і таленавітыя казачнікі, рэпертуар якіх вылучаецца багаццем і разнастайнасцю, а майстэрства выканання прыцягвае шырокую аўдыторыю. Ад 20 да 30 твораў расказалі К. Мельнікава, Ф. Вяргун, С. Ляўчэня. Як і ў мінулым, сярод сучасных казачнікаў можна вылучыць два тыпы: імправізатараў, якія ў межах традыцыі свабодна абыходзяцца з матэрыялам, і традыцыяналістаў, што строга прытрымліваюцца вядомай сюжэтнай схемы і нават вядомага ім тэксту.

Сучасныя запісы казак не толькі характарызуюць ступень распаўсюджання і захаванасці традыцыйных твораў, але, зробленыя з дапамогай гуказапісваючай апаратуры, даюць магчымасць данесці да чытача казку ў яе натуральным выглядзе, з усімі асаблівасцямі творчай манеры і паэтычнай мовы казачніка. Параўнанне класічных тэкстаў, запісаных у мінулым стагоддзі, з сучаснымі запісамі дапамагае вызначыць характар змен, што адбыліся ў змесце і мастацкіх асаблівасцях народных казак.

ЛІТАРАТУРА

Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 3. Витебск, 1887. Вып. 4. Витебск, 1891. Вып. 6. Могилев, 1901.

Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Спб., 1893. Т. 2.

Federowski M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej. T. 1—3. Kraków, 1897—1903.
Добровольский В. Н. Смоленский этнографический сборник. Спб., 1891.
Сержпутовский А. К. Сказки и рассказы белорусов-полешуков. Спб., 1911.
Казкі і легенды роднага краю / Пад рэд. П. Ф. Глебкі. Мн., 1960.
Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі. Мн., 1971.
Чарадзейныя казкі: У 2 ч. Мн., 1973—1978.
Сацыяльна-бытавыя казкі. Мн., 1976.
Карский Е. Ф. Белорусы. М., 1916. Т. 3. Ч. 1. С. 418—484.
Беларуская народна-паэтычная творчасць / Пад рэд. М. Р. Ларчанкі. Мн., 1979. С. 230—288.
Кабашнікаў К. П. Беларуская казка ў казачным эпасе славян. Мн., 1968. 28 с.
Бараг А. Беларуская казка. Мн., 1969.
Новиков Н. В. Образы восточнославянской волшебной сказки. Л., 1974.
Кабашнікаў К. П., Барташэвіч Г. А. Сустрэчы з казкай. Мн., 1984.
Казкі ў сучасных запісах. Мн., 1989.

Каток, пеўнічак і лісічка

Былі сабе каток з пеўнічкам, зрабілі яны хатку. Коцік накарміў пеўнічка, а сам пайшоў на ўловы. Прыйшла лісічка і кажа:

— Пеўнічку, пеўнічку, адчыні мне!

Пеўнічак адчыніў, а лісічка ўхапіла яго і панесла да сваёй хаткі. А пеўнічак стаў крычаць:

Коце, браце!
Мяне ліска нясе
У высокія горы,
У глыбокія норы,
Па бору, па каменню,
Па ўсялякаму зеллю.

Коцік пачуў, прыбег, пеўнічка адабраў, прывёў да хаткі і сказаў яму:

— Глядзі ж, не слухай лісіцы, як яна прыдзе, бо я пайду далёка.

Коцік пайшоў, а лісічка зноў прыбегла і кажа:

— Пеўнічку, галубочку, адчыні мне! Я агню вазьму.

— Не адчыню, бо ты мяне ўхопіш.

— Не бойся, я не буду хапаць.

Пеўнічак адчыніў, а лісічка ўхапіла яго і панесла да хаткі. Пеўнічак зноў крычыць:

Коце, браце!
Мяне ліска нясе
У высокія горы,

У глыбокія норы,
Па бору, па каменню,
Па ўсялякаму зеллю.

Коцік пачуў, прыбег, пеўнічка адабраў, набіў, прывёў да хаткі і сказаў:

— Ну, глядзі ж, больш не пускай яе ў хату, бо я пайду яшчэ далей.

Коцік пайшоў, а лісічка прыбегла і зноў гаворыць:

— Пеўнічку, галубочку, падай мне агню!

— Не падам, бо ты мяне ўхопіш.

— Не бойся, ну, падай праз дзірачку.

Пеўнічак падае, а лісічка хап яго і панесла да свае хаткі. Пеўнічак крычаў, крычаў — не пачуў коцік. А лісіца прынесла яго ў хатку і кажа сваім дочкам:

— Наварыце есці чэставаць госця.

Прыйшоў коцік, не бачыць пеўнічка. Зрабіў ён скрыпачку і стальную пушку, пайшоў, сеў над нарою і стаў граць:

А ў ліскі,
А ў ліскі
Новы двор,
Трое дочак,
Трое дочак,
На выбор,
Чацвёрты пеўнічак,
То-то мой!

— Ах, матка, як хтосьці хораша грае, пойдзем паглядзім.

Выйшлі дочкі паглядзець, а коцік з пушкі па іх — і забіў, каля сябе палажыў і зноў грае.

А лісіца кажа:

— Што гэта яны не ідуць есці?

Узяла дубца, выйшла, а коцік і яе забіў. І сталі яны з пеўнікам жыць у лісіцы ў хаце.

Дзедава рукавічка

Жыў дзед з бабай. Паехаў дзед у лес і згубіў рукавічку. Прыскакала да рукавічкі лягушка і пытаецца:

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

Ніхто не адгукаецца. Яна залезла ў рукавічку і стала жыць.

Трохі пагадзя паўзе рак. Прыпоўз да рукавічкі і пытаецца:

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

А лягушка гаворыць:

— Сама паня-пацягуня. А ты хто?

— А я рак-тарабун. Ці можна мне?

— Лезь!

Трохі пагадзя бяжыць зайчык. Прыбег да рукавічкі і пытаецца:

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

— Сама паня-пацягуня і рак-тарабун. А ты хто?

— А я па бярэзнічку прыгун. Палезу і я к вам?

— Лезь!

Трохі пагадзя бяжыць лісіца.

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

— Сама паня-пацягуня, рак-тарабун ды па бярэзнічку прыгун. А ты хто?

— А я лісіца, добрая маладзіца. Палезу і я к вам?

— Лезь!

Лісіца ўлезла і сядзіць. Трохі пагадзя ідзе воўк.

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

— Сама паня-пацягуня, рак-тарабун, па бярэзнічку прыгун і лісіца, добрая маладзіца. А ты хто?

— А я з-за куста хапун. І я палезу к вам?

— Лезь!

Улез і воўк. Трохі пагадзя сунецца мядзведзь. Падышоў да рукавічкі і пытаецца:

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

— Сама паня-пацягуня, рак-тарабун, па бярэзнічку прыгун, лісіца, добрая маладзіца, ды з-за куста хапун. А ты хто?

— А я зверху прыціскун. Пусціце мяне к сабе!

— Не, ужо няма куды.

— Ну, я зверху сяду!

Узлез наверх, як ціскануў, так звяры і разбегліся ўсе.

Мужык, воўк і ліса

Быў сабе гаспадар і пайшоў гараць. Гарэ ён, дак гарэ, аж прыходзіць воўк.

— Чаго ты прыйшоў, воўча? — кажа гаспадар.

— Прыйшоў твае валы з'есці,— кажа воўк.

— Мой ты добранькі, мой ты галубок, пачакай хаця, пакуль я дагару, а пасля сабе з'ясі.

— Добра,— кажа воўк і пайшоў пад воз і там лёг.

Чалавек той гарэ і плача, аж прыходзіць ліска.

— Чаго ты плачаш, чалавеча? — кажа яму ліска.

— Я плачу таго, што прыйшоў да мяне воўк і хоча валы з'есці.

— Ну, калі дасі мне мех курэй, то праганю воўка.

— Добра,— кажа гаспадар.

Ліска пабегла на гару і крычыць:

— Тру-ру-ру-ру! Малады князь палюе! Што ў цябе, чалавека, пад возам ляжыць?

Чалавек адказвае:

— Калода, пане, калода!

— Каб калода была, то на возе ляжала б.

Воўк як пачуў, як зачне прасіць чалавека, каб узлажыў яго на воз. Чалавек узлажыў воўка на воз і зачаў гараць. І зноў тая ліска пабегла на другую гару і зноў крычыць:

— Тру-ру-ру-ру! Малады князь палюе! Што ў цябе, чалавека, на возе ляжыць?

— Калода, пане,— адказаў мужык.

— Каб калода была, то ўвязана была б.

Воўк зноў папрасіў чалавека, каб увязаў; і той чалавек, узяўшы вяроўку, так увязаў воўка, што ён пакруціцца не змог.

Лісіца зноў пабегла на трэцюю гару і таксама крычыць:

— Тру-ру-ру-ру! Малады князь палюе! Што ў цябе, чалавека, на возе ляжыць?

Мужык таксама адказвае:

— Калода, пане!

— Каб калода была, то сякера ўрублена ў ёй была бы.

Воўк, пачуўшы гэтыя словы, пачаў прасіць чалавека, каб дзе сякеру прычапіў, каб яна стырчала. Чалавек, узяўшы сякеру, прыйшоў да воза дый як рубне ў галаву воўка, дак яго і забіў насмерць.

А лісіца, убачыўшы гэта, прыбегла да таго мужыка і кажа:

— Я цябе абараніла ад воўка, прынясі ж мне мех курэй.

— Добра! — кажа чалавек ды, узяўшы таго забітага воўка, пайшоў дадому. Зняўшы шкуру з воўка, улажыў у мяшок заместа курэй двух сабак Серку і Берку і пайшоў у поле да ліскі, дзе яна яго чакала. Прыйшоўшы туды, ён палажыў мяшок на зямлю і кажа да ліскі:

— Ты раскарачся добра, каб магла палавіць усе куры, а я іх выпушчу.

Ліска раскарачылася, як той чалавек казаў, і чакае, пакуль ён выпусціць куры. А чалавек, развязаўшы мяшок, як выпусціць сабак, а тыя сабакі як зачнуць рваць ліску.

Ліска ледзьве вырабілася ад сабак і прыбегла да нары і пытаецца ў сваіх вачэй:

— Што вы думалі, як мяне рвалі сабакі?

— Мы думалі,— кажуць вочы,— каб як прэндзай уцячы да норкі.

— А вы, лапкі?

— І мы тое самае думалі.

— А ты, хвасцішча-дурнішча, што думаў?

— Я думаў, каб як найпрэндзай цябе злавілі і задушылі.

— Ах ты, хвасцішча! Аддам цябе сабакам!

Дый вылезла з норкі:

— На,— кажа,— Серка, Берка! На хвост!

Тыя сабакі парвалі ліскін хвост дый адарвалі. Ліска ўжо са злосці да мужыка лаіць — нашто ашукаў.

Бяжыць яна, дак бачыць: аж штось гудзе. Падбягае, аж дзюравы збан з ветрам.

— Ах ты шэльма, пане збане! І ты страшыш! — кажа лісіца дый узяла зачапіла почапку на шыю дый панесла тапіць. Прыходзіць да ракі, усадзіла збан дый топіць. У той збан як налілося вады, дак той збан зачаў тапіцца і павалок за сабою ліску.

А той мужык гэта ўсё бачыў: пайшоў да ракі, выцягнуў ліску, абдзёр скуру дый прадаў.

Ліса-каталічка

Ішла сабе ліса, знайшла падсмажанае мяса ў пастцы. Дагадалася яна, што гэта яе хочуць злавіць. І не дакранулася да мяса. Пайшла яна далей, сустракае мядзведзя:

— Кумок-галубок, ці снедаў ты сёння?

— Не, кумка-галубка, не прыйшлося.

— Ну, пойдзем, я цябе завяду ў адно месца — слаўнае снеданне будзе! Сама б з'ела, ды сёння серада — мне нельга есці: я каталічка.

— Спасіба, кумка-галубка, пойдзем!

Вось ліса падвяла мядзведзя к гэтаму мясу. Як толькі ён дакрануўся, так яго абхваціла пастка і падняла ўгару. Лісіца ўзяла тады мяса ды й есць. А мядзведзь ёй:

— Кумка-галубка, табе ж серада.

— Э, кумок-галубок, няхай той серадзіць, хто ўгару глядзіць.

Вайна ваўка з сабакам

Жыў-быў багаты мужык. У яго быў добры сабака. Ён вельмі яго любіў, а як той сабака зусім пастарэў, то ён ужо і не даваў яму есці.

Жанкі гэтае хаты пайшлі жаць жыта і ўзялі з сабою малое дзіцятка. За імі ішоў стары сабака. Жанкі прыйшлі на поле, павесілі калыску і ўлажылі туды дзіцятка, а сабаку прагналі, каб ён не паеў іх хлеба. Сабака з гора адышоў і лёг пад кустом. Прыходзіць да яго шэры воўк і пытае:

— Што ты ляжыш?

— Адступіся, праклятый! Што ты лезеш ка мне ў вочы? Ты наеўся, а я яшчэ нічога не еў.

Воўк кажа яму:

— Дурань ты! Вот я цябе навучу! Я пайду і схвачу дзіця, а ты бяжы за мною, гаўкай і кусай мяне за лыткі.

Так ён і зрабіў. Жанкі як пачулі, што сабака гаўкае, азірнуліся назад і ўбачылі, што воўк панёс дзіця, а сабака адбірае. Яны прыбеглі і адабралі дзіця. І з гэтых пор сталі зноў даваць сабаку есці.

А хлопчык гэты расце ды расце не па гадах — па гадзінах, і дарос да васемнаццаці год, і бацька засватаў яго. У гэту самую пару прыйшоў той воўк пад гумно, каб пажывіцца. Сабака пачуў ваўка і стаў гаўкаць.

Воўк і кажа:

— Я ж табе даў хлеба, а ты мяне праганяеш!

— А, гэта ты, брат? — пытае сабака.

— Я.

— Ну, прыдзі ты, брат, к нам за дзве нядзелі: у нас будзе вяселле, і я цябе пачастую.

Настала вяселле. Сабака п'е, гуляе і забыўся аб сваім браце, а пасля падумаў:

— У мяне ж ёсць брат. Пайду пагляджу яго.

Выйшаў, глядзіць, а воўк ляжыць за гумном.

Сабака яму кажа:

— Што ты ляжыш тут? Пойдзем у хату!

— Як жа ты ўвядзеш мяне ў хату?

— Не бойся, пойдзем.

Прыходзяць яны к сенцам. Сабака і кажа:

— Ты пастой, а я ўпярод схаджу ў хату.

Сабака ўвайшоў у хату, мельнуў хвастом па лучыне, патушыў яе, пабег і сказаў ваўку:

— Бяжы борзда ў хату і лезь пад стол.

Сабака добра накарміў і напаіў ваўка. І ляжаць сабе абодва пад сталом.

Зачалі каравайніцы спяваць:

У нашага гаспадара
Кудравая галава,

Ён кудзёркамі патрасе
І нам гарэлкі паднясе...

Сабака ляжыць сабе ціхенька — нічога, а воўк:

— Я, брат, не вытрываю, заспяваю па-свойму.

— Маўчы! Бо будзе табе і мне!

Другі раз каравайніцы заспявалі:

У нашага свата
Пабелена хата;
Печ яго кахляна,
Чэсць яго кахана...

Воўк зноў кажа сабаку:

— Не вытрываю...

І зачаў спяваць па-свойму. Людзі пазналі, што гэта воўк, і ўхваціліся хто за качаргу, хто за чапялу і зачалі біць ваўка і сабаку. Білі-білі і выгналі абаіх вон.

Воўк кажа сабаку:

— Я табе гэтага не дарую! Ты мяне добра ўгасціў.

А сабака яму:

— А чаго ты крычаў? Я табе казаў: «Маўчы!»

— Я на цябе пайду вайною і будзем з табою ваяваць пад хваінаю. Ты вазьмі сабе на помач трох, і я сабе трох.

Воўк узяў сабе дзікага вепрука, мядзведзя і льва, а сабака — качара, пеўня і ката. Воўк прыйшоў на месца напярод і чакаў іх гадзіны тры. Потым кажа мядзведзю:

— Лезь ты на дрэва і паглядзі, можа ўжо ідуць.

Мядзведзь узлез і глядзіць.

Яго пытаюцца:

— Ці ідуць?

— Ідуць, браце.

Воўк кажа яму:

— Ну, злезь!

— Не злезу, страшна!

— І што там такі за страх, хто ж там ідзе?

— Адзін,— кажа,— з пікаю, а другі нясе дзве шаблі, а трэці ўсё кажа: «Таму так будзе, і таму так будзе!»

Дзік зарыўся ў мох.

Прыходзіць сабака з сваім войскам — і пачаў ваяваць. Зайшоў кот ззаду і хваць дзіка за хвост. Дзік і схваціўся.

А певень спалохаўся, падляцеў угару і закрычаў: «Кудах-кудах!» А мядзведзь думаў, што кажуць «падай-падай!» — і проста з гэтага дзерава зваліўся на зямлю. Глядзіць леў, што

мядзведзь і дзік ужо ўцяклі,— і ён кінуўся за імі. Застаўся воўк адзін.

З гэтай пары яны сталі жыць добра, мірна.

Воўк, Змітрок, кабыла і баран

Ішоў воўк з-пад Міра. Сустрэў Змітрака. Той Змітрок быў кравец. Ішоў ён з палкаю, што даўней меральі. Воўка кажа:

— Змітрок, Змітрок, я цябе з'ем.

А Змітрок адказвае:

— З'ясі дык з'ясі! Але перад смерцю дай я табе змераю камізэльку!

Воўк згадзіўся. Змітрок і пачаў яму палкаю па баках мераць. Мераў, мераў, пакуль ваўка чыста збіў. Тады кажа:

— Пачакай жа! Камізэльку я змераў, але яшчэ ляж дагары, яшчэ паназначваю, дзе гузікі ўшываць!

Воўк яшчэ лёг дагары, а Змітрок яго наўсторч тою палкаю чыста скалоў, што не захацеў і есці воўк Змітрака. Змітрок астаўся жыць і пайшоў сабе далей. А воўк ляжыць ды думае: «Гм! Не з'еў дык не з'еў! Але нашто мне была гэта камізэлька ды яшчэ ў два рады гузікі? Ці я пан? Ці я шляхціц?..»

І пайшоў воўк далей памаленьку. Ідзе ды ідзе. Аж бачыць — ходзіць кабыла. Воўк і кажа:

— Кабыла, кабыла! Я цябе з'ем.

А кабыла адказвае:

— З'ясі дык з'ясі, але нашто ты будзеш мяне есці? Ты вось лепш пачытай у мяне пад капытом газету!

Воўк пачаў глядзець, а кабыла як ляпне яму ў храпу нагамі, аж воўк адляцеў і ляжыць. А кабыла ўцякла. Ляжыць воўк ды думае: «Не з'еў дык не з'еў! Але нашто яшчэ было мне газету чытаць? Ці я грамацей, ці вучыцель?..»

Ачомкаўся воўк і пайшоў далей. Ідзе ды ідзе. Сустрэў барана і кажа:

— Баран, баран! Я цябе з'ем!

Баран адказвае:

— Нашто ты мяне будзеш есці? Ты вось лепш заплюшч вочы, адкрый рот, а я табе сам ускочу!

Сеў воўк, заплюшчыў вочы і адкрыў рот. Баран як разагнаўся ды як даў яму рагамі ў лабаціну, дык воўк самлеў. Баран уцёк, а воўк ачомкаўся дый кажа:

— Не ведаю, ці я яго глынуў, ці мінуў?

Козы

Жылі дзед з бабаю. Была ў дзедкі дачушка і ў бабкі дачушка. Былі ў іх козы. Прыйшла вясна. Дзед кажа:

— Трэба гнаць коз. Хто ж пагоніць?

— Ты гані,— на бабку ён кажа.

А бабка кажа:

— Не, я не паганю коз. Будзем пасвіць іх па чарзе. Няхай пасе твая дачка.

— Добра, няхай пасе мая дачка; пагоніць жа і твая.

Пагнала назаўтра яго дачка. Пасвіла яна, пасвіла, пасвіла, пасвіла, напаіла іх, накарміла, гоніць дадому. Дзед забег у вароты і сядзіць. Адчыняе яна, упускае іх на двор. Дзед кажа:

— Козы мае, козы, ці напіліся вы, ці наеліся?

— Мы напіліся і наеліся.

— А ты, казёл-барада?

— Я не напіўся, не наеўся. Бег цераз масточак, ухапіў кляновы лісточак, бег цераз грэбельку, ухапіў вады капельку. Вось што я піў і еў.

Тут дзед зазлаваў на дачку, набіў яе, загнаў у хату.

На другі дзень пагнала ўжо бабчына дачушка. Пасвіла яна, пасвіла, накарміла іх, напаіла, гоніць дадому. Дзед зноў забег у вароты, сеў і кажа:

— Козы мае, козы, ці напіліся вы, ці наеліся?

— Мы напіліся і наеліся.

— А ты, казёл-барада?

— Я не напіўся, не наеўся. Бег цераз масточак, ухапіў кляновы лісточак, бег цераз грэбельку, ухапіў вады капельку. Вось што я піў і еў.

Зазлаваў той дзед, прагнаў і сваю дачку, і бабчыну дачку. Прагнаў зусім з хаты. Назаўтра на бабу кажа:

— Ты ж пагоніш коз пасвіць.

Баба ўжо ўстала, выпаліла зарана ў печы, пагнала пасвіць коз. Пасе яна, пасе іх, пасе-пасе, на вялікай траве пасе. Напаіла іх, накарміла і гоніць дадому. Дзед зноў забег у вароты і пытае:

— Козы мае, козы, ці напіліся вы, ці наеліся?

— Мы напіліся і наеліся.

— А ты, казёл-барада?

— Я не напіўся, не наеўся. Бег цераз масточак, ухапіў кляновы лісточак, бег цераз грэбельку, ухапіў вады капельку. Вось што я піў і еў.

Зазлаваў той дзед і бабку прагнаў. «Ну, я назаўтра паганю». Устаў зарана-зарана, выпаліў у печы і пагнаў іх. Па-

свіў-пасвіў, пасвіў-пасвіў — і сонца зайшло, пасвіў усё. Пасля гоніць дадому. Прыгнаў, сам забег на двор, сеў і пытае:

— Козы мае, козы, ці напіліся вы, ці наеліся?

— Мы напіліся і наеліся.

— А ты, казёл-барада?

— Я не напіўся, не наеўся. Бег цераз масточак, ухапіў кляновы лісточак, бег цераз грэбельку, ухапіў вады капельку. Вось што я піў і еў.

Той жа ж дзед як раззлаваўся, як прывязаў жа ж казла к слупіку. Лупіў-лупіў, лупіў-лупіў яго вяроўкаю. Вяроўку ўсю парваў. Пугаю біў, палкаю. Казёл рваўся, рваўся, адарваўся ад слупіка і пабег у лес.

Бяжыць ён, бяжыць, бяжыць дык бяжыць — стаіць хата ў лазе на курынай назе. Ён забег у тую хатку, а там жыла лісічка. Сеў на печы, сядзіць, грэецца. Прыйшла лісічка дадому. Стук-стук у дзверы.

— Хто ў гэтым доме ёсць?

— Я, казёл-барада, паўбока луплены, за тры грошы куплены. Тапу-тапу нагамі, калю рагамі, ножкамі затапчу, хвосцікам замяту.

Спужалася тая лісічка, выйшла на двор і плача. Ідзе зайчык.

— Лісічка-сястрычка, чаго ж ты плачаш?

— А мой ты зайчык, як мне не плакаць, нехта ў маім доме ёсць.

— Хадзем, я табе выганю.

— Хадзем.

Прыйшлі яны. Зайчык лапкаю стук-стук у акенца.

— Хто ў гэтым доме ёсць?

— Я, казёл-барада, паўбока луплены, за тры грошы куплены. Тапу-тапу нагамі, калю цябе рагамі, ножкамі затапчу, хвосцікам замяту.

Спужаўся той зайчык, пабег у лес. Села лісічка, зноў плача. Ідзе воўк.

— Кумка-галубка, чаго ж ты плачаш?

— А мой ты воўча, як мне не плакаць, нехта ў маім доме ёсць.

— Хадзем, я табе выганю.

— Хадзем.

Прыйшлі яны, так воўк у акно стук-стук лапаю.

— Хто ў гэтым доме ёсць?

— Я, казёл-барада, паўбока луплены, за тры грошы куплены. Тапу-тапу нагамі, калю цябе рагамі, ножкамі затапчу, хвосцікам замяту.

Спужаўся той воўк, пабег у лес. Лісічка зноў села і плача. Ідзе мядзведзь.

— Кумка-галубка, чаго ж ты плачаш?

— А мой ты мядзведзя, як мне не плакаць, нехта ў маім доме ёсць.

— Хадзем, я табе выганю.

— Хадзем.

Прыйшлі яны. Мядзведзь стук-стук лапаю ў акно.

— Хто ў гэтым доме ёсць?

— Я, казёл-барада, паўбока луплены, за тры грошы куплены. Тапу-тапу нагамі, калю цябе рагамі, ножкамі затапчу, хвосцікам замяту.

Спужаўся і той мядзведзь, пайшоў у лес. Пайшоў, а лісічка засталася адна, сядзіць і плача. Ідзе пеўнік.

— Лісічка-галубка, чаго ты плачаш?

— А мой ты пеўнік, як мне не плакаць, нехта ў маім доме ёсць.

— Хадзем, я табе выганю.

— Гэй, ты выганіш! Ніхто не выгане ўжо. І зайчык выганяў, і воўк выганяў, і мядзведзь выганяў — ніхто не выгане!

— А я выганю! Хадзем!

Прыйшоў ён ганак:

— Адчыняй дзверы!

Адчыніў. Стаў пеўнік на парозе, спявае:

— Кукарэку! Касу нясу, казлу галаву знясу. Злязай, казёл, з печы, бо здыму па самыя плечы!

Той казёл з печы на падлогу, з падлогі на зямлю, з зямлі на лаву, з лавы на акно, пабіў акно, выскачыў і пабег аблуплены.

А лісічка з пеўнікам пастроілі акенца і сёння жывуць і хлеб жуюць.

Жораў і чапля

Жылі сабе па канцах балота жораў і чапля. Стала ім сумна жыць, і вось задумаў жораў к чаплі ў сваты ісці. Ціпяху-ліпяху, сем вёрст па маху, цераз бор ды ў чаплін двор.

— Здароў, чапля!

— Здароў, жораў!

— Ці не пойдзеш, чапля, за мяне замуж?

— А, твае ногі доўгі, пер'і кароткі, дужа ты непрыгож і ні к чорту не гож; ідзі сабе дзе быў!

Жораў перабраўся зноў цераз бор ды і прыйшоў у свой двор. Раздумалася чапля, што за жорава замуж не пайшла: «Дай-ка пайду яго перапрашу». Ціпяху-ліпяху, сем вёрст па маху, цераз бор ды і к жораву ў двор.

— Здароў, жораў!

— Здароў, чапля!

— Вазьмі мяне замуж за сябе!

— Твая шыя і сіня, і крыва, і сама ты гарбата; такая мне не трэба!

Хоць і стыдна і абідна, аднак чапля паплялася цераз бор назад у свой двор. Жалка стала жораву, што не ўзяў чаплю ўбогую, і зноў пайшоў ён тою самаю дарогай. Ціпяху-ліпяху, сем вёрст па маху, цераз бор ды ў чаплін двор.

— Здароў, чапля!

— Здароў, жораў!

— Ці не пойдзеш, чапля, за мяне замуж?

— А, твае ногі доўгі, пер'і кароткі, дужа ты непрыгож і ні к чорту не гож; ідзі сабе дзе быў!

Жораў перабраўся зноў цераз бор ды і прыйшоў у свой двор. Раздумалася чапля, што за жорава замуж не пайшла: «Дай-ка пайду яго перапрашу».

Так цэлы свой век яны ходзяць адзін к другому ў сваты, але ўсё-такі па канцах балота абаіх іх засталіся хаты.

Курка-рабушка

Быў сабе дзедка, была сабе бабка. Была ў іх курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Дзед біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць...

Ідзе воўк:

— Дзедка, чаго вы плачаце?

— Як жа нам не плакаць: жылі сабе мы з бабкай, была ў нас курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Я біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць... І воўк завыў.

Ідзе мядзведзь:

— Чаго ты, воўча, выеш?

— Як жа мне не выць: быў сабе дзедка, была сабе бабка. Была ў іх курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Дзед біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць,

трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць — і я, воўк, выю.

І мядзведзь зароў.

Ідзе лось.

— Чаго ты, мядзведзь, равеш?

— Як жа мне не равець: быў сабе дзедка, была сабе бабка. Была ў іх курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Дзед біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць, воўк завыў — і я, мядзведзь, зароў.

І лось рогі паскідаў. Прыйшоў лось да калодзезя: папова чалядка ваду бярэ.

— Чаго ты, лось, свае рогі паскідаў?

— Як жа мне не скідаць: быў сабе дзедка, была сабе бабка. Была ў іх курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Дзед біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць, воўк завыў, мядзведзь зароў — і я, лось, рогі паскідаў.

І чалядка вёдры пабіла, каромысел паламала і заплакала.

Ідзе дзяк:

— Дзеўка-дзявіца, чаго ты плачаш?

— Як жа мне не плакаць: быў сабе дзедка, была сабе бабка. Была ў іх курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Дзед біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, бегла мышка, бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць, воўк завыў, мядзведзь зароў, лось рогі паскідаў — і я вёдры пабіла, каромысел паламала і заплакала.

І дзяк пайшоў ды кнігі папарваў.

Ідзе поп:

— Дзяк, чаго ты кнігі папарваў?

— Як жа мне не рваць: быў сабе дзедка, была сабе бабка. Была ў іх курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Дзед біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць, воўк завыў, мядзведзь зароў, лось рогі паскідаў, чалядка

вёдры пабіла, каромысел паламала і заплакала — і я, дзяк, пайшоў кнігі папарваў.

Пайшоў поп і царкву запаліў.

Кот Максім — сват

Жылі сабе дзед з бабай, мелі яны сынка і катка. Сын звaўся Марцінам Глінскім-Папялінскім, кот быў Максім. Жылі старыя колькі год, потым памёрлі. Засталіся сынок і каток. Некалькі часу прайшло, згніла гэта хата, засталася адна печ. Марцін Глінскі навучыўся гаварыць па-кашачаму, а кот — па-чалавечаму. Жылі яны некалькі гадоў. Марцін жаніцца захацеў, а кот кажа яму:

— Ты жаніцца захацеў, седзячы на гэтай печы, у цябе ж голас не чалавечы. Я цябе карміў, паіў, а ты сядзеў, нічога не рабіў, толькі попел перасыпаў.

— Ну, ідзі ты,— кажа Марцін Глінскі-Папялінскі,— да царэўны ў сваты.

Нанасіў кот есці яму вялікую кучу: мышэй, сала, мяса — усяго. Нанасіўшы есці, пайшоў у сваты. Ідзе ды ідзе, на палянцы сустрэў зайца.

— Куды ты, кот, ідзеш? — пытаецца заяц.

— Іду да цара на суд,— кажа кот.

— На які суд?

— Дзе што кошка парушыць сала, ці каўбасу, ці яшчэ што, прыдзе гаспадар у свіран, на каго падумае? На ката, і скажа на ката. А ката там зусім не было, а кошка. Як я буду цярпець гэтакай няславы.

А заяц падумаў ды і гаворыць:

— І я пайду з табой!

— Чаго ты пойдзеш?

— Ды вось дзе што зайчыха ў сад улезе, шчэпы паесць, яблынькі і грушкі,— усё кажуць на зайца; дзе зайчыху сабакі ганяюць,— усё кажуць на зайца. Як гэтакай няславы цярпець? Пайду і я з табой да цара на суд.

— Што ж ты,— кажа,— адзін?

— А ты ж чаму адзін?

— Эх, ты. У мяне ж там дзядзькі, бацькі, прадзеды, сёстры, брацця. Усе па слову кінуць, дык мне і веры дадуць. А ты што адзін! Каб вас з гэтага лесу палавіна, дык бы вам веры далі.

А заяц гэты паслухаў. Як пакоціцца, як наробіць крыку — дзе каторы заяц не дачуў, дык так бег на гук, а каторы чуў, дык прыйшоў і пасабляў крычаць. Сабралася іх некалькі тысяч, але не тое што некалькі тысяч, але некалькі мільёнаў. Што як ішлі цераз лес, дык там павыбівалі карэнні капытамі — што

аж лес паўсыхаў, а як ішлі па полі, дык да вады зямлю ўбілі, каб яны піць не хацелі, дык бы ўвесь свет затапіла вада. Прыйшлі сяк-так да цара. Кот ім кажа:

— Зайдзіце вы ў гэты сарайчык, пастойце, як выйдзе мой суд, тады я вашу жалабу занясу і вас пазаву.

Як гэтыя зайцы ўскочылі ў сарай, так кот — хлоп! ды запёр іх і пайшоў сабе, песенькі пеючы, падскакваючы і ў ладкі плешчучы. Прыходзіць на ганак да цара і стукае:

— Адчыняйце!

Адчынілі.

— Пакажыце, дзе цар жыве.

Паказалі яму.

— Здрастуйце, ваша вялічаства!

— Здрастуй, каток, здрастуй! Што ж ты скажаш мне харошае?

— Прыслаў вам Глінскі-Папялінскі гасцінчыка.

Гасудар адказвае яму:

— Добра зрабіў, ды не дужа.

Пад'ехаў гасудар, паглядзеў у гэты сарай: «Мусіць у яго яшчэ больш ёсць, калі ён мне столькі прыслаў». Накарміў ён гэтага катка і меха наклаў, на дарогу даў.

Прыходзіць гэты каток да Марціна Глінскага-Папялінскага. Аж гэты Глінскі чуць жыве, а яшчэ пытаецца:

— Ці пойдзе яна за мяне, ці не?

— Годзе табе пытацца, калі ты не ўстаеш ужо.

— Ды ты адказвай, ды давай есці хутчэй мне.

Кот на самы першы выпадак пайшоў каля рэчкі, злавіў рыбу. Пасля стаў насіць, што дзе ні зарваў. Адкарміў яго, адпаіў, адхаяў. Пасылае яго Глінскі зноў да цара ў сваты. Кот яму нанасіў піцення-ядзення яшчэ больш.

Ідзе кот ды ідзе цераз лес, выходзіць на палянку, а насустрач яму воўк. Кот спалохаўся і скок на хвойку. А воўк і кажа:

— Ты не палохайся мяне, раскажы, куды ідзеш.

— Я б расказаў, але баюся.

Гэты воўк падскочыў, хваціў ката за каўнер і прыціснуў да зямлі:

— Калі скажаш, дык не з'ем цябе, а не скажаш — з'ем.

— Не еж — скажу.

— Ну, кажы, не буду есці!

Адпусціў яго ад зямлі.

— Ну, ты ж ужо зусім пусці мяне, ужо скажу, не ўцяку. Але ж ты не адкажыся, глядзі, а то табе вялікі сорам будзе.

— Чаму так? — пытаецца воўк.

— Калі зайцаў столькі хадзіла, дык вас трэба тры часткі гэтулькі.

— Куды?

— Куды і я іду.

— Куды ж ты ідзеш?

— Да цара на суд.

— І я пайду.

— Што ты адзін пойдзеш?

— А ты чаму адзін ідзеш?

— А ты не глядзі, што адзін іду. Мяне ўся царская фамілія ведае, а ад цябе і сабакі ўцякаюць, як угледзяць, не то цар. Сабярыцеся трэцяя частка з гэтага лесу, дык паверыць цар вам.

— Ну, раскажы ж, на які ты суд ідзеш?

— Ото ж я наперад не скажу. Збяры ты з гэтага лесу трэцюю частку, каб былі сведкі, дык табе веры дадуць, і тады я раскажу, на які суд іду.

Гэты кот раззлаваў ваўка, што воўк аж падскочыў, аб зямлю ўдарыўся і стаў галасіць. Усе ваўкі пачулі, што гэтак воўк плача, і давай збягацца. Як назбіралася іх багата, сталі яны пытацца ў ката. Гэты кот адказвае:

— Нам стаяць ды гаварыць, дык многа дзён пройдзе; пойдзем па дарозе і будзем гаварыць ідучы.

Ішлі яны, ішлі, ён ім расказаў уловіну.

— Праўда,— кажа воўк,— і нам трэба ісці, ты не салгаў.

Кажуць ваўкі:

— Мы ўперад пойдзем на суд.

А кот ім:

— Як,— кажа,— вы ўперад пойдзеце, калі мая жалаба занесена? Як выйдзе мой суд, падам я вашу жалабу, тады я вас пазаву. Цяпер жа вы пастойце ў гэтым сараі.

Яны паслухалі, а кот — хляп! ды і запёр іх, а сам пайшоў, падскакваючы, пеючы, у ладкі плешчучы. Прыйшоў на ганак. Яму адчынілі.

— Здрастуйце, ваша вялічаства!

— А што, каток, скажаш?

— Ды вось вам Глінскі-Папялінскі прыслаў гасцінчыка.

— Добра зрабіў, ды не дужа.

Пад'ехаў гасудар, паглядзеў — ваўкі скачуць на бэльках, так кот набіў іх у той сарай. Цар ката напаіў, накарміў, на дарогу даў, а ваўкоў і зайцоў вялеў пабіць:

— Скажы Глінскаму-Папялінскаму, няхай прыязджае да маёй дачкі ў сваты.

Кот прыбег к Глінскаму ў поўнач і давай яго будзіць.

— Уставай, уставай, я ад цара прыйшоў.

— А што ён табе сказаў?

— Ды сказаў, каб ты ехаў жаніцца на яго дачцэ.

— Ты, кот, сватаў, сватаў, каб цябе Бог са свету пратаў. На чым жа я паеду, калі я голы, як бізун?

— Ты не плач, але прасі, каб я ўхітрыўся.

Пайшлі яны сярод ночы. Там каля цара салдатаў многа і ў кожнага салдата дзве шапкі, а кот у кожную хату ўлезе і ў кожнага салдата па шапцы ўкрадзе. І ўкраў ён яшчэ тонкага драпу. Наклалі яны два мяхі гэтых шапак, панеслі на мост. Паставіўшы шапкі на мосце і пакінуўшы Глінскага ля шапак, пайшоў кот піць ваду. П'е ён і ўбачыў ракаў. Адзін рак надта вялікі, кот яго і выцягнуў на бераг.

— Пусці,— кажа рак,— жыў не буду.

— Саслужыш ты гэтакую службу? — пытае кот у рака.

— На вадзе саслужу, якую ты хочаш, а на беразе, забі мяне, нічога не саслужу.

— Скапай жа ты гэты мост!

— Скапаю.

Кот, не верачы, прывязаў рака на дрот, а на Марціна Глінскага кажа:

— Як паплыве мост, дык ты раскідай шапкі па рацэ.

Кот цераз мост пераскочыў, а Глінскі на мосце. Мост паплыў, а Глінскі раскідваў шапкі па рацэ. Тым часам каток прыбег да цара і кажа:

— Ехаў Глінскі да цара жаніцца, уз'ехаў на мост, мост зламаўся, салдаты патапіліся, пяхота і конніца, астаўся ён адзін на мосце.

Паслаў цар салдат на лодках. Прывезлі яны Глінскага ў царскі дварэц. Згулялі вяселле. Цар даў ім войска, грошай, і паехалі яны ў Змяёўскі дварэц, дзе золота з стрэх капала.

Бабіна дачка і дзедава дачка

Быў дзед ды з бабай, была ў дзеда дачка ды ў бабы дачка. Не ўзлюбіла баба дзедаву дачку. Дзед той гадзіў-гадзіў бабе — ніяк не ўгадзіць. Жалка яму сваёй дачкі, а баба адказвае:

— Дзень яе дзе хочаш.

Тады ён гаворыць:

— Адзявайся, дачушка, пойдзем з табой.

Пайшлі яны ў лес. Прыходзяць у лес — стаіць хатка на курыных ножках. Ён гаворыць:

— Хатка, хатка, стаяла па-новаму, стань па-стараму: ка мне акном, а к дочцы маёй дзвярмі!

Тая хатка абярнулася і стала па-стараму: к яму акном, а к дочцы яго дзвярмі. Тады ён гаворыць:

— Ідзі, жыві з Богам, а я пайду дроўцы сеч.

Адсек венічак і пабаешачку, звязаў і павесіў на асіну. Венічак шась-шась, а пабаешачка стук-стук! Яна думае, што бацька дроўцы сячэ, і ўсё яго чакае. Вечар прыходзіць, бацькі яна чакала-чакала,— ніхто не прыходзіць. Тады яна гаворыць:

— Хто ў лесе, хто ў балоце, хадзі ка мне начаваць!

Мядзведзь адгукаецца:

— Я ў лесе, я ў балоце, прыду к табе начаваць!

А яна думае, што бацька ёй адказвае. Тады прыйшоў к ёй мядзведзь нанач:

— Ну, дзеўка, адмыкай дзверы!

Яна адамкнула і дужа спужалася.

— Ну,— гаворыць мядзведзь,— затапі печ, вары кашу, пячы бліны.

Тады шчурка падскочыла і гаворыць:

— Дзеўка-дзявіца, красная красавіца, дай ложачку кашы аблізаць.

А яна гаворыць:

— На табе, шчурка, кашкі.

З'ела шчурка кашу і зноў прыбягае:

— Дзеўка-дзявіца, красная красавіца, дай мне блінка з печы, у худой гадзіне прыгажуся...

Яна кінула блінца, шчурка і пабегла пад печку.

Яны павячэралі.

— Ну,— гаворыць мядзведзь да дзеўкі,— пасцель пасцялі: рад камення, рад палення і ступу ў галовы.

Ён лёг і даў ключыкі, і прыказаў бегаць па хаце і бразгаць ключамі. А шчурка падскачыла і яе падмяніла.

— Дай,— гаворыць,— мне ключыкі, я цябе падмяню, а то цябе заб'е.

Стаў мядзведзь кідаць паленні — нікога не забіў.

На другі дзень мядзведзь, устаўшы, гаворыць:

— Шчасце тваё. Ну, дзеўка, мы з табой ажэнімся.

Яны ажаніліся і сталі жыць добра. Ён ёй нанасіў і мёду, і коней, і ўсяго.

У яе бацькі была сучка рабая,— яна выскачыла на вуліцу і стала брахаць:

— Гаў-гаў-гаў! дзедава дачка ў госці шасцёркай едзе і грошай многа вязе!

А бабе то не спадабалася. Яна сучку чапялой:

— Што ты, сучка, воўк це заеж, брэшаш! Дзедавай дачкі даўно на свеце няма!

А тут дачка і прыехала, і грошай бацьку прывязла. Бабе гэта не спадабалася, яна і кажа:

— Адвядзі і маю дачку туды, дзе твая была.

Нечага рабіць, дзед адвёў яе. Прыйшоў дзед у лес. Там стаіць хатка на курыных ножках. Ён гаворыць:

— Хатка, хатка, стаяла па-новаму, стань па-стараму: ка мне акном, а к дочцы маёй дзвярмі!

Тая хатка абярнулася і стала па-стараму: к яму акном, а к дочцы дзвярмі. Тады ён і гаворыць:

— Ну, дзіця, жыві тут, я пайду дроўцы сеч.

Адсек венічак і пабаешачку, звязаў і павесіў на асіну. Венічак шась-шась, а пабаешачка стук-стук! Яна думае, што бацька дроўцы сячэ, і ўсё яго чакае. Вечар прыходзіць, бацькі яна чакала-чакала,— ніхто не прыходзіць. Тады яна гаворыць:

— Хто ў лесе, хто ў балоце, хадзі ка мне начаваць!

Мядзведзь адгукаецца:

— Я ў лесе, я ў балоце, прыду к табе начаваць!

А яна думае, што бацька ёй адказвае. Тады прыйшоў к ёй мядзведзь нанач:

— Ну,— гаворыць мядзведзь,— затапі печ, вары кашу, пячы бліны.

Тады шчурка падскочыла і гаворыць:

— Дзеўка-дзявіца, красная красавіца, дай ложачку кашы аблізаць!

А яна гаворыць:

— Мядзведзь, мядзведзь! Шчурка кашкі просіць.

— У лоб яе ложкай!

Яна яе ўдарыла, шчурка пабегла,— сама стала печ бліны...

— Дай мне блінка з печы, у худой гадзіне прыгажуся...

Яна:

— Мядзведзь, мядзведзь! Шчурка бліна просіць.

Ён:

— У лоб яе чапялой!

Яна яе ўдарыла, шчурка пабегла пад печку, і закацілася, і завалілася. Яны павячэралі. Мядзведзь гаворыць:

— Сцялі мне пасцель: рад каменння, рад палення і ступу ў галовы.

Ён лёг і даў ёй ключыкі, і прыказаў бегаць па хаце і бразгаць ключамі. Як ён стаў кідаць паленнямі, дык з першага разу яе і забіў. Дзедава сучка выскачыла:

— Гаў-гаў-гаў! бабінай дачкі даўно на свеце няма!

Бабе гэта не спадабалася.

— Што, сучка, брэшаш? Мая дачка шасцярнёй прыедзе, у карэце, грошы прывязе. Дзед! Што твая сучка на мяне брэша? Ідзі прывядзі мне маю дачку, а то сучку заб'ю.

Дзед узяў кашалёк на плечы, пайшоў за бабінай дачкой. Прыходзіць у тую хату — аж там дачкі няма, адны косці

ляжаць, дзед падабраў косці ў кашалёк і пайшоў дамоў. Тады сучка:

— Гаў-гаў-гаў! бабіну дачку дамоў вязуць, у кашальку косці нясуць!

Бабе гэта не спадабалася.

— Што ты брэшаш? Мая дачка шасцярнёй прыедзе, у карэце, грошы прывязе.

Сучка зноў забрахала:

— Гаў-гаў-гаў! бабіну дачку дамоў вязуць, у кашальку косці нясуць!

Тады баба ўрабела і злегла ў пасцель. А каб дачка яе шчурцы блінок дала з'есці, то была б жывая.

Аб рачку

Ехаў адзін чалавек у лес па дровы, аж глядзіць — сядзіць у хворасце рак, так ён спалохаўся і адкінуў яго галіною, а рак давай прасіцца:

— Чалавечку, вазьмі мяне дахаты.

— Адчапіся ты, гадзе нялюдскі, на чорта мне здаўся!

Але як стаў рак прасіць, як стаў прасіць, так ён нішто, узяў. А там недалёчка жыў кароль і меў тры надта-надта харошыя дачкі: рак як адагрэўся на печы, так давай прасіць свайго гаспадара, каб пайшоў да караля і сказаў, што ў яго ёсць сын рачок і што ён хоча з каралеўнаю ажаніцца. Гаспадар кажа:

— Здурэў ты, гадзіна, ці што? Як ты смееш так казаць!

Але як стаў рак прасіць, як стаў прасіць, так пайшоў. Прыходзіць дый то неяк адважыўся і кажа: так і так. Так кароль:

— Ну, калі твой сын гэтакі разумны, то няхай мне за гэту ноч ад твае хаты да майго палаца дыяментавы мост зробіць.

Так гаспадар прыйшоў і кажа:

— А што, казаў, што не варта хадзіць, цяпер глядзі, казаў, каб ты за адну ноч дыяментавы мост выставіў!

А ён:

— Ну, то і добра,— кажа,— гэта ўжо не ваша бяда, толькі вынесіце мяне на двор ды на стаўбцы пасадзіце.

Так ён яго і вынес. На заўтрашні дзень, зрання, кароль выходзіць, ажно ззяе ўжо дыяментавы мост! Так прызваў да сябе таго гаспадара дый кажа:

— Відаць, твой сын разумны, то няхай жа яшчэ зробіць, каб за гэту ноч ад твае хаты да майго палаца мак расцвіў.

Гаспадар, прыйшоўшы дахаты, наваліўся на рачка і кажа:

— Ну, мост то ты зрабіў, але гэтага не ведаю, ці дасі рады.

— Кажыце! Ну што ён там вычварыў?

— А то ж казаў, каб ад хаты да палаца мак расцвіў за гэту ноч!

А рачок кажа:

— Ну, гэта яшчэ не бяда! Стойце, толькі вынесіце мяне на двор і дайце жменьку маку.

Ён гэтак зрабіў. Калі на заўтрашні дзень кароль прачнецца, глядзіць праз акно, ажно праўда, найхарашэйшы мак цвіце! Кароль прызваў гэтага чалавека дый кажа:

— Калі так, то няхай твой сын той дачцы, каторую ён сабе выбера, сукню, не мераючы, справіць.

Той гаспадар прыйшоў, кажа так і так, ажно за ноч і сукня стала гатова. Тады ўжо яго ўзяў дый завёз да караля. Паказаў ён сукню, так кароль сказаў сваім дочкам станавіцца ў рад, а яму выбіраць. Так ён серадольшай дачцы на ножку ўспоўз, памералі сукню — ажно як уліта на яе!

Тады зараз сталі хадзіць каля вяселля, палажылі рака на талерцы, паабкладалі дыяментамі і так ім шлюб давалі.

Па шлюбе кладуцца спаць, ажно ён узяў струхнуўся, так шкарлупіна абляцела, дый зрабіўся харошы каралевіч. А тую шкарлупіну пад падушку палажыў. Як каралеўна ўгледзела такога нязмерна харошага, так надта ўцешылася і ўжо тады перастала плакаць.

А гэта не быў рак, ды каралевіч, закляты праз адну ведзьму ў рака. Ажно назаўтра незнарок яна агледзела гэту шкарлупіну дый, схапіўшы яе, кінула ў агонь.

Прыходзіць ён, хоча на сябе ўзлажыць — няма! Так ён да яе:

— Не бачыла ты таго, што пад падушкаю было?

— Чаго? Брыды гэтай? А то ж я ўзяла і спаліла.

— Ну ж цяпер ты мяне навекі згубіла! Мне ўжо толькі месяц было пакутаваць, а ты мне вырабіла, што я не ведаю, калі пакута скончыцца.

І даў ёй жалезныя чаравікі дый кажа:

— Як гэтыя чаравікі стопчаш, тады хіба я выпакутуюся.

Гэта кажучы, перакінуўся ў галуба і паляцеў. Яна ад таго часу як дзень, так ноч усё плакала ды лямантавала, ды ўсё хадзіла па лесе ды па полі, па карэннях, па каменнях, каб хутчэй чаравікі патаптаць.

Ажно аднаго разу зайшла да аднае хаткі, а ў той хатцы была ведзьма, што каралевічаў заклінала. Яна просіцца на службу, а ведзьма кажа:

— Мне не трэба, у мяне і так ёсць задосыць, хіба ідзі тут недалёка да аднае пані, то яна цябе возьме галубкі пасвіць.

А тая пані таксама была ведзьма і згадзіла яе пасвіць,

а тыя галубкі ўсё былі заклятыя каралевічы. Тая ведзьма ёй так сказала:

— Як будуць усе галубкі цэлыя, то я табе добра заплачу, а калі не, то галаву зніму.

І здала ёй на рукі ўсё чыста. Гоніць яна іх пасвіць дый між усімі пазнала неяк свайго. А ён яе таксама пазнаў і з тае пары стаў ёй пасабляць: як галубкі дзе паразлятаюцца, ён іх пазганяе да горбы.

Выбыла яна год і ідзе па плату, ажно яе каханы сядзіць на дубе і кажа:

— Глядзі ж, ты нічога не бяры, толькі аднаго галубка, а ўжо ты мяне пазнаеш, бо я няўзнак кіўну галоўкаю.

Ведзьма, пералічыўшы галубкі, бачыць, што ўсе, і кажа:

— Ну, дзеўка, добра ты пасвіла — дам, што хочаш, а мо на другі год аставайся?

А яна кажа:

— На другі рок застацца не магу і грошай не хачу, толькі за тое дайце мне аднаго галубка.

— Добра,— кажа,— які ж табе даспадобы?

А каралевіч кіў няўзнак галоўкаю, так яна кажа:

— Вось, я гэтага хачу! — і ўзяла сабе.

Варочаецца яна да палаца, ажно на дарозе чаравікі падраліся, так ён як бач і перакінуўся зноў у чалавека.

Кароль, угледзеўшы іх, надта ўзрадаваўся, зараз ім справіў вялікі банкет, усе каралі на ім былі, віно лілося рэкамі, і я там была, мёд-віно піла, па барадзе цякло, а ў роце не было.

Два ў кораб арэшкі

Жылі-былі дзед і баба. Было ў іх тры дачкі. Гэтыя дочкі ўсё пралі ўтрох. Раз пралі яны ў лазні, а ехаў цар з фурманам. Едзець і кажаць:

— Што такое? Ніколі агню не было ў гэтай лазні, а цяпер аганёк гарыць. Пайдзі паглядзі.

Зайшоў гэты фурман у лазню. Глядзіць: тры дзеўкі прадуць. Пастаяў ён пад дзвярмі. Пастаяў ён пад дзвярмі, чуець, адна кажаць:

— Го, каб я за цара пайшла, нічога б не хацела, увесь бы свет абаткала:

А другая кажаць:

— А каб я пайшла за цара, так бы аднэй ба нітачкай увесь свет адзела.

А трэцяя кажаць:

— А я каб пайшла за цара, за пана круля, дык ба двух

сынкоў прывяла: аднаго з-пад мясёнца, вакол гвяздачкі, а другога з-пад слонца, слонца б свяціла. На адным слонца, на другім месяц і звёзды свяцілі.

Гэты фурман пазваў караля. Падыйшоў гэты кароль, паслухаў, паслухаў.

— Ну,— кажаць,— як гэтак, паедзем дамоў.

Паехалі яны дамоў. Прыязджаець назаўтра кароль да іх у сваты. Прыехаў гэты ўжо кароль у сваты і кажаць:

— Дзе тая, каторая казала, што двух сыноў прывядзець: аднаго з-пад слонца, а другога з-пад месяца і звёздачкі.

Гэта была самая меншая. Ну, і ўзяў ён ажаніўся ўжо, гэты кароль. Ажаніўся ён, кароль гэты, ну і жывець з ёй. Жывець. Прыходзіць яму аб'яўленне на вайну ехаць. Паехаў ён на вайну, а ў яе яшчэ не было гэтых сыноў. Прыйшлі ейныя дзве сястрыцы, старэйшых яна забрала к сабе, гэтых абедзвюх, каб яны ўжо жылі і ёй весялей было. Нарадзіліся ў яе два сыночкі. Адзін — у лобе месяц свеціць і звёзды, а ў другога слонца над галавой. Як ён ідзець, так слонца свеціць, дзе ні йдзець, усюды слонца свеціць. Толькі як шапкі надзенуць — тады нічога не відаць. Як шапачкі здзенуць,— тады відаць.

Не панравілася гэтым сёстрам, што яна маладзейшая, а яна царыцай.

Напісала яна пісьмо ўжо цару гэтаму, каралю. Напісала яна пісьмо каралю, што ў яе два сыны нарадзіліся, што адзін ужо з-пад слонца, другі з-пад мясёнца. Паслала, слуга ж нёс, а сёстры яго перанялі, напаілі ў хаце там недзека. Узялі пісьмо, перапісалі ягонае і напісалі, што яна двух шчанючкоў прывяла, два шчанюкі ёсць у яе. Ну што ж. Пачуў цар гэта пісьмо, ну ўсё роўна, што ні ёсць, пускай будзець. «Да майго вяртання нічога штоб не дзелалі. Пусць яны гадуюцца, гэтыя самыя шчанючкі». Прынёс слуга зноў гэта пісьмо. Яны зноў перанялі яго, прачыталі пісьмо, зноў напісалі, каб выкінулі яе вон, вывезлі саўсём, дажа ў лес, штоб яе нагі не стала ў хаце. Ну што, узялі гэтыя слугі ўсе сабраліся, мусяць жа ж прыказ цара слухаць. Узялі яе, адзежу ейну царскую здзелі з яе ўсю, дзяцей гэтых саўсём павыкідвалі голенькіх на двор, не было нічога ў яе, што надзець. Тады яна нейкіх там анучак знайшла рваных, паўкручвала гэтых рабятак ужо і пайшла ў свет. Торбамі абчапілася на плечы і пайшла ўжо жабраваць. Ну, хадзіла яна доўга, жабравала, жабравала, гэтыя сынкі падраслі, настаяшчыя ўжо сталі, па пяць, па шэсць гадоў ім ужо. Выраслі яны і ходзяць па свету ўсё і жабруюць.

Вярнуўся гэты цар з вайны. Ну, сказалі яны, што яна сама кінула ўсё і ўшла за тое, што гэтакія шчаняты прывяла яму. Шчаняты ў яе. Ну, што ж ён будзець рабіць.

Тады яна ўжо раз ідзець каля возера. Прыйшла ўжо ў возера. Цяжка хадзіць, трудна жабраваць і кажаць:

— Мае вы дзеткі, я ўжо вас падгадавала, а я вазьму і ўтаплюся ўжо ў гэта возера.

Яны сталі плакаць:

— Мама, не тапіся, мы падрасцём, будзем жыць, тады і цябе будзем глядзець.

Ну, пайшлі яны.

— Пойдзем да бацькі да нашага, да цара свайго, пойдзем туды.

А там баль, сільна залажыў баль вялікую цар гэты. Гасцей сазваў са ўсяго свету, якія толькі былі госці, усіх гасцей паззываў ён туды на гэта ўжо, на баль. Ну, прыйшлі, прыйшлі яны ў кухню, у служанкі просяцца:

— Можа вы пусцілі б нас нанач?

Дык яна:

— Ой, у нас нідзе месца няма сёння — гэтулькі многа людзей, не магу нідзе вас пусціць.

Дык яны:

— Ну, хоць мы пад краваццю, хоць дзе, пазвольце вы нам ужо хоць дзе-небудзь схавацца, то няма нідзе, ноч на двары.

Ну, служанка каець:

— Толькі схавайцеся і ціханька сядзіце, каб ніхто вас не ўвідзеў, бо, барані бог, хто увідзіць, дык і мяне выганяць вон за вас.

Ну, тады гэдак ужо схаваліся яны і ляжаць пад ложкам. Ну, балявалі, пілі яны там, гулялі, тады цар прынёс цэлы кораб арэхаў і кажаць:

— Хто разгадаець гэты кораб арэхаў, таму апішу палавіна свайго царства.

Усе разгадвалі, усе разгадвалі — ніхто не разгадаў. Тады гэтыя хлопчыкі просяцца:

— Мама, мы папросімся ў служанкі, мы разгадаем гэты кораб арэхаў.

Яна кажаць:

— Дурачкі, ён вас не прымець абадраных, гэтакіх страшных.

— Не, мы разгадаем.

І вот тады яны прасіліся, прасіліся, служанка гаворыць:

— Ну я схаджу, я схаджу, папрашу ў цара гэтага, ці прымець ён вас.

Пайшла, спыталася:

— У мяне жабрачка начуець, двое ў іх мальчыкаў, яны просяцца, яны кажуць, што яны разгадаюць ужо гэты кораб арэхаў.

— Ну, пускай ідуць.

Прыйшлі яны і сталі разгадваць абодва, адзін і другі. Вот адзін бярэць пару арэшкаў і кладзець у другі кораб арэхаў, у парожны кораб. І кажа:

— Два ў кораб арэшкі, быў стары, два ў кораб арэшкі, былі ў яго тры дачкі, два ў кораб арэшкі, яны пралі, два ў кораб арэшкі, і гаварылі, два ў кораб арэшкі: «Каб мы пайшлі за пана круля, два ў кораб арэшкі, адна казала, два ў кораб арэшкі,— я б аднэй ба нітачкай увесь свет бы абвязала, два ў кораб арэшкі». Другая казала, два ў кораб арэшкі: «Каб я выйшла за пана круля, два ў кораб арэшкі, я ўсім ба кросны ткала, два ў кораб арэшкі, я ўсіх ба аднэй ба адзежкай адзела, два ў кораб арэшкі». А трэцяя кажаць: самая меншая, два ў кораб арэшкі: «Я каб пайшла за пана круля, два ў кораб арэшкі, я б двух бы сынкоў прывяла, два ў кораб арэшкі, аднаго з-пад мясёнка кала звёздачкі, два ў кораб арэшкі, а другога з-пад слонца, два ў кораб арэшкі». Пан круль ехаў, два ў кораб арэшкі, пачуў, што гэтак гаварылі тры сястры, два ў кораб арэшкі. Ён ажаніўся з гэтай, два ў кораб арэшкі, каторая гаварыла, два ў кораб арэшкі, двух сынкоў прывядзе, два ў кораб арэшкі. Пану крулю прыйшлося, два ў кораб арэшкі, ехаць на вайну, два ў кораб арэшкі, а крулёва нарадзіла двух сынкоў, два ў кораб арэшкі: аднаго з-пад мясёнца, два ў кораб арэшкі, а другога з-пад слонца, два ў кораб арэшкі. Напісала пісьмо, два ў кораб арэшкі, пану крулю, каб ён ведаў, два ў кораб арэшкі, што яна прывяла двух сынкоў, два ў кораб арэшкі. Паслала слугу, два ў кораб арэшкі, а слугу сёстры перанялі, два ў кораб арэшкі, пісьмо перапісалі, два ў кораб арэшкі, што прывяла двух шчанючкоў, два ў кораб арэшкі. Ён, цар, сказаў, два ў кораб арэшкі, што толькі ні прывяла, няхай гадуе, два ў кораб арэшкі. І адпісаў пісьмо, два ў кораб арэшкі. Яны перанялі, два ў кораб арэшкі, адпісалі, каб яна вон выхадзіла, два ў кораб арэшкі, каб яе выгналі, два ў кораб арэшкі. Яны выгналі яе з дварца, два ў кораб арэшкі. Яна пайшла жабраваць, два ў кораб арэшкі. Яна хадзіла, два ў кораб арэшкі, прыйшла да возера, два ў кораб арэшкі, хацела ўтапіцца, два ў кораб арэшкі, а сынкі сталі плакаць, два ў кораб арэшкі: «Не тапіся, мама, мы цябе глядзець будзем, два ў кораб арэшкі». У пана круля быў баль вялікі, два ў кораб арэшкі. Кажуць: «Мама, пойдзем да свайго папы, два ў кораб арэшкі, сходзім, паглядзім, які ён ёсць, два ў кораб арэшкі». І мы прыйшлі, два ў кораб арэшкі, а там служанка не пушчала, два ў кораб арэшкі. Папрасіліся нанач, два ў кораб арэшкі, а яна пусціла, два ў кораб арэшкі. Пад ложкам мы схаваліся, два ў кораб арэшкі. Мы паляжалі, два

ў кораб арэшкі. Пан круль прынёс кораб арэшкаў і сказаў, два ў кораб арэшкі, хто разгадае гэты кораб, два ў кораб арэшкі, таму поўцарства, два ў кораб арэшкі.

Мы прасіліся ў мамы, два ў кораб арэшкі: «Пусці, мама, нас, два ў кораб арэшкі». Мама не пушчала, два ў кораб арэшкі, мы папрасілі служанку, два ў кораб арэшкі, каб яна, два ў кораб арэшкі, папрасіла нас разгадаць гэты кораб, два ў кораб арэшкі. Пан круль пазволіў, два ў кораб арэшкі.

І яны шапачкі паздымалі: слонца засвяціла ў хаце, месяц, усё. І круль увідзеў і пазнаў сваіх сынкоў.

І тады сёстраў гэтых да конскіх хвастоў прывязаў і паганяў, і іх паразрывалі. А тады выцягнулі яе з-пад ложка, прыбралі яе і яна стала царыцай і сыны сталі з імі жыць.

Іван Іванавіч-царэвіч

У некаторым царстве, у іншым гасударстве жыў сабе адзін цар. Захацеў ён жаніцца і паехаў у чужыя землі нявесту выбіраць. Паехаў ён у адно царства; ездзіў-ездзіў — пад абычай жану не знайшоў. Вярнуўся дамоў. Пажыў колькі там дома ды й паехаў у другое царства. І там не знайшоў пад сваю натуру. Вярнуўся дамоў, пажыў мала-многа дома і паехаў у трэцяе царства. Ездзіў-ездзіў — тожа не знайшоў. Вярнуўся дамоў і заехаў у дзярэўню. Папрасіўся ў мужыка нанач у харошага і стаў там пытаць сабе нявесты.

Тым часам павёў кучар коней паіць і спусціў вядро. Аглянуўся — цёмна ва ўсіх хатах, а ў адной свеціцца. Ён пайшоў вядзерца прасіць туды. Падыходзіць пад вакошка, аж там сядзяць тры дзявіцы — сёстры і размаўляюць між сабой:

— Царэвіч гэты ездзіць ды сватаецца, ну толькі крашай нас трох не знойдзе!

Большая кажа:

— Калі б мяне ўзяў, то я б яго ўсю армію адным хлебам накарміла!

Сярэдняя кажа:

— Калі б мяне ўзяў, то я б яго ўсю армію адной іголкай абшыла!

А меншая кажа:

— Калі б мяне ўзяў, то я б яму радзіла дванаццаць сыноў, ды ўсіх сокалаў: ва ілбе месяц, у патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры!

Кучар той не стаў ўжо вядра прасіць,— вярнуўся дадому, пазваў царэвіча і стаў яму гаварыць:

— От, царскае вялічаства, як вадзіў я коней паіць і спусціў вядро. Аглянуўся — ва ўсіх хатах цёмна, а ў адной све-

ціцца. Пайшоў я вядра прасіць, аж там тры дзявіцы сядзяць і шыюць, і выхваляюцца між сабой: «Хай гэты царэвіч хоць усю зямлю аб'ездзіць, а крашай нас не знойдзе!» Большая кажа: «Калі б мяне ўзяў, то я б яго армію адным хлебам накарміла!» Сярэдняя кажа: «Калі б мяне ўзяў, то я б яго ўсю армію адной іголкай абшыла!» А меншая кажа: «Калі б мяне ўзяў, то я б яму радзіла дванаццаць сыноў, ды ўсіх сокалаў: ва ілбе месяц, у патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры!»

Выйшаў царэвіч са двара і пытае ў таго мужыка, што начуе:

— Што, ёсць у вас такія і такія дзеўкі?

— Ёсць!

— Ну, пойдзем у сваты!

От ідзе цар і думае:

— Якую мне ўзяць?

Думаў-думаў сам сабе і надумаўся:

— Хоць бы я большую і ўзяў — у мяне хлеб ёсць; сярэднюю б узяў — у мяне і адзежа ёсць. А вазьму меншую!

Узяў сабе меншую і паехаў у сваё царства. І жыў там ці мала, ці многа, і зацяжарала яго хазяйка. На гэту пару трэба было яму са свайго царства на паўгода адпраўляцца. І прашчаецца ён са сваёй жонкай і прыказвае ёй дужа:

— Мая мілая, калі Бог дасць табе радзіны, каго б ты ні радзіла, дык бы мне напісала!

Тут жа і адправіўся ён, а яна праз месяцы два пасля яго радзіла дванаццаць сыноў, ды ўсіх сокалаў: ва ілбе месяц, у патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры. Піша яна пакет і адпраўляе са свайго царства верніка і строга яму прыказвае, штоб пакет не даваў нікому ў рукі. Дачуліся яе сёстры пра гэта і ўзялі па бальшой дарозе паадкуплівалі сабе шынкі. Так жа ехаў той вернік з пакетам і папаў к большай сястрэ нанач. І пытае тая сястра:

— Куды цябе Бог нясе?

— Еду к цару!

— Па якому случаю?

— Абрадзілася царэўна: дванаццаць сыноў радзіла, ды ўсіх сокалаў: ва ілбе месяц, у патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры!

Яна і кажа:

— А, то мая родная! Ах, дзеля такога госця трэба лазню стапіць, а то ты стаміўся-змарыўся!

Павялі яго ў лазню, а яна пакет выняла і сама напісала: «Радзіла табе, мой мілы, дванаццаць штук: кошкіны лапы, мышыныя хвасты, сабачыя раты».

Узяла запячатала і ўлажыла. Прыходзіць той з лазні, бярэ

пакет і адпраўляецца па дарозе сабе. Случаецца другая ноч, заязджае ён нанач. Тут жа пытаюць у яго:

— Куды ты едзеш?

— Еду к цару!

— Па якому случаю?

— Абрадзілася царэўна: дванаццаць сыноў радзіла, ды ўсіх сокалаў: ва ілбе месяц, на патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры.

Вот гэта адказвае:

— Ах, гэта наша родная сястрыца!

А гэта ён к сярэдняй заехаў.

Яна і кажа:

— Ах, друг наш, трэба табе лазню вытапіць!

Павялі яго ў лазню, а яна пакет разламала, яшчэ горай падправіла. Прыходзіць той з лазні і адпраўляецца па дарозе. Прыязджае к цару на граніцу, аддае пакет. Разламаў цар і ўзяў чытаць. І стаў крэпка плакаць.

— Ах,— гаворыць,— Божа міласцівы! Няўжо я перад Богам саграшыў, што мне такі случай здарыўся?

І ўзяў ён пакет пісаць:

— Мая мілая, да майго прыходу нічога не рабі!

І запячатаў пакет. Уручыў свайму давернаму. І паехаў той назад. Так жа заязджае к сярэдняй сястрэ, дзе ён начаваў. Яна яго ўгасціла і лазню затапіла. Павялі яго ў лазню, а яна ўзяла пакет разламала і напісала: «Штоб, мая мілая, не бачыў я цябе ў вочы да майго прыезду!»

Прыйшоў той з лазні, узяў пакет і паехаў па сваёй дарозе. Так жа заязджае к большай сястрэ. І тая яго прыгасціла і павяла ў лазню. А сама пакет разламала і падправіла яшчэ горш. Прыязджае ён к царэўне і аддае пакет. Царэўна пакет чытае і крэпка плача: «Ах, мой мілы! Што ты са мной робіш? Я ж табе чым выхвалялася, то й здзелала».

Толькі ж думаць нечага, а царскае слова свята: што напісана, тое і нада дзелаць.

Гукнула бондараў і кавалёў:

— Зрабіце мне бочку, а вы, кавалі, набіце жалезныя абручы.

Бочку для яе зрабілі. Яна ўзяла адзінаццаць хлопчыкаў у бочку ўпусціла, закрыла і пусціла на мора:

— Плывіце! Калі я не грэшная душа, дык вы жывы будзеце!

А сама дванаццатага ўзяла і пайшла ў свет са свайго царства. Хадзіла яна, хадзіла па ўсіх царствах і знайшла сабе манастыр. Просіцца ў гуменшага:

— Прыміце мяне за чалядку!

Гуменшы прыняў яе за чалядку. А хлопчыка стала прасіць, штоб у школу. Той жа хлопчык вучыцца скорым поспехам. І так вывучыўся ён за год, што другія па дзесяць год вучацца.

Скора казка кажацца, ды не скора дзела дзелаецца.

І вырас той хлопчык. І стала яму праціўна: бачыць ён, што яго матка за чалядку служа. Ён гаворыць:

— Матушка, годзе табе служыць, а пойдзем мы ды збудуем на бальшой дарозе ля мора сабе дом!

От яны і пайшлі адтуль. Прыйшлі к мору і выстраілі сабе там дом, і сталі займацца рознымі таргоўлямі. Ішлі бальшой дарогай звозчыкі каля дома, і ажарабілася ў іх кабыла. Дык яны падарылі яму жарэбчыка.

Прыязджалі к яму карабельшчыкі,— ішлі морам. Так жа ён іх і ўтасціў. І пабылі ў яго карабельшчыкі, і адпраўляюцца яны к свайму цару. Хлопчык іх праважае і заходзіць к свайму каню. Кажа яму конь:

— Ах, хазяін мой любы, узлезь ты на мяне і ўпадзі з мяне, і станеш ты галубцом. І паляціш ты на той бок мора, і сядзеш ты карабельшчыку на правае плячо, і занясе ён цябе ў царскія комнаты. І выслухаеш ты там, што будзе цар з царыцай гаманіць!

А цар той вярнуўся з воінства, дзе ён быў, і большую сабе сястру ўзяў сваёй жонкай.

Прыходзіць карабельшчык у комнату к цару:

— Найяснейшы, от па той бок мора што здзелалася: выстраіла ўдава дом сабе, і такі ў яе хлопчык, што крашай яго ў свеце няма: ва ілбе месяц, у патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры!

Дрогнула царскае сэрца, і зараз жа адправіў карабельшчыка з свайго дому.

— Ах,— гаворыць,— мая мілая, паедзем, пасмотрым на той бок, што там за хлопчык — гэта дзіва?

— Э, мой мілы, ці гэта дзіва? Гэта не дзіва, а ёсць дзіва: за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, на моры, на лукамор'і, на востраве стаіць дуб, а на тым дубе дванаццаць кокатаў, а на тых кокатах па дванаццаць святліц, а ў тых святліцах па дванаццаць дзявіц ды шыюць адзежу дарагую, ды кідаюць далоў, і гніе тая адзежа ні к якой пользе!

Вылятае той галубец з царскага дому, прылятае ў свой дом, садзіцца на свайго каня, падае далоў — і стаў чалавекам. І пытае ў яго конь:

— Ах, хазяін мой любы, што там цар з царыцай гаварылі?

— А што ж яны гаварылі. Гэта, гавораць, не дзіва, а то дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве,

у вялікім гасударстве, на моры, на лукамор'і, стаіць дуб, а на тым дубе дванаццаць кокатаў, а на тых кокатах па дванаццаць святліц, а ў тых святліцах па дванаццаць дзявіц ды шыюць адзежу дарагую, ды кідаюць далоў, і гніе тая адзежа ні к якой пользе! Конь мой любы, конь мой мілы, ці не можам мы гэтага дзіва дастаць?

— Прасі ў маткі благаславення, і паедзем у пуць!

Дала яму матка благаславенне, сеў ён на свайго каня і паехаў у пуць! Прыязджае к таму дубу:

— Здрастуй табе, дубе!

— Здрастуй, Іван Іванавіч-царэвіч!

— Эх, дубе, у якім ты ў нядобрым месцы стаіш! Калі б ты пайшоў у маю старану, там бы гэту адзежу насілі б і за цябе Бога прасілі!

А той дуб адказвае яму:

— А што ж, будзеш ты маю адзежу знашваць?

— Буду!

— Ну, я з табой пайду!

Сеў царэвіч на свайго каня, а дуб услед за ім ідзе. Прыехаў ён дамоў, прывёз дуб з сабою і паставіў сабе ля дому. І пачулі пра гэта дзіва па ўсяму міру. Ідуць жа гэта дзіва глядзець. Ішлі карабельшчыкі морам, прывярнулі караб к яго двару не так аддыхаць, як гэта дзіва паглядзець. Адпраўляюцца карабельшчыкі. Праважае іх хлопчык і заходзіць к свайму каню. Кажа яму конь:

— Вот, хазяін любы, скінься ты галубцом і ляці на той бок мора, і пачуеш ты, што будуць цар з царыцай гаварыць.

Ён узлез на каня, упаў з яго, скінуўся галубцом і паляцеў на той бок мора. Прылятае туды, садзіцца карабельшчыку на плячо, і ўваходзяць яны ў горніцы. Распісуецца цар з карабельшчыкам, і выхваляецца карабельшчык:

— Ах, цару найяснейшы, па той бок мора дзіва з'явілася: стаіць дуб, а на тым дубе дванаццаць кокатаў, а на тых кокатах па дванаццаць святліц, а ў тых святліцах па дванаццаць дзявіц ды шыюць адзежу дарагую.

Цар гэты выслухаў і карабельшчыка адсылае назад, і кажа царыцы:

— Ну, мая мілая, паедзем гэта дзіва паглядзім!

— Гэта, мой мілы, не дзіва, а то дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, стаіць шчогла, а на шчогле зязюля. Што кукне,— дык салдат з яе выйдзе з канём і з сядлом, і на вайну гатоў. Ды есць там нечага, і народ памірае галоднай смерцю!

От, цяпер жа вылятае той галубец з яго комнат і прылятае ў свой дом, ды пайшоў к каню. І пытае ў яго конь:

— Хазяін мой любы, хазяін мой мілы, што там цар з царыцай гаманілі?

Адказвае яму хазяін:

— Гаварылі, што то не дзіва, а от то дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, стаіць шчогла, а на шчогле зязюля. Што кукне,— дык салдат з яе выйдзе з канём і з сядлом, і на вайну гатоў. Ды есць там нечага, і народ памірае галоднай смерцю. Конь мой любы, конь мой мілы, ці не можна мне гэта дзіва дастаць?

Конь яму адказвае:

— Прасі ў маткі благаславення, і паедзем у пуць!

Узяў ён благаславенне і паехаў у пуць! Прыязджае к шчогле, злез з каня і гаворыць:

— Здрастуй табе, шчогла!

— Здрастуй, Іван Іванавіч-царэвіч!

— У якім ты ў нядобрым месцы стаіш! Калі б ты пайшла ў маю старану, там бы не паміраў гэты народ галоднай смерцю! Ці не пойдзеш ты са мной?

— Пайду!

Ён на свайго каня сеў, а шчогла ўслед за ім. Прыходзіць ён к свайму дому і становіць шчоглу ля дуба. Так жа салдат як упадзе, у адзежу надзяецца і на работу ідзе. То дзіва было, а гэтакага дзіва ніхто не бачыў. І збіраецца многа народу дзіва гэта глядзець. Ішоў карабельшчык морам і прываліў караб свой к берагу дзіва гэта глядзець. Паглядзеў гэта дзіва і адпраўляецца ў землі ў свае. Хлопчык жа, правёўшы яго, пайшоў к каню. Кажа яму конь:

— Хазяін мой любы, узлезь ты на мяне і ўпадзі з мяне, скінься галубцом і паляці на той бок мора.

Садзіцца галубец карабельшчыку на плячо, і ўносіць ён яго ў дом. І распісуецца цар з карабельшчыкам, і гаворыць карабельшчык:

— Вот, царскае сіяцельства, як па той бок мора, дык то было дзіва, а цяпер яшчэ большае: стаіць шчогла, а на шчогле зязюля. Што кукне,— дык салдат з яе выйдзе з канём і з сядлом, і на вайну гатоў. Як упадзе, у адзежу надзяецца і на работу ідзе.

Адпраўляе ён карабельшчыка і кажа:

— Ах, мая мілая, паедзем гэта дзіва глядзець!

— Э, мой мілы, ці гэта дзіва? То дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, дзікі кабан лычам арэ, нагамі скародзіць, хвастом рассявае, і ў тры дні хлеб паспявае. Ды некаму яго з'ядаць, дык ён там і згнівае.

Галубец адправіўся дамоў і, не заходзячы ў свой дом, ідзе к каню свайму. Пытае ў яго конь:

— Ах, хазяін мой любы, хазяін мой мілы, што там цар з царыцай гаманілі?

— Што ж там цар з царыцай гаманілі. Гэта, гавораць, не дзіва, а от то дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, дзікі кабан лычам арэ, нагамі скародзіць, хвастом рассявае, і ў тры дні хлеб паспявае. Конь мой любы, конь мой мілы, ці не можам мы гэтага дзіва дастаць?

Конь яму адказвае:

— Прасі ў маткі благаславення, і паедзем у пуць!

Ён узяў благаславенне, сеў на свайго добрага каня і паехаў. Прыязджае к кабану.

— Здрастуй табе, кабан!

— Здрастуй, Іван Іванавіч-царэвіч!

— Эх, у якім ты месцы ў нядобрым стаіш, хлеб сееш! От як бы ты пайшоў у маю старану, там бы мы гэта жыта зжыналі і гэты хлеб з'ядалі, і за цябе б Бога прасілі! Ці не пойдзеш ты са мною?

— Пайду!

Ён сеў на свайго на добрага каня, а дзік услед за ім. Прыводзіць царэвіч яго к свайму двару і становіць на сцяпу. Так жа, як зязюля кукне,— салдат з яе выйдзе, у адзежу надзяецца і на работу ідзе — жыта жаць.

Скора казка кажацца, ды няскора дзела дзелаецца.

У яго ўжо здзелалася такое царства, што ўжо больш, чым у цара. То дзіва глядзелі, а то яшчэ больш сталі людзі глядзець.

Ішоў карабельшчык морам і прывярнуў караб гэтага дзіва паглядзець. Праводзіць хлопчык карабельшчыка і заходзіць к свайму каню. Кажа яму конь:

— Хазяін мой любы, хазяін мой мілы, скінься ты галубцом, ляці на той бок мора і паслухай, што цар з царыцай будуць гаманіць.

Ён скінуўся галубцом і паляцеў. Садзіцца карабельшчыку на плячо, і ўносіць ён яго ў дом. І распісуецца цар з карабельшчыкам, і гаворыць карабельшчык:

— Вот, царскае сіяцельства, як па той бок мора, дык было дзіва, а цяпер яшчэ паболела: стаіць на сцяпу дзікі кабан, лычам арэ, нагамі скародзіць, хвастом рассявае, і ў тры дні хлеб паспявае. Салдат з дуба выйдзе, у адзежу надзяецца і на работу ідзе — жыта жаць.

Цар карабельшчыка назад адправіў і стаў з царыцай гаманіць:

— Ах, мая мілая, ну, паедзем гэта дзіва паглядзім!

А яна яму адказвае:

— Гэта дзіва не дзіва, а ёсць дзіва: за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве ёсць рака — кісялёвы берагі; прыйдзі — пакушай і сумкі не рушай! Як паядаеш, яна зноў зарасце.

Адпраўляецца той галубец з царскага дому і прылятае к свайму дому. Не зайшоўшы ў дом, пайшоў к свайму каню. От, конь у яго пытае:

— Хазяін мой мілы, хазяін мой любы, што цар з царыцай гаманілі?

— А што гаманілі. Казалі, што гэта не дзіва, а от дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, ёсць рака — кісялёвы берагі; прыйдзі — пакушай і сумкі не рушай! Як паядаеш, яна зноў зарасце. Конь мой любы, конь мой мілы, ці не можам мы гэтага дзіва дастаць?

Конь гаворыць:

— Вазьмі ў маткі благаславенне, і паедзем у пуць!

Ён узяў благаславенне, сеў і паехаў. Прыязджае к рацэ к гэтай.

— Здрастуй, рака — кісялёвы берагі!

— Здрастуй, Іван Іванавіч-царэвіч!

— Эх, у якім ты ў нядобрым месцы стаіш! Ці не пойдзеш ты са мной у маю старану? Там бы цябе з'ядалі, там бы цябе співалі, і ўсягды б ты свежая была.

— Пайду!

Сеў ён на свайго добрага каня, а рака ўслед за ім. І прывёз ён яе к свайму дому, і паставіў ля берага. Так жа дуб адзежу шые, зязюля кукне,— салдат выйдзе, адзежу надзяе, кабан хлеб засявае, салдат хлеб паесць, ідзе к рацэ. Прыйшоў, паядаў і пайшоў жыта жаць, і ў цагельню, у розныя работы там. То ж дзіва глядзелі, а то яшчэ больш сталі глядзець, з усяго свету прыязджаць. Так жа ішоў карабельшчык і прычаліў караб гэтага самага дзіва паглядзець. Паглядзеўшы гэта дзіва, правёў яго хлопчык гэты. І правёўшы яго, пайшоў к каню к свайму. І конь яму гаворыць:

— Хазяін мой любы, хазяін мой мілы, скінься галубцом і ляці на той бок мора, паслухай, што цар з царыцай будуць гаманіць.

Ён на каня ўзлез, з каня ўпаў і скінуўся галубцом. І паляцеў на той бок мора, сеў карабельшчыку на правае плячо, і ўнёс яго карабельшчык у царскія пакоі. Распісуецца цар з карабельшчыкам, і гаворыць яму карабельшчык:

— Вот, царскае сіяцельства, якое дзіва па той бок мора! То было дзіва, а цяпер яшчэ паболела. Цячэ рака — кісялёвы

берагі; прыдзі — пакушай і сумкі не рушай! І як паядаеш, яна зноў зарасце. Так жа дуб адзежу шые, зязюля кукне,— салдат выйдзе, кабан хлеб засявае, салдат адзежу надзявае, хлеба пад'есць, ідзе к рацэ. Прыйшоў, паядаў і на работу пайшоў.

Цар адправіў карабельшчыка і гаворыць на царыцу:

— Ну, мая мілая, паедзем дзіва паглядзім!

Яна яму адказвае:

— Гэта дзіва не дзіва, а то дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, стаіць кельня ля мора, і ў той кельні адзінаццаць братоў спасаюцца. І не знаюць яны, што яны браты адной маткі і аднаго бацькі. Дык от дзіва!

Адпраўляецца той галубец к свайму двару. Не пайшоў у дом, ды пайшоў к каню. Конь яго пытае:

— Хазяін мой мілы, хазяін мой любы, што цар з царыцай гаманілі?

— А што гаманілі. Казалі, што гэта не дзіва, а то дзіва, што за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, стаіць кельня ля мора, і ў той кельні адзінаццаць братоў спасаюцца. І не знаюць яны, што яны браты адной маткі і аднаго бацькі. Дык ці можам мы гэтага дзіва дастаць?

Гаворыць конь яму:

— Ідзі к маці і прасі, каб яна спякла праскуру!

Так жа ідзе ён ад свайго каня, хлопчык той, к маці сваёй:

— Матушка, спячы мне праскуру!

Яна паслухала яго і спякла праскуру. Ён жа ўзяў тую праскуру, сеў на свайго добрага каня і паехаў у пуць. Прыязджае к той кельні. І падказвае яму конь:

— Ступай ты ў кельню і вазьмі тую праскуру, што на стале будзе ляжаць, а гэту палажы, і сам схавайся!

Так жа ён увайшоў у кельню і ўзяў тую праскуру, а сваю паклаў, і сам схаваўся. Уваходзяць адзінаццаць братоў у кельню. Паселі за стол, і разламаў большы брат праскуру на адзінаццаць частак. І ўзялі яны па частачцы, і з'елі тую праскуру. Глянулі адзін на другога, заплакалі.

— Ах,— гаворыць адзін,— гэта ж мы браты ўсе!

І закрычалі:

— Хто тут ёсць? Адзавіся!

Ён жа і адазваўся. Яны ўзялі дружка дружку пацалавалі і ўзналі, што іх дванаццаць братоў родных. І пайшлі яны сабе дамоў, ужо ў хлопчыка гэтага ў гасподу. Яны селі ж у сваю бочку, а ён на свайго добрага каня. Прыязджае дамоў і кажа сваей маці:

— Эх, матушка! Найшоў я сваіх адзінаццаць братоў!

Тут жа і бочка к яму, к яго дому прыйшла. Устанавіўся круг, і выходзяць яны з круга, і выйшла маці проціў іх, і пазвала іх у дом. І сталі яны там піць і гуляць. Так жа збіраліся тое дзіва глядзець, а то стала ўжо збірацца нязметная сіла глядзець ужо на гэтых на хлопчыкаў. Так жа ішоў карабельшчык і прываліў гэта дзіва глядзець. Паглядзеўшы гэтага дзіва, і адправіўся ў свой караб. Праводзіць яго хлопчык. Заходзіць к каню. Кажа яму конь:

— Скінься ты галубцом і ляці к цару, што будзе цар з царыцай гаманіць?

Ён узлез на каня, упаў з яго, скінуўся галубцом і паляцеў. Прылятае к цару і садзіцца карабельшчыку на плячо, і ўносіць ён яго ў дом. Распісуецца цар. Цяпер карабельшчык яму адказвае:

— Ах, царскае вялічаства! От, па той бок мора то было дзіва, а то й паболела. То быў адзін хлопчык, а цяпер стала дванаццаць: ва ілбе месяц, у патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры!

Так жа і дрогнула сэрца ў цара! І хутка адправіў карабельшчыка таго, і на сваю царыцу:

— Ну, мая мілая, гэтага дзіва паедзем паглядзім!

— Эх, мой мілы, як жа нам даехаць? Мы паедзем лодкай, хваля ўсхваціцца — мы патопімся. А калі б ад нашага крыльца ды да яго дварца выстраіўся мост — маснічка залатая ды сярэбраная, і стаўбы стаялі, і фанары гарэлі, і жаркі пціцы пелі, от тады мы паедзем!

Той жа галубец выляцеў з таго дому і прыляцеў дамоў. Не заходзіўшы ў дом, пайшоў к каню свайму. І пытае ў яго конь:

— Хазяін мой любы, хазяін мой мілы, што цар з царыцай гаманілі?

— А што гаманілі. Цар казаў: «Ну, паедзем, мая мілая, гэтага дзіва паглядзім», а царыца кажа: «Як жа нам ехаць? У човен сядзем, а хваля ўсхваціцца — мы патопімся. От калі б ад нашага крыльца да яго дварца выстраіўся мост — маснічка залатая ды сярэбраная, і стаўбы стаялі, і фанары гарэлі, і жаркі пціцы пелі, от тады мы паедзем!» Конь мой любы, конь мой мілы, ці не можам мы гэтага дзіва зрабіць?

— Ідзі ты к сваім братам і скажы ім, каб яны старыя кнігі да свету чыталі. А ты ж бяры тапор ды ступай на двор, і так жа колікі цяшы, і ў зямлю бі, старайся, штоб кроў з цябе лілася, а ты верна работай, і чым больш, тым лепш!

Так яны і зрабілі: тыя кнігі чыталі, а ён узяўся гэту работу дзелаць. Стала на зару займацца, стаў на моры мост паднімацца. Сонца ўзышло — і мост гатоў — залатая маснічка і сярэбраная, і фанары загарэліся, і жаркі пціцы запелі.

Цар устаў і ўбачыў, што мост стаіць. Тады ён:

— Ну, мая мілая, паедзем гэта дзіва паглядзім!

Зараз жа коней запрэглі і паехалі.

І спаткала яго хазяйка, матка гэтага хлопчыка, з хлебам, з соллю. І там сталі яны піць і гуляць. Пасля бяседы стаў цар збірацца дамоў. Так жа яна кажа:

— Не, царскае вялічаства, у нас так не адпраўляюцца! Наце-тка вам гэту кнігу, прачытайце.

А яна ў гэту кнігу пісала ўсё дзела, як з двара пайшла. Калі ж цар прачытаў гэту кнігу, загадаў адсеч другой жонцы галаву. І сталі яны там жыць.

І я там быў, мёд-віно піў, і ў роце не было, і па барадзе не цякло.

Залатое пяро

Даўно-даўно жылі ў нас два браты. Паехалі яны разам у Сянно. Ехалі, ехалі і знайшлі на дарозе дзіцяня і жарабя. Старэйшы кажа:

— Няхай мне будзе гэта дзіця.

А меншы кажа:

— Не, няхай мне.

І сталі яны ажно сварыцца. Сварыліся, сварыліся яны гэтак, але кажуць:

— Ну, пойдзем к пану, панясём гэта дзіця, няхай нас пан рассудзіць.

— Ну і пойдзем!

— І пойдзем.

Сказалі гэтак і пайшлі к пану. Як прынеслі пану дзіця і жарабя, пан іх убачыў — яны яму дужа спадабаліся. Ён братам і кажа:

— Чым вам сварыцца, аддайце вы мне іх, я вам заплачу.

Браты тыя парадзіліся ды ўзялі і аддалі пану дзіця і жарабя, а пан заплаціў ім, колькі яны там згаварыліся.

Асталіся яны ў пана. Пан адгарадзіў ім па пакою: адзін пакой дзіцяці, а другі пакой жарабяці. І назваў дзіця пан Іванькам. Стаў пан іх гадаваць, а яны не па гадах растуць, ды па чыслах. Скора казка кажацца, ды няскора справа робіцца, так і тут. Вырас Іванька. Пан раз паслаў яго з фальварка ў вёску — як вось з Багданава ды ў Андрэйчыкі — загадваць мужыкам на прыгон ісці. Едзе ён на тым, на сваім, кані па дарозе, ажно бачыць — ляжыць на дарозе залатое пяро, ды якое прыгожае! Толькі Іванька сагнуўся яго браць, а конь кажа:

— Іванька! Не руш пяра, бо будзе бяда!

Іванька не паслухаў каня і ўзяў пяро. Узяў Іванька пяро і паехаў на вёску, загадаў там мужыкам, каб ішлі заўтра на прыгон к пану, і паехаў у двор. Прыехаўшы, занёс пяро к сабе ў пакой і палажыў. Як палажыў, так увесь пакой і асвяціла. Прыходзіць пан, убачыў гэта пяро і кажа Іваньку:

— Іванька, аддай мне гэта пяро!

Іванька кажа:

—Бяры сабе!

Забраў пан пяро у свае пакоі, дык так і асвяціла пакоі, усё роўна як днём, так і ноччу. Стаў з той пары пан Іваньку любіць і шкадаваць. Тады парабкі набунтавалі пану на Іваньку.

— А паночак наш! Іванька казаў, што ён можа дастаць тую птушку, што згубіла гэта пяро!

Пан прызваў Іваньку і кажа яму:

— Ну, Іванька! Калі ты знайшоў гэткае пяро, цяпер жа ты мне знайдзі тую птушку, што згубіла гэта пяро. А не, дык мой меч — табе галава з плеч!

Іванька, як пачуў гэта, як заплача! Пабег к каню.

— А конічак! Што я буду рабіць?

— А што?

— А што ж? Загадаў мне пан: як дастаў пяро, дык дастаў і тую птушку, што гэта пяро згубіла. А калі не знайду я тую птушку, дык пан сказаў: «Мой меч, а табе галава з плеч!»

— А што, Іванька, я табе казаў: не руш пяра, бо будзе бяда! Ну, дык гэта бяда не бяда, бяда яшчэ ўперадзе.

— А што ж рабіць?

— А ідзі к пану ды вазьмі ў яго бочку смалы і лакон палатна. Іван пайшоў к пану, узяў бочку смалы і лакон палатна і прынёс к каню.

— Ну, садзіся на мяне, Іванька, ды бяры бочку смалы і лакон палатна.

Сеў ён і паехалі. Ехалі, ехалі і пад'ехалі яны к сасоннічку. Конь і гаворыць Іваньку:

— Ну, цяпер, Іванька, вазьмі палатно ды намаж яго смалой і рассцялі на гэты сасоннік.

Іванька ўзяў намазаў палатно, разаслаў на сасоннік, а сам сеў, схаваўся дый пільнуе. Ці доўга, ці не ён чакаў, ажно ляціць птушка. Села яна на гэта палатно; ну як села, дык і прыкіпела. Конь крычыць:

— Хутчэй, Іванька, лаві, каб яна не паляцела!

Іванька падскочыў і схапіў яе, улажыў за пазуху, уссеў на каня дый паехаў. Прыехаў к пану, аддаў яму птушку, а сам пайшоў адпачываць.

Прайшло колькі там часу, пагніло ў таго пана ўсё сена.

Пан думаў, думаў, чаму б гэта яно так пагніло, і ніяк не ўгадае. А парабкі ўзялі ды зноў набунтавалі на Іваньку пану.

— А паночак! Іванька казаў, што ён можа схадзіць к Богу запытацца!

Пан вялеў ім пазваць Іваньку. Парабкі пазвалі Іваньку. Прыходзіць ён к пану, пан кажа Іваньку:

— Іванька, схадзі-тка ты к Богу спытайся, чаго гэта ў мяне сена пагніло. А калі не сходзіш, дык мой меч — табе галава з плеч!

Іванька як пабяжыць к каню ды як заплача:

— А Божа ж мой, Божа! А канёчак мой! А што ж я буду рабіць? Сказаў пан схадзіць к Богу спытацца, чаго яго сена пагніло!

А конь кажа:

— А што, Іванька! Я казаў табе: не руш пяра, бо будзе бяда! Ну, ды гэта яшчэ не бяда, яшчэ ўся бяда наперадзе. Але што рабіць? Садзіся, Іванька, на мяне ды паедзем!

Уссеў Іванька на каня і паехалі. Ехалі, ехалі — стаіць хатка. Уваходзяць яны ў хатку, а ў той хатцы дзед на печы качаецца ды крычыць гвалту. Увайшоў Іванка ў хатку, дзед і кажа:

— Куды цябе, Іванька, Бог нясе?

— А іду к Богу пытацца, чаго пагніло панава сена.

— Ах, мой ты ўнучак, спытайся ж у Бога, чаго я гэтак качаюся на печы! І злезці няможна, і ногі мае адмерзлі!

— Добра, спытаюся!

Пайшоў Іванька далей: ішоў, ішоў, ажно бачыць — качаецца па дарозе маладзіца, і яе ўсе топчуць.

— Куды цябе Бог нясе, Іванька?

— Іду к Богу пытацца, чаго панава сена пагніло.

— Запытайся ж там у Бога, Іванька, чаго гэта я ўвесь свой век ляжу на дарозе і мяне ўсе топчуць.

— Добра,— кажа Іванька.

Ехаў ён, ехаў, ажно бачыць — удвух пераліваюць ваду з аднаго калодзезя ў другі калодзезь ды не могуць ніяк пераліць.

— Куды цябе Бог нясе, Іванька?

— Іду я к Богу пытацца, чаго панава сена пагніло.

— Скажы ж ты, Іванька, там Богу, што мы ўвесь век свой пераліваем ваду з аднаго калодзезя ў другі калодзезь, ды ніяк не пераль'ём: у адным калодзезі не меньшае, а ў другім не большае.

— Добра, скажу! — адказаў Іванька і паехаў далей.

Ехаў ён, ехаў і прыехаў ажно к самаму мору. Бачыць

Іванька — ляжыць у моры рыбіна, ніяк не можа яна перавярнуцца.

— Куды цябе, Іванька, Бог нясе?

— А іду к Богу пытацца, чаго панава сена пагніло.

— А скажы ж ты там, Іванька, Богу, чаго гэта я ляжу на адным баку і ніяк не перавярнуся.

— Добра,— кажа Іванька,— скажу!

Пераехаў Іванька мора дый паехаў далей. Ехаў, ехаў — стаіць хатка. Едзе ён каля тае хаткі, ажно выходзіць з тае хаткі старэнькі чалавечак.

— Куды ты едзеш, Іванька?

— Еду к Богу пытацца, чаго гэта ў пана сёлета ўсё сена пагніло.

— А таго ў пана сена пагніло,— кажа старэнькі чалавечак,— што Дзеўка-Паланянка дванаццаць дзён купалася ў моры ды гуляла з сонцам. Ад гэтага не было сонца, ішоў дождж, панава сена і пагніло.

Іванька тады кажа:

— А Божа, Божа! Што я бачыў на дарозе, як ішоў сюды: нейкі чалавек у хатцы на печцы качаецца ды крычыць гвалту, што злезці няможна і ногі яго адмерзлі.

— Гэты чалавек быў мароз, і ён дужа многа ў людзей дабра памарозіў, многа людзей голад цярпела праз яго і многа людзей ён пасіраціў. Калі не будзе болей нікога марозіць і нікога крыўдзіць, дык пойдзе і будзе хадзіць. А калі не, дык зноў будзе ляжаць на печы не злазячы.

— А Божа, Божа! Што я яшчэ бачыў: нейкая маладзіца ляжыць, качаецца на дарозе, цераз яе ўсе едуць, яе ўсе топчуць, усю яе прытапталі.

— Гэта маладзіца была старая ведзьма-змяя; адбірала яна чужое малако. Людзі мелі па дванаццаць каровак, ды не мелі малачка; а яна ніводнае каровы не мела, ды малако ела. Людзі праз яе смяглі. Вось яна за гэта ляжыць на дарозе, што людзей многа крыўдзіла. Калі яна прысягне, што не будзе адбіраць у чужых кароў малако, дык устане, а не прысягне, дык зноў будзе ляжаць на дарозе.

— А Божа, Божа! Што я яшчэ бачыў на дарозе: два чалавекі пераліваюць ваду з аднаго калодзезя ў другі ды ніяк не пералюць: у адным калодзезі не меньшае, а ў другім не большае.

— Гэтыя людзі былі багатыры і дужа прыганялі бедных мужыкоў на прыгон к сабе — і малых і старых — і здзекаваліся з іх. Калі яны прысягнуць, што болей не будуць так рабіць, дык тады яны выльюць ваду, а калі не, дык зноў будуць пераліваць.

— А Божачка, Божа! Што я яшчэ бачыў: ляжыць на моры рыбіна ўвесь век свой на адным баку і не можа перавярнуцца.

— Гэта рыбіна полк салдатаў з'ела; калі яны выпусціць іх, дык паплыве, а калі не выпусціць, дык зноў будзе ляжаць.

Пайшоў Іванька ў двор к пану. Ішоў ён, ішоў — прыходзіць к мору, дзе ляжыць тая рыбіна. Рыбіна кажа:

— А што, Іванька, што мне Бог казаў?

— Пастой, як перайду на той бок, тады скажу!

Перайшоў на той бок і кажа:

— Калі ты выпусціш полк салдатаў, дык паплывеш, а калі не выпусціш, дык не паплывеш!

Рыбіна разінула рот. І-іх! Салдаты ідуць, музыка іграе! Як выйшлі ўсе, рыбіна і паплыла. Пайшоў Іванька далей. Ішоў, ішоў — тыя самыя два чалавекі ваду пераліваюць.

— А што, Іванька? Што нам Бог казаў?

— Пастойце, дайце выйсці наперад!

Зайшоў ён наперад, тады кажа:

— Вы былі багатыры, вы прыганялі мужыкоў бедных на прыгон к сабе, і малых і старых, і здзекваліся з іх. Калі вы не будзеце болей крыўдзіць бедных, дык вы перальяце гэту ваду, а калі не, дык вы нізашто не перальяце!

Мужыкі, пачуўшы гэта, як пабягуць за Іванькам, а Іванька як пабяжыць уцякаць... Бег, бег, але-ткі ўцёк. Пайшоў ён далей, ажно на дарозе ляжыць тая маладзіца, і ўсю яе стаптралі.

— А што, Іванька, што там мне Бог сказаў?

— Пастой, я зайду наперад, тады скажу!

Зайшоў ён наперад той маладзіцы і кажа ёй:

— Ты была старая ведзьма-змяя; ты адбірала чужое малако, людзей дужа крыўдзіла, людзі тады смяглі. Калі ты не будзеш гэтак рабіць, дык пойдзеш, а калі не, дык і век тут ляжаць будзеш!

Пайшоў Іванька далей. Ішоў, ішоў, ажно качаецца той чалавек на печцы.

— А што, Іванька, што там мне Бог казаў?

— Пастой, зайду наперад, тады скажу!

Зайшоў наперад і кажа:

— Ты быў вялікі мароз і многа памарозіў у людзей дабра, многа людзей цярпела праз цябе, многа ты людзей пасіраціў. Калі ты прысягнеш, складзеш накрыж рукі, што не будзеш крыўдзіць людзей, дык злезеш з печы, а калі не, дык ніколі не злезеш!

Чалавек той склаў рукі накрыж, злез з печы і пайшоў. Пайшоў Іванька далей. Ішоў-ішоў і прыходзіць у двор.

Пан пытаецца:

— Ну, Іванька, чаго маё сена пагніло?

— А во чаго, паночак, пагніло тваё сена: Дзеўка-Паланянка дванаццаць дзён купалася ў моры і гуляла з сонцам. І ад гэтага не было сонца, быў дождж, сена тваё і пагніло.

— Маладзец, Іванька, ступай адпачывай!

Пайшоў Іванька адпачываць. Прайшло колькі часу, парабкі зноў набунтавалі пану на Іваньку.

— А паночак наш! Іванька казаў, што ён Дзеўку-Паланянку дастаць можа!

— Пазавіце мне сюды Іваньку.

Пабеглі яны, гукнулі Іваньку з яго пакоя. Прыходзіць ён к пану, пан кажа:

— Дастань ты мне, Іванька, тую Дзеўку-Паланянку! А калі не дастанеш, дык мой меч — табе галава з плеч.

Іванька як заплача, як пабяжыць к каню:

— А канёчак ты мой! А што мне рабіць: пан сказаў мне дастаць Дзеўку-Паланянку, а калі не дастану, дык панаў меч — мне галава з плеч!

— А што, Іванька, ці я не казаў табе: не руш пяра, бо будзе бяда. Ну, ды гэта бяда не бяда, бяда яшчэ ўся наперадзе. Што рабіць, садзіся на мяне, паедзем шукаць Дзеўку-Паланянку!

Уссеў Іванька на каня і паехалі. Ехалі яны, ехалі, ажно ідзе той чалавек — мароз, што на печцы ляжаў.

— Добры дзень табе, Іванька! Куды цябе Бог нясе?

— На здароўе! Іду шукаць Дзеўку-Паланянку, пан сказаў.

— Ну, Іванька, пайду і я з табой. Ты ж мне памог, можа, і я табе памагу што-небудзь!

Пайшлі яны ўдвух ужо. Ішлі, ішлі, ажно ідзе тая маладзіца — ведзьма, што ляжала на дарозе.

— Добры дзень табе, Іванька! Куды цябе Бог нясе?

— На здароўе! Так і так; іду па Дзеўку-Паланянку, мне пан сказаў дастаць.

— Пайду і я з вамі. Бо ты мне памог, можа, і я табе, Іванька, што-небудзь памагу!

Пайшлі яны ўжо ўтраіх. Ішлі, ішлі, ажно сустракаюць тых людзей, што ваду пералівалі. А яны Іваньку «добры дзень» не далі. Пайшлі яны ўтраіх далей. Ідуць, ідуць і прыходзяць к мору. Як бы тут дастаць з мора Дзеўку-Паланянку? Думалі, думалі, але-ткі ўздумалі. Маладзіца тая скінулася крамкай і стала на марскім беразе; і ў той крамцы відаць дужа прыгожыя стужкі, хусткі і ўсё чысценька, што каму трэба, усё есць. Ды такое прыгожае, што і ўздумаць няможна. Вытыркнула Дзеўка-Паланянка галаву з мора ды як убачыла гэту крамку, дужа ёй захацелася што-небудзь у гэтай крамцы

ўзяць. Але баіцца, ці няма каго. Вытыркнула яна галаву другі раз, паглядзела, паглядзела — няма нікога, бо Іванька з канём захаваўся, маладзіца скінулася крамкай, а чалавек той стаў марозам. Вытыркнула яна галаву ў трэці раз, глядзіць — зноў нікога не відаць.

Тады яна сама сабе думае: «Ужо тут нікога няма, пайду ў крамку». Вылезла з мора і пайшла. Толькі яна вылезла, а мароз узяў ды мора ўсё і замарозіў. Конь крыкнуў на Іваньку:

— Бяжы, Іванька, лаві хутчэй Дзеўку-Паланянку!

Тая як пачула гэта, што хочуць яе злавіць, пабегла ў мора. А там усюды лёд. Іванька яе тут і ўхваціў.

— Ну,— кажа конь,— дзяржы, Іванька, пакрапчэй гэту Дзеўку-Паланянку ды паедзем!

Падзякаваў Іванька маладзіцы той і марозу, што памаглі яму ўлавіць Дзеўку-Паланянку, ды ўссеў на каня і паехаў к пану ў двор. Прыехалі ў двор, аддаў Іванька пану Дзеўку-Паланянку, а сам пайшоў адпачываць. Адпачнуў ён колькі, тая Дзеўка-Паланянка вялела пану даставіць ей з мора яе скрынку. Прызваў хутчэй пан Іваньку і кажа:

— Дастань ты мне з мора скрынку Дзеўкі-Паланянкі! А калі не дастанеш, дык мой меч, а табе, Іванька, галава з плеч!

Іванька як заплача, як загалосіць! Пабег к свайму каню.

— А канёчак! А татачка ты мой! А што ж я буду рабіць цяпер?

— А што там?

— Мне пан сказаў: «Калі ты дастаў Дзеўку-Паланянку, дык дастань жа ж цяпер скрынку яе з мора, а калі не дастанеш, дык мой меч, а табе галава з плеч!»

— А што, Іванька! Ці я табе не казаў: не руш пяра, бо будзе бяда? Ну, ды гэта бяда не бяда, бяда яшчэ наперадзе. А трэба як-небудзь дастаць скрынку. Садзіся на мяне, паедзем!

Уссеў Іванька на каня і паехалі. Ехалі-ехалі, ехалі-ехалі — нікога нідзе не відаць. Прыехалі к мору, ажно выходзіць рыбіна, што ляжала на адным баку.

— Добры дзень, Іванька! Куды Бог нясе?

— А іду даставаць скрынку Дзеўкі-Паланянкі з мора, пан сказаў.

— Ну, Іванька, ты мне памог, а я цяпер табе памагу. Пасядзі-тка ты тут, а я пайду загадаю ўсёй рыбе шукаць скрынку.

Сеў Іванька на беразе, а рыбіна пайшла ў мора і загадала ўсёй рыбе шукаць. Шукала, шукала ўся рыба і не знайшла.

Рыбіна зноў загадала шукаць, другі раз. Рыба шукала, шукала — не знайшла. Трэці раз як загадала рыбіна, як пайшла ўся рыба! Іх! Аж кішыць, аж мора шуміць! Шукала, шукала, алеткі адна маленькая рыбіна нясе скрынку Дзеўкі-Паланянкі! Ухваціла рыбіна скрынку і падала Іваньку. Узяў ён скрынку, падзякаваў, уссеў на каня і паехаў к пану. Ну, прыехаў у двор, аддаў скрынку Дзеўцы-Паланянцы, а сам пайшоў у свой пакой адпачываць. Адпачыўшы, думае сабе: ну, ужо ж нікуды я не пайду. Ажно во табе: Дзеўка-Паланянка загадала пану даставіць вады гаючай і жывучай.

Пазваў пан Іваньку:

— Схадзі ты, Іванька, прынясі мне вады гаючай і жывучай! Калі прынясеш, дык ладна, а калі не прынясеш, дык мой меч, а табе, Іванька, галава з плеч!

Іванька як пачуў гэта, як заплача, як зальецца слязьмі! Пабег к каню.

— А канёчак мой, а татка мой! А што я буду рабіць?

— А што?

— Ды загадаў мне пан прынесці вады гаючай і жывучай, а калі не прынясу, дык панаў меч, а мая галава з плеч!

— А што, Іванька, ці я табе не казаў, што не руш пяра, бо будзе бяда. Ну, ды яшчэ гэта бяда не бяда, бяда будзе наперадзе. Садзіся на мяне, паедзем!

Сеў Іванька на каня і паехалі. Як ехаць дык ехаць — і прыехалі к мору. Тады конь кажа Іваньку:

— Злазь-ка ды рэж мяне!

— Як я цябе буду рэзаць? А хто ж мяне будзе тады вучыць?

— Я табе кажу: злазь ды рэж! Улезеш у мае косці, і як будуць тут садзіцца крукі кляваць мяне, дык ты, як можна, хапай, лаві кручанёнка!

Іванька зноў кажа:

— Як я цябе буду рэзаць?

А конь гаворыць:

— Не бойся, рэж!

Нечага рабіць. Злез Іванька з каня, разрэзаў пуза ды ў сярэдзіну, у косці ўлез, схаваўся — сядзіць, пільнуе крука. Ажно якраз ляцяць крукі. Кручаняты ляцяць ды крычаць:

— Тата, мяса! Тата, мяса!

А стары крук крычыць:

— Не, дзеткі, гэта здрада наша, здрада наша!

Але кручанёнак зляцеў ды сеў на касцях; толькі хацеў ён клюнуць, а Іванька і схапіў яго. Тут крук стаў прасіць, каб Іванька аддаў яму дзіцёнка яго, а Іванька кажа:

— Злётай ды прынясі мне гаючай і жывучай вады, дык я табе аддам, а то не аддам.

— Ну, дай жа мне, Іванька, дзве пляшачкі!

Даў яму Іванька дзве пляшачкі, крук адну пляшачку прывязаў к аднаму крыльцу, а другую к другому і паляцеў. Ляцеў, ляцеў, прылятае туды, дзе жывучая і гаючая вада. Бачыць — тую ваду пільнуюць бабы з качэргамі. Ніяк няможна вады дастаць! Ён тады ўзяў і паляцеў каля самых іх. Бабы тыя і заглядзеліся.

— Вунь, вунь,— кажуць,— якая дзіўная птушка з пляшачкамі пад крыльцамі!

Заглядзеліся і адышліся ад вады. Крук тады скоранька к вадзе, зачарпнуў у адну пляшку гаючай вады, у другую — жывучай, падняўся і паляцеў, панёс ваду к Іваньку. Прыносіць ён ваду, Іванька узяў ды кручанёнка і разадраў папалам. Тады ўзяў гаючай вады, узліў на кручанёнка, кручанёнак згаіўся; узліў жывучай вады — кручанёнак аджыў. Быў кручанёнак харошы, а то яшчэ палепшаў. Тады Іванька кажа:

— Злятай ды дапоўні мне пляшачкі!

Узяў крук пляшачкі, схаваў пад крыллем, набраў прыгожых стужак і паляцеў. Прыляцеў ён к вадзе, а там зноў бабы сядзяць з качэргамі і нікога не пускаюць. Што тут рабіць? Адляцеў ён трошкі ад вады ды так, як ляцеў, і кінуў істужкі. Бабы пабеглі збіраць істужкі, а крук скоранька к вадзе, зачарпнуў у абедзве пляшачкі і паляцеў. Узяў Іванька ваду, аджывіў каня, аддаў круку кручанёнка-дзіцёнка і паехалі ў двор.

Аддаў Іванька ваду гаючую і жывучую Дзеўцы-Паланянцы; яна і гаворыць яму:

— Можа ты мне маніш, трэба цябе пасеч!

Іванька кажа:

— Сячы сабе!

Узяла яна тапор і пасекла Іваньку на дробныя частачкі. Тады ўзяла гаючай вады, спрыснула яго — цела згаілася. Узяла жывучай вады ды спрыснула — Іванька ўстаў.

— Ах,— кажа,— як я смашна быў заснуў!

Быў Іванька прыгожы, а то яшчэ прыгажэйшы стаў! Пан тады кажа Дзеўцы-Паланянцы:

— Зрабі мне гэтак!

Дзеўка-Паланянка ўзяла сякерку дый пасекла пана на дробныя кавалачкі, улажыла ў гаршчочак, зварыла і сабакам выкінула. А Іванька з Дзеўкай-Паланянкай пажаніліся і сталі жыць у панскіх палацах.

Рогі

У некатарым царстве, у некатарым гасударстве, ці можа ў тым, што мы жывём, жыў сабе чалавек. І было ў яго тры сынкі, як саколікі. Ён іх парасціў, пагадаваў, пуць ім падаваў, а дзяліць ніводнага не дзяліў да смерці да свае. Колькі там часу прайшло, старык сваіх сыноў сабраў і гаворыць ім:

— Мае сынкі, я ўжо збіраюся ўміраць, і трэба мне вас раздзяліць. Вазьміце вы мяне на бераг к сіняму мору, ды перанясіце цераз мора на востраў пад зялёны дуб: я вас там раздзялю.

Яго сыны ўзялі і панеслі. Неслі напераменку, кажан панямногу. Можа яны пранеслі яго тры дні, можа больш, пакуль данеслі да месца. А пад зялёным дубам ды стаяла ў яго скрынка. Ён вынімае з тае скрынкі торбачку, дае большаму сыну і пытае:

— Ці даволен ты, мой сын, маёй наградай?

Ён адказвае:

— Дзелаць нечага, даволен!

А сам бачыць, што няма нічога ў ёй, у торбачцы — пустая. І недаволен, і баіцца бацьку сердзіць.

Вынімае бацька другому сыну, сярэдняму, ражок, што трубяць, і зноў кажа:

— Ну, ці даволен ты, мой сын, маёй наградай?

Ён адказвае:

— Дзелаць нечага, даволен!

Тады бацька вынімае меншаму сыну, халастому — а тыя два жанатыя — рушнічок і зноў пытае:

— Ці даволен ты, мой сын, маёй наградай?

І ён адказвае, як браты.

Тады ён і расказвае сынам.

Большаму сыну кажа:

— Вось, мой сын! Ты пры хазяйстве жывеш, у цябе ўсякія расходы хазяйскія. Ты гэту торбачку, калі нада, скалатні — будзе яна табе поўная. Выбярэш з яе, што нада, і павесіш. А калі яшчэ нада, зноў скалатні — зноў яна будзе поўная. І пакуль твая жысць — будзе з цябе!

А другому, сярэдняму:

— А ты, мой сын, па лясніцкай часці ходзіш, па лясах; случай табе ўсякі бывае. Стрэціць цябе непрыяцель, ці ўдвух, ці ўтрох — колькі случыцца,— дык ты ў адзін канец ражка затрубі, дык табе помач і будзе, колькі табе трэба. А ў другі кончык затрубіш, дык яны зноў убяруцца ў ражок!

— А ты, меншы мой сын,— халасты; табе яшчэ нічога не трэба; табе трэба толькі, каб з дзеўкамі пагуляць. Дык ты

вазьмі рушнічок раскаці ды скажы: «Рушнічок, раскаціся, добры маладзец, садзіся, нясі мяне туды і туды,— куды хочаш!»

Тады і пытае ў іх:

— А што, мае сынкі, ці давольны вы маёй наградай?

Яны яму гавораць:

— Давольны!

Яны з радасці ўзялі свайго бацьку ды панеслі дамоў. Туды неслі тры дні, а адтуль за паўтара справіліся. Прынеслі яго дамоў. Ён колькі ўрэмя пажыў ды і памёр. Сыны сталі жыць разам, брат з братам.

І праявілася за дзевяць зямель, у дзесятым царстве, у цара дачка, такая прыгожая і карцёжніца бальшая. Колькі к ёй кавалераў наязджала, дык яна ў карты абыграе, ды тады і выб'е. Пачуў пра гэта халасты і давай у большага брата прасіць торбачкі. Большы брат не хацеў яму даць:

— Перавядзеш і нічога з цябе не будзе!

Доўга цягаліся, а ўрэшце брат торбачку даў. Ён выйшаў на двор, выняў рушнічок ды кажа:

— Рушнічок, раскаціся, добры маладзец, садзіся, нясі мяне к той царэўне!

Прыляцеў туды, увайшоў у горад, купіў сабе харошую адзежу, купецкую, адзеўся ды ходзіць па горадзе, і пытае ў тых людзей:

— Як бы мне к вашай княжне падысці?

Яны яму кажуць:

— Не гэткія былі, яна іх абыгрывала, а цябе нечага абыгрываць!

— А ўжо ж паспрабуем, што з гэтага будзе!

Яны яго і прывялі да часавых. Часавыя прапусцілі. Ён увайшоў у горніцу, паздраставуся і сеў піраваць. Папілі-пагулялі і давай у карты граць. Гралі некалькі дзён, некалькі сутак: яна ўсё адбірае грошы, а ён усё з торбачкі калоціць. Яна ў яго пытае:

— Вот што, мой мілы друг, любезны! З кім я грала — абыгрывала, ну цябе не абыграць. Адкуль ты гэтыя грошы бярэш? Відна, я твая!

— А ўжо ж мая.

Ну, бросілі ў карты гуляць і селі хлеб-соль есці. Яна яго харашэнька напаіла і стала пытаць.

— Усё роўна, я твая! Скажы мне праўду, адкуль ты гэтыя грошы бярэш?

Чалавек выпіў — розум паслабеў — і сказаў, адкуль грошы ён бярэ:

— У мяне ёсць такая бацькава торбачка; не мая, а большага

брата. Дык я яе буду калаціць, а яна ўсё будзе поўная...

Яна тады яму яшчэ крапчэйшага напітку дала, каб ён упіўся болей.

Піў ён, піў, пакуль напіўся, ды і з ног зваліўся. Царэўна яго тады абабрала, торбачку ўзяла, гукнула сваіх часавых, ды як дала яму казацкіх нагаяў! Выбіла харашэнька, ды і за дзверы выпіхнула. Ён праспаўся, праглуздаўся, паглядзеў — няма торбачкі, толькі рушнічок! Ён рушнічок выняў, разаслаў.

— Рушнічок, раскаціся, добры маладзец, садзіся, нясі мяне дамоў!

Прыскочыў дамоў, стаў у сярэдняга брата прасіць ражка. Сярэдні брат стаў на яго сварыцца:

— Што? Перавёў большага брата награду, перавядзеш і маю!

— Што Бог дасць, тое і будзе: можа вярну і тую — і тваю, і сваю.

Сярэдняму брату дзелаць нечага: даў яму ражок. Малодшы брат выйшаў на двор, рушнічок выняў, разлажыў:

— Рушнічок, раскаціся, добры маладзец, садзіся, нясі мяне к той царэўне!

Ён зноў на месцы. Ля таго горада астанавіўся на полі і стаў у ражок граць. Датуль граў, пакуль увесь той горад войскам абняў. У таго цара няма столькі сілы, а ў яго рознае войска: і казакі, і жандары, і якое толькі на свеце ёсць. Распяў белы шацёр, паставіў часавых, абняў увесь горад пушкамі, розным прыпасам і смаліць у горад!

І кажа меншы брат:

— Разару ўсё царства, горад, затым што тут жывуць не цар з царэўнай, а злодзеі. Як ім можна было мяне абкрасці!

Цар той выйшаў на двор, глянуў у празорную трубу, і спужаўся, што няма яму сілы, няма ў яго столькі войска, нечым яму бараніцца. Ён стаў на сваю дачку, на царэўну, сварыцца:

— Ідзі, мая дачка, перапрасі, бо цераз цябе нам усім галовы пакласці. Не трэба было табе чапаць тую торбачку.

Царэўна зараз жа надзелася ў харошае плацце, узяла з сабою прыслугу і пайшла да яго з просьбай. Падыходзіць да яго шатра — часавыя яе не пускаюць:

— Куды ідзеш, карáўка нямытая? Ты яго раз абабрала.

Яна горка плача і просіць, як можна просіць, каб яны яе прапусцілі.

А ён не спіць, усё чуе ды толькі яе муштруе. Падаждаўшы, яна падыходзіць другі раз:

— Здзелайце міласць, прапусціце мяне к свайму гаспадару!

Яны яе ў грудзі, не пускаюць, кажуць, што гасудар яшчэ спіць, не ўстаў.

А ён не спіць, ды ўсё яе так муштруе.

За трэцім разам прыйшла, ён вялеў прапусціць часавым. Яна падышла к яму, укленчыла, стала плакаць, стала прасіць:

— Друг мой любезны, прасці мяне! Пасля гэтага не буду ўжо так рабіць. Усё роўна ты мой, я твая!

Ён сеў, давай яе гасціць з сваімі часавымі, і яе прыслугу прыняў. Папіравалі-пагулялі, і стала яна прасіць яго ў свой дом з яго дружынаю. Ён узяў сваю дружыну і яе прыслугу і пайшлі ў яе дом, і сталі там піць і гуляць. Пілі-гулялі некалькі ўрэмя. Тады, царэўна зноў яму харошых напіткаў паднесла, каб ён ап'янеў, і зноў давай у яго спрашваць.

— Адкуль ты набраў столькі войска, што ў майго бацюшкі столькі няма, і як гэта ты ка мне прыстаўляешся з далёкай стараны?

Ён, выпіўшы добра, ды і прызнаўся ёй:

— У мяне ёсць такі ражок, што як у яго затрублю, дык яшчэ ў пяць разоў набярэцца столькі. У адзін канец затрублю,— яно набярэцца, а ў другі канец затрублю,— яно зноў убярэцца ўсё. І ёсць у мяне такі рушнічок: куды ўгодна ён мяне занясе і зноў дамоў прынясе.

Яна яго яшчэ больш падпаіла крапчэйшымі напіткамі. Ён датуль піў, пакуль і заснуў. Яна яго харашэнька абабрала: узяла ражок, узяла рушнічок, выйшла на ганкі і давай трубіць у ражок у другі канец. Патуль трубіла, пакуль ўсё войска ўтрубіла і часавыя яго паўцякалі. Толькі засталіся яе часавыя, яе слугі, а яго няма нікога. Яна сваіх часавых гукнула, яго ўзбудзіла, вывела на двор, ды дала яму такіх нагаяў казацкіх, колькі яму ўлезла. Выцягнулі яго за горад ды і ўкінулі ў балку. Ён колькі ўрэмя праляжаў, пакуль прачухаўся пасля чэсці, тады папоўз кой-як ровам тым і пайшоў, не чаяў ужо жывым быць. Нельга яму і дамоў ісці, патаму абкрадзен увесь. Дык ён сабе думае: «Пайду, ці не найду дзе якую пропасць — упрапасціцца, бо мне дамоў нельга вярнуцца: і братоў баюся, і не з чым».

Ішоў ён колькі ўрэмя — ці дзень, ці два, ці можа і тры берагам, паўз балота, чуе — яблыкамі пахне. Ён сабе думае: «Пайду, ці не найду дзе яблычка смáгу прагнаць — бо ўжо рот заросшы смагай — недзе ані напіцца, ані ўкусіць чаго».

Найшоў яблыню рагатую, кашлатую; сарваў яблычка і ўкусіў таго яблычка. Як параслі на ім рогі! Такія, як на яблыньцы! Было яму ліха, ды і пагорала! То ішоў, дык нічога хоць не чапаў, а то ідзе, дык бярэзнік скобліць рагамі!

Прайшоў колькі ўрэмя — ці дзень, ці два, ці можа тры,

паскабліў рагамі бярэзнік, ужо чуе зноў яблычны дух. Ён сабе думае так: «Пайду, ці не з'ем ужо такога яблыка, каб ужо прапасці!»

Стыдна ўжо выйсці і на свет божы з гэтакай карай. Адна кара, што рогі, другая кара, што пабіты крэпка бізунамі.

Найшоў яблыню, харошанькую яблыню, сарваў яблычка, укусіў — і адпалі ўсе яго рогі. І стаў ён яшчэ лепшы за таго як быў: і здаровы, і боль уся ўнялася. Ён яшчэ нарваў яблык, дастаў хустачку — была ў яго ў карманіку,— завярнуў іх ды і пайшоў тым следам, каторым скабліў бярэзнік рагамі. Прыйшоў да той яблыні да рагатай, нарваў і тых яблык ды ў другое месца паклаў. Ды і пайшоў у горад у той самы зноў. Ажно нанімае цар работнікаў засаджваць сад у сябе. Колькі ўрэмя ён яго засаджвае, а сад усё сохне. Нанімае цар садоўнікаў. Ён і аб'явіўся:

— Я магу сад садзіць!

Данеслі гэта цару, што такі і такі хлопец паднімаецца быць за садоўніка. Выклікае цар яго і пытае:

— Можаш ты сад садзіць?

— Чаму не, магу.

Цар яго прыстаўляе к народам, а той гаворыць:

— Я не хачу з людзьмі садзіць, адвядзіце мне ў другім месцы, з другога крыла!

Паказалі яму другое месца, ён і стаў займацца работай.

Гэта казка скора кажацца, ды няскора дзела ішло.

Народ садзіць сад — ён сохне, а ён садзіць — расце, і цвіце, і яблыкі растуць.

Па заканчэнні дзела пайшлі глядзець работу. Пайшлі, дзе садзілі народы — няма нічога, як было, так і ёсць — пасохла ўсё. Яны пасмяяліся і кажуць:

— Пойдзем глядзець новага садоўніка работу,— у яго работа добрая: і расце, і цвіце, і яблыкі растуць, і польза вялікая.

Данеслі яны самому цару, што не трэба больш нікога браць і плаціць, акрамя новага садоўніка: няхай жыве і садзіць сад. Цар выстраіў яму святлічку і прыставіў к яму дзявіцу, каб яму служыла, пішч гатавала, падносіла кушанне, прыбірала, абмывала. Ён і заняўся работай. І пачала царэўніна служанка хадзіць да яго на гулянкі, і ён пачаў яе прывучаць да сябе і кажа:

— Ты красівая дзявіца, а то б яшчэ пакрасівела, калі б з'ела майго яблыка, што я табе дам. Мудрэй бы была за сваю царэўну!

Ну, гэта просіць:

— Пажалуста, дай мне яблычка!

Ён ёй яблычка харошае выняў і даў. Яна яго з'ела — то была красівая, а то яшчэ пакрасівела, што яе і царэўна не ўвазнала. І пытае ў яе:

— Дзе ты такой масці набрала, нарумянілася?

— Гэта мне даў садоўнік новы яблыка, дык я як з'ела, дык і падужэла, і папрыгажэла, і павесялела.

Царэўна кажа:

— Хадзем жа мы патаргуем і мне яблыка!

Ну, і пайшлі таргаваць яблыка. Прыходзяць к садоўніку і таргуюць. Ён дае не тое яблыка, а другое — рагатае — і просіць за яго, што сам хоча. Садоўнік яблычка ёй паклаў, грошы ад яе ўзяў і гаворыць:

— Ты ж не еж яго цяпер, а з'ясі заўтра ўранні.

А для таго ён ўрэмя прадаўжае, каб уцячы адтуль. Узяла яна яблычка, пайшлі яны з святліцы. Ён святліцу зачыніў, усё сваё сабраў, ды сам — марш!

Гэта казка скора кажацца, ды няскора дзела ішло.

Пакуль царэўна пераначавала, ды садоўнік скрыўся ў горадзе, і няма нікога ў святліцы. Назаўтра ўранні памылася царэўна і з'ела таго яблыка. Як параслі на царэўне рогі, дык не месцяцца і ў комнаце. Што хоча каторы зламаць — баліць; хоча сарваць — баліць; і не ўходзіць у дзверы, не можна выйсці вон. Цар кажа:

— Вось мая дачка! Гэта, верна, ён самы! Будзеш ты цяпер гараваць, было табе не дзелаць такіх праступкаў!

Здзелалі вобыск па ўсіх гарадах, ці не знойдуць якога знахара, якога чалавека, каб ён збавіць мог. Той жа самы хлопец купіў ксяндзоўскае плацце, надзеўся так, як ксёндз, наўчыўся маленька грамаце і аб'явіўся:

— Я магу вычытаць ёй усё, толькі каб яна сазналася ў сваіх грахах.

Прыставілі яго к ёй. І стаў пытацца грахоў.

— Дзіцятка, можа ты каго абідзела? Можа хто на цябе плачацца?

Ну, яна і прызналася:

— Торбачку ўзяла ў такога і такога кавалера.

Ён кажа:

— Аддай, дзіцятка, гэта мне, гэта трэба на касцёл аддаць!

Яна аддала яму торбачку. Ён тады стаў чытаць малітву — што чытае, а што маніць, патаму грамаце знаў мала, а гэта толькі так, каб як-небудзь ды сваё ўзяць яму.

— Не, дзіцятка: яшчэ не ўсе грахі! Яшчэ нешта заняла ў людзей, і тое аддай на касцёл!

Яна і ражок аддала яму і рушнічок аддала. Ён тады вялеў тапіць лазню і вялеў прыставіць шэсцьдзесят музыкаў. Выта-

пілі лазню, прыставілі музыкаў, узялі царэўну пад рукі і павялі ў лазню. Ён узяў з яе рукі персцень і ўбіў пад брусам. Раздзеў яе і крыкнуў на музыкаў:

— Грайце!

Музыкі зайгралі, ён як яе ўзяў нагаем, дык зняў ёй радзімую шкуру з пят і да галавы. Тады вакно расчыніў:

— Рушнічок, раскаціся, добры маладзец, садзіся, нясі мяне к братам!

А яе так і кінуў. Тыя музыкі гралі-гралі, ды і стаміліся. І няма ніякага адзыву з лазні. Яны пайшлі, дзверы разламалі, ажно царэўна вісіць пад брусам. Яны адвязалі, адтуль яе вывелі — кроў з яе цячэ... Ну, прыслугі яе абмылі, абчапурылі тыя раны. Бацька і выслаў яе ў свет.

— Ідзі,— кажа,— бо гэта ён сам. Шукай яго, можа дзе знойдзеш!

А ён явіўся к братам. Браты гавораць:

— Годзе табе бадзяцца па свету! Жаніся ўжо тут, ды будзем жыць,— добра, што сваё паўзыскваў!

— Не, братцы, не буду жаніцца, падажду!

Пражыў можа год-паўтара, а можа паўгода — невядома колькі — выехалі яны ўсе ўтраіх з сахамі на поле работаць. Работаюць яны — ажно яна ідзе шляхам. Малодшы і кажа:

— Вы казалі, каб я жаніўся,— во мая жонка ідзе!

Яны засмяяліся,— ведама, бачаць, гэтакае цуда. Падыходзіць яна да яго, абняла яго ногі, стала цалаваць, стала прасіць:

— Прасці мяне! Што было, тое прайшло, а цяперака я твая, што хочаш, то са мной і дзелай, бо мне ўжо дамоў не варочацца адсюль!

Яны сабраліся, паехалі дамоў, узялі яе з сабою. Едуць дзярэўняй, хто убачыць — смяюцца. Прыехалі. Прыняў яе за госця і даў ёй яблычка харошае. Яна як з'ела,— дык то была прыгожая, а то яшчэ ў пяць разоў папрыгажэла! Рогі з яе спалі, і боль унялася. Ну і пачалі вяселле гуляць. Згулялі вяселле і паслалі к бацьку паклон, што благапалучна ўсё. Бацька даў многа прыданага. І цяпер жывуць.

І я там сляпуючы быў, мёд-віно піў, па губах цякло, а ў рот не папала.

Івашка-мядзведжае вушка

Жыў сабе чалавек, і была ў яго хазяйка. І пайшла яна ў лес у грыбы, і заблудзілася. Налучыўся на яе той жа час мядзведзь. Ён яе ўзяў ды і занёс к сабе. Пажыла яна гады тры і радзіла сына. Дала яна яму імя-празванне Івашка-мядз-

веджае вушка. Пабыў ён гады тры і рос не па гадах, ды па часах, не па часах, ды па мінутах. Вырас ён і гаворыць:

— Маці, я не буду з табой жыць і з мядзведзем, я пайду ад цябе.

Пайшоў сабе, ідзе дарогай і сустракае чалавека. Той гаворыць:

— Здрастуй, Івашка-мядзведжае вушка!

— Добрае здароўе, Дуб-Дубавік!

— А куды ты ідзеш? — пытае Дуб-Дубавік у Івашкі-мядзведжага вушка.

— Пайду ў свет.

— Ах, брат, пайду і я з табой.

— Ну, пойдзем!

Колькі яны там ішлі, бачаць — стаіць чалавек. Яны гавораць:

— Здрастуй, Гара-Гаравік!

— Добрае здароўе, Івашка-мядзведжае вушка і Дуб-Дубавік! Куды вы ідзеця?

— Ідзём у свет!

— Пайду і я з вамі!

— Ну, хадзі,— гаворыць Івашка-мядзведжае вушка.

Ну, яны пайшлі ўтрох. Ішлі, ішлі і нашлі яны сабе дом.

— Вот, браццы, тут цяпер і будзем жыць. Ты, Гара-Гаравік, аставайся абед варыць, а мы пойдзем на ахоту.

Той січас узяў вала зарэзаў, аблупіў, у кацёл уклаў, цяпло расклаў і давай варыць. Толькі гэта гавядзіна закіпела, нехта ідзе, стукае ў дзверы і кажа:

— Адчыні, хто ў маім доме ёсць!

Гэта Бяссмертны Кашчэй, ён сам з кокаць, барада з локаць. Ён яму адчыніў.

— Уссадзі мяне на лаўку!

Ён узяў і ўссадзіў яго.

— Ну, дай мне есці!

Ён яму і даў вала. Кашчэй гэтага вала з'еў, тады ўзяў паласу ў яго выкраіў з плячэй і ўляцеў. Ну, таму некалі дажыдацца, а трэба другога рэзаць вала. Абед трэба гатаваць. Толькі што ён закіпеў, прыходзяць яго таварышы.

— Ну,— кажуць,— брат, давай абедаць!

Ён выняў зусім яшчэ сырое мяса. Яны сталі есці:

— Як ты варыў? Зусім яно ў цябе сырое!

— Ах, братцы, пакуль дровы нарубіў, спазніўся.

Ну, аднака, ён таго не сказаў ім, што яму такая штука здзелана. Івашка-мядзведжае вушка гаворыць:

— Эх, брат, не стоіць табе! А ну-тка ты, Дуб-Дубавік, аставайся тут, ці не лепш ты згатовіш!

Дуб-Дубавік начаў пачышчы варочацца. Вала зарэзаў, аблупіў, у кацёл уклаў, цяпло расклаў і стаў варыць яго і думае: «Як бы паскарэй». Тут жа і ляціць той самы змей, сам з кокаць, барада з локаць — Кашчэй Бяссмертны, і стукае ў дзверы:

— Хто ў маім доме ёсць, адчыні!

Ён яму адчыніў.

— Перасадзі мяне цераз парог!

Ён перасадзіў.

— Ну, уссадзі мяне на лаўку!

Ён уссадзіў.

— Дай мне есці!

Ён яму даў есці. Кашчэй вала з'еў, паласу выкраіў з яго і паляцеў. Той думае: «От гора!» Пачаў шчэ хутчэй варочацца, зарэзаў другога вала, стаў гатаваць. Ды січас яны і прыходзяць:

— Давай, брат, абедаць!

Ён вынімае зусім сырое мяса. Івашка-мядзведжае вушка і гаворыць:

— Ах, брат ты мой! Я ж думаў, што ты лепш згатуеш, ажно ты яшчэ горш! Аднака ідзіце вы сабе, браццы, на ахоту, а я застануся гатаваць; ці не лепш я вас згатую!

Івашка-мядзведжае вушка вала зарэзаў, уклаў у кацёл і гатовіць. Развёў цяпло. Ды толькі ён згатаваў — ляціць Кашчэй і гаворыць:

— Хто ў маім доме ёсць, адчыні мне!

— Рукі не паадсыхалі, калі трэба, дык адчыніш!

Ён адчыніў.

— А ну, перасадзі мяне цераз парог!

— Ногі не паадсыхалі, пералезеш і сам!

— Уссадзі мяне на лаўку!

— Ногі не паадсыхалі, сам узлезеш!

— Дай мне,— кажа,— паесці!

— Калі нагатаваў, дык паеш! Я нагатаваў не для цябе.

Кашчэй схваціўся ды на яго. Тады Івашка-мядзведжае вушка ўхапіў яго за бараду ды пацёг прама ў лес. Узяў раскалоў дуб, засадзіў яго бараду ў дуб ды і забіў клінам.

— Вот ты,— кажа,— тут пасядзі, пакуль таварышы прыдуць!

Прыходзяць таварышы.

— Ну, давайце-ка, браццы, абедаць! Я зварыў не так, як вы. А хочаце, браццы, паабедаўшы паглядзець, што я ўсадзіў у дуба,— бараду ўшчаміў.

Прыйшлі яны ў тое месца, пасматрэлі, ажно яго нету. Вырваўся і паляцеў Кашчэй — барада ў дубе засталася.

— Пойдзем-ка, браццы, паглядзім, куды ён пайшоў, ведзь кроў ёсць!

От яны ўзялі і пайшлі. Увайшлі ў лес у агромны. Тады Івашка-мядзведжае вушка кажа:

— Ну, Дуб-Дубавік, давай дарогу!

Пачаў Дуб-Дубавік ірваць дубы, дарогу прабіраць.

Прабралі дарогу, прыйшлі к вялікай гарэ.

— А ну, Гара-Гаравік, раскапай гару!

Гара-Гаравік раскапаў. Перайшлі яны гару, бачаць — ляжыць вялікі камень. І пад той камень нара. Івашка-мядзведжае вушка кажа:

— Вот, браццы, во ён куды палез! Ну, давай валоў рэзаць і пас сшываць. І ўпусціце мяне туды. Я пайду яго шукаць. Ну, а тады, браццы, як год выйдзе, вы далжны прыбыць сюда, і я пас гэты скалатну, і вы мяне выцягніце.

Тады яны ўзялі валоў штук пятнаццаць зарэзалі, зрабілі пас, пачапілі камень і ўпусцілі туды. І яшчэ не хапае.

— Давай, браццы, яшчэ зарэжам штукі тры ды пас надвяжам!

Нашылі і ўпусцілі яго туды. Дасталі глыбіню.

— Ну, вот, цяпер, браццы, спушчайце мяне туды! Толькі глядзіце ж, цяпер я вас прашу, штоб вы былі ў той час, як мяне апушчаеце, цераз год!

Упусцілі яго туды, ён і пайшоў. Бачыць — стаіць дом медны. Прыходзіць ён у той дом, сядзіць там дзявіца.

— Ах,— гаворыць,— здрастуй, Івашка-мядзведжае вушка! Слыхам было слыхаць, а цяпер і ў глазы відаць, зачым ты ходзіш сюды. Мы колькі тут жывём, а рускага чалавека не бачылі. Ну, аднака, ты сваю галаву занёс сюды,— мы жывём у Бяссмертнага Кашчэя.

— Ну, я таго і шукаю!

— Давай мы з табой жаніцца!

Ён гаворыць:

— Я пайду Бяссмертнага Кашчэя шукаць!

— Эх, ты як пойдзеш, там яшчэ крашай мяне ёсць, ты на мяне забудзеш.

— Не,— кажа,— я й цябе вазьму адсюль.

Ну, ён пераначаваў, назаўтра ўстаў, памыўся, Богу памаліўся і пайшоў. Ідзе, аж стаіць другі дом. Сярэбраны.

— Здрастуй,— гаворыць,— дзеўка!

— Здрастуй, здрастуй, Івашка-мядзвежае вушка! Слыхам было слыхаць, а цяпер і ў глазы відаць, зачым ты ходзіш сюды. Мы колькі тут жывём, а рускага чалавека не бачылі. Ну, аднака, ты сваю галаву занёс сюды,— мы жывём у Бяссмертнага Кашчэя!

— Ну, я таго і шукаю, я за ім і іду, за [паганым] Бяссмертным Кашчэем.

— Ах, Івашка-мядзведжае вушка, давай,— кажа,— з табой жаніцца!

— Не, пайду Бяссмертнага Кашчэя шукаць!

— Ах, ты як пойдзеш, там яшчэ крашай мяне ёсць, ты і на мяне забудзеш.

— Не, я не забуду, я і цябе вазьму.

Ды і пайшоў, пераначаваўшы. Стаіць трэці дом — ды залаты. Ён заходзіць у той дом — сядзіць красівая дзеўка, вышывае.

— А, здрастуй,— гаворыць,— Івашка-мядзведжае вушка! Ці па волі, ці па няволі зайшоў сюды, буйну галаву занёс? Здзесь Бяссмертны Кашчэй, дык ён цябе з'есць!

— Ну, я яго шукаю!

— Ды ці шукаеш, ці не шукаеш, а ён тут не такі, як на тым свеце — на гэтым свеце ён сільней! Ну, на ж ты, паеш, і зраблю я цябе булаўкай і ўторну ў падушку.

— Ну, пажалуста, і распрасі, дзе яго смерць.

У скорым урэмю прылятае Бяссмертны Кашчэй і кажа:

— Фе, русь-кось пахне!

Ну, яна яму адказвае:

— Ах, душанька, ты па Русі лятаў, Русі набраўся, так табе бытта аддае тут.

— Я тут колькі жыву, а рускага чалавека не бачыў!

Унясла яна яму гарачых карцеч, ён наглытаўся. Лёг сабе і ляжыць. Яна кажа:

— Душанька, колькі мы з табой жывём! Ну, крый Бог, нас хто абідзе — крый Бог, твае смерці.

Ён зарагатаў:

— Ха-ха-ха! Маёй смерці нету. Мая смерць: у моры скрыня, а ў скрыні заяц, а ў зайцы вутка, а ў вутцы яйцо. Вот то мая смерць!

Устаў і паляцеў гэты Бяссмертны Кашчэй. Яна тады яго і выпусціла, Івашку-мядзведжае вушка, і кажа:

— Знаеш, друг мой, дзе яго смерць? Яго смерць: у моры скрыня, а ў скрыні заяц, а ў зайцы вутка, а ў вутцы яйцо: штоб яйцо ты тое дастаў ды ўдарыў яму ў лоб, от яму і смерць — дык дзе ты дастанеш?

Ён узяў сабе ружайцо і пайшоў.

Сколька ён урэмя ішоў, што баліць ажно яго шкура; есці хоча. Бяжыць воўк. «Ах,— думае,— вазьму ўб'ю, хаця ваўка наемся». Толькі ён злажыўся біць, а воўк і кажа:

— Ах, Івашка-мядзведжае вушка, не бі мяне, я табе пры злой гадзіне знадаблюся!

Так Івашка-мядзведжае вушка і пайшоў, не стаў біць ваўка. Ішоў, ішоў, аж шкура яго баліць. Думае: «Ну, хто стрэнецца, уб'ю ды з'ем». Бача — ляціць коршык. Ён склаўся. А коршык яму кажа:

— Ах, Івашка-мядзведжае вушка, не бі мяне, я табе знадаблюся пры злой гадзіне!

Так ён і пайшоў і яго не стаў біць. Колькі ён там ішоў, прыходзіць к мору, аж ляжыць рак такі агромны. Івашка думае: «Адсяку яго палавіну ды з'ем. Вот жа папраўлюся!»

Рак кажа:

— Ах, Івашка-мядзведжае вушка! Ты бачыш, што я гарую — палавіна на беразе, палавіна ў вадзе. Вот ты вазьмі кол ды спіхні мяне ў ваду. Я табе ў злой гадзіне знадаблюся.

Івашка-мядзведжае вушка ўзяў кол і скаціў яго ў ваду. Рак гаворыць:

— Ну, благадару табе, Івашка-мядзведжае вушка, што табе трэба, сказывай!

— А вот што мне трэба. Я прыйшоў сюды за смерцю Кашчэя Бяссмертнага. Ёсць у моры скрыня, а ў скрыні заяц, а ў зайцы вутка, а ў вутцы яйцо!

— Я табе яе дастаўлю.

Так ён папоўз і цягне скрыню перад сабою. Івашка ўзяў гэту скрыню, разбіў крышку, толькі адчыніў — заяц выскачыў і пабег.

— Ах, Бог мой, дзе воўк дзеўся, што казаў «я табе пры злой гадзіне знадаблюся»,— каб ён мне ўлавіў гэтага зайца.

Так той жа час воўк і схваціў яго. Івашка ўзяў яго разадраў. Вутка з яго пыр! — і паляцела. Ён, стоючы, і гаворыць:

— Дзе гэта дзеўся той коршык, каб ён мне яе ўлавіў.

Толькі ён сказаў, адкуль узяўся коршык, улавіў тую вутку. Івашка ўзяў разадраў вутку, дастаў яйцо. Ну, яно гразнае: «Ах, панясу ў мора, памыю». Стаў мыць, яйцо гэта пакацілася прама ў мора. Ён, стоючы, і кажа:

— Ах, Божа мой, Божа, што як бы той рак ды мне гэта яйцо падаў!

Так і нясе той рак яйцо яму. Ён узяў і пайшоў. Прыходзіць прама к самаму Бяссмертнаму Кашчэю. Так як ішоў, так прама ў дом. Бяссмертны Кашчэй, як толькі ён увайшоў,— глядзь на яго і кажа:

— Тут Івашка-мядзведжае вушка?

— А ўжо ж тут!

Так Кашчэй усхваціўся, прама к яму і кінуўся. Івашка яго ўдарыў тым яйцом прама ў лоб. Так Бяссмертны Кашчэй кажа:

— Ах, вот мая смерць!

Забіў Івашка Бяссмертнага Кашчэя. Тады кажа:

— Ну, красная дзеўка, я цябе вазьму, а дома гэтага жалка, як мы дом забярэм.

— Я,— кажа,— зараз забяру!

Узяла яйцо, абкатнула кругом, так гэты дом увабраўся ўвесь чыста ў яйцо. Тады Івашка-мядзведжае вушка узяў яго ў кішэню ўклаў, і пайшлі.

Прыходзяць к другому дому. Той залаты ўзялі, і шчэ прыходзяць к сярэбранаму.

— Што ж,— кажа,— красная дзеўка, я цябе забяру, а як жа дом забраць?

— Я дом гэты січас забяру!

Узяла яйцо, абкатнула кругом, так гэты дом увабраўся ўвесь чыста ў яйцо. Тады Івашка-мядзведжае вушка ўклаў яго ў кішэню, і пайшлі. Прыходзяць яны к трэцяму дому, к меднаму. Івашка-мядзведжае вушка і кажа:

— Ну вот, я цябе забяру, а як жа ты дом забярэш, дома шкада!

— Эх,— кажа,— я дом січас забяру!

Яна ўзяла яйцо, абкатнула кругом, так гэты дом увабраўся ўвесь чыста ў яйцо. Тады Івашка-мядзведжае вушка ўклаў і яго ў кішэню, і пайшлі. Прыходзяць на тое месца — акурат год прайшоў. Узяў ён і пасадзіў гэту, з меднага дому, і таргануў той пас. Яны і пацягнулі. Выцягнулі і пачалі адзін з адным біцца. Той гаворыць:

— Мне.

А той:

— Гэта мне.

А дзеўка гэта кажа:

— Стой, не біцеся, там яшчэ крашай мяне ёсць!

Тады яны ўзялі, спусцілі зноў пас. Івашка пасадзіў з сярэбранага дому дзевушку. Яны пацягнулі. Выцягнулі і сталі зноў біцца. Адзін гаворыць:

— Мне.

А другі:

— Гэта мне.

А дзеўка гэта кажа:

— Стой, не біцеся, там яшчэ дзевушка крашай мяне ёсць!

Яны ўпусцілі пас: ён пасадзіў і трэцюю, што з залатога дому. Тады выцягнулі.

— Ну,— кажуць,— гэта нам па адной, а трэцяя будзе нам за чалядку, служыць будзе нам. А яго, брат, упусцім пас, уцягнем упол і перарэжам — няхай ён уб'ецца.

Упусцілі пас. Ён тады зноў узяў пудоў ля сто зачапіў камень і таргануў пас, і сам адышоў дужа далёка. Яны і пацягнулі яго. Толькі ўпол света ўцягнулі, пас перарубілі,

і гудзе той камень назад. Івашка кажа:

— Ах, Божа мой, вот бы гэта было мне!

Зажурыўся і пайшоў адзін: «Як бы мне на той свет дастацца?»

І надышла дужа хмара вялікая. Ён і думае: «Пайду я пад дуб схаваюся, што б я не змок». Прыходзіць пад дуб, стаў і чуе: крычаць пціцы дужа крэпка. Ён тады:

— Ох, Божа мой, як пойдзе хмара, засячэ іх дождж! Узлезу я ды іх прыкрыю.

Ён узлез на дуб і распяўся над гняздом, і прыкрыў гэтых дзяцей, пакудава хмара не прайшла.

Калі распагодзілася, ён узяў злез і схараніўся [пад тым дубам]. Не па доўгім часе ляціць пціца-Полугрыца і пытае:

— Ах, дзеткі мае, хто вас прыкрыў ад гэтай хмары? Я ўжо думала, што вы жывы не будзеце.

Яны кажуць:

— Якісь чалавек!

Яна і крычыць:

— Ах, чалавек, што ты за гэта хочаш?

Ён адказвае пціцы-Полугрыцы:

— Я нічога з цябе не хачу, толькі штоб ты мяне даставіла на той свет!

Яна яму і кажа:

— Ідзі набі дзве бочкі мяса, дык я цябе дастаўлю!

— Толькі чым жа мне, якім мясам?

— А вот бы лягушак, мышэй, гадаў, якую звярыну падзеш, такую бі — і складай у бочкі. Тады мне і скажаш, я цябе панясу.

Пайшоў Івашка-мядзведжае вушка і пачаў біць розныя рознасці: і вужоў, і лягушак, і мышэй — што толькі на свеце ёсць — і складаў у бочку. Набіў і прыходзіць.

— Ну, я ўжо набіў.

Апускаецца пціца-Полугрыца.

— Ну,— кажа,— надзявай мне на адно крыло бочку і на другое, а сам садзіся пасярод. І глядзі: управа гляну — з правай бочкі падай, улева гляну — з левай бочкі падай, і як гляну, так і кідай!

Ну, і панесла яна. Стала пціца-Полугрыца што далей, то вышэй угару падымацца. Як яна на бакі пазірае, так ён гавядзіну кідае. Так ён кідаў, і не даляцелі яны больш як сажань на пяць — ужо гавядзіны не стала. Пціца-Полугрыца ў адзін бок зірнула — няма, у другі бок зірнула — няма, пачала маленька ўніз апускацца. Івашка-мядзведжае вушка ўрабеў. Узяў адрэзаў свае ікры. Як яна зірнула, ён і ўкінуў — так яна зразу сажані на два ўгару ўсхвацілася. Зірну-

ла яна ў другі бок, ён адрэзаў другія ікры і ўкінуў іх у рот. Ну, яна яго ўжо вынесла і пытаецца:

— Скажы, колькі ты мне гавядзіны даваў — ну смашней гэтыя не было. Што гэта за гавядзіна?

А ён кажа:

— Я адрэзаў свае ікры.

— А ну, пакажы!

Ён узяў выставіў. Яна хакнула, яно зразу прырасло. Ён другую выставіў — яна зноў хакнула, і другая болька загаілася.

— Ну, цяпер ідзі паскарэй, ужо твае таварышы скора будуць жаніцца. Яны б даўно жаніліся, толькі без цябе нічога не будзе!

Ён пайшоў — прыходзіць у горад. Сказаўся масцеравым і сапожнікам, шаўцом, значыцца. Ну, аднака ж, ён шыць не ўмее — толькі ён стаў у шаўца кваціраваць. А тая дзевушка самая паследняя, што была ў залатым доме, кажа:

— Калі ты мне пашыеш такія чаравічкі, як у мяне былі ў тым залатым доме, дык я тады ўжо, так таму і быць, з табой буду жаніцца.

Так гэты Дуб-Дубавік выйшаў на вуліцу і пытае:

— Хто такія чаравічкі пашые, во столькі грошай дам!

Шавец і кажа Івашку:

— Ах, Іванічка,— а ён называўся ўжо Іванічка-п'янічка — ах, Іванічка-п'янічка, за адзін заказ штоб чаравічкі такія і такія былі, як у гэтыя барыні,— дужа багата грошай дасць!

А ён яму гаворыць:

— Ідзі бяры задатак і гавары, што я спраўлю.

Ён пайшоў, узяў задатак, даў гэтаму Іванічку. І сказана так: штоб к такому-та часу былі чаравічкі гатовы. А Іванічка напіўся, аб гэтым не думае. Гэты шавец і кажа:

— Ах, Іванічка, што гэта будзе?

— А што?

— А як жа! Згадзіўся: калі ўмееш шыць, дык і шый! Мне за гэта,— кажа,— галаву знімуць!

Ванька пайшоў дом раскаціў, чаравічкі ўзяў і аддаў:

— На, нясі, і будуць у цябе пытацца, хто табе іх шыў, ты скажы, што ў мяне ёсць Іванічка-п'янічка!

Ён і панёс. Узялі гэтыя чаравічкі, і дабраў ён сваю астатнюю плату. Яна гаворыць:

— Во гэта акурат, як мае! Во цяпер я табе яшчэ скажу: «Калі ты справіш мне такое плацце, як у мяне, так таму і быць, будзем жаніцца з табою».

Ён, Дуб-Дубавік, выйшаў на базар і гаворыць:

— Эй, вы, партныя, гаспада, ці не можа хто з вас зрабіць такое і такое плацце!

Іванічка-п'янічка і гаворыць:

— Паднімайся, бяры задатку пабольш.

Ён узяў задатак і прыходзіць.

— На табе грошы, ну толькі ці зробім, Іванічка?

— Зробім, не бойся!

Ужо гэтаму шаўцу трэба несці, а тут плацце не гатова.

— Ах, Іванічка, што будзем рабіць?

— Я не знаю! Што ўмеў, то і зрабіў, ты паднімаўся!

Пайшоў Іванічка, раскаціў дом і ўзяў плацце.

— На, нясі, дабірай астатнія грошы!

Прынёс і аддаў.

— Вот гэта,— кажа царэўна,— маё! От цяпер харашо! Толькі каб у мяне такі вянок быў! Калі скуеш, то ўжо пэўна, што мы з табой будзем вянчацца!

А Іванічка перайшоў у кузніцу. Выйшаў Дуб-Дубавік на базар і кліча:

— Гаспада кавалі, ці не можаце зрабіць вянок такой-та, як у маёй нявесты быў!

А пачым хто знае, які ён быў. А Іванічка кажа кавалю:

— Кузнец! Ступай, паднімайся!

— Ох, Іванічка, як жа скуём? Мы зробім, які хочаш, толькі як жа не бачыўшы? Ліцо пад ліцо не падвядзеш!

Ён гаворыць:

— Не бойся, бяры грошай паболі!

— Ну, харашо.

Ён пайшоў і падняўся.

— Я,— кажа,— зработаю.

— Зработаеш?

— Зработаю!

— Вот табе грошай столькі-та! Ды глядзі, штоб зрабіў.

Прыходзіць у кузніцу.

— Давай, Іванічка, работаць! Я, брат, гэтага не ўмею, што ўмеў, то рабіў, а гэтага не знаю.

— Ты ж каваль, дык доўжан усякае работаць.

Напіўся Іванічка ды спіць.

— Што, Іванічка, прачынайся, а то галава прапала мая!

Іванічка дамок раскаціў, вянок узяў, прыносіць:

— На, аднясі ды астатнія грошы забярэш!

Каваль панёс гэты вянок. І пытаецца ў яго царэўна:

— Хто ў цябе работае?

— Іванічка-п'янічка!

Запрагае коней, едзе Іванічку глядзець.

— Дзе Іванічка-п'янічка?

Іванічка гэта ўслыхаў — ён узяў лёг да сцяны. Пайшла яна зноў к кавалю і пытаецца ў яго:

— Скажы праўду, ці іменна гэта ён работаў?

— Я вам не скажу — работаў ён ці не, толькі ён мне падае.

Яна зноў к яму. Ён так і ляжыць. От яна прама ў ліцо яму паглядзела.

— Вот,— кажа,— друг мой любезны, я цябе колькі лет ажыдала!

Ну, вот яны і павянчаліся. А Дуб-Дубавік і Гара-Гаравік павянчаліся з меншымі. І сталі жыць ды пажываць кожныя ў сваім доме.

Пакацігарошак

У некаторым царстве і некаторым гасударстве, на морыакіяне, на востраве на Буяне стаіць дуб зялёны, а пад дубам бык пячоны, і ў яго баку нож тачоны, і гэты ножык дабываецца — бяры еш! І то яшчэ не казка, толькі прыказка, а хто маю казку будзе слухаць, так таму собаль і куніца і прыгожая дзявіца, сто рублёў на вяселле, а пяцьдзесят на прагулянне.

Быў сабе мужык, і быў у яго саламяны язык, і меў ён двух сыноў і адну дачку: хаця яна стану простага, але хараства неапісанага. Айцец і маці жылі добра, усё жыццё былі хлебаробамі. Вось айцец гаворыць сынам:

— Дзеці, не трэба спадзявацца на тое, што ёсць, не спадзявацца на тое, што зроблена, а трэба шчыра працаваць.

Адпраўляюцца яны ў чужое панства ў заработкі і бяруць хлеба на тры дні.

— Калі вы той хлеб з'ясце, вам сястра прынясе больш.

А ім было ісці так, як бы цераз Гарадзілаўскі лес. Сястра і гаворыць, што не будзе знаць, куды ім несці. Старэйшы брат гаворыць:

— Мы будзем для цябе дарогу адзначаць, будзем салому трусіць па гэтай дарозе, проста к нам прыйдзеш.

І яны пайшлі і дарогу адзначылі; а ў тым лесе быў вялікі змей. Ён тую размову чуў і пераслаў дарогу ў свой палац. Як выйшла тры дні, адпраўляецца яна к ім з абедам.

Пайшла яна і прыходзіць проста ў змяіны палац. Згубіла шлях-дарогу і гаворыць:

— Куды я зайшла?

Выходзіць к ёй сямігаловы змей і гаворыць:

— Ідзі, ідзі сюды, разумніца! Я цябе даўно чакаю, я да цябе даўно дабіраўся! Ну, як ты харошага айца і маці, яны цябе трымалі пад наглядам, я не мог да цябе дабрацца. Я б не

глядзеў, што ты простага роду, даўно была б мая, а ўжо цяпер іменна мая! Забывайся на айца і маці, бо ты ўжо іх бачыць не будзеш, а ў мяне будзеш ты ўсім задаволена.

Браты яе аралі тры дні, і не стала ім чаго есці, яны кінулі араць і прыходзяць дамоў і з вялікай гразою к айцу і маці:

— Чаму вы не прыслалі есці?

Айцец гаворыць, што сястра панесла такога-та дня. Яны гавораць:

— Калі яе ўжо няма, то і не будзе.

— Я пайду,— сказаў адзін,— сваю сястру шукаць, хоць жыццё сваё палажу, а пайду шукаць.

Айцец гаворыць:

— Не ідзі, сынок, бо сваё жыццё загубіш, а яе ўжо не ўбачыш.

А ён гаворыць:

— Пайду!

І прыходзіць ён к таму змею і бачыць яе на дварэ. Яна яму гаворыць:

— Я цяпер няшчасная, я цяпер не твая сястра, а ты не мой брат. Папалася я ў катаржныя рукі.

Брат гаворыць:

— Няхай жа я тут загіну, абы я на цябе наглядзеўся.

Яна яму кажа:

— Пастой ты тут, а я пайду спытаю, што ён скажа на тое, што ты прыйшоў у госці.

Прыходзіць яна к змею ў спальню.

— Што б ты, душанька, зрабіў, каб мой старэйшы брат у госці прыйшоў?

Ён гаворыць:

— За госця прыняў бы.

Яна выйшла і ўводзіць яго ў пакой. Змей устаў з ложка свайго і пачаў частаваць яго, як добры чалавек.

— Ідзі, жонка, прынясі жалезнага бобу і жалезнага хлеба... Ну, еш, швагер.

Узяў яму адрэзаў хлеба, ён узяў хлеб і зернетка бобу, патрымаў і палажыў.

Змей гаворыць:

— Напэўна, ты, швагер, сыты, бо ты грэбуеш маім хлебам і соллю. Пойдзем жа цяпер паглядзім: ці ты багацейшы, ці я?

І павёў яго па ўсіх харомах, і ёсць у яго ўсякага дабра безліч. Павёў яго ў стайню, і стаіць у яго дванаццаць жарабцоў, і кожны жарабец на дванаццаць ланцугоў прыкован.

— Ну што, швагер, ты багацейшы ці я?

Ён яму адказвае:

— У мяне таго трэцяй долі няма, што ў швагра.

— Ну, ідзі ж за мною, я табе пакажу штуку.

І прыводзіць яго к калодзе ў чатыры сажні таўшчыні, дванаццаць даўжыні.

— Ці бачыш ты, швагра, тую калоду?

— Бачу,— кажа швагер.

— Калі ты яе без тапара пасячэш, а без агню спаліш, дык пойдзеш дамоў.

А брат гаворыць:

— Хоць тут ты мяне парубі, а я гэтага не зраблю!

— Калі ж ты гэтага не зробіш, досыць табе сюды хадзіць, дураку мужыку, саламянаму языку, а ты са мною пабратаўся! Калі ты мне брат, то і свіння сястра! Ты не толькі са мною размаўляць, не павінен на мяне вокам глянуць, бо ты не варты сюды хадзіць і мой дом паскудзіць!

І забіў яго і вочы выняў, улажыў у чарапок, а яго ўзяў за валасы і павесіў на бэльцы. Цяпер і другі брат пайшоў шукаць сваю сястру і знайшоў яе на дварэ ў змея.

Яна яму гаворыць:

— Ах, брат! Заб'е ён і цябе так, як першага.

— Няхай заб'е, абы я з табою пабачыўся.

— Пастой жа тут, я пайду запытаюся, што ён скажа.

І прыходзіць яна к змею ў спальню. Ён устаў са свайго ложка.

— Што скажаш, жонка?

— Ах, мілы мой муж! Што б ты рабіў, каб другі мой брат у госці прыйшоў?

— Што б я рабіў? За госця прыняў бы.

Яна гаворыць:

— Можа, прыняў бы яго так, як першага.

— Я першага забіў, бо ён са мною грубіў, не ўмеў са мною гаварыць. Няхай прыходзіць, гэтага я прыму.

Яна выходзіць на двор і гаворыць брату:

— Пакорна абыходзься.

— Давай, жонка,— гаворыць змей,— жалезнага бобу і жалезнага хлеба.

Яна прыносіць паўхлеба і міску бобу.

— Старэйшы твой брат незадаволен быў, можа, мала было, дык вазьмі гэта, а прынясі больш.

— Шчыра дзякую, швагер, бо я есці не хачу.

— Пойдзем жа мы, швагра, паглядзім на маё багацце: ці ты багацейшы, ці я.

І павёў яго па ўсіх сваіх харомах, і бачыць ён, што змей багаты-багаты — незлічона! Прыводзіць яго змей у сваю багатырскую стайню. Стаяць дванаццаць жарабцоў, і кожны на

дванаццаць ланцугоў прыкован. Брат гаворыць змею, што ў яго трэцяй долі таго няма.

— Ну, пайдзі ж, я табе пакажу штуку.

І паказаў яму калоду — чатыры сажні таўшчыні, а дванаццаць даўжыні, і гаворыць:

— Бачыш ты тую калоду? Калі ты без тапара яе пасячэш, без агню спаліш, то пойдзеш дадому, а не зробіш — будзеш вісець з братам.

Швагер яму сказаў:

— Хоць цяпер забі, а не зраблю гэтага!

Змей яго забіў, разам валасы звязаў і цераз бэльку перакінуў. Прыходзіць змей у свае палаты і бачыць жонку ў вялікай тузе і жалобе.

— Ах, мужу, ты мой мужу! Што ж ты мне зрабіў? Братоў забіў, а я не маю больш ні роду, ні племені, толькі айца і маці. Прыдай і мяне злой смерці, няхай не буду жыць.

— Не, мілая! Я табе таго не зраблю, а калі б дастаў айца і маці, дык і іх забіў бы, каб ты ні аб кім не думала і весялейшая была б. Няхай жа яны жывуць і кускі жуюць, а мы хлеб, бо ў іх нет.

Пайшла матка па ваду, узяўшы вёдры. Набрала яна вады, ідзе дадому, вельмі плача і думае гаротныя думкі:

— Ах, Божа мой! Чаго я цяпер дачакалася на старасці!

Раптам бачыць яна — коціцца гарохавае зернетка. Узяла яго і з'ела. І нарадзіўся ў яе хлопчык, і расце ён не па гадах, а па гадзінах, як пшоннае цеста на дражджах; і пестуюцца і цалуюцца з ім старыя і аддаюць яго ў школу; каторыя вучыліся гадоў па тры-чатыры, а ён вывучыўся ў адзін год, і не стала яму граматы. Прыходзіць ён са школы к айцу і мацеры.

— Ну, татанька і маманька, аддзякуйце маіх настаўнікаў, бо ўжо мне хадзіць у школу хопіць. І прашу вас сказаць мне праўду: які я ў вас ёсць? Ці я радзіўся першы, ці апошні?

Яны гавораць:

— Ах, сыну наш мілы, ты ў нас апошні.

І сказалі яму па шчырай праўдзе, што ў яго было два браты і сястра.

— А дзе ж яны дзеліся? Калі памерлі, то я не супраціўнік Богу, а калі што зрабілася ад худых людзей, то я магу спагнаць.

Яны яму гавораць:

— Ах, сыну наш мілы! Як жа ты пойдзеш і нас пры старасці, старых людзей, кінеш? Хто нас да смерці дахавае?

Ён ім гаворыць:

— Чый вы раней елі хлеб, той вас будзе хараніць, глядзець і пахавае, а мяне вы не ўтрымаеце, мяне людзі даўно чакаюць.

Ну, маманька і татанька, лажымся спаць: ранак мудраней вечара; дасць Бог дзень, дасць Бог і ежу.

Ранкам ён устаў, умыўся, Богу памаліўся і на ўсе чатыры стараны пакланіўся.

— Дазвольце, бацькі, мне перад паходам пагуляць.

Ну, пайшоў сабе на вуліцу гуляць і знаходзіць ён шпільку і прыносіць к айцу і мацеры.

Гаворыць ён айцу:

— На табе гэта жалеза, нясі да каваля і зрабі мне булаву сяміпудовую.

Айцец яму нічога не гаворыць, а толькі ў думках думае: «Даў мне Гасподзь дзецішча не так, як людзям; я ж давёў яго да розуму, а ён цяпер з мяне кпіць! Ці ж можа тое быць, каб са шпількі была булава сяміпудовая?»

Айцец, узяўшы грошы, паехаў у горад, купіў жалеза сем пудоў і даў кавалю рабіць булаву. Зрабілі яму булаву сяміпудовую і прывозяць дадому.

Пакацігарошак выходзіць з пакоя, бярэ сваю булаву сяміпудовую і кідае яе за воблакі. І прыходзіць ён да маці.

— Матка, на ў мяне ў галаве пашукай перад паходам, а то мяне бруд заесць.

Вось устаўшы з матчыных кален, выходзіць ён на двор і бачыць нябесныя хмары. Прыпаў ён да сырой зямлі правым вухам і, устаўшы, кліча свайго айца:

— Бацька, хадзі сюды, глядзі, што шуміць і гудзе, мая булава да зямлі ідзе.

Паставіў ён калена проціў сваёй булавы; ударыла яго булава па калене і пераламалася папалам. Ён раззлаваўся на свайго айца.

— Ну, айцец, чаму ты мне не зрабіў булавы з гэтага жалеза, што я табе даў; а калі б ты з яго зрабіў, то яна не зламалася б, а толькі пагнулася б! На ж табе гэтае самае жалеза, ідзі рабі, свайго не прыкладай.

Кавалі ўкінулі жалеза ў агонь і пачалі молатамі біць і цягнуць і зрабілі булаву сяміпудовую, яшчэ і засталося.

Бярэ Пакацігарошак сваю булаву сяміпудовую і адпраўляецца ў пуць, у чыстую дарогу, і прыходзіць ён к таму самаму змею сямігаловаму, дзе знаходзяцца яго браты і сястра.

Выходзіць яна к яму насустрач, ён з ёй вітаецца і гаворыць:

— Добры дзень, мілая і родная сястра!

Яна адказвае:

— Які ты мне брат?!

І ён падае ёй айца і мацеры рукапісанне, што ён ёсць родны яе брат.

— Пастой жа ты, брацец, тут, а я пайду спытаю, што змей на гэта скажа.

Прыходзіць яна ў яго багатырскую спальню. Змей у яе пытаецца:

— Ах, жонка, ты да мяне невясёлая ідзеш!

— Я прыйшла да цябе, мой мужу, што мой самы меншы брат прыйшоў у госці.

— То ў цябе не было больш братоў, як толькі два.

— Ён нарадзіўся без мяне.

Зараз змей устае і бярэ чарадзейную кнігу, глядзіць і мовіць да жонкі:

— Ну, жонка, яшчэ будзе ў цябе брат! Калі ён раней тэрміну нарадзіўся, я з ім размаўляць мала буду; ідзі пакліч яго.

Пакацігарошак уваходзіць да яго ў пакой.

— Добры дзень, швагер!

— Але ты яшчэ млад, бо ў цябе матчына малако на губах не абсохла! Калі б цябе маці вынасіла яшчэ дзевяць дзён, дзевяць гадзін і дзевяць мінут, то б ты мой супраціўнік быў, але пагасці...

І становіць яму жалезнае крэсла. Як ён на крэсла сеў, крэсла трэснула.

— А што, швагер, у лесе жывеш, а крэслы ў цябе худыя, ці ж няма ў цябе плотнікаў добрых, каб крэслы зрабілі крапчэйшыя?

Змей думае сабе: «Верна, я папаўся ў добрыя клешчы».

— Ну, давай, жонка, нам напіткаў і наедкаў.

Прыносіць яна рэшата жалезнага бобу і жалезнага хлеба.

— Зрабі ласку, еш, швагер!

— Дзякуй, швагер,— гаворыць Пакацігарошак,— я без усякай просьбы буду есці, так, як у свайго, бо з паходу я есці хачу.

І стаў есці разам з ім: той з'есць хлеба кавалак, а гэты з'есць два.

— Ну, пойдзем, швагер, паглядзім на маё багацце: ці ты багацейшы, ці я?

І павёў яго па ўсім сваім дабры.

— Як табе здаецца, у цябе больш ці ў мяне?

— Я не багаты, але ў цябе няма нічога!

Змей гаворыць:

— Ты, швагра, са мною грубіш. Ну, ідзі ж, я табе пакажу штуку.

І прыводзіць яго к гэтай самай калодзе, куды і братоў прыводзіў, якая ў чатыры сажні таўшчыні, у дванаццаць сажон даўжыні.

— Калі ты яе без тапара пасячэш, а без агню спаліш, то пойдзеш дамоў, а не — дык будзеш там, дзе і браты!

— Не сярдуй, дай мне справу скончыць! — сказаў Пакацігарошак і ўзяў мезеным пальцам таркануў тую калоду, дык яна на дробныя друзгі разляцелася, а як дзьмухнуў — попел стаў, як і не было!

— Ну што? Я сваю справу зрабіў.

— Пойдзем цяпер пабораемся: ці ты дужэйшы, ці я?

Пакацігарошак гаворыць яму:

— Дай руку, паспрабуем так, хто дужэйшы!

А змей гаворыць:

— Дзе табе, малакасосу, за руку мяне браць!

Ён кажа:

— Усё роўна нам трэба біцца.

— Ну,— гаворыць змей,— на табе руку.

Пакацігарошкава рука толькі пасінела, а змяіная рука з усімі пальцамі засталася ў Пакацігарошка.

— Аднак я тым незадаволен,— гаворыць змей, і як дзьмухнуў — зрабіў медны ток. А Пакацігарошак як дзьмухнуў — зрабіў сярэбраны ток.

І схапіліся яны бароцца. Як дзьмухнуў змей — убіў Пакацігарошка ў сярэбраны ток, а Пакацігарошак як дзьмухнуў — убіў змея ў медны ток адразу па калена. Змей як дзьмухнуў другі раз — убіў Пакацігарошка па калена, а Пакацігарошак як дзьмухнуў другі раз — убіў змея па пояс. Змей гаворыць:

— Пастой, швагер, адпачнём.

— Яшчэ не вельмі патаміліся,— кажа Пакацігарошак,— я з паходу, ды і то не стаміўся.

Змей да яго гаворыць:

— Відаць, швагер, я ў цябе загінуў?

Пакацігарошак кажа:

— Бо я за тым прыйшоў.

— Пакінь мне колькі-небудзь жыцця,— просіць яго змей,— і бяры сабе залатую, сярэбраную і бумажную маю казну, колькі пажадаеш.

— Я б пакінуў табе жыццё, але ты мяне зняважыў, назваў малакасосам, гэта мне вельмі цяжка знесці. Няма табе прашчэння! Больш з табою і гаварыць не хачу.

Змей распусціў сваю кроў па ўсіх сваіх жылах, даў прастор сваім рацівым плячам і ўдарыў Пакацігарошка і ўбіў яго па пояс у зямлю.

— Ну што, нацешыўся, швагер! Бо я, дурань, перад табою доўга балую, даўно трэба цябе прыбраць.

Як ударыў яго Пакацігарошак трэці раз, убіў яго па самую шыю ў медны ток. І бярэ ён сваю булаву сяміпудовую і кон-

чыў яму жыццё. Ды ўзяўшы змея, замазаў яго зусім у медны ток.

І пайшоў Пакацігарошак у багатырскую стайню, дзе стаялі багатырскія жарабцы; узяўшы першага жарабца за хвост, ён садраў з яго тулуном шкуру, выпатрашыў яго і сам у гэтае тулава ўлез. Прылятае крук з кручанятамі і пачалі есці. Ён адно кручаня і злавіў за нагу, і гэты воран стаў чалавечым голасам гаварыць:

— Хто ў тым тулаве ёсць? Акажыся.

— Я, Пакацігарошак.

Крук яму гаворыць:

— Што ты ад мяне хочаш?

— Што я ад цябе хачу? Прыстаў мне цалючай і жывучай вады, а калі не даставіш, то колькі вас ёсць — усе загінеце.

Тады крук, узяўшы пузыркі, паляцеў за трыдзевяць зямель у дзесятае царства, іншае гасударства і дастаў вады з-пад вялікай стражы і прыносіць Пакацігарошку.

Атрымаўшы гэту ваду, Пакацігарошак для надзейнасці ўзяў яго дзіця за дзве нагі і разарваў папалам.

— Я вось пагляджу, ці тая гэта вада!

Ён адной вадой памачыў — стала кручаня цэлае, а другой памачыў — і кручаня аджыло. Падзякаваў Пакацігарошак за ваду і пусціў яму дзіця. Цяпер ён прыходзіць к сваім братам, узяў памачыў іх цалючаю вадой — і сталі яны цэлыя, а другою памачыў — сталі жывыя. І прыводзіць ён іх да сястры.

— Ну, сястра і браты! Бярыце залатую, сярэбраную і бумажную казну, колькі вам трэба, і нясіце дадому.

І пайшлі яны ўсе ўчацвярых.

Вось браты, увайшоўшы ў лес, прывязалі Пакацігарошка к дубу.

— Братцы! Што вы робіце?

— Які ты нам брат? У нас брата не было і не будзе.

Ён, адпусціўшы іх ад сябе на вялікую адлегласць і вельмі раззлаваўшыся, выкруціў дуб з коранем і павалок за імі. Выходзіць ён з лесу і, убачыўшы сваю хату, прыходзіць дамоў і крыкнуў на бацьку і маці:

— Вось вам дровы!

— Ідзі, сынок, у хату.

А ён гаворыць:

— Я баюся, калі ў лесе хацелі мяне знішчыць, то ў хаце тым больш. Бывайце, бацька і маці, браты і сястра! Жывіце сабе добра!

Пайшоў ён назад. Ішоў, ішоў, і трапляецца яму насустрач Вярнігара.

— Добры дзень, брат Пакацігарошак! Куды ідзеш, куды пуць-дарогу дзержыш?

А Пакацігарошак пытаецца ў яго:

— Хто ты такі?

Ён яму адказвае:

— Я ёсць магутны багатыр Вярнігара.

— Ці хочаш быць маім таварышам? — гаворыць Пакацігарошак.

А ён адказвае на гэта:

— Можна! Хачу табе служыць.

І пайшлі яны разам. Ішлі, ішлі, і трапляецца ім насустрач магутны багатыр Вярнідуб.

— Добры дзень, братцы!

— Здароў!

— Якія вы людзі ёсць? — пытаецца Вярнідуб.

— Пакацігарошак і Вярнігара.

— Куды ж вы ідзяце?

— Мы ідзём у далёкі горад. Змей людзей выядае, дык ідзём яго біць.

— Ці нельга мне к вам у таварышы прыстаць?

— Можна! — гаворыць Пакацігарошак.

І прыходзяць яны ў горад і з'яўляюцца к цару.

— Якія вы людзі ёсць?

— Мы ўсе магутныя багатыры.

— Ці не можаце вы мой горад абараніць? Унадзіўся змей і губіць многа народу, трэба яго перамагчы.

— Навошта ж мы называемся магутнымі багатырамі, каб яго не адолець?

Прыходзіць поўнач, і пайшлі яны пад калінавы мост на вогненную раку. Вось прыходзіць шасцігаловы змей і супыніўся перад мостам, а яго конь заржаў, а сокал зашчабятаў, а хорт заскімліў. Ён каня ў лоб.

— Ты, чортава насенне, не іржы, а ты, сокал, не шчабячы, а ты, хорт, не скімлі! Бо тут ёсць Пакацігарошак. Ну,— гаворыць,— выходзь, Пакацігарошак! Ці будзем біцца, ці мірыцца?

Гаворыць Пакацігарошак:

— Не затым добры маладзец ходзіць, каб мірыцца, а затым, каб біцца!

І пачалі яны змагацца. Пакацігарошак з таварышамі сваімі збілі ўтрох змею па галаве.

Змей, убачыўшы, што хутка загіне, гаворыць:

— Ну, братцы! Толькі Пакацігарошак мне перашкаджае, я бы з вамі з двума ўправіўся.

Вось яны сталі яшчэ біцца і адсеклі апошнія галовы змею,

каня змеева ўзялі ў стайню, сокала ў клетку, а хорта ў псярню. А Пакацігарошак узяў павырэзваў языкі з усіх шасці галоў і палажыў сабе ў кішэню, і тулава скацілі ў вогненную раку. Прыходзяць яны к цару. Пакацігарошак прыносіць яму языкі для іменнай праўды. Цар ім дзякуе:

— Бачу, што вы ёсць сапраўдныя багатыры і абаронцы горада і ўсяго народа! Што вам пажадана піць і есці, бярыце ўсякія напіткі і наедкі.

І з радасцю ўдарыў ён публікацыю па ўсяму гораду, каб былі адкрытыя ўсе тракціры, кабакі і малыя корчмы для непераможных багатыроў. Вось яны хадзілі ўсюды, пілі, гулялі, прахалоджваліся і рознымі словамі забаўляліся.

Прыходзіць ноч, і ў самую поўнач ідуць яны пад калінавы мост на вогненную раку, аж падыходзіць сямігаловы змей. Конь яго заржаў, сокал зашчабятаў, хорт заскімліў. Змей каня ў лоб.

— Ты, чортава насенне, не іржы, ты, сокал, не шчабячы, а ты, хорт, не скімлі! Бо тут ёсць Пакацігарошак. Ну,— гаворыць змей,— вылазь, Пакацігарошак! Ці будзем біцца, ці мірыцца?

— Не затым добры маладзец ходзіць, каб мірыцца, толькі затым, каб біцца!

І пачалі яны біцца. І збілі багатыры змею шэсць галоў, а сёмая засталася. Змей гаворыць:

— Дай-ка адпачнем, нячыстая сіла!

А Пакацігарошак гаворыць:

— Не чакай, каб я табе адпачыць даў!

Сталі яны зноў біцца, збіў ён і апошнюю галаву змею, павырэзваў языкі і палажыў у кішэню, а тулава кінуў у вогненную раку. Прыходзіць к цару і прыносіць языкі для іменнай праўды.

У трэці раз таксама апоўначы ідуць яны к калінаваму мосту і к вогненнай рацэ, раптам падыходзіць к ім дзевяцігаловы змей. Конь яго заржаў, сокал зашчабятаў, а хорт заскімліў. Змей каня ў лоб.

— Ты, чортава насенне, не іржы, ты, сокал, не шчабячы, а ты, хорт, не скімлі, бо тут ёсць Пакацігарошак. А ну, вылазь, Пакацігарошак! Ці будзем біцца, ці мірыцца?

— Не затым добры маладзец ходзіць, каб мірыцца, толькі затым, каб біцца!

І сталі яны біцца, і збілі багатыры восем галоў, дзевятая засталася.

Пакацігарошак гаворыць:

— Дай-ка адпачнем, нячыстая сіла!

Змей гаворыць:

— Адпачывай не адпачывай, а са мною не саўладаеш; ты і братоў маіх перамог абманам, не сілаю.

Пакацігарошак не столькі ваюе, як думае, як бы змея абмануць: аднак уздумаў і гаворыць:

— Ды яшчэ вашага брата многа ёсць і ззаду — усіх прыбяру!

Змей аглянуўся, а ён і дзевятую галаву зняў, павыразаў языкі, палажыў сабе ў кішэню, тулава ў вогненную раку кінуў. Прыходзяць яны к цару. Цар гаворыць:

— Дзякуй вам, непераможныя багатыры! Жывіце сабе з радасцю і з міласцю і бярыце, колькі вам трэба золата, серабра і бумажных грошай.

Пасля таго ўсе тры змяіныя жонкі сышліся ў адно месца і ладзяць паміж сабой савет:

— Адкуль яны ўзяліся, што нашых змяёў пабілі? Не жанчыны мы будзем, калі не зжывём іх са свету!

Меншая жонка гаворыць:

— Ну, сястрыцы! Пойдзем мы на вялікую дарогу, куды яны будуць ісці. Я зраблюся прыгожым ложкам і яны, стаміўшыся, як сядуць на ложак, то ўсім тром будзе смерць!

А другая гаворыць:

— Калі ты ім нічога не зробіш, то я зраблюся яблынькаю каля вялікай дарогі, і як стануць яны ка мне падыходзіць — возьме іх прыемны пах, а як пакаштуюць, то ўсім будзе смерць!

Вось пад'язджаюць багатыры к прыгожаму ложку. Пакацігарошак махнуў па ім шабляю — дык палілася кроў!

Пад'язджаюць яны к яблыньцы.

— Брат Пакацігарошак, давай з'ядзім па яблычку,— гавораць багатыры.

А ён кажа:

— Калі можна, братцы, дык з'ядзім, а калі няможна, то далей паедзем.

Вымае ён шаблю і махнуў па яблыньцы накрыж, і палілася з яе кроў. Паспяшае за імі трэцяя змяя і раскрыла сваю пашчу ад зямлі да неба. Бачыць Пакацігарошак, што ім цяжка прыходзіцца; як выратавацца? Аглядваецца ён і бачыць, што яна на яго напірае, і кінуў ёй трох коней у рот. Паляцела змяя да сіняга мора ваду папіць, а яны пайшлі далей. Даганяе яна іх зноў. Бачыць ён, што змяя блізка, і кінуў ёй у рот трох сокалаў. Зноў змяя да сіняга мора паляцела ваду піць. А яны пабеглі далей. Аглядваецца Пакацігарошак, змяя зноў яго даганяе, і бачыць ён небяспеку, узяў ды кінуў ёй трох хартоў у рот. Зноў яна да сіняга мора паляцела ваду піць, пакуль напілася, яны яшчэ далей уцяклі. Аглядваецца ён і бачыць,

што зноў змяя даганяе. Пакацігарошак, узяўшы абоіх таварышаў, кінуў ёй у рот. Змяя паляцела да сіняга мора ваду піць, а ён далей. Даганяе яна зноў, ён аглядваецца і бачыць жалезны завод і забягае ў кузню.

Кавалі гавораць яму:

— Што, чужастранны чалавек, так спужаўся?

— Людзі добрыя! Уратуйце мяне ад нячыстае сілы.

Яны ўзялі кузню заперлі наглуха.

— Аддайце маё,— гаворыць змяя.

Вось кавалі гавораць ёй:

— Праліжы жалезныя дзверы, а мы яго табе на язык паложым.

Яна пралізала дзверы і язык у сярэдзіну ўсадзіла. Кавалі ўзялі ўтрох гарачымі кляшчамі за язык і гавораць:

— Ідзі, чужастранны чалавек, што хочаш з ёю рабі.

Ён выйшаў на двор і давай біць і пабіў на ёй скуру да касцей, а косці да мазгоў, вызваліў таварышаў, а тулава закапаў на сем сажон глыбіні.

Вось ён і цяпер жыве ды кускі жуе, а мы хлеб, бо ў яго нет! І я там быў, мёд-віно піў, па барадзе цякло, а ў губе не было.

Ілья

Жылі сабе муж з жонкай, і нарадзіўся ў іх сын Ільюшка. Пражыў ён больш дваццаці гадоў, і ляжаў дваццаць тры гады на адным баку. Прыходзіць раз к яму дзядуля.

— Што ты, Ільюшка, вады б напіўся ці квасу?

— Магу напіцца вады!

І сказаў яму дзядуля прынесці вядро вады. Той як унёс, так ён і выпіў.

— Як ты, Ільюшка, маешся сам сабою?

— А во, дзядуля, маюся так: магу ад зямлі неба дастаць і ад неба зямлі!

Тады дзед гавора, каб ён унёс вядро квасу. Той як унёс, так ён і выпіў. Дзядуля пытаецца:

— Як ты маешся, Ільюшка?

— Не, дзядуля, чую, што крэпак, ды ўжо так не магу здзелаць — ад зямлі неба дастаць!

— Жыві ж, Ільюшка, на здароўе і ачышчай свет. Прашчай!

А яго матка з бацькам пайшлі ляда сеч. Тады Ільюшка зняў вароты, паставіў на іх бочку вады і дванаццаць булак хлеба і панёс ім на галаве абедаць. Падыходзіць ён к ляду, бацька ўбачыў, гавора:

— Наш Ільюшка ідзе!

— Во,— кажа матка,— ці наш Ільюшка зробіць? Гэта так нехта ідзе. Ён толькі часу дажыдае!

— Не,— кажа бацька,— гэта наш Ільюшка!

Прыходзіць Ільюшка:

— Памагай Бог вам!

Тады бацька з маткай узрадаваліся, што прыйшоў іх сын Ільюшка.

Ён гавора:

— Ну, ацец і маці, абедайце, лажыцеся аддыхаць, а я пасяку ляда!

Ацец-маці паабедалі і ляглі аддыхаць, а ён стаў ляда сеч, ды не сеч, а так ірваць з карэннем. І стаў Ільюшка той лес кідаць на адзін бок і на другі, на сем вёрст і загаціў тым лесам раку Дунай на сем вёрст. Тады разлілася тая рака і пайшла па ўсіх старонах, хацела ўвесь свет затапіць — крэпка загаціў. Прачнуліся яго ацец-маці, убачылі, што ён нарабіў, і гавораць:

— Ах, Ільюшка, не ладна зрабіў — свет затопіш!

Тады пайшоў Ільюшка к Дунаю-рацэ і зноў стаў раскідваць лес на сем вёрст, расчышчаць раку. Расчысціў раку і пайшоў дамоў. Рака як была, так і пайшла зноў гуляць. Прыходзяць бацька з маткай дамоў. Ільюшка паслаў бацьку свайго к папу.

— Ёсць у яго такі конь, купі ты мне яго за пяць злотых!

Ён пайшоў к папу:

— Бацюшка, ёсць у вас конь за пяць злотых?

— Ёсць,— гавора,— прадам!

Ён і купіў.

Прыводзіць к сыну дамоў. А конік быў нячысты, кароліві, маленькі. Тады Ільюшка пускае яго, таго каня, у чыстае поле на дванаццаць сутак, штоб дванаццаць травін з'еў за дванаццаць дзён. А сам пайшоў у кузню к кавалю зрабіць дванаццаць пудоў булаву жалезную. Тады выйшаў на чыстае поле добры маладзец, Ільюшка, раскруціў тую булаву і шыбнуў угару. Яна ляцела дванаццаць часоў, палавіна сутак, і як узварачалася, падставіў ён калена. Яна як ляцела — дзёр аб калена, і рассыпалася.

— Не,— гавора,— трэба крапчэйшую зрабіць!

Зноў пайшоў да каваля ў кузню і зрабіў булаву дваццаць пяць пудоў. Пабалаваў яе ў руках:

— Вот гэта будзе мне хараша!

Зрабіў яшчэ сабе піку, шаблю войструю здзелаў. Тады выйшаў добры маладзец Ільюшка на чыстае поле і крыкнуў па-маладзецку, свіснуў па-казацку:

— Каб мой конь зараз тут быў!

Ён прыбягае. Бяжыць — зямля дрыжыць, сам увесь калоціцца — крэпка сілен стаў. Прыбягае і стаў — шарсціна залатая, шарсціна срэбраная. І пытае:

— Чаго, Ільюшка, жалаеш?

— А паедзем белы свет ачышчаць, нягіднага Сокала пабіваць!

І просіць ён у аццa-маці благаслaвення:

— Благаславіце, ацец-маці, у белы свет ехаць мне!

Ацец гавора:

— Бог благаславіць і мы благаславім. Куды надумаўся, адпраўляйся сабе.

Тады ён увабраў каня ў залатое сядло, узяў з сабою ўвесь струмант бойны — булаву і піку — і паехаў у белы свет. Ехаў ён, ехаў троя сутак і прыехаў у царства цара Пражоры. Ён па дзесяць чалавек еў на дзень, а нягідны Сокал яму дастаўляў есці. Ён, нягідны Сокал, як свісне, дык на дванаццаць вёрст кругом чалавек упадзе — крэпка сілен быў. І сядзеў той нягідны Сокал на дванаццаці дубах адзін, і ў яго дванаццаць рагоў. Пад'язджае к яму Ільюшка, ён і гавора:

— Здрастуй, Ільюшка, добры малойца! Чаго ты сюды зайшоў?

— Сам добры малойца ахвотаю зайшоў!

— Што ж, Ільюшка, ці біцца будзем, ці мірыцца?

— Не на тое я йшоў, штоб мірыцца, а на тое, штоб біцца з табой!

Тады як хваціў добры малойца Ільюшка булаву, як дзёрнуў яго па галаве — на месцы і палажыў. Адрубіў яму галаву і ўстыкнуў яе на піку, і пасек яго тулава на дробны мак, кінуў у асінавы груд і спаліў. Крыкнуў па-маладзецку, свіснуў па-казацку:

— Ну, мой конь, паедзем к нягіднаму цару Пражору!

Ну, й паехалі — галаву сокала на піку! Пад'язджае туды і выстаўляе тую галаву нягіднага Сокала на пікі ў цара пад ганкам. Услыхаў той цар Пражор, што нехта едзе, і гавора:

— Хто там едзе? Каго гэта мой нягідны Сокал дапусціў?

А таго не знае, што нягіднага Сокала галава ў яго пад ганкам на пікі!

— А едзе,— кажа,— Ільюшка! Будзе тое і табе, што твайму Сокалу!

А ён быў крэпка жыран; дык вочы ў яго заплылі і бровы зараслі, і ён нічога не бачыў. Дык ён кажа:

— Слугі мае верныя, падніміце мне вілкамі бровы!

Хацеў ён паглядзець на Ільюшку. А добры маладзец Ільюшка ўзяў булаву і ідзе к яму ўжо, аж ганкі трашчаць пад нагамі. Цар Пражор пытае:

— А дзе ж мой Сокал?

Ільюшка хутка ідзе на ганкі, бярэцца за піку і паказвае:

— А во дзе твой Сокал!

— Слугі мае верныя! Дайце нам піцення-ядзення, пап'ём мы з Ільюшкай!

Тады завялеў цар Пражор прыгатаваць для Ільюшкі залатое крэсла,— з сабой пасядзець.

Не хоча Ільюшка нічога, садзіцца быццам-та піць-есці з ім, ды, нічога не кажучы, схапіў з галавы сваю шапку — дванаццаць пудоў, як ударыў таго нягіднага цара Пражора, дык на тры аршыны сцяну каменную прабіў і яго наскрозь сцяны прабіў... Убіў ён нягіднага Сокала і цара Пражора і ачысціў свет. Тады ўбіраецца ён у белы свет, ехаць пуцём-дарогаю. І ўязджае ён у такія лясы, у такую пушчу-драмушчу, што ні ўздумаць, ні ўзгадаць, толькі ў казках казаць. Прыязджае ён у такое царства, не ў гэта, дзе мы жывём, а ў другое, і стаўляецца ў тым царстве пруд на дванаццаць камянёў. Пад'язджае ён туды і гавора:

— Бог помач вам! Ці не ёсць у вас, рабяты, вады папіць?

Яны адказваюць:

— Чаму, можна вадзіцы папіць, ёсць харошая!

Папіў ён вады, падзякаваў:

— Ну, спасіба вам за харошую ваду!

І разгаварыліся яны. І пытаюцца яны ў яго:

— Ці не параіш ты нам, ці не паможаш ты нам дванаццаць камянёў узлажыць? Мы б табе, што ты хочаш, заплацілі б.

Тады гавора Ільюшка:

— Я вашыя платы не хачу, а пасабіць магу. А ці крэпкі вашы ганкі?

— Крэпкі — можаце ўзысці!

А таго яны не знаюць, што ён такі крэпкі багатыр! Тады ён узяў на адну руку камень надзеў і на другую надзеў і стаў ступаць на ганкі. Ступіў — тыя ганкі ломюцца.

— Не,— гавора,— не магу ўзнесці па гэтых ганках,— ламаюцца яны. Ну, ды мне вашы ганкі не трэба, я магу і так паўскідаць!

Узяў адзін камень у адну руку, а другі ў другую і паўскідаў іх наверх, туды, дзе трэба іх класці. Ну, тады яны гавораць:

— Ну, просім мы цябе, каб ты ўсе паўскідаў!

Так ён узяў і ўсе паўскідаў.

— Хто ты такі,— пытаюцца,— добры малойца?

— Я Ільюшка Іванаў.

— Што ж ты з нас хочаш: ці грошы, ці што?

— Нічога я з вас не хачу, хачу толькі каб вы мяне заўсёды благадарылі.

— Можа хочаш, мы цябе пачастуем харошымі напіткамі?

— Ну, мне гэта ваша не трэба! Прашчайце, браццы! Ачысціў я ўвесь белы свет! Жывіце на здароўе! Вот вы не зналі, а цяпер я скажу, што я сільны, магушчы багатыр, Ільюшка Іванаў, і маліцеся Богу за маё здароўе пагэтаму...

Тады паехаў ён у сваё царства. Прыязджае туды, прыходзіць у свой двор к аццу, к маці. Так яны ўзрадаваліся!

— Ах,— гавораць,— Ільюшка! Мы ўжо думалі, што цябе на свеце няма!

— Слава Богу,— кажа,— жыў і здароў, і вясёл, і ачысціў увесь свет!

Курыла Кажамяка

Была недзе вялікая гара, а ў той гары жыў цмок. Гэты цмок украў у цара дачку. Жыла яна год у той гары з цмокам, жыла два. А ў той гары была дзюрка, куды лятаў цмок. Раз, як паляцеў цмок, улятае ў тую дзюрку голуб. Тады яна напісала картачку к свайму бацьку, на нітачку прывязала і начапіла на шыю голубу. Як начапіла картачку, дык выпусціла голуба вон. Голуб паляцеў у той горад, адкуль цмок узяў царэўну, і сеў на даху. Людзі ўбачылі, што ў таго голуба нейкая картачка на шыі, і сталі яго лавіць. Улавілі, адвязалі картачку ад шыі і сталі чытаць. А ў той картачцы напісана:

— Ацец мой любезны, дастаньце мяне з такой і з такой гары. І больш мяне ніхто не дастане, апроч Курылы Кажамякі. І вот як вы можаце яго ўзнаць: як толькі будуць тапіцца печкі і будзе ісці дым, дык ва ўсіх дамах дым пойдзе набок, а ў яго прама. Ён сільней цмока, і калі хочаце дастаць мяне адсюль, дык упрасіце Курылу!

Тады цар сабраў старыкоў паважаных і паслаў іх к Курылу прасіць, каб ён дастаў яго дачку з гары ад цмока. Пайшлі тыя старыкі к Курылу і сталі яго прасіць. Прасілі, прасілі і кланяліся — не ўпрасілі. Сабраў тады цар сярэдніх людзей і паслаў іх к Курылу прасіць, каб ён дастаў яго дачку з гары ад цмока. Пайшлі яны к яму, кланяліся, караліся, усе, усе прасілі — не, не ўпрасілі. Засмуціўся той цар і не ведае, што яму цяпер рабіць, як бы-та яго ўпрасіць. Тады яму параілі:

— Вазьмі ты паспрабуй паслаць малых рабят, можа ён над імі і змілуецца.

Ён паслухаў той рады іхняй, сабраў малых дзяцей і паслаў іх к Кажамяку прасіць, каб ён схадзіў к цмоку за дачкой за царскай. Пайшлі тыя дзеці к Кажамяку, а ён на возеры кожы

мые. Сталі яны перад ім плакаць, кланяцца. Тады яго быццам та ўзяў жаль. Разарваў ён тыя кожы на чатыры часці і ўкінуў у возера. І паслаў сказаць цару, каб ён купіў дванаццаць пудоў пянькі і шэсць пудоў смалы і даставіў яму. Курыла абвярцеўся пянькою, абсмаліўся смалою і пайшоў на тую гару.

Прыходзіць ён на тую гару, ажно цмок вылятае к яму.

— Што,— гаворыць,— Курыла, за чым прыйшоў сюды?

— А прыйшоў за царскай дачкой. Аддай мне яе!

— Не, я не аддам царскай дачкі!

— А не аддасі, дык мы з табою разбярэмся!

І схапіліся яны біцца. Біліся, біліся з самага рання да самага паўдня. Цмок убіў Курылу па пяты ў зямлю, а Курыла цмока ўбіў па калені. Тады цмок кажа:

— Аддышам, Курыла! Цары з царамі б'юцца, і каралі з каралямі б'юцца і то аддышку маюць, а мы з табою біліся палавіна дня і не аддыхаем!

А Курыла кажа:

— Не, я не хачу аддыхаць, біцца дык біцца!

Сталі яны зноў біцца. Біліся, біліся ад самага паўдня да самага вечара. Курыла цмоку галаву зняў, а цмок убіў Курылу па калені. Забіўшы праклятага цмока, Курыла раскапаў гару і дастаў царэўну. І, дастаўшы царэўну, прыставіў яе к аццу. Цар, убачыўшы сваю дачку перад сабою, крэпка ўзрадаваўся, угасціў Курылу як можна лепш і даў яму дужа многа грошай.

Вярнуўся Курыла дамоў і лёг спаць на дванаццаць сутак. І прыставіў ля дзвярэй часавога, прыказаў яму так:

— Каторыя хочуць паглядзець на мяне мужчыны, ты пускай, ну жанчыны ні адной не пускай!

Як лёг ён спаць, тады яго матцы крэпка захацелася на яго паглядзець. Узяла яна адзелася ў мужчынскую адзежу і прыходзіць. Часавы думаў, што гэта мужчына, і прапусціў яе ў пакой. Увайшла яна туды, дзе ён спаў, і як толькі глянула на яго, так ён і памёр...

Жораваў кашалёк

Жылі сабе дзед з бабай. Не мелі яны пры сабе ні дзяцей, ніякіх сродственнікаў, так сабе жылі ўдваіх у хатцы. Жылі яны крэпка бедна. Вядома, былі старыя, гадоў па восемдзесят, а можа й болей — старыя людзі доўга жылі. Дажылі яны да таго, што і есці нечага. Толькі тым і піталіся, што дзед дастане якіх-небудзь сухаркоў па міру.

Даждаліся яны вясны-красны. Баба дзеда і настаўляе:

— Дзедка, людзі дык усе сеюць, хоць бы ты пасеяў пшана,

у нас недзе гарчык ёсць! Хоць бы мы, бяззубыя, на старасці паспыталі кашкі ці крупнічку цёплага, а то гэтыя сухаркі ўжо абрыдлі!

Дзед бабы паслухаўся і пасеяў пшана па вясне-красне. Высек лядцо і на лядцы пасеяў. Пасеяўшы, дзед не пайшоў глядзець цэлую нядзелю яго ўсходаў. На другую нядзелю пайшоў — вырасла пшано аж па пояс.

Так Бог паспяшыў, каб яно расло на старых, на бедных, што есць нечага.

Прыходзіць ён к пшану свайму, бачыць — стаіць у яго пшане журавель, ды такі бальшы, агромны. Як прыхадзіць к таму пшану, узяў дзед палку і шыбнуў у жорава. Жораў падняўся і паляцеў. Стаў глядзець дзед таго пшана, аж яно ўсё чыста збіта, патаптана, паламана. Ён тады прыходзіць дамоў і кажа бабе:

— Вот, бабка, даў нам Бог харошую ўроду пшана, ды не даў спажыць: унадзіўся жораў у пшано і прама есць, косіць — усё чыста пабіў, паламаў!

— А, мой дзядулька, а ты ж быў колісь стральцом, вазьмі стрэльбачку, пачысці яе, падпаўзі ды й забі яго. Вот будзе нам і мяса!

Той дзед паслухаў, узяў стрэльбу, пачысціў яе і пайшоў к пшану. А журавель ды прылятаў перад поўднем. А ён які, значыцца, жораў — сам змей. Дзед толькі падышоў, а жораў тут і скінуўся: то быў пціцай, а то стаў панам — аж ззяе, пры ўсёй хорме, у твары красны. Адвяшчае той пан дзеду.

— Стой, дзядулька, не бі мяне. Гэта тваё пшано?

— Маё.

— Што ж хочаш за сваё пшано?

Той дзед спужаўся; бача — такі пан, а ён такі шкут, абадраны, залатаны, укураны, як у лазні ў якой!

— Што,— кажа,— я хачу: няму ў мяне нікога — ні дзяцей, ні сродственнікаў — карміць мяне некаму!

— Ну, дзядулька, калі ў цябе нікога няма і некаму цябе карміць, дык ідзі ты за мной зялёнай трапой, шаўковай травой, выйдзеш ты на паляну, там будзе мой двор. Не ідзі ты на захад сонца к майму ганку, зайдзі ты наўпроці поўдня. Там будзе другі ганак: ты на яго і ідзі ў мой дом. Там будзе часавы стаяць; ён спросіць у цябе: «Куды ты ідзеш?» А ты скажы: «К жураўлёваму». Ён цябе пусціць. А тут я, можа, пачую, а можа, у вакно ўбачу — сам адчыню табе дзверы і ўпушчу ў свой дом!..

Сказаўшы гэта, ён троп-троп! — Здзелаліся ў яго рукі крылушкамі, ён узняўся і паляцеў.

Той дзед і пайшоў зялёнай трапой, шаўковай травой. Ісці

яму, ісці — выходзіць на паляну і бача дом сярод паляны. Такое страенне — гэта ні здумаць, ні згадаць, толькі ў казках сказаць; можа такога і ў цэлым нашым царстве няма — так і ззяе! Цяпер прыходзіць той дзед к дому, падыходзіць к таму ганку, што ад поўдня. Стаіць часавы яго, таго жураўлёвага.

— Ты куды,— кажа,— ідзеш, шкут ты гэтакі?

А той пачуў, жораў, лоп-лоп, адчыняе адну комнату, а тады другую:

— А пайдзі, пайдзі сюды!

Часавы адступіўся набок. Вот дзед прайшоў адзін пакой, другі пакой, уваходзіць у трэці. Жораў пасадзіў яго ў крэсла і паставіў яму ядзення-піцення, віна ўсякага, прадухтаў, хрухтаў — адкрыў яму свой увесь стол, толькі малака пташачага не было. Угасціў таго дзеда, тады спрашвае:

— Што ты, дзядулька, хочаш за сваё пшано?

— Мой панок, мой залаты, не магу сказаць, што ваша ласка, то й дасцё!

Той жораў пайшоў у другі пакой, выносіць яму кашалёк і гаворыць:

— Ну, дзед, калі ты, ідучы па дарозе, захочаш есці, скажы: «Кашалёк, кашалёк, дай мне піцення-ядзення!» Ён адкрыецца, і з таго кашалька будзе і стол, і крэсла, і тыя самыя кушанні, што ты ў мяне еў. А як пад'ясі, нап'ешся, тады скажы: «Піценне-ядзенне, хараніся ў кашалёк!» Тады яно ўсё скрыецца, ты згарні і ідзі сабе дамоў. Толькі памногу не пі, а то ўвап'ешся, і хто-небудзь украдзе кашалёк!

Той дзядулька, прайшоўшы па дарозе дамоў, захацеў паспрабаваць: ці праўда гэта будзе, што мне жораў адвясціў? Адышоў паўдарогі, сеў, выняў кашалёк, раскрыў і кажа:

— Кашалёк, кашалёк, каб мне было піцення-ядзення!

Дзед той паспытаў сяго-такога па малай частачцы, тады кажа:

— Піценне-ядзенне, хараніся ў кашалёк!

Усё і схавалася. Прыходзіць ён к свайму сялу, к сваёй хатцы. Уваходзіць у яе:

— Дзень добры! — кажа.— Ці жыва тут баба мая?

— А жыва, дзядулька! А ты ці жыў?

— Я жыў-здароў!

— А я ж думала, што цябе ці ваўкі з'елі, ці мядзведзі забілі, у мох зацягнулі, закапалі і калоддзем завярнулі.

— Не, бабулька, ваўкі не з'елі, мядзведзі не забілі, а прынёс я хлеба-солі, будзе з нас па нашай жысці! Садзісь-ка, бабка, за стол і я сяду,— можа ты з месяц не ела. Будзе нам піцення-ядзення!

— Што ты, дзядулька? Адкуль ты возьмеш піценняядзення?

— Садзісь-ка, садзісь!

Селі яны за стол, выняў дзед кашалёк, паклаў на стол. А стол той каравы, вядома, у курніцы. Раскрыў ён кашалёк:

— Ну, кашалёк, кашалёк, каб было нам піценняядзення!

І тут адкуль што ўзялося! То была курніца, а тут сталі пакоі, можа лепш гэтых, ды што гэтыя — можа і ў цэлым царстве няма такіх. І рознае-рознае піценне-ядзенне: тут і віны, і бабкі, і пірагі — усяго было. Баба тая здзівілася!

— Божа мой, Божа мой, адкуль усё гэта?

— А вот, бабка, як паслала ты мяне забіць жорава, дык я прыхаджу к свайму пшану, а ён там. Толькі я злажыўся, каб яго забіць, а ён скінуўся панам, такім панам, што аж зэяе. «Што ты,— кажа,— хочаш з мяне за сваё пшано?» Я яму кажу: «У мяне няма нікога, карміць мяне некаму!» Тады ён кажа: «Ідзі ты ка мне ў мой двор зялёнай трапой, шаўковай травой, там я цябе награджу». Пайшоў я туды, у двор к яму, ён мяне накарміў, напаіў і кашалёк гэты даў.

Тая бабка выпіла, абняла дзеда, пацалавала:

— Ну, спасіба ж табе, дзедка, я рада табе: ты ўсё роўна як з таго свету явіўся! Ці ведаеш ты што, дзедка? Мы адны жывём, ні ў людзей не бываем, ні людзі ў нас. Пазавём мы к сабе войта і старасту ў госці! У нас гэткі стол, і хата наша ад стала правіцца!

— А як, баба, сабе хочаш; можаш і пазваць сабе, няхай і пабудуць у нас!

Тая баба закухліла намятку, пайшла на сяло і пазвала войта і старасту.

— Хадзіце,— кажа,— мае дзеткі, ка мне ў госці!

— Што ты,— кажуць,— старая карзіна, якія ў цябе госці? Жыве ў западной хаце, можа, есці нечага, а яна ў госці заве!

— Не, мае дзеткі, тады будзеце нас ругаць, як пабываеце, ды не будзе ў нас накрытага стала. А напярод нечага ругаць!

Тады тыя адумаліся: «Ну, няхай сабе і так, пойдзем сабе!» І пайшлі яны ўдваіх у госці. А яны ахвочы папіваць, калі хто заве. Уваходзяць у хату:

— Дзень добры, дзед!

— Здароў!

— Што скажаце нам?

— А во сядзьце, пасядзіце на лаўцы: і скажам і пакажам!

Тыя селі. Адзін кнут дзержыць — пугу, а другі — бізун. Вядома, войты і старасты былі граза для сялян — заўсёды з кнутамі хадзілі па сялу, з хат выганялі на баршчыну. Тады дзед выняў кашалёк:

— Кашалёк, кашалёк, каб было піцення-ядзення!

Адкрываецца з таго кашалька піценне-ядзенне, усякае ўгашчэнне для ўсяго засядання, колькі будзе, ці пяць, ці дзесяць. Стаў дзед угашчаць войта і старасту. Тыя п'юць і ядуць, і не надзівуюцца, што гэта такое: і піцення, і ядзення, і хата пасвятлела? Ці не Бог гэта з неба скінуў рай? Гэта і ў пана няма такога ўгашчэння, стала, украшэння! Напіліся яны, наеліся — лоўка нахлябаліся і зялёнага і вішнёвага, якóе толькі ёсць на свеце, і пайшлі. Баба і гаворыць:

— Ці ведаеш што, дзядулька?

— А што?

— Пазавём мы пана к сабе ў госці?

— Што ты, баба дурная! Во, праўда,— хто бабы слухае, заўсёды пагібае. Пойдзе к нам пан, к старцам к такім! Ідзітка, ён табе кнутам уздасць!

— А што будзе, ды будзе — пайду!

— Ну, ідзі сабе.

Пайшла баба. Прыходзіць к пану ў пакой. Выходзіць пан:

— А што, старая бабка, скажаш?

— А што, паночак, скажу: прасіў дзед, прашу і я вас к сабе ў госці!

— Што? Ах ты, быдла! Ты мяне завеш у госці? Я пайду к старчысе?

— Не, паночак, не ймеце вы веры мне, запытайцеся ў сваіх верных людзей. Ёсць у вас войт і стараста: спрасіце ў іх, ці можна ісці к нам, ці не?

Пазваў пан лакеяў, кучароў:

— Схадзіце, пазавіце ка мне на часок войта!

Слугі тыя пайшлі к войту:

— Казаў пан, каб к яму йшлі!

Прыходзіць войт к пану:

— Заве ведзьма мяне ў госці,— кажа пан,— дык ці можна к ёй ісці?

— А, паночак, можна, можна: мы ў пана не бачылі такога стала, як у іх. Ёсць у дзеда кашалёк, і з яго ўсё адкрываецца: і гарэлка, і віны, і стол. Можна пайсці!

Той пан паслухаў войта, вялеў сваім кучарам, каб заклалі коней. Пан з паняй адзеліся і паехалі не так піць-есць, як тыя праўды ўзнаць: ці іменна праўда, ці можа ложна, што старуха гаворыць. Прыязджаюць к той хатцы і злазяць з хвальтона. Тады дзед той выходзіць:

— Не гневайцеся, паночак, мая хатка знаружы не чыста, а ў сярэдзіне будуць вам і стуллі, і квяты, і ўсё.

Уваходзіць той пан у хату, і стаў у парозе. Тады той дзед выняў кашалёк і гаворыць перад панам:

— Кашалёк, кашалёк, каб было тут піценне-ядзенне і ўсякае ўкрашэнне ў маёй хаце!

Тут зараз усё адкрылася: і піценне, і ядзенне, і ўсякае ўкрашэнне, што і ў цэлым царстве няма такога стала, як у яго! Вось той пан бача, не стыдна сесць.

— Просім, паночак, на свой на хлеб-соль!

Стаў пан разбіраць тыя віны, бачыць, што самыя дарагія. Сталі піць і есці. Папілі-паелі, пан і кажа:

— Дзядуля, табе совесна мець такі кашалёк; ты такі шкут, а ў цябе дом і стол лепш майго. Мне совесна проці сваіх другаў. Я цябе прашу па ласцы: аддай ты мне гэты кашалёк. Дам табе правізію супоўную: крупы, муку, закрасу — усё, што трэба, усё табе буду прыстаўляць. І слугу табе дам, і карову, і свінню — усё. Нашто табе кашалёк? Я цябе пахаваю і сыботнікі адпраўлю, уцешу, па манастырах пазаводжу!

Той дзед пагаварыў з бабай:

— Ну, то ж, дзед, пан просіць — трэба паслухаць. Нам усё будзе: і слуга будзе, адзежда — і памыта, і пададзена!..

Паслухалі, аддалі і асталіся ў сваёй у дзіравай хатцы, як былі. Той пан узяў кашалёк і паехаў. Тады даў ім і правізію, і слугу: пуд мукі, пуд гароху, пуд круп яшных драных, пяць хунтаў сала, тры хунты масла, дзесяць хунтаў солі — выдаў ім паёк. З'елі яны той паёк у колькі дзён. З'еўшы паёк, паслалі яны сваю слугу ў хальварак к пану:

— Пане, прыслалі дзед ды баба па паёк,— той паёк выйшаў!

Тады той пан не даў пайка і слугу не пусціў.

— Поўна,— кажа,— даваць, у мяне ёсць гэткіх многа, што трэба даваць. Мне трэба карміць тых, хто работае, а яны на баршчыну не ходзяць. Хай па міру сабіраюць і ядуць: з міру па нітцы — голаму рубашка; з міру па крошцы — дваім прапітацца можна!

Так пан і зняверыў, слова змяніў. Пайшла тая слуга і адвясціла гэта дзеду:

— Казаў пан, што ў яго ёсць такіх многа, што трэба даваць: трэба карміць тых, што работаюць. А вам казаў па міру сабіраць і есці. І мне назад у двор ісці!

І пайшла назад. Асталіся тыя дзед з бабай, як былі: і каравыя, і дзіравыя, і ў нудзе ў вялікай.

Дзед думаў-думаў, думаў-думаў думу: «Што тут рабіць? Як хлеб даставаць?» І надумаўся: «Пайду-тка я к таму жораву, пажалюся яму, ці не памілуе, ці не дасць ён другога кашалька. Той баба звяла. Сказана: хто бабы слухае, той заўсёды загібае. З бабай жывеш, праўды не кажы ніколі!»

— Пайду,— кажа,— баба, к жораву, ці не дасць ён нам другога кашалька?

— Ну, схадзі, дзед. Дасць, не дасць, а схадзі!

Ну, ён пайшоў зялёнаю трапою, шаўковаю травою. Ішоў, ішоў, прыходзіць на палянку. На той палянцы жораваў дом. Прыходзіць ён к таму дому, падыходзіць пад яго ганак. Часавы на яго крычыць:

— Ты куды, шкут, чаго табе тут трэба?

А жораў пачуў, лоп-лоп,— дзверы адчыніў:

— А, хадзі, хадзі сюды!

Часавы сычас набок. Увайшлі яны ў пакоі; адзін прайшлі, другі, увайшлі ў трэці. Жораў пытаецца:

— Ну што, дзядулька, можа, хто абідзеў?

— Што, паночак,— пан абідзеў. Пазвала баба войтаў у госці, напаіла, накарміла, а тады кажа: «Пазавём мы пана!» Я не хацеў, але сатана звядзе і сакала. Пайшла яна, пазвала. Прыехаў пан з паняй. І падлёг ён мяне, каб аддаў яму кашалёк, падлёг і падлёг. «Я,— кажа,— усё табе буду прыстаўляць». Мусіў я ў бабы папытацца. А баба кажа: «Аддай, дзед, трэба пана паслухаць, ён жа ўсё нам будзе прыстаўляць». Аддаў я кашалёк, а пан прыслаў нам паёк.

Тады як той паёк выйшаў, ён і зняверыў. «Хай,— кажа,— па міру ідуць сабіраць ды й кормяцца!..»

Ну, жораў пасадзіў яго за стол, угашчае, а той за слязамі і не есць...

— Ці не дасцё вы мне,— кажа,— шчэ такога кашалька?

— Добра, дам, дам! Будуць знаць усе! Не дам я табе кашалька, але дам табе бачоначак!..

Пайшоў ён у другі пакой, выносіць бачоначак і вуча яго:

— Прыходзь ты дамоў, скажы: «Баба, лезь-ка з печы. Не прынёс я кашалька, а прынёс бачоначак!» Як баба злезе з печы, ты і скажы: «Ну-ка, дванаццаць молайцаў, лезьце з бачоначка, расцяніце гэту бабу, улініце ёй кнутамі харашэнька!» Дадуць яны бабе, тады скажы: «Ну-ка, дванаццаць молайцаў, лезце ў бачоначак!» Ну, тады скажы бабе, каб яна закухліла сваю намятку і пайшла к пану, ды не сказала, што ты прынёс бачоначак, а сказала б, што прынёс другі кашалёк, шчэ лепш таго. Пазаві пана з паняй, і войтаў, і дваран усіх. І як сабяруцца ўсе, пасадзі пана з паняй на куце, а тых усіх на дварэ. Тады скажы: «Нуце-тка, дванаццаць молайцаў, лезьце-ка з бачоначка, улініце ім усім!» Як дадуць, тады скажы: «Нуце-тка, дванаццаць молайцаў, стойце ў парозе!» І патрабуй назад свайго кашалька!..

Падзякаваў дзед, пайшоў дамоў. Як улінуў бабе! Баба пабегла, пазвала пана, паню і войтаў, і дваран усіх. Як улінў-

лі ўсім, і дваранам, і войтам, і кучарам, і ўсім!

— Дванаццаць молайцаў, стойце ў парозе! Ну, пане, палож тут кашалёк, а то будзе і табе такое ўгашчэнне, якога ты ніколі не бачыў, і дзяды твае, і прадзеды не бачылі!

Грозя, бач! А што гразіць, калі той і сам усё відзеў, і стаяць у парозе дванаццаць молайцаў з кнутамі! Пан той відзіць, што плоха, ды прызапомніў кашалёк узяць з сабою. Адвяшчае дзеду:

— Аддаю, дзядулька, табе кашалёк твой, толькі пусці жывога! Многа-мала мне жыць, будзе з мяне і свайго дабра. Прызавіце мне майго слугу!

Прызвалі таго слугу, пусцілі яго к пану.

— Пажалуйста, галубчык, едзь скарэй у двор, і там у шахве, ці можа ў скрыні, ляжыць кашалёк. Вазьмі яго і прыстаў мне сюды ў скорым урэмю, а то мне тут плоха знаходзіцца!

Чаму! Калі дванаццаць д'яблаў стаяць у брылях, стаяць з кнутамі!

Даў ключыкі — пры сабе меў у кішэні. Той паехаў, узяў кашалёк, дзе было сказана, і даў пану. Пан кажа:

— На, дзедушка, твой кашалёк, толькі пусці мяне!

Дзед узяў кашалёк і кажа:

— А дайце-тка яму! Ён мужыкоў б'е і не верыць, што больна, хай жа і ён пазнае, як нам больна!

Ну, узялі дванаццаць молайцаў, аддзюбашылі троху, тады дзед кажа:

— Дванаццаць молайцаў, лезьце ў бачонак!

Пан тады ходу! Ці ўзяў шапку, ці не, а шубу пасеклі ў кускі! Той дзед астаўся тады жыць з сваім кашальком, з сваёй сілы ды абароны. І ніхто ўжо яго не тронуў.

Дзіва

Жыў сабе чалавек вельмі бедны, не было ў яго чаго есці. Пакінуў ён сваю жонку дома, а сам пайшоў у свет. Ідзе ён дзень, ідзе другі і прыходзіць у лес. У лесе стаіць хатка; ён зайшоў у гэту хатку, а там сядзіць нейкі старычок. Вот ён і пытае:

— Ці можна ў цябе, старычок, пераначаваць?

А старык адказвае:

— Чаму ж? Начуй!

Сядзяць яны час, а можа і два, пара ўжо вячэраць, а на стале і хлеба ні куска. Вот старык і гаворыць:

— Мый, брат, рукі!

І сам памыў. Селі за стол, а хазяін і гаворыць:

— Дзіва, ідзі ў хату жыва! Сячыся, рубайся, у гаршчок

накладайся, да агню прыстаўляйся і на стол падавайся!

Вот уваходзіць у хату нейкі індык, сам зарэзаўся, аскубся, да агню прыставіўся, зварыўся і на стол падаўся. Хазяін і кажа госцю:

— Еж, брат, толькі касцей не грызі!

З'елі яны ўсё мяса, косці палажылі на стол, а хазяін кажа:

— Дзіва, сабірайся, ды і за парог выбірайся!

Дзіва сабралася, ды і за парог выбралася. Вось госцю стала зайздросна,— ён і просіць:

— Прадай мне, добры чалавек, гэта дзіва!

А старычок адказвае:

— Я не прадаю нікому за грошы, а добрым людзям і так даю.

І падарыў гэта дзіва чалавеку. Чалавек узяў яго к сабе, занёс дамоў і кажа жане:

— Вот я прынёс дзіва, ты толькі паглядзі, што тут будзе!

І загадаў накласці дроў у печку, а сам з жаною сеў за стол. Індык стаіць у сенях. Вот хазяін кажа:

— Дзіва, ідзі ў хату жыва! Сячыся, рубайся, у гаршчок накладайся, да агню прыстаўляйся і на стол падавайся!

Дзіва заходзіць, само зарэзалася, аскублася, да агню прыставілася і на стол падалося. З'елі яны ўсё мяса, а косці палажылі на стол, і кажа хазяін:

— Дзіва, сабірайся, ды і за парог выбірайся!

Сабрала яно ўсе свае косці, саскочыла са стала і пайшло, як прыходзіла. Пабылі яны з дзень, і выйшлі ў іх усе дровы. Хазяін паехаў у лес па дровы, а к жане яго прыходзіць поп і заве к сабе мыць бялізну. Вось яна і хваліцца:

— Ох, мой бацюхна! Што ў нас ёсць за дзіва! Садзіцеся за стол.

Селі. А яна і заве:

— Дзіва, ідзі ў хату жыва!

А дзіва ўсё не слухае. Узяла баба качаргу і крычыць:

— Вось, я ж табе!

Ды як дасць па ім качаргою — качарга так і ўрасла к дзіву, а баба к качарзе. Крычыць баба на ўсё горла:

— Ой, бацюшка, памажы ад качаргі адарвацца!

Прыйшоў поп і гаворыць:

— Ды што гэта такое?

Узяўся спасаць бабу і сам прырос. Прыходзіць дзяк і кажа:

— Бацюшка! Ды што так доўга сядзіце? Трэба абедню служыць.

А поп гаворыць:

— Відзіш, што не магу адарвацца.

Дзяк стаў памагаць папу адрывацца — і сам прырос. Прыходзіць стараста і тожа стаў спасаць бацюшку, ды і ён прырос. Прыйшла матушка, а поп крычыць:

— Не бярыся, а то прырасцеш,— пайдзі пазаві шаптуху, штоб памагла нам.

Прыйшла шаптуха, стала шаптаць, ды як возьмецца за качаргу, ды і сама прырасла. Дзіва павалакло іх усіх у лес, к хазяіну, цераз грэблю, дзе быў мост. Выскаквае з-пад маста чорт і гаворыць папу:

— Калі пусціш за царскія дзверы, то я цябе адарву.

Поп абяцаў пусціць. Чорт ўзяўся адрываць папа ад качаргі — і сам прырос. Ідуць усе яны к хазяіну. Прыйшлі на месца, а хазяін высек шэсць дубін — на чорта самую тоўстую, ды і гаворыць к яму:

— А ты чаго тут?

Ды як стаў даваць! Біў-біў, а потым сам узяўся за качаргу — і чорт адстаў. Адарваўшыся, ён пусціўся на сваё месца, адкуль выскачыў, толькі лінію леса выламаў па дарозе. Прыйшла чарга і да папа.

— А ты чаго? — пытаецца хазяін, ды і аб папа пабіў дубіну.

Пусціўся поп бегчы дадому — аж рукавы ды полы матаюцца. Так усіх ён угасціў дубінамі, і ўсе паўцякалі дамоў. А хазяін узяў сваё дзіва на воз, прывёз яго дадому. І цяпер ён жыве з жаной і не нуждаецца ні ў якой страве.

Асілак

Жылі сабе дзед ды баба. Жылі яны ў згодзе: разам гаравалі, працавалі, разам аддыхалі. І былі шчаслівыя, толькі ў адным не было ім уцехі: пражылі ўвесь век і не мелі дзяцей.

— Хто нам на старасці вады падасць? — часта гаварыла баба і хвартухом выціралa слёзы.

— Не плач, баба,— разважаў яе дзед, мо' яшчэ і парадуемся на старасці...

Але вось і радзіўся ў іх такі гожы хлопчык, што ўсе і надзівіцца не могуць.

Расце хлопчык ды сілы набіраецца. І скора ён стаў такі дужы, што яго ні адзін самы здаравенны мужчына не можа пабароць. Вырас Асілак, вабраўся ў сілу і давай збірацца ў свет. Як ні ўпрашвалі дзед з бабаю, каб ён не пакідаў іх на старасці,— куды там!

— Няма чаго мне тут з вамі сядзець ды курэй заганяць.

Я пайду шукаць ворагаў і ці сам загіну, ці ворагаў загублю.

Няма чаго рабіць,— прыбралі дзед з бабаю свайго сынка ў вялікую дарогу і з плачам правялі яго за сяло. Тут яны папрашчаліся і вярнуліся да гасподы, бо далей не маглі ісці, вельмі ўжо былі старэнькія. Увайшоў Асілак — так яго ўсе называлі — у цёмны лес ды так засвісцеў, што аж лісце пасыпалася. Спалохаліся птушкі, пахаваліся ў галіны або ў лом. Спалохаліся дзікія зверы, пахаваліся, хто куды мог. Было ў гэтым лесе сем братоў, сем разбойнікаў. І ніхто не смеў прайсці або праехаць праз той лес. Жылі яны так і нікога не баяліся. Пачулі разбойнікі той свіст і пайшлі проста на Асілка. Тым часам Асілак выйшаў на парасельку, наклаў агню, сядзіць сабе ды на ражэньчыку пячэ сала. Тут яго разбойнікі і абступілі адусюль.

— Якія вы людзі і што вам трэба? — пытае Асілак.

— Хто ты такі, што пасмеў прыйсці ў наш лес? — пытае старшы разбойнік.

— Хто я — пазнаеш, як памераешся са мною сілаю, а лес не твой!

— Гэта наш лес, гэта наша панства. Мы тут тубыльцы з даўніх часоў.

— Вы разбойнікі. Вы разбоем запанавалі гэтым лесам. А я прыйшоў, каб адабраць у вас пушчу і даць усім людзям.

— Гэ, які ты моцны. Давай перша пабораемся, хто з нас дужэйшы.

— Давай.

Узяў старшы разбойнік жалезную булаву ў дзесяць пудоў і стаў перад Асілкам. Асілак азірнуўся кругом, бачыць — непадалёчку стаіць велізарны дуб, што ўтрох не абняць. Ухваціў Асілак таго дуба і вырваў з коранем. Убачылі тое разбойнікі, спалохаліся, давай прасіцца, каб ён не губіў іх.

— Будзь у нас старшым, і тады мы над усім светам запануем.

— Не,— кажа Асілак,— не затым я прыйшоў, каб светам панаваць, а затым, каб аслабаніць свет ад паноў. А хто хоча быць панам над другімі людзьмі, той мой вораг.

І давай тыя сем братоў, сем разбойнікаў, прасіцца, каб Асілак узяў іх к сабе ў таварышы.

— Добра,— кажа Асілак.

І пайшлі яны разам. Ідуць яны сабе ды ідуць ад аднаго сяла да другога. І ўсюды Асілак адно кажа: што ўсе людзі павінны быць вольнымі. У яго адна прымаўка была. Ён яе заўсёды гаварыў:

— Еж хлеб і людзям дай. І — жыві, спажывай, ды людзей не ўжывай...

І пачаў Асілак навучаць, каб людзі жылі ў згодзе ды ў ласцы.

— Тады,— кажа,— ніякае ліха з імі не справіцца, бо згодная грамада, бы адзін вялікі чалавек, вялікі багатыр, дужэйшы ўсіх багатыроў.

Пайшла тая прачутка па ўсяму свету. Спужаліся паны і давай лавіць Асілка. Доўга яны шукалі яго, ды ўсё не маглі знайсці. Але вось тыя сем братоў, сем разбойнікаў, захацелі самі быць панамі. Згаварыліся яны і выдалі Асілка. Паны рады, называюць разбойнікаў сваімі братамі, чапкуюць перад імі і даюць ім маёнткі, многа грошай і ўсялякага дабра. Давай гэта разбойнікі падмаўляць людзей, каб яны выдалі мяцежніка Асілка. Адных падмовілі, другіх застрашылі, а трэціх падпаілі. Ведама, заўжды знойдуцца дурныя людзі, што яны гатовы самі ў вяроўку лезці. Яны і сказалі панам, дзе жыве Асілак. Асілак тым часам нічога не ведаў і лёг на адпачынак. Тут напалі на яго, скрампавалі вяроўкамі і вядуць. Сабралася многа людзей, шкода ім Асілка, ды няма чаго рабіць. Не могуць адабраць у маскалёў добрага чалавека. Вядуць Асілка ў двор, а людзі цягнуцца ззаду. Мужыкі маўчаць, апусціўшы галовы, а бабы плачуць ды божкаюць.

— На каго ж ты нас пакідаеш? Хто ж нам скажа добрае слаўцо?

Тым часам сабралася паноў, што хоць гаць гаці ды па галовах хадзі. Бы ваўкі над падлам завылі, што Асілка злавілі. Смяюцца, жупяць, рукі паціраюць ды якую прыдумаць кару выбіраюць. Адзін кажа — скуру з жывога садраць; другі кажа — ганталёў у цела пазаганяць; трэці кажа — павесіць за язык, каб увесь свет знаў, што пан, то не мужык; чацвёрты кажа — язык адрэзаць ды ногі перабіць, каб не мог па свету хадзіць, не мог гаварыць ды людзей вучыць. Пакуль яны крычалі ды кару прыдумлялі, Асілак страпянуўся, вяроўкі парваў ды й на людзей сказаў:

— Браткі, калі б паноў чорт узяў, тады б свет бяды не знаў, а без гарапашнікаў-мужыкоў не было б ні хлеба ні асьмакоў. А каб гэта ліха зламаць, трэ ўсім, як адзін чалавек, стаць: не грызціся паміж сабою, ды ад ворагаў бараніцца гурбою.

Так сказаў Асілак і знік; толькі клубок агню з таго месца пакаціўся па зямлі.

Спалохаліся паны, стаяць ды дрыжаць. Ачухаліся яны, азіраюцца, бы ваўкі ў ваўкоўні. А Асілак, кажуць, і да тых часоў па свеце гуляе ды людзей навучае... Але, пэўна, хутка тое будзе, што кожны сам сабе панам будзе. Усе людзі будуць роўна гараваць, будуць роўна панаваць.

Іванка-прастачок

У яком-та краю жылі людзі, бы ў раю: гаравалі, працавалі, ды і бяды не мелі. Свет вялікі, зямлі многа, усюды вольна, працуй на хлеб, рабі ды Бога хвалі. І жылі там людзі ў ласцы, у згодзе, увесь дзянёчак працавалі, а аб ночы аддыхалі. А прыдзе бяда,— у згодзе ратаваліся ў прыгодзе: бедным, хворым памагалі, дык і ўсе бяды не мелі.

Толькі вось адкуль узяўся і пачаў сюды лятаць страшны Змей; пачаў лятаць, пачаў дабро цягаць, а нарэшце і людзей хватаць ды к сабе цягаць. Нахватаў ён людзей і давай будаваць сабе харомы. Нахватае адусюль людзей, згоніць іх у адно месца ды і прымушае будаваць харомы, акопваць іх канавамі, абсыпаць валамі ды абгароджваць частаколам, каб ніхто не мог туды ўлезці.

Будуюць людзі, капаюць канавы, насыпаюць валы зямлі, бы горы, і патуль гаруюць, пакуль там і загінуць.

А Змей хватае ды валочыць туды ўсё новых ды новых людзей. Вот набудаваў ён многа такіх агародаў, пралажыў паміж імі шляхі, лятае па іх ды цягае ў агароды і людзей, і людское дабро.

Працуюць людзі, загаруюць што кольвек, а тут наляціць Змей, абярэ ўсё, бы пажар, ды і запрэ ў сябе ў агароды, а людзі пухнуць ад голаду ды мруць, бы мухі. І чым далей, тым горай: няма спосабу, няма ратунку ад ліхога Змея. Тым часам тыя людзі, што іх Змей навалачыў у свае харомы, жаруць сабе людское дабро, нічога не робяць ды толькі сала гадуюць. Дык вот не толькі Змей, але і яны, забыўшы бацькоў ды братоў, пачалі па шляхах вылазіць з агародаў, бы мурашкі з муравейніка, пачалі хадзіць па свету ды адбіраць у людзей іх дабро.

І стала людзям горай ад людзей, як ад Змея, бо ведама, гэтых ліхіх слуг Змея вельмі многа. Яны, бы плойма, усюды находзяць людзей і адбіраюць у іх, што ўбачаць. Няма ў іх літасці — з жывога скуру дзяруць. І пачалі яны лічыць людзей горай гаўяда, пачалі саромецца, што самі яны людзі, пачалі выдумваць сабе ўсялякія назвы. Хто назваў сябе змеем, хто ваўком або мядзведзем ці другім зверам, хто арлом, коршунам ці другою птушкаю, хто якім кольвек дзеравам. Толькі людзей яны называюць проста людзьмі, быццам гэта самае горшае імя. Дык от скуль узяліся паны Свінскія, Ваўкі і другія.

Але вось радзіўся ў тым краю хлапчук. Быў ён вельмі благенькі, вельмі худы: як заняпаў з маленства, дык так і астаўся на ўсё жыццё.

Ні паны, ніхто яго не чапае, бо ён такі нехлямяжны, што

нікому непатрэбны. От ён і вырас ужо, але ўсё грае з дзецьмі бы маленькі. І празвалі яго людзі Іванкам-прастачком.

От узімку сядзіць сабе Іванка-прастачок на печы ды з лучыначак цацкі складвае, а ўлетку пясочак перасыпае з дзецьмі. Так пражыў ён гадоў трыццаць.

От раз сядзіць Іванка-прастачок на зямлі каля прызбы ды перасыпае пясочак, аж ідуць тры старцы. Прыйшлі яны к хаце ды і селі на прызбе аддыхаць. У сяле ні жывой душы — пан усіх выгнаў на работу. Пуста, хоць падпалі. Сядзяць старцы на прызбе, аддыхаюць ды насыпаюць у люлькі тытуню. Хапіліся яны — аж няма агню ды і просяць Іванка, каб ён дастаў агню люлькі закурыць. Пабег Іванка ў хату, набраў у прыгаршні жару ды і прыносіць старцам. Закурылі тыя люлькі, падзякавалі Іванку ды і пытаюць яго, што ён робіць.

— Пясочак перасыпаю,— кажа Іванка,— бо што ні рабі, то ўсё на паноў. А нашы людзі дурныя, цягнуць жылы ды са ўсёй сілы гнуцца, дзела спраўляюць, а ліха маюць, бо паны ўсё к сабе грабуць, з мужыкоў скуры дзяруць, а то і зусім іх к сабе бяруць, за свет заганяюць, б'юць, калечаць, мучаюць, забіваюць і літасці не маюць.

Паслухалі тое старцы, галавамі паківалі, узяліся за струманты ды і зайгралі. Першы раз зайгралі — Іванку розум далі; другі раз зайгралі — у сэрца жаласці нагналі; трэці раз яны зайгралі — язык Іванку развязалі.

Зніклі старцы, а Іванка-прастачок стаў ужо не дурачок, стаў за дзела брацца ды і ў свет збірацца. Зрабіў дудку-весялушку ды зайграў сабе так жаласліва ды так гожа, што не толькі людзі, а зверы і птушкі сталі яго слухаць, сталі ўкруг збірацца.

І пачаў Іванка-прастачок па свеце хадзіць, у дадачку граць, людзей збіраць ды ім праўду казаць. Як зайграе, дык і ўбачаць людзі, што вялікая крыўда на свеце, што адны пануюць, другія гаруюць; адны багаццю лічбы не маюць, другія з голаду паміраюць. І разнёсся ад Іванкавай дудкі голас па ўсяму свету. Пачалі людзі к таму голасу прыслухоўвацца ды розуму набірацца; пачалі думаць ды гадаць, як за праўду пастаяць.

От учулі па палацах той вялікі голас ды і спалохаліся слугі Змея, пачалі яны войска збіраць ды Іванка-прастачка шукаць. Чуюць голас на ўсходзе — шамялях яны туды. Палашы блішчаць, пікі, бы лес, тырчаць, гарматы грымацяць, а Іванка не відаць. Стануць ціха, бы на паляванні, слухаюць, стаяць. Аж тым часам чуюць голас на захадзе — грае дудка-весялушка, грае, людзей навучае. Ідзе пошчак ад сяла да сяла, па полі, па лесе, ад краю да краю. Кінуцца яны на захад, го-

няць коней, бягуць самі, шаблямі звіняць, ды Іванка не спаймаюць. Гудзе дудка, грае: то засвішча, то, бы бусел, заляскоча, то зацягне тонка-тонка, от бы павуціна, то так дробненька шчабеча, што ў паноў аж лыткі затрасуцца, а мароз бяжыць па спіне, быццам мышы туды залезлі ды і скрабуцца пазурамі.

От з тых часоў слугам Змея ні ўдзень, ні ўночы няма спакою, бо бяды яны сабе чакаюць, бы вол доўбні. Дудка свішча, дудка грае; пошчак па свету гуляе, людзей навучае. Яго ні злавіць, ні з гармат не забіць. Ён вольна па свету гуляе, ніякіх загародак не знае; хоць сам без цела, ды вялікую сілу мае. Грае-грае, а як прыдзе час, дык усіх ён параўнае.

Ой, ты дудка мая, весялушка мая!

Чорт-злодзей

Жыў сабе дзед ды баба. Жылі яны пры вялікай беднасці. Калі выпрасяць у каго зярнят, змелюць ды папалам з попелам спякуць прасначок — аб тым і жылі. Вось раз пайшоў дзед у поле, узяў з сабой сваю шаўлюгу і пянькі ўзяў. Паехаў і стаў араць. Араў, араў, захацеў ён есці. Тады ён выпраг сваю шаўлюгу, пусціў на луг, а сам сеў на ўзмежку і стаў з пянькі вяроўкі віць. Віў, віў, ажно прыносіць баба яму прасначок. Палажыў дзед каля сябе прасначок, стаў канчаць вяроўку, аж выскаквае чорт і схапіў прасначок. Дзед зір — няма прасначка! Паглядзіць — аж чорт пабег у балота. Дзед за ім.

Увайшоў ён у палацы ў прыгожыя, аж там дужа многа чарцей. Прыйшоў дзед к старшаму чорту і пытае:

— Дзе мой прасначок?

А ён кажа:

— Шукай у маладых чарцянкоў, бо стары гэтым займацца не будзе!

Дзед кажа:

— Разявайце раты!

Як разінулі, ён і ўбачыў свой прасначок у чарцянка ў роце.

— Во,— кажа,— мой прасначок!

Тады старшы чорт гаворыць таму чарцянку:

— Нашто ты гэта зрабіў? Яны і так бедныя. Вазьмі, дзед, яго служыць к сабе, хай адслужыць!

— Куды я яго буду браць? Што ён будзе ў мяне рабіць, мне самому есці нечага!

Ну, але-тку ўзяў — добра, думае, дроў у лес з'ездзіць!

Прывёў яго дамоў. Дасталі яны сабе жменьку жыта. Чарцянок кажа:

— Давайце мне малоць!

— А не, мы самі змелем, нам самім нечага рабіць!

— Не, давайце!

Аддалі яму малоць. Ён малоў, малоў, ужо і хлеб замясілі, а ўсё поўныя жорны мукі. Сталі яны яе ў засек сыпаць. Сыпалі, сыпалі і насыпалі повен засек. Тады яны думаюць сабе: «Дадзім яму малоць і пшаніцы жменьку!»

Дасталі жменьку пшаніцы ў суседзяў, стаў ён яе малоць і намалоў поўны засек пшоннае мукі. Дасталі яны тады жменьку ячменю; ён і з тае жменькі намалоў поўны засек ячменнае мукі. Жыве дзед з бабаю ўжо ладна!

Сталі яны тады зямлю араць. Чарцянок той туды-сюды павярнуўся — усё поле і ўзараў.

— Што цяпер, дзед, будзем рабіць? Возьмем у пана здзельна ляда высеч ды пасеем пшаніцы!

Узялі яны ляда. Ён яго за адзін дзень высек, узараў і пшаніцу пасеяў. Зарадзілася пшаніца добрая. Сталі дзяліць. Гэты жа чарцянок кажа дзеду:

— Няхай пан возіць вазамі, а я табе буду насіць ношкамі.

Пан сабе думае: «Што то воз, а што то ношка! Усё-ткі воз большы!» Ну, выслаў ён каней. Пан жа ўзяў з поля дзесяць вазоў, а той засіліў усё астатняе ды пацёг.

Тады ён гаворыць дзеду:

— Ну, дзед, паедзем у дровы!

Прывёў дзед яго к лазе, а чорт кажа:

— Не, я гэтых дроў сеч не буду, пакажы мне тоўстых!

Прывёў дзед яго ў бор.

— Ну,— кажа,— цяпер ідзі сабе ў двор, я і без цябе ўпраўлюся!

Пайшоў дзед дамоў, а чорт наваліў калод з карэннем, наклаў на шаўлюгу дроў чуць не пад неба, сеў на воз і вязе, ды так вязе, што і чацверыком не дагоніш! Едзе пан на чацверыку, і прыстаюць коні. Ён тады, той пан, гаворыць:

— Давай мяняць коней!

Чорт кажа:

— Давай!

Памянялі яны коней і паехалі. Прыязджае ён к дзеду на чацверыку.

— Эй, дзед, адчыняй вароты, вязу дровы!

Адчыніў дзед вароты, бачыць чацвярых коней.

— Што ж ты,— кажа,— прыехаў на чацверыку — у мяне ж сена няма!

Пайшоў тады чорт к пану малаціць, сена зарабляць. На біцюк узяў бервяно, на цапілна ўзяў балку і стаў малаціць — тут жа ўсё і памалаціў. Пайшоў к пану.

— Паночак, я памалаціў. Калі будзеце ласкавы, дайце мне чарку гарэлкі!

Пан узрадаваўся.

— А ідзі, міленькі, у склеп! Там гарэлка стаіць і закусіць ёсць чым!

Чорт пайшоў, папіў гарэлку, паеў хлеб, сыр, вяндліну і прыходзіць к пану.

— Дзякуй, паночак, выпіў, закусіў. Ці не далі б мне ношачку сена?

— А вунь там у лесе, за ракой стаіць стог. Ідзі, наскубі сабе ношку.

Чорт прыйшоў, узяў стог абматаў вяроўкамі і панёс. Убачыў войт.

— Ах, паночак, вы казалі ношку наскубсці, а ён увесь стог павалок!

— Ах, каб яго! Выпусціце на яго двух быкоў бадлівых, хай яго забадаюць!

Выпусцілі двух валоў, а чорт тых валоў за вушы, ды на стог і панёс!

— Ах, каб яго! Пусціце скарэй двух парсюкоў, хай яму лыткі абарвуць!

Пусцілі парсюкоў. Ён і тых за вушы, ды на плечы і панёс! Прыносіць, сена на двары пакінуў, а быкоў і парсюкоў у хлеў загнаў. І стаў дзед жыць па-гаспадарску. Праслужыў чорт год і кажа:

— Дзядулька, адпраў мяне дамоў!

— А йдзі, маё дзіцятко, з Богам!

Тады чорт зноў кажа:

— Дзядулька, пусці мяне дамоў!

— Ды ідзі ж, маё дзіцятка, з Богам!

Чорт тады зноў просіць:

— Пусці мяне, дзядулька, дамоў!

А дзед як раззлуецца:

— А ідзі ты,— кажа,— к чорту!

Ён тады зарагатаў і пабег.

Мужык, яго жонка і пан

Жыў сабе ў адным сяле Сенька, і была ў яго жонка, але надта лянівая. Пайшла аднаго разу жаць, нажала сноп і лягла спаць. Выспалася і пайшла дадому. Сенька стаў пытацца:

— Колькі ж ты нажала?

— Капу, ды і злажыла капу.

Пайшла на другі дзень, нажала столькі ж і на трэці дзень нажала столькі ж — усяго за тры дні нажала тры снапы.

Паехаў Сенька забіраць жыта. Прыехаў туды, глядзіць — ажно жонка яго спіць, а жыта нажата ўсяго тры снапы. Ён забраў снапы, жонкі не будзіў, абмазаў яе смалою, абсыпаў пер'ямі і паехаў дадому. Сеньчыха ўстала, паглядзела на сябе, спужалася і сказала сабе: «Гэта ж не Сеньчыха, аднака ж пайду на сяло, калі будуць сабакі брахаць ды дзеці палкамі кідаць, то я ўжо не Сеньчыха». Прыйшла яна на сяло — сабакі не брэшуць, дзеці палкамі не кідаюць; стала счытаць хаты: «Гэта кумава, гэта Навумава, гэта сватава, гэта братава, а гэта Сенькава». Падышла пад вакно і пытаецца:

— Сенька, а Сенька! Чы Сеньчыха дома?

— Дома,— ляжыць на ложку, як ступа.

Пайшла далей. Ніхто ў хату не пускае; зайшла ў пусты млын, села ў кош, сядзіць. Прыйшлі ўночы злодзеі і сталі дзяліць грошы. Адзін кажа: «Мне!» Другі: «Мне!» І трэці кажа: «Мне!» Тады яна бачыць, што ёй усё роўна — бяда ёй прыйшла, і кажа:

— А дзе ж мне?

Злодзеі папужаліся, думалі, што чорт, і разбегліся. А яна набрала грошай і пайшла дадому. Прыйшла і кажа:

— Сенька, Сенька! Адчыні!

— Хто там?

— Я, Сеньчыха!

— Не трэба! У мяне ёсць свая Сеньчыха.

— Не, Сенечка, адчыні, я грошы нясу.

Сенька адчыніў і кажа:

— Дзе ж ты ўзяла?

Яна расказала, як было, ды і кажа, што яшчэ ўсіх не забрала. Сенька пайшоў наперад на раку, усадзіў у нерат зайца, а ў жалезы занёс шчуку, пасадзіў і пайшоў за ёю. Прыйшлі, забралі грошы і пайшлі дадому. Ішлі цераз мост. Сенька кажа ёй:

— Зайдзём, паглядзім нерата на рацэ.

Пайшлі, глядзяць — сядзіць заяц.

— Вот шчасце! — кажа Сеньчыха.

— Пойдзем жа яшчэ,— кажа Сенька,— паглядзім жалезы!

Пайшлі, глядзяць — сядзіць шчука.

— А-а! Вот шчасце! Але разам шчасце,— кажа Сенька.

Прыйшлі дадому і схавалі грошы.

— Ну, глядзі ж, цяпер жа як прыдзеш на месца, дык купі мне шубу янотаву.

— Добра, куплю, як паеду.

Паехаў ён на месца, накупляў абаранкаў, начапляў на дугу, на аглоблі і едзе дадому. Толькі што Сенька прыехаў, Сеньчыха выбегла на двор і пытаецца:

— Ну, што ж, прывёз шубу?

— Ды не!

— Чаму?

— Што было рабіць? Як зайшла абаранкава хмара, было забіла — насілу ўцёк.

— Ну, глядзі, як паедзеш у другі раз, дык ужо купі!

— Куплю.

Паехаў Сенька ў другі раз і ізноў прыехаў без шубы.

— Чаму ж не купіў? — пытаецца Сеньчыха.

— Калі пан на месцы ўкраў кілбасу, дык яго білі па насу, дык і я спужаўся і насілу ўцёк.

— Ах, няшчасце! Ну, глядзі ж, як паедзеш ізноў, дык ужо, канешне, купі! — прыказвае Сеньчыха.

Паехаў Сенька трэці раз, купіў валову шкуру і прыехаў дадому. Сеньчыха выбегла на двор і пытаецца:

— А што ж? Купіў?.. Дзе?

— А вот я нясу ў хату.

Прынёс, надзеў на яе валову шкуру, і яна пайшла ў царкву. Усе людзі там разбегліся па кутках. Яна глядзіць і дзівіцца,— падышла к сваёй куме і кажа:

— Што гэта, кумка, людзі ад мяне ўцякаюць?

— Але, кумка, гэта ж ты валову шкуру надзела.

— Гэта ж мне Сенька купіў, казаў, што янотава шуба. Пайду ж скажу пану, што ў яго ёсць багата грошай.

Пайшла і сказала. Пан прызваў к сабе Сеньку з Сеньчыхай і гаворыць:

— Што ж ты, Сенька, грошы маеш, а падаці не плаціш?

— Дзе ў мяне, пане, тыя грошы? Мала што яна наманіла!

— А я кажу прыметы,— кажа Сеньчыха,— як мы неслі грошы ды бачылі...

— От слухай, пане, што яна, шалёная, будзе гаварыць.

— А што ж, не выцяглі мы зайца з нерата на рацэ, а шчуку з жалез?

— Бач, пане, што яна кажа.

— А ты ж казаў, як ты ездзіў на месца купляць шубу, ды як абаранкава хмара найшла, дык ты насілу ўцёк, ды як пан быў на месцы, украў кілбасу і яго білі па насу; ды ты мне гаварыў?

— Чуеш, пане, чы гэтаму была праўда, што яна, шалёная, кажа?

Раззлаваўся пан, казаў набіць Сеньчыху і прагнаць яе вон. Прапалі яе і грошы, і шуба. А Сенька спажыў яе грошы і пасля яе смерці ўзяў сабе маладую і разумную жонку.

524

Як лянівая дачка рабіць навучылася

Была ў адных бацькоў вельмі лянівая дачка, нічога рабіць не ўмела ды і не хацела. На ўсё адказвала: «Не ўмею». Вось так і выросла яна. Прыйшоў час і замуж дачку аддаваць, а бацькі бядуюць, як яна ў чужыя людзі пойдзе. Прыехалі сваты, а бацька цішком і кажа свату, што аддаць то мы аддадзім, але ж яна рабіць нічога не ўмее. Пачуў гэта бацька маладога і кажа: «То нічога, мы яе навучым».

На другі дзень пасля вяселля ўсе з раніцы ўзяліся за работу, толькі маладая нявестка ні за што не бралася, думала, што будзе, як і дома. Прыйшоў час палуднаваць, свёкар і кажа:

«Ну, хто што рабіў, ідзіце есці».

А яе не завуць. Самой жа ісці брыдка, бо нічога не рабіла.

Увечары паўтарылася ізноў тое самае. Прагаладалася нявестка і заснуць ніяк не можа. Усё чакае, каб скарэй раніца наступіла, тады ўжо, хоць і не ўмеючы, будзе рабіць што-небудзь, абы пад'есці ёй далі.

Раніцай яна паднялася з пасцелі разам з свякрухай і свёкрам, узяла венік, пачала месці падлогу і пытае:

— Тата, а падлогу месці — гэта работа ці не?

А свёкар адказвае:

— Работа, дачушка, работа.

Пытае далей:

— Тата, а ваду несці — гэта работа ці не?

А свёкар зноў адказвае:

— Работа, дачушка, работа.

І яна гэтак да абеду* не прысела, усё старалася, каб што-небудзь зрабіць.

А ў абед свёкар зноў гаворыць: «Ну, хто што рабіў, ідзіце есці».

Тут і яна ўжо таксама прыйшла, бо рабіла ж. І так пайшло дзень за днём.

Прыходзіць адзін раз бацька праведаць дачку. Сеў на лаве і гаворыць з свёкрам. А калі той недзе выйшаў, дачка падбегла да бацькі і кажа яму ціхенька:

— Тата, ты так не сядзі, хоць палу кажуха тры.

А бацька і пытаецца:

— А чаму, дачушка?

А яна адказвае:

— У нас есці таму не даюць, хто нічога не робіць, а кажух церці таксама работа, абы так не сядзець.

Прыходзіць свёкар, а бацька і пытаецца:

— Ну, то як мая дачка, робіць яна што ці не?

— Усё, усё робіць, навучылася!

Як мужык хітра гуся падзяліў

Адзін бедны мужык прынёс да пана гуся і просіць, каб пан даў за яго шуфель жыта. Дык пан кажа:

— Ну, нас семера: я, пані, двое сыноў і двое дачок. Падзеліш ты на нас усіх гэтага гуся?

Той падумаў:

— Добра,— кажа,— пан галава ў даму, то пану будзе галава; пані будзе шыйка, бо першая за панам; паненкам будзе па ножцы, каб лёгка танцавалі, панічам па крылышку, каб красіва пісалі, а я, мужычышча, вазьму сабе кадлубішча.

— Ну,— кажа пан,— хітры!

Гуся яму аддаў і ўжо не адзін шуфель жыта, але можа якіх даў з пяць. Прынёс мужык жыта, а брат як даведаўся, дык узяў дзве гусі, занёс да пана і просіць таксама жыта. Пан кажа:

— Добра, але падзялі ж ты нас.

Той падумаў і кажа:

— Пану будзе гусь і пані будзе гусь.

— А маім дзецям?

Дык той і не ведае, што рабіць.

— Ідзі ж,— кажа пан,— па свайго брата, ён нас раздзеліць.

Пайшоў ён па таго, прыходзяць, дык пан кажа:

— Падзялі ты нас, бо твой брат дурны якісь, не дасць рады.

Той падумаў трошкі і кажа:

— Ці пан верыць у святую тройцу?

— Цо табе гэта, альбо ж я не католік?

— Ну, калі так, то пан, пані і галоўка — то святая тройца; дзве паненкі і ножка — і то святая тройца; двое панічоў і скрыдэлька — і то будзе святая тройца, а мужык і дзве гусі, то таксама святая тройца.

Так пан аддаў яму гусі і жыта, колькі ён хацеў, а брата прагнаў вон. От які мужык быў мудры!

Кацярына

Жыў-быў дзед. У яго была дачка Кацярына. Адзін раз дзед пайшоў у лес і найшоў там залатую ступу, прынёс дамоў і кажыць дачцэ:

— Дачушка! Я гэту ступу аднясу пану.

— Не нясі, татулька, пану, бо пан, узяўшы яе, захочыць і таўкачы.

Толькі дзед не паслухаў дачкі, панёс ступу пану. Калі дзед

прынёс ступу, пан выйшаў на двор, паглядзеў яе і сказаў дзеду, каб к ступе былі таўкачы. Дзед заплакаў і пайшоў.

Прыйшоў дзед дамоў і кажыць дачцэ:

— Праўду ты казала, што пан захочыць і таўкачоў.

Тады Кацярына гаворыць бацьку:

— Ідзі, бацьку, і скажы пану трох дуракоў: адзін, што пацяраў ступу, другі, што знайшоў, а трэці — ты, пан, што ўзяў ступу і хочаш яшчэ таўкачоў.

Дзед пайшоў і сказаў. Тады пан гаворыць:

— Дзед, твая дачка Кацярына разумна. На табе жменьку лёну, знясі яго сваёй дачцэ, няхай яна мне гэты лён спрадзець, саткець і здзелаець мне к вечару рубашку.

Дзед заплакаў і пайшоў дамоў.

Прыйшоўшы, ён сказаў дачцэ, што прыказаў пан. Тады дачка дала дзеду палачку і сказала:

— На табе, татулька, гэту палачку, аднясі яе к пану і скажы яму, штоб ён мне перша здзелаў усё прыпасы для таго, штоб можна было ткаць.

Дзед пайшоў і аддаў пану палачку. Пан узяў яе і сказаў:

— Разумна, брат, твая дачка Кацярына.

Пасля гэтага пан узяў дзесятак яец, зварыў іх і сказаў дзеду:

— Штоб твая дачка пасадзіла курыцу на гэтыя яйкі і штоб цераз дзве нядзелі былі цыпляты.

Дзед заплакаў і пайшоў дамоў.

Прыйшоўшы, аддаў дачцэ яйкі і сказаў, што пан прыказаў.

Тады дачка ўзяла гарнец ячменю, зварыла яго і сказала бацьку, штоб ён яго аднёс пану, штоб ён яго пасеяў, зжаў, змалаціў і надраў круп, каб было чым карміць цыплят.

Дзед пайшоў і аддаў ячмень пану. Пан тады сказаў:

— Разумна твая дачка Кацярына, але ты ёй скажы, штоб яна ка мне ні прыйшла, ні прыехала, ні сытая, ні галодная, ні голая, ні адзетая.

Дзед пайшоў і кажа гэта Кацярыне. Яна тады ўзяла наварыла жыдкага кісялю, нахлябалася яго, укруцілася ў сетку, узяла труса, села на казла і паехала к пану. Толькі што пан з акошка ўвідзіў Кацярыну, вялеў напусціць на яе сабак. Як толькі сабакі кінуліся на яе, яна зараз кінула ім труса, а сама на казле пад'ехала пад крыльцо к пану. Пан выйшаў к Кацярыне, гаворыць:

— Я ж табе казаў, што б ты ні прыйшла, ні прыехала, ні сытая, ні галодная, ні голая, ні адзетая.

— А я ж так кісялю паела, сець надзела і на казле прыехала.

— Ну, будзем, Кацярына, жаніцца,— сказаў пан.

— Будзем, паночак.

— Толькі ты, Кацярына, мой суд не перасуджвай.

— А пан на мяне «брэдзіш» не скажа.

Вот яны і ажаніліся і жывуць. Толькі раз, у навозную талоку, у аднаго мужыка жарабілася кабыла, а жарабёнак падкаціўся пад калёсы. Тады мужыкі началі спорыць. Адзін гаворыць: «Мая кабыла жарабілася», другі: «Мае калёсы». І пан гаворыць: «Калёсы жарабіліся».

Тады Кацярына сказала, штоб калёсы і кабылу пусцілі з гары, за кім пабяжыць жарабёнак, таго кабыла. Пан кажа:

— Кацярына! Ты мой суд перасудзіла.

— На ночы ў майго бацькі,— сказала Кацярына,— куры, узлезшы на дом, клювалі звёзды, а шчукі, вылезшы з вады, сабіралі гарох.

— Што ты брэдзіш?

— Во, пан, на мяне сказаў «брэдзіш».

— Будзем, Кацярына, разжэньвацца.

— Будзем, паночак.

Тады Кацярына ўзяла напаіла гарэлкай пана, палажыла яго ў лодку і паехала з ім па рацэ.

Толькі пан прачнуўся і гаворыць:

— Вернемся, Кацярына, у двор.

Пасля гэтага пан і Кацярына сталі жыць і пажываць умесце.

Пану навука

Слухайце, бо скажу вам не казку, а шчырую праўду. Дзе тое было, цяпер я забыўся, бо ўжо, бачыце, старасць. А ведама, калі з чупрыны гінуць валасы, то і памяць з галавы. Вось я забыўся, што сёння абедаў. Не памятую. А мо' і нічога. Трапляецца і гэтак. Кажуць жа: «Часам з квасам, а парою з бядою, ці то з вадою». Цяпер ліха, жалюцца маладзічкі, а даўней было гарэй. Вы таго не памятаеце. Не вельмі даўно тое было, яшчэ за паншчыну.

Добра, калі трапляўся добры пан. Але дзе трапляліся такія добрыя паны? Больш былі не паны, а звяр'ё паганае. Як трапіцца такі паганы пан, то хоць лажыся ды памірай,— нічым яму не ўгодзіш. Кажуць жа: «Зачыні чорту дзверы, то ён праз вакно». Гэтак і люты пан. Ты яму годзіш, шчыра робіш, а ён табе ўсё крычыць: «Не так, шэльма, не так, галган, не так, псякрэў»,— і есць цябе поедам, есць, зневажае, здзекваецца. А чуць што — жыўцом скуру злупіць. Ой, цяжка, вельмі цяжка было за лютымі панамі. А ліхія паны былі ўсе.

Вось жа ў адным дварэ быў такі ліхі пан. Чаго толькі ён

ні вычвараў! Як толькі ён ні здзекваўся над людзьмі! Сек ён і мужыкоў і баб, старых і малых. Расцягнуць маладзіцу або дзеўку, камісар тыча пальцам ды й кажа: «Лупі!» Хурман пачне пярэсціць, што аж пара валіць. Не аднаго ён засек насмерць і нікога не баяўся. А людзей ён лічыў гарэй сабак. Што ён вычвараў над маладзіцамі ды дзеўкамі, дык сорам казаць... Не мог той паганы пан ужо больш нічога прыдумаць, каб паздзекваццца над людзьмі, вось і вялеў ён, каб мужыкі прыводзілі на продаж валоў толькі ў двор. А па канцах сяла паставіў рагаткі ды не пазваляў праехаць к мужыкам ніякаму купцу. Вось і павялі людзі ў двор валоў на продаж. Але прывядзе хто вала, а пан і кажа:

— Што ж ты прывёў, асёл? Гэта ж не вол, а казёл.

І заплаціць бы за казла, а то яшчэ пашле на стайню ды ўсыпле паўсотні гарачых. Доўга мучыліся бедныя мужыкі з такім панам. Доўга цярпелі, бо што зробіш, каму пажалішся. Ведама, паны за панамі і цягнуць. Але вось знайшоўся адзін чалавек, што адплаціў таму пану за ўсе людскія слёзы ды за крыўду. Вось як тое было.

Быў там удалы, здатны хлопец. Рана ён асірацеў, але і адзін-такі ўзбіўся на гаспадарку. Горды быў хлопец. Ніхто яго ніколі і пальцам не зачапіў. Толькі вось ён прыводзіць у двор на продаж вала. Убачыў пан, выйшаў на ганак ды і кажа:

— Што ж ты прывёў, асёл? То ж не вол, а казёл.

Пазірнуў той дзяцюк, што блізка нікога няма каля пана, паказаў яму папліску ды і пытае:

— Што гэта, пане, бяроза ці лаза? Я ж прывёў табе вала, не казла.

І давай пярэсціць, давай дубасіць пана тою папліскаю. Рэзаў-рэзаў, пакуль сам здаволіўся.

— Вось жа табе, пане, за тое, што ты людзей мучыш. Калі вычухаеш гэта, то чакай мяне яшчэ другім разам, тады здыму з цябе скуру.

Сказаў гэта дзяцюк ды і ўцёк у лес. А ведама, якія даўней былі цёмныя ды густыя лясы. У іх жыві, колькі хочаш, ніхто цябе не трапіць. Знайшла дворня пана без памяці — так вымесіў той дзяцюк. Толькі на трэці дзень трохі ачухаўся пан і вялеў злавіць Рымшу — так звалі таго дзецюка. Ды куды там, яго і след ветрам замяло. Амаль тыдняў сем пракачаўся пан, чуць чорту душу не аддаў. Якіх толькі дактароў не справаджалі — нічога не парадзяць, бо яму, мабыць, Рымша адсадзіў печанцы. А што ўложыць хам, то не выйме і пан.

Але вось па немалым часе прыехаў у двор якісьці венгерац. У яго ўсялякіх зелляў, усялякае лякобы! Рад пан, чапкуе,

просіць таго доктара, каб яго палячыў. Пагасцяваў доктар у дварэ і давай лячыць пана. Вялеў гэта ён напаліць лазню. Павёў пана туды. Пасадзіў яго на лаўцы і казаў аберучкі дзяржацца за жэрдачку, а сам пачаў націраць пана ўсялякімі мазямі. Сядзіць пан, трымаецца аберучкі за жэрдачку ды толькі крэкча. Але нядоўга ён так сядзеў: выцягнуў доктар з кішэні сыромец, прывязаў ім к жэрдачцы панскія рукі, заткнуў пану вехцем горла, узяў хварасціну ды і кажа:

— Што гэта, пане, бяроза ці лаза? Я ж прадаў табе вала, не казла.

Бачыць пан, што гэта Рымша, а не доктар, хоча крычаць, ды не можа, бо вехаць у роце. Круціцца пан, бы ўюн на гарачай скаварадзе, а Рымша дастаў з-пад палы канчук і давай хрысціць паганага пана па чым папала. Лупіў-лупіў, амаль не ўсю скуру садраў, ды і давай пасыпаць пана соллю. Самлеў пан ад болю. А Рымша сеў на коней ды паехаў сабе. Толькі яго і бачылі. Доўга хварэў пан, чуць не паўгода пракачаўся. Усе думалі, што ўжо яму прыйшлі канцы, але ліхога і смерць не бярэ: к вясне вычухаўся пан і хацеў ехаць за граніцу на воды, ды бачыць — грошай няма. От уздумаў ён прадаць лес. Пайшла пагалоска, і пачалі купцы аглядаць лес. Таргаваліся яны, таргаваліся, ды не сходзяцца аб цану, бо пан вельмі даражыўся. Толькі вось прыехаў якісьці вельмі багаты купец. Павёў яго пан аглядаць лес. Хваліць пан лес, а купец толькі ўсё адводзіць пана ў гушчарню ды ў нетру. Забраліся яны ў такую гушчэчу, што і свету божага не бачна. Купец давай абнімаць хвоі, сажнем мерыць таўшчыню. Абхапіў і пан адну хваіну, а купец хуценька выхапіў з кішэні сыромец ды і прывязаў пана да хвоі. Бачыць пан, што тут не пярэліўкі і хацеў крычаць, званць на ратунак, але так спалохаўся, што няма голасу. Паказаў яму купец папліску ды пытае:

— Што гэта, бяроза ці лаза? Я ж прадаў табе вала, не казла.

Дагадаўся пан, што гэта Рымша. Тым часам Рымша запхаў пану мохам рот ды і давай пярэсціць па чым папала ды прыказваць, каб больш не здзекваўся над людзьмі. Біў-біў Рымша пана — чуць насмерць не забіў, ды так і кінуў прывязаным да хвоі. Так да вечара і ўсю ноч правісеў пан на хвоі, пакуль дворня знайшла. От тут ужо пан цэлы год пракачаўся: усё не можа выздаравець. Няма ачунку, вось і радзяць пану ехаць на воды. Прадаў пан гэты лес, прадаў збожжа ды гаўяда, сабраў многа грошай ды і давай выладжвацца на воды. Тым часам Рымша ўсё цікуе за панам. Толькі пан выехаў з двара ды ўехаў у лес, як Рымша ўжо зрабіў на яго пастку. Паставіў ён на дарозе ганоў на трое адзін ад другога двух конных хлапчу-

коў з доўгімі папліскамі. Толькі пад'ехаў пан, як першы хлапчук трасе папліскай ды крычыць:

— Што гэта, пане, бяроза ці лаза?

А сам па каню ды наўцекача.

— Лапайце, лапайце! — крычыць пан,— то ж галган Рымша.

Фурман адрэзаў пастронкі, сеў на каня ды і пагнаўся за хлапчуком. Але той сунуў у лес і, чорт ведае, куды дзеўся. Фурман папёр дарогаю ўперад мо' вёрст дзесяць. Тым часам заехаў упярод перад панам другі хлапчук, паказаў папліску ды і пытае:

— Што гэта, пане, бяроза ці лаза?

— Лапай, лапай яго, галгана! — крычыць пан на лакея,— то ж Рымша!

Ускочыў лакей на другога каня ды і пагнаўся за хлапчуком. Астаўся пан адзін. Тут Рымша высунуўся з-за выскаці ды і паказаў пану папліску:

— Што гэта, пане, бяроза ці лаза? Я ж прадаў табе вала, а не казла.

І давай дубасіць ды пярэсціць пана тою папліскаю. Збіў Рымша пана на горкае яблыка, забраў усе грошы ды і пайшоў сабе ў лес у сваю зямлянку. Кажуць, потым Рымша многа дабра рабіў людзям. Яшчэ да гэтых часоў у цёмным лесе сярод балота стаіць гара. Яе называюць Рымшаваю гарою. Гэта паміж Заполлем і Навасёлкамі. Дык, кажуць, там жыў той Рымша. Ён дзесь схаваў многа грошай, але нельга знайсці. Зямлянку тую я сам бачыў, як хадзіў туды ад пана з картаю. Каб пашукаць, мо' і грошы ёсць.

Мужык і пан

Адзін мужык убачыў у памешчыка харошую свінню з парасятамі. Ён пайшоў і стаў кланяцца свінні. Гэта відзела пані з балкона. Яна паслала лакея спрасіць, чаму ён свінні кланяецца. А той кажа:

— Гэта мая Рапка жэніцца, а ваша Белка маёй Рапцы родная цётка, дык я заву на вяселле, а яна ўсё кажа: «Не хачу!»

Лакей пайшоў і расказаў пані. Тая рассмяялася і сказала прызваць мужыка. Мужык прыйшоў. Тады пані і кажа:

— Што ты нашай свінні кланяешся?

— А во што: у мяне ёсць Рапка, а ваша Белка ёй родная цётка, дык мая Рапка жэніцца і просіць вашай Белкі на вяселле,— вот я і прыйшоў прасіць, а яна кажа: «Не хачу!»

— Ха-ха-ха!.. Ну дык як жа ты яе павядзеш,— кажа пані.— Ці павязеш?

— Не, павяду, калі пойдзе,— я прыйшоў.

— А парасяты як будуць?

— І з дзеткамі, прасіла Рапка, штоб пусцілі.

— Ну, дык я скажу, штоб запрэглі каня і палажылі Белку, а калі не захоча ляжаць, то прывязаць, а парасят у мяшок.

Пані прыказала запрэгчы каня, палажыць на воз свінню і парасят і даць мужыку.

— Ці скора ты назад прывязеш?

— Скора, мая панічка.

Мужык сеў і паехаў. Пана не было ў дварэ. Як прыехаў пан, так пані яму кажа:

— У нас быў мужык, ён нашай Белцы кланяўся, прасіў на вяселле. Я яе пусціла і каня дала ехаць.

А пан кажа:

— Во дурная, мужык абманіў: прападзе і конь, і свіння з парасятамі. Скарэй коней давайце!

Далі тройку з колакалам. Пан сеў і пытае:

— Куды мужык паехаў?

— А во сюды,— кажуць людзі,— і паказалі пану дарогу. Пан туды і паехаў. А мужык пачуў колакал, звярнуў у лес. Там забіў свінню з парасятамі, каня прывязаў, а сам выйшаў на дарогу, наклаў кучу памёту, накрыў шапкай і сядзіць. Едзе пан.

— На бок! — крычыць панскі кучар.

— Не, паночак, не! Едзьце вы сабе на бок,— мне не можна!

Пан сказаў кучару аб'ехаць мужыка. Мінуўшы мужыка, пан астанавіўся і спрашвае:

— Ці не бачыў ты, мужычок, тут мужыка, едучы і везучы свінню з парасятамі?

— Бачыў, паночак, ён тут нядаўна ехаў.

— А ці знаеш, куды ён паехаў?

— Знаю.

— Пакажы ж нам дарогу.

— Не, паночак, не! Мне і з месца няможна сыйсці. Калі хочаш, то я вам дарогу скажу: вы будзеце ехаць прама, потым завароціце крута-крута ўправа, а там крута-крута ўлева і так далей.

Пан і спрашвае ў кучара:

— Ці паняў ты?

— Не, пане!

— І я не паняў.

Тады пан спрашвае ў мужыка:

— Ці дагнаў бы ты яго?

— Чаму не, пане? Я яго зараз бы прыцяг к вам.

— Ну, дагані, я табе заплачу.

— Не, Божа сахрані! Мне з месца няможна сыйсці.

— Чаму ж табе няможна сыйсці? Што ты тут робіш?

— Гэта, паночак, ехаў мой пан і сустрэўся з знакомай паняю, і тая пані падарыла яму шчыгла. Дык пан сказаў мне яго дзяржаць, пакуль ён будзе ехаць назад.

— Ну, дык ты едзь з маім кучарам, а я буду вартаваць.

— Не, пане, не хачу; тады мне ад пана жыцця не будзе, як ты ўпусціш шчыгла.

— Я не ўпушчу.

— Не, пане, не паверу.

— Ну, дык я буду вартаваць з фурманам, а ты едзь адзін.

— Не, не хачу!

— На табе сто рублёў, едзь!

— Не, баюся, пане: вы пусціце шчыгла.

— Ды не пусцім жа!

Мужык узяў сто рублёў і сеў ехаць. А пан спрашвае:

— Ці скора ты вернешся?

— Цераз час, паночак, я тут буду.

Мужык паехаў. Па дарозе ён адчапіў колакал, заехаў у лес, узяў каня з свіннёю і парасятамі і паехаў.

Пан з кучарам прачакалі час — мужыка няма, прачакалі другі — яго няма. Тады кучар кажа:

— Пані была дурная: аддала каня з свіннёю і парасятамі, а пан яшчэ дурней: аддаў тройку коней і сто рублёў.

А пан кажа:

— Што ты, мужык, дурню! Як я зраблю аб'яўленне, чый шчыгол, так і найду вара.

Стала сонца заходзіць, а кучар кажа:

— Не хачу ўжо сядзець,— я есці хачу, хадзем у двор.

А пан кажа:

— Ну, дык ты бяры шчыгла, а я буду падымаць шапку.

Трохі падумаўшы:

— Не, ты ўпусціш; ты падымай шапку, а я буду браць шчыгла.

Кучар узяў за вяршок шапкі, а пан абедзве рукі падсунуў пад шапку.

Кучар як падыме шапку, дык пан разам абоймі рукамі як хваціць,— дык прама ў памёт. Тут як закрычыць:

— А дурань! а галган! во шчыгол!..

Кучар кажа:

— Я гаварыў, што пані дурная, а пан дурней.

А пан крычыць:

— На адсячы мне рукі! Што мне зрабіць?

— А што вам, пане, зрабіць — абатрыце аб траву.

Пан так і зрабіў, і пайшлі яны ў двор. Прыйшоўшы, пан і кажа пані:

— Ты дурная: аддала каня і свінню з парасятамі, а я дурней: аддаў трох коней і сто рублёў, а яшчэ рукі ўпэцкаў, хоць адсеч трэба.

Пані рассмяялася. А мужык і цяпер ездзіць на панскіх конях.

Асцярожны пасланец

Быў сабе адзін пан ды такі паганы, злосны, што проста бяда — ніхто не мог яму ўгадзіць. Усе яго баяліся, бы чорта. Бывала, як прыдзе к яму хто чаго кольвек прасіць, а ён раптоўна як крыкне:

— Што скажаш?

Дык той кажа:

— Усё добра, паночку.

А сам дрыжыць, бы асіна.

— А па добрым што? — закрычыць пан.— На канюшню яго, галгана!

От так не дасць і слова прамовіць. Іначай ён і не ўмеў з людзьмі гаварыць. І баяліся ж людзі гаварыць таму пану што-небудзь кепскае, не пад гумар — засячэ, усю скуру зніме, калі хто не патрапіць сказаць яму так, як ён хоча, а скажа не па шэрсці. Толькі быў адзін нехлямяжны мужычок, звалі яго Стопкам; той умеў з тым панам гаварыць.

Раз той пан граў у карты ды і выйграў вельмі харошы маёнтак. От гэтак вясною, каля Міколы, паехаў пан аглядаць той маёнтак ды і астаўся там на ўсё лета. Бачыш, яму вельмі спадабаўся той маёнтак. Праўду ж кажуць, што новае сітка на калочку вісіць, а старое пад лаваю ляжыць. Бачыць аканом, што доўга пана няма, а тут у дварэ бяда на бядзе едзе ды бядою паганяе. От ён стаў думаць, як бы паведаміць пану. Думаў-думаў ды і надумаўся паслаць к пану пасланца. Толькі не ведае, каго паслаць, каб ён добра расказаў пану пра ўсё нячасце. Каго ні пашле, усе не слухаюць, баяцца пана, каб за праўду не засек. Абяцаў ён вялікі гасцінец таму, хто пойдзе к пану. Перабраў усё сяло — няма ахвотнікаў. Не знае аканом, што рабіць — сядзіць ды ломіць рукі. Прачуў пра тое Стопак, пайшоў к аканому і кажа:

— Я пайду к пану і ўсё яму скажу: я ўмею з ім гаварыць.

Рад аканом, чуць не цалуе Стопка. От аканом даў Стопку цэлую жменю грошай, чобаты з сваіх ног і пасылае яго к пану ў новы маёнтак. Ідзе Стопак і ні аднае карчмы не мінае.

Ці доўга ён ішоў, ці мала, толькі вось прыйшоў у новы двор. Падыходзіць к пакоям, аж там сустракае яго лакей.

— Ты чаго тут шляешся, валацуга? — крыкнуў лакей на Стопка і давай яго цкаваць сабакамі.

Стопак дастаў з вярэнькі кусок сала і кінуў яго сабакам. Сабакі годзе брахаць. Тым часам Стопак узышоў на ганак.

— Што табе трэба? — пытае лакей зноў.

— Мне трэба бачыцца з панам,— кажа Стопак,— прыйшоў я, паночку, з старога панскага двара.

— Добра,— кажа лакей,— я скажу пану аб табе, але скажы ж ты мне, адкуль ты знаеш, што я пан.

— Адтуль знаю, бачу: ты пан, не пан, а так сабе палупанак, бо ў цябе нос нізкі, лоб слізкі, от і бачна, што лізаў панскія палумескі.

Хацеў лакей схапіць Стопка за каўтуны ды, як кажуць, паслаць яго з валаснога ўпраўлення ды ў земскі суд, але тут якраз лакея пазваў к сабе пан.

— Які там хлоп? — пытае лакея пан.

— То пасланы ад пані з панскага маёнтка.

— А пакліч яго.

Пабег лакей зваць Стопка к пану, а Стопак тым часам дастаў капшук, напхаў у люльку тытуню, выняў з магалейкі губку і крамянец, узяў цагало і давай красаць агонь. Выкрасаў ён агню і давай курыць люлечку. Курыць сабе ды паплёўвае на чысты памост.

— Ідзі, цябе пан кліча,— кажа лакей.

— Не трасца трасе, хай абажджэ,— кажа Стопак і пакурвае сабе люлечку.

— Прэндзей ідзі!

— Зараз, зараз, толькі люльку дакуру.

Ждаў, ждаў пан Стопка, не даждаўся. Гоніць зноў лакея па Стопка. А Стопак агінаецца ды шавеліцца, бы мокрае гарыць.

Дакурыў ён люльку, выбіў з яе попел, схаваў за пазуху і толькі тады памаленьку пасунуўся к пану. Лакей, бы сабака, бяжыць наперадзе ды адчыняе дзверы. Улез Стопак к пану ды і закашляўся. Кашляе Стопак, а пан чакае ды толькі вусы круціць.

— Дзень добры, паночку!

— А цо повеж? — пытаецца пан.

— Усё добрае, паночку.

— А па добрым цо?

— Ды от, паночку, мяне прыслаў аканом. Панскі сцізорык зламаўся.

— Які сцізорык?

— Ды гэта ж той, што пану пер'і рабілі.

— Як жа яго зламалі?

— Кажуць жа, пане, што без нажэндзя і вошы не заб'еш.

Але ўсялякае нажэндзе пры рабоце псуецца, от так і панскі сцізорык. Хацелі пану на боты злупіць з выжла скуру, узялі сцізорык, але на панскім выжлу вельмі моцная скура — сцізорык і зламаўся.

— Якего выжла — цо ты пляцеш, галган?

— Панскі выжал, той самы, можа пан памятае, ён яшчэ ўскочыў у калодзеж, а Мікіту паслалі даставаць, ды ён і ўтапіўся там. Эге ж, той самы выжал, што пан любіў яго браць на паляванне. Э-э-ж, дай Божа памяць, здаецца мне, што пан аддаў за таго выжла суседняму пану трох мужыкоў.

— Цо ж, мой выжал здэх?

— Здох, пане.

— З чаго ж ён здэх?

— Кажуць, паночку, быў здароў, але як каніны аб'еўся, дык разам і ногі выпруціў.

— Якой каніны?

— Ды мяса ж жарабца.

— Якога жарабца?

— Панскага буланага жарабца, з лысінаю.

— Цо ж, і ён здэх?

— Здох, паночку... А шкода, добры быў жарабец.

— О, я няшчэнслівы!

— Э, пане, чаго вельмі турбавацца? Ужо ж ведама, калі жарабятка ўродзіцца з лысінаю, то яно ці здохне, ці яго воўк з'есць.

— А чаго ж жрэбец здэх?

— Падарваўся, мабыць.

— Цо ж на нім робілі, прэнтко ездзілі, чы цо?

— Не, пане, на ім не ездзілі, заўсёды ён стаяў на стайні.

— А цо ж?

— Ваду, пане, вазілі.

— Але ж на цо была та вода?

— Людзі ж кажуць, паночку, што як топішся, то і за брытву хопішся. Як загарэўся ў двары свінух, дык аканом вялеў і на жарабцу ваду вазіць.

— Цо ж і свінух спалілсе?

— Згарэў, паночку.

— Як жа ён запалілсе?

— Бачыш, пане, ён быў блізка каля аборы, от ад яе і загарэўся.

— То і абора спаліласе?

— Гарэла, пане, як свечка.

— З чаго ж яна запаліласе?

— От гэтага, паночку, добра не ведаю: ці ад абозні, ці мо' ад пакояў.

— Езус, Мар'я, то і пакоі спаліліс̀е?

— Згарэлі, пане, суздром усё знікла, от як бы хто языком злізаў.

— І вшыстэк двор спаліл̀се?

— Увесь, пане; чыста, гладка, хоць рэпу сей.

Ухваціўся тут пан за галаву і давай божкаць.

— Але з чаго запаліліс̀е пакоі? — пытае зноў пан Стопка.

— Ад свечак, пане.

— Для чэго ж палілі свецы?

— Ну, як жа, пане, ведама, заўсёды свечкі паляць, як хто памрэ.

— Цо?.. Хто ж там змарл?..

— Вечны пакой, каб ёй на тым свеце лёгка ікнулася,— пані памёрла.

— Цо-цо-цо ты гадаеш, пані змарла?.. О, я няшчэнслівы!

— Чаго ж пан плача? Пану ж Бог даў і прыбытак.

— Які? Гадай прэндзей!

— Пану Бог даў унука. Большая паненка сына мела. Гожы, кажуць, хлапчук, ці то паніч, выліты панскі хурман Мікіта.

...Пачуўшы тое, пан звалiўся з крэсла, а Стопак пайшоў сабе ў пякарню падвячоркаваць. Дык вот які быў Стопак і як ён умеў з панамі гаварыць.

Не люба — не слухай

Адзін пан дужа любіў слухаць казкі. Раз і прызваў ён мужыка гаварыць казкі. І кажа яму пан:

— Вот талерка золата; калі скажаш ты мне такую казку, каб не было ў ёй ні слова праўды, каб я сказаў на цябе «лжэш», дык тады аддам табе гэту талерку з золатам.

І пачаў мужык.

— Чаго, паночак, на свеце не бывае. Вось са мной раз такая прыгода здарылася. Было гэта, як я яшчэ не радзіўся. Наняўся я ў аднаго гаспадара пчол пасціць,— пяцьдзесят раёў пчол. Кожны дзень трэба было іх сашчытаць і выпусціць за пажыўнасцю; вернуцца — трэба пералічыць іх, выдаіць і ў вуллі пазаганяць.

— Свет вялік, можа быць, праўда,— кажа пан.

Глянуў мужык на золата і гаворыць далей.

— Раз ранкам выпусціў я пчол на пасту. Вярнуліся яны дамоў — дванаццаць пчол няма. Што тут рабіць? Можа дзе ў балоце завязлі... Кінуўся я іх шукаць. Як ісці, дык ісці... аж бачу — адзінаццаць пчол ляцяць, акрываўленыя, параненыя, а дванаццатай няма. Будзе бяда!.. Я ісці далей. Бачу — за ракой стада ваўкоў, апанавалі маю пчалу і душаць; яна адбі-

ваецца, не паддаецца ім. Я ну бегчы шпарчэй на помач. Прыбег к рацэ — перавозу няма. А бачу, што яшчэ часінку — і ваўкі яе разарвуць. Я, гэта, схваціў сам сябе за чупрыну, размахаў-размахаў,— як штурхну, так і перакінуўся на той бок ракі.

— Можа быць,— кажа пан.

— Але з разгону як гопнуў я аб зямлю, дык па пояс і ўвяз. Я і туды, я і сюды — не вылезці. Без рыдля нічога не зробіш, думаю сабе. Я, гэта, кінуўся як мага дадому, схапіў рыдзель ды і назад; адкапаў сябе, тады кінуўся к пчале на помач.

— Свет вялік, можа быць, і праўда,— кажа пан.

— Прыбег я к пчале, адагнаў ваўкоў, бачу, што ёй ужо не жыць: па баках боўтаецца мяса, як шмацце, а крыві-крыві!.. Я, нядоўга думаючы, шась яе нажом па горлу і прырэзаў: потым абяліў яе і прывёз мяса дадому: дванаццаць кадзей мяса наклаў!

— Свет вялік, можа быць, і праўда.

— Тут я ўспомніў, што косці засталіся на пожні. Думаю сабе: «Лаяць будуць людзі, што заграмаздзіў касцямі больш дзесяціны сенажаці. Пабягу ды скіну іх у раку». Прыбег, стаў паднімаць хрыбет з рабрамі. Падняў я яго, потым як штурхну ад сябе! Я думаў, што ён упадзе ў раку, а ён адным канцом стаіць на зямлі, а другім у неба ўпёрся.

— Свет вялік, можа быць, і праўда.

— Палез я па гэтым хрыбце на неба. Як лезці, дык лезці — і ўзлез. Бачу — у адной хаце пірушка, святыя гуляюць: п'юць гарэлку і віно, закусваюць, песні такія прэпадобныя пяюць... Ну, думаю сабе, з п'янымі, чалавека, не займайся, а то яшчэ ненарокам бокі намнуць. Іду далей. У другой хаце святы Мікола набраўся гарэлкі, як пучок, ляжыць пад лавай і храпіць, як пшаніцу прадаўшы.

— Можа, і праўда.

— Каля яго ляжыць шапачка, сама залатая з дарагімі каменнямі. Я гэту шапачку за пазуху ды і назад; аж тут святы Мікола прачнуўся, стаў шукаць сваю шапку. Падняўся крык... Ну, думаю, калі зловяць,— будзе кепска. А тут ніяк не найду таго месца, дзе стаяў хрыбет. Бачу — ляжыць пілавінне. Я давай з яго вяроўку віць.

Звіў доўгую вяроўку, прывязаў адзін канец яе і стаў спускацца з неба па вяроўцы. Спусціўся да самага канца вяроўкі, а яшчэ зямлі няма. Што тут рабіць? Я, гэта, вазьму ды адрэжу зверху кусок вяроўкі, а знізу надтачу і спускаюся далей.

— Свет вялік, можа быць, і праўда.

— Стаў, гэта, я на зямлю. Бачу — не наша зямля. Ну, думаю сабе, гэта, пэўна, пекла. Іду далей. Аж бачу — панскі бацька,

пакойнік, абарваны, абшарпаны, босы, пасвіць свіней.

— Лжэш, хаме!

Мужык цап за талерку з золатам ды і за дзверы.

Несцерка

Жыў сабе так Несцерка, меў дзетак шэсцерка. Рабіць ляніцца, красці баіцца, папрасіць не пасмее — не з чаго яму пражыць. Вот ён узяў ды й пайшоў к Богу. Ідзе, ажно едзе Юр'я-залатое сядло.

— Здароў, святы Юр'я!

— Здароў! Хто ты такі?

— А я,— кажа,— Несцерка, маю дзетак шэсцерка, рабіць ляную́ся, красці баюся, папрасіць не пасмею!

— Куды ты ідзеш?

— К Богу!

— Чаго?

— А вот чаго: не з чага мне пражыць, дык пайду к Богу спрашу, чым мне займацца: ці чытаць, ці пісаць, ці з гаршкоў хватаць? А ты куды, святы Юр'я?

— К Богу й я!

— Зачым?

— А пра свае надабнасці!

— Ну ўспомні там, святы Юр'я, пра мяне!

— Добра, успомню!

— Спытайся ў Бога, святы Юр'я, чым мне займацца?

— Добра, спытаюся!

— Забудзеш, святы Юр'я?

— Не, не, спытаюся!

— Не забудзеш? Дай мне ў заставу сваю залатую страмяну, што не забудзеш!

— А як жа я паеду!

Несцерка ўзяў лазінку, зрабіў страмяну і прывязаў, а залатую ў заставу ўзяў. Паехаў той Юр'я к Богу, а Несцерка дажыдае, пакуль ён вернецца. Тады святы Юр'я распрасіў у Бога пра свае надабнасці і стаў садзіцца на каня. А Бог убачыў лазовую страмяну і пытаецца:

— А дзе твая страмяна?

— А, Госпадзі, Несцерка атабраў,— мае дзетак шэсцерка, рабіць ляніцца, красці баіцца, папрасіць не пасмее, з чаго яму пражыць?

— А няхай круціць ды матае і душу пітае!

Юр'я і паехаў. Пад'ехаў ён к Несцерку, той Несцерка пытае:

— А што, святы Юр'я, што табе Бог казаў?

— А вот што Бог казаў: «Няхай круціць ды матае і душу пітае!» Ну, дай жа, Несцерка, маю страмяну, што ты ў мяне ўзяў у заставу залатую!

— А калі я ў цябе яе браў? Я яшчэ сам табе даў страмяну лазовую. Падавай яе мне назад! Во мая страмяна, ля сядла!..

Што той Юр'я набраўся з Несцеркам, але-ткі мусіў заплаціць за лазовую страмяну.

Той Несцерка пабег у хату:

— Троху пажытку ёсць, слава Богу! Мне-ткі не напрасна Бог сказаў, што як салгу, дык жыў буду і з таго хлеба!

Пражыў тое, што заплаціў яму Юр'я за лазовую страмяну, тады ўзяў і павесіў залатую страмяну на варотах. Ажно едзе пан багаты. Убачыў страмяну, што вісіць на варотах, і кажа свайму кучару:

— Зайдзі, папытайся, ці не ёсць у яго прадажныя сёдлы?

Кучар зайшоў у хату і спрашвае:

— Што, ты сёдлы дзелаеш?

— Дзелаю,— кажа Несцерка,— ды толькі на заказ, патаму я дзелаю сёдлы дарагія — сярэбраныя, залатыя!

Кучар пайшоў і сказаў пану. Той пан злез і стаў дагаварвацца. Дагаварыліся, каб ён здзелаў яму сядло за сто рублёў і згары-грошы. Узяў Несцерка грошы ды і сядзіць на печы. Прыязджае той пан за сядлом, а ён ляжыць босы на печы.

— Дзе сядло?

— Якое сядло, паночак?

— Ды тое, што я табе даваў грошы.

Несцерка толькі ксціцца:

— А вой, а вой! Якое ў мяне сядло? Я не ўмею лапцей сплесці...

Пан той крычаў, крычаў ды і кажа:

— Адзявайся, пойдзем на суд!

А Несцерка кажа:

— А што, ці я босы пайду?

— Ах, д'яблы яго вазьмі! Кучар, дай яму мае валенцы! Ну, адзявайся, пойдзем!

— А што, ці я голы пайду?

— А, нех ці, пане, д'яблы ўзялі! Дай яму, кучар, маю хутру!

Кучар прынёс хутру. Несцерка абуўся, адзеўся. Выйшлі вон. Пан стаў садзіцца на каня. А Несцерка паглядзеў ды кажа:

— А што я ці сабака, ці што, што я пяшком пабягу!

— А, нех ці д'яблы, пане, узялі! Дай яму, кучар, прыcцяжнога каня!

Сеў той Несцерка, і паехалі на суд.

Прыехалі туды. Сталі іх судзіць.

— Ну, што ты, Несцерка, грошы пану не аддаеш?

— Ды я ж яму не вінават! Ён ка мне вяжацца, сам не ведаю чаго. Хоча, мусіць, сарваць што-небудзь! Зараз скажа, што гэта і боты яго на мне!

Пан той кажа:

— Дурань ты! Дык гэта ж мае боты!

— Ну вот, бачыце! Ён во кажа, што боты яго на мне. Можа, ён скажа, што і хутра гэта яго!

Пан зноў:

— Ах, каб цябе д'яблы, пане! Гэта ж мая хутра!

— Ну во, бачыце, гаспадзіны суддзі: ён ужо прызнаецца і к хутры! Можа, зараз скажа, што і конь гэта яго!

Пан той зноў крычыць:

— Ах, каб цябе д'яблы, пане! Гэта ж і конь мой!

— Ну вот, бачыце, гаспадзіны суддзі: ён ужо кажа, што і конь яго!

Суддзі тыя думалі, думалі ды і кажуць пану:

— Не, брат, відаць, што ты маніш, што гэта ўсё тваё: і хутра, і боты, і конь, і грошы!

І нічога не прысудзілі Несцерку. Сеў той Несцерка на каня і паехаў у двор. Засталіся яму і конь, і хутра, і боты, і грошы. І цяпер ён жыве з тых грошай.

Завідны поп

У аднаго вельмі беднага чалавека памёрла дзіця. Просіць бедны чалавек суседзяў зрабіць дамавіну і выкапаць магілу для дзіцяці. Але ведама, калі чалавек багаты, дык усе яму памагаюць, а беднаму — ніхто. Прасіў, прасіў бедны чалавек, але ніхто не пайшоў капаць яму. Горка яму, слёзы так і цякуць, бы з бярэзіны сок. Няма чаго рабіць, трэба ісці самому капаць яму для свайго дзіцяці. Кажуць, гэта вялікі грэх, але што зрабіць, калі ад беднага й людзі адступіліся. Узяў бедны чалавек заступ і пайшоў, але перш зайшоў к папу й просіць, каб пахаваў дзіця.

— Добра,— кажа поп,— толькі ты мне перш прынясі дзесяць злотых і паўасьміны аўса.

— Няма,— кажа,— бацюшка, у мяне ні аўса, ні грошай.

І давай прасіць, каб поп пахаваў дзіця так, а ён ужо потым адробіць. Куды там! Поп не хоча і слухаць. Як ні прасіў бедны чалавек, поп стаіць на сваім ды й толькі. Заплакаў бедны з жалю і пайшоў капаць магілу.

Ось капае ён, капае і выкапаў гаршок з грашыма: чырвонцы аж зяюць... Панёс гэты бедны чалавек гаршок з грашыма да

гасподы і схаваў пад печ, а адзін чырвонец прыносіць папу. Здзівіўся поп, адкуль гэта ў беднага чалавека золата, і давай выпытваць. Бедны ўсё і расказаў, як было. От пахавалі ў беднага чалавека дзіця. Сама пападдзя з папом потым зайшлі ў хату к беднаму на памінкі. Толькі позна разышліся ўсе. Астаўся бедны чалавек адзін з жонкаю. Прыйшоў поп дамоў, і хочацца яму адабраць у беднага грошы. Зарэзаў ён казла, абвярнуўся ў казліную скуру, прыладзіў рогі ды й пайшоў у самую глупась к беднаму пад вакно. Прыйшоў, высунуў у вакно галавішчу з рагамі і кажа нямым голасам: «Аддай мае грошы!»

Спалохаўся бедны чалавек і аддаў гаршок з грашыма. Ухапіў поп аберучкі гаршок і пабег дамоў. Прыбег, хоча паставіць гаршок на стол, ды нельга — рукі прыраслі. Паспрабавала пападдзя садраць з папа казліную скуру. Куды там! І скура, і рогі прыраслі. Што ні рабіў завідны поп, нічога не ўрадзіць. Прыйшлося прасіць беднага чалавека, каб ён забраў свае грошы.

Сабраліся людзі, дзівяцца на папа, а ён толькі казлінаю барадой трасе. Ось, прыйшоў бедны чалавек і як узяў свае грошы, дык і скура з папа звалілася, ды не толькі казліная, але й свая.

От які быў завідны поп.

Шаптуха

У якомсь сяльцы жыла старэнькая баба. Была яна адна, бы тая былінка ў полі. Усе яе крэўныя да сваякі даўно паўміралі, а яна як асталася, так і ліпіць, як тое гнілое да старое дзерава. Сяльцо было маленькае, мо' якіх дамоў дзесяць. На самым канцы стаяла бабіна хатка. Яна была такая старэнькая, як і сама баба... Знайшоўся якісь добры чалавек, што нарабіў у бабінай хатцы падпорак, да аблажыў яе загатай; от і стаіць старэнькая, абросшая мохам, бы яе хазяйка, хатка...

Назбірае баба шчэпачак, падтопіць у печцы да й апякаецца перад полымем. Ведама, на старасці дак і ўлетку холадна. Вот так і жыве сабе старэнькая баба: калі ёсць што, то з'есць, а калі няма, дак і так абойдзецца. Да й колькі ёй трэба? Дасць хто кольвек асушкаў хлеба або бульбы, от баба размочыць скарынку да й пасмокча яе трохі бяззубым ротам, а бульбу спячэ ў прыску да й есць. От гэтым і жывілася тая баба ўжо пэўне гадоў з сарачню. Бачыце, ёй ужо было мо' больш як гадоў сто.

Мо' яшчэ доўга б пражыла так тая баба, але от раз ехаў

праз тое сяльцо тамашны пан, убачыў ён старэнькую бабу і здзівіўся, што яна так доўга жыве.

— Хіба ж ты, бабка, яшчэ жыва? — пытае пан.

— Жыва, паночку... От не дае Бог смерці...

— Як жа ты жывеш?

— Якое маё жыццё, паночак! Як так жыць, дак лепей гніць: зарабіць — не ўздолею, а дзеткі і ўнукі ўсе даўно паўміралі. Некаму і вады падаць.

— Чаму ж ты, баба, не шэпчаш або не варожыш?

— Не ўмею...

— Слухай, баба, я цябе наўчу.

— Наўчы, паночак, наўчы, каб і я недарма свет займала.

Пан прыхіліўся к вуху ды й кажа бабе:

— От як пазавуць цябе к хвораму, дык ты пахукай трэйко на яго ды й шапчы: «Сіголаў жыў, сіголаў не». Пашапчы о гэ трохі, дай яму выпіць вады, ён і паправіцца. А калі памрэ, сіголаў яго бяры. От за тое цябе будуць карміць і паважаць.

Падзякавала баба пану, ды й пачала шаптаць...

Пайшла чутка, што аб'явілася такая баба, такая шаптуха, што вельмі добра шэпча... Павалілі к той бабе адусюль, нясуць і вязуць усякага дабра. Жыве сабе баба анігаткі. Тым часам той пан, што наўчыў бабу шаптаць, чуе аб тым ды толькі смяецца сабе ціхенька з дурных людзей.

Але вось пайшоў той пан на паляванне, спацеў ды пакрычаў проці ветру, от і зрабілася ў яго ў горле скула. Пан к дахтурам — куды там — от-от скула задавіць. Жонка кажа, каб пазвалі тую бабу, а пан і слухаць не хоча, але, нарэшце, як прыпёрла ліха, так згадзіўся. Прыйшла баба, а пан ўжо чуць дыхае. От давай баба хукаць да шаптаць: «Сіголаў жыў, сіголаў не».

Прыслухаўся пан, ды як учуў, што баба шэпча тое, што ён яе вучыў, дак яго апанаваў такі смех, што не можа вытрымаць. А баба шэпча і шэпча. Слухаў-слухаў пан, ды як зарагоча — скула і трэснула. Выздаравеў ён, да й пытае ў бабы:

— Ці ж ты, бабка, усё так лечыш?

— Эге ж, мой саколіку, усё так...

Дык вось як шаптала ды варажыла тая баба.

Папоўская хцівасць

Быў сабе ў адным сяле багаты мужык і бедны поп. Вось аднаго разу заклаліся яны між сабою, што на свеце мае большую сілу: розум ці грошы?

— Ты,— кажа поп,— сваім багаццем нічога не зробіш ды толькі дарэмна перавядзеш усе грошы, бо ты дурны.

— Хоць вы, бацюшка, і вельмі разумны, а я такі грашыма вас так уплутаю, што вы сваім розумам нічога не зробіце, а як я грашыма ўвёў у паганае дзела, так грашыма і выведу.

— Добра, добра, але і для гэтага трэба розуму.

— Калісь пабачым.

Прайшло з паўгода, а мо яшчэ больш, мужык не забыў сваёй крыўды, таго дурня, што тады зарабіў ад папа, ды як толькі з ім стрэнецца, так віляе, каб не зайшла гаворка за розум ды за грошы. Ён хацеў, каб поп зусім забыўся на колішнюю спрэчку. Вось раз увечары прыйшоў мужык к папу, тройчы перахрысціўся, сказаў: «Вечар добры»,— сеў ды быццам то зажурыўся. Поп перастаў чытаць, кніжку склаў, адсунуў, зірнуў на мужыка дый пытае:

— Чаго ты такі маркотны?

— Ой, маўчыце, бацюшка, маю вялікае гора!

— Ну?!

— Сучка здохла!

— Тху! Па сучцы так гаруеш? І сораму табе няма!

— Каму сучка, а каму роднае дзіця.

Гэта кажучы, паклаў на стале кучку сярэбраных рублёў, мо з сотню, а паповы вочы загарэліся полымем.

— Што ж мне з табою рабіць,— кажа жаласна,— каб твая туга скора прайшла?

— Ёсць спосаб: мне вось знах... добры чалавек (тут мужык прыпомніў, што поп знахароў не любіць, дык пасунуў, быццам нехаця, грошы так, што кучка разбурылася і рублі бразнулі) нараіў сучку пахаваць на могілках у труне з малітваю, з крастом ды са святою вадою, дык я прыйшоў прас...

Як не рассердзіцца бацюшка, ды як не стане крычаць:

— Што ж ты такі ды сякі, скруціўся ці якога чорта?! Гэта ж не то грэх, а яшчэ і астрогам пахне. Ці ты аб гэтым падумаў, а?!

— Ну,— кажа мужык, згрэбаючы са стала ў кішэню свае грошы,— дык я ж сілаваць не буду, калі няможна.

Але хоць і разумны бацюшка, ды ўсё ж такі, маўляў, на грошы мае папова вока, дык крыкнуў:

— Пастой, я падумаю!

Мужык грошы паклаў назад, сеў дый чакае, а поп бегаў па хаце, а далей стаў дый кажа:

— Добра, я гэта для цябе зраблю, толькі прысягні, што людзі не будуць знаць аб сучцы, што быццам хаваем тваё дзіця, ды каб на могілках дамавіну не адчыняць.

— Добра, бацюшка! Будзьце спакойны, усё зробім як трэба.

Назаўтра рана пайшла па сялу плётка, што Ганна-бага-

тырчыха ноччу скінула дзіця. Стаў сходзіцца народ, а неўзабаве і бацюшка надышоў. Пасля малітвы вынеслі з хаты дамавінку, паставілі на калёсах, а багатыр сам узяў вожкі ў рукі дый павёз, быццам мерцвяка. Вось як прыехалі на могілкі і бацюшка хацеў крапіць, то адзін з суседзяў падбег ды і крышку скінуў з дамавінкі.

— Так,— кажа,— святая вада не дойдзе да мерцвяка. А цяпер крапіце.

Як пабачылі людзі сучку ў труне ды як наробяць крыку, той тое, а той другое: поп скруціўся, папу нешта зроблена, а мо на ўсіх чорт туман напусціў, і ўсім здаецца, што гэта сучка, ды яшчэ знайшліся і такія, што хацелі біць абодвух — і папа і багатыра. А поп ні на гэтым, ні на тым свеце — сам не свой, ведама, з вокам запарушаным, стаіць ні жывы ні мёртвы, а багатыр падышоў ды і кажа:

— Цяперака адрабі сваім розумам тое, што я зрабіў грашыма.

Сеў сабе на калёсы дый паехаў да гасподы, пасвісцаючы, а поп яшчэ доўга стаяў моўчкі, пакуль народ разышоўся, а тады і ён павалокся дадому па-за гумнамі.

Мужык, добра паабедаўшы, звязаў чорнага казла, паклаў на калёсы, запрог каня дый паехаў у мястэчка, бо чуў ад якогасьці пераезджага, што там сягоння чакаюць архірэя. Прыехаў ужо змярканнем ды, спыніўшыся ў заездзе, выпраг каня, закінуў травы і, аслабаніўшы казла, прывязаў яго ля каня, а сам пайшоў на подслухі ды на пранюхі. Прыйшоўшы на двор благачыннага, уваткнуў таму ды сяму гасцінца і яшчэ, быццам-то нехаця, як паказаў, сколькі мае грошай пры сабе, дык і даведаўся, што яму трэба, што архірэй прабудзе дні са два і што да яго можна даступіцца заўтра пасля службы. Прыйшоўшы да заезду, калі ўжо запальвалі свечкі шабас канчаць, напаіў каня, узяў чвэртку моцнай гарэлкі і тарана ды, маючы з дому сала і хлеб, павячэраў дый лёг на калёсах, накрыўшыся світкаю.

Назаўтра пасля службы дапусцілі яго з казлом да архірэя, думаючы, што казла ён вядзе на гасцінец, калі архірэй сядзеў у пакоі сам адзін. Увайшоўшы туды, нізенька пакланіўся, перахрысціўся тройчы дый цмокнуў архірэю ў руку.

— А што скажаш, чалавеча добры?

— Ваша прасвяшчэнства, мне Бог даў усяго патроху, нечага грашыць, але ж козы нешта не вядуцца, дык мне добры чалавек нараіў прасіць вас, каб на майго казла руку палажылі, пастрыглі дый далі яму імя айцец Іван.

І гэта кажучы, паклаў на столе здаровы варашок сярэбраных рублёў, мо больш трох соцень. Архірэй зразу анямеў,

а далей вочы загарэліся агнём, ды як раскрычыцца і стане лаяць, дык яшчэ горш за папа:

— Ты сякі-такі, сабака, сукін сын, пайшоў вон, падлюга! — ды яшчэ такога нагнуў, што і пераказаць сорам.

— Калі няможна, ваша прасвяшчэнства, то я ж сілаваць не буду; маўляў, купіў не купіў, а патаргавацца можна.

Ды давай зграбаць свае грошы ў кішэню, так каб мацней звінелі. Але хоць ён і архірэй, ды ўсё ж такі папова вока: як пачуў, што рублі звіняць, хаваюцца ў кішэнях, то крыкнуў:

— Пастой, я падумаю.

І давай бегаць так, як тады поп. Бегаў, бегаў, а далей стаў ды кажа:

— Добра! Толькі ж, барані цябе Госпадзі, не кажы нікому, бо нам абодвум будзе бяда.

— Не бойцеся, ваш прасвяшчэнства, ад мяне ніхто не даведаецца, калі вы самі да гэтага не давядзеце.

Зрабіўшы ўсё, як трэба, мужык з казлом, ці бо то з айцом Іванам, прыехаў дадому яшчэ зарана ды вельмі рад.

Хтось данёс архірэю, што поп хаваў сабаку на могілках, дык архірэй не паехаў у аб'езд, ды завярнуў сюды, каб гэтую паганую справу разабраць. Прыехаў ён з благачынным, пазваў старасту, дзесятніка ды з дзесятак гаспадароў, склалі такі суд, што куды, а бедны папок, бачыўшы гэта, думае сабе: «Ну, ужо я цяперака суздром прапаў!»

Яшчэ не пачыналі дапытвацца, як і што было, калі глянулі: багатыр вядзе казла проста к самым папоўскім дзвярам.

— Ці ты скруціўся,— хтось кажа,— куды ты прэшся з гэтым казлом?

— Эге! Каму,— кажа,— казёл, а каму айцец Іван.

Архірэй, як гэта пачуў, дык вельмі спужаўся: ухапіўся за галаву дый сам да сябе кажа:

— Ох, бедная ж мая галоўка! Мне і не ў памяці, што мужык з казлом і поп з сабакам могуць быць у адным сяле. Пускайце гэтага чалавека да мяне!

Мужык казла прывязаў, увайшоў у хату, дзе, акрамя архірэя, нікога больш не было, і як ні ў чым не бывала, тройчы перахрысціўся, пакланіўся нізенька, цмокнуў у руку дый маўчыць.

— Ты ж кляўся, што ніхто не будзе ведаць, а бач, як дадзяржаў прысягу.

— Ніхто, ваша прасвяшчэнства, не ведае і ведаць не будзе, як вы самі да гэтага не давядзеце, я вам тады так казаў.

— Дык чаго ж ты ад мяне хочаш? Гавары барзджэй, бо ўжо людзі вельмі цікавяцца.

— Аслабаніце і суздром абчысце бацюшку, скажыце, што

ён ніколі, нічога, ніякага, што вока мае светлае, а я вам аддам пашпарт ды скажу людзям, што казла прыводзіў вам на гасцінец, бо мне знахар нараіў, а вы не прынялі.

— Бог з табой, няхай і так будзе!

Выйшаў архірэй на двор, баццам папытаў то сяго, то таго — а іх уперад багатыр падпаіў ды падгаварыў, дык яны і ляпнулі ні тое ні сёе — дый агаласіў, што поп ні ў чым не вінаваты.

Мужык, пан і цар

Жыў-быў пан. Ён вельмі любіў гуляць у карты. Гуляў да таго часу, пакуль не прагуляў усё, што меў. Калі яму не было ўжо чым залажыць, ён пайшоў да аднаго мужыка і пазычыў у яго тысячу рублёў. Як прыйшоў час, мужык пайшоў да пана па грошы, але пан прагнаў яго. Што рабіць? Шмат думаў мужык і вырашыў падаць на пана жалабу цару. А хто ж напіша? Сам неграматны, а ў вёсцы грамаць ведалі толькі пісар і дзяк. А яны ж будуць на баку пана. І мужык сам стаў пісаць прашэнне. Нарысаваў, навадзіў ліній і адправіўся з гэтым пісьмом да цара.

Прыйшоўшы да дварца, мужык стаў прасіцца ў слуг, каб яго прапусцілі да цара. Яго не пускалі. У гэты час міма праходзіў саветнік цара. Слугі падалі яму прашэнне. Саветнік паглядзеў, нічога не разабраў і загадаў не пускаць мужыка. Ходзіць мужык каля дварца з думай, як жа папасці к цару. А цар у гэты час гуляў у садзе і ўбачыў мужыка.

— Што патрэбна табе, чаго ходзіш ты тут?

Мужык не знаў, што гэта цар, і паведаў яму аб сваім горы.

— Пакажы прашэнне.

Мужык падаў.

— А што тут намалёвана?

— Вось гэта, паночак, панскі маёнтак, а гэта мая хаціна. Па гэтай дарозе пан прыходзіў да мяне...

Цар выслухаў і загадаў яму пайсці ў дзверы і сказаў, што яго там прапусцяць. А сам, пераадзеўшыся ў царскае адзенне, пайшоў у дварэц. І мужык зайшоў.

— Што патрэбна яму? — спытаў цар у саветніка.

— Жалабу прынёс на пана, але разабрацца ў ёй немагчыма.

— Падай сюды! — загадаў цар і стаў разглядаць жалабу.— Ды што тут няясна? Усё ясна. Гэта маёнтак пана. Так, мужык?

— Так, царочку, так.

— А гэта твая, мужык, хаціна?

— Мая, царочку, мая.

— Па гэтай дарозе пан прыходзіў к табе, і ты пазычыў яму грошай, а ён не аддае цяпер?

— Вось гэта дык галава! — сказаў мужык на цара. — А ў вас,— зірнуў ён на саветніка,— бязмен.

Цар загадаў пану вярнуць мужыку грошы.

«Верны» слуга

От да аднаго пана прыехаў пан, і сталі яны гаварыць пра свае слугі. От першы гаворыць:

— У мяне слуга — пастух, такі верны! От, у мяне ест вол з залатымі рагамі, і ён яго пасе. Ніхто ў яго не ўкрадзе таго вала і ніхто за ніякія грошы не купіць.

Другі пан кажа:

— А я вот украду.

Ну, вот і залажыліся там, як даўней бывала, паны на некалькі тысяч рублёў: украдзеш — значыцца, я праіграў, а не ўкрадзеш — ты праіграў.

Сказалі выправіць гэтага пастуха ў поле. Там недалёка рэчка, кусты. Пасе ён ды трымае гэтага вала на вяроўцы. Зараз прыходзіць паненка, харошая-харошая. Стала на беразе, раздзелася, стала гімнастыкі рабіць над рэчкай. Загледзеўся ён, зацікавіла яго гэта. Узёў ды і пусціў гэтага вала з рук. І прытаіўся сабе, думае: «Яна, мусіць, мяне не бачыць». Прытаіўся і паглядае.

Тая парабіла сабе гімнастыкі, тое-сёе, ускочыла ў ваду, сплесанулася, адзелася і пайшла. Зірк ён назад — вала няма! «Што ж рабіць? Што ж пану гаварыць? Як гэта гэтак палучылася?».

Прыходзіць у двор. А тыя злядзеі прывялі ўжо вала да пана.

— Вот,— кажа пан-госць,— табе і верны слуга. Вот і ўкраў я вала твайго.

— Дык дзе ж ты падзеў вала? — пытае пан-гаспадар у пастуха.— Ты яго ў руках трымаў, і ў цябе ўкралі? Гвалтам у цябе не адбіралі?

— Не.

— Дык, а як жа гэта зрабілася.

— От ведаеце, панок, што: як прыйшла пакуса без барады і вуса, як раздзелася дагала — дык я і забыўся на вала.

Як мужык пана частаваў

Ехаў мужык і сустрэўся з панам. Але пан быў чужы і не ведаў мужыка. Пакланіўся мужык пану. Паглядзеў на яго пан і бачыць, што мужык сам абадраны, а вол яго худы, чуць ногі цягне. Пытаецца пан:

— Чый ты мужык?

— Домнін.

— А Домна чыя?

— Жонка мая.

— А каго вы баіцёся?

— Ды во ў Канцавога Ігната вельмі благая сучка. Дык мы ўсе вельмі яе баімся, як хто ідзе, дык кол ці камень нясе.

— А хто вас дзержыць?

— Кол за кол, вугол за вугол — так і дзержымся.

Раззлаваўся пан і кажа:

— Вось каб узяў ды заехаў к гэтаму мужыку даўганосаму.

Паглядзеў мужык на пана, адвярнуў нос набок і кажа:

— Заедзь, панок. Я кварту гарэлкі пастаўлю, а Домна буракоў увалье.

Захацеў пан паглядзець, дзе і як жыве гэты абадраны мужык, ды й паехаў да мужыка.

Пасадзіў мужык пана за стол, паставіў кварту гарэлкі, а Домна — буракі на стол. Наліў мужык чарку гарэлкі і пытаецца ў пана:

— Ну, дык да каго ж мне піць, паночак?

А пан той поляк быў, дык ён і адказвае:

— Пі до мне.

Падняў мужык чарку:

— Ну, дык, Домна, будзь здарова! — і выпіў.

Наліў другую, даў Домне, і тая выпіла. Наліў трэцюю чарку і зноў да пана звяртаецца:

— Да каго ж цяпер, панок, піць будзем?

Пан зноў:

— Пі до мне!

Зноў выпіў мужык з Домнай. Так выпілі яны з жонкай цэлую кварту гарэлкі.

Сядзеў пан, глядзеў, а потым вылез з-за стала, плюнуў і паехаў злосны.

Бацькавы наказы

Жыў бацька з сынам. Бацька быў стары, і прыйшла гадзіна яму памірaць. А сына свайго ён вельмі любіў і хацеў, каб той жыў правільна, не горай за другіх. А для гэтага даў яму перад смерцю шэсць наказаў: кабылы жаробнай на чужыя рукі не давай; з двара жонкі не бяры; няпрошаны на вяселле не ідзі; каб заўсёды з мёдам снедаў; каб, праходзячы, у працы людзям не казаў «памажы Божа»; а калі ў пуню будзеш вазіць снапы, то павуцінне на пацёсе каб шапкай выцер.

Сын бацьку не паслухаўся. Узяў ён ды і даў жаробную

кабылу свайму суседу. А тая кабыла на трэці дзень жарабё скінула. Пагараваў ён ды і супакоіўся, а для навукі жарабё закапаў і на тым месце дубочак пасадзіў — для запамятавання пра бацькаў наказ.

Прыйшоў час яму жаніцца, а сасватаў ён дзяўчыну не прастую, а дваровую. Згулялі яны вяселле, пара ўжо б і за працу прыняціся, а жана нічога рабіці не ўмее ды і ўдабавак не хочыць, вельмі ж дужа працаваць яна не прывыкшы. Тады й успомніў хлопец наказ бацькі, але позна — жонкі не закапаеш.

У вёсцы вяселле, а яго на вяселле не клічуць; ён бярэ кумпяк, добры літр водкі і ідзе на вяселле. Стаў у парозе і стаіць, чакаець, пакуль яго за стол папросюць. А за стол яго не клічуць. Пастаяў, пастаяў і дахаты так вараціўся, а кумпяк ды літру з водкай падвесіў на бэльцы — для запамінання бацькавага наказу.

Спіць, спіць гэты сын, а потым устане і снедаць не хоча, бо дужа ж доўга ён спаў. І бярэ тады да свайго снедання мёд і есць, бо ўспомніў, што бацька казаў, каб ён з мёдам еў. А нейк раз прыйшлося яму з рання, яшчэ да снедання, добра папрацаваць. Прыйшоў ён снедаць і так смачна паеў, што як з мёдам усё роўна. Вось тады і ўспомніў ён чацвёрты бацькаў наказ.

Прыйшла пара звозіць жыта дамоў. Едзе ён звозіць жыта, а людцэ ўжэ ўсе даўно ў полі. Успомніў сын бацькаў пяты наказ, каб нікому ў працы не казаў «памажы Божа», ён і не кажа, а людзі дзівяцца: вось дзе які ірад — пройдзе і нікому нічога не кажа. У той дзень звазіў ён саўсім мала снапоў. Тады назаўтра ўстаў ён да свету і паехаў у поле, а ў полі яшчэ нікога не было. Вось вязе ён з поля снапы, а людзі ў поле ідуць і «памагай Бог» яму кажуць. Вось толькі тады зразумеў сын, што азначае бацькаў пяты наказ.

Ну, і апошні, шосты наказ: як будзе вазіць снапы ў пуню, ён павінен шапкай павуцінне з пацёсу выцерці. Ну, ён і ўзяўся. Ну, думае, хоць гэты наказ выканаў. І пачаў вазіць снапы, вазіў, вазіў і столькі шмат навазіў, што ажно да пацёсу шапкай пачаў даставаць і разам павуцінне выціраць. Агледзеўся сын і думае: нашто ж я гэта мэнчыўся, лазіў, выціраў, калі яно само выцерлася? І зразумеў, што яму хацеў сказаць бацька.

Вось так выканаў сын бацькавы наказы.

Як я з дзедам пакутваў

Я жыў з дзедам, а бацькі яшчэ не было. Былі ў нас з дзедам пчолы па сабаку, насілі мёд рэзгінямі. Адна пчаліна несла мёд цераз возера і ўпусціла рэзгінь мёду ў возера; гэта возера стала салодкае. Хадзіла там мая кабылка і выпіла гэту ваду, так што аж упілася, і ляжала без ума, п'яная. Толку не маглі мы даць з дзедам (а бацькі яшчэ не было). Узяў мой дзед ды шкуру здзёр з яе. Праспалася гэта кабылка і ўстала. Як напалі на яе авадні з мухамі, а яна ж без шкуры. Я ж узяў з дзедам (а бацькі яшчэ не было) абсыпаў яе грэчкай дзеля таго, штоб была гнедая. Як парасла грэчка на кабыле, ды як унадзіліся ў тую грэчку цецярукі, то і тут мала з яе толку. Дзед мой кажа (як бацькі яшчэ не было):

— Надабе звязаць дзве вяровачкі і перакінуць цераз кабылу, прывязаўшы каробачку, а к хвасту прывязаць даўбешачку: цецярукоў як наляціць, яна хвастом як махне, то цецярука і заб'е.

Зрабілі мы так з дзедам (як бацькі яшчэ не было). Стала гэта кабыла біць цецярукоў і набіла поўну каробачку, так што стала цяжка, і перарэзала павадком кабылку. Трэба ж тут даць ратунак,— як жа жыць без кабылкі? Мой дзед кажа (як бацькі яшчэ не было):

— Нада адсеч дзве дубінкі і сшыць кабылку.

Мы так і зрабілі. Параслі дубы на кабыле з гэтых галіц дубовых, так што не магла яна і хадзіць: возьмуць і абернуць яе набок. Што нам тут рабіць з дзедам? (а бацькі ўсё яшчэ не было). Давай мы ўжо бычкамі пасеку араць. Пааралі, пасеялі мы з дзедам (як бацькі яшчэ не было) пшаніцы, ячменю. Як парос ячмень — старому вераб'ю па калена, а маладому па бруха, колас ад коласа — не чуць голаса. Зжалі мы з дзедам (як бацькі яшчэ не было) ячмень гэты, а як ужо злажылі, дык капа ад капы — на дзень язды. Перавезлі мы яго з дзедам дамоў і злажылі сторану ў хаце на стаўпе, што каля печы стаіць, і сталі мы ўжо з дзедам малаціць (а бацькі ўсё яшчэ не было), так што страты не было; ложкамі мералі, коўшыкамі зносілі, з току гэта ўжо збіралі. Цяпер сталі мы з дзедам (а бацькі яшчэ не было) гэтым ячменем кабана карміць і выкармілі вочынь бальшога, што якраз падлезе пад чыгун і схаваецца. Выгналі мы яго з дзедам вон ужо на двор. Ухваціла яго варона, можа яшчэ маладая, узяла ў дзюбу і раздзяўбла, на калé седзючы.

Няма ў нас з дзедам (а бацькі ўсё яшчэ не было) гавядзіны, дык мы кол гэты рубім і ў гаршок брасаем: кабан наш вочынь жырны быў, так што і кол жыру набраўся і ад яго ў гаршку

накіпаець. А цяпер, слава Богу, мы і лепш жывём, бо радзіўся мой бацька. Мы з дзедам пастарэлі і пасівелі, ды і бацька ўжо цыбук парадашны вырас.

Я там быў, мёд-віно піў, па барадзе цякло, а ў рот не папала; далі мне барану,— я адтуль смаргануў, далі мне смаляную кабылу: ехаў я, ехаў на ёй,— стала мне холадна; разлажыў я агонь, начаў грэцца, а кабыла мая і растала, звеснае дзела: смаляная.

Легенды і паданні

Да легенд звычайна адносяць трывала замацаваныя ў фальклорнай традыцыі вусныя апавядальныя творы, у аснове якіх ляжыць фантастычны вобраз або ўяўленне, звязаныя з гісторыяй працоўных або тлумачэннем розных прыродных і грамадскіх з'яў. У больш вузкім разуменні, якога прытрымліваюцца некаторыя даследчыкі, легендамі з'яўляюцца толькі творы на біблейскія сюжэты, г. зн. апакрыфічныя творы.

Легенды — мастацкія творы, але дамінантнай у іх з'яўляецца не эстэтычная, як у казках, а пазнавальная функцыя.

Беларускія легенды разнастайныя па тэматыцы. У апублікаваных запісах прадстаўлены легенды касмаганічныя, этнагенічныя, гістарычныя, апакрыфічныя і інш. У іх адлюстраваны розныя ўяўленні народа, спробы растлумачыць паходжанне сусвету і зямлі, чалавека і жывёл, сутнасць розных з'яў прыроды і грамадскага жыцця. Часам у легендах адчуваецца рэлігійны ўплыў, але ў той жа час многім легендам уласцівы элементы стыхійнага матэрыялізму, у іх асуджаецца эксплуатацыя чалавека чалавекам, сацыяльная няроўнасць, выказваюцца крытычныя адносіны да рэлігійнага вучэння. Асабліва выразны крытычны пачатак у апакрыфічных легендах, якія апавядаюць, як Бог і святыя нібыта некалі хадзілі па зямлі. Гэтыя творы поўныя іроніі, персанажы ў іх пазбаўлены арэолу святасці. Па сваёй ідэйнай накіраванасці яны вельмі блізкія да сатырычных антырэлігійных казак і анекдотаў. Ідэйным зместам і высокім мастацкім майстэрствам прыцягвае ўвагу легенда «Вялікі грэшнік», у якой забойства грэшнікам лютага ворага сялян — войта расцэньваецца як справядлівы, гуманны ўчынак, як неабходная і нават святая справа.

У некаторых беларускіх легендах распрацоўваюцца розныя маральна-этычныя праблемы, сцвярджаецца неабходнасць добрасумленных адносін да працы, справядлівых і добразычлівых адносін паміж людзьмі.

Нягледзячы на агульную тэндэнцыю затухання гэтага жанру, у часы Вялікай Айчыннай вайны ўзніклі легенды пра мужных абаронцаў нашай Радзімы, пра партызанскіх камандзіраў Герояў Савецкага Саюза К. С. Заслонава, А. С. Каўпака і іншых.

Па сваёй асноўнай функцыі — перадачы выпрацаваных папярэднімі пакаленнямі пэўных ведаў або ўяўленняў — да легенд набліжаюцца паданні. Але калі ў легендах прысутнічае фантастыка і ў сувязі з гэтым яны маюць адпаведную паэтыку, паданні даюць звесткі аб рэальных асобах і сапраўдных падзеях, хаця, натуральна, пры перадачы з вуснаў у вусны аддаляюцца ад першаасновы, жыццёвы матэрыял набывае ў іх паэтычную інтэрпрэтацыю.

Найбольш распаўсюджаныя ў беларускім фальклоры паданні гістарычныя і тапанімічныя, многія з якіх маюць гістарычную афарбоўку. З вуснаў у вусны перадаваліся паданні аб асілках, якія нібыта некалі жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі і пакінулі пасля сябе старажытныя гарадзішчы ды

велізарныя камяні з адбіткамі сваіх пальцаў ці рук. Тэма многіх паданняў — барацьба беларускага народа з іншаземнымі захопнікамі. Яны маляўніча апавядаюць аб адзінаборстве рускага воіна з татарскім, пра перамогу над шведамі, пра Айчынную вайну 1812 года і аднаго са славутых яе герояў генерала Платава. Адначасова ў гэтых творах адлюстраваны цяжкія пакуты, якія прыносілі войны народу, з гневам і болем апавядаецца аб рабунках і здзеках, што чынілі захопнікі на беларускай зямлі. Вядомы таксама шматлікія паданні аб заснаванні розных населеных пунктаў, паданні аб рэках, азёрах, урочышчах і нават асобных збудаваннях. Такія паданні таксама дапамагаюць глыбей пазнаць мінулае, перадаюць адносіны народа да розных падзей, яго ўяўленні аб гісторыі роднага краю і любоў да сваёй зямлі. Гістарычныя паданні складаюць важную частку беларускага гераічнага і гістарычнага эпасу.

ЛІТАРАТУРА

Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: В 3 т. Спб., 1893. Т. 2.

Романов Е. Р. Белорусский сборник. Витебск, 1891. Вып. 4.

Federowski M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej. T. 1—3. Kraków, 1897—1903.

Кабашников К. П. Прозаические жанры белорусского фольклора // Прозаические жанры фольклора народов СССР. Мн., 1974. С. 32—46.

Легенды і паданні / Склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. Мн., 1983.

Вялікі грэшнік

Даўно гэта дзеялася... Чула я ад старых людзей — а яны лгаць не будуць — значыць, праўда была. Жыў на свеце дужа вялікі грэшнік. Такі грэшнік, што не было таго граха, каб ён не саграшыў. Такі быў злодзей, якога і свет не бачыў: ён і краў, і чыніў разбоі, губіў людзей без пакаяння... Нават чорту душу запрадаў; чараваў, калі краў, абарачваўся ваўкалакам, пушчаў моравае паветрые — і не было ліку яго грахам.

Прыйшлося яму паміраць. Тут такі страх яго агарнуў, што не магла яго душа пакінуць цела. Няма яму смерці, ды й годзе. Тут успомніў ён на Бога. Захацеў паспаведацца, душу ачысціць. Сколькі не прыводзілі к яму папоў, ксяндзоў,— як раскажа ім свае грахі,— не даюць адпушчэння. Такі ён быў грэшнік. А смерць не прыходзіць, а душа яго мучыцца, з целам не можа разлучыцца.

Раздаў ён сваё багацце ўбогім і пайшоў па свету шукаць таго ўгодніка, каб замаліў яго грахі, разлучыў душу з целам. Ідзе, распытвае...

Параілі яму людзі даведацца к аднаму пустэльніку, што цэлае жыццё жыў у пушчы, еў толькі хлеб з вадой, маліўся, душу спасаў і ўгодны быў Богу. І пайшоў ён к яму. Прыходзіць — так і так,— кажа,— я дужа вялікі грэшнік, ратуй мяне,— выспаведуй. Ты ўгодны Богу,— можа адпусцяць мае грахі. Стаў спаведацца. Выслухаў яго той пустэльнік, кажа:

— Ты такі грэшнік, што цябе смерць не возьме, зямля не прыме, пакуль ты свае грахі на гэтым свеце не адпакутуеш, пакуль ты не зробіш столькі дабра, каб яно твае грахі пераважыла. А датуль ты будзеш мучыцца.

І пайшоў той грэшнік заслужваць спасення. Хадзіў ён на афяры, і хадзіў на каленях, марыў голадам сваё цела, нанімаўся к сярдзітым гаспадарам на работу, каб яго білі, лажыўся за другіх пад розгі, служыў хворым і ўбогім — смерць не прыходзіць. Хацеў на сябе рукі налажыць: таніўся, вешаўся і рэзаўся — усё няма смерці, толькі мукі прымаў надарэмна.

І так прайшло многа год. Раз ідзе ён полем. Ідзе і праклінае сваю долю. Узяла яго злосць, што няма яму смерці. «Дакуль я буду мучыцца?» — думае ён сабе. А быў першы дзень Вялікадня. Ідзе ён і бачыць многа-многа народу на полі — пашуць, барануюць. «Што ж бы гэта значыла? — думае ён,— першы дзень Вялікадня такое свята, што і птушкі святкуюць — гнёзды не ўюць, а тут народ марудзіцца». Падыходзіць бліжэй, бачыць — войт пахаджвае паміж работнікамі і бізуном іх падганяе. Тыя плачуць, жалюцца:

— Што гэта,— кажуць,— ты насміхаешся над намі? Хіба няма ў цябе Бога ў сэрцы? Б'еш нас, катуеш у будні, у свята не даеш адпачынку... І нават сягоння, на Вялікдзень, выгнаў на прыгон!

А войт раве, як апантаны, бізуном лупіць. Глядзеў, глядзеў той грэшнік. «Во,— думае, акаянны, ні папушчы мяне! Падумаць гэта, як народ мардуе!» Падышоў ён к войту і кажа:

— Што ты робіш? За што ты людзей мучыш?

А войт, ні слова не кажучы, як нахлысне бізуном цераз лоб,— аж іскры з воч пасыпаліся. Азвярэў наш грэшнік, схваціў камень, як пусціць ім у войта... І разбіў яму чэрап. Войт не айкнуў — сасвяжыўся. А грэшнік і скончыў сваю пакуту.

Як чалавек зрабіў агонь

Першы агонь к нам прыляцеў з Перуном, да як загарэўся адзін хварастовы курэнь, дак людзі збегліся адусюль хапаць галавешкі, да па сваіх курэнях і зямлянках у попелі перахоўваць. Адначэ гэты агонь не шанцаваў нікому, аж пакуль аднаму старому калёсніку, каторы акрамя калодак тачыў і верацёна, не паслаў шчаслівае думкі, штоб ён папрабаваў кружкі на верацёнах вышпульваць ясянёвым клінком да не нажом вырэзваць як досі.

— Чаму не,— кажа калёснік сам сабе,— ясень цвярдзей,

дак павінен узяць мякчэйшую бярозу, і давай ось папробуем.

Застругаўшы ясянёвы клінок, прыставіў яго к верацяну, моцна прыжымаючы, і зачаў смычком шморгаць то сюды, то туды, што раз скарэй, аж палянь — пашоў дым з верацяна, да так пахне бы з вогнішча. Ён гэта далей шморгаць да яшчэ скарэй да хутчэй, аж покуль лоб стаў мокры да з верацяна іскры пасыпаліся. Дак вось як чалавек знайшоў справядлівы агонь, тагда людзі ўсюды патушылі перуновае цяпло да завялі свойскі агонь і з тых пор сталі лучшэй жыць.

Асілкі

Даўно, даўно, калі яшчэ людзі жывалі па лясах драмучых, прыйшлі ў цяперашнюю Утужыцкую абшчыну асілкі і занялі яны два места, адно на рэчцы Вараухе, у Забарышчах, а другое — на Іваніхе пры той жа рэчцы. У тых мястах у тое ўрэмя ніякага народу не было, мяста былі вольныя па ўсёй Жанвіль-Утужыцкай старане. У лясах той стараны жылі звяры ўсякія: мядзведзі, воўкі, ласі, кабаны, лісіцы, рысі, а па рэках і азярах жылі выдры: рыбы ў вадах было такое мноства, хоць палоўнікам чэрпай.

Асілкі тыя былі людзі здаровыя, росту ў касую сажань, у плячах аршына з два, голас мелі, як звон немалы, бывала калі крыкнець ва ўвесь голас, ды свіснець, дык якое б дзерава не было бальшое, а заваліцца. Вот якія былі яны людзі, тыя асілкі.

Хазяйства яны ніякага не трымалі, не было ў іх ні якой худобы, ні скацінкі дамашняй, ні прыпасу, ні запасу. Ні хлеба, ні лёну не сеялі. Кармілісь яны тым, што лавілі па лясах звярэй ды па вадах рыбу. Адзежу сабе яны строілі з звярыных шкур. Вот так і жылі. Мусіць пра Бога яны саўсім не зналі, бо ніхто не чуў ад старыкоў, штоб яны мелі дзенебудзь царкву алі папа. Асілкі, пажыўшы на рацэ Вараухе, спадабалі Жанвіль-Утужыцкую старонку, бо тут ім усяго досыць было. Звяр'я па лясах было відзіма-нявідзіма і рыбы ў водах тожа, а ім больш нічога і не трэбавалась. Вот і задумалі яны абсяліцца і пачалі сразу строіць два гарадзішча — Забыркі і Іваніху. Народу тут было многа, шутка сказаць, кажынны год бабы прывадзілі па два ды па тры рабёнкі.

Струменту ў іх амаль ніякага не было. Кажуць, што ў іх быў на ўсіх адзін тапор, ды і той не жалезны, а якісь медзяны, а можа і жалезны, пра гэта дзяды не сказывалі, мусіць, запомнілі. Адно звесна, што асілкі не мелі струменту, а гарадзішчы строілі. Гарадзішчы гэтыя і цяпер ёсць на Вараусе, вот зараз ідзі і паглядзі. Не меўшы досыць струменту, асілкі

перабрасывалі тапор з гарадзішча і на гарадзішча, бо не хацелі траціць часу на хаджэнне. Зыкнець, бывала, асілак з аднаго гарадзішча ў другое, тапор давай, той возьмець тапор ды й кінець яму. Такая была ў іх сіла, за то і празывалісь асілкамі. Гэта яшчэ нешто тапор перакінуць, вярсты за тры, а то, бывала, нада на пастройку дзерава, пойдзець у лес, вырвець дзерава з карнём ды так і прэць на гарадзішча, а то камень прыдзецца прыставіць, дык ён возьмець яго ды й кінець за вярсту і больш прама на гарадзішча. Другія кідалі такія бальшушчыя камні, што будзець у полсажня вялічынёю, алі такія камні не ўсягды дакідывалі да гарадзішча. А то ёсць такія мясціны, што саўсім закіданы камнямі. Дзяды казалі, што на гэтых самых мясцінах асілкі друг супроць дружкі ваявалі, кідаясь камнямі. Яны і звярэй убівалі камнямі, адтаго камні і ляжаць аж да сягодня па лясу. А далі сказывалі старыкі, што асілкі ўшлі адсюль, як толькі перавяліся ў лясах звяры і пазменшала рыбы ў вадзе, бо ім не з чаго стала жыць. З тых пор і гарадзішчы іхныя запусцелі, бо пасля іх не скора прышлі сюды нашы дзяды, каторыя абабралі сабе другія мясціны, каторыя больш спасобны для хлебапашаства і для разводу скацінкі.

Адкуль сяляне і паны

Бог першага чалавека вылепіў з гліны, да, паставіўшы пад плотам, штоб сох, сам кудысь пайшоў; тагды прыбег чорт, да з тае гліны, што асталася, вылепіў такога самюсенькага другога чалавека, да й кажа сам да сябе:

— Як жа я пазнаю, калі Бог ажывіць абодвух, каторы яго, а каторы мой? Трэба неяк свайго назначыць.

Зірнуў ён кругом, ці няма якое ламакі, ды не знайшоў нічога, а тут чуе, што Бог падыходзіць, дык барджэй плюнуў сваёй леплёнцы ў лоб ды й пабег. Бог прыйшоў ажыўляць ды бачыць, што стаяць дзве леплёнкі, як адна, начэ дзве краплі вады.

— Хіба ж,— кажа,— я дзве вылепіў? Здаецца адну... а мо і дзве? Не прыпомню.

Узяў да й ажывіў абедзве, а як яны заварушыліся, то з божае выйшаў хадзяін-пахар, а з чортавае — нейкае благароддзе ў казённай шапцы, з кругленькаю бляшкаю, акурат на тым месцы, дзе чорт плюнуў. Тагды хазяіну Бог сказаў:

— Ідзі да гасподы!

А благароддзю, узяўшы за шыварат, даў каленам... Начэ выгнаў, не даўшы ніякага спосабу.

Колькі жыць чалавеку

Калісьці ў далёкім мінулым кожны чалавек знаў, колькі яму гадоў жыць на свеце. Але адзін раз адбылося такое.

Ішоў Бог па зямлі. Зайшоў у адну дзярэўню і відзіць, што адзін чалавек робіць плот з саломы. Бог паглядзеў на яго і пытаецца:

— Ты чаго, чалавеча, плот не з дрэва гародзіш, а з саломы?

— Дык мне ж ужо мала гадоў жыць на свеце асталося. На мой век хваціць.

Тады Бог рашыў зрабіць так, каб людзі не знялі, каму калі паміраць. Так і цяпер.

Чаму не аднолькава работы ва ўсіх?

Было яшчэ так. Хадзілі па зямлі Пётра з Богам і не ведалі, каму што прыдзяліць. Ну, ідуць яны. Сонца нізка. Падыходзяць да жанчыны, якая жала, пытаюцца, як прайсці ім туды ды туды, просяць, каб паказала ім дарогу. А яна кажа:

— Сонца нізка, мне жаць трэба. Не буду паказваць, ідзіце, куды хочаце.

Ну, раз такое дзела, пайшлі яны далей. Косіць мужык. Падышлі яны да мужыка і кажуць:

— Ці не паказаў бы ты нам дарогу, як туды ды туды прайсці?

Мужык кажа:

— Чаму ж не, пакажу.

Закурыў і павёў іх да дарогі, паказаў, куды трэба ісці. Далей ідуць, ідуць, ходзіць конь. Пытаецца Бог у каня:

— Як бы ты нам дарогу паказаў?

А конь глянуў:

— Сонца нізка, я не пад'ем. Не павяду вам паказваць дарогі.

— Ну, ладна, не павядзеш, дык хадзі, грызі.

Пайшлі далей. Ходзіць карова. Просіць Бог у каровы, каб паказала ім дарогу.

— Чаму ж не,— кажа карова,— пакажу.

Павяла іх і на дарогу вывела. Ну, вот і кажа Бог на Пётру:

— Слухай, што гэта будзя: вот гэта жанчына будзе век рабіць, і ёй век будзе работы па горла — ніколі не паробіць. А мужык паробіць і ўсягды яму будзе вольны час. А конь таксама — будзе грызці, грызці, і ніколі яму не дадуць пад'есці, а карова паходзіць — ужо і жвакуе, ужо і пад'ела.

Чаму варагуюць сабака, кот і мышы

Перш і сабака меў шляхэтскія паперы. Ну вядомо: дзе яму з імі насіцца. Аддаў ён кату і просі:

— Схавай, братко, (перш сабака, кот і мышы былі з сабой у дружбе) пад страху дзе высока, там цалей будзіць.

Кот узяў ды аддаў мышам схаваць пад падлогу, бо баяўся, што пад страхой найдзе хто. Адылі, бача сабака, што яго ніхто не шануе,— акрыўдыўся, мысля: «Я ж ім пакажу, хто я такі!» Пашоў к кату, просі дастаць паперы. Той палез к мышам,— аж яны даўно іх з'елі. Ну з тых пор у іх і пашлі гэта нінавісць адзін к другому: сабака на ката, а кот на мыш.

Аб Воўгі, Дняпры і Сажы, і бацькі іх Нівісном

Сож і Воўга былі раднэя сёстры, а брат Днепр. Ацец іх быў Нівіснэй. Вазврашчаліс яны. Воўга Нівісному была любезная дочка, а Днепр быў яму ўпраціўнік. Прызваў к сабе Нівіснэй Воўгу і Сож, а Днепр, хоць яго бацька ні зваў, пад дзвярамі слушаў, што будзіць ацец дачкам гаварыць:

— Вот вы, мае дочкі любімыі! Вот ты, Воўга, прыхадзі ка мне ў паўноч! Я цібе пашлю прыкраснымі гарадамі; прыкрасныя баркі па табе будуць хадзіць. Ну, і ты, Сож, прыхадзі! Пашлю цябе прыкраснымі мястамі, а Дняпра пашлю махамі, балатамі.

У паўноч Воўга ўскочыла і прыбіжала к атцу:

— Бацюшка, пара пасылаць!..

— А, ета ты, Воўга?

— Я.

— Падайдзі, дачушка, бліжый!

(Дачушкі былі касматы — шчаслівы.)

Пашчупаў яе.

— Благаслаўляю цябе прыкраснымі мястамі іцці: сяленіямі і гарадамі.

Загрымела — пашла.

А Днепр прашнуўся, пабег, пасматрэў на крываці: Воўгі нету, а Сож спіць. Нільзя Дняпру пад'явіцца замест сястры: у яго было цела чыстае — пашчупаюць і ўзнаюць.

Абвярцеў рукі пасканнямі, бягіць к атцу:

— Бацюшка, бацюшка, пара іціць!

— Ты, Сож?

(Пірымяніў гаворку, як сістра.)

— Ну, падайдзі сюда, дачушка!

Падайшла. Апяць спрасіў:

— Ты, Сож?

— Я, бацюшка.

— Пара пушчаць: а то скора свет будзіць.

Рукі падзіржаў, відаць, што касмата.

— Благаслаўляю цябе, дачушка, іцці прыкраснымі гарадамі — мястамі!

Днепр, як махнуў — знаіць, што сістра прашнецца — ірваў горы, дзелаў калены.

Прашнулась Сож — нет ні воднава на краваці, усхваціласъ біжаць к бацюшкі пад благаславенія.

— Бацюшка, пара пушчаць!

— Ты ж хто?

— Ды Сож.

— Я ж цібе паслаў.

— Даўжно Дніпра і Воўгу — я праспала!

— А, дачушка, верна, Днепр-машэннік, абманіў мяне — пашоў на тваім месці... Ну, дачушка, відна, пойдзіш на Дняпровым месці — ідзі уж махамі-балатамі!..

Усё махамі-балатамі ідзець Сож.

Пра Нёман і Лашу

Гэтых рэчак яшчэ не было. І ў тым месцы, дзе яны цяпер выцякаюць, стаяў у балоце стары корч, а пад карчом біла крыніца. Яна ўсё біла і біла...

І вось вада ўсё расцякалася, і ўжо выцягнулася ў маленькую канаўку... Гэта канаўка раз пабегла і пабегла па лугах. Гэта радзіліся Нёман і Лаша.

Нёман быў хлопец, а Лаша — дзяўчына. Нёман крэпка палюбіў Лашу. І вось яны беглі цэлы дзень, а сонца пячэ, і затаміліся яны. І вечарком ляглі яны спаць. А назаўтра, яшчэ раненька, устала Лаша, Нёман не пабудзіла і пабегла сабе ціханька.

Прачнуўся Нёман — няма Лашы. Ён усхапіўся і — напрамік, шукаць Лашу. І саўсім убок пабег, праз усё: і лугі, і горы, і, як кажуць, праз каменні да паленні...

І вось цяпер Лаша ціханька сабе, ціханька плыве, а Нёман ляціць і ляціць напрамік.

Пра чайку і возера Нарач

Даўным-даўно ў адной з нарачанскіх вёсак жылі чароўная дзяўчына Галя і прыгожы юнак Васіль. Моцна кахалі яны адзін аднаго. Хлопец — майстар на ўсе рукі. Ён зрабіў незвычайнае люстэрка і падарыў яго сваёй каханай. Толькі нядоўга

былі шчаслівыя Васіль і Галя. Ненавісны багацей Барына захацеў завалодаць прыгажуняй. Бацька Галі заступіўся за дачку і загінуў ад рук прыгнятальніка. На выручку ёй прыйшоў Васіль. Ён забіў ненавіснага Барыну, вызваліў каханую, але ў няроўнай стычцы загінуў сам. Гэта бачыла Галя. Яна траціць прытомнасць і выпускае з рук люстэрка. На часткі разбілася яно. І на месцы, дзе ўпалі срэбныя асколкі, утварылася возера.

І з тае пары дзяўчына крылатай чайкай над Нараччу кружыць, спявае для любага.

Ад чаго Нясвіж пашоў

Тут, дзе цяперака замак стаіць і аж да Качаноўскага лесу, некалі было паросшы ўсё лесам. А ў тым замку, што на высокай гары, жылі паны. Яшчэ пры паляках там былі муры, людзі цэглу бралі. Дык вось з гэтага замка і пашлі яны на паляванне на тое месца, дзе цяпер Нясвіж. А тады яны палявалі на мядзведзяў. Я яшчэ помню, як Радзівіл біў мядзведзя, дзе цяпер лагчына глыбокая, што як на Качановічы ісці і на лінію. Ён тады аднекуль прыводзіў мядзведзя, выпусціў яго, а пасля з усёю світаю забіў.

Ну, дык, значыць, як паехалі паны на паляванне, так паспорылі, хто пяройдзе цераз балаты, што там былі. А балаты вялікія. Ну, і паспорылі яны. Дык адзін з іх ішоў, дык забіў мядзведзя. Потым прашоў і прышоў назад у гэты замак. Ну, яго пытаюць, як, што? Ён кажа, што прайшоў усё балота і мядзведзь папаўся, вось я яго і забіў.

Ну, яны потым пашлі правяраць. Доўга хадзілі па балоце, наканец нашлі мядзведзя. А летам было, дак мядзведзь трохі прыпах.

— Не свеж,— кажа адзін з іх.

Вот ад гэтага і пачалі званць Нясвіж.

Потым тут замак зрабілі, людзі пачалі жыць.

Кажуць, што нават падземным ходам злучаецца ён з тым, што на высокай гары стаіць. Казалі некаторыя, што з Мірскім замкам тожа быў ход.

Каб што ў кнігах пачытаў, то і знайшоў бы што-небудзь, а так што — людзі ўсяляк гавораць.

Пра скарб

Там, дзе ад шляху пашла паваратка на Зялёную Параслю, у правую руку, як ісці ад Рэчыцы к Хвайнікам, у калодзезі е вялікі браварны казан, поўны грошай, накрыты млінавым

каменем. Сколькі раз людзі хацелі выкапаць тыя грошы, да як толькі дакапаюцца да таго каменя, каторым пакрыты кацёл, так зараз з Рэчыцы і ляцяць казакі з голымі шаблямі. Людзі паўцякаюць, то і казакі шчэзнуць, а далей і места зараўняецца, як бы нічога ніколі.

Як п'яніца ў рай папаў

Прыходзіць п'яніца к царству нябеснаму і ў дзверы стукае:

— Адчыніце!

У апостала Пятра ключы ад царства нябеснага; дык ён чуе стук, падыходзіць к дзвярам:

— Хто тут?

— Ды я.

— Хто ж ты?

— Ды п'яніца. Пусці мяне ў царства нябеснае!

— Ну, тут п'яніц няма — нельга!

— А ты хто, што мяне не пускаеш?

— Я апостал Пётр!

— Я знаю цябе: гэта той, што ад Хрыста адракаўся, не паспеў пятух тры разы прапець, а цяпер ты ў міласці ў Бога! А я, хоць і п'яніца, а Хрыста не забываю: калі пападзецца чарка гарэлкі, то гавару: «Госпадзі, благаславі!» А ад Хрыста я ні разу не адракаўся, як ты. Я ўсё, брат, знаю.

Няма чаго гаварыць Пятру супроць гэтага, назад вярнуўся, падышоў к Паўлу:

— Ідзі, Павел, пагавары ты з ім!

Падыходзіць Павел к дзвярам.

— Хто тут?

— Я, п'яніца; пусці мяне ў царства нябеснае!

— Тут п'яніц не прымаюць.

— А ты хто, што мяне не хочаш пусціць?

— А апостал Павел.

— А, Павел! Знаю: гэта той самы, што гнаў Хрыста ад Ерусаліма да Дамаска; а цяпер ты ў яго ў міласці! А я ж ніколі Хрыста не гнаў, а калі прыдзецца чарачка гарэлкі, то зараз жа: «Госпадзі, благаславі!» А не гнаў Хрыста па-твойму.

Нечага адказваць Паўлу супроць гэтага: вярнуўся назад і расказаў Пятру пра ўсё.

Гаворыць Пётр:

— Ну, пашлём евангеліста Івана: ён ад Хрыста ні разу не адракаўся — няхай-ка з ім пагаворыць.

Падыходзіць к дзвярам Іван:

— Хто тут?

— Я, п'яніца; пусціце мяне ў царства нябеснае!

— А, ты п'яніца і просішся! Такіх сюда не прымаюць.

— А ты хто такі, што не хочаш мяне ўпусціць?

— Я евангеліст Іван!

— А, ты евангеліст! Навошта ж вы абманваеце людзей! Вы напісалі ў евангеллі: стучыце — і адчыняць вам; прасіце — і атрымаеце! Хіба гэта не абман! Я гадзіны дзве стаю і стукаю, а мне не адчыняюць. Калі ты мяне не ўпусціш у царства нябеснае зараз жа, то я вярнуся на белы свет і раскажу людзям, што вы напісалі ў евангеллі няпраўду.

Спужаўся Іван сораму і ўпусціў п'яніцу ў царства нябеснае.

Машэка

Па ўсёй амаль Магілёўскай губерні вядома імя Машэкі, нейкай страшэннай пачвары, якой палохаюць дзяцей. Ці заплача малое, ці закапрызіць, звычайна кажуць яму: «А вунь Машэка! Машэка ідзе! Машэка пачуе!» Або хто зробіць непрывабную, пачварную грымасу, таксама крычаць на яго: «Машэка! Машэка!»

Народнае паданне сведчыць, што імя гэта гістарычнае і звязана з гісторыяй Магілёва. Вось паданне, як яно захоўваецца ў вуснах нашага народа.

На тым месцы, дзе зараз Магілёў, стаяў цёмны непраходны лес, скрозь гушчар якога не мог прабіцца нават промень сонца. Ад гэтага лесу і Дняпру было цесна, а Дняпро ў тыя часы быў шырокі і злосны. У лесе, у чашчобе быў страшэнны разбойнік, якога звалі Машэкам. Ён быў дужы, як волат: адной рукой спыняў васьміконны экіпаж на ўсім скаку і адным разам вырываў з карэннямі вялікія сосны. А хадзіў ён у мядзвежай шкуры поўсцю наверх. Не такі тады быў народ, як зараз, шмат было асілкаў, але ўсе дрыжэлі перад Машэкам, і пяць дзесяткаў нічога не маглі зрабіць супраць аднаго. Машэка наводзіў жах на ўсе навакольныя вёскі. Хаця людзі жылі тады вялікімі паселішчамі, ён бязбоязна ўваходзіў у кожную вёску і браў, што яму было трэба. Усюды самі адчынялі яму вароты, каб толькі пакінуў жывога. Не раз выходзілі супраць Машэкі вялікімі дружынамі, але ён жыў у такой непраходнай глухамані, што ніхто не знаходзіў не толькі логава, але нават дарогі назад, і ўсе або паміралі з голаду, або былі забіты кісцянём.

Але і на Машэку прыйшла пагібель. Чаго не маглі зрабіць сотні людзей, зрабіла адна жанчына. Аднойчы па дарозе праз лес ехала плеценая васьміконная брыка, у якой сядзеў малады

мужчына з прыгожай жанчынай. Раптам з'явіўся Машэка з-за вялізнай яліны, у адзін міг спыніў брыку і адправіў на той свет кучара, так што той і азірнуцца не паспеў. Убачыўшы, што тут не да жартаў, мужчына, што сядзеў у брычцы, выхапіў шаблю і з усяго размаху ўдарыў Машэку па галаве, але шабля пераламалася аб стальную шчэць, а мужчына прырос да свайго месца ад аднаго ўдара разбойніка. Але глянуўшы на жанчыну, Машэка аслупянеў.

Ён пазнаў у ёй старую знаёмую. Яна, не прыняўшы кахання Машэкі, прымусіла яго пасябраваць з буйным ветрам. Калі прайшло здзіўленне, Машэка ўзяў у свае лапы паўмёртвую ад перапугу прыгажуню і аднёс у сваё логава. Тут яна апрытомнела, адразу зразумела сваё становішча і склала план, як бы звесці са свету вылюдка. Яна прыкінулася лагоднай, так што разбойнік цалкам паверыў ёй. Аднойчы ён бестурботна заснуў пры ёй крэпкім сном. Яна асцярожна дастала вялізны нож — і кроў палілася ракой з перарэзанага горла вылюдка. Зрабіўшы гэту справу, прыгажуня неяк выйшла на дарогу, прыйшла да сваіх і паказала ім праклятае месца, дзе з вялікім ганьбаваннем закапалі таго людаеда і назвалі гэтае месца магілай льва.

Недалёка ад таго месца знайшлі вялікі бугор ці гару, якая ўся была абліта крывёю і ўсыпана касцямі нявінных ахвяр Машэкі.

Пасля Машэкі тут было яшчэ шмат разбойнікаў, дзеля знішчэння якіх мясцовыя ўладары-князі прызначылі тое месца для высылкі злачынцаў. Злачынцы паволі вырубілі лес і праз гэта прагналі разбойнікаў. З цягам часу на тым месцы быў заснаваны горад, які, ці то ад мноства магіл забітых разбойнікамі людзей, ці ад магілы льва Машэкі, назвалі Магілёвам.

Нарач

У гушчары старых бароў, як сляза, упаўшая з неба, блішчэла вялікае возера. Вельмі прыгожым яно было. Расказы пра яго чароўнасць ішлі ад паселішча да паселішча і нават у далёкія краіны заходзілі.

А яшчэ казалі людзі, што ў вёсцы, што прыляпілася да аднаго з берагоў возера, жыла дзяўчына-сірацина па імені Найрыта, а аднавяскоўцы звалі яе Нарай. Вочы яе блакітныя, колеру азёрнай хвалі, заўсёды весела ўсміхаліся. Залацістыя валасы тугой касой абкручвалі галаву. Голас у яе быў высокі і гучны.

Бывала сядзе на беразе пад разлапістым клёнам, дзе збіра-

лася звычайна моладзь, на гусельках грае і спявае. Спачатку голас павольна плыве, а пасля ўзлятае высока і ляціць над пабярэжжам. У гэты час і птушкі спынялі свой спеў. Людзі забываліся пра сваё гора.

Аднойчы, калі Нара спявала, праязджаў вёскай пан, стары ўдавец. Пачуў ён дзівосную песню і загадаў спыніць каня. Слухаў, слухаў і сказаў Нары: «Прыгожая кветка выросла ў дзікім краі. Табе толькі спяваць у маіх пакоях».

— Кепская з мяне будзе служанка,— прамовіла Нара.

— Ты будзеш гаспадыняй, жонкай маёй,— зазначыў пан.

Вакол Нары сядзелі на зялёнай мураве хлопцы і дзяўчаты. Адзін з іх, чарнявы хлопец, падыйшоў да пана.

— Гэта мая нявеста,— сказаў ён,— а пан няхай сярод паноў жонку шукае.

— Ці не сын ты таго Пятра, што бунтаваў мне народ? — успомніў пан, чырванеючы ад злосці. І залемантаваў: «Узяць яго!»

Прыслужнікі звязалі Андрэйку і павезлі ў маёнтак. Больш яго ніхто не бачыў. Праз некаторы час пасля гэтага здарэння пан зноў прыехаў да Нары даведацца, ці згодна яна да шлюбу. Дзяўчына зрабіла выгляд, што згадзілася. Тут жа дамовіліся пра вяселле.

Надышоў гэты дзень. Злосны вецер гнаў цёмныя хмары, а лес спяваў жалобныя песні. Нара ехала на фурманцы ў маёнтак, у руках трымала пакунак. Сустрэлі яе служанкі. Завялі ў панскія пакоі і апранулі ў шлюбнае адзенне. І Нара выйшла такой прыгажуняй, што ні пяром апісаць, ні ў казцы расказаць. Пакланілася яна пану ды папрасілася перад шлюбам крышку адной пабыць у пакоях. Пан згадзіўся. Ходзіць ён па дварэ, на служанак пакрыквае і на дзверы паглядвае.

А Нара тым часам з пакунка дастала смалякі ды падпаліла пакоі адзін за другім. І калі шугануў чорны дым з вакон, а па даху заскакалі чырвоныя языкі полымя, выскачыла праз вакно і на сваёй фурманцы, паганяючы каня, паехала ў вёску. Прыйшла на тое месца, дзе з Андрэйкам часта сустракала ўсход сонца, прыхілілася да клёна і горка заплакала.

Да тут пачуўся конскі тупат. Прыехалі панскія служакі. Бегалі па ўсёй вёсцы. Людзей бізунамі білі. Дапытваліся, дзе Нара.

— Вось яна,— закрычаў адзін з іх.

— Жывую не возьмеце,— крыкнула ворагам дзяўчына і кінулася да возера.

Цёмныя хвалі з белымі грабянямі ішлі адна за другой, а на беразе калыхаўся човен. Той човен, у якім Нара з Андрэй-

кам не раз каталіся. Спрытна і ўмела ўхапілася яна за карму і, адштурхнуўшыся ад берага, села ў човен.

— Я адпомсціла, пан, за Андрэйку, за яго бацьку і за ўсіх тых, хто загінуў ад тваіх рук у тваім маёнтку,— прашаптала Нара.

Ад злосці панскія служакі кінулі гуслі ў возера. А човен адплываў усё далей і далей, потым зусім знік у хвалях. Усю ноч бушавала возера. Стагналі хвалі...

З таго часу і назвалі людзі возера імем смелай дзяўчыны. Да нашых дзён дайшла назва Нарач.

Пра возера Баторына

1

Раней Мядзель быў вельмі вялікім горадам, які цягнуўся ад цяперашняга Мядзеля аж да Волачка. Горад быў багаты і меў тарговыя шляхі. Са сваім войскам, для захвату Мядзеля, рушыў князь Батурын. Каб хутчэй дайсці да горада, ён павёў сваё войска не вакол возера, а напрамую праз возера. Але чужынцаў чакала вялікая бяда. Калі войска дайшло да сярэдзіны возера, раптам лёд праламаўся, і возера пад лёдам схавала ўсё войска князя Батурына, разам з ім самім. Ні адзін воін не дайшоў да горада. З гэтага часу возера носіць назву «Батурына». Яна дайшла і да нашых дзён. Яшчэ і цяпер рыбакі часта выцягваюць з возера каскі чужынцаў.

2

Непадалёку ад Мядзеля знаходзіцца возера Баторына. Раней яно не мела ніякай назвы. Але старыя людзі ведаюць легенду аб тым, як гэта возера пачало называцца Баторынам.

Гэта было ранняй вясной. Польскі кароль Стэфан Баторый уцякаў са сваім атрадам з Масквы. Дарога ішла праз возера. Лёд на возеры быў ужо слабы, і ўвесь атрад патануў у возеры. Пасля гэтага возера і сталі называць Баторынам.

Адкуль Рубеж

Пра войны тыя нам дзяды расказвалі, ну а ў кніжках можа і ні так, як мы знаім. Тут і шведы былі, і палякі, і французы, ну, усіх іх і пабілі. Во, можа слыхалі, тут недалёка Рубеж, дак то шчэ ад татар. Прышлі яны і сталі супроць нашага войска. А раней дак перш біліся князі ці багатыры, а за імі ўжо войска. Вышлі на поле татарын і рускі, біліся конныя,

потым пешшы, ну ніхто не пераможа. На другі дзень, аддыхнуўшы, зноў сышліся. І зноў таксама ніхто не пабядзіў. Так і прастаялі сем дзён, пакуль не знайшоўся такі малады хлопец, што як схапіў таго татарына, да як кінуў яго вобземлю, так і ўбіў. А за ім і ўсё войска на татар пайшло, пабілі іх многа, каторых пабралі да паразганялі.

Дак ад таго і Рубеж завецца, што доўга на ім стаялі. А ў капцах недалёка татары закапаны.

Пра вайну са шведамі

У 1709 годзе, калі Пётр Вялікі атрымаў вядомую перамогу пад Палтаваю над шведскім каралём Карлам XII, шведы па дарозе назад пераходзілі праз Валожын, абрабавалі і разарылі тутэйшых жыхароў. Яны ўварваліся таксама ў царкву.., забралі там усё... і паставілі ў ёй коней. Некаторыя з шведскіх салдат пачалі былі страляць у абраз святой Параскевы... і за тое... аслеплі.

Услед за шведамі прыйшоў атрад рускіх войск, а з ім і сам рускі цар, Пётр Вялікі. Ён асабіста аглядаў аграбленую непрыяцелямі царкву.

Бітва пад Лясной

Швед, разбіты пад Лясной, трапіў у балота Чыстая Лужа. Там патанулі ў дрыгве яго гарматы, коні, людзі, а галоўны начальнік іх — Левенгаупт — кінуўся цераз Брадзілаў мост на Прапойск. Прапойскія перавознікі на вачах у шведаў хутка знішчылі паромы на Сожы. У той жа час на левым баку Сожа, у Старынцы і Краснаполлі, з'явіліся казакі. Яны не дапусцілі шведаў да пераправы і пагналі іх далей, на Рудню... Тут шведы пакідалі сваё ваеннае снаражэнне ў балота і разбегліся па лясах, ратуючыся ад пагоні рускіх... Начальнікі шведскія кінуліся да Сожа, закапалі там пад сасновым крыжам купу золата і срэбра... І давай уцякаць па слядах свайго караля.

Вайна шведска

Як то было кедысь цяжка на свеце, неспакой, от шведска вайна была, мноства рознага войска цягалася па свеце. От тады ішлі якіясьці Сасы, Тарантасы, не зналі нашай мовы, а мы іх. Бог іх ведае, як яны гаварылі, толькі ўвойдзе да хаты і крычыць: «Пекі курка!», то ледзьве дамысліліся, што ён кажа — палі печ. Забіралі людзям хлеб, авёс, на хвурманкі

гналі, а некаторыя як паехалі, то і прапалі з імі зусім. От, кажуць, з Дрыгі неякі Баран Мацей і Балдыка стары прапалі. А возьмуць дзяцей, пазасаджаюць шыямі за лаву, прыціснуць лаваю і падушаць. А старшыя паўцякалі да лесу, дзеўкі ўсе ў лесе сядзелі, бо не можна было быць дома. Так, бывала, яны падходзяць пад лес і крычаць: «Крыся, Марыся, жані валэ да дому, жані!» А як катора выйдзе з леса, то ўжо яе ўхопяць і робяць, што хочуць, з ёю.

Платон-казак

У дванаццатым гаду падняўся на белага рускага цара пранцуз Напальён. Нагнаў ён сюды войска, бы цёмная хмара, ды й пачаў паліць вёскі, гарады ды забіваць людзей. Пахаваліся людзі, хто паспеў, у лес ці за балота, загналі туды ўвесь свой статак, а дабро закапалі ў зямлю. Знішчылі пранцузы ўвесь край, змарнавалі ўсё дабро, так што й самі пачалі падыхаць з голаду. Пераелі паганыя сабак ды катоў, палавілі мышэй ды пацукоў, пастралялі ўсіх варон ды й паелі ўсялякую погань. Сам цар Напальён ходзіць сабе на балоце ды ловіць жабы або чарапахі, каб пасілкавацца, бо голад не свой брат, кожнага як засмокча, дык гатоў сам сабе руку адгрызці. Соўваюцца галодныя пранцузы, бы сонныя мухі, ды збіраюць чарвякоў, жукоў ды ўсялякіх слізнякоў, каб хоць гэстаю пошкуддзю набіць сабе лантух. От і пачалі людзі памаленьку вылазіць з лесу ды дабіваць тых гадаў. Збяруцца яны дзе-небудзь грэцца ў хату, а тут бы з зямлі вынырне Платон-казак, да й запаліць адусюль тую хату. Пякуцца пранцузы, бы картопля ў прыску, пякуцца, а вылезці з хаты не могуць, бо дзверы калом падпёрты. Гуляе Платон-казак то тут, то там і ніяк яго не могуць злавіць пранцузы. Абяцаў Напальён вялікі гасцінец таму, хто зловіць Платона-казака, ці хоць скажа, дзе ён. Але ніхто не можа таго сказаць, бо Платон-казак лятае, бы арол, плавае, бы шчупак, бегае, бы хорт. От пераадзеўся ён за купца ды й прыехаў к Напальёну, нібыта прадаваць хлеб. Прымае яго Напальён ды й пытае:

— Ой ты, слаўны купец-маладзец, ты ўсюды па свету бываеш, усё бачыш, усё знаеш, мо Платона дзе стракаеш?

— Ну, няма таіць чаго,— добра знаю я яго.

Цар тут разам схамянуўся, на Платона азірнуўся. Дак казак той не дурак, паказаў яму канчак. Замахнуўшыся з пляча, рэзнуў трэйко згарача, аж звалілася карона: сам ускочыў у стрымёна дый крычыць:

— Лаві Платона!

От такі то быў казак, што пранцузам даўся ў знак. Ён па

полю раз'язджае, страх на армію наганяе, паліць генералаў хаты да бярэ ад іх гарматы; забягае на дарозе, топіць войска ў Бярозі. От адзін стаў Напальён, хоць прывёў да нас мільён. От і едзе той казак па полю, смела даў каняцы волю. Жыта поруч каласіцца, крыж за горкаю ласніцца. Сонца грэе, аж пячэ, толькі пот з ілба цячэ. От ён шапачку здымае, Бога шчыра праслаўляе, што памог пранцуза раць з края роднага прагнаць. Толькі ў жыце зашумела, раптам сэрца бы згарэла. Толькі ён перахрысціўся да й на карак да каня схіліўся. Казакоў падбегла двое.— Мабыць, месца тут ліхое.— Перш пранцуза тут забілі, а Раманава мястэчка на жалобу запалілі. Бы свяча, дамы палаюць,— то Платона памінаюць. Слёзанькі з вачэй цякуць, песню ж казакі пяюць, як вялікі той казак згінуў дарам небарак.

Дзяды расказвалі

А былі ў Пагосце і туркі, даўно-даўно. Нам пра іх дзяды расказвалі, а ім іхнія дзяды. Тур, што з таго канца паўз сяло да Сцвігі цягнецца, таго так завуць, што ў ім турак утапіўся. Ехаў па тонкаму лёду на кані, праваліўся да ўтапіўся. Глумяліся туркі над нашымі людзьмі. Людзі хваліся ад іх па зарэччу, у лесе, дзе прыходзілася. Як уполету, так і ў далінах хваліся, дзе капелюшніку багата. Залезе чалавек у даліну, галаву з вады высуне, штоб дыхаць можна было, а галавы не бачна, бо капелюшына зверху прыкрывае. Вось адзін раз паўцякалі людзі ад туркаў з сяла, хаваюцца, дзе хто. Каторыя то ў Дзедавай даліне, што каля панскага поля, пад капелюшнік пахаваліся. Сядзяць да перажыдаюць, пакуль туркі з сяла пойдуць. Аж некі чалавек ідзе паўз бераг да па-нашаму нашых людзей гукае: «Куліна-а-а, Марына-а-а, хадзі пашлі-і-і!» А ў вадзе якраз нейкая Куліна і сядзела. Паверыла на гэты голас, вылезла да таго чалавека. Мокрая ўся. Падышла, аж бачыць, што гэта турак — чорны, з вусамі, з шабляю, толькі ў наша адзенне перадзеты. Уцякаць не пабегла — дагоніць да яшчэ зарубае. Загадаў ён ёй у сяло йці да свае хаты. Зайшлі ў яе хату, да ён загадаў яду яму згатовіць да вады багата нагрэць, штоб яму памыцца. Затапіла яна печ, прыставіла там нешта, мо картоплі, мо крышаны, мо боршч, Бог яго ведае, а яшчэ вады ў вялікім чыгуне прыставіла, як турак загадаў. Агонь у печы гарыць, у чыгунах да гаршках вада кіпіць, нешта варыцца, а Куліна каля печы стаіць. А турак сеў на парозе, сцеражэ жонку. Да бачыць жонка, што галава яго набок пахілілася, вочы зліпліся. Задрамаў турак. А вада ў вялікім

чыгуне парыць моцна, кроп ужо ў чыгуне. Куліна гэты чыгун вілкамі з печы выцягла, абматала шматкою, узяла дзвюма рукамі да як шамнула ўвесь кроп турку на галаву. Апарыла яго, ды ён кончыўся. Вось так жонка турка накарміла і сама жывая засталася.

Анекдоты



Паразаічныя жанры малой формы — анекдоты, жарты і гумарэскі — узніклі амаль адначасова з сацыяльна-бытавымі казкамі, развіваліся ў цеснай сувязі з імі; актыўна бытуюць і зараз.

Пад а н е к д о т а м (ад грэч anekdotos — неапублікаваны) да палавіны XIX ст. разумелі кароткае камічнае апавяданне пра смешны выпадак з жыцця якога-небудзь вядомага гістарычнага дзеяча. Пазней анекдотам сталі называць невялікае вуснае аднаэпізоднае апавяданне пра незвычайную, смешную падзею, сітуацыю, рысу характару чалавека ці ўчынак з неспадзявана камічнай развязкай. Блізкім да анекдота з'яўляецца ж а р т, у аснове якога таксама апавяданне пра смешнае здарэнне, дасціпная насмешка. У параўнанні з анекдотам, які выстаўляе на смех і сацыяльна-палітычныя з'явы, жарт звычайна незласліва высмейвае бытавыя здарэнні, паасобныя малаістотныя, але смешныя рысы і якасці людзей, іх дзіўныя ўчынкі. Як і для анекдота, для жарту характэрна аднаэпізоднасць, нечаканасць выніку. Найбольш папулярная форма жарту дыялагічная. Праз кароткі дасціпны дыялог выяўляецца асноўны ідэйны сэнс твора, накіраванасць насмешкі.

Добразычлівым характарам смеху вызначаецца і г у м а р э с к а, або досціп,— таксама невялікі апавядальны твор, у якім трапна высмейваюцца прыватныя з'явы, паводзіны людзей. Для гумарэскі не абавязковыя нечаканы камічны вынік, аднаэпізоднасць. Жанравыя межы паміж анекдотам, жартам, гумарэскай невыразныя, і нярэдка творы гэтых жанраў у зборніках змешваюцца.

Як і іншыя народныя творы, асабліва сатырычнага і гумарыстычнага характару, анекдоты ў дакастрычніцкі час былі перш за ўсё важнай ідэйнай зброяй у барацьбе з сацыяльным прыгнётам. У іх з бязлітаснай іроніяй і сарказмам народ выкрывае дэспатызм і жорсткасць, прагнасць і скупасць, крывадушша і карыслівасць паноў, папоў і іншых эксплуататараў. Вельмі пашыраны ў гэтых анекдотах прыём супрацьпастаўлення дурному пану мудрага, кемлівага і дасціпнага мужыка. Селянін спрытна выкарыстоўвае слабасці свайго працiўніка, смяецца і здзекуецца з яго, як, напрыклад, у анекдотах, якія па форме нагадваюць распаўсюджаныя ў XIX ст. ананімныя гутаркі пана з селянінам. У іх мужык наўмысля прыкідваецца дурнем, каб лепш накпіць з пана.

Бязлітасна высмейвае народ і панскіх памагатых — войта, аканома, старасту, пісара. У анекдоце «Віншаванне», напрыклад, высмейваецца ўгодлівасць, ліслівасць, падхалімства панскіх лакеяў. З жадання панскай дворні павіншаваць пана з нараджэннем дзіцяці атрымаўся толькі канфуз.

Раскрываецца ў сатырыка-гумарыстычных жанрах і становішча працоўных. З горкай іроніяй гаворыцца ў іх пра беднасць палешукоў, якія не ведалі нават, што такое боты. Беларускія анекдоты пра палешукоў нагадваюць рускія пра пашахонцаў.

Жарты, анекдоты і гумарэскі — вельмі пашыраныя жанры і ў савецкі час. І зараз існуе нямала анекдотаў, у якіх расказваецца, як дасціпна і знаходліва дзейнічае герой, што трапіў у смешныя абставіны. Аднак анекдоты вызначаюцца не толькі цікавым, камічным і дасціпным зместам. Ствараюцца яны, як правіла, на важныя, актуальныя тэмы. Многія сучасныя народныя жарты і анекдоты накіраваны супраць п'янства, ашуканства, крадзяжу.

Сатырыка-гумарыстычныя творы перыяду Вялікай Айчыннай вайны высмейвалі нямецка-фашысцкіх захопнікаў, развейвалі міф аб непераможнасці гітлераўскай арміі, адлюстроўвалі патрыятызм, высокі маральны дух савецкіх людзей, іх нянавісць да фашысцкіх ваяк.

Тэматыка жартаў, анекдотаў, гумарэсак разнастайная. Ёй адпавядае і багацце мастацкіх сродкаў. У анекдотах, жартах і гумарэсках выкарыстоўваюцца гіпербалізацыя, завастрэнне, іронія, сарказм, гратэск, кантраст і іншыя мастацкія сродкі. Як і ў казках, у анекдотах нярэдка вылучаецца толькі адна адмоўная рыса або якасць персанажа, на якой і акцэнтуецца ўвага. Анекдот, жарт і гумарэска адразу ж уводзяць у дзеянне, без экспазіцыі, зачыну, дэталізацыі. Важнай асаблівасцю пабудовы анекдота і жарту з'яўляецца неадпаведнасць і нават супярэчнасць паміж апавядальнай, асноўнай яго часткай, і заключнай (канцоўкай). Камічны эфект нярэдка і дасягаецца з дапамогай гэтай супярэчнасці. Як правіла, прама выказаная мараль у анекдоце адсутнічае. Яна вынікае са зместу твора, сэнс, ідэя якога не заўсёды «ляжаць на паверхні»: часам яны заключаны ў падтэксце. Анекдот больш, чым іншыя жанры, патрабуе актыўнага мыслення слухача. Нямала сатырыка-гумарыстычных твораў запісалі дарэвалюцыйныя фальклярысты. Шмат беларускіх анекдотаў і жартаў змясцілі ў зборніках П. В. Шэйн, Е. Р. Раманаў, У. М. Дабравольскі, М. Федароўскі, А. К. Сержпутоўскі.

ЛІТАРАТУРА

Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: В 3 т. Спб., 1893. Т. 2.

Сержпутовский А. К. Сказки и рассказы белорусов-полешуков. Спб., 1911.

Беларускія народныя жарты/Склаў З. Бяспалы. Мн., 1970.

Жарты, анекдоты, гумарэскі/Склад. А. С. Фядосік. Мн., 1984.

Беларуская народна-паэтычная творчасць. Мн., 1988.

Віншаванне

Жыў-быў адзін пан і ў яго радзіўся сын. Уся дворня задумала, як найлепш пакланіцца пану, а іх аканом так навучае:

— Я буду ісці першы, гасцінца яму прынясём, я буду на галаве нясці яму поўную карзіну яец, старшына варону, а стараста маслёнку. Як прыдзем, я буду першы гаварыць. Ты, старшына, скажы: «Са ўсім дваром»; а ты, стараста, скажы: «З дзяцьмі і з жонкай»; а ты, парабак, скажы: «З усім набыткам».

Яны прышлі скора к пану ў пакой. У аканома вяроўка адвязалася ад лапця і, як парабак увайшоў і нагой прыдзяржаў, няўмысля, вяроўку, аканом паваліўся і крычыць:

— Бадай ты прапаў.

Старшына не пачуў, што аканом гаворыць, і кажа:

— Са ўсім дваром.

А стараста кажа:
— З дзяцьмі і з жонкай.
Парабак кажа:
— Са ўсім сваім набыткам.
Пан, як пачуў гэта, прагнаў іх кіем, як сабак, вон.

Даведаўся

Зайшоў селянін да пана, а той якраз паеў і парожнюю міску перавярнуў. Селянін і пытае:
— Пане, а чаму вы як паелі, то перавярнулі міску?
— Гэта значыць, што я наеўся.
— Вось яно што! А я ўсё думаў, было, чаго гэта мая свіння, як толькі паесць, дык і пераверне карыта.

Сваю службу знае

Адзін пан пытаецца раз у свайго фурмана, ці той паедзе з ім у вялікую дарогу.
— За вамі, пане, усюды,— адказвае фурман.
— Як гэта ўсюды? Нават у пекла?
— Нават у пекла!
— Але падумай сабе, што ў пекле надта ж горача, агонь.
— Нічога, пане,— кажа фурман,— я сваю службу знаю, высаджу пана ў пекле, а сам, як заўсёды, буду чакаць перад брамай.

Самыя лепшыя грушы

Адзін пан паслаў слугу за грушамі і сказаў:
— Купі мне самых лепшых.
Слуга прышоў у краму і папрасіў груш. Купец падаў яму. Але слуга сказаў:
— Не, дайце мне самых лепшых.
Купец кажа:
— Паспрабуй адну, тады пазнаеш, што ўсе добрыя.
— Як я пазнаю,— кажа слуга,— што яны ўсе добрыя, калі паспрабую толькі адну?
І слуга паадкусваў патрохі ад кожнай і прынёс іх пану.

Хітры хлапчук

Хлапчук вёў на вяроўцы цяля, якое кідалася ва ўсе бакі. А тут якраз ураднік праязджаў.

— Ты чаму перада мною шапкі не знімаеш, хам?! — закрычаў ён на хлапца.

— Калі ж мае рукі заняты, пане ўраднік. Злезце, калі ласка, з воза, патрымайце цяля, а я шапку зніму.

Рапарт пану

Пан пад наглядам старшага конюха адсылаў свайго любімага каня на выстаўку. Па дарозе жарабец здох, і конюх рапартуе пану:

— Міласцівы пан, сівы жарабец здох, скуру вашу панскую здзёр і прадаў, а за грошы для вашай міласці хамут моцны купіў, аб чым данашу і шчыра дзякую.

Разышоўся, як заечае сала

Едуць пан з кучарам. Пан і гаворыць:

— Во, убіў я зайца, дык з яго сала было з цэлы пуд.

А кучар яму:

— Во, пане, будзем ехаць праз мост, дык там чорт брахуноў хапае.

— А далёка той мост?

— Ды не,— кажа кучар,— во за гэтым лесам, дзе горка, а там луг, а там ужо зусім блізка.

Як уехалі яны ў лес, пан зноў кучару:

— Каб ты бачыў таго зайца! Аднаго сала яго было хунтаў з дзесяць.

Едуць яны далей, праехалі ўжо лес, дык пан:

— Ну, можа, не дзесяць, але ж хунтаў пяць з таго зайца сала было.

А як пайшла дарога лугам, дык пан ужо:

— Ну, хоць сала на ім не было, а ўсё ж заяц быў і не такі худы.

Едуць яны далей. Праехалі луг, грэблю, а моста ўсё няма.

— А дзе ж той мост? — пытае пан.

— А разышоўся, як заечае сала.

Суддзя і селянін

Лысы суддзя дапытвае селяніна.

— Што прымусіла цябе не заплаціць падатак?

— Нічога не выросла, паночку,— адказаў селянін,— зямля пустая.

Суддзя паказаў пальцам на зямлю і дадаў:

— Калі б ты, гультай, захацеў, дык і на пустой зямлі вырасла б што-небудзь!

Селянін паказаў пальцам на лысіну суддзі і запытаў:

— А хіба на тваёй галаве, паночку, што-кольвечы расце, калі яна зусім пустая?

Дурны суддзя

— Вы прызнаеце сябе вінаватым у тым, што абразілі пана Казлоўскага, назваўшы яго дурнем?

— Якая ж гэта абраза, пане суддзя, калі ён сапраўды дурны?

— Усё роўна няможна, гэта абраза асобы.

— А калі дурня ды назавеш разумным — гэта можна, пане суддзя? Гэта не будзе абразай?

— Гэта можна.

— Які ж вы разумны, пане суддзя.

Добра зразумеў

Пані з брыдкім і страшным тварам, наняўшы фурманку, пытаецца ў фурмана:

— Ваш конь не выверне, ён не баязлівы?

— Нічога, сядайце: ён не будзе назад аглядацца.

Што ні пан, то сабака

Едзе мужык і вязе свінню, а насустрач ідзе пан з сабакам. Пан кажа:

— Што ні мужык, то свіння.

А мужык доўга не думаючы адказвае:

— Што ні пан, то сабака.

Жартаўлівы гаспадар

— Гаспадарыку, гаспадарыку,— кліча парабак,— конь захварэў!

— А што ж там яму?

— А Бог яго ведае,— чыста пахмурнеў,— нат піць не хоча.

— Ну,— кажа,— калі піць не хоча, зробім яго старшынёй, то, нябось, навучыцца!

Мужык і пан

Калісьці аднаму мужыку трэба было кудысьці паехаць чыгункаю. Паехаў ён, але на нейкім вакзале, дзе ён перасядаў

на другі цягнік, захацелася яму есці. Шукаў, шукаў месца каля стала — ледзь знайшоў, бо народу было шмат.

Толькі пачаў там есці, як ні адсюль, ні адтуль з'явіўся нейкі вяртлявы панок са шклянкаю чаю ў руках. Стаў каля мужыка ды й глядзіць на яго, нібы кажа: «Ану ўступі, мужык, месца пану».

Але мужык быў не з баязлівых — есць і ні гу-гу. Тады панок і кажа голасна, так, каб мужык пачуў, да іншых панкоў, што сядзелі кругом:

— А скажыце ж, вяльможныя панове, якая розніца між мужыком і свіннёю? — І, сёрбаючы чай стоячы, глядзіць на мужыка.

А мужык, не доўга думаючы, ды:

— Розніца ёсць, пане!

— Якая?

— Ды такая, што мужык есць седзячы, а свіння стоячы.

Чым частавалі пана

Аднаго разу прыехаў у вёску пан (можа і поп) дань сабіраць. Сабраў многа і адправіўся дамоў са сваімі прыслугамі. Але вось пану захацелася піць, і ён сказаў хлопчыку Міхаську, каб той прынёс квасу. Міхаська хуценька збегаў дамоў і ў гліняным чарапку прынёс квасу.

Пан выпіў, хваліць, што смачны, ды пытаецца:

— А ў вас яшчэ многа такога квасу?

— Вой многа. Учора ў квас уваліўся пацук, дык мама лазіла даставаць, то было яшчэ па пуп.

Тут пан як раззлуецца, як топне нагою ды як шпурне чарапок, той і разбіўся. А Міхаська як заплача: «А, дзядзечка, што ж вы зрабілі, куды ж я буду ноччу...»

Калі скончаць?

Пан кліча:

— Пятро, ці ты тут?

— Тут, паночку.

— А што робіш?

— Нічога.

— А ты, Янка, дзе?

— Ды з Пятром, пане.

— А ты што робіш?

— Памагаю Пятру.

— Ну, добра. Як скончыце, падасце мне боты.

Тату на старасць

У аднаго чалавека быў стары тата вельмі, яны лічылі, што ён ужо не патрэбны ў хаце, так парадзіліся з жонкаю, каб яго вывезці на поле, няхай там змерзне. Прыцягнуў той чалавек саначкі дахаты, пасадзіў старога, а жонка кажа:

— На табе дзяружку, накрый яго.

А сын іх маленькі кажа:

— Раздзяры, тату, напалову дзяружку.

Ён пытае:

— На што?

А ён кажа:

— Каб і я меў чым накрыць цябе, як буду вывозіць на поле.

Так той чалавек спалохаўся і кажа:

— То і мне так будзе, ну то лепей няхай стары ў хаце дажывае да смерці.

Зняў з санак і пасадзіў каля печы. І то такі людзі праўду кажуць:

— Хто што кіне за сабою, то знайдзе перад сабою.

Адзіны ратунак

Ішоў цераз лёд ураднік ды й праваліўся. Сабраўся народ. Пабеглі за бусакамі. А ідзе адзін селянін.

— Чаго вы,— кажа,— хвалюецеся? Чаго крычыцё?

— Дык ураднік топіцца!

— А вы яму чырвонца пакажыце, ён адразу выскачыць.

Няхай

Алёкса быў вельмі нядбалы, гультаяваты мужык. Суседзі кажуць яму:

— Алёкса, што ты не залапіш дзіркі ў страсе? Бачыш — хата цячэ!

А Алёкса смокча сабе люльку дай кажа:

— Няхай цячэ.

Ці кажуць:

— Алёкса, бачыш,— свінні лазяць у агарод.

— Няхай лазяць,— кажа Алёкса.

Пайшоў раз Алёкса ў лес драць луцце, забраўся ў гушчэчу, дзярэ і не бачыць, што стражнік крадзецца. А стражнік ціханька падкраўся ззаду да й цап Алёксу за рукі. Круціўся, круціўся Алёкса — нічога нейме: трымае стражнік, як клямшчамі. Давай Алёкса зневажаць стражніка на чым свет ста-

іць. Слухаў, слухаў стражнік, перш маўчаў, але як стаў Алёкса праклінаць яго матку, не вытрымаў, прывязаў гада к дзераву і ну яго дубасіць луццямі. Паласаваў, паласаваў да й кажа:

— Ну, гад, здыхай тут у лесе, а калі хто трапіць, дык скажы, што цябе прывязаў Няхай.

Пайшоў стражнік, а Алёкса паспрабаваў адвязацца, але нічога не зробіць: вельмі моцна яго ўкрампаваў стражнік. Пачаў гэта Алёкса крычаць на прамілы Бог. Ішлі тут дзецюкі, пачулі, што хтось крычыць, і пайшлі па голасу цераз гушчэчу. Падыходзяць к Алёксе, пытаюць, хто яго прывязаў, а ён кажа:

— Няхай прывязаў.

Плюнулі дзецюкі і пайшлі далей. Стаіць Алёкса, плача, а тут камарэча апанавала — вочы выядае. Давай Алёкса зноў крычаць, званць людзей на помач. Учулі пастухі, думаюць, што мо' каго мядзведзь дзярэ; бягуць туды; бачаць — стаіць Алёкса пад дзеравам ды толькі галавою матае. Зірнулі яны бліжэй, ажно Алёкса прывязаны к дзераву.

— Хто цябе, дзядзька, прывязаў? — пытаюць пастухі.

— Няхай прывязаў,— кажа Алёкса.

Хацелі ўжо й пастухі пакінуць Алёксу, але ён зноў пачаў крычаць:

— Ратуйце, хто ў Бога верыць, адвяжыце рукі!

— Хварэць жа тваёй мацеры,— кажуць пастухі,— чаму ж ты не хочаш, каб цябе развязалі, да ўсё кажаш, што няхай прывязаў.

Адвязалі гэта пастухі Алёксу; ухваціў ён сваю сякерку да й сунуў да гасподы, як воўк. З той пары годзе Алёкса казаць за кожным словам «няхай».

Сын Хвядос

Быў у бацькі сын Хвядос. Бацька хацеў яго жаніць, паехаў у сваты, а сыну сказаў паставіць снапоў у восець, каб, знача, раніцой можна было змалаціць. Пайшоў Хвядос стаўляць снапы ды ўвесь ток і спаліў.

Прыязджае ноччу бацька, будзе Хвядоса:

— Пойдзем малаціць!

Той адказвае:

— А чым, калі цапы пагарэлі?

— Як пагарэлі?

— А так.

— Няўжо ж хто зрабіў, сам згарэў і цапы папаліў. Нечага рабіць.

Бацька пабедаваў, пабедаваў, потым думае:

«Ажаню яго, тады можа паразумнее».

Паслаў гэта Хвядоса к папу ў споведзь. Па дарозе ён спатыкае чалавека, той пытае:

— Куды, Хвядос, воліш?

— Жаніцца буду, у споведзь іду!

— Дай Бог шчасліва!

— Так і будзець,— адказаў Хвядос.

Прыйшоў у клібанію. Поп пытае:

— Ты жаніцца хочаш? А ці ўмееш пацяры?

Хвядос кажа:

— Не, я іх ніколі не чуў і не бачыў, а ёсць Кандрат, меншы брат — во дык той на пацяры, як гад!

Ну, поп хацеў яго прагнаць, аж бача, ён нешта трымае.

— Што гэта ў цябе пад палой?

— А гэта я, бацюшка, гасцінца прынёс, троха із быдла, а трохі із збожжа. І палажыў вянок цыбулі і курыцу.

Паслаў поп Хвядоса са сваёй кабылай на начлег.

— А заўтра,— кажа,— я з табой распраўлюся.

Назаўтра рана прыходзіць Хвядос к папу, надуўся і стаіць у кутку.

Поп кажа:

— Чаго ты надуўся, Хвядос?

— І ты б надуўся, каб на начлезе быў.

— А што там?

— А тое, што тваю кабылу ваўкі ўкусілі.

— А ці многа ўкусілі? Будзе жыва?

— А дзе там, застаўся толькі хвост ды грыва.

Што Бог злучыў, таго не разлучай

Ці ведаеце вы, як ліха жыць на свеце, калі ўсю жытку трэ служыць другім людзям і ніколі няма табе слабоды, няма свайго вугла. Хоць ты служы ў палацах, да яны чужыя, а хатка хаць курная да брудная, да свая. Праўду людзі кажуць, што як век служыць, та лепей не жыць. Які б там не быў добры хаджаін, та ці хаджайка ліхая, ці яго дзеці, або радня, дак ніколі няма табе супакою. Як ты ні рабі, як ні старайся, та людзі ўсё ж скажуць, што, ведама, парабак, якая ад яго карысць.

От быў такі няшчасны адзін чалавек, што яму ўсё прыходзілася парабкаваць. Як ні стараўся ён выбіцца на сваю гаспадарку, нельга ніякім правам, бо як тут гаспадараваць, калі ў цябе ні кала, ні двара, калі няма за што рук зацяць. Перш ён часта мяняў гаспадароў, але нарэшце пазнаў, што гэта

гарэй, чым жыць у аднаго. Бо ўсім гадзіць, усім рабіць шчыра да добра, то і сілы не хопіць; а жывучы ў аднаго, то можна яму нарабіць шмат так, што е чым пахваліцца. От так і служыў ён у аднаго гаспадара, служыў верна, шчыра працаваў, дак і гаспадар як бы лічыў яго сваім сем'янінам. От прышлі Коляды, накалолі людзі свіней, нарабілі каўбас да й балююць. А той парабак пазірае, пакуль дадуць, да яшчэ мо й не дадуць. Дак ось якраз жа тое і вышла. Напрагла гаспадыня на скаварадзе сала, палажыла туды цэлае лычка каўбас да й падае на стол. Каўбаса была парэзаная на кускі, але яны не саўсім адрэзаны. Дзяўбануў гаспадар кусок каўбасы да так усю й пацёг к сабе.

— Прытрымай,— кажа ён жонцы, а тая адмаўляе:

— Што Бог злучыў, таго не разлучай.

Управіў гаспадар адзін усю каўбасу, а парабак толькі аблізаўся, дарам што разам сядзеў пры стале. От на свята пайшла гаспадыня ў госці, там трохі падпіла да й замарудзіла. Вярнуўся з карчмы гаспадар да й давай лаяць жонку, а тая як пачала яго зневажаць, дак яны слова за слова да й спляліся біцца. Сядзіць парабак на лаве да толькі пазірае. Горача прышлося жанчыне, от яна й просіць парабка, каб ён іх развёў. А той і кажа:

— Што Бог злучыў, таго не разлучай.

От з тых час кінуў ён парабкаваць да пачаў сам гаспадараваць. Перш зрабіў будан, потым курэнь, а нарэшце і хатку, хоць маленькую, да дарагенькую.

Набожны ксёндз

Быў сабе адзін ксёндз вельмі набожны. Ён раз сказаў усім людзям, што ў другую нядзелю прыляціць у касцёл Свенты Дух. Ужо ксёндз маліўся цэлы тыдзень, ажно яму прыснілася, што Дух Свенты не явіцца яму за тое, што ён пахваліўся. Ён не хацеў, штоб у другую нядзелю было гэтак. Паслаў ён свайго парабка на сяло, каб ён купіў белага галубка і ў нядзелю рана занёс яго ў касцёл на гару (чардак). А там у столі былі маленькія дзверцы. У нядзелю рана прышло да касцёла шмат людзей і паноў. А ксёндз паслаў свайго парабка на гару касцёла і сказаў:

— Як толькі я ў касцёле скажу: «Духу Свенты, зэйдзь на мене!», дык ты ўпусціш гэтага галубка ў касцёл.

Ксёндз пашоў у касцёл, а парабак палез угору. Там ён паглядзеў, ажно галубка няма, з'еў кот. А тым часам ксёндз у касцёле казаў казанне, і, падняўшы рукі да неба, кажа:

— Духу Свенты, зэйдзь на мене!

А парабак з гары крычыць:
— Немаш, дабрадзею, кот з'ядл!

Аб хітрым дзяку

Украў поп з дзякам карову, падзяліліся яны ўсім, толькі скурай не маглі падзяліцца, так пабралі ў зубы, да й цягнуць: поп не вытрываў, пусціў, а дзяк бэнц аб сценку галавою і забраў скуру. Тут зараз погаласка пайшла, што хтосьці карову ўкраў, так дзяк прыходзіць да папа, да й кажа:

— Я не вытрываю, мушу сказаць!

— Што ты, здурэў, ці што?

— Калі ж надта сумленне грызе!

— На табе грошай, колькі хочаш, толькі не выказвай нікому.

Назаўтра ён зноў прыходзіць, да й кажа:

— А ей, не вытрываю.

Так поп яму яшчэ больш грошай даў, каб толькі не казаў. Вечарам назбіралася да папа ўсялякіх гасцей і згаварыліся аб карове, так дзяк кажа:

— А гэта я з папом украў гэту карову!

Так поп зачырванеўся, усунуў яму няўзначай усе свае грошы, а дзяк кажа:

— І ўсім, здаецца, падзяліліся, толькі скуры не далі рады, так я ўзяў адзін канец у зубы, а яны другі і цягнулі. Яны пусцілі, а я бох! Аб сцену галавою, так і прачнуўся.

Такім спосабам дзяк ні граху не меў, бо прызнаўся, і ўсе грошы ад папа забраў. От хітры, ліха яму!

Пропаведзь

Даў адзін мужык сына на папа вучыць. Пабыў ён недзе колькі гадоў, у бацькі грошы набраўшы, ажаніўся ды й прыехаў дадому. Тым часам мужыкі паставілі царкву і такія радыя, што свайго папа маюць. Ну, заказаў жа ён ім у нядзелю на пропаведзь прыходзіць. Папрыходзіў народ, ён вышаў з кніжкай ды й пытае:

— Людзі, людзі, ці вы ведаеце, што ў гэтай кніжцы напісана?

— Не,— кажуць,— не ведаем, ойчэ духоўны.

— То вам і казаць нечага, калі вы такія дурні,— ды і сам пайшоў за райскія дзверы і больш не паказаўся. Пастаялі людзі, пастаялі, пажурыліся і разышліся... На другую нядзелю зноў наказвае схадзіць на пропаведзь, та ўжо мужыкі сышліся пад царкву, ды й урадзілі, як адказаць бацюшку.

Увайшлі ў царкву, ажно і поп выходзіць:

— Людзі, людзі, ці вы ведаеце, што ў гэтай кніжцы напісана?

— Ведаем, ойчэ духоўны!

— То што,— кажа,— буду язык аб зубы біць, калі вы самі ведаеце — ды й завярнуўся і пайшоў. І зноў мужыкі пастаялі, як мыла з'еўшы. Потым, вышаўшы з царквы, пабедавалі, што занадта папа разумнага маюць, бо ўжо і невядома, як цяпер яму адказваць, ды й тым абышлося.

Поп і запаведзі

Аднойчы дзяк прапанаваў прыгадаць некалькі запаведзей, якіх, на яго думку, не прытрымліваюцца парафіяне.

— Гарэлкі не піць,— цягне дзяк.

— Амінь,— гугнявіць святы айцец.

— Не красці.

— Амінь.

— Чужых жонак не спакушаць.

— О! — усклікнуў пры гэтых словах поп, стукнуўшы пальцам сабе ў лоб, і, як ашалелы, памчаўся з царквы.

— Што з вамі, бацюшка?! — закрычаў перапалоханы дзяк.

— Успомніў, дзе я ўчора галёшы забыў,— пачулася ў адказ.

Карась

Памёрла ў адной вёсцы жанчына ў пост. Сталі спраўляць памінкі. Рашылі купіць рыбы. Кінуліся сюды, туды,— а рыбы няма. Што рабіць? Закалолі парася, паставілі на стол, запрасілі папа на вячэру. Прыйшоў поп, і давай яны прасіць літасці, што не посная страва. А поп сам рад у пост свежанінкі з'есці. Ён рукой махнуў, падышоў да парася ды кажа:

— Ператвары, Гасподзь, парася ў карася.

А потым звярнуўся да іх і кажа:

— Ешце на здароўе. Карась добры.

І сам прыняўся есці.

Споведзь шляхціца

Спавядаўся шляхціц перад бернардынам і гаварыў пра тое, пра гэта, аж, нарэшце, кажа:

— Цалаваў чужую жонку,— але ў сваё апраўданне дадае, што не рабіў бы гэтага, ды людзі яму дарадзілі, што гэта ад хваробы вачэй памагае.

А бернардын на тое кажа:

— Не вер, калі б то праўда была, я ўжо праз сцяну бачыў бы.

Папоўская пропаведзь

Гаварыў поп у царкве пропаведзь. Наракаў усё на людзей, каб многа не клапаціліся.

— Паглядзіце,— кажа ён,— як жывуць птушкі і звяры, нічога не робяць: не сеюць, не жнуць, а Бог корміць іх.

— Эх, бацюшка! — кажа мужык.— Калі яны нічога не робяць, то гэткае іх і жыццё: ходзяць зімою па дарозе ды памёт дзяўбуць альбо падлу ядуць.

Разжаліў

Паганы ў нашым сяле быў дзяк: не ўмеў ён пець ні каліва. Як запяе, бывала, дык і слухаць нельга, хоць з царквы ўцякай. Якся раз пеў ён вельмі жалабна. Пяе, а сам аглядаецца: ці не разжалабіць ён каго? Аж і бачыць: стаіць чалавек ля бабніку ды й плача. Па шапачным разборы падыходзіць дзяк к таму чалавеку і пытае:

— А што ты, чалавек добры, сёння плакаў?

— Ай, дзядзечка, як жа мне не плакаць: ты сёння якраз так пеў, як мая каза бляяла, калі яе ваўкі рэзалі.

У пекле

— Ну ж, брат Андрэй, і папаспаў жа ты!

— Вот галава! Ці ж той свет пад бокам?

— Ці ж ты быў на тым свеце?

— Быў. Бачыў рай і пекла.

— Што ж ты бачыў у пекле?

— Што бачыў? Нашага брата ні аднаго не бачыў там.

— Ну, а каго ж?

— Паноў ды папоў.

Бедная баба

— А чаго вы, бабка, плачаце?

— Як жа мне, галубок, не плакаць, калі чыталі ў цэркві, што на тым свеце будзе «плач і скрыгат зубамі»... А чым жа я буду скрыгатаць, калі ў мяне ані аднюсенькага зуба няма?

Мужчына за мужчыну цягне

Адна баба хацела даць на імшу да пана Езуса, каб пан Езус укараў яе мужыка, што ён з яе здзекаваўся. Ну, так ідзе ды спатыкаецца з кумою, ды кажа так і так, а кума кажа:

— Не давай да пана Езуса, лепш да найсвентшай маткі, бо такі вядома, што мужчына за мужчыну цягне.

Дзіцятка

Аднаго разу сядзелі купцы ў заезджым двары. Гаспадыня выйшла з хаты, а хлопчык яе пачаў крычаць па матцы. Крычаў, покуль не змарыўся, а тады змоўк.

— Ну, дзякуй Богу, перастаў,— кажа адзін купец.

А хлопчык, пачуўшы гэта, адказвае:

— Ага, перастаў, адпачну, ды зноў буду.

Вялікі чын

— Твой сын у маскалёх? — пытае дзед у старой бабы.

— Але! І не простым ён салдатам служыць, а такога чыну дабіўся, што ўсе яго слухаюцца.

— Значыць, ён унтар?

— Куды вышэй!

— Фальдфэбель?

— Э, шчэ вышэй: барабаншчык.

Немажлівая рэч

— Калі гляджу на вас, не інакш як асла бачу перад сабой.

— Не, гэта не можа быць, бо я не люстра.

Пакаштаваў

Селянін прыехаў з горада і кажа свайму суседу:

— От жа ў горадзе смачныя булкі!

— А ты каштаваў?

— Ды не, я якраз бачыў, як адзін паніч еў.

Варажбітка

Жыла-была ў адной вёсцы бабка старэнькая, варажбітка. Вядома — вайна. Ні табе пісем, ні тэлеграм, а мужчыны з вёскі на вайну пайшлі, хочацца бабам пра іх што-небудзь даведацца. Вось і ходзяць яны да варажбіткі. Тое-сёе яна ім

і ўгадвала. І разнеслася слава пра варажбітку, што яна можа нават угадаць, чым вайна скончыцца.

Прыехалі неяк у вёску два немцы курэй ды яйкі збіраць. Пачулі яны пра варажбітку і прыперліся да яе:

— Варажы, матка, чым вайна скончыцца.

Бабка спалохалася, адмаўляецца:

— Не ўмею я варажыць!

Немцы за вінтоўкі:

— Варажы, інакш капут зробім!

Прышлося паслухацца. Папрасіла яна дастаць двух пеўняў — чырвонага і чорнага. Сама то яна ведала, што такіх пеўняў толькі два ў сяле, якраз у суседзяў. І сілу іх ведала. Пабеглі немцы і ў хуткім часе прывалаклі пеўняў. Тады і кажа бабка:

— Цяпер прызначце самі, які будзе нямецкая армія, а які чырвоная. І мне нічога не кажыце.

А сама думае: «Чорт вам даў чырвонага сваім палічыць. Вы чырвонага, як чорт ладана, баіцеся. А чырвоны певень чорнага на маіх вачах разоў пяць за вясну дубасіў».

— Гут,— кажуць немцы,— прызначылі.

Пашаптала бабка над пеўнямі, што ў галаву ўзбрыло, абсыпала іх соллю для прыліку і пусціла біцца.

Счубіліся пеўні. Спачатку чорны пачаў перамагаць. Стаяць немцы, рагочуць; яны яму, відаць, несучы сюды, шнапсу ў дзюбку ўлілі. І так было насеў чорны, што збіў і паваліў чырвонага.

Ляжыць чырвоны, а чорны кругом ходзіць і на яго пазірае. Толькі чырвоны нядоўга ляжаў. Сабраўся ён з сіламі ды як усхопіцца, як насядзе на чорнага, ды так ёмка, што той хутка і лапкі ўгору задраў.

— Ну,— кажа хітрая бабка,— глядзіце самі. Я ж не ведаю на каго вы ставілі. Толькі перамога будзе на чырвоным.

Немцы выйшлі ад бабкі вельмі раззлаваныя. А людзі, што былі пры гэтым, смяяліся: яны, як і бабка, разумелі, на каго немцы стаўку зрабілі.

Пра мужыка Івана

У адным сяле жыў дзед Іван. Ён часта хадзіў у грыбы і ведаў у лесе ўсе дарогі і куткі. А любіў гэтыя куткі за тое, што нарадзіўся тут і пражыў увесь век.

Настала зіма. Былі вялікія мяцеліцы, снегу намяло так, што нельга было ні прайсці, ні праехаць.

Прыехалі ў вёску немцы, сабралі яны ўсіх людзей і пача-

лі пытаць, хто знае дарогу на Маскву. Адзін стары патрос барадой і кажа:

— Я пражыў тут увесь век, ведаю кожную дарожку. Хадземце, я вас правяду на Маскву.

Дзед узяў кій і пайшоў наперадзе, а немцы пайшлі за ім. Дзед вёў, вёў, а калі настаў вечар, немцы пытаюцца ў яго:

— Куды ты нас вядзеш, стары пёс?

Ён ім адказвае, што скора будзе відаць вёска. Вядзе стары немцаў. Настала ноч. Дзед кажа:

— Мусіць, мы збіліся з дарогі.

Немцы зноў сталі крычаць на яго:

— Куды ты нас, стары пёс, вядзеш?

— Паночкі,. я вас вяду на Маскву.

— Хутчэй даводзь нас да вёскі, а то ад цябе застанецца толькі попел.

Дзед гаворыць ім:

— Скора мне восемдзесят год, як я хадзіў па гэтых ваколіцах.

А сам думае: «Убачыце вы Маскву, як я сваю патыліцу. Я завяду вас туды, адкуль воран касцей вашых не вынясе».

Потым немцы выбіліся з сіл, сталі крычаць:

— Стой, стары пёс! Ты не туды нас вядзеш!

І пачалі яго біць. Тады стары кажа:

— Вы думалі, што я здраднік, за ваша паганае золата прадаў свой народ, сваю зямлю?! Дык ведайце, што я пайшоў на смерць па сваёй добрай волі і зрабіў гэта дзеля таго, каб знішчыць вас і выратаваць сваю зямлю. Я павёў вас туды, куды і шэры воўк не забяжыць, куды каршун злы сваіх касцей не заносіў. Не бачыць вам Масквы!

Так загінуў дзед-герой за сваю зямлю, за свой народ.

Камандзір Дзёмін

Гэта было ў Чашніцкім раёне. Выйшаў аднойчы на дарогу Дзёмін, камандзір партызанскага атрада, а там якраз рухаліся ўласаўцы.

Дзёмін быў адзін, а іх — 27 конных. Наган, праўда, у Дзёміна быў, але ён не паказваў, а сказаў проста, па-брацку:

— Хлопцы, калі ў вас будзе якое непаразуменне, вы ўсе будзеце перабіты. Ідзіце за мной.

Уласаўцы думалі, што папалі ў засаду, і паехалі за ім. Дзёмін вёў іх кіламетраў 4—5 да атрада, а яны думалі, што ўсё засада.

Тады малыя і старыя смяяліся, як гэта так — адзін дваццаць сем прывёў.

Як Заслонаў немцаў-карнікаў сустрэў

Недалёка ад месца, дзе Заслонаў стаяў, было балота. Яно ўсё пазарастала хмызняком, толькі пасярэдзіне быў такі паўвостраў-палянка. Калі сказалі Заслонаву, што яго едуць лавіць немцы, ён адразу загадаў зрабіць засаду, а сам пераапрануўся, лапцікі адзеў, парык — ну проста дзядок старэнькі — і пайшоў насустрач немцам.

Пад'язджаюць да яго немцы, сталі пытаць:

— Куды, стары, ідзеш, адкуль ты?

А ён ім адказвае:

— Хадзіў во да сваёй дачкі ў вёску, яна там жыве. Дроў дапамог ёй насячы, а зараз вось дахаты іду.

Немцы яго зноў пытаюць:

— Ці былі там партызаны?

— Былі і паехалі ў лес толькі што.

— Паказвай хутчэй, дзе яны хаваюцца.

— Яны ж мяне ледзь не забілі, а дачку дык разарылі,— кажа Заслонаў і павёў іх у лес.

Навокал ціха, спакойна. Бачыць Заслонаў, што ўжо ўсе фашысты заехалі на гэты востраў, тады ён адскочыў у кусты, застрэліў афіцэра з нагана і камандуе:

— Па фашыстах — агонь!

Кінуліся немцы, хто куды, але ніводнага з іх партызаны не выпусцілі: каго перабілі, каго жыўцом узялі, а хто ў балоце загінуў.

А Заслонаў тады і кажа байцам сваім:

— Кожнаму ў нашым жыцці трэба ваяваць і зброяй і розумам.

Як Заслонаў у разведку хадзіў

Апрануўся Заслонаў у форму нямецкага генерала і паехаў у Сянно глядзець нямецкія ўмацаванні. Заходзіць ён да ваеннага каменданта горада:

— Я начальнік вобласці. Прапаную паказаць умацаванні, размяшчэнне немцаў, паліцаяў.

Ну, вядома, ваенны камендант выцягнуўся ў струнку, рад стараццца выканаць загад вышэйшага начальства. Павёў, паказвае дзоты, умацаванні, інтэрнаты нямецкіх салдат і паліцаяў, а Заслонаў ходзіць з ім і ўсё гэта бярэ на заметку. А ад'ютант яго ў кабінеце каменданта паклаў запіску: «Заслонаў знайшоў вашы ўмацаванні слабымі. Дзякуй вам за азнаямленне ад дзядзі Косці, хутка прыйдзем да вас у госці».

Заслонаў агледзеў усё і паехаў да сваіх партызан. А ноччу прыйшоў са сваімі партызанамі і разграміў увесь гарнізон.

Цвярозыя разважанні

Ноч. Ля кастра два фрыцы. Кураць, гутараць.

— Фрыц, мы былі ў Варшаве, пабывалі ў Парыжы, ці давядзецца нам пабываць у Берліне?

Вылечылі

— Ад сэрца вітаю вас, Марта, з дарагім госцем, а вас, Ганс, з прыездам на радзіму. Але, майн гот! Які ў вас змардаваны выгляд! Адкуль вы такі прывалакліся?

— З рускага курорта, сусед.

Курортнікі

— Чаму вашы салдаты маюць такі дрэнны выгляд, палкоўнік Драпке?

— Яны толькі што прыбылі з савецкага курорта.

Добра, ды не зусім

— Дзень добры, Фрыц! Адкуль?

— Дзень добры, дзядзька Бекер. З Расіі вярнуўся. Нагу там страціў.

— Гэта дрэнна.

— Дрэнна, ды не зусім! Мой друг Вілі галаву страціў, а я жывы.

— Гэта добра!

— Добра, ды не зусім: прыехаў у Эсен, дома няма,— англійская бомба разбурыла.

— Вось гэта дрэнна.

— Дрэнна, ды не зусім: жыву я цяпер на свежым паветры — сонца, прырода, апетыт.

— І сапраўды, як добра!

— Добра, ды не зусім: апетыт ёсць, а есці няма чаго. З нашага эрзац-хлеба хутка і апошнюю нагу працягнеш, на той свет адправішся.

— Гэта зусім дрэнна.

— Дрэнна, ды не зусім: там я са сваімі сябрамі сустрэнуся. Вып'ем, што Бог дасць.

— Гэта добра. Не забудзься выпіць з фюрэрам.

Дакладны адказ

— Як ты думаеш, Ганс, ці доўга чырвоныя будуць наступаць?

— Мне здаецца, што да тых пор, пакуль кожны з нас, немцаў, не будзе ўзнагароджаны драўляным крыжам.

Да зімы мы не дажывём

— Ганс, чырвоныя б'юць летам і восенню, а што ж будзе зімою? Божа ж мой!

— Не палохайся, Курт, і не турбуйся, да зімы мы не дажывём.

Красамоўнае маўчанне

— Пан оберст, што кажуць франтавікі аб савецкай артылерыі?

— Тыя, якія зведалі яе агонь, пан генерал, нічога не кажуць — яны на тым свеце.

У фашысцкім шпіталі

У р а ч. Скажы, Фрыц, што чуваць на фронце пра нашу перамогу?

Ф р ы ц. Ад грому рускай артылерыі і ад разрываў снарадаў, пан доктар, нічога не чуваць.

Храбры ваяка

— Пан обер-лейтэнант, вам прыходзілася калі-небудзь прымушаць чырвонаармейцаў бегчы?

— О, вядома! Учора, напрыклад, яны беглі за намі 20 кіламетраў.

Салдацкая размова

— Ведаеш, Эрых, па-мойму, рускія дрэнна разбіраюцца ў мясцовасці.

— Чаму ты так думаеш?

— Ды вось учора ноччу прыйшлі сюды два чырвонаармейцы, а каб не заблудзіць, чатырох нашых з сабой павялі.

Дрэнны клімат

— Які паганы клімат у гэтай Беларусі! Толькі ўчора прыехаў, а ўжо страляе і коле.

— У якім месцы?

— З усіх бакоў!

Навагоднія падарункі

— Сцяпан, куды немцы паехалі?

— Разбіраць партызанскія навагоднія падарункі. Цэлых два эшалоны ляжаць пад адхонам.

Бабуля і ўнучак

— Унучак, дзе ты быў, як гарэў нямецкі склад? Трэба было сысці з воч немцаў, каб дарэмна не прычапіліся, праклятыя.

— Не, бабулька, я тады зусім не быў у іх на вачах, я ў той час другі склад падпальваў.

У разведцы

— Бабулька, ці шмат немцаў засталося ў вашай вёсцы?

— Многа, родненькія. Цэлы магільнік.

У нямецкім шпіталі

— Гер оберст, за адвагу ў баі з партызанамі фюрэр узнагародзіў вас жалезным крыжам. Віншую! Цісну руку!

— Дзякуй вам, пан генерал. На жаль, магу падаць вам толькі нагу: рукі мне ў Беларусі партызаны адцяпалі.

Пекла і рай

— Я накіраваў у Мінск эшалон з карным атрадам для задушэння партызан, але тут па-ранейшаму для нас не жыццё, а сапраўднае пекла,— скардзіўся нямецкі генерал каменданту горада.

— Выбачайце, пан генерал, асмелюся давесці да вашага ведама, што партызаны, відавочна, улічылі гэтыя абставіны і адправілі эшалон з карным атрадам проста ў рай,— пахмура адказаў фашысцкі камендант.

Законнае пытанне

— Обер-лейтэнант абяцаў, што пасля гэтай контратакі мы, салдаты, будзем есці сала, біфштэкс і шакалад.
— Адкуль обер ведае, чым кормяць на тым свеце?

У нямецкай школе

— Карл, якое ты ведаеш найбольш распаўсюджанае дрэва ў Расіі?
— Бяроза, гер настаўнік.
— Добра. А што з бярозы робяць?
— Крыжы для нашых салдат, гер настаўнік.

Дакладны адрас

У эшалоне, які ехаў на фронт, адзін немец запытаў другога:
— Ганс, куды мы едзем?
— А хіба не ведаеш? Ды куды паехалі мільёны немцаў. У магілу!

Ці вернемся мы ў Данбас?

— Фрыц, як ты думаеш, ці вернемся мы ў Данбас?
— Дурань, падумай лепш, ці вернемся ў Германію.

Канец ясны

— Фрыц! У цябе яшчэ захаваўся партсігар?
— Захаваўся. А што?
— Аддай яго мне. Ты ўсё роўна ў атаку ідзеш.

Небяспечная хвароба

— На што вы скардзіцеся, хворы?
— Доктар, цяжка! У мяне зуб на зуб не трапляе. У мяне сутаргі.
— Калі ў вас наступаюць гэтыя сутаргі?
— Калі наступаюць рускія.

Па загадзя распрацаванаму плану

Пасля няўдалай карнай экспедыцыі афіцэр прабірае салдата:

— Як магло здарыцца, што вы, Ганс Мюлер, узнагароджаны «Жалезным крыжам», першы ўцякалі ад партызан?

— Я не ўцякаў, пане капітан. Я проста выраўніваў лінію фронта і планамерна пакідаў занятыя пазіцыі па загадзя распрацаванаму плану.

Сур'ёзнае разыходжанне

Беларускі партызан:

— У мяне з фашыстамі сур'ёзнае разыходжанне па зямельнаму пытанню.

— Якое ж?

— Яны хочуць быць на нашай зямлі, а я хачу, каб яны былі ў нашай зямлі.

Гутарка сяброў

— Як бы я хацеў зараз пабачыць нашага Вілі...

— Ды ён жа ў палоне ў рускіх!

— Вось там бы я і хацеў яго ўбачыць.

Асвоіў

— Што гэта няма вестак ад Аскара? Ён, напэўна, пачаў ужо асвойваць зямлю, якую даў яму ў Беларусі фюрэр?

— Вестак і не будзе.

— Чаму?

— Ён ужо асвоіў...

— Усю, і так скора?

— Усю — не ўсю, аршыны тры... Там, дзе ёсць партызаны, шмат часу для гэтага не патрэбна.

Зазнаўся

— Як табе падабаецца? Ганс прыехаў з фронту, нават рукі не падае.

— Зазнаўся, мусіць?

— Ды не! Руку ён пакінуў пад Віцебскам.

Сабаку з'еў

У лагеры ваеннапалонных сустрэліся два немцы — Ганс, узяты ў палон пад Сталінградам, і Фрыц, узяты пад Корсунем. Ганс пачаў расказваць Фрыцу пра жахі сталінградскага акружэння:

— Ведаеш, да таго дайшло, што мы ледзь не падохлі з голаду.

— Ды што ты мне расказваеш, як малому, пра акружэнне! — перабіў яго Фрыц.— Я сам на гэтай справе сабаку з'еў.

— Цэлага сабаку! — крыкнуў з зайздрасцю Ганс.— Ну, дык я табе скажу, што ты быў не ў акружэнні, а ў цешчы ў гасцях. Мы дык скуры конскія і нават халявы са сваіх ботаў паелі.

Пяты вінаваты

— І што гэта такое? — звярнуўся адзін фрыц да другога.— Ад Ленінграда аж да Пскова дабеглі, а рускія ўсё смаляць па пятах. І як мы ні маскіруемся пры адступленні, усюды яны нас убачаць.

— А ведаеш чаму?

— Ну?

— Мы так драпаем, што аж пяты блішчаць: яны нас і дэмаскіруюць.

Адпачынак

— Ганс, пішы апошняе пісьмо родным і завяшчанне!

— А што, мы заўтра ў бой ідзём?

— Не, нас адводзяць на кароткі адпачынак у бліжэйшы тыл.

— Дык пры чым тут пісьмо і завяшчанне?

— Пры тым, што там партызаны прадоўжаць наш адпачынак на векі вечныя.

У нямецкім бліндажы

Палкоўнік фон Гоп-Скок заўважыў, што обер-лейтэнант спіць у ботах.

— Чаму вы спіце ў ботах, пан афіцэр? Гэта ж... не гігіенічна!

— Затое практычна, пан палкоўнік. Я больш спадзяюся на свае ногі, чым на свой батальён.

Верная дарога

Нямецкі памешчык, пад'язджаючы прасёлачнай дарогай да густога лесу, сустрэў беларускага селяніна і пытае:

— Куды вядзе гэта дарога?

— У магілу,— адказаў селянін, дастаючы гранату.

У яго зноў баявыя поспехі

Два фрыцы гутараць у зямлянцы.

— Шанцуе Курту. У яго зноў баявыя поспехі. Яшчэ адна такая ўдалая бамбардзіроўка, і ён будзе прадстаўлены да ўзнагароды.

— Няўжо яму ўдалося знайсці і разбамбіць партызанскі лагер?

— Не. Яго звяно забіла і параніла адну карову, астатнія разбегліся.

Дарэмныя захады

— Ці не пойдзем мы ў вёску, ды ці не сцягнем авечку? — сказаў адзін воўк другому.

— Дарэмныя захады,— адказаў другі.— Там да нас ужо немцы пабывалі.

У Берліне

— Як жывеце?

— Нічога сабе.

— Як разумець гэта «нічога сабе»?

— Вельмі проста: усё забралі гестапаўцы.

Цёплае і халоднае

— Я вас не пазнаю, пане Мюлер,— сказаў адзін берлінец другому.— Вы раней так цёпла адклікаліся на ўсе мерапрыемствы фюрэра.

— Дарагі мой! — адказаў Мюлер.— Хіба вы забыліся, колькі разоў праводзілася ўжо кампанія зімовай дапамогі? Усё цёплае забралі ў нас эсэсаўцы.

У раённай управе

У раённую ўправу прыехаў гітлераўскі начальнік. У памяшканні ўправы нікога не было, толькі прыбіральшчыца мыла падлогу.

Гітлеравец заўважыў пыл і павуцінне на партрэтах фашысцкіх главароў.

— Гэта што такое? — зароў фашыст, паказваючы на партрэт Гітлера.

Прыбіральшчыца адказала:

— Я нанялася толькі выскрабсці падлогу, а ўбіраць бруд са сцен не мая справа.

У судзе

— Фрыц Бегнер, вы абвінавачваецеся ў тым, што ў час контратакі ўцякалі ад рускіх на захад.

— Божа мой, гер суддзя! Я не ўцякаў, а даганяў свайго пана ефрэйтара.

— А ён чаго бег?

— Ён даганяў фельдфебеля.

— А фельдфебель?

— Пан фельдфебель даганяў обер-лейтэнанта.

— А лейтэнант чаго бег?

— Даганяў пана палкоўніка.

— А пан палкоўнік?

— Пан палкоўнік даганяў пана генерала, які бег да фюрэра, каб далажыць аб нашай перамозе.

— Хайль! — гаркнулі суддзі, і суд быў спынены.

Смех і слёзы

— Як людзі адносяцца да тваёй работы? — пытаецца пры сустрэчы кравец у свайго таварыша.

— Смяюцца,— адказвае той.

— Гэта яшчэ нічога, што смяюцца. Вось я як пашыю, дык плачуць.

Я не з тых

— Колькі табе год, Мальвіна?

— Дзевятнаццаць.

— Дык год назад ты тое ж самае гаварыла.

— Я не з тых, што сёння гавораць адно, а заўтра другое.

Арыфметыка

— Ці багата, бабка, ваша кароўка малака дае?

— Дзесяць літраў.

— А колькі прадаваць носіце?

— Пятнаццаць.

Размова суседак

— Алена, глядзі, якая ў мяне сукенка! Ці падабаецца?

— А дзе ж ты яе купіла?

— Пашыла.

— Дзіва што! Твая швачка шые так, што і на азяродзе ляжыць добра.

Выкруціўся

Аднойчы ў царкве за споведзь старая бабулька дала папу бутэльку самагонкі. Поп схаваў бутэльку ў кішэню і пачаў маліцца, адбіваць паклоны.

Неяк бутэлька вывалілася ў папа з кішэні і пакацілася па падлозе. Усе, хто быў у царкве, убачылі гэта. Папу стала няёмка, але ён не разгубіўся. У царкве вісеў вялікі абраз «Тайная вячэра». Ён павярнуўся тварам да абраза і сказаў на ўсю царкву:

— Святыя! Вы там калі п'яце, дык піце, але бутэлек сюды не кідайце!

Пазаабрадавыя песні

Пазаабрадавыя песні, як відаць з самой назвы,— гэта песні, якія выконваюцца незалежна ад абраду ці календара, у любы час і ў розных канкрэтных жыццёвых абставінах. У народзе пра гэтыя песні гавораць, што яны спяваюцца «абы калі», «калі давядзецца», «калі надумаецца», «хоць дзе», «дзе можна» і інш. Спяваюць іх у час адпачынку і на рабоце, дома і ў полі, «на міру» і сам-насам. Песні гэтыя не звязаны ні з гульнямі, ні з дзеяннямі.

Мелодыя ў пазаабрадавай песні замацавана непасрэдна за адным тэкстам (рэдка адзін тэкст выконваецца на некалькі мелодый), тады як у каляндарна-абрадавай паэзіі на адзін і той жа напеў (асабліва ў вясельнай песнятворчасці) спяваецца многа тэкстаў.

Пазаабрадавыя песні ў адрозненні ад каляндарна-абрадавых характарызуюцца большай актыўнасцю, што дало ім магчымасць шырока адлюстраваць самыя розныя бакі побыту народа.

Пазаабрадавыя песні часта называюць проста лірычнымі, бо лірычны пачатак (а ён уласцівы таксама каляндарна-земляробчым і сямейна-абрадавым песням) у пазаабрадавых з'яўляецца дамінуючым. Гэта песні пра асабістыя пачуцці і перажыванні чалавека, пра яго адносіны да акаляючай рэчаіснасці.

Сіла ўздзеяння пазаабрадавай лірычнай песні ў тым, што яна перадае пачуцці і перажыванні, сугучныя, блізкія, зразумелыя многім людзям, вылучаецца глыбінёй, багаццем і разнастайнасцю чалавечых эмоцый. Тут радасць і гора, любоў і нянавісць, весялосць і смутак чалавека. У гэтых песнях выяўляюцца лепшыя рысы нацыянальнага характару беларусаў: смеласць, адвага, праўдзівасць, працавітасць, гасціннасць, гуманізм, чуласць, сціпласць, імкненне да свабоды і нянавісць да прыгнятальнікаў. У іх знайшла адлюстраванне народная мараль, светапогляд працоўных. Пазаабрадавая песенная лірыка дае шырокую карціну жыцця народа, яго сямейна-бытавых і сацыяльна-грамадскіх адносін, таму невыпадкова яе называюць энцыклапедыяй жыцця народа.

Цяжкае мінулае, невыносныя ўмовы жыцця нарадзілі нямала песень, поўных горычы, болю і скаргі. Гэта — песні-жальбы, у якіх адлюстравана горкая доля працоўнага чалавека. Але ёсць і іншыя матывы ў беларускай народнай пазаабрадавай лірыцы. Многа твораў прасякнута рашучым пратэстам супраць прыгнёту, гвалту, бяспраўя. Народ праклінае сваіх крыўдзіцеляў, кліча на барацьбу, верыць у шчаслівую будучыню.

Больш за ўсё ў пазаабрадавай лірычнай песні гаворыцца пра жанчыну, пра яе перажыванні, каханне, долю. Тлумачыцца гэта тым, што стваральнікам і выканаўцам беларускай пазаабрадавай лірыкі была ў асноўным жанчына, і песня — гэта споведзь жанчыны, мастацкая біяграфія, расказаная шчыра, непадробна, з хваляваннем.

Пазаабрадавая лірычная песня захапляе нас высокай мастацкасцю, здзіўляе паэтычнай вобразнасцю і прыгажосцю мелодыі. Ні ў адным фальклорным жанры так шырока і магутна не выявілася душа народа, як у песні.

Нявырашанай праблемай у даследаванні пазаабрадавай лірыкі з'яўляецца пытанне класіфікацыі. Пры класіфікацыі песні можна ўлічваць розныя аспекты: і жанравы, і музычны, і тэматычны, і функцыянальны. Пазаабрадавыя песні падзяляюцца на антыпрыгонніцкія, рэкруцкія, салдацкія, казацкія, бурлацкія, чумацкія, сямейна-бытавыя, любоўныя, жартоўныя, песні-балады, песні рабочых і песні рэвалюцыйнага змагання. Да пазаабрадавай паэзіі адносяцца і песні гістарычныя, дзіцячыя, калыханкі, гульнёвыя і танцавальныя. У кожным з гэтых песенных відаў вылучаюцца падвіды і тэматычныя групы.

Беларуская народная песня жывіла і жывіць прафесійную нацыянальную музыку, ёю захапляліся і звярталіся да яе ў сваёй творчасці вялікія рускія, украінскія і польскія кампазітары. Народная песня магутна ўплывае наогул на прафесійную паэзію, на культуру ў цэлым.

ЛІТАРАТУРА

Жартоўныя песні / Склад. І. К. Цішчанка. Мн., 1974.

Песні пра каханне / Склад. І. К. Цішчанка. Мн., 1978.

Сямейна-бытавыя песні. Мн., 1984.

Сацыяльна-бытавыя песні. Мн., 1987.

Гілевіч Н. С. Наша родная песня. Мн., 1968. С. 123—182.

Гілевіч Н. С. Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Мн., 1975.

Глушчанка Г. С., Мухарынская А. С., Нісневіч С. Г. Гісторыя беларускай савецкай музыкі. Мн., 1971. С. 11—35.

Петровская Г. А. Белорусские социально-бытовые песни. Мн., 1982.

Можейко З. Я. Песенная культура белорусского Полесья. Мн., 1971. С. 90—106.

Песні беларускага народа / Пад рэд. М. М. Нікольскага, М. Я. Грынблата. Мн., 1948. Т. 1.

Шырма Р. Р. Беларускія народныя песні: У 3 т. Мн., 1959—1962.

Анталогія беларускай народнай песні / Уклад. і камент. Г. І. Цітовіча. Мн., 1968.

Лірычныя песні / Уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. Мн., 1976.

АНТЫПРЫГОННІЦКІЯ ПЕСНІ

Ах ты сонца-сонейка...

— Ах ты сонца-сонейка,
Я на цябе віну маю,
Віну маю вялікую:
Што ты раненька ўсходзіш,
Што ты позненька заходзіш.

— Ах ты дзеўка-дзеванька,
Не вінуй жа ты мяне,
Вінуй жа свайго пана:
Хоць я раненька ўзыйду,
Цябе на ніўцы знайду,
Хоць і позненька зайду,
Цябе на ніўцы пакіну.

Не плач, маё дзіцятка...

— Не плач, маё дзіцятка,
Не плач, маё роднае.
Вунь дзе войт ідзе,
На татку, на мамку
Ён бізун нясе.
У тым бізуне
Скураты ўвіты,
На тым бізуне
Слёзкі паліты.
Тыя слёзкі крывавыя
З сэрца раненага...
Схавайся ты, дзетка,
На божу пасцельку.
Няхай твае вочкі
Заплюснуць навекі.
Не бачыў бы ты гора,
Гора мужыкова,
Не ўзнаеш ты долі,
Кроўкай палітое...

А ў бары зязюлька кукуе...

А ў бары зязюлька кукуе,
Мой сыночак на полі начуе.

Сыру зямельку ён арэ,
На худыя шчочкі слёзы лье.

А заўтра да сонца рана
Трэба ехаць араць на пана.

Ах мая ты галованька бедная,
Ах маё ты горанька горкае!

Што ж мне заўтра раненька ды зварыць,
Чым жа мне сынка свайго накарміць?

Накармлю сыночка лебядою,
Пасалю я лебяду сваёю слязою.

— Еш, мой даражэнькі, ды спяшы,
А то прыганяты ўжо бяжыць,

Каб нашаму пану трасца ў бок,
Як ён цябе сушыць, мой сынок.

Добры наш пан, добры наш пан...

Добры наш пан, добры наш пан,
Добры да работы:
Ой, як зойме з панядзелку,—
Рабі да суботы.

А ў нядзельку раненька
Усе званы звоняць,
А атаман з дзесятнікам
Насіць снапы гоняць.
Ой, насілі, панасілі,—
Селі спачываці,
А глянуць назад сабе,
Ажно сам пан скача
Да каго б'е, каго лае,
Каго так пытае:
— Ой, чаго вы, хлопцы, селі,
Чаму снапоў вы не насілі?
— Ой, тым жа мы не насілі,
Што ўжо ніўка мокра.

У там той вёсцы вецер вее...

У там той вёсцы вецер вее,
А ў той вёсцы ціха,
У нашай вёсцы дабра няма,
А ў суседняй ліха.

У нашых войтаў, аканомаў
Ядвабныя хусткі,
А гдзе былі гаспадары,
То ўсе хаты пусткі.

У нядзелю ранюсенька
У два званы звоняць,
А нас войты, аканомы
На паншчыну гоняць.

Як за старым было панам
Лёгка на работу:
А ўвесь тыдзень сядзі дома,
Шарварка ў суботу.

Цяпер за маладым панам
Цяжка на работу:
Увесь тыдзень на паншчыне,
Шарварка ў суботу.

Ой, со дома, пане браце...

Ой, со дома, пане браце,
Со дома, со дома.
Няма хлеба, пане браце,
Ні ў полі, ні дома!

Была ж у мяне паляначка
Зелена, зелена,
Да пажалі ўражжы ляхі
Без мяне, без мяне.

Як пайшоў я, пане браце,
К пану па зарплату;
А ён мяне выбіў, выбіў,
Да й выгнаў з хаты.

Цяпер сталі ўражжы ляхі
Шчэ горш на работу,
Увесь тыжджань на паншчыне,
Шарваркі ў суботу.

Ой, ждом жа мы нядзелечкі,
Як самога Бога,
Да штоб наша аддыхала
Малая нябога.

Ой, у нядзелю параненьку
Ва ўсе званы звоняць.
Асаул жа з казакамі
На паншчыну гоняць.
Мужчын у гумно малаціці,
А баб валоў пасці.
Малых дзяцей да цюцюну
У папушы класці.
Бадай жа вам, ўражжы ляхі,
Важка ў свеце жыці,
Як вы нашы памучылі
Маленькія дзеці.

Бадай пану ў дварэ страшна...

Бадай пану ў дварэ страшна,
Як нам ў полі сонца зайшла.
Сонца зайшла — мы шчэ жнемо,
Пры месяцы снапы носімо,
Пры зораньках копы кладземо,
А паўночы дадому ідземо,
На світанні вячэраемо,
У дзень белы знову йдземо.
Бадай пана не схавалі,
Каб сабакі разарвалі;
Пахавалі пры даліне,
Каб па ёму воўкі вылі.
Бадай пана громы ўбілі,
Як мы ручкі патамілі.

Ой, закурэла, ой, ды задымела...

Ой, закурэла, ой, ды задымела
Ды сырымі дрывамі.
Ой, няма як выйсці ды на свет белы
Нам за варагамі.

Сонейка ўзыйдзе, сонейка зайдзе
Ды за лесам дубовым,
А ты сееш не прысядзеш
На полі скарбовым.

Ой, вяльможны спаць палягуць,
А ты йдзі араці.
І ў нядзелю маеш дзела,
Некалі згуляці.

Сабе ж сееш жыта жменю,
Ячменю другую;
Спадзявайся панскай ласкі,
Пан табе ўслугуе.

Зарадзіла ў пана жыта,
Павілося ў трубы,—
Толькі ты ці будзеш сыты
На сваім атрубе?

Накалоціш, намалоціш
Возам не павезці,
А прыйдзецца за каляды,
Няма чаго есці.

Зноў у хаце закурыцца
Асінай-дрывамі,
Годзе, браццы, трэба біцца
За зямлю з панамі.

Ой, ты, дуб-дубіна...

Ой, ты, дуб-дубіна,
Сенажаць куміна,
На адным берагу
Сем вазоў мурагу.

Трэба сена касіць,
Пану копы вазіць,
Сенакос убіраць,
Жыта-хлеб дажынаць.

Трэба дзень рабатаць,
Да й начы пакідаць,
Усё на паншчыну,
На дарэмшчыну.

Толькі знай — рабатай,
Мазалі нажывай,
На работах цяжкіх,
Да ўсё гаспадарскіх.

Пойдзе войт з бічуком,
За ім пан з бізуном,
Аканом за скарбам,
Паня за падаркам.

Не баюся пана,
Войта-аканома,—
Шэсць дзён на прыгоне,
А ў нядзельку дома.

На загады пані,
Пані гаспадыні,
Аднясу падаркі —
Тонкай кужаліны...

Прывыкайце, чорны вочы...

Прывыкайце, чорны вочы,
Адны начаваці:
Няма майго міленькага,
Не з кім размаўляці.

Няма майго міленькага,
Няма гаспадара,—
Каму бы я пасцелячку
Пухову заслала.

Даўно свайго міленькага
У паход выпраўляла,—
З тых пор свае чорны вочы
Слязьмі выцірала.

Пасляпіла свае вочы
Горкімі слязамі,
Няма жыцця, няма рады
Ўсё за варагамі.

602

Паны дзяруць, паны скубуць,
А багач за імі,—
Паследнія манатачкі
Ужо мы пазнасілі.

Выхадзіла на дарогу,
Выхадзіла ў поле,
Нідзе следу не відала
Тут свайго мілога.

— Навярніся, мой міленькі,
Да з таварышамі,—
Калатніце міраедаў,
Каб яны не ўсталі.

Каліна-маліна...

Каліна-маліна
У лузе стаяла,
У лузе стаяла,*
Стоючы завяла.

Каліна-маліна,
Што не зелянееш?
Ці ветру баішся,
Ці луга жалееш?

Дзяўчына-рыбчына,
Чаго смутна ходзіш?
Ці свет у няволі,
Ці горкая доля?

Мне свет не ў няволі,
Не горкая доля,—
Не дай жа мне, Божа,
Заслужнага хлеба.

Бо хлеб той заслужны,
Вельмі ён патужны:
Як я стану кроіць,
Пані мне вымовіць.

Як я стану кроіць,
Пані мне вымовіць,
Як я яго ўкушу,
Заплакаці мушу.

Ты запей, запей, жавароначак...

Ты запей, запей, жавароначак,
Падай галасок за цёмны лясок.

Падай галасок за цёмны лясок,
За цёмны лясок, у каменны астрог.

Усе людзі жывуць, як цвяты цвітуць,
Мая галава вяне, як трава.

Айцец з маткаю атракаюцца,
А сястра з мужам насмяхаюцца.

Прадай ты, жана, ды свайго каня,
Выкуп ты свайго мужа з астрога.

---

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

Прадала жана ды свайго каня,
Не выкупіла мужа з астрога.

РЭКРУЦКІЯ ПЕСНІ

Зашумела дубровачка зялёная...

Зашумела дубровачка зялёная,
Заплакала малодачка маладая.

— Не шум, не шум, дубровачка зялёная,
Не плач, не плач, малодачка маладая!

— Ой як жа мне, маладзенькай, ды не плакаць —
Наехалі казачэнькі рэкрутаў браці.

Калоцяць у барабаны, песенькі пяюць,
Малодзенькіх рэкрутаў набіраюць.

Каторыя ахвотнічкі, тыя самі ідуць,
Каторыя нявольнічкі, тых сілай вядуць.

Малойчыкі весяляцца, п'юць, скачуць,
Толькі адны жанатыя сільна плачуць:

— Застаюцца нашы жоны ўдавамі,
Застаюцца нашы дзеці сіратамі.

— Забылася я ў мілага запытаць,
Ці пазволіць мой міленькі мне пагуляць.

— Ой, гуляй ты, мая міла, як гуляла,
Наймай сабе скрыпкі, дудкі, як наймала.

Ды не гуляй, мая міла, з маладымі,
Ды гуляй жа, мая міла, са старымі.

Бо старыя, мая міла, раду радзяць,
Маладыя ж, мая міла, з свету збавяць.

Ой, з-пад лесу, лесу цёмнага...

Ой, з-пад лесу, лесу цёмнага,
З-пад явара з-пад зялёнага

Вылятала хіжа пташачка,
Вынасіла гасударскі прыказ.

Чутно-відно, будуць набор набіраць,
Каторага нам сыночка аддаць:

Ці старшага, селядоршага,
Ці самага наймалодшага?

У старшага ды дзяцей чарада,
У селядоршага жана малада.

У наймалодшага нікога няма —
Ні дзяцей ды ні жаны маладой.

Старшы братка адкупляецца,
Селядоршы адмаўляецца,

Наймалодшы прыбіраецца,
З айцом, з мамкаю прашчаецца.

З айцом, з мамкаю прашчаецца,
А з сястрыцай не расстанецца:

— Прашчай, прашчай, айцец, маманька
І сястрыца маладзенькая.

— Пастой, брацец, я кудзёркі расчашу.
— Ой, расчэша вецер буйненькі.

У чыстым полі за гарматамі,
Варанога каня дзержачы,

Варанога каня дзержачы,
Залатое сядло носячы.

З-пад зялёнага дуба...

З-пад зялёнага дуба
Загарэлася гара.

Ой, га-га-га-га,
Загарэлася гара!

А з-пад тае горушкі
Вышла тры маёрушкі.

Як ішлі, так ішлі,
Гасудара не знайшлі,

Сталі жалабы пісаць,
Па губернях рассылаць.

Па губернях рассылаць,
Каго ў салдаты аддаць.

Абабралі старыка,
Старык не гадзіцца.

Абабралі багача,
Багач выплаціцца.

Абабралі малайца,
Што без маткі, без айца...

Ой, укінулі на вазок,
Ды й павезлі ў гарадок.

Вязуць яго праз сяло,
Стала людзям весяло.

Вязуць яго да двара,
Забалела галава.

Вязуць яго да прыёму,
А ён думаў, што дадому.

Пасадзілі на столачку,
Абгалілі галовачку.

Паставілі ў куточку:
Скідай майткі і сарочку.

Далі шаблю і палаш:
Цяпер, братцы, я не ваш.

Далі шаблю і муніц'ю:
Ідзі, браце, за граніцу.

Ой, у полі тры бярозкі стаіць...

Ой, у полі тры бярозкі стаіць.
Між бярозак тры дарожкі ляжыць.
Туды ішоў белы ўдалы маладзец,
Нёс указы ён у белых руках.
Стаў указы ён перачытываць:
Катораму брату на вайну ісці.
А большаму не прыходзіцца,
Серадольнаму не хочацца,
Самы меншы сабіраецца,
Мамка з плачу аж валяецца.
— Не плач, не плач, мая мамачка, пры мне,
Наплачышся ты даволі без мяне.
Людзі пойдуць у поле араць,
А я буду з казакамі ваяваць,
Мамка будзе ўсё слёзы праліваць,
Людзі пойдуць у лугі касіць,
А я буду з шабелькай хадзіць,
Мамка будзе па мне слёзачкі ліць.

Спарадзіла маменька сынка-сакалка...

Спарадзіла маменька сынка-сакалка,
Спарадзіўшы сына, каня купіла,
А купіўшы коніка, ў салдаты здала.
А здаўшы ў салдацікі, сільна плакала.

А старшы брацітка каня сядлаць,
А младшая сёстранька брата ўбіраць,
Брата ўбіраць, у брата пытаць:
— А скажы ж ты, брацітка, а скажы ж ты мне,
А калі ж ты, брацітка, у госці прыдзеш?
— А ўзыдзі ж ты, сёстранька, на круту гару,
А глянь жа ты, сёстранька, пад ясну зару.
А з-пад яснай зары два салдацікі ідуць.
— Салдацікі, брацікі, вы скажыце мне:
Ці відзелі брацітку ў чужой старане?
— Але ж, там твой брацітка тры палкі служыў.
Але ж, там твой брацітка на вайну хадзіў.
Але ж, там твой брацітка галаву злажыў.

Ой, у лузе там каліна стаіць...

Ой, у лузе там каліна стаіць,
На каліне салавейка сядзіць,
Горку ягаду каліну клюе,
Салодкаю ды й закусвае.
Пад калінай той дарожка ідзе,
Дарожачка выбіваная,
Дарожачка мураваная.
Па дарожцы афіцэры ідуць,
За сабою навабранцаў вядуць.
Навабранцы выбіраныя,
Ручкі-ножкі пакаваныя.
А за імі ацец, маці ідзе,
Белы ручкі ўсё й ламаючы,
Свайго сына навучаючы:
— Не будзь, сынку, ні грубён, ні гразён,
Да будзь, сынку, ўсяму свету наравён.
— Поўна, поўна мяне, маць, павучаць,
Было мяне на гэты свет не пускаць,
Было мяне ў ціхі Дунай пускаць:
Ціхі Дунай пераплыў бы я,
Царскай службы не служыў бы я.

Не плач, маці, ні айцец...

Не плач, маці, ні айцец,
Я ж не адзін маладзец.
Я ж не адзін маладзец —
Нас пагоняць, як авец.
Нас пагоняць, павядуць,

Па казармах разашлюць.
Па казармах разашлюць,
Нам вінтовачкі дадуць.
Лепей дома хлеб аўсяны,
Чым на вайне пытляваны.
Лепей дома з грабелькамі,
Чым на вайне з шабелькамі.
Лепей дома цэпам стукаць,
Чым на вайне муштру слухаць.

Цёпла восень і з дажджом...

Цёпла восень і з дажджом,
Мы ў Расеюшку пайдзём.

Мы набяром малайцоў,
Ад матушак, ад атцоў,

Ад жоначак маладых,
Ад дзетушак маленькіх.

Як жанатых вязуць —
За імі жоначкі ідуць.

За імі жоначкі ідуць
І ў тры руч'і слёзы льюць.

Як халастых вязуць —
За імі дзевачкі ідуць.

За імі дзевачкі ідуць,
Слаўну песеньку пяюць.

— Ох, мае вы, дзеўкі, дзеўкі,
Павярніцеся назад.

Цяпер жа нам не да вас,
Разлучаюць нас ад вас.

Ох, пайдзем мы на сражэнне,
Станем ў праваму крыле.

Станем ў праваму крыле,
На турэцкай на зямле.

А турэцкая зямля —
Многа слёзак праліла.

У канцы садзіку зялёнага...

У канцы садзіку зялёнага,
Зялёнага ўсё й вішнёвага,

Пралягала там дарожанька,
Дарожанька запушчоная.

Шлях-дарожанька не торная,
Не торная, не праезжая.

Уся калодамі завалена,
Калодамі ўсё рэкруцкімі.

Той дарожанькай рэкрут вядуць
З калодамі да замкнёнымі.

А за імі ўслед — жанок табун,
Жанок табун да з дзіцяткамі.

Стогнуць рэкруты з калодамі
Дубовымі закаваныя,

Плачуць гоманам дарожанькай
Рэкруцкаю праважатыя.

Баравая ягадачка...

Баравая ягадачка
Вельмі саладкая,
Салдацкая горка служба,
Горка праклятая.
Каторыя халастыя,
То п'юць і гуляюць,
Каторыя жанатыя,
Плачуць і рыдаюць:

— Тут мы, братцы, тут мы, братцы,
Тут мы ўсе самыя,
Нашы жоны-рэкрутачкі
Дома, маладыя.

Каторая добра жона,
Мужыка праводзіць,
У чыстым полі пад крушынай
Стоячы гаворыць:

— Бадай жа ты, крушынанька,
Болей не выросла,
Як ты майго міленькага
У чужы край занесла.

Бадай жа ты, крушынанька,
Болей не ўрадзіла,
Як ты майго міленькага
Навек разлучыла.

САЛДАЦКІЯ І КАЗАЦКІЯ ПЕСНІ

А ў нядзельку рана стала рассвітаці...

А ў нядзельку рана стала рассвітаці,
Прыляцела зазюлечка да й стала каваці.

Прыйшла родна маці сына ратаваці,
Сына ратаваці і з прыёму вызваляці:

— Ой, наце вам, паны, каня і сядзельца,
Ой, выпусціце майго сына, баліць маё сэрца.

Ой, наце вам, паны, каня варанога,
Ой, выпусціце майго сына з прыёму дадому.

— Не хочам мы браці каня і сядзельца,
Не выпусцім твайго сына, няхай баліць сэрца.

Цёмна ночка да нявідная...

Цёмна ночка да нявідная,
Дарожанька да не трапная,
Каменем да пабітая,
Слёзанькамі да палітая.
Палівала да старая матка,
Свайго сына да гадуючы,
Да войска выпраўляючы.
За ім ідзе дзве сястроначкі,
За ім ідзе дзве жалобначкі:
— Ой, вярніся ты, наш родны браток,
Пакажыма дзве дарожанькі ў садок,
Вымыема да галованьку,
Расчашыма жоўты косанькі.
— Не вярнусь, дзве сястроначкі,
Не вярнусь, дзве жалобначкі,
Вымыюць мяне дробны дожджычкі,
Расчэшуць мяне буйныя ветрыкі.

Гэй, зашумела зялёна дуброва, шчыры бор...

Гэй, зашумела зялёна дуброва, шчыры бор,
Эй, бяруць, бяруць мяне, маладзенькага, ў набор.

Эй, бяруць, бяруць мяне, маладзенькага, ў набор
Эй, заплакала ўся радзіначка па ём, эх, па ём.

Эх, мамка плача, гасцінчыкі печучы,
Эх, татка плача, сыну грошы лічучы.

Эх, татка плача, сыну грошы лічучы,
Эх, братка плача, каня з поля ведучы.

Эх, братка плача, каня з поля ведучы,
Эх, другі плача, павозачку строячы.

Эх, другі плача, павозачку строячы,
Эх, сёстра плача, гасцінчыкі пекучы.

Эх, сёстра плача, гасцінчыкі пекучы,
Эх, жонка плача, малютачку дзержучы.

Эх, жонка плача, малютачку дзержучы:
— Эх, куды, мілы, ты ад'язджаеш?

Эх, куды, мілы, ты ад'язджаеш?
Эх, на каго малютку пакідаеш?

Эх, на каго малютку пакідаеш?
— Эх, няма, няма ціхаму Дунаю канца,

Эх, няма, няма ціхаму Дунаю канца,
Эх, бяруць, бяруць мяне ў салдаты, малайца,

Эх, бяруць, бяруць мяне ў салдаты, малайца,
Эх, няма, няма гэтаму малютку айца.

Як я молада была...

Як я молада была,*
Дык я рана ўставала.

Я каўнер вышывала
Свайму большаму брату.

Па дарогах хадзіці,
Гасудару служыці.

У каўнярочку вышыла
А я жаркае сонца.

У рукавочку вышыла
А я ясён месячык.

У падалочку вышыла
А я дробныя звёзды.

Ад сонейка, браточак,
Табе цёпленька будзіць.

Ад месячка, браточак,
Табе відненька будзіць.

---

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

Ад звёздачак, браточак,
Табе весела будзіць.

Па дарогах хадзіці,
Гасудару служыці.

У нядзельку раненька...

У нядзельку раненька
Узышло сонца ясненька.
Татка коніка корміць,
Дужа жаласна плачэць.

Прыйшоў сынок, пытаець:
— Чаго, татка, так плачэш?
Ды нашто ж, каму рана,
Татка, коніка корміш?

— Табе, сыночку, табе.
На вайну ты паедзеш,
На вайну ты паедзеш,
Ах! адтуль не прыедзеш.

Панясеш ты галоўку
Ды ў чужу старонку,
Занясеш свае плечы
Пад турэцкія мечы.

— Не плач, татачка, пры мне:
Наплачашся без мяне,
Наплачашся даволі,
Як не ўвідзіш ніколі.

У нядзельку раненька
Узышло сонца ясненька.
Мамка есцікі варыць,
Дужа жаласна плачэць.

Прыйшоў сынок, пытаець:
— Чаго, мамка, так плачэш?
Дык нашто ж, каму рана,
Мамка, есцікі варыш?

— Табе, сыночку, табе.
На вайну ты паедзеш,
На вайну ты паедзеш,
Ах, адтуль не прыедзеш.

Панясеш ты галоўку
Ды ў чужу старонку,
Занясеш свае плечы
Пад турэцкія мечы.

— Не плач, мамачка, пры мне:
Наплачашся без мяне,
Наплачашся даволі,
Як не ўвідзіш ніколі.

У нядзельку раненька
Узышло сонца ясненька,
Сястра хустачкі рубіць,
Дужа жаласна плачэць.

Прыйшоў браток, пытаець:
— Чаго, сястрычка, плачэш?
Ды нашто ж, каму рана,
Сястра, хустачкі рубіш?

— Табе, брацітка, табе.
На вайну ты паедзеш,
На вайну ты паедзеш,
Ах, адтуль не прыедзеш.

Панясеш ты галоўку
Ды ў чужу старонку,
Занясеш свае плечы
Пад турэцкія мечы.

— Не плач, сястрычка, пры мне:
Наплачашся без мяне,
Наплачашся даволі,
Як не ўвідзіш ніколі.

Ды на нашым гародзе...

Ды на нашым гародзе,
Гэй, гэй, ды на нашым гародзе

Ды стаяла бяроза,
Гэй, гэй, ды стаяла бяроза.

Яна тонка, высока,
Гэй, гэй, яна тонка, высока

І ў карэнні глыбока,
Гэй, гэй, і ў карэнні глыбока.

І на лісця шырока,
Гэй, гэй, і на лісця шырока,

І на сучча бахмата,
Гэй, гэй, і на сучча бахмата.

А на тэй жа бярозе,
Гэй, гэй, а на тэй жа бярозе

Дробны пташкі шчабечуць,
Гэй, гэй, дробны пташкі шчабечуць.

Шчыру праўдачку кажуць,
Гэй, гэй, шчыру праўдачку кажуць,

Што малойчыка звяжуць,
Гэй, гэй, што малойчыка звяжуць.

А ў нядзельку паранку,
Гэй, гэй, а ў нядзельку паранку

Загадалі ў хурманку,
Гэй, гэй, загадалі ў хурманку.

І коніка варанога,
Гэй, гэй, і коніка варанога,

Ізвозчыка маладога,
Гэй, гэй, ізвозчыка маладога.

А як селі, запелі,
Гэй, гэй, а як селі, запелі,

Бел малойчык заплакаў,
Гэй, гэй, бел малойчык заплакаў:

— Старана мая, старонка,
Гэй, гэй, старана мая, старонка,

Не магу цябе забыці,
Гэй, гэй, не магу цябе забыці.

Ні матулькі старэнькай,
Гэй, гэй, ні матулькі старэнькай,

Ні жаны маладзенькай,
Гэй, гэй, ні жаны маладзенькай,

А ні дзетак маленькіх,
Гэй, гэй, а ні дзетак маленькіх.

Каліна-маліна...

— Каліна-маліна,
Што не расцвітаеш?
Малада дзяўчына,*
Эй, што сядзіш думаеш?
— Я сяджу думаю
І думаці буду,
Палюбіла Колю,
Эй, павек не забуду.
А ў нядзелю рана
Ясна сонца ўсходзіць,
Там, пэўна, Коля,
Эй, па казарме ходзіць.
Па казарме ходзіць,
У руках шаблю носіць.
У руках шаблю носіць,
Эй, камандзіра просіць:
— Камандзір ваенны,
Адпусці дадому,
Пакінуў дзяўчыну,
Эй, сам не знаю кому.

Зазвінелі новы ключы...

Зазвінелі новы ключы,
У мора плывучы;
Заплакалі малойчыкі,
На вайну ідучы.

Заплакалі маладыя,
А потым старыя:
Пакідаюць жонкі дома
І дзеці малыя.

Зляталіся чорны галкі
Ды ўсё поле ўкрылі,
Заплакалі малойчыкі.
Жалю нарабілі.

— Злятайцеся, чорны галкі,
Злятайцеся ўгору,

А вы, млоды малойчыкі,
Ступайце дадому.

— Рады былі б мы ступаці,
Туман наступае,
Рады былі б вярнуціся,
Нас цар не пускае.

---

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

Ах ты, зорка мая...

Ах ты, зорка мая,
Зара ясная,
Не парою ты, зара,
Занімаешся.
Не парою ты, зара,
Занімаешся,
Рана, рана ты, дзянёк,
Пачынаешся.

Ад'язджае мой мілы
У дарожаньку,
Панясе ён пад мячы
Ды галованьку.
Астаюся малада
Удавіцаю,
Як асіна-дзераўцо
Над крыніцаю.

Зялёная ды дубровонька...

— Зялёная ды дубровонька,
Чаго шумна ды зашумела?

— А як жа мне ды не шумеці,
Каля мяне ўсе паходы йдуць.

Каля мяне ўсе паходы йдуць,
Усё маё ды карэннейка б'юць.

— Маладая ды ўдованька,
Чаго горка ды заплакала?

— Ой, як жа мне ды не плакаці,
Усе мужы дадому ідуць,

Усе мужы дадому ідуць,
А мой мілы ды ўбіт ляжыць.

А мой мілы ды ўбіт ляжыць,
У правай ручцы ды каня дзяржыць.

У левую ды расу бярэ,
Расу бярэ ды на сэрца лье:

Раса мая ды краплюшчая,
Душа мая ды жывушчая!

Тудою ішлі тры касцы,
Ой, тры касцы ды мае браткі.

Накажыце ды маёй жане,
Няхай яна ды мяне не жджэ,

Няхай яна ды мяне не жджэ,
А няхай яна замуж ідзе:

Калі добра — праклінаць будзе,
Калі ліха — успамінаць будзе.

Шчука-рыба ў моры...

Шчука-рыба ў моры
Гуляе даволі.
Ёсць у ўдовы адзін сын,
Да не даў Бог долі.

— Ой, прадай матка,
Каня майго варанога,
Ой, ажані мяне, матка,
Сына маладога.

— Ой, не вяляць, сынку,
Каня прадаваці,
А ўжэ цябе запісалі
У салдаты аддаці.

Маці гадавала,
Слёзы разлівала,
Ляцеў арол з чужых старон
Да й таго пытала:

— Ой, ты сівы орле,
Высока лятаеш,
Ой, ці часта майго сына
А ў войску відаеш?

— Ой, ці то твой сын
У войску спачывае,
Яму сівы саболенька
Галоўку ціскае.

Не дай, Божа, смерці,
У салдатах умерці,
Дзе некаму даглядаці
Салдацкае смерці.

Ой, воран лятае,
Смерці даглядае,
Бела цела абірае,
Косці пакідае.

Ой ты, поле маё...

Ой ты, поле маё,
Не радзімае,
Да нішто ў тым полі
Ніколі не расце.

Толькі вырас адзін
Куст ракітавы,
Без вады, без расы
Ён пакінуты.

Там ляжыць пад кустом
Цела белае,
Цела белае,
То салдацкае.

Маладзенькі салдат
Увесь паранены,
Перад смерцю ляжыць,
Як пласт беленькі.

А над ім ў галавах
Стаіць конічак,
Галавою панік
Над салдацікам.

Ой ты, конь вараны,
Друг-таварыш мой,
Не пакінуў мяне
У чужой старане.

Ой, бяжы ты, мой конь,
На староначку,
Дзе жывуць ацец-маць,
Да ўсе родныя.

Што я ранен ў баю
Стрэлай каленай,
Паміраю ў сцяпу
Пад ракітаю.

Накажы ты, мой конь,
Атцу-мацеры,
Да славечка скажы
Маладой жане,

Памяніце мяне
Добрым словечкам,
Падгадуйце маіх
Дробных дзетачак.

Памёр, памёр салдаціку...

Памёр, памёр салдаціку
У нядзелечку рана,
Палажылі салдаціка
У святліцы на лаве.

— Каб я была зазюленькай
Да ўмела лятаці,
Паляцела б я па свету
Сыночка шукаці.

Ой вы, добрыя малойцы,
Учыніце волю:
Вы пусціце сівы коні
За целам, за мною.

Прыляцела б на магілу,
Да сказала б «ку-ку»,
Падай, падай, мой сыночак,
Мне правую руку...

Няхай заржуць сівы коні,
Ідучы за мною,
Няхай чуюць ацец-маці
Са ўсёю раднёю.

— Ой, рад бы я, матуленька,
Абедзве падаці,
Сырой зямлёй засыпалі,
Не магу падняці.

Як пачула матуленька,—
Залілась слязамі,
Узгаласіла родна маці
Горкімі славамі:

Памяніце добрым словам
У магіле салдата,
Накажыце жане маёй
Дзяцей гадаваці.

Прыляцелі гусі...

Прыляцелі гусі
З далёкага краю,
Узмуцілі ваду
На ціхім Дунаю.

Ці ён там запіўся,
Ці ён загуляўся,
Ці з гора-печалі
Ў чужы край забраўся.

— Пачакайце, гусі,
Я ў вас запытаю,
Ці не з таго краю,
Скуль мужа маю?

— Ён жа не запіўся,
Ён не загуляўся,
З гора ды печалі
У чужы край забраўся.

Ой, у полі жыта
Золатам абліта,
Пад белай бярозай
Ляжыць казак ўбіты.

Ой, ён жа ўбіты,
На смерць не забіты,
Чырвонай кітайкай
Вочанькі накрыты.

Ды прышла дзяўчына,
Ды загаласіла,
А прышла другая,
Зусім не такая.

Адкрыла кітайку
Ды пацалавала:
— Уставай, казача,
Устань, маладзенькі.

За гарою трава шуміць...

За гарою трава шуміць,
За другою казак ляжыць,
Ляжыць казак за гарою,
Пад купіну галавою,
Накрыў вочкі сукніною,
Казацкаю заслугою.
За гарою воран крача,
Над казакам сіў конь плача.
Не плач, коню, нада мною,
Сам ты бачыш шчырасць маю;
Бяжы, коню, беражкамі,
Салдацкімі дарожкамі,
Ды прыбяжы ў маю браму,
Стукні, бразні падковамі,
А там выйдзе мая маці,
Будзе цябе распытваці:
Ой, конік мой вараненькі,
Дзе мой сынок маладзенькі,
Ці ты забыў, ці ты згубіў?
Я не забыў, я не згубіў;
Ён на месце ажаніўся,
Узяў жонку варшавянку,—
У чыстым полі жоўту ямку;
Узяў жонку на рыначку,—
У чыстым полі магілачку.

Ой, у полі пад вішанькаю...

Ой, у полі пад вішанькаю
Там казачок забіты ляжыць,
Над ім конік вараны стаіць,
Капыцейкам землю сячэ,
Свайму пану ваду дастае.
— Табе, коню, вады не дастаць,
А мне, маладому, ад зямлі не ўстаць.
Бяжы, коню, да новага двара,
Выйдзе да цябе старая жана,
Старая жана, то матка мая.
Будзе ў цябе сынка пытаці.
Не кажы, коню, што забіт ляжу,
Да скажы, коню, што ажаніўся.
— Што ж ў яго, коню, за сваты былі?
— Былі ў яго сваты — зялёны дубы.
— Што ж у яго, коню, за музыка быў?

— Быў у яго музыка — зялёны явар.
— Што ж у яго, коню, за сватанька была?
— Была ў яго сватанька — чырвона каліна.
— Што ж у яго, коню, за дружкі былі?
— Былі ў яго дружкі — белы бярозы.
— Што ж у яго, коню, за млода была?
— Была ў яго млода — арабіначка,
У чыстым полі да магілачка.

Дзе крыніца глыбокая...

Дзе крыніца глыбокая,
Там вадзіца сцюдзёная
І травіца зялёная.

На травіцы казак убіт,
А ў галоўцы конік стаіць,
А ў галоўцы конік стаіць.

Конь з казаком размаўляе:
— Ці ты на мне сам паязджай
Ці ты мяне ў поле пушчай!

— Бяжы, косю, дарогаю,
Бяжы, косю, шырокаю,
Бяжы, косю, шырокаю!

Як прыбяжыш к вароцечкам,
Стукні-грукні капыцікам,
Стукні-грукні капыцікам!

Ой, там выйдзе стара жана,
Стара жана — мамка мая,
Стара жана — мамка мая.

Будзе цябе аўсом вітаць,
Будзе цябе сынка пытаць,
Будзе цябе сынка пытаць:

— Ой ты, косю сівусенькі,
Дзе мой сынок малюсенькі,
Дзе мой сынок малюсенькі?

Ці ты яго ў полі згубіў,
Ці ты яго ў вайне забіў,
Ці ты яго ў вайне забіў?

— Мамка мая старэнькая,
Скажу слоўца вярненькае,
Скажу слоўца вярненькае:

Ні я яго ў полі згубіў,
Ні я яго ў вайне забіў,
Ні я яго ў вайне забіў!

Ой, забілі цёмны ночы,
Дзяўчыніны чорны вочы,
Дзяўчыніны чорны вочы.

Мяне вяжа да бярозы,
А сам ідзе к белай ложы,
А сам ідзе к белай ложы.

Мяне вяжа да ляшчыны,
А сам ідзе да дзяўчыны,
А сам ідзе да дзяўчыны.

Мяне вяжа да сасонкі,
А сам ідзе да карчомкі,
А сам ідзе да карчомкі.

З карчмы ідзе — хіляецца,
Аж на мне поўсць мяняецца,
Аж на мне поўсць мяняецца!

— Каб це, косю, ваўкі з'елі,
Каб це, косю, разарвалі,
Як на сынка досыць жалю!

Каб ты, косю, утапіўся,
Як мой сынок не жаніўся,
Як мой сынок не жаніўся!

Каб це, косю, лясы ўбілі,
Каб це, косю сівусенькі,
Дзе ж мой сынок малюсенькі?

— Мяне, мамка, лясы знаюць,
Як я бягу — шум сціхае,
Як я бягу — шум сціхае.

Мяне, мамка, рэкі знаюць,
Як я бягу — высыхаюць,
Як я бягу — высыхаюць.

Мяне, мамка, ваўкі знаюць,
Як я бягу — уцякаюць,
Як я бягу — уцякаюць!

Цёмна ночка наступае...

Цёмна ночка наступае,
Жаўнер коніка сядлае;

Асядлаўшы, уздыхае,
На ваёнку выязджае.

— Еду поле і другое,
На трэцяе уз'язджаю.

Верны конік паклыпае,
Сон галоўку абымае.

Пушчу каня на далінку,
А сам лягу на гадзінку.

Сплю гадзінку, сплю другую,
І трэцюю не буджуся.

Шчаслівая гадзінанька,
Скуль узялася дзяўчынанька:

— Уставай, жаўнер, досі спаці,
Твайго каня не відаці.

Ідзе войска незмярное,
Незлічонае, страшное.

Возьмуць каня варанога,
Заб'юць цябе, маладога.

Каня возьмуць — другі будзе,
Цябе заб'юць — мне жаль будзе.

— Ці ты мяне, дзеўка, любіш,
Што мяне так рана будзіш?

— Каб я цябе не любіла,
То б я рана не будзіла.

Шуміць-шуміць зялёная дубрава...

Шуміць-шуміць зялёная дубрава,
Стучыць-стучыць шырокая дарога.
Едуць, едуць казачанькі су вайны,
Майго мілага не чуць, не відаць.
Адзін яго сівы конік бяжыць,

На коніку сядзёлачка ляжыць,
У сядзёлачцы страменнейка яго,
У страменнейку рубашачка яго.
Я думала, што бялявая,
А ж яна уся крывавая,
Загадалі мне, маладой, тры думы:
Без вадзіцы — бела вымыці,
Без ветру — суха высушыць,
Без качалак — гладка выкачаць.
Я молада прымышлёная была:
Ў дробных слёзках бела вымыла,
Ў алых губках суха высушыла,
Ў белых ручках гладка выкачала.

Конь бяжыць, зямля дрыжыць...

Конь бяжыць, зямля дрыжыць,
Бел малойчык там ляжыць.
Ён убіты, парубаны,
Ў сенажаці пахаваны.
Прыляцелі тры ластаўкі,
Тры ластаўкі, шэры зязюлі,
Сталі над ім кукаваць.
Адна села ў галоўцы,
Друга села на сердзеньку,
Трэця села ў белых ножках.
Матка села ў галоўцы,
Сястра села на сердзеньку,
Жонка села ў белых ножках.
Матка тужыць век ад веку,
Сястра тужыць год ад году,
Жонка тужыць да абеду,
Па абедзе пайшла ў садок,
Пайшла ў садок, звіла вянок.
Звіўшы вянок, пайшла ў танок,
Танцуючы, гаварыла:
— Калі гіты лепшы будзе,
Таго буду праклінаць,
Калі гіты горшы будзе,
Таго буду спамінаць.

ЧУМАЦКІЯ, БУРЛАЦКІЯ і ПРЫМАЦКІЯ ПЕСНІ

Чумак рана ўставае...

Чумак рана ўставае,
Сваіх хлопцаў пабуджае:
— Уставайце, хлопцы, рана,
Уставайце, вазы мажце,
Новы ёрмы закладайце,
Сівых валоў запрагайце,
У Крым-горад выязджайце.

Чумак з двара выязджае,
Жану дома спакідае:
— Заставайся, жана, дома,
Рубай дровы і лучыну,
Цярпі гора і кручыну;
Рубай дровы на парозе,
А лучыну на услоне.

Валы мае палавыя...

— Валы мае палавыя,
Чаго вы памарнелі?

— Ад таго мы памарнелі,
Што не пагожае сена елі.
Не гожу воду пілі
І сем раз у Крым схадзілі.

У Крым ішлі да рыкалі,
А з Крыма ішлі — цяжка вязлі.

Пад горачку да падганяе,
А з горачкі сам сядае.
Ох, ад таго памарнелі...

Ты чумача, чумача...

— Ты чумача, чумача,
Жыццё тваё лядача:
Ты не косіш, не арэш,
Чаго рана з Крыму йдзеш,
Усіх таварышаў вядзеш?
— Вяду, вяду да не ўсіх,
Толькі нету аднаго,
Братца майго родненькага,
Самага большанькага.
Ён застаўся ў Крыму:
Прабіла соль галаву;
Не соль прабіла — вясы,
Клаўшы соль на вазы.

Дзе ж ты, бурлак, валачыўся...

Дзе ж ты, бурлак, валачыўся,
Што й па пояс намачыўся,
Эй, эй, да што й па пояс намачыўся?..

— За таварам, за валамі.
— Брэшаш, бурлак, прышлі самі,
Эй, эй, да брэшаш, бурлак, прышлі самі.

Бурлак доўга не спрачаўся,
Скінуў світку ды паслаўся,
Эй, эй, да скінуў світку ды паслаўся.

Яшчэ бурлак не паслаўся,
Як хазяін ўжэ праспаўся,
Эй, эй, да як хазяін ўжэ праспаўся.

Яшчэ бурлак не лажыўся,
Як хазяін нарабіўся,
Эй, эй, як хазяін нарабіўся.

Устань, бурлак, годзе спаці,
Пара сівы й валы гнаці,
Эй, эй, да пара сівы валы гнаці.

Бурлак валы выганяе,
Слязьмі сляды залівае,
Эй, эй, да слязьмі сляды залівае.

Слязьмі сляды залівае,
Айца з маткай праклінае,
Эй, эй, да айца з маткай праклінае:

— Нашто было так ражаці,
Шчасця-долі не даваці,
Эй, эй, да шчасця-долі не даваці?

Да сядзіць пугач у лузе на каліне...

Да сядзіць пугач у лузе на каліне,
Дзе совае пер'е ўецца.

Дзе совае пер'е ўецца...
Да косіць косар шоўкавую траўку,
Эй, гарачы пот ільецца.

Эй, гарачы пот ільецца...
Да сядзеў бурлак ў холадку пад дубам,
Да з касарыка смяецца...

Да з касарыка смяецца.
Ой, хоч смейся, ой-эй, хоч не смейся,
Не смех табе,— праўда й будзе.

Не смех табе,— праўда будзе...
Да прыдзе зіма, лютыя марозы,
Ай, у бурлака сена не будзе.

Ай, у бурлака сена не будзе...
Прышла зіма, лютыя марозы,
А бурлак ішчэ ў дарозе.

А бурлак ішчэ ў дарозе...
Прыехаў бурлак з вялікай дарогі,
Да нечым валоў гадаваці.

Нечым волаў гадаваці...
Да бярэ бурлак раменны налыгач,
Да ідзе сена набываць.

Ідзе сена набываць...
Да ідзе сялом, вуліцаю,
Аж налыгач валочыцца.

Аж налыгач валочыцца...
А касарык ў новых вароцех,
Эй, да з бурлака смяецца.

Эй, да з бурлака смяецца...
Хоць ты смейся, касарыку-дзядзьку,
А прадай хоць сена вязку.

Ой, хто не служыў, братцы,
у багатыра...

Ой, хто не служыў, братцы, у багатыра,
Той і гора не знае.*

---

* Кожны другі радок паўтараецца двойчы.

Ой, як я служыў, братцы, у багатыра,
Я ўсё горачка знаю.

Ой, рана ўстану, ды позненька лягу,
Усё раблю й не гуляю.

Ой, запрагаю пару серых волаў
Еду полечка араці.

Ой, бяру з сабой бедну сіраціну
Ды валоў падганяці.

Ой, цоб-цобэ, вы серыя волы,
Ды й да самага абеду.

Ой, усе жоны абедаць прыносяць,
А хазяюшкі нету.

Ой, распрагаю пару серых волаў
Ды пушчу ў дубраву.

Ой, бяру з сабой бедну сіраціну
Ды іду дадому.

У варот стаіць стары старычышча
Ды й Дуняшу гукае:

— Ой, ідзі, ідзі, Дуняшачка, сюды,
Вот ідзе парабчышча.

Ой, налі яму ўчарашняга баршчу,
Ён й не тое пахлешча.

А нікому, а нікому...

А нікому, а нікому,
Як батраку маладому,
Эй!*

Батрак робя, рабатае,
Аж пот вочы залівае,
Эй!

Прышоў батрак на кватэру:
— Падай, хазяйка, вячэру,
Эй!

— А я ў печы не тапіла,
Вячэраці не варыла,
Эй!

---

* Кожная страфа паўтараецца двойчы.

626

Еж, батрачок, хоць галушкі,
Лажыся спаць без падушкі,
Эй!

Яшчэ батрак не разуўся,
А ўжо пан абачнуўся,
Эй!

Яшчэ батрак не лажыўся,
А ўжо пан станавіўся,
Эй!

— Уставай, батрак,
падымайся,
Займай валы, выганяйся,
Эй!

Валы мае палавыя,
Лугі мае зеляныя,
Эй!

Ежце траву зялёную,
Піце ваду сцюдзёную,
Эй!

Маці мая радзімая,
Нашто мяне спарадзіла?
Эй!

Нашто мяне спарадзіла
І ў батракі налажыла?
Эй!

Расцвілася чарэшанька...

Расцвілася чарэшанька,
Ды ягад не мае.
А хто ў прымах не бывае,
Той гора не знае.

Бо я прымак, бо я прымак,
Бо я гора знаю:
Кулачонькі пад бачонькі,
Сам спаці лягаю.

Ідзе Дуня, ідзе Дуня,
Ідзе абуджаці:
— Уставай, уставай, прымачэнька,
Ідзі ў поле гараці.

Пашоў прымак, пашоў прымак
У поле гараці.
Ён забыўся, нешчаслівы,
Куска хлеба ўзяці.

Гараў прымак, гараў прымак,
Стаў ды паглядае:
— Усе жонкі абед нясуць,
А мая не дбае.

Нясе Дуня, нясе Дуня,
Нясе хлеб з вадою.
— Калі хочаш абедаці,
То еж хлеб з вадою.

Гараў прымак, гараў прымак,
Дагараў да дому.
Распрагае сівы коні,
Сам ідзе дадому.

Ідзе прымак, ідзе прымак,
На дудачку свішча.
— Хавай, маці, абед, сала,
Едзе прымачышча.

Ішоў прымак, ішоў прымак,
Зашоў на падворы,
А тут цешча прыказала:
— Рубай, прымак, дровы.

Рубаў дровы, рубаў дровы,
Разрубаў калоду.
Яму цешча прыказала:
— Ідзі, прымак, па воду.

Прынёс вады, прынёс вады,
Захацеў ён есці.
Яму цешча загадала:
— Нясі свінням есці.

— Бадай вашы свінні здохлі,
А цешча згарэла,
Як мне гэта прымацкая
Служба надаела.

Як зышлася кума з кумой,
Сталі гаварыці:
— І твой прымак, і мой прымак
Не хочуць рабіці.

І твой прымак, і мой прымак
Не хочуць рабіці,
А як жа нам разлічыцца,
Каб не заплаціці.

Стаяў прымак, стаяў прымак
Ў сенях пад дзвярыма,
Як учуў ён гэты словы,
Абліўся слязіма.

І ты прымак, і я прымак,
Нечага стыдзіцца.
Сабраліся ўсе прымакі
Ды пайшлі тапіцца.

Прыйшлі бліжэй да рэчачкі —
Мелкая вадзіца.
Ой, і доля прымацкая,
Недзе утапіцца.

Ах вы, хлопцы маладыя,
Не йдзіце ў прымы,
Жаніцеся ў сваёй хаце
На чвэрць дзесяціне.

СЯМЕЙНА-БЫТАВЫЯ ПЕСНІ

Піце, піце, госцейкі, піце...

Піце, піце, госцейкі, піце,
А на мёд не дзівіце.

Ой, нашы пчолачкі
Паляцелі за брод па мёд.

Прыляцяць жа з-за броду,
Прынясуць гасцям мёду.

Будзем чары наліваць,
Усіх гасцей частаваць

І віном, і гарэлачкай,
І мёдам салодзенькім.

Ах вы, столікі мае...

Ах вы, столікі мае,
Вы, цясовыя мае,
Чаго жа вы стаіцё
Не засланы ў мяне?

Ой вы, кубачкі мае,
Пазлачоныя мае,
Чаго жа вы стаіцё
Не наліты ў мяне?

Ах вы, госцікі мае,
Ах вы, любыя мае,
Чаго жа вы сядзіцё
Не вясёлы ў мяне?

Ці мой хмелю не хмялён,
А ці хлеб мой не пушон?
Скажу хмелю падалліць,
Скажу хлеба падлажыць.

На гарэ вярбіца...

На гарэ вярбіца,
Пад гарой карчомка.

А ў той жа карчомцы
Увесь мой род гуляе,

Увесь мой род гуляе,
Мяне ўспамінае:

— Знаць, наша сястрыца
Горку долю мае,

Горку долю мае,
З намі не гуляе.

А я к свайму роду —
Па шыечку ў воду.

Хоць я абмачуся,
Да роду даб'юся,

З родам насяджуся,
Гарэлкі нап'юся,

Гарэлкі нап'юся
Дый нагаруся.

Ой, за бор, за бор...

Ой, за бор, за бор,
Сонца коціцца,
Мне да матанькі
У госці хочацца.

Да мужа звярнусь,
Часам здарыцца,
Папрашу яго,
А ён сварыцца.

За бор сонейка
Закацілася.

А я ў маманькі
Нагасцілася:

У канцы століка
Настаялася,
Горкіх слёзак я
Наўлівалася.

І за столікам
Насядзелася,
З палыном рэдзькі
Там наелася.

Ды ўжо сонейка за лес коціцца...

Ды ўжо сонейка за лес коціцца,
Мне да матанькі ў госці хочацца.

Дзе мяне мама спатыкаць будзе,
Чым мяне мама частаваць будзе?

Частуе мяне мёдам ды віном:
— Якаво ж табе за чужым сталом?

— Ці ела, мамка, рэдзьку з палыном?
Такаво ж і мне за чужым сталом.

Я ў канцы стала настаялася,
Лічаных кускоў наглыталася.

Цераз хату йду,— думу думаю,
Цераз сені йду,— слёзанькі лію.

Цераз сені йду,— слёзанькі лію,
Як на двор выйду,— свету не віджу.

Ты каліна, ты маліна...

Ты, каліна, ты, маліна, *
Над вадою схілілася.

Над вадою схілілася,
Я молада журылася.

Я молада журылася,
Што ад роду адбілася.

Што ад роду, ад радзімы,
Цяжка жыці на чужбіне.

Цяжка жыці, цяжка быці,
З чужым родам гаварыці.

Цяжка саду без зязюлі,
Цяжка дочцы без матулі.

Ой, пайду я гукаючы,
Сваёй долі шукаючы.

Адгукнулась мая доля
Каля сіненькага мора.

Адпушчу я сваю долю
Та й па сіняму па мору.

Плыві, доля, ты з вадою,
А я следам за табою.

Чырвоная каліначка...

Чырвоная каліначка, *
Чаго ў лузе схілілася?

Маладая дзяўчыначка,
Чаго яна журылася?

— Ой, таму я журылася,
Што ад роду адбілася.

Адбілася ад радочку,
Цяжка майму галасочку.

Ой, пайду я гукаючы,
Сваёй долі шукаючы:

«Адгукніся, мая доля,
На тым баку сіня мора.

Ды прыплыві к беражочку,
Ды к ліповаму кусточку».

Ой, вырвем мы па лісточку
Ды напішам па пісьмочку.

Каб радзіма не тужыла,
Ка мне ў госці прыхадзіла.

---

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

Стуку-груку...

Стуку-груку,
Стуку-груку на памосце,
Едзе к брату сястра ў госці.

— Я ж не еду,
Я ж не еду піць, абедаць,
Толькі цябе пераведаць.

Братавая,
Братавая хлеб саджае,
Братка сядзіць абедае.

Ёсць у мяне,
Ёсць у мяне хлеб у возе,
Пабедаю я ў дарозе.

— Прымай, жонка,
Прымай, жонка, хлеб і сала,
Едзе ў госці сястра мая.

Прыедзь, братка,
Прыедзь, братка, ка мне ў буду,
Я й гэтаму рада буду.

Сястра гэта,
Сястра гэта як зачула,
Назад коні павярнула.

Хлеба-солі.
Хлеба-солі прыпазычу,
А ўсё ж табе дабра зычу.

Што на свеце пачуваецца...

Што на свеце пачуваецца?
Брат сёстрамі не цураецца,
Папрасіў брат сёстраў у госцікі:
Багатую — у суботачку,
А бедную — у нядзелечку.
Багатая за сталом сядзіць,
А бедная — у канцы стала.
Багатая мёд, гарэлку п'е,
А бедная чысту вадзіцу.
Багатая песенькі пяе,
А бедная слёзачкі ліе.
— Чаму, сястра, песень не пяеш?
Ці ты, сястра, ноты не маеш?
Ці ты, сястра, песень не ўмееш?
— А я, сястра, нотачку маю,
А я, сястра, песенькі ўмею:
З багатымі пяяць не смею!

Ой, зелена, зелена...

Ой, зелена, зелена
Траўка на мяжы,
Затым яна зелена,
Што ідуць дажджы.

Ой, молада, молада
Жонка ў мужыка,
Затым яна молада,
Што доля така.

Ой, спіць у пярыначцы
Да белага дня,
Пакуль збудзіць свёкарка
Не сваё дзіця:

— Уставай, нявестачка,
Доўга так не спі,
Рыжыя каровачкі
У поле не пашлі.

Кужалёк непрадзены
Кудзелькай ляжыць,
А жытцо, пшанічанька
Не жата стаіць.

А мужык заступіцца:
— Татачка ты мой!
Не маеш ты волечкі
Над жонкай чужой.

Рыжанькіх каровачак
Я й сам напасу,
Белы кужалёчак
Спрасці прыкажу.

На жытцо, пшанічаньку
Жнеяк я найму,
А сваю міленькую
Я й сам пабуджу.

Уставай, міленькая,
Досыць табе спаць!
Вараныя конікі
Упрэжаны стаяць.

Садзіся, міленькая,
К жнейкам павязу,
Усіх іх, галубачка,
Табе пакажу.

Золатам, дукатамі
Будзем ім плаціць,
К сабе на дажыначкі
Будзем іх прасіць.

Як пайду я ў каморачку...

Як пайду я ў каморачку
Ды прылажу галовачку.
Спаць хачу, спаць!
Спаць хачу, спаць!

Ідзе свёкар, гаворачы,
Каля маёй каморачкі:
— Спі, шэльма, спі,
Спі, не рабі!

І цяляткі не поены,
І кароўкі не доены,
Спі, шэльма, спі,
Спі, не рабі!

Як пайду я ў каморачку
Ды прылажу галовачку.
Спаць хачу, спаць!
Спаць хачу, спаць!

Ідзе мілы, гаворачы,
Каля маёй каморачкі:
— Спі, жонка, спі,
Спі, не рабі!

І цяляткі напоены,
І кароўкі падоены.
Спі, жонка, спі,
Спі, не рабі!

Я ўчора ў піру была...

Я ўчора ў піру была,
П'яненька дамоў прышла,

Ой, ёй-ёй-ёй, Божа мой,
П'яненька дамоў прышла. *

У вароты пастукала,
У вакенца паслухала.

Па хаце свёкар ходзіць,
У руках бізун носіць.

Ён у руках бізун носіць,
Залоўку набіць вяліць.

Мой мілы ўслед ходзіць,
Ён свайго татку просіць:

— Татанька раднюсенькі,
Не бі ты хмяльнюсеньку.

Бі жану цвярозую
Белаю бярозаю.

Бярозанька беленька,
А мне жонка міленька.

Бярозанька з веткамі,
Мая жонка з дзеткамі.

Бяда салаўю, бяда...

Бяда салаўю, бяда, **
Што халодная вясна:

Ні яму гнязда звіці,
Ні яму яйка знесці.

Гняздзечка завівае,
Яечка замярзае.

Бяда малайцу, бяда,
Што нялюба жана:

Ні яму з сабою браці,
Ні яму пакідаці.

У доме пакінуўшы,—
Матуля журлівая.

Матуля журлівая,
Жана бедурлівая.

Матуля журыць будзе,
Жана бедаваць будзе.

Ой, запяю песню вясёлую...

Ой, запяю песню вясёлую,
Вясёлую
Да развею бяду сваю,
Бяду сваю.

Бяда свая, бяда свая
Прабедзенька.

---

* Прыпеў «Ой, ёй-ёй-ёй, Божа мой» паўтараецца з другім радком кожнай страфы.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

Прабедзенька, ды ўсё не сукроўна,
Не сукроўна.

Радзіначка пайшла, пайшла маці
У сад гуляці.
Да свайго сыночка пазнаваці,
Пазнаваці.

Не пазнала сынка і ў народзе,
І ў народзе.
Да пазнала сынка і ў паходзе,
І ў паходзе.

— Ой сынку мой, сынку Іванюша,
Іванюша.
Я цябе насіла, галасіла,
Галасіла.

Я цябе раджала, абмірала,
Абмірала.
Да сорак жа ночак не спала,
Не спала.

Да сорак ночак не спала,
Не спала.
Да к сырой зямліцы прылягала,
Прылягала.

Ой, палын — трава горкая...

Ой, палын, палын,—
Трава горкая,
А доля мая
Яшчэ горшая.

Ой, пайду ў садок.
Вінаградачак,
К свайму татачку
На парадачку:

— А мой татачка,
Ды дарадзь ты мне,
Што мой міленькі
Не любіць мяне.

Робе краватку
Адзінокую,
Кладзе дошчачку
Нешырокую!

— Ой, гаруй, гаруй,
Маё дзіцятка,
Спацькі лажыся,
К сценцы хініся!

Гаруй горачка,
Не кажы людзям,
Насі золата,
Не хіні к грудзям!

— Маё золата
Перавязана,
Маё горачка
Усё расказана!

Ой, гаю мой, гаю...

Ой, гаю мой, гаю,
Гаю мой зялёны,
Ды праз цябе, гаю,
Ветрык павявае.

Ветрык павявае,
Лісточкі калыша,
А брат ды сястрыцы
Усё лісты піша.

Ой, піша ён, піша,
З паўночы чытае:
— Ой, чаму ж, сястрыца,
У гасцях не бывае?

Ой, ці ты, сястрыца,
Коніка не маеш,
Ды ці ты, сястрыца,
Дарожкі не знаеш?

— Ой, браце мой, браце,
Я й коніка маю,
Я й коніка маю,
Я й дарожку знаю.

Я й коніка маю,
Я й дарожку знаю,—
Ды за сваім горам
У гасцях не бываю.

Чырвоная каліначка...

Чырвоная каліначка*
На зялён луг схілілася,

Я, малада, журылася,
Што ад роду адбілася.

Ой, ад роду, ад радочку,
Цяжка мне жыць сіротачкай.

Цяжка жыці, цяжка быці
На чужыне маладзіцы.

Цяжка саду без зязюлі,
Мне ж цяжэле без матулі.

Цяжка рыбцы без вадзіцы.
Мне ж цяжэле без сястрыцы.

Цяжка дрэўцу без лісточка,
Мне ж цяжэле без браточка.

Ой, пайду я гукаючы,
Сваёй долі шукаючы.

Адгукнулась мая доля
На тым баку сіня мора.

Ой, пайду я к беражочку
Да к ліповаму кусточку.

Да вышчыкну па лісточку,
Да напішу па пісьмочку.

Ой, напішу па пісьмочку,
А пашлю я да радочка.

Няхай радня прачытае,
Назад весці прысылае.

---

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

Ой, горкая я і доля мая...

Ой, горкая я і доля мая,
За п'яніцу замуж выйшла.

П'е п'яніца ноч, другую,
На трэцюю ноч у двор
прыходзіць:

Бярэ мяне за ручэньку,
Вядзе на Дунай-рачэньку.

Хоча мяне ўтапіці,
Маю душу загубіці.

А я стала ды сказала:
— Чым я табе не ўгаджала.

А я ж бела ды румяна,
На работу хаджу рана.

На работу хаджу рана,
Хлеба-солі бяру мала.

А я й тога не з'ядаю,
Сваім дзеткам прыблюдаю.

Вярба, вярба, дзе ж ты расла?..

Вярба, вярба, дзе ж ты расла?
Ужо ж тваё лісцё вада знясла.

А я, млода,— як я жыла,
Што мая краса дарма прайшла?

Не йшла замуж ні год, ні два
І на трэці год не думала.

Аддалі замуж на пятаму
Ды п'янічаньку праклятаму.

Прапіў каня варанога
Ды ідзе дамоў па другога.

А я, млода, проці яго:
Нясу рубліка залатога.

Нясу рубля залатога
Выкупляць каня варанога.

Ні раз, ні два выкупляла,
У вішнёвым саду начавала.

Салавейкі «цяху-цяху»,
А я, молада, цярплю муку.

О, не кукуй, зязюленька, рана...

О, не кукуй, зязюленька, рана.
Гэй, гэй, зязюленька, рана.

Ды не кажы, што ночанька мала.
Гэй, гэй, што ночанька мала.

Я, молада, ўсю ночаньку не спала.
Гэй, гэй, усю ночаньку не спала.

Міленькага з дарожанькі чакала.
Гэй, гэй, з дарожанькі чакала.

Мой міленькі прыехаў так позна.
Гэй, гэй, прыехаў так позна.

Параскідаў падушачкі розна.
Гэй, гэй, падушачкі розна.

— А на каго ж, мой міленькі, злуеш?
Гэй, гэй, мой міленькі, злуеш?

Што мае падушачкі псуеш?
Гэй, гэй, падушачкі псуеш?

— Злую на тваю мамку старую.
Гэй, гэй, на мамку старую.

Што аддала цябе маладую.
Гэй, гэй, цябе маладую.

— Было не сеч зялёнага дуба.
Гэй, гэй, зялёнага дуба.

Было не браць, калі я не люба.
Гэй, гэй, калі я не люба.

О, не кукуй, зязюленька, рана.
Гэй, гэй, зязюленька, рана.

Белая бярозачка...

Белая бярозачка,
Ці не цёмненька табе
Сярод бору стоючы,
У роўна поле гледзючы?

Малада малодачка,
Ці не сумненька табе
З ліхім мужам жывучы,
На добрыя гледзючы?

— Жоначкі-суседачкі,
Парадзьце параданьку,
Як мне мужа навучыць,
Як ад п'янства адлучыць?

— Вазьмі ячменю жменю,
А другую — ды хмелю,
Звары піва п'янога,
Напой мужа ліхога.

Выведзі ў роўна поле,
Прывяжы да таполі,
Аблажы саломкаю,
Падпалі лучынкаю.

Бяжы ў дом гукаючы,
Ручанькі ламаючы:
— Здаецца, і гром не быў,—
Мілага пярун спаліў!

Аддаў мяне бацька далёка замуж...

Аддаў мяне бацька далёка замуж,
Прыказаў мне бацька ў госці не хадзіць.
Не хадзіла к бацьку чатыры гадочкі,
На пяты гадок пайшла к бацьку ў госці,
Маці не пазнала — са двара сагнала.
Суседзі спазналі, мамачцы сказалі:
— Суседачка наша, гэта ж дочка ваша!
— Суседачкі мае, вярніце яе!
— Хоць бы вы вярнулі, то я не вярнуся,
То я не вярнуся, назад не аглянуся,
Назад не аглянуся, слязьмі абальюся.
Як пайду я борам, борам ды барочкам,
Запяю я песню громкім галасочкам,
Як зачуюць-пачуюць ярыя ваўчочкі.
— Вы, ваўкі, ваўчочкі, зарэжце ж мяне,
Мяса паядайце, косці паглыдайце,
Косці паглыдайце, сэрца не чапайце.
Занясіце сэрца к татачку на двор,
К татачку на двор, к мамачцы на стол:
Няхай маці знае, як дачку зганяе.

Зялёная вішня

Зялёная вішня
З-пад кораня вышла.
Аддала мяне маці,
Дзе я непрывычна.
Ты думаеш, мама,
Што я тут паную.
Прыдзі падзівіся,
Як я тут гарую.
Ты думаеш, мама,
Што я тут не плачу,
А я ж за слязамі
Бела свету не бачу.
Успомні мяне, мама,
Хоць раз у нядзелю,
А я цябе, мама,
Сцелючы пасцелю.
Успомні мяне, мама,
Хоць раз у аўторак,
А я цябе, мама,
На дзень разоў сорак.
Успомні мяне, мама,
Хоць раз у суботу,
А я цябе, мама,
Ідучы на работу.
Як выйду на ганак
Ды крыкну дадому:
«Вары, мама, вячэру
І на маю долю».
«Варыла, варыла —
Ні многа, ні трошкі:
Няма табе, дочка,
Ні міскі, ні ложкі.
Міску разламалі,
А ложку згубілі.
Ідзі туды, дочка,
Каго ты любіла».

Ой, пайду я лугам, лугам...

Ой, пайду я лугам, лугам,
Дзе мой мілы арэ плугам.
Мілы арэ, а я плачу —
Маладые лета трачу.
Мілы арэ скібачкамі.
А я плачу слёзачкамі.
— А мамачка, што рабіці?
Што не хоча муж любіці?
— Вары, дачка, абед добра,
Нясі мужу есці ў поле.
Панясла я мужу есці —
Ці не скажа ён мне сесці?
Ён наеўся і напіўся —
Сеў на мяжы, пахіліўся.
— Чаго ляжыш ды не ворыш?
Чаму са мной не гаворыш?
— От я ляжу і думаю:
Нялюбую жонку маю.
Адыдзіся, нелюбая,
Ёсць у мяне ўжо другая.
— Хоць у цябе тры, чатыры —
Я старшая над усімі.
Я на шлюбе пастаяла,
З табой кольцы памяняла,
З табой кольцы памяняла,
Табе верна прысягала.

А дуб к дубу ды галовачку клоніць...

А дуб к дубу ды галовачку клоніць,
Цешча зяцю у бяседзе гаворыць:
— А ўзяў дачку красну, як бруснічку,
Счарніў дачку чорну, як чарнічку.
А ўзяў дачку, як яркае сонца,

Ссушыў дачку суху, як саломка.
А не мог зяць у бяседзі,
А пайшоў зяць свае жонкі гладзеці.
— А жана ж мая, наймілейша душа,
Сварылася на мяне твая маці дужа.
А мы ж з табой за адным сталом сядзім,
Мы ж з табою з адной міскі ядзім,
Мы ж з табой з адной лусты ломім,
Да мы ж з табой хораша гамонім.
— А й муж мой, ты, яснае сонца,
Прасці, прасці маёй матачцы тое слоўца.
А й у полі, полі ды каліна алеіць,
Кажная маці дзіцятка жалеіць.
А й у полі, полі ды каліна ссыхаіць,
Каждая маці па дзіцятку ўздыхаіць.

Ой, татачка мой родненькі...

Ой, татачка мой родненькі,
Галасочак мой тоненькі.
Ты не заві мяне доняю,
А заві мяне горкай доляю.
Як была я ў пялёначках —
Гора маё ў галовачках.
Як стала я падрастаць, падрастаць,
Гора маё павышаць, павышаць.
Як стала я каля лаўкі хадзіць —
Гора маё мяне за ручку вадзіць.
Павяду я гора ў цёмны лясок —
Гора маё не губляецца,
Ка мне ў лесе адгукаецца.
Павяду я гора ў рэчку тапіць —
Гора маё ды й не топіцца
І за мною ўслед валочыцца.
Нідзе яго не ўтапіць, не згубіць,
Давядзецца век увесь у горы жыць.

Як вышчыпну з рожы кветку

Як вышчыпну з рожы кветку
Ды пушчу на воду.
Плыла, плыла з рожы кветка
Ды й на вадзе стала.
Выйшла маці ваду браці —
Кветачку пазнала.

— Знаці, знаці, па дзіцяці
Сем нядзель ляжала.
— Не ляжала, мая мамка,
Ні дня, ні гадзіны.
Папалася ў такі рукі,
Ў няверну дружыну.
— Памры, памры, маё дзіця,
А хоць жа на тры дні —
Выпытаеш, выведаеш
У мілага праўды.
Яшчэ міла не сканала,
А ўжо мілы ўбраўся —
Дый з чужымі харошымі
Шчыльненька абняўся.

Галава мая, галовачка,

Галава мая, галовачка,
Галовачка мая бедная,
Галовачка мая бедная —
У мяне мамачка не родная.
У мяне мамачка не родная,
Сямеечка не вясёлая.
Самі сядуць павячэраюць,
Мяне, маладу, пашлюць па ваду.
Я, малада, не спрачаюся,
Па вадзіцу сабіраюся,
Буду ісці цераз бацькаў двор,
Цераз бацькава падворышча:
Мой татачка ў варотах стаіць,
А мамачка — у новых сенейках.
У татачкі слёзы коцяцца,
А ў мамачкі, як рака, льюцца.
— Не жалуйся ты, дачушачка,
Ні на бацьку, ні на мамачку,
А жалуйся ты, дачушачка,
На сваю буйну галовачку,
Што папалася ў няволечку.
З добрым моладцам злюбілася —
На бацьку, матку забылася.

А белая бярозачка бялей майго цела...

А белая бярозачка бялей майго цела,
Не аддаў мяне татачка за каго хацела.

А белая бярозачка ваду замуціла,
Чаго мяне, маладую, замуж пакруціла?
Ні я ўпіла, ні я ўела, ні я пагуляла —
Толькі свае маладыя леты пацірала.
Ні я ўпіла, ні я ўела, ні бела знасіла —
Толькі свае маладыя леты патраціла.
Ёсць у майго у брацяткі коні вараныя —
Я паеду даганяці леты маладыя.
І конікаў перагналі — й летаў не дагналі,
І конікаў памарылі — й летаў не ўлавілі.
Ёсць у майго міленькага кабылка гнядая,
Ой, сяду ж я, паеду я сама, маладая.
Сядзяць, сядзяць мае леты ў калінавым кусце.
— Вярніцеся, мае леты, хаця ка мне ў госці.
— Не вернімся, не вернімся, бо няма да чаго:
Было ўмеці шанаваці здароўечка сваё.

Ой, у роўным полі стаяць тры садочкі...

Ой, у роўным полі стаяць тры садочкі,
Ў адным садочку — салавей шчабеча,
У другім садочку — зязюлька кукуе,
У трэцім садочку — сын з мамкай гаворыць:
— Ой, сынку, мой сынку, сынку найраднейшы,
Скажы мне, мой сынку, хто ў цябе мілейшы:
Ці цешча, ці жонка, ці родная мамка?
— А мне цешча міла толькі для прывету,
А мне жонка міла — з вечара да свету,
А мне мамка міла — ад веку да веку:
Як мяне насіла — цяжынька хадзіла,
Як мяне раджала — канала-ўмірала,
Мяне гадавала — ночкі недаспала.
А як памрэ цешча — я й так абыйдуся,
А як памрэ жонка — з другой ажанюся,
А як памрэ мамка — слязой абальюся.

ЛЮБОЎНЫЯ ПЕСНІ

Ой, у полі верба расла...

Ой, у полі верба расла, *
Там стаяла дзеўка красна.

---

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Не так красна, як ўрадліва,
Яе доля нешчасліва.

Ой, у полі тры дарожкі,
Пайшла дзеўка да варожкі,
А варожка захварэла,
Варажыць не захацела.

— Не плач, дзеўка, не траць века,
Будзеш мець ты чалавека,
Не старога, не малога,
Казачэньку маладога.

Ой, зарадзілі сільна, буйна...

Ой, зарадзілі сільна, буйна
Ягады ў бары,
Ой, там хадзіла красна дзеўка,
Ягады брала.

Ой, заблудзіла красна дзеўка
У сырым бары,
Ой, прыблудзіла красна дзеўка
К круту берагу.

Ой, гукала, выклікала
Перавознічка:
— Ой, перавознік, бел малойчык,
Хлопец малады.

Перавязі ты красную дзеўку
На той бок ракі,
Ой, што захочаш, што запросіш,
Усё я заплачу.

— Ой, не хачу я, красна дзеўка,
Нічога з цябе,
Ой, ці пойдзе, красна дзеўка,
Замуж за мяне.

— То воля бацькі, воля маткі,
Воля не мая,
То воля бацькі, воля маткі,
Воля не мая.

А ў полі вярба...

А ў полі вярба,
Пад вярбой вада,
Там хадзіла, там гуляла
Дзеўка малада. *

Дзеўка ад вады,
Хлопец да вады:
— Пастой, пастой,
дзяўчыначка,
Дай каню вады.

— Рада б пастаяць,
Каню вады даць,
Мае босенькія ножкі,—
Сцюдзёна стаяць.

— Я зніму парчу,
Ножкі увярчу,
А назад як я вярнуся,
Боцікі куплю.

— Не купляй ты мне,
А купі сабе:
Ёсць у мяне татка, мамка,
Яны купяць мне.

Ой, рабіначка...

— Ой, рабіначка,
Ты зялёная,
Ой, калі ж ты ўзышла,
Калі вырасла?

— Я вясною ўзышла,
Летам вырасла,
На высокі цярэм
Пахілілася.

— Ой, дзяўчыначка,
Ты прыгожая,
Дзе ты, красна, расла,
Гадавалася?

— Я у мамкі расла,
Гадавалася,
Як вішэнька ў саду
Красавалася.

— Ты, дзяўчына, скажы,
Не утоівай,
Скажы праўданьку ўсю,
Дзе ўзяла красу?

— Я спаткала красу
У зялёным лясу,
У зялёным лясу
Пад рабіначкай.

— А дзявочу красу
Не знайсці ў лясу,
Не знайсці, не купіць
Ды прыгожай быць!

Ляціць галка цераз балку...

Ляціць галка цераз балку,
Лятаючы, крача.
Маладая дзяўчыначка
Ходзіць гаем, плача.

Не пускае яе маці
Рана да крыніцы,
Ні жыта жаці, ні лён рваці,
Ні на вечарніцы.

---

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

А раз вечарам пазненька,
Як маці заснула,
Выйшла слухаць салавейку,
Бо зроду не чула.

Выйшла, стала пад вярбою
Ды дзівіцца ў воду.
— Цяжка, маці, важка, маці,
Што й дала ўроду.

Нашто дала кары вочы,
Малёваны бровы.
І ўсё дала, і ўсё дала,
Да не дала долі.

Трэба было, мая маці,
Тых броў не даваці,
А лепш было б, мая маці,
Шчасце, долю даці.

Чаму не прыйшоў, ці не прыехаў...

— Чаму не прыйшоў, ці не прыехаў,
Як я цябе прасіла?

Ці каня не меў, ці сам не пасмеў,
Ці матка не пусціла?

— Я й коніка меў і ехаць хацеў,
Мамачка выпраўляла,

Меншая сястра, лет не дарасла,
Яна мяне не пускала.

— Не едзь, брацетка, не едзь, родненькі,
Бо туды не даедзеш.

Дзеўкі не зап'еш, коніка заб'еш,
Дадому не вернешся.

З'ездзіш коніка варанекага,
Па полі гарцуючы,

Стопчаш боцікі казловенькія,
З дзеўкамі танцуючы.

Сатрэш шапачку бабровенькую,
З галоўкі знімаючы,

А хусціначку шаўковенькую,
Слёзкі ўціраючы.

Ці свет, ці світае...

Ці свет, ці світае,
Ці на зоры займае?
А мой міленькі,
Голуб сівенькі,
Коніка сядлае. *

Сядлай, мілы, каня,
Каня вараненька,—
Прыязджай, мілы,
Не кідай, мілы,
Мяне маладзеньку.

Ці ж я не такая,
Як і тая, другая,—
Я харошая,
Я прыгожая,
Толькі доля ліхая.

У полі асінку
Вецярок калыхае,
А мой міленькі,
Чорнабрывенькі
Ад мяне уцякае.

У полі дубочак,
На вярху жалудочак.
Як не бачу я
Цябе, міленькі,
Невясёлы дзянёчак.

У полі азерца,
Там плавала вядзерца.
Ой, прыйдзі, прыйдзі,
Ды парадзімся,
Маё мілае сэрца.

Ты пойдзеш гарою,
Я пайду даліною.
Людзі кажуць мне
Ды сама знаю,
Што не жыць мне з табою.

Зялёны дубочак...

Зялёны дубочак,
Шырокі лісточак.
Куды вецер вее,
Туды голлі гнуцца.**

Куды вецер вее,
Туды голлі гнуцца.
Па ветру да мілай
Усе весці нясуцца.

Сягоння субота,
А заўтра нядзеля,
— Чаму ў цябе, хлопча,
Кашуля не бела?

— Як жа будзе бела,
Хоць заўтра нядзеля:
Мамка ў мяне стара,
Сястра ў мяне мала.

Мамка ў мяне стара,
Сястра ў мяне мала,
Дзяўчына кахана
Любіць перастала.

Пераплыву рэчку,
Сяду на брусочку.
Ці не прыйдзе міла
Памыць мне сарочку?

---

* Апошнія тры радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.
** Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

Ляціць сарока ды скрай аблока...

Ляціць сарока ды скрай аблока,
Усё крача.
Ходзіць Ясенька ды скрай ваконца,
Усё плача:

— Выйдзі, дзяўчына, сэрца адзіна,
Да мяне,
Сінія вочы спаці не хочуць
Без цябе.

— Свечка чуць гарыць, матуля не спіць,
Ах, баюсь.
Свечачка згасне, матуля засне,
То прыйду.

Параўнюй, Божа, горы, даліны
Роўненька,
Прынясі, Божа, майго мілога
Раненька.

А хоць раненька, а хоць пазненька —
Не баюсь,
Свайго мілога па ціхай мове
Пазнаю.

Пайду я ў садочак...

Пайду я ў садочак,
Сарву я лісточак
Ды павысцілаю
Мілага слядочак.

Ды павысцілаю,
Каб пташкі не ўбілі,
Каб майго мілога
Другія не любілі.

Адна палюбіла
Ды прычаравала:
Нясоленай рыбы
Вячэраць давала.

— Вячэрай, казачэ,
Ды не сумнявайся,
Як не маеш жонкі,
Са мною кахайся.

— Ой, маю я жонку
Ды на Украіне.
Разбітае сэрца
На дзве палавіны.

Ой, маю я жонку
Ды дзетачак двое,
Ды дзетачак двое,
Чарнявых абое.

Ці не быстрая рэчка...

Ці не быстрая рэчка ваду замуціла.
Ды чаго плачаш, дзяўчыначка,
Ці не матуля біла?

— Ой, біла не біла, сама засмуціла,
Што не даў мне Бог, не судзіў мне Бог
Каго верна любіла.

Ты пойдзеш гарою, а я даліною,
Я сама знаю, людзі гавораць,
Што не быць мне з табою.

Няхай жа гавораць усялякае ліха,
А мы з табой, дзяўчыначка,
Любімося ціха.

Ты, чырвоная каліна...

— Ты, чырвоная каліна,
Ах, і што цябе зламіла?
— Зламілі мяне буйныя ветры
Са лютымі маразамі.*

— Ой ты, беленькі малойчык,
Ах, і што цябе ссушыла?
— Ссушыла мяне дзяўчына тая,
Што із чорнымі брывамі.

Стаю я пад каліною,
Хаджу я за табою;
Выйдзі, дзяўчына, выйдзі, рыбчына,
Пагаворым мы з табою.

— Ах, і рада б выхадзіці,
Ды з табою гаварыці:
Ляжыць нялюбы на правай ручцы,
Я ж баюся разбудзіці.

— Дзяўчыначка мая люба,
Адкаціся ад нялюба,—

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

Буду страляці, буду лучаці
З-за зялёнага дуба.

Буду, буду лучаці
З-за зялёнага дуба:
Заб'ю нялюба з тугога лука,
Як сізога галуба.

— А ці ўлучыш, ці не ўлучыш,
Ужо з нялюбым не разлучыш.
Сядлай жа каня, з'язджай са двара,
Ты не мой, а я не твая.

На гарэ дубочак...

На гарэ дубочак,
Зялёны лісточак.
Не бачыла міленькага
Ужо другі дзянёчак.

Учора панядзелак,
Сягоння аўторак.
Я думала, маладзенька,
Што нядзелек сорак.

Па садочку хаджу,
Руту-мяту саджу.
— Выйдзі, выйдзі, мой міленькі,
Штось я табе скажу.

— А я табе скажу,
Што людзі гавораць,—
Што да цябе, мая міла,
Кавалеры ходзяць.

Чатыры хадзілі,
Няверна любілі,
Стаў пяты хадзіці,
Стаў верна любіці.

— Перастань, міленькі,
Да мяне хадзіці,
Як дазнае мая маці,
Будзе мяне біці.

— Ой, я не пакіну,
Я не перастану,
Пакуль жа ты, мая міла,
На шлюбаньку станеш.

— Ёсць у мяне зелле
Ніжай пералазу,
Як дам табе напіціся,—
Пакінеш адразу.

Усе хмарачкі ды па парачцы...

Усе хмарачкі ды па парачцы,
Адна хмарачка розна,
Адна хмарачка розна.

А не сварыся, мая мамачка,
Што прыходжу я позна,
Што прыходжу я позна.

А хоць сварыся, хоць не сварыся,
Ты мяне не навучыш,
Ты мяне не навучыш.

Каго я люблю, каго кахаю,
Ты мяне не разлучыш,
Ты мяне не разлучыш.

Дай волечку мне, да мне, маладой,
Дык помніці буду,
Дык помніці буду.

Замуж выйду, хоць як жыць буду,—
Цябе не забуду,
Цябе не забуду.

Ой, крушына, крушына...

Ой, крушына, крушына,
Ты мяне засушыла.

Ты вырасла ў полюшку
На маю нядолюшку.

Як ты распускалася,
Я з мілым спаткалася.

Як ты ягадзілася,
Я з мілым схадзілася.

Як ты асыпалася,
Я з мілым рассталася.

Праз твой зелен кусточак
Я згубіла вяночак.

Ой, ці ўсе лугі пакошаны...

Ой, ці ўсе лугі пакошаны,
Ці ўсе сенажаці.
Ой, пытаецца сын у матулі,
Каторую замуж браці.

Ой, ці тую багатую,
Што хораша ходзіць,
Ой, ці бедную сіраціначку,
Што ні возьме, то ўсё зробіць?

А багатая, няўдалая
У садочку гуляла,

Тая бедная сіраціначка
Тры капы жыта нажала.

У багатае, няўдалае —
Валы да каровы,
А ў беднае сіраціначкі —
Толькі чорныя бровы.

У багатае, няўдалае
Валы паздыхаюць,
А у беднае сіраціначкі
Бровы не зліняюць.

Ой, белая бярозанька...

Ой, белая бярозанька
Голлечкам да сонца.
Заплакала дзяўчыначка,
Гледзячы ў ваконца.

Ой, белая бярозанька
Шумна зашумела,
Маладзенькай дзяўчынаньцы
Галоўка балела.

Ой, балела, не балела,
Самі слёзы льюцца,
Што да мяне, маладое,
Няўдалыя шлюцца.

Хоць шлецеся, не шлецеся,
Я ваша не буду,—
Каму дала белу ручку,
То з тым жыці буду.

Адзін стаіць на ганачку,
Другі — за плячыма,
Адзін сыпле дукатамі,
А другі слязіма:

— Ой, каб табе, таварышу,
Дукатаў нястала,
Як я любіў дзяўчыначку,
Табе шкода стала.

Ой, каб жа ты, таварышу,
З ёю не разбыўся,
Як я любіў дзяўчыначку,
А ты ажаніўся.

Ой, бадай жа, таварышу,
Маё ліха табе,
Як я любіў дзяўчыначку,
А ты забраў сабе.

Ой, пад гаем зеляненькім...

Ой, пад гаем зеляненькім
Слала ўдова лён бяленькі.
Яна слала, выглядала,
Тонкі голас падавала.
Там Васілька сена косіць,
Тонкі голас пераносіць.
Кінуў касу на далінку,
А сам пайшоў дадоманьку.
Выйшла маці яго з хаты,
Стала Васіля пытаці:
— Ты, Васілька, што думаеш,
Чаму не п'еш, не гуляеш?
— Дазволь, маці, ўдаву ўзяці,
Тады буду піць, гуляці.
— Не дазволю ўдаву браці,
Удовы ўмеюць чараваці.
Чаравала мужа свайго,
Прычаруе сына майго.
— А я чараў не баюся,
Ды на ўдаве ажанюся.

Цякла рэчка з-пад мястэчка...

Цякла рэчка з-пад мястэчка,
З вішнёвага саду.
Кліча хлопец дзяўчыначку
К сабе на параду.

— Парадзь, парадзь, дзяўчыначка,
Як родная маці,
Ці мне цяпер жаніцца,
Ці восені ждаці?

— А я табе, бел малойчык,
Раю і не раю,
З табой стаю, размаўляю,
Пра другога дбаю.

— А каб жа ты, дзяўчыначка,
Тады замуж пайшла,
Як у млыне на камені
Пшанічанька ўзышла.

— А каб жа ты, мой малойчык,
Тады ажаніўся,
Як у полі пры дарозе
Сухі дуб развіўся.

Туман, туман па даліне...

Туман, туман па даліне,*
Шырокі ліст на каліне.

Яшчэ шыршы на дубочку,
Кліча голуб галубачку.

Хоць не сваю, дык чужую:
— Хадзі, міла, пацалую.

— Нашто ж маеш цалаваці,
Сэрцу тугі задаваці?

Не задавай сэрцу тугі,
Не возьмеш ты, возьме другі.

---

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Возьме другі і харошы,
Майму сэрцаньку прыгожы.

— Не плач, дзеўка, не журыся,
Я ж шчэ не ажаніўся.

Во, як буду жаніціся,
Прашу піва напіціся.

Майго піва напіціся,
Майму дзіву дзівіціся.

— Тваё піва мне не піва,
Тваё дзіва мне не дзіва.

Толькі дзіўна слава тая,
Што на людзях пахаджае.

Твая маці чараўніца,
А сястрыца разлучніца.

Разлучыла нас з табою,
Як рыбаньку з вадою.

Цяжка рыбцы без вадзіцы,
Так мне, беднай маладзіцы.

Цяжка рыбцы на пясочку,
Так мне, беднай, без дружочка.

А дзе тая крынічанька...

А дзе тая крынічанька,
Голуб што купаўся?
А дзе тая дзяўчынанька,
З каторай кахаўся?

А ўжо тая крынічанька
Даўно замучона,
А ўжо тая дзяўчынанька
З другім заручона.

Ой, я тую крынічаньку
Тыччам пратычу,
Ды я сваю міленькую
К сабе пераклічу.

Ой, я тую крынічаньку
Чаўном пераплаўлю,
Ды я сваю міленькую
К сабе перабаўлю.

Вой, стаяла калінанька
На заходзе сонца,
А плакала дзяўчынанька,
Гледзячы ў ваконца.

Зажурылі, засушылі
Мяне, маладзеньку,
Яшчэ з войскам у свет далёкі
З'ехаў і міленькі.

Не плач, не плач,
дзяўчынанька,
Я к табе вярнуся.

Усёй душою, шчырым сэрцам
К табе прыхілюся.

Зажывём мы, запануем,
Як галубкоў двое,
І раздзелім з табой шчасце,
Долю і нядолю.

Здрада, здрада, чорны бровы, здрада...

Здрада, здрада, чорны бровы, здрада!
А ўсё ж твая, мой мілы, няпраўда.

Як жаніўся, любіці маніўся,
А цяпер ты ад мяне ад'язджаеш.

А куды ж ты ад мяне ад'язджаеш,
Каму, маладую, мяне пакідаеш?

Рана ўстаеш, каню аброк даеш,
На повадзе к вадзе каня вядзеш.

Як белы свет, коніка сядлаеш,
У абед дык з двору выязджаеш.

Я пастаўлю стораж ў парозе,
Сама лягу на цісовай ложы.

Чую, чую, стораж мой гаворыць,
Што мой мілы ўжо ад'язджаіць.

— Зламі, конік, нагу вараную,
Скруці, мілы, галаву змяннную.

Скруці, мілы, галаву змяннную,
Як ты змяніў мяне, маладую.

Ой, ляцелі гусі...

Ой, ляцелі гусі
Ды з-пад Белай Русі,
Селі яны, палі,
На ціхім Дунаю.

Селі яны, палі,
Ваду замуцілі,
А нас, маладзенькіх,
З табой разлучылі.

Бадай тыя гусі
Марна запрапалі,
Як мы кахаліся,
Цяпер перасталі.

Як мы кахаліся,
Як ластаўкі ў стрэсе,
Цяпер разышліся,
Як дарожкі ў лесе.

Як мы кахаліся,
Нас бяда не знала,—
Цяпер разышліся,
Як цёмная хмара.

Паехаў мой мілы...

Паехаў мой мілы,
Не чуць, не відаці,*

Выйду за вароты —
Два слядочкі знаці.

Ой, адзін слядочак —
Каня варанога,

А другі слядочак —
Майго міленькога.

Ой, пайду я, пайду
У вішнёвы садочак.

Вышчыплю, выламлю
З каліны лісточак.

Вышчыплю, выламлю
З каліны лісточак,

Буду прыкрываці
Мілага слядочак,

Каб па яго следу
Людзі не хадзілі,

На чужой старонцы
Дзеўкі не любілі.

На чужой старонцы
Дзеўкі не любілі,

Мяне, маладую,
За ім не судзілі.

Судзілі, судзілі
Старыя й малыя,

Цяпер пачынаюць
Хлопцы маладыя.

Хоць вы гаварыце,
Хаця перастаньце,

Мяне, маладую,
Болей не чапайце.

У агародзе вярба расла...

У агародзе вярба расла,
Там стаяла дзеўка красна.

Яна красна ды й красіва,
Доля ж яе нешчасліва.

---

* Другі радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

Доля ж яе нешчасліва,
Няма таго, што любіла.

Няма яго ды й не будзе,
Разлучылі злыя людзі.

Разлучылі, разлучылі,
Каб у пары не хадзілі.

Ці свет, ці світае...

Ці свет, ці світае,
Ці на зоры займае?
Ці мой міленькі, галуб сівенькі,
Коніка сядлае?

Сядлай, мілы, каня,
Каня вараненькага,
Прыязджай, мілы, не кідай, мілы,
Мяне, маладзеньку.

Ці я не такая,
Як і гена другая?
Я й харошая і прыданая —
Доля ж няшчасная!

Ой, у полі азерца,
Там плавала вядзерца,
Ой, прыдзі, мілы, да й парадзімся,
Маё мілае сэрца!

Чырвона каліна
Да ў полі павяла,
Не суверная да дружынька
Мне свет завязала.

Ты пойдзеш гарою,
А я даліною,
Кажуць мне людзі, дай сама знаю,
Што не жыць мне з табою.

Ой, хадзіла Машанька...

Ой, хадзіла Машанька
Па садочку,
Пакалола ножачку
На вішнёчку,
Баліць, баліць ножачка,
Ды не больна.
Любіў казак дзеўчыну,
Ды не доўга.
А забралі казачэнька
У салдаты,
Забыла дзяўчыначка
Папытаці.
Забыла дзяўчыначка
Папытаці,
Ці ёй замуж выхадзіць
Ці гуляці.

— Гуляй, гуляй, дзяўчыначка,
Як гуляла,
Тапчы, тапчы чаравічкі,
Як таптала.
Тапчы, тапчы чаравічкі.
Як таптала,
Не кажы ты хлопцам праўды,
Як казала.
Не кажы ты хлопцам праўды,
Як казала,
Не сцялі ім пасцель белу,
Як ты слала.
Яны тваю пасцель белу
Перакінуць,
Яны цябе любіць будуць
Ды пакінуць.

Ой, заржы, заржы, сівы коніку...

Ой, заржы, заржы, сівы коніку,
Рана з поля ідучы.
Ці не пачуе мая міла,
Пасцельку сцелючы?
Яна пачула, цяжка ўздыхнула,
Сільна заплакала.
Няма мілога, чарнабрывога,
Што верна кахала.
Ой, стаіць явар ды над вадою,
Кудравы да долу.
Ах мой міленькі, з Украіненькі
Вярніся дадому.
Ой, стаіць явар дый над вадою,
Явар вада мые.
Ах мой міленькі з Украіненькі,
Сэрца ж маё ные.
Ой, стаіць явар дый над вадою,
Каб не абярнуўся.
Ах мой міленькі з Украіненькі
Каб скора вярнуўся.

Сядзіць голуб пры дубку...

Сядзіць голуб пры дубку,
Галубка на вішні,
Скажы, скажы, дзяўчыначка,
Што ў цябе на мыслі?

— Як не хочаш, мой міленькі,
Ты мяне любіці —
Парай, парай ты мне зелля,
Каб скарэй забыці.

— А я знаю тое зелле
Блізка пералазу,
Як папарыш і нап'ешся,—
Забудзеш адразу.

— Буду парыць, буду піці,
Каплі не апушчу,
Тады я цябе забуду,
Як вочы заплюшчу.

Што за месяц, што за ясны...

Што за месяц, што за ясны,—
Уночы свеціць, а ўдзень не.
Што за міленькі дружочак,—
Калі прыйдзе, калі не.

Усе людзі, людзі кажуць,
Усе людзі гавараць:
— Сорам, дзеўка, сорам, красна,
Позна з вечара гуляць.

Дзяўчыначцы кепска стала,
Стала плакаць ды ўздыхаць,
Хлапчыноньку шкода стала,
Стаў дзяўчынку суцяшаць.

— Не плач, дзеўка, не плач, красна.
Прыйду ў госці да цябе,
Разгарыцца кроў гарача —
Вазьму замуж за сябе.

Па садочку пахаджаю...

Па садочку пахаджаю,
Сама сябе разважаю,
Сама сябе разважаю:
Каго люблю, ды не маю.
Каго люблю, ды не будзе,
Адлучылі яго людзі,
Адлучылі, адсудзілі,
Каб мы ў пары не хадзілі.

Каб мы ў пары не хадзілі,
Адзін другога не любілі.
Я, малада, пакарана:
Ў мяне пара не дабрана.
Пайду ў рэчку утаплюся
Ці аб камень разаб'юся.
Няхай усе людзі знаюць,
Што з кахання паміраюць.
— Ой, у садзе вішня расла,
Не плач, дзеўка, не плач, красна:
Будзеш меці з кім гуляці,
Галовачку хлапатаці.

Ці ўсе тыя да сады цвітуць...

Ці ўсе тыя да сады цвітуць,
Каторыя асыпаюцца?
Ці ўсе тыя шлюбы бяруць,
Што любяцца ды кахаюцца?
Палавіна да садоў цвіце,
Палавіна асыпаецца,
Палавіна шлюбы бярэ,
Палавіна разлучаецца.
— Ці я табе не казала,
Як стаялі пад паветкаю:
Не едзь, мілы, ў чужы край,
Не застанеш мяне дзеўкаю?
Ці я табе не казала,
Як стаялі над крыніцаю:
Не едзь, мілы, ў чужы край,
Бо застанеш маладзіцаю?
— Любіў цябе я дзяўчынаю,
Буду кахаць маладзіцаю,
Сем гадоў буду чакаці —
Вазьму замуж удавіцаю.

Добры вечар, дзяўчыначка...

— Добры вечар, дзяўчыначка, куды йдзеш?
Скажы ж ты мне праўданьку, дзе жывеш?
— Я жыву на беразе, ля вады,
Збудаваўшы хатачку з лебяды.
Паставіў я коніка ля варот,
А сам да дзяўчыначкі на парог:
— Адчыні, дзяўчыначка, адчыні,

Сама сабе крыўданькі не рабі.
— Не буду, не буду я адчыняць,
Бо захочаш ночаньку начаваць.
— Не буду, дзяўчыначка, не буду,
Як узыдзе месячык — я й пайду.
Ой, узышоў месячык і зара.
— Бывай ты, дзяўчыначка, здарова!

Любіліся, кахаліся...

Любіліся, кахаліся,
Як галубкі ў стрэсе,
А цяпер мы разышліся,
Як ягадкі ў лесе.
— Як не хочаш, мой міленькі,
Маім дружком быці,
То дай жа мне таго зелля,
Каб магла забыці.
— Ёсць у мяне тое зелле
Каля пералазу:
Як наварыш і нап'ешся —
Забудзеш адразу.
— Буду варыць, буду піці
І каплі не ўпушчу.
Тады, міленькі, забуду,
Як вочанькі сплюшчу.

Ты, мой казача, ты, мой любенькі...

— Ты, мой казача, ты, мой любенькі,
Калі мы будзем ад'язджаць?
— Тады мы будзем ад'язджаць,
Калі ўсе людзі лягуць спаць.
— Ты, мой казача, ты, мой любенькі,
А дзе ж мы будзем начаваць?
— Я пад вярбою і ты са мною,
Ты ж, мая люба, дарага.
— Ты, мой казача, ты, мой любенькі,
А што мы будзем з табою слаць?
— Сцялі радзенца, ты ж маё сэрца,
Ты ж, мая люба, дарага.
— Ты, мой казача, ты, мой любенькі,
А чым мы будзем накрывацца?
— Я — чорнай хмарай, ты — людскай славай,
Ты ж, мая люба, дарага.

— Ты, мой казача, ты, мой любенькі,
А чым мы будзем умывацца?
— Ой, я — вадою, а ты — слязою,
Ты ж, мая люба, дарага.
— Ты, мой казача, ты, мой міленькі,
А што мы будзем снедаці?
— Я — белы булкі, ты — думай думкі,
Ты ж, мая люба, дарага.

Учора не быў і сёння не быў...

Учора не быў і сёння не быў,
Відаць, мой міленькі мяне пазабыў.
— Яшчэ не забыў, хіба забуду:
Сяду і паеду — сем год не буду.
Да едзь сабе, едзь, такой там бяды.
Прыласкаю хлопца з чужой стараны.
Пасаджу яго на канцы стала,
Буду паглядываці, як на сакала.
— Сакол мой, сакол, чаму ты невясёл?
Напэўна, саколік, саколку ты меў?
— Я саколку меў, і замуж пайшла,
Ды каб жа далёка — ў суседа майго.
Вадзіцы ідзе — «дооры дзень» дае.
Яна майму сэрцу жалю паддае.
Вадзіцы ідзе — усміхаецца,
А маё сэрцайка разрываецца.
Пайду я, пайду — стрэльбачку вазьму.
Няхай жа не будзе ні мне, ні яму.

Ой, у полі азярэчко...

— Ой, у полі азярэчко,
Там плавала ведзярэчко.
Сасновы клёпкі, дубовы дзенцо —
Выйдзі, выйдзі, маё сэрцо.
— Ой, рада б я выхадзіці,
З табой рэчы гаварыці.
Людзі кажуць мне, сама я знаю,
Што цябе мне не любіці.
Ой ты, хлопец маладзенькі,
Дзе твой конік вараненькі?
Асядлай каня, выязджай з двара,
Ты не мой, я не твая.
Хлопец коніка сядлае,

Да коніка прымаўляе:
«Рыссю, мой коню, рыссю, мой сівы,
Аж да ціхага Дунаю,
А ля ціхага Дунаю
Стану, гляну, падумаю:
Ці мне ўтапіцца, ці з каня ўбіцца,
Ці дадому вараціцца?»

Там у лузе, лузе...

Там у лузе, лузе
Зацвіла каліна,
Захацела ў садзе спаці
Малада дзяўчына.

Захацела ў садзе спаці
Там пад яблынькамі:
— Пусці, маці, пагуляці
Ночку з малайцамі.

Сядзіць братава на лаўцы,
Ў вокны паглядае:
— Ужо твая дочка, маці,
З хлопцамі гуляе.

— Ой, бадай ты, братавая,
З лаўкі ды не ўстала,
Як на мяне маладую,
Няпраўду сказала.

Бадай жа ты, братавая,
З хаціны не выйшла,
Як на мяне маладую,
Няславанька выйшла.

Ой, ляцелі гусі з броду...

Ой, ляцелі гусі з броду,
Памуцілі ў рэчцы воду.
Покуль вада чыста стала,
Я з Раманам пастаяла.
Раман, Раман, Раманіку,
Пусці мяне дадоміку.
Я не родну мамку маю —
Будзе біці, добра знаю.

Не так біці, як ругаці,
Яшчэ й шэльмай называці.
«Дзе ты, шэльма, валачылась,
Што вячэра ўжо зварылась!»
А я маці прызнаюся,
Што з Раманам кахаюся.
Ён бялявы, я чарнява:
Будзе пара кучарава.
Ён высокі, а я нізка:
Будзе пара вельмі блізка.
Ой, ляцелі гусі з броду,
Памуцілі ў рэчцы воду.

ЖАРТОЎНЫЯ ПЕСНІ

Ой, у полі крынічанька...

Ой, у полі крынічанька,
Там халодна вадзічанька.

Ой, там Раман валоў пасе,
Кацярына ваду нясе.

Стаў Раманку жартаваці,
З вядзёр ваду выліваці.

— Ой, Рамане, маё сэрца,
Пакінь вады хоць вядзерца.

Мая вада халодная,
У мяне маці няродная.

Я няродну маці маю,
Будзе біці, добра знаю.

Будзе біці і караці
І шэльмаю называці.

«Дзе ты, шэльма, спазнілася,
Бо вячэра зварылася».

— Навучу, дзеўка, збрахаці,
Каб не біла цябе маці.

«Наляцелі гусі з броду,
Памуцілі з пяском воду.

Я стаяла, прастаяла,
Пакуль вада састаяла».

— Брэшаш, доню, збрахалася,
Ты з Раманам кахалася.

— Цяпер, маці, прызнаюся,
Што з Раманам кахаюся.

Ён чарнявы, я бялява,
Будзе пара кучарава.

Ён высокі, а я нізка,
Будзе нам радзіна блізка.

Ён багаты, а я бедна,
Будзе пара адпаведна.

Ой, у полі крынічанька,
Там халодна вадзічанька.

Ой, пасею я рамоню...

Ой, пасею я рамоню
Да ў гародзе пры дарозе.
А там малады коні пасе
Ды да мяне нанач ідзе.

А я яго палюбіла,
На покуце пасадзіла.
Мёдам, віном напаіла,
Калбаскаю накарміла.
А я яму пасцель слала:
Адзін радочак падушачак,
Другі радочак пярынаў,
А пад галоўку пухоўкі.

А я яго пакрывала
Ядвабным коўдрам.
А заўтра я яго выпраўляла
З музыкамі і скрыпкамі.

Ой, я на яго слядочак
Пакаціла талярочак.

Ой, пасею я рамоню
Да ў горадзе пры дарозе,
А там стары валы пасе
Ды да мяне нанач ідзе.
А я старога не любіла,
Пад печаю пасадзіла,
Дзёгцем, смалой напаіла.
Я яму пасцель слала:
Адзін радочак камячоў.
Другі радочак палячоў,
Жэжнавы камень пад галоўку.
А я яго пакрывала старою бараною.
А назаўтра выпраўляла,
Сабакамі цкавала,
А на яго слядочак
Пакаціла камушочак.

Ой, паслала мяне маці...

Ой, паслала мяне маці,
Ой, паслала мяне маці,
Ой, паслала мяне маці
Яравое жыта жаці.

А я жыта не жала,
А я жыта не жала,
А я жыта не жала,
У баразёнцы ляжала.

Баразёнка вузенька,
Баразёнка вузенька,
Баразёнка вузенька —
Не памесцілася.

Цёмна ночка каротка,
Цёмна ночка каротка,
Цёмна ночка каротка —
Не нацешылася.

А я дзень укарачу,
А я дзень укарачу,
А я дзень укарачу,
Цёмну ночку падтачу.

Вунь Мікіта ідзе,
Вунь Мікіта ідзе,
Вунь Мікіта ідзе,
Мне арэшкі нясе.

Я не знаю, што рабіць,
Я не знаю, што рабіць,
Я не знаю, што рабіць:
Ці пакінуць, ці любіць?

Ці арэшкі лускаць,
Ці арэшкі лускаць,
Ці арэшкі лускаць,
Ці Мікіту цалаваць?

Я й арэшкі лускала,
Я й арэшкі лускала,
Я й арэшкі лускала
І Мікіту цалавала.

Ой, хацела ж мяне маці...

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за першага аддаць,
А той первы,
Первы няверны,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за другога аддаць,
А той другі
Ходзіць да падругі,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за трэцяга аддаць,
А той трэці
Як у полі вецер,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
За чацвёртага аддаць,
А той чацвёрты
Ні жывы, ні мёртвы,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за пятага аддаць,
А той пяты
П'яніца праклятый,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за шостага аддаць,
А той шосты
Малы, недарослы,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за сёмага аддаць,
А той сёмы
Прыгожы ды вясёлы...
Ён не схацеў мяне ўзяць!

Сам не знаю, не ведаю...

Сам не знаю, не ведаю,
Што рабіці маю.
Людзі кажуць жаніціся,
А я і не думаю.

Ой, што ж мне жаніцца,
Ой, нашто ж мне жонка?
Ёсць ў мяне суседачка,
Добра прыяцелька.

Маладзіцы, удавіцы
На мяне маргаюць,
То ў нядзелю, то у свята
К сабе зазываюць.

— Прыдзі, прыдзі, мой міленькі,
Ка мне на хвілінку,
А я вышлю свайго дзеда
У лес па малінку.

Ідзі, стары, барадаты,
У лес па малінку.
А не пойдзеш у маліну,—
Любіці пакіну.

Хлопец пашаньку пахае...

Хлопец пашаньку пахае, ой-ёй-ёй!
У яго сошанька крывая, ой, Божа ж мой!*

Прышла к яму чарнявая:
— Вазьмі ж мяне, хлопец, замуж.

Дзеўка замуж захацела,
Ледзь уся не абамлела.

Хлопец здуру ажаніўся,
Навек жонкай падавіўся.

Ані лыжкі, ані міскі,
Павесілі тры калыскі.

Ля калыскі трэба нянькі,
А ля печы кашаваркі.

Даў ёй хлопец тры капейкі:
— Пайдзі купі хлеба, солі.

Хлеба, солі не купіла,
На базары заблудзіла.

Ой, пайду я лугам...

Ой, пайду я лугам, лугам, ну ды я, ну ды я,
Дзе мой мілы арэ плугам, ну ды я, ну ды я.

Панясу я яму есці, ну ды я, ну ды я.
Ці не скажа радам сесці, ну ды я, ну ды я.

Ён наеўся і напіўся, ну ды я, ну ды я,
Сеў на плуг і засмуціўся, ну ды я, ну ды я!

— Чаго сядзіш і не арэш, ну ды я, ну ды я,
Чаго, мілы, не гаворыш, ну ды я, ну ды я?!

— А я сяджу і думаю, ну ды я, ну ды я,
Што ліхую жонку маю, ну ды я, ну ды я.

---

* Прыпевы «Ой-ёй-ёй» і «Ой, Божа ж мой!» паўтараюцца адпаведна пасля першага і другога радкоў кожнай страфы.

— Ці ж ты сватаў мяне ўночы, ну ды я, ну ды я,
А дзе ж былі твае вочы, ну ды я, ну ды я?

— Каб жа ты была такая, ну ды я, ну ды я,
Як і мая братавая, ну ды я, ну ды я!

— А я бровы ў сажу ўмажу, ну ды я, ну ды я,
Братавую пераважу, ну ды я, ну ды я!

Чабарок, чабарок...

Чабарок, чабарок
Ды каля дарожкі,
Харошанькі мой міленькі,
Ды крывыя ножкі.
Ох, ох, ды крывыя ножкі.*

А мой жа ты даўганосы,
Ой, які ж ты нехарошы,
Каб ты быў такі, як я,
Дык даўно была б твая.

Каля саду я хадзіла,
Ды шчыпала вішні.
Дай жа, Божа, кавалера
Ды пад мае мыслі.

Каб і люльку не курыў,
Табакі не нюхаў,
Чужых жонак не любіў,
Адну мяне слухаў!

Чаму ж мне не пець...

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Калі ў маёй хатаньцы
Парадак ідзець?

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Мушка на вакенцы
У цымбалкі тнець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Павучок на сценцы
Кросенцы снуець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Мой сынок ў калысцы,
Як бычок, равець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Парсючок пад лаўкаю
Бульбачку грызець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Жонка на печы
Прусакоў таўчэць.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Петушок на сметнічку
Зерняткі дзяўбець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Сучачка на лычку
Хатку сцеражэць.

---

* Апошні радок кожнай страфы паўтараецца з воклічам «Ох, ох!»

На дварэ дожджык...

На дварэ дожджык,
А ў хаце лужа.
Разгневалася жонка
Ды на свайго мужа.

Міленькі ходзіць,
Ручанькі ломіць:
— Чаго ж мая любка
Са мной не гаворыць?

Разгневалася жонка
Ды на свайго мужа,
Залезла на печку,
Сказала: нядужа.

Міленькі ходзіць,
Ручанькі ломіць:
— Чаго ж мая любка
Са мной не гаворыць?

Устань, устань, міла,
Прынёс табе піва.
— Дай жа мне спакой,
Я ледзьве жыва.

Міленькі ходзіць,
Ручанькі ломіць:
— Чаго ж мая любка
Са мной не гаворыць?

Устань, устань, міла,
Я прынёс гарэлкі.
— Чорт цябе забяры,
Шукай сабе дзеўкі.

Міленькі ходзіць,
Ручанькі ломіць:
— Чаго ж мая любка
Са мной не гаворыць?

Устань, устань, міла,
Прынёс табе мёду.
— Дай жа мне спакой,
Я не ем яго зроду.

Міленькі ходзіць,
Ручанькі ломіць:
— Чаго ж мая любка
Са мной не гаворыць?

Устань, устань, міла,
Прынёс я дубінку —
Тонкую, гібкую
Ды й на тваю спінку.

Мілая ўстала
Як бы не ляжала,
Абняла мілога
Ды й пацалавала.

— Дзякуй табе, мілы,
Што ты здагадаўся,
Ад маёй хваробы
Зелля расстараўся.

Не балела цела,
Не балелі косці.
Гэта ж я ляжала
З вялікае злосці.

А мой мілы захварэў...

А мой мілы захварэў,
Кіселіку захацеў.

Ох, ну, ды ох, ну!*
Кіселіку захацеў.

---

* Словы «Ох, ну, ды ох, ну!» паўтараюцца ў кожнай страфе з паўторам другога радка тэксту.

670 Ой, цыц, мілы, не ўмірай,
Кіселіку дажыдай.

Пайшла баба па сялу
Даставаці кісялю.

Не дастала кісялю,
Ды дастала аўса.

Намачыла кісель
На дванаццаць нядзель.

На баране цадзіла,
А на лёдзе варыла.

Пакуль кісель укіпеў,
Мой міленькі адубеў.

Як на покуці ляжаў,
Яшчэ было трошкі жаль.

Цераз сяло як вяла,
Яшчэ трошкі загула.

Як вывела за сяло,
Ужо стала весяло.

Было ў цешчы сем зяцёў...

Было ў цешчы сем зяцёў:
Вот і Цішка зяцёк,
І Мікіта зяцёк,
І Захарка зяцёк,
І Макарка зяцёк,
І Дзяменцій зяцёк,
І Кліменцій зяцёк,
Ай, Ванюша луччы ўсіх.

Прыехалі зяці ў госці:
Вот і Цішка прыехаў,
І Мікітка прыехаў,
І Макарка прыехаў,
І Захарка прыехаў,
І Дзяменцій прыехаў,
І Кліменцій прыехаў,
Ай, Ванюша ўперадзі ўсіх.

Стала цешча зяцёў частаваці:
Вот і Цішку стакан,
І Мікітку стакан,
І Захарку стакан,
І Макарку стакан,
І Дзяменцю стакан,
І Кліменцю стакан,
Ай, Ванюшу стакан мёду.

Стала цешча закуску даваць:
Вот і Цішку ляпёшку,

І Мікітку ляпёшку,
І Захарку ляпёшку,
І Макарку ляпёшку,
І Дзяменцю ляпёшку,
І Кліменцю ляпёшку,
Ай, Ванюшку гарачы блін.

Стала цешча зяцёў спаці класці:
Вот і Цішку на пол,
І Мікітку на пол,
І Захарку на пол,
І Макарку на пол,
І Дзяменцю на пол,
І Кліменцю на пол,
Ай, Ванюшку на куце.

Стала цешча напрадкі даваці:
Вот і Цішку дзяружку,
І Мікітку дзяружку,
І Захарку дзяружку,
І Макарку дзяружку,
І Дзяменцю дзяружку,
І Кліменцю дзяружку,
Ай, Ванюшку адзіяла.

Стала цешча зяцёў праважаці:
Вот і Цішку дубінкай,
І Міколку дубінкай,
І Захарку дубінкай,
І Макарку дубінкай,
І Дзяменцю дубінкай,
І Кліменцю дубінкай,
Ай, Ванюшка хай тут.

Спарадзіла чачотачка семера дачок...

Спарадзіла чачотачка семера дачок,
Спарадзіла невялічкіх, семера малых:
Аўгіння і Аксіння,
І Тацюха, і Насцюха,
І Макрына, і Грыпіна,
Сёмая — Хімка.

Спарадзіўшы і ўзрасціўшы, замуж аддала:
Аўгінню за Мірона,

Аксінню за Сапрона,
Тацюху за Дзяміда,
Насцюху за Свірыда,
Радзівону — Макрына,
А Хрытону — Грыпіна,
Хімку — за Кузьму.

Як пачала чачотачка пасагі даваць,
Як пачала невялічкім усім дараваць:
Аўгінні — кажушок,
Аксінні — фартушок,
Тацюсі — пялёнкі,
Насцюсі — суконкі,
Макрыні — дзве кошкі,
Грыпіні — панчошкі,
Хімцы — падвязкі.

Зазывала чачотачка дзесяцёх мудрых,
Зазывала чачотачка братцоў родных:
Адзін быў Савацей,
Другі быў Цілямей,
Трэці быў Атрахім,
Чацвёрты — Гарасім,
Быў Барыс і Дзяніс
І арганец, пузанец,
І слуга Карпец.

Былі дзеўкі на вяселлі і маладзіцы,
Былі старынькія бабкі і ўдавіцы:
Яся, Кася і Скірпуся,
Была Хадора і Барбуся.
Нанімала чачотачка многа музыкі,
Нанімала чачотачка ўсю капэлю:
Верабей на скрыпцы,
Салавей на прытыцы,
А сарокі ў прыскокі,
А вароны у далоні,
Чорны галкі на цымбалкі,
Дробны пташкі насунулі,
Люба слухаць, як зайгралі.

А чачотка не гуляла,
Чорну блаху гатавала.
Тры дні госці банкет мелі,
Пакуль чорну блаху з'елі.

А на трэцюю нядзелю
Госці дамоў захацелі,
За вяселле дзянкавалі,—
Пара дамоў!

А як дзед з бабай пайшоў па каліну...

А як дзед з бабай пайшоў па каліну,
Цераз рэчку, азярцо пераходзіць дзеду.
— А дзеду мой, дзеду, наламай каліны,
Не наломіш каліны — люблю ды й пакіну.*

А ўжо дзеду вада па калена паняла,
Сядзіць баба на беражку, дзеду веры не няла.

А ўжо дзеду вада ды па пуза паняла,
Сядзіць баба на беражку, дзеду веры не няла.

А ўжо дзеду вада па пояс паняла,
Сядзіць баба на беражку, дзеду веры не няла.

А ўжо дзеду вада па грудзі паняла,
Сядзіць баба на беражку, дзеду веры не няла.

А ўжо дзеду вада ды й па глотку паняла,
Сядзіць баба на беражку, дзеду веры не няла.

А ўжо дзед патануў, толькі задам баўтануў,
Рада баба, рада баба, што дзед утапіўся:
Ды паднялась пранца-хваля, за куст учапіўся.

Пасеяў мужык грэчку...

Пасеяў мужык грэчку,
Жонка кажа: «Мак, мак!»
Няхай так, няхай сяк,
Няхай з грэчкі будзе мак.

Пасеяў мужык жыта,
Жонка кажа: «Мак, мак!»
Няхай так, няхай сяк,
Няхай з жыта будзе мак.

Пасеяў мужык рэпу,
Жонка кажа: «Мак, мак!»
Няхай так, няхай сяк,
Няхай рэпа будзе мак.

Злавіў мужык рыбу,
Жонка кажа: «Рак, рак!»
Няхай так, няхай сяк,
Няхай рыба будзе рак.

Купіў мужык бізуна,
Жонка кажа: «Пастарнак!»
— Калі гэта пастарнак,
Пакаштуй жа яго смак.

* Апошнія два радкі паўтараюцца як прыпеў пасля кожнай страфы.

А ў верасні месяцы...

А ў верасні месяцы
Выпала пароша.
Дзед бабу палюбіў,
Бо яна хароша.

І крывая, і сляпая,
Яшчэ к таму злая:
І крычыць, і бурчыць,
Слова дзеду не змаўчыць.

— Убярыся, бабка,
У белае белле:
Я ж цябе павяду
З сабой на вяселле.

Убралася бабка
Ды ў белае белле.
— Цяпер вядзі, дзед, мяне
З сабой на вяселле.

Узяў дзед ды бабку
За белую ручку,
І спіхнуў дзед бабку
З моста ды ў рэчку.

— Цяпер, бабка, кайся,
Крыху пакупайся.
А як бабка панырне,
То дзед кіем папіхне.

Прыйшоў дзед дадому
І стаў ён бажыцца:

— І ё-ёй, і яй-богу,
Не буду жаніцца.

Раздумаўся дзедка
Ды ў далоні плешча:
— Калі буду жыў-здароў,
Ажанюся яшчэ!

Ах, ты дуй, ах, ты дуй...

Ах, ты дуй, ах, ты дуй,
Мая міла, не бядуй,
Па маёй галаве,
Астанецца ўсё табе.

Ах, ты дуй, ах, ты дуй,
Мая міла, не бядуй,
І таўкач, і мялён,
І старожа, і прыгон.

Ах, ты дуй, ах, ты дуй,
Мая міла, не бядуй.
Астанецца ўсё табе,
І сарочка з мяне.

Ах, ты дуй, ах, ты дуй,
Мая міла, не бядуй.
У сарочцы гніды, вошы,
І калітачка без грошы.

Ах, ты дуй, ах, ты дуй,
Мая міла не бядуй,
І хамут, і дуга,
І я табе не слуга.

Ах, ты дуй, ах, ты дуй,
Мая міла, не бядуй,
Не бядуй, не бядуй,
Мая міла, не бядуй.

Захацела бабусенька...

Захацела бабусенька
Ды разбагацеці,
Цып, цып, цырура.*

Пасадзіла курапатку,
Каб вывела дзеці.

Выпусціла бабусенька
На падвор'е пасці.

Сама села на улачку
Кудзелечку прасці.

Шура-бура наступае,
Дожджык пакрапляе.

— Пара, пара, бабуленька,
Курчат збіраці.

Яшчэ курчат не сабрала,—
Дзве растаптала.

Сюды-туды павярнула —
На трэцяе ступнула.

— Ой, да Божа, Божа, Божа,
Ды што ж мне рабіці?

Ёсць у мяне стары дзедка,
Будзе мяне біці.

А як прышоў стары дзедка
Із лесу да хаты:

— Чаму, чаму, бабуленька,
Курчат не чуваці?

— Выпусціла на падвор'е,
Празарылі людзі.

Ой, як узяў, як узяў дзедка
Сырую дубінку.

Пабіў бабе, пакалаціў
Галаву і спінку.

— Бадай табе, стары дзедку,
Барада аблезла.

Забіў, забіў, закалаціў,
Аж на печ не ўзлезу.

Ой, у лесе пры даліне...

Ой, у лесе пры даліне,
Ой, там сталася бяда!
Гэй, гэй, у лесе, у лесе,
Ой, там сталася бяда!**

Пры даліне, у гушчары
Калыхаліся камары.

Дуб да дуба пахіліўся,
Камар з дуба зваліўся.

Пабіў камар патыліцу
Аб дубову караніцу.

Ой, пабіў камар бакі
Ды аб дубовыя сукі.

Ой, пабіў камар калені
Аб дубовыя карэнні.

Высыпаліся ўсе зубы
З камарыкавай губы.

---

* Прыпеў «Цып, цып, цыпура» паўтараецца пасля кожнай страфы.
** Апошнія два радкі паўтараюцца пасля кожнай страфы.

Прылятала муха-сваці
Камарыка ратаваці.

— Пасылайце да аптэкі,
Ці не будзе крыху лепей?

У бальніцу завязіце
І мяне там палажыце.

Там добрыя дактары —
Вымуць душу без пары.

— Камарыку, мой ты браце,
Дзе ж нам цябе пахаваці?

— Не хавайце край дарогі,
Бо патопчуць мяне ногі.

Не хавайце пры даліне,
Бо вырыюць мяне свінні.

Пахавайце ў цёмным лесе
Пры зялёненькім гарэсе.

Будуць гарэхі шчыпаці,
Камарыка ўспамінаці.

— А чый жа гэты помнік —
Ці маёр тут, ці палкоўнік.

— Не маёр тут, не палкоўнік,
А сам камар супакойнік.

Гэй, гэй, у лесе, у лесе,
А сам камар супакойнік.

А я ў печы не паліла...

— А я ў печы не паліла,
Мілы мой, міленькі.
А я ў печы не паліла,
Голуб мой сівенькі.
— Напалі, міла, напалі, міла,
Напалі, уха-ха, чарнабровая мая!
— Я цябе не буду слухаць,
Мілы мой, міленькі.
Я цябе не буду слухаць,
Голуб мой сівенькі.
— Я наб'ю, міла, я наб'ю, міла,
Я наб'ю, уха-ха, чарнабровая мая!
— Чым жа будзеш мяне біці,
Мілы мой, міленькі?
Чым жа будзеш мяне біці,
Голуб мой сівенькі?
— Таўкачом, міла, таўкачом, міла,
Таўкачом, уха-ха, чарнабровая мая!
— Я здароўя не маю,
Мілы мой, міленькі,
Я здароўя не маю,
Голуб мой сівенькі.
— Памірай, міла, памірай, міла!
Памірай, уха-ха, чарнабровая мая!

— Дзе ж ты мяне пахаваеш,
Мілы мой, міленькі,
Дзе ж ты мяне пахаваеш,
Голуб мой сівенькі?
— Пад гарой, міла, пад гарой, міла,
Пад гарой, уха-ха, чарнабровая мая!
— Што пасадзіш на магіле,
Мілы мой, міленькі?
Што пасадзіш на магіле,
Голуб мой сівенькі?
— Бур'яну, міла, бур'яну, міла,
Бур'яну, уха-ха, чарнабровая мая!
— Чым жа будзеш памінаці,
Мілы мой, міленькі?
Чым жа будзеш памінаці,
Голуб мой сівенькі?
— Гарбузом, міла, гарбузом, міла,
Гарбузом, уха-ха, чарнабровая мая!

А ў месяцы верасні...

А ў месяцы верасні
Выпала пароша.
Дзед бабу палюбіў,
Што баба хароша:
І сляпая, і крывая,
Яшчэ к таму злая:
І крычыць, і бурчыць,
Проці дзеда не змаўчыць.
— Убярыся, бабка,
У белае белле,
Тады пойдзем, бабка,
З табой на вяселле.—
Убралася бабка
У белае белле:
— Цяпер пойдзем, дзедка,
З табой на вяселле.—
Узяў дзед бабку
За белую ручку
Ды спіхнуў дзед бабку
З мосту ды ў рэчку.
— Цяпер, бабка, кайся —
Трошкі пакупайся.—
А як бабка узнырне —
Дык дзед кіем папіхне,
Прыйшоў дзед дадому
І пачаў бажыцца:
— Ей-богу, далібог,
Не буду жаніцца.—
Адумаўся дзедка
Ды ўсплёснуў у ладкі.
— Калі буду жыў-здароў —
Пайду шукаць бабкі.

Ой, да прадай, бабушка, бычка...

— Ой, да прадай, бабушка, бычка,
Ой, да прадай, бабушка, бычка, эй!
Вось бычка, вось бычка,
Вось бычка, бычка, бычка.

— Ну якога?
— Палавога.
— Ён у мяне палавы.
Ён у мяне дарагі.
Яго не прадам!
— Ой, да прадай, бабушка, бычка,
Ой, да прадай, бабушка, бычка, эй!
Вось бычка, вось бычка,
Вось бычка, бычка, бычка.
— Ну якога?
— Лысага.
— Ён у мяне лысы-лысы,
Ён памые лыжкі, місы.
Ён у мяне палавы,
Ён у мяне дарагі.
Яго не прадам!
— Ой, да прадай, бабушка, бычка,
Ой, да прадай, бабушка, бычка, эй!
Вось бычка, вось бычка,
Вось бычка, бычка, бычка.
— Ну якога?
— Шэрага.
— Ён у мяне шэры-шэры,
Ён зачыніць вокны, дзверы.
Ён у мяне лысы-лысы,
Ён памые лыжкі, місы.
Ён у мяне палавы,
Ён у мяне дарагі.
Яго не прадам!
— Ой, да прадай, бабушка, бычка,
Ой, да прадай, бабушка, бычка, эй!
Вось бычка, вось бычка,
Вось бычка, бычка, бычка.
— Ну якога?
— Рабага.
— Ён у мяне рабы-рабы,
Ён мне робіць вілы, граблі.
Ён у мяне шэры-шэры,
Ён зачыніць вокны, дзверы.
Ён у мяне лысы-лысы,
Ён памые лыжкі, місы.
Ён у мяне палавы,
Ён у мяне дарагі.
Яго не прадам!
— Ой, да прадай, бабушка, бычка,

Ой, да прадай, бабушка, бычка, эй!
Вось бычка, вось бычка,
Вось бычка, бычка, бычка.
— Ну якога?
— Бурага.
— Ён у мяне буры-буры,
Ён загоніць свінні, куры,
Ён у мяне рабы-рабы,
Ён мне робіць вілы, граблі.
Ён у мяне шэры-шэры,
Ён зачыніць вокны, дзверы.
Ён у мяне лысы-лысы,
Ён памые лыжкі, місы.
Ён у мяне палавы,
Ён у мяне дарагі —
Яго не прадам!

Баба Ева, дзед Тамаш, эха-ха...

Баба Ева, дзед Тамаш, эха-ха,
Паехалі на кірмаш, эха-эха-ха!
Што павезлі прадаваць, эха-ха,
То нятрудна зрахаваць, эха-эха-ха!
Баба — курку й петушка, эха-ха,
Дзед — пшаніцы паўмяшка, эха-эха-ха!
Распрадалі свой тавар, эха-ха,
Зайшлі яны ў рэстаран, эха-эха-ха!
Пілі, елі да апрог, эха-ха,
Чуць вылезлі за парог, эха-эха-ха!
Дзед усеўся за пана, эха-ха,
Баба села за фурмана, эха-эха-ха!
Пакуль бабка не спала, эха-ха,
Дык кабылка страпятала, эха-эха-ха!
А як бабка задрамала, эха-ха,
І кабылка прыстала, эха-эха-ха!
Ішоў злодзей па дарозе, эха-ха,
Спадабаў кабылку ў возе, эха-эха-ха!
Ўзяў кабылку з хамутом, эха-ха,
Кінуў бабу з пугаўём, эха-эха-ха!
Як прачнуўся ў возе дзед, эха-ха,
Ды й зароў ён, як мядзведзь, эха-эха-ха!
Ты ж наперадзе сядзела, эха-ха,
А куды ж ты глядзела, эха-эха-ха!
Баба дзеду не ўверала, эха-ха,
Па аглоблях паганяла, эха-эха-ха!

ПЕСНІ ДА ТАНЦАЎ, СКОКАЎ І ГУЛЬНЯЎ

Юрачка

Ах, ты, Юрачка,
Што не жэнішся,
Прыдзе зімачка,—
Куды дзенешся?

Што ты, Юрачка,
Азіраешся,
Палюбіць каго
Сабіраешся?

Ты напрасна не хадзі,
Доўга дарма не глядзі.
Ах, ты, Юрачка,
Што не жэнішся?

Ах, ты, Юрачка,
Што сутулішся,
У каго зімой
Ты прытулішся?

На каго жа ты
Тут любуешся,
Ночкай цёмнаю
Ты цалуешся?

Ты напрасна не хадзі,
Доўга дарма не глядзі.
Ах, ты, Юрачка,
Што сутулішся?

Кадрыль

А ці я не дзеўка,
Ці я не паненка,—
Рукі, як бячоўкі,
Ногі, як начоўкі.

А ці я не дзеўка,
Ці я не паненка,—
Спадніца ў кружкі,
Чатыры падушкі.

А ці я не дзеўка,
Ці я не паненка,—
Хвартух у ёлкі,
У чатыры полкі.

А ці я не дзеўка,
Ці я не паненка,—
І спаднічка з радна,
Я з мордачкі ладна.

А Мікіта жыта носіць...

А Мікіта жыта носіць,
Мікіціха дзяжу месіць.
Мікіта, Мікіта,
Клінам шуба сашыта.*

А Мікіта кучу веіць,
Мікіціха муку сеіць.
Мікіта, Мікіта,
Клінам шуба сашыта.

А Мікіта дровы сячэць,
Мікіціха есці нясець.
Мікіта, Мікіта,
Клінам шуба сашыта.

---

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

Антон маладзенькі...

Антон маладзенькі
Піў мёд саладзенькі,
Антоніха прыбягала,
Свайму мужу падсабляла.

Антон казу вядзець:
Тпру! Ну! Каза няйдзець,
Антоніха падсабляла,
Казу ззаду падпіхала.

— А ты, каза, стой, стой!
А ты казу дой, дой!
А я казу кулаком,
Ідзі сабе з малаком.

Падушачка, падушачка...

Падушачка, падушачка,
Мая пухавая,
Адна ў мамкі дачушачка,
Дзеўка маладая.
У нядзелю на кірмашы
Шоўку прыкупіла,
Падушачку пухавую
Міламу пашыла.

— Сёння прыйдзе мой міленькі —
Вымяту падлогі,
Падушачку пухавую
Пасцялю пад ногі.
— Калі, дзеўка, мяне любіш
Ды шчыра шануеш,
Падушачку пухавую
Ты мне падаруеш.

— Падушачку пухавую
Не магу аддаці:
Прыйду позненька з вячорак —
На чым буду спаці?
— Вазьму, дзеўка, цябе замуж
Гэтаю вясною,—
На падушачцы пуховай
Будзем спаць удвое.

Падушачка, падушачка,
Мая пухавая,
Адна ў мамкі дачушачка,
Дзеўка маладая...
На пуховай падушачцы
Мякусенька спаці,
Прыгожую дзяўчынаньку
Люба цалаваці.

А Лявоніху Лявон палюбіў...

А Лявоніху Лявон палюбіў,
Лявонісе чаравічкі купіў;
Лявоніха, душа ласкавая,
Чаравічкамі палясківала.

Як я молада ў матулькі была,
Як вішэнька у садочку цвіла;
Цвіла, цвіла ды пацвітывала,
З малайцамі ды пагулівала.

Папалася злому духу — мужыку,
Ссушыў мяне, як лісцінку у духу,—
А чаму ж цябе пярун не забіў,
Як ты мяне маладую палюбіў.

Наехала повен двор казакоў,
Узялі, ўзялі майго мужа у палон.
Ой, не жаль мне, што яго узялі,
Толькі жалка, што не моцна звязалі.

Ой, не жаль мне, што яго узялі,
Толькі жалка, што не моцна звязалі.
Ён, паганец, уцячэць, уцячэць,
Мне галоўку натаўчэць, натаўчэць.

А Лявоніха не жонка была,
Не мытую мне кашулю дала,—
Не мытую, не качаную,
У суседа пазычаную.

Ай, Лявоніха, Лявоніха мая,
Несалёную капусту дала,
А Лявона дык і чорт не бярэць:
Несалёную капусту жарэць.

А у полі ніўка...

А у полі ніўка,
Жыта палавінка,
Там дзяўчынка жыта жала,
Сама чарнабрыўка.*

Жала яна, жала,
У снапы вязала.
Ехаў казак дарожанькай:
— Здрастуй, дзеўка-жнейка.

Гэта — тая слава
Па ўсім свеце пала,
Што дзяўчына казачэньку
Сэрданькам назвала.

У гародзе буракі,
Чырвоная жычка,
Любяць мяне, мама, хлопцы,
Хоць я невялічка.

Хоць я невялічка,
Хоць я нехароша,—
Возьмуць мяне, мама,
хлопцы
Без аднаго гроша.

Хоць я невялічка —
На лавачку стану,
А ўсё ж таму казачэньку
Да сэрца прыстану.

Гэй, гэй, таўкачыкі...

Гэй, гэй, таўкачыкі!
Гэй, гэй, дубовыя!
Гэй, гэй, дубовыя,
На работу гатовыя!

Сем год бадзяліся,
У адну ступу сабраліся.
Гэй, гэй, таўкачыкі!
Гэй, гэй, дубовыя!

Пасеялі дзеўкі лён...

Пасеялі дзеўкі лён,
Пасеялі дзеўкі лён,
Дзеўкі лён,
Дзеўкі лён.
Пасеялі дзеўкі лён.

Пасеяўшы палолі,
Пасеяўшы палолі,
Палолі,
Палолі.
Пасеяўшы палолі.

Белы ручкі калолі,
Белы ручкі калолі,
Калолі,
Калолі.
Белы ручкі калолі.

Унадзіўся сівы конь,
Унадзіўся сівы конь,
Сівы конь,
Сівы конь.
Унадзіўся сівы конь.

Памяў, стаптаў дзеўкам лён,
Памяў, стаптаў дзеўкам лён,
Дзеўкам лён,
Дзеўкам лён.
Памяў, стаптаў дзеўкам лён.

---

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

Старэнькі дзедка...

Старэнькі дзедка
Па гародзе ходзіць,
Па гародзе ходзіць,
Канапельку сее.
Люшачкі, люшачкі,
Люлі, люлі, люлі.*

Малада малодка
У варатах стаяла,
У варатах стаяла,
Галубоў зманяла:
— Шугі, галубы,
На каноплі к дзеду,
На дзедавы градкі
Канапель кляваці.

Каб мне, маладзенькай,
Канапель не браці,
Каб белых ручак
Да мне не мараці.

Стаіць Янка на гары...

Стаіць Янка на гары,
А я у даліне.
Янка сее кавуны,
А я журавіны.
Журавіны не ўзышлі,
Кавуны пасохлі.
Ка мне хлопцы не прыйшлі,
Каб яны падохлі.
Я на рэчцы плацце мыла,
На бярозе вешала.
Дзесяцёх хлапцоў любіла,
Аднаго пацешыла.
Цераз рэчку кладачка,
Няма майго Ўладачка.
Клічу, клічу, не чуе —
Няхай з Богам начуе.
Цераз рэчку грэбелька,
Няма майго Хведарка.
Клічу, клічу, не чуе —
Няхай здароў начуе.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы двойчы.

Гістарычныя песні, творчасць рабочых, паэзія змагання

У гэтым раздзеле аб'яднаны творы, у якіх прама ці ўскосна адлюстраваны гістарычныя падзеі, што адбываліся на Беларусі: барацьба беларускага народа супраць іншаземных захопнікаў, сацыяльнага і нацыянальнага ўціску.

Гістарычныя песні найбольш поўна захавалі памяць аб нападах татар, аб татарскім палоне, у які траплялі жыхары беларускіх вёсак. Самы распаўсюджаны сюжэт гэтых твораў — сустрэча маці з дачкой, якую татары захапілі ў палон раней. Песні пра татарскі палон увабралі ў сябе лепшыя якасці народнай лірыкі, выкарыстоўваюць яе паэтычныя здабыткі, вобразы, мастацкія сродкі. Толькі ў адной запісанай Е. Раманавым песні «У нядзелю пад панядзелак» сабрана сапраўднае суквецце эпітэтаў: *каморка* ***смаловая,*** *завалы* ***дубовыя,*** *замочкі* ***нямецкія,*** *караватка* ***цісовая,*** *пярыны* ***пуховыя,*** *вішанька* ***садавая,*** *ягадка* ***баравая,*** ***ясен*** *месяц,* ***цёмная*** *ночка,* ***буйныя*** *ветры,* ***яркія*** *звёзды,* якія разам з іншымі мастацкімі сродкамі надаюць твору маштабнасць, эпічнае гучанне. Іншыя гістарычныя падзеі — барацьба са шведамі, з арміяй Напалеона, крымская і турэцкая войны, у якіх прымалі ўдзел беларусы, больш поўна адлюстраваны ў некаторых салдацкіх песнях, сваім паходжаннем звязаных з рускай фальклорнай традыцыяй, хаця і добра вядомых на беларускай этнічнай тэрыторыі. Яны заўсёды складалі істотную частку мужчынскага песеннага рэпертуару: «А ў дванаццатым гаду», «Са французскага двара», «Ох ты поле, поле чыстае, турэцкае», «Успомнім, братцы, як стаялі» і інш. У працэсе бытавання песні перакладаліся на беларускую мову, але пераклады звычайна атрымліваліся няпоўныя, недасканалыя, што перашкаджае іх публікацыі ў Хрэстаматыі.

Узнікненне і развіццё фальклору рабочых і паэзіі змагання на Беларусі звязана са зменамі ў эканамічным, палітычным і духоўным жыцці народа, якія былі выкліканы новай сацыяльна-эканамічнай фармацыяй — эпохай капіталізму. Ужо ў традыцыйных жанрах беларускага фальклору можна заўважыць пачатак рабочай тэматыкі: у казках і песнях ствараюцца малюнкі катаржнай працы на панскіх броварах, у кузнях, на цукровых заводах, на будаўніцтве чыгункі і г. д.

Фальклор рабочых Беларусі прадстаўлены пераважна песеннай творчасцю, прыпеўкамі, вуснымі сказамі, анекдотамі, прымаўкамі, прыказкамі. Ён моцна звязаны з традыцыйнай вусна-паэтычнай творчасцю, выкарыстоўвае яе мастацкія здабыткі. Не менш важным фактарам развіцця фальклору рабочых з'явіўся ўплыў рэвалюцыйнай паэзіі, прафесійнай літаратуры, а таксама цесная сувязь з рабочым фальклорам рускага і ўкраінскага народаў.

Фальклор рабочых узбагаціў беларускую народную паэзію новымі тэмамі, ідэямі, вобразамі, адлюстраваў важныя змены ў свядомасці працоўных, іх сацыяльна-эстэтычных поглядах. Песні рабочых выкрываюць сацыяльную няроўнасць, якая панавала ў грамадстве. У іх створаны вобраз капіталістычнага горада, дзе ўшчэнт разбіваюцца ўсякія надзеі працоўнага чалавека

пазбавіцца галечы. Песні малююць вобраз знясіленага працай рабочага, пакуты яго сям'і, якая памірае з голаду. З асаблівым спачуваннем апавядаецца ў іх пра цяжкі, часам трагічны лёс жанчыны-работніцы. Гэтым вобразам працоўных людзей супрацьстаяць вобразы іх прыгнятальнікаў і непасрэдных выканаўцаў волі гаспадароў — майстроў, наглядчыкаў, надзеленых самымі адмоўнымі рысамі.

Асобную тэматычную групу ў беларускім фальклоры рабочых складаюць шахцёрскія песні і прыпеўкі, якія, як сведчаць запісы пасляваенных гадоў, захоўваюцца ў памяці людзей да нашых дзён. Многія з твораў былі прынесены адыходнікамі з шахт Данбаса, Урала, некаторыя ўзнікалі на мясцовай глебе, у чым пераконвае сувязь з беларускай фальклорнай традыцыяй. Распаўсюджваліся таксама песні аб сасланых на катаргу ў Сібір.

Паэзія рабочых адлюстравала і розныя формы пратэсту супраць эксплуататараў, пачынаючы са стыхійных выступленняў, калі рабочыя псавалі машыны, і да свядомай барацьбы з грамадска-палітычным ладам.

Асобныя творы рабочага фальклору па сваёй ідэйнай накіраванасці набліжаюцца да рэвалюцыйнай паэзіі.

Як сведчаць дакументы, ужо з 70-х гг. мінулага стагоддзя працоўным Беларусі былі вядомы «Марсельеза», «Дубінушка», у пачатку XX ст.— «Варшавянка», «Чырвоны штандар», «Інтэрнацыянал» і многія іншыя рэвалюцыйныя гімны і маршы. Распаўсюджваюцца таксама песні на вершы А. С. Пушкіна, М. А. Някрасава, Т. Р. Шаўчэнкі, А. М. Горкага, якія заклікалі народ да змагання за лепшую долю.

У рэвалюцыйнай паэзіі знайшла водгук руска-японская вайна 1904—1905 гг., падзеі 1905 г., першая сусветная вайна. На Беларусі распаўсюджваліся песні «Дзела была пад Артурам», «Трэпаўскі маніфест», «Салдацкая марсельеза» і інш. Акрамя твораў на рускай мове, бытавалі таксама і беларускія песні, складзеныя народам або прафесійнымі паэтамі і прыбліжаныя па змесце да рэвалюцыйных гімнаў і маршаў. Да іх ліку трэба аднесці песні на вершы Я. Купалы «Не пагаснуць зоркі ў небе», «А хто там ідзе?», Ц. Гартнага «Да Нёмана» і іншыя творы на вершы беларускіх паэтаў, а таксама песню «Адпусцілі сялян на «свабоду» і рад твораў першай сусветнай вайны, якія выкрываюць злачынствы цара і генералаў, што ўцягнулі краіну ў крывавую бойню: «Поўна, братцы, нам крушыцца», «Мы ж не зналі, братцы-таварышы», «Жыў у Петраградзе адзін негадзяй» і інш.

Фальклор Заходняй Беларусі (1921—1939) займае адметнае месца ў гісторыі беларускай народна-паэтычнай культуры. Ён склаўся ва ўмовах вызваленчай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі за сацыяльную і палітычную свабоду супраць панска-польскага прыгнёту і адыграў значную ролю ў гэтай барацьбе. Творчасць гэта цікавая як з пункту погляду адлюстравання сацыяльнай псіхалогіі мас у перыяд актыўнага іх грамадскага жыцця, так і з боку пазнання спецыфікі мастацкай практыкі народа ў часы грамадскіх зрухаў, у рэвалюцыйную эпоху.

У Заходняй Беларусі заставаўся стары эканамічны ўклад з прыватнай уласнасцю, сацыяльным і нацыянальным уціскам. У гэтых умовах працягвала бытаваць традыцыйная народная творчасць, набываючы, аднак, большую сацыяльную завостранасць. Лепшыя песенныя ўзоры сталі служыць актуальным задачам дня. Яны сцвярджалі веліч і харство народнага генія.

У першыя гады заняволення Заходняй Беларусі там развіўся пад кіраўніцтвам КПЗБ даволі значны партызанскі рух. Настрой нязломнасці, дух супраціўлення адлюстроўвала і паэзія таго часу; самадзейныя прыпеўкі пра паноў, іх прагнасць і баязлівасць, песні пра герояў народнага супраціўлення («Атаман Муха» і інш.).

Сярэдзіна 20-х гг. і другая палавіна іх адзначаліся шырокім вызваленчым рухам у форме легальных арганізацый («Беларуская сялянска-работніцкая грамада», «Сялянска-работніцкі клуб «Змаганне», «Таварыства беларус-

кай школы» і інш.), якія стварылі шырокую сетку легальнага перыядычнага друку рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку. Узнятыя да свядомага грамадскага жыцця масы пацягнуліся да асветы, да друкаванага слова. Карэспандэнты з вёсак і гарадоў слалі ў рэдакцыі вершаваныя допісы, карэспандэнцыі, нярэдка гумарыстычнага ці сатырычнага зместу. Гэта была масавая самадзейная паэзія, больш удалыя творы праз друк зноў вярталіся ў народ і набывалі там шырокае бытаванне ў выглядзе прыпевачных куплетаў, песень. Героем гэтых твораў выступаў сам народ, які падымаўся да разумення свайго сацыяльнага і палітычнага становішча, свайго права.

Значную ролю ў станаўленні сацыяльнай і нацыянальнай свядомасці працоўных Заходняй Беларусі адыграла беларуская рэвалюцыйна-дэмакратычная літаратура і перш за ўсё творы Я. Купалы і Я. Коласа, многія з якіх набылі шырокую ўсенародную вядомасць, фальклярызаваліся. Гэта вершы Купалы «Гэй, наперад», «За свабоду сваю», «Не пагаснуць зоркі ў небе» і інш., коласаўскія «Нёман», «Сціхні ты, змоўкні, песня пакуты», «Доля батрачкі» і інш.

У 30-я гг., нягледзячы на разгром легальных дэмакратычных арганізацый, вызваленчы рух не спыняўся. Шырокае распаўсюджанне ў народзе набылі песні міжнароднага пралетарыяту «Інтэрнацыянал», «Варшавянка», «Чырвоны сцяг» і інш. Вядомыя рэвалюцыйныя песні «Беснуйтесь, тираны!», «Мы кузнецы», «Молодая гвардия» прайшлі ва ўмовах вызваленчай барацьбы Заходняй Беларусі своеасаблівую народную рэдакцыю.

У 30-я гг. вызваленчы рух працоўных Заходняй Беларусі адзначыўся рэвалюцыйнымі выступленнямі пралетарыяту і сялянства. Па гарачых слядах падзей узнікаюць песні «Так званая вёска Асташын» (пра антыпанскае выступленне сялян Навагрудчыны), «Нарачанка» (аб барацьбе нарачанскіх рыбакоў). Героем масавых песень становіцца мужны змагар падполля (песні «Пра Сяргея Прытыцкага», «Пра Колю Арцюха» і інш.). Паасобныя песні расказвалі пра суровую заходнебеларускую рэчаіснасць, клікалі на барацьбу з прыгнятальнікамі («Перайшлі Каляды», «Ой, вядуць, вядуць», «Пад гоман вясёлы» і інш.). Часта рэвалюцыянеры-падпольшчыкі ў мэтах прапаганды паспяхова выкарыстоўвалі старую каляндарную абраднасць і паэзію. Пад выглядам калядоўшчыкаў, валачобнікаў яны хадзілі па вёсках і ў сваіх «калядках», «валачобных» выкрывалі буржуазны ўрад, клікалі працоўных на змаганне («Браты мае, ўжо час настаў», «Чырвоная зорка», «Сягоння Купалле, заўтра — Ян» і інш.).

Істотны раздзел заходнебеларускага фальклору складаюць песні палітзняволеных. Зняволеныя барацьбіты, нягледзячы на суровыя ўмовы, і ў турмах жылі паўнакроўным духоўным жыццём. Дух рэвалюцыйнай салідарнасці, узаемавыручкі, глыбокай веры ў ідэалы сацыялізму панаваў сярод зняволеных турмы Лукішкі, якую называлі заходнебеларускай Бастыліяй, у Картуз-Бярозе, у гродзенскай, навагрудскай, глыбоцкай і іншых турмах, у Заходняй Беларусі і ў самой Польшчы. Як успамінае адзін з кіраўнікоў падполля ў Заходняй Беларусі М. С. Арэхва, амаль кожны другі палітзняволены ў турме пісаў вершы. Некаторыя з гэтых твораў падхоплівaліся ўсімі і станавіліся песнямі. Так, у Лукішках быў створаны марш грамады «Сто тысяч нас было сяброў», атрымала вядомасць турэмная песня «Ціха гасла чароўная зорка». У канцэнтрацыйным лагеры Бяроза Картузская ўзніклі творы, моцныя сваёй антыімперыялістычнай накіраванасню, інтэрнацыянальным пафасам (песні «Марш бярозаўцаў», «У Бярозаўскай бятанярні», «Ой, у Бярозе» і інш.).

Тэма змагання пераважае ў народнай творчасці перыяду Вялікай Айчыннай вайны. У гэты час узрасла цікавасць да традыцыйнай вуснай паэзіі. На аснове лепшых традыцый узнікала шмат новых твораў, якія адыгрывалі велізарную ролю ў патрыятычным выхаванні народа, развенчвалі міф аб непераможнасці гітлераўскай арміі, клікалі на змаганне з ворагам, усялялі

веру ў перамогу. З трансфармаваных традыцыйных народных твораў найбольш актыўна бытавалі тыя песні, прыпеўкі, прыказкі і прымаўкі, жарты і анекдоты, у якіх або адлюстраваліся неймаверныя цяжкасці жыцця ва ўмовах фашысцкай акупацыі, або ідэі якіх былі сугучны настроям нашага народа. Народ услаўляў подзвігі партызан-мсціўцаў, адлюстроўваў у яркай мастацкай форме асноўныя падзеі таго часу, думкі, настроі і імкненні шырокіх мас, аплакваў у галашэннях загінуўшых.

Вусна-паэтычная творчасць вогненных гадоў вызначаецца адлюстраваннем непрымірымай нянавісці да ворагаў, шчырай любові да Радзімы. Фальклорны працэс гэтага часу адрозніваўся ад працэсу стварэння традыцыйных вусна-паэтычных твораў. Больш актыўную ролю пачалі адыгрываць прафесійнае мастацтва і літаратура. Па матывах многіх індывідуальных твораў узнікала шмат новых, якія шырока распаўсюджваліся і вусна і пісьмова. На матывы песень з папулярных савецкіх кінафільмаў ствараліся сатырычныя творы, у якіх выкрываліся злачынствы гітлераўскіх захопнікаў на беларускай зямлі, з'едліва высмейваліся Гітлер, Гебельс, Рыбентроп і іншыя фашысцкія кіраўнікі. З асаблівай пагардай ставіўся беларускі народ да здраднікаў Радзімы.

Глыбокім смуткам па Радзіме прасякнуты песні паланянак. У іх гучыць бязмерная пакута савецкіх людзей, вывезеных з роднай зямлі ў фашысцкае рабства. Расказваючы пра невыносна цяжкае жыццё ў няволі, дзяўчаты просяць землякоў бясстрашна змагацца з ворагам і хутчэй вызваліць іх.

Паэтычная творчасць перыяду Вялікай Айчыннай вайны не страціла свайго гісторыка-пазнавальнага і выхаваўчага значэння і зараз.

ЛІТАРАТУРА

Песні беларускага народа / Пад рэд. М. М. Нікольскага, М. Я. Грынблата. Мн., 1940. Т. 1.

Кабашнікаў К. П. Ад традыцыйнага фальклору да рэвалюцыйнай паэзіі. Мн., 1969.

Калеснік У. А. Час і песні. Мн., 1962.

Паэзія барацьбы. Мн., 1985.

Пра татарскі пастой

У чыстым полі бяроза стаяла,
На бярозі зязюля кувала.
Годзі, годзі, зязюля, куваці,
Бо ўжо едуць татары бярозу рубаці.
— Ты, бяроза, хілява-бялява,
Чаму ў полі ты не вясёла?
Чаму, бяроза, суха, не зялёна?
— Як жа мне зялёнай быці?
Пада мною татары стаялі,
Татары стаялі, голля рубалі,
Голля рубалі, карэнь выбівалі,
Крынічнай вады дабывалі,
Сваіх коней напавалі.

Вох ты, ёлка, ялінка...

Вох ты, ёлка, ялінка,
Прынадобнае дрэўца,
А стаяла там ёлка,
А стаяла ялінка,
Пры пуці, пры дарозе,
Бліз прыбойнага гасцінца.
Во пад той жа ёлкай,
Краваць цісавая,
А на той жа краваці
Да пярына пухавая,
А на той жа пярыні
Добры моладзец ляжыць,
Добры моладзец ляжыць,
Ён ні зарэзан, ні ўбіт.
На ём рубашачка,
Яна тонка, палатняна,
Яна таненька і бяленька,
Уся кроўю скіпела.
А не шыла матушка,
Не страчыла сястрыца —
Вох і шылі татары,
А страчылі калмыкі;
Вох і шылі татары
Вострымі мячамі,
Страчылі калмыкі
Залатымі штыкамі.

Каля лесу, каля цёмнага...

Каля лесу, каля цёмнага,
Пралягла там дарожанька шырокая.
Па той дарожаньцы бяжыць конік варанюсенькі,
На тым коніку сядзіць малойчык маладзюсенькі.
Бяжыць конік — разлягаецца,
Сядзіць малойчык — хістаецца.
Яго мамка пераймаець, у яго пытаець:
— Ох ты, сынку мой, сынок,
Нашто так ківаешся,
Што на коніку хістаешся?
— Ох ты, маці мая, матулька,
Не сам я ківаюся,—
Упаіў мяне татарскі сын:
Тром ножыкам вараўскім,
А чацвёртай шабляй вострай,
А пятай — куляй простай.

Наехалі, наехалі ўсё татарыны...

Наехалі, наехалі ўсё татарыны,
Наехалі ўсё татарыны.

Сталі яны, сталі яны дзяльбу дзяліці,
Сталі яны дзяльбу дзяліці:

Таму-сяму, таму-сяму па татарыну,
Таму-сяму па татарыну,

Дасталася, дасталася, ой, цешча зяцю,
Дасталася, ой, цешча зяцю.

Загадаў зяцька, загадаў зяцька тры дзелы дзелаць,
Загадаў зяцька тры дзелы дзелаць:

Первыя дзела, первыя дзела — белы кужыль прасці,
Первыя дзела — белы кужыль прасці;

Другое дзела, другое дзела — серых гусей пасвіць,
Другое дзела — серых гусей пасвіць;

Трэція дзела, трэція дзела — дзіця калыхаць,
Трэція дзела — дзіця калыхаць.

Я ручкамі белы кужыль праду;
Я ручкамі, я ручкамі белы кужыль праду,

Я глазкамі, я глазкамі серых гусей пасу,
Я глазкамі серых гусей пасу;

Я ножкамі, я ножкамі дзіця калышу,
Я ножкамі дзіця калышу:

— Баю, баю, баю, баю, баю, маё дзецітка,
Баю, баю, маё дзецітка:

Па матушкі, па матушкі мой унучачак,
Па матушкі мой унучачак;

Па бацюшкі, па бацюшкі мой Татар'евіч.
Па бацюшкі мой Татар'евіч.

Ой, лятаў-палятаў ды сівы гарол...

Ой, лятаў-палятаў ды сівы гарол,
У кіпцях ён нясе руку белую,
Руку белую малайцоўскую;
А ўдагон яму ясен сакол:
— Пагадзі-пастой ты, сівы гарол,
А дзе ж быў-жыраваў ты, сівы гарол?
— А я быў-жыраваў на пабоішчы,

Над шырокай ракой каля Клеціўска!
А там послынь сцелена ды галовамі,
Усё галовамі малайцоўскімі:
А там кроў плыве ды Дунай-ракой,
А ваўкі грызуць белы костачкі;
Там агні гараць, там катлы кіпяць,
І татары стаяць, палон дзелючы,
Палон дзелючы, падзяляючы,
Дзяцей з маткамі разлучаючы.
Дасталася сястра брату патурчаніну,
Сястра брату, цешча зяцю басурманіну.
А брат сястру дамоў пусціў,
Дамоў пусціў, добра слоўца казаў:
— Ты вяртай, сястра, бордза да дому;
Прыдуць татары налета ўзнову,
Прыдуць узнову хмарай страшнаю,
Стануць абозам ля нашага двору.
А прывёз зяць цешчу маладой жане:
— Вось табе, мая малада жана,
Вось табе з вайны паланяначка,
Будзе яна табе, мая верна жана,
Векавечная твая работніца,
А вам, дзеткі мае, будзе нянькай яна.
А ты дай ей, жана, тры работанькі:
Перша работа — тонкі кужаль прасці,
Другая работа — гусей у лузе пасці,
Трэцяя работа — дзіцё калыхаці...
Ножкамі маці дзіцё калыхае,
Дзіцё калыхае, сціха падпявае:
— Ой, люлі, люлі, дробна дзіцятка,
Ой, люлі, люлі, маё ты мілае.
А па бацьку — ты мне татарчатка,
А па маці — ты мой унучатка.
Як учула дачка песню з пакою,
Бяжыць у сені бордзай стралою:
— Ой, кінь, кінь, маці, дзіцё калыхаці,
Хадзем у пакоі, а сядзь за столам,
Бяры ў мяне, маці, ключы залатыя,
Адмыкай жа імі скрыні дубовыя,
Бяры золата-срэбра, сколькі табе трэба,
А будзь ў мяне, родна, як у сябе дома.
— Дзіцятка маё, Алёнка мілая,
Не нада мне грошы, пусці дадому,
Пусці дадому ў Клецкі староны.

У нядзелю пад панядзелак...

У нядзелю пад панядзелак
Звала нявехна завіцу нанач:
— Хадзі, завічка, хадзі, сястрычка, ка мне нанач!
— Баюсь, нявехна, баюсь, галубка.
— Не бойсь, завічка, не бойсь, сястрычка:
Ёсць у мяне каморка смаловая,
У мяне завалы дубовыя,
У мяне замочкі нямецкія,
У мяне караваткa цясовая,
У мяне пярыны пуховыя,
У мяне падушкі цвятовыя,
У мяне палажочкі бярчастыя.
Ой, стучыць, гручыць кала каморкі...
Завіца кажа: «Татары едуць!»
Нявехна кажа: «Начлежнікі коні вядуць,
Пужкамі сякуць».
Адзін прышоў — каморку адбіў,
А другі прышоў — палажок адкрыў,
А трэці прышоў — завічку павёў.
— Нявехна мая, зрадніца,
Зрадзіла ты мяне, маладую,
Як вішаньку садавую,
Як ягадку баравую.
Ой, не татка мяне выпраўляе,
Не мамка мяне сураджае,
Не браты мне вароты адчыняюць,
Не сёстры мяне праважаюць.
Выпраўляе мяне ясен месяц,
Сураджае мяне цёмная ночка,
Адчыняюць вароты буйныя ветры,
Праважаюць мяне яркія звёзды.
Пашла мамулька дачкі шукаці,
Ідзе поле, ідзе другое,
На трэццім полі стаіць хатачка,
У той хатачцы — татарачка.
Зайшла мамулька ў тую хатку,
Татарка кажа: «Бабулячка,
Наймісь ка мне дзяцей калыхаць,
Белымі рукамі кужалю прасць,
Ярамі вачамі гусей пасць».
— Кужалю прасць — падумаці,
А гусей пасць — пагуляці.
— Садзісь, бабка, у мяне дзяцей калыхаць,

А я пайду к суседу на бяседу.
Ой, стала татарачка пад дзвермі да й слухае,
Як баба дзяцей калыша.
А яна да й коціка прыпявае:
— Ай, нуце спаткі, мае татараняткі!
Вы не татараняткі, вы — мае донькі дзіцяткі!
Увыйшла татарка ў хату
Да й за слёзкамі свету не бача:
— Кідай, бабулька, дзяцей калыхаці,
Хадзем, бабулька, бяседы вадзіці,
Ты не бабулька — мая мамулька.

Як белы свет завадзіўся...

Як белы свет завадзіўся,
Маладой Шаўрук нарадзіўся.
Ох, служыў ён цару, каралю,
А царыцы, імператрыцы.
Ох, яна ж ажаніла яго,
Яна абкружыла яго,
Узяла яму жонку,
Узяла не пароўні яго:
Ні спячы, ні зварыць,
Ні з людзьмі гаварыць.
Ох, рассердзіўся Шаўручанька
Да выйшаў на крутую гору,
Да крыкнуў Шаўручанька,
Да крыкнуў на ўсю галаву:
— Ох, Масква ж ты мая, Масква,
Ох, прабелая ты Літва,
Дай жа ты мне двух барцоў сюда!
Не дасі мне двух барцоў сюда,
Я цябе ўсю вытаўку!
Я цябе ўсю вымазчу!
Да на сваю староначку,
Занясу ж я галовачку.
Узяў цар пісьма пісаць,
Па ўсіх гарадах рассылаць,
Маладому Шаўручаньку
Барцоў іскаць.
Абазвалася два...
Два родных брата.
На іх сапожкі шаўровенькія,
Шапкі бабровыя,
Лясачкамі папіраюцца,

Самі сабе ўдзіўляюцца:
— Здраствуй ты, Шаўручаньку!
Вот цібе хлеб да соль на стол,
Вот цібе двух барцоў за стол!
Да спужаўся Шаўручаньку,
Да спужаўся маладзёшанькі.
Да ступіў ён на ножанькі,
Пакаціліся ў яго слёзанькі.
Сталі яны піць да гуляць,
Стаў ён да барцоў спрабаваць.
Звечара да апоўначы,
З апоўначы да да белага дня.
Сталі яны, паздароўкаліся.
Стаў дзень рассвітаць,
Стаў ён барцоў спрабаваць.
Ах хапіў ён младшага брата,
Падкінуў яго ўгору высако!
Яго косткі патрэскаліся,
Яго сустаўцы паразляталіся.
— Ох, гаворыць старшы брат,—
Ох, брат ты мой радной,
А мы мамкі адной.
Ты на сілу да не чаешся,
А папераду хватаешся!
Да схапіў ён Шаўручаньку
Да пад белыя ручанькі.
Да падняў высако,
Па калена ў зямельку ўбіў!
Косткі патрэскаліся,
А суставы паразляталіся,
А шкурачка палопалася.
Ходзіць Шаўрукова маць
Рукі-ногі ломіць,
Бога просіць:
— Кеб вы такія, барцы,
Густа сеяліся,
А рэдка ўсходзілі,
Майго сына Шаўручаньку
З свету зводзілі.

Прыехаў дзед на паляначку...

...Прыехаў дзед на паляначку
І пусціў коніка на папасачку,
А сам лёг на аддыханнійка.

І прышло к дзедушку сорак молайцаў,
Сорак молайцаў, усе разбойнічкі.
Хочуць дзеда ў палон забраць,
Яго коніка ў табун загнаць.
А стары дзедзя не ўлякаецца,
К сырому дубу прыграбаецца.
Узяў дуба за вярхушачку,
Прыгнуў дуба к сырой зямлі.
Сырая зямля здрыганулася,—
Сорак молайцаў улякнулася:
— Ах ты дзедушка, родны бацюшка,
Не будзем цябе ў палон браць
І твайго коніка у табун гнаць,
А будзем цябе аццом звацъ.

Цёмна ночка наступая...

Цёмна ночка наступая,
Сон галоўку абымая,
Едзе казак і думая.
Пусціў каня на даліну,
А сам прылёг на гадзіну.
Шчаслівая гадзіначка,
Скуль бралася дзяўчыначка:
— Уставай, казак, досыць спаць,
Ідуць туркі ваяваць.
Возьмуць каня варанога,
Цябе заб'юць маладога.
Возьмуць каня — другі будзя,
Цябе заб'юць — мне жаль будзя.
— Дзяўчыначка, верна любіш,
Што так рана мяне будзіш?
— Каб я цябе не любіла,
То так рана ні будзіла.

Ой, у горадзе Магілеве дымам пацягнула...

Ой, у горадзе Магілеве дымам пацягнула,
Як то войска Запарожска з гармат да раўнула.
Ой, у горадзе Магілеве да сталася пуста,
Як павеялі казакі з самапалаў густа.
Ой, у горадзе Магілеве арлы да гадзюкі,
Ляцкім целам згадуюцца, ляцку дзелу радуюцца.
Ой, у горадзе Магілеве што пні да калоды...
Прылучылася, бач, ліха ляцкай пародзе.

Не такое яшчэ б ліха, як тая пазора,
Што ходзіць па белу свету з двора да да двора.
Не так тая пазора, як казакам парада...
Што краўчыну шануючы, ляхам далась зрада.
Далась ляхам зрада із самага рана,
Ад гецьмана Налівайка, шаноўнага пана.

Была дзела пад Палтавай...

Была дзела пад Палтавай,
Дзела слаўнае, друззя,
Мы дралісь тагда са шведам
Пад знамёнамі Пятра.
Наш магучы імператар,
Памяць вечная яму,
Сам камандаваў вайскамі,
Сам і пушкі заражаў.
Сам камандаваў вайскамі,
Сам і пушкі заражаў.
Сам ружжом салдацкім правіў
І, як сокал, ён лятаў.

Каля рэчачкі Дняпра...

Каля рэчачкі Дняпра
Там хадзіла удава,
Там хадзіла удава
Да й забачыла яна
Да й на явары арла,
Да й на явары арла.
— Ох ты, ворлю мой, ворлю.
Да ты, чорна варона,
Ты высока лятаеш
І далёка відаеш.
Ці ня відзеў ты, орлю,
Майго мілага дружка?
Ох, мой-та то міленькі,
Ён із туркам ваюе,
Ён із туркам ваюе
Па каленічкі ў крыве
Ды й па пашачкі ў трупе,
А на нём рубашоначка
Ўся ўскіпела ў крыве.
Ох, ты, ворлю мой, ворлю,
Ох, ты чорна варона,
Ты высока лятаеш
І далёка відаеш.
Прынясі-ка ты, ворлю,
Мне рубашачку ад яго.
Выпяру я рубашачку
Сваімі гаручымі слязамі,
Высушу я рубашачку
Сваёю сухатою,
Перашлю я рубашачку
Сваёю красатою.

Прывыкайце, чорны вочы...

Прывыкайце, чорны вочы,
Адны начаваці:
Няма майго міленькага,
Не з кем размаўляці.

Няма майго міленькага,
Няма гаспадара,
Каму бы я пасцелечку
Пухаву заслала.

Даўно свайго міленькага
У паход выпраўляла,
З тых пор свае чорны вочы
Слязьмі выцірала.

Пасляпіла свае вочы
Горкімі слязамі,
Няма жысці, няма рады
Усё за ворагамі.

Паны дзяруць, паны скубуць,
А багач за імі,
Паследнія манатачкі
Мы паізнасілі.

Выхадзіла на дарогу,
Выхадзіла ў поле,
Нідзе следу не відала
Тут свайго мілога.

Навярніся, мой міленькі,
Да з таварышамі,
Калатніце міраедаў,
Штоб яны не ўсталі.

Ой ты, доля, наша долечка...

Ой ты, доля, наша долечка,
Агарнула нас жа горачка,
З-за чаго жа мы так мучымся,
А нідзе мы не навучымся.

Ідзем да пана мы да сонейка,
А прыходзім у ноч позненька.
На каго мы так стараемся,
Да зямелькі прыгінаемся.

Забалелі ўжо ў нас ручачкі,
З-за чаго жа нашы душачкі
Паны жадныя так катуюць,
Нашу душачку выматваюць.
Ці мы пану запраданыя,
Ці навек яму адданыя?

Ды калі ж мы дачакаемся,
Ды з панамі паквітаемся,
Ды з панамі пазмагаемся
Ой, за долю, за шчаслівую.

Горка, доля ты батрацкая...

Горка, доля ты батрацкая,
Гарапашная, жабрацкая,
Праца цяжкая, нязмерная,
Мазалёвая, сіберная.
На прыбыткі ды на панскія,

На папоўскія, дваранскія,
Гей, збірайся, хлопцы жвавыя,
На расправы на крывавыя,
На расправы — пажарышчамі,
Ад маёнткаў — папялішчамі.

Ой, ляцелі гускі...

Ой, ляцелі гускі
З далёкага краю,
Пачакайце, гусі,
Я вас папытаю.

Пачакайце, гусі,
Я вас папытаю:
Ці не з той краіны,
Дзе я мужа маю.

Туды ж ён запратан
З брытай галавою,
Пакінуўшы дзетак,
А мяне ўдавою.

За паноў-зладзеяў
Яго катавалі,
Ў калодкі забілі
Ды ў Сібір паслалі...

Падняліся гускі
Дай загагаталі:
— Многа там ў Сібіры
Ў калодках відалі.

Катаржан таўпою
З краю ў край ганялі,
А хто спатыкнецца,
Ў зямлю зарывалі...

Не па ўласнай мы ахвоце...

Не па ўласнай мы ахвоце
Былі ў катаржнай рабоце,
Сібірскай тайзе.
Мы пясок там прамывалі.
Цару золата шукалі,
Сабе не знайшлі...

А бывала хлеба корка
У горле стане, як распорка,
Што не праглынеш.
Шчы хлябалі з тухлым мясам,
Запівалі брудным квасам,
Мутнаю вадой.

Салавей мой сізакрылы...

— Салавей мой сізакрылы,
Скажы праўду, дзе мой мілы?
— А твой мілы ходзіць на работах
Па сахарных па заводах.
А ён робіць, робіць, рабатае,
А пот ліцо яму залівае,
А хазяін 'шчэ яго ругае:
— Чаму ты дзелачка не робіш?
Як паехаў хазяін дадому,
Нарабілі хлопцы лому,
Паламалі ўсю цэрку і прасову,
Пашла пара па ўсяму заводу,
Пашла слава па ўсяму народу...

Адпусцілі сялян «на свабоду»...

Адпусцілі сялян «на свабоду»
Дзевятнаццатага феўраля,
Толькі землі не далі народу—
Вось вам «міласць» цара і дваран.

Мужыкі без зямлі прападаюць,
А дваране і рады таму,
Што за бесцань яны нанімаюць
Мужыкоў на работу сваю.

Прыціскае нас земскі начальнік
І ўраднік дыхнуць не дае,
Поп пужае нас адам крамешным
І за трэбы тры скуры дзярэ.

А хто не быў на чыгунцы...

А хто не быў на чыгунцы,
Той гора не знаець.

А мы былі, прабавалі,
Пра ўсё гора зналі:

І холаду, і голаду,
Усяго напрымаліс,

І холаду, і голаду,
Усяго навідаліс.

З Масквы мы выязджалі
З поўнымі вазамі,

Ад Масквы, што да Канбова
Вялікія вёрсты,

Сазнабілі рабочыя
На руках напёрсты,

На руках, руках напёрсты,
Шчытаючы вёрсты.

Дзе работаюць шахцёры...

Дзе работаюць шахцёры,
Панарыты ямы, норы
Па тры сажні шырынёй,
Паўтараста глыбінёй...

Нас па клетачках садзілі
Па дванаццаць чалавек.
Клетка дзёрнула, рванула,
Ажно ў сэрца кальнула...

Не паспеў слова сказаць,
Ствалавы крычыць злязаць...
Канагоны за вагоны,
Забойшчыкі пад забой.

А санашнік справу знае,
На сабе санкі цягае,
Яго выгляд, як у чорта,
І спіна уся пацёрта...

Раз, было, я замарыўся...

Раз, было, я замарыўся
І трошкі заспаў,
Прышоў на работу,
Свісток прасвістаў.

Майстар пакасіўся,
Слова не сказаў,
Тры рублі штрафу
Ураз запісаў...

Пажыў, пажыў я на свеце...

Пажыў, пажыў я на свеце,
Панасіў бальшых лапцей,
Паработаў я работы,
Паядаў я гнілых шчэй.
Бацька дома работае,
Сын у Піцеры жыве.
Бацька грошы дажыдае,
Сын ў апорачках ідзе.

А гармонька-матушка!
Няма хлеба-мякушка.
Пап'ю кіслага кваску —
Разганю сваю таску.
З гаспадаром я разлічыўся,
Ні граша не атрымаў,
Я з канторушкі пайшоў,
Кулаком слёзы уцёр.

Жыццё маё нялёгкае...

Жыццё маё нялёгкае,
У горадзе цяжка пражыць,
Сямейку сваю родную
Даводзіцца забыць.
З дзярэўні пісьмы пішуць —
Раскошна сын жыве,

Палучку палучае,
Дамоў грошы не шле.
Якая там палучка —
У месяц рублёў пяць,
Ідзеш сабе і думаеш,
Куды грошы дзяваць?..

У нядзельку раненька...

У нядзельку раненька
Узышло сонца ясненька,

Татка коніка поіць,
Дужа жаласна плача.

Прыйшоў сынок, пытае:
— Чаго, татка, плачаш,

Да нашто ж, каму рана,
Татка, коніка поіш?

— Табе, сынку, гатую,
На вайну на лютую.

На вайну ты паедзеш,
А дамоў ці прыедзеш.

— Не плач, татка, за мною,
Трэба кончыць з вайною,

Трэба кончыць з вайною
Да з вайною ліхою.

Салдацкія прыпеўкі

Піша, хлопцы, жонка мне:
— Ці хутко канец вайне?
Ой, ці хутко, барыня,
Ці хутко, сударыня?
Ці хутко кончыцца вайна,
Бо сумую я адна.
Што ты скажаш, барыня,
Барыня, сударыня?
Ці хутко скончыцца вайна,
Бо абрыдла нам яна.
Ой, абрыдла, барыня,
Ну яе, сударыня!
Вайна начата ні намі,
А царамі ды панамі.
Праўда гэта, барыня?
Ой, праўда, сударыня!
За чужыя багажы
Не палезем на нажы!
Ой, нашто нам, барыня,
Ой, нашто, сударыня!
У нас няма цара ўжо болей,
Увесь народ на вольнай волі.
Ой, як добро, барыня,
Добро як, сударыня!
Усе паны баяцца краху,
Разбягаюцца са страху.
Уцякаюць, барыня,
Каб хутчэй, сударыня!
А мы слёз не будзем ліць,
Землю іх давай дзяліць.
Ой, як добро, барыня,
Добро як, сударыня!
Вось якія ў нас дзяла —
Рэвалюцыя прышла.
Ой, як добро, барыня,
Добро як, сударыня!

А мы Бога паміналі...

А мы Бога паміналі,
А мы Бога папрасілі
За Міколіна здароўе:
Каб і ручкі не служылі,

Каб і ножкі не хадзілі,
Каб ад сонца ён туляўся,
Каб ад ветру ён валяўся,
Каб саломкай падпіраўся.

Шалейце вы, каты!

Шалейце вы, каты, піце нашу кроў,
Будуйце астрогі, гадуйце шпікоў,
Паўстане да бою народ катаваны
На смерць, на смерць, на смерць вам, тыраны!

За волю народа, за права яго
Не страшны кайданы і змрочны астрог,
Бо вольнага духу не скуць у кайданы
На смерць, на смерць, на смерць вам, тыраны!

З усходу бліжэй бура ўсё грукаціць,
За Нёман, за Віслу яна праляціць,
І сонца свабоды з-за хмараў нам гляне —
Парвем, парвем, парвем мы кайданы.

Работнікам рукі ад зграі ліхой
Усе мы падайма, паклічам на бой,
Бо нас аб'яднала ліхая нядоля,
Пот крывавы, здзек і няволя.

Атаман Муха

Польскі бот неміласэрдны
Топча край беларусоў.
Грабіць, муча пан бязмерна —
Не было такіх часоў.
Стогнуць вёскі ад падаткаў,
Пухне з голаду народ,
Лад вядзе бізун і ўзятка,
Патурае розны зброд.
Вось на помсту за няволю,
За грабежства і за здзек
Устаў на кліч народнай волі
Беднай вёскі чалавек.
Ён пагібель ліхадзеяў —
Гэта Муха-атаман.
Перад ім са страху млее
Ксёндз-круган, пузаты пан.

Горы золата з палацаў,
Муха скажа, дык плыве
Скуль узяты, там дзе праца
У курнай хатачцы жыве.
Дзьмухане са злосці Муха —
Мігам знікне панскі двор.
Кулаком імпэтна бухне —
Ляжа ворагаў бугор.
Мухі моц нераможна,
Бо пакрыўджаныя з ім,
Нават Польшча вельміможна
Пратрусіла зусім.
Лес і поле, горы-долы
Атамана берагуць,
Беларусі вёскі, сёлы
Пад яго крыло імкнуць.

Скалыхнуў народ да бою
Муха, слаўны атаман,
Прападай жа з галавою
Акупант наш, польскі пан!

Прыпеўкі

Кінуў жонку, ды начуе
Пан са стрэльбай у руках.
А як страх які пачуе,
Дык збаўленне у нагах.
Кукурэкнуў на ўсе крэсы
Наш чырвоны петушок,
Нагавіцы, інтарэсы
Пан пакінуў і уцёк.

Эй, Варшава, нас не руш
Ды на лбе сабе адзнач,
Што ўсім крыкнуў беларус:
— Я вам больш не паслугач!
Вывеў польскі пан пузаты
Волю-долю з нашай хаты.
Охі-ўздохі кіну-рыну,
Торгну пана за чупрыну.

Заходнебеларускі гімн

Не пагаснуць зоркі ў небе,
Покі неба будзе,
Не загіне край наш родны,
Покі будуць людзі.
Ночка цёмная на свеце
Вечна не пануе,

Зерне, кінутае ў ніву,
Усходзе ды красуе.
І зацвіў наш край, як сонца,
Пасля непагоды
У роўнай волі, у роўнай долі
Між усіх народаў.

Нёман

Льецца Нёман паміж гораў
Светлы, чысты, як з расы,
Накапаў ён ям і нораў,
Гоніць воды праз лясы.
Колькі раз рыбацкі човен
На грудзях тваіх гуляў:
Ой ты, Нёман, быстры Нёман,
Колькі дум ты мне нагнаў.

Сёння горкі твае воды
Ад гарачых нашых слёз,
Ад нядолі, ад няволі,
Што з сабою пан прынёс.
Але пройдуць дні нягоды,
І настане светлы май,
Калі злучыш назаўсёды
Разарваны лёсам край.

Наперад, гэй...

Да родных ніў пальецца спеў
З прызывам ўсіх да працы,
Хто шчасця век ў жыцці не меў,
Ідзі яго шукаці.

Наперад, гэй, хутчэй, хутчэй
Да той жаданай мэты,

Хай свеціць сонца нам святлей
І мы яму пасвецім.*

Дзе серп блішчыць, звініць каса,
Дзе льецца пот крывавы,
З рассветам змые ўсё раса,
Пальецца песня славы.

І на прасторы родных ніў
Свабоды сцяг паставім,
Дзе кат свабоду закляймiў,
Там волю мы праславім.

Уставай, галодны беларус,
Служыць радзімай справе,
Скінь з плеч няволю і прымус,
Здабудзь дарогу к славе.

Маладняк

Смялей! Зару спаткаем,
Сябры, у барацьбе!
І шчыльнымі радамі
Праб'ем мы шлях сабе.
Наперад, марш!
На новы шлях!
Вышэй юнацкі вольны сцяг!

Мы маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.

Мы паднявольнай працы
Спазналі ўсе прыгон
І радасці ў юнацтве
Не ведалі мы дзён:
Ярмо фашызма церпім мы,
На душах цемры кайданы.

Мы маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.

Пад гоман звонкай сталі
Лілі мы пот і кроў
І шчасце мы кавалі
Для банды буржуёў.
Але прыгон, што нас
душыў,
Барацьбітамі нас зрабіў.

Мы маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.

На бой з гвалтаўнікамі,
Сябры, за намі ўслед!
Мазольнымі рукамі
Мы створым новы свет.
За намі ўсе! Гартуйце сталь!
Смялей у сонечную даль.

У бой, маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.

Кавалі

Мы кавалі з юнацкім духам,
Куём мы будучыні дні,
Наш цяжкі молат ўзлятае пухам
І ў сталь магутную грыміць.

Мы кавалі зямлі рабочай
Аб лепшай долі летуцім,
Ды не дарма мы трацім сілы,
Недарам сталлю мы грымім.

Бо сталь сваім магутным гулам
Рве путы цемры векавой
І ў гарадах зямное кулі
Рабочы люд ўстае сцяной.

Куём мы шчасце для народу,
Правы на ўласнае дабро
І за жаданую свабоду
Мы ўсё змагаліся й памром.

Мы кавалі з юнацкім духам,
Куём мы будучыні дні,
Наш цяжкі молат ўзлятае пухам
І ў сталь магутную грыміць.

Нарачанка

Рыбакі нарачанскія, сяляне,
Вы збірайцеся ўсе ў грамаду.
Не давайце вы рыбу фашысту,
Не спраўляйце гарматаў яму.

Не патрэбны нам іхні гарматы,
Нам ахвота яшчэ толькі жыць.
Усе сілы паны пакладаюць
Рыбакоў нарачанскіх пабіць.

Рыбакоў нарачанскіх ёсць многа,
Ім не ўдасца усіх пагубіць,
Прыдзе дзень і гадзіна расплаты,
Пан у жаху ад нас задрыжыць.

Вы не думайце, кучка фашыстаў,
Што вы будзеце век панаваць,
Прыдзе час — мы жыццё пабудуем,
Будзем вашы двары раздзяляць.

Рыбакі нарачанскія дружны,
Яны многа па свеце чуваць,
А панам усё гэта ёсць страшна,
Што не хочуць Нарочча аддаць.

Для нас Нарач ёсць родная маці:
Нас карміла, паіла сыноў,
Не дапусцім яе мы ў крыўду,
Усёй сілай адгонім паноў.

Нас не зломіць нядоля ліхая...

Нас не зломіць нядоля ліхая,
Не сагнёмся прад ёю дугой,
Мы — сям'я кавалёў маладая,
Майстры будучыні людской.

Нам не страшны маланкі і буры,
Не спалохаемся перуноў,
Нашай моцнай юнацкай натуры
Не зламаць усеўладным паном.

Нас нядоля-бяда гадавала,
Голад-холад карміў, даглядаў,
Мы — сям'я кавалёў маладая,
Уціск нашую моц гартаваў.

Дык наперад, арлы маладыя,—
Пойдзем прышласці лепшай шукаць,
Знішчым гора і слёзы людскія,
Хто ж нас можа цяпер утрымаць?

Наперад! Лепшы лёс нас чакае,
Сонца будзе нам лепей свяціць,
Мы — сям'я кавалёў маладая,
Йдзем аковы няволі разбіць.

Гэй, наперад!..

Гэй, наперад, покі сэрца
Б'ецца, рвецца на прастор,
Годзе млеці ў паняверцы,
Гэй, да сонца, гэй, да зор.

Хай бацькі стагналі ўчора,
Йшлі на той свет без пары,
Сёння ў нашай моцы — доля,
Мы жыцця гаспадары!

Думка ў думку дружна, смела
Усе наперад грамадой.
Кожны ведай сваё дзела —
Знай, за праўду крэпка стой.

Марш бярозаўцаў

Палямі палескімі група ішла,
Штыхі навакол, як шчацінне,
А сэрца нам такт адбівала: раз-два,
Дзесь плакала маці аб сыне.

Зямля нам ледзь чутна шаптала ў слязах:
— Ой, стрэне ў Бярозе вас доля.
І каты, і здзекі, і карцэраў жах,
Няволя навокал, няволя!

Галоў не схілялі, ішлі, як на бой,
Сыны барацьбы і пакуты.
Да дна пілі келіх атруты ліхой,
Праклятага ладу атруты.

Марш, марш, толькі ша, навіна ёсць, браты.
І шэптам пайшло ўздоўж калоны:
«Усюды бастуюць». Раўняйся, раз-два,
Імкне люд пад сцяг наш чырвоны.

Там знаюць усе, што не стала ў нас двух,
Што здзек, што тэрор тут шалёны.
Бярозаўцы, рот-фронт! Не зломяць наш дух,
Бо крочаць за намі мільёны.

Нас душаць зладзеі-акупанты...

Нас душаць зладзеі-акупанты,
Нас душаць буржуі і паны,
Па спінах гуляе гумовая палка,—
Гаротныя нявольнікі мы.

На бой, маладзёжнае племя,
З чырвоным штандарам ў руках,
Супроць акупанта, бяспраўя, няволі,
За ўладу рабочых і сялян.*

Працуем, гаруем дні і ночы,
Свой пот праліваем ракой,
А ўсё для акупанта, паноў і падпанкаў,
Для катаў, купцоў-ліхвяроў.

Нам прыклад падалі Саветы,
Як скінуць буржуяў і паноў,
Як волю і шчасце здабыць для народа,
І мы той дарогай пайдзём.

Выходзьце, сыны Беларусі,
З рабочых кварталаў і сёл.
Наперад, за жыццё, свабоду і шчасце,
Наперад у рашучы бой.

Чырвоная зорка

Чырвоная зорка, чырвоная зорка
На ўсходзе свеціць,
Каб вызваляліс, каб вызваляліс,
Кліча свае дзеці.

Сурмы іграюць, на бой прызываюць,
Мужык прабудзіўся і абразуміўся,
Пазнаў, што волі, шчасця і долі
Ад веку вякоў не мае.*

Устаньце з няволі, устаньце з няволі,
Досыць гаваці,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.

Бо свет нам новы, бо свет нам новы
Трэба будаваці.

Мы ўсе брацці, мы ўсе брацці,
Сям'я беларусаў,
У сваім родным краі, у сваім родным краі
Жыць будзем без прымусаў.

У сваім родным краі, у сваім родным краі
Жыць добра нам будзе.
Вольна і свабодна, вольна і свабодна,
Аж здзівяцца людзі.

Стары год пражыўшы...

Стары год пражыўшы, жывем новы год,
Чаго ж дачакаўся наш бедны народ?
Дачакаліся мы мукі,
Будуць помніць нашы ўнукі
Да смерці паноў.

Нашу зямельку ад нас аднялі,
Панскіх сыночкаў панадзялялі.
А за гэтыя падаткі
І кароўкі і цяляткі
Ад нас аднялі.

Бо паны волю такую маюць,
З мужыка шкуру жыўцом здзіраюць:
Як пан дзярэ, то ксёндз строга:
Cierp, duszeczko, to od boga,
Cierp, duszeczko, cierp!

Як мы будзем у касцёл хадзіць
Ды будзем слухаць, што ксёндз гаворыць,
Дык, браткі, з гэтай нядолі
Не выйдзе дабра ніколі,
Покуль будзем жыць.

Пан пехатою не ходзе,
Ён любіць ездзіць на самаходзе.

Едзе, пуза адваліўшы,
Досыта крыві напіўшысь,
Гэта ўсё людской.

Што паны робяць за нашы грошы?
Яны спраўляюць абед харошы,
П'юць віно, ядуць дзічыну,
Штоноч — свежую дзяўчыну,
Бо яны — паны.

Цяжка на сэрцы запала дума:
— Ці ж ад паноў ўжо ратунку няма?
Ёсць ратунак, вам прызнацца,—
У КПЗБ запісацца
І пабіць паноў.

Заходнебеларуская купалка

Сёння Купала, а заўтра Ян,
Будзе, панове, ліха вам.

Будзе вам ліха, ліха ліхое,
Скончыцца вам панства такое.

Сёння Купала, а заўтра Ян,
Будзе, панове, ліха вам!

Ой, вядуць, вядуць...

Ой, вядуць, вядуць дарогай скутых,
Не лісты звіняць асеннія, а путы,
Не лясы галосяць следам у дуброве,
А, застаўшыся, сіроты і удовы.

Толькі помсты нашай путамі не звяжуць,
Яна зарывам і поўначчу ўстаніць,
Над асадніцкімі хатамі, сялібамі
Палацовымі яна зазвоніць шыбамі.

Смерць вязня

Ціха гасла чароўная зорка,
Яе блеск недзе гінуў між хмар.
За турэмнай цаглянай сцяною
Паміраў малады камунар.

Хмары чорныя дзіка глядзелі,
Дзіка гром угары грукатаў,

Прытуліўшысь да кратаў сталёвых
Барацьбіт з захапленнем шаптаў:

— Ох, каб сілы юнацкай хоць трохі
Засталося ў схудалых грудзях,
Каб дзяўчыне каханай апошні
Пацалунак злажыці я мог.

Каб пабачыць таварышоў мілых,
Ім аддаць свой апошні прывет,
Я спакойна сышоў бы ў магілу,
Без пратэсту пакінуў бы свет!

Толькі вобразы мілых луналі
І неслісь у невядомы шлях,
Перад ім абразы ўсплывалі
І ўсплыў перад ім працы сцяг.

Так пагасла чароўная зорка,
Так памёр малады камунар,
Народ песняй яго ўспамінае,
За геройства складаючы дар.

Пад гоман вясёлы...

Пад гоман вясёлы, пад звон чары поўнай,
Пры зборы усіх на бяседзе такой
Успомнім мы, брацці, аб долі няроўнай,
Пра ўсіх тых, хто церпіць за край родны свой.

З гарачай душою ўсе лепшыя сілы,
Што выйшлі з рабоча-сялянскай сям'і,
Адных ужо крыюць курганы-магілы,
Другія — у мурах за кратай турмы.

У Познань і Кракаў, у далёку чужыну,
Загнаны ў няволю ён быццам навек,
Бацькоў старых кінуў і мілу дзяўчыну,
Сам церпіць ён голад, і холад, і здзек.

І белым тварам прынікшы да кратаў,
Зоркі шукае на небе начном,
Каб думку занесла да роднае хаты,
Каб кліч перадала ўсім браццям ў сяло.

Змагайся, мой дружа, з наезнікам-панам,
Змагайся за лепшую долю сваю,
Змагайся за лепшую долю-свабоду,
Хоць цяжка змагацца, а ўсё зможаш ты.

Пад гоман вясёлы, пад звон чары поўнай,
Пры зборы усіх мы прысягу даём:
«Не зломяць нас віхры ў той бітве няроўнай;
За здзек з нашых брацціяў мы помсту нясём».

Гусі

Як ляцелі гусі
Ды над Беларуссю,
Ляцелі, ляцелі,
Апусціліс, селі.
Гусі тыя былі
Шляхецкага роду,
Яны нарабілі
У нашым полі шкоды.
— Гыля, гыля, гусі,—
Яны не баяцца,
У нашай Беларусі
Сталі абжырацца.
Паадраслі пёры,
Набраліся шыку,
Пыхі і гонару.
Гусь-то — пан вялікі.

Як над нашым полем
Ды аднаго году
Ляцелі саколы
З-пад сонца усходу.
Як убачаць гусі,
Моцна напужаліс,
З палёў Беларусі
Ледзь яны паднялісь.
Ды ляцелі гусі,
Хто куды каторы,
У палёх Беларусі
Пагублялі пёры.
Пагублялі шапкі,
Панскую асанку
Ды ляцелі з крыкам:
— Уцякай, васпанку!

Ох ты, сад, ты мой сад...

Ох ты, сад, ты мой сад,
Сад зялёненькі,
Не парой ты, мой сад,
Расцвітаешся.
А куды ж ты, мой сын,
Сабіраешся?
Ці ў ход, ці ў паход,
Ці ў дарожаньку?
Паначуй, мой сынок,
Хоць жа ночаньку.
— Я і рад начаваць
І нядзелечку.
Трэба йсці ваяваць.

Урага выганяць.
А ты, маці, не плач,
Дарагая сястра,
Пажадай мне удач,
Абнімі ля двара.
Ай, ацец мой і маць,
Вы мне дорагі.
Ды краіну таптаць
Сталі ворагі.
За любімы народ,
За айчыну-маць
Я іду у паход
Немчуру выганяць.

Ой, ты, Ваня-Ванечка...

Ой, ты, Ваня-Ванечка,
Мілая душа.
Я з табою, Ванечка,
Не нажылася.

Я з табою, Ванечка,
Не нажылася.
Ты сеў да й паехаў,
Я асталася.

Ты сеў да й паехаў
Па барах гуляць.
А мяне ж пакінуў
Дома гараваць.

Гаравала ночаньку,
Гаравала дзве,
А на трэццю ночаньку
Стала на зарэ.

А на трэццю ночаньку
Стала на зарэ.
Ці не едзе Ванечка
На сівым кане?

Партызаны едуць,
А лясы шумяць.
— Адпусціце Ванечку
На час пагуляць.

Адпусціце Ванечку
Адпусціце майго,
Што ругала мамачка
Мяне за яго.

Ругала, ругала,
Шчэ й хацела біць.
А я палюбіла,
Не магу забыць.

Балада аб партызанцы Галіне

Над ракою у спакою
Расцвітала каліна,
А ў сяле за ракою
Вырастала дзяўчына.*

На каліну-маліну
Прылятала зязюля,
Да дзяўчыны Галіны
Прыглядаўся Януля.

За ракой, дзе Галіна,
Сенажаці касілі,
А ў сяле, дзе Януля,
У паход затрубілі.

Перастала каліна
У цвяточкі ўбірацца,
Перастала Галіна
З сваім мілым відацца.

Бедавала зязюля,
Што цвяточкаў не стала.
Бедавала матуля,
Што дзяўчына прапала.

Падняла восень хвалі
У рацэ пад калінай,
Пайшлі ў бой партызаны —
Там была і Галіна.

---

* Два апошнія радкі кожнай страфы паўтараюцца.

На кані вараным...

На кані вараным
Выязджаў партызан. Эй!
Шабля вострая з ім
Шчэ й гранаты, наган.*

Ён каня задзяржаў,
Пацягнуўся рукой. Эй!
Конь бадзёры іржаў,
Біў зямлю ён нагой.

Дзве рукі, як замок,
Крэпка зжаліс ь на міг. Эй!
— Да спаткання, сынок!—
Яму кажа стары.

Сын крануў павады,
Сын фуражкай ўзмахнуў. Эй!
І паехаў туды,
Адкуль чуцен быў гул.

Конь памчаўся стралой,
Толькі вецер свісцеў. Эй!
Гэта красны баец
К партызанам ляцеў.

Цячэ рэчка ля паляны...

Цячэ рэчка ля паляны,
Беражкі крутыя,
Там сышліся партызаны,
Хлопцы удалыя.

Толькі камандзір атрада
Штосьці невясёлы,
Бо за лесам фрыцы-гады
Паляць нашы сёлы.

Яны паляць і кідаюць
Наш народ у пекла,
Кроў ружовая густая
Па зямлі пацекла.

— Партызаны, партызанкі,—
Камандзір гаворыць,—
Нашых дзетак давяць танкі,
Вунь шалее вораг.
Пойдзем, хлопцы, пойдзем,
братцы,
Край агнём палае.
За цябе ідзём змагацца,
Беларусь лясная.

Дык давайце будзем біцца,
Каб фашыстаў сцерці,
Чым палонным быць пад
фрыцам,
Лепш ў баі памерці.

Адказалі партызаны
Бацьку-камандзіру:
— Знішчым ворагаў паганых,
Хоціць куль і жвіру.

І пайшлі у бой лавінай
На фашыстаў-катаў,
Стала вольнай зноў краіна,
Ззяе сцяг крылаты.

Залячылі людзі раны,
Расцвітай, Расія!
Вам спасіба, партызаны,
Хлопцы удалыя

* Два апошнія радкі кожнай страфы паўтараюцца

Па полі, пакрытым туманам...

Па полі, пакрытым туманам,
Туды, дзе дыміўся цягнік,
Ішлі змагары-партызаны,
Іх вёў камандзір-падрыўнік.

Жаданнем іх сэрцы гарэлі
Пусціць эшалон пад адкос.
Ім вецер дуў ў полы шынеляў,
Мароз красіў шчокі і нос.

Праходзілі смела, бадзёра,
Намер іх няможна спыніць!
За крыўду народа, за гора
Фашыстам ішлі адамсціць.

І шмат узляцела ў паветра
Ад рук іх варожых машын.
Ім сведкай становяцца ветры
Ды шум стогадовых хваін...

У бары кукавала зязюля...

У бары кукавала зязюля,
Яе песню я слухаў не раз,
Гэта ты, дарагая матуля,
Залівалася плачам па нас...

Не сумуй, дарагая матуля,
Што сыноў тваіх дома няма,
Нас мінула варожая куля,
І не страшна нам злая зіма.

І не страшны нам вораг
пракляты,
Б'ём яго мы удзень і ўначы,
Скора, скора падмажа ён
пяты,
Ды не ўдасца, бадай, уцячы...
Калі ж заўтра варожая куля
Прынясе мне смяротны канец,
Не сумуй, дарагая матуля,
Што за край наш загіне баец.

Каб жыць на свабодзе па-людску...

Каб жыць на свабодзе па-людску,
Каб гора ніколі не мець,
Нясуць партызаны са Слуцку
Праклятаму ворагу смерць.

Выходзяць на бітву аршанцы,
Суровы ідзе Магілёў,
Каб помсціць фашысцкім паганцам,
За гвалты, за здзек і за кроў.

Штыхамі шчаціцца Мозыр,
У гневе гудзе Белавеж,
І помста бязлітасна, грозна
Паўстала з сялянскіх застрэш.

Бушуе народным паўстаннем
І Гомель, і Віцебск, і Пінск,
І ворагу помсціць за раны
Наш родны разбураны Мінск.

І людзі выпростваюць плечы,
Скідаюць нявольніцтва груз,
Чырвонае войска наўстрэчу
Ідзе да цябе, Беларусь.

У лесе, на мшыстай палянцы...

У лесе, на мшыстай палянцы,
Пад восеньскі шум баравы
Сышліся мы ў цёмнай зямлянцы,
Каб голас паслухаць Масквы.

Зямлю грэе сонца ўжо скупа,
І з дрэваў асыпаўся ліст,
Праверыў па музыцы рупар
Нязменна вясёлы радыст.

Вось грымнулі воплескі громам,—
Зямлянка, зямлянка, зважай!
І голас, як сонца, знаёмы
Пачуў беларускі наш край.

У нас прасвятліліся вочы,
І стала ў зямлянцы цяплей,
І кожны наблізіцца хоча
Да рупара трошкі бліжэй.

Ніколі не згіне ад лютых пажараў...

Ніколі не згіне ад лютых пажараў
Вялікі і слаўны наш край.
У бой за Радзіму збірайся, таварыш,
Ідзі партызаніць у гай.

На прускага ката!
За вёску і хату!—
Кліч помсты народнай заве.
Ідуць у атаку
Лясныя салдаты,
Грукочуць гранаты,

Крычаць аўтаматы:
Жыве Беларусь!
Жыве!*

Змагайся без страху з навалай варожай
За шчасце калгасных палёў;
У пушчах Палесся, на Нёмане й Сожы
Грыміць навальніца баёў.

Адважныя хлопцы сядзяць у засадах,
Разгневана пушча гудзе:
— Ад куль не схавацца вам, лютыя гады,
Расплаты не ўнікнуць нідзе!

Ніколі не згіне ад лютых пажараў
Вялікі і слаўны наш край.
У бой за Радзіму збірайся, таварыш,
Ідзі партызаніць у гай.

Не зязюлька плача і кукуе...

На мяжы, дзе зломак кукурузы
Перавесіў пер'і цераз тын,
Спіць герой Савецкага Саюза
Партызан Заслонаў Канстанцін.

Не зязюлька плача і кукуе
У дрымучых віцебскіх лясах,
Гэта песню мы пяём такую,
Што любіў насвістываць ён сам.

Мы яе пад кулямі спявалі,
Прабіваліся па пахі у вадзе.
Колькі ворагаў — ніколі не злічалі,
А пыталіся адразу толькі: «Дзе?»

Над зямлёй руінаў і пажарышч
Ўстане сонца, гляне цераз тын.
Спі спакойна, доблесны таварыш,
Спі, герой, Заслонаў Канстанцін.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.

Ой, туманы

То не воран чорным крыллем маша,
Не дубровушка зялёная шуміць,
То герой Ісачанка наш Саша
Пад кустом ракітавым ляжыць.

Ой, туманы, шэрыя туманы,
Дзе тады ляталі, дзе былі?
Ды й чаму ж, туманы, растуманы,
Земляка ад мін не збераглі?

Ён закрыў навекі свае вочкі,
Дзе бяжыць Дняпро, наша рака,
Ой, туманы, што ж вы, туманочкі,
Не збераглі Сашу-земляка.

Падарваўся на варожай міне
За свабоду, шчасце, за людзей,
Аб адважным партызанскім сыне
Несціхана лес усё гудзе.

Ой, туманы, што ж вы, туманочкі,
Ой, калгасныя шырокія палі,
Ой, чаму ж вы Сашу-партызана
Не схавалі, нам не збераглі...

І не раз стагнала Хоўхла-вёска,
Ой, не раз дрыжэлі землякі.
Выбухаў хаваў лес адгалоскі,
Пад адхон ляцелі цягнікі.

Ой, туманы, шэрыя туманы,
Дзе тады ляталі, дзе былі?
Ды й чаму ж, туманы, растуманы,
Земляка ад мін не збераглі?

Будуць помніць негадзяі-фрыцы,
Беларускіх мужных партызан,
Нам цябе ніколі не забыцца,
Беларускі волат і тытан.

Ў чыстым полі, ў полі пад ракітай...

Ў чыстым полі, ў полі пад ракітай,
Дзе клубіўся па начы туман,
Там ляжыць ў сырой зямлі зарыты,
Там схаваны юны партызан.

Я сама героя праважала,
Ў дальні пуць, на слаўныя дзяла,
Баявую шаблю падавала,
Варанога коніка вяла.

На траву, на травушку сцяпную,
Ён упаў, прастрэлены ў баю,
За Савецкую зямлю радную
Ён аддаў геройску жызнь сваю.

Трава палягае...

Трава палягае,
Віхуры галосяць,
На свежыя раны
Пясочку наносяць.

Нясіце вы, ветры,
Жалобу матулі,
Скасілі сыночка
Нямецкія кулі.

І ночка праходзіць,
Другая мінае,
Матуля над сынам
Нямцоў праклінае:

— Бадай вам,
нямцове,
Пазнацца з труною,
Як вы разлучылі
Сыночка са мною.

Быццам чорная навала...

Быццам чорная навала,
Вораг рваўся ў родны край,
І краіна застагнала
Ад бандыцкіх чорных зграй.

Быццам змей дваццаціглавы,
Поўз фашысцкі чорны зброд,
Стаў таптаць палі і травы,
Стаў паліць ён наш народ.

Наша вёска невялічка,
Называюць Астравок.

Партызанаў сувязныя
Ўсе пасаджаны ў астрог.

Але мукі ім не страшны,
Смелы, храбры наш народ.
Фрыц стараецца дарэмна
Ў іх дабіцца, дзе атрад.

Збеснаваўся вораг люты,
Ідзе ў вёску Астравок,
Ўсіх людзей сагнаў у хаты
І не выпусціў, паджог.

720 Крыкі жалю, злобы, помсты
Па акрузе разняслісь
І да вёскі к партызанам,
Як прызывы, данеслісь.

Сіла гневу, жалю, помсты
Іх ў атаку падняла.
І на ворага-паганца
Мсціць за вёску павяла.

За пакуты ўсёй краіны
Кожны помсціў партызан,
Не адзін фашыст загінуў,
Пакаціўся у бур'ян.

Хай запомніць вораг дзікі,
Што не знішчыць наш народ,
Хай не ткне свіное рыла
Ў наш савецкі агарод.

Бывайце здаровы!..

Бывайце здаровы,
Багата жывіце
І нашы парады
Ад сэрца прыміце!

У кожным палку каб
Героем быў кожны,
А ваш камандзір каб
Героем быў двойчы.

Каб снайперы білі
Найболей тых фрыцаў,
На кожнага была б
Штук гэтак па трыццаць.

А калі не трыццаць,
А болей іх будзе,
Ніхто не спытае,
Ніхто не асудзіць.

Каб наша пяхота
І танкаў лавіна
Пакінула б фрыцам
Зямлі тры аршыны.

Хай фрыцам ў Берліне
Дастануцца слёзы,
А фрыцам ў Расіі —
Крыжы і бярозы.

Каб вы разагналі
Ўсю зграю пагану,
Каб кожны баец ваш
Хадзіў бы з медалем.

А калі баец ваш
І з ордэнам будзе,
Ніхто не спытае,
Ніхто не асудзіць.

Яшчэ вам жадаем
Вярнуцца дадому,
Убачыць у шчасці
Усіх сваіх родных.

Бывайце здаровы,
Багата жывіце,
Паганых ўсіх фрыцаў
На захад ганіце.

Ганіце вы фрыцаў
На захад, на захад,
Каб жыць вам вясёла,
Каб жыць вам багата.

Каб сонца вам ззяла
На ніве жыцейскай,
Каб ваша дывізія
Стала гвардзейскай.

Прыстань, Прыстань, знаёмая вёска...

Прыстань, Прыстань, знаёмая вёска,
Ці даўно ты садамі цвіла,
Ці даўно вечарамі гармошка
Сабірала на танцы дзяўчат?

Ты скажы мне, дзе дзеліся хаты
І куды твае людзі пайшлі?
Папалілі ўсё ворагі, каты,
І людзей папалілі жывых.

Напіліся крыві чалавечай
І зямлю напаілі слязой,
Гэта тыгры у скуры авечай
Па краіне гуляюць з касой.

Дзе іх сэрца, фашысцкія гады,
Дзе душа іх, паганая кроў,
Каб дзяцей вырываці з рук матак
І паліць на вачах у бацькоў?..

На адплату, браты-беларусы,
На адплату за нашых дзяцей,
За жанчын, за сірот на адплату
Падымайцеся, брацці, жывей!

Забрукуй, сівы галубочак...

Забрукуй, сівы галубочак,
На чырвонай каліне,—
Няхай плача малады
малойчык
Па харошай дзяўчыне.

Няхай плача, няхай тужыць,
Галоўку клапоча:
Высахла я на былінку,
Скарыцца ж не хочу.

Выганяе люты вораг
З роднае хаты,
У няволю гнаці хоча
Ліхадзей закляты.

У няволю гнаці хоча
Ліхадзей закляты,
Ды яму я не скаруся,
Лепей утаплюся.

Баліць галоўка, баліць
макоўка,
Нечым завязаці,

Няма мілага, чарнабровага,
Некім наказаці.

Завяжу галоўку, завяжу
макоўку
Шоўкавым платочкам,

Пашлю да мілага,
чарнабровага
Сівога галубочка.
— Ляці, сівы галубочак,
Ляці, не садзіся,
Прыляціш да майго мілога,
Нізенька скланіся.

Ляцеў сівы галубочак,
Ляцеў, не садзіўся,
Прыляцеў да майго мілога,
Нізенька скланіўся.

— Ой, ідзі, мой міленькі,
З Арміяй Чырвонай
Вызваляці, бараніці
Край наш любы, родны.

Гэй вы, фрыцы-ягамосці...

Гэй вы, фрыцы-ягамосці,
Завітайце к нам у «госці»,
Мы гасцей як след прымаем
І падносім ім, што маем:
Хто гранату, а хто кулю,

А хто толавую «дулю».
Вельмі ўдалая прылада
Падрыхтована для гада:
Шнур з яечкам на канцы,
Немцу смерць у тым яйцы.

Ой, з-пад горкі ўсё туман...

Ой, з-пад горкі ўсё туман,
Ўсё туман, ўсё туман.

А ў тумане шэрым конік
Вараны, вараны.

На ім едзе камандзірык
Малады, малады.

Вёў ён сотню партызанаў
За сабой, за сабой.

Проціў немцаў усе стаялі,
Як сцяна, як сцяна.

Кулі сыпаліс, жужжалі,
Як пчала, як пчала.

З іх нікога не забіла,
З іх, байцоў, з іх, байцоў.

Толькі ўбіла камандзіра
Малайцоў, малайцоў.

Ужо сонца закацілася...

Ужо сонца закацілася
За цёмныя лясы.
Там птушкі песні пелі
На розныя галасы.

У адным лясу драмучым
Ізбушка стаяла,
А ў той старай ізбушцы
Ўдовушка жыла.

Аднажды два салдата
Прасіліс начаваць:
— Пусці, пусці, хазяюшка,
Нас ночку пераспаць.

— Я печку не паліла,
Гасцей я не ждала,
Я ў полі работала,
Дамоў позна прыйшла.

— Не нада нам, хазяечка,
Не нада нічаго,
Мы ноч пераначуем,
А заўтра ў бой пайдзём.

Адзін салдат заходзіць,
Садзіцца ён за стол,
Другі салдат заводзіць
З хазяйкай разгавор.

— Скажы, скажы, хазяюшка,
З якіх ты пор ўдава?
— З чатырнаццатага годзіка,
Як пачалась вайна.

З чатырнаццатага годзіка,
Як пачалась вайна,

Я мужа правадзіла
І сына радзіла.

А ў сорак першым годзіку,
Як пачалась вайна,
Я мужа не даждала —
Сыночка аддала.

Ад мужа ізвяшчэнне:
Убіт ён на вайне.

Ад сына ізвяшчэнне:
Ляжыць у моры на дне.

— Узнай, узнай, хазяюшка,
Ты мужа сваяго,
Яшчэ ўзнай, хазяюшка,
Сыночка роднага.

Я мужа узнавала
Па ласкавых славах,
Сыночка узнавала
Па русых валасах.

Я мужа не ўзнала:
Ён стаў зусім сядой.
Сыночка не ўзнала —
Ён стаў двойчы Герой.

Я мужа не ўзнала:
Усё лічанька ў шрамах,
Сыночка не пазнала —
Уся грудзь у ардэнах.

Сыночка накарміла
І ўлажыла спаць,
А з мужам радам села,
Каб гора расказаць.

Пінская партызанская

Каля лесу, з-пад ракі,
Па палях гарыстых
Йшлі да нашага сяла
Ворагі-фашысты.*

Захацелася у нас
Хлебам накарміцца,
Захацелася дабром
Нашым пажывіцца.

І фашысты не дайшлі
Да лясной паляны,—
Там сустрэлі іх агнём
Нашы партызаны.

Не далі мы у жыцці
Збыцца іх надзеям,
Па савецкай па зямлі
Не хадзіць зладзеям!

---

* Два апошнія радкі кожнай страфы паўтараюцца.

Партызаніць бацька Ніны...

Партызаніць бацька Ніны,
Партызаніць і яна,
А за Ніну больш дзяўчыны
Прыгажэйшай тут няма.

Дома ў вёсцы зараз матка
Засталася толькі быць,
Бо ў старой іх роднай хаце
Пасяліўся рыжы фрыц.

Фрыц не просты — обер нейкі,
Тупарылы і руды,
Ён прысланы аж з Вілейкі
Камендантаваць сюды.

Йшла раз Ніна на заданне,
Міну ў кошыку нясла,
Не магла прайсці тут Ніна
Міма роднага сяла.

І зайшла праведаць матку,
Сёе-тое распытаць,
І прыйшлося тут дзяўчыне
Фрыца гэтага спаткаць.

— Ты карош, дзяўчына, ошань,—
Разгаворы фрыц пачаў,
І набок скасіўшы вочы,
На пасцелю паказаў.

— Пачакае хай заданне,—
Ніна думае тайком.—
Пагуляю я ў «каханне»
З гэтым дохлым прусаком.

І пасцелю ў задуменні
Стала Ніна рыхтаваць,
Фрыц стаіць у захапленні:
— Ну і дзеўка, што казаць!

Адвярнуўся на хвіліну
Фрыц у вокны паглядзець,

Ніна міну пад пярыну
Ціха з кошыка кладзець.

— Распранайся ж, мой каханы,
І ў пасцельку ў добры час,
Я адпраўлю толькі маму,
Каб не бачыла тут нас.

І міргнуўшы фрыцу міла,
Ніна выйшла за парог,
Матку з хаты падхапіла
І за вербы з усіх ног.

Толькі фрыц крануў пярыну,
Захляснула вочы бель.
Аж да неба ўзняла міна
Хату, фрыца і пасцель.

А Лявоніху Лявон палюбіў...

А Лявоніху Лявон палюбіў
Лявонісе чаравічкі купіў,
Лявоніха — душа ласкавая—
Чаравічкамі палясківае.
На гармоніку Лявонісе пад тон
Грае, грае, прыўдарае сам Лявон.
Ух-ха! Весяліся душа!
Ух-ха! Лявоніха хараша!
Раптам — вораг! Загрымела ў нас вайна,
Аблілася наша кроўю старана.
Ох, бяда, бяда, вялікая бяда—
Грабіць край наш чорных гітлерцаў арда.
Дзе ж ты, дзе, мая Лявоніха, цяпер?
Мо замучыў цябе немец, люты звер?
Не, Лявоніха з Лявонам у лясу,
І Лявоніха абрэзала касу.
Не абцасамі, а стрэламі пастуквае,
Немцаў кулямі з-за кусцікаў прыхлопвае.
Кулямётам жа Лявонісе пад тон
Грае, грае, прыўдарае сам Лявон.
Рэха весела абодвум ім падказвае,
Біты вораг перад імі аж падскаквае.
Ух-ха! Лезе з немца душа!
Ух-ха! Лявоніха хараша!

Дайце ў рукі мне гармонь...

Дайце ў рукі мне гармонь,
Залатыя планкі,
Я спяваю вам, як дамоў
Фрыц уцёк з Удранкі.
Частавалі іх тады
Нашыя брыгады,
І пабеглі хто куды
Гітлераўцы-гады.

Уцякалі без сапог.
Фрыц параніў ногі
І сярод глухіх дарог
Збіўся ён з дарогі.

Пазабыў знаёмы пуць
Гітлеравец «бравы»,—
Трэба ўлева павярнуць,
Павярнуў управа.

Дзень і ноч праходзіў ён,
І назаўтра рана
Ў нашу вёску трапіў ён...
Ў рукі к партызанам.
Не вярнуўся фрыц дамоў
Ад ракі Удранкі,
Эх, гармонь, мая гармонь,
Залатыя планкі.

Хутка сонца заззяе над намі...

Хутка сонца заззяе над намі—
Сустракаць будзем волі зару.
У чужынцаў ляжаць пад нагамі
Ты не будзеш, мая Беларусь!

Там, на ўсходзе, грыміць кананада,
Ноччу неба гарыць у агні.
Гэта крышаць фашысцкага гада
Пабраціімы твае і сыны.

Дзень і ноч ўсё мацнеюць раскаты,
Дзень і ноч бой безупынку кіпіць:
Гэта час надыходзіць расплаты,
Гэта гнеў наш пажарам гарыць.

Беларусь, наша маці, краіна!
Гэта дзень вызвалення ідзе,
Узнімі ж ўсю нянавісць і сілу
І абруш па варожай брыдзе...

Няхай помста твая запалае
Ў кожнай скібе сталтанай раллі,
Хай нямецкую набрыдзь змятае
З нашай роднай пакутнай зямлі.

Хутка сонца заззяе над намі—
Сустракаць будзем волі зару.
У чужынцаў ляжаць пад нагамі
Ты не будзеш, мая Беларусь!

Із далёкіх із краёў...

Із далёкіх із краёў
Шлі салдацікі дамоў,
Эй, шлі салдацікі дамоў,

Па вузенькай дарожцы
Запыліла вочы ім,
Эй, запыліла вочы ім.

То пясочак, то не дым,
То Радзіма — не Берлін,
Эй, то Радзіма — не Берлін.

Вот і роднае сяло
На прыгорку відно,
Эй, на прыгорачку відно.

Выхадзіце, сёстры, брацця,
Пераможцаў сустракаці,
Эй, пераможцаў сустракаці!

Із далёкіх із краёў
Шлі салдацікі дамоў,
Эй, шлі салдацікі дамоў.

На магіле ружы расцвітаюць...

На магіле ружы расцвітаюць,
Шэпча бэз над кветкамі вяргінь,
А ў магіле спіць герой савецкі—
Партызан Заслонаў Канстанцін.

Не салоўка голасам пявучым
Над ракой калыша ціхі гай,
Гэта мы яму спяваем песню
Пра любімы, родны, вольны край.

У дрымучых у лясах аршанскіх
Гэтай песні ён не даспяваў,
Ад смяротнай кулі, ад фашысцкай,
За Радзіму вольную ён паў.

Беларусь, ты бацькаўшчына наша,
Ўдаль і ўшыр прасторам ты лягла,
Кветкай яркай, кветкаю прыгожай
Між рэспублік вольных расцвіла.

Ой, з-за лесу-бору па-над хатай
Ясна свеціць сонца цераз тын.
Мы табе пяём сягоння песню,
Наш герой — Заслонаў Канстанцін.

Я рана ўстану...

Я рана ўстану,
Пайду на расу,
К магіле-кургану
Вянок панясу.

Пад гэтым курганам
Каханы ляжыць,
Навокал калгаснае
Жыта шуміць.

Пад гэтым курганам
Каханы ляжыць,
Жыццё яго рана
Смерць ўспела скасіць.

Пайшоў ў партызаны,
Фашыстаў знішчаў,
За край свой каханы
Жыццё ён аддаў.

Сама на магілу
Вянок палажу,
— Прымі вянок, мілы,—
Яму я скажу.

Каб змог ты, каханы,
Устаць, паглядзець,
Як край лечыць раны,
Расці стаў, квітнець.

Балады



У народнай пазаабрадавай песеннай творчасці асобную групу складаюць б а л а д ы — ліра-эпічныя песні. Тэрмін «балада» ў народзе невядомы. Спевакі называюць іх доўгімі або жалоснымі песнямі. У навуковы ўжытак гэты тэрмін уведзены ў XIX ст. Збіральнікі і даследчыкі беларускай вусна-паэтычнай творчасці называлі балады думамі або думкамі.

Балады — творы драматычнага зместу, напоўненыя высокім эмацыянальным пачуццём. Тэма іх — сямейнае або асабістае жыццё чалавека, незвычайныя, трагічныя здарэнні. Як і многія іншыя фальклорныя жанры, балада ўзыходзіць да глыбокай старажытнасці і прайшла складаны эвалюцыйны шлях станаўлення.

Паводле распрацаванай беларускімі фалькларыстамі класіфікацыі, балады дзеляцца на пяць асноўных груп: 1) песні з міфалагічнымі матывамі, у якіх тлумачыцца паходжанне раслін, жывёл, камянёў, апавядаецца пра пераўтварэнне чалавека ў расліну, жывёлу, птушку, камень і г. д.; 2) песні казачнага і легендарнага зместу, у якіх побач з рэальнымі героямі (мачаха, падчарка) дзейнічаюць персанажы, тыповыя больш для фантастычных казак і легенд — гора, бяда, смерць, вецер, звяры і інш; 3) песні-загадкі, у якіх героі загадваюць, на першы погляд, неверагодныя, невырашальныя загадкі; 4) песні гульнёва-падарожнага складу, якія характарызуюцца своеасаблівай кампазіцыяй — «паўтарэнне з нарастаннем» і пэўнай ўмоўнасцю зместу; 5) песні навелістычнага зместу, у якіх апавядаецца пра неверагодныя падзеі, пераважна драматычнага ці трагічнага характару ў асабістым жыцці людзей. У іх адсутнічае фантастыка. Асноўная тэма — нешчаслівае каханне, здрада, сямейныя канфлікты і інш.

ЛІТАРАТУРА

Салавей Л. М. Беларуская народная балада. Мн., 1978.

Балады/Уклад., сістэматызацыя, уступ. арт. і камент. Л. М. Салавей: У 2 кн. Мн., 1977—1978.

Паехаў сынку на Русь жаніцца...

Паехаў сынку на Русь жаніцца,
Люлі, люлі, на Русь жаніцца.

Забыўся мамцы нізка скланіцца,
Люлі, люлі, нізка скланіцца.

Вярнуўся сынок у паўдарожкі,
Люлі, люлі, ў паўдарожкі.

Скланіўся мамцы нізка ў ножкі,
Люлі, люлі, нізка ў ножкі.

Мамка сынка з дарожкі ждала,
Люлі, люлі, з дарожкі ждала.

Для сына віна гатавала,
Люлі, люлі, гатавала.

А нявестачцы — горкай атруты,
Люлі, люлі, горкай атруты.

Сын віна не піў, пад каня падліў,
Люлі, люлі, пад каня падліў.

Горку атруту напалам дзяліў,
Люлі, люлі, напалам дзяліў.

— Сумела, маці, нас пераняці,
Люлі, люлі, нас пераняці.

Сумей жа, маці, нас пахаваці,
Люлі, люлі, нас пахаваці.

Сынка схавалі пры даліне,
Люлі, люлі, пры даліне.

А нявестачку ў балаціне,
Люлі, люлі, ў балаціне.

Па сынку плачуць мамка й сястрыца,
Люлі, люлі, мамка й сястрыца.

Па нявестачцы — раба зязюля,
Люлі, люлі, раба зязюля.

Па сынку вырас зелен дубочак,
Люлі, люлі, зелен дубочак.

Па нявестачцы — бела бяроза,
Люлі, люлі, бела бяроза.

Раслі-раслі — пахіліліся,
Люлі, люлі, пахіліліся.

Дуб з бярозкай сашчапіліся,
Люлі, люлі, сашчапіліся.

Усе людзі не здзівіліся,
Люлі, люлі, не здзівіліся.

Як на тым свеце палюбіліся,
Люлі, люлі, палюбіліся.

Як паехаў пан каралевіч на Русь ваяваць...

Як паехаў пан каралевіч на Русь ваяваць,
Пакінуў Марусечку гора гараваць.

Марусечка гора гаравала, сына радзіла,
У пялёначку спавіла і ў Дунай пусціла.

А там хлопцы-рыбалоўцы рыбку лавілі,
Не злавілі шчукі-рыбы — злавілі дзіця.

А як панеслі дзіця ўсё на рожны двор,
Як далі ў барабаны і ў жалобны звон.

Загадалі ўсім дзевачкам сабірацца
І малому дзіцятачку прызнаваціся.

Усе дзевачкі, як кветачкі, напярод ідуць,
Яны на сваіх галовачках вяночкі нясуць.

Марусечка-каралеўначка пазаду ідзе,
На сваёй галовачцы вянка не нясе.

— Зачым, зачым, Маруся, забаўна была,
Што на сваю галовачку вянка не звіла?

— Я сем нядзель, як адзін дзень, ўсё хвора была,
На сваю галовачку вянка не звіла.

— Знаем, знаем, Маруся, ўсе твае размовы.
А кінулі Марусю ў Дунай глыбокі.

А яшчэ Маруся не патанула,
Яна сваю матулечку ўспамянула.

— Бадай табе, матулечка, ручка балела,
Як ты мяне, матулечка, біці жалела.

Ёсць у цябе, матулечка, дочкі ўдома дзве,
А не давай патолечкі, як давала мне.

Ёсць у цябе, матулечка, дочак ўдома пяць,
А не пушчай па кірмашыках, няхай ўдома спяць.

Лугам, лугам лабада...

Лугам, лугам лабада,
Тудой ішла удава,
А за ёю татарын-баярын,
Хоча яе секці-рубаць.
— Стой, татарын, не сячы,
Алі ты, баярын, не рубай:
Ёсць у мяне радзімы мой бацюшка,
Той мяне ці не выкупя.
Я к бацюшку пад вакошка,
Мне бацюшка ні славечка.
Ў тую пору ліхая гадзіна,
Калі мяне мамка радзіла!

Лугам, лугам лабада,
Тудой ішла удава,
А за ёю татарын-баярын,
Хоча яе секці-рубаць.
— Стой, татарын, не сячы,
Алі ты, баярын, не рубай:
Ёсць у мяне радзімая матушка,
Тая мяне ці не выкупя.
Я к матушцы пад вакошка,
Мне матушка ні славечка.
Ў тую пору ліхая гадзіна.
Калі мяне мамка радзіла!

Лугам, лугам лабада,
Тудой ішла удава,
А за ёю татарын-баярын,
Хоча яе секці-рубаць.
— Стой, татарын, не сячы,

Алі ты, баярын, не рубай:
Ёсць у мяне родны брацец,
Той мяне ці не выкупя.
Я к братцу пад вакошка,
Мне брацец ні славечка.
Ў тую пору ліхая гадзіна,
Калі мяне мамка радзіла!

Лугам, лугам лабада,
Тудой ішла удава,
А за ёю татарын-баярын,
Хоча яе секці-рубаць.
— Стой, татарын, не сячы,
Алі ты, баярын, не рубай:
Ёсць у мяне радзімая сястрыца,
Тая мяне ці не выкупя.
Я к сястрыцы пад вакошка,
Мне сястрыца ні славечка.
Ў тую пору ліхая гадзіна,
Калі мяне мамка радзіла!

Лугам, лугам лабада,
Тудой ішла удава,
А за ёю татарын-баярын,
Хоча яе секці-рубаць.
— Стой, татарын, не рубай:
Ёсць у мяне радзімы мой міленькі,
Той мяне ці не выкупя.
Я к міламу пад вакошка,
Мне міленькі тры славечка.
Ў тую пору добрая гадзіна,
Калі мяне мамка радзіла!

А былі ж людзі да няверныя...

А былі ж людзі да няверныя,
А паверылі пагану цмоку.

Ой, таму цмоку на дзень па чалавеку,
А ў пятніцу рана яму двух мала.

Прышла радавая да самаго цара,
А ў таго ж цара ні чалядачкі.

Ні чалядачкі, ні дзіцятачкі,
Толькі ў таго цара прамудра царэўна.

Прамудра царэўна, адзявайся,
Надзявай шаты, шаты дарагія.

Надзявай шаты, шаты дарагія,
Абувай боты да ўсё залатыя.

Да ідзі ў поле пад сіне мора.
А сіняе мора скалыхнулася,

А сіняе мора скалыхнулася,
Прамудра царэўна ўлякнулася.

Выплываець з мора паганы цмок,
У яго з роту агонь валіць.

А ў яго з вушэй дымы ідуць,
А ў яго з вачэй іскры сыплюць.

— Пастой, пагадзі, паганы цмок,
Пастой, пагадзі, паганы цмок.

Як зачуў Госпад да усю праўду.
— А святы Юрый, адзявайся.

Надзявай шаты, шаты дарагія,
Надзявай шаты, шаты дарагія.

Надзявай боты да ўсё залатыя
Да ідзі ў стайню, выбірай каня.

Выбірай каня найсівейшага,
Найсівейшага, найсільнейшага.

Да едзь у поле пад сіне мора
Прамудру царэўну да й бараніць.

— Ой, Госпадзі ж Божа, сам я баюся,
Ад паганага цмока не (а)дбаранюся.

— А святы Юрай, чаго баяцца?
Сячы канём, канём перадом.

Сячы канём, канём перадом,
Канём перадом, войстрым кап'ём.

Закідай ланцуг, ланцуг на рогі,
Ой, вядзі цмока па ўсяму свету.

Стрыкліва крапівіца балотная...

Стрыкліва крапівіца балотная,
Журліва свякровушка няродная.
Як журыць нявестку як дзень, так ноч:
— Ідзі, нявестка, ў чыстае поле,
У чыстае поле яраво жыта жаць.
Пасылаець мяне не абедаўшы.
Я жала, жала дзень да вечара,
Дзень да вечара я не абедаўшы.
Снапочак нажну, каласочак сатру,
Я тым каласочкам паабедаю.
А паабедаўшы, снапы знасіла,
Снапы знасёмшы, ў копанькі склала,
У копанькі склала, двораньку пашла,
Прашомшы двору, пад кароў пашла.
Я дзевяць кароў падаіла,
Пад дзесятую падступіла,
На дзіцятачку ну я ўздумала,
На маленькага ну я ўздумала.
Удару даёнку аб сыру маць-зямлю,
Пабягу я за дзіцятачкай за маленькай.
Над дзіцятачкай чатыры нянечкі,
Чатыры нянечкі, шэрыя ваўкі.
Радзілі раду, раду добрую,
Адзін гаворыць: дайце-ка, братцы,
Давайце-ка, братцы, я пакалышу,
Баюся я, братцы, нябы ўраню.
Другі гаворыць: дайце, братцы,
Дайце-ка, братцы, я пакублю.
Баюсь я, братцы, нябы злізаці.
Трэці гаворыць: дайце-ка, братцы,
Дайце-ка, братцы, я пацалую,
Баюсь я, братцы, нябы саўсім з'ем.
Чацвёрты гаворыць: дайце-ка, братцы,
Дайце-ка, братцы, ну я падзялю:
Каму ручачку, каму ножачку,
Роднай матушцы — хоць галованьку.
Роднай матушцы на ўздыханейка,

Лютай свекрыві на папіканне.
— Ах вы, нянечкі, шэрыя ваўкі,
Ідзіце-ка вы у зялёны луг,
Там майго свёкаркі шасцёрка коней,
Выберыце-ка палаўчэйшага,
Вы не дзяліце, вы саўсім з'есця.

А ўдовушка, удава...

А ўдовушка, удава
Сем лет без мужа жыла.
Удовушка, удава
Сем лет без мужа жыла.

Сем лет без мужа жыла,
Двух купчыкаў злюбіла,
Э-э-эй, а-ха-ха,
Двух купчыкаў злюбіла.

І двух купчыкаў злюбіла,
Пару сыноў радзіла,
Э-э-эй, а-ха-ха,
Пару сыноў радзіла.

Пару сыноў радзіла,
Сама бабаю была,
Пару сыноў радзіла,
Сама бабаю была.

Сама бабаю была,
Сама імя ім дала,
Э-э-эй, а-ха-ха,
Сама імя ім дала.

Сама імя дала:
Іванюшку й Васіля,
Э-э-эй, а-ха-ха,
Іванюшку й Васіля.

Іванюшку й Васіля
Да на рэчку панясла,
Іванюшку й Васіля
Да на рэчку панясла.

Да на рэчку панясла
У Дунай-рэчку бросіла,
Э-э-эй, эй-ха-ха,
У Дунай рэчку бросіла.

— Ох ты, рыба алая,
Прыглядай маіх дзяцей,
Э-э-эй, эй-ха-ха,
Прыглядай маіх дзяцей.

Прыглядай маіх дзяцей
Да семнаццаці ляцей,
Э-э-эй, эй-ха-ха,
Да семнаццаці ляцей.

Цераз семнаццаць жа ляцей
Пайшла ўдоўка па ваду,
Э-э-эй, эй-ха-ха,
Пайшла ўдоўка па ваду.

А шырока размахнула,
Глыбако пачарпнула,
Э-э-эй, эй-ха-ха,
Глыбако пачарпнула.

Аглянулася назад,
Плывець новенькі карабль,
Э-э-эй, эй-ха-ха,
Плывець новенькі карабль.

А ў том жа караблі
Жывуць удоўкіны сыны.

А за раджэння, за нашэння
Дык ты маць наша радна,
Э-э-эй, эй-ха-ха,
Дык ты маць наша радна.

А за кармлёту, за паёту
Дык ты лютая змяя,
Э-э-эй, эй-ха-ха,
Дык ты лютая змяя.

Да у нашым Слуцку навіна стала...

Да у нашым Слуцку навіна стала,
Адна ж панна-вайтоўначка сына радзіла.

Парадзіўшы сыночка, ў кітай спавіла,
Парадзіўшы сыночка, ў кітай спавіла.

Спавіўшы ў кітаечку, на Дунай пусціла,
Спавіўшы ў кітаечку, на Дунай занясла.

— Да плыві ж, мой сыночак, да дзе дна няма,
Як у гэтым Дунаечку да й няма канца.

Да ніхто ж таго дзіва не чуў, не бачыў,
Толькі ж чуў да бачыў паніч-каралевіч,

На высокім ганачку пахаджаючы,
Да белыя свае ручкі памываючы,

Да белыя свае ручкі памываючы,
Шоўкаваю хустаю паціраючы.

Як зажадаў пан-каралевіч шчучкі-рыбачкі:
— Да мілыя мае тры рыбаловы,

Да й закіньце сеткі, сеткі-невадкі.
Ці не ўловіце, не спаймаеце шчучкі й акуньца?

Да як закінулі, так і спаймалі,
Да як закінулі, так і спаймалі.

Не ўлавілі, не спаймалі шчучкі й акуньца,
Да злавілі, да спаймалі малое дзіця.

Да й узялі тое дзіця да й на ручанькі,
Да й паняслі ж тое дзіця да святлічанькі.

Да як зазванілі ува ўсе званы,
Да штоб сабраліся паненкі, паны.

Да ўсе ж паны, паненачкі вясёленька йдуць,
Да ж на сваіх галовачках вяночкі нясуць.

Адна ж панна-вайтоўначка хмурнесенька йдзе,
Да на сваёй галовачцы вянка не нясе.

Да ў сені не ўвайшла, цяжка уздыхнула,
А на дзіцятка глянула — да й заплакала.

— Знаці, знаці, вайтоўначка, твая прычына.
Як узялі вайтоўначку пад белы бокі.

Як узялі вайтоўначку пад белы бокі
Да й уруцілі вайтоўначку ў Дунай глыбокі.

Яны ж да й німалі, што яна ўтанула,
Но шчэ панна-вайтоўначка тры разы ўзрыгнула,

Такі сваёй роднай мамцы слоўца мовіла:
— Ёсць жа ў цябе, мая мамка, яшчэ дачок пяць.

Ёсць жа ў цябе, мая мамка, яшчэ дачок пяць—
Не пускай іх па вячорках, хай дома спяць.

Ёсць жа ў цябе, мая мамка, яшчэ дачок тры—
Не пускай іх па вячорках, дзверы падапры.

Ёсць жа ў цябе, мая мамка, яшчэ дачок дзве—
Не давай ім патоленькі, як давала мне.

Не пускаць было мяне, маці, з поўначы на віно,
Ну, гэта мяне тое віно з розуму звяло.

Як зайгралі, завяселілі ў скрыпкі і ў цымбалы
І з панічом-кралевічам спаць паклалі.

Пасею пшанічаньку у роўненькім полі...

Пасею пшанічаньку у роўненькім полі,
Пасаджу бандароўну ў новенькім пакоі.

Расці, расці, пшанічанька, пакуль цябе жаці,
Заляцаўся пан крулевіч бандароўну ўзяці.

А у Слуцку на рыначку карчомка стаяла,
Там панна бандароўна п'яная гуляла.

Вот гуляла, вот гуляла з тымі дваракамі,
А дачуўся пан крулевіч, што з яго слугамі.

А у Слуцку на рыначку гаварылі ціха:
— Уцякай, бандароўна, будзе табе ліха.

Уцякала бандароўна на цёмныя лугі,
Сталі яе даганяці крулеўскія слугі.

Як дагналі, так узялі пад белыя рукі,
Да павялі нешчасліву на вялікі мукі.

Прывялі і паставілі на новенькім ганку:
— Стой, панна бандароўна, з вечара да ранку.

Як стаў жа пан крулевіч на скрыпачку йграці,
Стала панна бандароўна песенькі спяваці.

Як стаў пан крулевіч ружжо набіваці,
Стала панна бандароўна цяжка уздыхаці.

Як памерыў, так і ўдарыў у левае вуха,
Ляжыць панна бандароўна і нема, і глуха.

Паляжала, паляжала з вечара да ранку,
Пакуль сказаў пан крулевіч выкапаці ямку.

Прыходзіць родна маці, спляснула рукамі:
— Адгуляла ж, дзіця маё, з тымі дваракамі.

А прыходзіць родны бацька, тупнуў жа нагою:
— Дзіця маё маладое, разлука з табою.

Павялеў жа пан крулевіч ёй труну рабіці,
Залатымі кутасамі вокала аббіці.

У нашага крулевіча шоўкам хата крыта,
Адна была ў яго жана і тая забіта.

Ляцелі скаўроначкі садам, гукаючы,
Заплакаў пан крулевіч, лісты чытаючы.

Ой, лятаў-палятаў ды сівы арол...

Ой, лятаў-палятаў ды сівы арол,
У кіпцях ён нясе руку белую,
Руку белую малайцоўскую;
А ўдагон яму ясен сакол:
— Пагадзі-пастой ты, сівы арол.
А дзе ж быў-жыраваў ты, сівы арол?
— А я быў-жыраваў на пабоішчы,
Над шырокай ракой каля Клеціўска!
А там послынь сцелена ды галовамі,
Усё галовамі малайцоўскімі;
А там кроў плыве ды Дунай-ракой,
А ваўкі грызуць белы костачкі;
Там агні гараць, там катлы кіпяць,
І татары стаяць, палон дзелючы,
Палон дзелючы, падзяляючы,
Дасталася сястра брату-патурчаніну,
Сястра брату, цешча зяцю-басурманіну.
А брат сястру дамоў пусціў,
Дамоў пусціў, добра слоўца казаў:
— Ты вяртай, сястра, борзда дадому,
Прыдуць татары налета ўзнову,
Прыдуць узнову хмарай страшнаю,
Стануць абозам ля нашага двору.
А прывёз зяць цешчу маладой жане:
— Вось табе, мая малада жана,
Вось табе з вайны паланяначка,
Будзе яна табе, мая верная жана,
Векавечная твая работніца,
А вам, дзеткі мае, будзе нянькай яна.
А ты дай ёй, жана, тры работанькі:
Першая работа — тонкі кужаль прасці,
Другая работа — гусей у лузе пасці,
Трэцяя работа — дзіцё калыхаці...
Ножкамі маці дзіцё калыхае,
Дзіцё калыхае, сціха падпявае:
— Ой, люлі, люлі, дробна дзіцятка,
Ой, люлі, люлі, маё ты мілае.
А па бацьку — ты мне татарчатка,
А па маці — ты мой унучатка.
Як учула дачка песню з пакою,

Бяжыць у сені борздай стралою:
— Ой, кінь, кінь, маці, дзіцё калыхаці,
Хадзем у пакоі, а сядзь за столам,
Бяры ў мяне, маці, ключы залатыя,
Адмыкай жа імі скрыні дубовыя,
Бяры золата-срэбра, сколькі табе трэба,
А будзь ў мяне, родна, як у сябе дома,
— Дзіцятка маё, Алёнка мілая,
Не нада мне грошы, пусці дадому,
Пусці дадому ў Клецкі староны.

Як паехаў сын Даніла на ваёначку...

Як паехаў сын Даніла на ваёначку,
Ой, люлі, люлі, на ваёначку.
Яго маці старая да ў ложы ляжала,
Ой, люлі, люлі, да ў ложы ляжала.
Яна сыну Данілу лісты белыя пісала,
Ой, люлі, люлі, лісты белыя пісала,
— Прыязджай жа, сын Даніла, ды да свайго двара,
Ой, люлі, люлі, ды да свайго двара,
Твая жана Кацярына сваю волю паняла,
Ой, люлі, люлі, сваю волю паняла.
Твае коні вараныя пазаезджавала,
Ой, люлі, люлі, пазаезджавала,
Твае сукны зялёныя пазаношавала,
Ой, люлі, люлі, пазаношавала,
Твае ложы пуховыя пазакачавала,
Ой, люлі, люлі, пазакачавала.
Твае мёды салодкія пасасмоктавала,
Ой, люлі, люлі, пасасмоктавала.
Вот прыехаў сын Даніла ды да свайго двара,
Ой, люлі, люлі, ды да свайго двара.
А пайшоў сын Даніла да ў новую клець,
Ой, люлі, люлі, да ў новую клець.
А ўзяў жа сын Даніла найвастрэйшы меч,
Ой, люлі, люлі, найвастрэйшы меч,
А зняў жане Кацярыне ён галаву з плеч,
Ой, люлі, люлі, галаву з плеч.
А пайшоў сын Даніла да хазяйства паглядзець,
Ой, люлі, люлі, да хазяйства паглядзець.
Яго коні вараныя пазастоявалі,
Ой, люлі, люлі, пазастоявалі.
Яго сукны зялёныя пазалежавалі,
Ой, люлі, люлі, пазалежавалі.

Яго ложы пуховыя пазапылявалі,
Ой, люлі, люлі, пазапылявалі.
Яго мяды салодкія пазаплесневалі,
Ой, люлі, люлі, пазаплесневалі.
— Вот жа табе, матулечка, тры грахі на цябе,
Ой, люлі, люлі, тры грахі на цябе:
Адзін грэх, матулечка, што дзіця сірата,
Ой, люлі, люлі, што дзіця сірата,
Другі грэх, матулечка, што Кацюшы няма,
Ой, люлі, люлі, што Кацюшы няма,
Трэці грэх, матулечка, што я сам удавец.
Ой, люлі, люлі, што я сам удавец.

Паехаў сынку на Русь жаніцца...

Паехаў сынку на Русь жаніцца,
Забыўся мамцы нізка скланіцца.
Вярніся, сынку, упаўдарожкі,
Скланіся мамцы нізка ў ножкі.
Прыехаў сынку із нявестачкай,
Мамка сыночка пераймала,
Мамка сыночка пераймала,
Зялёным віном частавала.
І нявестачку пераймала,
Горкай атрутай частавала.
Сынок віна не піў, а пад каня выліў,
А горку атрутку папалам дзяліў.
Учора звячора нявестачка сканала,
А сыночак сягоння зрана.
Павязлі сынка на калясніцы,
А нявестку на сляпой кабыліцы.
Сынка схавалі каля цэркаўкі,
А нявестачку ды за цэркаўкай.
На сынку вырас зялёны явар,
А на нявестачцы бела бяроза.
Раслі яны, раслі ды пахіліліся,
Праз цэркаўку сашчапіліся.
Усе людзі дый дзівіліся,
Што на тым свеце пажаніліся.

Жана мужа ды не любіла...

Жана мужа ды не любіла,
Узяла яго й загубіла,
Узяла яго й загубіла,

Ў нову горніцу палажыла.
Прыехалі да два братцы яго.
— Нявехначка, ты лябёдка наша,
Дзе наш да найбольшанькі брат?
— Дзевярочкі, лебядзёчкі мае,
Да паехаў ваш брацейка ў прыём,
Да Бог ведае, ці вернецца ён.
— Нявехначка, ты лябёдка наша,
Яго ж конічак на стаінцы стаіць,
Яго шабелька на кручыку вісіць,
Яго шапачка на століку ляжыць.
— Дзевярочкі ж, лебядзёчкі мае,
Начавалі любы госці ў мяне,
Начавалі любы госці ў мяне,
Ён жа пайшоў любых гасцей правадзіць.
— Нявехначка, ты лябёдка наша,
А што ў цябе за нож на стале,
А што ў цябе за нож на стале,
А што ў цябе за кроў на сцяне?
— Дзевярочкі ж, лебядзёчкі мае,
Начавалі любы госці ў мяне,
Начавалі любы госці ў мяне,
Ды ўлавілі шчуку-рыбіцу мне.
— Нявехначка ж, ты лябёдка наша,
Адамкні нам нову горніцу,
Пакажы ж нам шчуку-рыбіцу.
— Дзевярочкі, лебядзёчкі мае,
Я згубіла залатыя ключы,
Я згубіла залатыя ключы,
Ў чыстым полі ярну пшонку жнучы.
— Нявехначка, ты лябёдка наша,
Да й пойдзем мы к кавалям, майстрам,
Да й пойдзем мы к кавалям, майстрам,
Да скуём мы залатыя ключы.
— Дзевярочкі ж, лебядзёчкі мае,
Ды не куйце залатыя ключы,
Да й скуйце вы войструю меч,
Да й скуйце вы войструю меч,
Да зніміце мне галовачку з плеч.
Не знімайце у суботку позна,
Да зніміце у нядзельку рана:
Будуць людзі да й да цэркаўкі йсці,
Будуць людзі да дзівіціся,
Старым мужам на падзівінне,
Маладым жонкам на пакаянне.

Як у нашым сяле нова новіна...

Як у нашым сяле нова новіна:
Маладая Марусенька нарадзіла сына.
Не ўскарміла, не ўспаіла — у Дунай пусціла.
Маладыя рыбаловы рыбу лавілі,
Не злавілі шчукі-рыбы, злавілі ліня,
Развярнулі, паглядзелі — малое дзіця.
Прынеслі ў цэркаўку, ды у Божы дом,
Загрымелі, зазвінелі у жалобны звон:
— Усе дзевачкі, малодачкі, сабірайцеся,
Да гэтага дзіцятачкі прызнавайцеся,—
Усе дзевачкі, малодачкі сабіраліся,
Да гэтага дзіцятачкі не прызналіся.
Усе дзевачкі, малодачкі ў раду ідуць,
Яны сабе на галоўках вяночкі нясуць.
Адна наша Марусенька ў раду не йдзе,
Яна сабе на галоўцы вянка не нясе.
— Чым жа наша Марусенька занята была,
Чаму сабе на галоўку вянка не звіла?
Як паднялі Марусеньку угару высока,
Як кінулі Марусеньку у Дунай глыбока.
Яшчэ наша Марусенька не ўтанула,
Яна сваю матулечку ўспамянула:
— Ёсць у цябе, матулечка, дачушачак пяць,
Не пускай іх на вулічку — няхай дома спяць.
Ёсць у цябе, матулечка, дачушачкі дзве,
Не давай ім такой волі, як дала ты мне.

Была я ў мамкі адна на раду...

Была я ў мамкі адна на раду,
Аддала мяне мамка замуж за ваду.
Прыказала мне дамоў не хадзіць,
Ля майго акенца сцежак не рабіць.
Жыву я гадочак, жыву я другі,
На трэці гадочак занудзілася,
К мамачцы ў госцікі захацелася.
Як пайду я, малада, ў Дунай па ваду,
Пастаўлю вядзёрачкі на белым ляду.
Як пазычу я ў зязюлькі крылак,
Ў зязюлькі крылак, ў вераб'я пер'яў,
Як палячу я к мамачцы ў госці.
Лугам ляцела — слязьмі заліла,
Борам ляцела — бары сушыла.

Як прыляцела ў мамаччын сад
Ды села-пала на сухім дрэўцу,
Як закую дужа жаласна:
— Гэтаму дрэўцу Бог лісця не даў.
Мне, маладзенькай, Бог долі не даў.
Аж мая мамка па саду ходзіць,
Меншы брацейка за ручку водзіць.
Другі брацейка стрэльбачку нясе,
Стрэльбачку нясе, татку просе:
— Ай, татка, татка, заб'ем зязюльку.
— Ай, сынок, сынок, малады розум,
Гэта ж не зязюлька — мая дачушка,
Мая дачушка, ваша сястрыца.
Калі зязюлька — ляці ў шчыры бор,
Калі сястрыца — ідзі к нам у двор,
Садзіся за стол — будзем частаваць,
Будзем у цябе праўдачку пытаць:
— Ці добра, сястрыца, ў чужой старане?
— Ці смачна, брацец, рэдзька з палыном?
Так мне, маладзе, у чужой старане.
Учора звячора свякратка пабіў,
А ён, пабіўшы, пахваляецца:
Майму татачку наругаецца:
— Як жа добра біць чужое дзіця:
Чужое дзіця не адбіваецца,
Толькі слёзкамі абліваецца.

Сын у мамачкі ночку начаваў...

Сын у мамачкі ночку начаваў,
Ночку начаваў, дзіўны сон сасніў.
Дзіўны сон сасніў, мамачку ўзбудзіў:
— Ай, мамка, мамка, разгадай мой сон:
З-пад правай ручкі выскачыў сакол,
З-пад левай ручкі — шэра зязюлька.
— Ой, сынку, сынку, нядобры твой сон,
Ой, сынку, сынку, едзь хутчэй дамоў.
У цябе ў доме бяда сталася:
Твая жоначка сына радзіла,
Сына радзіла, сама няжыва.
Ехаў ён борам — а бор не шуміць,
Ехаў ён праз сад — а сад не цвіціць.
Прыехаў на двор — сам цівун стаіць.
Увайшоў у сені — цёслы цяслуюць,
Цёслы цяслуюць — труну будуюць.

Увайшоў у святліцу — стаіць ложа.
І стаіць ложа ды засланая,
А ляжыць жана ды прыбраная,
А ў галоўцы стаяць свечачкі,
А ў ножачках — дробны дзетачкі.
Гараць свечачкі, не тухаючы,
Плачуць дзетачкі, прымаўляючы:
— А табе, татка, мамка на вулцы,
А наша, татка, мамачка ў трунцы,
Табе, татачка, мамка ў вяночку,
А наша, татка, мамка ў пясочку.
— Мілая, скажы, што мне рабіці:
Ці мёд-віно піць, ці жаніціся?
— Ты будзеш, мілы, мёд-віно піці,
Твае дзетачкі будуць слёзы ліці.
Ты будзеш, мілы, на куце сядзець,
Твае дзетачкі з-за печы глядзець.

Ой, за гаем, гаем, гаем зеляненькім...

Ой, за гаем, гаем, гаем зеляненькім
Там едзе Ясенько конікам сівенькім.
А ён едзе, едзе, на скрыпаньку грае.
Ідзе яго маці, Яся сустракае.
— Ды пакінь ты, Ясю, на скрыпаньку граці,
А едзь ты дадому жонку караці.
Чаму не б'еш жонку, чаму не караеш,
Часу сваёй жонцы гуляць дазваляеш?
А вазьмі ты, сынку, да сваю нагайку—
Спішы сваю жонку, як чорную галку.
У суботу вячорам камора звінела,
А пад дзень бяленькі міла ўжо змарнела.
— Ах ты, мая маці, парадніца ў хаце,
Навучыла, маці, як жонку караці,
Навучыла, маці, як жонку караці,
Цяпер скажы, маці, дзе яе хаваці.
— Пахавай, сыночку, ў зялёным садочку,
Будзеш хадзіць да яе ды штовечарочку.
У нядзелю рано сонейко не ўсходзіць,
А ўжо наш Ясенько на могілках ходзіць.
Ой, ён ходзіць, ходзіць, да ўсё пахаджае,
Да сваю мілую сюд-тут пабуджае.
— Ды ўставай, мілая, прынёс я гарэлкі.
— Я тае гарэлкі не піла і дзеўкай.

— Уставай, мілая, прынёс табе мёду.
— А я твайго мёду не піла і зроду.
— Уставай, мілая, кароўкі рыкаюць.
— Выпускай цялятак — няхай высысаюць.
— Уставай, мілая, дзяціначка плача.
— Ой, няхай не плача, няхай перастане.
Няхай тое знае, што маці не ўстане.

Дзіцячы фальклор



Фальклор для дзяцей уключае самыя розныя вусна-паэтычныя жанры славеснай і музычнай народнай творчасці — казкі, песні, прыпеўкі, загадкі, калыханкі, забаўлянкі, лічылкі, скорагаворкі, заклічкі, гульні і іншае, складзеныя самімі дзецьмі або дарослымі для дзяцей. У дзіцячы рэпертуар перайшлі і некаторыя творы, складзеныя дарослымі для дарослых. Жанравая разнастайнасць і асаблівасці дзіцячага фальклору абумоўлены функцыяй, якую ён выконвае як сродак разумовага і фізічнага выхавання дзіцяці ў розныя перыяды яго жыцця. Творы дзіцячага фальклору вельмі простыя па форме і змесце і ў іх звычайна прысутнічае элемент займальнасці.

Прынята дзіцячы фальклор дзяліць на некалькі груп: 1) калыханкі; 2) творы, звязаныя з гульнёй; 3) творы, не звязаныя з гульнямі і рухам.

Калыханкі — адзін з самых старадаўніх відаў творчасці, вядомы ўсім народам. Галоўная функцыя калыханак — супакойванне дзіцяці, каб яно хутчэй засынала, таму іх мелодыя плаўная, спакойная, рытм найболей адпавядае рытму гушканняў калыскі, змест песенек часта аблямаваны характэрнымі запевамі і прыпевамі «а-а-а», «люлі-люлі», «лялі-лялі», «баю-баю» і інш.

Будучы старадаўняй творчасцю, калыханкі багата захавалі элементаў язычніцтва, магіі. Прырода ў іх адухоўлена, птушкі, звяры і жывёлы надзелены чалавечымі якасцямі. Часцей за ўсё ў калыханках сустракаюцца вобразы ката, мышкі, куркі, голуба, сарокі, зайкі. Калыханкі надзіва пяшчотныя, у іх багата матчынай ласкі і любові, цеплыні і замілавання дзіцем. У іх адбілася душа маці, цэлая карціна чалавечага жыцця. Гэта песні і аб сне, які малюецца жывой істотай, што ў выглядзе зморанага спадарожніка блукае па хатах, шукаючы прытулку.

У гульнявым дзіцячым фальклоры адпаведна ўзросту дзіцяці можна вылучыць розныя творы. Тыповую групу складаюць забаўлянкі, якімі маці ці бабулькі, перабіраючы пальчыкі ручак і ножак маленькіх, супакойвалі ці пацяшалі іх. Функцыі забаўлянак і калыханак процілеглыя. Забаўлянкі павінны весяліць, забаўляць дзіця, узбуджаць яго, рабіць бадзёрым. Пацешкі выконвалі і вялікую педагагічна-выхаваўчую ролю, прывучалі дзяцей разумець дабро, быць праўдзівымі, добрасумленнымі, працавітымі. Праз забаўлянкі дзеці атрымлівалі першыя ўрокі маральна-этычных паводзін чалавека ў грамадстве, засвойвалі мараль, выпрацаваную народам на працягу стагоддзяў.

Найболей народная педагогіка выявілася ў гульнях-песнях з прыпеўкамі, жараб'ёўкамі, лічылкамі, скорагаворкамі. Песні-гульні развівалі ў дзяцей сілу, спрыт, трапнасць, прывучалі да кемлівасці, увагі, разважлівасці, назіральнасці; яны аб'ядноўвалі дзяцей, выпрацоўваючы ў іх пачуццё сяброўства, таварыскасці, калектывізму і справядлівасці. Песні-гульні мелі велізарнае значэнне ў мастацка-спартыўным выхаванні дзяцей.

Дзіцячыя песні тэматычна вельмі разнастайныя, што абумоўлена іх

функцыяй і паходжаннем. Асабліва вылучаюцца жартоўныя песні і песні-небыліцы, якія ўзыходзяць да фальклору дарослых — песень сацыяльных, сямейна-бытавых, хрэсьбінных, гумарыстычных і сатырычных твораў. Дзівосны свет птушак, жывёл, звяроў, якімі населена жартоўна-сатырычная песнятворчасць, захапляў дзяцей неверагоднасцю падзей, незвычайнасцю паводзін персанажаў. Параўноўваючы, супастаўляючы незвычайнасць ці недарэчнасць паводзін фальклорных персанажаў з акаляючай рэчаіснасцю, дзеці ўцягваюцца ў працэс актыўнага мыслення: самастойна адкрываюць, устанаўліваюць заканамернасці, лагічную сувязь рэчаў, іх рэальны стан.

Творы, не звязаныя з гульнёй, уласна, таксама гульнявыя. Іншая справа, што ў іх увага накіравана не на рухі і дзеянні, а на выяўленне сэнсу, зместу. Характэрнымі для пазагульнявога фальклору з'яўляюцца закліч кі, кароценькія вершыкі, песенькі, прыгаворкі, з якімі дзеці звяртаюцца да сонца, дажджу, вясёлкі, ветру, раслін, жывёл і г. д. У іх, як і ў калыханках, прыкметна захаваліся элементы магіі, сляды язычніцтва.

Скорагаворкі і лічылкі — гэта чыста славесныя гульні. Характэрнай рысай уласна гульняў з'яўляецца тое, што яны цесна звязаны з вытворчай дзейнасцю чалавека і асабліва земляробчай. Класіфікацыя гульняў яшчэ канчаткова не выпрацавана, бо іх можна дзяліць у залежнасці і ад зместу, і ад формы, і ад колькасці ўдзельнікаў. У апошніх працах беларускіх даследчыкаў прапануецца дзяліць дзіцячы фальклор на гульні як мастацка-драматычнае дзеянне і гульні як сродак фізічнага выхавання.

Дзіцячыя гульні — жывая фальклорная з'ява. І раней і зараз яны перажываюць пастаянныя змены (пад уплывам часу, грамадскага і сямейна-бытавога ўкладу), якія адбіваюцца на іх бытаванні, функцыі і змесце.

ЛІТАРАТУРА

Дзіцячы фальклор/Склад. Г. А. Барташэвіч. Мн., 1972.

Барташэвіч Г. А. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору. Мн., 1976.

Беларускі дзіцячы фальклор / Склад. А. М. Аляхновіч, М. В. Рахчэеў. Мн., 1994.

Гілевіч Н. С. Наша родная песня. Мн., 1968. С. 172—178.

КАЛЫХАНКІ

А-а, а-а, каткі два...

А-а, а-а, каткі два,
Шэры, белы — абадва.
Адзін, лысы, ловіць мышы,
Другі, буры, ловіць шчуры.
Адзін пайшоў па капусце,
Носіць Свеце сон у хусце.
Апсік, каток, на кірмаш,
А Светачка спацькі ляж.

Люлі-люлі-люлі...

Люлі-люлі-люлі,
Палез кот па дулі,
Памарозіў лапкі,
Узлез на палаці.
Сталі лапкі грэцца,
Недзе кату дзецца.
Дайце кату папкі
У абея лапкі.
Няхай каток не вурчыць,
А малютка спіць, маўчыць.
Пайшоў каток на вулку,
А ты, дзіця, у люльку.
А я буду калыхаць,
Дзіця будзець спаць.

Пайдзі, коця, на вулку...

Пайдзі, коця, на вулку,
А дзіця у люльку.
На ката варкота,
А на дзіця дрымота.
На ката безгалоўе,
А на дзіця здароўе.
На ката ўсё ліха,
А ты, дзіця, спі ціха.
Ты, коця, не вурчы,
А ты, дзіця, спі-маўчы.

Ах ты, коцік, мой каток...

Ах ты, коцік, мой каток,
У цябе серанькі хвасток.
Прыйдзі ў хату начаваць,
Маю Волечку качаць.
А я табе заплачу:
Дам кусочак піражка
І кушынчык малачка.

Люлі-люлі-люлі...

Люлі-люлі-люлі,
Прыляцелі куры
З вялікае буры.
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Сталі куры сакатаць,
Трэба курам чаго даць.
Ці ячменю жменю,
Ці жыта карыта,
Ці бобу каробу,
Ці гароху троху,
Ці ярыцы паўмяліцы,
Ці грыкі чаравікі,
Ці пшаніцы паўдайніцы,
А дзіцяці — цыцы.

А-а, люлі-люлі-люленькі...

А-а, люлі-люлі-люленькі,
Да ляцелі куранькі.
Да ляціце, куранькі, вон, вон,
Да нясіце хлопчыку сон, сон.
Да ляціце, куркі, на вароты.
Да селі-ўпалі на вароцях
У чырвовенькіх чабоцях.
А-а, баю-баю, баю-баю.

Баю-баю-баінькі...

Баю-баю-баінькі,
Прыбяжалі заінькі.
— Ці спіць ваша дзевачка,
Дзевачка-прыпевачка?
— Ухадзіце, заінькі,
Не мяшайце баінькі.

А-а-а, люлі-люлінькі...

А-а-а, люлі-люлінькі,
Да пабег зайчык у лясочак,
Да знайшоў зайчык паясочак.
Трэба зайчыка паймаці,
Да паясочак адабраці
І хлопчыку аддаці,—
Стане хлопчык спаці.
Да пабег зайчык пад ліпку,
Да знайшоў сабе скрыпку.
Трэба зайчыка паймаці,
Скрыпачку адабраці,—
Стане хлопчык спаці.
Да пабег зайчык пад грушку,
Да знайшоў сабе падушку.
Трэба зайчыка паймаці,
Да падушку адабраці,—
Стане хлопчык спаці.
А-а-а, люлі-люлінькі.

Ой, баю-баю-баю...

Ой, баю-баю-баю,
Не лажыся на краю.
А ты з краю упадзеш
І галоўку разаб'еш.

А-а, а-а, малое...

А-а, а-а, малое,
А налета — другое.
Гэта будзе нянька,
А другое — лялька,
Гэта будзе калыхаць,
А малое будзе спаць.
Гэту будзем малаком,
А другую — кулаком.

Люлі, люлі, ўсе паснулі...

Люлі, люлі, ўсе паснулі,
А сыночак (дачушка) спаць не хоча.
Люлі, люлі, люлі. Люлі, люлі, люлі.
Засынаюць кураняткі
Пад крыламі сваей маткі.
Люлі, люлі, люлі. Люлі, люлі, люлі.
Шэры коцік спіць у куце,
І сабачка спіць у будзе.
Люлі, люлі, люлі. Люлі, люлі, люлі.
А па сенцах ходзіць бай—
Спі, сыночак (дачушка), засыпай!
Люлі, люлі, люлі. Люлі, люлі, люлі.

Ааа, ааа, люлі...

Ааа, ааа, люлі,
Прыляцелі куры,
Селі на варотах
У чырвоных ботах.*

Сталі куркі сакатаць—
Трэба куркам есці даць.
Пасыпім ім грэчкі,
Каб няслі яечкі.
Куры грэчкі не ядуць
І яечак не нясуць.

Сталі куркі сакатаць—
А што куркам есці даць?
Пасыпім гароху,
Хай ядуць патроху.
І гароху не ядуць,
І яечак не нясуць.

Злазьце, куркі, вы з варот
Ды ідзіце у гарод.
Бо (імя дзіцяці) трэба спаць,
А мне яго (яе) калыхаць.
А вы, куркі,— гультаі,
Дык ходзіце па раллі.

* Чатыры першыя радкі служаць запевам да кожнага куплета.

Люляй-люляй, дзіця, спаць...

Люляй, люляй, дзіця, спаць,
Няма каму калыхаць,
А я, маладзенька,
Пагуляць радзенька.

Люлі, малое дзіця...

Люлі, малое дзіця,
Люлі, дарагое.
Бадай жа ты, дзіцятачка,
З калыбелі ўпала,
За табою, дзіцятачка,
Мне гульба прапала.
Мне гульба прапала,
Гуляць волі не стала.

ЗАБАЎЛЯНКІ

Ладу-ладу-ладкі...

Ладу-ладу-ладкі.
— А дзе былі? — У бабкі.
— А што елі? — Кашку.
— А што пілі? — Бражку.

Бабулька казала,
Як нас частавала:
— Прыхадзіце часцей,
Пачастую ляпей:

Дам вам сыраквашкі,
Бярозавай кашкі,
Піражкоў у маку
І розных прысмакаў.

Лады-лады-ладкі...

Лады-лады-ладкі,
Малыя рабяткі
Гарох малаціліі—
Цапы паламілі.
Лады-лады-ладкі!
— Дзе былі? — У бабкі!
— Што елі? — Кашку!
— А што пілі? — Бражку!
Кашка — масляная,
Бражка — смашненькая.
Папілі, паелі—
Дамоў паляцелі,
На вароты селі,
«Ладушкі» запелі.

Лады, лады, ладкі...

Дарослы бярэ ў свае рукі ручкі дзіцяці, лёгенька стукае іх далонькамі адна аб адну і расказвае або спявае.

Лады, лады, ладкі,
Паедзем да бабкі,
Паедзем да бабкі
Па цёплую шапку,
Па новыя боты
Харошай работы,
Па цёпленькі кажушок,
Па кілбаску у мяшок.

Ладачкі, ладачкі,
Паедзем да бабачкі,
Будзем есці кашку,
Будзем піць там бражку,
Бабка наша міла,
Прынясе нам сыра,
Прынясе кілбаскі
І смашнага мяска.
А пасля на ўцеху
Прынясе гарэхаў.
Пасля на дарожку
Прынясе гарошку.
Коніку — саломы,
Каб завёз дадому.

Пайшоў каток пад масток...

Пайшоў каток пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток:
Ці самому есці?
Ці *(імя дзіцяці)* несці?

Пайшоў ён да хаткі,
Памарозіў лапкі,
Памарозіў лапкі,
Палез на палаткі.

Палез бы ён вышай,
Ды баіцца мышай.
А там мышкі дурэлі—
Кату хвосцік аб'елі.

Пачаў коцік плакаць—
Сталі слёзкі капаць.
Не плач, коцік, не вурчы,
Ты *(імя дзіцяці)* спі, маўчы.

Кацюты, кацюты...

Кацюты, кацюты,
Ладушкі-ладкі.
— Дзе былі?
— У бабкі.
— Што рабілі?
— Муку малолі.
— Дзе падзелі?
— Мышкі з'елі.
— Куды паняслі?
— Сюды, сюды, сюды.

Чук-чук, чукавала...

Чук-чук, чукавала,
Пад рэшатам начавала.
Рэшата радзенька,
Дзіцятка маленька.

Кую, кую ножку...

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Куплю чаравічкі
На ножкі вялічкі.
Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
За чатыры мілі
Падковачкі збілі.
Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Дарожка ліхая,
Кабылка кульгае.

Кую, кую ножку...

Той, хто забаўляе, бярэ левай рукой за голую ножку дзіцяці, узнімае яе і, лёгенька стукаючы пальцам правай рукі ў ніз ступні, прыгаворвае:

Кую, кую ножку—
Паедзем ў дарожку,
За чатыры мілі,
Па масла, па сыры.
Дарожка крывая,
Кабылка храмая,
А ножка малая.

А пасля, часцей стукаючы ў ножку:

Туп, туп, туп, туп,
Па-е-ха-лі!

Сарока дзецям кашку варыла...

Дарослы бярэ ў сваю руку ручку дзіцяці, другой рукой па чарзе перабірае пальчыкі і гаворыць:

Сарока дзецям кашку варыла,
На прыпечку студзіла,
Качаргой мяшала,
Памялом давала.
Гэтаму дала, гэтаму дала,
Гэтаму дала і гэтаму дала.
А гэтаму не дала.
Бо гэты мал—
Круп не драў,
Вады не насіў,
Цеста не мясіў—
Тфу, тфу яму ў вочкі,
Пыр, пыр, пыр — паляцелі сарочкі.

Пры апошніх словах дарослы лёгенька махае ручкамі дзіцяці.

Чыкі, чыкі, сарока...

Той, хто забаўляе, бярэ ў сваю левую руку ручку дзіцяці і трымае яе далонькай уверх. Пальцам сваёй правай рукі стукае ў далоньку дзіцяці і расказвае:

Чыкі, чыкі, сарока
Прыляцела здалёка,
Села ў пана на таку,
Мяле крупы на муку.
А пан кажа: «Засяку!
Ў мяне шабля пры баку».
«Хоць і шабля пры баку,
Ад цябе я уцяку!»

Пры апошніх словах дарослы лёгенька ўзмахвае ручкамі дзяцяці і кажа «Па-ля-це-ла!»

Мышка, мышка, дзе была...

— Мышка, мышка, дзе была?
— Была ў пана караля.
— Што рабіла? — Лыжкі мыла.
— А што далі? — Кусок сала.
— Дзе паклала? — Пад лаўкаю.
— Чым накрыла? — Халяўкаю.
— Дзе падзела? — Кошка з'ела.

Ішоў бай па сцяне...

Ішоў бай па сцяне
У чырвоным жупане.
Ці баіць, ці не? — Баіць.
— І ты кажаш — баіць,
І я кажу — баіць.

Ішоў бай па сцяне,
Насіў лапці ў кішане,
Ці баіць, ці не? — Не.
— І ты кажаш — не,
І я кажу — не.

Ідзе бай па сцяне...

Байка для дзяцей, якія безупынна просяць, каб ім расказвалі байкі

Ідзе бай па сцяне, у чырвоным каптане,
Сямёра лапцяў пляце, крывую нагу валачэ,
Баіць ці не? — Бай.— І ты кажаш: бай, і я кажу: бай.
Ідзе бай па сцяне, у чырвоным каптане і г. д.
Баіць ці не? — Не.— І ты кажаш: не, і я кажу: не.
Ідзе бай па сцяне і г. д.

У большасці выпадкаў пасля некалькіх паўтораў дзеці пакідаюць баюна ў спакоі і ідуць гуляць са сваімі цацкамі.

ПЕСНІ

Пайшоў конік да вады...

Пайшоў конік да вады,—
Шаўковыя павады,
Вады не напіўся.
— Чаму не напіўся?
— Калодзіцы няма.
— А дзе тая калодзіца?
— Чэрві патачылі.
— А дзе тыя чэрві.
— Куры паклявалі.
— А дзе ж тыя куры?
— Каршуны падралі.
— А дзе тыя каршуны?
— У поле паляцелі.
— А дзе тое поле?
— Кветкамі зарасло.
— А дзе тыя кветкі?
— Дзеўкі пашчыпалі.
— А дзе тыя дзеўкі?
— Панічы пабралі.
— А дзе тыя панічы?
— Пайшлі на вайну.
— А дзе тая вайна?
— Пасярод гумна.

Зайчык маленькі...

— Зайчык маленькі,
Чым ты жывенькі?
— Я і сам дзіўлюся,
Чым я жыўлюся.
Пасадзіў капусту
Ні рэдка, ні густа.
Пайду я рана,—
Капуста парвана,
Пайду я позна,—
У капусце росна.

А шэрая козанька...

А шэрая козанька,
Тапу-тапу скоранька,
Пераскочыла праз плот
Ды пабегла ўвагарод.
Аб'елася цыбуліцы,—
Крычыць, бяжыць па вуліцы;
Аб'елася часнаку,—
Крычыць, бяжыць па таку.

ЗАКЛІЧКІ, ПРЫГАВОРКІ

Сонейка, сонца...

Сонейка, сонца,
Выгляні ў аконца,
Пасвяці нам трошку,
Дам табе гарошку.

Дожджык, дожджык, секані...

Дожджык, дожджык, секані,
Я паеду на кані.
Дожджык, дожджык, перастань,
Я паеду на Растань.

Дожджык, дожджык, крапані...

Дожджык, дожджык, крапані,
Бабу з поля прагані.

Не йдзі, не йдзі, дожджыку...

Не йдзі, не йдзі, дожджыку,
Звару табе боршчыку.

Ай, люлі-люлі,
Люленькі-люлі.

Пастаўлю пад лаўкаю,
Накрыю лапаткаю.

Пастаўлю пад сенцамі,
Накрыю паленцамі.

Пастаўлю пад елкаю,
Накрыю талеркаю.

Талерачка здымецца,
А дожджык унімецца.

Гары, гары жарка...

Гары, гары жарка,
Прыедзе кухарка.
Кухарка — на карове,
Кухар — на кабыле,
Дзеці — на цялятах,
Слугі — на шчанятах.

Калода, калода...

Калода, калода,
Калі будзе пагода?
Як цяпер, то ляці,
Як у чацвер, то сядзі.

Слімак, слімак...

Слімак, слімак,
Выпусць рожкі,
Дам мукі
На пірожкі.

Калека, калека...

Калека, калека,
Нагрэй чалавека!
Калі не нагрэеш,—
Сама акалееш.

Каза, каза, дай малака...

Каза, каза, дай малака!
Казёл, казёл, дай дзёгця!

Жылі-былі мужыкі...

Жылі-былі мужыкі,
Бралі грыбы рыжыкі.

Да вілася пчолачка...

Да вілася пчолачка,
Пчолачка, пчолачка
У вяршэчку сосанкі,
Сосанкі, сосанкі.

Ехала ікаўка...

Ехала ікаўка
На сівой кабыле.
Кабыла пала,
Ікаўка прапала.

ДРАЖНІЛКІ

Мі-кі-та! Ці ты та?..

— Мі-кі-та! Ці ты та?
— Не я то, мой та-та.
Мікіціха дзяжу месіць,
А Мікіта спіну чэшыць.
Мікіта дровы сячэць,
А Мікіціха бліны пячэць.
Сячэць дровы яловыя,
Пячэць бліны паловыя.
Касы заяц нанёс яец,
Вывеў дзяцей — касых чарцей.

Наталля — пралля...

Наталля — пралля,
Кузьма-вераценнік.
Пайшоў у бярэзнік,
Сабакі дагналі,
Нагу адарвалі.

Дзілінь-дзілінь-баў...

Дзілінь-дзілінь-баў!
Саўка прапаў!
Палажылі Саўку
На белую лаўку.
Лаўка трасецца,
Саўка смяецца.
Курачка сакоча—
Савачка рагоча.
Дзілінь-дзілінь-баў!
Саўка прапаў!

Віця, Віця, Віцяля...

Віця, Віця, Віцяля,
З'еў карову і цяля
І дванаццаць парасят,
Толькі хвосцікі вісяць.

Сяргей-верабей...

Сяргей-верабей
На кані катаўся,
Рукі, ногі паламаў,
Без штаноў застаўся.

ЛІЧЫЛКІ

Раз, два, тры, чатыры...

Раз, два, тры, чатыры,
Кошку грамаце вучылі:
Не чытаць, не пісаць,
А за мышкамі скакаць.

Раз, два — булава...

Раз, два — булава,
Тры, чатыры — прычапілі,
Пяць, шэсць — кашу есць,
Сем, восем — сена косім,
Дзевяць, дзесяць — сена весіць.

Раз, два, тры, чатыры...

Раз, два, тры, чатыры,
Пяць, шэсць, сем, восем,
Выйшла баба з доўгім носам,
А за бабай сівы дзед,
Запытываець, колькі табе лет.

Сядзіць немец на паліцы...

Сядзіць немец на паліцы,
Лічыць дзеці на вуліцы:
Айн, цвай, драй—
Міша, вылятай.

Сядзіць зайчык на прыпечку...

Сядзіць зайчык на прыпечку,
Лічыць дзеці па-нямецку:
— Сцяпан, Лявон,
Выйдзі з хаты вон.

Первенчыкі...

Первенчыкі,
Другенчыкі,
Кругі,
Другі,
Вон!
Дружэньчыкі,
Бярвеньчыкі,
Я шышаў,
А ты выйшаў.

Сем семярэй...

Сем семярэй
І сямёра свіней.
Свінка і свінчын брат
І сямёра парасят.

Саломінка

Саломінка, Ляцела.
Яромінка Касцюк,
Прэла, Масцюк,
Гарэла, Радзівон,
На мора Пайдзі вон.

Чыкі-чыкі-чыкарок...

Чыкі-чыкі-чыкарок,
Паня, Фёдар-Федарок.
Тлела, гарэла, замуж хацела.
Чырык, башмак,
Барада, лаві.

Цок-цыгірок...

Цок-цыгірок,
Пана фіда-футарок.

Прэла, гарэла,
Замуж ляцела.
Вусь, барадусь,
Кіслы квас,
Лаві нас!

Кацілася торба...

Кацілася торба
З вялікага горба.
А ў той торбе
Хлеб, паляніца.
З кім ты хочаш
Падзяліцца?

Эна, бэна, рэсь...

Эна, бэна, рэсь,
Кэнтар, мэнтар, жэсь,
Эна, бэна, раба,
Кэнтар, мэнтар, жаба.

Э-ката, пэ-ката, мэ...

Э-ката, пэ-ката, мэ,
Абель, дабель, далінэ,
Ікі, пікі, гамацікі,
Клёнц, бонц, заёнц.

А ты, коцік, не гуляй...

А ты, коцік, не гуляй,
Начовачкі прыбірай!
Начовачкі слізкі,
Вядзёрачкі блізкі.
Круг абарваўся,
А ты так астаўся.

ГУЛЬНІ

Палачка-шукалачка

Збіраецца група дзяцей. Выбіраюць аднаго, які будзе ўсіх шукаць (шукальнічак). Рэшта хаваюцца хто куды. Калі ўсе

схаваюцца, шукальнічак на ўмоўленым месцы стукае палачкай і голасна гаворыць:

Палачка-шукалачка,
Я йду шукаць.
Каго я першага знайду,
Таго за палачкай пашлю!

Каго першага знаходзяць, той пасля таго, як усе знойдзены, становіцца на месца шукальнічка.

Гарлачыкі

Збіраюцца дзеці і садзяцца кружком. Выбіраюцца дзеючыя асобы: матка, дачка і кот. Матка ідзе ў поле жаць, а дачка пільнуе ад ката гарлачыкі (гаршчэчкі). Кот падкрадваецца і куляе ўсе гарлачыкі. Прыходзіць дадому матка, бачыць перакуленыя гарлачыкі і гаворыць:

— Божа мой, хто гэта пабараціў гарлачыкі? А знаць жа, гэта прыходзіў кот?

Потым матка лае дачку:

— А ты куды глядзела, куды глядзела?

І б'е дачку. Гульня працягваецца такім чынам да трох разоў. Матка ідзе ў поле, кот куляе гарлачыкі, а матка карае дачку. За трэцім разам матка кідаецца шукаць ката, які уцякае. Матка, дагнаўшы ката, карае яго для віду.

У яркі

Для гульні расчышчаюць гладкую пляцоўку і на ёй робяць пяткамі невялічкія ямачкі, якія і называюцца яркамі. Яркі размяшчаюцца ў адзін рад, столькі, колькі ўдзельнікаў. На адлегласці трох крокаў ад ярак праводзіцца «агонь» — лінія. Потым кожны па чарзе павольна коціць па ярках мячык. Як толькі мячык упадзе ў чыю-небудзь ярку, усе стрымгалоў кідаюцца бегчы ад іх. Гаспадар яркі хапае з яе мячык, падбягае да агню і стараецца «застукаць» каго-небудзь мячыкам.

Каго застукае, таму залічваецца ярка; у адваротным выпадку ярка лічыцца таму, хто кідаў мячык. Калі такіх штрафаў збярэцца столькі, колькі ярак у радзе, тады штрафнога ставяць тварам да сценкі і караюць яго ўдарамі па спіне кулакамі, канешне, не моцнымі, пад такт песні:

Ярка, палка!
Каралёва жонка!

Лезь на палаці,
Стань казыраці,
Будзем у карты граці,
І вечара дажыдаці.

Б'юць мацней і разбягаюцца. Калі прайграўшы каго-небудзь зловіць, гульня пачынаецца зноў з самага пачатку.

У пераскочкі

Удзельнікі гульні здымаюць шапкі і кладуць іх адна на другую слупком. Потым у тым жа парадку, як складзены шапкі, пачынаюць скакаць цераз іх, каб не зачапіць шапак нагамі. Калі хто-небудзь зачэпіць шапкі, яго гоняць «скрозь строй». Робіцца гэта так. Усе становяцца адзін за другім і шырока расстаўляюць ногі, а вінаваты паўзе ў іх пад нагамі. Яго ў гэты час б'юць шапкамі.

У каваля

Выбіраюць з удзельнікаў гульні каваля. Каваль мае скручаную пытку з хусткі або ручніка. На лаве пад шапкай ці яшчэ пад чым хавае якую-небудзь рэч, напрыклад арэх, цыбуліну, гарошыну і г. д. Да каваля падыходзяць па чарзе дзеці і адгадваюць, што схавана. Хто не адгадае ад першага разу, таго каваль б'е пыткай. Так праходзяць усе ўдзельнікі гульні. Калі ніхто з удзельнікаў не адгадае, які прадмет схаваны, тады ўсе б'юць каваля.

У казу

У казу гуляюць галоўным чынам у полі, у час пасьбы коней — «кала коней». Перш за ўсё выбіраюць пастуха. Робіцца гэта так: шырока расстаўляюць ногі і, схіліўшыся, кідаюць праз іх шапкі назад ад сябе. Чыя шапка ўпадзе бліжэй, той і павінен пасвіць коз. Тады ўдзельнікі ўбіваюць у зямлю слупок, прывязваюць да яго аброць з повадам і даюць пастуху канец повада ў рукі. На такой адлегласці павінен пастух знаходзіцца ад слупка. Потым удзельнікі складваюць ля слупка свае шапкі, якія называюцца козамі.

Пастух бярэ ў рукі дубец або пугу і пасе козы, гэта значыць стараецца не дапусціць, каб нехта падбег да слупка і ўхапіў сваю шапку. Калі ж удасца ўхапіць тры казы (шапкі), пастуха гоняць скрозь строй. Усе ўдзельнікі зноў шырока расстаўляюць ногі, а пастух павінен на карачках бегчы паміж імі. Пры гэтым яго б'юць шапкамі.

Прарок

Гульцы выбіраюць паміж сябе прарока і садзяць яго пасярод хаты на ўслоне; тады прароку накрываюць хусткай галаву і ўсе, пабраўшыся за рукі, ходзяць наўкола яго. Па чарзе кожны з гуляючых кладзе руку на галаву прарока, а яшчэ абыхто выбраны з чарады, калі пакладзе на галаву прарока руку хлапец, кажа «Адам», а калі пакладзе дзяўчына, то кажа «Ева». Тады прарок вяшчуе, што спаткае ў жыцці: аднаму кажа, што будзе багатым, другому, што будзе ўсё жыццё плакаць і г. д.

У гэтай гульні, калі прарок умее добра жартаваць, бывае шмат смеху, весялосці.

У чыжыка

Гуляюць двое, абодва з палкамі, якія называюцца лаптою. Акрамя таго, робяць яшчэ кароценькую палачку, у чвэрць аршына, і завастраюць у яе канцы. Гэта палачка завецца чыжыкам. Затым на зямлі чэрцяць круг або квадрат і адзін з ігракоў, каму прыйдзецца верх на палцы, становіцца з чыжыкам у круг, а другі ідзе ў поле. У кругу чыжык кладзецца на зямлю, ігрок б'е лаптой па востраму канцу яго, і чыжык падскоквае ўверх. У гэты час ігрок павінен ударыць яго так, каб ён паляцеў далёка ў поле. Калі ігрок прымусіць чыжык падскокнуць тры разы і не здолее загнаць яго ў поле, ён прайграў і сам ідзе з круга ў поле, а на яго месца становіцца палявы. Калі ж ён выганіць чыжыка ў поле, палявы павінен пераняць яго на ляту сваёй лаптой. Тады ён ідзе ў круг. Калі ж гэта яму не ўдасца і чыжык упадзе на зямлю, тады ён паднімае яго з зямлі і кідае ў круг. Калі пападзе, сам ідзе ў круг і выбівае чыжыка ў поле.

Дагаворваюцца звычайна на 50 удараў. Хто першы выканае такі лік, ён мае права прымусіць прайграўшага праскакаць на адной назе адлеглась ад поля да мяжы столькі разоў, колькі не выканана ім удараў.

Народны тэатр



Народны тэатр — адметная з'ява ў традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў. Яго вытокі — у глыбокай старажытнасці і звязаны ён з першымі спробамі чалавека да пераўвасаблення. У аснове народнага тэатра, як і ва ўсёй вусна-паэтычнай творчасці, ляжыць працоўная дзейнасць чалавека.

Народны тэатр адыграў вялікую ролю ў гісторыі культуры беларускага народа, бо з'явіўся папярэднікам прафесійнага тэатральнага мастацтва. Гісторыкі народнага тэатра вылучаюць тры асноўныя складаемыя: абрадавыя ігрышчы, народныя драматычныя гульні і ўласна народную драму.

На глебе народнай драматургічнай творчасці ўзнікла інтэрмедыя да школьнай драмы. Інтэрмедыі, не будучы пераважна звязанымі з тэкстам твора, адыгрывалі асаблівую ролю — з'яўляліся ўстаўкамі пацешнага зместу, напісанымі каларытнай народнай мовай. Характэрная асаблівасць інтэрмедыі ў тым, што яе галоўным персанажам быў просты чалавек, выхадзец з народа, часта — селянін.

Асобае месца ў гісторыі народнага тэатральнага мастацтва займае батлейка — тэатр лялек, вядомы на Беларусі з XVI ст. Зараз у жывым бытаванні сустракаецца рэдка.

Першапачатковыя паказы батлейкі насілі чыста рэлігійны характар. Пазней, калі яна адышла ад уплыву царквы, рэлігійна-біблейскі змест амаль знікае. Галоўнымі ў паказах становяцца сцэны з гарадскога і сельскага жыцця. Многія беларускія варыянты батлеечных прадстаўленняў насычаны рознымі бытавымі сцэнамі з народнымі песнямі, прыпеўкамі, музыкай, танцамі, анекдотамі, жартамі. Гэта дэмакратызавала прадстаўленні, «абміршчала», надавала ім свецкі характар. Асаблівую ролю ў беларускай батлейцы адыгрывалі сацыяльна завостраныя сцэны, накіраваныя супраць прыгнятальнікаў.

Прадстаўленне складалася з дзвюх частак. Першая — паказ біблейскага эпізоду, звязанага з нараджэннем Хрыста. Другая — жартоўна-сатырычныя сцэны з народнага жыцця, у якіх удзельнічаў звычайна беларускі мужык Мацей з жонкай, казак, шляхціц, яўрэй, цыган, доктар і інш. Папярэднічала гэтай частцы, як правіла, драма «Цар Ірад». З пачатку XX ст. некаторыя сцэны, напрыклад Мацей і доктар, выконвалі не толькі лялькі, але і людзі. Такое прадстаўленне вядома пад назвай «батлеі». У гэты час асаблівую цікавасць праяўляла да батлейкі гарадская і вясковая інтэлігенцыя, якая і апрацоўвала тэксты ў адпаведнасці са сваім светапоглядам.

Народныя драмы «Цар Максіміліян» (яе яшчэ называюць «Цар Мамай»), «Лодка» прыйшлі ў беларускі фальклор з рускай народнай творчасці. Іх прынеслі ў Беларусь салдаты, што адбывалі царскую службу, рамеснікі, сяляне-адыходнікі. «Цар Максіміліян» — сапраўды народная драма, у якой спалучаны элементы літаратурнай творчасці і традыцыйнага народнага драматычнага дзейства.

Аснову канфлікту складаюць адносіны паміж царом Максіміліянам (язычнікам) і яго непакорным сынам Адольфам (хрысціянінам). Цар патрабуе ад сына вырачыся сваёй веры і пакланіцца «кумірскім багам». Пратэст супраць дэспата-бацькі знаходзіў водгук у сэрцы народнага гледача, для якога драма на сцэне асацыравалася з барацьбой супраць прыгнятальнікаў — духоўных і сацыяльных.

ЛІТАРАТУРА

Народны тэатр/Уклад., уступ. арт. і камент. М. А. Каладзінскага. Мн., 1983.

Барышаў Г. І., Саннікаў А. К. Беларускі народны тэатр батлейка. Мн., 1962.

Усікаў Я. К. Беларуская камедыя: Ля вытокаў жанру. Мн., 1964.

Селянін і студэнт

Дзеючыя асобы: Селянін, Студэнт

Селянін

Ахце мне ж! Людзей, людзей, як вады! Але там рабята-жэўжыкі, віхер іх носіць, круцяцца; гэто кажуць, што іх на пагулянку раз у год пушчаюць. Там жа ні ладу ні парадку: адзін другога піхіць носэм на зямлю, у чубкі, на кулачкі, як запалюць. Ах, дарога, дарога праклятая, самые пекелішкі, утаміўся, як сабака, пашанаваўшы ясного сонейка, красного месечка і вас паноў. Прысяду троху. Маспанове, ат на пацеху вашую і сваю прызнаюся вам, што ёсць у мене дома Баўтрук-баструк, да жальця Божа, што мужыком урадзіўся; такая прашкуда прамысльная, да бакіламара, як на пірагі з масліч-кам напіраецца; калі б гэта розум на няго набыць, парушыў бы я сваю машну, а цяпер, як гэтыя жэўжыкі разлезуцца, і за гразь яго мог бы дастаць.

Студэнт

А ты, мужык, цо ту маш за справэн?

Селянін

Не музык, маспане, ані дудар, парою ў кулак затрублю, калі дзеткі ў хаце зубамі звоняць.

Студэнт

Але цо ты маш за справэн?

Селянін

Не, маспане, непісьменны чалавек, правоваца не ўмею, а хаць бы пасварыўся з суседамі, то зараз ураднік рассудзіць справу пастронкам.

Студэнт

Чы маш яго потшэбэ?

Селянін

Куды, мой ты салавейку, натрэбы, я і кутыша не маю, дабро каб світка была на хрыбце.

Студэнт

Глупі хлоп, як целен.

Селянін

Было адно целятко і тое здохло.

Студэнт

Дышкуруе як гроху сен об'ядшы.

Селянін

У мяне, панічу, дзяцей, як бобу, а гароху і асмінкі нету.

Студэнт

Дармо, як відзэн, грох на сцянэн жуцам.

Селянін

І ты, маспане, вельмі шуміш, гарох у гаршчок, не на сцену кідай.

Студэнт

Хлоп розуму і за шэлонг нема.

Селянін

Да такі ў мене барада, як лес, а розуму бы не было, а гэто знаеш, мой лебедзю, што кажуць: калі б на панскую мудросць не мужыцкая хітросць, даўно б мужыкі пагіблі. Да маю сынка жэўжыка, такі, як парасятко свавольнае.

Студэнт

Тэраз як просе звычайне, а як выросне бэндзе з него свіня.

Селянін

Да ну, маспане, і паліцікі не ўмееш.

Студэнт

Мней шаж ото, цож з тэго, жэ маш сына?

Селянін

Я й хацеў бы для няго розуму больш вытаргаваць, чы не будзеце даражыцца?

Студэнт

Мой мужу, вы часэм за квартэ гожалкі розум пшэдаеце, а за цо сен мы мамы дрожыць; достанеш у мне за біты таляр достаткем, только в цож вазьмеш?

Селянін

Кажуць, маспане, што розум да галавы ідзець; то гэто ты, вашэць, мне ў ухо накладзі, а я сынку свайму ў дома ўсё вытрасу.

Студэнт

Добжэ і так, тылько чы поймеш ты сам?

Селянін

І паймаю, маспане, не ўцячэць, не.

Студэнт

Слухай жа.

Селянін

Што, што? З вербы цэпы новые? Не, мой галубчыку, з вербы лядашчо цэпы. Учы чаго іншого. Паруш і розуму лацінского.

Студэнт

Чы не хцэш быць матэматікус?

Селянін

Гэто, гэто матаць на ус; гавары больш.

Студэнт

Добжэ, сон там.

Селянін

Што, што? Дзве карбоны цэлые! Не маю, бачыш, ні адной цэлэй, вытраслі ўраднікі.

Студэнт

Не разумеш і тэго.

Селянін

І разумею, маспане, калі цэлые карбоны, а калі не цэлые.

Студэнт

Пойдземы до Лоікі, тылько мовен, жэ там цаліго спіноса.

Селянін

Згінь, прападзі з розумам, нехай ідзець калом у землю, не хачу, не хачу, паня шпектар.

Студэнт

Але не розумеш. Я мовен цаліго спіноса.

Селянін

Да знаю, што кажэш — калом па спіне — шуплю. А тое, куды ты, вашэць, круціш, не хачу.

Студэнт

Отож дойдзіш з нім справы. Я мовен цаліго спіноса, а он мові колэм по спіне.

Селянін

Годзе, годзе таго, вельмі пераўчуся.

Студэнт

Почэкай, хлопе, тшэба ці вбіць і то добжэ в гловэн, жэбы не выпадло, тшэба ці даць по уху.

Селянін

Не важся, зараз розумам назад аддам.

Студэнт

Оддай жэ таляр біты, якось обецал.

Селянін

І не, маспане. Я ад цябе ж наўчыўся, што карбоны не цэлые, а до таго ведаеш, панятко, што глупі даець, а мудры бярэць, а я цяпер маю розуму з тваей наукі; не дам, не дам ні шэляга.

Студэнт

Як хлопе? Быце забіто, давай таляр біты.

Селянін

Пастой, той спадару, што таляра не маю, а бітого, калі хочэш, вазьмі па хрыбце.

Студэнт

Згінь, пшэпадзі з такон заплатон!

Селянін

Верніся, панятко, не добрэ прыбіў, пастой, пажджы! Не заплаціў саўсім.

Апісанне батлеечнага прадстаўлення, якое адбывалася ў Рэчыцы, Мозыры, Капаткевічах і Парычах

Прыйшоўшы ў дом гаспадара перад пачаткам прадстаўлення, адзін з больш спрытных і практычных хлопцаў-удзельнікаў хаджэння з вяртэпам садзіцца ззаду яго і аб'яўляе, што пачынаецца прадстаўленне з Новага Запавету аб нараджэнні Спасіцеля. Прадстаўленне адбываецца ў верхнім ярусе вяртэпа. Спачатку з'яўляюцца два мужыкі (пастухі віфлеемскія) і кланяюцца нованароджанаму дзіцяці ў пояс і, павярнуўшыся да гледачоў, гавораць: «Мы — пастухі віфлеемскія, знаходзіліся сію ноч на стражы, паслі свой скот; вдруг пры бальшой цемнаце асіяў нас неабыкнавенны свет. Мы іспугаліся, но анёл Гасподзен сказаў нам: «Не пугайцеся! Гэта радзіўся цар славы; вы ідзіце і пакланіцеся яму; ён у Віфлееме». Множаства анёлаў увідалі паюшчых: «Слава ў вышніх Богу...» Гэта царкоўная песня выконваецца хорам пеўчых пры вярцепе.

Пасля заканчэння спеваў «Слава ў вышніх Богу...» пастухі выходзяць. Прыходзяць вешчуны, цары персідскія, кланяюцца нованароджанаму дзіцяці і прыносяць падарункі. Потым яны звяртаюцца да народа са словамі: «Мы валхвы, цары персідскія — з далёкіх стран, не пажалелі сваіх царскіх трудоў і прыйшлі пакланіцца нованароджанаму младзенцу; мы гэта ўзналі па звяздзе на вастоку, каторая нам сапуцтвавала». (Пры гэтых словах спяваецца царкоўная песня: «Волхвы, цари персидския, познаша яве на земли рожденного царя небесного...») Вешчуны кланяюцца і выходзяць. Пасля заканчэння ўсяго гэтага пачынаецца прадстаўленне ў ніжнім ярусе вярцепа аб Ірадзе. Свечка пераносіцца з верхняга ярусу ў ніжні. Павольна паказваецца з-за фіранкі адзін з цароў, які садзіцца на трон, і тут падбягае да яго воін і пытаецца: «Што прыкажаце, ваша вялічаства?» (Цар прыказвае паклікаць граданачальніка. Воін адразу выходзіць. Уваходзіць граданачальнік.) «Што слышна ў нас?» — пытаецца цар.— «Нічога

асобеннага, ваша вялічаства!» — «Як жа нічога! Нарадзіўся новы цар, і я, апасаючыся, штобы ён не заўладзеў маім царствам, павеляваю ўбіць усіх нованароджаных младзенцаў мужскога пола».

Праз дзве-тры секунды ўваходзіць воін з дакладам, што дзяцей усіх забілі, плача адна Рахіль і просіць аб памілаванні адзінага сына, што застаўся ў жывых. Воін адпраўляецца за заслону і прадстаўляе жанчыну, якая плача і просіць злітавацца. «Ваша вялічаства,— просіць жанчына,— я паручаю вам свайго сына, вазьміце яго ў сваі палаты, не васпітывайце, толькі ліш бы ён быў жыў».— «Да,— адказвае цар,— былі случаі, знаем ужо: і фараон кагда-то васпітываў Маісея, а ён потым лішыў яго царства». (Жанчына выходзіць з жаласнай песняй. Хор пеўчых спявае.)

О, Ірадзе ты праклятый!*
Не пашчадзіў ты ў Віфлееме
Ні адзінага дзіцяці;
Ты хацеў убіць Марыіна сына,
Нашто цябе сатана ўскусіў.
Но Божая сіла
Да сяго не дапусціла;
Ты ўбіць Хрыста рашыўся,
А Іосіф з Марыяю
У Егіпет удаліўся.
О, Ірадзе ты праклятый!
Ты яшчэ на свет божы не радзіўся.
У тваім сэрцы сатана пасяліўся.
О, Ірадзе ты праклятый!

(Ірад сыходзіць з трону; уваходзіць яўрэй Бэрка, у старым сваім нацыянальным адзенні, разглядае палацы Ірада, звяртаецца да гледача са словамі: «Ві знаеце, гаспада, сто тут цар зыў, а ціпер уз я купіў гэтыя палацы, а сам цар узэ памьёр, гэта яго Бог скараў, сто ён насых целых цатырнаццаць тысяч дзетацак перабіў. Я думаю,— працягвае яўрэй,— у гэтым палацы аткрыць тракцір: от тут бацонацак пастаўлю, а тут крэсялька». Потым сам садзіўся на трон і пачынаў танцаваць ад радасці. У хуткім часе з'яўляецца мужык і звяртаецца да гледача са словамі: «Вы не знаеце, гаспада, майго гора. Я ж як наеўся куцці, так ні магу і пайсці: от я ўжо ішоў у волась ік хвершалу, аж едзе валасны пісар, пытаецца ў мяне: «Куды ты едзеш, Змітро?» — У воласць ік хвершалу: баліць, паночак, вельмі мой жываточак. Я ж учора як наеўся куцці, дак не магу пайсці». А пісар кажа: «Хвэршала цяперака няма; ты лепей ідзі ік Бэрку і выпі гарэлкі чвэртку, укінуўшы дроб канхво-

* Прыпеў паўтараецца двойчы.

ры, так не будзеш хворы». Нарэшце мужык звяртаецца да яўрэя: «А, здароў, Бэрка, ну — але ж у цябе і палацы, і чаго ж тут у цябе няма! Аднаго толькі бацькі з мацяраю тут нямашака! Дай жа мне гарэлкі чарку выпіць!» — «Давай зэ гросы!» — «Да я ж ня ўзяў з сабою з дому».— «Цагоз ты ісоў, на веру думаес? Ісцэ я толькі пацын раблю, а ён узэ... музык, трасца яго матары, прысоў і дай яму на веры: прынёс бі цаго мерацку!» — «Пагадзі ж ты, пракляты.., я ж табе наслю, я табе ізраблю, што цябе чорт ухваціць». Мужык выходзіць. «Так п'яніца ўсё страсцае: я табе наслю! Дзе ві баціл, гаспада, той цорт, дзе ён ес на свеці, хто гэта даказэ!» У гэтую мінуту з'яўляецца чорт, вельмі страшны з выгляду, на ім адзенне з тхаровага меху, твар чорны, з хвастом, на галаве рогі. Чорт хапае Бэрку і нясе з сабой; Бэрка крычыць: «Гвалт!» Гледачы смяюцца. У канцы ўсяго прыходзіць яўрэйка, жонка Бэркі, звяртаецца да гледачоў з пытаннем: «Цы не бацылі мая Бэра?» — «Яго ж чорт ухваціў»,— гаворыць той, хто выконваў увесь час славесныя ролі дзеючых асоб.)

Апісанне батлеечнага прадстаўлення ў былой Мінскай губерні

Яшчэ пры цары, калі мы былі малыя, прыязджаў да нас Тумаш з-пад Мсціжа і паказваў лялькі. Помню я, што адну ляльку называлі Ульяна. Лялькі гэтыя ён паказваў са скрыні, у якой было два палы: верхні і ніжні. Спачатку пакажа ў ніжнім, а затым — у верхнім. У скрыні было выразана акенца, каб людзі глядзелі. Перад прадстаўленнем сабіраў грошы, або яйкі ці сала. Людзей ішло вельмі многа, як цяпер у кіно ідуць. Запомнілася мне, як аднойчы паказваў бабу. Баба таўкла масла. Затым падбягае мужык, і таўкуць удвух. Затым падбягае чорт, і так ужо таўкуць, што ўсё разлятаецца. Помню яшчэ, выязджалі на конях гусары і рубалі адзін аднаго. У аднаго адлятала галава і кацілася па полу, затым вылазіла змяя і адцягвала мёртвага.

Яшчэ помню, што мужык прыбягаў да бабы, якая таўкла масла, і не памагаў таўчы, а пачынаў сварыцца. Тады прыбягаў чорт і пачынаў іх мірыць. У той час, калі Тумаш паказваў лялькі, яго сын граў на скрыпцы. Быў з імі чалавек, які граў на цымбалах.

Перад прадстаўленнем Тумаш казаў: «Зараз пакажу вам батлейчыкаў». Жонка Тумаша была з нашай вёскі. Гэта Тарасевіч Ульяна Дзям'янаўна. У нашай вёсцы дзеці называлі Тумаша «слепчык», і заўсёды, калі ён прыязджаў, дзеці крычалі: «Прыехаў «слепчык» — прывёз батлейчык».

Цар Ірад

Вярцеп быў двух'ярусны; верхні паверх уяўляў пячору нараджэння Хрыстова. У ніжнім ярусе адбываліся зямныя дзеянні, пачынаючы з паяўлення Ірада. Ірад сядзіць на троне: да яго з'яўляюцца тры вешчуны. Ён загадвае ім на адваротным шляху з Віфлеема прыйсці да яго і расказаць падрабязна аб нараджэнні Спасіцеля. Ірад дарэмна чакае вешчуноў.

Ірад *(звяртаецца да свайго воіна)*

Воін мой, воін,
Воін вааружонны,
Стань перада мною,
Як ліст перад травою,
І слушай мае прыказання.

Воін *(уваходзіць)*

О, грозны цар Ірад!
Пашто свайго вернага воіна прызываешы
І якія грозныя прыказы павеляваешы?

Ірад

Пайдзі ў Віфлеем
І ізбей усіх младзенцаў
Ад двух лет і ніжа.

Воін *(выходзіць і вяртаецца зноў)*

О, грозны цар Ірад!
Па твайму прыказу
Я схадзіў у Віфлеем
І ізбіў усіх младзенцаў
Ад двух лет і ніжа;
Толькі адна старая баба Рахіля
Не дае свайго дзіцёнка біць.

Ірад

Прывядзі яе сяйчас сюды.

Воін выходзіць і зараз жа прыводзіць Рахіль, у чорным з галавы да ног адзенні, з дзіцём на руках, якое жаласна пішчыць.

Ірад

Як ты, старая баба Рахіля,
Смеяш не даваць свайго дзяцёнка біць
Маяму вернаму воіну,
Кагда я гэта прыказаў?

Рахіль *(вые)*

Да ён жа у мяне адзін,
Да такой маленькі,
Да ад яго нікому нет зла!

Ірад

А, дак ты мне яшчэ смееш грубіць!
(воіну) Калі яе рабёнка!

Воін заколвае дзіця, якое страшэнна крычыць. Рахіль моцна плача.

Хор

Не плач, не плач, Рахеля.
Тваё дзіця цэла.
Яно не ўмірала,
А адцвятала.

Ірад *(звяртаючыся да воіна)*

Гані адсюда старую бабу!

Воін праганяе яе ў адзін бок, а з процілеглага ходу з'яўляецца Пустэльнік.

Пустэльнік

О, Ірадзе, Ірадзе,
Полна табе грашыці,
Пара смерці прасіці.

Ірад *(заве воіна)*

Воін мой, воін,
Воін вааружонны,
Стань перада мною,

Як ліст перад травою,
Слушай мае прыказання!

Воін *(уваходзіць з мечам і спыняецца перад Ірадам)*

О, грозны цар Ірад,
Пашто свайго вернага воіна прызываешы
І якія грозныя прыказы павеляваешы?

Ірад

Прагані адсюда сего старога брадзягу!

Воін праганяе Пустэльніка ў адзін бок, а з другога боку з'яўляецца Смерць з касою і пачынае рэчытатыў.

Смерць

О, Ірадзе, Ірадзе,
Пално табе грашыці,
Пара смерці прасіці!

Ірад з жахам устае з трону, хутка і парывіста.

Вот я к табе прышла —
Настаў твой смертны час:
Склані сваю галаву на маю касу.

Ірад *(просіць адтэрміноўкі)*

Дай атсрочкі адзін год!

Смерць

Ні на адзін месяц!

Ірад

Дай на адзін дзень!

Смерць

Ні на адзін час!

Ірад

На адну мінуту!

Смерць

Ні на адну секунду!

Ірад пакорна схіляе галаву на касу, а Смерць, адсекшы галаву, плаўна выходзіць адным ходам, а з другога — убягаюць чэрці, з візгам і рогатам акружаюць цела Ірада і на чале з вялізным чортам цягнуць яго ў пекла.

Хор *(паказвае кіпенне пякельнай смалы)*

Жжж... Ззз... Ссс...

Трон стаіць пусты.

Арышанька *(выходзіць і звяртаецца да гледачоў)*

Ах, ішла з гары — утамілася;
Ішла пад гару — спатыкнулася.
Дайце на царскім месце пасядзець *(садзіцца)*.

Стары *(з мехам за плячамі)*

Ах, Арышанька, дружочак,
Я прынёс це дзеняжак мяшочак,
Толькі дай на тваіх каленях пасядзець,
А ты ў мяне з мяшочка дзеняжкі выбірай.

Арышанька

Садзіся, старычок,
Садзіся, дарагой.

Стары садзіцца ёй на калені. Арышанька выбірае ў яго грошы.

Франт *(з'яўляецца і звяртаецца да гледачоў)*

Ах, пачценняйшыя гаспада,
Как гэта не стыдна,
Как гэта не абідна,
Што стары хрыч з барадой
Сядзіць на каленях у маладой?!

Стары

Ах ты, хрант,
У цябе сапагі ў рант,

Жылетка піке,
А нос у табаке;
Сапог скрыпіць,
А ў кармане трасца кіпіць!
А я хоць стары сядой,
Да дзеняг у мяне мяшок бальшой.
Ступай адсюда прэч!

Стары і Арышанька *(крычаць разам)*

Ступай прэч.

Франт, сканфужаны, выходзіць.

Арышанька *(за кулісамі гаворыць)*

Мілыя музыканцікі,
Сыграйце нам танцікі!

Музыканты іграюць «Па вуліцы маставой...» Арышанька скача рускага. Стары па яе загаду таксама скача, знясілены, ён ледзь не падае. Арышанька, нарэшце, вядзе са сцэны вельмі стомленага старога. Стары кульгае і кашляе на пацяшэнне і смех гледачам.

На сцэне з'яўляюцца Максімка (шукальнік грыбоў) і яго бацька*.

Мужык *(з'яўляецца на сцэне)*

Куды жа гэта я заброў?
Во це на!
А гдзе жа Максімка? *(кліча)*
Сын Максім,
А, сын Максім!

Максімка *(за сцэнай)*

Ау, татка!

Мужык

А гдзе жа ты?

Максімка

Да ў лясу!

---

* Герой 1812 года.

Мужык

Зачым ты туда папаў?

Максімка

Да грыбы сабіраю!

Мужык

Да што ты, адурэў алі п'яны: якія ноне аб
Растве грыбы?

Максімка

Да яшчэ якія, падасінавікі!
Хадзі ка мне сабіраць,
А то ўсех аднаму не набраць!

Мужык

У такі-та мароз мне к табе іціць! Не, уж ты выхадзі ка мне скарэй — пара дамоў, а то замерзнем!

Максімка

Не, мне ў лясу цяпло! Да я нікак і заблудзіўся — так і ёсць, заблудзіўся.

Мужык

Дак чытай за мной малітву «Да васкрэсне Бог».

Максімка

Да растрэсніць лоб твой, цяцька! Так сцямнела, што ні згі ні віджу.

Мужык

Ну, дак чытай за мной другое!..

Цар Максіміліан

Сюжэт і дзейства

Да ўзвядзення на прастол Максіміліана яшчэ царстваваў яго састарэлы бацька Ірад. Ён быў ужо на схіле гадоў, удавец, але справы ў яго ішлі бліскуча. Меў смелых рыцараў. Частыя нашэсці ён не толькі адбіваў, але і ў значнай ступені пашыраў свае ўладанні; быў ён яшчэ жыццярадасны, любіў паляванне, меў зграю ганчакоў. Весяліўся з паланянкамі (наогул любіў жанчын). У сябе са сваімі рыцарамі пілі і весяліліся, асабліва пасля ўдалага паходу. Яго сын Максіміліан быў сярэдніх год, меў жонку і сына Адольфа 12—13 год. Сам Максіміліан быў адважным, жорсткім і даўно марыў аб троне і чакаў смерці бацькі.

Вось з гэтага і пачынаецца. Узнімаецца заслона.

Дзея 1-я

На сцэне ля царскага трона выстройваецца стража па чатыры чалавекі ў дзве шарэнгі. Трон стаіць на ўзвышэнні, да яго вядуць дзве прыступкі, аздобленыя рознай інкрустацыяй. Чакаюць з'яўлення цара. На сцэну выходзіць рыцар у даспехах і паведамляе аб прыходзе цара. Стража бярэ на каравул і пяе песню:

Цар Ірад у град грядзёт, адзяржаў
сваю пабеду над грозным над врагом
(паўтараюць тройчы).

Два воіны вядуць пад рукі цара на трон. Цар сядае, яму падаюць скіпетр (булаву).

Маналог цара

Дасціг я высшай уласці ў паходзе на врагоў,
Ачысціў я прастранства да южных берагоў.

Стража пяе:

Слава, слава, слава.

Цар загадвае ў гонар перамогі наладзіць баль. Заслона. На сцэне ставяцца сталы, накрытыя абрусамі, з рознай закускай і выпіўкай, прыгатаванай выканаўцамі. Узнімаецца заслона, і за сталамі рассаджваюцца рыцары — удзельнікі

паходу. Пачынаецца баль. У парыве нянавісці да цара яго наследнік разбівае кубак з віном. Усе звяртаюць на гэта ўвагу. Але цар загадвае стражы хутчэй рыхтавацца да паляванння: за сцэнай пачынаюць выць чатыры прывязаныя сабакі. Усе ўстаюць і выходзяць (нібы на паляванне) і выводзяць пад рукі цара. Заслона.

Пры адкрыцці заслоны на сцэну ўрываецца лепшы вартавы цара Аніка-воін і паведамляе, што ў час палявання забіты цар. Яго выносяць на сцэну ў труне і ставяць на пастамент. Адпяваць цара прыходзяць поп і манахі, апранутыя ў чорнае.

Хор *(падхоплівае)*

Са святымі ўпакой, упакой,
Цар наш быў не плахой, не плахой:
Любіў выпіць, закусіць, закусіць
І суседа прыгласіць, прыгласіць.
Любіў удовушак-касатачак,
Любіў красівых ён дзяўчатачак.

Поп

Вы зладзеі, багахульнікі,
Царскай міласці адступнікі,
Вас нужна ўсех звязаць
І ў Сібір саслаць.

Хор

І вас, бацюшка, з намі.

Поп бярэ крыж і кадзіла і разам з манахамі ідзе да выхаду. За імі рыцары нясуць у труне цара. Ззаду ідзе Далакоп з рыдлёўкай на плячы. Заслона.

Дзея 2-я

Вацарэнне Максіміліана.

Адкрываецца заслона, і на сцэну выходзіць царская стража з васьмі чалавек, якія становяцца па чатыры чалавекі з двух бакоў трона адзін за другім.

Хор выконвае песню:

Гдзе ты, гдзе ты, цар царэй,
Ангел міра, друг людзей,

Гдзе ж ты, сонца наша ясна,
Гдзе цябя, цябя іскаць?
Ждзём цябя, царыца-маць,
Хочам сына увідаць.
Ждзёт Вас ўсех страна радная,
Ждзёт святая Русь.

На сцэну павольна ўваходзіць цар Максіміліан, за ім царыца, ведучы за руку наследніка Адольфа. Ззаду ідуць пяць дзяўчынак у белым адзенні; сярэдняя нясе ўпрыгожаную інкрустацыяй царскую карону, астатнія — рознакаляровыя стужкі, адзін канец якіх прымацаваны да кароны. Цар сядае на прыбраны трон; есаулы надзяваюць яму на галаву карону.

Цар карону надзявае,
Ў рукі скіпетр ён бярэ
(Паўтараюць тройчы).

Цар устае і загадвае:

Вы, зашчытнікі мае,
Абнажыце мячы свае.

Стража спявае:

Мы зашчытнікі твае,
Абнажаем мячы свае.

Маналог цара:

Бяру ў рукі скіпетр і дзяржаву,
Усяму міру чэсць і слава.
Буду вераю служыць,
І народ благаславіць.

Хор выконвае:

Слаўся, слаўся, мудры цар,
Не дай ў абіду, гасудар.
А за гэта ўвесь народ
Праславіць увесь ваш царскі род.

Пачынаецца баляванне. Віно (вада, падфарбаваная журавінавым сокам) льецца ракою. Усе рыцары весяляцца, акрамя аднаго слаўнага воіна Анікі. У яго дрэнныя адносіны з царом,

які падазрае яго ў інтымнай любоўнай сувязі з цяперашняй царыцай. Так, цар не памыляецца ў адносінах да сустрэч Анікі са сваёй жонкай. А таму пасля ўзвядзення на прастол Максіміліана Аніка пачынае сакрэтныя перагаворы з адным рыцарам суседняга племені з мэтай нечаканага нападу на Максіміліана. Калі ўсё ўдасца, Аніка марыць узвесці на трон сына цара Адольфа (яго іграе Рыхтэр), а ў сувязі з тым, што апошні малалетні,— самому кіраваць дзяржавай. Царыца, вядома, аб гэтым не ведала. Аднак яна любіла яго, як каханка, і гэтага вераломства не падазравала. Аніка цішком намякаў Адольфу, што яму хутка давядзецца стаць каралём, і той застаўся дужа задаволены.

І вось моцнае суседняе племя вядзе інтэнсіўную падрыхтоўку да маланкавага нападу на стан Максіміліана. Аднак лазутчыкі данеслі цару, што на яго ўладанні рыхтуецца нашэсце. Цар быў упэўнены, што для яго гэта не ўяўляе пагрозы, таму што ў яго ёсць добра ўзброенае войска. Акрамя таго, ён вельмі спадзяваўся на такіх слаўных і непераможных важакоў, якімі былі бясстрашны воін Аніка і Прык-Лонскі.

Засопшыся, на сцэну ўбягае адзін з есаулаў цара і паведамляе аб тым, што сюды рухаецца вялікі атрад іншаземнага войска. Цар быў страшэнна перапалоханы і загадаў біць трывогу.

І вось пачынаецца пабоішча. Усе 28 удзельнікаў раздзяліліся на дзве групы. Адна была апранута ў страшныя даспехі — сярэбранага і зялёнага колеру (ворагі). Царскае ж войска — у «залатое» абмундзіраванне.

Затрубілі трубы, і на сцэну з розных дзвярэй пачалі выбягаць рыцары і воінства, і пачалася бітва і рубка: мячамі, сякерамі, стрэльбамі. Гэта бітва заняла прыкладна 10—15 мінут. Адзін за другім пачалі падаць воіны (забітыя з абодвух бакоў), а ў канцы боя засталося і ў тых і ў другіх усяго па некалькі чалавек.

Бачачы, што вораг адольвае, цар пачаў выклікаць самых лепшых рыцараў і моцна крыкнуў: «Прык-Лонскі! Гдзе храбры Аніка?» І вось, як толькі з'явіліся гэтыя воіны і ўступілі ў бойку, увесь варожы лагер быў знішчаны: на сцэне валяліся трупы, шлемы, мячы, коп'і і ўсе даспехі. (Заслона. Прыбралі сцэну).

Фінал

На троне сядзіць цар з сям'ёй. З'яўляецца невядомы ў чорным адзенні з закрытым тварам. Пытае ў цара дазволу гава-

рыць. Цар дазваляе. Невядомы паведамляе, што гэтае нашэсце, у якім цар страціў большую частку свайго войска, звязана са змоваю есаула Анікі, мэтай якога было ўзвесці на трон яго сына Адольфа. Цар неадкладна выклікае Аніку і робіць дазнанне. Дапрашвае Аніку:

Есаул, мой есаул. Падхадзі ка мне скарэй,
Гавары пра ўсё вярней!
А не скажаш — у гразь утапчу,
Кінжал у грудзь пушчу,
Пяцьдзесят закачу, мала пяцьдзесят — сто,
Прападзе служба ні за што.
Вялю клетку змасцярыць
І цябя там пасадзіць,
Там ты будзеш воўкам выць.

Аніка не сазнаецца. Цар пытае сына, ці браў ён удзел у змове. Адольф не адмаўляе, што ў яго былі пасланцы, і ён даў згоду на царства. На запытанне бацькі, ці ведае аб гэтым маці, Адольф адказвае адмоўна і нават не выдае Аніку. Максіміліан загадвае пакараць сына — адсячы яму галаву.

Адольфа выводзяць на сцэну, кладуць на эшафот, устанаўліваюць калодку, на якой будуць адсякаць яму галаву. Адольф са слязамі просіць цара памілаваць яго; спявае.

Прасці, прасці, ацец радной!..

Тое ж спявае маці. Цар устае з трона і загадвае кату неадкладна выканаць яго загад. Уваходзіць кат у чырвоным адзенні і з сякерай. Поп чытае малітву. Спявае:

Адольф няшчасны, не пячалься,
Смертнай казні ты не бойся,
Там ты палучыш наслаждзеніе,
Табе дадуць злат вянец.

Кат адсякае галаву. Царыца траціць прытомнасць, яе выносяць.

Хор *(спявае)*

Там у полі пад ракітай царскі сын убіты;
Ён і не ўбіт і не зарэзан, толькі ўвесь ізранен.
Прыхадзіла маць радная, парчу адкрывала,
Яна парчу адкрывала, сына ўзнавала.

Царыца *(спявае)*

Ты ўстань, устань, Адольфе,
Ўстань ты, прабудзіся:
Ці не твае гэта коні гуляюць на волі,
Ці не твае гэта шаблі вісяць абнажоны,
Ці не твае гэта стрэльбы вісяць заражоны?
Прашчай, мой ангел. Прашчай!

У гэты момант прыбягае воін Аніка і са стрэльбы напавал забівае цара. Трон валіцца ўверх нагамі. На сцэне ляжыць цар і яго карона. Заслона.

* * *

Упершыню «Цара Максіміліана» я чуў у выкананні нашых гутнікаў у Міхаліне прыкладна ў 1904—1905 гг. Для пастаноўкі гэтай п'есы патрэбна даволі вялікае памяшканне, бо павінны былі адбывацца сцэны, бойкі варагуючых плямёнаў і іх рыцараў. У Міхаліне гэта пастаноўка ставілася ў вялікім гумне ляснічага; там пабудавалі вялікую сцэну і глядзельную залу.

Другі раз у гэтай пастаноўцы я ўжо сам браў удзел — выконваў тады ролю сына Максіміліана Адольфа. Гэта было ў Нараўцы ў 1912 г. Прадстаўленне ладзілі ў школе, і ў час шматлікіх рэпетыцый я запомніў як сам сюжэт п'есы, так і асобныя ролі. Пераехаўшы ў Старава ў лютым 1916 г., я пачаў працаваць памочнікам у Біоха Ігнася. Недалёка працаваў Бабкоў. У час работы спявалі песні, частка якіх была з «Максіміліана». З расказаў Біоха і Бабкова стала вядома, што першы ўдзельнічаў у пастаноўцы п'есы ў Міхаліне, а другі (Бабкоў) дзесьці на Валыні. Я ў іх спытаў, ці не паспрабаваць нам разам паставіць гэту п'есу ў Стараве. Яны ахвотна згадзіліся, і мы пачалі дэталёва абмяркоўваць план гэтай задумы і шукаць выканаўцаў. Бабкоў згадзіўся быць галоўным рэжысёрам, Біох выказаў жаданне выканаць ролю цара, а я заняўся, пад рэдакцыяй Бабкова, перапіскай роляў і быў рэпецітарам.

Усіх выканаўцаў было чалавек 35—40, сярод іх мы запрасілі наступных: Плюцінскіх, Вясёлых, Траццякоў, Тарнецкіх, Казлоўскіх, Грабоўскіх, Палатавых, Маеўскага, В. Асвяцімскага, І. Янушэўскага, А. Шварца, Б. Лаўрушку, І. Рыхтэра (апошні іграў сына цара) і інш. На ролю царыцы запрасілі Вольгу Шварц. Для падрыхтоўкі касцюмаў і рэквізіту мы ўтрох (Ал. Паляшчук, Аф. Траццяк і я) паехалі ў Слуцк, купілі рознакаляровай паперы, блёстак, картону і пачалі пад кіраўніцтвам Біоха, Бабкова і Франца Тарнецкага майстра-

ваць мячы, шаблі, пікі, кароны, паясы і іншае начынне.

Работа ішла хутка, але з рэпетыцыяй было больш складаней <...> амаль усе хлопцы былі непісьменныя, і таму даволі марудна развучваліся ролі, а таксама матывы песень...

Рэпеціравалі вечарамі, а для самога прадстаўлення прасілі Нусінава адвесці нам будынак пры гуце — даволі высокае і прасторнае памяшканне. Нусінаў даў нам дошак для ўзвядзення сцэны, вырабу лавак і царскага трона, а таксама правёў электрычнасць. Ставілі бясплатна. Кліонскі быў на генеральнай рэпетыцыі і зрабіў некалькі карысных заўваг. Нарэшце, 25 снежня вырашылі іграць спектакль. Праўда, мы трохі хвалявaліся, таму што і ў выканаўчай і ў пастановачнай частцы былі шарахаватасці, але ўсё ж сыграліяк выйшла.

Прадстаўленне «Цара Максіміліана» ў Слуцку

У мае дзіцячыя гады ў Слуцку на Ражство, яшчэ пад Новы год, хадзілі віншаваць пад вокны са звяздою, з канём, з казою, з мядзведзем, а дзяўчаткі, сабраўшыся па 3—9, з'яўляліся пад вокнамі і спявалі шчадроўкі, віншуючы са святам гаспадароў і асобных асоб іх сямей, асабліва падлеткаў. Але толькі адзін год давялося мне бачыць паказ такога значнага народнага відовішча, як «Цар Максімільян».

Раскажу, што ўтрымала памяць.

Мне было, мабыць, гадоў сем ці восем, калі я пачуў, што сваяк наш Лявон Куляшэвіч, шаснаццацігадовы падмайстар у свайго бацькі-шаўца, разам са сваімі таварышамі па прыхадскому вучылішчу і сябрамі па гульнях у бабкі з вуліц Крывасёлак рыхтуюць к Ражству «прэстаўленне» пад назвай «Цар Максімільян», што для гэтага яны запісалі належныя словы ад аднаго з лепшых батлейшчыкаў Слуцка Нічыпара Дылы, які іншы раз паказваў у сваёй батлейцы гэтакае «прэстаўленне», і казалі, што ў маладосці ён сам прымаў удзел у гульні гэтай гісторыі ў дружыне добрага знаўца «Цара Максімільяна». Хлопцаў набралася шмат, але частка іх адышла потым ад гэтай справы або таму, што не было здольнасці і ахвоты «прэстаўляць», або таму, што падрыхтоўка каштавала грошай на патрэбнае адзенне, зброю і адбірала шмат часу. Вядомы ў горадзе іканапісец Вяроўскі нарысаваў хлопцам, як павінны быць апрануты і ўзброены ўдзельнікі відовішча, а батлейшчык, якога прасілі навучыць, як гаварыць і як дзейнічаць, узяўшыся за гэту справу, сам паказаў удзельнікам, як належна прадстаўляць. Сястра Лявона і другія дзяўчаты пад начальствам маёй цёткі нашывалі пафарбаваныя пад медзь

патрэбныя панцыры воінам і фіцмаршалу цара Максімільяна, пашылі кумірыцкім багіні і богу Марцу вопраткі адпаведна іх ролям. Пробы прадстаўлення рабілі ў прасторнай пуні майго дзеда, так што я і наслухаўся і наглядзеўся столькі, што шмат размоў дзейных асоб ведаў не горш за іх саміх. Памяць, канешне, не ўтрымала ўсяго гэтага, але захаваліся выпадковыя кускі размоў і добра памяцен увесь ход дзеі.

Калі пачаліся пробы ўжо ў вопратках і так, як потым ішло ўсё перад гледачамі, я быў канчаткова ачараваны. Пастараюся ўсё перадаць так, як паказвалася гэта відовішча.

Вось выйшла з вуліцы ў двор да майго дзеда дружына хлопцаў, удзельнікаў «прэстаўлення», стукаюць у дзверы. Да вышаўшага на стук дзеда зварочваецца «фіцмаршал» і вершаванаю моваю віншуе яго са святам і просіць дазволу ўвайсці ў хату, каб згуляць «прэстаўленне» — «Цар Максімільян». Згода на гэта атрымана, і хлопцы ўваходзяць у пакой. Фіцмаршал просіць дазволіць расставіцца так, як гэта адпавядае справе «прэстаўлення», і пытаецца, каго гаспадары хацелі б запрасіць глядзець відовішча з сваіх суседзяў. Нарэшце, усе суседзі сабраліся і прыгатовіліся слухаць. Я сяджу наперадзе ў першым радзе ля свайго дзеда і бабкі і так добра усё бачу, што перакажу вам усё, як было ў гэтым прадстаўленні.

Перад намі грамадка людзей у такім выглядзе: пасярэдзіне стаіць так званы Скараход-фіцмаршал, на галаве яго нібы сталёвы шалом, на тулаве генеральскі мундзір, грудзі якога поўны ордэнаў і медаляў, зробленых самімі хлопцамі з бляхі і раскрашаных, хаця звякалі і два-тры сапраўдныя медалі, атрыманыя за турэцкую вайну. Лампасы нашыты на штанах, якія засунуты ў боты; і на іх звіняць шпоры. Пры баку кавалерыйская шабля. За ім стаіць сам цар Максімільян. У яго на галаве таксама такі ж шалом, толькі з шышкі яго тырчыць старое страусавае пяро; на грудзях медзяны панцыр, з-пад якога чырвоная рубашка, штаны з лампасамі, запраўленыя ў боты. На баку пры назе доўгі двухстаронні меч, пафарбаваны пад сталь. Паабапал царка два воіны ў шаломах, панцырах і з пікамі. Далей за імі сын Максімільянаў Адолька — кучаравы русавалосы юнак, безаружны, у ружовай рубашцы, падпяразаны беларускім сялянскім поясам, штаны ўпраўлены ў боты. Закутаная ў афарбаванае ў блакіт прасцірадла стаіць кумірыцкая багіня, так, што твару яе нельга бачыць. Па другі бок ваяка Марац: на ім шышак, як у пажарніка, панцыр і шчыт, у руцэ кароткі меч. У апошнім радзе кат Брамбэус у чырвонай сарочцы, шырокіх штанах, запраўленых у боты, з вялікай сякерай, як у мясніка, на якую ён абапіраецца.

Фельчар з вялікім градуснікам на адным плячы і торбай з лякарствамі; пры гадзінніку, які аказваецца цыбуляю. Яшчэ адна асоба, завінутая ў плашч, з-пад якога тырчыць каса. Хто не бачыў прадстаўлення, той не ведае, хто гэтая асоба, але я ведаю — гэта Смерць.

За ўсімі ззаду стаіць стары з сівой барадой Далакоп. Ён жа механоша, якому за прадстаўленне даюць натураю: хлеб буханкамі, сала, каўбасы. У яго дзеля гэтага санкі з мехам; на санках ён возіць трон цара Максімільяна — крэсла з падлакотнікамі і высокаю спінкаю, размаляванае пад срэбра і золата.

Пачынае відовішча Скараход-фіцмаршал:

— Людзі добрыя, думайце-гадайце, хто перад вамі зараз выйдзе! Выйдзе паказацца, на людзях пакрасавацца!.. Ці то будзе імператар французскі, ці кароль прускі?

Цар Максімільян *(рашуча ў поўны свой голас крычыць, выходзячы наперад. За ім абое воіны па баках).*— Я — не імператар французскі і не кароль прускі! Я — грозны цар сусветны Максімільян!.. (Пры гэтых яго словах ад механошы ззаду перадаюць фіцмаршалу трон для цара, які той і ставіць.) Дзеля мяне, цара ўсяслаўнага, сусветнага, магутнага Максімільяна! Слуга мой верны, Скараход-фіцмаршал, ускладзі на мае плечы парфіру! (Падаюць фіцмаршалу пурпуровую з бліскучаю залацінкаю мантыю, якую фіцмаршал і ўскідвае на плечы цара.) Дай мне ў рукі скіпетр і дзяржаву! (Фіцмаршалу падаюць іх, і ён перадае іх цару.) А заместа шалома ўскладзі на маю галаву карону, каб я мог правіць людзьмі па закону! (Цар Максімільян садзіцца на трон.) Вось сеў я на свой прарадзіцельскі трон, я магутнейшы з магутных, бо я падпарадкаваў сабе сушу і мора, пакарыў усе народы! Самі богі мне зайздросцяць, бо хто пасмее быць мне непаслухмяным?

Далей не памятаю, хто падказаў цару, што яму непаслухмяны сын яго Адолька.

Цар Максімільян *(крычыць у гневе).* Скараход-фіцмаршал, слуга мой верны! Стань перада мною, як ліст перад травою.

Фіцмаршал. Дзеля чаго ты мяне, грозны цар, прызываеш?..

Прыпеўкі



Прыпеўка — невялікая лірычная песенька, якая складаецца з чатырох (радзей двух, шасці, васьмі) радкоў і выконваецца на якінебудзь сталы матыў. Вядомы і іншыя назвы гэтага жанру: вытанкі, скакушкі, брандушкі, выдрыганцы і інш. Тэрмін «частушка» запазычан з рускай навуковай тэрміналогіі і ўпершыню ў навуковую беларускую літаратуру ўведзены А. Астаповічам. Вытокі жанру ў танцавальных песеньках, а таксама ў песеньках вясельных і дударскіх. У прыпеўках адлюстраваны многія бакі жыцця дарэвалюцыйнага сялянства. Аднак асноўная тэма гэтага жанру — любоў. У савецкіх прыпеўках прыкметнае месца займае грамадска-палітычная тэма.

Сярод фальклорных жанраў, якія адлюстроўваюць сучаснасць, адно з першых месц належыць прыпеўцы.

Першыя публікацыі беларускіх прыпевак адносяцца да 40-х гг. XIX ст.

ЛІТАРАТУРА

Цішчанка І. К. Беларуская частушка: Пытанні генезісу жанру. Мн., 1971.
Никифоровский Н. Я. Белорусские песни-частушки. Вильна, 1911.
Прыпеўкі / Склад. І. К. Цішчанка. Мн., 1989.

Скора, скора снег растане,
Скора рэчкі паплывуць,
Скора мілага майго
У салдаты забяруць.

Гуляй, гуляй, маё дзіцятка,
Астатняе лецечка:
У салдаты аддадуць —
Такой волі не дадуць.

Кіну каменьчык у рэчку,
Не магу яго дастаць,
Гоняць мілага ў салдаты,
Не магу яго даждаць.

Выйду, выйду за вароты,
Пакачаю галавой;
Здалі мілага ў салдаты,
Засталася сіратой.

Вышывала я платочак
Ды не знала каму даць.
Бяруць мілага ў салдаты,—
Яму слёзы выціраць.

Там ты будзеш ваяваці,
Тут я — гора гараваці.
Табе сінія палаці,
Мне цясовыя краваці.

Лясок маленькі з прагаленкай,
З усходу вецярок.
Пагаворым, мой міленькі,
Хоць апошні вечарок.

Наша вуліца шырока,
Уся пасыпана пяском,
Здалі мілага ў салдаты —
Галасіла галаском.

Найдзі, хмара, найдзі, гром,
І разбі казённы дом
І начальніка таго,
Што ўзяў мілага майго.

Усё б я пела, ўсё б я пела
Розныя прыпевачкі,
Ды цяпер мне не да песень,
Дарагія дзевачкі.

Ах ты, міленькі ты мой,
Мы апошні год з табой:
Цябе ў салдацікі здадуць,
Мяне замуж аддадуць.

А не ўсё па гору плакаць,
А не ўсё па ім тужыць,
Трэба ж хоць адну часінку
Ды ў вясёласці пажыць.

Пайду скакаць,
Дома нечага кусаць —
Сухары ды коркі,
На нагах апоркі.

Танцуй, Мацвей,
Не шкадуй лапцей,
Лапці новенькія
Дый лазовенькія.

Ой, без дудкі, без дуды
Ходзяць ногі не туды,
А як дудку пачуюць —
Самі ногі танцуюць.

Не буду плакаць, бедаваць,
Слязамі мора наліваць,
Слязамі мора не нальеш,
А толькі сэрца надарвеш.

Зайграйце, музыкі,
Мае лапці вялікі,
Мне татулька іх сплёў
На святы пакроў.

Як удару трапака —
Лапаткі дзяруцца.
Як прыскочу казака —
Аборачкі рвуцца.

Я і стар — не магу,
Я і слаб — не магу.
Як зайграюць лявоніху,
Ашалеўшы бягу.

А скрыпачка, далі Бог,
Не жалей жа маіх ног!
Мае ножкі не баляць,
Яны хочуць пагуляць.

Эх, колькі ж нас —
Адна жменечка!
Пагуляем жа
Харашэнечка.

Пайшла б я казачка,
Ды баюся мужычка,
Жонка скача і пяе,
Мужык плача і кляне.

А чучыла, чучыла,
Мяне маці мучыла,
Як парадак навадзіць,
Бліны ў рэшаце насіць.

Я дадому йшла,
Самавар знайшла;
Любі мяне, панамар,
Падарую самавар.

Каля кузні йшла,
Малаток знайшла,
Любі мяне, кавалёк,
Што знайшла я малаток.

Во цяпер мне пагуляць,
Пакуль грае скрыпка:
Ручкі, ножкі не баляць,
Серадзінка гібка.

А сягоння серада,
Я мяса не ела,
Не цалуйце мяне, хлопцы,
Каб я не самлела.

Танцавала рыба з ракам,
А пятрушка з пастарнакам,
А цыбуля з часнаком.
Красна дзеўка з дзецюком.

Я ля кузні йшла,
Вугалёк знайшла.
Любі мяне, кавалёк,
Падарую вугалёк.

Як пайду я па ваду
І старога прывяду:
У пролубку галавой —
Пагуляю удавой.

Рада, рада была баба,
Што дзед утапіўся.
Ліха ж яму нагадзіла —
За куст ухапіўся.

Каб я сваю жонку меў бы,
Ані піў бы, ані еў бы;
Ані еў бы, ані спаў бы,
Толькі жонку цалаваў бы.

Бацька руды, матка руда,
Браты руды, сястра руда,
І я руды, руду браў,
І руды нас поп вянчаў.

Я па беражку бягу —
Бераг асыпаецца.
Я бяззубага люблю —
Бяззубы не кусаецца.

Дзяўчыначка, люблю цябе,
Не еж хлеба — вазьму цябе.
Не еж хлеба, не пі воды,
Вазьму цябе для выгоды.
— Няхай не есць твая маці,
Калі хочаш мяне ўзяці.

Пашла Гандзя па цыбулю:
— Пастой, Гандзя, пацалую!
Пацалую, не ўкушу,
Бо люблю цябе, як душу!

Не судзіце, добры людзі,
Што я абшарпаўся.
Мой татулька такі быў,
Я па ім удаўся.

А мілашачка мая,
Стаў я разжывацца.
Прадаў сенцы, купіў дзверцы,
Пачаў зачыняцца.

— Чаго мілы не вырос,
Чаго малаваты?
— Прыхапіў мяне мароз
Каля тваёй хаты.

Пастарайцеся, дзяўчаты,
Усе канавы засыпаць,
Бо такія хлопцы ходзяць,
Што з канавы не відаць.

А на печы пры лучыне
Дзеўкі грошы палічылі,
Налічылі паўталера
Ды й купілі кавалера.

А ў гародзе грушкі дзічкі,
Мой кавалер невялічкі.

794

Буду грушкі абіраці,
Кавалера гадаваці.

Мой мілёнак, як цялёнак,—
Толькі б венікі вязаць:
Правадзіў мяне дадому
І не змог пацалаваць.

На гары на хутары
Хлопцы коней путалі.
Путалі, стараліся,
У сваты збіраліся.

Божа, Божа, Божа мой,
Хто прыгожы, ды не мой,
А хто брыдкі, абшарпаны,
Гэта, мабыць, мой каханы.

А мой мілы хударлявы,
Мне не падабаецца,
Навяжу я на папары,
Няхай ад'ядаецца.

Мой мілёначак харош,
Хоць за пазуху палож.
Палажыла б за душу,
Ды баюся — задушу.

Мы чужыя хаты крылі,
А свае някрытыя.
Чужых дзевак мы любілі,
А свае — забытыя.

Ой, Васілю, Васілю,
Баравое зелле!
Яшчэ замуж не пайду,
Не спраўляй вяселле.

Прыкацілі ка мне сваты
На сівой кабыле,
Завярнуліся назад —
Жаніха забылі.

Ішла дзеўка з Барысава.
— А чыя ж ты? — Дзянісава.
— А як завуць? — Ганусяю.
— А што робіш? — Смяюся я.

— Скуль ты, дзеўка? — З-пад Янова.
— А чыя ж ты? — Кавалёва.
Ой, я дзеўка над дзяўкамі,
Чаравічкі з падкаўкамі.

Татулечка родненькі,
Купі платок модненькі,
Ды як можна памадней —
Любіць віцебскі Андрэй.

Дзяўчыначка, мая люба,
Мядовая твая губа.
Адзін разок пацалую —
Тры дні ў роце мядок чую.

А ў майго мілёначка
Худая кабылёначка.
Не даехаў да гары,
Кабылу з'елі камары.

Не хадзіце, дзеўкі, ў лазню,
Не хадзіце парыцца.
Ад гарачае прыпаркі
Пудра ўся адваліцца.

А мой мілы, кажуць людзі,
Непрыгожы, маленькі.
У нядзелю паглядзела,
Ён як кветка аленькі.

Каму Вася, проста Вася,
А мне Васечка.
Каму Вася нехарошы,
А мне красачка.

Мне не трэба пуд гароху,
Толькі дзве гарошынкі,
Мне не трэба многа хлопцаў,
Мне адзін харошанькі.

Мне не трэба пуд мукі.
Мне не трэба сіта.
Мяне мілы пацалуе,
Цэлы тыдзень сыта.

— Ой ты, дзевачка Улляна,
Чаго любіш ты Мілляна?
— Чаго ж яго не любіць,
Ён умее галубіць!

Колькі лесам не хадзіла,
Мацней дуба не знайшла.
Колькі хлопцаў не любіла,
Лепей Вані не знайшла.

Мама, гора, мама, гора,
Аддай мяне за Рыгора:
А ў Рыгора кудры ўюцца,
За Рыгора дзеўкі б'юцца.

На вуліцы скрыпка грае,
Мяне маці не пускае.
— Пусці, маці, паглядзець,
Будзеш сабе зяця мець.

Ты зайграй, мая тальянка,
Трыццаціладовая!
З-за цябе, мая тальянка,
Любіць чарнабровая!

Ванька з Піцеру прыехаў,
Гармонь новую прывёз.
Гармонь новая раве,
Бацька хлеба не дае.
Гармонь мая матушка,
Лепей хлеба-мякушка.
На гармонь як закачу,
Тры дні хлеба не хачу.

Хто ў гармоніку іграе,
Той каровачкі не мае,
Ні кароўкі, ні бычка,
Не хлябае малачка.

Хораша табе, каліна,—
На табе шырокі ліст,
Хораша табе, падруга,—
Цябе любіць гарманіст.

Ты іграешь весяло,
Цябе хваліць ўсё сяло,
Цябе хваліць мая маць:
— Расхарошы будзе зяць.

А гармонька-матушка!
Няма хлебца-мякушка,
Пап'ю кіслага кваску —
Разганю сваю таску.
А гармонька-матушка,
Лепей хлеба-мякушка.

Я ў гармонь як закачу,
Тры дні хлеба не хачу.
А як хлеба не з'ясі,
Дык гармонік прадасі.

Колькі раз я заракаўся
Гэтай нівай не хадзіць;
Спалюбілася дзяўчынка,
Не магу яе забыць.

Колькі зорачак на небе,
Адна зорачка гарыць;
Ёсць і гожых і прыгожых —
Па адной сэрца баліць.

Ой, на гары — гарохаўе;
Чэрці пана спалохалі.
Ой, не бойся, пане, смерці:
Не хапаюць дурняў чэрці.

Ты не поп, ты не дзяк,
Не цалуй мяне так,
Няхай мяне пацалуе
Маладзенькі казак.

Іграй, дудка,— пайду ў танцы,
Люблю дзевак, каб іх пранцы!

А у міленькай насок
З дваццаці пяці дасок.

Дзяўчынанька мая,
Харошага стану,
А хто цябе любіць будзе,
Як я перастану?

Я ў сераду радзілася,
На тры дзелы згадзілася.
Я і ў сохі і ў бароны,
За мной хлопцы, як вароны.

Расце мак-пастарнак
І цыбуля-дынька.
Мой муж — гаспадар,
А я — гаспадынька.

Я гуляю, весялюся,
На чатыры спадзяюся,
Як падумаю сама —
Дык ніводнага няма.

А я — руска, ты — католік.
Не руш мяне за падолік.
Мой падолік шоўкам шыты —
Хто зачэпіць, будзіць біты.

Танцавала полечку,
Парвала хвальбоначку.
Пайду мамачку прасіць,
Каб хвальбоначку зашыць.

А як жа я гарую —
Узяў жонку маладую.
Хлеб саджаю і мяшу,
Дзіця плачыць — калышу.

Ты-лі-лі, ты-лі-лі,
Каб капусты ўлілі,
Далі хлеба камяка —
Паскакаў бы казака.

Не тужы, мая мілаша,
За мной будзеш панаваць;
Я наймуся свінней пасвіць,
А ты будзеш падганяць.

Ажаніся, не ляніся —
Будзеш панаваці:
Жонка будзе свінней пасці,
А ты — заганяці.

Ты да мяне, я да цябе —
Болей ні да кога.
Любі мяне, а я цябе,
А болей нікога.

Дзяўчыначка дробна скача,
За кроснамі сядзе — плача,
Галёпчыка добра йдзе,
Ніткі ў берды не ўвядзе.

Дзе ж ты, міленькі, купаўся,
Што мне гэтак спадабаўся?
Ці ў барвінку, ці ў шалвеі,
Што па табе сэрца млее?

— Дзяўчыначка бела-бела,
Дзе ты красачку падзела?
— Я на рэчцы мылася,
Красачкі забылася.

А ў гародзе авясец —
На сто рублёў каласец.
А вяночак па рублю,
Адхініся — не люблю.

Сюды-туды вокам кіну:
Няма таго, за кім гіну.
А пры боку сядзіць згрэбла,
Што нікому не патрэбна.

Я з-пад лесу, я з-пад гаю
Свайго мілага пазнаю:
Ногі доўгія, крывыя,
Порткі зрэбныя, рабыя.

Колькі печы ні паліла,
Ды ўсё трэсачкамі.

Колькі хлопцаў ні любіла,
Ды ўсё смешачкамі.

Бацька грае, сын басуе,
Дачка замуж галасуе.
Бацька жыта прадае,
Дачку замуж аддае.

Ад парога да парога
Чаравічкі папарола.
А ты, шэўчык, не гуляй —
Чаравічкі зашывай.

А гуляй, Мацей,
Не жалей лапцей.
А мы былі на базары —
Лапці новы заказалі.

Ой, цешча мая,
Чатыры аборкі.
Хачу — дома заначую,
Хачу — у Хадоркі.

Ты Пракоп, а я Мікіта,
Ты ад коп, а я ад жыта,
Ты адсюль, а я адгэтуль —
Не даруем шэльме гэтай.

Ох, дзедзька ты мой,
А я бабка твая.
Шануй мяне, гадуй мяне,
Каб я гладка была.

Я падпіла, падгуляла.
Цяпер мяне знайце:
Чаравічкі я стаптала,
Мне другія дайце.

Хадзіў Зэлік па балоту,
Трасцу рабіў, не работу.
Сена касіў, жыта жаў,
Дзевак любіў, бабу ўзяў.

Біце, біце у цымбалы —
Не зважайце, што я малы,
Дуйце, дуйце у жалейкі —
Не жалейце, што маленькі.

— Ой, Марына, Марына,
Што ты ўчора варыла?
— Заціpачку з кісяльком
І гуляла з Васільком.

Вядзі мяне к дубу, дубу,
А я твая дзеўка буду.
Заві мяне паненкаю,
Паі мяне гарэлкаю.

На вуліцы суха ліпа,
Пайду замуж за Піліпа.
Ужо ліпа зелянеіць,
Па Піліпу душа млеіць.

Дзяўчаткі мае,
Сыраежачкі,
Пасаліў бы я вас,
Няма дзежачкі.

Танцуй, танцуй, лапці мае,
За поясам яшчэ двое.
Бацька сядзіць на пліце,
Яшчэ болей напляце.

Я па верасу хадзіла,
Верас ногі завіваў.
Я багатага любіла,
Мяне бедны адбіваў.

Ты не сватайся, Мікіта,
Я прасватана, прапіта.
Пад вянцом стаю і плачу,
За каго іду, не бачу.

Не судзіце, цётачкі,
Я не падсудзімачка.
Досіць мяне абсудзіла
Мілага радзімачка.

Ах ты, цешча мая,
Не хвалі сваёй дачкі:
Яе лытачкі, як нітачкі,
Сухія кумпячкі.

Што за я, што за я,
Што за масцярыца:
Шыла міламу штаны,
Выйшла рукавіца.

798

У мястэчку на базары
Хлопцы прадаюцца:
На капейку — сорак штук
І то задаюцца.

Любосць не навек —
Толькі дзеля жалі.
Ці ня чэрці цябе
Ка мне прывязалі?

Я гуляла, гапацела,
Гаварыла, з кім хацела.
Дала ручку цераз тын,
Гаварыла, ды не з тым.

Я надзену плацце бела
І пайду ў ім пад вянец.
Ссохну, звяну, як былінка,
І гульбе маей канец.

Падай, мамачка, пілу,
Я рабіначку спілю.
На рабіне жоўты ліст,
Мяне кінуў гарманіст.

Пела, пела і напела
На сваю галовачку,
На чатыры дзевяры,
На пятую заловачку.

Праважала я мілога
Да зялёненькіх рабін.
Абняла, пацалавала:
— Ідзі, міленькі, адзін.

Мы сядзелі каля тыну,
Ты бажыўся: «Не пакіну».
Кляўся небам і зямлёй:
«Будзеш, мілачка, маёй».

Чаравікі тупу, тупу,
Бацька кажыць: «Куплю,
куплю».
Маці кажыць: «Не купляй,
Дачцэ волі не давай».

Не судзіце, мужыкі,
Не судзіце, цёткі:
Беражыце языкі
Дочкам на падмёткі.

Хлопцы знаюць, хлопцы
знаюць,
Знаюць, з кім знаёміцца:
У каго куры нясуцца
І карова доіцца.

Мяне мама біла, біла,
Каб я хлопцаў не любіла.
А я маме на бяду
Поўну хату прывяду.

На стале стаіць вазон —
Любіць паліваннейка.
Наша тайная любоў
Любіць цалаваннейка.

Я па лесе песні пела,
Ішлі адгалосачкі.
Па мне мілы сохне, вяне
Я па ім — ні трошачкі.

Эх, мілка мая,
Каб цябе халерыя:
Восем год цябе любіў,
А ты мне не верыла.

— Чаму ўчора ты не быў?
— Недзе шапачку згубіў.
— А ты б дзедаву надзеў.
Дзед на печы б пасядзеў.

А я свайму Мішаньку
Вышыю манішаньку.
Унізочку выстрачу,
Мішаньку любіць хачу.

Кавалер, кавалер,
Каб ты праваліўся:
Адзін вечар пасядзеў,
А ўсім пахваліўся.

А у Колевай гармоні
Планкі пазалочаны.
Не любіце, дзяўкі, Колю:
Коля развалочаны.

Шыла кофту, шыла кофту
Шыла з адваротамі.
Усю ночку прасядзела
З мілым пад варотамі.

Я сядзела на пасцелі,
Вышывала платок белы.
Вышывала кончыкі —
Міламу паклончыкі.

Палюбіла троечку:
Колю, Ваню, Толечку.
Колю — рана, Ваню — днём,
Толю — вечарам з агнём.

Я ў нядзелю выйшла замуж,
Ў сераду заплакала.
Сваю бедную галоўку
Навек загайдакала.

Гарманісцік, весялей,
Нашых ножак не жалей:
Нашы ножкі не баляць.
Яны хочуць пагуляць.

А у Слуцку на базары
Прадаюць мужчын вазамі.
Адна баба ўсіх любіла —
За капейку сем купіла.

Каб ты, міленькі, ссінеў,
Як асіна сіняя.
Я іду, а ты гаворыш,
Што я некрасівая.

Ой, гармонь, ой, гармонь,
Не спаліў цябе агонь,
Не ўзяла цябе вада,
Як я была малада.

Ой, я пела, прыпявала,
Прыпяваць хацелася.
А цяпер сама не знаю,
Дзе ахвота дзелася.

Ты, сяброўка дарагая,
Пойдзем падабедаем.
Аднаго мілёнка любім —
Пойдзем пераведаем.

Не дай Божа з такім лёсам —
Любіць хлопца з доўгім
носам:
Каб яго пацалаваць,
Трэба нос адпілаваць.

Міленькі, каханенькі,
Не напівайся п'яненькі.
Ты нап'ешся, з ног далоў —
З кім жа я пайду дамоў?

— А мамачка, што такое,
Што пад акном стаіць трое?
— Гэта, дочанька, не дзіва:
Я й па пяцера вадзіла.

Нашы мужныя героі родны край праславілі

У сорак першым на граніцы
Немцы бомбы скінулі,
Вілі, альберты і фрыцы
На наш край нахлынулі.

Сквапны Гітлера сабакі
На калгасныя прысмакі,
Мы ж дадзім такога сала,
Каб калом у горле стала.

Неба хмарамі дыміцца,
Вецер соснамі гудзе,
Смелы кулі не баіцца
І ў баі не прападзе.

Ішлі немцы грабіць вёску,
Ішлі з аўтаматамі,
Партызаны частавалі
Немчуру гранатамі.

Ранкам ясным перад спёкай,
Сонца мыецца ў расе,
Немцу я за вока — вока,
А за зуб — вымаю ўсе.

Просіць фрыц, зайшоўшы ў хату,
— Матка, яйкі, матка, шпэк...
Я ж яму ражном у горла,
Падавіўся каб навек.

Афіцэр прыйшоў у хату,
Лезе ў печ ён з галавой,
А калгасніца Агата —
Па загрыўку качаргой.

Наляцелі немцы-каты,
Папалілі нашы хаты,
Мы цяпер жывем у пушчы,
Днём і ноччу катаў трушчым.

Колькі лесам ні хадзіла,
Ўсё кусты арэхавы:
Колькі хлопцаў ні любіла,
Ўсе на фронт паехалі.

Колькі ягад я сабрала,
Чорненькай смародзіны;
На зашчыту хлопцы сталі,
Патрыёты Родзіны.

Падружачка дарагая,
Дзе ж то нашы сокалы?
— На іх шэрыя шынелі,
Паясы шырокія.

*

Падруга мілая мая,
Ці чула пра мілёначка —
Ў яго цяпер пагоны,
На пагонах зорачкі.

*

Мой мілёначак на фронце
І не першы ужо раз,
Б'е фашыстаў там няшчадна,
Апраўдаў ён мой наказ.

*

Дзевачкі, мароз, мароз,
Ёлачкі аб'інелі,
А мой міленькі ў баі
Стаіць на першай лініі.

Ой, падружка дарагая,
Табе новасці нясу,
Твой мілёнак чарнабровы
Ляжыць ранены ў лясу.

Я, бывала, прыпявала,
А цяпер ўжо не пяю:
Калі трэба раненым
Дык вазьміце кроў маю.

Зламаю ветку-вінаградку,
Зламаю я смародзіну;
А мой мілы ў партызанах
Зашчышчае Родзіну.

Партызан як прыдзе ў хату,
Стаўлю я на стол харчы,
Бо гатова, нібы брату,
Партызану памагчы.

Наша хата — лес зялёны,
Бліндажы і шалашы,
Смела наш баец чырвоны
Немцаў-ворагаў глушы.

І пад Мінскам і пад Брэстам,
Ля Вілейкі, ля Свянцян
Не знаходзіць немец месца
Ад удараў партызан.

Мы на Пцічы, мы на Сожы,
На Вілейцы, на Дзвіне
Білі, б'ем салдат варожых
Па загрыўку, па спіне.

Выйшлі немцы на засаду,
Каля лесу заляглі,
А мы іх, фашысцкіх гадаў,
Прыкавалі да зямлі.

Цераз рэчку быструю
Немец мосцік выстраіў,
Партызаны падышлі,
Мост ўзарвалі і пайшлі.

Партызанская работа —
Немцам гора і турбота:
Што ні ноч, то пад адхон
Пушчан новы эшалон.

Немцы ладзілі засаду,
Выбіралі хмызнякі,
Падпаўзлі да іх мы ззаду
Ды ударылі ў штыкі.

Ночка цёмная без зорак,
Як магу цябе забыць,
Калі гэтай ночкай цёмнай
Пайшоў немцаў я глушыць.

Нарачанскія туманы
Засцілаюць берагі,
Б'юць нямецкіх акупантаў
Партызаны-рыбакі.

Нарач-возера, як мора,
Не убачыш берагоў.
Бараніць свае прасторы
Кожны верны сын гатоў.

На ўзбярэжжах на разлогіх
Чараты — куды ні глянь.
Хочуць фрыцы запалохаць
Нас, свабодных нарачан.

Ды нямецкія загады,
Не застрашаць рыбакоў:
Забіраем аўтаматы,
Выплываючы на лоў.

Закідаем падвалокі,
Не зважаем на загад —
Немца ўтопім у затоках,
Як у лужыне шчанят.

Пойдзеш, мілы, ў партызаны,
Вазьмі мяне ваяваць:
Будзеш біць ты з кулямёта,
Я — патроны падаваць.

Прыйшоў немец па пасаг
З аўтаматам у руках,
Куляй і гранатаю
Немца я пасватаю.

Сэрца б'ецца і сумуе,
Жаль мне сэрца роднага —
Палюбіла партызана,
Мсціцеля народнага.

Ў партызаны паступіла,
Красну лентачку нашу,
Партызана палюбіла,
Партызанам даражу.

Я надзену шынель шэры,
Шапачку-вушаначку,
Пазнавай жа, мой міленькі,
Сваю партызаначку.

А мой мілы партызан,
А я — партызаначка,
У кавалерыю мы пойдзем —
Баявая парачка.

Разышоўся Вільгельм Кубэ:
— Беларусь — калонія!
Партызаны міну ў бок —
І ўся цырымонія.

Паліцай на казе
Самагонку вязе,
Яму куля ўздагон —
І душа з яго вон.

Дождж ідзе, дождж ідзе,
На вуліцы слізка,
Уцякайце, паліцаі,
Партызаны блізка.

Паліцэйскія сабакі,
Куды будзеце ўцякаць?
Скора вас фашысты кінуць,
Мы не будзем вас прымаць.

Ой, не спіць Адольф-скаціна,
Гебельсу маркоціцца.
Іх ваенная машына
У канаву коціцца.

Не хавайся, Гітлер-вораг,
Ўсюды мы цябе знайдзём,
Мы упэўнены, што скора
Усіх фашыстаў пераб'ём.

Як ты, Гітлер, ні старайся,
Ўсюды справы твае — «швах»,
Ты Расію не раскусіш,
Бо арэх не па зубах.

З неба зорачка упала,
Яшчэ многа упадзе,
Многа Гітлеру папала,
Яшчэ болей пападзе.

Ах ты, Гітлер касавокі,
Ненавісны вораг мой,
Бацьку вывез у няволю,
Засталась я сіратой.

Сядзіць Гітлер на асіне,
Богу моліцца балван:
— Памажыце, ўсе святыя,
Пакарыці партызан!

Тэлеграму з таго свету
Прыслаў Гітлеру Кубэ:
— Прыязджай, мой родны фюрэр,
Мне тут сумна без цябе.

Пачуў Гітлер у Берліне,
Што ён скора ўжо загіне,
Падхапіў свае манаткі
І ўцякае без аглядкі.

Не садзіце на машыну
На машыну сінюю —
Не вязіце вы мяне
Ў Германію сілаю.

Надаелі мне дубы,
Сосны надакучылі:
Фрыцы сэрца пераелі,
«Бобікі» замучылі.

Надаела пайка хлеба,
І салома мятая.
Да чаго ж нам надаела
Тут жыццё праклятае.

Ты, машына паравая,
Адвязі мяне дамой,
Мне фашысцкая старонка
Аказалася турмой.

Калі б знала, ведала,
На вайну б паехала,
На вайну, у самы бой,
Дзе ваюе мілы мой.

Найдзі, хмара, найдзі, гром,
І разбі фашысцкі дом,
За каменнаю сцяной
Забі Гітлера стралой.

Ты кукуй, кукуй зязюля,
На зялёнай на мяжы,
Ты ляці стралою, куля,
Чэрап фрыцу праніжы.

Стаіць бяроза над ракой,
Галіначка хістаецца,
А мой мілы у партызанах
З фрыцамі змагаецца.

На ігрушы спеюць грушы,
А на дубе — жалуды,
Вытрасае з катаў душу
Мой мілёнак малады.

Выйдзем ноччу, дзевачкі,
Станем на узгорачкі,
Можа, ўбачым на усходзе
Крамлёўскія зорачкі.

Немчуру не раз мы білі
Ды пра ўсё яны забылі;
А на гэты, відаць, раз
Будуць вечна помніць нас.

Нашы мужныя героі
Родны край праславілі,
Пасярод Германіі
Чырвоны сцяг паставілі.

Адышла вайна-навала...

Адышла вайна-навала,
Адгрымеў суровы бой.
Сонца светлае заззяла
Над краінай дарагой.

Мой мілёнак трактарыстам,
Водзіць трактар з краю ў край.
У вайну граміў фашыстаў —
Цяпер росціць ураджай.

Мілы мой прышоў з вайны,
Глянь на гімнасцёрачку:
Справа, злева ардэны
І Героя зорачка.

Ваня мой служыў танкістам,
Узнагароджан не раз быў,
А ў калгасе трактарыстам —
Новы ордэн заслужыў.

Мы фашыстаў разграмілі.
Перасталі ваяваць.
Едзем мы цяпер дадому
Край Саветаў будаваць.

Партызаны-партызаны,
Браты нашы родныя,
Вы геройскі ваявалі
За справы народныя.

Не грукочуць грозна пушкі,
Мы у працы, не ў баю.
У новых песнях і частушках
Славім Родзіну сваю.

Дзе снарадныя варонкі
Сум наводзілі на нас,
З пераможнай песняй звонкай
Падымаем мы калгас.

Быў любімы мой танкістам,
Біў фашыстаў на вайне,
А цяпер ён трактарыстам
Норму выканаў ўтрайне.

Методыка збірання фальклору

Думка аб неабходнасці збірання вусна-паэтычнай творчасці неаднаразова выказвалася вучонымі і пісьменнікамі яшчэ ў мінулым стагоддзі. Ян Чачот, шкадуючы, што ханісты даўніх часоў не захавалі дакладных запісаў песень і паданняў народа, папярэджваў, што яшчэ больш слушна будуць папракаць нас нашчадкі, калі мы не збяром рупліва гэтых помнікаў і не перададзім ім. Усведамленне вялікай каштоўнасці духоўнай спадчыны, народнай паэзіі многімі прадстаўнікамі беларускай, рускай, украінскай, польскай інтэлігенцыі дало свой плён. У другой палавіне XIX — пачатку XX ст. былі выдадзены буйнейшыя зборнікі беларускай народнай вусна-паэтычнай творчасці: зборнікі песень і прыказак І. І. Насовіча, шматтомныя выданні фальклору розных жанраў П. В. Шэйна, Е. Р. Раманава, М. Федароўскага, У. М. Дабравольскага, зборнікі песень З. Ф. Радчанкі і казак А. К. Сержпутоўскага і многа іншых каштоўных прац. Аднак нават і гэтыя фундаментальныя выданні не змаглі адлюстраваць усяго багацця і ўсёй ідэйна-тэматычнай і жанравай разнастайнасці беларускай народнай творчасці. Да таго ж прыхільнікі і паслядоўнікі розных школ і напрамкаў у фальклярыстыцы асноўную ўвагу надавалі ў сваёй збіральніцкай дзейнасці тым творам, якія лічылі найбольш каштоўнымі, абмінаючы часам тое, што з іх пункту погляду ўяўлялася другарадным. Збіраючы традыцыйны фальклор, у першую чаргу абрадавую паэзію, чарадзейныя казкі, прадстаўнікі міфалагічнай школы, напрыклад, амаль не зважалі на многія сучасныя ім з'явы: фальклор рабочых, частушкі, рэвалюцыйную паэзію, якая, мяркуючы па дакументах, была распаўсюджана і ў горадзе, і на вёсцы. Увогуле творам сацыяльна вострым, накіраваным супраць прыгнёту, эксплуатацыі, духоўнага і нацыянальнага ўціску, у фальклорных зборніках мінулага — пачатку нашага стагоддзя не надавалася належнай увагі.

У 20—30-я гг. XX ст. работа па збіранні і вывучэнні беларускага фальклору набыла новыя арганізацыйныя формы, новыя арыенціры, галоўным з якіх стала сучаснасць, што дало магчымасць кампенсаваць некаторыя недахопы папярэдняй збіральніцкай дзейнасці. Пры сектары этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі АН Беларусі быў створаны багаты архіў, фанатэка, выдадзены шэраг зборнікаў. Але жорсткая арыентацыя на сучаснасць прывяла да таго, што класічны традыцыйны фальклор і ў збіральніцкай, і ў даследчай практыцы апынуўся на другім месцы.

У пасляваенны час беларуская фальклярыстыка зрабіла новы крок наперад. Выраслі і ўмацаваліся арганізацыйна кадры фальклярыстаў больш планамернай і мэтанакіраванай стала збіральніцкая работа. Рэгулярна праводзяцца фальклорныя экспедыцыі супрацоўнікамі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Рэспублікі Беларусь. Зараз у фондах Інстытута знаходзіцца каля 600 тысяч запісаў тэкстаў фальклорных твораў, звыш 35 тысяч магнітаграм. Вядзецца картаграфаванне, што дапамагае навуко-

ва абгрунтавана вызначыць маршруты экспедыцый. Фальклорныя фонды ІМЭФ папаўняюць удзельнікі конкурсаў на лепшага збіральніка вуснапаэтычнай творчасці і пастаянныя нашы карэспандэнты. Цікавыя матэрыялы мы атрымалі з вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. З новых запісаў звяртаюць на сябе ўвагу ўзоры сучаснай вусна-паэтычнай творчасці, фальклор Вялікай Айчыннай вайны, запісы паэзіі рабочых, тэксты народнай драмы, апавядальных твораў і многіх жанраў традыцыйнага песеннага фальклору. Значная колькасць новых запісаў апублікавана ў зборніках і даследаваннях, а таксама ў шматтомным выданні «Беларуская народная творчасць», 42 кнігі якога ўжо выйшлі з друку.

Актывізавалася збіральніцкая работа і ў вышэйшых навучальных установах рэспублікі. Гэтаму садзейнічала ўключэнне ў вучэбны план студэнтаў-філолагаў фальклорнай практыкі. Лепшыя студэнцкія запісы склалі аснову фальклорных зборнікаў, якія выдаюцца БДУ.

Нягледзячы на відавочныя дасягненні, работа па збіранні і публікацыі беларускага фальклору павінна працягвацца, як працягваецца і далейшае развіццё самой вусна-паэтычнай творчасці. Нямала новага, цікавага і каштоўнага яшчэ і сёння можа знайсці збіральнік у старажытных пластах народнай творчасці, у прыватнасці ў абрадавай паэзіі. Навуковую каштоўнасць уяўляе кожны новы варыянт ужо вядомага па ранейшых запісах твора, а таксама запісы сучаснага фальклору. Збіранне можа весціся па розных праграмах: запісы твораў аднаго жанру, адной тэматыкі, запісы твораў усіх жанраў, якія бытуюць у пэўнай мясцовасці і г. д., але ў кожным выпадку гэта работа павінна быць мэтанакіраванай, сістэматычнай і адпавядаць пэўным навукова-метадычным патрабаванням.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЗБІРАННЯ ФАЛЬКЛОРУ

Збіральнік народнай творчасці павінен вывучыць раён, дзе ён вядзе запіс. Трэба пазнаёміцца з мінулым краю, ведаць гістарычныя падзеі, асобныя бітвы ў час войнаў, сялянскія паўстанні, рэвалюцыйны рух, а таксама гістарычныя помнікі, старажытныя збудаванні, курганы і г. д. Апіраючыся на гэтыя веды, у размове з насельніцтвам можна нагадаць той ці іншы факт і ў сувязі з ім запытацца, ці не склалася ў народзе паданне, песня, легенда ці які-небудзь іншы твор, звязаны з гэтай падзеяй. Пры вывучэнні краю неабходна звярнуць увагу і на сучасны яго стан: эканамічнае развіццё, культурныя дасягненні і г. д. Вельмі карысная сувязь з калектывамі мастацкай самадзейнасці, у якіх не толькі выконваюцца, але часта і складаюцца новыя фальклорныя творы.

Пры збіранні рабочага фальклору вельмі важна ведаць гісторыю прадпрыемства, калі яно заснавана, якія падзеі мелі месца на гэтым прадпрыемстве. Падобная інфармацыя дапаможа збіральніку ў размовах з ветэранамі працы хутчэй атрымаць неабходныя звесткі аб распаўсюджанасці рабочай паэзіі і яе характарыстыку.

У падрыхтоўку трэба ўключыць і азнаямленне з этнаграфічнай літаратурай, таму што многія творы фальклору звязаны з народнымі звычаямі або абрадамі. Не менш карысна вывучыць асаблівасці мясцовай гаворкі, што дазволіць збіральніку найбольш дакладна запісваць фальклорныя творы.

Дакладнасць запісу забяспечваецца шырокім выкарыстаннем магнітафонаў і відэатэхнікі, што патрабуе ад збіральніка пэўных навыкаў працы з гэтай апаратурай, умення весці запісы як ад індывідуальных выканаўцаў, так і ад калектываў.

ЯК ЗАПІСВАЦЬ ФАЛЬКЛОР

Перад тым, як гаварыць аб запісванні фальклорных твораў, неабходна спыніцца на патрабаваннях да запісаў. Думка аб тым, што ў запісах фальклорных твораў павінна быць адлюстравана душа народа, яго жыццё, мары і надзеі, узнікла даўно. Найбольш абгрунтавана яна была выказана М. А. Дабралюбавым у рэцэнзіі на зборнік А. Афанасьева «Народныя рускія казкі», дзе М. А. Дабралюбаў пісаў: «Нам казкі важныя болей за ўсё як матэрыялы для характарыстыкі народа».

Сам па сабе фальклорны твор, хаця і ўяўляе мастацкую каштоўнасць і выказвае глыбокія думкі, не дае поўнага малюнка адносін народа да гэтага твора. Якое месца займае ў абрадзе тая ці іншая песня, ці супадае паданне з рэчаіснасцю — гэтыя і многія іншыя пытанні патрабуюць адказу. І збіральнік фальклору павінен даць на іх адказ.

Важна ведаць, наколькі пашыраны той ці іншы твор, межы яго распаўсюджанасці, калі іх магчыма вызначыць.

У асобных выпадках у пэўную мясцовасць прыносяць з сабою творы людзі з іншых месц. Цікава высветліць, як гэтыя творы ўспрымаюцца, як уваходзяць у мясцовы рэпертуар: са зменамі ці цалкам захоўваюць свой першапачатковы выгляд.

Многія творы беларускай народнай паэзіі звязаны з пэўнымі абрадамі і звычаямі, і вельмі добра, калі разам з абрадавымі песнямі збіральнік дае апісанне гэтых абрадаў і звычаяў. Напрыклад, запісваючы песні веснавога цыкла, трэба высветліць, якія народныя веснавыя святы былі вядомы ў гэтай мясцовасці, як яны называліся, калі і як адзначаліся. Ці існаваў тут звычай загукаць вясну, ці была традыцыя вадзіць карагоды, калі і дзе іх вадзілі, хто ў іх прымаў удзел (толькі дзяўчаты ці дзяўчаты і хлопцы), як называлі карагод — усе гэтыя пытанні патрабуюць адказу. Вясельныя песні пажадана запісваць у тым парадку, у якім яны выконваюцца на вяселлі, разам з апісаннямі асноўных яго этапаў: заручын, зборнай суботы, прыгатавання каравая, пасаду і г. д. Заслугоўваюць увагі і такія элементы вяселля, як ад'езд маладога да маладой, сустрэча маладога ў дварах маладой, сустрэча маладога і маладой у дварах яго бацькоў і інш. Гэтыя эпізоды таксама маюць свой сцэнарый, сваіх дзеючых асоб, свае песні.

Параўнанне сённяшніх запісаў з дарэвалюцыйнымі дасць магчымасць высветліць найбольш устойлівыя элементы абрадаў, што дапаможа стварыць новыя абрады або падтрымаць тое карыснае новае, што ўзнікае ў народзе.

Пры запісах песень трэба абавязкова адзначыць, як тая ці іншая песня называецца ў народзе: калядная, вяснянка, калыханка, жніўная, талочная, шахцёрская і г. д.

Зараз на дапамогу збіральнікам павінна прыйсці сучасная гуказапісваючая апаратура. Але і ў гэтым выпадку, калі фальклорны твор, асабліва песня ў харавым выкананні, запісваецца на магнітафон, неабходна весці запісы ў сшытку, што гарантуе дакладнасць тэксту і дазваляе збіральніку падаць усе неабходныя звесткі аб творы, пра якія гаварылася вышэй.

Запісваць творы народнай паэзіі неабходна ў час выканання. Добры народны выканаўца — гэта сапраўдны мастак, які часта ідзе сваім шляхам і па сутнасці стварае свае ўласныя варыянты народных твораў. Ён уносіць у іх свой мастацкі густ, свае адносіны да той ці іншай з'явы, свой светапогляд. Але такое творчае выкананне патрабуе пэўных умоў. Ні ў якім разе нельга перабіваць выканаўцу пытаннямі, просьбамі спыніцца, паўтарыць той ці іншы радок, даваць яму няспынна адчуваць, што запісваецца кожнае яго слова. У гэтым выпадку замест добрага мастацкага твора мы можам запісаць сюжэтную схему, пераказаную сухой невыразнай мовай.

Калі ж збіральнік не паспеў запісаць асобныя месцы фальклорнага твора, ён павінен іх прапусціць, і толькі пасля таго, як выкананы ўвесь твор,

можна папрасіць зноў паўтарыць яго. Запісваць трэба слова ў слова, захоўваючы ўсе асаблівасці мовы і манеру выканання.

Ні ў якім выпадку нельга апрацоўваць запісы, «падпраўляць» мову ці змест, бо гэтым самым знішчаецца ўсякая навуковая каштоўнасць работы. Запісваць творы трэба так, як чуе іх збіральнік. «Пісаць як чуеш» — гэта павінна быць правілам. Прытрымліваючыся яго, збіральнік перадасць не толькі змест, але і ўсе моўныя асаблівасці твора.

Захаванне галоўных дыялектных асаблівасцей: фанетычных, марфалагічных і лексічных — мае важнае навуковае значэнне. Яны сведчаць аб часе ўзнікнення твора, дапамагаюць вызначыць месца ўзнікнення і г. д. Апрача гэтага, мясцовыя асаблівасці арганічна ўваходзяць у сістэму мастацкіх сродкаў твора.

Фальклорныя запісы робяцца ў адпаведнасці з існуючай зараз сістэмай графікі, звычайным беларускім алфавітам, які дазваляе перадаць усе адценні мовы. Можна запісваць і ў фанетычнай транскрыпцыі, але гэта больш складана. Трэба запісваць усе адступленні, уводныя эпізоды, а таксама рэплікі слухачоў. Абавязкова адзначаць месца знаходжання націску. Дыялектныя, мала пашыраныя словы неабходна тлумачыць. Пажадана такое тлумачэнне атрымаць ад самога выканаўцы твора ці ад слухачоў.

Запіс фальклорных твораў — цяжкая і складаная справа. Розныя фальклорныя жанры маюць свае асаблівасці.

Песня, як і ўсе творы, запісваецца ў час выканання, пасля чаго запіс правяраецца і ўдакладняецца пры паўторным выкананні ці пад дыктоўку выканаўцы. Песня падзяляецца на асобныя музычныя фразы, якія супадаюць з вершаванымі радкамі. Пры запісванні неабходна прытрымлівацца гэтага падзелу. Калі ёсць магчымасць, пажадана, каб запісвалі песню адначасова два збіральнікі. Пасля запісу тэкст звяраецца, а спрэчныя месцы высвятляюцца з дапамогай выканаўцы. Найбольш каштоўнымі з'яўляюцца запісы песень, дзе разам з тэкстамі даецца і мелодыя.

Больш складаны запіс эпічных жанраў. Хуткі тэмп, у якім часам вядзецца расказ, не заўсёды дазваляе запісаць яго слова ў слова. Пры паўторнай перадачы твора казачнік рэдка прытрымліваецца яго першапачатковага тэксту. Таму пажадана як можна шырэй выкарыстоўваць пры фальклорных запісах магнітафон.

Калі песні, казкі, частушкі можна запісваць, папярэдне падрыхтаваўшыся да гэтага, то так званыя «малыя» жанры: прыказкі, прымаўкі, загадкі — запісаць значна цяжэй. Яны не выконваюцца, а проста ўжываюцца людзьмі, прадбачыць загадзя іх ужыванне ў мове немагчыма. Таму збіральніку гэтых жанраў трэба быць надзвычай уважлівым да народнай мовы. Адны і тыя ж прыказкі і прымаўкі звычайна ўжываюцца ў розных выпадках, набываюць розны сэнс, у сувязі з гэтым іх неабходна запісваць у кантэксце, гэта значыць разам з іншымі словамі або сказамі, каб было зразумела, якую думку падкрэсліваў ці абагульняў чалавек. Калі тая ці іншая прыказка або прымаўка ўжыта ў пэўным сэнсе і вядома, што яна ўжываецца і ў іншых выпадках, неабходна падкрэсліць гэта. Разам з загадкай трэба запісваць і адгадкі, якіх да адной загадкі можа быць некалькі. Калі існуюць варыянты фальклорных твораў, неабходна запісваць і іх.

ПАШПАРТЫЗАЦЫЯ ФАЛЬКЛОРНЫХ ЗАПІСАЎ

Вядома, што фальклорныя запісы з'яўляюцца не толькі мастацкімі творамі, але і матэрыялам для даследаванняў вучоных — фалькларыстаў, літаратуразнаўцаў, мовазнаўцаў, гісторыкаў, этнографаў, мастацтвазнаўцаў і інш. А для навуковых даследаванняў важна ведаць час, месца запісу, ад каго запісана і многае іншае. Таму, каб забяспечыць навуковую каштоўнасць

фальклорных запісаў, да кожнага з іх неабходна дадаць наступнае:

1) дату запісу;

2) месца запісу твора: вобласць, раён, вёска, калгас, горад, завод, навучальная ўстанова;

3) звесткі аб асобе, ад якой запісаны твор: прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост, нацыянальнасць, прафесія, адукацыя, адрас.

Калі высвятляецца, што асаблівасці біяграфіі выканаўцы мелі пэўны ўплыў на яго рэпертуар, трэба адзначыць і гэта. Напрыклад, чалавек, які доўга жыў у другой мясцовасці, можа прынесці з сабой творы, якія ён успрыняў там. Гэтыя творы могуць набыць пашырэнне ў новым месцы (так, напрыклад, распаўсюджваліся ў Беларусі салдацкія песні) і могуць застацца толькі здабыткам гэтай адной асобы. Такія факты маюць значную навуковую цікавасць;

4) ад каго выканаўца пераняў твор.

Да пашпарта дадаюцца звесткі, аб якіх было сказана раней у раздзеле «Як запісваць фальклор»: аб распаўсюджанасці твора, сувязі з гістарычнымі падзеямі, абрадамі і г. д.

Пашпартызацыю павінны мець і магнітафонныя запісы. Перад тым, як пачаць запісы фальклорных твораў, збіральнік запісвае на стужцы ўсе асноўныя звесткі, што ўваходзяць у пашпарт фальклорнага твора: хто вядзе запісы, дзе, калі і ад каго. Перад кожным творам аб'яўляецца яго назва і жанравая прыналежнасць. У канцы запісаў, зробленых ад аднаго выканаўцы або ў адным населеным пункце, пашпарт паўтараецца. Да кожнай магнітафоннай стужкі прыкладаецца вопіс твораў, якія на ёй запісаны ў парадку іх выканання.

Спіс скарачэнняў



ААН РФ	Архіў Акадэміі навук Расійскай Федэрацыі (Санкт-Пецярбургскае аддзяленне)
АГГ	Архіў Геаграфічнага таварыства Расійскай Федэрацыі
АІМЭФ	Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Рэспублікі Беларусь
Анталогія	*Цітовіч Г. І.* Анталогія беларускай народнай песні. Мн., 1975. 616 с.
Балады	Балады / Уклад., сістэматызацыя, уступ. арт. і камент. Л. М. Салавей: У 2 кн. Мн., 1977—1978. Кн. 1. 784 с. Кн. 2. 744 с.
Барышаў, Саннікаў	*Барышаў Г. І., Саннікаў А. К.* Беларускі народны тэатр батлейка. Мн., 1962. 180 с.
Беларусь у нар. тв-ці	Дарэвалюцыйная і савецкая Беларусь у народнай творчасці / Пад рэд. Я. Коласа, М. М. Нікольскага. Мн., 1938. 287 с.
Бел. жарты	Беларускія жарты. Мн., 1915. 32 с.
Бел. казкі	Беларускія народныя казкі. Мн., 1981. 480 с.
Бел. народ	Беларускі народ супроць папоў і рэлігіі. Мн., 1939. 189 с.
Бел. песни	Белорусские песни, собранные И. И. Носовичем.— Зап. ИРГО по отд-нию этнографии. Спб., 1873. Т. 5. С. 45—280.
Бел. песні	Беларускія народныя песні / Запіс М. Чуркіна. Мн., 1959. 136 с.
Бел. тв-ць	Беларуская народная творчасць савецкага часу / Склад. В. А. Захарава. Мн., 1978. 208 с.
Бел. фальклор	Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны. Мн., 1961. 620 с.
Бел. эпас	Беларускі эпас / Пад рэд. П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава. Мн., 1959. 320 с.
Бессонов	*Бессонов П.* Белорусские песни. М., 1871. XXXI, III, 176 с.

Булгаковский	*Булгаковский Д. Г.* Пинчуки. Спб., 1890. 200 с.
Валачобныя песні	Валачобныя песні / Склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей, муз. часткі В. І. Ялатаў. Мн., 1980. 560 с.
Веснавыя песні	Веснавыя песні / Склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей, муз. часткі В. І. Ялатаў. Мн., 1979. 608 с.
Восеньскія песні	Восеньскія і талочныя песні / Уклад. А. С. Ліса, С. Т. Асташэвіча, муз. часткі В. І. Ялатава. Мн., 1981. 679 с.
Вяселле	Вяселле: Абрад / Уклад., уступ. арт. і камент. К. А. Цвіркі. Мн., 1978. 640 с.
Gawrońska	*Gawrońska B.* Piesni ludowe ziemi Wilenskiej i Nowogródzkiej. Wilno, 1935. 78 s.
Гарэцкі, Ягораў	*Гарэцкі М., Ягораў А.* Народныя песні з мелодыямі. Мн., 1928. 205 с.
Гілевіч (1973)	Песні сямі вёсак / Уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. Мн., 1973. 512 с.
Гілевіч (1974)	Песні народных свят і абрадаў / Уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. Мн., 1974. 464 с.
Гілевіч (1979)	Лірыка беларускага вяселля / Уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. Мн., 1979. 655 с.
Гілевіч (1983)	Народныя казкі-байкі, апавяданні, мудраслоўі / Уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. Мн., 1983. 350 с.
Гілевіч (1992)	*Гілевіч Н.* Мой белы дзень. Мн., 1992. 331 с.
Гильтебрандт	*Гильтебрандт П.* Сборник памятников народного творчества Северо-Западного края. Вильна, 1866. XVIII, 300 с.
Грынблат	*Грынблат М.* Песні беларускага народа. Мн., 1940. Т. 1. 392 с.
Грынблат, Ялатаў	*Грынблат М. Я., Ялатаў В. І.* Радзінная паэзія. Мн., 1971. 784 с.
Грыневіч	*Грыневіч А.* Беларускі дзіцячы спеўнік. Вільня, 1925. 31 с.
Грыневіч, Зязюля	*Грыневіч А., Зязюля А.* Беларускія песні з нотамі. Пб., 1912. Т. 2. 32 с.
Дзень паэзіі	Дзень паэзіі. Мн., 1969.
Дзіцячы фальклор	Дзіцячы фальклор / Склад. Г. А. Барташэвіч. Мн., 1972.
Дмитриев	*Дмитриев М.* Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края. Вильна, 1869. 264 с.
Добровольский. Т. 1	*Добровольский В. Н.* Смоленский этнографический сборник: В 4 т. Спб., 1891. Т. 1. 716 с.

Добровольский. Т. 4	*Добровольский В. Н.* Смоленский этнографический сборник: В 4 т. М., 1903. Т. 4. XVI, 718 с.
Довнар-Запольский	*Довнар-Запольский М.* Песни пинчуков. Киев, 1895. Вып. 1. XXVIII, 303 с.
Жанчына ў бел. тв-ці	Жанчына ў беларускай народнай творчасці / Пад рэд. М. М. Нікольскага, М. Я. Грынблата. Мн., 1940. 519 с.
Жніўныя песні	Жніўныя песні / Уклад А. С. Ліса, С. Т. Асташэвіча, муз, часткі В. І. Ялатава. Мн., 1983. 814 с.
Захарава	*Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах. Мн., 1973. 304 с.
Земляробчы каляндар	Земляробчы каляндар (абрады і звычаі). Мн., 1990. 405 с.
Zieńkiewicz	*Zieńkiewicz R.* Piosenki gminne ludu Pinskiego. Kowno, 1851. XVIII, 415 s.
Зянько	*Зянько У.* Спадчына маёй маці. Мн., 1993.
Кабашнікаў, Цішчанка	*Кабашнікаў К. П., Цішчанка І. К.* Беларускія частушкі. Мн., 1960. 182 с.
Казкі	Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі. Мн., 1971. 496 с.
Каладзінскі	*Каладзінскі М. А.* Народны тэатр. Мн., 1983. 511 с.
Калеснік	*Калеснік У.* Рэвалюцыйныя песні былой Заходняй Беларусі // Полымя. 1956. № 9. С. 106—117.
Каминский	*Каминский В. А.* Белорусы Ново-Александровского уезда // Филол. зап. Воронежск. ун-та. 1910. Вып. 4. С. 739—767.
Киркор	*Киркор А.* Заметки о западной части Гродненской губернии: Этногр. сб. Спб., 1858. Вып. 3. С. 47—113.
Косич	*Косич М.* Литвины-белорусы Черниговской губернии // Живая старина. Спб., 1901. Вып. 3-4. С. 1—88.
Kuba	*Kuba L.* Białoruski narodni pîsni: Slovanski sbornik. Praha, 1887. VI.
Ластоўскі	Wypisy z bełaruskaj litaratury. Casć 1. Złażyu i wydaŭ W. Lastoŭski. Wilnia, 1918.
Ледаховіч	*Ледаховіч Э.* Беларускія народныя песні Гродзеншчыны. Мн., 1960. 116 с.
Логіны	*Логіны І.* і *Я.* Моладаўскія песні. [Рукапіс] 250 с.
Малевич	*Малевич С.* Белорусские народные песни. Спб., 1907. 195 с.
Нар. тв-ць	Народная творчасць / Уклад. С. І. Васілёнак. Мн., 1940. 396 с.

Никифоровский	*Никифоровский М. Я.* Белорусские песни «частушки». Вильна, 1911. IV, 166 с.
Pietkiewicz	*Pietkiewicz Cz.* Kultura duchowa Polesia Kzeczyckiego. Warszawa, 1938. 459 s.
ПБЗК	Паэзія беларускага земляробчага календара. Мн., 1992.
Пинчуки	*Булгаковский Д. Г.* Пинчуки: Этногр. сб. Спб., 1880. 210 с.
Праблемы фальклору	Праблемы сучаснага беларускага фальклору. Мн., 1969. 171 с.
Радченко	*Радченко З.* Гомельские народные песни. Спб., 1888. 265 с.
Романов. Материалы	*Романов Е. Р.* Материалы по этнографии Гродненской губернии. Вильна, 1912. Вып. 1. 237 с.
Романов. Вып. 1-2	*Романов Е. Р.* Белорусский сборник. Киев, 1886. Т. 1. Вып. 1-2. XI, 468 с.
Романов. Вып. 3	*Романов Е. Р.* Белорусский сборник. Витебск, 1887. Вып. 3. XVIII, 444 с.
Романов. Вып. 5	*Романов Е. Р.* Белорусский сборник. Витебск, 1891. Вып. 5. XV, 448 с.
Романов. Вып. 6	*Романов Е. Р.* Белорусский сборник. Могилев, 1901. Вып. 6. IV, 528 с.
Романов. Вып. 7	*Романов Е. Р.* Белорусский сборник. Вильна, 1910. Вып. 7. 44 с.
Романов. Вып. 8	*Романов Е. Р.* Белорусский сборник. Витебск, 1912. Вып. 8. VIII, 600 с.
РФВ	Русский филологический вестник. Варшава, 1884, 1885. Т. 13. № 1-2.
Сахараў	*Сахараў С. П.* Народная творчасць латгальскіх і ілукстэнскіх беларусаў. Рыга, 1940. Вып. 1. 164 с.
Сержпутовский	*Сержпутовский А. К.* Сказки и рассказы белорусов-полешуков. Спб., 1911. 188 с.
Сержпутоўскі	*Сержпутоўскі А. К.* Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета. Л., 1926. 265 с.
Сучасны фальклор	Сучасны беларускі фальклор / Склаў І. В. Гутараў. Мн., 1963. 144 с.
Сучасныя песні	Сучасныя народныя песні і частушкі / Склаў П. Ахрыменка. Гомель, 1955. 31 с.
Тэраўскі	*Тэраўскі У.* Беларускі лірнік. Берлін, 1922. 89 с.
Federowski. Т. 3	*Federowski M.* Lud białoruski na Rusi Litewskiej. Kraków, 1903. T. 3. V, 314 s.
Federowski. Т. 5	*Federowski M.* Lud białoruski na Rusi Litewskiej. Warszawa, 1950. T. 5. 920 s.

Хрэстаматыя	Беларускі фальклор: Хрэстаматыя / Склад. К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс, А. С. Фядосік, І. К. Цішчанка. Мн., 1985. 749 с.
Цітовіч	*Цітовіч Г.* Песні беларускага народа. Мн., 1959. 419 с.
Чубинский	Труды этнографическо-статистической экспедиции в Западный край...: Материалы и исследования, собранные П. П. Чубинским. Спб., 1872. Т. 3.
Чуркін	*Чуркін М.* Беларускія народныя песні і танцы. Мн., 1949. 192 с.
Czeczot	*Czeczot J.* Piosinki wieśniacze z nad Niemna i Dzwiny... Wilno, 1846. 134 s.
Шейн. Бел. песни	*Шейн П. В.* Белорусские песни. Спб., 1873. 566 с.
Шейн. Т. 1. Ч. 1	*Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: В 3 т. Спб., 1887. Т. 1. Ч. 1. XXVI, 585 с.
Шейн. Т. 1. Ч. 2	*Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: В 3 т. Спб., 1890. Т. 1. Ч. 2. XXXI, 708 с.
Шейн. Т. 2	*Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: В 3 т. Спб., 1893. Т. 2. XIV, 715 с.
Шейн. Т. 3	*Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: В 3 т. Спб., 1902. Т. 3. IV, 535 с.
Ширма. Двести песен	*Ширма Г. Р.* Двести белорусских народных песен. М., 1958. 275 с.
Шлюбскі	*Шлюбскі А.* Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны: У 2 т. Мн., 1927. Т. 1. 192 с.
Шырма	*Шырма Р. Р.* Беларускія народныя песні, загадкі, прыказкі. Мн., 1947. 220 с.
Шырма. Т. 1	*Шырма Р.* Беларускія народныя песні: У 3 т. Мн., 1959. Т. 1. 424 с.
Шырма. Т. 2	*Шырма Р.* Беларускія народныя песні: У 3 т. Мн., 1960. Т. 2. 430 с.
Шырма. Т. 3	*Шырма Р.* Беларускія народныя песні: У 3 т. Мн., 1962. Т. 306 с.
Ялатаў	*Ялатаў В. І.* Ад песні да песні. Мн., 1961. 108 с.
Янкоўскі	*Янкоўскі Ф.* Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы. Мн., 1962. 556 с.
Янчук	*Янчук Н. Я.* По Минской губернии // Изв. императорск. о-ва любителей естествознания, антропологии и этнографии. М., 1899. Т. 11. Кн. 9. Вып. 1. 30 с.

8 ЦБС Читальный зал г. Минск

Змест-паказальнік



С.	*Змест**	*Крыніцы***
3	Ад складальнікаў	
5	**АСАБЛІВАСЦІ І ЗНАЧЭННЕ ВУСНА-ПАЭТЫЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ**	
17	**ПІСЬМЕННІКІ І ДЗЕЯЧЫ КУЛЬТУРЫ АБ ФАЛЬКЛОРЫ**	
17	П. М. Шпілеўскі	Современник. 1853. № 7. С. 13—14.
18	Аляксандр Рыпінскі	Bialorus. Pariz, 1840. S. 27.
18	Ян Чачот	Dzieje folklorystyki Polskiej 1800—1863. Warszawa, 1970. S. 214.
19	Ян Баршчэўскі	Пачынальнікі: З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / Уклад. Г. В. Кісялёва. Мн., 1977. С. 40—46.
20	Ігнат Храпавіцкі	Rubon. 1845. № 5, 8, 61, 69.
20	Адам Міцкевіч	Mickiewicz A. Dzieła wszystkie. T. 16. S. 230.
20	Уладзіслаў Сыракомля	Gazieta Warszawska. 1855. 25 чэрв.
21	М. В. Доўнар-Запольскі	*Довнар-Запольский М. В.* Исследования и статьи. Киев. Т. 1. С. 337.
21	Янка Купала	Любімы паэт беларускага народа. Мн., 1960. С. 11—12.

* Змест-паказальнік склала В. Аверкіна.
** Гл. спіс скарачэнняў (с. 810).

22 Якуб Колас — *Лужанін М.* Колас расказвае пра сябе. Мн., 1964. С. 20—21.

22 Максім Багдановіч — *Багдановіч М.* Зб. тв.: У 2 т. Мн., 1968. Т. 2. С. 455—456.

23 Вацлаў Ластоўскі — *Ластоўскі.* С. 65—66.

24 Цётка — *Пашкевіч-Цётка А.* Лучынка. 1915. № 2. С. 1.

25 Змітрок Бядуля — *Бядуля З.* Вера, паншчына і воля ў беларускіх народных песнях і казках. Мн., 1924. С. 99—101.

26 Максім Гарэцкі — *Гарэцкі М.* Гісторыя беларускае літаратуры. Мн., 1926. С. 30—31; Максім Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы /Склад. А. С. Ліс, І. У. Саламевіч. Мн., 1984. С. 191—192.

27 Кандрат Крапіва — *Крапіва К.* Зб. тв.: У 4 т. Мн., 1963. Т. 4. С. 267.

27 А. А. Афанасьеў — Полымя. 1969. № 1. С. 198.

27 С. В. Саўчанка — *Савченко С. В.* Русская народная сказка. Киев, 1914. С. 245—246.

27 Е. Р. Раманаў — *Романов Е. Р.* Белорусские народные мелодии // Белорусский сборник. Вильно, 1910. Вып. 7. С. 4.

28 Міхал Федароўскі — *Саламевіч Я.* Міхал Федароўскі. Мн., 1972. С. 224.

28 Антон Грыневіч — Каляндар на 1921 г. Вільня, 1920. С. 15.

28 М. М. Пятуховіч — Полымя. 1918. № 3. С. 177.

29 Уладзімір Тэраўскі — ЛіМ. 1981. 3 верас.

29 Аляксандр Грачанінаў — ЛіМ. 1980. 6 ліп.

29 Сяргей Гарадзецкі — Памяці Янкі Купалы. Ташкент, 1943. С. 33.

29 М. В. Анцаў — Віцебшчына. Віцебск, 1928. Вып. 2. С. 184—192.

31 А. К. Сержпутоўскі — *Сержпутовский А. К.* Сказки и рассказы белорусов полешуков. Спб., 1911. С. 2—4, 7.

32 Максім Танк — Беларускі летапіс. 1937. № 2-3. С. 40.

33 Янка Брыль — *Брыль Я.* Зб. тв.: У 4 т. Мн., 1968. Т. 3. С. 222—223.

34 Рыгор Шырма — *Шырма Р.* Беларускія народныя песні. Вільня, 1929. С. 3.

37 Аляксандр Фадзееў (з пісьма да Р. Шырмы) — Звязда. 1974. 25 жн.

37 А. Кандратовіч — *Кондратович А.* «Я люблю белорусскую поэзию...» // Не-

С.	Змест	Крыніцы
		ман. 1975. № 1. С. 136—138.
40	Генадзь Цітовіч	*Цітовіч Г. І.* Анталогія беларускай народнай песні. Мн., 1969. С. 9.
40	Таццяна Лапаціна	ЛіМ. 1968. 27 сак.
41	Ніл Гілевіч	*Гілевіч Н.* Наша родная песня. Мн., 1968. С. 11—12; *Гілевіч Н.* Мой добры дзень. Мн., 1992.
43	**ЗАМОВЫ**	
44	Замова паляўнічага	*Романов.* Вып. 5. С. 155.
44	Замова на стрэльбу	*Шейн.* Т. 2. С. 556.
44	Замова для пчол	Зап. Ул. К. Цішчанка ў 1975 г. у в. Улукі Слаўгарадскага р-на ад бацькі — Цішчанкі К. А. (1897 г. н.), які запомніў гэту замову ад свайго бацькі // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 75. Спр. 104. Сш. 1. Арк. 68.
44	Замова пры выгане скаціны ў поле	*Шейн.* Т. 2. С. 553.
45	Замова на сцаленне малака ў каровы	Романов. Вып. 5. С. 22.
45	Замова на захаванне жывёлы	Зап. Г. А. Барташэвіч у в. Іскань Быхаўскага р-на ад Д. І. Гапеевай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 73. Спр. 69. Сш. 1. Арк. 83.
46	Замова ад ваўка	*Романов.* Вып. 5. С. 44.
46	Замова ад лесуна	*Шейн.* Т. 2. С. 552.
46	Замова ад дамавіка	Тамсама. С. 524.
46	Замова ад русалкі	Тамсама. С. 525—526.
47	Замова ад ліхога вока	*Шлюбскі.* С. 37—38.
48	Замова ад злога духа	*Романов.* Вып. 5. С. 25.
49	Замова ад нячыстай сілы	Тамсама. С. 10.
49	Замова ад ляку	*Романов.* Вып. 5. С. 36.
49	Замова ад ляку	Тамсама. С. 34.
50	Замова ад ляку	Зап. Г. А. Барташэвіч у пас. Кулага (в. Іскань) Быхаўскага р-на ад Д. І. Гапеевай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 73. Спр. 69. Сш. 2. Арк. 59.
50	Замова ад крыксы	*Романов.* Вып. 5. С. 33.
51	Замова ад змяінага ўкусу	*Шейн.* Т. 2. С. 2. 550.
51	Замова ад шалу	*Романов.* Вып. 5. С. 104.
51	Замова ад кровацячэння	*Шейн.* Т. 2. С. 540.
51	Замова ад ліхаманкі	Тамсама. С. 554.
52	Замова ад лішая	*Романов.* Вып. 5. С. 95.
52	Замова ад скулы	*Добровольский.* Ч. 1. С. 195.

52 Замова ад зубнога болю — *Шейн.* Т. 2. С. 540.
52 Замова ад хваробы валасоў — Тамсама. С. 554.
53 Замова ад залатніка — Зап. І. Цішчанка ў 1951 г. у в. Улукі Слаўгарадскага р-на ад Ганны Прахарэнка (1860 г. н.)
53 Любоўная замова (прысушка) — *Романов.* Вып. 5. С. 151—152.
54 Замова ад нагавору — Зап. пад кіраўніцтвам Л. М. Салавей студэнткамі Мінскага педінстытута імя М. Горкага А. Г. Ляшкевіч і І. І. Мурашка ў 1975 г. у в. Прусы Старадарожскага р-на ад Вусік П. С. (68 год) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 73. Спр. 69. Сш. 1. Арк. 52.
54 Прысушка — Зап. Г. А. Барташэвіч у 1975 г. у в. Клінок Чэрвеньскага р-на ад Алісейчык В. Х. (76 год) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 75. Спр. 96. Сш. 1. Арк. 43.

55 **КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ**

58 **КАЛЯНДАРНЫЯ АБРАДЫ**

58 Каляды — Земляробчы каляндар. С. 85—89.
62 Абраднасць Куцці — Тамсама. С. 89—91.
64 Мясцовыя народныя звычаі на калядныя святы — Тамсама. С. 97—100.
67 Масленіца ў вёсцы — Тамсама. С. 132—133.
68 Вялікдзень на Беларусі — Тамсама. С. 160—161.
69 Святы Юрый на Беларусі — Тамсама. С. 180—182.
71 Дзень Тройцы — Тамсама. С. 212—213.
73 «Куст» — Тамсама. С. 214—215.
75 Дзень Івана Купалы — Тамсама. С. 222—227.
80 Абрады сялян Віцебскай і Мінскай губерняў пры ўборцы хлеба з палёў — Тамсама. С. 241—251.
90 Жніўныя абрады — Тамсама. С. 251—255.
94 Багач — Тамсама. С. 272.

95 **ЗІМОВЫЯ ПЕСНІ**

95 **Калядкі і шчадроўкі. Песні калядных ігрышчаў**

95 А Калядачкі, а хадзіце к нам... — *Гілевіч* (1974). С. 16.
95 Прыехала Каляда на белым кані... — Тамсама. С. 13.

С.	Змест	Крыніцы
95	Як пайшла Каляда...	*Гілевіч* (1974). С. 13.
96	Прыехала Каляда ў вазочку...	Тамсама.
96	Добры вечар таму, хто ў етым даму...	ПБЗК. С. 112.
96	За сяньмі, сяньмі там за новымі...	РФВ. Т. 13. № 1-2. С. 266.
97	Ой, ў ляску, ў ляску...	ПБЗК. С. 112.
97	Ці дома, дома сам пан гаспадар?..	Тамсама. С. 115.
98	Пане гаспадару, ці спіш, ці ляжыш?..	*Потебня А. А.* Объяснения малорусских и сродных народных песен: Колядки и щердивки. Варшава, 1887. Т. 1. С. 137.
99	У нашага пана...	ПБЗК. С. 116—117.
99	Пане гаспадар, Бог цябе заве...	Тамсама. С. 124.
100	У нашага пана двор гараджоны...	Тамсама. С. 124—125.
101	Го-го-го, каза...	Шейн. Т. 1. Ч. 1. С. 92.
101	Паварочывайся казёл...	Тамсама. С. 97—98.
102	На новае лета...	*Шырма.* Т. 3. С. 277—278.
102	А ці дома сам пан гаспадар?..	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 58.
103	Ці дома, дома сам пан гаспадар?..	*Шырма.* Т. 3. С. 258.
103	А ў пана, пана, пана Васіля...	ПБЗК. С. 129.
103	Ой, рана, рана куры запелі...	*Шырма.* Т. 3. С. 262—263.
103	Ля варот, варот высокі цяром...	ПБЗК. С. 131.
105	Ой, па мосціку, па залатому...	Тамсама. С. 133.
105	У нашага пана двор гароджаны...	Тамсама. С. 132.
106	Да мостам, мостам да вярбовенькім...	*Захарава.* С. 71—72.
106	Там на рэчаньцы, там на быстранькай...	ПБЗК. С. 139—140.
107	Красна дзевачка, расці скоранька...	Тамсама. С. 141.
107	Ой, у лузе, у лузе красна каліна...	*Радченко.* С. 110—111.
108	Там за садамі трава-мурава...	*Шырма.* Т. 3. С. 267.
108	Узышло, узышло тры месяцы...	Тамсама. С. 261.
108	Ой, пад лесам да пад высокім...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 75—76.
109	Ой, пад вярбою, пад зеляною...	*Чубинский.* С. 440.
109	Ой, рана-парану да куры запелі...	ПБЗК. С. 142.
110	Зажурылася крутая гара...	*Романов.* Вып. 7. С. 117.
110	Там за рэчкаю, там за быстраю...	*Шырма.* Т. 3. С. 265.
111	Ой за варацьмі крутая гара...	ПБЗК. С. 143—145.
112	А ў лузе, ў лузе красна каліна...	Тамсама. С. 146.
112	Хадзіла-блудзіла семсот малайцоў...	Тамсама. С. 147.
113	Зажурылася крутая гара...	Тамсама. С. 151.

114	А збегла, збегла з поля старожа...	ПБЗК. С. 152.
114	Калядка йдзе, сто коні вядзе...	Тамсама. С. 153.
114	Ляцеў каршунішча, каляда...	*Гілевіч* (1973). С. 31.
115	А йшоў-перайшоў, каляда...	Тамсама. С. 32.
115	Чаго ты, рожа, адна ў гародзе?..	ПБЗК. С. 164.
116	Да я Каляду да на кут павяду...	Тамсама. С. 159—160.
116	Пайшла Каляда калядуючы...	ПБЗК. С. 159—160.
117	У канцы сяла да стаіць вярба...	Тамсама. С. 160—161.
118	Ой, рана, рана каваліха ўстала...	Тамсама. С. 130—131.
118	**Масленічныя песні**	
118	Наша масленка катліва...	*Шырма.* Т. 3. С. 293.
119	У нас сягоння масленіца...	*Сербаў І.* Аб беларускай народнай песні // Гоман. 1918. № 88.
119	Наша масленіца гадавая...	*Гілевіч* (1974). С. 56.
119	У нас маслены дзень...	*Гілевіч* (1973). С. 347.
119	Мы на горушцы пабывалі...	*Романов.* Вып. 7. С. 140.
120	Чок, чок, салавей, вы, пташкі, маўчыце...	ПБЗК. С. 170.
120	**ВЕСНАВЫЯ ПЕСНІ**	
120	**Песні гукання вясны, вясняночкі**	
120	Благаславі, Божа, на ўзгорачку сесці...	*Добровольский.* Т. 4. С. 90.
121	Благаславі, Божа мілы, зіму замыкаці...	*Шейн.* Материалы. С. 126.
121	Благаславі, Божа, вясну красну пеці...	*Гілевіч* (1974). С. 68.
121	Дабравешчанніко святое...	Веснавыя песні. С. 150.
121	Ты пчолачка ярая...	**Kuba. S. 245.**
122	Зіма з летам сустракаецца...	*Радченко.* С. 1.
122	Прыдзі, прыдзі, вясна...	ПБЗК. С. 176.
122	Ой, вясна ды й весенка...	*Гілевіч* (1974). С. 71.
123	Ой, вясна красна!..	***Moszyński K.*** **Polesie Wschodnie. Warszawa, 1928. S. 296—297.**
123	Ты, вясна, ты, красна...	*Сербаў І.* Аб беларускай народнай песні // Гоман. 1918. № 88.
124	Жаваранак, ранняя птушэчка...	*Гілевіч* (1974). С. 68.
124	Вясна красна, вясна красна, наступае...	Тамсама.
124	А вясна, вясна, вясеначка...	ПБЗК. С. 182.

С.	Змест	Крыніцы
125	Ой, вясна, ды й вясенка...	Веснавыя песні. С. 117.
125	Ой, вясна, вясна, што ты прынясла?..	*Захарава.* С. 73.
125	Ой, прышла вясна красна...	*Сербов И.* Белорусы-сакуны. Пг., 1915. С. 134—135.
126	Ой, вясна мая вясёлая...	Хрэстаматыя. С. 94.
126	Вол бушуе — вясну чуе...	Шырма. Т. 3. С. 13.
126	Да вясна красна...	*Federowski.* Т. 5. S. 659—660.
127	Вясна красна...	*Чуркін.* С. 95—96.
127	Рынулі рэкі, рынулі...	*Шырма.* Т. 3. С. 25.
127	А ляцела сойка цераз чыста поле...	*Ялатаў.* С. 17.
127	Зязюля кукуе, лецячка чуе...	*Киркор.* С. 92.
128	Зайдзі, зайдзі, зоранька вячэрняя...	*Zieńkiewicz.* S. 156.
128	Дзякуй Богу, што вясна прышла...	Веснавыя песні. С. 152.
128	Была ў маткі...	*Гілевіч* (1974). С. 76.
128	Зязюлечка баравая...	Тамсама. С. 77.
129	Сярод Дуная дзевачка сядзіць...	Тамсама. С. 78.
130	Бяжыць рэчка ад мельнічка — ой, рана...	*Киркор.* С. 93.
131	**Валачобныя песні**	
131	На первы дзень, на вялікдзень...	*Гілевіч* (1974). С. 83.
131	Добры вечар, пане гаспадару!..	Тамсама. С. 84—85.
133	Добры вечар, чэсны й пане...	*Бессонов.* С. 5—7.
136	Пане гаспадару, слаўны мужу...	*Шейн.* Бел. песни. С. 86—92.
141	Да на першы дзень святых Вялікадней	Минский листок. 1887. № 27.
142	А ў нядзелю да параненька...	*Логіны.* С. 17.
142	Ішла хмара да хмарыстая...	Минские губернские ведомости. 1868. № 23.
144	Ой на моры, моры ды на сіненькім...	*Логіны.* С. 17.
145	Да ў кольнічку, ў агародзічку...	Тамсама.
146	А ў тыночку, ў вагародчыку...	Тамсама. С. 16.
146	Дай на Вялікдзень, дай на першы дзень...	*Хрэстаматыя.* С. 114.
147	Чый то домік на прыгорачку?..	Тамсама. С. 115.
148	Добры вечар, ды паненачка!..	*Гілевіч* (1974). С. 105.
148	А ў матулькі адна дочка...	Тамсама. С. 113—114.
150	А ў гародзе ды на пераходзе...	*Шырма.* Т. 3. С. 89.
150	Ой, на азярыне ды на сіненькай...	Тамсама. С. 36.
151	Авёс зелен, позна сеян...	АГТ. Раздз. 4. Воп. 1. Клц. 13. Л. 6.

152 Ой, на моры, на сінім Дунаі... *Шырма.* Т. 3. С. 49—50.
152 А ў лесе, лесе да на верасе... *Бессонов.* С. 13.
153 Добры вечар, слічны панічок!.. *Гілевіч* (1974). С. 120—121.
154 У цёмным лесе стучыць, гручыць... Тамсама. С. 122—123.
154 Дзень вялік, дзень вялік... Тамсама. С. 126.
154 А на першы дзень, на Вялікадня... Валачобныя песні. С. 426.
155 Як пайшоў Мікола... Беларускія народныя песні: Сольныя і харавыя. Мн., 1928. С. 61.

155 **Юраўскія песні**

155 Юр'я, Юр'я... *Бессонов.* С. 23.
155 Юры, ўставай рана... *Шырма.* Т. 3. С. 112.
156 Ой, ты, Юр'я, Мікола... Хрэстаматыя. С. 123.
156 Ой, выйду я на вулачку... *Czeczot.* S. 2—3.
157 А Юр'ева матка каля рэчкі хадзіла... Веснавыя песні. С. 165.
157 Павядзём Юр'е да бору... *Захарава.* С. 76.
157 Юр'ева маці ўпроч пайшла... Хрэстаматыя. С. 124.
157 Да што там у стайні стучэла?.. Тамсама. С. 124—125.
158 Юр'я, уставай рана... АГТ. Раздз. 4. Воп. 1. Клц. 13. Л. 5.
158 Юр'е, добры вечар!.. *Зеленин Д. К.* Описание рукописей ученого архива Императорского РГО. Спб., 1914. Вып. 1. С. 12.
158 Юр'ева матка ў свет пайшла... ПБЗК. С. 235.
158 Й матка Юр'я клікала, гэй... Тамсама. С. 236—237.
159 Дзе ты, Юр'е, ўрасіўся?.. Тамсама. С. 239.
159 А ты, Юр'я, Мікола... Тамсама.
159 Юрайка, Юрайка, ці зялёна мураўка?.. Тамсама. С. 240.
160 Разгуляўся Юр'еў конь... Тамсама.

160 **Карагодныя**

160 Ды хадзіў карагод... *Гілевіч* (1974). С. 128—129.
160 Завілася пчолка над варотамі... *Тэраўскі.* С. 76.
161 Ды рынула вада з Дуная... *Радченко.* С. 48—49.
161 Устань рана, перапёлачка... *Гілевіч* (1973). С. 42.
162 Як пушчу стралу... ПБЗК. С. 247—248.
163 А мы ляда капалі, капалі... Тамсама. С. 250.
163 Пастаўлю й свячу проціў месяца... Тамсама. С. 258—259.
164 Медуніца, медуніца лугавая... ПБЗК. С. 262.
164 Як ад кута да парога... Тамсама. С. 266.
165 Дуброва мая зялёная... Тамсама. С. 268.

С.	Змест	Крыніцы
165	У майго татулькі сад над ракою...	ПБЗК. С. 270—271.
166	Пры лужку бела бярозка зашумела...	*Шырма.* С. 16.
166	Вылятала галачка, вылятала...	*Шырма.* Т. 3. С. 34.
167	**Траецкія, куставыя, русальныя песні**	
167	Пойдзем, дзевачкі...	Памятная книга Смоленской губ., на 1859 г. С. 53—54.
167	Пойдзем, дзевачкі...	Веснавыя песні. С. 183.
167	Пойдзем мы, дзеванькі, на луг гуляці...	*Гілевіч* (1973). С. 42.
168	За рэчкаю, за быстраю...	ПБЗК. С. 282—283.
169	Ай, не радуйся, зялёны дуб...	Тамсама. С. 284—285.
169	Не радуйся, клён да ясення...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 186—187.
169	Ох, мы ж былі у харошаму й бору...	ПБЗК. С. 286.
170	Прывялі куста, зеляненькага клёна...	Тамсама. С. 287.
170	Пойдзем, дзевачкі, у шчыры бор...	Тамсама. С. 288.
170	Ці ты бывала, тройца, ці бывала?..	Хрэстаматыя (1985). С. 130.
171	На Граной нядзелі...	*Романов.* Вып. 8. С. 207.
171	Павяду русалку...	Тамсама. С. 206.
171	Правяду русалку, правяду...	*Гілевіч* (1974). С. 128.
172	На Граной нядзелі...	*Шэйн.* Т. 1. Ч. 1. С. 199.
172	Ветрычак вее, сонейка грэе	*Раговіч У.* Вянок беларускіх народных песень. Мн., 1988.
173	**ЛЕТНІЯ ПЕСНІ**	
173	**Купальскія і пятроўскія песні**	
173	Ішла Купала сялом, сялом...	Зап. В. Іваноўская ў 1964 г. у в. Дахны Смаргонскага р-на ад Я. Іваноўскай (1909 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 85. Сш. 1. Арк. 9.
173	Сягоння Купала, а заўтра Ян...	*Federowski.* Т. 5. **S. 717.**
173	Да ўзыйдзі, месячык...	Минская старина. Мн., 1911. Вып. 2. С. 229.
174	Прасілася Гарыслаўка ў ойчанькі...	*Бессонов.* С. 48.
174	Ой, пойдзем, сястрыцы...	*Цітовіч.* С. 31.
175	Ой, рана, рана на Яна...	*Federowski.* Т. 5. **S.** 710—711.

С.	*Змест*	*Крыніцы*
175	Ой, рана на Йвана...	*Чуркін.* С. 99.
175	Ой, нету, нету Купаліша...	*Czeczot.* S. 32.
176	А як я ў зёлачкі пашла...	Зап. Л. М. Салавей у 1972 г. у в. Якубоўшчына Міёрскага р-на ад М. С. Малец (1906 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 52. Сш. 1. Арк. 24.
176	Ты, купалінька, рана, рана...	*Карский Е.* Отчет о поездке в Белоруссию в 1903 г. Спб., 1905. С. 9. Зап. у в. Янаўцы (Фабіянава, у Латгаліі).
176	Купалачка, дзе твая дачка?..	*Czeczot.* S. 32—34.
177	А хто ж у нас не жанаты ходзіць?..	*Романов.* Вып. 8. С. 218.
177	Купала. Янава ночка невялічка, Купала...	Зап. І. Місуна ў 1969 г. у в. Сваткі Мядзельскага р-на ад В. Роўда // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 66.
178	Была ў суседа дачушка...	Виленский вестник. 1895. № 134 (Залессе, Ашмянскага пав.).
178	Купалялё, на сенажаці мядучка...	*Гілевіч* (1973). С. 43.
178	Малая ночка Купалночка...	Зап. у Брэсцкім пав. І. Ярашэвіч // Undyna. 1846. S. 13.
179	Да зялёны кусток распускаецца...	*Сахараў.* С. 21.
179	Купала на Йвана...	Зап. Г. Барташэвіч у 1967 г. у в. Заполле Бялыніцкага р-на ад А. Ігнатовіч (1908 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 110. Сш. 3. Арк. 1.
179	Каліна, а па ельнічку...	*Гілевіч* (1973). С. 353.
180	Ой, каліна, а хто ж у нас...	Тамсама.
180	Каліна, чыя рута за вадою...	Тамсама. С. 355.
180	А ў масце, масце...	Зап. А. Ліс у 1967 г. у в. Плешчыцы Шклоўскага р-на ад Г. Кавалёвай (1924 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 111. Сш. 2. Арк. 26.
181	Кукуй, зязюленька, не ўпікай...	*Гілевіч* (1974). С. 150.
181	А ў бару, бару, на баравіне...	Тамсама. С. 156.
182	А ў нашым жыце перапяліца...	Тамсама. С. 180—181.
182	Ішоў вечар па вулачцы...	Тамсама. С. 142.
182	Ішла Купалка сялом, сялом...	Тамсама.
183	Каліна на лузе стаяла...	Тамсама. С. 145.
183	Купалка Яна на вулку звала...	Тамсама. С. 158.
184	На вуліцы скрыпка грае...	Тамсама. С. 149—150.
184	Купальна ночка невялічка...	*Малевич.* С. 27—28.
185	Ішла паненка цераз бор...	Тамсама. С. 29.
185	Ой, то-то! Ляцелі гусі рад па раду...	*Романов.* Вып. 8. С. 234.
186	Ой, то-то! Хто гэту гару капаў...	Тамсама. С. 236.

С.	Змест	Крыніцы
186	Да Купаленка, рана, рана...	*Добровольский.* Ч. 4. С. 218.
186	Цёмная ночка Купалачка...	*Дмитриев.* С. 231.
186	А што ў нас сягоння за вечар быў?..	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 236.
187	Ішла Купалінька па вуліцы...	*Шейн.* Бел. песни. С. 433.
187	Я зёлкі ў полі збіраю...	Тамсама.
188	Сонейка, сонейка, Ян з Пятром ходзяць...	***Czeczot.* S. 4.**
188	На моры вутка купалась...	*Шейн.* Бел. песни. С. 440.
188	Ай, бору мой, бору мой!..	Тамсама. С. 444.
189	Ляцеў чыжык цераз рынак...	*Сахараў.* С. 25.
189	Кукавала зязюлька ў садочку...	*Карский Е.* Белорусские песни села Березовца Новогрудского уезда // Рус. филол. вестник. Варшава, 1884. Т. 3. С. 128—129.
189	У нашага войта на дварэ...	Зап. У. Паўлюкоўскі ў 1929 г. у в. Брыксічы Баранавіцкага п. // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 3. Спр. 17. Арк. 3—4.
190	Ай, то, то, ды за гарою за каменнаю...	***Czerny A.* Piesni Bialoruskie z powiatu Dzisnenskiego... // Zbor wiadomosci do antropologii krojowei. Kraków, 1895. T. 28. S. 216.**
190	А ў горадзе на рынку...	*Гарэцкі, Ягораў.* С. 85—86.
191	Цераз гару чорна сцежка...	Зап. А. Ліс у 1966 г. у в. Сенькава Верхнядзвінскага р-на ад А. Саўлук (1880 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 104. Сш. 2. Арк. 37.
191	А на Купалу...	*Шлюбскі.* С. 110.
192	Да ў адным канцы Купала...	***Federowski.* Т. 5. S. 713.**
192	Да не будзе лецечка...	*Довнар-Запольский.* С. 59.
192	Ой, у лесе, у лесе пры барку...	***Federowski.* T. 5. S. 713.**
192	А ў майго татулькі тры сады зялёных...	*Шлюбскі.* С. 110.
193	Ой, дымна за дваром...	*Бессонов.* С. 32.
193	Перад Пятром, пятым днём...	Зап. А. Ліс у 1972 г. у в. Дзеркавічы Верхнядзвінскага р-на ад. Н. Новікавай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 57. Сш. 1. Арк. 11.
193	Купала на Івана! Што Іван робіць?..	*Романов.* Вып. 1-2. С. 277.
194	Зажурылася малада ўдованька...	*Булгаковский.* С. 61.
194	А я дзеўка добрая Алеся...	*Шлюбскі.* С. 125.
194	Да ў нашым сяле тры вуліцы...	Дзень паэзіі. С. 139.
195	А ў лузе касец косіць...	*Гілевіч* (1973). С. 49.
195	Сонейко. Пятрова ночка, дзе твая дочка?..	Зап. А. Ліс у 1978 г. у в. Ягадзень Іўеўскага р-на // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 78. Спр. 156. Сш. 1. Л. 33.

С.	*Змест*	*Крыніцы*
195	Сонейко. Пятрова ночка суборначка...	Зап. А. Ліс і П. Каруза ў 1978 г. у в. Астраўцы Іўеўскага р-на ад Яўгеніі Чэрнік (1909 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 78. Спр. 156. Сш. 1. Л. 17.
195	Ой, рана, рана, на Яна-Купала...	*Малевіч.* С. 30.
196	**Жніўныя песні**	
196	Гаварыла поле шырокае...	Зап. А. Гурскі ў 1967 г. у в. Ланькава Бялыніцкага р-на ад М. Краўцовай (1905 г. н.), Г. Котавай (1894 г. н.) і С. Котавай (1907 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 112. Сш. 1. Арк. 31.
196	У полі жыта палавее...	*Гілевіч* (1974). С. 199.
19[illegible]	Як пайду я дарогаю...	Зап. А. Ліс ў 1967 г. у в. Заполле Бялыніцкага р-на ад П. Ігнатовіч (1909 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 111. Сш. 1. Арк. 31.
197	Ой, час, пара дадоманьку...	Зап. Е. Кійко ў в. Данілавічы Дзятлаўскага р-на ад З. Сёмухі (1897 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 84. Сш. 1. Арк. 33.
197	Да знаці, пана, знаці...	Зап. К. Кабашнікаў у 1952 г. у г. Тураве ад П. Чорнай (1870 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 84. Сш. 2. Арк. 23.
197	Пеpажані, Божа, хмаркі...	Зап. Г. Барташэвіч і К. Кузняцова ў 1958 г. у в. Сорагі Слуцкага р-на ад Н. Забелы (1893 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 41. Сш. 3. Арх. 1.
198	Ой, не ляжы, ветру, ў полі...	Зап. Я. Бартко ў 1962 г. у в. Петравы Дзятлаўскага р-на ад моладзі // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 4. Сш. 1. Арк. 11.
198	Ой, месяц ясненькі...	Зап. Е. Кійко ў в. Данілавічы Дзятлаўскага р-на ад Я. Груда (1913 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 18. Воп. 10. Спр. 7. Сш. 6. Арк. 4.
198	Да ўжо сонца за бор, за бор...	Зап. Н. Русаловіч у в. Скарынічы Мінскага р-на ад Г. Станішэўскай // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 5. Спр. 6. Арк. 28.
198	Ой, закаціся, сонейка...	***Federowski.* T. 5. S. 743.**
199	Няхай вечар бардзей будзе...	Тамсама. С. 757.
199	Паслаў мяне свёкар...	Тамсама. С. 759.

С.	Змест	Крыніцы
199	Сакатала бочачка...	Зап. І. І. Лушчыцкая ў 1961 г. у в. Сосенка Вілейскага р-на ад Я. Шалуха (1902 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 65. Сш. 6. Арк. 12.
199	Ой, красуйся, жыцейка...	*Гілевіч* (1974). С. 249.
200	Пад арэхавым кустом...	ААН РФ. Ф. 104. Воп. 1. Спр. 325. Л. 92.
200	Да раўнуйце постаці...	ААН РФ. Ф. 134. Воп. 2. Спр. 14. Л. 44 адв. Зап. А. і В. Логіны ў 1913 г. у в. Моладава Навагрудскага п.
200	Дзевачка з поля ішла...	*Гілевіч* (1974). С. 252.
200	Палуднічкі прагудзелі...	Тамсама. С. 268.
201	Кругло, мало балоцечка...	Тамсама. С. 263.
201	Наш гаспадар маладзенькі...	Тамсама. С. 270.
201	А чыя ж то валока...	Зап. Л. Грыгарук у 1958 г. у в. Пасынкі на Беласточчыне ад М. Грыгарук // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 68.
201	Выйшла маці жыта жаці...	Зап. В. Сіўцова ў 1965 г. у в. Панскае Крупскага р-на ад Н. Сямёнавай (1905 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 67. Сш. 11.
201	Што ў мяне была за свякровачка...	*Гілевіч* (1973). С. 360.
202	Баліць мая сярэдзінка...	*Радченко.* С. 57.
202	Добры вечар, нашай маці...	Зап. А. Ліс у 1967 г. у в. Заполле Бялыніцкага р-на ад Х. Казловай (1908 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 111. Сш. 1. Арк. 3.
202	Чые гэта талачане...	**Zieńkiewicz. S. 228.**
202	Ой, дайце мне загон-разгон...	Зап. І. Цішчанка ў 1956 г. у в. Хорск Давыд-Гарадоцкага р-на ад М. Паскрэб (1876 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 39. Сш. 5. Арк. 27.
202	Ой, пара й, пара да двара...	Зап. М. Я. Грынблат у 1960 г. у в. Грудзінава Сіроцінскага р-на ад К. Шаўцовай (1917 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 47. Сш. 4. Арк. 23.
203	Ой,закаціся, ярка сонейка...	Зап. Т. Андрушкевіч у 1960 г. у в. Скепня Жлобінскага р-на ад Г. Елінскай // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. Спр. 16. Арк. 16.
203	Глядзіць, глядзіць маё вочка...	Зап. А. Емяльянаў у 1968 г. у в. Грабёл Расонскага р-на ад А. Бутравай (1910 г. н.) //

С.	*З м е с т*	*К р ы н і ц ы*
		АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. Спр. 8. Арк. 79.
203	Сіняе азёрачка...	Зап. А. Гурскі ў 1961 г. у в. Жыцькава Барысаўскага р-на ад М. Адамейка (1910 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 63. Сш. 2. Арк. 38.
204	У слаўнага пана...	*Довнар-Запольский.* С. 59.
204	Да гула пчолка, гула...	*Янчук.* С. 76.
204	Вялік наш бор, вялік...	Тамсама. С. 74.
204	Ты наш пане — баране...	Зап. К. Кабашнікаў у 1956 г. у в. Баравое Лельчыцкага р-на ад Я. Шамко (1872 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 9. Воп. 5. Спр. 9. Сш. 2. Арк. 14.
205	У добрага пана...	Зап. В. Гусціновіч у 1960 г. у м. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на ад У. Зініч (1881 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. Спр. 14. Сш. 2. Арк. 101.
205	Ой, жыта жну, пажынаю...	Зап. В. Гусціновіч у 1956 г. у м. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на ад А. Гарбацэвіч // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. Спр. 4. Сш. 1. Арк. 19.
205	Мая мамка, мая кветка...	Зап. А. Фядосік у 1948 г. у в. Кашэвічы Капаткевіцкага р-на ад С. Мароз (1902 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 8. Спр. 2. Сш. 6. Арк. 8.
205	Ой, у полі бярэзінка...	Зап. У. Мацкевіч у 1948 г. у в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага р-на // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 8. Спр. 2. Сш. 23. Арк. 2.
205	Поле маё, поле маё вялікае і вясёлае...	Зап. А. Ліс у 1964 г. у в. Вышадкі Гарадоцкага р-на ад М. Барысавай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 86. Сш. 2. Арк. 10.
206	Добра жаць — шырокая ніўка...	*Шырма.* Т. 3. С. 188.
206	Ой, пара дамоў, пара...	Тамсама. С. 186.
206	На лугу касцы косяць...	Тамсама. С. 173.
206	Лета ж маё лецейка...	Тамсама. С. 172.
207	Ды ўжо вечар, вечарэе...	Зап. Л. Ткачова ў 1960 г. у в. Баравуха Слуцкага р-на ад М. Сяўрук (1895 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 55. Сш. 5. Арк. 33.
207	Калі ж тая серада прайшла...	*Шырма.* Т. 3. С. 109.
207	Сонейка, сонейка...	Тамсама. С. 179.
207	Ой, пара нам дамоў, пара...	Тамсама. С. 160.

С.	Змест	Крыніцы
207	Ой, гудцы гудуць...	*Federowski.* **Т. 5. S. 741.**
208	Закурыўся ціхі, дробны дождджык...	Зап. В. Скідан у 1967 г. у м. Галоўчын Бялыніцкага р-на ад У. Дракінай (1902 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 105. Арк. 7.
208	Пара дамоў, пара...	Зап. А. Ліс у 1960 г. у в. Ветхава Смаргонскага р-на ад А. Ліс (1907 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 54. Сш. 4. Арк. 21.
208	А мы поле рачком сышлі...	Зап. Г. Барташэвіч і А. Янголь у 1965 г. у в. Бокшыцы Слуцкага р-на ад М. Шэлег (1910 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 29. Сш. 3. Арк. 34.
209	А пара нам дамоў ісці...	*Шлюбскі.* С. 149.
209	Да ў нашага пана...	*Czeczot.* **S. 10—11.**
209	Да падзякуйма Богу...	Зап. У. Коўчар у 1946 г. у в. Кірава Слуцкага р-на ад Г. Крывашэй (1884 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 17. Сш. 1. Арк. 7.
209	Ай, добра ноч!..	*Шейн.* Бел. песни. С. 474.
210	Хадзі, выдзі, пане гаспадару...	ААН РФ. Ф. 104. Воп. 1. Спр. 116. Л. 30 адв. Зап. у Слонімскім п.
210	Ой, хадзіў Раю...	*Гілевіч* (1974). С. 273—274.
211	Хадзіў Спарыш па вуліцы...	*Шейн.* Бел. песни. С. 493—494.
211	Разгарыся вячэрняя зорка...	Тамсама. С. 497.
212	Каціўся вяночак па полю...	*Гильтебрандт.* С. 209.
212	У нас сягоння вайна была...	*Киркор.* С. 233.
212	Ляцеў саколік па полю...	*Романов.* Материалы... С. 164.
212	Рада, рада шэра перапёлка...	*Сахараў.* С. 49.
213	Ніўка, ніўка, аддай маю сілку...	*Романов.* Вып. 8. С. 262.
213	Адчыняйце шчытовы вароты...	Тамсама. С. 261.
213	Ой, я з поля цяку, бягу...	*Federowski.* **Т. 5. S. 754.**
213	Жала я жыта...	Зап. М. Стэрнэ ў 1949 г. у в. Старая Дуброва Акцябрскага р-на ад М. Жулега (1889 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 27. Сш. 1. Арк. 10—11.
214	У нашага пана...	Жніўныя песні. С. 475.
214	Да ці выйшла да цёмная туча?..	*Добровольский.* Ч. 4. С. 258.
215	Пахіліўся зялёны дубочак...	Зап. А. Ліс у 1970 г. у в. Адамчукі Вільнюскага р-на ад А. Стэфановіч (1909 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 27. Сш. 1. Арк. 45.

215 А чы поўна арэхавая чаша?.. *Шейн.* Бел. песни. С. 501.
215 Да слава табе, Божа... Жніўныя песні. С. 526.
216 Залатая мяцёлачка... Тамсама. С. 524.
216 Да на гарэ вецер вее... Тамсама. С. 527—528.

216 **ВОСЕНЬСКІЯ ПЕСНІ**

216 **Ярынныя песні**

216 Журавы лятуць... Хрэстаматыя (1985). С. 193.
217 Ападае лісточак... Тамсама.
217 А ў цёмным лесе... Зап. А. Салавей у 1972 г. у в. Якубоўшчына Міёрскага р-на // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 78. Сш. 1. Арк. 21.
217 Ай, у бару ціцярук балбочыць... *Шейн.* Бел. песни. С. 482.
218 Сінія мае два галубочкі... Зап. А. Ліс ў 1975 г. у в. Гудоўшчына Маладзечанскага р-на ад А. Луцкай (1902 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 75. Спр. 106. Сш. 1. Арк. 36.
218 Ой, восень мая... Зап. М. Гваздзёў у 1967 г. у в. Плешчыцы Шклоўскага р-на ад Г. Ксяндзовай (1927 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 108. Сш. 3. Арк. 31.
218 Ай, восень, восень, макрота... Зап. Г. Барташэвіч у 1964 г. у в. Ледневічы Сенненскага р-на ад Г. Цывы (1922 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 90. Сш. 2. Арк. 18.
219 Ужо не раненька, ужо не позненька... Зап. А. Гурскі ў 1963 г. у в. Запруддзе Маладзечанскага р-на ад Н. Шаўлюк (1903 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 79. Сш. 2. Арк. 46.
219 Непраўдзівая каліна казала... *Шейн.* Бел. песни. С. 479.
219 Бярозка з лістом... Тамсама. С. 480.
220 Ай, чый то конік пад борам... Зап. Г. Барташэвіч у 1964 г. у в. Ледневічы Сенненскага р-на ад Г. Цывы (1922 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 90. Сш. 2. Арк. 197
220 А віхор каліну паламаў... Зап. А. Гурскі ў 1961 г. у в. Жыцькава Барысаўскага р-на ад А. Круглік (1904 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 63. Сш. 2. Арк. 40.
221 Ой, заржы, заржы, вараны каню... *Шырма.* Т. 3. С. 229—230.
221 Праду я, праду, спатанькі хачу... Зап. М. Гваздзёў у 1967 г. у в. Галаўчын Бялыніцкага р-на

С.	Змест	Крыніцы
		ад В. Хадасевіч (1894 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 108. Сш. 1. Арк. 42—43.
222	Ай, упала ластаўка, упала...	*Шейн.* Бел. песни. С. 490—491.
222	Хто на стаёнцы зазвоніць...	*Гілевіч* (1973). С. 55.
222	Дробна пташачка, невялічкая...	Зап. А. Ліс у 1977 г. у в. Ветхава Смаргонскага р-на ад А. Ліс (1907 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 77. Спр. 136. Сш. 2. Л. 19.
223	Да ўсе хмарачкі да па парачцы...	Восеньскія песні. С. 125.
223	Ластаўка-белакрылка...	Тамсама. С. 135—136.
224	Лятала каза па бярэзнічку...	Тамсама. С. 160.
224	Чаго ты, лосю, чаго сівенькі?..	Зап. А. Ліс у 1977 г. у в. Ветхава Смаргонскага р-на ад А. Ліс (1907 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 77. Спр. 136. Сш. 2. Л. 21.
224	У садочку, у халадочку...	Восеньскія песні. С. 149—150.
225	Дай у гародзе на пагодзе...	Зап. А. Ліс у 1977 г. у в. Вётхава Смаргонскага р-на ад А. Ліс (1907 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 77. Спр. 136. Сш. 2. Л. 20.
225	Ой, гаварыла канапелька...	Зап. К. Кабашнікаў у 1973 г. у в. Баркалабава Быхаўскага р-на ад Тацяны Гурынай (1908 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 73. Спр. 73. Сш. 2. Л. 9.
226	Там пад борам-лесам...	Зап. А. Ліс у 1970 г. у в. Адамчукі Вільнюскага р-на ад А. Янкоўскага (1903 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 27. Сш. 2. Арк. 1.
226	Авясец, мамухна!..	*Шлюбскі.* С. 165.
226	Дзе ты, хмелю, быў?..	Зап. А. Ліс у 1974 г. у в. Дубіна Юрждыцкая, хут. Барок ад Г. Іванчык (1902 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 74. Спр. 83. Сш. 2. Арк. 23.
226	Ой, пры Дунаю, пры ціхусенькім...	**Gawrońska. S. 36—37.**
227	Вядзьмедзька кару дзярэць...	*Гілевіч* (1974). С. 294.
227	Пушчу я паву...	Зап. А. Салавей і П. Каруза ў в. Якубоўшчына Верхнядзвінскага р-на ад М. Малец (1906 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 52. Сш. 2. Арк. 45.
228	Дабро маё зеляное, зеляное...	Зап. А. Барыс у 1972 г. у в. Фралова Міёрскага р-на ад Н. Кашыры (1901 г. н.) //

АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 55. Сш. 1. Арк. 65.

228 Ходзіць вутачка па сенажаці... *Гілевіч* (1974). С. 292.

229 Ой, зара мая, несхадзімая... Тамсама. С. 298.

229 Чом вы, канапелькі, не зялёны стаіце?.. *Радченко*. С. 137.

229 Лугавая зязюлечка, лугам ляціш... *Полевой А.* О языке населения Новозыбковского уезда Гомельской губернии. Мн., 1926. С. 46.

230 Ішла цяцера з лугоў, з балотаў... *Сахараў С. П.* Народная творчасць латгальскіх і ілукстэнскіх беларусаў [Рукапіс IV] // АІМЭФ. Ф. 3. Воп. 10.

230 Ці я табе, мая мамачка... Зап. А. Ліс у в. Крэва Смаргонскага р-на ад Н. Майсевіч // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 84. Сш. 3. Арк. 30.

230 Досыць, калінка чырвоненькая... Зап. В. Шніп у 1952 г. у в. Пуганы Радашковіцкага р-на ад Я. Мацюгі // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 40. Сш. 55. Арк. 7.

231 Час дамоў, час дамоў, час дамоў ісці... Зап. А. Гурскі ў 1960 г. у в. Грудзінава Сіроцінскага р-на ад А. Шаўцовай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 48. Сш. 4. Арк. 22—23.

231 Хадзіла дзеванька... *Шейн.* Бел. песни. С. 485.

231 Недаспелая макаўка... Зап. А. Гурскі ў 1963 г. у в. Бабцы Глыбоцкага р-на ад Х. Герасімёнак (1910 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 7. Сш. 3. Арк. 25.

232 Гуляй, гуляй, шчука, плаціца... *Сахараў*. С. 63.

232 Ой, не вылятай, сіва зязюленька... *Цітовіч*. С. 53.

233 Асіна балота красіла... *Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 260.

233 Віліся пчолачкі... Тамсама. С. 258.

233 Ой, зялён, мой лён, зялён... Зап. І. Лушчыцкая ў 1961 г. у в. Пасынкі Мядзельскага р-на ад Л. Роліч (1896 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 65. Сш. 1. Арк. 43.

233 Каханка дзеванька, каханка... *Шейн.* Бел. песни. С. 483.

234 Затужылася Евачка... Зап. Г. Барташэвіч у 1964 г. у в. Ледневічы Сенненскага р-на ад Г. Цывы (1922 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 90. Сш. 2. Арк. 20.

234 Ды на полі ліпа з сонейкам йграець... *Сахараў*. С. 51.

234 Кляновы лісточак... *Шырма*. Т. 3. С. 248.

С.	Змест	Крыніцы
235	Хадзіў-пахадзіў...	*Шейн.* Бел. песни. С. 484—485.
235	Ішла дзевачка за вароцейкі...	Зап. К. Кузняцова ў 1963 г. у в. Лоск Маладзечанскага р-на ад А. Лазар (1926 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 80. Сш. 6. Арк. 16.
235	За цёмным лесам — трава павяла...	*Сахараў.* С. 52.
236	На моры вутачка купавалася...	*Каминский.* С. 743.
236	Закракатала шэра вутанька на рацэ...	*Сахараў.* С. 50—51.
236	Румяна поле, румяна...	Зап. А. Ліс у 1961 г. у в. Пасынкі Мядзельскага р-на ад С. Савук (1902 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 68. Сш. 4. Арк. 38—39.
237	Былі ў татулькі да тры дачушкі...	ПБЗК. С. 443.
237	Да за сцяною за камянною...	Тамсама. С. 446.
238	Па сінім моры...	Тамсама. С. 446—447.
238	Ой, чаго, зімачка...	Зап. Т. Андрушкевіч у 1963 г. у в. Завод Жлобінскага р-на ад К. Пашкоўскай (1895 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 3. Спр. 27. Арк. 13.
239	**Песні пры лёне**	
239	На гары лён...	*Ялатаў.* С. 14.
239	Доўга, доўга я з вечара сяджу...	*Каминский.* С. 744.
240	Як пайшоў жа кужаль па кутах, па лаўках...	*Сахараў.* С. 59.
240	**ТАЛОЧНЫЯ ПЕСНІ**	
240	Талака, талака...	*Гілевіч* (1974). С. 302.
241	Гаспадар, гаспадар...	Тамсама.
241	А і добра мы табе...	Тамсама.
241	Чыя ж гэта талака?..	Тамсама. С. 303.
241	Талака, талака...	Тамсама. С. 304.
241	Добра мне, добра...	Тамсама. С. 304—305.
242	Як сядзем мы на лавачцы...	Тамсама. С. 305.
242	На мяне казалі...	Тамсама. С. 306—307.
242	А знаць наш бацюшка багата жывець...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 206.
242	А чыя ж то жана па двару ходзіць?..	*Романов.* Вып. 1-2. С. 174.
243	Ішла талака з чыстага поля...	Тамсама. С. 275.
243	Ці не пчолка?..	*Шейн.* Бел. песни. С. 413.
243	Ах вы, мілы мае бабачкі...	*Гарэцкі, Ягораў.* С. 106.

243 Ды знаць наша доля худая... *Шейн.* Бел. песни. С. 412—413.
244 А мы свайму пану... *Шлюбскі.* С. 166.
244 Каля месяца, каля яснага... *Шейн.* Бел. песни. С. 423.
244 Ня слава, ня слава, Андрэйка, твая... Тамсама. С. 415.
244 Ні слава, ні слава, Яначка, твая... *Сахараў.* С. 54.
245 Ні слава, ні слава, гаспадар, твая... *Шейн.* Бел. песни. С. 414.
245 Дунай з морам паспіраліся... Тамсама. С. 134.
245 Вы мужове-панове... Тамсама. С. 424.
245 Таргуйся, таргуйся, Кірылку, з намі... *Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 205.
246 Па полю сіз голуб лятаіць... *Гарэцкі, Ягораў.* С. 107.
246 Па шырокаму гасцінцу... Восеньскія песні. С. 399.
246 Сілязенька, галоўка сізенька... *Романов.* Вып. 8. С. 197.
247 Ні слава, ні слава, Ярэмка, твая... *Шлюбскі.* С. 168—169.
247 Да бараначка чорненькі, чорненькі... *Шейн.* Бел. песни. С. 505.

248 **СЯМЕЙНА-АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ**

252 **ХРЫСЦІННЫ АБРАД** *Шейн.* Т. 3. С. 384—390.

257 **ХРЭСЬБІННЫЯ ПЕСНІ**

257 А хто, хто ў нас да па ночы ходзіць?.. *Гілевіч* (1974). С. 313.
257 Цераз рэчачку, цераз быструю... Тамсама. С. 316.
258 У нас сягоння, хвала табе Божа... Тамсама. С. 317.
258 Сцелецца да ўецца Зап. В. Коўчур у 1946 г. у в. Цараўцы Слуцкага р-на ад Г. Крывашэй // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 17. Бл. 1. Л. 1.
259 Ды хто ў нас, ды хто ў нас... Зап. Ю. Ф. Мацкевіч і Г. І. Цітовіч у 1946 г. у в. Крывічы Старобінскага р-на ад С. М. Чарэўка // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 10. Л. 46.
259 Ой, дымна, дымна ў садзе... *Косич.* С. 34.
260 А між сеначак, між камарачак... *Гілевіч* (1974). С. 313—314.
261 Раса пала на травіцу... Тамсама. С. 315.
261 Як малодка дзіцятку радзіла... Тамсама. С. 320.
262 Каб я знала, ведала... Зап. М. П. Гваздзёў у 1965 г. у в. Зубава Аршанскага р-на ад Х. С. Рабекінай (53 г.) //

С.	Змест	Крыніцы
		АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 94. Бл. 1. Арк. 19—20.
262	Цераз гару сцежка ляжала...	*Гілевіч* (1974). С. 326.
262	Не стук стучыць...	Анталогія. С. 110.
263	Ой, учора, мае кумочкі...	*Гілевіч* (1974). С. 347.
263	Не кукуй, зязюлечка, рана...	Зап. І. Лушчыцкая ў 1961 г., у в. Жыцькава Барысаўскага р-на ад Г. І. Рыжковай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 62. Бл. 4. Л. 24.
264	Папрасілі мяне на хрысці-начкі...	Зап. А. Фядосік у 1974 г. у в. Гародзькі Валожынскага р-на ад Е. Глябовіч // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 77. Спр. 86. Сш. 2. Л. 2.
264	А што па масту па калінаваму?..	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 22.
264	Бабуля к унучцы сабіралася...	*Гілевіч* (1974). С. 337—338.
265	Парадзіха ў полазе ляжыць...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 22.
265	А ўчора звячора...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 332.
266	Добра, добра мне...	Тамсама. С. 322.
266	А бабулька, пахнючая мята...	*Гілевіч* (1974). С. 332.
266	Бабулька ж мая міленькая...	Зап. Г. Барташэвіч у в. Міхалішкі Астравецкага р-на ад Ю. С. Пагады // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 33. Бл. 2. Л. 22—23.
267	Наша бабачка, а пірагі пякла...	*Гілевіч* (1973). С. 220.
267	Ці ведаеш, бабка?..	*Грынблат, Ялатаў.* С. 186.
267	Каля месяца, каля яснага...	Зап. Я. Сакалова ў в. Перагон Слаўгарадскага р-на ад Н. Баруценка // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 11. Сш. 8. Л. 1—2.
268	А ў бару дуб'ё...	Зап. Г. Барташэвіч у 1965 г. у в. Лядцы Дубровенскага р-на ад Х. П. Малахавай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 99. Бл. 3. Л. 3.
268	Наша бабулька да й малімонка...	Зап. Л. Савікоўская і Г. Цітовіч у 1945 г. у в. Кіржына Крывіцкага р-на ад Н. І. Грышкевіч // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 2. Л. 102.
268	Бедавала наша бабулька...	Зап. М. Грынблат і Г. Цітовіч у 1945 г. у в. Асаўлянскія Хутары Крывіцкага р-на ад Л. М. Місун // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 2. Л. 87.
268	Півушка, півушка ты піўное...	*Шэйн.* Т. 1. Ч. 1. С. 324.
269	А я ж гэту бабку...	Зап. М. Грынблат і Г. Цітовіч у 1945 г. у в. Асаўлянскія Хутары Крывіцкага р-на ад Л. М. Місун // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 2. Л. 87.

С.	*Змест*	*Крыніцы*
269	Куначка па бору пахадзіла...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 322.
269	Упілася бабка, упілася...	*Самцэвіч П. А.* Хрэсьбіны ў в. Унтальянка Барысаўскага р-на Менскай акругі // Наш край. 1928. № 11.
270	А скочыла наша Хрыстынка...	*Романов.* Вып. 8. С. 347.
271	Кума мая, кумачка...	Анталогія. С. 115.
271	Кум з кумою на куце сядзіць...	Зап. Ф. І. Юхневіч у 1958 г. у в. Бардзілава Халопеніцкага р-на ад Т. Е. Кручок // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. Спр. 13. Сш. 1. Арк. 2.
272	Кланялася кума куму...	*Гілевіч* (1973). С. 63.
272	Ой, кум да кумы заляцаўся...	*Federowski.* Т. 6. S. 554—555.
273	Што ж то за красачка?..	*Романов.* Вып. 8. С. 340—341.
274	У нашага кума бела бяроза...	*Шейн.* Бел. песни. С. 6.
274	Ой, кум ідзець па вуліцы...	*Гілевіч* (1974). С. 344.
274	Кум з кумою на покуце сядзяць...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 24—25.
275	Цераз бор сасна павалілася	*Гілевіч* (1974). С. 333.
275	Ай, кум куме рад...	Тамсама. С. 345.
275	На тым баку за рэчкаю...	Тамсама. С. 335.
276	На стале каша стала...	*Шырма.* Т. 2. С. 252.
276	А ў нядзелечку з параненечку...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 24.
276	А у нашай Кацярынушкі...	*Гілевіч* (1974). С. 354.
276	Прасілі хоху у хрысцінушкі...	Тамсама. С. 357.
277	А было у бабкі...	Тамсама. С. 339—340.
278	У нашага Іванькі...	Зап. М. П. Гваздзёў у 1961 г. у в. Салтанаў Рэчыцкага р-на ад К. Ракусевіч (80 гадоў) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 60. Л. 79—80.
279	Стаіць шацёр над вадою...	*Гілевіч* (1973). С. 425.
279	Ішоў кум па сялу...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 24—25.
279	Кума кума любіла...	*Шейн.* Бел. песни. С. 3.
280	На гарэ ліпка нахілілася...	Зап. Ф. І. Юхневіч у 1958 г. у в. Бардзілава Халопеніцкага р-на ад Т. Е. Кручок // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. Спр. 13. Сш. 1. Л. 2.
280	Я ў хрэсьбінкі паманілася...	*Гілевіч* (1974). С. 352.
281	Пасаджу я квасоліну...	*Грынблат, Ялатаў.* С. 429.
281	У полі гаёк расшугаўся...	*Гілевіч* (1974). С. 318.
282	Ой, два дубы, ой, два дубы...	Тамсама. С. 351—352.
282	А на моры селязенька ды падпырхіваець...	Тамсама. С. 319.
283	Чарачка медавая...	*Грынблат, Ялатаў.* С. 218.
283	Ой, запала, ой запала...	Зап. А. Фядосік у 1974 г.

С.	Змест	Крыніцы
		у г. Валожыне ад Г. М. Рубацкай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 74. Спр. 86. Бл. 1. Л. 10.
284	Час дадому, час...	Гілевіч (1974). С. 357—358.
284	Хрэсьбінныя прыгаворкі...	*Грынблат, Ялатаў*. С. 644—645.
285	**ВЯСЕЛЬНАЯ ПАЭЗІЯ**	
285	Шлюбныя звычаі на Беларусі ў XVI стагоддзі. Запісаў Ян Ласіцкі	Вяселле. С. 87—88.
287	Абрады вясковага люду з-над Бярэзіны. Запіс Э. Н.	Тамсама. С. 50—91.
318	Вяселле ў в. Пудзіна Навагрудскага р-на. Запіс У. А. Урбановіча	Зап. У. А. Урбановіч у 30—40-я гг. у в. Пудзіна Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. ад Гузоўскай В. Д., Жамойды В. І., Кіені В. Р. і інш. // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 93. Спр. 278.
347	Вяселле ў вёсцы Берлеж Блужскага сельсавета Пухавіцкага раёна. Запіс А. С. Фядосіка	Зап. А. С. Фядосік у 1973 г. у в. Берлеж Пухавіцкага раёна ад В. Гайдучонак і Н. Паўловіч // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 73. Спр. 70. Бл. 5. Арк. 23—47.
354	**ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ**	
354	Зялёная дубровачка...	*Гілевіч* (1979). С. 19.
354	Ляцелі гускі рад па раду...	Тамсама. С. 21.
354	Чаму, верабейка, ды не жэнішся...	Тамсама. С. 23.
355	Прыехалі сваты на двор...	*Шейн*. Т. 1. Ч. 2. С. 91.
355	Да і сіні васілі зацвілі...	*Гілевіч* (1979). С. 25.
356	З суботы на нядзелю нявеста сон відзела...	Жанчына ў бел. тв-ці. С. 143.
356	Ой, скарэй бы вячора даждаці...	*Цітовіч*. С. 86—87.
356	Да ў месяца два ражкі крутыя...	*Шейн*. Т. 1. Ч. 2. С. 80.
357	Татачка мой родненькі...	Тамсама. С. 339.
357	Ці ты, дзевачка, не чуеш?..	Жанчына ў бел. тв-ці. С. 146.
357	Прыляцелі коршуны з сакалом...	*Шейн*. Т. 1. Ч. 2. С. 157.
358	Хвалілася каліначка за ракой...	*Цітовіч*. С. 93.
358	Дзяўчыначка мая заручоная...	*Гілевіч* (1974). С. 388.
358	Ай, не шум шуміць...	Зап. П. Пратасевіч у 1967 г. у в. Казіно Ушачскага р-на ад С. Пратасевіч // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 24. Сш. 4. Л. 30.

С.	*З м е с т*	*К р ы н і ц ы*
359	Мамачка мая, родная мая...	*Гілевіч* (1973). С. 430.
359	Будзе табе, дзевачка, вялікае гора...	Тамсама. С. 428.
360	Пойдзеш, дзевачка, ў чужыя людзі	Тамсама. С. 430.
360	А за лесам, лесам...	Тамсама. С. 28.
360	Ляцелі гусачкі, усе маўчалі...	Тамсама. С. 29.
361	За гарой рутачка, за гарой...	Тамсама. С. 31.
361	Ідзі, дачушка, дадому...	Тамсама. С. 33.
361	Ой, цёмна, цёмна, ў лесе...	Тамсама. С. 34.
362	Прыехалі на заручыны...	Тамсама. С. 46.
362	Каб я знала да я ведала...	Тамсама.
362	Пашугай, рута, пашугай...	Тамсама. С. 50.
362	Да ў вароцечках яліна...	Тамсама. С. 53.
363	Ой, звонка, звонка, сасонка...	Тамсама. С. 223.
363	Не сядзі, дзевачка, не сядзі...	*Гілевіч* (1979). С. 55.
363	Зборная суботанька настае...	Тамсама. С. 59.
364	Звязлі, знялі...	Тамсама. С. 97.
364	У Цімоха хата топіцца...	Тамсама. С. 100—101.
364	Да разгарэлася каліна...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 2. С. 339.
365	Стаіць дубок зелянюсенькі...	*Гілевіч* (1979). С. 113.
365	Ой, звіўся раёчак па край вароцечак...	Тамсама. С. 121.
365	Села маці блізко дзіцяці...	Тамсама. С. 124.
366	Як табе, маё сонейка?..	*Гілевіч* (1973). С. 437.
366	Ляці, ляці, саколе, ды не апазняйся...	*Гілевіч* (1979). С. 128.
366	За лесам, лесам сонейка іграе...	Тамсама. С. 129.
367	Кукавала зязюля ў садочку...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 2. С. 49.
368	Па лузе зялёны рамон паслаўся...	*Гілевіч* (1979). С. 133.
368	Раззеляніўся зялёны садок у гародзе...	Тамсама. С. 148.
368	З-пад белага бярэзнічка...	Тамсама. С. 152.
369	Чырвона каліначка...	Тамсама. С. 157.
369	Пусціла дзевачка русу касу...	Тамсама. С. 161.
369	Зялёная руціца, жоўты цвет...	Тамсама. С. 166.
369	Непраўдзівая калінка...	*Гілевіч* (1973). С. 66.
370	Калінка мая лугавая...	Тамсама. С. 225.
370	Шкада табе, мамачка, а мне гора...	Жанчына ў бел. тв-ці. С. 145.
370	Не плач, не плач, мая матулька, да па мне...	Зап. М. Аўхімовіч у 1967 г. у в. Купаленка Крупскага р-на ад Л. Аўхімовіч // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 11. Сш. 7. Л. 2-3.
371	У гародзе мята...	*Гілевіч* (1973). С. 167.
371	Станьце, дружачкі, да ўсе ў рад...	Жанчына ў бел. тв-ці. С. 152.
371	На чыей гэта ніве?..	*Гілевіч* (1973). С. 274.
372	Караваю, мой раю...	Тамсама. С. 63.
372	Каравайнічкі, пачынайнічкі...	*Гілевіч* (1974). С. 365.

С.	Змест	Крыніцы
372	Прыйшоў на вяселле наш сваток...	*Цітовіч.* С. 105.
373	Сыпце пшаніцу...	*Захарава.* С. 140.
373	Ліхія стральцы-байцы па полю ходзюць...	Тамсама. С. 169.
374	Брат сястру на пасад вядзе...	Тамсама. С. 196.
374	Маладая Гэлечка ў сені ўступіла...	Тамсама. С. 199.
374	Ой, хадзіла дзевачка круг стола...	Тамсама. С. 203.
374	Разлягайцеся, горы...	Тамсама. С. 206.
375	За гарой, за гарой...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 2. С. 114.
375	Як прыехалі з-пад вянца...	*Гілевіч* (1979). С. 208.
375	Каціласа калясо з клеці...	Зап. А. Фядосік у 1973 г. у в. Крынка Асіповіцкага р-на ад Е. Аўдзейчык // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 73. Спр. 70. Бл. 3. Арк. 21.
376	Ды пайшла сіротачка ды па свету, плачучы...	*Гілевіч* (1979). С. 221.
376	Хто там, хто там у цёмным лесе гукае?..	Тамсама. С. 225.
377	Усе зорачкі паўсходзілі...	Тамсама. С. 248.
377	А й чырвоная каліна, каліна...	Тамсама. С. 262.
377	Зялёненькі наш вінаград...	Тамсама. С. 310.
378	Ой, рэчка, рэчка быстрая...	Тамсама. С. 269.
378	Усходзіла красна сонца з замор'я...	Тамсама. С. 303.
378	Ой, сваточкі, галубочкі, просім вас...	Жанчына ў бел. тв-ці. С. 155.
379	Спіралася куна й з бабром пад вадой...	*Гілевіч* (1979). С. 321.
379	Салавей зязюльку да сябе падмаўляе...	Тамсама. С. 382.
379	Як заручалі, тады казалі...	Зап. М. Аўхімовіч у 1967 г. у в. Гумны Крупскага р-на ад А. Сіляк (1903 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 11. С. 7. Л. 12.
380	Харошы сваце, харошы...	*Гілевіч* (1979). С. 339.
380	Маладзенькая дружачка...	Тамсама. С. 350.
380	А сваціца-галубіца, не баў нас...	Тамсама. С. 357.
381	Пры дарозе белы рамон сцелецца...	Тамсама. С. 412.
381	Стаяць коні пры дарозе...	Тамсама. С. 437.
382	Віцечка каля цешчы ходзіць...	Тамсама. С. 439.
383	Вынось, маці, дзежку...	Тамсама. С. 471.
383	А ў нашым садзе паспелі вішні...	Тамсама. С. 489.
383	А прыданачкі, мае галачкі, едзьце дамоў...	Тамсама. С. 532.

С.	*Змест*	*Крыніцы*
383	А стаяла наша Валечка пры мосце...	*Гілевіч* (1979).
384	Аддалі мяне, забылі мяне...	*Чуркін.* С. 111.
384	**ХАЎТУРНЫЯ ГАЛАШЭННІ**	
384	Мой міленькі дружок...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 2. С. 648—649.
386	А мой мілюсенькі, а мой раднюсенькі...	Тамсама. С. 683—684.
387	Ах, мая ж ты матушка...	Тамсама. С. 672—673.
388	Яблычка маё недаспелае...	Тамсама. С. 654—655.
388	Дзецятка маё роднае, дзецятка маё мілае...	Тамсама. С. 657—658.
390	Бабка мая, зязюлька мая!	Тамсама. С. 690—691.
391	**ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ**	*Янкоўскі;* АІМЭФ.
419	**ЗАГАДКІ**	Загадкі / Склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. Мн., 1972. 448 с.
426	**КАЗКІ**	
429	Каток, пеўнічак і лісічка	*Шейн.* Т. 2. С. 1—3.
430	Дзедава рукавічка	Могилевская старина // Могилёвские губернские ведомости / Под ред. Е. Романова. Могилев. 1903. Вып. 3. С. 81—82.
431	Мужык, воўк і ліса	Казкі. С. 153.
432	Ліса-каталічка	*Романов.* Вып. 3. С. 28.
433	Вайна ваўка з сабакам	*Шейн.* Т. 2. С. 259—261.
436	Воўк, Змітрок, кабыла і баран	Казкі. С. 128—129.
437	Козы	Бел. казкі. С. 54—56.
439	Жораў і чапля	*Шейн.* Т. 2. С. 265.
440	Курка-рабушка	*Романов.* Вып. 3. С. 1—2.
442	Кот Максім — сват	*Шейн.* Т. 2. С. 11—15.
445	Бабіна дачка і дзедава дачка	Тамсама. С. 92—94.
448	Аб рачку	*Federowski.* **T. 2. S. 181**—183.
450	Два ў кораб арэшкі	Зап. К. П. Кабашнікаў у 1971 г. у в. Груздава Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. ад У. Рамбольскай (1906 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. № 44.
454	Іван Іванавіч-царэвіч	*Романов.* Вып. 4. С. 169.
464	Залатое пяро	*Романов.* Вып. 3. С. 232—238.
473	Рогі	Тамсама. С. 181.
479	Івашка-мядзведжае вушка	*Романов.* Вып. 6. С. 340—347.
489	Пакацігарошак	*Дмитриев.* С. 146 — 162.
500	Ілья	*Романов.* Вып. 3. С. 259—262 (падаецца ў скарачэнні).
504	Курыла Кажамяка	Тамсама. С. 217—219.

С.	Змест	Крыніцы
505	Жораваў кашалёк	*Романов.* Вып. 3. С. 271—276.
512	Дзіва	*Шейн.* Т. 2. С. 165—167.
514	Асілак	*Сержпутовский.* С. 87—90 (падаецца ў скарачэнні).
517	Іванка-прастачок	Тамсама. С. 149—152.
519	Чорт-злодзей	*Романов.* Вып. 3. С. 327—328.
521	Мужык, яго жонка і пан	*Шейн.* Т. 2. С. 187—190.
524	Як лянівая дачка рабіць навучылася	*Гілевіч* (1983). С. 91—92.
525	Як мужык хітра гуся падзяліў	*Federowski.* **T. 3. S. 149—150.**
525	Кацярына	*Шейн.* Т. 2. С. 197.
527	Пану навука	*Сержпутоўскі.* С. 103—107.
530	Мужык і пан	*Шейн.* Т. 2. С. 371—373.
533	Асцярожны пасланец	*Сержпутоўскі.* С. 83—86.
536	Не люба — не слухай	*Шейн.* Т. 2. С. 244—246.
538	Несцерка	*Романов.* Вып. 3. С. 400—402.
540	Завідны поп	*Сержпутоўскі.* С. 40—41.
541	Шаптуха	Тамсама. С. 176—178.
542	Папоўская хцівасць	Бел. казкі. С. 402—405.
546	Мужык, пан і цар	*Гілевіч* (1983). С. 35—36.
547	«Верны» слуга	Тамсама. С. 44—45.
547	Як мужык пана частаваў	Тамсама. С. 49—50.
548	Бацькавы наказы	Тамсама. С. 110—111.
550	Як я з дзедам пакутваў	*Шейн.* Т. 2. С. 246.
552	**ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ**	
553	Вялікі грэшнік	*Шейн.* Т. 2. С. 371—373.
554	Як чалавек зрабіў агонь	АІМЭФ. Ф. 9. Воп. 3. Спр. 20. Арк. 332.
555	Асілкі	Бел. эпас. С. 145—146.
556	Адкуль сяляне і паны	*Pietkiewicz.* **S. 78—79.**
557	Колькі жыць чалавеку	*Гілевіч* (1983). С. 143.
557	Чаму не аднолькава работы ва ўсіх	Тамсама. С. 151—152.
558	Чаму варагуюць сабака, кот і мышы	*Шейн.* Т. 2. С. 349.
558	Аб Воўгі, Дняпры і Сажы, і бацькі іх Нівісном	*Добровольский.* Ч. 1. С. 233—234.
559	Пра Нёман і Лашу	Зап. Г. Кляўко ў 1951 г. // АІМЭФ.
559	Пра чайку і возера Нарач	*Астаневіч М.* Скарбы Нарачы // Звязда. 1966. 5 ліп.
560	Ад чаго Нясвіж пашоў	Зап. В. В. Максімовіч у 1951 г. у в. Лань Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. ад Л. Дашка.
560	Пра скарб	*Pietkiewicz.* **S. 213.**
561	Як п'яніца ў рай папаў	*Добровольский.* Ч. 1. С. 255—256.
562	Машэка	*Шейн.* Т. 2. С. 451—453.

С.	*Змест*	*Крыніцы*
		Упершыню апублікаваў Ф. Падабед у «Могилевских ведомостях» (1851, № 8; неофициальная часть). Пераклад з рускай мовы К. Кабашнікава.
563	Нарач	Нарачанская зара. 1969. 7 кастр. Зап. С. Ждановіч.
565	Пра возера Баторына	*Гілевіч* (1983). С. 212—213.
565	Адкуль Рубеж	Бел. эпас. С. 212.
566	Пра вайну са шведамі	Рукап. аддзел б-кі Вільнюск. ун-та. А-63 / II. 172.
566	Бітва пад Лясной	Бел. эпас. С. 213.
566	Вайна шведска	*Federowski.* T. 3. S. 5.
567	Платон-казак	*Сержпутоўскі.* С. 166—167.
568	Дзяды расказвалі	Тураўскі слоўнік. Мн., 1982. Т. 1. С. 241.
571	**АНЕКДОТЫ**	
571	Віншаванне	*Шейн.* Т. 2. С. 315.
572	Даведаўся	Ніва (Беласток). 1975. 22 чэрв.
572	Сваю службу знае	АІМЭФ. Ф. 9. Воп. 2. Спр. 30. Л. 16.
572	Самыя лепшыя грушы	Тамсама. С. 23.
572	Хітры хлапчук	Бел. жарты. С. 9.
573	Рапарт пану	Тамсама. С. 10.
573	Разышоўся, як заечае сала	Тамсама. С. 10—11.
573	Суддзя і селянін	Тамсама. С. 12.
574	Дурны суддзя	Тамсама. С. 15.
574	Добра зразумеў	Наша ніва. 1914. 16 мая.
574	Што ні пан, то сабака	Зап. Д. У. Корсак у 1965 г. у в. Н-Бярэзіна Іўеўскага р-на ад Б. Рабкоўскага (60 гадоў) // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 27. Сш. 9.
574	Жартаўлівы гаспадар	*Federowski.* T. 3. S. 116.
574	Мужык і пан	Ніва (Беласток). 1975. 14 вер.
575	Чым частавалі пана	Зап. А. А. Гадзецкая ў 1964 г. у м. Грозава Капыльскага р-на ад М. Е. Давідоўскага (66 гадоў) // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 63. Бл. 8. Л. 1.
575	Калі скончаць?	АІМЭФ. Ф. 9. Воп. 2. Спр. 30.
576	Тату на старасць	*Federowski.* T. 3. S. 28.
576	Адзіны ратунак	Ніва (Беласток). 1974. 24 лют.
576	Няхай	*Сержпутоўскі.* С. 37—38.
577	Сын Хвядос	*Шейн.* Т. 2. С. 306—307.
578	Што Бог злучыў, таго не разлучай	*Сержпутоўскі.* С. 239—240.

С.	Змест	Крыніцы
579	Набожны ксёндз	*Шейн.* Т. 2. С. 322.
580	Аб хітрым дзяку	*Federowski.* Т. 3. S. 178—179.
580	Пропаведзь	Тамсама. С. 209.
581	Поп і запаведзі	Бел. жарты. С. 36—37.
581	Карась	Бел. народ. С. 42.
581	Споведзь шляхціца	*Federowski.* Т. 3. S. 174.
582	Папоўская пропаведзь	Беларусь. 1959. № 1. С. 29 (зап. Я. Колас).
582	Разжаліў	*Романов.* Вып. 3. С. 428.
582	У пекле	Беларусь. 1960. № 6. С. 27.
582	Бедная баба	Бел. жарты. С. 1.
583	Мужчына за мужчыну цягне	*Federowski.* Т. 3. S. 79—80.
583	Дзіцятка	Бел. жарты. С. 1.
583	Вялікі чын	Тамсама. С. 7.
583	Немажлівая рэч	Тамсама. С. 8.
583	Пакаштаваў	Народныя ўсмешкі. Мн., 1961. С. 14.
583	Варажбітка	Бел. фальклор. С. 438—439.
584	Пра мужыка Івана	Тамсама. С. 444—445.
585	Камандзір Дзёмін	Тамсама. С. 448.
586	Як Заслонаў немцаў-карнікаў сустрэў	Тамсама.
586	Як Заслонаў у разведку хадзіў	Тамсама. С. 451.
587	Цвярозыя разважанні	Тамсама. С. 497.
587	Вылечылі	Тамсама. С. 496.
587	Курортнікі	Тамсама.
587	Добра, ды не зусім	Тамсама.
588	Дакладны адказ	Тамсама. С. 489.
588	Да зімы мы не дажывём	Тамсама.
588	Красамоўнае маўчанне	Тамсама.
588	У фашысцкім шпіталі	Тамсама.
588	Храбры ваяка	Тамсама.
588	Салдацкая размова	Тамсама.
589	Дрэнны клімат	Тамсама. С. 482.
589	Навагоднія падарункі	Тамсама. С. 486.
589	Бабуля і ўнучак	Тамсама.
589	У разведцы	Тамсама. С. 492.
589	У нямецкім шпіталі	Тамсама. С. 491.
589	Пекла і рай	Тамсама. С. 481.
590	Законнае пытанне	Тамсама. С. 497.
590	У нямецкай школе	Тамсама.
590	Дакладны адрас	Тамсама.
590	Ці вернемся мы ў Данбас?	Тамсама.
590	Канец ясны	Тамсама.
590	Небяспечная хвароба	Тамсама. С. 497.
590	Па загадзя распрацаванаму плану	Тамсама. С. 478.
591	Сур'ёзнае разыходжанне	Тамсама. С. 479.
591	Гутарка сяброў	Тамсама. С. 478.
591	Асвоіў	Тамсама. С. 481.
591	Зазнаўся	Тамсама. С. 491.
591	Сабаку з'еў	Тамсама. С. 500.
592	Пяты вінаваты	Тамсама.

С.	*З м е с т*	*К р ы н і ц ы*
592	Адпачынак	Бел. фальклор. С. 481.
592	У нямецкім бліндажы	Тамсама. С. 478.
592	Верная дарога	Тамсама.
593	У яго зноў баявыя поспехі	Тамсама. С. 475.
593	Дарэмныя захады	Тамсама.
593	У Берліне	Тамсама.
593	Цёплае і халоднае	Тамсама. С. 475.
593	У раённай управе	Тамсама. С. 479.
594	У судзе	Тамсама. С. 478.
594	Смех і слёзы	Праблемы фальклору. С. 166. Зап. А. Шастаковіч у 1974 г. у в. Рудзевічы Мядзельскага р-на ад І. А. Літвіновіча
594	Я не з тых	Тамсама. С. 167. Зап. В. Скідан у 1964 г. у в. Мокіш Хойніцкага р-на ад У. А. Краўчанкі.
594	Арыфметыка	Тамсама. Зап. В. Скідан у 1964 г. у в. Рудакоў Хойніцкага р-на ад А. П. Бржэзінскага.
594	Размова суседак	Праблемы фальклору. С. 168. Зап. А. Фядосік у 1967 г. у г. п. Мікашэвічы ад В. С. Данілава.
595	Выкруціўся	Тамсама. С. 165. Зап. В. Маеўскі.
596	**ПАЗААБРАДАВЫЯ ПЕСНІ**	
597	**АНТЫПРЫГОННІЦКІЯ ПЕСНІ**	
597	Ах ты, сонца-сонейка...	*Шейн.* Бел. песни. С. 77.
598	Не плач, маё дзіцятка...	*Бычко-Машко И. Е.* Сборник народных песен. Спб., 1911. С. 34.
598	А ў бары зязюлька кукуе...	Жанчына ў бел. тв-ці. С. 258.
598	Добры наш пан, добры наш пан...	Нар. тв-ць. С. 103.
599	У там той вёсцы вецер вее...	*Czeczot.* S. 30.
599	Ой, со дома, пане браце...	*Грынблат.* С. 166.
600	Бадай пану ў дварэ страшна...	*Гильтебрандт.* С. 122.
600	Ой, закурэла, ой, ды задымела...	*Цітовіч.* С. 253—254.
601	Ой, ты, дуб-дубіна...	*Чуркін.* С. 115.
601	Прывыкайце, чорны вочы...	*Цітовіч.* С. 258.
602	Каліна-маліна...	*Цітовіч.* С. 263.
602	Ты запей, запей, жавароначак...	Тамсама. С. 255.

С.	Змест	Крыніцы
603	**РЭКРУЦКІЯ ПЕСНІ**	
603	Зашумела дубровачка зялёная...	*Грыневіч, Зязюля.* С. 36.
603	Ой, з-пад лесу, лесу цёмнага...	*Шырма.* Т. 2. С. 329—330.
604	З-пад зялёнага дуба...	*Federowski.* Т. 5. **S. 798.**
605	Ой, у полі тры бярозкі стаіць...	*Гілевіч* (1922). С. 164.
605	Спарадзіла маменька сынка-сакалка...	Тамсама. С. 162—163.
606	Ой, у лузе там каліна стаіць...	Тамсама. С. 163.
606	Не плач, маці, ні айцец...	Тамсама. С. 162.
607	Цёпла восень і з дажджом...	АІМЭФ. Воп. 10. Спр. 78. Сш. 2. Арк. 5.
607	У канцы садзіку зялёнага...	*Чуркін.* С. 124.
608	Баравая ягадачка...	*Шырма.* Т. 2. С. 325.
609	**САЛДАЦКІЯ І КАЗАЦКІЯ ПЕСНІ**	
609	А ў нядзельку рана стала рассвітаці...	*Радченко.* С. 192.
609	Цёмна ночка да нявідная...	*Гильтебрандт.* С. 12—13.
609	Гэй, зашумела зялёна дуброва, шчыры бор...	АІМЭФ. Ф. 8. Спр. 26. Сш. 3. Арк. 45—46.
610	Як я молада была...	*Цітовіч.* С. 224.
611	У нядзельку раненька...	Тамсама. С. 222—223.
612	Ды на нашым гародзе...	*Чуркін.* С. 122—123.
614	Каліна-маліна...	*Цітовіч.* С. 231.
614	Зазвінелі новы ключы...	Тамсама. С. 235.
615	Ах ты, зорка мая...	Тамсама. С. 236.
615	Зялёная ды дуброванька...	*Шырма.* Т. 2. С. 360—361.
616	Шчука-рыба ў моры...	*Гильтебрандт.* С. 59—60.
616	Ой ты, поле маё...	*Чуркін.* С. 128.
617	Памёр, памёр салдаціку...	Тамсама. С. 129—130.
617	Прыляцелі гусі...	*Шырма.* Т. 2. С. 312.
618	За гарою трава шуміць...	*Булгаковский* С. 138—139.
618	Ой, у полі пад вішанькаю...	*Czeczot.* **S. 25.**
619	Дзе крыніца глыбокая...	*Шырма.* Т. 2. С. 304—305.
620	Цёмна ночка наступае...	*Грыневіч, Зязюля.* С. 21—22.
620	Шуміць-шуміць зялёная дубрава...	*Гілевіч* (1992). С. 166.
621	Конь бяжыць, зямля дрыжыць...	Тамсама. С. 167.
622	**ЧУМАЦКІЯ, БУРЛАЦКІЯ І ПРЫМАЦКІЯ ПЕСНІ**	
622	Чумак рана ўставае...	*Радченко.* С. 195.
622	Валы мае палавыя...	АІРЛ АН РФ. Кал. 30. Сш. 1. Арк. 38.
622	Ты чумача, чумача...	АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 4. Сш. 1. Арк. 15—20.

С.	*Змест*	*Крыніцы*
623	Дзе ж ты, бурлак, валачыўся...	*Грынблат.* С. 113—114.
623	Да сядзіць пугач у лузе на каліне...	Тамсама. С. 117.
624	Ой, хто не служыў, братцы, у багатыра...	Тамсама. С. 118.
625	А нікому, а нікому...	АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 63. Сш. 1. Арк. 42.
626	Расцвілася чарэшанька...	Зап. М. Я. Грынблат у 1970 г. у в. Падзюргеляны Эйшышкага р-на Літоўскай ССР ад В. Лялькі // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 26. Сш. 1. Арк. 39—47.
628	**СЯМЕЙНА-БЫТАВЫЯ ПЕСНІ**	
628	Піце, піце, госцейкі, піце...	Зап. А. Емельянаў у 1960 г. у в. Цяцерын Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл. ад Ф. Нырцовай (1914 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. Спр. 8. Арк. 54.
628	Ах вы, столікі мае...	*Чуркін.* С. 105. № 69.
629	На гарэ вярбіца...	Зап. А. І. Гурскі ў 1965 г. у в. Ляды Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. ад Е. Г. Клімавай (1917 г. н.) і П. Каржаевай (1918 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 95. Бл. 1. Арк. 8.
629	Ой, за бор, за бор...	*Шырма.* Т. 2. С. 26. № 12.
629	Ды ўжо сонейка за лес коціцца...	*Цітовіч.* С. 180.
630	Ты, каліна, ты, маліна...	Тамсама. С. 177.
630	Чырвоная каліначка...	Тамсама. С. 178.
631	Стуку-груку...	Зап. Г. А. Барташэвіч у 1968 г. у в. Прысынкі Уздзенскага р-на ад В. С. Шыдлоўскай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 6. Сш. 4. Арк. 3. № 2.
631	Што на свеце пачуваецца...	*Шырма.* Т. 2. С. 81. № 53.
631	Ой, зелена, зелена...	*Грыневіч. Зязюля.* С. 19. № 16.
632	Як пайду я ў каморачку...	*Шырма.* Т. 2. С. 39. № 21.
633	Я ўчора ў піру была...	*Цітовіч.* С. 277.
633	Бяда салаўю, бяда...	*Шырма.* Т. 2. С. 213. № 151.
633	Ой, запяю песню вясёлую...	Зап. М. А. Янкоўскі ў 1959 г. у в. Вёснаў Глускага р-на ад А. Верашчакі // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. Спр. 3. Сш. 1. Арк. 55.
634	Ой, палын — трава горкая...	*Шырма.* Т. 2. С. 54. № 32.
635	Ой, гаю мой, гаю...	*Цітовіч.* С. 181.
635	Чырвоная каліначка...	*Грыневіч. Зязюля.* С. 5—6.
636	Ой, горкая я і доля мая...	Зап. Ул. К. Цішчанка ў 1975 г. у в. Улукі Слаўгарад-

скага р-на ад В. К. Цішчанкі // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 75. Спр. 104. Сш. 1. Арк. 68.

636 Вярба, вярба, дзе ж ты расла?.. *Цітовіч.* С. 187.
637 Ой, не кукуй, зязюленька, рана... Тамсама. С. 190—191.
638 Белая бярозачка... Зап. М. А. Янкоўскі ў 1959 г. у в. Вёснаў Глускага р-на ад А. Верашчакі // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. Спр. 3. Сш. 1. Арк. 66.
638 Аддаў мяне бацька далёка замуж... *Гілевіч* (1992). С. 193.
639 Зялёная вішня... Тамсама. С. 184.
639 Ой, пайду я лугам, лугам... Тамсама. С. 185—186.
639 А дуб к дубу ды галовачку клоніць... Тамсама. С. 192—193.
640 Ой, татачка мой родненькі... Тамсама. С. 190.
640 Як вышчыпну з рожы кветку... Тамсама. С. 186.
641 Галава мая, галовачка... *Гілевіч* (1992). С. 187.
641 А белая бярозачка бялей майго цела... Тамсама. С. 190.
642 Ой, у роўным полі стаяць тры садочкі... Тамсама. С. 192.

642 **ЛЮБОЎНЫЯ ПЕСНІ**

642 Ой, у полі верба расла... *Гілевіч* (1973). С. 181.
643 Ой, зарадзілі сільна, буйна... *Цітовіч.* С. 113.
644 А ў полі вярба... Тамсама. С. 116.
644 Ой, рабіначка... Тамсама. С. 100.
644 Ляціць галка цераз балку... *Захарава.* С. 192—193.
645 Чаму не прыйшоў, ці не прыехаў... *Гілевіч* (1973). С. 285.
646 Ці свет, ці світае... *Цітовіч.* С. 126—127.
646 Зялёны дубочак... Тамсама. С. 110.
647 Ляціць сарока ды скрай аблока... Тамсама. С. 108—109.
647 Пайду я ў садочак... *Гілевіч* (1973). С. 195—196.
648 Ці не быстрая рэчка... Зап. Э. Н. Ледаковіч у 1959 г. у в. Лявонавічы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. ад Н. Чурко // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. Спр. 20. Арк. 92.
648 Ты, чырвоная каліна... *Цітовіч.* С. 119—120.
649 На гарэ дубочак... *Шырма.* Т. 1. С. 86.
649 Усе хмарачкі ды па парачцы... *Гілевіч* (1973). С. 99—100.
650 Ой, крушына, крушына... Дзень паэзіі. С. 140—141.
650 Ой, ці ўсе лугі пакошаны *Шырма* Т. 1. С. 66.
651 Ой, белая бярозанька... Тамсама. С. 60.
651 Ой, пад гаем зеляненькім... Зап. В. Шымук у 1959 г. ад калгасніка сельгасарцелі імя Чапаева Дзятлаўскага р-на А. К. Вайцешкі // АІМЭФ.

Ф. 13. Воп. 9. Спр. 9. Сш. 1. Арк. 34.

652 Цякла рэчка з-пад мястэчка... *Гілевіч* (1973). С. 400.
652 Туман, туман па даліне... *Грыневіч, Зязюля.* С. 7—8.
653 А дзе тая крынічанька... Тамсама. С. 4.
654 Здрада, здрада, чорны бровы, здрада... *Гілевіч* (1973). С. 107.
654 Ой, ляцелі гусі... *Шырма.* Т. 1. С. 23.
655 Паехаў мой мілы... *Ледаковіч.* С. 5—6.
655 У агародзе вярба расла... *Захарава.* С. 201.
656 Ці свет, ці світае... *Грыневіч, Зязюля.* С. 14.
657 Ой, хадзіла Машанька... *Гілевіч* (1973). С. 186—187.
657 Ой, заржы, заржы, сівы конік-ку... *Грыневіч. Зязюля.* С. 9.
658 Сядзіць голуб пры дубку... *Гілевіч* (1973). С. 329.
658 Што за месяц, што за ясны... *Цітовіч.* С. 104.
658 Па садочку пахаджаю... *Гілевіч* (1992). С. 174.
659 Ці ўсе да сады цвітуць... Тамсама. С. 173—174.
659 Добры вечар, дзяўчыначка... Тамсама. С. 175.
660 Любіліся, кахаліся... Тамсама. С. 173.
660 Ты, мой казача, ты, мой любенькі... Тамсама. С. 175.
661 Учора не быў і сёння не быў... Тамсама. С. 172—173.
661 Ой, у полі азярэчко... Тамсама. С. 176—177.
662 Там у лузе, лузе... Беларускі фальклор у сучасных запісах / Склад. В. А. Захарава. Мн., 1973. С. 196.
662 Ой, ляцелі гусі з броду... *Гілевіч* (1992). С. 171—172.

663 **ЖАРТОЎНЫЯ ПЕСНІ**

663 Ой, у полі крынічанька... Зап. М. П. Гваздзёў у в. Азершчына Лепельскага р-на ад. Г. Лапіцкай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 92. Арк. 478.
664 Ой, пасею я рамоню... *Federowski.* **T. 5. S. 26.**
665 Ой, паслала мяне маці... Зап. М. П. Гваздзёў у 1961 г. у в. Гарадзец Кобрынскага р-на ад Е. І. Казакевіч // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 69. Сш. 3. Арк. 34.
666 Ой, хацела ж мяне маці... *Цітовіч.* С. 200.
666 Сам не знаю, не ведаю... Тамсама. С. 286.
667 Хлопец пашаньку пахае... Цітовіч. С. 289.
667 Ой, пайду я лугам... *Ледаковіч.* С. 70.
668 Чабарок, чабарок... *Цітовіч.* С. 285.
668 Чаму ж мне не пець... Жартоўныя песні / Склад. І. К. Цішчанкі. Мн., 1974. С. 70.
669 На дварэ дожджык... Зап. М. П. Гваздзёў у 1958 г. у в. Азершчына Лепельскага р-на ад Г. Лапіцкай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 92. Арк. 475.

С.	Змест	Крыніцы
669	А мой мілы захварэў...	Цітовіч. С. 273—274.
670	Было ў цешчы сем зяцёў...	*Добровольский.* Ч. 4. С. 377.
671	Спарадзіла чачотачка семера дачок...	*Шейн.* Т. 1. Ч. 1. С. 527—529.
673	А як дзед з бабай пайшоў па каліну...	*Романов.* Т. 1. С. 1—2.
673	Пасеяў мужык грэчку...	Зап. І. І. Лушчыцкая ў 1960 г. у в. Засулле Стаўбцоўскага р-на ад А. К. Кумец // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 52. Арк. 25.
674	А ў верасні месяцы...	Зап. І. С. Курбека ў 1960 г. у Докшыцкім р-не // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. Спр. 7.
674	Ах, ты дуй, ах, ты дуй...	*Грынблат.* С. 266.
675	Захацела бабусенька...	*Чуркін.* С. 160.
675	Ой, у лесе пры даліне...	АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 48. Сш. 2. Арк. 16.
676	А я ў печы не паліла...	*Гілевіч (1992).* С. 211.
677	А ў месяцы верасні...	Тамсама. С. 212.
677	Ой, да прадай, бабушка, бычка...	Тамсама. С. 214—216.
678	Баба Ева, дзед Тамаш, эха-ха...	Тамсама. С. 216.
679	**ПЕСНІ ДА ТАНЦАЎ, СКОКАЎ І ГУЛЬНЯЎ**	
679	Юрачка	*Чуркін.* С. 172.
679	Кадрыль	Тамсама. С. 174.
679	А Мікіта жыта носіць...	Тамсама.
680	Антон маладзенькі...	Тамсама. С. 173.
680	Падушачка, падушачка...	*Цітовіч.* С. 314—315.
681	А Лявоніху Лявон палюбіў...	Тамсама. С. 304—305.
682	А ў полі ніўка...	Тамсама. С. 311.
682	Гэй, гэй, таўкачыкі...	*Чуркін.* С. 172.
682	Пасеялі дзеўкі лён...	*Цітовіч.* С. 316.
683	Старэнькі дзедка...	*Чуркін.* С. 169.
683	Стаіць Янка на гары...	*Гілевіч* (1992). С. 222.
685	**ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕСНІ, ТВОРЧАСЦЬ РАБОЧЫХ, ПАЭЗІЯ ЗМАГАННЯ**	
688	Пра татарскі пастой.	*Ластоўскі.* С. 54.
689	Вох ты, ёлка, ялінка...	*Добровольский.* Ч. 4. С. 10.
689	Каля лесу, лесу цёмнага...	Бел. эпас. С. 167.
689	Наехалі, наехалі ўсё татарыны...	*Добровольский.* Ч. 4. № 6.
690	Ой, лятаў-палятаў ды сівы гарол...	Бел. эпас. С. 175—176.
692	У нядзелю пад панядзелак...	*Романов.* Вып. 1-2. С. 49—50.
693	Як белы свет завадзіўся...	Зап. В. І. Скідан у 1973 г. у в. Звіняцкае Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. ад А. Апанасенкі (1898 г. н.) // АІМЭФ.

С	*Змест*	*Крыніцы*
		Ф. 8. Воп. 73. Спр. 71. Сш. 2. Арк. 48—50.
694	Прыехаў дзед на паляначку...	Бел. эпас. С. 162.
695	Цёмна ночка наступая...	Тамсама. С. 173.
695	Ой, у горадзе Магілеве дымам пацягнула...	Тамсама. С. 183.
696	Была дзела пад Палтавай...	Тамсама. С. 188.
696	Каля рэчачкі Дняпра...	Тамсама. С. 204.
696	Прывыкайце, чорны вочы...	Песні бел. народа. С. 87.
697	Ой ты, доля, наша долечка...	Зап. Н. Андрэева ў 1962 г. у в. Рацэмля Навагрудскага р-на ад В. Будзюк // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 1.
697	Горка, доля ты батрацкая...	Беларускія народныя і рэвалюцыйныя песні. Мн., 1938. С. 160.
698	Ой, ляцелі гускі...	Песні бел. народа. С. 92.
698	Не па ўласнай мы ахвоце...	Нар. творчісць та етнографія. 1963. № 3. С. 77.
698	Салавей мой сізакрылы...	Песні бел. народа. С. 131.
699	Адпусцілі сялян «на свабоду»...	Бел. народ. С. 121.
699	А хто не быў на чыгунцы...	Песні бел. народа. С. 134.
699	Дзе работаюць шахцёры...	Нар. творчісць та етнографія. 1963. № 2. С. 76.
700	Раз, было, я замарыўся...	*Васілёнак С. І.* Народная творчасць. Мн., 1940. С. 248.
700	Пажыў, пажыў я на свеце...	АІМЭФ. Ф. 9. Воп. 2. Спр. 34. Арк. 206—207.
700	Жыццё маё нялёгкае...	Полымя рэвалюцыі. 1935. № 8. С. 130.
700	У нядзельку раненька...	Зап. М. Чуркін і І. Сербаў у 1936 г. у в. Лядцо Пухавіцкага р-на ад Анюты і Альжбеты Жаўнерчык // АІМЭФ. Ф. 9. Воп. 2. Спр. 5. Арк. 31—32.
701	Салдацкія прыпеўкі...	Зап. М. Жылінскі ў 1962 г. у в. Камяніцы Свіслацкага р-на ад І. Карася (1879 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 2.
701	А мы Бога паміналі...	*Никифоровский.* С. 8.
702	Шалейце вы, каты!..	Зап. А. Ліс у 1961 г. на Слонімшчыне ад розных асоб // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 76. Сш. 3. Арк. 11.
702	Атаман Муха	Чырвоны сцяг. 1924. № 3.
703	Прыпеўкі	Чырвоны сцяг. 1925. № 4.
703	Заходнебеларускі гімн	Зап. А. Ліс у 1961 г. у г. п. Любча ад Аеры Булаўка (1910 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 8. Спр. 43. Арк. 32. Фальклорны

С.	Змест	Крыніцы
		варыянт верша Я. Купалы.
703	Нёман	*Цітовіч.* С. 357.
703	Наперад, гэй...	Зап. А. Ліс у 1961 г. у г. п. Глыбокае ад Надзеі Сакалоўскай (1910 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 68. Сш. 1. Арк. 1—2. Народны варыянт верша П. Пестрака.
704	Маладняк	Зап. А. Ліс. У 1960 г. у в. Еськавічы Нясвіжскага р-на ад Лукаша Капыткі (1908 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 54. Сш. 4. Арк. 2. Пераклад, заходнебеларускі варыянт верша А. Безыменскага.
705	Кавалі	Зап. А. Ліс у 1960 г. у г. Нясвіжы ад У. Гуля (1914 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 54. Сш. 4. Арк. 1. Пераклад верша Ф. Шкулёва «Кузнецы».
705	Нарачанка	Зап. А. Ліс у 1961 г. у в. Пасынкі Мядзельскага р-на ад М. Субача (1896 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 68. Сш. 1. Арк. 12—14.
706	Нас не зломіць нядоля ліхая...	Полымя. 1956. № 9. С. 175.
707	Гэй, наперад!..	АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 85. Арк. 4 (верш Я. Купалы, муз. А. Грыневіча).
707	Марш бярозаўцаў...	Полымя. 1958. № 2. С. 178.
708	Нас душаць зладзеі-акупанты...	*Калеснік.* С. 116.
708	Чырвоная зорка	Тамсама. С. 113.
709	Стары год пражыўшы...	Тамсама. С. 114.
710	Заходнебеларуская купалка	*Цітовіч.* С. 258.
710	Ой, вядуць, вядуць...	Вілейская праўда. 1939. 27 лістап.
710	Смерць вязня	Зап. А. Ліс у 1960 г. у в. Еськавічы Нясвіжскага р-на ад Лукаша Капыткі (1908 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 54. Сш. 4. Арк. 15.
711	Пад гоман вясёлы...	*Калеснік.* С. 115.
712	Гусі	*Грынблат М.* Падпольныя народныя песні ў былой Польшчы // ЛіМ. 1941. 15 лют.
712	Ох, ты, сад, ты мой сад...	Бел. тв-ць. С. 51—52.
713	Ой, ты, Ваня-Ванечка...	Тамсама. С. 58.
713	Балада аб партызанцы Галіне	Тамсама. С. 61—62.
714	На кані вараным...	Зап. В. І. Ялатаў у 1957 г. у в. Верхняя Тошчыца Быхаўскага р-на ад В. А. Сысоевай

С.	*Змест*	*Крыніцы*
		і Т. І. Ціханцовай // АІМЭФ. Ф. 2. Воп. 7. № 3.
714	Цячэ рэчка ля паляны...	Зап. І. С. Тулупаў у в. Белае Балота Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл. ад Р. І. Палавінка // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. № 19.
715	Па полі, пакрытым туманам...	Бел. фальклор. С. 72.
715	У бары кукавала зязюля...	Тамсама. С. 69.
715	Каб жыць на свабодзе палюдску...	Тамсама. С. 63.
716	У лесе, на мшыстай палянцы...	Тамсама. С. 73.
716	Ніколі не згіне ад лютых пажараў...	Тамсама. С. 106—107.
717	Не зязюлька плача і кукуе...	Тамсама. С. 149.
718	Ой, туманы...	Бел. тв-ць. С. 55—56.
719	У чыстым полі, ў полі пад ракітай...	Тамсама. С. 155.
719	Трава палягае...	Тамсама. С. 159.
719	Быццам чорная навала...	Зап. І. Трус у 1950 г. у Уздзенскім р-не Мінскай вобл. // АІМЭФ. Ф. 9. Воп. 1. № 16.
720	Бывайце здаровы!..	Бел. фальклор. С. 214—215.
721	Прыстань, Прыстань, знаёмая вёска...	Тамсама. С. 227
721	Забрукуй, сівы галубочак...	Тамсама. С. 238—239.
722	Гэй вы, фрыцы-ягамосці...	Бел. фальклор. С. 204.
722	Ой, з-пад горкі ўсё туман...	Тамсама. С. 258.
722	Ужо сонца закаціласа...	Бел. тв-ць. С. 68—69.
723	Пінская партызанская	Песни счастья. М.; Л., 1950. С. 15. Зап. Г. Цітовіч у в. Лунін Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.
724	Партызаніць бацька Ніны...	Бел. фальклор. С. 209—210. Зап. Л. С. Савікоўская ў 1945 г. у в. Горна Плешчаніцкага р-на Мінскай вобл. ад загадчыцы хаты-чытальні В. Р. Еляневіч, якая чула гэту песню ад партызан партызанскай брыгады імя Калініна ў 1943 г.
725	А Лявоніху Лявон палюбіў...	АІМЭФ. Ф. 9. Воп. 2. Спр. 34. Арк. 287—288.
726	Дайце ў рукі мне гармонь...	Бел. фальклор. С. 211.
726	Хутка сонца заззяе над намі...	АІМЭФ. Ф. 9. Воп. 2. Спр. 34. Арк. 290.
727	Із далёкіх із краёў...	Песні бел. народа. С. 372.
727	На магіле ружы расцвітаюць...	Бел. фальклор. С. 150.
728	Я рана ўстану...	Сучасны фальклор. С. 22.

С.	Змест	Крыніцы
729	**БАЛАДЫ**	
729	Паехаў сынку на Русь жаніцца...	Балады. Кн. 1. № 331.
731	Як паехаў пан-каралевіч на Русь ваяваць...	Балады. Кн. 2. № 704.
732	Лугам, лугам лабада...	Тамсама. Кн. 1. № 507.
733	А былі ж людзі да няверныя...	Тамсама. № 477.
735	Стрыкліва крапівіца балотная...	Тамсама. № 439.
736	А ўдовушка, удава...	Тамсама. № 217.
737	Да у нашым Слуцку навіна стала...	Тамсама. Кн. 2. № 647.
738	Пасею пшанічаньку у роўненькім полі...	Тамсама. № 857.
740	Ой, лятаў, палятаў ды сівы арол	*Гілевіч* (1992). С. 198—199.
741	Як паехаў сын Даніла на ваёначку...	Тамсама. С. 199—200.
742	Паехаў сынку на Русь жаніцца...	Тамсама. С. 203—204.
742	Жана мужа ды не любіла...	Тамсама. С. 202—203.
744	Як у нашым сяле нова новіна...	Тамсама. С. 203—204.
744	Была я ў мамкі адна на раду...	Тамсама. С. 205—206.
745	Сын у мамачкі ночку начаваў...	Тамсама. С. 206—207.
746	Ой, за гаем, гаем, гаем зеляненькім...	Тамсама. С. 207—208.
748	**ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР**	
749	**КАЛЫХАНКІ**	
749	А-а, а-а, каткі два...	Зап. Л. М. Салавей у 1971 г. у в. Груздава Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. ад М. М. Казлоўскай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 39. Сш. 1. Арк. 46.
750	Люлі-люлі-люлі...	*Шейн.* Бел. песни. С. 16.
750	Пайдзі, коця, на вулку...	Тамсама. С. 20.
750	Ах ты, коцік, мой каток...	Зап. Г. А. Барташэвіч у 1968 г. у в. Белая Дуброва Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 6. Сш. 2. Арк. 50.
750	Люлі-люлі-люлі...	Дзіцячы фальклор. С. 140.
751	А-а, люлі-люлі-люленькі...	Зап. В. Ф. Гусціновіч у 1958 г. у в. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. ад Г. П. Дамашэвіч // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 9. Спр. 4. Сш. 1.
751	Баю-баю-баінькі...	Зап. М. П. Гваздзёў у 1965 г. у в. Вялікае Сяло Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. ад П. П.

С.	*З м е с т*	*К р ы н і ц ы*
		Куляшовай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 94. Сш. 3. Арк. 13.
751	А-а-а, люлі-люлінькі...	Дзіцячы фальклор. С. 168. Зап. В. Ф. Гусціновіч у 1960 г. у в. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. Ад М. Р. Гусціновіч // Фонд РДНТ.
751	Ой, баю-баю-баю...	Зап. М. Я. Грынблат у 1964 г. у в. Сурміно Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. ад Н. Б. Маскалёвай // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 87. Сш. 5. Арк. 34.
751	А-а, а-а, малое...	Зап. Л. М. Салавей у 1971 г. у в. Груздава Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. ад М. М. Казлоўскай (1911 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 39. Сш. 1. Арк. 46. № 55.
752	Люлі, люлі, усе паснулі...	*Зянько.* С. 142.
752	Ааа, ааа, люлі...	Тамсама. С. 193.
753	Люляй-люляй, дзіця спаць...	*Federowski.* T. 5. S. 613. № 1438.
753	Люлі, малое дзіця...	*Czeczot.* S. 74.
753	**ЗАБАЎЛЯНКІ**	
753	Ладу-ладу-ладкі...	*Грыневіч.* С. 5. № 1.
753	Лады-лады-ладкі...	Дзіцячы фальклор. С. 193.
754	Лады, лады, ладкі...	*Зянько.* С. 191.
754	Пайшоў каток пад масток...	Тамсама. С. 193.
754	Кацюты, кацюты...	Тамсама. С. 195.
755	Чук-чук, чукавала...	Тамсама. С. 206.
755	Кую, кую ножку...	Тамсама. С. 212.
755	Кую, кую, ножку...	Тамсама. С. 195.
756	Сарока дзецям кашку варыла...	Тамсама. С. 197.
756	Чыкі, чыкі, сарока...	*Зянько.* С. 194.
756	Мышка, мышка, дзе была...	*Грыневіч.* С. 6. № 3.
757	Ішоў бай па сцяне...	*Грыневіч. Зязюля.* С. 30.
757	Ідзе бай па сцяне...	*Зянько.* С. 196.
757	**ПЕСНІ**	
757	Пайшоў конік да вады...	Зап. Л. М. Салавей у 1971 г. у в. Груздава Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. ад М. М. Казлоўскай (1911 г. н.) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 39. Сш. 1. Арк. 52—53. № 63.
757	Зайчык маленькі...	Зап. Н. М. Шнаркевіч у 1970 г. у г. Вільнюсе ад К. Асіповіч (з в. Маркава Маладзе-

С.	Змест	Крыніцы
		чанскага р-на) // АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 37. Сш. 2. Арк. 15.
758	А шэрая козанька...	*Грыневіч.* С. 11. № 10.
758	**ЗАКЛІЧКІ, ПРЫГАВОРКІ**	
758	Сонейка, сонца...	Зап. Г. А. Барташэвіч у 1971 г. у в. Дукора Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. ад дзяцей // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 40. Арк. 10.
758	Дожджык, дожджык, секані...	Тэкст зап. Г. А. Барташэвіч, мелодыю — В. І. Ялатаў у 1971 г. у в. Хацежына Мінскага р-на Мінскай вобл. ад вучняў Ульянаўскай пачатковай школы // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 40. Арк. 40.
758	Дожджык, дожджык, крапані...	Зап. А. С. Емяльянаў у 1971 г. у в. Прынёманне Гродзенскага р-на Гродзенскай вобл. ад Л. Кірэні (11 год) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 2. Спр. 42. Арк. 30.
758	Не йдзі, не йдзі, дожджыку...	*Грыневіч.* С. 13. № 14.
759	Гары, гары жарка...	*Federowski.* Т. 5. S. 617. № 1452.
759	Калода, калода...	Дзіцячы фальклор. С. 364.
759	Слімак, слімак...	Тамсама. С. 369.
759	Калека, калека...	*Романов.* Вып. 2. С. 172.
759	Каза, каза, дай малака...	*Добровольский.* Ч. 4. С. 477.
759	Жылі-былі мужыкі...	Тамсама. С. 477.
759	Да вілася пчолачка...	Дзіцячы фальклор. С. 374.
760	Ехала ікаўка...	Тамсама.
760	**ДРАЖНІЛКІ**	
760	Мі-кі-та! Ці ты та?..	*Шейн.* Бел. песни. С. 35.
760	Наталля — пралля...	Тамсама. С. 36.
760	Дзілінь-дзілінь-баў!..	*Романов.* Вып. 2. № 76. № 8.
761	Віця, Віця, Віцяля...	Дзіцячы фальклор. С. 380.
761	Сяргей-верабей...	Тамсама.
761	**ЛІЧЫЛКІ**	
761	Раз, два, тры, чатыры...	Тамсама. С. 393.
761	Раз, два — булава...	Тамсама. С. 399.
761	Раз, два, тры, чатыры...	Тамсама. С. 400.
761	Сядзіць немец на паліцы...	Тамсама.
762	Сядзіць зайчык на прыпечку...	Тамсама. С. 401.

С.	*З м е с т*	*К р ы н і ц ы*
762	Первенчыкі...	Дзіцячы фальклор. С. 401.
762	Сем семярэй...	Тамсама. С. 402.
762	Саломінка...	*Добровольский.* Т. 2. С. 491—492.
762	Чыкі-чыкі-чыкарок...	Зап. М. Я. Грынблат у 1945 г. у в. Бараўцы Куранецкага р-на ад дзяцей // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 140.
762	Цок-цыгірок...	*Романов.* Вып. 8. С. 567.
763	Кацілася торба...	Зап. І. Л. Сагарава ў 1950 г. у в. Веляцін Хойніцкага р-на // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 35. Сш. 1. Арк. 13.
763	Эна, бэна, рэсь...	Зап. М. Я. Грынблат у 1945 г. у в. Порса Куранецкага р-на ад Галі Сінко (12 гадоў) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 161.
763	Э-ката, пэ-ката, мэ	Зап. М. Я. Грынблат у 1945 г. у в. Палачаны Маладзечанска-га р-на ад Ніны Струмілінай (13 гадоў) // АІМЭФ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 170.
763	А ты, коцік, не гуляй...	*Романов.* Вып. 8. С. 567.
763	**ГУЛЬНІ**	
763	Палачка-шукалачка	Дзіцячы фальклор. С. 501.
764	Гарлачыкі	*Добровольский.* Т. 4. С. 496.
764	У яркі	*Романов.* Вып. 8. С. 576—577.
765	У пераскочкі	Тамсама. С. 565.
765	У каваля	Чарняўская. Дзяціныя гульні. С. 542.
765	У казу	*Романов.* Вып. 8. С. 568—569.
766	Прарок	Дзіцячыя гульні. С. 5.
766	У чыжыка	*Романов.* Вып. 8. С. 580.
767	**НАРОДНЫ ТЭАТР**	
768	Селянін і студэнт	*Каладзінскі.* С. 198—201.
773	Апісанне батлеечнага прадстаўлення, якое адбывалася ў Рэчыцы, Мозыры, Капаткевічах і Парычах	*Шэйн.* Т. 3. С. 141—144.
775	Апісанне батлеечнага прадстаўлення ў былой Мінскай губерні	*Барышаў, Саннікаў.* С. 143—144.
776	Цар Ірад	Изв. отд-ния рус. яз. и словесности императорской Академии. Спб., 1908. Т. 13. Кн. 2. С. 71—78.
782	Цар Максіміліян	*Каладзінскі.* С. 470— 476.

С.	*Змест*	*Крыніцы*
788	Прадстаўленне «Цара Максіміліана» ў Слуцку	*Каладзінскі.* С. 476—478.
791	**ПРЫПЕЎКІ**	*Никифоровский; Кабашнікаў, Цішчанка;* АІМЭФ. Ф. 8, 9.
804	**МЕТОДЫКА ЗБІРАННЯ ФАЛЬКЛОРУ**	
805	Падрыхтоўка да збірання фальклору	
806	Як запісваць фальклор	
807	Пашпартызацыя фальклорных запісаў	
809	Спіс скарачэнняў	

Вучэбнае выданне

БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР: ХРЭСТАМАТЫЯ

Складальнікі: **Кабашнікаў** Канстанцін Паўлавіч і інш.

Рэдактар
В. І. Аверкіна

Афармленне
і мастацкае рэдагаванне
А. Г. Званарова

Тэхнічны рэдактар
Г. М. Раманчук

Карэктар
Л. А. Шлыковіч

Здадзена ў набор 26.01.95. Падпісана да друку 08.02.96. Фармат 60×90/16. Папера афсетная. Гарнітура «Балтыка». Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 53,5. Умоўн. фарбаадбіт. 54,25. Ул.-выд. арк. 41,29. Тыраж 4200 экз. Зак. 1737.

Выдавецтва «Вышэйшая школа» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 5. 220048, Мінск, пр. Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, вул. Чырвоная, 23.



Асаблівасці і значэнне вусна-паэтычнай творчасці

Пісьменнікі і дзеячы культуры аб фальклоры

Замовы

Каляндарна-абрадавая паэзія

Сямейна-абрадавая паэзія

Прыказкі і прымаўкі

Загадкі

Казкі

Легенды і паданні

Анекдоты

Пазаабрадавыя песні

Гістарычныя песні, творчасць рабочых, паэзія змагання

Балады

Дзіцячы фальклор

Народны тэатр

Прыпеўкі

Методыка збірання фальклору

БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР